БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАВУКІ Й МАСТАЦТВА
ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА
НАША НІВА

АРХІВЫ

БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

ТОМ I
Кніга 2

АРХІВЫ

БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

ТОМ I

Кніга 2

ARCHIVES OF THE BELARUSIAN DEMOCRATIC REPUBLIC

Volume I

Book 2

Fund №582
The State Museum of Lithuania
(«Council of Ministers of the Belarusian Democratic Republic»)

BELARUSIAN INSTITUTE OF ARTS AND SCIENCES, INC.
BELARUSIAN LITERARY ASSOCIATION
НАША НІВА

Minsk — New York — Prague — Vilnius
1998

АРХІВЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Том I

Кніга 2

Фонд №582
Дзяржаўнага Архіву Літвы
(«Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі»)

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАВУКІ Й МАСТАЦТВА
ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА
НАША НІВА

Вільня — Нью-Ёрк — Менск — Прага
1998

Выдаецца за кошт грамадзкай падпіскі,
спадчыны сп. Аляксандра Лашука
ды з дапамогай
Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва,
Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня,
Фундацыі Імя П.Крэчэўскага,
Беларускага Харытатыўнага Фонду,
Скарбніцтва Рады БНР

Укладаньне, падрыхтоўка тэксту, уступны артыкул, камэнтары, пераклады, паказальнікі, кампутарны набор, макет:

Сяргей Шупа
Siarhej Šupa

Belarusian Institute of Arts and Sciences
Bibliographic Series No. 4

Library of Congress Catalog Card Number 98-70449

© Belarusian Institute of Arts and Sciences, 1998
© Таварыства Беларускага Пісьменства, 1998
© Сяргей Шупа, укладаньне, уступны артыкул, камэнтары, паказальнікі, 1998

Printed in Lithuania
ISBN 9986-9219-2-9 (Кн.1)
ISBN 9986-9219-3-7 (Кн.2)

2339. Ліст старшыні Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Камітэту Кузьмы Цярэшчанкі Ўраду БНР за 20.08.1920 з выказам даверу прадстаўляных Камітэтам партый, арганізацый і ўстановаў да Ўраду Вацлава Ластоўскага

582.2.54:389 — ра

2340. Ліст Кузьмы Цярэшчанкі (Більдэрлінгсгоф) Вацлаву Іваноўскаму (Варшава) за 22.08.1920

Даражэнькі пане Вацлаве, гэты ліст, карыстаясь любезным дазволам Польскага Пасольства, перасылаю табе з Рыгі праз іх кур'ера. Сюды я прыехаў 14 жніўня. Ад нашых спаткаў вельмі радушны прыём. Трэба падкрэсліць, што за час падарожжа я так зьменчыўся, што прапазыцыя пераехаць з Рыгі у Більдерлінсгоф (курорт) была мною з радасцю прынята. У Більдэрлінсгофе адбываецца і Балтіцкая канфэрэнцыя, г.зн. што тут лягчэй як йдзе можна спаткаць тутэйшых адпаведных палітычных дзеячоў. Ўсё гэта прыватнае, пераходжу да справы.

Пачну з Бацькаўшчыны. Як ужо табе вядома з газэт, у Менску абвешчана ў другі раз Беларуская Саветская Рэспубліка. Да часу Всебеларускага з'езду саветаў урадовая улада будзе знахадзіцца ў руках Рэўкома — у склад якога павінны вайсьці 3 беларуса 1 расеяц і 1 жыд. — Што датычыцца беларусаў, дык іх мейсца будуць заняты шчырымі працаўнікамі, для якіх справа на першым чаргу. Гавораць і аб іменах, але іх я пакуль што называць ня буду. Ёсьць весткі што нацыянальная праца не спынена; аб рэпрэсіях нічога ня чутна. Дзетальных інфармацый, якія маглі б дасканальна мяне здаволіць, я пакуль што не атрымаў. З літоўскіх крыніц выйшлі чуткі быццам у першае дні па заняцьцю Вільні быў заарыштаваны Антон, што з ім зрабілі далей на пэўна не вядома; адны гавораць што яго адразу жа аслабанілі, а другія кажуць быццам яго вывязлі у Маскоўшчыну. Пра Горадню нічога ня чуваць. Цяпер пра Рыгу і нашых. З адпаведных беларускіх працаўнікоў тут знаходзяцца Ластоўскі, Палута, Кастусь, Галавінскі і многа другіх. Па праўдзе кажучы ўсе заняты працай — якая, лічучысь з нашымі варункамі, йдзе вельмі добра. Сам Бог памагае пры гэтым страшэнным становішчэ ўсе такі трымацца на гэтакай высаце. Кніжны голад адчуваецца ва ўсю. Абавязкова трэба падмога; патрэбны і людзі. Усе гэта у пераспектыві намечаецца што я мушу падкрэсьліць, гэта праўдзіво, але час не чакае, трэба на гвалт выкарастаць палітычную сітуацыю сяньняшняга дня.

Дзякуючы палітычным варункам наша Дзержаўная справа сама вылазе рубам і во ў гэты момэнт двоеўладзьдзе прыносе вялікую шкоду, бо як іх бок, так і наш бок, пры нашай пакуль што не вялікай моцы, не дае той велічыны якая патрэбна для Дзержаўнай рэпрэзентацыі. Асабліва гэта дала пачуць Балтіцкая канфэрэнцыя, якая не дала мейсца у сваем складзе беларусам, ну аб гэтым дзеталічна буду пісаць далей.

Якім нібудзь чынам гэту справу, справу раскола, трэба залатвіць. Аб гэтым мы доўга конфіравалі з п. Ластоўскім і кой да якіх скуткаў прыйшлі.

Як адных, так і другіх аб'едзіняе наш канечны палітычны напрамак — дамаганьне Незалежнасьці і Непадзельнасьці нашай дарагой Бацькаўшчыны. Як адны так і другія у гэту хвілю, да адбудовы нашай Дзержаўнасьці не ў моцы узяцца за выка[на]ньня партыйных пераканаьняў. Было толькі адно разгаждзеньне ў тым, што мы гаварылі што пры ўсякіх варунках павінна вясьцісь актыўная праца, як на Бацькаўшчыне так і за межамі і што для гэтаго трэба выкараставаць уселякую сітуацыю, а яны стаялі на грунце рэвалюцыйнай барацьбы у часе польскй акупацыі пры праце на Бацькаўшчыне і выкарыставаньні уселякіх варункаў пры загранічнай працы. Такім чынам нас разделял погляд на працу пры польскай акупацыі, але цяпер гэта раз'еднаючая знішчана жыцьцем, што дае поля для перагавораў аб каордзінацыі працы. Як я мысьлю сабе гэту каардзінацыю я пакуль што пісаць, па некаторым прычынам, ня буду. — Быў я у п. Л.Васілеўскаго. Ен хварэе. Размова наша цягнулася ня больш часа — я яму развіваў думку сваечаснасьці узнаньня незалежнасьці[1]. Па праўдзе кажучы ен канкрэтна нічога не заявіў, зсылаясь што гэта справа Варшавы, але ен ўсетакі сказаў што гэту справу трэба фарсіраваць. Мяне вельмі цікавіць з якім багажам па нашаму пытаньню паехала у Менск польская дзелегацыя. З газэт відна што прэдстаўнікі Украіны там ёсьць. Ня ужож Дашынскі не здержаў свайго слова. Сягоньня буду апяць у Васілеўскага, буду гаварыць на конто грошаў. Я апыніўся тут, як я ужо пісаў з Гданьска а маль без капейкі; гэта чартоўская памена валют з'ела увесь мой скарб. Прашу цябе, даражэнькі Вацлаве, перашлі сюды грошай хутчэй. Можна гэту перасылку зрабіць праз польскіх кур'ераў. Нехай Тарас аб гэтым паклапоціцца. п.Васілеўскі на гэта згоду даў; ліку я не азначаю, але грошы на гвалт патрэбны і для справы і для асобнага кур'ера якога я к табе вышлю адразу пасьля першай палучкі. На днях Вільня будзе заўсім рээвакуіравана бальшавікамі[2] абавязкова туды трэба падмога. Прашу цябе не шкадуй грошы на тэлеграмы стаў у ізвестнасьць аб стане справы у цябе. Цяпер трэба нагвалт дамагацца незалежнасьці і дамагацца шырокага разьвіцьця працы В.К.[3]; бо не маючы рэальнай сілы немагчыма нікога прымусіць гаварыць з намі. Гэта чуецца тут на каждым кроку. Ліцьвіны трымаюць сябе не магчыма, адказ ад прыняцьця у склад Балт. Канф. выклікан ня згодай ліцьвіноў, якія заявілі быццам яны ня хочуць вязацца у Расейскія ўнутраннае справы. Буду гаварыць з п. Шымкусам[4], можа гэта хуць троху паправіць справу на Бацькаўшчыні.

Уся мая беда, што ня гож я да уселякіх дыплематычных гутарак. Вельмі добра было б калі б ты не пашкадаваў Тараса і худчэй прыслаў ба яго сюды; ен тут многа памог ба. Па маючымся у мяне точным весткам Аляксюк цяпер знаходзіцца у Празе; цікава ці зьвярнуў ен грошы ці не. У апошнім выпадку трэба з ім паступіць крута ўплоць да арэшта праз чэхаў, бо інакш мы заўсім згубім сваю марку у палякаў. Такіх мерзаўцаў шкадаваць нема чаго.

Як там з Грыбом, пры першай магчымасьці напраўляй яго сюды. Грошы лепей пасылаць сюды ў Польскай валюце, але для гэтага трэба імець дазвол ад Міністэрства Загранічных Спраў. Добра так сама купляць осты

на іх перавоз так сама патрэбен дазвол. Без перашкод можна правазіць любую валюту апрача польскай і нямецкай. Расейская добра толькі у вялікіх кюпюрах як 100 і 500 царскія. Курс польск. за 100 польск. 50 латв. Жыцьце тут дарагоя. У гэту хвілю жыву у пансіоне плачу за ўсе 120 руб у дзень; дорага, але таней знайсці ня можна. Чую сябе троху лепей, можа папраўлюся. Калі наладжу справы і мая прысутнасьць ня будзе патрэбна ні цябе, ні тут, дык паеду на Бацькаўшчыну — спачатку у Вільню, а калі будзе магчымасьць дык і да Менску. Але гэта ў перадзі.

Абавязкова, даражэнькі, напраў п. Трэпку у Нямеччыну нехай ен папілнуе закупку Саюза Сельскай Гаспадаркі. Правоз можна лічыць абязпечаным калі ня ў Менск дык у заходняю Беларусь ці праз Латвію, ці праз Літву. Можна спадзеваца што бальшэвікі Саюза не зачапілі. Справа з Кастусем выяснена, ен будзе пераведзен у другое мейсце. Аўсянік пакуль што сюды не прыехаў; пачутках ен у Празе.

Аб легалізацыі пакуль што ніскім не гаварыў, але буду гаварыць абавязкова, можа для гэтаго прыйдзецца выехаць да Рэўля. Тут есьць маладыя людзі якіх варта было б паслаць у вышэйшыя школы, я ня ведаю а сродках; калі толькі на гэта што есьць, дык другой раз напішу грунтоўней.

Прывет ад мяне ўсем нашым асаблівы Тарасу[5] і Андрэю[6]

цалую твой Кузьма

Більдэрлінсгоф. 22.VIII 20 г.

Адрэс. Рыга Ніколаеўская 20. Беларуская Місія.

582.2.53:003&r,002 — ра

[1] Пра візыт К.Цярэшчанкі з В.Ластоўскім да хворага Л.Васілеўскага, кіраўніка польскай дэлегацыі на канфэрэнцыі ў Більдэрлінгсгофе, гл.: Показания В.Ю.Ластовского 31-го июля 1930 года // Маладосць. №8. 1993. С.211. [2] Бальшавікі перадалі Вільню Літве 27.08.1920. [3] Магчыма Віленскага [Беларускага Нацыянальнага] Камітэту. [4] Ёнас Шымкус — кіраўнік літоўскай дэлегацыі на канфэрэнцыі ў Більдэрлінгсгофе. [5] Б.Тарашкевічу. [6] А.Якубецкаму (?).

2341. Ліст Аўгена Ладнова (Шатэль-Гіён) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 25.08.1920

Châtel Guyon 25/VIII 20.

Дараженькі, Пане Старшыня!

Учорась атрымау Ваші пратесты, а сяняка ліст ад Енарала Костуся[1].

Я прапаную и падтрымліваю патребнасць едынага фронту і згоды з Найвышейшымі: тутака у Закардонных Справах мене запыталі, каго трэба прызнаць? Гдзе Вашъ Урадъ, кто паимённа уходзіць у склад Ураду, дзе яны? Гетае пытанне ляжыць у аснове прыгатавання акту аб прызнанні. Але раней як такі акт будзе абвешчаны, нам усім прыдзецца падпісаць умовы, якія тутыка выпрацованы. Вось для чого я так пільне прасіу Вас каб усі наші былі з Вамі, бо може выйсць нешто дуже паскуднае, кале ніхто не зьявицца. Для падпісання умовы згода з Найвышейшімі будзе мець бальшую вагу.

У тутейшых газетах некалькі раз афицыяльна упаміналася палякамі пра геройскую чыннасць на фронце проці бальшавікоу беларусскіх аружных сіл (беларуска-літоуская дывизія[2]).

Я за гэтае ухапіўся і напісау для Ураду тутэйшых нашых прыяцелеў, што палякі нашымі збройнымі сіламі корыстаюць, а мы ничого не маем (народ наш). Я прасіу, каб Урадъ прыяцелеу узяу пад сваю каманду нашы збройныя сілы и даў нашаму ураду магчымасць, апираючысь на гэтую сілу, ставиць сваи варунки усходникам и заходнікам. Я казау, што мы будзем вясьці вальку, пакуль не прагонім усходнікау з нашай зямлі. Прашу Вас напісаць ад Ураду паперу у тым же сэнсі і як найхудшей прыслаць сюды а я прэдстаулю Ураду Ф<ранцыі>. Мне так радзілі нашы прыяцелі. Усюды падтрымлівайце гэту ідэю. Мы маем свае войска! У астатнім ліcце да Вас, які я паслаў почтаю тыдня таму назадъ я Вам казау, што сіла усходнікоу толькі кажущаяся. Цяпер Вы маеце ужо весткі, што я быу праў. Тутыка відней; каліб усходнікам памаглі немцы, так ад іх бы толька мокра асталась. Францыя вялікая, магучая сіла, и у гэтым нашэ щасьце!

Учорась абвещана у газэтах, што амэрыканскі пасол у Варшаве прасіу польскі урад не перехадзіць граніцу этнографічную. Значыцца Беларусь аддасцца на міласць бальшавікоў. Я сяня пішу пратест проци такой справы: мы маем свае войска і будзем адбіваць Бацькаушчыну ад ворогоу заклятых. Мы не прызнаем і народ наш ніколі не прызнае ніякіх Савецкіх Рэспублік! У нас есць урад, есць Рада — едыны законны и правамоцны предстаунік усяго народу. Толькі яны маюць право казаць і рабіць а ніхто другі. Я прашу каб нам была дазволена переѣхаць у Польшчу и аттуль, апіраючысь на свае войска, начаць акцыю проці бальшавікоў Прашу Вас зрабіць гэта самае празъ франц. місыю у Рызе. Дубликаты прышліце мнѣ, я іх предстаулю у Міністэрство. Прапануйце тое самае праз польскаго предстауніка у Рызе польскаму Уряду; копію прышліце мне. Усе гэты нашы прапазыцыі будуць у маіх руках добрым аружжам, што мы шукаем паразумення с суседзямі, а прыяцелі тутэйшые будуць нажымаць з іх стараны на Урад. Справа пойдзе вельмі добра! Вот у гэтым сэнсі паразуменне з Найвышейшымі абавязкова патрэбна, але Вы ім ничого не кажыце. Падпішыце умову, вазьміце мандаты, прызнаньне Рады імі, нашаго Ураду, папоуніце урадъ як найхудшей и усі акты, якіе прышлеце сюды падпішыце усім урадом. Мне здаецца што у склад ураду трэба уключыць пана Язепа Варонку. Дайце яму народную асьвету, алі які другі. Треба каб урад меу палнамоцтва адъ Рады на защыту інтэрэсоў белар. народу на міравой Канферэнцыі, на учыненне усякіх умоу політычных і эканамічных и т.д. калі прыедзеце сюды перш на перш трэба будзе предъявиць мандаты. Прыміце гэта пад увагу.

Трэба мець копію протакола Рады аб выборе Ураду з поименованньем усіх члонкау Ураду.

Тут польскі пасол у зносінах за мною пішэ афицыяльна да мене, як да афицыяльнаго предстауніка Беларусі. Раней гэтаго ні было!

Я звараціуся да яго з афіцыальным лістам абъ устанавленньи паразумення з нами. Ліст напісау 3/VIII, а копію паслау у Закардонныя Справы, у Камісыі Закардонных Спрау Палаты и Сэната. Их інтэресы былі 3/VIII дужа кепскіе, але я ведау, што ім будзе адсюль вялікая падмога. И напісау тады, калі ен ня може сказаць, што мы шли да сільнага. Мой ліст

зробіу дужа добрае враженне на Закардонныя Справы и на Камісыі. Адповедзь дужа прыемную па форме, атрымау на другі дзень ад Графа Замойскаго. Мой ліст ен адаслау да Варшавы. У Закардонных мне казали: «Бальшая ці маленькая, але Ваша Бацькаушчына будзе!» На нас тут дуже добра глядзяць, як на спакойных, ціхіх, скромных і вельмі прыхільных да Ф<ранцыі>!

Нехай людзі, або гісторыя Вам разскажуць, якія тут прышлось вясьці валькі; я аб сабе нічого казаць не буду!

Усі Вашы пратесты и постановы о межнародовым становіщы Беларусі прысылайце мне, кабъ я мог гэта даваць (Вашы арыгіналы з переводам які зроблю тут) у Закардонныя. Трэба даваць знакі істнавання!

Напішыце як найхудшей пратест проці Бел. Сов. Республики! 21 іюля Ленин на зъѣздзи крестьян казау, што яны ідуць асвабадзіць Беларусь, а як прыйшлі так і абъявілі Савецкую Республіку! Гэта насілле над намі! Чекаю Вашых пратестау. Абнимаю крэпко Вас і усих нашых. Цалую ручку пані Старшіновой. Ваш, Эўгені.

Костуся трэба назначыць и.д. Мін. Обороны.

Пішыце у Парыж па стараму адресу.

582.2.54:281&r-282&r — ра

[1] Езавітава. [2] 1-ая літоўска-беларуская дывізія пад камандаваньнем Л.Жалігоўскага складалася з крэсовых палякаў і беларусаў каталікоў.

2342. Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) дырэктару газэты «Le Temps» (Парыж) за 26.08.1920

582.2.54:292&r-296&r — рк перакладу на расейскую мову

Водгук на артыкул у газэце «Le Temps» №21572 за 23.08.1920 аб польскіх умовах міру і ўсходніх межах Польшчы. У лісьце выказваюцца думкі аб аднаўленьні аўтаномнай Беларусі ў складзе Вялікай Расейскай Фэдэратыўнай Рэспублікі.

2343. Справаздача старшыні Дэлегацыі БНР на Канфэрэнцыі Балтыйскіх Дзяржаваў у Рызе Янкі Чарапука за 29.08.1920

Пану Старшыне Рады Народных Міністроу
Беларускай Народнай Рэспублікі
Грамадзяніну В.Ластоускому.

Я.Чэрэпука, Старшыні дэлегацыі БНР
на Канфэрэнцыю Балтыцкіх Рэспублік у Латвіі.

Даклад.

Беларуская дэлегацыя на канферэнцыю Балтыцкіх дзяржау, злажыушаяся у такім складзе: 1) старшыня дэлегацыі член Рады Рэспублікі Я.Чэрэпук, 2) сэкрэтар д-р Пігулеускі, 3) экспэртоу інжэнероу Головінскаго і Мінца (апошні быу залічаны ад Рады Беларускай каленіі у Латвіі) яна па сваем прыбыцьцю у Рыгу зараз-жа прыступіла да выпауненьня узложаных на яе урадовых даручэньняу.

У першы чарод у рэдакцыі мейсцовых газэтоу была дана заметка аб складзе дэлегацыі, затым была зроблена афіцыяльная візыта Старшыні міністру міжнародовых спрау Латвіі гр. Мейеровіцу.

На гэтай аудыенцыі удалося выясьніць, а таксама і устанавіць, што Латвія дзеля ухода Беларусі на канферэнцыю зойме прыхільнае становішчо, гэтага самаго дэлегацыі патрэбна была дабіцца і ад другіх учасьнікоу т.е Польшчы, Літвы, Эстоніі і Фінляндзіі.

Прымаючы пад увагу, што пад час істнаваньня кабінэта А.Луцкевіча калі у Гельсінгфорсе адбывалася першая арганізацыйная канферэнцыя на якой прымалі учасьцьце Фінляндзія, Эстонія, Латвія, Літва і Польшча, — Беларусь тагдэ не была прэдстаулена сваім прэдстауніцтвам, а згодна прынятаму гэльсінгфорскаму статуту прыняцьце новаго сябра адбыцца можа толькі за агульнай згодай усіх выжэйпамянутых дзяржаў.

Ціпер-жа Беларускай дэлегацыі было папасьць больш трудней, чым гэта магло-б стаць раней.

Глауныя прычыны тут скрываюцца у тым, што палітычныя і тэррыторыяльныя справы Беларусі з сваімі суседзямі не былі да гэтай пары выясненымі, як напрыклад асабліва з Польшчай і Літвой.

Так што першым заданьнем дэлегацыі былі зроблены належные крокі каб нахіліць на сваю старану Польшчу і Літву.

У гэтым кірунку велася афіцыяльная гутарка 2 разы з Старшыней Польскай дэлегацыі, поунамоцным міністрам гр. Васілеускім.

Пасьля доугіх супольных перэгавороу, удалося дабіцца, што Польшча будзе падтрымліваць, каб Беларусь была на канферэнцыю прынята.

Гэта было і выяулена мне паслом Польшчы у Латвіі паслом Каменецкім.

Такая самая палітычная работа і з старшынею Літоускай Дэлегацыі д-рам Шаулісам была праробленa. Гутарка велася мной і гр. Головінскім. Але тут ужэ яуна і выразна у перэгаворах выявілася, што літоуцы будуць стаяць за тое, каб беларусы не папалі на канферэнцыю.

Другімі славамі умацаванье беларускай дзяржаунасьці гэта не саупадае з інтэрэсамі Літоускаго гаспадарства.

Віленшчына і Городзеншчына гэта той Гордзіеу вузел, каля якога усе звязана. Гастрату адносін літоуска-беларускіх узмацаваy яшчэ пратэст Беларускаго ураду, проціу аддачы літоуцам бальшэвікамі беларускіх зямель і эксплоатацыі лесоу..., гэта выразна падкрэсьліу Шауліс.

Наагул ужэ было вядома, што літоуцы будуць проціу нас, гэтыя весткі нашэй дэлегацыі удалося атрымаць і з другіх крыніц. Як факт падтверджу размову з міністрам міжнародовых спрау Латвіі Мейеровіцам і з Гэнеральным сэкрэтаром канферэнцыі тов. міністра міжн. спр. Латвіі гр. Альбатам.

Эстонія заняла пазыцыю нэутральную спачатку, але пасьля перэгавороу з старшыней дэлегацыі гр. К.Пустай чулося, што эстонцы перэшкод чыніць ня будуць.

Фінляндыя, з прэдстауніцтвам якой веу перэгаворы інж. Головінскі, та яна была успасоблена да нас як найпрыхільней.

І так аснауной працай дэлегацыі было:

1, папасьць, як роунапрауны сябр з голасам пастаноучым на канферэнцыю Балтыцкіх дзяржаy у Більдэрлінгсгофе,

2, наладзіць добрасуседзкія адносіны з Польшчай і Літвой,

3, правесьці сярод канферыруючых рэспублік шырокую агітацыю палітычную у справе незалежнасьці Беларусі,

4, даказаць, што Урад Беларусі, хаця часова і змушаны быу пакінуць Бацькаушчыну, але, што ен у хуткім часе зноу вернецца на сваю тэрыторыю,

5, атрымаць належную моральна-матэрыяльную дапамогу дзеля умацаваньня сваей Дзяржаунай Незалежнасьці.

У гэткім напрамку дэлегацыя працавала з вялікай энэргіей. Кожнай дэлегацыі былі зроблены абшырные даклады аб палітычным, нацыянальным, эканомічным і вайсковым становішчу Беларусі. Рэзультатам чаго кожнае прэдстауніцтво паслала сваім урадам абшырные мэморыялы аб палажэньні беларускай справы. Затым удалося наладзіць адносіны з Польшчай, выключаючы толькі Літву.

І што справу удалося паставіць на належную высату, гэта сьведчыць тое, што нашэ пытаньне разбіралася не толькі у Прэзыдыуму, які быу змушаны запрасіць яшчэ спецыяльны даклад самаго Ураду, але і тое, што было склікана спецыяльнае пленарнае паседжэньне дзеля разгляду таго палажэньня у яком апынілася Беларуская Народная Рэспубліка.

Але ня гледзючы на усе тыя вялікія стараньня, каб правесьці у жыцьце тую мэту, якую мела у сваем даручэньню дэлегацыя, яна сустрэнулася на моцны адпор Літвы, якая усялякімі спосабамі стралася уменшыць права беларусоу на учасьцьце у канферэнцыі.

І калі на чатвертым пасяджэньню была галасаваньне, ці каб Беларусь увайшла на канферэнцыю, ці не, Літва была толькі адна проціу. Гэта удалося даведацца як з кулуарных гутарак прыватных з конферыруючых прэдстауніцтв, таксама было дана зразумець і з гутарак, якія я меу з сэнатарам Замуэлем, сябром Латвійскай дэлегацыі, так і з генеральным сэкрэтаром конферэнцыі Альбатам.

Другім яшчэ фактам які многа перэшкаджау дэлегацыі для здзейсьненьня яе даручэньняу была абслютная адсутнасьць грошэй.

Не гледзючы на усе гэта калі я зрабіу пажагнальную аудыенцыю Старшыне Латвійскай дэлегацыі сэнатару Замуэлю, ен адказау, што на будучую канферэнцыю Беларусь можэ быць напэуна прынята, калі толькі уладзіць адносіны з Літвой, бо усе другія Прыбалтыцкія дзяржавы стаяць на старане моцнаго хауруса з Беларускай Народнай Рэспублікай.

Старшыня Дэлегацыі

582.2.54:298&r — мк

2344. Л.Генделіовичъ. О кругѣ дѣятельности Бѣлорусской Торговой Палаты

582.2.54:352-353 — мк

Дата невядомая.

2345. Даклад шэфа Беларускага Прэс-Бюро ў Капэнгагене Ісака Лур'е за 29.08.1920 аб заснаваньні ў Капэнгагене Беларускай Гандлёвай Палаты

582.2.54:354-358 — ма

2346. Праект палажэньня аб Беларускім Гандлёвым Камітэце ў Капэнгагене, складзены Ісакам Лур'е

582.2.54:350-351 — мк

Дата невядомая.

2347. Узоры пячаткі й блянкавага штампу Беларускага Цэнтральнага Саюзу Сельскай гаспадаркі (Менск)

582.2.54:388

Дата невядомая.

2348. Расьпіска Лявона Дубейкоўскага за 2.09.1920 аб атрыманьні ад Вацлава Іваноўскага ў Цэнтральную Касу 823 польскіх марак

582.2.58:077

2349. Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 3.09.1920

Прошу телеграфировать о полученіи письма.
3/IX 20.

Дараженькі пане, Старшыня!

Если Вы еще не исполнили телеграфной просьбы моей немедленно прислать в Париж мнѣ, на имя Конференціи Послов в Парижѣ (Мирной Конференціи) ноту с просьбой о признаніи Независимости, то прошу сдѣлать это как можно скорѣе. Посылаю матерьял для ноты, в котором в хронологическом порядкѣ изложены акты Государственнаго значенія, свидѣтельствующіе о стремленіи нашего народа к Независимости.

Въ таком же духѣ нужно будет составить и Вашу ноту. Я написал секретарю, чтобы он выслал Вам копію моей послѣдней ноты. Вы можете ее цѣликом перебить на машинкѣ на бланкѣ Сов. Министров (подпишите всѣ т.е. Правительство) и прислать мнѣ, а я передам по назначенію. Даже в том случаѣ, если Вы послали уже ноту, можете повторить, будет даже лучше.

Просите и требуйте чтобы нам было предоставлено право принять участіе в мирных переговорах Польши с Сов. Россіей. Я подал такую ноту здѣсь, но необходимо, чтобы и Вы дѣйствовавли в том же направленіи, так как «друзья» наши, на которых мы так расчитывали, тайно сообщают, что я — единица и за мной никого нѣт. Вот почему прошу Вас теперь оставить всю работу по установленію «взаимоотношеній» с сосѣдями и направить всю дѣятельность сюда, чтобы я служил только передатчиком: нужно доказать, что Вы — существуете и дѣйствуете. Моя работа и Ваша должны быть параллельны и согласованны. Связь с Вами должна быть непрерывной и регулярной: посылайте информаціи о дѣятельности на мѣстах.

Необходимо сообщить точно:

1) С какими организаціями Правительство связано в Бѣлоруссіи, т.е. на кого может опереться

2) Нужны постановленія политическихъ партій по существу текущаго момента

Нужно протестовать противъ Совѣтской оккупаціи и провозглашенія самочинно, безъ волеизъявленія народа, Совѣтской Республики, которую Бѣлоруссы никогда не признаютъ и съ оружіемъ въ рукахъ будутъ бороться за свою независимость

Нужно протестовать противъ польской оккупаціи: поляки заявили, что они оккупировали Бѣлоруссію по просьбѣ самихъ бѣлоруссовъ

Нужно опровергнуть и протестовать

Нужно приложить къ требованію о признаніи незалежности провозглашеніе этого акта отъ 25 марта, постановленіе Рады Виленщины и Гродненщины. Вы пришлите только официальное заявленіе со ссылками на эти акты, а самые акты въ переводѣ я приложу.

Если есть протоколы рады Республики, говорящіе объ этомъ, необходимо немедленно прислать засвидѣтельствованные копіи этихъ протоколовъ при Вашемъ официальномъ сношеніи: я переведу и представлю Франц. Правит.

Постановленія съѣздовъ полит. партій, крестьянскихъ организацій, кооперативовъ, если таковые имѣли мѣсто и вынесли резолюціи о признаніи независимости, необходимо прислать таковые.

Постановленія рады Республики о формированіи Бѣлорусскаго войска (или Рады Виленщины и Гродненщины) обязательно пришлите.

Довѣріе Рады Виленщины и Гродненщины Правительству и Радѣ Республики также пришлите.

Сообщите, какимъ образомъ предполагаете организовать борьбу съ большевиками на территоріи Бѣлоруссіи? Можете ли поднять возстаніе? Какія для этого нужны средства? Какія имѣются силы?

Всѣ эти вопросы обязательно освѣтите.

Всѣ протесты, какіе только были сдѣланы Вами за время польской оккупаціи противъ таковой, обязательно пришлите мнѣ для той же цѣли.

Всѣ протесты противъ захватныхъ стремленій литовцевъ обязательно необходимы.

Если есть протоколы переговоровъ съ литовцами, латышами и проч. обязательно пришлите таковые.

Приложите всю Вашу энергію къ одной только точкѣ: Париж.

Здѣсь все будетъ сдѣлано. Имѣйте въ виду, что все готово для формальнаго заявленія о признаніи. Вамъ необходимо быть всѣмъ вмѣстѣ. Пригласите Бодунову, Воронко, Терещенко, Кречевскаго, Зайца, Цвикевича. Теперь всѣ должны быть на мѣстахъ. Нельзя разбрасываться. Вамъ всѣмъ придется прибыть сюда.

Просите о передачѣ бѣлорусскихъ воинскихъ частей подъ команду французовъ и одновременно просите о разрѣшеніи и содѣйствіи новыхъ формированій.

Заявите, что это наши воинскія части, сформированныя согласно постановленія Рады Виленщины и Гродненщины, при участіи комиссіи изъ членовъ Рады Республики. Эти войска дрались храбро въ составѣ польской арміи (донесенія польскаго Генер. Штаба отъ 4 августа и 15 августа) и мы желаемъ теперь въ борьбѣ за освобожденіе нашихъ земель отъ большевиковъ

опереться на наши вооруженныя силы. Вырѣзку изъ «Le Temps» за 3/IX 20 (оффиціоз Франц. Правит.) по поводу бѣлорусских и украинских войск, при сем прилагаю. Используйте это обстоятельство: оно чрезвычайно важно. Это — наша реальная сила. Я подал по этому вопросу ходатайство в Штаб Маршала Фоша. Прошу чтобъ французы взяли под свою команду и помогли нам организовать свое войско. Если удовлетворят, то этим все будет сдѣлано. Дѣйствуйте и Вы немедленно в этом же направленіи.

Костуся в Штабѣ Фоша хорошо знает подполковник француз; он очень лестно отзывался о Костусѣ перед моим помощником по занимаемой должности (родственник Маршала).

Здѣсь работа кипит; не теряйте ни одной минуты и Вы. Вопрос назрѣл. Большевики хотят намѣренно разорвать нашу землю, как в Брест-Литовскѣ в 1918.

Здѣсь желают знать, каково отношеніе нашего населенія к Совѣтской власти? Можно ли разсчитывать, что при наступленіи наших вооруженных сил населеніе возстанет против большевиков. Если имѣются свѣденія о возстаніях крестьян против большевиков или можете поручиться, что такое возстаніе наши власти поднимут против большевиков, обязательно сообщите, чтобы я мог Ваше сообщеніе передать Фр. Прав. Только опираясь на реальныя силы нашего народа, мы можем требовать нашего признанія. Ваше соглашеніе с Найвышейшими чрезвычайно важно в данный момент. Используйте его.

Гдѣ бы Вы предполагали наиболѣе желательным и выгодным начать работу по борьбѣ, т.е. куда бы Вы желали переселиться: в Ковну или в один из уголков Бѣлоруссіи?

Начинайте работу в добрый часъ! Жду Ваших протестов, информацій и дѣйствій на мѣстах. Это будет проявленіем связи с населеніем; если возстанія имѣли мѣсто, немедленно сообщите. Гдѣ Минчук? Ведет ли он далѣе борьбу. Не бесѣдуйте ни с кѣм из сосѣдей по нашему вопросу. Будьте замкнуты. Все истолковывается шиворот навыворот. Имѣйте в виду, что за Вами зорко слѣдят и доносят сюда, парализуя этим мою работу.

Посылаю вырѣзку из Le Temps и мой отвѣт на нее. Въ отвѣтѣ Вы найдете полезный матерьял для ноты. Имѣйте в виду, что американцы стоят упорно за объединеніе Россіи и нажимают на наших друзей. Возможна Федерація Бѣлор., Украйны, Крыма, Дона, Кубани и пр. Прошу Вас считаться с этим весьма важным фактором. Свѣдѣнія, поступающія от Петлюры, говорят о том, что он вновь переходит на точку зрѣнія необходимости федерації.

Я захворал. Просто износился. Заболѣл. Сижу в Шатель-Гійонѣ. Скоро возвращусь. Пишите Париж 25 Av. Victor Emmanuel III в делегацію, для меня.

Что ничего не слышно о т. Бодуновой? Привѣт от меня!

Крѣпко всѣх обнимаю! Цѣлую ручку Пани Старшиновой. Ваш, ЕЛаднов.

Костуся нужно назначить и.д. обороны, а Васильковского на его мѣсто.

Подписи всѣх на нотах обязательны.

582.2.54:393&r-394&r — ра

2350. Запіска на візытоўцы Кузьмы Цярэшчанкі (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 3.09.1920

Яго Міласьці Пану Ластоўскаму

Пане Вацлаве, я еду у Більдерлінсгоф; мне абавязкова сяньні перагаварыць з Каменецкім[1], а ен паехаў туды

З пашанай КозТэрэшчэнко

3.IX.20

Рыга

582.2.54:398&r — p

[1] Сябра польскай дэлегацыі на канфэрэнцыі ў Більдэрлінгсгофе.

2351. Пратакол супольнага сходу Рады Народных Міністраў, Прэзыдыюму Рады БНР з удзелам Надзвычайнай Місіі БНР у Маскве, які адбыўся ў Рызе 3.09.1920

Пратакол

супольнаго Сходу Рады Народных Міністроў, Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з учасьцем Надзвычайнай Беларускай Місьі у Маскве і Шэфа Вайскова-Дыплёматычнай Місьі у Латвіі і Эстіі.

3 верэсьня 1920 году

м. Рыга

Слухалі:

Даклад Надзвычайнай дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі у Маскве, Грамадзяніна Базыля Захаркі, аб ходзе даручэных яму Урадам Б.Н.Р. перэгавораў з урадам Камісароў Р.С.Ф.С.Р.

З дакладу выясняецца, што:

а) Дэлегацыя выехаўшая 7 чэрвеня з м. Рыгі не змагла, з незалежных ад яе прычын, праехаць адразу у Расею не ўдалося і яна затрымалася у Рэвелі, скуль знеслася с Камісарам Міжнародных спраў Р.С.Ф.С.Р. грамадзянінам Чычэрынам;

б) што пасьля зносін с Камісарам Чычэрынам, не прэдставілося магчымым праехаць у Маскву усей дэлегацыі у поўным складзе і прышлося дэлегацыю разбіць: Сэкрэтар Дэлегацыі гр. Янка Чэрапук, быў пакінуты у Рэвелі для звязі з Урадам, а Старшыня Дэлегацыі, грам. Васіль Захарка і член дэлегацыі - Міхась

Пастанавілі:

1, Прыняць даклад да ведама. Дзякаваць дэлегацыі за панесеную ей вялікую і цяжкую працу.

Маркевіч выехалі ў Маскву; прычым Старшыня Дэлегацыі выехаў 24 чэрвеня зусім афіцыальна, як прэдстаўнік Ураду і маючы ахранные граматы ад прэдстаўніка Р.С.Ф.С.Р. у Рэвелі, а Член Дэлегацыі грам. Маркевіч злажыў у Рэвелі свае поўнамоччы і выехаў у Маскву, як прыватны грамадзянін па прыватных справах і паперах;
в) у Маскве, куды Старшыня прыбыў асобна і пазьней грам. Маркевіч, а іменна 3 ліпня, ён быў спачатку памешчэн у асабняку камісарьята Міжнародных Спраў, на Самацечнай-Садовай вуліцы, а пасьля у гасцінніцы «Княжы Двор» на Анціпьеўскім перавулку; грамадзянін Маркевіч быў памечшэн у асабняку Камісарьяту Міжнародных Спраў на Паварской вуліцы; афіцыальных зносін абодвы дэлегаты — друг з другам — ня мелі;
г) перэгаворы с пачатку абецалі быць вельмі спрыятнымі, але пасьля сказіліся тым, што пад уплывам сваіх вайсковых неўдач на Украіне[1], Савецкая Расея, каб забаспечыць свой правы фланг, заключыла пасьпешую міравую умову з Літвой[2] і аддала Літве беларускіе землі Віленшчыны і Гродзеншчыны; гэты жданны для Беларусі дагавор быў асобнай энэргічнай нотай, ад 17 ліпня №8, Старшынёй Дэлегацыі рашуча апротэстованы, і ен, ня лічучы далей магчымым вясці якіе-б то ні было размовы, — пастанавіў выехаць да Ўраду з дакладам;
д) 3 жнівеня, скончыўшы патрэбные фармальнасці, Старшыня Дэлегацыі гр. Захарка заняў адведзенае яму мейсцо у цягніку, адыходзячым праз Петраград на Рэвель, але за 5 мінут да атхода цягніка у вагон зьявіўся прэдстаўнік Камісарьята Міжнародных Спраў, грамадзянін Гай і заявіў,

што Камісарыят Міжнародных спраў
просіць старшыню Дэлегацыі затры-
мацца ешчэ на некаторы час у Мас-
кве; Старшыня Дэлегацыі, гр. Захар-
ка, згадзіўся затрымацца ешчэ на
некалькі дзён;
е) затрымка Старшыні Дэлегацыі не
дала ніякіх рэзультатоў і ён, падаў-
шы новую ноту, 20 жнівеня №9, вы-
ехаў 27 жнівеня, разам з гр. Марке-
вічам у Рэвель скуль ужо прыбыў
2 верэсьня у м. Рыгу;
ж) падробны даклад аб зробленай
Дэлегацыяй працы будзе пададзен
Старшыней дэлегацыі у бліжэйшые
дні разам с копіямі пададзеных Ура-
ду Р.С.Ф.С.Р. нотаў Ураду.

3) Дадатковы даклад грамадзяніна Маркевіча, асьвяціўшаго настроі і адносіны да нас з боку расейскіх урадоўцаў, выложэные яму у прыватных гутарках.

Дзякаваць і прыняць інформацыі да ведама.

3) Даклад Сэкрэтара Рады Б.Н.Р. грамадзяніна Мамонькі, прыехаўшаго сеньніка з Менску, аб становішчы на Бацькаўшчыне, пачынаючы з апошніх дзен панаванья у Менску палякоў і да 23 жнівеня. З дакладу выяўляецца:
а) што палякі, пакідаючы Менск спалілі шмат будынкоў і прычынілі Менску страшэнные страты (руіны грамадзянін Мамонька сфатаграфаваў і прывез у Рыгу).
б) пасьля атходу палякоў ўлада у Менску была узята беларусамі на чале з грам. Мамонькам;
в) с прыходам чырвонай арміі — ўлада перэйшла да чырвонай арміі;
г) бальшавікі прапанавалі беларускім партыям увайсці з імі у кантакт і раздзяліць с камуністамі ўладу, але беларускіе партыі, нездаволеные большэвіцкай палітыкай ўмешыванънеся у беларускіе справы, — адмовіліся ад падпісаньня дэкляра-цыі аб апавешчэньні незалежнасці

Радавай Беларускай Соцыялістычнай Рэспублікі і ад адпаведальнасці за палітыку Савецкаго Ураду на Беларусі; на супольную працу з большэвікамі пайшлі толькі партыя беларускіх камуністоў;
д) беларускіе дзеячы вядуць цяперака працу у культурна-прасьветных нацыанальных установах і ў нацыанальных коопэратывах, якіе захавалі сваю аўтаномнасць у поўнай меры; рэзультаты гэтай працы ужо выявіліся і на адбыўшыхся вучыцельскіх зьездах працаўнікоў прасьветы, усюды вынесены рэзалюцыі па[т]рэбуючые абавязковасці ва ўсіх школах беларускай мовы.

(подпісі)
Ластоўскі
Старшыня Рады Народных Міністроў

Палута Бадунова
Віцэ-старшыня Рады Б.Н.Р.

Захарко Я.Чэрапук Маркевіч
Члены Надзвычайнай Дэлегацыі у Маскву

Я.Мамонько
Сэкрэтар Рады Б.Н.Р.

А.Вальковіч
Кіраўнік Канцэлярыі Рады Н.М.

К.Езовітоў
Сэкрэтар сходу.
582.2.54:401&r-404 — рк В.Ластоўскага

[1] 26.04.1920 польскія войскі разам з дывізіямі С.Пятлюры рушылі на Ўкраіну. 7.05.1920 быў узяты Кіеў. [2] У Маскве 12.07.1920.

2352. Нота Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі за 7.09.1920[1] міністру міжнародных справаў і Ўраду Рэчыпаспалітай Польшчы з прапановай прызнаць незалежнасьць БНР дзеля пасьпяховага змаганьня з Расеяй

Беларуская Народная
Рэспубліка
Міністэрства
Міжнародных Спрау
7 верэсьня 1920 г.

Міністру Міжнародных Спрау
Ураду Рэчыпаспалітай Польскай.

Грамадзянін Міністр.

Паутара году таму назад, Начальнік Польскай Рэспублікі, Фэльдмаршал Язэп Пілсудзкі, акупаваушы беларускія землі Горадзеншчыны і Віленшчыны і збіраючыся у паход на Міншчыну, Вітэбшчыну і Смаленшчыну, абвесціу, што польскі меч нясе гэтым землям волю і дзержаную незалежнасьць. Вестка аб гэтым акце выклікала узрыу здаволеньня у беларускага народу і падгатавала прыхільнае спатканьне польскіх войск на уноу займаных беларускіх тэрыторыях, дзе арганізаваліся нават асобные паустанчые атрады беларускай зяленай арміі, за большэвіцкім фронтам, дапамагаушые палякам.

С таго момэнту прайшло ужо шмат часу. Польшча прызнала незалежнасьць Украіны і Літвы. У руках польскага камандаваньня знаходзілася значны час сталіца Беларускай Народнай Рэспублікі і вялікіе тэрыторыі на усход ад яе, забаспечаушые спакойную арганізацыю і будаўніцтва Беларускай дзержавы, але Урад Польшчы на жаль да апошніх часоу не наважыуся правясьці у жыцьце абецаньня Начальніка Польскай Рэспублікі і вызнаць Незалежнасьць Беларусі.

Ваенныя удачы цяпер ізноу пасуваюць польскія легіоны на межы Беларускай Зямлі. Цяперашнія маскоуска-бальшавіцкія акупанты, шукаючы сабе падтрыманьня у беларускім народзе, абвесцілі Незалежную Радавую Беларускую Рэспубліку. Аднак народ беларускі ніколі ня можэ пагадзіцца з маскоускай акупацыей, дабіваючыся поунай палітычнай незалежнасьці. Непрызнаньне дагэтуль Польшчай Незалежнасьць Беларусі звязывае беларускаму народу рукі. Ен ня можэ актыуна выступіць проці маскоускіх акупантоу.

Каб падняць рашучую барадзьбу з Расейскай акупацыей трэба даць беларускаму народу пэунасьць, што змагаючыся у тылу і на фронце з бальшавіцка-маскоускім уціскам, ен гатуе сабе ня новую няволю, а будуе Незалежную Беларускую Дзержаву.

Лічучы, што сучасны момэнт найбольш падходзіць да таго, каб споуніць абецаньня Начальніка Польскага Гаспадарства, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі зварачаецца праз Вас, Грамадзянін Міністр, да Ураду Рэчыпаспалітай Польскай с прапазыцыей вызнаць Незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі.

Прыміце Грамадзянін Міністр запэуненьне у вялікай да Вас пашане.

В.Ластоўскі,
Старшыня Рады Народных Міністрау і заступаючы
Міністра Міжнародных Спрау.

582.1.06:012 — шк бел
582.1.06:057 — шк бел
582.1.07:074 — шк бел
582.1.06:031 — шк фра
582.2.51:128 — шк бел
582.2.53:141 — шк фра
582.2.54:334&r — мк пол

[1] 7.09.1920 канфэрэнцыя была перанесеная ў Рыгу.

2353. Нота Ўраду БНР Прэзыдыюму польска-расейскай Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе за ??.09.1920

582.2.54:378&r — р бел

Дакладная дата невядомая. Чарнавік дакумэнту №2352.

2354. Пратэст Ураду БНР перад культурнымі нацыямі сьвету за ??.09.1920 супраць падзелу Беларусі

582.2.54:371&r-372&r — р бел

Дакладная дата невядомая.

2355. Нота пратэсту Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі за 7.09.1920 Мірнай Канфэрэнцыі ў Парыжы, Ураду Польшчы і Ўраду РСФСР у справе мірных перагавораў паміж Расеяй і Польшчай

МІРНАЙ КОНФЭРЭНЦЫІ У ПАРЫЖЫ.

Адбываючыеся у цяперэшні час мірные перэгаворы паміж РСФСР і Польскай Рэспублікай, зачэпляюць жывотные інтэрэсы Беларускай Народнай Рэспублікі, якая у цягу шасці гадоу служыла тэатрам кровапралітнейшай вайны і паложэна паміж Дзержавамі, якіе вядуць спамянутые перэгаворы.

Савецкая Расея, зауседы прызнаваушая права на самоазначэньне народау да аддзяленьня, і опэраваушая гэтым клічам перад заходна-эуропэйскай Дэмокрацыей, не мае і ня можэ мець права выступіць у ролі гаспадара Беларускай тэрыторыі, народ каторай ясна выразіу сваю волю да незалежнага дзержаунага істнаваньня, мае свой перэдпарлямэнт і законна выбраны Урад.

Адбытые ужо мірные перэгаворы паміж Расеяй з аднэй стараны, Латвіей і асабліва Літвой — з другой стараны, на каторых Расея прысвоіла сабе ролю гаспадара беларускай тэрыторыі, нарушылі сувэрэныя правы беларускага Народу і абрэзалі тэрыторыі ім населенные, у безкантрольны загад вышэйназваных суседзей Беларусі.

Каб унікнуць новых несправядлівасцей і гвалтоу у стасунку да Беларускага Народу і яго тэрыторыі, законны Урад Беларускай Народнай Рэспублікі, надзеленый поунамоччамі Вялікага Усебеларускага Кангрэса і Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, даверыем усіх політычных партій, організацый і групп, ужо звярнулося да Мірнай Конфэрэнцыі у Парыжы і да Ураду Польшчы і Расеі з вымогамі даць Беларусі мейсцо у адбываючыхся мірных перэгаворах.

В.Ластоўскі,
Старшыня Рады Народных Міністрау і заступаючы
Міністра Міжнародных Спрау.

582.1.06:029 — шк фра
582.1.46:031 — шк фра
582.2.51:010 — шк фра
582.2.51:073 — шк фра
582.2.53:034 — шк фра
582.2.53:139 — шк фра
582.2.54:330&r — мк фра
582.2.54:331&r — рк рас

2356. Тэлеграма Язэпа [Мамонькі?] (Коўна) Пятру Крэчэўскаму (Бэрлін) за 7.09.1920 і адказ Пятра Крэчэўскага

berlin motzstrasse 21 kretschewski =

kowno 1117 10 6/9 20-10 =

wlast ryzie czy wyzdarawieli[1] telegrafuj = jazep +

chwareiem bieznadziejna zbiraimsia Rihu Piotro

582.2.47:015 — а

1 «Хвароба» і «здароўе», паводле прынятай дзеячамі БНР крыптаграфіі — адсутнасьць або наяўнасьць грошай.

2357. Ліст старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлава Ластоўскага (Рыга) Прэзыдыюму Рады БНР (Бэрлін) за 7.09.1920 (вых. №416)

7 верэсьня 1920
№416
м. Рыга

Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Ўслед за маей афіцыальнай вустнай заявай, маю гонар далажыць Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ніжэйпісанае:

Паводле маючыхся у мяне дакладоў Міністра загранічных спраў грамадзяніна Ладнова, справа прызнаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі пастаўлена на чарод на Мірнай Конфэрэнцыі у Парыжы.

У аснову акту аб прызнаньні павінны легчы ноты ад імені Рады Беларускай Народнай Рэспублікі і Ураду:

а) нота пратэсту проці маскоўска-большэвіцкай окупацыі на Беларусі,

б) нота пратэсту проці нарушэньня сувэрэнных правоў Беларускай Народнай Рэспублікі праз утварэньне на Беларусі савецка-бальшэвіцкаго Ураду,

в) ноты аб дапушчэньні Беларускай Народнай Рэспублікі да учасьцьця ў Расейска-Польскіх перэгаворах у Рызе, як поўнапраўнай стараны,

г) ноты аб пазваленьні тварэньня аружных беларускіх сіл для барадзьбы з большэвізмам і аб матэрьяльнай помачы са стараны дзержаў Антанты гэтым нашым аружным сілам.

Дзеля таго, што вышэйпамянованые акты надзвычайна пасьпешна трэба даставіць у Парыж, дзеля таго, што 18 г.м. пачынаецца у Рызе Канфэрэнцыя між Польшчай і Расеяй, а значэ у прадаўжэньні 8 дзён на гэты акты павінна быць паложэна дэцызыя, а Прэзыдыум Рады Б.Н.Р. з незразумелых для мяне прычын чамусь адцягае падпісаньне іх, прашу пісьменна даць мне разьясьненьне прычын змушаючых Прэзыдыум рады Б.Н.Р. рабіць адцяжкі гэтай пільнай справе.

В.Ластоўскі
Старшыня Рады Народных Міністроў Б.Н.Р.

582.2.54:397&r — р В.Ластоўскага
582.2.54:408 — мк

2358. Ліст Рады Народных Міністраў БНР (Рыга) Прэзыдыюму Рады БНР (Бэрлін) за 7.09.1920 (вых. №418)

Беларуская Народная Рэспубліка.
Рада Народных Міністроу.
7 верэсня 1920 г.
№418

У Прэзыдыум Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі.

На аснове пастановы Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 16 ліпеня 1920 г. мною, дзеля папаўненьня складу Габінэту запрошэны:

Міністром Фінансоў — гр. А.Вальковіч і
Дзержаўным Сэкрэтаром — гр. К.Езавітоў,
аб чым маю гонар паведаміць Прэзыдыум Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Ластоўскі
Старшыня Рады Народных Міністроу.
582.2.54:317 — мк

2359. Ліст Рады Народных Міністраў БНР (Рыга) Прэзыдыюму Рады БНР (Бэрлін) за 7.09.1920 (вых. №419)

7-IX-20.
№419

Ў Прэзыдыум Рады Б.Н.Р.

Маю гонар паведаміць, што па прычынам аккупацыі Беларусі неўзяўшыя да гэтуль учасьця у працы Ураду грам. Белевіч, Душэускі і Грыб, на моцы пастановы Рады Нар. Міністр. Рэспублікі ад 6 чэрвеня 1920 году і пастановы Прэзыд. рады Рэсп. ад 16 ліпня 1920 году, — пастановай Рады Нар. Мін. ад 31 ліпня 1920 г. лічацца выбыўшымі са складу Рады Народн. Міністраў Б.Н.Р.

Ластоўскі
Старшыня Рады Народных Міністроу.
582.2.54:318&r — рк

2360. Нота пратэсту Рады БНР і Рады Народных Міністраў БНР Канфэрэнцыі Паслоў у Парыжы за 7.09.1920 супраць бальшавіцкай акупацыі Беларусі і гвалтоўнага абвяшчэньня Савецкай Беларусі (вых. №???)

Конференцыі Паслоў у Парыжы.

На змену польскай окупацыі на Беларусь прыйшла новая — расейска-большэвіцкая окупацыя. Пачаліся на Беларусі ўласьцівые большэвіцкай ўладзе тэрор і гвалты. Крайнім выразам гвалту у дзедзіне свабоды нацыональнаго самаазначэньня, яўляецца большэвіцкій акт 31 ліпня г.г. апавешчаючый Беларусь Савецкай Рэспублікай сфэдэраванай з Расеяй. Акт

гэты, акром партыі комуністоў, адмовіліся падпісаць і апратэставалі ўсе беларускіе партыі, арганізацыі і групы.

Іменем Беларускаго Народу, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі, прыняўшый ўласць ад Ўсебеларускаго Устаноўчаго Кангрэсу, надзеленый даверьем усіх беларусіх палітычных партый, організацый і груп, горача протэстуе проці большэвіцкаго акту гвалту і заяўляе, што ен, разам са сваім Народам, будзе змагацца з накінутым яму ўжо другі раз Савецкай ўладай актам, і з назначэньнем з Масквы паміма волі Беларускаго Народу, Савецкім Урадам, які узурпуе сувэрэнные правы Беларускаго Народу.

Ад імені Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

Віцэ-старшыня

Сэкрэтар

Ад імені Рады Міністроў Беларускай Народнай Рэспублікі

Старшыня Рады Міністроў

Міністр Загранічных спраў

Кіраўнік Канцэлярыі Рады Міністроў

582.2.54:368&r-369&r — р бел

582.2.54:412&r — р В.Ластоўскага

2361. Нота Рады Народных Міністраў БНР Ураду Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі за ??.??.1920

Ураду Злучэных Штатоў Паўночнай Амэрыкі.

Пакуль граніцы этнографічные ня будуць пакрывацца граніцамі дзержаўнымі, пакуль сталецьцямі няволеные Расеяй народы не здабудуць даўнай сваей свабоды датуль немагчымы супакой на тэрыторыях б. Расеі, а гэто значэ немагчымы спакой на Усходзе Эўропы. Амэрыканскі Урад выносячы пастанову аб адбудаваньні ў цэлым быўшай Расеі відаць не задаў сабе пытаньне, што такое быўшая Расея. Мы беларусы сто лет цярпеўшые расейскую няволю можэм і маем права даць на гэто ясны адказ. Расея для яе чысленных народаў была вялікай турмой. Народ беларускі трапіў у Расейскую няволю ў самым канцы XVIII сталецьця і адразу пачалася з ім расправа. Першы удар быў скіраваны на нашу культуру і веру. Прасьледаваньня гугенотаў у Францыі бледнуць перад тымі прасьледаваньнямі, якіе выносілі беларусы-уніяты у Расеі, нашэ уніяцкае духавенство. Расея вынішчыла цэрквы, манастыры і іх маетнасці забрала, а кнігі папаліла. Блізка сто гадоў, да 1905 г. беларусы ня мелі права выдаць ніводнай кнігі на сваей мове, ня мелі права маліцца на сваей мове. У канцы XIX сталецьця на Беларусі ў рэзультаце расейскай гаспадаркі было менеў школ, як у канцы XVIII, хоць народанасяленьне больш чым удвоілася. Нас душылі, нас мучылі, нас унічтажалі сто гадоў. Цяпер, калі сцены гэтй Вялікай Расейскай турмы распаліся, німа тэй сілы якая-бы здужала загнаць народы Расеі у іх назад. І мы сумневаемся ці знайдзецца

народ каторы-бы ўзяў на сябе ролю палача заковываць народы Расеі у іх старые катаржные ланцугі.

Іменем Беларускаго Народу Урад Б.Н.Р. заносіць самы гарачы пратэст проці (ноты?) ад дня ..... Ураду Амэрыкі.

582.2.54:370&r — р В.Ластоўскага

Дата невядомая.

2362. Дазнаньне кіраўніка Канцылярыі Рады Народных Міністраў Аляксандра Вальковіча ў справе «абразы» Рады БНР Кастусём Езавітавым 7.09.1920 паводле запыту сакратара Рады БНР Язэпа Мамонькі за 7.09.1920

582.2.54:425&r-430&r — ма, ра

П.Крэчэўскі адмовіўся падпісаць ноту пратэсту Ўраду й Рады БНР супраць бальшавіцкай акупацыі Беларусі, даведаўшыся аб чым К.Езавітаў эмацыйна зрэагаваў на гэта ў прысутнасьці Я.Мамонькі.

2363. Рэзалюцыя, вынесеная прадстаўнікамі ўсіх беларускіх арганізацыяў на паседжаньні ў Вільні 7.09.1920

РЭЗАЛЮЦЫЯ
ВЫНЕСЕНАЯ ПРЭДСТАЎНІКАМІ ЎСІХ БЕЛАРУСКІХ
ОРГАНІЗАЦЫЯЎ НА ПАСЯДЖЕНЬНІ 7-ГО ВЕРАСЬНЯ 1920 ГОДУ.

Разгледзеўшы палажэньне, утварыўшееся у зьвязку з літоўска-расейскай міравой умовай і выслухаўшы справаздачу прэдстаўнікоў беларускаго грамадзянства езьдзіўшых ў дэлігацыі да Літоўскаго Ураду[1], сход прэдстаунікоў Центральнае Беларускае Рады Віленшчыны і Горадзеншчыны, Беларускаго Нацыянальнаго Камітэту і ўсе другія беларускія арганізацыі, уважаючы, што ўсе тэрыторыяльные споркі між Беларусьсю і Літвой павінны быць окончальна развязаны дарогай міжнародных зносін беларускаго і літоўскаго ўрадаў і прынімаючы пад увагу вымогі жыцьця, прызывае ўсіх беларусаў жыхароў прылучанай да Літвы беларускай тэрыторыі, каб злучылі ўсе свае сілы дзеля згоднае, супольнае з братным літоўскім народам дзержаўнае працы і дзеля здабыцьця беларускаму народу належнаго яму мейсца на роднай зямле.

Адначасна з гэтым сход прэдстаўнікоў вышейсказаных організацыяу, зварочваецца да Устаноўчаго Сойму Літвы, ў якім беларусы яшчо ня маюць сваіх прэдстаўнікоў, а также да Літоўскаго Ўраду, з цьвердым дамаганьнем забэзпечаньня тых варункаў, пры каторых беларусы маглі бы прыняць актыўнае учасьце ў дзержауным будаўніцтве супольнае Бацькаушчыны і здаволіваць усе свае нацыянальные патрэбы.

У змысл гэтага сход жадае:

1) каб аснаўнымі законамі Літвы была выдзелена ў асобную аўтаномную адзінку далучаная да Літвы Беларуская тэрыторыя ў межах перевагі беларусаў;

2) каб для гэтае тэрыторыі ўжо цяпер быў утвораны часовы орган (Краевая Рада), зложаны з прэдстаунікоў організаванаго грамадзянства

ўсіх нацыянальнасьцяў гэтае часьці Літвы, каторы супольна з Намесьнікам Літоускаго Ўраду наладзіў бы краевую адміністрацыю і Суды, організаваў бы ўсе жыцьце і падгатаваў бы і правеў бы выбары як у органы лекальнаго і краеваго самоупрауленьня, так і агульна дзяржаўные установы;

3) каб задакляраваная Літоўскім Ўрадам права ўсіх нацыянальнасьцеў Літвы на пэрсанальную аўтаномію, было праведзена ў поўнай меры ў адносінах да беларусаў, дзе яны становяць меншасьць і каб на чале міністэрства беларускіх спраў быў пастаўлены чалавек, маючый даверые беларускаго грамадзянства.

СТАРШЫНЯ КАМІТЭТУ Ерэміч
СЭКРЭТАР КАМІТЭТУ Яцкевіч
582.2.54:395&r — мк
582.2.54:396&r — мк

[1] У Коўна на прыём у Раду Міністраў Літвы езьдзілі кс. А.Станкевіч, Ф.Ярэміч і М.Кахановіч. Гл.: Пагоня. №6. 2.09.1920.

2364. Узоры пячатак Выдавецкага Таварыства «Вызваленьне» і Хаўрусу Дапамогі Беларускім Пісьменьнікам імя А.Прушынскага
582.2.54:260

На дакумэнце пазначана: «Бэрлін, 8 верасьня 1920 г.» (дата рэгістрацыі?).

2365. Пратэст Прэзыдыюму Рады БНР Мірнай Канфэрэнцыі ў Парыжы за 10.09.1920 (вых. №270/98)
10.IX.20
270/98

Мирной Конференции в Париже

Мужественно-патриотичный белорусский народ перенося все тяжести и жертвы великой европейской войны, происходившей на его территории, стремился к успешному окончанию войны, чтобы затем, наравне со всеми союзными народами отдохнуть тихою и спокойною жизнью.

К сожалению мечтам этим не суждено было осуществится.

На смену войне пришел всеразрушающий Российский большевизм, на смену большевизму пришли их союзники немцы, на смену немцам пришли вновь большевики, затем на смену большевикам пришли поляки и наконец на смену полякам опять пришли большевики.

И так до сих пор, на территории Белорусии идет безконечная завоевательная борьба, разрушившая многия города и деревни, уничтожившая орудия производства, истребившая домашний скот и убившая хозяйственную жизнь страны.

Всему этому могбы и может положить конец только сам хозяин — белорусский народ, горячо любящий и щадящий свою страну и свою собственность.

К великому прискорбию, до сих пор борющияся стороны, по тем или иным своекористным целям не давали белорусскому народу сорганизоваться и приступить со всею силою к защите своего отечества.

В данное время, Белоруссия имеет великое несчастие в третьи раз видеть у себя большевиков, в конец разоряющих народное достояние и вновь, по примеру Брест-Литовска, продающих белорусские земли Литве[1] и другим державам и тем самым сознательно вносящих разлад между соседними народами.

Отмечая вкратце то тяжелое положение, в котором находился и находится белоруский народ и его Правительство, Президиум Рады Белорусской Народной Республики являясь правомочным выразителем воли всего белорусскаго народа заявляет, что белорусский народ никогда не признавал и не признает большевитской власти и оккупации на Белоруссии.

Он протестует против большевитскаго насилия, попирающаго волеиз'явление белорусскаго народа и его суверенныя права. С этим насилием он будет боротся до конца и в этой борьбе он еще раз просит помощи у союзных Великих держав.

За Председателя Рады Б.Н.Р.
Товарищ его В.Захарко

Секретарь
582.2.54:391&r-392&r — р рас

[1] Паводле літоўска-расейскай мірнай дамовы за 12.07.1920 году да Літвы адыходзілі паўночна-заходнія беларускія паветы ўлучна з Горадняй, Шчучынам, Лідай, Смаргоньню, Паставамі, Маладэчнам, Браславам і Друяй.

2366. Матэрыялы з рыскіх расейскіх газэт «Сегодня» і «Русская Жизнь» ад 10.09.1920 да 15.10.1920 аб ходзе мірных перагавораў паміж Польшчай і Расеяй

582.1.08:078-094

2367. Зварот Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Партыі да польскіх уладаў [?] за ?.10.1920

582.1.67:001&r — мк
582.2.52:004&r — мк
582.2.52:156&r — мк

Дакладная дата невядомая (верасень 1920). У сувязі з новым наступам польскіх войскаў на ўсход зварот папярэджвае аб недапушчальнасьці паўтарэньня акупацыйных мэтадаў і палітыкі Цывільнае Ўправы Ўсходніх Земляў. Падпісалі ад імя Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Партыі: В.Іваноўскі, Б.Тарашкевіч, А.Трэпка. На звароце пазначана: «Nie dla druku». 11.09.1920 Тарашкевіч, Іваноўскі й Трэпка былі на прыёме ў Пілсудзкага. Гл.: Łatyszonek O. Białoruskie formacje wojskowe 1917-1923. Białystok, 1995. S.141.

2368. Ліст Вацлава Ластоўскага (Рыга) Аўгену Ладнову (Парыж) за 12.09.1920

12.IX.20

Дарагі Еўгені Міхайлавіч

Большэвізм трымаецца, як і усюды, так і у нас на Беларусі, тэрорам і гвалтам. У сіле праўда — кажуць большэвікі. Паўстаньня проці большэ-

вікоў на Беларусі ніколі не спыняліся, беларусы барацца з імі не перэставалі. Ва ўсіх проці-большэвіцкіх арміях і на ўсіх фронтах лілася беларуская кроў за гуманізм, за праўду, справядлівасць і лад на свеце, за сваю незалежную і непадзельную бацькаўшчыну. Аднак нашай крыві ніхто не цаніў і ня цэніць, а гэто-ж людзкая кроў... Барацца нам ніхто не памог. Спакойна ўсе глядзелі і глядзяць да гэтуль, як шосты ўжо год пылаюць нашы вёскі і гарады, як шосты ужо год голадам мораць 12 мільенны народ! За шэсць гадоў мы перэмянілі 6 окупацый, шэсць жорсткіх ёрмоў. Цяпер што? Ізноў паўстаньня? Дзеля чаго, каб уздзець сёмы раз недаўна скінутае ярмо? Усё гэта ужо апрацівела. Народ атупеў ад болесці. Народ зняверыўся, што ёсць дзе небудзь на сьвеце праўда. Прыходзяць большэвікі нас грабяць, рвуць нашу бацькаўшчыну і дзеляць. Добрые суседзі рвуць нашэ жывое цело і суляць нам сваё ярмо. Прыходзяць палякі так сама рвуць дзеляць і грабяць. Большэвізм у паняцьці нашаго Народу зыходзіцца с паняцьцем непраўды. А хто прыходзіў да яго с праўдай?

Барацца з большэвізмам можна і лёгка з ім барацца, самым страшным для яго аружжам — праўдай. Але пакуль што гэтаго аружжа ніхто не застасаваў супроць іх. Пакуль народ над народам будзе здзекавацца і не шанаваць яго нацыональных інтэрэсоў і патрэб, пакуль дзержаўные граніцы не будуць пакрывацца граніцамі этнографічнымі, ня будзе успакаеньня, ня будзе міру. Непраўда у адносінах да нацый, ёсць крыніцай большэвізму.

Палажэньне у нас цяпер такое, што дакуль нябудзе прызнаньня Незалежнасці Беларусі, г.зн. забаспечэньня што мы з большэвіцкаго ярма можэм трапіць у польскае, немагчымы поўстаньня проці большэвікоў. Сарганізаваных сіл незалежніцкіх мы маем цяпер у Беларусі звыж 30.000, але іх захаваем лепей да тых часоў, калі усходніе і заходніе воўкі паміж сабой пагодзяцца, разарвуць нашэ цело, каб пасьля ўнутры адных і другіх далей барацца за сваю незалежнасць.

Даруйце, Дарагі Еўгені Міхайлавіч, але я ня веру ўжо ў ніякіх нашых прыяцелёў. Ня веру і у прызнаньне нашай Незалежнасьці Антантай. Намі проста іграюць, намі таргуюць. Злосна таргуюць.

Аб усім, што у нас дзеецца, па майму паручэньню, пісаў да Вас Езовітоў. Паўтарацца ня буду. Ўсе акты, якіе Вы прасілі вышлемо Вам.

Цяпер падаю да Вашаго ведама палажэньне у якім знаходзіцца Урад. У нікога ні граша. Я ўсё ужо параспрадаваў, што можна было прадаць. Далей цягнуць лямку не маю ні сіл ні змогі. Калі апошнюю рэч прадам і апошні грош выпушчу, — ўзяўшы кій у рукі пайду на Бацькаўшчыну. Сабраць сваіх ня мог, бо не маюць за што прыехаць. У свой зрэшта час я пісаў Вам — калі спрыяюць ніхай памогуць. Але іх спрыяньне, відаць ня йдзе далей укладных слоў.

Цалую Вас ВЛ.

582.2.54:342&r-343&r — рк

2369. Рэзалюцыя, вынесеная на сходзе беспрацоўных беларусаў у Вільні 12.09.1920

РЭЗАЛЮЦЫЯ,
ВЫНЕСЕНАЯ НА СХОДЗЕ БЕЗРАБОТНЫХ БЕЛАРУСАЎ 12 ВЕРАСЬНЯ 1920-го ГОДУ.

Безработные беларусы места Вільні, забраўшыся на сход 12 верасьня протэстуюць перэд Урадам і Устаноўчым Соймам Літвы процiў таго, што нас, адвечных жыхароў гэтага краю, працаваўшых у розных дзяржаўных установах і варштатах пры ўсіх окупацыях, віленскіе агенты літоўскае ўлады звальняюць з мейсц, якія мы занімалі ў працягу дзесяткаў гадоў, назначаючы на гэтые мейсцы новых людзей і не даючы нам другой работы, а малодшых служачых казённых установ, як старажоў і кур'ераў, выкідаюць з кватэр на вуліцу. Гэты здзек над намі галоўным чынам робіцца з тае прычыны, што мы ня можэм гаварыць і пісаць у літоўскай мове.

Мы трэбуем ад Літоўскаго Ўраду даць нам пр[а]цу ў тых спэцыяльнасьцях, ў якіх мы працавалі дагэтуль [...]

СТАРШЫНЯ КАМІТЭТУ Ярэміч
СЭКРЭТАР КАМІТЭТУ Яцкевіч
582.2.54:385 — мк
582.2.54:386 — мк

2370. Ліст Вацлава Ластоўскага (Рыга) Аўгену Ладнову (Парыж) за 14.09.1920 (вых. №432)

14.IX.20
№432

Еўгені Міхайлавіч!

Вашы пісьмы — дырэктару журнала «Le Temps» ад 20.VIII.20. і Прэзыдыуму Конфэрэнцыі Паслоў ад 14.VIII.20. мяне здзівілі і да глыбіны душы абурылі. Я не разумею аб якой гэто аўтаноміі у рамках фэдэратыўнай Расеі распісываецеся? Што гэто значэ?

Вам, Пане Ладноў, як Міністру загранічных спраў і як старшыне дэлегацыі на Мірную Конфэрэнцыю у Парыжы, ніхай будзе ведама, што Беларускі Народ і Яго Урад борацца за Незалежнасць (independance) і Непадзельнасць Беларусі. Ні ў якое ярмо — ні ў маскоўскае, ні ў польскае — беларусы ня пойдуць.

Прашу Вас тэрміновым парадкам даць мне разьясьненьне; ў праціўным выпадку я прымушэн буду ужыць проці Вашых заяў самых радыкальных заходаў.

Старшыня Рады Міністроў
ВЛастоўскі
582.2.54:379 — рк

2371. Мэмарандум Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі за 15.09.1920 (вых. №434) Мірнай Канфэрэнцыі ў Парыжы ў справе распачатых мірных перагавораў паміж Расеяй і Польшчай

15.IX.20.
№434.

МІРНАЙ КОНФЭРЭНЦЫІ У ПАРЫЖЫ.

Адбываючыеся у цяперэшні час мірные перэгаворы паміж Р.С.Ф.С.Р. і Польскай Рэспублікай, зачэпляюць жывотные інтэрэсы Беларускай Народнай Рэспублікі, якая у цягу шасці гадоу служыла тэатрам кровапралітнейшай вайны і паложэна паміж Дзержавамі, якіе вядуць спамянутые перэгаворы.

Савецкая Расея, зауседы прызнаваушая права на самоазначэньне народау да аддзяленьня, і опэраваушая гэтым клічам перад заходна-эуропэйскай Дэмократыей, не мае і ня можэ мець права выступіць у ролі гаспадара Беларускай тэрыторыі, народ каторай ясна выразіу сваю волю да незалежнага дзержаунага істнаваньня, мае свой перэдпарлямэнт і законна выбраны Урад.

Адбытые ужо мірные перэгаворы паміж Расеяй з аднэй стараны, Латвіей і асабліва Літвой — з другой стараны, на каторых Расея прысвоіла сабе ролю гаспадара беларускай тэрыторыі, нарушылі сувэрэныя правы беларускага Народу і абрэзалі тэрыторыі ім населенные, у безкантрольны загад вышэйназваных суседзей Беларусі[1].

Каб унікнуць новых несправядлівасцей і гвалтоу у стасунку да Беларускага Народу і яго тэрыторыі, законны Урад Беларускай Народнай Рэспублікі, надзеленый поунамоччамі Вялікага Усебеларускага Кангрэса і Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, даверыем усіх палітычных партій, організацый і групп, ужо звярнулося да Мірнай Конфэрэнцыі у Парыжы і да Ураду Польшчы і Расеі з вымогамі даць Беларусі мейсцо у адбываючыхся мірных перэгаворах.

Цяпер, бачучы, па ходу перэгаворау, адбываючыхся дагэтуль без учасцьця прэдстаунікоу Беларусі, што цэласць Беларускіх этнографічных тэрыторый і сувэрэнные правы Беларускага Народу ізноу, больш чым калі небудзь могуць быць нарушэны, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі нанова звертаецца да Мірнай Конфэрэнцыі у Парыжы, што воля Беларускага Народу да незалежнага Дзержаунага будауніцтва цьверда і ненарушна. Яна ярка праяулялася ва усе часы гісторыі, як у дні незалежнага дзержаунага будауніцтва Беларусі, калі яна упорна змагалася ад XII да XVI ст. з усімі сваімі суседзямі, так і у дні паняволеньня яе Польшчай і Расеяй.

Асабліва цьверда вядзецца гэтае змаганьне с 1905 году. У гэтым гаду беларусы даведзеные царскімі парадкамі Расеі да найвышэйшай ступені абурэньня, апавесцілі у дні рэволюцыі 1905 г. незалежную Беларускую Рэспубліку с прэзыдэнтам гр. Бурбісам на чале.

Беларуская Рэспубліка 1905 году, як і аналогічная ей Латвійская Рэспубліка таго-ж часу, праістнавала усяго толькі некольк тыднеу. Незалежнасьць яе не была прызнана царскім Урадам Расеі, скіраваушым у Беларусь спэцыальны карацельны атрад для ліквідацыі Беларускага Рэволюцыйнага Ураду і самой Рэспублікі. Урад Беларусі быу арэштаваны царскімі войскамі у м. Мэйшагола і аддадзены пад суд. Справа гэта вядома у Расеі пад названьнем «Справа Мэйшагольскай Рэспублікі», закончылася заключэньнем у турму гр. Бурбіса і яго супрацоунікоу.

У 1917 г. Беларуская Народная Рэспубліка ізноў паустала да незалежнага жыцьця і Усебеларускі Кангрэс 18-31 студзеня[2] таго-ж году урачыста скончыў папярэднюю арганізацыйную працу рэволюцыйных беларускіх арганізацый афіцыяльным праклямаваньнем Беларускай [Народнай Рэспублікі] і выдзеліў з свайго складу першый Беларускі Прэдпарлямэнт і Урад.

Устаноучы Сойм Расеі разагнаны упаследку бальшавікамі, усе-ж такі здолеу, на сваім апошнім заседаньні ад 5 сьнежня[3] 1918 году, пастанавіць, што усе нацыянальнасьці быушай Расеі маюць права на свае нацыянальна-дзяржаунае будаўніцтва.

Гэткім чынам сама Расея санкцыянавала адбудаваньне на яе тэрыторыі новых рэспублік і пажадала толькі быць з імі у фэдэратыунай сувязі.

Пасьля эвакуацыі бальшавікамі Беларусі быу створаны Беларускі Парлямэнт і Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, якая зараз-жа пасьля скліканьня асобнай граматай падцьвердзіла пастановы Усебеларускага Конгрэсу і 25 сакавіка 1918 г. праклямавала поуную незалежнасьць Беларусі.

Вялікі прынцып самаазначэньня народаў, які быу высунуты Мірнай Конфэрэнцыяй у Парыжы вызнан усім сьветам і нават пачаушымся на Усходзе бальшавізмам і паустаушай да незалежнага істнаваньня Польшчай. Але да гэтага часу з усіх старон правы беларускага народу бязсорамна нарушаліся і яго імкненьне да незалежнага дзяржаунага будаўніцтва усімі былі таптаны.

Не адзін раз за апошніе некалькі гадоу, бачучы на сваей тэрыторыі чужаземныя арміі, незаконна распараджаючыяся беларускімі нацыянальнымі багацьцямі, Народ Беларускі абурываўся і паўставаў з аружжам у руках проціу акупантаў, зрабіушы[х] з Беларусі арэну кравапралітнейшых войн дзеля сваіх падрахункаў чужых і не зразумелых для Беларусі. І зауседы Урад Беларусі не маючы ніякіх спэцыяльна воражых пачуваньняу да ніводнага са сваіх суседзеу і кіруючыся да устанауленьня з імі самых прыязных адносін, стараўся супакоіць гэтыя паустаньня свайго пакрыуджанага народу, бо разумеу і верыу, што змаганьне, якое вядзецца дзякуючы збегу варункаў на Беларускай зямлі, вядзецца дзеля высшых мэт, каторым часова можна і трэба прынясьці у жэртву інтэрэсы сваей бацькаушчыны.

Цяпер, пры заключэньні Расеяй несправядлівага міру праз галаву Беларускага народу і яго Ураду з Літвой і магчыма з Польшчай, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі ня будзе мець маральнага права стрымліваць абмануты народ Беларусі ад яго справядлівага гневу і на тэрыторыі Беларусі узнікне новая вайна з яе панявольнікамі як усходнімі, так і заходнімі.

Выкладаючы усе вышэйсказанае Урад Беларускай Народнай Рэспублікі просіць мірную конфэрэнцыю учуць маленьне гвалчанага і разрываного паміж суседзямі Беларускага Народу і:

1. Прызнаць Незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі.
2. Абараніць яе тэрыторыю ад захвату Польшчай, Расеяй, або Літвой.
3. Узяць пад французкае камандаваньне або кіраўніцтва яго істную-

чыя ужо беларускія часьці, так і тыя каторыя будуць сарганізаваны у будучым.

4. Даць магчымасьць Беларускаму Ураду сабраць вайсковых беларусоу, ваюючых у розных арміях — на Бацькаушчыну.

5. Памагчы Беларускаму Народу і яго Ураду у змаганьні з балышавіцкай акупацыяй.

Арыгінал падпісалі: В.Ластоускі, Старшыня Рады Міністрау Беларускай Народнай Рэспублікі; Е.Ладноу, Міністр Міжнародных Спрау; А.Вальковіч, за Міністра Фінансау; К.Езавітау, за Дзержаунага Сэкрэтара.

З арыгіналам згодна: Ю.Гладкі-Ластоўскі
Кіраунік Канцэлярыі Рады Народных Міністрау
582.1.06:013-016 — шк бел
582.1.06:058-061 — шк бел
582.1.07:075-078 — шк бел
582.1.08:005&r-008&r — ра В.Ластоўскага
582.1.06:032-035 — шк фра
582.1.46:026-029 — шк фра
582.1.08:010&r-011&r — шк фра
582.1.08:009&r — мк рас
582.2.51:013-016 — шк фра
582.2.51:076-079 — шк фра
582.2.51:112-115 — шк бел
582.2.53:037-040 — шк фра
582.2.53:142-145 — шк фра

[1] Карты тэрытарыяльных стратаў Беларусі, зацьверджаных літоўска-расейскай дамовай за 12.07.1920 і латвійска-расейскай за 11.08.1920 гл. у кнізе: Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубяжах. Мінск, 1993. с.33, 34. [2] Памылкова замест сьнежня. [3] Памылкова замест студзеня.

2372. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Лявону Зайцу, Аляксандру Цьвікевічу, Пятру Крэчэўскаму (Бэрлін) за 15.09.1920

Прага 15 IX 20

Многапаважаные паны!

Сягоння я атрымау па почце у Празі (пеўна нехто прывез у Прагу і тут кінуў у пачтовы ящык) пісмо ад пана Дубейкоускаго, у яком было пісьмо на імя п. Зайца. Дубейкоускі прасіў міне каб як наихутчай пераслаць яго Вам. Ні чэскі ні Украінскі курьеры не едуць цяперь у Берлін, бо чэскі паехау учора а другі раз паедзе за 14 днеў. Я рашыу паслаць пісьмо па почце але на почце яго вскрылі каб паглядзець ці німа грошай. У канверце аказалася яще два канверта: адзін для п.п. Зайца, Цвікевіча і Крэчеускаго, а другі для п. Аусяніка. Так як за каждое пісьмо экспрес-рекоманда трэба была плаціць 3 к. 50 г. т.е. 7 кор., то я влажыу іх у адзін канверт. Думаю што гэтым не зрабіу якога нібуць праступка.

Далее Дубейкоускі пішэ што работы шмат а тоўку мала, пытаетца як справы «на загранічном рынку» і кажа што Тарэщэнка паехау у Рыгу каб паразуметца з Ластоўскім.

Я Дубейкоускаму пісау уже перед трыма днямі але пэўна ен яще не атрымау маяго ліста.

Вент учора вечарам паехау у Парыж.

Ваш Мікола.

582.2.47:007&r-008 — ра

2373. Ліст Міхася Какановіча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 16.09.1920

582.1.45:143&r

Аб стаўленьні да Польшчы й Літвы, аб працы гімназіі. «З Менскам німа зносін. З Горадняй так сама».

2374. Ліст Леаніда Баркова (Бэрлін) Аўгену Ладнову (Парыж) за 17.09.1920

582.2.54:406&r-407&r — ра

Аб сытуацыі ў Дыпляматычнай Місіі БНР у Бэрліне, аб некампэтэнтнасьці й шкодным уплыве на працу Місіі Зайца і Крэчэўскага.

2375. Ліст дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Бэрліне Леаніда Баркова (Бэрлін) Канцэлярыі Рады Народных Міністраў БНР (Рыга) за 18.09.1920 у справе затрыманьня Язэпа Мамонькі на станцыі Люзін польскім камэндантам і забраньня ў яго рэчаў і грошай з далучанай перапіскай па справе

582.2.54:341 — мк

2376. Справаздача дэлегата Міністэрства Замежных Справаў БНР Янкі Чарапука (Рыга) старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 19.09.1920

Міністру-Старшыне Р.Н.М.
гр. Ластоўскаму

Дэлегата М.З.С.

Даклад

У звязку з адбываючаюся тут у Рызе Мірнай Канфэрэнцыі Польска-Расейска-Украінскай мне удалося завязаць прыхільныя адносіны з Польскім Сэкрэтарыатам, што дае мне магчымасьць папасьць на пасядзэньне Конфэрэнцыі.

Калі з Вашэго боку пане Старшыня німа ніякіх перашкод для маей прысутнасьці на Конфэрэнцыі, гдзе я знаходжу трэба развіваць шырокую акцыю палітычную сярод яе учаснікаў, а таксама і паміж загранічных карэспондэнтоў, тагдэ маю гонар прасіць а ніжэпададзенам паведаміць міне

Я.Чэрэпук

Рыга 19 Верасня 1920.

582.2.54:319 — ра

2377. Запіска на візытоўцы Кузьмы Цярэшчанкі (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 19.09.1920

Даражэнькі пане Вацлаве,

Пакідаючы Рыгу шчыра жадаю Вам ўсяго найлепшага. У выпадку патрэбы я згождаюсь прыняць, згодна нашых размоў, партфель Міністра Земляробства. Інфармацыі буду пасылаць. З грашмі устрою.

Цалую Вас і ручку Вашай жаны

Ваш

Козьма Тэрэшчэнко

19 верасьня 1920 г.

582.2.54:399&r — р

2378. Візытоўка Аляксандра Салікоўскага

ОЛЕКСАНДЕР САЛІКОВСЬКИЙ
МІНІСТР ВНУТРІШНІХ СПРАВ У.Н.Р.

582.2.54:400 — д

2379. Ліст Рады Народных Міністраў БНР (Рыга) старшыні Расейскае Палітычнае Нарады А.Гірсу (Парыж) за ??.09.1920 з паведамленьнем аб пастанове Ўраду БНР за 31.05.1920 у справе выключэньня з складу Дэлегацыі БНР у Парыжы Кіпрыяна Кандратовіча й Аляксея Азнабішына

582.2.54:384 — мк

Дакладная дата невядомая.

2380. Пратэст Цэнтральнай Рады Віленшчыны й Горадзеншчыны за 21.09.1920 (вых. №930с.) супраць уключэньня ў польскую дэлегацыю на мірную канфэрэнцыю ў якасьці прадстаўнікоў ад Віленшчыны й Горадзеншчыны Банькоўскага й Крыжаноўскага

582.1.07:059-060 — шк бел
582.1.08:015&r — мк бел
582.1.11:062-063 — шк бел
582.1.11:064-065 — шк бел
582.1.11:066-067 — шк бел
582.1.11:068-069 — шк бел
582.2.51:116-117 — шк бел

2381. Ліст Міхася Какановіча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 2?.09.1920, дасланы з пастановамі БНК у Вільні аб адносінах да Дамініка Сямашкі

582.2.54:321&r — ра

Дакладная дата невядомая (пасьля 21.09.1920). Тлумачэньне М.Какановіча: «Гэтыя пастановы М.Какановіч і кс. А.Станкевіч падалі старшыні Рады Міністраў Літвы, старшыні Сойму й фракцыям».

2382. Ліст Васіля Захаркі (Рыга) Аўгену Ладнову (Парыж) за 22.09.1920

22 IX

Рыга

Даражэнькі Еўгеньні Міхайлавіч!

Натта перапрашаю, што доўга не пісау Вам, но паверце даражэнькі, што я так змучыўся і знэрваваўся у гэтай нешчаснай Маскве, што толькі цяперь прыхожу да сябе.

Вярнуўся я с Саудэпіі толькі 2 IX. Хацеласябы падзеліцца с Вамі усімі падробнасьцямі і поглядамі, вынясенымі мною с Саўдэпіі, но пакуль што я встрымліваюся да тае пары, пакуль добра не выясьнімо што нам рабіць, у нашэм вельмі цяжкам палажэньні. Магу толькі адно сказать што ніякіх рэзультатау я не дабіуся. На мой погляд бальшавікі сазнацельна будут нас дзеліць, як дзялілі, дзеля таго каб сварыць усе суседнія народы. Самі мы абараніцца не можам, а суседзі нашы толькі гэтаго і хочуць, я бы сказаў, на сваю пагібель. На мой погляд, як бальшавікі, так і анцібальшавікі адналькова да нас адносяцца. Кожны з іх стараяцца каб як кольвек адкусіць як можна большы кусок нашае Бацькаушчыны. Ад гэтуль усім гэтым так званным «нашым прэяцелям» анцібальшавікам, нават ні па душэ нашае ізснаваньне. Помачы ад іх чэкаць ні прыходзіцца. Вы можэце сказаць, што есьць яшчэ Вялікія Дзержавы. На што я бы адказаў, што даўно пара і у іх разачаравацца.

Бачачы усе гэто, нявольно можна стаць самому бальшавіком. Мы дайшлі, можна ска[за]ць, да точкі. Далей абсалютне німа на што жыць. Ужо адна толькі гэтая прычына, павідна растрасьці нашыя сілы. Кожны пойдзе сам па сабе. Думаю, што больш усяго направіцца да дому, на усход. Каб добро усе абмеркаваць і прыняць найменьш абмылковыя пастановы сюды вызываюцца і дні чэрэз чатыры прыезжаюць Крэчэуск. і Цьвік. Можа быць яшчэ яны прывязуць якое кольвек падтрыманьне. Прашу не дзівіцьця такому смутнаму тону маяго пісьма. Вы добра ведалі нашае палажэньне яшчэ у іюні месяцы. Трэба дзівіцца як яшчэ людзі здолялі пратрымацца да гэтае пары. Пасля доўгаго опыта, я больш ні у кого не веру. Нашае спасеньне толькі у нас самых. Не гледзячы на чые бы то ні было панаваньне прыдзецца і трэба йсьці у народ — на Бацькаўшчыну. Калі не здоляем абараніцца цяперь, то трэба хоця бы гуртаваць народныя сілы дзеля будучыны.

21.IX пачаліся міравыя перэгаворы паміж палякамі і бальшэвікамі. Думаю, што нас яшчэ раз будут дзеліць, не гледзячы на усе нашыя пратэсты. Адным словам, я нічого добраго ні чэкаю ні ад Рыгі, ні ад Масквы, ні ад Варшавы, ні ад Берліна ні ад Парыжа. Перэд тым, як прынімаць тое ці іншае рэшэньне, у звязку з цяжкім момэнтам, вельмі пажэданы Вашы зусім адкрытыя, апрэдзеленныя і канкрэтныя погляды, якія — не аткажэце прыслаць як найхучэй.

Бывайце здаровы. Моцна цалую Вас В.Захарко.

582.2.54:375&r-376&r — рк

2383. Ліст кіраўніка Канцылярыі Рады Народных Міністраў БНР Аляксандра Вальковіча (Рыга) Цэнтральнай Радзе Віленшчыны й Горадзеншчыны (Вільня) за 24.09.1920 з просьбай выслаць пратэст супраць удзелу на Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе польскіх прадстаўнікоў ад Віленшчыны й Горадзеншчыны Банькоўскага й Кржыжаноўскага

582.2.54:373&r-374&r — мк

Пратэст быў высланы ранейшым днём (дакумэнт №2380).

2384. Беларускае Прэс-Бюро у Рызе. 25.09.1920

582.1.08:016 — шк

2385. Беларускае Прэс-Бюро у Рызе. 26.09.1920

Двѣ резолюціи. — Численное соотношеніе національностей въ новой Литвѣ. — Смерть бѣлорусскаго поэта. — Русскіе соціалисты-революціонеры за независимость новыхъ республикъ.

582.2.54:329 — шк

2386. Справаздача дэлегата Міністэрства Замежных Справаў БНР Янкі Чарапука (Рыга) старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 27.09.1920

п. Старшыне Р.Н.М. гр. Ластоўскаму
Даклад

Гэтым маю гонар асьведаміць Вас з мае урадовай чыннасьці якую я праводзіў у жыцьце на 8 пасядзэньні Польска-Расейска-Украінскай Мірнай Дэлегацыі.

Пасля аканчаньня пасядзэньня я веў гутарку з Сябрам Польскай Дэлегацыі Паўнамочным Міністрам гр. Васілеўскім, якому я даводзіў, што палякі у сваіх перэгаворах з Бальшэвікамі павінны адстайваць поўную Незалежнасьць Б.Н.Р. у яе этнаграфічных межах ідучых і захапваючых не толькі граніцы 1772 г., але і ўсю Смаленщыну. Тэрыторыя гэта павінна быць перэдана Ураду Б.Н.Р. і урачыста павінна быць абвешчана Незалежнасьць Беларусі з боку Польшчы...

Прычым я яму заўважыў, што на часе было бы завязаць урадовую гутарку як з боку Польскага Ураду у асобах Старшыні Мірнай Дэлегацыі Віцэ Міністра Загранічных Спраў Я.Домбскага, Пасла ў Латвіі проф. Каменецкага і самаго Васілеўскаго і Беларускага Ураду у асобах якія ім будуць для гэтай справы указаны аб чым я яго паінфармую. На гэта мне было адказана, што Васілеўскі перэгаворыць з Домбскім. Аб рэзультаці мне будзе дан адказ.

Затым я інфарма[ва]ў Эстонскага Дыплёмату гр. Пусту, які сам звярнуўся да міне, аб становіщу нашай Рэспублікі.

Пасля гэтага я даў абшырную інфармацыю корэспандэнту «Таймса» ангэльскага і амэрыканскім газэт, уручыўшы ім матэр'ялы аб беларускай справе.

Прычым адзначаю, што як ангэльскіе, амэрыканскія і польскіе корэспондэнты выразілі пажаданьне мець з Вамі, пане Старшыня інтэрвью.

Пры гэтым далучаю Вам тэксты дэкларацый Дэлегацыі Польскай і Расейско-Украінскай.

Я.Чэрэпук
Дэлегат М.З.С.
582.2.54:320&r — ра

2387. Дэкларацыя польскай дэлегацыі на мірных перамовах у Рызе за 27.09.1920

582.2.54:360-361 — мк фра
582.2.54:362 — мк пол
582.2.54:363 — мк рас

2388. Дэкларацыя расейскай дэлегацыі на мірных перамовах у Рызе за 27.09.1920

582.2.54:364-367 — мк рас

2389. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 27.09.1920

Прага 27 IX 1920 г.

Яго Міласьці
Пану Старшыні Міністрау Бел. Нар. Рэспублікі

Сягоння я атрымау ліст ад п Зайца з Бэрліна, з якога відаць, што п.п. Крэчэускі, Цвікевіч і Аусянік паехалі у Рыгу. Я дау телеграмму п. Ладнову у Парыж, каб так сама ехау у Рыгу. З гэтаго я сужу што у Рыгу склікаетца с'езд нашых дзеячоу, які ужо дауно быу патрэбен, спешу хоць вкратце падзеліцца мыслямі.

Не гледзючы на тое, што бацькаущына наша так сама як год таму назад стогне пад чужым ігам, палітычная сітуацыя як бы немнога зменілася у нашу карысьць. На гэта указывае баромэтр Ангельскай палітыкі после таго як саздалася «Малая Антанта» (Чехо-Славакія, Югославія і Румынія)[1]. Камбінація Франціі а сазданіі з гэтых дзержау і Вэнгріі кааліціі, якая бы паставілася проціу Саудепіі на помощ Польшы пала, бо Малая Антанта аб'явіла строгі нейтралітэт. Протяжыруя новым прыбрежным дзержавам (Літве і др.) Англія, у гэты час як Польша сама адбіла бальшавікоу і зачала новую афенсіву, — не склонна паддзержываць польскі імперіялізм, баючыся, што увелічэная Польша не пакіе сваей экспансіўнай палітыкі на Літву і далей. Вось пачаму Англія паставілася проціу прысаедзіненя Выхаднай Галіціі к Польшы і прэдлажыла праізвесьті там плебісьціт. (У гэтай «Мало-Польшы» полякау толькі 14%). Як гэта, так і іншыя палаженя (успешная барацьба з бальшавікамі, паўстаня у прыднепроўскай Украіне і т.д.) даюць Украінцам вялікую надзею на лепшае будущее. Новая Украінская Міссія паехала у Лондын. Арыштованныя у Бэрліне і Вене украінскія грошы пачці што уволены ад арешта. на прошлом тыдні я гаварыу з Украінскім паслом у Празі п. Славінскім і ен надзе[е]цца што хутка усе грошы будуць аслабадзены. (А гэта і для нас будзе лепей) Хочучы удзержаць Версальскі трактат во усей сіле, Франція

павінна была іці на уступкі. Вось недауна французскія газэты заявілі што «Еслі бы Польша хацела устанавіць свае выхадныя граніцы за Немнам, наступіу бы разрыу с Польшай».- Ніхто не будзе спорыць а том што Франція і цяперь іграе вялікую роль у выхадном пытані паддзержкай Врангеля, Польшы і г.д.; алеж ніхто не може сказаць што яна стаіць за «единую недѣлимую». Кажды і не дальнозоркі палітык бачыць што гэта анохранізм. Балышынство стаіць за «федарацію» усіх нова саздаушыхся і саздающыхся дзержау з Россіей (само сабой разумеецца не з бальшавіцкай) Мне здаецца што і Франція на гэта не толькі пойдзе але яще паддержываць будзе гэты напрямік, калі будзе відзець што яе інтэрэсы будуць абязпэчэны, т.е. калі новыя дзержавы вазьмуць на сябе часьці доўга старай Расеі. Цяперь пакуль Расея яще называецца «Саудепіей» вядутца дэбаты а том каб к «Малой Антанце» прысаедзінілісь Польша, Болгарія і нават Грецыя (аб гэтай астатней самніцельна). Тутэйшая прэсса к Болгарыі адносіцца сімпатычна і нічога не мае проціу каб прылучылася Польша, калі яна перестане быць задорнай. Трэба ведаць што «Малая Антанта» састаўляе сілу у 47 міліонау чэл. і вядзе сваю самастаяцельную палітыку. Чэха-Словакіі і Югаславіі хочацца каб хутчэй устанавіўся парадак на Выхадзе каб можна было сухою дарогаю вясьці таргоўлю. Алеж яны ведаюць што пакуль Галіцыя будзе у Польскіх руках, пакуль не будуць успакоены народы, састаўляўшыя калісь Расею — гэта усе праблематычна. Тут неуместна пускацца у падробнасьці. Скажу толькі, што Малая Антанта з'являетца цяперь сільным фактарам у кіравані Еуропейскай палітыкі і што з нею серьезна лічыцца «Бальшая Антанта», якая здаецца цяперь вельмі слаба звязана. Не падлежыць самненю, што Малая Антанта адносіцца к Укр. і нам прыхільна.

Мне скажуць што гэта толькі галіматня, але гдзе канкретныя факты? А бальшавікі? А Польша?

На гэта магу адказаць кратко, але всестаронне абдуманна і праштудіраванна не толькі мною, але і людзьмі прыбыўшымі з Саудепіі і Польшы, і іншымі.

Цяперь гэтыя пытаня не так востры, як яны былі перад тым. Бальшавікі у канца, які може наступіць незадоўга. Што датыкаецца Польшы то трэба мець на узглядзе яе унутренную сітуацію і географічнае палажене. Па маяму глыбокаму прасвядчэню цяперь Польша не з'являетца страшнай. А пасля бальшавіцкая Расея? Тут то і трэба цяперь падгатаўляць грунт пакуль яще бальшавікі дзержацца. Треба каб наш прэдстаунік быу у Лондыне і Бельградзе. Целы свет цяперь хочэ каб хутчэй наступіу мір на зямлі. Трэба даказываць свету што ня будзе міру пакуль ня будуць аслабаждзяны народы із пад чужога ярма. (Бальшавікі хочуць разам зравалюціянізіроваць пралетаріят целаго света і цераз гэта яны нігдзе не находзяць сімпацыі (кроме адзіночных асоб) ня толькі у правых але і у левых загранічных саціялістау, бо каждаму вайна надаела і кажды знае што у Еуропе гэта не мысліма. Такія рэчы не даюцца ламаць цераз калено)

Трэба падаваць меморандумы «Саюзу Народау»[2], які і сорганізован з тою целью каб устраняць сваркі і войны паміж народамі і г.д. Адным словам трэба працаваць як мага у гэтым напрямку. У другом напрямку

трэба падгатауляць планы унутреннаго устройства бацькаущыны, бо калі прыдзе час узяць «бразды праулення» у свае рукі а мы ня будзем падгатоулены (адзін наш відны дзеяч гаварыу мне што ен і прэдставіць не може як бы гэта было) то толькі асаромімся перад людзьмі. Ці будзе падпісан мір Сав. Расеі з Польшай ці не — нам не трэба складываць рук пакуль не дабьемся сваей мэты, бо і самые крайніе пэссімісты ведаюць што усе гэтые сабыцьня не будуць трывалымі. Міравы трактат, пад якім не будзе подпісі прэдстаунікоу суверэннаго гаспадара, т.е. беларускаго народа, не будзе мець для нас ніякаго абязацельства. Украінцы заявілі целаму свету, што мір паміж Польшай і бальшавікамі, еслі ен будзе, не будзе мець для іх ніякаго значеня. Яны будуць прадаужаць барацьбу пакуль не дабьюцца свае мэты. Гэта трэба зрабіць і нам, тым больш, што калі мы маучым то загранiца думае што мы давольны бальшавіцкім рэжымам і гэта умацовывае іх палажене. Іці з Польшай нам не падарозе, але мне здаецца што не може многа шкодзіць калі Польша будзе памагаць нам арганізаваць беларускае войска на сваей тэррыторіі, бо войска павінна быць беларускае а яно нам будзе вельмі патрэбна, тым больш што істнаване самой Польшы, такой як яна ёсьць (шляхетскай) вельмі самніцельна. Усе прызнакі указываюць на тое, што як толькі кончыцца вайна у Польшы прыдзе ревалюція. А з Польшай дэмократычнай ці саціалістычнай можна будзе сталкавацца. — Але гэта мае асобае мнене. Еслі ёсьць цвердыя довады проціу гэтаго, я спорыць не буду. Што датыкаецца Врангеля і іншых працівабальшавіцкіх цячені, напрыклад парці Кадэтау, русскіх соц. рев., меньшавікоў і г.д., якіе надзеюцца захваціць уласьць Расеі у свае рукі после бальшавікоу, то мне здаецца што чакаць ад іх чаго нібуць добраго, калі яны будуць панамі палаженя, трудна. Толькі цяперь, калі Врангель і яго кампанія шукаюць сгоды з Украінцамі, можна былоб вынудзіць, пад дауленем інастранных дзержау, то чаго мы хочэм; але гэта дзержавы павінны быліб гаранціраваць, бо гэтым паном трудна верыць. У гэтых справах будзе кампетэнтным пан Ладноу і ен може сказаць што нібуць конкрэтнаго, а так сама і а Польшы. Я толькі яще раз магу паутарыць, што наше палажене може палепшыцца, толькі мы павінны стаяць на старай плацформе поунай незавісімасьці і недзялімасьці Беларусі і ісьці рука об руку з украінцамі.

З глыбокай пашанай М.Вершынін.

Маскоускіе узурпаторы праігрываюць вайну а палітычна ужо праграліу целом свеце. После об'явленя імі разалюціі Камуністычнаго с'езда у Маскве[3] а варунках уступленя у III інтэрнаціонал усе загранічные саціалісты ад іх адвярнуліся, сказаушы, што «жменя дэмагогау може дачасна вясьці "діктатуру над пралетаріятам" у Расеі але не у нас, гдзе кажды працаунік знае сабе цену і не пойдзе у маскоускую няволю». Паследняя стаўка бальшавікоу была у Празе, але тут дзякуючы растаропнасьці старых, практычных соц. дэмокр. важакоу, яна не выгарела, хоць яны цераз сваіх агэнтау, прыехаўшых з Расеі, паднялі рабочых, захваціліі соц. дем. друкарню і сазвалі камуністычны с'езд, называя яго с'ездам соц. дем. Прыверженцау іх аказалося ня многа. Палаженя больш. міссіі Чырвона-

га Крыжа пашатнулася. Легіонеры требуюць а высылце Гіллерсона (глава міссіі) у 48 гадзін. Тарговая міссія не прыедзе у Прагу. Масква праіграла і тут.

М.В.

582.2.54:326&r-328&r — ра

[1] Асновы Малой Антанты былі закладзеныя чэхаславацка-югаслаўскай дамовай, падпісанай у Бялградзе 14.08.1920. [2] Маецца на ўвазе Ліга Нацыяў. [3] II кангрэс Камінтэрну, які адбыўся ў Маскве 19.07-7.08 1920 і прыняў стаут Камінтэрну.

2390. Выпіска Вацлава Ластоўскага з кнігі: Записки генерала Куропаткина. Берлинъ

582.2.54:359 — рк

Дата невядомая. Аб стратах Расеі, панесеных у войнах з Польшчай за «вяртаньне» да Расеі беларускіх і ўкраінскіх земляў.

2391. Ліст рэдакцыі часопіса «Przymierze» (Варшава) [Браніславу Тарашкевічу?] за 28.09.1920 з запрашэньнем наведваць таварыскія сходы, арганізаваныя рэдакцыяй

582.2.37:001 — ма

У часапісе «Przymierze» (czasopismo niezależne poświęcone sprawom wyzwalających się narodów) былі надрукаваныя «Беларускія палітычныя пастуляты Б.Тарашкевіча: Taraszkiewicz B. Białoruskie postulaty polityczne // Przymierze. Nr.III. 1920.08.29; Nr.V. 1920.09.12.

2392. Пратакол агульнага сходу Прэзыдыюму Рады БНР з Радай Народных Міністраў БНР у Рызе 28.09.1920

Пратакол
агульнага Сходу Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з Радай Міністраў Рэспублікі.
28 вересьня 1920 году.
м. Рыга.

Былі прысутны: Старшыня Прэзыдыўму Рады Б.Н.Р. — П.Крэчэўскі, Віце-Старшыня Прэзыдыуму Рады Б.Н.Р. — В.Захарка, Сэкрэтар Прэз. Рады Б.Н.Р. — Я.Мамонька, Старшыня Рады Народных Міністраў Б.Н.Р. — В.Ластоўскі, Міністэр Справядлівасьці — А.Цвікевіч, Міністэр Фінансаў — А.Вальковіч і Дзержаўны Сэкрэтар — К.Езавітаў.

Слухалі

1, Даклад Старшыні Рады Народных Міністраў, — В.Ластоўскага, аб працы Урада за апошні пэрыод часу і аб уключэньні у склад Рады Народных Міністраў двух новых сяброў: на пасаду Міністра Фінансавых Спраў Гр. А.Вальковіч і на пасаду Дзержаўнага Сэкрэтара — К.Езавітава.

Пастанавілі:

1, Даклад прыняць да ведама. Наконта таго як лічыць новапрынятых членаў запрасіць ад Прэзыдыуму Рады Б.Н.Р. тлумачэньня да паперы яго ад 7 вересьня №203/85.

2, Паперы даверыя Ураду Б.Н.Р. ад іммені:
а) Цэнтральнай Рады Віленшчыны і Горадзеншчыны ад 30 травеня 1920 г. №215;
б) Партыі беларускіх с.-р. ад 31 травеня 1920 году;
в) Партыі беларускіх сац.-фэдэралістаў ад 31 травеня 1920 г. №150;
г) Канфэрэнцыі Беларускіх Дзержаўных і Грамадзянскіх дзеячоў ў Рызе (пратакол) ад 1 червеня 1920 г.;
д) Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Камітэту ад 20 жніўня 1920 г.;

2, Выражэнія даверыя прыняць да ведама.

3) Даклад Міністра Справядлівасьці і Пасла на Украіне, А.Цвікевіча, аб адносінах да Беларусі і аб становішчэ беларускай справы на Украіне, ў Чэхіі і Нямеччыне. Усюду адносіны да нас добрыя, усюды візіруюць нашы пашпарты і моцна маральна падтрымліваюць нас ў барацьбе за незалежнасьць.

3) Прыняць да ведама.

4) Даклад Старшыні Рады Народных Міністраў і Намесніка Мін. Межн. Спраў, В.Ластоўскага, аб адносінах да Беларусі з боку Літвы, якіе характэрызуются як яўна непрыхільные і навэт варожые. З боку Ураду Беларусі рабіліся крокі, каб дайсьці да паразуменьня, але крокі гэты не прывелі да згоды, бо літвіны вымагаюць ад Беларусі Вільню і Горадню.

4) Прыняць да ведама.

5) Даклад Шэфа Вайскова-Дыплёматычнай Місьі ў Латвіі і Эстіі палкоўніка К.Езавітава аб адносінах Латвіі і Эстіі да Беларусі, з якого відна, што адносіны гэты досіць лайяльны і што оба Урада зусім афіцыяльна зносяцца з Місыей.

5) Прыняць да ведама.

6) Даклад Старшыні Рады Нар. Мін. аб Расейска-Польскіх міравых гутарках ў Рызе, аб патрэбаваньні нашага ў ей учасьція, звернутага да Урадаў

6) Даклад прыняць да ведама. Делегацыю затвердзіць. Для сувязі з Савецкай дэлегацыей упоўнаважыць Гр. Мамонько. Для сувязі з дэлега-

Польшчы, Савецкай Расеі і Мірнай Канфэрэнцыі і аб тым, што на гэту канфэрэнцыю Урад прапануе паслаць гэткую дэлегацыю:
а) Паунамоцные члены: Ластоўскі, Цвікевіч і Ладноў і
б) члены: Овсянік, Галавінскі.

цыей польскай — Грам. Чэрэпука.

7) Даклад Мін. Фінансаў, Гр. Вальковіча, аб грашовым становішчэ: «Грошы німа зусім. Найвышейшая Рада праз Гр. Тэрэшчанку абецала прыслаць грашовую дапамогу. Прысылка была абецана на пятніцу 24 вересеня, але да сенешняга часу нічога не прыслана».

7) Устаноўлена, што ў Дзержаўнай кассе а таксама у кассах усіх міністэрстваў і усіх місый — грошей зусім нема. Даручыць Гр. Цвікевічу перегаварыць ў грашовай справе з украінцамі.

8) Даклад Гр. Цвікевіча і Гр. Езавітава аб прапазыцыі украінцаў пачаць на Украіне беларускіе фармаваньня і ў гэтых мэтах паслаць на Украіну Вайсковага Упоўнаважэнага Беларускага Ураду.

8) Прынцыпова згодзіцца, але пры варунке, што фармаваньне не будзе залежаць ад Палякоў. Даручыць перегаварыць з Кедроўскім ў гэтай справе Гр. Цвікевічу і Гр. Езавітаву.

Старшыня Рады Б.Н.Р.
Віце-Ст.
Сэкрэтар
Старшыня Рады Мін. Б.Н.Р.
Міністры
582.2.54:322&r-323&r — p

2393. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 28.09.1920

Прага 28 IX 1920

Міласьцівы п. Старшыня!

Ведаючы што наше фінансавае палажене дрэнная не хацеу бы Вам дакучаць, але мае тут у Празі вельмі кепскае. Я ад новаго году (г.г.) атрымываў 1500 карон, а ад лютаго 1700 к у месяц. Гэта такая сумма што тут смешна сказаць, бо канторщыкі атрымываюць 3000 карон у месяц, што пры тутэйшай даражыне меньш чым 100 карон перад вайною. Але вот ужо тры месяцы нічога не атрымываю. Я сямейны. Жыву у той самай кватэры што жыў перад вайною (адзін пакой і кухня) і у сябе садзяржу сваю канцылярію, бо наняць мешкане для канцылярії не маю за што. Мне стыдна як прэдстаўніку Беларусі, калі ка мне прыходзяць чужые людзі. Усе гэта могуць пацвярдзіць тые, хто быў у міне, напрыклад п.п. Захарка, Цвікевіч, Аусянік і інш.

Калі ёсьць цяперь грошы, то вельмі прасіў бы прыслаць, а калі не — то як атрымаеце ад украінцау ці з другой крыніцы. Не магу я жыць Св.

духам і на скарбовые патрэбы трэба было. Пазычыў ад укр. пасла пана Славінскаго 500 кар., ад укр. прафэсара Стоцкаго 500 к. і 1200 карон ад другіх асоб. Гэта усе трэба аддаць. За газэту «Nova Reforma» за год трэба плаціць каля 200 кар. а грошай німа. Не адмоўця пане старшыня увелічыць мне пэнсію. Можеце запытацца у п.п. Аусяніка, Галавінскаго і інш. а маем жыці у Празе.

Выбачайце Пане старшыня што гэтым затрудняю Вас. Ведаеце прыказку: «што каму баліць той а тым і гаварыць». — Прасіў Бэрлін, прасіў Ладнова з Парыжа, а цяперь прашу Вас.

Ваш слуга Мік.Вершынін

582.2.54:335&r-336&r — ра

2394. Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) Васілю Захарку (Рыга) за 28.09.1920

Дараженькі Василій Иванович!

Только что получилъ Ваше письмо и немедленно на него отвѣчаю.

Вы просите сказать Вам правду искренно о положеніи дѣл здѣсь. Охотно, от всего сердца исполню Вашу просьбу, оговорившись, что никогда по отношенію к Вам у меня не было второго лица.

Наше дѣло, послѣ моего пріѣзда, прошло рядъ комиссій в двух палатах; вездѣ благопріятно. Постановленія о признаніи были препровождены Правительству и опубликованы в печати въ концѣ іюля. Газетную вырѣзку съ офиц. письмом Предсѣд. Совѣта Министров от двух парламентских группъ, подписанную предсѣдателем обѣих, депутатом Жео, я послал в Ригу. Получена она или нѣт, не знаю? Из послѣдних писем Власта (офіціальнаго) и Костуся я заключаю, что не все посылаемое доходит по назначенію, и кто-то очевидно перехватывает документы и информацію, сѣя недоразумѣнія, подозрѣнія и провоцируя раскол между нами в наиболѣе острый, серьезный момент.

Возвращусь к дѣлу. Палаты в комиссіях приняли опредѣленное постановленіе о поддержкѣ Новых Госуд. образованій. Соціалисты государств Антанты ведут политику противоположную; они готовы всемѣрно поддерживать «истинных соціалистов» — московских насильников. Въ этом камень преткновенія в нашем вопросѣ, ибо Правительства держав Согласія волей-неволей вынуждены считаться съ давленіем соц. партій.

Различіе во взглядах на наш вопрос между Америкой, Англіей и Фр. не мало тормозит дѣло. Друзьям нашим весьма приходится считаться съ международным положеніемъ; вотъ причина задержки. Здѣсь принимаются всѣ мѣры, чтобы найти для насъ выходъ и благопріятно разрѣшить наш вопрос. Примите во вниманіе, что со всѣх сторон пишут так: никакой организаціи у них нѣт. Есть группа, даже вѣрнѣе, группы лицъ, находящихся в Ригѣ, Ревелѣ, Гельсингфорсѣ. Каждая из них дѣйствует самостоятельно, являясь как бы правящим центром. Нѣкоторые факты сообщенные сюда, это подтверждают. При таких условіях, когда нѣт арміи, нѣт территоріи, нѣт администр. аппарата, возникает невольно вопросъ: куда же посылать представителей, в случаѣ признанія власти? Отвѣтить

на этот вопрос невозможно. Нельзя же признать и потребовать от сосѣдей отвоевать для насъ территорію. Такой актъ (требованіе) могъ бы вызвать немедленно международныя осложненія. Почву у сосѣдей зондировали друзья наши, но отвѣты были отрицательные. Въ этомъ смыслѣ Вы правы, что разсчитывать можно только на самих себя. Въ послѣднее время однако в настроеніи ближайших сосѣдей произошел перелом. Мнѣ предстоит нѣсколько свиданій по вопросу о возможности полученія уголка территоріи для начала работ. Помощь нам оказывают, в этом смыслѣ всестороннюю. Полагаю, что удастся добиться положительных результатов. Финансовая и всѣх видов поддержка пріурочиваются къ этому моменту. Вѣрьте, Дорогой Друже, что болѣе доброжелательнаго отношенія трудно ожидать! Павел Федорович пробыл здѣсь нѣсколько дней, но уже успѣл понять сложность задачи и доброе желаніе помочь нам.

Въ смыслѣ реальной силы может имѣть большое значеніе пріѣздъ Аусяника. И я убѣдительно прошу Вас сдѣлать все возможное и зависящее, чтобы он немедленно прибыл сюда. Можно возбудить ходатайство объ открытіи кредита для его организаціи[1]. Кромѣ того я веду переговоры съ группой финансистов, от которой вчера получил офиціальное письмо (переводъ прилагаю).

Наш вопрос подлежал разрѣшенію в Правит. сферах на прошлой недѣлѣ: предполагалось разрѣшить принципіально, в какой формѣ при создавшихся для нас условіях возможно оказать нам поддержку? Генер. Секретарь Справ Заграничных приготовил для доклада досье и взял у меня дополнительные матерьялы, полученные из Риги.

И вдруг! Перемѣна Правительства[2], смѣна высших административных лицъ, уход Генер. Секретаря, новый Кабинет, и вновь отсрочка...

Буду кратокъ, Дорогой Другъ: если бы я видѣл, что здѣсь только затягивают время и никакого интереса к нам не проявляют, повѣрьте, что я бы давно оставил эту крайне неблагодарную, тяжелую работу, и уѣхал бы на Кавказъ, гдѣ моя семья оказалась без всяких средств, а жена лишилась трудоспособности, просуществовав 2 года без всякой помощи с моей стороны! Я вижу, чувствую и понимаю, что в этом всемирном Центрѣ мы привлекли вниманіе, и здѣсь хотят, ищут способа нам помочь! И это, только это меня здѣсь удерживает, я жертвую на пользу Бацькаущчынѣ своей семьей!

Сейчас только мнѣ протелефонировали из закордонных, чтобы я приготовил на завтра всѣ документы свидѣтельствующіе о дѣятельности Правительства, Рады, полит. положеніе, ноты протеста, вооруж. силы, словом вся дѣятельность, свидѣтельствующая о существованіи Государства. Как видите интересуются нами! Павел Федорович помогает работать. Глядя на отношеніе к нам закордонных спрау, настроеніе у него стало бодрое, увѣренное.

Я буду работать мѣсяцъ еще и надѣюсь в теченіе его достигнуть возможности подвести твердый финансовый фундамент. Когда это будет сдѣлано, дальнѣйшая работа пойдет сама-собой и у Вас всѣх, мои Друзья Дорогіе, будет иное настроеніе. Ваше положеніе для меня далеко не без-

различно, и если я молчу, то просто потому, что обстановка мѣняется, как в калейдоскопѣ, и не имѣю возможности передохнуть отъ приготовленія докладов, переговоров, ходатайств и пр.

Въ Штабѣ Фоша я видѣл на столѣ книгу Костуся[3]. Развѣ это не доказательство интереса?! Я не давал ее. Кстати прошу прислать десяток экземпляров книги. Я хочу перевести ее на фр. язык.

Дорогой, Василь Иванович! Не падайте духом, было хуже, а теперь мы близки к лучшему будущему. Скажите пожалуйста Власту, что он напрасно безпокоится. Я ни в чем не расписался, а просто прочел одному лицу, по понятным соображеніям, посланную Власту информацію, чтобы в острый момент «собали не лаяли».

Вѣдь я же написал в коротенькой записочкѣ, приложенной к этим информаціям что я прочитал это одному Господину, связанному с нашімі ворогамі, имѣя в віду, что это іх успокоіт.

Вѣдь я представил мандат; это понятно. Развѣ можно дѣйствовать, не скомпрометировав себя, внѣ предѣлов мандата?! Вѣдь это ясно и понятно! Власту и Костусю напишу при первой возможности. Время весьма горячее настало, поэтому прошу извинить. Информировать Вас будем о ходѣ дѣл. Сообщите, пожалуйста, какой минимум средств в мѣсяц нужен для Вас всѣх (в латышской валютѣ)?

Простите! Заканчиваю письмо, спѣшу отправить первой почтой.

Крѣпко Вас обнимаю и цѣлую! Привѣт всѣм нашим: Власту, Креч, Цвік, Костусю, Мамонько и др. Просите визу Аусянику, Мамонько. Сообщите мнѣ телеграммой я обращусь в Закордонные с ходатайством. Хорошо бы было чтобы Мамонько пріѣхал вмѣстѣ с другим кооператором, о котором пишет Костусь. Скажите Костусю что я имѣю помощника по должности якую несу на Бацькаушчынѣ, а ніякай пасады іншей не маю. Не падайте духом! Крѣпко обнимаю

Ваш ЕЛад...

Дараженькі Васілі Иванович! Я прасіу нашых (пана Цвік і Креч) каб прыслалі копію акрэдытыва; чы не можна гэта атрымаць цяпер. Тутака мне абецалі зрабіць шкандал тым правакатарам, якія не выдалі грошы. Нехай яны тутэйшым банкам скажуць: «А што скажуць усходнікі?» Быць можа мы атрымаемо по акрэдытыву у тутэйшых банках?

Прышліце копію.

Ваш Эўгені.

Парыж
28/IX 20.
25 Av. Victor Emmanuel III.
582.2.54:447&r-448&r — ра
582.2.54:449 — канвэрт

[1] Беларускай Вайсковай Камісіі. [2] 23.09.1920 Поля Дэшанэля на пасадзе прэзыдэнта зьмяніў Аляксандар Мільеран. 24.09.1920 быў сфармаваны новы кабінэт міністраў Жоржа Лега (Leygues). [3] Езовитов, К. Белоруссы и поляки: Документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 годах. Ковна, 1919. 124 с.

2395. Ліст [старшыні Прэзыдыюму Рады БНР Пятра Крэчэўскага?] (Рыга) міністру [...?] Украінскай Народнай Рэспублікі (?) за 29.09.1920 (вых. №216)

29.IX.20.
№216

Шчыра паважаны Пане Міністэр,

карыстаючы з нагоды, ласкава заахвяраванай нам тутэйшым Вашым Паслом, п. Кедроускім, засылаю сэрдэчнае павітаньне з прычыны сьвежых перамог Слаунага Украінскага Войска[1].

Падзеі апошніх часоу нашэ і Вашэ пытаньня высовываюць на сьветавую палітычную арэну. Не глядзючы на тую, ці іншую пастаноуку у цяперашні момант, мы лічым, што канечная развязка Украінскай і Беларускай праблемы яшчэ далека наперадзі. І дзеля гэтага, зьвяртаюсь да Вас, Высокапаважаны Пане Міністэр, з прапазыцыяй навязаньня актыунаго паразуменьня што да каардынацыі нашых сіл.

Мы, Беларусы, зауседы стаялі і стаімо за самую сціслую Беларуска-Украінскую дружбу і узаемную падпору, на грунце нацыянальна-дзяржаунага вызваленьня Беларускаго і Украінскаго Народоу.

Выходзячы з гэтаго пагляду, мы зауседы гатовы пайсьці, чым дужа, на сустрэч патрэбам і інтэрэсам Украінскай Дзяржаунасьці, спадзеваючыся узамен такіх жа самых адносін і з Вашай стараны.

Справы канкрэтнаго зместу будзе мець зручнасьць абгварыць з Вамі наш Пасол на Украіне, Паунамоцны Міністэр, Грамадзянін Цвікевіч, які збіраецца выехаць да Вашаго Ураду.

Прыміця, Пане Міністэр, завярэньня у самых шчырых да Вас адносінах.

582.2.54:325&r — мк

[1] Пасьля «цуду над Віслай» 20.08.1920 польска-украінскія войскі пачалі наступ на ўсход. Вайсковыя аддзелы УНР, пераправіўшыся 15.09.1920 праз Днестар, пачалі наступаць на бальшавікоў пад Чорткавам, а іх левая група — на мястэчка Падгайцы. 18.09.1920 бальшавікі былі адкінутыя за Збруч і гнаныя да рэчкі Калюса каля Стараканстанцінава і Лятычава. Наступ быў спынены загадам польскага камандаваньня 18.10.1920 у сувязі з падпісаньнем замірэньня з бальшавікамі.

2396. Ліст старшыні Рады БНР Пятра Крэчэўскага (Рыга) галаве Дырэкторыі Украінскай Народнай Рэспублікі Сымону Пятлюры (Варшава) за 29.09.1920 (вых. №51)

29.9.20
№51

Яго Дастойнасьці
Галоунаму Атаману і Галаве Высокай
Дырэкторыі Украінскай Народнай Рэспублікі
Пану С.В.ПЕТЛЮРЭ.

Шчыра вітаю Вас, Высокапаважаны Атамане, і у Вашай асобе Украінскі Народ, з пабедамі, атрыманымі Вашымі слаунымі казакамі на Роднай Украінскай Зямлі, жадаю як найхутчэй усім Вашым нацыянальным сілам вярнуцца у сваю старую сталіцу Кіяу.

Са свайго боку, ад Імені Беларускаго Народу і Яго Рады Рэспублікі, мушу зазначыць, што шчыры і незменны хауруснік Украіны — Беларуская Народная Рэспубліка — гатовы у кожны момант праліць супольна кроу за абарону Незалежнасьці і Непадзельнасьці як Беларусі, так і Украіны, каб абараніць іх ад усіх ворагау, пасягаючых на нашу Сувэрэннасьць.

Прыміця завярэньня у шчырай да Вас пашане.

Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

582.2.54:405 — мк

2397. Візытоўка Якуба Данілюка

Якуб Данілюк
Старшыня Рады Беларускай Калёніі у Латвіі

[На адвароце:]

Jacques Daniliouk
Président de la Rada
de la Colonie Blanche-Ruthénienne à Latvia.

582.1.71:019

2398. Візытоўка Антона Сьцяпуры

Антон Сцяпура
Намэстнік Старшыні Рады Беларускай Калёніі у Латвіі

[На адвароце:]

Antoine Stziapoura
Vice-Président de la Rada
de la Colonie Blanche-Ruthénienne à Latvia.

582.1.71:020

2399. Візытоўка Карла Пуста

Charles Robert Pusta
Délégué du Gouvernement d'Esthonie
auprès du Gouvernement Français
1, Bould de Totleben app. 2.
Téléph. Auteuil 19-60

582.1.71:021

2400. Візытоўка Зігфрыда Мэеровіца

Zigfrids A. Meierovics
Ministre des Affaires Etrangères de Latvia

582.1.71:022

2401. Візытоўка А.Хараша

A.Charasch
Docteur ès sciences politiques et économiques
Rédacteur
«Neue Zürcher Zeitung»
Zürich, Hôtel Suisse, Genève

582.1.71:023

2402. Візытоўка Баліса Сруогі

Balys Sruoga
«Lietuvos» dienraščio
korespondentas.

582.1.71:024[1]
582.1.71:026

З прыпіскай: «просит выдать курьеру редакціи обещанный матеріал»

2403. Візытоўка С.Б.Хольбэка

S.B.Holbek
cand. theol.
Berlingske Tidende
Copenhagen

The Foreign Press Service
New York

582.1.71:025

2404. Візытоўка Осіпа Назарука

Joseph Nazarouk
Docteur en Droit
Ancien Ministre de la Republique Ukrainienne

582.1.71:027

Осіп Назарук — міністар прэсы ва ўрадзе УНР прэм'ера Астапенкі (7.04-9.05.1919)

2405. Візытоўка Косьця Лявіцкага

Kost' Lewitsky
Docteur en Droit
ex Premier Ministre de la République Ukrainienne
Occidentale, membre du Conseil National Ukrainien,
chef de la Délégation de la République Ouest Ukrainienne
(Galicie Orientale) à la Conférence de la Paix à Riga

582.1.71:028

Косьць Лявіцкі — прэм'ер першага ўраду ЗУНР (9.11.1918-4.01.1919).

2406. Візытоўка Аляксандра Галавінскага

Ing. A. Golowinski

582.1.71:048

2407. Візытоўка Васіля Захаркі

Васіль Захарко
Намесьнік Старшыні Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі

582.1.71:050

2408. Візытоўка Георга Урбата

Georg Urbat
Deutsche Allgemeine Zeitung
Berlin S.W. 48

[Прыпісана алоўкам:]
Riga, Hotel Metropole

582.2.54:525 — д

2409. Запіска на візытоўцы Уладзімера Пігулеўскага Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за ??.10.1920

D-r V.Pigoulevsky
Employé pour missions speciales du Ministère des Affaires Etrangères
de la République Démocratique Blanche-Russienne

Гр. Старшыня!

Нядаўна званіў Шэф і прасіў, каб Вы зараз жэ абавязкова ішлі да Цвікевіча, куды пайшоў Галавінскі, які атрымаў вельмі важные і пільные весткі і будзе Вас тамака чэкаць. Заўтра зрана трэба рабіць крокі.

582.2.54:526 — ра

Дакладная дата невядомая.

2410. Пратакол 1-га паседжаньня Дэлегацыі БНР на Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе 1.10.1920

Пратакол 1го заседаньня Дэлегацыі Б.Н.Р.
на Мірную Канфэрэнцыю ў м. Рызе за 1.10.1920

Гр. Цвікевіч адчыняе заседаньне заявай аб пачыне працы дэлегацыі ў саставе: правамочных членаў гр.гр. Ластоўскаго і Цвікевіча, і райцаў гр.гр. Галавінскаго і Аўсяніка.

Сэкрэтаром дэлегацыі запрашаецца гр. Пігулеўскі.

На парадку дня ставіцца пытаньне аб форме працы дэлегацыі і аб форме выступленьня на мірнай канфэрэнцыі.

Канстатуюцца дзьве думкі:

1., Дамагацца ўключэньня дэлегацыі на Канфэрэнцыю як самастыйнай стараны.

2., Здаволіцца адным пратэстам, якая тактыка прынята Галіцыйскай дэлегацыяй, прыбыўшай ў Рыгу ў складзе гр.гр. Кост. Левіцкаго, Осіпа Назарука і інш.

Прымаецца апошняя прапазыцыя.

Матывуецца тым, што ўключэньне дэлегацыі відаць па ўсему ня адбудзецца, а самае дамаганьне можэ зрабіць ўраженьне учасьця ў ёй. Гр. Ластоўскі прыводзіць спраўку са зместу з апошніх нотаў ад 20/VIII і 7/IX 20 г. якімі Урад дабіваецца прыняцця ў Канфэрэнцыю, дзеля чаго пытаньне аб формах выступленьня адпадае. Гр. Цвікевіч дакладае, што прымаючы пад увагу няатрыманьне адказу на ноты Ураду дэлегацыі самой належыць звернуцца з адпаведнай дэклярацыей, чаму прапануе прыступіць да яе апрацаваньня і прызнае, што яна павінна складацца з заявы і мэмарандума.

Пытаньне аб тым, чы падаваць разам з заявай мэмарандум астаецца адкрытым да апрацаваньня праэкту самой дэклярацыі.

В.Ластоўскі А.Цьвікевіч А.Аўсянік А.Галавінскі
Сэкрэтар У.Пігулеўскі
582.1.08:017 — ра

2411. Пратакол паседжаньня Прэзыдыюму Рады БНР за 1.10.1920

ПРАТАКОЛ.

Заседаньня Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 1-го кастрычніка 1920 г.

СЛУХАЛІ:

Пратакол Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 6 чэрвеня 1920 г. і паперы Старшыні Рады Народных Міністроу Б.Н.Р. ад 7-го верасня 1920 г. за №№418, 419.-

ПАСТАНАВІЛІ:

Разглядеушы все гэтыя пытаньня была звернутая асаблівая увага на пастанову ад 6 червеня па каторой і даецца тлумачэніе.

На падставе трецьяго пункту пастановы Р.Б.Н.Р. ад 13 сьнежня 1919 г. Прэзыдыум Рады Рэспублікі пастановляя: што усе асобы уваходзячыя у кабінэт Міністроу Б.Н.Р. як зацьвержаныя вышей памяненай пастановай Рады Рэспублікі заховываюць сваі становішча ва усіх Нацыанальна-дзержауных напрамках працы.

Выбыцьце іх с Кабінэту може быць толькі:

а) с прычыны іх сьмерці,

б) просьба іх аб атстауцы,

в) па прычынам учіненным імі праступкау, скампроментованіе,

г) с прычыны адказу на затрэбованія Старшыні Р.Н.М. зьявіцца у мейсцо істнаванія кабінэту,

д) с прычыны адказу ад працы і службоваго падчыненьня Старшыні Р.Н.М.

Пры той ці іншай доугачасовай атсутнасьці па справам Нацыанальна-Дзержауным дзеля выпауненьня іх абавязкау па Міністэрствам могуць назначацца часовые Кіраунікі Міністэрствамі, якія павінны зацьвяржацца Презыдыумом Р.Р.

А адчыненьня же новых Міністэрствау не паіменованых у пастанове Р.Б.Н.Р. ад 13 снежня 1919 г. і назначеньне новых Міністрау може быць

проізведено толькі со згоды Прэзыдыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

П.Крэчэускі
Маршалак Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

В.Захарко
Наместнік Маршалка Р.Б.Н.Р.

Я.Мамонько
Сэкрэтар.
582.2.54:439&r — мк

2412. Дэкларацыя Паўнамочнай Дэлегацыі БНР за 2.10.1920 Прэзыдыюму Польска-Расейскай Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе з патрабаваньнем прызнаць незалежнасьць БНР і дапусьціць дэлегацыю да ўдзелу ў канфэрэнцыі

Беларуская Народная
Рэспубліка
Поунамочная Дэлегацыя
на мірные перэгаворы
у Рызе.
2 кастрычніка 1920 году.
м. Рыга
Мікалаеуская вул. №20
кв. Беларускай Місыі.

Польска-Расійскай Мірнай Конфэрэнцыі
у Рызе.

Упоунамочаная Урадам Б.Н.Р. Дэлегацыя на Расейска-Польскую Мірную Конфэрэнцыю у Рызе мае гонар зазначыць ніжэйпісанае:

1.- На Усебеларускім Устаноучым Кангрэсе 18-31 сьнежня 1917 году беларускі народ вустамі 1872 дэлегатау ад гарадоу, валасьцей, прафэсыянальных арганізацый і палітычных партый Беларусі, апавесьціу Беларусь Народнай Рэспублікай у межах лічэбнай перавагі беларускага народу.

2.- 25 марца 1918 году, калі Расея Берасцейскім трактатам стала дзяліць Беларусь, Спауняючы Камітэт Усебеларускага Устаноучага Зьезду — Рада Беларускай Народнай Рэспублікі — дапоуненая прэдстаунікамі ад земств, клясавых групп і нацыянальных меншасьцей Беларусі апавесціла сувэрэннасьць і незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі і разрыу датыхчасовых дружных зьвязей з Расеяй.

3.- 30 красавіка 1918 году Незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі вызнае, скінуушый ярмо расейскай няволі, Урад Украіны[1].

4.- Аснауны прынцып Парыжскай Мірнай Конфэрэнцыі выражэн сьледуючым прынцыпам «кожны народ мае права самаазначыцца».

6.- Пасьля акупацыі часьці Беларусі польскімі войскамі у чэрвені 1919 году Начальнік Польскай Дзержавы, Язэп Пілсудзкі афіцыяльна заявіу у Менску, сталіцы Беларусі, што Беларусь павінна быць незалежнай

Дзержавай і адносіны паміж народам польскім і беларускім павінны быць як роуны з роунымі.

6.- 23 верасьня 1920 г. Ц.И.К.Р.С.Ф.С.Р. урачыста прызнау Незалежнасьць і Сувэрэннасьць Беларусі[2].

Апіраючыся на ясна выражанай волі Беларускага Народу мець незалежнае дзержаунае істнаваньне Урад Беларусі надзелены паунамоччыямі Усебеларускага Устаноучага Кангрэсу даверыем усіх палітычных беларускіх партыяу, нацыянальных эканамічных арганізацый і групп, — няупынна бароуся тры гады за дэмакратычные ідэалы і ва усе выдатнейшые момэнты выступау у абарону правоу і інтэрэсау Беларускага Народу, а у першы чарод усюды цьверда і сьмела адстаівау сувэрэннасьць, дзержауную незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі.

25 марца 1918 году Рада і Урад Беларускай Народнай Рэспублікі апротэставалі перад усім сьветам нямецка-бальшавіцкі Берасцейскі Трактат, нарушаючый сувэрэннасьць Беларускай Народнай Рэспублікі адарваньнем ад яе жывога цела палуднева-заходніх зямель з гарадамі Брэстам, Беластокам, Бельскам і Пінскам.

10 красавіка 1920 году з прычыны меушыхся адбыцца у Барысаве Расейска-Польскіх перагаворау, пратэстам на імя Ураду Польшчы, Расеі і Рады паслоу у Парыжы, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі заявіу, што праз галаву Беларускага Народу Расея і Польшча ня могуць заключаць мір, што беларускі Народ не пацерпіць ні з чыей стараны анэксый сваіх аблітых крывей зямель, а Антанта дапусьціушы далучэньне Беларусі да Польшчы, учыніць гістарычную абмылку і яшчэ ня раз асьвеціць полымем вайны гарызонт Эуропы і наклічэ на сябе праклящьце усіх малых народау.

20 жніуня 1920 году Урад Беларускай Народнай Рэспублікі па поваду пачаушыхся у Менску перагаворау паміж Расеяй і Польшчай выслау пратэст Урадам Польшчы і Расеі, а копіі Урадам Антанты, зазначаючы, што ваеваушые на беларускай тэрыторыі і не маючыя паміж сабою сумежных граніц — Расея і Польшча ня могуць падпісываць міравых трактатау без учасьця Беларусі, і трэбуючы паунапрауна[га] учасьця у мірнай конфэрэнцыі.

7 верасьня 1920 году калі мірная конфэрэнцыя была перанесена у Рыгу, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі пратэстам высланым Урадам Расеі і копіі дэлегацыям Расейскай і Польскай заявіу, што Расея не мае права выступаць у ролі гаспадара Беларускай тэрыторыі, народ каторай самаазначыуся і мае свой законны Урад.

Цяпер, на моцы паунамочый ад нашага Ураду, мы заяуляем Мірнай Конфэрэнцыі у Рызе:

1.- Расея і Польшча не маюць супольных паміж сабою граніц і іх разьдзеляе абшырная, у 280.000 кв. кілемэтрау сувэрэнная беларуская тэрыторыя; усходняя польская граніца стыкаецца з Беларусьсю, а не з Расеяй і заходняя расейская граніца праходзіць ня з Польшчай, а з Беларусьсю. Польшча аб усходніх, а Расея аб заходніх сваіх граніцах павінны гаварыць з Беларускай Народнай Рэспублікай.

2.- Ні Расея, ні Польшча ня могуць выступаць у ролі гаспадароу беларускай тэрыторыі народ каторай хоць і уходзіу у дзяржауную сувязь з Польшчай, як роуны з роуным, але ніколі не належыу да Польшчы і парвау дзяржауныя зьвязі з Расеяй.

3.- Ні Расея, ні Польшча не правамочны гаварыць аб будучыне Беларусі, народ каторай дауно самаазначыуся, мае законна, выбраны і надзелены поуным народным даверыем Урад.

4.- Утворэны у часе цяперашняй расейскай акупацыі Рэвалюцыйны Камітэт і накінуты беларускаму народу як Урад Савецкай Беларусі, — ня можэ выступаць ад імяні беларускага Народу, бо народ яго ня выбірау, і ен яуляецца дыктатарскім органам партыйнай меншасьці.

Мы трэбуем ад абодвых ваеваушых старон — Расеі і Польшчы пацьверджэньня законных трэбаваній нашага народу аб прызнаньні Незалежнасьці і Сувэрэннасьці Беларускай Народнай Рэспублікі і дапушчэньня на конфэрэнцыю яе дэлегацыі, як стараны на тэрыторыі каторай Расея і Польшча вялі разарыцельную вайну.

Старшыня Дэлегацыі В.Ластоускі
Сэкрэтар У.Пігулеускі.

З арыгіналам згодна:
Кіраунік Канцэлярыі Рады Народных Міністрау Ю.Гладкі-Ластоускі.
582.1.06:019-020 — шк бел
582.1.06:064-065 — шк бел
582.1.07:017-019 — шк бел
582.1.07:020-022 — шк бел
582.1.07:029-030 — шк бел
582.1.07:031-032 — шк бел
582.1.07:079 — шк бел (-2с)
582.1.11:058-059 — шк бел
582.1.07:023-028 — ра В.Ластоўскага
582.1.08:012-014 — шк бел
582.1.06:036-037 — шк фра
582.1.45:131-131a-131b — шк бел
582.2.51:017-018 — шк фра
582.2.51:080-081 — шк фра
582.2.51:131-132 — шк бел
582.2.53:041-042 — шк фра
582.2.53:146-147 — шк фра

[1] Пацьверджаньня факту прызнаньня няма. 29.04.1918 у Кіеве адбыўся дзяржаўны пераварот, у выніку якога ўладу захапіў гетман П.Скарападзкі. Малавераго дна, каб у гэткіх абставінах 30.04 магло вырашацца пытаньне аб прызнаньні незалежнасьці Беларусі. Не пацьвярджаюць гэты факт і матэрыялы другой кіеўскай дэлегацыі — А.Луцкевіча (верасень-кастрычнік 1918). [2] З пастановы Усерасейскага ЦВК за 23.09.1920: «Воля к независимости была высказана народом Белоруссии в Акте 1918 года, и на основании этого акта ВЦИК признает сам и требует признания независимости Белоруссии со стороны Польши». Хутчэй за ўсё маецца на ўвазе «акт» абвяшчэньня Савецкай Беларусі 1.01.1919 — бальшавікі хутчэй памыліліся ў даце, чым у сваёй палітычнай лёгіцы.

2413. Нота Ўраду БНР Прэзыдыюму польска-расейскай Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе за ??.10.1920

582.2.54:377 — р бел

Чарнавік ноты за 2.10.1920 (дакумэнт №2412).

2414. Запрашэньне міністра замежных справаў Латвіі Вацлаву Ластоўскаму на раўт у гонар Польскай Дэлегацыі на Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе, які мае адбыцца 2.10.1920

582.2.54:410 — ма

2415. Беларускае Прэс-Бюро ў Рызе. ?.10.1920

[Кароткі выклад гісторыі змаганьня беларускага народу за незалежнасьць]

582.2.54:413&r — шк

582.2.54:414&r — шк

Дакладная дата невядомая.

2416. Пратакол 2-га паседжаньня Дэлегацыі БНР на Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе 4.10.1920

Пратакол 2го заседаньня Дэлегацыі Б.Н.Р.
на Мірную Канфэрэнцыю ў м. Рызе за 4.10.1920

Гр. Ластоўскі адчыняе заседаньне прэдлажэньнем парадку дня:

1., Прыняцьце пратаколу 1го заседаньня.

2., Даклад аб перагаворах с прэдстаўнікамі Латвіі, Украіны, Эстіі і Польшчы.

3., Адносіны да рожных групаў беларускіх дзеячоў.

4., Справы нашай дэклярацыі.

5., Нарада з Галічанамі.

Парадак дня прымаецца.

Пратакол 1го заседаньня зацьвержываецца.

Гр. Ластоўскі робіць даклад аб адбыўшыхся перагаворах з прэдстаўнікамі Латвіі, Украіны, Эстіі і Польшчы.

Міністр Межнародовых Спраў Латвіі гр. Мэеровіц па нашай прозьбе прымае на сябе дружэственнае пасрэдніцтва паміж Урадам Б.Н.Р. і Палякамі ў справе вызнаньня Б.Н.Р. і яе Ураду.

Прэдстаўнікі Украіны гр.гр. Кедроўскі, Залізняк, Васылло, Задарожны і інш., прымаючы пад увагу, што яны ня могуць выступіць адкрыта ў сучасны момэнт, калі лічацца саюзнікамі Польшчы, абецалі фактычнае падтрыманьне працы якая ляжыць на абавязку дэлегацыі.

Па паразуменьню з Украінцамі дана шыфрованая тэлеграма ў Варшаву на імя Левіцкаго[1], ў якой зазначэна абавязковасьць прыезду сюды Варшаўскай групы[2].

Нашы крокі з боку Эстіі ў ліцэ яе прэдстаўнікоў гр. Пуста і інш. сустрэлі прыхільные адносіны і падтрыманьне.

1ае спатканьне с Палякамі па прапазыцыі гр. Мэеровіца атбылося 2/X ў пасла Каменецкаго.

З нашага боку былі гр.гр. Ластоўскі, Цвікевіч, Аўсянік, з боку Палякоў п. Каменецкі. У гутарке з нашаго боку было зазначэна, што карыстаючысь прапазыцыяй гр. Мэеровіца мы гатовы гутарыць ў справе вызнаньня Польшчай незалежнасці Б.Н.Р. і абгаварыць тыя канкрэтныя умовы, якія з гэтым будуць звязаны.

П. Каменецкі зазначыў, што ён упаўнамочэн заявіць, што польская старана гатова ўступіць ў перэгаворы і прасіў пакуль што устрымацца ад падачы дэкларацыі на мірную Канфэрэнцыю.

2ае спатканьне с Палякамі адбылося 4го/X-20 г. пры чым з нашаго боку прысутствавалі гр.гр. Ластоўскі, Цвікевіч і Аўсянік, і з боку палякоў: паўнамочны Міністр і Пасол Васілеўскі, Пасол Каменецкі і члены дэлегацыі на мірную Канфэрэнцыю Абезерскі і Крыжаноўскі.

На гэтам сходзе было зазначэна з нашага боку, што мы можэм гутарыць з прэдстаўнікамі польскаго Ураду толькі на грунце вызнаньня Б.Н.Р. і яе Ураду.

Прэдстаўнікі польскай стараны дэкляравалі, што прынцыпова проціў гэтаго Польскі Урад нічога ня маець, але лічыць патрэбным, каб ўсе сілы беларускай дзержаўнасьці кансалідаваліс каля аднаго цэнтру. З нашаго боку прапазыцыя іх ня сустрэла адмоўленьня і дано было паразумець, што на вызаў Варшаўскіх працаўнікоў беларускі Урад згодзен.

Беларускай стараной пасля гэтаго было заяўлена, што па прозьбе пасла Каменецкага дэлегацыя пакуль што устрымае падачу дэкларацыі на Мірную Канфэрэнцыю і з сваего боку просіць польскую дэлегацыю устрымацца з рэшучымі прапазыцыямі і пастанаўленьнямі ў справах міру.

Пазыцыя занятая дэлегацыей сходам пахваляецца.

Па поваду дальнейшых перэгавораў з Палякамі сход пастанаўляе звярнуцца з прапазыцыяй «sine qua non» да Польскага Ураду: 1., аб амністыі гр. Грыба з жонкай і Камарынца і 2., каб Польская дэлегацыя абязалась ня памещаць у прэсу вестак аб прыезде Варшаўскіх беларускіх працаўнікоў.

Пытаньне скончана.

Гр. Ластоўскі даводзіць да ведама, што Прэз.-Мін. В.Ластоўскі, Мін. А.Цвікевіч з Марш. П.Крычеўскім на чале былі прысутны 2/X-20 г. на рауце, які быў дан Міністрам Загранічных Спраў Латвіі гр. Мэеровіцэм ў чэсць польскай дэлегацыі, на якім быў прысутны ўвесь дыплематычны корпус пры Латвійскам Ураде.

3/X-20 г. быў зроблен візыт Французскаму Камісару ў Прыбалтыцэ M. de-Sartige.

Па пытаньню аб паразуменьню з рожнымі групамі беларускіх дзеячоў прасіць разглядзець гэта Раду Народных Міністраў.

Заслухаўшы даложэны да гэтаго праэкт дэкларацыі пастаноўлена раздаць яго ўсім членам дэлегацыі для дзетальнаго азнаемленьня і крытыкі.

Нарада з Галічанамі назначаецца на 4 гадзіны 5го кастрычніка 1920 г.

Ластоўскі Цвікевіч Галавінскі Аўсянік Сэкэртар Пігулеўскі

582.1.08:018&r-019 — ра

[1] Міністар замежных справаў УНР. [2] Беларускіх дзеячоў, згуртаваных вакол Найвышэйшай Рады (гл. дакумэнт №2417).

2417. Тэкст шыфраграмы Вацлава Ластоўскага (Рыга) прадстаўнікам «варшаўскай беларускай групы» за ?.10.1920

~~Паважаны Пане Дубейкоў...~~

Грамадзяне,

карыстаюся ласкава запрапанаванай мне услугай каб перэслаць Вам вестку. Кажуць, Вы можэце гэтай дарогай даць адповедзь.

1. Пазыцыі нашы узмацовываюцца.

2. На чародзе рэалізацыя пляноў гістарычнаго значэньня у курсе каторых Вы павінны быць.

3. Час гарачы і кожды момэнт дораг.

4. Веручы у Вашу шчырасць жду каго небудзь для зьвязі.

ВЛаст

582.2.54:446 — рк

Дакладная дата невядомая.

2418. Пісьмовае сьведчанне Пятра Цьвяткова за 4.10.1920 аб тым, што інфармацыю аб выключэньні Аўгена Ладнова й Вацлава Ластоўскага з партыі эсэраў ён атрымаў не ад Янкі Чарапука, а ад беларускай палітычнай арганізацыі

582.2.54:450 — ра

2419. «Что желаетъ Бѣлоруссія». Пераклад на расейскую мову інтэрвію з Аляксандрам Цьвікевічам з латыскай газэты «Jaunakas Sinas» за 5.10.1920

582.1.08:036&r — мк

2420. Пратакол 3-га паседжаньня Дэлегацыі БНР на Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе 5.10.1920

Пратакол 3го заседаньня Дэлегацыі Б.Н.Р.
на Мірную Канфэрэнцыю ў Рызе за 5.10.1920

Парадак дня

1., Зацьвержэньне пратаколу 2го заседаньня.

2., Справа дэклярацыі на Мірную Канфэрэнцыю.

Пратакол 2го заседаньня прымаецца і зацьвержываецца.

Заслухаушы праэкт дэклярацыі, даложэны да пратаколу 2го заседаньня пастаноулена зацьвердзіць яго і падаць прэдседацелям абеіх дэлегацый на Мірную Канфэрэнцыю, а копіі прэдстаўнікам ўсіх Урадоў, знаходзячымся ў Рызе, даручыў гэта сэкрэтару гр. Пігулеўскаму.

Ластоўскі Цьвікевіч Галавінскі Аўсянік Сэкрэтар Пігулеўскі

582.1.08:025 — ра

2421. Дэклярацыя Паўнамочнай Дэлегацыі БНР за 5.10.1920 Прэзыдыюму Польска-Расейскай Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе з патрабаваньнем дапусьціць дэлегацыю да ўдзелу ў перагаворах

Беларуская Народная
Рэспубліка
Поунамочная Дэлегацыя
на мірные перэгаворы
у Рызе.
5 кастрычніка 1920 году.
м. Рыга
Мікалаеуская вул. №20
кв. Беларускай Місыі.

Мірнай Конфэрэнцыі у Рызе.

У момэнт, калі вайсковыя чыннасьці паміж Расійскай Соцыалістычнай Фэдэратыунай Савецкай Рэспублікай і Польскай Рэспублікай спыняюцца і калі ваеваушые староны прыступаюць да устаноуленьня міру, да якога імкнуцца усе народы Эуропы, а больш за усіх змучаны шасьцілетняй крывавай бойкай Беларускі народ — Поунамочная Дэлегацыя Беларускай Народнай Рэспублікі на Мірную Конфэрэнцыю упоунаважаны сваім Урадам заявіць ніжэйпісанае:

1.- Трывалы і справедлівы мір паміж Р.С.Ф.С.Р. і Польшчай можэ быць дасцігнуты толькі пасля таго, як абедзьве староны адмовяцца ад захвату неналежных ім часьцей этнаграфічнай Беларускай тэрыторыі і дадуць магчымасьць Беларускаму Народу вольнаго і дзержаунаго развіцьця і будаўніцтва.

2.- Непадзельнасьць этнаграфічных беларускіх зямель і забаспечэньне Беларускаму Народу вольнаго развіцьця павінно выявіцца фармальным прызнаньнем абедзьвемі старанамі незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі на чале з яе правамочным Урадам і з адводам з тэрыторыі Рэспублікі расійскіх і польскіх акупацыйных войск.

Такое прызнаньне для абедзвех старон тым больш патрэбна, што Р.С.Ф.С.Р. і Польшча пры устаноуленьні замірья ужо заявілі аб фактычным прызнаньні незалежнасьці Беларусі.

Р.С.Ф.С.Р. і Польшча не маюць агульных граніц; іх дзеліць тэрыторыя Беларускай Народнай Рэспублікі. Польшча аб пауночна-усходніх і Р.С.Ф.С.Р. аб заходніх сваіх граніцах павінны дагаварыцца з Урадам Беларускай Народнай Рэспублікі.

На аснове вышэйсказанаго Урад Беларускай Народнай Рэспублікі дамагаецца учасцьця у Расійска-Украінска-Польскіх мірных перэгаворах, як роунапрауная старана і заяуляе, што мір вырэшаючый лесы Беларусі і замацаваны бяз учасцьця Прэдстаунікоу яе законнаго Ураду — Беларускі Народ не прызнае для сябе абавязковым і будзе з ім змагацца усімі магчымымі спосабамі.

Арыгінал падпісалі:
Старшыня Поунамочнай Дэлегацыі на мірные
перэгаворы у Рызе В.Ластоускі

Сябра д-р А.Цьвікевіч.

Сэкрэтар У.Пігулеускі.

З арыгіналам згодна:
Кіраунік Канцэлярыі Рады Народных Міністрау Ю.Гладкі-Ластоускі.
582.1.06:021 — шк бел
582.1.07:033 — шк бел
582.1.46:030 — шк бел
582.1.08:020-021 — ра Я.Чарапука праекту дэкларацыі
582.1.06:038-039 — шк фра
582.1.08:024 — шк фра
582.1.08:022 — шк рас
582.1.08:023 — шк рас
582.2.51:019-020 — шк фра
582.2.51:082-083 — шк фра
582.2.51:133 — шк бел
582.2.53:043-044 — шк фра
582.2.53:148-149 — шк фра
582.2.54:345&r — рк пол (В.Ластоўскі)
582.2.54:346-348 — рк рас
582.2.54:349&r — рк рас
582.2.54:411&r — мк фра

2422. Даклад дэлегата Міністэрства Замежных Справаў Янкі Чарапука старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 5.10.1920 аб тым, што ён не пераказваў Пятру Цьвяткову інфармацыі аб выключэньні А.Ладнова й В.Ластоўскага з партыі эсэраў
582.2.54:451&r — ра

Цьвяткоў пераказаў інфармацыю А.Чарвякову, які быў у той час у Рызе.

2423. Расьпіска кіраўніка справаў расейскай дэлегацыі на мірнай канфэрэнцыі Ф.Шышова за 6.10.1920 аб атрыманьні Дэкларацыі дэлегацыі БНР
582.1.08:034

2424. Расьпіска кіраўніка канцылярыі польскай дэлегацыі на мірнай канфэрэнцыі за 6.10.1920 аб атрыманьні Дэкларацыі дэлегацыі БНР
582.1.08:035

2425. Запіска Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 6.10.1920
16 г. 25 м. 6.X.1920 г.
Польскій Посол Каменецкій проситъ Предсѣдателя Рады Министров Б.Н.Р. Господина Ластовскаго пожаловать сегодня в Польскую Миссію в 10 часовъ вечера для переговоров
Передал Секретарь Посольства Балинскій

Вызывал сначала почему-то Черепука, а потым прасіл паведаміць Старшыню.
Пераслаў
Шэф Місьі К.Езавітоў
582.2.54:445 — ра

2426. Пратакол 4-га паседжаньня Дэлегацыі БНР на Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе 7.10.1920

Пратакол 4го заседаньня Дэлегацыі Б.Н.Р.
на Мірную Канфэрэнцыю ў Рызе за 7.10.1920

Парадак дня.

Заслуханьне Беларуска-Галіцкай адозвы.

Слухалі: пытаньне аб агульнай Беларуска-Галіцкай канфэрэнцыі.

Пастанавілі: Даложэны да гэтаго пратаколу праэкт супольнай адозвы «Да ўсіх» як пратэст проціў Расейскаго і Польскаго імпэріялізмаў — зацьвердзіць і падпісаць.

Зьмест адозвы прэдставіць на зацьвержэньне Рады Народных Міністраў, пасля чаго яе апублікаваць.

Ластоўскі Цьвікевіч Галавінскі Аўсянік Сэкрэтар Пігулеўскі
582.1.08:026 — ра

2427. Копія ноты прадстаўніка Ўкраінскай Народнай Рэспублікі Сяргея Шалухіна й шэфа Ўкраінскай Дыпляматычнай Місіі ў Латвіі Ўладзімера Кедроўскага да старшыні польскае дэлегацыі Домбскага за 7.10.1920 ў справе замірэньня й прэлімінарнага міру паміж Польшчай з аднаго боку й Савецкай Расеі і Ўкраіны з другога

582.1.08:042 — мк
582.2.54:417 — мк

2428. Суправаджальная запіска Украінскай Дыпляматычнай Місіі ў Латвіі Беларускай Дыпляматычнай Місіі да копіі ноты ўкраінскіх прадстаўнікоў да Домбскага

582.1.08:041

2429. Тэлеграма Лявона Дубейкоўскага (Варшава) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 7.10.1920

lastowski bialoruska misja riga
mikolajewska 20=
+warschau 5670 10 7 19 50

pryjedu zdowolu patreby = dubiejkowski .+
582.2.54:441 — а

2430. Ліст Алега Васількоўскага (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 7.10.1920

582.2.54:442&r-443&r — ра
582.2.54:444 — канвэрт

2431. Супольны Пратэст «Да ўсіх» — Адозва за 8.10.1920 супольнай канфэрэнцыі дэлегацый Беларускай Народнай Рэспублікі і Ўсходне-Галіцкай Рэспублікі[1], прыбылых у Рыгу дзеля абароны Дзяржаўных Інтарэсаў сваіх народаў і тэрыторыі

Упоунамочаныя Дэлегацый Беларускай Народнай Рэспублікі і Усходня-Галіцкай, прыбыушы у Рыгу дзеля абароны дзяржауных інтэрэсау сваіх народау і тэрыторый, адбылі супольную конфэрэнцыю і па усестароннім абмяркаваньню справы міра на Усходзе Эуропы аднагалосна пастанавіла выдаць гэту адозву:

Да усіх.

Супольны пратэст Дэлегацыі Беларускай і Усходня-Галіцкай проці імпэрыялістычнага захвату іхніх зямель на аснове рыжскай прэлімінарнай умовы.

У Рызе падпісываецца сягоньня прэлімінарная умова між Польшчай і Расеяй, якая ня толькі ня улагодзіць адносін на Усходзе Эуропы, але яшчэ болей разьятрыць міжнародную барацьбу. Вынікам гэтай умовы яуляецца самаупраунае прыгвалчэньне волі цэлых народау, спраконвечныя землі каторых ператарговывалі, як прыватную уласнасьць адпаведна да хаценьня зазнаушагася імпэрыялізму. Жэртвамі гэтага торгу палі перш за усе Беларусь, тэрыторыю каторай самапрауна разарвалі на карысьць Польшчы і Расеі, ды Усходняя Галіччына, каторую цэліком кінулі на зьежу Польшчы, а так сама іншыя старыя украінскія землі: Холмшчыну, Валынь і Падольле. А незадоуга пачуюць вынікі гэтага торгу Літва і іншыя прыбалтыцкія дзяржавы.

Як Беларусь, так і Усходняя Галіччына ужо выявілі і даказалі свае права на самаазначэньне, заснавалі свае дзяржавы, забаспечаючы раунапрауе усім нацыянальным меншасьцям, выбралі легальныя Урады, сарганізавалі свае арміі, дый заявілі сваю дзяржауную адміністрацыю.

Супроць Галічыны выступіла імпэрыялістычная Польшча вайной і па доуга трываушай крывавай барацьбе удалося ей чужой дапамогай перамагчы і заліць салдатчынай увесь край. Ад таго часу па гэтых зямлях шалея страшэнны імпэрыялізм, выгубляе дзясяткі тысяч бязвінных людзей, тысячы гніюць у польскіх турмах і лагерах і тысячы людзей разстрэляны, або павешаны за любоу да іх роднага краю. Спалены і зраунаваны з зямлей цэлыя палосы Беларусі і Галіччыны, тысячы людзей прымушаны былі пакінуць свае хаты і бяз хлеба і прыпынішча блутаецца па цэлай Эуропе, выклікаючы агульны спагад. А супроць тых, што асталіся, Польшча пагромамі вядзе барбарскае вынішчаючае іх змаганьне, адмауляе ім доступу да нацыянальных школ і урадау, волі слова і права да жыцьця.

Усе тоя робіць Польшча з тэй мэтай, каб выкарыстаць гэныя багатыя у сырье старонкі — не на карысьць жыхароу, тых зямель аголеных вайной, а на карысьць паразітнага жыцьця польскіх памешчыкау.

Хоць спамянутая прэлімінарная умова прызнала незалежнасьць і сувэрэннасьць Беларусі і Украіны, а усходняя Галіччына ужо раней прызнана дзяржавамі Антанты, як асобны дзяржауны арганізм,— то усе-ж такі дакуль трывае чужая акупацыя на гэтых землях, дакуль акупанты ня будуць прымушаны забраць свае войскі з чужых для іх тэрыторый, датуль акупаваныя землі астаюцца пад цяжкім ярмом няволі і аб праудзівым міры ня можэ быць і мовы.

Супроці усякага імпэрыялізму вядзем і будземо вясьці барацьбу да канца.

Зьвертаемся да усіх у ймя найсьвяцейшых клічау чалавечэства, у ймя культуры, міра і людзкасьці: памажэце нам у змаганьні за правы да жыцьця, дайце нам падмогу у барацьбе за свабоду. Калі вы захочэце то зможэце уплывамі на свае урады, каб не памагалі імпэрыялістычнай Расеі і Польшчы душыць Беларусі і Галіччыны. Ці-ж пасьля разьбіцьця старых турэм народау маюць стануць новыя турмы.

Споуніце свой абавязак супроць паняволеных і скажыце свае цьвердае слова.

Беларуская Рэспубліка мае права да жыцьця і поунай свабоды.

Галіцкая Рэспубліка мае права да жыцьця і поунай свабоды.

Арыгнал падпісалі: Старшыня дэлегацыі Вацлау Ластоускі;
сябры: Александр Цьвікевіч, Антон Аусянік, Александр Галавінскі.

Ад Дэлегацыі Усходняй Галіччыны: Старшыня дэлегацыі Константын Левіцкі; сябры: Эрнест Брайтэр, д-р Язэп Назарук, д-р Лука Міхуга і Есафат Жан.

У Рызе, дня 8 жніуня[2] 1920 году.

З арыгіналам згодна:
Кіраунік Канцэлярыі Рады Міністрау Ю.Гладкі-Ластоўскі.

582.1.06:022-023 — шк бел
582.1.06:066-067 — шк бел
582.1.07:085 — шк бел (с1)
582.1.07:086-087 — шк бел
582.1.08:029 — мк бел (1-шы экз)
582.1.38:004 — мк бел
582.1.38:005 — мк бел
582.1.38:006 — мк бел
582.1.08:027&r-028 — ра В.Ластоўскага
582.1.07:034 — шк фра
582.1.08:030&r — шк фра
582.1.11:040 — шк фра (с1)
582.1.11:060 — шк фра
582.1.19:031 — шк фра
582.1.20:020 — шк фра
582.2.51:012 — шк фра
582.2.51:075 — шк фра
582.2.51:134,136 — шк бел
582.2.53:036 — шк фра
582.2.54:324&r — р праект В.Ластоўскага

[1] Заходне-Ўкраінскай Народнай Рэспублікі. У дэлегацыю ўваходзілі: Косьць Лявіцкі (старшыня), Осіп Назарук, Эрнст Тэадор Брэйтэр і Лука Мышуха. [2] Памылкова замест кастрычніка.

2432. Пратакол 5-га паседжаньня Дэлегацыі БНР на Мірнай Канфэрэнцыі ў Рызе 8.10.1920

Пратакол 5го заседаньня Дэлегацыі Б.Н.Р.
на Мірную Канфэрэнцыю ў Рызе за 8.10.1920

Парадак дня.

1., Заслуханьне пратаколаў 3го і 4го заседаніяў.

2., Справаздача сяброў дэлегацыі з іх чыннасці і далейшыя пляны.

Пратаколы 3го і 4го заседаніяў пастаноўлена зацьвердзіць і падпісаць.

Гр. Ластоўскі апаведае, што 6/X адбылася 3ья гутарка з Польскай Дэлегацыяй.

З боку Беларусоў былі гр.гр. Ластоўскі, Цвікевіч і Аўсянік, з боку Палякоў — гр.гр. Васілеўскі, Каменецкі, Абезерскі і Крыжаноўскі.

Згодна з пратаколам дэлегацыя звернулась з заявай аб амністыі беларускіх дзеячоў, якіе знайходзяцца ў польскіх турмах і лагерах а ў першую чаргу гр. Грыба з жонкай і Камарынца. На гэта палякамі быў дан памыслны адказ і прапанова падаць аффіцыяльную заяву. З далейшай гутаркі выявілась, што ужо прэдрашэно падпісаньне паміж Палякамі і Расейцамі пярэмір'я і прэлімінарнаго міру. З прічыны гэтаго намі было заяўлена, што мы лічым сябе свабоднымі ў падачэ дэклярацыі-пратэсту.

Далей Палякамі было зроблена пытаньне, як мы уяўляем сабе пытаньне аб канкрэтных варунках нашай дзержаўнай працы пасля вызнаньня Палякамі нашаго Ураду і якія будуць пры гэтым бліжайшыя мэты беларускай улады.

На гэта намі было адказано:

1., Пасля спаўненьня Польскім Урадам глаўнаго пункту аб вызнаньні незалежнасьці Б.Н.Р. Беларускі Урад павінен перэхаць у Менск і злажыць справаздачу чароднай сэсіі Рады Рэспублікі.

2., Беларускаму Ураду павінна быць дадзена магчымасць адразу ж прыступіць да фармуваньня аружнай сілы на тэррыторыі паміж фронтамі і гранічнай лініяй устаноўленай прэлімінарным догаворам.

3., Беларускі Урад ўходзіць ў саюзныя умовы с Польскім Урадам.

Міністр Васілеўскі ад імяні Польскай дэлегацыі заявіў, што гэтые прапазыцыі ею прымаюцца як грунт для далейшаго разгляду і абгавору.

На гэтым гутарка скончылась.

Аб размове з беларускімі бальшэвікамі дакладае гр. Аўсянік.

Па даручэньню Старшыні дэлегацыі гр.гр. Галавінскі і Аўсянік на працягу часу ад 1го да 6го кастрычніка мелі гутаркі з старшыней Беларускага Рэўкому гр. Чэрвяковым.

З гутарак выявілась:

1., Прыхільнасць гр. Чэрвякова да Беларускай нацыянальнай працы, што пацьвержаецца газэтай, якая друкавалась у Смаленску на беларускай мове пад яго рэдакцыяй[1] і той культурнай працай якая вядецца цяпер на Беларусі пад аккупацыяй Расейскіх войск да якой ен прыцягнуў больш выдатные беларускіе сілы, а так сама тым, што тэррору ў адносінах да беларускіх нацыянальных і палітычных дзеячоў ня было.

2., На запытаньне як гр. Чэрвякоў адносіцца да сучасных перэгавораў і да магчымаго паддзелу Беларусі адказаў, што ен прысутны на перэгаворах толькі як сведка, што мандатоў сваіх ен Расейско-Украінскай дэлегацыі на заключэньне міру не перэдаваў.

Савецкі Беларускі Урад, стаячы на грунце этнаграфічных граніц з Польшчай, (а так сама з Расіяй), на паддзел Беларусі ня згодзіцца, рыхтуючы мір будзе ігнараваць і лічыць сябе на далей ў стане вайны з Польскім імпэріялізмам.

Сход заслухаў паведамленьне старшыні дэлегацыі аб візыті Фінляндскаму паслу ў Латвіі і Літве гр. [2] ў якім інфармавалі яго аб бягучых справах беларускіх.

Паслом між іншым было зазначэна, што Фінляндзія ўвесь час выяўляе сымпатыі да Беларусі, што было адзначэна яшчэ ў акце ў снежні 1919 году аб аффіцыяльном вызнаньні незалежнасці Б.Н.Р.

Сэкрэтаром гр. Пігулеўскім даложэна, што дэкляpацыі Беларускай дэлегацыі на Канфэрэнцыю у Рызе 6го кастрычніка 1920 г. зложэны ў Сэкрэтаріаты Польскай і расейскай дэлегацыяў, ў чым атрыманы распіскі.

Ластоўскі Цьвікевіч Галавінскі Аўсянік Сэкрэтар Пігулеўскі

582.1.08:031&r-032 — ра

[1] «Звѣзда». Выходзіла ў Смаленску з восені 1919. Ад 8.08.1920 — у Менску.
[2] Прозьвішча прапушчана.

2433. Виленское Слово. №25. 8.10.1920

582.1.45:122

З артыкулам «Личность В.Ластовскаго»

2434. Хадайніцтва Вацлава Ластоўскага за 9.10.1920 да паўнамоцнага міністра й пасла п. Васілеўскага з просьбаю аб вызваленьні з польскай турмы Тамаша Грыба з жонкай і Юрыя Камарынца

582.1.08:033&r

Прыпіска алоўкам: «пав[одле] Васілеўскага Грыб звольнены».

2435. Агляд дацкай прэсы №16 за 9.10.1920, дасланы Інфармацыйным Бюро БНР у Капэнгагене

582.1.08:037
582.1.08:039

2436. Суправаджальны ліст Прэзыдыюму Рады БНР старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 9.10.1920 (вых. №204/86), дасланы з пратаколам паседжаньня Прэзыдыюму Рады БНР за 1.10.1920

582.2.54:440 — ма

2437. Копія пратакола сходу, які адбыўся 10.10.1920 на кватэры ў Антона Луцкевіча (Вільня)

ПРАТАКОЛ

Мы, нижеподписавшіеся[1] свидѣтельствуем, что 1) — 10-го октября 1920 г. в 5 час. вечера на квартирѣ А.И.Луцкевича [(]Вильно Виленская 33) состоялось политическое совѣщаніе, на котором сдѣлали доклады пріѣ-

хавшіе в Вильну одновременно со вступленіем в нее польских войск т.н. «Средней Литвы», — Вацлав Ивановскій и Бронислав Тарашкевич. 2) — На этом совѣщаніи, нѣкоторые мы здѣсь подписавшіеся были приглашены А.И.Луцкевичем, — присутствовали: А.И.Луцкевич, И.Станкевич, Ф.Еремич, кс. Ад.Станкевич, А.Карабач, М.Каханович, В.Ивановскій и Б.Тарашкевич. Всѣ эти лица, за исключеніем И.Станкевича, Ивановскаго и Б.Тарашкевича входят в состав Политической Комиссіи Виленскаго Бѣлорусскаго Національнаго Комитета. Совѣщаніе открылось докладом Ивановскаго и Тарашкевича, которые сообщили слѣдующее:

Послѣ того, как польское войско под натиском большевиков оставило Минск, Вильно и т.д., словом всю Бѣлоруссь, бѣлорусскій вопрос замер в кругах польскаго общества. В Варшавѣ положеніе было очень тяжелое, был открыт заговор Н.-Д. против Пилсудзкаго. Н.-Д-ки хотѣли задержать один из идущих на фронт познанских полков, при его помощи арестовать Пилсудзкаго и видных пилсудчиков и на мѣсто Пилсудзкаго посадить Дмовскаго. Когда этот план стал извѣстен пилсудчикам, то они в свою очередь мобилизовали всѣ свои силы, вооружили их и выработали подробный план борьбы с Н.Д-ми и намѣревались вырѣзать всѣх Н.Дков. Для большей планомѣрности Варшава была раздѣлена на участки и в одном из таких участков был комиссаром извѣстный, особенно минским бѣлоруссам пан Воеводзки (в Минскѣ вѣдал политическим отдѣлом дэфензивы по бѣлорусской секціи). Но т.к. Н.Д-ки не рѣшились выполнить свой план, братоубійство не имѣло мѣста. Как только польскія войска отогнали большевиков из под Варшавы и стали постепенно отвоевывать не только польскія но и бѣлорусскія земли. Находящіяся в Варшавѣ в то время бѣлорусскіе дѣятели (полонофилы Ивановскій, Тарашкевич и присные им) подняли в общественных правительственных сферах агитацію в пользу спѣшнаго пересмотра бѣлорусскаго вопроса в смыслѣ признанія и об'явленія независимости Бѣлоруссіи. Часть польскаго общества, особенно католики бѣлорусскаго происхожденія (крупныя землевладѣльцы) в большинствѣ правительственныя сферы и бельведэр во главѣ с Пилсудзким готовы были поддержать наши требованія бѣлоруссов. Весьма сожалели, что Польша своевременно не прокламировала независимости Бѣлоруссіи. Теперь, когда польскія войска продвигаются вперед, надежда на созданіе независимости Бѣлоруссіи снова зарождается. Вопрос уже был налажен. В Варшавѣ было уже сформировано Бѣлорусское Правительство. Были уже сфабрикованы соотвѣтствующіе декреты и дипломатическія ноты. Бѣлорусское Правительство предполагалось скомбинировать так, что-бы премьер и не менѣе половины министров состояло из поляков, тогда, как другую половину составить из представителей бѣлорусской національности, при чем портфель министра иностранных дѣл предоставить бѣлоруссу. С этим проектом докладчики с членами помянутаго министерства во главѣ с Пилсудзким выѣхали в Минск. Но так как польская делегація в Ригѣ была облачена обширными полномочіями и что мірная делегація готова была принять всякія условія міра с большевиками, и далеко не претендовала ждать занятія Минска

польскими войсками — в пути Пилсудзкій измыслил новую комбинацію: «Серединную Литву» (Докладчик Ивановскій сообщая об этой комбинаціи замѣтил: «Пилсудзкій на такіе штуки великій мастер»). При обсужденіи организаціи Правительства Серединной Литвы присутствовал и литовец Акштолайтис[2], который потребовал, что-бы эта власть состояла из трех поляков, трех бѣлоруссов, трех литовцев и одного еврея. Поляки на такую комбинацію не согласились и Акштулайтис прервал переговоры. (При сообщеніи об этом Тарашкевич замѣтил: «Акштулайтис умный и дѣльный человѣк»). Отказался войти в правительство и поляк Гордзялковскій, т.к. он полагал, что это правительство должно состоять на половину из поляков и бѣлоруссов. Наконѣц, составив правительство и приняв необходимыя подготовительныя мѣры, Пилсудзкій отдал приказ генералу Желиговскому напасть на Вильно со своей Литовско-Бѣлорусской дивизіей. Ему в помощь Костялковскій вел отряд состоявшій из служивших в арміи восточных крестьян в количествѣ 1.600 чел. Что-бы никто не подумал, что все это дѣлается по приказу Пилсудзкаго, пришлось инсценировать бунт польскаго войска. Литовско-Бѣлорусская дивизія, ослушавшись польскаго главнаго командованія самовольно отправляется в Вильно «выручать виленщизну из под господства Ковенскаго Литовскаго Правительства, которым сдан этот край большевиками против воли населенія Виленщины и Гродненщины». Таким-же самым путем рѣшено было захватить и Минск, каковая задача была поручена Балаховичу, тогда как Петлюрѣ поручался захват Украины. К этому моменту насчитывалось войск: у Литовско-Бѣлорусской дивизіи около 12.000 солдат, Балаховича 20.000 и Петлюры 25.000. По такому-то Пилсудзким обработанному плану и подняла возстаніе Литовско-Бѣлорусская дивизія. Как вам извѣстно литовцы стали отступать на Виленском фронтѣ повидимому не зная, что поляки не обладают большими силами. Затѣм они взяли Ораны, простояли цѣлый день под Яшунами и вот вчера вечером (т.е. 9/X с.г.) вмѣстѣ с польскими войсками мы пріѣхали в Вильно.

На вопрос, что сдѣлали-бы поляки, если-бы у литовцев было больше войска и они их отогнали-бы назад, г. Ивановскій отвѣтил: «Тогда взбунтовался-бы польскій отряд стоявшій в Маріямпольском направленіи и двинулся-бы вперед».

На вопрос, как они пріѣхали в Вильну, отвѣтил: «Выѣхали из Варшавы недѣлю тому назад. Ѣхали то железной дорогой, то лошадьми. Ѣхали одновременно со всей комиссіей».

Вопрос: Откуда правительство Средней Литвы возьмет деньги?

Отвѣт: Мы с собой привезли цѣлый автомобиль польск. марок.

В дополненіе к докладу Ивановскаго Тарашкевич раз'яснил, что вопрос о судьбѣ бѣлоруссов в составѣ комиссіи правительственной рѣшен так: «Разумеется, прибавил он, скверно, что так происходит, но ничего нельзя подѣлать. Важно то, что в Вильнѣ будет созван Краевой Сейм со всѣй Средней Литвы. Весь народ этого края сможет высказаться и это нас должно болѣе-менѣе удовлетворить».

Послѣ нѣкоторых мѣлких вопросов дополнительных собраніе разошлось в 8 часов вечера.

582.1.45:097&r — мк

---

[1] Пад копіяй ніякіх подпісаў няма, аўтарства дакумэнту і абставіны яго ўзьнікненьня невядомыя. [2] Юргіс Аўкштуолайтіс — літоўскі авантурыст прапольскага кірунку, удзельнік розных змоваў супраць ураду Літвы.

2438. Тэкст прэлімінарнага мірнага дагавору паміж Польшчай і Савецкай Расеяй

582.1.08:043-050 — мк рас
582.1.08:051-060 — мк пол

Пра тэрытарыяльную будучыню Беларусі:

«Ст.1.

Обе договаривающиеся стороны, согласно принципа самоопределения народов, — признают независимость Украины и Белоруссии, а также соглашаются и постановляют, что восточную границу Польши, т.е. границу между Украиной и Белоруссией, с одной стороны, и Польшей, с другой, составляет линия: [...]».

2439. Carte de la nouvelle frontière entre la Pologne et la Russie (l'Oukraïne et la Blanche-Ruthénie) selon l'accord préliminaire de paix de 12.10.1920

1:2,000,000
Lit. A.Schnakenburg, Riga
582.1.08:077

2440. Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 12.10.1920

12/X 20
Париж

Многоуважаемый,
Вацлав Юстынович!

Не написал до сих пор Вам отвѣта вслѣдствіе отсутствія свободнаго времени.

Обстановка с каждым днем все болѣе выясняется. Тѣ мѣропріятія, какія осуществляются на Ваших глазах — слѣдствіе «французской погоды». Уродовыя указанія были даны в мѣста, гдѣ находится пан Дубейковскій[1], и бѣлые орлы подчинились. Подробности сообщу лично. Работа в этом направленіи, работа упорная, настойчивая велась все время послѣ моего пріѣзда. Брошенное К.[2] обвиненіе по адресу друзей[3] я принимаю; в свое время дам на него отвѣт.

Пока предпочитаю дѣйствовать и говорить языком дѣл, а не фразъ, пустых упреков и.т.д. Моя ближайшая задача получить фондъ. Работа идет успѣшно. Как только получу окончательное увѣдомленіе прошу командировать Базыля за полученіем и за подробной информаціей.

Прошу Вас не забывать, что если одному человѣку нельзя существовать без средств, то тѣм болѣе невозможно государству. Нуждаясь в средствах нужно опираться на сильнаго в этом отношеніи. Я был и оста-

нусь вѣрным своим прежним друзьям, если бы даже пришлось погибнуть изъ-за этой вѣрности. Сумой переметной я не стану; сумѣ переметной, как говорит пословица, грош — цѣна. Тяжесть положенія мнѣ понятна, но упреки, жалобы, намеки и угрозы обратиться к другим мнѣ непонятны, и я их вряд ли пойму!

Могу сказать лишь одно: пусть ждут иной погоды, пусть ищут других друзей, я буду дѣлать свое дѣло не за страх и личныя выгоды, личное благополучіе, а за совѣсть, ибо не за страх, а за совѣсть я начал политическую работу въ 1903 году, при жестоком царском режимѣ, будучи в то время молодым офицером.

О своих дѣлах я дам отвѣт публичный, гласный!

Документ, вызвавшій с вашей стороны рѣзкій запрос был мною составлен, прочитан, но никому не представлен. Сдѣлать было нужно чтобы отвѣтить на вопрос: Как согласовать акт 17-31 Декабря с дальнейшими? Усходники и два заходника представили массу документов; одни — (усходники) ссылаясь на акт 31 Дек., говорят, что они законнѣйшіе наслѣдники[4], и потому всѣ остальные никаких прав не имѣют; бѣлые орлы и Л<итовцы> говорят: «Прочтите и убѣдитесь Какая власть 31/XII 17г признана?!» Вот в этой обстановкѣ подвохов, клеветы, лжи, при отсутствіи многих необходимых для работы данных, окруженный со всѣх сторон врагами, без моральной поддержки Центра, пришлось и приходится вести работу чрезвычайно сложную и отвѣтственную. Прошу не считать этого ни упреком, ни сѣтованіем, а простым констатированіем факта.

Нѣсколько дней тому назад мнѣ предъявили копію документа о Вил. и Грод., подписанною Вами и спросили, что это значит?! Прошу Вас объяснить, как можно (я пойму).

Со всѣх сторон шиповник! И в это время Ж<ео> не пользуется отпуском, не отдыхает а ведет интенсивную работу, усложнившуюся вслѣдствіе смѣны лицъ[5], Вы понимаете каких!?

Полагаю, что Вам понятно, что частные финансовые группы не рискуют итти в дѣло, видя и слыша только отрицательное. Белые Орлы и Л<итовцы>, в банках, в Прав. мѣстах и учрежденіях распространяли и распространяют , что имущество принадлежит им, признанным де всѣми, а вот тѣ, они просто мелкіе полит. спекулянты! Спросите у них, в каком положеніи находится их государство? Гдѣ тѣ силы, котоыя их защищают? В чем выражается связь с населеніем? Почему не пріѣхали кооператоры? И отвечают: потому что их никто не знает и не признает. Требуются доказательства от противнаго. Гдѣ они?

Уступая нажиму отсюда в Варшаву, бѣлые орлы признали принцип, но отказались признать существующее нынѣ реальное его воплощеніе. Ж. и его друзья работают теперь над этим вопросом. Видя эту работу, видя честное, благородное отношеніе к данным обещаніям, мнѣ становится больно и стыдно за письмо К. Впрочем объ этом не стоит; пусть дѣлает так, как ему подсказывает совѣсть! Прошу, пусть ничего объ этом мнѣ не пишет.

Итак, Многоуважаемый Вацлав Юстынович, я ничего не нарушил и никаких мѣр не требуется. Если работа моя не соотвѣтствует видам, прошу сообщить: я немедленно приготовлю все для передачи лицу болѣе соотвѣт-

ствующему. Я буду рад, что наконец смогу поѣхать искать семью, которая живет 2 года без всяких средств и без всякой помощи с моей стороны. Къ этому несчастью присоединилось новое: жена заболѣла артритом в лѣвой ногѣ и на нѣсколько мѣсяцев прикована к постели. Въ январѣ я хотѣл уѣхать, но задержал меня Луцкевич: просил ждать его пріѣзда. Подчинился долгу и необходимости. Все возможное сдѣлаю независимо от личнаго положенія, а за освобожденія от лежащих обязанностей буду признателен.

Прошу Вас озаботиться составленіем подробнаго Государственнаго бюджета. Смѣта доходов на основ количества земельных угодій (налог на них). Промысловый налог и пр.

Возьмите образец у Правит. Латышской республики или Госуд. росписи прежней Россійск. Имперіи. Составьте роспись приблизительно. Воспользуйтесь статистическими матерьялами (отчеты Губернаторов, Земских собраній, городов). Если мы желаем существовать необходимо представить доказательства, что мы знаем на что мы будем существовать и что нам нужно. Этот документ, а в крайнем случаѣ матерьялы, прошу прислать паном Базылем. Я его вызову (приглашу) телеграммой. Как только рѣшится окончательно вопрос о позыкѣ. Привѣт всѣм нашим.

Пользуюсь случаем засвидѣтельствовать Вам свое почтеніе.

Цѣлую ручку Вашей Уваж. супругѣ.

Ув. Вас Еуген.

Аусянік был необходим для доклада Ф. о войсковой Комиссіи.

Хотѣл послать почтой. Узнал, что ѣдет француз из Риги; просил передать Вам письмо. Совѣтую познакомиться с ним; он связан со здѣшними правящими кругами.

Пріѣзд Мамонько, как кооператора был и сейчас нужен. Однако письмо К. вынуждает меня воздержаться. Вопрос о позыкѣ в различных фин. группах рѣшен в положит. смыслѣ. Жду общаго собранія. Когда получу письменное постановленіе телеграфирую Вам. Василію Иван. нужно будет пріѣхать сюда. Мое присутствіе тут абсолютно необходимо. На бѣлых орл. смотрят, как на провокаторов. Мнѣ обѣщали, что ни вершка земли они не получат.

582.1.45:070&r

[1] У Варшаву. [2] К. (тут і далей у лісьце) — магчыма, К.Езавітаў. [3] Французаў. [4] Маецца на ўвазе рэзалюцыя Ўсебеларускага Зьезду аб аўтаноміі Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расейскай рэспублікі. [5] Маецца на ўвазе зьмена ўраду ў Францыі 24.09.1920.

2441. Тэлеграма Аўгена Ладнова (Парыж) Кастусю Езавітаву (Рыга) за 12.10.1920

yezzvitoff 20

nikolaevskaya riga

paris rf8/13 31w 12/10 18 30

pozgdravliayu novorojdennym[1] stop peregovory pozyki podhodiat uspechno kontsu stop prochu bazylia gotovitslia priehat za fondom pervomu vysovu

sostavtie nemedlenno podrobny gosudarstvenny budjet prichlitie bazilem otchen vajno

ladnoff

582.2.54:438 — а

[1] Што мае на ўвазе Ладноў — невядома. Ці не падпісаньне прэлімінарнага міру?

2442. Дэклярацыя ў справе падпісаньня прэлімінарнага міру, адрасаваная старшыні мірнай канфэрэнцыі ў Рызе

582.1.08:061&r-063 — р

Дата невядомая. Почырк Езавітава.

2443. Заява сакратара Рады БНР Язэпа Мамонькі (Рыга) старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 13.10.1920 аб тым, што папера №235 за 1.06.1920 з прапановай Кляўдыюшу Душэўскаму зьявіцца да месца знаходжаньня Ўраду БНР перададзена ім К.Душэўскаму ў Вільні у ліпені 1920

582.2.54:415 — мк

2444. Ліст Васіля Захаркі (Рыга) Аўгену Ладнову (Парыж) за 14.10.1920

Ладнову в Париж

14 X 20 г.

Дорогой Евгеній Михайлович!

Вчера получили Вашу телеграмму о моем приготовленіи в Париж.

Всѣ с большим интересом приняли ее, но желанной радости не высказали, из за боязни разочерованія. Я не хочу этим сказать, что мы всѣ во всем стали абсолютными пессимистами. Нѣт, мы вѣрим в успѣх нашего святого дѣла но только жизнь сдѣлала нас болѣе осторожными.

Как бы то там ни было, но мы от души желаем Вам успѣха. Были бы рады и счастливый поздравить Вас с каждым успѣхом в добрых дѣлах, чего мы уже давно ожидаем с нетерпеніем.

Как извѣстно, неудовлетворенныя ожиданія нервируют публику и вызывают апозицію, по этому Вы не должны удивляться существующему безпокойству по отношенію к Вам и нашим друзьям.

Зная всѣ обстоятельства, я нахожу это безпокойство вполнѣ естественным. Для того же чтобы оно прошло, я просилбы Вас принять всѣ мѣры к проявленію всѣх бѣлорусских негативов. Это необходимо сдѣлать как можно скорѣе ибо как Вам извѣстно после майскаго Вашего доклада нѣкоторые нашые планы были измѣнены, а некоторые и вовсе отмѣнены. Одобрив Ваши предположенія, благородство заставляло нас итти по одному — условленному пути, ход котораго к сожаленію остостается закрытым до сих пор.

Тѣ или иные предложенія у нас имѣются, дѣлались и дѣлаются нам и в настоящее время, но так как они, не смотря на их выгоду или невыгоду исходят отчасти с противоположной, а отчасти с конкурирующей стороны, то нами до сих пор приняты не были. Время, в особенности в нынѣшнее лихолѣтіе не терпит, не можем дальше терпѣть и мы, в особенности

в тот момент, когда дѣлят и рѣжут на куски нашую многострадальную Бацькаушчыну. Вы это увидите из Русско-Польскаго договора. Независимость Бѣлоруссіи (по договору совѣтской) признана как Россіей так и Польшей, но от нея поляки оторвали двѣ слишком губерніи.

Іоффе заявил что совѣт. Россійское правительство готово признать буржуазное Бѣлорусское правительство — Ластовскаго, но поляки зная что мы такого куска своей территоріи не уступим им воспротивились этому признанію и признали совѣтское правительство.

Вот Вам и поляки.

В результатѣ раздѣл Бѣлоруссіи, а за ним неизбѣжныя возстанія и кровавая борьба, ибо как бѣлорусскій так и украинскій народы полонизаціи не потерпят.

Кому такая борьба на руку говорить не приходится, по этому то хорошо все это учитывая большевики легко отдали бы безмозглым полякам даже большее пространство чужих земель, оставаясь при этом при том мнѣніи, что чужих земель полякам не удержать.

Наши друзья, как Вы говорите хочут имѣть нашія симпатіи, но в таком случаѣ гдѣ же их симпатіи и защита, хотябы тогда, кода они являются здѣсь всѣсильными совѣтниками и руководителями.

Протест против пахабнаго Русско-Польскаго мирнаго договора мы готовим, кажется мирной Конференціи в Парижѣ и Лиги Націй.

Балтійскія Державы хорошо понявшій имперелистическія замыслы Польши стали на нашую сторону. Даже Литва, наученная горьким опытом, пришла наконец к тому убѣжденію, что ей нужно итти вмѣстѣ с нами, теперь она первая заговорила, правда пока частным порядком, и о признаніи и о федераціи с нами.

Работать здѣсь, в особенности в настоящее время, можно и должно широко, да на жаль развернуться нѣт на что.

Восточною Европою, в том числѣ и нами, чрезвычайно заинтересовались всѣ, от корреспондентов нѣт отбоя.

Нашая Найвышейшая Рада как и Петлюра окончательно спровацирована, обманута и продана поляками.

Рак-Михайловскій и Терешченко прислали свае полномочія Власту.

Наднях пріѣзжает сюда Дубейковскій и тогда будем имѣть полныя варшавскія информаціи.

Хочется поговорить еще с Вами но кажется я и так изрядно надоѣл Вам поэтому умолкаю.

Прошу передать мой нижайшій поклон колонелю Мож и Павлу Ѳедоровичу[1].

По обстоятельствам времени и во избѣжаніе задержки нашей работы, прошу Вас ни с чѣм хорошим или плохим не медлить, а тотчас телеграфировать. Кстати Власт немного недоволен тѣм, что Вы офиціалныя депеши посылаете не на его имя.

Ваш В.Захарко

582.2.54:432&r-435&r — рк

[1] Вэнту.

2445. Тэлеграма Лявона Дубейкоўскага (Варшава) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 14.10.1920

= LITOWSKIJ MISIJA BILORUSKA
RIGA NIKOLAEWSKAJA 20 =
FR VARSOVIE 1307 12 14Г10 18

=JAK TOLKU ZDZBUDU HROSY PRIJEDU = DUBIEIOWSKI "

582.2.54:437 — а

2446. Беларускае Прэс-Бюро ў Рызе. 15.10.1920

Поляки проговариваются! — Почему поляки рвутся на востокъ. — Комиссія Лиги Народовъ убѣдилась и возмутилась. — Представители «Кресовъ Всходнихъ и Инфлянтъ. — Кто такіе Желиговскій, Абрамовичъ и Ко. — Новое «Правительство» уже подготовлено для Минска. — Польскіе соціалисты молчатъ.

582.2.54:470-471 — шк

2447. Тэлеграма [Кляўдыюша Душэўскага?] (Коўна) Уладзімеру Пігулеўскаму й Станіславе Корф (Рыга) за 16.10.1920

riga totleben 7 pigulewski korf
kowno 01227 11 16 15 7 =

= otec podoslan wijeschaju wilkomirskim = klaudus kado .+

582.2.54:436 — а

2448. Ліст Шарля Можа (Парыж) Кастусю Езавітаву (Рыга) за 17.10.1920

582.2.54:421&r — мк перакладу на расейскую мову

Аб прызнаньні незалежнасьці Беларусі ў самым хуткім часе.

2449. Суправаджальная запіска шэфа Вайскова-Дыпляматычнай Місіі БНР у Латвіі й Эстоніі палкоўніка Кастуся Езавітава за 18.10.1920 (вых. №825) да агляду дацкай прэсы

582.1.08:038

2450. Рапарт кіраўніка Канцылярыі Рады Народных Міністраў Аляксандра Вальковіча старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 18.10.1920 (вых. №452)

Канцэлярыя
Рады Народных Міністроу
18 Кастрычніка 1920 г.
№452

Грам. Старшыне Рады Народных Міністроў

Рапарт.

Згодна Вашай рэзалюцыі на запросе Сэкрэтара Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 7-га верасня 1920 г. за №202/84, прэдстауляя пры гэтым праізведенае мною дазнаніе, маю гонар далажыць Вам што па маему па-

гляду такі дакумэнт не павінен мець мейсцо у Дзержауныхъ Архівах, як компрометуючы нашу працу.-

А.Вальковіч
Кіраўнік Канцэлярыі.
582.2.54:431 — ма

2451. Рэзалюцыя інтэрнаваных беларусаў лягеру Ліхтэнгорст у Нямеччыне за 19.10.1920

582.1.45:092 — мк
582.1.52:001 — мк
582.1.52:002 — мк
582.2.54:423 — мк

З падтрымкай Ураду БНР. Старшыня сходу — «врачъ Ив. Цвикевичъ».

2452. Ліст Івана Цьвікевіча (Ліхтэнгорст) Дыпляматычнай Місіі БНР у Бэрліне за 19.10.1920

582.2.54:424 — мк

Аб сходзе беларусаў, інтэрнаваных у лягеры Ліхтэнгорст і аб прынятай сходам рэзалюцыі.

2453. Нота Рады БНР і Ураду БНР да Ўраду Латвійскай Рэспублікі за 2?.10.1920 (вых. №???) з прапановай прызнаць незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі

582.2.54:481-482 — мк

Дакладная дата невядомая.

2454. Машынапіс працы Клаўдзія Душэўскага «Беларусь і польска-рускі прэлімінарны мір» (Вытрымкі з дакладу, прачытанага аўтарам на Беларускай канфэрэнцыи 20.10.1920 ў Рызе)

582.1.11:001-012 — мк
582.1.08:064-076 — мк перакладу на расейскую мову
582.1.11:013-030 — мк пер.
582.2.51:147-151 — мк пер.

Зьмест беларускага тэксту (ст. 11-21):
— [Беларусь і Савецкая Расея] (582.1.11:002);
— Аб плебісцыце на Беларусі (582.1.11:005-010);
— Магчымыя вынікі Рыжскага міру (582.1.11:011-012);
Зьмест расейскага тэксту:
—Русско-польскій прелиминарный миръ и Бѣлоруссія (582.1.11:014-017);
—Причины стремленія Польши захватить Бѣлоруссію (582.1.11:017);
—Бѣлоруссія и Совѣтская Россія (582.1.11:017-018);
—О плебисцитѣ въ Бѣлоруссіи (582.1.08:065-067; 582.1.11:019-021);
—Возможныя послѣдствія прелиминарнаго мира (582.1.08:068; 582.1.11:022; 582.2.51:148);
—Какъ реагировала Бѣлоруссія на польско-русско-украинскія мирныя переговоры (582.1.08:069-076; 582.1.11:023-030).

2455. Рэзалюцыя, прынятая на Беларускай нацыянальна-палітычнай канфэрэнцыі 20.10.1920 у Рызе ў справе падпісаньня прэлімінарнага міру паміж РСФСР і Польшчаю 12.10.1920 у Рызе

РЭЗАЛЮЦЫЯ,
прынятая на Беларускай нацыянальна-палітычнай Конфэрэнцыі
20.X.1920.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Конфэрэнцыя, разгледзіушы і абсудзіушы умову аб прэлімінарным міру паміж Р.С.Ф.С.Р. і Польшчай, падпісаную 12-га кастрычніка 1920 г. у г. Рыга, —

канстатуе, што

1.- Р.С.Ф.С.Р. і Польшча, немаючыя супольных граніц і безжаласна руйнуючыя да гэтай пары Беларусь, ваюючы на яе тэрыторыі, у сучасны момэнт знайшлі магчымым рашыць долю Беларускага Народа і распараджацца яго зямлей без учасьця яго прадстаунікоу і ігнаруючы справядлівымі дамаганьнямі Беларускага Народу і яго законнага Урада, не дапусьцілі, не гледзячы на сваечасныя трэбаваньні да учасьця у перагаворах яго правамочнай дэлегацыі.

2.- Польшча і Р.С.Ф.С.Р. не гледзячы на энэргічныя пратэсты Дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі 12-га кастрычніка 1920 году падпісалі умову аб прэлімінарным (часовым) міру, згодна якой:

а) з мэтай ашукаць Беларускі Народ і яго кіраунікоу прызнаюць незалежнасьць Беларусі, але у той самы час моучкі абходзяць пытаньне аб прызнаньні яго Ураду як у сучасны момэнт так і у будучыне, гэта значэ пакідаюць за сабой поуную свабоду чыну у адносінах да Беларусі.

б) Неупынна праводзячы у жыцьце сваю імпэрыялістычную палітыку, раздзялілі па узаемнаму згавору Беларусь на дзьве часьці, аддаушы самыя культурныя землі Віленскай, Горадзенскай і Мінскай губ. с польскім элемэнтам ад 0,2% да 8% (згодна польскай статыстыцэ) у безкантрольнае уладаньне Польшчы і аб'явіушы у прынцыпе другую часьць незалежнай, перадалі яе фактычна у распараджэньне Р.С.Ф.С.Р. і паставілі у поуную ад яе залежнасьць.

3.- Не гледзячы на страшныя высілкі Польшчы і Р.С.Ф.С.Р. задушыць Беларускае нацыянальнае адраджэньне і паралізаваць барадзьбу Беларускага Народа за незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі, не гледзячы на штучнае ізаляваньне ад Беларускага Народа яго нацыянальных дзеячоу і перапоуненьне імі Польскіх і Расейскіх турм, не гледзячы, урэшці, на безжаластныя расправы з некаторымі з іх — імкненьне Беларускага Народа да незалежнага нацыянальна-дзержаунага істнаваньня, не толькі не аслабелі, але наадварот акрэплі настолькі што спужалі і змусілі лічыцца з сабой прыгнетчыкау Беларускага Народа і вырвалі у іх прызнаньне незалежнасьці Беларусі.

Прымаючы усе вышэйсказанае пад увагу, Беларуская нацыянальна-палітычная конфэрэнцыя пастанавіла:

1. Умову аб прэлімінарным міру паміж Р.С.Ф.С.Р. і Польшчай, падпісаным 12 кастрычніка 1920 г., каторая можэ легчы у аснову сталага міру — лічыць для Беларускага Народу неабавязковай.

2. Усімі спосабамі і сродкамі вясьці барадзьбу і далей за незалежнасьць і непадзельнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі з усімі яе ворагамі.

3. Патрэбаваць абавязковага учасьця Дэлегацыі Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі у дальнейшых перагаворах аб міру паміж Р.С.Ф.С.Р. і Польшчай.

4. Прызнаць дзеяльнасьць Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі і крокі, каторыя ен рабіу для абароны незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі правільнымі, канешнымі і згоднымі з волей усяго Беларускага Народа.

Старшыня К.Душэускі
Віцэ-Старшыня Галавінскі
Сэкрэтар Пігулеускі
582.1.06:024 — шк бел
582.1.06:068 — шк бел
582.1.07:080 — шк бел
582.2.50:031 — мк рас
582.2.51:036 — шк фра
582.2.51:099 — шк фра
582.2.51:135 — шк бел
582.2.53:060 — шк фра
582.2.53:164 — шк фра

2456. Рэзалюцыя, прынятая на Канфэрэнцыі Беларускіх Сацыялістычных Партый 21.10.1920 у Рызе ў справе падпісаньня прэлімінарнага міру паміж РСФСР і Польшчаю 12.10.1920 у Рызе

РЭЗАЛЮЦЫЯ
прынятая на Канфэрэнцыі Беларускіх Соцыялістычных Партый
21-га кастрычніка 1920 г.

1.- Польшча і Расея, не маючы супольных граніц, вялі у працягу апошняга году руйнуючую вайну на беларускай тэрыторыі і без учасьця прэдстаунікоу Беларускага Народу, 12-га кастрычніка 1920 году, падпісалі у м. Рызе умову аб прэлімінарным міры, паводле каторай, распаложэная паміж Польшчай і Расеяй Беларусь дзеліцца на дзьве часьці.

2.- У абоймы польскага імпэрыалізму і шавінізму кінута трэцяя часьць беларускай тэрыторыі з насяленьнем у 4 1/2 мільеноу жыхароу, паміж каторага палякі становяць ня больш як ад 2% — 8%. Польшча на гэтыя зямлі, справечна беларускіе, не мае ні гістарычнага ні этнаграфічнага права.

Савецкай Расеі кінута 180.000 кв. кілом. беларускай тэрыторыі з насяленьнем у 8 мільенау жыхароу. Незалежнасьць Савецкай Беларусі гэта толькі фікцыя прыкрываючая паняволеньне беларускага народу расейскім цэнтралізмам.

3.- Мір гэты патаптау сьвятое права народау на самаадзначэньне.

4.- Мір гэты разрывае жывое цела беларускага народу і не дае яму так горача жданых варункау спакойнай творчай працы.

5.- Мір гэты кідае беларускі народ на шлях самай упорнай барацьбы, на шлях новай вайны за незалежнасьць і непадзельнасьць сваей Бацькаушчыны.

Мы — Беларускіе Соцыялістычные Партыі: Соцыялісты-Рэволюцыянэры, Соцыялісты-Дэмакраты, Соцыялісты-Фэдэралісты, не гледзя на разбежнасьць нашых соцыальных і палітычных поглядаў, саусім аб'яднаны агарнуушым нас пачуцьцем пратэсту з нагоды гэтага ганебнага Польска-Расейска-Украінскага міру.

Вымагаем:

1.- Перэгляду прэлімінарнага міру і устанауленьня дзяржауных расейска-беларускіх і беларуска-польскіх граніц па этнаграфічнаму прынцыпу.

2.- Дапушчэньня як раунапраунай стараны на мірные расейска-польскіе перэгаворы Дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі, як ядынага правамоцнага прэдстауніцтва беларускага народу.

3.- Ачышчэньня этнаграфічнай беларускай тэрыторыі ад акупантскіх, як польскіх так і расейскіх, войск.

4.- Ня умешываньня ні Расеі ні Польшчы ва унутраные беларускіе справы.

Мы — Беларускіе Соцыялістычные Партыі, клічэм да соцыялістоу Польшчы і Расеі падтрымаць нас у нашых справядлівых дамаганьнях і усей сілай сваей павагі уплынуць на свае Урады, каб не уцягаць працоуные масы Польшчы і Расеі у новыя вайны за беларускую тэрыторыю, каторые неунікнены калі мір будзе падпісан на варунках прелімінарнай угоды.

Мы клічэм да вас, соцыялісты усяго сьвету, ва імя клясавай салідарнасьці, ва імя людзкіх правоу беларускага працоунага народу, ва імя Міру, справядлівасьці і свабоды, падтрымаць усей сваей павагай і уплывамі жыцьцевые вымаганьня беларускага працоунага народу і гэтакім чынам памагчы нам спыніць бакханалію імпэрыялізму і цэнтралізму нашых суседзей.

Мы — Беларускіе Соцыялістычные Партыі, перад усім сьветам заяуляем, што будзем да канца змагацца за правы Беларускага працоунага народу як і за правы працоуных масс усяго сьвета.

Калі Польска-Расейска-Украінскі мір будзе заключаны на асновах прэлімінарнай умовы, мы — Беларускіе Соцыялістычные Партыі не прызнаем яго і будзем змагацца з усімі узурпатарамі правоу Беларускага Народу.

Партыя Соцыялістоу-Рэволюцыянэрау.
Партыя Соцыялістоу-Дэмократау.
Партыя Соцыялістоу-Фэдэралістау.

З арыгіналам згодна:
Кіраунік Канцэлярыі Рады Міністрау Ю.Гладкі-Ластоўскі.
582.1.06:025 — шк бел
582.1.06:069 — шк бел
582.1.07:081 — шк бел
582.1.11:061 — шк бел
582.2.51:034 — шк фра
582.2.51:097 — шк фра
582.2.51:137 — шк бел
582.2.53:058 — шк фра

2457. Дэкларацыя Найвышэйшае Рады Беларускай Народнай Рэспублікі за 21.10.1920

DEKLARACJA.

Wojna wszechświatowa, wbrew tendencjom jej inicjatorów, wbrew woli jej działaczy, wbrew oficjalnym traktatom, wysunęła na plan czołowy wyzwolenie narodów, jęczących pod jarzmem narodowościowego ucisku.

Powstał cały szereg nowych państw, budujących swe życie na zasadach narodowych. Do największych z nich należy Państwo Polskie, uznane i przyznane, gwiazda pierwszorzędnej wielkości w Konstelacji europejskiej. Ostatnim aktem zmagania się o wyzwolenie tego państwa była krwawa i ofiarna walka z najazdem imperjalistycznym moskiewskim.

Preliminarja pokojowe spisane. Pokój ma ująć w normy prawne likwidacje tej walki pomiędzy Państwem Polskim, a Rosyjską i Ukraińską sowieckiemi Republikami.

Nie uznanie jednak suwerenności stron walczących jest główną tezą pokojową, bo wyniki walki usunęły co do tego wszelkie wątpliwości. Kamieniem węgielnym preliminarza, zawartym w czołowym punkcie, jest sprawa Białorusi, sprawa uznania samostanowienia jej o swym losie. Obłudnie przez bolszewików wysunięta kwestja uznania sowieckiej Białorusi zostaje dyplomatycznie przez stronę przeciwną sprowadzona do porozumienia się i w tym sensie jest to pokój «porozumienia». Strony «porozumiały się» co do «wpływów» każdej z nich na Białoruś. Porozumienie występuje na starych wypraktykowanych przez Katarzynę II, Frydryka Wielkiego, zasadach podziału krajów słabszych sąsiadów na «sfery wpływów», nie pytając o wolę zainteresowanego. Strony dzielące targują się, nareszcie dobijają targu o granice «wpływów» (Dzisna, Kajdanów, Nieśwież, Łań).

Przeciw temu podziałowi żywego ciała Białorusi zakłada naród białoruski stanowczy protest. Polskie społeczeństwo, przed dwoma zaledwie laty zjednoczone, winno zrozumieć, jaką krzywdę wyrządza narodowi Białoruskiemu takie rozerwanie na części i nie powinno na się przyjmować roli rozbiorcy Białorusi.

Kawał Białorusi na zachód od tej granicy zostaje zagarnięty przez Polskę, oddaje się go pod zarząd całkowicie niekompetentnych w życiu lokalnem, niepowołanych do tego ministerstw Państwa Polskiego, obsadza się go, tereny o ludności białoruskiej z mniejszościami polską a żydowską, wyłącznie przez urzędników polaków. Z tym lud białoruski nigdy się nie zgodzi. Odrębność bytu, kultury, mowy, obyczajów, deptanych przez posiadających władzę poplecznikow klas zamożnych, stworzy irrydentę żywiołową.

Na wschód od tej granicy tworzy się jakaś «Białoruś», Białoruś teoretyczna, uznawana tylko zasadniczo, bez granic wschodnich, bez prawa własnej suwerenności, rozpatrywana, jako część integralna Rosyjskiej Socjalistycznej Federacyjnej Sowieckiej Republiki, Białoruś o ustroju, jakim ją raczą obdarzyć samodzierżce moskiewscy. I przeciw temu oddaniu lwiej części Białorusi na łup moskewski protestuje naród Białoruski, który z Moskwą od wieków krwawą prowadzi walkę o swój żywot.

Warunki preliminarzy pokojowych są przeto całkowicie aneksjonistyczne i pokój na nich osnuty innych cech nie nabierze. Jedynie uwzględnienie potrzeb

i żądań Białorusi może go zmienić na pokój sprawiedliwy i trwały. A wola ludów Białorusi została jasno i niedwuznacznie wypowiedziana wówczas jeszcze, gdy żaden z już obecnie wolnych narodów dawnej Rossji jeszcze się nie wypowiedział. Cały szereg zjazdów białoruskich zakończony w ogólno-białoruskim Kongresem w grudniu 1917 roku wypowiedział się jednoznacznie za Niepodległość i Niepodzelność Białorusi,

I tą wolę musi Naród Polski uszanować!

Niech żyje Wolna, Niepodległa, Niepodzielna Białoruś!

Niech żyje Ludowa Białoruska Rzeczpospolita, zbudowana wspólnym wysiłkiem wszystkich krajowych sił twórczych!

Pełnomocnik Najwyższej Rady Białoruskiej Republiki Ludowej, Prezes Białoruskiego Komitetu w Warszawie[1]

Delegat Najwyższej Rady Białoruskiej Republiki Ludowej, Członek Białoruskiego Komitetu w Mińsku[2]

21 października 1920 roku
Warszawa.
582.2.31:063 — мк

[1] Л.Дубейкоўскі. [2] Б.Тарашкевіч.

2458. Пратэст Найвышэйшае Рады Беларускай Народнай Рэспублікі за 21.10.1920

Rada Najwyższa Białoruskiej Republiki Ludowej niniejszym zakłada stanowczy protest w imieniu całego Narodu Białoruskiego przeciw warunkom pokojowym, podpisanym 12-X r.b. w Rydze, a przedewszystkiem przeciw podziałowi Ziem Białoruskich pomiędzy Polską a Rosją.

Zywy organizm całkowity, jakim przedstawia się Białoruś, dzielą we[...] uznania i w imię swych osobistych interesów mocarni sąsiedzi Białorusi [...]jąc o niedalekiej przeszłości, kiedy to sami byli rozczłonkowani, albo [...]stali przez historję ukarani za podział innych narodów. Ci sami, co na [...] głosili prawo samostanowienia narodów, ci, co szczycą się swą demokratyc[znością,] odrzucili w stosunku do Białorusi zasadę samookreślenia i wyrzekli się [demokra]tycznych dróg rozwiązania tej sprawy. Wbrew swym wystawionym wszędzie zas[adom lu]dzie co ryski podpisali traktat, uznali za dogodniejsze podzielić pomiędzy przedstawionymi przez nich państwami Ziem Białoruskich, nie pytając o zgodę Narodu Białoruskiego, zamieszkującego od wieków tą ziemię-ziemię, którą on bronił przez cały ciąg swej historji, i będzie bronić nadal od chciwych rąk obcych.

Aby uspokoić sumienie społeczne świata, stwarzają oni fikcyjną «Sowiecką Białoruś» i na papierze nadają jej fikcyjną niepodległość, obracając w rzeczywistości centralną Białoruś w zwyczajną prowincję Moskiewską.

W pełni świadomości i głębokiego przekonania, że haniebny akt, podpisany w Rydze, stwarza nieskończoną ilość pretekstów do nowych wojen, jakowe będą wstrząsać światem całym, że dzieje się przed obliczem świata najokropniejsza krzywda i niesprawiedliwość Narodu Białoruskiemu, że stwarzają się warunki, by zdławić odrodzenie narodowe Narodu Białoruskiego, my w imieniu

tego narodu żądamy od Polski i Rossji rzeczywistego przyznania niepodległości Białoruskiej Republiki Ludowej i usunięcia po za granice etnograficzne Białorusi jak polskich, tak i rosyjskich wojsk, aby na oczyszczonym od obcej okupacji terytorjum mógł zostać zwołany przez Rząd Białoruskiej Republiki Ludowej jej prawowity suwerenny Sejm Ustawodawczy.

Z tym samym żądaniem zwracamy się i do międzynarodowych organizacji, jakowe od chwili swego powstania ponoszą odpowiedzialność za krzywdy, wyrządzone ludom bezbronnym przez ich mocarnych sąsiadów. Jeżeli nie chcą one swego obecnego milczenia opłacić z czasem rzekami krwi ludskiej i wielemiljardowymi wydatkami na wojnę, muszą poprzeć nasz protest i wcielić w życie nasze żądania.

Wreszcie zwracamy się do narodów świata całego wyzwolonych i życiem wolnych żyjących i tych, co jęczą jeszcze w obcej niewoli. Niech przypomną pierwsi swą walkę o niepodległość i niepodzielność i zrozumieją naze żądania i niech wiedzą drudzy, że wyzwolenie Białorusi jest podstawą zgody wszechświatowej i zwycięztwem tej sprawiedliwości, o którą oni walczą. Niech więc swym głosem, swym wpływem moralnym pomogą nam do zrzucenia jarzma obcego, do starcia hańby niewoli z oblicza ziemi ojczystej.

I niech wiedzą wszyscy, że dotąd nie ucichnie ostra walka na Ziemiach Białoruskich, dotąd nie zazna Wschód Europy pokoju i spokoju, dokąd nie zostaną spełnione sprawiedliwe żądania wszystkich jego ludów, a w ich liczbie i Białoruskiego.

Rozszarpana na części, za życia pogrzebana Białoruś żyje i żyć będzie i walczyć będzie, aż nim nie wyjdzie z tego grobu, dokąd ją zepchnąć chcieli twórcy pokoju ryskiego.

Rada Najwyższa Białoruskiej Republiki Ludowej

Delegaci Rady Najwyższej B.R.L.

Warszawa października 1920 roku.

582.2.31:064 — мк

2459. Рапарт шэфа Вайскова-Дыпляматычнай Місіі Беларускай Народнай Рэспублікі ў Рызе Кастуся Езавітава (Рыга) старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 21.10.1920 (вых. №833)

21 Кастрычніка 1920 г.

№833

Грамадзяніну Старшыне Рады Народных Міністроў.

Рапарт.

Пры гэтым маю гонар перэслаць да Вашага ведама паперу генерала Булак-Балаховіча ад 14.XI.19 г. за №734, аб яго пажаданьні перайсьці на беларускую службу.

У свой час, аб заяве генерала Балаховіча, я паведаміў урад гр. Луцкевіча, які адказаў, што пратакольнай пастановай Рады Міністроў ад 22 студня 1920 г., генерал Балаховіч са сваім войскам прыняты у склад Беларускай армії.

Спраўка: Папера Старшыні Рады Н. Міністроў гр. Луцкевіча ад 26.1.20 г., №31.

К.Езавітоў
Палкоўнік, Шэф Місыі.

Сэкрэтар ЯЧэрэпук
582.2.54:420 — ра

На рапарце заключэньне дзяржаўнага кантралёра:
«17 ліст. 1919 г.
№19

Заключэньне

Нічога німаючы проці ассыгновак на беларускія нацыянальныя атрады, лічу аднак абавязкова патрэбным назначэньне пры такіх атрадах спэцыальнаго урадоўца Дзержаўнаго Кантролю дзеля ніадкладнай фактычнай праверкі і кантролю выдаткаў.

Дзержаўны Кантралёр ЛЗаяц».

2460. Пратакол супольнага сходу Рады Народных Міністраў і Прэзыдыюму Рады БНР, які адбыўся ў Рызе 22.10.1920

Пратакол
супольнаго Сходу Пр. Рады Б.Н.Р. і Рады Міністроў

Былі прысут...

22.X.20

Слухалі:	Пастанавілі:
1, Даклад Мін. Справядлівасьці Гр. Цвікевіча аб візыце его да Мін. Міжн. Спраў, аб прыхільным спатканьні его, аб тым што ен закрануў справу дальнейшаго часоваго прэбываньня Ст. Рады Нар. Мін. ў Латвіі, але не атрымаў на гэта адмовы, і аб тым, што ў Латвійскаго Ураду зноў атрымана 25.000 латвійскіх рублеў — на тых жа варунках, што і раней.	1, Прыняць да ведама. Атрыманыя ад Латвійскаго Ураду грошы здаць у Дзержаўны Скарб.
2, Даклад Мін. Справядлівасьці Гр. Цвікевіча аб візыце да нямецкаго Прэдстаўніка з якім ён меў доўгую інформацыйную гутарку.	2, Прыняць да ведама.
3, Даклад Старшыні Прэзыдыуму аб патрэбе паездкі его у Бэрлін.	

582.2.54:416 — р К.Езавітава

2461. Ліст Ураду БНР (Рыга) дыктатару Усходне-Галіцкай Рэспублікі Яўгену Петрушэвічу за 22.10.1920 (вых. №460)
Кастрычніка 1920

Яго Дастойнасьці
Пану Дыктатару
Усходне-Галіцкай Рэспублікі
Петрушэвічу

Высокапаважаны Пане Дыктатару,

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае гонар зьвярнуцца да Вас і у Вашай асобе да Ураду Усходне-Галіцкай Рэспублікі з уважлівай прозьбай аб дапамозе у гэты крытычны для нас момэнт.

Мы, Беларускі Урад, перэжываемо такі страшэнны пэрыод, што перад намі паустае пытаньне аб часовым спыненьні працы. За адсутнасьцьцю усякіх грошы Урад ня можэ ня толькі вясьці аружную барацьбу за сваю уладу, прапаганду і утрымліваць патрэбную зьвязь з мейсцамі — але ня можэ нават утрымаць сябе самаго. Калі на працягу бліжэйшаго часу ня будуць знайдзены патрэбные суммы — усе сябры Ураду і Прэзыдыуму Рады Рэспублікі павінны будуць на неазначэны час разсыпацца па сьвеце.

У гэты цяжкі момэнт мы зьвертаемо свае вочы да братняго Галіцкаго Ураду. Мы добра ведаем, што і Вашэ становішчэ цяжкае, што і Вам прыходзіцца жыць і працаваць у надзвычайна трудных варунках.

Але той, хто сам перэжывау падобнае, той найлепей зразумее патрэбу дапамогі слабейшаму.

Мы не зазначаемо суммы якая нам патрэбна.

Даручаем нашаму Міністру і Поунамочнаму Паслу грамадзяніну Цьвікевічу паразумецца аб гэтым і аб варунках пазычкі з Вамі, Пане Дырэктору, і Вашым Высокапаважаным Урадам.

Разам з тым даверaемо яму, грамадзяніну Цьвікевічу, атрымаць для нас тые грошы, якіе будуць Вамі нам пазычаны.

Прыміце, Высокапаважаны Пане, запэуненьня у шчырай да Вас пашане.

Старшыня Рады Народных Міністроу.
582.2.54:422 — мк

2462. Пратакол сходу Горадзенскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту 24.10.1920
582.1.55:001 — д

Сход выступіў у падтрымку Бацькі Булака-Балаховіча пасьля дакладу сябра Беларускага Палітычнага Камітэту Вячаслава Адамовіча, які прыехаў у Горадню. Падпісалі пратакол старшыня Камітэту Якавюк і сакратар Федарук.

2463. Адозва Горадзенскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту да беларускага народу [каля 24.10.1920]
582.1.55:002 — д

Не датаваная. Была апублікаваная ў газэце «Беларускае Слова» (Горадня) , 1920.11.24.

2464. Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 25.10.1920

Многоуважаемый,
Вацлав Юстынович!

Я Вам послал письмо нарочным (случайным).

Въ нем я сообщил, что въ отдѣльных организаціях, входящих в состав большой финансовой группы, принципіально рѣшено поддержать нас. Теперь вопрос зависит от общаго собранія. Полагаю, что и в оном возраженій не будет. Поскольку этот вопрос сложен и труден можно понять только при самом близком съ ним знакомствѣ. Примите во вниманіе, что, кромѣ мѣстных сил[1], остальное все против нас. И если Вам дѣлали и дѣлают предложенія, то позвольте Вам сказать прямо — это провокація, ибо я лично читал неофиціальныя сообщенія идущія и от конкурентов и от стерликов[2] (врагов), свидѣтельствующія объ истинном их отношеніи къ Вам. Если Вы желаете убѣдиться, скажите каждому из них в отдѣльности да, согласны, и Вы увидите, что получится?!

Я начал свою работу здѣсь с указанія на предложенія конкурентов. Здѣшніе круги очень заинтересовались и нажали на Урад. Предстаунік спрау грашовых аднесся вельмі прыхільна и хацеу падтрымаць справу двумя урадамі. Ен напісау афіціальны ліст у Лендын маючы мэту супольна падтрымаць эканамічна і палітычна. Ответ был в таком же духѣ, как пану Кречеускому у Ковні на яго прывітане. Патом звярнулися да Рыму і аттуль адтрымалі адповедзь, што Дзяржава не істнуе і поэтаму нема чаго гаварыць! Туды паехау Де-В<улич>, и да сей пары яго еще нема. Ен працуе паеднаць группы, якія эксплеатуюць вуглепрамысловасць на Украине з яго групай, каб падтрымаць нас.

Донесенія агентов изъ Б<ерлина?> объ отношеніи мѣстных кругов к нам столь возмутительны, что я не могу о них спокойно даже думать, не то, что говорить или писать. Вот почему на неоднократное обращеніе пана Кречеускаго с приглашеніем пріѣхать туда, я отвѣтил категорическим отказом и написал через Прагу, что к провокаторам не поѣду. Что они провокаторы я знал давно, но что они способны на подлость, превосходящую всякій максимум я никогда не предполагал. Для примѣра сообщу такой факт: «пан Кречеускі сказау за абедам, што трэба нам абъеднацца з німі у адно». По понятным Вам причинам не указываю мѣста и времени, когда факт имѣл мѣсто. Свѣдѣнія даны ими, при чем было подчеркнуто, что «такіе люди берутся за такое дѣло». Я убѣжден, что это гнусная ложь, однако это дѣлается так тонко и ловко, что бороться со злом мы безсильны! Подробности сообщу лично. Я не выѣхал по понятным Вам причинам: я не мог ничего привезти и сам ничего не имѣл. Де-В отсутствует.

Прошу Вас поступить так: обратитесь к Латышскому Мин. Ин. дѣлъ с просьбой разрѣшить их послу в Парижѣ принять от меня 3000 фр. Соотвѣтствующую сумму в латышской валютѣ просите выдать Вам. Эту сумму моих личных средств я посылаю Вам чтобы Вы могли передохнуть, пока я закончу здѣсь дѣло. Оно стоит очень твердо, люди серьезные, работа большая.

Если Латышское Мин. согласно телеграфируйте мнѣ, я немедленно внесу деньги. За остальным нужно будет кому-нибудь пріѣхать: я пола-

гаю, что лучше всего было бы пріѣхать Василію Ивановичу. Впрочем Вам виднѣе на мѣстѣ. Только что я получил его письмо. Удивляюсь Вацлав Юстынович! Неужели Вы думаете, что я Вас игнорирую? Мнѣ и в голову это никогда не приходило. Большое неудобство заключалось в посылкѣ через посредство І<езовитова>. Прошу вас прислать мнѣ Ваш адрес. Настоящее письмо посылаю через пана І.

У Закордонных Справах меня завѣрили, что бѣлые орлы могут дѣлить как угодно, но ни клочка не получат. Здѣсь их рѣшеніе утверждено не будет.

До сих пор они не сообщили офиц. условій договора. Усиленно скрывают, что признали Совѣтскую Беларусь.

Въ займѣ им отказали. Я подал протест Лигѣ Націй, Конференціи и Послам Вел. Держав по поводу раздѣла. Я требую предоставленія законному Правит. права устроить порядок в Державѣ согласно желанію народа.

Здѣсь нас поддерживают твердо, но Лендын ведзе якуюсь камбінацыю, с Б<~~алаховичем~~?> насчет лѣсов. У Закордонных справах маются весткі. Ситуацыя скоро выяснится.

Крѣпко жму руку! Всего наилучшаго! С утра до поздней ночи я занят. Цѣлую ручку Супругѣ Уважаемой Вашей.

Уваж. Вас, Эугені.

25/X 20.

582.1.45:072&r-072a&r

[1] Французаў. [2] Брытанцаў.

2465. Ліст Станіславы Кісель (Масква) Вацлаву Гладкаму (Рыга) за 25.10.1920

Уважаемый Вацлав Петрович

Только что узнала, что, как оказывается прынимают письма заказные в Рыгу. Спешу послать эти строчки.

Я еще живу в Москве[1]. Прыходится питать одни надежды работать на родине по народному образованию, ибо до сих пор не могу получить возможности выехать на место службы, несмотра на командировку меня комисариатом в Смоленск.

Как поживаете Вы сами, Власт? Передайте, или перешлите ему от меня прывет и просьбу написать как ему живется. Письмы вероятно из Латвии прынимают.

Как поживает мадам Кодобе, мой хросны? Передайте прывет от меня и попросите чтобы написали ибо у меня нет их адреса.

Целую ручки Вашей маме, и меня прошу не забывать.

Стаха

Москва 25.X.20.

Мой временны адрес

Москва, по Мясницкой, Гусятников пер. д. №7. Общежитие

582.1.45:105&r

[1] Станіслава Кісель, другая (тады яшчэ не зарэгістраваная) жонка В.Ластоўскага, адразу пасьля Рыжскай канфэрэнцыі выехала ў СССР. Гл.: Справа Вацлава Ластоўскага // Маладосць. №8. 1993. С.231.

2466. Ліст Уладзімера Станкевіча (Бэрлін) Язэпу Варонку (Коўна) за 26.10.1920

582.2.06:051

У справе дасланага машынапісу разьдзелу кнігі У.Станкевіча пра народы Расеі (пра беларусаў?)

2467. Заява Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Радзе Паслоў Балтыйскіх Дзяржаў і Ўрадам Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы й Польшчы за 27.10.1920

Радзе Паслоу Балтыцкіх Дзержау і Урадам Фінляндіі, Эстоніі, Латвіі, Літвы і Польшчы.

Пасьля таго, як пунктам першым умовы 12 кастрычніка 1920 году аб прэлімінарным міру паміж Расеяй і Польшчай, абедзьве стараны урачыста прызналі дзяржаўную незалежнасьць Беларусі, Прэзыдыум Рады і Урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае гонар зьвярнуцца да Рады Паслоу Балтыцкіх Дзержау з ніжэйадзначаным:

Беларускі Народ лічыць пачатак сваей незалежнасьці са дня 25 марца 1918 году, калі Рада Рэспублікі, выражаючы волю народу заявіла аб разрыве дзержаунай сувязі з Расеяй і аб устанауленьні сувэрэнітэта Беларусі у форме незалежнай Народнай Рэспублікі.

Стоючы на грунце акта 25 марца 1918 году і не прызнаючы згодна сваім папярэднім заявам, для сябе абавязковай прэлімінарную мірную умову паміж Расеяй і Польшчай, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі усеж такі, вітае прызнаньне незалежнасьці Беларусі абедзьвымі старанамі, выражанае у азначанай умове.

Прызнаньне незалежнасьці Беларусі з'яуляючыся актам справядлівасьці, аснаваным на праве народау на самаадзначэньне, сьведчыць аб тым, што Расея адказалася з гэтага момэнта ад дзержауных правоу сваіх на беларускую тэрыторыю, а ваеваушая з ей Польшча афіцыальна згодзілася на істнаваньня незалежнай Беларусі.

Такім чынам, аднастаронні акт волеіз'яуленьня беларускага народу ад 25 марца 1918 году, прызнаны у сучасны момэнт двумя новымі старанамі, дзякуючы чаму можна, з пачуцьцем глыбокага здаволеньня канстатаваць, што [больш] чым двухлетняя барадзьба беларускага народу за сваю незалежнасьць азнаменавалася чародным сусьцігам (усьпехам).

У сучасны момэнт перад Балтыцкімі дзержавамі да каторых Беларусь мае самыя гарачыя сымпатыі і з каторымі жадае жыць у найлепшых добрасуседзкіх адносінах, паустае вялікае заданьне аб формах падтрыманьня Беларускага народу у яго далейшай барадзьбе за адраджэньне.

Гэта падтрыманьня можа быць, на сам-перш, выканана шляхам фармальнага прызнаньня Балтыцкімі дзержавамі устаноуленай Беларускім народам формы яго дзержаунасьці, а іменна Беларускай Народнай Рэспублікі, а так сама дапамогай да запрашэньня прэдстауніка Ураду Беларусі у склад Рады Паслоу Балтыцкіх дзержау.

Просячы аб такім прызнаньні, мы, Прэзыдыум Рады і Урад Беларускай Народнай Рэспублікі маем гонар адзначыць, што гэты акт добража-

дательства са стараны Балтыцкіх дзержау аблегчыу бы магчымасьць выступленьня Беларускай дэлегацыі на будучых перагаворах Расеі і Польшчы аб аканчальным міру, і тым бы дапамог устанауленьню моцнага і справядлівага парадка на усходзе Эуропы, чаго шчыра жадае змучаны шасьцілетнім кравапраліцьцем Беларускі Народ.

Арыгінал падпісалі:

П.Крэчэускі, Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

В.Ластоускі, Старшыня Рады Міністрау Беларускай Народнай Рэспублікі

К.Душэускі, Дзержауны Сэкрэтар.

З арыгіналам згодна: Ю.Гладкі-Ластоускі.

Кіраунік Канцылярыі Рады Народных Міністрау.

582.1.06:070 — шк бел
582.1.07:042 — шк бел
582.1.07:082 — шк бел
582.1.07:083 — шк бел
582.1.07:084 — шк бел
582.1.07:088 — шк бел
582.1.07:089 — шк бел
582.1.07:090 — шк бел
582.2.51:139 — шк бел

2468. Мэмарандум Рады Народных Міністраў БНР да ўрадаў Балтыйскіх краінаў (у якасьці дадатку да Заявы за 27.10.1920)

МЭМАРАНДУМ

У дапауненьне і раз'ясьненьне заявы ад 27 кастрычніка, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае гонар коратка вылажыць у гэтым мэмарандуме:

а) варункі, якія папярэджалі прызнаньне незалежнасьці Беларусі са стараны Польшчы і Расеі,

б) значэньне азначанага прызнаньня для Беларускага народу,

в) задачы і варункі сваей далейшай чыннасьці.

I.

Незалежнасьць Беларусі, прызнаная цяпер Польшчай і Савецкай Расеяй, вядзе свой пачатак з 25-га сакавіка 1918 году.

Апіраючыся на яуна выражанай волі беларускага народу да дзержаунага самаазначэньня, Рада Рэспублікі, вышаушая з Усебеларускага Кангрэсу 5-17 сьнежня 1917 году, Устауной Граматай 25-га сакавіка 1918 году, зьвернутай да народау усяго сьвету, апавесьціла разрыу дзержауных звязей Беларусі з Расеяй і устанауленьне незалежнасьці сувэрэннага беларускага народу. Форма дзержаунасьці Беларусі была прынята у форме Народнай (дэмократычнай) Рэспублікі. Разам с тым было пастаноулена прыступіць пры першай магчымасьці да скліканьня Беларускага Устаноучага збору; да таго-ж мамэнту ролю Вышэйшай Заканадаучай Установы прыняла на сябе Рада Беларускай Народнай Рэспублікі (Перадпарлямэнт),

зложаная з выбраных прэдстаунікоу Усебеларускага Конгрэса і дапоуненая дэлегатамі ад палітычных партый, земстваў, гарадоў, нацыянальных меншасьцей, грамадзкіх і эканамічных арганізацый (усяго да 200 дэпутатаў). Дзеля безупынных акупацый Беларускі Устаноучы Збор да гэтага часу ня мог быць скліканы. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі істнуе да гэтай пары; апошняя 5-ая сэсыя яе адбылася у сьнежні 1919 году на каторай быу выбраны Урад цяперашняга складу.

Адначасова з устанауленьнем формы дзержаунасьці Рада Беларускай Народнай Рэспублікі устанавіла асновы, на каторых дзержаунасць гэта павінна трымацца, а іменна: поуная дэмократычнасьць, прэдстауніцтва і абарона усіх клясаў насяленьня, наданьне аутаномных правоу нацыянальным меншасьцям. А глауным сваім заданьнем Незалежная Беларуская Дзержава павінна была мець культурнае і эканамічнае адраджэньне Беларускага Народа.

Канкрэтнымі заданьнямі Беларускай Улады было змаганьне з захватнымі імкненьнямі маскоускіх бальшавікоу, жадаючых устанавіць сваю сыстэму улады і гаспадаркі на Беларусі і па другое змаганьне супроць Берасьцейскай умовы. Спэцыяльным пунктам дэклярацыі 25 сакавіка 1918 году Рада Беларускай Народнай Рэспублікі апавесьціла Берасьцейскі трактат для Беларусі не важным.

Цяпер, па уплыве двух с паловай лет, пасьля конституцыйнага акта 25 сакавіка 1918 году, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі са спакойным сумленьнем можэ спытацца у урадау усіх дэмократычных Дзержау: «Ці справядлівы яго чыннасьці і ці правідловая была яго пазыцыя».

Кождая запрауды дэмакратычная улада, протэстуючы супроць рабства і гвалту павінна атказаць на гэта пытаньне падтверджаюча.

Што датычэ Беларускага Народу, то погляд яго застаецца такім жа як і у 1918 гаду; улады і гаспадараваньня акупантау ен не прызнае і ня жадае, служыць карысьцям чужой дзяржаунасьці ня хочэ.

Змаганьне Беларусі за незалежную дзержаунасьць з момэнту яе апавешчэньня ішла і цягнецца дагэтуль двумя шляхамі: шляхам аружнай барадзьбы і шляхам палітычнай прапаганды і арганізацыі шырокіх мас жыхарства. Калі на полі аружнай барадзьбы Беларусь да гэтага часу не магла с прычыны недахвату усякай паддзержкі са стараны, дабіцца выдатных вынікау і уфундаваць дэмократычную уладу, то у кругу палітычнай арганізацыі народу і агітацыі за гэту дэмократычую уладу Беларускі Народ здолеу дайсьці вялікіх вынікау.

У партфэлях Ураду маюцца ясныя довады таго, што шырокія масы беларускага народу глыбока варожае да усіх акупантау, ці прыходзяць яны з заходу, ці з усходу, і сілай гатовы падтрымаць свой Урад.

Але да таго часу пакуль Беларускі Урад не знайшоу сабе шчырых саюзнікау і не абязпечыу сабе матэрыяльнай дапамогі з іх стараны, клікаць народ на кравапраліцьце яно ня хочэ. Прыклад братней Украіны, ужо тры гады абліваючайся крывей у няроуным змаганьні, часова стрымлівае яго ад прыняцьця даканчальных пастаноу.

Дзеля чаго жыхарства Беларусі звертае свае вочы на дэмакратычны Урад і з нецярпеньнем чакае устаноуленьня яго улады.

Дзеля таго, што ена нясе з сабою палітычную цэласьць і незалежнасьць яго, справядлівую развязку соцыяльна-гаспадарчых пытаньняў, роунасьці усіх грамадзян перад законам і адраджэньне нацыянальнай культуры.

Перамагаючы Беларускі Урад у аружным змаганьні бальшавіцкая улада увесь час бывала пабітай у палітычным змаганьні. І дзеля таго, каб выбіць з рук Беларускага Народу галоунае яго, у гэтай палітычнай барадзьбе, арудзьдзе, яно паводле прыкладу Украіны і другіх маладых дзержау, дэкляруе клічы незалежнасьці і нацыянальнага адраджэньня народау Беларусі на асновах савецкіх.

Першы раз незалежнасьць Савецкай Беларусі праклямавана была пры заняцьці імі Менска 1 студня 1919 году. Зроблена гэта было ня шчыра і калі, можна так выразіцца, «па дамоваму», бо Эуропе аб гэтым не было дадзена ведаць. Але дзеля таго, што Беларускі Дэмакратычны Урад здолеу да 1919 году ня толькі аб'еднаць беларускі народ каля ідэі незалежнасьці і нацыянальнага адраджэньня, але і засьведчыць гэтые жаданьня у галоуных цэнтрах Эуропы, асабліва на Парыжскай Мірнай Конфэрэнцыі, то, пры пауторным заняцьці Менска 31 ліпеня 1920 году, Расейскі Урад другі раз заявіу аб незалежнасьці Беларусі і устаноуленьні у ей Савецкай улады, апублікаваушы на гэты раз дэкларацыю сваю да усеагульнага ведама.

Само сабой ясна, што актау Савецкай Улады зверху устанауляючых форму дзержаунасьці, жыхарства Беларусі не прызнае. Для яго абавязкова не азначэньне, а самаазначэньне. Пачаткам сваей незалежнасьці насяленьне Беларусі лічыць дзень 25 сакавіка 1918 году.

II.

Прызнаньне незалежнасьці Беларусі ставіць на чарод пытаньне аб прызнаньні яе дзержаунасьці, г. з. Беларускай Народнай Рэспублікі.

Прызнаньне незалежнсьці Беларусі умовай 12 кастрычніка гэтага году азначае: 1) атказ Расеі ад дзержауных правоу на Беларускую тэрыторыю і 2) прызнаньне Польшчай, што на усходзе ена мае граніцу не з Расеяй, а с Беларусей.

Яуляючыся актам па істоце няунікненым, справядлівым і сьведчучым аб чарговым сусьцігу (успеху) беларускага асвабаджэнчэскага руху, прызнаньне беларускага сувэрэнітэта Расеяй і Польшчай грашыць неяснасьцю і няпоунасьцю: астаулена без атповедзі пытаньне аб форме дзержаунасьці і аб агульных яе граніцах; разам з тым праведзена заходняя граніца Беларусі[1] с Польшчай (супроць законау Божаскіх і чалавецкіх), каторай Беларусь дзеліцца блізка што папалове і лепшые па культуры часьці яе аб'яуляюцца зямлей польскай.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі пэуны, што гэта апошняя несправядлівасьць будзе папраулена пры устанауленьні аканчальнага міру.

Варункам гэтай папраукі павінна быць прызнаньне Беларускай Народнай Рэспублікі і яе законнага Ураду.

Трудна дапусьціць думку, каб заключэньне прэлімінарнай умовы паміж Расеяй і Польшчай, па дагавору 12 кастрычніка, сьведчыла аб скрытым прызнаньні Савецкай Беларусі.

Такое дапушчэньне нельга зрабіць па двух прычынах: фармальнай і маральнай.

Як сказана у папярэдней часьці акты Расейскага Савецкага Ураду аб арганізацыі Беларусі не з'яуляюцца актамі волевыяуленьня беларускага народу, а спробамі акрэсьленьня узаемаадносін паміж Масквой і Менскам. Гэты акты сьведчылі не аб беларускай незалежнасьці, а наадварот аб фактычнай залежнасьці Беларусі ад Савецкай Расеі. Квазі-Урадовая установа Савецкай Беларусі, у форме Рэволюцыйнага Камітэту не можэ лічыцца урадам Беларусі, дзеля таго што ніякім народным сходам ен не выбраны і на выпауненьне урадовых функцый не упаунамочаны. Гэта есьць группа асоб рэпрэзэнтуючая невялікую меншасьць, группа каторая трымаецца выключна падтрыманьнем Маскоускага Совнаркома. Круг чыннасьці яго агранічаны да надзвычайнасьці і права прэдстауніцтва беларускіх інтэрэсау перад суседзямі ен не мае. Сам беларускі Ревком відаць не лічыць сябе Урадам незалежнай Беларусі, у кожным разе адсутнасьць яго афіцыяльных прэдстаунікау на Мірнай конфэрэнцыі у Рызе і неучасьце у разрашэньні першай важнасьці дзержауных пытаньняу, рашаючых долю беларускага народу (ня толькі с правам рэшаючага голасу, але нават дарадчага) сьведчыць што Беларускі Рэвком папраудзі яуляецца абласной установай Совнаркома і Урадам незалежнай Беларусі сябе ня лічыць.

Нельга пасьля гэтага дапусьціць, каб гэткім лічыла яго Польшча і Савецкая Расея.

Урад незалежнай старонкі сам бярэ на сябе атпаведальнасьць за выпауненьне умоваў яго датычачых. Нават калі ен не заключае ад сябе падобных умоваў, то абавязковасьць выпауненьня умоваў ускладываецца на яго старанамі, каторыя мірацца. Між тым ні адзін пункт умовы не гаворэ аб тым, каб незалежная Беларусь атказывала за выпауненьне умовы, рашаючай долю яе народу і тэрыторыі, і давала у гэтым якіе-небудзь гарантыі.

Адно, што можна угледіць у неясных і запутаных фармуліроуках умовы 12 кастрычніка у адносінах да Беларусі, гэта тое, што Польшча не рашылася ешчэ пайсьці на прызнаньне дэмократычнай Беларускай Народнай Рэспублікі, дабытай у рэволюцыйнай барадзьбе самым народам.

Пазыцыя Польшчы з'яуляецца у гэтым аднашэньні тым больш незразумелай, што, як ведама В.Ц.И.К. прызнау дэмократычную Беларусь і старшына Савецкай Дэлегацыі п. Іоффэ, прымушаны цяжкім становішчам Савецкай улады выражау згоду на прызнаньне «буржуазнага» ураду Беларускай Народнай Рэспублікі.

Да апошняга часу у палітычнай барадзьбе не было прынята ссылацца на акты маральнага значэньня, але пасьля прыняцьця вэрсальскай умовы Сьвяшчэннага прынцыпа права народау на самаазначэньне, такая ссылка атрымлівае рэальны сэнс і дзеля гэтага Урад Беларускай Народнай Рэспублікі заяуляе, што «скрытае» прызнаньне Беларускага Ревкома явілася бы праяуленьнем выключнай несправядлівасьці у адносінах да беларускага народу. Гэта было бы публічным пасьведчэньнем што беларускі

народ есьць сазнацельны слуга бальшавізма, якім ен ніколі не быу і быць не можэ, што беларускі нацыянальны дэмократычны рух з'яуляецца аванпостам разрушыцельных ідэй Савецкай Масквы, што дэмократычны беларускі Урад выбіваючыйся із сіл у непасільнай барадзьбе проціу насільля Масквы, ідзе проціу інтэрэсау і жаданьняу насяленьня Беларусі і што яго барадзьба за дэмократызм не спатыкае ні у кім спагады.

Калі такі удар у плечы дэмократычным беларускім сілам можэ арганізовываць бальшавіцкая улада, як натуральны вораг іх, то дапушчэньне такіх чынау са стараны дэмократычнай Польшчы з'яуляюцца незразумелым, і Урад Беларускай Народнай Рэспублікі аткідывае такое дапушчэньне.

Цяперашні момэнт з'яуляецца дужа добрым для падтрыманьня беларускай дэмократычнай улады. Калі урад Балтыцкіх дзержау спагадае барадзьбе Беларусі з усходнім насільлем і жадае відзець яе сваім сусе-дам, то прызнаньне Беларускай Народнай Рэспублікі будзе нармальным завяршэньнем справы, пачатай умовай 12 кастрычніка. Фармальных памех у гэтым аднашэньні ужо нема.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі цьверда верыць, што па гэтаму справядліваму і ядына магчымаму шляху пойдзе так сама і Польшча, не гледзячы на усю труднасьць беларуска-польскіх гранічных спрэчак.

III.

Беларускі народ гатоу сілай абараняць сваю народную (дэмократычную) дзержаунасьць.

Аткрытае прызнаньне незалежнасьці Беларусі са стараны Польшчы і Савецкай Расеі разсеяла многія непэунасьці, зьвязаныя з ея істнаваньнем.

Спрэчка аб беларускім народзе, як асобным племені, аб яго языку, быце і культуры, даюшчых права на нацыянальнае адраджэньне і Незалежнае дзержаунае разьвіцьце, можна лічыць закончанай. Тым не менш для пастароннага палітыка могуць оставацца некаторыя неяснасьці, каторыя Урад Беларускай Народнай Рэспублікі лічыць абавязкам асьвяціць.

Ці дамагаецца беларускі народ сваей дзержаунай незалежнасьці.

Мы сьмеем даць адповедзь на гэтае пытаньне падцьверджаючую.

Тое, што да гэтага часу Беларускі Урад не уцьвердзіуся на сваей тэрыторыі, у значнай меры тлумачыцца не спагадаючымі аб'ектыунымі варункамі. Яшчэ у 1917 годзе на заходнім і румынскім фронтах вайсковыя беларусы прыступілі да фармаваньня нацыянальных дывізій для падтрыманьня беларускай дзержаунасьці. Сьцягнуць гэтыя сілы к Менску і стварыць з іх аружную аснову беларускай улады было заданьнем Цэнтральнай вайсковай беларускай Рады, каторая працавала над беларускімі фармаваньнямі у Менску і аб'еднала фармаваньні на другіх фронтах. Але на жаль Беларускі Урад і Вайсковая Рада не пасьпелі гэтага зрабіць дзеля таго, што фарміраваушыяся раней украінскія войскі Нацыянальнай Украінскай Рады, а пасьля і польскія паукі гэнэрала Довбар-Мусьніцкага уступілі у аткрытую барадзьбу з бальшавікамі (разаружэньня бальшавіцкіх гарнізонау у сьнежні 1917 году) і бальшавіцкае камандаваньне, угледзіушы у нацыянальных фармаваньнях угрозы свайму панаваньню, ужыла

усе меры на тое, каб іх разстроіць. Агітацыя за мір і агульнае разаружэньне былі пачаткам, а Берасьцейская умова — фіналам гэтых мер. Вайсковая беларуская Рада, разгром якой пачало яшчэ бальшавіцкае камандаваньне, была аканчальна разгромлена немцамі, заняушымі у лютым 1918 году сталіцу Беларусі і разаружыушым[і] тута-ка апошія астаткі беларускіх нацыянальных фармаваньняу, вытрымаушых непасільную барадзьбу з бальшавікамі.

Паяуленьне на заходзе ад Беларусі Польскай дзержавы паслужыла не на карысьць арганізацыі беларускай аружнай сілы. Польшча адразу паставіла у поуным аб'еме гістарычную сваю спрэчку з Расеяй. Беларусь аказалася у сярэдзіне гэтай спрэчкі і як у гістарычныя часы з'явілася яблыкам раздору паміж двумя больш сільнымі суседзямі. Польскія войскі пайшлі на Беларусь не з мэтай помачы ей і абароны яе правоу перад Савецкай Расеяй, але з мэтай заваеваньня яе для сябе. Змагацца на два фронты, пры тым проціу непараунана магутных суседзяу Беларусь пэунеж была не у сілах. Ісьці у саюзе з адным з іх проціу другога Урад Беларускай Народнай Рэспублікі ня мог, дзеля таго што Варшава не хацела прызнаць Беларусь за аб'ект праваадносін, а з Масквой проціу Варшавы Беларусь не магла йсьці дзеля поунай нязгоды сваіх палітычных і соцыяльных ідэалау.

Усе арганізаваныя беларускія сілы у гэтых цяжкіх варунках зауседы былі разсеваны і ператвараліся у партызанства, каторае змагаючыся проціу бальшавіцкай акупацыі, дапамагала сусьцігам польскага аружжа, і, змагаючыся проціу польскай акупацыі, дапамагала наступленьню і прарыву бальшавікоу. І толькі у балоцістых райенах Прыпяці, паміж Пінскам і Мазыром, а так сама у лесных масывах на граніцах Вітебскай і Смаленскай губэрній беларускія партызанскія сілы аставаліся і астаюцца на сваей тэрыторыі і да самага апошняга часу чырвоная армія не магла з імі справіцца.

Запэуненьне, што Беларусь не імкнецца да сваей уласнай дзержаунасьці і што яна прымае, як нешта натуральнае, уладу Савецкай Масквы чы Польшчы, можэ быць легка аткінута ссылкай на палажэньне Расеі: ніхто у Эуропе не дапускае мысьлі, што бальшавіцкае панаваньне па душы рускаму народу, а між тым панаваньне бальшавікоу цягніцца ужо трэцьці год. Выключны уплыу у гэтай заяве маюць аб'ектыуныя умовы: вялікасьць адлегласьцей, рэдкасьць насяленьня, слабая зьвязь і г.п. Арганізацыя баз на пэрыфэрыі Расейскай тэрыторыі (Крым, Архангельск, Уладзівасток) і падтрыманьня Антантай даюць магчымасьць спадзевацца, што барадзьба з Савецкай уладай будзе прадаужацца і закончыцца сусьціжна.

Тыя-ж аб'ектыуныя варункі маюць мейсца і на Беларусі. Але арганізацыя цьвердай базы для барадзьбы за сваю уладу здавалася тут немагчымай, як дзеля таго, што уся Беларусь сталася сплашным фронтам вайны двух больш сільных народау, так і дзеля таго, што ні толькі магутныя дзержавы Антанты, але і ніхто не прыходзіць да яе у гэтай справе з дапамогай, яна аказалася здауленай з усіх старон.

Часам указываюць, што беларускі асвабаджэнчэскі рух з прычыны сваей кароткасьці — яко-бы толькі са дня рэвалюцыі 1917 году — ня мог выгадаваць у шырокіх кругах народу пачуцьця самаазначэньня, пачуцьця цэльнасьці і абасобленнасьці сваей і дзеля гэтага ня можэ разлічаць на кансалідаваную волю, каторая магла-б стварыць і утрымаць уласную дзержаунасьць.

На гэта трэба адзначыць, што беларускі рух распачауся яшчэ у прошлым сталецьці і ужо у 1905 годзе праявіуся у масавых формах. Рэвалюцыя 1917 году, бальшавіцкі развал Расеі, шасьцілетняя крывапралітная вайна і, наканец, цэлы рад перэменяючыхся чужых акупацый — усе гэта, узятае разам з прапагандай беларускіх партый, паслужыла такой калассальнай школай выхаваньня народу, каторую пры нармальных варунках жыцьця і агітацыі прышлося бы праходзіць цэлыя дзесяткі гадоу. Савецкая Расея з аднэй стараны, і Польшча, з другой стараны, нясуць з сабою альбо чужую і непрывычную дзержаунасьць, або безмысьльную сыстэму гаспадарства. Кансэрватызм масы аткідае гэты ноушэствы і знаходзіць задавольненьне у лезунгах уласнай нацыянальнай улады, пастроенай на самабытных асновах і служачай уласным інтэрэсам. Сазнаньне воражасьці і непрымірымасьці інтэрэсау Беларусі, як часьці Польшчы або Беларусі, як часьці Расеі, настолькі насьпела у народзе, што адно гэта служыць фактам кансалідацыі едынай нацыянальнай волі.

Такім чынам імкненьне да арганізацыі і узмацаваньня улады беларускага дэмократычнага Ураду базіруецца, як на пачуцьці сазнаньня сваей цэльнасьці і нацыянальнай абасобленнасьці, так і на пачуцьці нязгоднасьці сваіх інтэрэсау з інтэрэсамі суседзей.

Робіцца часам ссылка на яка-бы безгістарычнасьць Беларусі і атсутнасьць канешных інтэлігэнтных сіл у Краю. І тое і другое указаньне не вытрымлівае ніякай крытыкі.

Гістарычны атэстат і гістарычныя традыцыі беларускага народу пры самым паверхнастным знаемстве сьведчуць аб безпрэчнай творчай сіле беларускага народу.

Беларускі народ можэ з гордасьцю ссылацца на свае культурнае прошлае. Пачынаючы з 12-га сталецьця на Беларусі істнуе вялікая навука і літэратура. Імены такіх культурных дзеячоу, як Кірыл Тураускі, Авраамій Смаленец, Клімэнт Смаляціч і Ефрасіньня Полацкая, сваей прасьветнасьцю і літэратурнымі працамі стварылі і азнаменавалі сваю эпоху. Язык беларускі быу дзержауным языком усяго вялікага Княжства Літоускага. Друкаваная і рукапісная беларуская літэратура 12-14 сталецьцій, каторая сахранілася да нашага часу у рэлігіезна-палемічных творах, летапісях, павествах і юрыдычных памятніках даводзяць надзвычайна шырокае разьвіцьця беларускай культуры. Ужо у 1517 годзе беларусы выдаюць на сваей мове біблію. Старэйшыя із научнага пункту гледжэньня, лепшыя зборнікі законау так называемыя «Літоускія статуты» трох рэдакцый — 1529, 1567 і 1588 гадоу, сьведчуць аб высокім разьвіцьці у Беларусі юрыдычных навук. Вышэйшыя школы «акадэміі» аснаваны былі на Беларусі ужо у 14-ым сталецьці. У пачатку гістарычных часоу, беларускі народ састауляе

сваю асобную дзержаўную адзінку з усімі адзнакамі сувэрэннасьці. Такім ен уходзіць у дабравольны саюз з Літвой і разам з апошняй заключае пэрсанальную унію з Польшчай, і толькі, увайшоушы у склад Расеі, у канцы 18-га сталецьця Беларусь утрачывае адзнакі сувэрэннасьці і незалежнасьці.

Падпаручыку Карэцкаму аб'яуляю выгавар затое, што не праверыу пастаноўку дневальных у уходных дзьвярэй у казармы, дзеля чаго забраліся два агітатары з бальшавіцкімі мэтамі, якія і былі затрыманыя салдатамі куляметнай роты.
582.1.12:081

Чучалы дзеля колкі зрабіць кожнай роце і вучэбнай камандзе сваім папячэньнем, атрымаушы матэрыял з нестраевой роты і зараз жэ па атрыманьні учэбных вінтовак прыступіць да абучэньня штыкавому бою.
582.1.12:087

Заутра у нядзелю заняткаў не рабіць. Жадаючых памаліцься салдатаў адправіць камандамі у касцел і цэркоу.
582.1.12:002

20 января с.г. Командующій Арміей осмотрѣв войсковые части, находящіеся в Шанцах Понемуни нашел: Во всѣх частях, за исключеніем Бѣлорусского батальона, пища плохая. Это отчасти зависит от продуктов, отчасти от неумѣнія их готовить, неопытный кошевар и хорошіе продукты испортит.
582.1.12:119

2502. Нота Ўраду Беларускай Народнай Рэспублікай старшыні Польскай дэлегацыі на мірных перамовах у Рызе за 17.11.1920

Предсѣдателю Польской Делегаціи
на Мирныхъ переговорахъ въ Ригѣ.

В договорѣ прелиминарнаго мира, подписанномъ совѣтской Россіей и Польшей 12 октября 1920 года подтверждено обѣими сторонами признаніе независимости Бѣлоруссіи. Это признаніе, какъ видно изъ декларацiи делегаціи Совѣтской Россіи оглашенной 24 сентября с.г. и заявленія предсѣдателя Польской Делегаціи г. Домбскаго 4 октября с.г. въ главной комиссіи мирной конференціи уже признавалось въ 1918 году. Основывалось это на Всебѣлорусскомъ Учредительномъ Съѣздѣ и объявленномъ его преемникомъ — Радой Бѣлорусской Народной Республики (предпарламентѣ) актѣ независимости Бѣлоруссіи 25 марта 1918 года. Другихъ правомочныхъ бѣлорусскихъ государственныхъ органовъ ни въ оккупированной части Бѣлоруссіи Совѣтской Россіи, ни Польши не было. Даже бѣлорусскій Ревком образованный 31 іюля 1920 года учрежденіе по назначенію изъ Москвы а не выборное.

Считаясь поэтому съ признаніемъ Бѣлорусской Народной Республикой, какъ актомъ закономѣрнымъ и признаннымъ обѣими договаривающимися сторонами Делегація Бѣлорусской Народной Республики на мирных переговорахъ Совѣтской Россіи зъ Польшей въ Ригѣ вновь категорически требуетъ:

1. Дать право и возможность Правительству Б.Н.Р. сейчасъ же взять власть въ Бѣлоруссіи и вывести оккупаціонные войска Россіи и Польши съ бѣлорусской территоріи.

2. Отмѣнить несправедливый, имперіалистическій пункт договора прелиминарнаго мира 12 октября с.г. о раздѣлѣ Бѣлоруссіи, — и

3. немедленно допустить делегацію Бѣлорусской Народной Республики на мирныя переговоры въ Ригѣ, какъ самостоятельную сторону.

Делегація Бѣлорусской Народной Республики предупреждаетъ, что въ случаѣ игнорированія Совѣтской Россіей и Польшей законныхъ требованій Бѣлорусскаго Народа и его Правительства, какъ это имѣло мѣсто на прелиминарномъ мирѣ и, разрѣшеніе бѣлорусскаго вопроса безъ участія представителей Бѣлорусской Народной Республики — повлечетъ за собой долгую и кровавую борьбу за свое освобожденіе. Отвѣтственность за послѣдствія ляжетъ исключительно на Совѣтскую Россію и Польшу, которыя грубо и вопреки всѣмъ законамъ международныхъ отношеній нарушаютъ право суверенной Бѣлорусской Народной Республики.

582.2.49:017&r — мк

582.2.49:016 — ра (чарнавік)

2503. Праект прапановаў аб фармаваньні беларускага войска ў Літве. Нататкі Антона Аўсяніка

Ко второму пункту договора

Проект

§1. Правительство Бѣлоруссіи обязывается немедленно приступить к формированію бѣлорусскаго національнаго войска как путем вербовки охотников, так и путем мобилизаціи своих граждан на территоріи Литвы и в освобождаемых частях собственной территоріи.

§2. Правительство Бѣлоруссіи обязывается подчинить свои войска в оперативном отношеніи Главному Штабу Литовской арміи, в состав котораго должны войти представители Министерства Обороны Бѣлоруссіи.

§3. Содержаніе Бѣлоруской арміи, экипировку и полное содержаніе берет на себя казна Литовской Республики до времени вступленія белорусской арміи на собственную территорію.

§4. Бѣлорусская армія постепенно по мѣрѣ занятія собственной территоріи переходит на содержаніе казны Бѣлорусской Народной Республики.

§5. До этого времени Правительство Бѣлоруссіи обязывается приложить всѣ усилія к тому чтобы получить со стороны все необходимое для его арміи.

§6. Существующія бѣлорусскія войсковыя части на территоріи Литвы вступают в состав арміи Бѣлорусскаго Правительства.

На купэрце заадрэсаваць:

Яго Дастойнасьці Пану Розэнбауму

582.2.58:118-119 — р

Чарнавік ліста паўнамоцнага прадстаўніка БНР у Літве А.Аўсяніка міністру замежных справаў Літвы за 19.11.1920 (НАРБ, 325.1.057:007).

2504. Ліст Васіля Захаркі (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.11.1920

Дарагіе таварышы!

Сядзімо і дзівімся вашым адносінам да Рыгі. Яны мне напамінаюць Парыж. Інфармацыі німа. Грошы паслалі на Марс тагды, калі яны вельмі патрэбны на землі. Вальковіч ужо страціў надзею знайсьці іх.

Калі хто будзе калі-кольвек ехаць сюды, та добра было бы каб прывез поуныя інфармацыі аб тым, што робіцца на Бацькаўшчыне.

Тут нічога новага апрача канфлікта прэзідіума с Мамонько, які не ведама якому Богу служыць — но гэто пакуль што нехай будзе сэкрэтам.

Бывайце здаровы
Ваш Васіль
22XI1920
582.1.45:161&r-161a

2505. Ліст Янкі Чарапука (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.11.1920

Даражэнькі п. Власт!

Ліст Ваш атрымаў. За памяць засылаю маю шчыра-сэрдэчную падзяку. Я рабіў захады, каб атрымаць візу у Парыж. Паслаў быў тэлеграму у Французскае М.З.С. Прайшло ужо дзве нядзелі — адказу ніякага німа. Згодна з Вашымі тэлеграмамі аб маём ад'ездзе у Літву, я бы даўно выехаў бы — затрымоўка была у грашах, якія павінны былі быць атрыманы ад Вас Валь<ковічам> — іх і дагэтуль няма. Лічучы, што туды выехаць трэба як найхучэй я на свой кошт выезжаю у серэду а 11½ вечарам з Рыгі — візы ужо выраблю. Пакуль што ад'езд адбудзецца толькі мой. Асмалоўскі выедзе пазней...

Пакульшто усяго найлепшага
Ваш Янка Чэрэпук
22/XI 20.
582.1.45:162

2506. Ліст Сымона Розэнбаўма (Коўна) Ісаку Адольфавічу (?) за 22.11.1920

Žydu
Tautos Taryba
Kaunas.

Ковно 22 ноября 1920 г.

Дорогой Исаак Адольфовіч.

Я тепер къ Вам по слѣдующему дѣлу:

Бѣлорусскій вопрос, к которому мы всегда относились с улыбкой (какъ впрочем в свое время и к Литовскому), начинет принимать значительную реальность. Вам, конечно извѣстно, что в прелиминарномъ договорѣ между Россіей и Польшей признана самостоятельность Бѣлоруссіи. Это впрочем единственная база, на которой впрочем возможен проч-

ный мир между Россіей и Польшей. Моя мечта об уніі между Литвой и Бѣлоруссіей и, таким образом, об'единеніи всего «Литовского еврейства», въ еврейскомъ смыслѣ слова, теперь, какъ литовским, так и бѣлорусским дѣятелям не кажется уже химерой.

Как-бы впрочем Вы не смотрѣли на этот вопрос, евреи, как по существу, так и по тактическимъ соображеніямъ, должны обнаруживать величайшіе симпатіи к этому движенію. Это тѣм болѣе, что мы таковые обнаруживаем к Литвѣ и господствует мненіе, что Литва будтобы обязана своим существованіем именно этим симпатіям. Таким образом, если мы откажем въ своих симпатіях бѣлоруссам, то нам припишут безрезультатность бѣло[ру]сского движенія и мы будем имѣть въ Бѣлорусском народѣ серьезного врага.

Хочу еще прибавить, что с точки зрѣнія федеративной Россіи такая комбинація — федерація Литвы и Бѣлоруссіи — только желательна и что въ противном случаѣ раньше или позже Бѣлоруссія или, покрайней мѣрѣ, значительная часть ея будет захвачена поляками.

Все сказанное — предисловіе к письму, с которым к Вам обратится Бѣлорусское Правительство.

С сердечным привѣтом
Ваш С Розенбаум
582.2.54:462&r-463 — рк

Адрасат і абставіны невядомыя.

2507. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) [Шарлю Можу?] (Парыж) за 23.11.1920

Пане Палкоўніку

Пяць месяцоў мінуло с тае пары, калі мы мелі гонар праводзіць Вас у ~~дарагую~~ пекную Францыю, ~~кахаюю Бацькаўшчыну~~. Праводзілі мы Вас з верай, што лібэральнейшый і дэмократычнейшы французскі народ, праз лепшых сваіх сыноў падасць нам руку помачы. С тых часоў на політычным горызонце Эўропы і ў нашай многапакутнай бацькаўшчыне шмат што змянілося. Хіба Вам газэты прынясьлі весткі і аб адходзе палякоў з Беларусі, і аб ганебным польска-большэвіцкім, а па этычнаму свайму зместу тыповым большэвіцкім міры, якім над нашай бяздольнай бацькаўшчынай Беларусьсю адвечные яе ворагі Варшава і Масква рабілі вівісэкцыю, разразаючы яе жывое цело на часці, пасылаючы розных авантурыстоў, якіе являюцца у стасунку да народу пр[агн?]ымі грабіцелямі, а перад Зах. Эўропай разыгрываюць ролю благародных асвабадзіцелёў. Думаю, што ім у Вас ніхто ня верыць, як і у нас.

Але у нашым дзержаўным жыцьці за гэты час сталіся важные перамены. Расея і Польшча прызналі незалежнасць Беларусі. А гэто значэ Расея адрэклася сваіх сувэрэнных правоў на беларускую тэрыторыю, а Польшча ужо не пярэчыць, што між ей і Расеяй ляжыць тэрыторыя Беларусі.

Апошнімі часамі мы заключылі умову з Літвой аб узаемным падтрыманьні і Урад наш будзе мець сваю політычную базу у Літве.

Мы ужо маем прызнаньне і маем базу. Патрэбна нам помач, каторай дагэтуль нам ніхто не даў.

Веручы у Вашу шчырую прыязнь да нашай справы, я і прашу Вас памагчы нам перад сваімі землякамі, у справе помачы аружжам і грашамі дзеля ачышчэньня нашай зямлі ад окупантоў.

Каб тые массы грошы, якіе былі патрачэны на Дзенікіных, Калчакоў і Врангелёў ~~былі патрачэны на падмогу Украіне і Беларусі даўно бы па~~на адбудаваньне у расеі рэакцыі і грошы выданые Польшчы на паняволеньне другіх народаў, дзержавы Антанты далі на падмогу вызваляючымся народам, на адбудаваньне іх дзержаў, даўно-б ужо большэвіцкая гыдра не трывожыла заходную Эўропу.

Думаю, што цяпер ўрэшце стане Антанта на правільную дарогу і дапамагаючы адбудаваньню Украіны і Беларусі ~~аткрые сабе~~ заслужыць на векавечную ўдзячнасць гэтых народаў і аткрые сабе дзьверы да бязьмерных запасоў сырья у якое гэты старонкі багаты.

Чэкаючы Вашай ласкавай адповедзі
з вялікай да Вас пашанай...

582.1.45:154&r — чарнавы рукапіс па-беларуску В.Ластоўскага
582.2.54:460&r-461 — р пераклад на французскую мову

2508. Упаўнаважаньне Рады Народных Міністраў БНР ваеннаму аташэ пры Дыпляматычнай Місіі БНР у Бэрліне Давіду Анэкштэйну за 23.11.1920 (вых. №480/8)

Kowno, 23. November 1920
N 480/8

VOLLMACHT
Giltig bis zum 1/VII. 1921.

Die Regierung der Weissruthenischer Volksrepublik beauftragt hiermit ihrem militärischen Attaché bei der Diplomatischen Vertretung in Berlin, den Herrn David Aneckstein, sich mit den verschiedenen Regierungsstellen und Aemtern in Verbindung zu setzen und auch im Namen der Republik, den Bräuchen des internationalen Rechtes gemäss, solche Verhandlungen anzuknüpfen, die sein Amt belangen.

Ластоўскі
der Vorsitzende des Rates der Volksministerien
und zeitweilig Minister des Ausswärtigen Amtes.
582.2.54:459 — мк

2509. а) Опасный документъ // Невядомая расейская газэта, каля 25.11.1920; б) За кулисами // Тамсама

582.1.36:008

а) Рэцэнзія на «Atlas Polski» Römer'a (1916); б) Пра «Komitet Obrony Kresów»

2510. Ліст Валадзіміра Вінічэнкі ўкраінскім работнікам і сялянам (газэта «Нова Доба» №34, Газэта «Вперед» №250). Рыга, 26.11.1920

582.1.11:031&r-037&r — мк

2511. Ліст Рудольфа Абіхта (Брэслаў) Язэпу Нялепку (Коўна) за 28.11.1920

Sehr geehrter Herr Nielepka!

Ihr Brief vom 17. dieses Monats hat mich sehr erfreut. Ich wollte Ihnen in weißreußischer Sprache antworten, bin aber seit zwei Jahren nicht mehr dazu gekommen, ein weißreußisches Buch in die Hand zu nehmen und deshalb ganz aus der Übung. Deshalb schreibe ich Ihnen in deutscher Sprache. Ich habe eine weißreußische Grammatik in deutscher Sprache bis auf die Satzlehre und in weißreußischer Sprache einschließlich dieser geschrieben, und mit Hilfe eines geborenen Weißreußen, könnte letztere in einigen Wochen druckfertig gemacht werden. Leider bin ich gegenwärtig von einer kontraktlich übernommenen wißenschaftlichen Arbeit so vollständig in Anspruch genommen, daß ich für nichts anderes Zeit habe. Wenn wir Leben und Gesundheit behalten, werde ich aber, so Gott will, in den nächsten großen Universitätsferien, d.h. vom 1. August 1921 an frei sein[1]. Vielleicht kann ich Ihnen dann auch ein Stübchen in meiner Wohnung einräumen.

Im nächsten Sommer will ich im hiesigen Osteuropa-Institut zwei Vorträge über Weißreußen halten. Ich werde Sie dann bitte, mir einiges Material über die neuste Entwicklung der weißreußischen Frage zu senden, die sich im Augenblick ja noch gar nicht voraussehen läßt.

Ich besitze eine genaue Übersetzung des Evangeliums St. Marci, die ich nach dem besten griechischen Texte angefertigt habe. Sollten Mittel vorhanden sein, um sie zu drucken, so will ich sie Herrn Lastouski gern überlassen. Sie müßte natürlich von einem Weißreußen stylistisch überarbeitet werden. Dazu würde natürlich auch eine Übertragung in die russische Schrift gehören, die wohl jetzt endgültig angenommen ist.

Wenn Sie Zeit und Lust haben, den Briefverkehr mit mir fortzusetzen, so wird es mich freuen. Ich komme dadurch wieder allmählich ins Weißreußische hinein. Ihre Briefe werde ich pünktlich beantworten. Für unsere bevorstehende gemeinschaftliche Arbeit brauchen Sie keine besondere Vorbereitung — die Kenntnis Ihrer Muttersprache genügt. Hoffen wir daß der neu eröffnete Postverkehr nicht wieder unterbrochen wird.

Da Sie Ihre Adresse nicht angegeben haben, sende ich meinen Brief an Herrn Aŭsianik nach Koŭno. Hoffentlich gelangt er in Ihre hände.

Gern möchte ich etwas von dem lesen, was Sie geschrieben oder gedruckt haben.

Herrn Lastoŭski bitte ich einen schönen Gruß von mir zu bestellen.

Wie geht es den Herren: Janka Stankewič, B.Taraškewič, der seiner Zeit mal an meiner weißreußischen Gramatik mitarbeiten wollte, und Anton Luckewič, von dem ich einmal gelesen habe, daß ihn die Russen — oder waren es die Polen — gefangen gesetzt haben. Mein Interesse ist für alles Weißreußische noch so lebendig wie früher, nur meine übrige Arbeit wächst mir über den Kopf, und dabei wird man nicht jünger. Nun sende ich Ihnen noch einen herzlichen Gruß und zeichne Ihr freundschaftlich egebener

Prof. Dr. Abicht,
Breslau XVI, Hansastraße 11II
582.1.45:117&r-117a&r

[1] Гэтае спадзяваньне ня спраўдзілася — Р.Абіхт памёр 12.02.1921.

2512. Рапарт службоўца Дыпляматычнага Прадстаўніцтва БНР у Літве Язэпа Нялепкі дыпляматычнаму прадстаўніку Антону Аўсянікў за 30.11.1920 аб спробе начальніка канцылярыі Міністэрства Беларускіх Справаў Шэпфа завэрбаваць Язэпа Нялепку дзеля супрацоўніцтва зь літоўскімі службамі

582.2.49:018&r — pa

2513. Пераклад Міколам Вяршыніным гутаркі з міністрам замежных справаў Польшчы кн. Сапегам, надрукаванай у праскай газэце «Narodni Listy» №352 за 1920 год

582.1.10:003r-003 — pa

Дакладная дата невядомая.

2514. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.12.1920

Пане Вацлаве!

Дайце каму-небудзь правіць гэтую коррэктуру — у ей паправак немнога. Найперш — з граматыкай. Чаго прытрымліваццa? Абгаварыце гэтае пытаньне з Антонам — ён спецыаліст, здаецца!

Як парашыце — так і будзе. Бо я пакуль што не маю уласнай апініі.

Хутчэй вышліце назад!

Чакаю!

Ваш АлдрЦвікевіч

582.1.45:105a

Дакладная дата невядомая. Магчыма, гаворка йдзе пра кнігу: Цьвікевіч А. Адраджэньне Беларусі і Польшча. Бэрлін, 1921.

2515. Візытоўка Бронюса Балуціса

Bronius K. Balutis
Užsienių Reikalų Ministerijos Direktorius
Kaunas

582.1.71:005

2516. Візытоўка Пятраса Клімаса

Petras Klimas
Sous-Secrétaire d'Etat aux affaires Etrangères
Kaunas, Lithuanie

582.1.71:006

2517. Візытоўка Пятраса Клімаса

Petras Klimas
Užsienių Reikalų Vice-Ministeris

582.1.71:047

2518. Візытоўка Кляўдуша Душэўскага

Claudius Duschewski
Bergingenieur. Geolog

582.1.71:010

2519. Візытоўка Нафталіса Фрыдманаса

N.Fridmanas
St. Seimo narys
Prisiekusis advokatas
Kaunas

582.1.71:029
582.1.71:046

2520. Візытоўка Казіса Грынюса

Dr. K. Grinius
Lietuvos Respublikos Ministeris Pirmininkas

582.1.71:031
582.1.71:033

2521. Візытоўка Эдмона Прыва

M. Edmond Privat

582.1.71:035

2522. Справаздача невядомай асобы аб дзейнасьці бальшавіцкіх агентаў сярод ваеннапалонных у Нямеччыне й сьпіс германа-бальшавіцкіх агентаў у Эўропе

582.2.37:075-077 — мк

Дата невядомая.

2523. Бѣлоруссія опять возстанавливается. Пераклад зь невядомай літоўскай газэты.

582.2.58:058 — р

Дата невядомая.

2524. Беларуская Справа. №1. Сьнежань 1920. Коўна. (Макет вокладкі)

582.2.53:071 — р

Дакладная дата невядомая.

2525. Цыркуляр дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Літве Антона Аўсяніка супрацоўнікам Прадстаўніцтва за 1.12.1920

Беларуская Народная
РЭСПУБЛІКА

Паунамочнае Дыплематычнае
ПРЭДСТАЎНІЦТВО
у Літве.

1 сьнежня 1920 г.
№1
м. Коўно.

Да супрацоунікаў Урадоуцаў
Дыплематычнага Прэдстаўніцтва
у Літве.

Умова паміж Нашым Урадам і Урадам Літоускай Рэспублікі палажыла пачатак брацкага супрацаўніцтва двух вялікіх народаў.

Урад мой наказаў мне у Грамаце сваей хаурус Нашага Народу з Народам Літоускім узмацовваць, памятуючы, што Літвін як і у сваей гістарычнай мінуушчыне будзе другам і хаурусьнікам Беларуса.

Прыступаючы да адказнага выпауненьня сваіх абавязкаў — Паунамочнага Дыплематычнага Прэдстаўніка Б.Н.Р. у Літве — я прашу і заклікаю Вас, п.п. супрацоунікі-урадоуцы да выпауненьня ніжэйпісанага:

1. — Кіруйціся у сваей працы зауседы да дабра Нашага шмат пакутнага Беларускага Народу і Нашае Бацькаушчыны-Беларусі.

2. — Заставайцеся вернымі нашым Вышэйшым Дзяржауным Установам, Законадаучаму органу — Радзе Б.Н.Р. і выканаучаму — Радзе Народных Міністрау Б.Н.Р.

3. — Словам і дзелам узмацоввайце нашую дружбу з Літоускім Народам і яго Урадам.

4. — Трымайце у поуным сэкрэце усе нашы Дзяржауныя і службовыя тайны.

5. — Адносьцеся да сваіх службовых абавязкаў сумленна.

Арыгінал падпісаў Андрэй[1] Аусянік, Дыплематычны Прэдстаунік у Літве.
582.2.58:115 — мк

[1] Памылкова замест Антон.

2526. Адкрыты ліст Аляксандра Галавінскага да беларускіх сацыялістаў

582.2.58:057 — пачатак р перакладу на расейскую
582.2.58:122&r — мк рас
582.2.58:123&r — мк рас
582.2.58:124&r — мк рас
582.2.58:126&r — мк рас
582.2.58:125&r-127 — мк бел

Дата невядомая.

2527. Блянк анкеты «для жадаючага служыць у беларускім войску»

582.2.58:116&r — мк

Дата невядомая.

2528. Адрасы [для рассылкі Бюлетэню Беларускага Прэс-Бюро ў Коўне?]

1) Лібава — Цветкоў, Розовая вул. 31.
2) Ревель — Маркевіч, Отэль Залаты Леў №48.
3) Коўна — Рэд. «Часопісь» вул. Міцкевіча 13-а.
4) Капэнгаген — Др. І.Лурье, Lurje — Paludan Mullerswej 2 I Kopenhaqen W.

5) Дорпат — грам. Лутц, Звездная 46 кв. 1.
6) Чыкаго Амэрыка — (Mr. Michel Farbmann «The Chicaqo Daily News» Chicaqo).
7) Прага — Вершыніну, И.S.A.Werscininu, Praque Jakolinska 22.
8) Парыж — Ладнов, Paris VIII Rue Bayard 24 Ladnoff.
9) Берлін — Місыя, Berlin, Motz str. 21.
10) Масква — Беларускі Камісаріат, Дыло.-
11) Петроград — прафэсар Эпімах-Шыпіло.-
12) Рэваль Mr Chef de la Mission du Gouvernement Royal d' Japon.
13) Lozanne (Suisse) A la Ligue des Peuples
14) Rome Biblioteque Vatican
582.2.58:117 — мк

Дата невядомая.

2529. Адрасы замежных дыпляматычных місіяў у Коўне

Дыплёмат. Місіі:
1. — Англійская
Садовая, 19

2. — Латвійская
Алея Свабоды, 25

3. — Нямецкая
вул. Гэдэміна, 11

4. — Расійская Сав.
Алея Свабоды 6

5. — Французская
Падгорная, 20

6. — Швэдская
вул. Міцкевіча, 15

7. — Эстонская
Алея Свабоды, 9. Egidio
582.2.58:120 — р

Дата невядомая.

2530. Адрасы дыпляматычных прадстаўніцтваў і місіяў БНР за мяжою

Адрэсы
Нашых прэдстаўніцтв і місый

1) Ryga, Bielaruskaja Dyplomatycznaja Misija
Nikolajewskaja, 20

2) Berlin W.30 Weissrhutenienn Mission, Motzstrasse, 21. An Herrn Zajatz

3) Tcheko-Slowakaj, Prag III, Venzygowa, 4. An Herrn Veršynin

4) Copenhague, Bernstorfsvej 5, Kobenhavn 5 Lurje

5) Paris 25, Avenue, Victor Emmanuel III M-r Ladnoff

582.2.58:121 — р

Дата невядомая.

2531. Справаздача Аркадзя Смоліча (Варшава) за 5.12.1920 аб авансах, атрыманых ім за час ад 1.07.1920 і аб зробленых за гэты час выдатках

582.2.56:120&r-121

2532. Апраўдальныя дакумэнты аб выдатках Аркадзя Смоліча за час ад 1.07.1920 да 5.12.1920

582.2.56:127-140

2533. Чарнавік раскладу выдаткаў на беларускую працу ў Горадзеншчыне, складзены Аркадзем Смолічам і Кузьмой Цярэшчанкам 5.12.1920

582.2.56:126

2534. Рахункі выдаткаў Кузьмы Цярэшчанкі зь ягонай паездкі ў Рыгу і хадайніцтва перад Цэнтральнай Касай БНР аб выплаце яму 9.591 польскай маркі ў кошт гэтых выдаткаў

582.2.56:122-123

2535. Ліст Міністэрства Замежных Справаў Літвы Прадстаўніцтву БНР у Коўне за 6.12.1920 (вых. №5229) з просьбай запатрабаваць ад Вацлава Ластоўскага справаздачу аб выкарыстаньні выдадзеных яму як старшыні Таварыства «Золак» у Вільні ў 1918 годзе 25 000 аўксінаў

582.2.53:169 — ма

2536. Ліст Аўгена Ладнова (Жэнэва) Вацлаву Ластоўскаму (Бэрлін) за 7.12.1920

Женева 7/XII 20.

Многоуважаемый,
Вацлав Станиславович!

Простите, если перепутал Ваше имя, отчество[1].

Согласно телеграммѣ п. Цвікевича я прибыл немедленно в Женеву вмѣстѣ с Вент. Привезъ с собою всѣ необходимые матерьялы для работы в Лигѣ Націй и документы для доклада о произведенной работѣ за время, истекшее со дня моего отъѣзда изъ Риги.

Я очень желал Вас видеть, ибо считал нравственным долгом выяснить многое, послужившее причиной недоразумѣній, возникших в августѣ с/г.

К большому моему огорченію Васъ я не дождался. Уѣзжаю обратно. Вент сообщит Вам подробно о создавшемся положеніи. Я вручил Венту договор, который привозил в Ригу.

Документами благоволите воспользоваться по своему усмотрѣнію.

Полезные в Вашей работѣ матерьялы, если таковые понадобятся, будут немедлено Вам присланы.

Я просил Вас прислать мнѣ паспорт: выданный Антоном Ив.[2] в 1919 г. (11 іюня) потерял силу за истеченіем срока. Другим, присланным мнѣ им же и помѣченным 13/II 20, Минск, я считал неудобным воспользоваться. Однако получив телеграмму п. Цвікевича о Вашем отъѣздѣ и срочной необходимости выѣхать, я воспользовался тѣм, что было. Прошу прислать Вентом другой.

Многократно посылал я Вам, Іез<овитову> Мамонько и Бодуновой письма. Почти ни от кого, кромѣ Іез. отвѣтов не было.

Я привез с собою почтовыя расписки, копіи нѣкотор. документов, чтобы совмѣстно выяснить причину отсутствія извѣстій.

Так как повидаться с Вами не удалось то обо всем этом я просил передать Вам через Павла Федор<овича>.[3]

На послѣдняго, как и на всѣх нас, был возведен поклепъ о доносах на наших. Совмѣстно съ ним этот вопрос был выяснен в Парижѣ.

Хочется обо многом переговорить, да к несчастью в условіях современной переписки, это вещь крайне затруднительная.

Даст Бог, увидимся, тогда и переговорим обо всем.

Сердечно желаю Вам добраго здоровья, сил для работы и успѣха в ней.

Ежели будете писать, не откажите передать мой искренній привѣт Уважаемой Вашей Супругѣ.

Уваж. Вас, Ваш, ЕЛаднов

582.1.45:082&r-082a

582.1.45:071b — канвэрт

[1] Сьведчаньне абвастрэньня хваробы. [2] Луцкевічам. [3] Вэнта.

2537. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.12.1920 аб прыцягненьні капітана Крума да працы ў Консульстве замест выбылага Юрыя Бонч-Асмалоўскага

582.1.45:073&r-073a

2538. Ліст Кляўдуша Душэўскага (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Бэрлін?) за 10.12.1920

Коуна 10.XII.1920

Браце!

Што Ты нарабіў.

1. Не скончыў тут спраў і выехаў раптам[1], гвалтоўна, не пакінуўшы нічога.

Прыехалі чуць не ўсе і я у тым ліку. І сядзім тут як добрые дурні. Публіка ірытуецца і гневаецца. Страшэнна прыкрая сытуацыя.

Грошы так сама граюць роль.

С Тваей стараны гэта вялікая памылка.

2. Што Ты зрабіў з гэрбам. Не трэба быць вялікім палітыкам каб так не рабіць.

Паміма таго што праект новага гэрбу нікуды не годзен для печаткі і для дзерж. гэрбу, яго-ж кабінэт не мае права ні уводзіць ні зменяць.

Гэтым Ты даеш вялікі козыр у рукі праціўнікаў.

Што да гэрбу то і я самым рашучым чынам процiў.

Покуль што стараўся замаучываць гэту справу але яна мне псуе аканчацельна нэрвы.

3. Выехаўшы, Ты далей ні слуху ні духу.

Вывады: Памятай што выпады неарганізаваные — губяць заўседы усе справы.

Памятай, што чым большае становішчэ тым большая атпаведальнасьць. Памятай што у арганізованнасьці павінна быць коллегіальнасьць. Памятай што калі хочэш што праводзіць, дык перш знайдзі аднадумцаў, каторые і павінны правесьці.

У звязку з усімі падзеямі тут саздалася такая несмачная атмасфэра што я збіраюся так сама кінуць усе і ехаць.

Першая магчымасьць рэальнай працы у нас — комам.

Так нельга рабіць, Браце, гэты паступак Твой можа быць дужа цяжкім у сваіх выніках.

Хучэй старайся паправіць, бо страціш усю сваю павагу у сваіх таварышоў.

Не гневайся бо дабра хачу

Твой! Кляўдуш

582.1.45:080&r-080a&r

[1] В.Ластоўскі выехаў з Коўна ў Жэнэву 26.11.1920.

2539. Ліст Янкі Чарапука (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Бэрлін?) за 10.12.1920

Darazeńki Panie Staršynia!!

Ja uzo znachodzusia na miejscu swajoj uradowaj służby. Zasyłaju Wam maio serdečnaie prywitańnie za toj uśpiech iaki Wy atrymali u dziarzaŭnym i palityczna-dyplematyčnym stanowišču. Bezumoŭna chutka z 12 mil. hrudziej Biełarusoŭ zahudzić radasny nacyanalny kryk: «Nichaj zywie Lastouski! Nichaj zywie Wialikaia Wolnaia Niezaleznaia Biełaruś!»

Tolki u haru serce i duch My wyjdziem za Wašym prowadam na Backoŭskija honi...

Usiaho najlepšaho

Waš JČerepuk

10. śniežnia 1920 h

Koŭna

582.1.45:083

2540. Ліст Жака Дыкера[1] (Жэнэва) Вацлаву Ластоўскаму (Жэнэва) за 10.12.1920

Многоуважаемый Г-н Ластовскій.

Меня очень удивляет Ваше замѣчаніе хотя я хорошо знаю русскій язык я не могу уловить разницы между «Бѣлая Россія» и «Бѣлорусь»,

при переводѣ создавать не существующих слов я не могу, но полагаю что Вы можете это легко поправить сдѣлав этим самым текст мало понятным для французов.

Съ почтеніем
J.Dicker
582.1.45:128

[1] Наняты В.Ластоўскім перакладчык (гл. наступны дакумэнт).

2541. Нататкі Вацлава Ластоўскага з побыту на сэсіі Лігі Нацыяў у Жэнэве 10-16.12.1920

Жэнэва
10.XII.20

Пакуль над'едуць Цвікевіч, Баркоў, Анэкштэйн маю шмат труднасцей з нарыхтаваньнем работы. Асабліва цяжка дзеля незнаньня французскай мовы.

Адшукаў тлумача жыда з Вітэбшчыны. Жыве ён 35 гадоў ужо у Швайцарыі і рвецца на Беларусь — каб там памерці.

Мэморьял здаў у перэклад. За перэклад і надрукаваньне 16 страніц жадаюць 200 франкоў (лічучы франк 12 марак = 2400 ням. мар.). Цэны наагул тут вельмі высокія на усё.

11.XII. Быў у Літвіноў (Hotel de la Paix) бачыўся с Клімасам, Вольдэмарасам і інш. Кажуць, што быў тут Ладноў і Вэнд. Спраўдзіўшы у готэлях даведаўся, што абодвы выехалі. Літвіны адносяцца даволі прыхільна. У мэморьяле жадаюць паправак у сэнсе прызнаньня Вільні, як места літоўскага. на гэто згодзіцца мы ня можэм. І так з нашай стараны даволі вялікіе уступкі — мы згодзіліся лічыць Вільню літоўска-беларускім местам.

Вечэрам прыехалі Цвікевіч, Баркоў, Анэкштэйн. Я сустрэціў іх на вагзале. Затрымаліся у готэлі «Monopol» узялі побач 4 пакоі.

Цэлы дзень зыйшоў на бегатні шукаючы Украінцоў, Латышоў, Эстоў, Грузіноў. Бачыліся з украінскім дзеячом Чыжэўскім. Гэто ледзь жывы ўжо старэц, але ешчэ даволі быстраго розуму. Прыняў, як сваіх.

Вечэрам у месце гуляюць карнавал-маскарад. На вуліцах тысячы перэадзетых, гоман, крык, музыка. Выглядае ўсе гэто на староннага чэлавека даволі цікава, але разам с тым і даволі трывіяльна.

14.XII. Жэнэва

Адбыўся абед аколічных рэспублік з учасцем профэсуры, політычных дзеячоў і прэссы
былі прэдстаўнікі
Айзебэрджану
Грузіі
Беларусі
Літвы
Латвіі
Украіны
Армэніі
Эстіі
Гаварыліся прамовы і ўсё іншае

Даклад Ладнова
1) Справа аб Езавітаве як Старшыне Рады Н. Мін.
2) Даклад Ладнова
3) Тэкст пастановы Мінскаго Усебеларускаго Зьезду
~~4)~~ 1) ~~Савецкая~~ Б.Н.Р. у фэдэрацыі з Расеяй
2) і ўласць Беларускай Рады Работніцкіх і Салдацкіх дэпутатоў.
Мэморандум 4 дзержаў
У Адэссе 1919 г. (6/II) быў пададзен ген. Анзэльму мэморандум 4 дзержаў Беларусі Украіны Дона і Кубані.
Мэморандум гаворыць аб адбудаваньні Расеі на фэдэратыўных асновах з нізу. г.н. асобные дзержавы заключаюць між сабой саюз як роўныя з роўнымі — ад фэдэрацыі асобных дзержаў паміж сабой да фэдэратыўнай дзержавы у цэлым.
Гэты дакумэнт падпісан:
Украіна — Галіп і Марголін
Беларусь — Некрашэвіч
Дон — Ген. Чэрэчукін
Кубань — Біч (прадседацель Куб. Рады)

Вуліч абеспечыў пазычку Ураду Б.Н.Р. 300.000 тонн вугаля за лясны наш эквівалент.

Пісьмо палк. Купчынскаго
Ен пісаў гр. Палену, што Беларусы ~~проці~~ соучаснікамі немцоў.

Палкоўнік Неклюдоў і член Руск. К-та у Польшчы заявілі Ладн[ов?]у, што яны цверда за тое, каб Урад пераехаў для працы на занятую тэрыторыю і жадалі пачаць перэгаворы з Урадам.

Камандэруецца Камітэтам Экспансіі на Ўсход Цветкоў у Латвію, Літву, Беларусь. Яму абецау Ладноў поўнамочча радніка па фінансавым справам Камі

15.XII.
Адбылася нарада з аколічнымі рэспублікамі
былі:
Айзэбэрджан — Топчерібанов [?]
Беларусь — Ластоўскі, Ладноў, Цвікевіч
Грузія
Украіна — Левіцкі, Шульгін
Латвія — Мееровіц
Літва — Нарушэвіч, Клімас
Эстонія — Пуста

Разбіраліся пытаньня
1) аб пунктах стычных
устаноўлена
а) усе часці б. Расеі
б) усім страшэн Расейскі цэнтралізм
в) адзін дэмократ. лад

2) Аб пунктах разлучаючых
а) адношэньне да усходу
б) группа балтыйская і группа чорнаморская
3) Аб помачы Украіне і Беларусі
пастаноўлена
а) падтрымліваць у прэссе
б) перад Зах. Эўропай
4) Аб адношэньні да Лігі Нацый
Падаць аднародные заявы выражаючые нездаволеньні.

16.XII.

Былі з Ладновым у Дэні, сэкрэтара Лігі Нацый. Гаварылі 1½ гадзіны.

Прасіў даць яму дапаўніцельны мэморандум, у якім выясніць якая форма плебісцыту найбольш для нас адповедна і як-бы хацелі яго арганізаваць.

Былі у Сакалова і Моцкіна (жыдоўскіх сыоністцкіх дзеячоў).

Абецалі нам падмогу і прасілі зняціся з імі у Парыжы

582.1.45:087-087a-087e

2542. Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) Вацлаву Ластоўскаму (Жэнэва) за 11.12.1920

Парижъ 11 декабря 1920

Многоуважаемый,
Вацлав Юстынович!

Я был в Женевѣ. Видѣлся с Представителями Литвы. Один из них (бывшій в делегаціи в Парижѣ) сказал, что вряд ли Вы скоро пріѣдете, и поэтому я предпочел уѣхать, ибо положеніе дѣл было таково, что оставаться на неопредѣленное время в Женевѣ я не мог.

Подробности сообщит Вам Павел Федорович[1]. Он поѣхал Вам навстрѣчу. Я телеграфировал 21 Motz. Цвікевичу, что уѣзжаю обратно.

Вчера от Павла Федор. получил телеграмму, что Вы выѣхали в Женеву. Я просил телеграммой Павла Федоровича прибыть в Женеву и сдѣлать доклад Вам о создавшемся здѣсь положеніи. Поѣздка моя зависит от Вашего рѣшенія в связи с докладом Павла Федор.

Я очень сожалѣю, что не видѣлся с Вами. Многое, очень многое нужно было выяснить. Прошу Вас делегировать немедленно Павла Федоровича ко мнѣ. У него имѣется виза на обратный путь. Жду Вашей вѣсточки и жду Павла Федоровича.

Желаю Вам добраго здоровья. Рад был бы видѣть Вас здѣсь. Вы бы лично убѣдились во всем, что и как было сдѣлано.

Еще раз желаю Вам добраго здоровья!

Уважающій Вас, ЕЛаднов

25 Av. Victor Emmanuel III

Paris.

582.1.45:086

582.1.45:085c — канвэрт

[1] Вэнт.

2543. Запрашэньне дэлегацый Эстоніі, Грузіі, Латвіі, Літвы і Ўкраіны Вацлаву Ластоўскаму на супольную вячэру, якая мае адбыцца ў аўторак 14.12.1920 у рэстаране «Dumont», Жэнэва

582.1.45:085a

582.1.45:085 — канвэрт

2544. Канвэрт тэлеграмы, адрасаванай Вацлаву Ластоўскаму ў гатэль «Monopole» (Жэнэва) 15.12.1920

582.1.45:085b

2545. Суправаджальны ліст Кастуся Езавітава (Рыга) дыпляматычнаму прадстаўніку БНР у Коўне Антону Аўсяніку за 15.12.1920, дасланы з пратэстам Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні генэралу Жэлігоўскаму за 16.11.1920

582.2.58:128 — ма

2546. Мэмарандум, пададзены 16.12.1920 ў Лігу Нацый у Жэнэве Дэлегацыяй Беларускай Народнай Рэспублікі ў справе захопленых Польшчай заходнебеларускіх земляў

Мэморандум, паданы у Гэневе у Лігу Нацый, Дэлегацыей Беларускай Народнай Рэспублікі 16-га сьнежня (декабря) 1920 году.

Расея і Польшча, зводзячы свае старыя гістарычныя рахункі на працягу апошняга году, ваевалі на тэрыторыі Беларусі і [у] завяршэньне нанесеных імі беларускаму народу крыуд, знайшлі магчымым без учасьця прэдстаунікоу Беларусі і не гледзячы на энэргічныя пратэсты Дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі, самавольна распарадзіцца долей беларускага народа і яго тэрыторыей падпісаньнем Рыжскай прэлімінарнай умовы.

Згодна Рыжскай умове да Польшчы павінна адыйсьці 100.000 кв. кіломэтрау спакон веку беларускай тэрыторыі з насяленьнем у 4.500.000 чалавек. Другую, усходнюю часьць пакінулі у безкантрольнае распараджэньне Савецкай Расеі.

Мір гэты зневажыу сьвятыя правы народау на самаазначэньне.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі гэтым мае гонар зьвярнуцца да Лігі Нацый і вылажыць свае справядлівыя трэбаваньні адносна захвачаных Польшчай заходня-беларускіх зямель.

Беларускі народ вынясшы на сваіх плячох большую часьць жахау сусьветнай вайны, матэрыяльна зруйнованы і духоуна змучаны, мае права разлічаць на помач Лігі Нацый у сэнсе ненарушэньня яго сувэрэнных правоу; членам Лігі Нацый у данным выпадку зьяуляецца Польшча.

Уся тэрыторыя якую заселяюць цяпер беларусы, гэта значэ быушая Гродзенская, Віленская, Менская, Магілеуская, Вітэбская і Смаленская губэрніі, а так сама Аугустоускі павет Сувалскай губэрніі — есьць спаконвечная беларуская земля. Калі зьвярнуцца да старынных рускіх хронік (летапісяу) Іпацьеускай, Валынскай і другіх памятнікау пісьменнасьці, калі заглянуць у старыя польскія хронікі (Длугаша і Стрэйкоускага), калі абзнаеміцца са старыннымі хронікамі грэцкімі, арабскімі і другімі, то мо-

жна пераканацца, што уся вышэй указаная беларуская земля раней X сталецьця заселена была іменна беларускімі пляменамі: крывічамі, дрэгавічамі, бужанамі, наравянамі, каторыя нічога супольнага ня мелі з «ляшскімі» г. зн. польскімі пляменамі, і вялі з імі пастаянную барадзьбу. Бліжэйшымі суседзямі беларускіх пляменау былі мазоушане — ляшскае племя, якое жыло за Бугам і Нарэвам. Храбры князь Мазавецкі Конрад у пачатку XI сталецьця шмат разоу нападау на беларусау, якія жылі на правым берагу Буга і Нарэва і не раз удавалася яму захапіць беларускія гарады Драгічын, Мельнік і Бярэсьце на Бугу, але хутка беларусы прымушалі яго йсьці назад за Буг і Нарэу. Беларускімі князьзямі на Бугу у XI сталецьці былі аснаваны гарады Драгічын, Мельнік, Бранск, Бярэсьце, у вярхоуях Нарэва Сураж, Бельск, Камянец, Васількоу; на рацэ Немане Горадню. Па некаторых данных горад Горадня аснаваны быу куды раней X сталецьця адным з Полацкіх князеу, а горад Полацк — сьведка сівой беларускай старыны — быу доугі час сталіцай беларусау-крывічоу. У г.г. Брэст і Камянцы у XII сталецьці князь Уладзімір, Іоан Філосау збудавау каменныя вежы. Камянец як стойкі сьведка беларускай старыны і беларускай дзержаунасьці істнуе і цяпер, а г. Брэст зруйнаваны недауна у другой палове XIX сталецьця.

Горадня была сталіцай удзельнага княжства блізка што да паловы XIII сталецьця г. зн. да нашэствія татарау, калі і падчыніуся Вялікаму Князю Літоуска-Беларускаму. Вітаут слаунай пабедай над нямецкімі крыжакамі пры Грунвальдзе, пасьля вайны і пабеды над сваім дваюродным братам — польскім каралем Ягелла (Владыславам) зрабіу гор. Горадню сваей сталіцай і разам з тым сталіцай Літвы і Беларусі. Заходняй граніцай яго дзержавы са стараны палякоу былі тыя-ж самыя рэкі Буг і Нарэу. І пасьля Вітаута Літва і Польшча яшчэ не адзін раз то злучаліся пад уладай аднаго караля польскага і вялікага князя літоускага, то знова расходзіліся і жылі саусім незалежна, маючы адна свайго караля, другая свайго вялікага князя, але Буг і Нарэу незьменна аставаліся граніцай паміж Польшчай з адной стараны і Літоуска-Беларускім вялікім княжствам з другой. І нават пасьля Люблінскай уніі (1569 г.) калі Польшча усіліушыся на шчот Літвы і Беларусі у працягу 200 гадоу, да раздзелу у 1772 годзе атрымала магчымасьць распараджацца на Літве і Беларусі у сваіх інтэрэсах, але лічучыся са старымі правамі і прывілегіямі Літоуска-Беларускага княжства яна ня сьмела нарушыць дзержауныя граніцы сваей з літоуска-беларускім княжствам, і рэкі Буг і Нарэу усе аставаліся пагранічнай лініей, свайго роду дэмаркацыйнай лініей, пераход якой абстауляуся некаторымі фармальнасьцямі. Так прыкладам кароль польскі і вялікій князь Літоускі, едучы з каралеуства у княжства, на Бугу чы Нарэву, г. зн. на граніцы павінен быу меняць сваю польскую сьвіту на сьвіту літоускую.

Такім чынам, каралеуства Польскае мела са стараны вялікага княжства Літоускага сваю строга акрэсьленую дзержауную граніцу па рэках Бугу і Нарэву да самага раздзелу Польшчы г. зн. да канца XVIII сталецьця. Гэта дзержауная граніца схадзілася з граніцай этнаграфічнай, — па

левай старане Буга і Нарэва Польшча і палякі, па правай старане Буга і Нарэва — Беларусь і далей Літва, беларусы і далей літвіны.

Ясна, што гістарычныя і этнаграфічныя асновы усецэла зводзяцца да таго, што і у цяперашні час і у будучыне рэкі Буг і Нарэу павінны аставацца дзержаунай граніцай паміж Польшчай з аднэй стараны і Беларускай або Літоуска-Беларускай дзержавай (гэта дамовая справа Літвы і Беларусі) — з другой стараны. Калі гэта старая гістарычная і этнаграфічная граніца не задавальняе Польшчу у якім небудзь другім сэнсе, прыкладам у стратэгічным, эканамічным, то гэта саусім не датычэ прынцыпа самаазначэньня нацыянальнасьцяу, а зьяуляецца довадам толькі імпэрыялізма і захватау.

Люднасьць Горадзеншчыны у агромнай большасьці беларуская. 1.000.050 праваслауных беларусау, а з 370.000 каталікоу — самая большае 70.000 палякоу і апалячаных беларусау, рэшта-ж 300.000 каталікоу — беларусы. Значэ на 1.300.050 беларусау у Гродзеншчыне прыходзіцца не больш за 5½ % палякоу. Такое працэнтнае атнашэньне ліку беларусоу і палякоу гаворэ само за сябе. Натуральна, што беларусы Гродзеншчыны пасьля 1905 году былі захоплены агульным нацыянальна-беларускім рухам і адразу высунулі цэлы рад відных дзеячоу, прымаючых непасрэднае учасьцьце у нацыянальным будаўніцтве, у нацыянальнай рабоце.

Барадзьба за нацыянальнае самаазначэньне пры расейскім царскім рэжыме у шырокіх разьмерах было нема[гчы]ма да 1914 году і выражалася у рабоце глауным чынам культурна-прасьветнай і нацыянальнай прапагандзе. Вайна і цяжкі рэжым нямецкай акупацыі у пачатку прыглушыу гэты рух, але пасьля нямецкая улада дазволіла аткрыць беларускія школы, друкаваць беларускія кнігі і закладываць беларускія арганізацыі. Асабліва добрым у гэтым значэньні быу 1918 і пачатак 1919 гадоу. За гэты кароткі час у Гродзеншчыне было аткрыта больш 100 беларускіх школ, у м. Сьвіслачы пачала працаваць беларуская вучыцельская семінарыя, на весках арганізовываліся беларускія нацыянальныя камітэты, беларускія коопэратывы. У месяцы студзеню (январу) 1919 году у г. Горадні быу сфарміраваны Першы пехотны беларускі полк і адзін эскадрон кавалерыі і такім чынам быу паложан пачатак арганізацыі нацыянальных беларускіх воінскіх часьцей. Сярод беларускай вясковай люднасьці у усіх паветах Гродзеншчыны нацыянальна беларускі рух разліваўся шырокай фалей, канцэнтрыруючыся у Горадні кругом працаваўшых тама-ка арганізацый: «Беларускага Камітэту», «Гродзенскай Беларускай Управы», «Гродзенскай Павятовай Селянскай Рады», аб'еднаўшыхся у месяцы сакавіку (марцу) 1919 году у «Цэнтральную Беларускую Раду Гродзеншчыны».

Такім чынам нацыянальны рух сярод беларускай люднасьці Горадзеншчыны, характэр і напражэньне нацыянальнай работы захоплівалі люднасьць тым стыхійным патокам, які выносіць народ да дзержауна-нацыянальнага будаўніцтва, стаушага ужо аб'ектам усяго беларускага руху у Горадзеншчыне і пажаданай справай для усяго беларускага насяленьня гэтай заходней акраіны Беларусі. Гэты рух адналькова інтэнсыуна захапіу усіх беларусоу Гродзеншчыны ад Немана на поуначы да Буга і Нарэва на поудні, і ад ракі Бабра на захадзе да ракі Мухауца на усходзе.

Асабліва усіліуся гэты рух, калі прайшлі злавешчыя чуткі аб прэдстаячай акупацыі Гродзеншчыны палякамі. Люднасьць не траціла надзеі, што пагроза мінуе, што Антанта не дапусьціць такой вялікай несправядлівасьці у адносінах да 15.000.000 беларускага народу, такой цяжкай абіды у адносінах да 1.500.000 беларускага насяленьня Гродзеншчыны, цяжка пацярпеушага у часе вайны і нічым не правініушагася перад Антантай.

Але дзевяты вал накаціуся... У канцы месяцу красавіка (апрэля) уся ужо Гродзеншчына заліта была польскай фалей, напоунена польскімі жандармамі. Беларускі полк у Горадні вераломна быу разаружэны, абрабованы і разогнаны, а ахвіцэры інтэрнаваны, хто у Кракау, хто у Брэст, хто у Беласток і г. д. Беларускія школы за выключэньнем толькі аднэй у горадзе Горадне закрыты, вучыцелі-ж, часьцю пасаджэны у турму, часьцю інтэрнаваны туды куды і ахвіцэры, часьцю проста разагнаны. Беларускія нацыянальныя арганізацыі прымушаны былі замоукнуць і замерьці, дзеля таго што блізка усе дзеячы былі арэштаваны, пасаджэны у турмы, а пасьля разасланы у канцэ[н]трацыйныя лагеры Польшчы і Галіцыі. Аставалася яшчэ некаторы час у Горадні «Беларуская Рада Гродзеншчыны», але гэта была ужо не беларуская арганізацыя, а простая фікцыя з 3-4 падстауных асоб чэрпаушых шмат грошы з польскага кішаня... Беларускія вясковыя арганізацыі былі разгромлены, а больш відныя дзеячы былі арэштаваны, штрафованы, рухомая маемасьць іх рэквізована, самі-ж яны пасаджэны у турмы, дзе яны падвергаліся пабоям і у рэшце большасьць з іх была інтэрнавана у Польшчу і Галіцыю. У замену вясковых беларускіх камітэтау на весках палякі сарганізавалі парафіяльныя камітэты пад прэдседацельствам ксяндзоу-палякоу, солтысау і войтау, назначаных палякамі; польскія паны і польскія жандармы сталі сільна прыгнетаць і тэрорызаваць мейсцовую беларускую людасьць праваслауную у надзеі перацягнуць на сваю сторану беларусоу-каталікоу. Праваслауныя цэрквы ніколі не быушыя касьцеламі часьцю закрываліся, часьцю перараблялися у каталіцкія касьцелы. Праваслауных сьвяшчэннікоу выганялі з прыходау, забараняючы ім адпрауляць службу. Нанова назначаных праваслауным Гродзенскім біскупам сьвяшчэннікау не дапушчалі у прыходы, адбіралі у праваслаунага духавенства іх зямельныя надзелы, поле і сенажаці, а так сама прыхацкія дамы, выганяючы праваслауных сьвяшчэннікау з цэркоуных кватэр і прэдстауляючы ім ютіцца у цесных селянскіх хатах разам з селянскай сямьей. Праваслаунага біскупа Уладзіміра у Горадні уселяк зневажалі і здзеківаліся над ім, рабілі у яго памешканьні обыскі, падымаючы нават падлогі. Было пяць выпадкау, калі польскія салдаты у Горадні астанаулівалі на вуліцы біскупа Уладзіміра, хваталі яго бораду і гразілі бораду абрэзаць... У замену беларускіх школ аткрыта палякамі многа польскіх школ у гарадах і весках, процію жаданьня насяленьня, не сьмеушага голасна пратэставаць. Абучэньне у школах гэтых вядуць запрошаныя з Галіччыны польскія вучыцелі і пераважна вучыцелькі.

Гэты страшны дзевяты вал польскі пакрыу чорнай пеляной беларускую Гродзеншчыну у працягу блізка 1½ года, з студзеня—красавіка

1919 года па ліпень 1920 г., калі палякі пад націскам бальшавікоу вышлі з межау Гродзеншчыны.

У канцы месяца верасьня гэтага 1920 году палякі узноу занялі Гродзеншчыну, а па Рыжскай умове 12 кастрычніка нешчаснай Гродзенскай Беларусі гразіць сьмяртэльная небязпечнасьць быць праглынутай Польшчай назаусегды.

Нешчасная беларуская Гродзеншчына у сьмяртэльным жаху працягівае ужо скаваныя польскімі путамі свае рукі да Лігі Народау і да усіх народау сьвету і моліць выратаваць яе ад палякоу і вярнуць ей свабоду, права і магчымасьць істнаваць непадзельна з усей Беларусей.

Беларуская Гродзеншчына не адзін раз ужо заяуляла сваю волю і свае права на самастойнае нацыянальна-дзержаунае істнаваньне супольна і непадзельна з усей Беларусей. Заяуляла аб гэтым на Усебеларускім Установчым Кангрэсе у Менску у сьнежню 1917 году. Заяуляла аб гэтым у Вільні на Беларускай канфэрэнцыі 20 лістапада 1918 году. Заяуляла аб гэтым у Горадні на зьездзе каля трохсот правамоцных дэлегатау ад беларускага насяленьня усіх гарадоу і весак усіх дзевяці паветау Гродзеншчыны.

Разам з тым Гродзеншчына беларуская не адзін раз заяуляла энэргічны пратэст свой, як праяуленьне волі усяго беларускага насяленьня Гродзеншчыны, ня толькі проціу прылучэньня да Польшчы, але нават проціу польскай акупацыі. Пратэст такі заяулен быу дыплематычным прэдстаунікам Амэрыкі, Англіі, Францыі і Італіі у Спаа 8 студзеня 1919 года.

Такія жа пратэсты неаднаразова пасылаліся Польскаму Ураду і у Польскі Устаноучы Сойм (31 студзеня 1919 году, 31 сакавіка 1919 году і інш.).

Непадстаунасьць польскіх прэтэнсый на прылучэньне да Польшчы Беларускай Гродзеншчыны ясна відаць і з таго, што, як выжэй сказана, Гродзеншчына ніколі, да астатняга раздзелу Польшчы у 1795 году, не уваходзіла у склад этнаграфічнай Польшчы. Этнаграфічна-дзержауная граніца самаго каралеуства Польскага чы Польскай Кароны на пауночна-усход усегды гранічыла р.р. Бугам і Нарэвам, за якімі непасрэдня пачыналася Літоуска-Беларускае Вялікае Княжства, насяленьне якога складалася з беларусау і літоуцау. Гэта граніца ніколі не аспарывалася нікім, ні нават самімі палякамі і калі у 1815 году на Венскім Кангрэсе пастаноулена было вазстановіць «Герцагства Варшаускае», то граніцай Герцагства на пауночна-усход з боку Беларусі была выстаулена старая этнаграфічная лінія паміж Польшчай і Беларусей па рэкам Бугу і Нарэву.

Натуральны па істоце справы і па фармальна-юрыдычным нормам вывад з усяго выжэйпаказаннага можэ быць вылажан у наступаючых пунктах:

а) не падлежачыя спрэчцы гістарычныя і этнаграфічныя даныя сьведчаць, што адвечнай граніцай Беларусі, як часткі Вялікага Княжства Літоуска-Беларускага на заходзе (з боку Польшчы) была рака Буг, прыблізна ад м. Владавы да упадзеньня у яе ракі Нурца, пасьля, тячэньне ракі Нурца да ракі Нарэва паміж гарадамі Суражам (беларускі г.) і Лапамі (польскі г.), далей р. Нарэу да упадзеньня у яе ракі Бабра і нарэшце тячэньне ракі Бабра у напрамку на горад Аугустоу.

б) гэта заходняя граніца Беларусі за увесь польскі перыед існаваньня польскага каралеуства і Віленскага Княжства Літоуска-Беларускага ніколі не нарушалася ні да Люблінскай уніі (1569 г.) ні пасьля яе аж да астатняга раздзелу Польшчы у 1795 году.

в) Гродзеншчына, непасрэдна прылегаючая з усходу да рэк Бугу, Нурца, Нарэву і Бабру, г. зн. да гістарычна-этнаграфічнай граніцы самой Польшчы, спакон вякоу заселена была беларускімі племенамі дрэгавічэй, бужан, наравян і заусегды вялі барадзьбу з жыушымі па другой старане гэтых рэк польскімі племенамі (мазурамі і інш.) — за гэту гістарычную і этнаграфічную сваю граніцу і утрымалі яе да канца XVII сталецьця.

г) Умацаваньне Польшчы за шчот Літвы і Беларусі пасьля Люблінскай уніі не закранула тэрыторыяльную граніцы Гродзеншчыны з боку Польшчы, граніца аставалася тая самая, як натуральная этнаграфічная. Замест гэтага Польшча прабавала колонізаваць Гродзеншчыну выхадцамі з Польшчы, перацягівала на сваю старану літоуска-беларускіх баяроу прэдастауленьнем рожнага роду пасад, прывілегій і польска-шляхэцкіх гярбоу (Городэльскі Сойм 1413 году) і надзеляла на Літве і Беларусі польскіх магнатау зямельнай уласнасьцю. Плян колонізацыі не удауся, дзеля энэргічнага пратэсту літвіноу і беларусау, але апалячэньне літоускіх і беларускіх баярау пайшло скорым тэмпам і літоуска-беларускія баяры папоунілі сабой рады польскіх магнатау, адракліся ад свайго народу. Справа надзяленьня польскіх магнатау зямлей на Літве і Беларусі не сустрэціла асобных перашкод, дзеля збліжэньня польскіх магнатау з быушымі літоуска-беларускімі баярамі шляхом прыняцьця астатнімі польскіх гярбоу і станавіліся радней польскіх магнатау.

д) Здрада літоуска-беларускіх баярау свайму народу і апалячэньне іх адарвалі іх ад народных мас, але астатнія аднак цьверда асталіся вернымі сваей мове, быту і нацыянальнасьці і зьбераглі сваю нацыянальную беларускую самабытнасьць да гэтага часу, — часу нацыянальнага падняцьця і адраджэньня беларусоу і літвіноу.

е) Апалячэньне верхняга слою на доугі час пазбавіла беларускі народ кіраунікоу, але большае зло скуткам гэтага было у тым, што вялізарныя зямельныя маенткі цяперашніх патомкау старых беларускіх дваранскіх фамілій лічацца ужо польскай зямлей, як і самі уласьнікі гэтых зямель лічуць сябе палякамі. Такім чынам адвечныя беларускія землі узятыя калісь-то з беларускага народнага фонду, землі, якія як спадчына есьць уласнасьць беларускага народу штучна падводзяцца пад рубрыку польскіх — і зьяуляюцца аб'ектам прытязаньняу польскага ураду і польскай грамадзкай думкі, — прытязаньняу, як відаць з выжэйуказанага, зусім не падстауных, штучных.

ж) Так сама штучны і непадстауны указаньня на тое, што у Гродзеншчыне, гэтай адвечна беларускай часьці, жыве многа палякоу, — настолькі много, что Гродзеншчына больш Польшча чым Беларусь. А папраудзе у Гродзеншчыне палякоу усяго наусяго ня больш 5,5% усяго насяленьня. Гэтыя палякі — гэта у большасьці памешчыкі-каталікі, старых беларускіх баярскіх радоу. Пасьля апалячэныя мешчане-беларусы у

гарадох і дзесятак шляхэцкіх аколіц — дауніх коланістау выхадцау з Польшчы.

з) Грамадзкая думка Польшчы і Польскі Урад хочуць пераканаць сябе і усіх, што усе каталіцкае насяленьне Гродзеншчыны — палякі.

Падцьвярджэньне гэта зусім не падстаунае, гэтага прауда і даказываць ня трэба, дзеля тага што рэлігійная прыналежнасьць ні у якім выпадку не можэ быць прызнаваема за прызнак нацыянальны. Гэта зусім відочна вытлумачываецца прыкладам Гродзеншчыны. У 9 паветах Гродзеншчыны 1.000.050 праваслауных і 370.000 каталікоу. І праваслауныя і каталікі дома у сябе, гаворуць «папросту» — г. зн. па-беларуску (а не «па-панску», г. зн. па-польску); мацярынская мова, як тых так і другіх «простая» г. зн. беларуская. Нацыянальна беларускі рух захапіу як тых, так і другіх, як сярод народных мас у селах і весках, так і сярод гарадскога насяленьня і інтэлігэнцыі, нават больш таго, у радох першых і глауных дзеячоу і працаунікоу беларускага руху беларусоу каталікоу было і есьць ня меньш чым беларусоу праваслауных.

І калі сярод беларусоу-каталікоу есьць пэуны лік такіх значна апалячэных, якія цягнуць да Польшчы, то % іх у агульным ліку беларусоу-каталікоу Гродзеншчыны не вялік. Значна большы лік беларусоу-каталікоу лічыць сябе беларусамі і жадае прылучэньня не да Польшчы, а да сваей роднай Беларусі.

і) Гродзеншчына з $1^1/_2$ мільеным беларускім насяленьнем досьць умыслова развітым і у большасьці граматным, не можэ і не павінна быць разглядываема, як этнаграфічнае удабрэньне для якой-небудзь суседней, напрыклад польскай нацыянальнасьці. Паутара мільена гродзенскіх беларусоу цьверда ведае, што яны беларусы, што належаць яны да вялікай 16-мільеннай сямьі беларускага народу і жадае жыць сваім нацыянальным жыцьцем разам з усей Беларусей.

к) Каля $1^1/_2$ гадічная акупацыя Гродзеншчыны палякамі у 1919 і 1920 гадох да наступленьня бальшавікоу дало беларускаму насяленьню Гродзеншчыны такую цяжкую і страшную картіну терору і гвалту з боку польскай улады і польскіх жандармау, што адна думка аб прылучэньні іх да Польшчы прыводзе у жах нешчаснае насяленьне у гэта[й] многа перамучыушайся заходняй акраіне Беларусі.

І гістарычныя і этнаграфічныя даныя і настрой і жаданьня і воля агромнага насяленьня большасьці Гродзеншчыны, як чыстакроунай часткі Беларусі і апошняя спроба жорсткага тэрору і гвалту з боку палякоу у адносінах да беларусоу Гродзеншчыны зьяуьляюцца выстарчаючымі довадамі і указацелямі да рашэньня пытаньня аб Гродзеншчыне.

У імя справядлівасьці, у імя права на нацыянальнае самаазначэньне, у імя прыналежнасьці этнаграфічнай, гістарычнай і бытавой да 16 мільенай беларускай сямьі, у імя народнага дабрабыту і міру і у рэшце для спыненьня незаслужаных і незвязаных патрэбнасьцю цяжкіх мук $1^1/_2$ мільена беларусоу праз далучэньне іх да чужой для іх і воражай ім Польшчы, Гродзеншчына уся цалком у старых гістарычных і этнаграфічных граніцах павінна увайсьці у склад Беларусі, але ні у якім выпадку не у склад Польшчы.

Г. Вільня — дрэуняя сталіца Літвы і Беларусі. Горад будаваўся (з 1313 году), умацовываўся і украшаўся усільлямі і трудамі літоўцоў і беларусоў. Гэта быў ня толькі палітычны, але культура-прасьветны і духоўна-рэлігійны цэнтр, як для літоўцаў-каталікоў, так і праваслаўных беларусоў. Горад Вільня быў і таргова-прамысловым цэнтрам для абодвых народаў.

Такое значэньне для Літвы і Беларусі горад Вільня зьберэгае і да нашых дней.

Насяленьне Віленшчыны толькі літоўска-беларускае. Заходняя частка Віленшчыны населена літоўцамі, большая-ж частка усходняя заселена беларусамі. Палякоў у Віленшчыне незначны процэнт. Беларусоў-каталікоў нельга лічыць палякамі, як таго жадала-б Польшча. Хаця сярод беларусоў-каталікоў і есьць прыхільнікі да Польшчы, але % іх не вялікі і у кожным выпадку яны астаюцца беларусамі і гавораць дома «па-просту», г. зн. па-беларуску. Начынаючы з 13 сталецьця гістарычны лес цесна зьвязывалі і зьвязываюць беларускі народ з народам літоўскім. Абодвы гэтыя народы у добрай згодзе і брацкім пажыцьці мелі агульную моцную і слаўную дзержаунасьць да другой паловы 16 сталецьця, а пасьля у працягу больш 300 гадоў разам адналькова мучыліся ад польскага імпэрыялізму (200 гадоў) і пасьля ад расейскага (150 гадоў).

Вялікая вайна дала таучок да нацыянальнага і дзержаунага адраджэньня як літоўцаў так і беларусаў. Больш спрыяючыя замежныя варункі далі магчымасьць Літве яшчэ два гады таму назад пачаць дзержаунае будаўніцтва і залажыць фундамэнт для новага дзержаунага самастойнага жыцьця. Беларусы-ж да астатняга часу пазбаулены была гэтай магчымасьці. Тэрыторыя Беларусі да гэтага часу служыць тэатрам барадзьбы паміж Расеяй і Польшчай і аб'ектам прытязаньняў тэй і другой, а дзеля гэтага справа дзержаунага будаўніцтва Беларусі як самаістнага палітычнага арганізму, на сваей дарозе да гэтага часу сустрэчае непрэадольныя перашкоды. Але гэта не значэ, што 16 мільены беларускі народ адмовіуся ад права на сувэрэннае нацыянальна-дзержаунае жыцьцё і не хочэ яго, а пазбавіць яго гэтага права ніхто ня можэ, дзеля таго што гэта было бы актам жорсткай несправядлівасьці і гвалту, з якім беларускі народ ніколі не памірыуся бы і бароуся бы за сваю свабоду да канца. Але старыя брацкія узы, добрыя гістарычныя успамінаньня і преданьня даунейшага часу, а так сама агульныя цяжкія варункі паднявольнага жыцьця у працягу трох астатніх вякоў цесна зьвязывае гэтыя два народы літоўцеу і беларусоў — узаемнай сымпатыей, даверьем і дружбай. Гэта гістарычная і маральная зьвязь у месяцы лістападзе 1920 году нашла сабе выражэньне у асобнай фармальнай згодзе ураду Літоўскай Народнай Рэспублікі з урадам Беларускай Народнай Рэспублікі. Пытаньне аб будучых узаемаадносінах Літвы і Беларусі — пытаньне унутранае, пытаньне дамовае і формулы для апрэдзяленьня гэтых адносін найдуцца лехка, самі сабой, парукай гэтаму служаць і гістарычныя традыцыі, узаемнае дружалюбіе і даверье, эканамічныя варункі і адналькавасьць бытовых асобнасьцеу. А дзеля таго і пытаньне аб г. Вільні, адналькова важным і дарагім як для літоўцаў так і для беларусаў і аб Віленшчыне наагул — есьць дамовае унутранае

пытаньне, толькі літоуцау і беларусау.

Але на жаль у гэтым пытаньню, як відаць ясным і простым, узьнік зацемняючы і затрудняючы яго рашэньне асаблівы варунак — гэта прытязаньне на г. Вільню з боку Польшчы.

Але гор. Вільня ніколі ня быу польскім горадам.

Як сталіца Вялікага Княжства Літоуска-Беларускага спачатку злучанага з Польшчай на началах асабістай уніі а пасьля паступова захопленага польскім імпэрыялізмам, г. Вільня у працягу 2-3 астатніх сталецьцій быу аб'ектам сільнага імпэрыялістычнага польскага націску. Дзеля гэтага, высшы слой літоускага і беларускага грамадзянства у г. Вільні а пачасьці гарацкое мешчанства уляглі нацыянальнай пераработце і пачалі цягнуць да Польшчы, — імі вот і прыкрываецца Польшча, стварыушы авантуру Жэлігоускага, але праудзівая мэта Польшчы — імпэрыялістычная, г. зн. пашырэньне сваіх граніц на шчот Літвы і Беларусі і разам з тым абарона тут вялізарных маенткау польскіх магнатау, як фонду для польскай колонізацыі.

Штучнасьць і непадстаунасьць прытязаньній Польшчы на Віленшчыну зусім ясна і зразумела. Прытязаньні гэтыя груба пярэчаць даным гісторыі і этнаграфіі і груба нарушаюць нацыянальна-дзержауныя правы Літвы і Беларусі.

Дзеля гэтага пастанова Лігі Народау скарыстаць плебісцыт для вырашэньня пытаньня аб будучай прыналежнасьці Віленшчыны да Літвы чы да Польшчы зьяуляецца нечаканай і не можэ быць інакш вытлумачана, як захватнае імкненьне палякоу. Вільня ня можэ адыйсьці да палякоу — гэта горад літвіноу і беларусоу — гэта іх спадчына, іх сьвятыня.

Калі-ж не лічучыся з усімі даннымі гісторыі і этнаграфіі Ліга Народау знайдзе магчымым не прыняць пад увагу гэтых даных — і рашыць правясьці плебісцыт, то простая справядлівасьць патрэбуе, каб плебісцытная формула была перамененa і збудована згодна данным гісторыі і этнаграфіі, г. зн. каб пытаньне рашалася аб будучай прыналежнасьці Віленшчыны чы да Літвы і Беларусі з аднаго боку, чы-ж да Польшчы — з другога боку. У карысьць прыналежнасьці горада Вільні да Літвы і Беларусі — галасы павінны складацца у адну сумму.

582.1.11:087-103 — мк бел
582.1.11:104-113 — мк бел
582.1.19:017-030 — шк фра
582.1.46:073-086 — шк фра
582.2.12:032-047 — мк рас
582.2.47:066-079 — шк фра
582.2.51:057-070 — шк фра
582.2.52:128-141 — шк фра
582.2.54:530-542,528 — шк фра
582.2.54:543-555 — мк бел

2547. Суправаджальны ліст старшыні Дэлегацыі БНР у Жэнэве Вацлава Ластоўскага прэзыдэнту Лігі Нацыяў за 16.12.1920, дасланы з мэмарандумам Дэлегацыі БНР

DELEGATION
de la REPUBLIQUE DEMOCRATIQUE
de BELAROUS.

Genève, le 16 Décembre 1920.

Monsieur le Président
de la Société des Nations
GENEVE

Monsieur le Président,

La délégation de la République Démocratique de Bélarous (Russie (-Ruthénie)-Blanche) a l'honneur de présenter, en votre personne, à la Société des Nations, un mémoire contenant les vœux du peuple bélarussien.

La Bélarous, située entre la Lettonie, la Russie, l'Ukraine, la Pologne et la Lithuanie, comprend un territoire de 260.000 Km. carrés avec une population de 15 millions. Ce pays, très riche en bois, lin, chanvre, tourbe et autres matières premières, après avoir été exposé, pendant 5 ans, aux malheurs de la guerre dont elle était le théâtre, est épuisé matérialement et moralement comme aucun autre pays ne l'est.

Le peuple bélarussien, dès la convocation du Congrès Constituant à Minsk en 1917, lutte pour son indépendance politique. Il a son parlement (la Rada de la République — env. 200 députés) et un Gouvernement élu par ce parlement. L'indépendance de la Bélarous est reconnue officiellement par la Finlande, la Lithuanie et l'Ukraine (de jure), aisi que par les autres Etats allogènes de l'ancien Empire Russe.

La Russie et la Pologne, suivant le principe de droit des peuples de gouverner eux-mêmes ont reconnu également l'indépendance de Bélarous par le traité de Riga (12 Oct. 1920). Cependant le même traité contient les clauses fixant la division du territoire de la Bélarous entre la Russie et la Pologne. Le Gouvernement bélarussien n'ayant pas de force pour résister à ces deux Etats fut obligé de chercher l'abri en Lithuanie.

Le mémoire fait savoir que:

1°. Le peuple bélarussien ne consentira jamais à l'annexion par la Pologne de la partie occidentale de son territoire (env. 100.000 Km. carrés), ni aux prétentions des Polonais à la ville de Vilna et sa province. Vilna est le centre d'ancien Grand-Duché Lithuano-Bélarussien avec une population bélarusso-lithuanienne prédominante. C'est pourquoi le plébiscite proposé par la Pologne n'apparait pas nécessaire. Le peuple bélarussien n'admettra jamais l'annexion ni l'occupation de ses territoires par les Polonais.

2°. Il n'admettra non plus l'annexion par la Russie des Soviets de la partie orientale de la Bélarous, ni le système d'administration qui y est introduit par les bolchévistes. Il luttera toujours pour son indépendance et son indivisibilité.

Au nom du peuple qu'il représente, le Gouvernement de la République de Bélarous prie la Société des Nations de faire réparer par sa médiation la violation des droits du peuple bélarussien et de lui faire restituer ses territoires annexés par la Pologne et la Russie.

La réconciliation complète entre la Pologne et la Russie, ainsi que le rétablissement de la vie normale en Europe Orientale ne peut être acquis qu'après la

reconnaissance de l'indépendance de la Bélarous et la satisfaction de ses demandes justifiées.

Veuillez agréer, Monsieur le Président, l'assurance de notre plus haute considération.

Le Président de la Délégation
Président du Conseil des Ministres
(Signé). W.Lastowsky.
582.2.37:074&r — шк

2548. Нататкі Вацлава Ластоўскага з сэсіі Лігі Нацыяў (Жэнэва) за 16.12.1920

Найман (Нач прэс-бюро ЛН)
паляк
Косманоў (Старшыня Жэн. Сыоністоў)
Брандінг (лідэр Скандын. соцыялістоў) Гаварыў у нашай справе з Гімансам
Баўмайстар (Заведуе аддзелам прэссы у Міжнар. Б. Прац
Праф. Мільлё
Бутлер (нам. старш. М.Б.П.
Дені (сэкрэтар Політ. аддзелу Л.Н.
Раіў прасіць каб М.Б.П.
паслало сваю сьледчую камісыю
Сакалоў і Моцкін
582.1.25:070

2549. Візытоўка Вацлава Ластоўскага

Waclas Lastovsky
Ministre Président de la République Bielarus
(Russie Blanche)
Président de la Délégation a la Société des Nations
582.1.71:002
582.1.71:008
582.1.71:009

2550. Ведамасьць на выплату пэнсіяў і сутачных вышэйшым урадоўцам Беларускай Народнай Рэспублікі ад ліпеня да сьнежня 1920 году

Рак-Міхалоўскі Сымон
Тэрэшчэнко Козьма
Ўласаў Александра
Іваноўскі Вацлаў — Прэдст. Ураду
Смоліч Аркадзь — " — " — "
Дубейкоўскі Лявон — " — " — "
Трэпка Антон
Тарашкевіч Браніслаў
582.2.56:124-125

Дата невядомая.

2551. «Законъ» о грабежѣ // Невядомая расейская газэта (Воля Россіи?), перадрук зь «Беларускага Слова» (Горадня) за 17.12.1920
582.1.36:004

Пра закон аб надзяленьні зямлёй польскіх жаўнераў у беларускіх і ўкраінскіх паветах

2552. Мэмарандум аб становішчы ў Беларусі, пададзены 18.12.1920 ў Лігу Нацый у Жэнэве Дэлегацыяй Беларускай Народнай Рэспублікі
Дэлегацыя Беларускай Дэмакратычнай Рэспублікі у Гэневе.

Гэнева, 18 сьнежня 1920 г.

Мэмуары, датыкаючыя палажэньня у Беларусі.

I. Урад Беларускай Народнай Рэспублікі.

Апавешчэньне дзержаунай незалежнасьці Беларусі адбылося у м. Менску на Усебеларускім Кангрэсе у сьнежню 1917 г., на якім былі прысутнымі больш як 1500 дэлегатау ад розных палітычных партый, земскіх, гарадзкіх самаупрауленьняу, коопэратывау і іншых устаноу. З усіх падобных кангрэсау, у параунаньні з другімі нацыянальнасьцямі, знаходзячыхся на тэрыторыі быушай Расейскай Імпэрыі з'яуляецца першым па сваей магутнасьці — гэта Менскі Кангрэс.

Чыннасьць гэтага Кангрэсу выявілася у арганізацыі Дзержаунай улады на дэмакратычных асновах, але была сустрэчэна воража з боку бальшавіцкага Савета заходняга фронту расейскай арміі (Обліскомзап'а), пачалася барадзьба, якая цягнулася нядоуга, бо за недастаткам часу Кангрэс ня мог сьцягнуць на помач Менску сваіх беларускіх войскау. Чыннасьць Кангрэсу была прыастаноулена аружнай сілай бальшавікоу.

Тым не менш сябры Кангрэсу пасьпелі выдзеліць са свайго складу выпауняючы орган — Раду Кангрэса лікам з 50 дэпутатау, выбраных усімі фракцыямі. Рада атрымала ад Кангрэсу усю поунату улады да дзержаунай арганізацыі Беларусі. Рада Кангрэсу была хутка папоунена прэдстаунікамі нацыянальных меньшасьцяу (жыды, палякі, велікарусы і г. д.) а так сама прэдстаунікамі прафэсыянальных арганізацый і коопэратывау.

У канцы 1918 году прэдстаунікі заходней часьці Беларусі (занятай з 1915 году нямецкай арміяй) былі так сама у складзе Рады. Дзеля таго, што беларускае дзержаунае самаупрауленьне пачалося у межах Расеі і арганізавалася на дэмакратычных асновах нямецкае камандаваньне адняслося да гэтага надта варожа. Праз некаторы час нямецкія войскі занялі горад Менск. Гэта варожасьць распалівалася польскімі «магнатамі», якія жадалі уберагчы свае маенткі пры помачы рэакцыйнай нямецкай улады. Крупныя польскія землеуласьнікі (памешчыкі) не астанаўліваліся нават перад правакацыяй, гаворачы і запэуняючы, што народна-нацыянальны беларускі рух носіць бальшавіцкі характэр.

25-га сакавіка (марца) 1918 году Рада Кангрэсу аб'явіла асобным актам разрыу Беларусі з бальшавіцкай Расеяй і пасьля прэабразавалася у «Раду Беларускай Народнай Рэспублікі». Рада гэта істнуе і да гэтага часу,

як заканадаучая установа Беларусі і складаецца прыблізна са 180 дэлегатаў. Найбольш важнымі канстытуцыйнымі пастановамі зьяуляюцца:

а) прызнаньне незалежнасьці Беларусі у яе этнаграфічных граніцах;

б) пастанова, якая адносіцца да сазыву беларускага Устаноучага Збору па прынцыпу агульнага галасаваньня;

в) прэдстауленьне нацыянальна-пэрсанальнай аутаноміі усім нацыянальным меншасьцям Беларусі;

г) разрашэньне зямельнай праблемы, аснаванай на прынцыпах раздзелу зямельнай крупнай уласнасьці паміж трудавым селянствам; парадак гэтага раздзелу прэдастауляецца Устаноучаму Сойму.

Астатняя сэсыя Рады мела мейсца у Менску у сьнежню 1919 г. пад польскай акупацыей. Але дзеля варожых адносін акупацыйнай улады агранічылася толькі выбарам ураду цяперашняга складу і зьвярнулася з пратэстам проціу польскай акупацыйнай палітыкі на Беларусі і проціу плянау польскага Ураду прылучыць беларускую тэрыторыю да Польшчы. Вот спіс членау Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі астатняга складу:

Старшыня Рады гр. Ластоускі.

Унутраных Спрау гр. Грыб.

Міжнародовых Спрау гр. Ладноу.

Юстыцыі гр. Цьвікевіч.

Фінансау гр. Белевіч.

Дзержауны Сэкрэтар гр. Душэускі.

Дзержауны Кантралер гр. Заяц.

Большасьць членау прауленьня прыналежыць да партыі сац.-рэвалюцыянэрау. Дзеля таго што Рада Рэспублікі распушчэна на неакрэсьлены час яна прапанавала свае палнамоцтва Прэзыдыуму, які працуе разам з Урадам. У склад Прэзыдыуму уваходзяць:

1. Прэзыдэнт гр. Крэчэускі.

2. Віцэ-Прэзыдэнт гр.гр. Захарка і Бадунова.

3. Сэкрэтары гр.гр. Мамонько і Козіч.

Не гледзячы на безупынную вайну паміж Расеяй і Польшчай, якая не дазваляе Беларускаму Народнаму Ураду умацавацца на сваей тэрыторыі сувязь яго з насяленьнем не толькі не спынілася, але наадварот умацовываецца з кожным днем. Гэта сувязь падтрымліваецца:

1) Членамі Рады Рэспублікі, астаушыміся у розных мейсцох Беларусі.

2) Праз спэцыяльных урадовых камісарау, арганізуючых насяленьне у абедзьвіх частках Беларусі (пад бальшавіцкай акупацыей, а так сама і пад польскай акупацыей).

3) Праз палітычныя партыі (глауным чынам праз партыі беларускіх с.-р.).

4) Праз коопэратывы і усякія нацыянальныя арганізацыі: абласныя, губэрнскія і павятовыя Рады большая частка якіх функцыяніруе з дазваленьня акупацыйных улад (польскай і расейскай).

Не гледзячы на военны стан і рожныя перашкоды Беларускі Урад дзякуючы жывой і чыннай сувязі у працягу барадзьбы не траціць спайкі з народам. Найлепшым довадам гэтай сувязі з народам зьяуляюцца па-

устаньня, якія маюць мейсца то пад акупацыей бальшавікоу, то пад польскай акупацыей і канчаюцца захватам зямлі.

Барадзьба беларускіх нацыяналістау проціу акупантау настолькі цяжкая, бо ім прыходзіцца змагацца проціу двух сільных ворагоу: Савецкай Расеяй і Польшчай. Сусьцігі гэтага паустаньня звычайна выкарыстываюцца аднэй з двух старон знаходзячыхся у стане вайны. Дзеля гэта[га] Беларускі Урад ня меу да гэтага часу магчымасьці асвабадзіць сваю тэрыторыю ад варожай акупацыі.

II. Адносіны Беларусі да суседніх Дзержаў.

Беларускі Дэмакратычны Урад ня можэ прыастановіць да той пары сваей барадзьбы проціу Савецкай Расеі, пакуль яна не прызнае незалежнасьці Беларусі і не дагаварыцца з ею да міру.

Прызнаньне незалежнасьці Беларусі Расеяй Рыжскім мірным дагаварам 12 кастрычніка 1920 году не здавольнівае Урад Беларускай Народнай Рэспублікі, дзеля таго, што гэта прызнаньне можэ быць вытлумачэна як прызнаньне «Савецкай Беларусі».

Адносіны Беларусі да Эсьціі, Латвіі, Літвы самыя найлепшыя. Незалежнасьць палітычная Беларускай Народнай Рэспублікі прызнана гэтымі дзержавамі, якія нават прапануюць Беларусі сваю дапамогу, асабліва Літва аказывае самае прыязнае падтрыманьне Беларусі на тэрыторыі якой часова знаходзіцца Урад Беларускай Рэспублікі.

Адносіны паміж Беларусей з аднаго боку і Украінай, Грузыей і Азарбейджанам з другога боку таксама прыязныя.

Што датычэ адносін Беларусі да Польшчы, трэба засьведчыць што не гледзячы на усе міралюбныя стараньня Ураду Беларускай Рэспублікі, узаемныя адносіны астаюцца нявысьветленымі і нават варожымі.

Польскі Урад да гэтага часу ня можэ дапусьціць, каб наш народ паустау, як незалежная Дзержава і меу бы свой нацыянальны Урад.

Польскае грамадзянскае пераконаньне, якое пяць гадоу таму назад было здаволена сваім этнаграфічным істнаваньнем Дзержавы цяпер свае прэтэнсьі распаусюжывае за Буг і Нарэу. Польскі Урад думае, што захват і дэнацыяналізацыя Беларусі (альбо нават заходняй яе часткі г. зн. Гродзенскай, Менскай і Віленскай губ.) узмацуе Польшчу проціу Расеі і дасьць ей эканамічную базу, якая гварантуе будучае эканамічнае разьвіцьце Польшчы. Гэта заблуда. Такая анэксыя пародіць вечную варажасьць паміж Беларусей і польскім народам. Гэткія спробы не магчымы ня толькі для слабой Польшчы, але для самой Расеі нават у яе старых граніцах, каб выкарыстаць Беларусь для інтэрэсау другіх Дзержау. Такое заданьне ня можэ быць выпаунена, дзеля таго, што беларускі народ толькі што перажыу асвабадзіцельную рэвалюцыю.

Спроба анэксыі Беларускай тэрыторыі зроблена Польшчай у Рызе 12 кастрычніка 1920 г. Фармальнае запатрэбаваньне Беларускага Ураду прыймаць удзел у гэтых перагаворах было адкінута польскай дэлегацыей. Спроба найсьці выйсьце з такога становішча шляхам афіцыяльных перагавораў паміж беларускай і польскай дэлегацыямі ня прывяла ні да чаго, дзеля пазыцыі яунага імпэрыялізму занятага апошняй.

Насільны захват заходняй Беларусі Польшчай быу падмацаваны захватам літоускіх тэрыторый. Генэрал Жэлігоускі захапіу узброенай сілай гістарычны цэнтр Літоуска-Беларускага княжства — Вільню, без якога Літоуская Дзержава а супольна з ей і беларускі народ ня мыслюць свайго істнаваньня.

III. Аб плебісцыце.

Саюз Народау лічыць магчымым спрауляць гэтыя акты гвалту Польшчы правядзеньнем плебісцыту на захопленых тэрыторыях[1]. Урад Беларускай Народнай Рэспублікі лічыць што адзін аружны захват чужых зямель Польшчай есьць ня грунтоуная аснова правядзеньня на гэтых землях плебісцыту.

Тэрыторыя Гродзенскай, Менскай і Віленскай губэрній, захопленая палякамі, ні у якім выпадку ня можэ лічыцца спрэчнай тэрыторыяй. Яна усюды заселена беларусамі: праваслаунымі і каталікамі, а заходняя часткa Віленскай губ. заселена літоуцамі. Усе данныя польскай статыстыкі, зробленныя у апошні час сьведчаць аб гэтым агульна вядомым факце.

Едыны спосаб падкапаць гэту фактычнасьць гэта зьмешываньне прынцыпа нацыянальнага з прынцыпам рэлігійным (.....).

Да такога спосабу падходзіць Польшча, называючы беларусау-каталікоу «белапалякамі» (.....).

Правядзеньне плебісцыту на гэтых адвечна беларускіх землях тлумачыцца толькі часовай слабасьцю Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі, які не мае магчымасьці сілаю атбараніць свае сьвятое права на гэтыя землі перад напорам польскага імпэрыялізму.

Ссылаючыся не на сілу, а на свае сьвятое права Беларускі Урад можэ толькі прасіць Саюз Народау аб аслабаджэньні гэтых зямель ад акупацыйных войск Польшчы.

Плебісцыт непрыемлімы і па другіх прычынах:

а) па статыстычным данным аб уцекачох у 1915 году відаць, што з Гродзенскай, Віленскай і часьці Менскай губ. выбыло у цэнтральную Расею болей, як 2 мільены жыхароу. Выехалі у большасьці беларусы-праваслауныя, якія ідучы за прыкладам сваіх праваслауных сьвяшчэннікау уцекалі ад прыхода германскай арміі, у той час як каталіцкае духавенства аставалася на сваіх мейсцох пад германскай акупацыяй. Польскія статыстычныя досьледы зробленыя цывільным упрауленьнем усходніх зямель і надрукаваныя у афіцыяльным выданьні «Всхуд Польскі» за першую палову 1920 году сьведчуць, што да гэтай пары яшчэ не вярулася назад ад 25 да 50 % усей людасьці гэтых губэрняу. Польскі Урад (праект законау у Польскім Сойме) хочэ перадаць часова абезлюдзеушыя землі дэмабілізаваным польскім салдатам.

Правядзеньне плебісцыта пры такіх варунках немагчыма;

б) Змучаная і зруйнаваная беларуская людасьць гэтых зямель, прымушаная жыць і зімою у земляных ямах і напалову разрушаных акопах, сьведчыць аб шасьцігадовай усе руйнуючай вайне, — лішне змучаная голадам і пошасьцямі, інфэкцыйнымі хваробамі (сыпны тыфус) людасьць не можэ спакойна рашаць пытаньня аб сваей будучай доле. Людасьць

думае аб адным — як бы не памерці з голаду. Праудзівыя гаданьня не ідуць далей куска хлеба і другіх прадуктаў першай патрэбы, якія дастаўляюцца з загранiцы праз Польшчу і перадаюцца людназьці рукамі польскіх паноў і адміністратыунымі установамі польскай акупацыі. Польскія чыноунікі даводзяць, што голас беларускай вескі можна купіць за амэрыканскую муку, і на жаль, гэта не саусім але атчасьці справядліва.

Пэуне-ж плебісцыт немагчымы пры гэтых варунках у народзе, які знаходзіцца у руках польскіх чыноунікаў і магнатаў.

в) Рэжым польскай акупацыі настолькі цяжкі, што нават у выпадку астауленьня палякамі заходняй беларускай тэрыторыі, тэрарызаваны народ гэтым рэжымам у працягу блізка двух гадоў нема ведама чы зможэ выразіць сваю праудзівую волю.

IV. Заметкі да формы плебісцыту.

Працэс умацаваньня беларускага народа на базах сваей палітычнай незалежнасьці і сваей непадзельнасьці разгледаецца беларускім урадам саусім натуральна і ен павінен зьдейсьніцца у формах незалежнай беларускай дзержавы. Рана чы позна дзержауная улада Беларусі установіцца у Гродзеншчыне і Меншчыне і у усходняй часьці Віленскай губэрніі.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі не перэстане вясьці барадзьбу за сваю тэрыторыю да тэй пары покуль яе не атрымае і гэтым самым знойдзе спосаб задаволіць жаданьні польскай меншасьці і іншых нацыянальных меншасьцяу.

Беларускі Урад разгледае пытаньне аб плебісцыце, як прылучэньне беларускіх земляу да Польшчы і неправідловы а так сама недапусьцімы у інтэрэсах беларускага народу — чын.

Пытаньня пастаулена такім чынам што:

1) імкненьне беларускага народу да сваей палітычнай незалежнасьці саусім ігнаруецца і

2) з незапамятнага часу беларуская тэрыторыя разгледаецца як спрэчная абласьць.

Беларускі Урад разгледае лінію лорда Кэрзона, як найвышшую прэтэнсыю Польшчы, этнаграфічная граніца якой акрэсьліваецца між двумя народамі цячэньнем рэк Буга і Нарева. Толькі тэрыторыя паміж лініяй Кэрзона і рэкамі Бугам і Нарэвам можэ падлегаць плебісцыту.

Дзеля таго, што Беларускі Урад не кіруе яшчэ сваей старонкай, мог бы згадзіцца на плебісцыт у часьці тэрыторыі, каторая разгледаецца як спрэчная, пад варункам каб галасы паданыя процiу Польшчы разгледаліся як часовую аддачу гэтых тэрыторый пад упрауленьня Літоускай Дзержавы.

Што датычэ максімальных прэтэнсый Літвы акрэсьленых граніцай устаноуленай літоуска-расейскай умовай 12 ліпеня 1920 году, то Беларускі Урад заінтэрэсаваны гэтым пытаньнем пастольку, паскольку у гэтай обласьці есьць жыхары беларускай нацыянальнасьці, і у той самы час нічога процiу гэтага плебісцыту не будзе мець і згодзіцца Урад Літвы, але і у гэтым выпадку формула плебісцыту павінна быць зьменена.

Галасаваньне можэ быць за Польшчу з аднэй стараны, а за Беларусь і

Літву з другой. Плебісцытная картачка (надрукаваная на чатырох мовах: беларускай, польскай, літоускай і жыдоускай) павінна быць раздадзена людназьці адна з голасам за Польшчу, другая з голасам за Літву і Беларусь разам.

Пытаньне аб граніцы паміж Літвой і Беларусей будзе унутраней справай гэтых двух дзержавау.

Тэрыторыя распаложаная на усход ад лініі Кэрзона да граніцы накрэсьленай літоуска-[2]расейскай умовай 12 кастрычніка і літоуска-расейскай умовай 12 ліпеня 1920 г. чыста беларуская тэрыторыя павінна быць перададзена Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі або часова пад кіраўніцтва Літвы, што павінна быць абгаворана у спэцыяльнай умове паміж Літвой і Беларусей.

582.1.11:114-123 мк бел
582.1.45:111-111a-111g — мк рас
582.2.51:048-055 — мк рас
582.2.51:104-111 — мк рас
582.2.52:118-127 — шк фра

[1] Ліга Нацыяў 28.10.1920 прыняла пастанову аб плебісцыце ў Сярэдняй Літве.
[2] Памылкова замест польска-.

2553. Квітанцыя аб уплаце Вацлавам Ластоўскім як сябрам-заснавальнікам на фонд «Вызваленьня» 100 ням. марак і 206 лат. рублёў

582.1.45:121

Дата невядомая. На квітанцыі пячаткі:
1. Выдавецкае Таварыство «Вызваленьне»
2. Хаўрус Дапамогі Беларускім Пісьменьнікам імені А.Прушынскага

2554. Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) Вацлаву Ластоўскаму (Бэрлін) за 21.12.1920

21/XII 20

Вельміпаважаны,
Пане Старшыня!

Справы маи вельмі кепскія. Меу я надзею на памогу пана де В<уліча>, бо ен абецау падтрымаць, але ничого з гэтаго не выйшло. Ен выехау раней, чым я прыехау у Парыж.

Кватэру, якую мы раней занімалі, прынімаў пан Стош. Як мы выежджалі с туль, то да нас была прэтэнзія гаспадара дому, што нема некалькіх рэчеу (адзеял, пасуды, матрацау и др., папсованы кауры у пакоях канцэлярыі). Я казау, што нічого ня ведаю, бо я прыехау у дэлегацыю позней ад усіх и ня ведаю, што было а чаго нема?

Гаспадар падау у суд. Мяне вызывалі, але я быу у той час з Вамі. Суд пастанавіу узыскаць з дэлегацыі 2000 фр 75 см и 169 fr 50 ct за судебные издержкі.

Ня ведаю што рабіць!

Чакаю ад Вас вестак. Пасылаю да Вас нашаго чэлавека, але з визай зноу хлапоты.

Ен Вам прывязе дакумэнты, кніжкі, инфармацыю. Пасылаю смэту. Каб толькі разлічыцца з усімі арганізаваць працу і выехаць у Коўно.

Абрыдла такая сытуацыя!..

Калі Вы атрымалі, што належало, то вельмі прашу Вас як найхудшэй прыслаць, каб я мог ліквідаваць усі прэтэнзіі як за кватэру за 2 мѣсяцы, так усім служащым, за старую кватэру 2170 фр 25 см и на дарогу. Добра было б калі хоць бы на месяц упяред я мог аставіць грошы тут маму замесьціцелю, и тоды я зразу паеду да Вас.

Нема сіл сядзець без прадуктыунай працы — талоч ваду у ступе.

Прашу, калі ласка, зрабіць праз літоускага предстауніка у Б<эрліне>, каб ен тэлеграфаваў пану Мілошу, што атрымау ад Вас и належыць выдаць мне. Вас прашу тэлеграфаваць мне: Зроблена. Павідаіце пана Мілоша. Калі у Вас таксама кепска, то дайце як найхудшей вестку. Я зараз зліквідую усе, а далей што Бог даст?! Вельмі прашу даць вестку тэлеграмай.

Курьер выедзе як толькі атрымае візу.

Чы паслалі пану Павлу грошы? Калі у Вас нічого нема, то лепей, каб ен сюды не ехау, бо празь 7-10 дней ен нікого тут не знайдзе.

З пашанай

Ваш Эугені.

Вітаю усіх працоўнікоў нашых!

Калі не пабачымся, хай Бог Вам усім памагае у Вашай щырай працэ для Роднаго Краю, для дарагой Бацькаушчыны!

Выбачайце за стыль лісту, бо роднага языка ня ведаю, ня меу часу вучыць, але буду вучыць!

Бывайце, дараженькі, здаровы!

582.1.45:077-077a&r

2555. Ліст Аўгена Ладнова (Парыж) Вацлаву Ластоўскаму (Бэрлін) за 22.12.1920

22/XII 20

Вельміпаважаны,
Пане Старшыня!

21/XII атправіў Вам ліст почтай; у ауторак 20/XII паслау Вам тэлэграмму.

Становіщэ у данны момэнт вельмі цяжкае. На тых, на каго тутака я меу ще надзею, далей спадзеваща нема чаго.

Калі мажліва, прашу як найхудшей прыслаць згодна за смэтай, якую пасылаю панам Кахоўскім; ен наш — смаленскій. Чалавек — працаўнік і добры патрыот.

Тутэйшую сытуацыю ен Вам акрэсліць дэтальна.

Прашу як наіхудшей даць мне вестку; чекаю тэлеграмму. Чым раней я буду ведаць становіще, тым лягчей будзе адбыць ліквідацыю. Чым далей цягнуць тым болей будзе усякіх претензій.

Адповедзь на рожные пытаньня прышлю праз літвіноу.

Пасылаю дакумэнты, кніжкі, якіе меу час падабраць. Буду пасылаць праз літвіноу па часьцям архіу. Як толькі становіща акрэсліцца (выясніцца) паеду да працы у Коўну. Меморандумы нашы разаслаў усюды.

Вітаю усіх працаўнікоу за Святам Божаго Народження.
Найлепшыя пажадання Ваш, Эугені

Прашу не адмовіць выдаць прагоные і сутачныя грошы пану Кахоўскому на дарогу туды и назадъ, бо ен паехау на грошы, пазыченные у знаемых. Я даць яму нічого ня могъ, бо нічого сам не маю.
Эугені
22/XII 20
Парыж
582.1.45:074&r

2556. Чарнавік тэлеграмы Вацлава Ластоўскага (Бэрлін) Аўгену Ладнову (Парыж) і іншыя нататкі
Париж
Ladnoff 25 Avenue Victor Emmanuel
J'ai envoyé le 18 Paris Delegation lithuanien Vingt milles stop Prier communiquer reception stop L-wsky

2) Прошу прислать пашпарт праз літвіноу
3) Мандат на право участія в смѣшанной ликвидаціонной Комиссіи по ликвидаціи остатков денегъ прежней Россіи
4) Прислать бѣлор газеты, книги в Женеву по адресу:
Suisse
Monsieur Kojevnikoff
35 Av. de Champel
5) Біографіи бѣлор Госуд Дѣятелей
582.1.45:081

Дата невядомая. Запісана рукою перакладчыка (сакратара? кур'ера?).

2557. Справаздача Сымона Рак-Міхайлоўскага (Горадня) за 26.12.1920 аб авансах, атрыманых ім з Цэнтральнай Касы й аб выдатках за сьнежань 1920 году
582.2.56:142
582.2.56:141 — канвэрт

2558. Апраўдальныя дакумэнты аб выдатках Сымона Рак-Міхайлоўскага за сьнежань 1920 году
582.2.56:142-152

2559. Справаздача Сымона Рак-Міхайлоўскага (Горадня) за 26.12.1920 аб выдатках з 15.000 польскіх марак, пазычаных Цэнтральнай Касай ад Дэлегацыі Беларускай Вайсковай Камісіі ў Горадні 22.11.1920
582.2.56:153

2560. Апраўдальныя дакумэнты аб выдатках з 15.000 польскіх марак, пазычаных Цэнтральнай Касай ад Дэлегацыі Беларускай Вайсковай Камісіі ў Горадні 22.11.1920
582.2.56:153-173

2561. Апраўдальныя дакумэнты аб выдатках з 45.000 польскіх марак, атрыманых Сымонам Рак-Міхайлоўскім 19.12.1920 ад Цэнтральнай Касы БНР праз Аркадзя Смоліча

582.2.56:174,177-215

2562. Ліст Льва Нікіціна (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.12.1920 аб выхадзе з працы ў канцылярыі

582.1.45:076&r-076a&r

2563. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.12.1920

Бэрлін, 27 сьнежня 1920 г.

Паважаны Пане Вацлаве!

Надсылаю Вам некалькі страніц тэксту. Я умыслне не стараўся тлумачыць некаторыя словы на беларускую мову, каб даць Вам магчымасьць зрабіць патрэбныя стылістычныя папраўкі. Калі ласка — марайце як мага больш*, трэба каб усё мела запраудны стыль. Рабіце так сама патрэбныя рэмаркі, што да тэксту, ці лепш, што да зьместу. Маю надзею, што не пашкадуеце часу, — і гэты раздзеў будзе мець добры выгляд, як і першы, каторы мы пісалі першы раз.

Толькі — ласкавы будзьце — не закладайце надта далека гэтай справы у шафу. Як толькі атрымаеце, — прагледзьце — і назад. Друкар ня чакаець!! На гэтым тыдню патрэбна здаць у друк!!!

Чакаю назад!!!

За гэтыя дні, нічога апроч тэлеграм, з Коуны, што усе што небудзь забыліся і т.д. — нічога новага, што бы зьяулялась важным. Вярнуўся з Польшчы Крыстіні. Бачыуся з Смолічам, Дубейкоускім, Дзекуць-Малеем, Вернікоускім і інш. З гутарак выяснілася, што яны пакладаюць надзеі на нашу працу і чакаюць дапамогі ад нас. Гэта трохі дзіуна. Грыб і Комарынец выпушчаны на волю, Комарынец хутка прыезджае сюды. Таму і другаму мы паслалі грошы. Робім захады, каб выцягнуць Грыба заграніцу. У Варшаве Крістіні бачыу штандар І бел. стрэл. палка Б.Н.Р.!! Кажэць, што надта «роскошны»! Цэнтр вайсковых фармаваній у Лодзі[1], дзе працуець вайсковая камісія. Рэгістрацыя афіцэрау і салдат на Шпітальнай 12, — ідзе досьць добра. Но асаблівага настрою няма — усе лічаць патрэбным, каб быу вызнаны Беларускі Урад. Найвыжэйшіе далі у прэсу спраставаньне, аб тым, што іх, як «глаўных»! — забылі упісаць у лік «беларускіх урадаў»! Памятаеце, была заметка?

Атрымаў ліста ад Краскоўскага — Івана Ігнатавіча. Пішэ, што хацеў бы працаваць культурна на ніве беларускай, пытаецца ці можна праехаць у Вільню і там устроіцца, гаворыць аб працы у Грузіі і т.д. Я адказаў, што усё гэта магчыма, што мы з радасьцю хацелі бы бачыць яго сярод нас, але што наша грашовае становішча ня моцна і, наагул, што мы, кошты, патрэбныя для яго, як сам папярэджвае, відаць прэдстаівіць ня зможам. Што будзе ён далей рабіць — пабачым, хутко павіне[н] атрымаць ад яго адказ. Ён цяперыка са усей сямьей у Вене.

Прыехаў Гершовіч, пачалі гутаркі далей. Так сама началіс гутаркі з Лурье. Магчыма, што што небудзь будзе. Скажыце, пане Вацлаве, дзе той дагавор з французамі, які перэдау нам Ладноу? Ён абавязкова патрэбен тут, каб пусьціць яго у ход. Паведамьце аб гэтым мяне тэлеграмай, і калі ен у Вас, то вышліце заказным.

Справа з пашпартамі палепшылась значна, візы ставяць без уселякіх затрудненій у Цэнтр-Бэрліне (поліцэйпрэзідзіум), «с предупредительностью». Як і трэба было чэкаць офіціально нам яны атказалі адно, а фактычна — далі знаць куды трэба і што трэба. Цяперыка будзем націскаць, каб рэгістравалі у Міністэрстві.

Галавінскі выезджаець заутра, ці пазаутры. Затым Заяц, за Зайцам — я. Сямья мая не магла выехаць разам з Крістіні, бо не атрымала грашэй. Прыедзе разам з Комарынцам. Як толькі устрою сямью — вазьмуся за справу зубамі і нагамі. Будзем жыць!

Пятру, Базылю, Антону[2] і усім — мой нізкі берасьцейскі паклон. Добрых сьвят, добрага Новага Году усім. Не пішу ім паасобку — бо страшэнна завален работай па коррэктуры і па прэсс-бюро. Заутра візіт Галавы[3] і Анэкштэйна у усходнікау[4]. Я знайшоў сярод палонных пару добрых людзей і хачу прапусьціць праз свае рукі дзесятак-другі новых дз[е]ячоў. Між іншым будзе у мяне — М.Колас[5], ня ведаю, ці не сваяк гэта старога Коласа; добра пішэ па-беларуску.

Абавязкова зрабіце захады, каб Клімас споўніў свае слова (2 словы, памятаеце, аб чым?). Так сама зьвярніце увагу каго сьлед, што беларусы Горадні і наагул, занепакоены надта тым, што робіцца імі у Варшаве. Нам трэба быць у курсе іх спраў. Памятаеце, мы аб гэтым гутарылі з Вамі. З Гравенгофам яшчэ не бачыўся!..

Чакаю назад рукапіс.

Цісну руку — бывайце здаров!

Ваш АлдрЦвікевіч

---

*Я маю другі экзэмпляр, які папраўлю згодна Вашым папраўкам — і ужо яго буду здаваць у друк.

582.1.45:090&r

---

[1] Беларуская Вайсковая Камісія дзейнічала ў Лодзі ад 3.10.1920 да 15.05.1921. [2] Крэчэўскаму, Захарку і Аўсяніку. [3] Галавінскага. [4] Бальшавікоў. [5] Міхась Колас пазьней жыў у БССР, друкаваў апавяданьні ў «Савецкай Беларусі», памёр у сакавіку1924 году ў Чэрвені.

2564. Ліст дыпляматычнага прадстаўнка БНР у Літве Антона Аўсяніка (Коўна) старшыні Рады Народных Мінітраў БНР Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.12.1920 з просьбай выдаць аванс 3.000 марак на выдаткі Прадстаўніцтва і з «цэдулай» МЗС Літвы за №5223

582.2.51:152 — ра

2565. Заява Дзяржаўнага Сакратара БНР Кляўдыюша Душэўскага за 27.12.1920 з просьбай вызваліць яго ад пасады

582.2.53:066 — ра

2566. Рапарт дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Літве Антона Аўсяніка старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.12.1920 (вых. №3)

27/XII 1920
№3
KOVNO

Яго Дастойнасьці
Пану Старшыне Рады Народных
Міністраў Ураду Б.Н.Р.

На моцы вуснага распараджэньня Вашае Дастойнасьці і дзеля высьвятленьня справы гэтым-то лістам маю гонар даць тлумачэньне у справе журнала «Сьцяг», меўшага выйсьці у месьце Коўне.

Перад выездам Вашае Дастойнасьці з Коўны у Бэрлін Вы загадалі мне заняцца падгатаваўчай працай па выданьню памянёнага журнала і даручылі мне наказаць сябру ураду п. Душэўскаму, каб ён пасьля свайго прыезду заняўся гэтае справай, а так сама дапамог Дыплём. Прэдстаўніцтву у Літве у справе прэс-бюро.

Пасьля прыезду п. Душэўскага, выпаўняючы Ваш загад, я перадаў п. Душэўскаму абразцы паперы, на якой меўся друкавацца «Сьцяг», фармат яго, абразцы абкладак і цэны, якіе выставілі ковенскіе друкары за друк журнала у 16 страніц і ў 32. Сказаў гэтак сама п. Душэўскаму, што фармат журнала мае быць такі украінская «Воля».

Аб прыезьдзе п. Душэўскага, як было у мяне ўмоўлена з друкарамі, я паведаміў іх, і адзін з друкароў, прозьвішча яго не памятую, некалькі разоў заходзіў да п. Душэўскаго у справе журнала. Гэтак сама пераказаў п. Душэўскаму аб тых матэр'ялах, якіе Вы заставілі для друку — гэта мэморандуму і іншае.

Што да грошы на выданьне «Сьцяга», дык з Вашых слоў я сказаў п. Душэўскаму, што урад мае асыгнаваць пэўную суму на гэтае выданьне і што Вы меліся заставіць грошы на журнал.

У справе дапамогі прэс-бюро гэтак сама пераказаў п. Душэўскаму і заўважыў гэтак: «Чуў я, што Вы, пане Душэўскі, маеце вострае пяро, а я газэтнай работай ніколі не займаўся. Хачу, каб мае білютэні добра выглядалі».

П. Душэўскі згадзіўся дапамагчы мне.

Аўсянік
Поўнамочны Дыплёмат. Прэдст.
у Літве

582.2.54:458&r — ра

2567. Запіска Антона Аўсяніка Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.12.1920

Пане Старшыня!

Д-р Пурыцкі[1] прасіў Вас прысьці сягоньня у 2 гадзіне. Перад Вашае гутаркай з д-рам Пурыцкім прашу Вас даць мне маленькую аудэнцыю для гутарак аб справах і перадачы некторых матэр'ялаў.

27/XII-20
Аўс...

582.2.54:497 — ра

2568. Дакладная запіска віцэ-старшыні Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту Аляксандра Карабача старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.12.1920 з просьбай аб выдзяленьні грошай і актывізацыі працы Камітэту

582.2.54:527 — ма

2569. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ??.12.1920

Паважаны пане Вацлаве!

Лісты, пратаколы і рукапіс — атрымаў. Дзякую! Іван Ігнатавіч жыве у Вені, Украінскае Пасольства (Алеегассэ, 19) — туды і пішыце. Толькі зазначаю, што ён паедзе толькі на сталую і пэўную, у сэнсі грашо[в]ага забаспячэньня, пасаду; аб гэтым ён сам цьвёрда папераджаў. Працаўнік ён добры і калі можна было-б прыцягнуць яго да працы, дык лепшага ня трэба жадаць.

Праца наша паміж палонных павялічваецца з кожным днём. Дайце пэўны адказ — ці можна пасылаць людзей у войска? есць пару ахвотнікаў, у тым ліку адзін дохтар і афіцэр.

Сямья мая прыезджае на гэтых днях, яна ужо у Данцыге. Як толькі устрою справу з кватэрай — выеду у Прагу — Карлсбад — Вену з тымі даручэньнямі, якіе маю, а затым — у Коуно.

Ад Ладнова вестак не маем. Кахоўскі выезджае у Парыж сёніка.

Цісну руку АлдрЦвікевіч

Калі ласка — вышліце мне маю кнігу:

Olszewicz - Znaczenie gospodarcze Litwy i Białej Rusi!

Яе перэдаў Вам Галавінскі — калі мы ехалі у Жэнэву, я бачыў яе у Вас разам з дакладам, які апрацаваў [...?].

Вышліце разам з рукапісам.

582.1.45:091&r

Дакладная дата невядомая.

2570. Нататкі алоўкам Вацлава Ластоўскага

Яковлеў
Маёровъ
Разумовіч
Благавешченскі
казначэй?

582.2.53:067 — р

Дата невядомая. Прозьвішчы афіцэраў Беларускага Асобнага Батальёну.

2571. Ліст Юрыя Гладкага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.12.1920

582.1.45:075-075а

«[...] Пры магчымых пераменах у мейсцы працы, прашу Вас не запамятаваць майго вялікага жаданьня да працы на карысьць нашай Вялікай і Многапакутнай Бацькаўшчыны і прыкладу маіх пазнаньняу у замежных мовах, як гэта Вы знойдзеця магчымым [...]».

2572. Ліст Уладзімера Грунтова (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.12.1920 з просьбай аб павелічэньні пэнсіі

582.1.45:078&r-078a

Уладзімер Грунтоў — кур'ер Вайскова-Дыпялматычнай Місіі і сакратар Прэс-Бюро ў Рызе.

2573. Oszmiańczuk. Chaos białoruski // Gazeta Krajowa (Wilno). Nr.96. 28.12.1920

582.1.45:089

2574. Ліст Вацлава Іваноўскага (Варшава) міністру замежных справаў Польшчы за 28.12.1920 і росьпіс выдаткаў Цэнтральнай Касы Найвышэйшае Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

582.2.56:115&r-116&r — ра
582.2.56:117&r-119&r — мк

Паведамленьне аб прызначэньні грошай, выдаткаваных Цэнтральнай Касай Найвышэйшай Рады Беларускай Народнай Рэспублікі: «Summy, przekazywane na ręce «pełnomocników organizacji białoruskich» (faktycznie Najwyszejszej Rady) na zasadzie umowy, podpisanej z ramienia Rzeczypospolitej przez p. W.Raczkiewicza i L.Wasilewskiego były przeznaczone na rozmaite cele: na sprawy szkolnictwa, sprawy rolniczej pomocy przez «Sajuz Sielskaj Haspadarki», nakoniec na cele «narodowe białoruskie»».

Дакумэнты №№1-114 справы 582.2.56 далучаныя да гэтага ліста як апраўдальныя дакумэнты.

2575. Пераклад Міколам Вяршыніным гутаркі аб палітычным стане Беларусі з старшынёй Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Варшаве Лявонам Дубейкоўскім, надрукаванай у праскай газэце «Narodni Listy» №358 за 1920 год

582.1.10:001&r-002&r — рукапіс

2576. Ліст Янкі Чарапука (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.12.1920

Даражэнькі п. Старшыня!.. Даехалі мы счастліво. Я адвез у мястэчка да п. Тауразэвічаў Яны сказалі, што 29 а гадзіне 11 дня адвезуць п. Ганну[1] да хаты (павезе сам стары) У звязку з тым, што там начаваць ні было гдзе, я наняў фурманку і выехаў у той самы дзень да Мажэек (усяго дарогі 12 верст) і 29 я ужо быў у Рызі. У дарозі ўсё было добрэ...

Далей п. Кадлуба згадзіўся выехаць, я раблю усе стараня, каб атрымаць яму пропуск. Найпазней праз дзен 4 ён выедзе. Сам К...[2] выехаў у Костку. Прыбудзе 8 сюды. Сягоння 30го я бачыўся з яго Наместнікам Заўтра будзе нарада з Wskim. Прыняты я быў прыхільна і цёпло. Па заканчэню ўсяго зараз жэ выяду да Вас. У лепшых палажэньне цяжкое надходзіць ўсходняя хмара...

Цалую Янка
30/XII Рыга
582.1.45:094

[1] Ганна Ластоўская, старэйшая дачка В.Ластоўскага. 2 Адсюль і да канца ліста — асобы, мясьціны й абставіны ня выяўленыя.

2577. Ліст Ганны Ластоўскай (Парогі) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.12.1920

30/XII 1920 г.

Дарагі Тата!

Я ужо прыехала дамоў, усе дзякаваць Богу здаровые. Стаська[1] вельмі здаволена з адзежы. Ці не прыехала Стаха[2], бо як прыедзе то прошэ папрасиць яе каб зараз мне написала хаця некольке слоў. Добра былоб калі будзе якая магчымасьць па сьвятах узяць адгэтуль Стаську бо Тата жэш ведае якіе тут былі варункі перш, а зімой ящэ горш можэ дзе ў інтэрнаце можна будзе прыстроіцца. Можэ Тата на новы год да нас прыедзе? хаця на пару дзён.

Прошэ напісаць хаця трошэчкі буду чэкаць. Тымчасам цалую Тату з новым годам каб усё было як найлепш.

Ваша Ганка

582.1.45:106&r

582.1.45:105b — канвэрт

[1] Стася Ластоўская — малодшая дачка В.Ластоўскага. [2] Станіслава Кісель — другая жонка В.Ластоўскага.

2578. Зварот прыватнае нарады беларускіх сацыялістычных дзеячоў 30.12.1920 да Ўраду БНР і Беларускага Рэўкому з просьбай як найхутчэй зьвярнуцца да Ўраду Савецкай Расеі ў справе прызнаньня поўнае незалежнасьці Беларусі

582.2.54:500-513 — р Я.Чарапука

582.2.54:514-521 — мк рас

2579. Сьпіс беларускіх работнікаў у Вільні й ваколіцах

1. Кахановіч
2. Ярэміч
3. Карабач
4. Самойла
5. Андрэеу
6. Рак-Міхайлоускі
7. Смоліч
8. Станкевіч
9. Станкевіч
10. Толочко
11. Душэускі
12. Тулоускі
13. Тарашкевіч
14. Валэйша
15. Станкевіч Стан.
16. Гапановіч
17. Чыжэускі
18. Маркевіч Петр
19. Маркевіч Казім.

20. Грачанік
21. Згірскі
22. Згірскі
23. Калач
24. Багдановіч Генадзі
25. Яцкевіч
26. Яцкевіч
27. Катовіч
28. Катовіч
29. Сасноускі
30. Арэхава
31. Ганчарук
32. Канчэускі
33. Біндзюк
34. Міхаэль
35. Гэрмановіч
36. Мурашка
37. Пліс
38. Кушнеу
39. Грыневіч
40. Дубіцкі
41. Мараускі I.
42. Мараускі II.
43. Кукуць
44. Більдзюкевіч
45. Ціуля
46. Окушка
47. Вітко
48. Сядыгін
49. Астанковіч
50. Сегень
51. Фальковіч
52. Сенкевіч
53. Дворчанін
54. Бобрык
55. Сымановіч
56. Салавей
57. Гічан
58. Лемеш
59. Радзевіч
60. Каранеускі
61. Капланъ
62. Вільфін
Шышкоу
64. Баравік
65. Пуська

66. Рожановіч
67. Таразэвіч
68. Катковіч
69. Сенюль
70. Бараноускі
71. Бротоу
72. Міхайлоу
73. Грышкевіч
74. Гоголінскі
75. Канчэускі II.
76. Бычкоускі
77. Гараднічы
78. Беланец

582.2.54:522-524 — мк

Дата невядомая.

2580. Візытоўка Дамініка Сямашкі

Дамінік Семашко
Міністэр Беларускіх Спраў Літоўскаго Ураду

582.1.71:030
582.1.71:045 — В.Ластоўскаму[1]
582.2.06:002 — Я.Варонку

[1] З тэкстам на адвароце: «З Н.Г. 1921»

1921

2581. «Змагайся, як мага — зможаш!». Інструкцыя №1 Цэнтральнага Камітэту Беларускае Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў. Студзень 1921

582.1.39:016&r — мк

Дата невядомая. У інструкцыі — заклік да супраціву польскай акупацыйнай уладзе і да канкрэтных актыўных дзеяньняў супраць яе

2582. Маляваныя віньеткі Вацлава Ластоўскага

582.1.39:перадапошняя ст. вокладкі

2583. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.01.1921

Паважаны Пане Вацлаве!

Высылайце назад рукапісі і коррэктуры. Чакаю — і не дачакаюсь! Друкар злуецца. Высылайце толькі заказнымі. Хутчэй...

Ваш АлЦвікевіч

582.1.45:113

Дакладная дата невядомая.

2584. Артыкул невядомага аўтара «Прычыны дэзарыентацыі беларускай палітычнай думкі»

582.2.52:001-003 — мк

Дата невядомая.

2585. Возстаніе в игуменском уѣздѣ // [Вар]шавс[кое Слово (Варшава)?]. ??.01.1921

582.2.53:069 — д

Дата невядомая.

2586. Рэзалюцыі беларускіх арганізацыяў за 2.01.1921 у справе інцыдэнту ў Беларускім Клюбе ў Вільні ў часе сустрэчы Новага Году, калі афіцэры «Беларуска-Літоўскай дывізіі» зьбілі Міхася Кахановіча

582.1.16:006 — д
582.1.16:007 — д
582.1.45:127 — д
582.1.45:127а — д

Рэзалюцыі Беларускага Клюбу ў Вільні, Беларускага Вучыцельскага Саюзу, Пэдагагічнай Рады 1-ай Віленскай Беларускай Гімназіі, Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні.

2587. Суправаджальны ліст дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Літве Антона Аўсяніка (Коўна) Канцылярыі Рады Народных Міністраў БНР (Коўна) за 4.01.1921 (вых. №3), дасланы з копіямі выбарак з тэкстаў Беларускага Прэс-Бюро ў Коўне за 1920 год

582.2.58:001 — ма

2588. Копія выбарак з тэкстаў Беларускага Прэс-Бюро ў Коўне за 1920 год

582.2.58:002&r-012 — мк
582.2.54:486-496 — мк

У 1920 годзе выйшлі гэткія нумары бюлетэню:
№1, 20.11.1920
№2, 22.11.1920
№3, 24.11.1920
№4, 27.11.1920
№5, 3.12.1920
№6, 8.12.1920
№7, 8.12.1920
№8, 11.12.1920
№10, 12.12.1920
№11, 13.12.1920
№12, 14.12.1920
№13, 15.12.1920
№14, 19.12.1920
№15, 22.12.1920 — 582.2.54:488
№16, 23.12.1920 — 582.2.54:487
№17, 29.12.1920 — 582.2.54:486

2589. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.01.1921

[...] Пасылаю Вам з г. Чэрэпуком Вашы ксёнжкі [...]

582.1.45:107

2590. Ліст Юрыя Гладкага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.01.1921

582.1.45:108&r

Перасылаючы з Чарапуком атрыманы з Масквы ліст (ад С.Кісель).

2591. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.01.1921

Berlin, 9.I.1921.

Глыбокапаважаны Пане Вацлаве!

Пасылаю Вам чародны кавалак тэксту. Не адмоўце у сваей ласке — перагледзець! Разам з тым папрасіце ад майго імяні П. Галавінскага, каб прачытаў стр. 2-5, дапоўніў і наагул дадал аргумэнтаў да тэксту на страніцы 5: аб, бытцым, вялікай беднасьці Беларусі.

Пакуль што яшчэ не атрымаў тую рату, каторую паслаў праз пошту. – Чакаю — і першую і гэтую назад.

———————

У мяне — радасць: прыехала жонка з дзецьмі. Усе здаровы. Памясьціліс пакуль у пансыоне — страшэнна дорага — і ня ведаю, як выйду із палажэньня. Калі-б была кватэра на Літве — адразу ж пераехаў туды.

Спытайце і Вы, пане Вацлаве — можа прыпадкам што небудзь будзе. Напамінайце аб гэтым Івану[1] і Галавінскаму.

Аб палітычных справах пішу асобна.

Ваш АлЦьвік...

!!Перашліце кніжку: Olszewicz, «Znaczenie gospodarcze Litwy i Białej Rusi» — !! Яна павінна быць разам з запіскай А.Галавінск. у Жэнэву.

582.2.53:073-074 — ра

[1] Івану Ів. Цьвікевічу, брату Аляксандра.

2592. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 10.01.1921

Бэрлін, 10 студзеня 1921 г.

Паважаны п. Вацлаве!

Пастараюся па меры магчымасьці адказаць на тыя пытаньня, якія закранулі у сваім лісьце Вы, а так сама Антон.

Справа пашпартоў: Пасьля майго візіту Міністру Сімансу,— місія зрабіла спробу націснуць на гэтую справу офіцыальным і пісьменным парадкам. Само сабою зразумела, што атрымалі негацыуны адказ. Але разам з тым, пад уплывам усіх гутарак і самаго прынцыпу адносін да нас (які, магу зазначыць зауседы быу прыхільны),— было зроблено неофіцыальнае разпараджэньне пашпарты нашые візаваць, дзеля чаго цяпер нашы

звычайныя загранічныя пашпарты, што выдае місія візуюцца без уселіякіх перашкод у Цэнтрум-Бэрліне. Гэта — явішча вялікае вагі! Апошнімі днямі я быў два разы у Ген. Консула Мін. Загрн. Спраў п. Гофмана і атрымаў ад яго тэлеграфную візу для Камарынца і так сама візу (на асобным пеперу, як для Вас было зроблено апошні раз) — для Лурье і яго жонкі у Парыж. Наагул, па усяму відаць, што перашкод цяперыка з боку Міністэрства у справе пашпартоу ня будзе; трэба зьвертацца за гэтым беспасярэдна да Консула Гофмана, мінуючы Блюхера, які па свайму становішчу асобы, якая павінна ведаць палітычныя стасункі і тое, што мы Нямеччынай не вызнаны, — ня можа інакш нам адказываць на нашыя запытаньня, як толькі шляхам офіцыальным і, разумеецца, негаціуным.

Што датычыцца візы для Крэчэускаго і Захарко, дык аб гэтым трэба асьцярожна перагаварыць зноў такі з Гофманам. Магчыма, што нямецкі пасол на Літве не мае гэткага неофіцыальнага загаду ставіць нам візы і прытрымоуваецца пеперы з Міністэрства. Пытаньне гэтае — надта як кажуць «шчэкотлівое» і яго трэба вырашыць асьцярожна. Прасілі мы з Зайцам аб гэтым Мюлера, які ужо у гутарках з Міністэрствам спецыалізаваўся. Лічу, што на гэтым тыдню справу залатвім добра. З свайго боку раіў бы, каб і у Літве, з нямецкім паслом не ставіць пытаньне аб візаваньні пашпартоу офіцыальна, і барані Бог — на пісьме. Нічога апроч непрыемнасьці ня будзе, бо трэба памятаць, што мы не вызнаны! Націскаць жа у гэтым кірунку неофіцы[а]льна, будзем далей, пакуль не дабьемся свайго.

2. Аб тым, што украінская місія у Рызе ліквідуецца я ужо чуу раней ад тутэйшых украінцаў. Гэта — зусім зразумелая рэч, паскольку Латвія хоча зрабіць умову аб паразуменьню з Савецкай Украінай. Думаю, што нам гэта не пагражае, асабліва у такой самай гострай форме. Думаю, што гэта залежыць у большай меры ад нас саміх. І вось чаму. Па першае, незалежнай савецкай Беларусі, хоць бы у тым выглядзе, як мае Савецкая Украйна — нема. Права загранічнае паліытыкі і разам з тым права загранічнага прадстаўніцтва, савецкая Беларусь не мае. Гэта аргумэнт — формальны. Па другае, Чэрвякоў і К-о, на мой пагляд не будуць стаяць, як Ракоускі[1], за абавязковую барацьбу з нашымі місіямі, паскольку апошнія ня будуць біць іх разам з палякамі. Для іх наш урад — свайго роду «аддушына», каторою моўчкі зауседы можна карыстаць у абарону Беларусі ад Польшчы. Па трэцьце — паскольку мы з літоуцамі і проціу палякаў, пастольку мы увыходзім у ігру бальшавікоу проці Польшчы. Такім чынам, у большасьці справа залежыць ад нас.

Зусім другое — украінцы Петлюры, які вядзе вайну з Расеей, у саюзе з Польшчай. Апроч таго, — ён фактычная, аружная сіла, а мы — ідэя. Само собою, што як толькі мы занадта высоуваемся з сваімі паустанцамі і пр., дык гэта непрыемна бальшавікам і яны злуюць. Але да змаганьня, скіраванага да ліквідацыі нашай пакуль што яны не сягаюць. Так мне, на першы пагляд, здаецца. Вам там, бліжэй да справы — відней.

3. Ці не пагражае нам зліквідаваньне у Літве дзякуючы вымаганьням тых самых бальшавікоў? Думаю, што не. Але толькі зноу пад тым варункам, калі мы не надта будзем выпірацца з сваімі паўстанцамі і наагул проціў-бальшавіцкай пазіцыей. Трэба памятаць, што мы можам сідзець у

Літве толькі тагды, калі ня будзем зьяуляцца урадам, варожым Савецкай Расіі (гл. умову літоуска-расейскую). Кожны раз, калі мы выйдзем за граніцу магчымага у гэтым сэнсі, дык напорэмся на пратэст Аксэльрода[2]. Гэта — ясна. Не ведаю, што можна закінуць у гэтым кірунку бальшавікам і літоуцам? Нічога!

І вось, паустае пытаньне — як быць? Проста кажучы, што для нас карысней: ці білютэні аб паустанцах, ці рэальная праца, — праца, скіраваная да узмацаваньня нашых сіл пакуль што у Літве і у тым абшары, якой магчыма прыпадзе ей пасьля таго, як Польшча будзе пабіта?

Мне здаецца, што рэальная праца, хоць бы і не у вялікім маштабе, якую мы цяперыка вядзем на Літве, ужо добры крок наперад. Вы, напрыклад, пішаце, — да і без вашаго паведамленьня я добра ведаю, што справа звычайнай нацыональнай прапаганды, стаіць надта дрэнна. Нема нават каму кіраваць «Бюро прэсы і прапаганды». Нема людзей і сіл на гэтуль маленькую рэч! Нема сіл — гэтаж трагічна зычыць! — нават на тое, што мы зусім свабодна можэм рабіць у Літве. Мне гэта не дзіва, гэта старая наша бяда.

Наша палітычная сьмерць, як кажэ Антон[3], не у тым, што Расея падпіша мір з Польшчай, а у тым, што да гэтага міру далучыцца Літва. Я ж лічу, што міра паміж Літвой і Польшчай — ня будзе да апошняго! Вы самі добра ведаеце, што такое Вільна для літоўцаў і для палякаў? Ведаючы гэта, я зусім спакойна углядаюся на гутаркі іх у Варшаве і на спробы (пад націскам французаў!) як небудзь вырашыць справу Вільні. Нічорта не выйдзе з гэтых разгавораў да таго часу, пакуль Літва не згодіцца федэравацца з Польшчай. А наскольк рэальна гэта апошняя магчымасьць — мы добра ведаем.

Ітак, на мой пагляд — трэба узмацоуваць нашу базу у Літве, аб якой было столькі мовы, трэба гуртаваць у стройную сістэму тыя сілы, якія у нас есьць. Трэба як мага рэальней зьвязацца з Вільней і Горадней, бо толькі пакуль што там мы можам спадзеваца чаго небудзь дабіцца. Плятформа «Беларускага Слова» — да нас больш чым прыхільная. Каб зьбіць на тое ж усе віленскія групы, а пасьля гэтага аб'еднаць пад нашым загадам і Горадню і Вільну, арганізацыйна і тактычна зьвязаўшы іх, дык гэта усё, што можна было-б у данны момэнт зрабіць. Як далей зложацца лёсы гэтага абшару — нема ведама, але гэта той рэальны об'ект, каторы адзіна мы можам мець на уваге і на каторым можэм працаваць. У гэтым кірунку перашкод ні з боку бальшавікоу, ні з боку літвіноу мы сустрэнуць ня можэм. Усё другае — на мой пагляд трэба пакуль што пакінуць у старане. Цягнуцца да бальшой дзяржаунай палітыкі у той час, калі нам трудна выдаваць які небудзь маленькі «Сьцяг» — не трэба. Не трэба забываць, што ужо адзін толькі факт нашаго істнаваньня як ураду — палова беларускай палітычнай справы і добрая чверць будучай незалежнай Беларусі. За уселякую цану трэба трымацца Літвы і арганізаваць Віленшчыну і Горадзеншчыну. Пераезд, як некаторыя думаюць у Прагу, — гэта зусім на мой пагляд немагчымая рэч. Гэта значыць вертацца у становішча у дзесяць разоў горшае, чым было у свой час у Рыге. Бо пасьля Прагі нам застанецца пераехаць толькі на... Прынцэвы астравы.

Літва ні пры якіх варунках ня можа ігнараваць нас, так сама як і мы ня можэм ігнараваць яе. Мы да зарэзу патрэбны друг другу. Толькі разам мы можам хоць крыху забаспечыць сябе ад маіорызацыі палякамі. Мне здаецца, што гэта добра разумеюць усе літоускія дзеячы і што дзеля гэтага мы можэм спакойна працаваць на далей разам з імі.

Трэба карыстацца з тых хоць невелікіх рэальных концэссій, якія можна ад іх атрымаць, як напр. марка, вайсковыя часьці, грашовая, дыплематычная і інш. дапамога, у тым ліку рэалізацыя выдавецкага фонду. Аб гэтым апошнім, так сама як і аб марачнай справе я мімаходам гутарыў з Гершовічам. Ён едзе у Копенгаген, дзе між іншым, парадзіцца з патрэбнымі асобамі, ведаючымі марачнымі справамі. Пасьля звароту яго б[у]дзем мець спецыальную нараду у гэтых справах, аб зьмесце якой буду лічыць абавязковым Вас паінфармаваць.

4. Які напрамак агульнай палітыкі прыняць у зьвязку з сучасным момэнтам? З папярэдняга зьместу майго ліста гэта больш-менш відаць. Калі верыць пастановам апошняга зьезду саветау у Маскве[4], — мір паміж Польшчай і Расеей будзе падпісаны і той ці іншы тэрмін будзе трымацца. Адзіна з чаго могуць яны пачаць вайну (г.зн. да чаго прычапіцца) дык гэта усе тая-ж Вільня. Калі мір будзе падпісан нам прыдзецца на час пакінуць думаць аб усходняй Беларусі і, як я за[з]начау выжэй, зьвярнуць усю увагу на абшар Вільні-Горадні. Тут, дзякуючы асобным абставінам, мы зможам надалей весьці працу, пры гэтым працу рэальную. Наагул, пакуль што нам прыходзіцца махнуць рукой на усходнюю Беларусь; туды мы ніякім чынам ня можэм дасягнуць — сіл мало; добра, калі будзем хоць трымаць сувязь інфармацыйнага характару.

Ставіць цяпер пытаньне: ці з Масквой, ці з Варшавай, — на мой пагляд ня можна. Мы маем найлепшага хаурусніка — Літву і да таго часу, пакуль мы можэм трымацца на Літве, гэткіх пытаньняу ня можа быць. Аддаць свае пазіцыі мы зауседы пасьпеем, на гэта зауседы хопіць часу. А ставіць пытаньне, ці з Масквой, ці з Варшавай, гэта значыць ісьці у Каноссу. Вы зусім слушна зазначаеце, што калі Аксельрод гаворыць аб супольных фармаваньнях, фінансах і г.д. — дык гэта адна мана і азначае не больш як аутаномію. Я нават думаю, што не аутаномію, а упрост службу у Кнорына, добра яшчэ калі не дамашні арэст.

Ня больш даст нам і пан Васілеускі. Мы, паметаеце, маглі добра у гэтым перэканацца па гутаркам у Рыге. Аб гэтым жа сьведчыць і тон «Беларускага Слова» і становішча нашых у Вільні. На «краевы сойм» мы будзем гадзіцца толькі тагды, калі да гэтага будут прымушаны і літоуцы. А апошняга яшчэ прыдецца чакаць!

Будзем трымацца да апошняга і — чакаць як разьвінуцца далейшыя падзеі. Парадку яшчэ доуга ня будзе, яшчэ далёка да вырашаньня усходняга пытаньня у ва усім яго аб'еме. І нам сьпешацца з тым, каб пасоуваць наперад гэтае вырашаньне — ня карысна. Толькі тагды мы маглі быць зацікаулены у гэткім пасоуваньні, калі-б чуліся на сілах. Пры нашам сучаснам палажэньні — невыразнасьць палітычнай сітуацыі — адзіны козыр.

Дзеля гэтага ня трэба ставіць пытаньняу аб орыентацыях. Адно толькі трэба: каб кожны быу заняты пэунай працай. Горш усяго калі дарма трацяцца сілы тыя, якія есьць. Добра, апроч таго, каб наш цэнтр быу усе-ж такі не у Коуне, а дзе небудзь у другім месцы на Літве, каб не было гэтага нуднага мадзеньня без працы і на віду у ковенскіх жыхароу. Цяганьне да Пяркоускага і назад і вечныя спрэчкі могуць убіць самы найлепшы настрой. Падумайце аб гэтым!

5. Справа аб грашох. Самая важная справа — ад яе «все качества», як кажуць. Я не бачу падвалін асаблівых для непакою і з гэтага боку. На тую працу, якая перад намі ёсьць, грашэй нам заусягды хопіць. Для літоускага ураду якія небудзь сто-дзьвесьці тысяч на месяц для нас — грошы пусцяковыя. І мы іх у тым, ці іншам відзе мець будзем, — трэба толькі быць запрауды з імі у дружбе.

Лурье гаворыць, што на гэтых двох тыднях ен дабьецца аканчаньня даручанай яму пазыкі. Я не бачу у гэтым вялікага усьпеху, нават калі банк пойдзе нам насустрэч — настолькі варункі гэтае пазыкі цяжкія. І лічу патрэбным запрасіць офіцыальнай згоды Прэзідыума і Рады Н.М. на гэтыя варункі. Абставіны часу прымусяць усеж такі нас, каб пазыку прыняць, калі дадуць. Але паутараю, толькі прымус прадыктуе нам гэты крок. Пабачым, што будзе...

Што датычыцца справы пазыкі праз Гершовіча, дык Банк атрымау ад Міністэрства адказ такога зьместу, што ен ставіць пытаньне аб пазыке нам ад падгатауляючагося праэкту літоуска-нямецскае гандлевае умовы. Так мне перэдау Гершовіч, папярэдзіушы што гэтага ен чакау. Што павінна гэта азначаць — я дакладна ня ведаю і ламаю над гэтам сабе галаву. Факт той, што нам не адмовілі, но чаму паставілі нашу справу у залежнасьць ад зусім старонняй умовы — пытаньне. Тут у чымсьці сабака зарыта. Я зрабіу крокі, каб раскрыць гэтыя скобкі. Перэгаворы аб умове пачынаюцца паміж Літвой і Нямеччынай у сярэдзіне Студзеня і павінны скончыцца у канцы месяца. Разам з тым вырашыцца і наша справа, пры чым Гершовіч абецае залатвіць яе памысьльна: ён назначаны галавой літоускай дэлегацыі для перэгавораў. Я буду тут пакуль што і буду трымаць руку на пульсе гэтае справы. У зьвязку з перэгаворамі Гершовіч, відаць, едзе у Копенгаген і пасьля яго звароту мы умовіліся дэтальна аба усім пагаварыць. Думаю, што можна будзе нам так, ці інакш скарыстаць з гэтых перэгавораў.

Справу новай пачтовай маркі трэба залатвіць як найхутчэй, але заразам — як найсурьезней. Трэба, каб былі прэдстаулены Радзе Н.М. атпаведныя праэкты і каб былі гарантыі у добрай карысьці справы для нас (а не для розных шыберау). Я гаварыу, паутараю, аб гэтым з Гершовічам і з Др. Шоттэ — ободва абецалі даць пэуныя праэкты. Тое ж — патрэбна і ад знаемых, з каторымі размауляе тут-ка Вальковіч. Разам з тым трэба сур'езна пагаварыць з літоускім Міністрам Почты і Тэлеграфа.

6. Я выезджаю на гэтых днях (пазаутры, ці у пятніцу) у Карлсбад і Прагу. Абавязкова трэба абгаварыць сучаснае становішчэ разам з Украінцамі і, у першую чаргу, з Віннічэнко. Без інфармацый апошняго у нас

ня будзе поунага пагляда на справу усходу. Вырашу так сама справу пазыкі у чэхау, галічан і справу місіі у Праге. Калі прауда, што Петрушэвіч у Праге, дык у Вену ехаць не прыдзецца.

Што датычыцца нашае палітычнае нарады, то я зауседы стаял на тым, каб яна адбылася. Але гэтая нарада толькі тагды будзе мець сенс, калі на ей па першае будзе Ладноу, і па другае — будуць прэдстаунікі з месц, у тым ліку з Менску і Варшавы. Я пісау Вам як можна знасіцца з Варшавай (праз Данціг — Укр. Конс. палкоунік Паулюк). Грыб павінен хатука прыехаць і прывесьці патрэбныя весткі аб стане рэчэй пад Польшчай.

Ці атрымоуваеце Вы сталыя весткі ад Ладнова? Ці зноў, як раней ніякага зьвязку з ім нема? Паутараю, без яго нарада немагчыма, хоць бы толькі таму, што ён офіцыальны кіраун[і]к нашай загранічнай палітыкі і інфармован у паглядах Антанты.

Гэты ліст, пане Вацлаве, прачытайце разам з Антонам, дзеля таго, што я не магу перапісываць яго яшчэ раз. Цяпер адкажу на спецыальныя пытаньня, якіе закрауу Антон.

а) Умова наша з літоуцамі ясна кажэ, што граніца паміж Беларусью і Літвой пакуль што застаецца неакрэсьлянай. Да часу скліканьня нашага Сойму. Значыць — граніца Літоускага гаспадарства йдзе па г[р]аніцы умовы 12 ліпеня. Гэта-ж нам было ясна, калі мы дагаварылісь з літоускім урадам. І з гэтага трэба рабіць адпаведныя вывады. Што датычыцца пагляда на гэтае пэтаньне нашых віленскіх і горадзенскіх організацый, дык яны — установы грамадзкіе і для іх ніякі загад не абавязковы. Што хочуць, то ніхай і робяць. Трэба глядзець, што для нас карысней, ці легальна працаваць на Літве, ці выігрываць у апініі віленскіх дзеячоу.

в) йсьці на компромісы з бальшавікамі можна толькі тады, калі з гэтага што небудзь выйдзе. Пакуль што з гэтага нічога выйсьці ня можэ, а ужо адзін факт нашага істнаваньня як ураду — палова справы. Тое самае — з палякамі.

с) фармаваць войскі — добра, але з каго і за якія кошты? Адзіна, што рэальна — гэта тварыць у Літве тое, што твораць палякі на Беларусі — беларускіе вайсковыя часткі. Арганізоуваць іх толькі у складзе літоускае арміі і на літоускі кошт. Патроху людзей мы можам надсылаць адсюль. Рабіць гэта паціху беза усякае шуміхі і рэклямы.

д) паустаньня у Жэліговіі — рэч патрэбная і палітычна не шкадлівая. Згодзен; але больш лічыу бы карысным весьці грунтоуную агітацыю, бо паустаньня гэтыя, наскольк і яны робяцца не па нашаму безпасярэднаму загаду, нема ведама каму яшчэ прыносяць карысьць, а каштуюць дорага.

Дадам две навіны:

1 — Польшча падпісала сэкрэтную абараніцельна-наступацельную умову з Фінля[н]дзіей проціу Саветау. Вядуцца аб гэтым жа гутаркі з Румыніей: Фатаграфічны зьнімак з першае умовы бачыу Бруно[5].

2 — Польскі урад, як паведамляе карэспандэнт «Голаса Росіі» атрымау ад Лігі Нацый цыркуляр, у каторым гаворыцца, што у справе Вільны і абшару, апроч двох заінтэрэсаваных старон есьць яшчэ трэці, і што з гэтым трэба лічыцца. Тэкст цыркуляру дакладна няведам ні польскай прэсі

(якая, відаць, яго замаучывае) ні карэспадэнту, апошні строіць дагадкі, што тутка йдзе гутарка аб Расеі. Ці не аб нас гаворыць цыркуляр?

Бывайце здаровы.
Цісну руку АлдрЦвікевіч

Мюллер быў сягонні у Міністэрстві, дзе яму сказалі: «Афіцыальна мы ня можэм адказаць на запытаньня аб візах інакш я[к] негаціўна. Неафіцыальна мы знайшлі тут у Бэрліне спосаб даваць Вам магчымасьць пераездаў (вядомые Вам пасьведчаньня!). Мы заўсёды рады, калі нашы прэдстаўнікі у другіх дзяржавах робяць гэта, не пытаючыся нас. Калі-ж яны запрашываюць офіцыально — дык мы адмаўляем, як гэта было недаўна між іншым з запросам з Лодзі». — Трэба залатвіць справу на месцы с прэдстаўніком — знайсьці для гэтага ходы. — Візу для Грыба далі адразу-ж і па тэлеграфу.—

Інымі словамі — тое, што я ужо напісаў у пачатку ліста.

Быв. зд. АлЦв...

582.1.45:116&r-116a&r-116d&r

---

[1] Старшыня СНК савецкай Украіны. [2] Дыпляматычны прадстаўнік савецкай Расеі ў Літве. [3] Аўсянік. [4] Восьмы Ўсерасейскі Зьезд Саветаў адбыўся ў Маскве 22-29.12.1920. [5] Мюллер.

2593. «Да ўсіх». Пратэст Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі за 10.01.1921 супраць надзяленьня польскіх жаўнераў землямі ў абязьлюдзелых паветах Беларусі

582.2.58:064 — шк фра
582.2.58:065 — шк фра
582.2.58:066 — шк фра
582.1.23:008&r — мк бел
582.2.58:080 — мк бел
582.2.58:081 — мк бел
582.2.58:082 — мк бел
582.2.58:084 — мк рас
582.2.58:085 — мк рас
582.2.58:086 — мк рас
582.2.58:087 — мк рас
582.2.58:088 — мк рас
582.2.58:089 — мк рас
582.2.58:090 — мк рас

Тэкст супадае з тэкстам дакумэнту № 2597.

2594. Справаздача Сымона Рак-Міхайлоўскага (Варшава) за 11.01.1921 аб выдатках з 45.000 польскіх марак, атрыманых ім 19.12.1920 ад Цэнтральнай Касы БНР праз Аркадзя Смоліча

582.2.56:175&r-176

2595. Рапарт паўнамочнага дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Літве Антона Аўсяніка старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 12.01.1921

Копія

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ
РЭСПУБЛІКА

ПАЎНАМОЧНАЕ ДЫПЛЁМАТЫЧНАЕ
ПРЭДСТАЎНІЦТВО
у ЛІТВЕ
12 I 1921
№6

Яго Дастойнасьці
п. Старшыне Рады Народных Міністрау Б.Н.Р.

Маю гонар паведаміць аб ніжей пісаным:

1. У справе перагаворау з Савецкай Расіяй

Перагаворы мае з Аксельродам[1] спыніліся з прычыны катэгарычна выстауленых ім мне запытаньняу, змест якіх Вам ведамы, на якіе я не маючы дэрэктыу, ня мог даць адповедзі.

Аднак, у вуснай заяве Вам і сябрам Прэзыдыуму Рады Б.Н.Р., я некалькі разоу зауважау, што для карысьці нашай справы гэтые перагаворы трэба вясьці як Коуне, так і глауным чынам у Маскве.

У даны час перагаворы з Аксельродам, як мне ведама, вядуць п.п Цьвікевіч[2] і Галавінскі, — аб ходзе перагаворау я не паінфармаваны.

Я пазволю сабе высказаць свае погляды на справу дзержауных адносін да Савецкай Расеі, тым больш, што гэтая справа, дзякуючы палітычным абставінам, сталася актуальнай.

Як ведама, яшчэ першы Урад Б.Н.Р. — Народны Сэкрэтарыят — у 1918 годзе стараўся навязаць прыхільныя дзержауные стасункі з Масквой. Дзеля гэтай мэты Народны Сэкрэтарыят праз свае дэлегацыі уступау у перагаворы з Масквой. Перагаворы гэтыя аднак канкрэтных вынікау не далі і даць не маглі дзякуючы гэткім аснауным прычынам:

а) Бальшэвізм, а гэтым самым і Урад Савецкай Расеі, які здзейсьняе ідэалы сусьветнай рэвалюцыі і камунізму, па сваей істоце зьяуляецца інтэрнацыянальным. Ідэі нацыянальныя ен лічыць перажыткам буржуазным.

б) Беларускую дзержаунасьць разгледае у значэньні тэрыторыяльным — абласным.

І як ведама, у 1919 годзе «Літ-Бел» гэта паказау на практыцы.

Дэлегацыя Ураду Б.Н.Р. гэтак сама у прошлым годзе не дайшла да згоды з Маскоускай Уладай дзякуючы вышэй пісаным прычынам.

І у перагаворах з Аксельродам выявілося, што Савецкая Расія прызнаць незалежнасьці Беларусі у тым значэньні, у якім жадаюць і разумеюць гэта беларускіе палітычные партыі, грамадзкія арганізацыі і Урад Б.Н.Р., ня можэ. Сталося ужо ясным, што Савецкая Беларусь федэратыуна зьвязана з Савецкай Расіяй, а гэта значыць, што і юрыдычна і фактычна незалежнасьці Беларусь ня мае.

Маючы на увазе вышэй памяненыя факты і кіруючыся перш за усе нашымі нацыянальнымі інтэрэсамі, я асьцерэгауся ісьці у сваіх перагаворах

з Аксельродам на абецанкі цеснага Беларуска-Маскоускага збліжэньня. І цяпер — у цяжкі час для нашай гасударственнасьці — я лічу, што перагаворы з Савецкай Расіяй павінны вясьціся вельмі асьцярожна і толькі у плоскасьці абароны непадзельнасьці і незалежнасьці Б.Н.Р.

Рэч ясная, што Савецкі Урад, ужо праклямаваушы Савецкую Беларусь у імя сваіх комуністычных ідэй і палітычных мэтау, ня згодзіцца прызнаць Урада Б.Н.Р., бо Масква лічыць ужо уконстытуаваныя камісарыяты органамі на Беларусі.

Калі Аксэльрод прапанавау мне, каб наш Урад дагаварвауся з «Ревкомам» — я гэтую прапазыцыю лічыу патрэбным адкінуць, матывуючы тым, што Урад Б.Н.Р. зьяуляецца ядыным правамочным Урадам на Беларусі, нясучым сваю прыемственнасьць ад 1-га Усебеларускага Кангрэсу, а дзеля гэтага разгледае «Рэвком» як орган сілком накінуты беларускаму народу; з гэтай прычыны Урад Б.Н.Р., жадаючы аднак паразумецца з Масквой мог-бы вясці перагаворы толькі безпасрэдна з Уладай Р.С.Ф.С.Р.

Ставячы справу гэткім парадкам, я прыняу пад увагу захаваньне аутарытэту Ураду Б.Н.Р. і ідэю незалежнасьці Беларусі.

Перагаворы Ураду Б.Н.Р. з Урадам Савецкай Беларусі умацавалі-б яшчэ больш праконаньне, як некаторых Дзержау Эуропы, так і самой Савецкай Расіі, што справа беларуская — хатняя справа Расіі.

Каб забязпечыць сабе пашырэньне ідэі сусьветнай рэвалюцыі у першы чарод на Захадзе — бальшэвікі стараюцца, як і самі у гэтым прызнаюцца, стварыць буфэрныя Савецкія Дзержавы, якіе і палітычна і эканамічна падпарадкаваны Маскве.

Я глыбака праконаны, разумеючы ідэалегію маскоускіх камуністау, што навет пайшоушы на компроміс з Савецкай Расіей, наш Урад, як выканауца ідэі аслабаненьня нашага народу з чужацкага ярма, як абаронца нацыянальна дзержауных правоу яго, ня здоляе здзейсніць сваіх заданьняу, супрацоунуючы з Масквой.

Мір Польшчы з Савецкай Расеей трэба разгледаць як факт часовы. З поуным правам, можна сказаць, што мір гэты, як не натуральны і штучны, з пачаткам падхадячага палітычнага момэнту парвецца, і мы ізноу будземо сьведкамі вайны паміж нацыяналістычнай Польшчай з камуністычнай Расіей. Гэта пацьверджаецца цэлым радам фактау: як Польшча, так і Расія сьпешна рэарганізуюць і умацоувываюць свае арміі, а падарож Начальніка Польскай Дзержавы у Францыю звязана з Польска-Францускай мілітарнай угодай.

Хто выйграе гэту вайну — ня ведама, а дзеля гэтага нашы адносіны да абедзьвіх старон павінны быць дужа асьцерожнымі.

Падзеі палітычныя у даны час дужа меняюцца і хто сягоння яуляецца ворагам, заутра можа стацца прыяцелем.

2. У справе адносін Літоускага Ураду да Б.Н.Р.

У сваей працы я зауважыу, што Літоускі Урад у сваіх афіцыяльных адносінах да Ураду Б.Н.Р. застаецца прыхільны.

Аднак, фактычна Літоускі Урад у апошніе часы вядзе сваю палітыку, якая нашай справе можа пашкодзіць.

Факт перагаворау Літвіноу з Палякамі, аб чым сьведчыць польская і загранічная прэса, аб справе цеснага збліжэньня абедзьвіх дзержау — стау безпярэчным. Літоуская-ж прэса і Літоускі Урад гэту справу затушоуваюць, прыдаючы ей значэньне «Перагаворау аб абмене ваенна-палоннымі».

Бяручы пад увагу, што угода Літоуска-Польская можа адбыцца за кошт нашых зямель, а гэтак сама ануляваньне умовы нашай з Літвінамі 12 Лістападу 1920 г., безаткладна патрэбна з нашага боку прыступіць да падгатаваньня грунту для Дзержаунага Беларускага і Польскага збліжэньня.

Вядучы гэту справу покі што зусім сэкрэтна, я лічыу-бы што работу трэба распачаць у двух кірунках: першае — распачаць гутаркі з прэдстаунікамі Польскай Рэспублікі у Прыбалтыцэ, другое — увайсьці у цесныя зносіны і паразуменьня з Беларускімі групамі, якіе вядуць палітычную працу, апіраючыся на Польшчу.

Я ужо паведамляу Вам, што Літоускі Урад лічыць сваймі дзержаунымі граніцамі на Усходзе, абазначэныя лініі 12-га Ліпеня, і па гэтаму праву ня лічыць магчымым, каб дыплематычнае Прэдстауніцтво у Літве выдавала пашпарты грамадзянам-беларусам з чыста беларускіх зямель як Горадзеншчыны, так і Віленшчыны.

Гэты факт пры лепшым становішчы нашай дзержаунасьці трэба было-б разгледаць як факт нам варожы, але я лічыу-бы па прычынам тактычным не рабіць з яго, покі што, казус-бэльлі.

Да гэтага часу другі пункт умовы Літоускай Дзержавай ня выпаунены. Міністэрство Загранічных Спрау тлумачыцца, што вайсковыя беларускія фармацыі выклічуць незадаволеньне з боку Савецкай Улады і сам факт фармаваньня можа паслужыць канфліктам між Літвой і Савецкай Расіей.

Матывы такога тлумачэньня нельга прызнаць слушнымі, бо перш чым падпісываць умову з намі — Літоускі Урад паразумеваўся з Масквой, тым больш і Масква не магла і ня можа мець супроць нашых вайсковых фармацый, бо яны, як ведама, павінны былі-б ствараца дзеля карысьці саміх-жа бальшавікоу. Значыцца, у матывах Літоускага Міністэрства Загранічных Спрау трэба шукаць другую прычыну, а яна есьць у факце Літоуска-Польскіх перагаворау.

Справу вайсковых фармаваньняу, хацяб компрамісова, трэба, на мой пагляд, вясьці далей і дабівацца яе вырашэньня.

3. У справе Беларускіх Партызан.

У білютэнях прэс-бюро пры дыплематычным прэдстауніцтве я стараюся усімі мерамі павялічыць значэньне барацьбы партызанау, а гэтым самым нашай нацыянальнай сьпеласьці.

Справу Беларускіх партызан, як і справу Першай Беларускай Брыгады узяла на сябе група беларускіх дзеячоу, якая называе сябе «Найвышэйшай Радай Б.Н.Р.».

Угледаючыся-ж на тое, што факт партызанскай барацьбы нашага селянства з маскоуцамі мае значэньне ня толькі маральнае, а і глыбака палітычнае і карыснае для справы нашай Дзержаунасьці, партызанскі рух трэба усімі мерамі пашыраць і мець на яго Урадовы Уплыу.

Аднак, гэта можна зрабіць дарогай згавору з цяперашнімі правадырамі партызаншчыны. Але вырашэньне гэтага пытаньня зьвязана з вырашэньнем і другога пытаньня, а ласьне: нікаторые з нашых выдатнейшых дзеячоу угледаюцца на справу партызан не прыхільна, лічуць яе шкадлівай для агульнай беларускай справы. Стоючы на іншым грунце, я лічыу-бы, што гэтую паважную справу можна было-б і патрэбна абгаварыць сярод беларускіх дзеячоу, розных палітычных напрамкау, а дзеля гэтай мэты патрэбна безаткладнае скліканьне канфэрэнцыі прэдстаунікоу усіх палітычных партыяу і грамадзкіх арганізацыяу. Гэтая канфэрэнцыя, паміма абгавору пытаньня тут памяненага, заняушыся вырашэньнем сучаснага нацыянальна-дзержаунага становішча нашай Бацькаушчыны, маральна памаглаб у рабоце Ураду Б.Н.Р.

4. У справе адносін Міністэрства Беларускіх Спрау да Ураду Б.Н.Р.

Мне стала ведама ад асоб, якім можна верыць, што як пан Семашка, так і яго агэнты-урадоуцы стараюцца здэскрыдытаваць Урад Б.Н.Р. перад ангельскім Камісарам[3], называючы наш Урад «самазванным» і «авантурыстычным». Лічыу-бы, што такога роду факт трэба давесьці да ведама Літоускага Ураду, прынцыпова ставючы пытаньне аб непатрэбе і шкоднасьці такіх міністрау, як п. Семашка.

5. У справе перагаворау з Прэдстаунікамі загранічных Дзержау.

У перагаворах з Ангельскім Камісарам зауважыу, што справай нашай Англія зацікаулена, асабліва нашым прыродным багацьцем. Англійскі Камісар запрапанаваў мне падаць ад Ураду Б.Н.Р. мэморандум на імя Ангельскага Ураду, пры чым Камісар у мэморандуме [прасіу] паказаць: 1) Якую суму грошэй жадае Урад Б.Н.Р. пазычыць ад Англіі і на якіх варунках; 2) чым можа забезпечыць гэтую пазыку; 3) на які лік войска жадае атрымаць Урад Б.Н.Р. абмундыраваньня, зброі і інш.; 4) дзе мае тварыць сваю армію; 5) кароткі нарыс гісторыі беларускага руху; 6) сучаснае палажэньне Беларусі; 7) адносіны да суседзяу; 8) статыстычныя даныя аб прыродным багацьці Беларусі.

Пры візыце да французскага Прэдстаўніка выясьніу, што адносіы яго да Ураду Б.Н.Р. прыхільныя.

Паунамочны Дыплематычны
Прэдстаунік у Літве.
582.2.49:019&r-020&r — мк

[1] Дыпляматычны прадстаўнік савецкай Расеі ў Літве. [2] Іван Цьвікевіч. [3] Палкоўнік Р.Б.Ўорд (R.B.Ward).

2596. Бюлетэнь Беларускага Прэс-Бюро ў Коўне. №19. 14.01.1921

Польскій терроръ въ Гродненщинѣ. — Белорусскія войска не разбиты.
582.2.58:078 — мк
582.2.58:079 — мк

2597. «Усім». Пратэст Ураду БНР за 15.01.1921 супраць надзяленьня польскіх жаўнераў зямлёю ў абязьлюдзелых паветах Беларусі

УСІМ

Польскі Урад унес у Сойм праэкт двух законау і Сойм прыняў іх:

1) аб пераходзе зямлі у абезлюднеушых паветах Беларусі у уладаньне Польскай дзержавы; і

2) аб надзелі гэтай зямлей польскіх жаунерау.

Так, беларускія землі абезлюднелі. З аднэй Гродзенскай губэрніі расейскі царскі урад, пры атступленьні пагнау з сабой каля мільена жыхароу. У часе польскай акупацыі дзесяткі тысяч селян беларусау былі згноены у турмах і лагерах Польшчы пачынаючы ад Берасьцейскага лагеру і канчаючы Кракаускім.

Касьцьмі беларускіх уцекачоу высланы крыжовы шлях ад Кракава да Сібірскай тайгі... Армія нешчасьлівейшых у сьвеце людзей, страціушых усе што мела, да гэтай пары яшчэ не можэ вярнуцца на свае старыя папелішчы.

Адно, што асталося у іх на бацькаушчыне — гэта мізэрны і зрыты акопамі кавалак зямлі, каторы паіу і карміу іх дзядоу і прадзедау і да яго яны імкнуцца усей душой. Але фронты і жалезныя загародкі перашкаджаюць вярнуцца ім на бацькаушчыну.

Дарэмна... Прагавітыя суседзі шукаюць здабычы на палях нешчасных уцекачоу. Заканадаучая палата займаецца грабежствам і падзелам зямлі уцекачоу.

Няужо чалавецкая прагавітасьць давяла культурны польскі народ да шалу? Няужо старыя дзедоускіе гнезды беларускіх уцекачоу будуць запоунены чужынцамі-прышэльцамі?

Няужо польскі імпэрыялізм пабье сусьветны рэкорд бязпрауя і насільля? У стары нявольніцкі час памешчык-нявольніцкі гаспадар надзеляу сваіх верных слуг зямлей са сваіх абшарау. Цяпер польскі урад і нават Сойм хочуць надзяліць жаунерау, сваіх верных слуг, бараніушых інтэрэсы польскіх памешчыкоу, як у сябе так і на Беларусі, землямі уцекачоу-беларусау.

Далей ісьці нема куды.

Астаецца разрываць магілы і рабаваць нябошчыкау.

Зьвертаемся да усіх, у імя сьвятейшых ідэалау чалавецтва, у імя культуры і гуманнасьці, заступіціся за разрываемую на часьці Беларусь; заступіціся за нешчасных беларускіх уцекачоу.

Людзі гонару скажыце свае цьвердае слова.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі.

15 студзеня 1921 г.

582.1.07:064 — шк бел
582.1.11:045 — шк бел
582.1.11:046 — шк бел
582.1.11:047 — шк бел
582.1.20:001&r — шк фра
582.1.23:001&r — шк рас
582.1.23:002&r — шк рас
582.1.23:003&r — шк рас
582.1.23:004&r — шк рас

582.1.23:005&r — шк рас
582.1.23:006&r — шк рас
582.1.23:007&r — шк рас
582.2.51:035 — шк фра
582.2.51:098 — шк фра
582.2.53:059 — шк фра
582.2.53:163 — шк фра

2598. Ліст Браніслава Тарашкевіча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.01.1921

Браце мілы,

Перад усім шлю Вам шчыры прывет і просьбу перадаць маё прывітаньне старым знаёмым з якімі Вы часта сустракаецеся.

Будучы змушаны быць кароткім, прашу Вас вельмі пераслаць пры магчымасьці тую літэратуру, што Вы дасталі ад п. Марголіна — а перад усім рэчы, якіе адносяцца да філёлёгіі і беларусазнаўства — або на Варшаву або на Вільню.

Наагул перасылайце нам якія маеце і можаце дастаць выданьні.

Дужа быў-бы ўдзячны калі-б Вы маглі дастаць мне з Расеі такіе кніжкі

1) акад. А.Шахматов. Энциклопедія Славянской филологіи. Древнѣйшій період исторіи русскаго языка.

акад. А.Шахматов. Введеніе в курс исторіи русскаго языка (зеленая книжка)

як дастаць усе гэта — можа парадзіць пан Марголін

Гэтые дзьве кніжкі патрэбны мне да зарэзу.

Ваш Тарас

Вільня

15.I.21.

582.1.45:096&r

2599. Ліст Міхася Какановіча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.01.1921

582.1.45:115&r-115a&r

У справе канфлікту ў Беларускім Клюбе. Перададзены з нагодай.

2600. Дагавор паміж Р.С.Ф.С.Р. і С.С.Р.Б. аб ваенным і гаспадарчым саюзе, падпісаны 16.01.1921

582.1.15:277-278 — мк
582.1.15:279-280 — мк
582.1.17:001-002 — мк[1]

[1] Перадрукаваны з газэты «Известия» (Масква) за 6.04.1921, №74.

2601. «Батька» занялся политикой // Эхо (Коўна). 16.01.1921

Генералъ Балаховичъ отъ чисто боевой работы рѣшилъ перейти къ международной политикѣ и началъ съ того, что оффиціально «свергъ» бѣлорусское правительство.

Вотъ послѣдній «декретъ» Балаховича.

«Согласно съ выраженною волей всѣхъ повстанческихъ группъ на территоріи Бѣлоруссіи объявляю: 1) Всѣ повстанческія группы, находящіяся на территоріи Бѣлоруссіи, а также и регулярныя войска находятся подъ моимъ непосредственнымъ командованіемъ. 2) Изъ всѣхъ правительствъ, которыя именуютъ себя Бѣлорусскими правительствами, будетъ признано то, которое опирается на бѣлорусское крестьянство, вмѣстѣ съ нимъ работаетъ за независимость и вмѣстѣ съ народомъ дѣлитъ его тяжелую долю. 3) Тѣ, кто считаетъ себя Бѣлорусскимъ правительствомъ, однако, на дѣлѣ, является только правительствомъ на бумагѣ, разъѣзжаетъ заграницей, не имѣетъ ничего общаго съ бѣлорусскимъ народомъ, тормозятъ дѣло освобожденія родины изъ-подъ большевистскаго ига, объявляются врагами бѣлорусскаго народа. 4) Всѣ, кому дорога родина, призываются къ работѣ подъ моимъ руководствомъ.

Батька-Булакъ-Балаховичъ»

582.1.36:008а

2602. Nota przedstawiciela Litwy przy Lidze Narodów prof. Woldemarasa wręczona prezesowi Ligi Narodów d. 11 grudnia 1920 r. // Goniec Kowieński (Kowno). Nr.12. Niedziela, 16 stycznia 1921

У справе стаўленьня Лігі Нацыяў да польска-літоўскага канфлікту

582.1.36:003

2603. Бюлетэнь Беларускага Прэс-Бюро ў Коўне. №20. 17.01.1921

Беларускі савецкі буфэр (перадрук артыкулу з «Извѣстій Всероссійскаго Исполнительнаго Комитета Совѣтовъ», №291, 25.12.1920)

582.2.58:083 — мк

З грыфам: «Толькі для беларускіх устаноў».

2604. Пратакол сходу Найвышэйшае Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў Варшаве за 19.01.1921

Пратакол
сходу Найвышэйшае Рады Беларускае Народнае Рэспублікі
19 студзеня 1921 году

Прысутнымі былі: Намесьнік старшыні Рак-Міхайлоўскі і сябры Ал.Ўласаў і К.Тарэшчанка.

Слухалі	Пастанавілі
1. Справаздача дэлегацыі Найвышэйшае Рады аб працы у Варшаве.	1. Даручыць грамадзяніну Браніславу Тарашкевічу весьці палітычную беларускую працу, як старшыня дэлегацыі Найвышэйшай Рады і падабраць сабе патрэбных сяброў дэлегацыі, за працу якіх ён бярэць на сябе адпаведнасьць перад Найвышэйшай Радай.

Арыгінал падпісалі: за Старшыню Найвышэйшае Рады Б.Н.Р., Намесьнік яго Сымон Рак-Міхайлоўскі; сябры: А.Уласаў і К.Тарэшчанка.

З арыгіналам згодна: Намесьнік Старшыні Найвышэйшае Рады Белар. Народн. Рэспублікі Сымон Рак-Міхайлоўскі

23/I-1921 г.
м. Варшава
582.2.40:093 — рк

2605. Грамата Найвышэйшай Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Браніславу Тарашкевічу за 19.01.1921 (вых. №11) у справе прызначэньня яго старшынёю Дэлегацыі БНР

Грамата

Найвышэйшая Рада Беларускае Народнае Рэспублікі на сходзе сваім ад 19 студзеня 1921 року ухваліла: назначыць грамадзяніна Броніслава Тарашкевіча старшынёю дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі, ускладаючы на яго кіраўніцтва усей палітычнай беларускай акцыей і атветнасьць за яе.

За Старшыню Найвышэйшае Рады Беларускае Народнае Рэспублікі: Рак-Міхайлоўскі

Сябры Найвышэйшае Рады:
Коз.Тэрэшчэнко
АУласоў

Дана у Вільні
19 студзеня 1921 року
№11
582.2.37:070 — ра

2606. Заява Рады Народных Міністраў БНР міністру замежных справаў Літоўскае Рэспублікі за 20.01.1921 (вых. №312)

Беларуская Народная Рэспубліка
Рада Народных Міністрау
20 студзеня 1921 г.
№312.

ЯГО ДАСТОЙНАСЬЦІ
Пану Міністру Міжнародовых Спрау
Літоускае Дзержавы.

У зьвязку з ліквідацыей авантуры Жэлігоускага і Вашай прапазыцыяй аб супольнай працы у гэтым кірунку — Урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае гонар паведаміць аб сваей плятформе, што да Савецкай Беларускай Рэспублікі і кірунку працы у найбліжэйшые часы:

1. Урад Б.Н.Р., зьяуляючыся насіцелем чыстай ідэі незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі, з гэтага пункту зыйсьці ня можэм.

2. У адносінах да Савецкай Беларускай Рэспублікі Урад Б.Н.Р. хоча захаваць прыязные адносіны.

3. Найбліжэйшай сваей задачай Урад Б.Н.Р. лічыць працу у кірунку злучэньня заходняй часьці Беларусі з усходняй.

Пры гэтым мае гонар зазначыць, што Беларускі Народ, змучаны сямілетняй вайной, дабіваючыся незалежнасьці і непадзельнасьці сваей Бацькаушчыны, шукае варункау спакойнай, творчай працы.

Ластоускі Старшыня Рады Народных Міністр[а]у. Аусянік за Дзержаунага Сэкрэтара.-

З арыгіналам згодна:
М.Севасьцянюк
За Кіраўніка Канцэлярыі Рады Народных Міністрау
582.1.15:272 — мк

2607. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.01.1921

20.I.1921.

Вельміпаважаны Дзядзька Власт,

атрымаў Ваш ліст з наказамі наконта Турчыновіча і хоць не дачытаў ешчэ гэтай кнігі[1], бо смакую кожны ліст, але пасылаю яе Вам.

Вельмі буду Вас прасіць, каб Вы далі яе праглядзець і Варонцы.

Камплект будзе Вам пересланы з Вальковічам.

Разам з Турчыновічам пасылаю «Русскій Календарь-Справочнік на 1921 годъ». У ём ёсьць весткі і аб нас: даў тое-сёе.

Аб справах не пішу, бо ў курсе ўсіх спраў Іван Іванавіч[2], які зробіць Вам даклад.

За наша становішчэ тутака змагаемся усемі спосабамі. Усе, на каго магчыма была нажаць — скарыстаны. Гэтымі днямі ўсё аканчацельна будзе высьветлена.

Шлю найлепшыя пажаданьня.

З шчырай пашанай
К.Езавітаў
582.1.45:093&r

[1] Магчыма, маецца на ўвазе кніга А.Турчыновіча «Обзоръ исторіи Бѣлоруссіи съ древнѣйшихъ временъ» (1857). [2] Цьвікевіч.

2608. Ліст Алега Васількоўскага (Рэвэль) Кастусю Езавітаву (Рыга) за 20.01.1921 з просьбай працягнуць тэрмін дзейнасьці дыпляматычнага пашпарту

582.2.12:030&r-031&r

2609. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 21.01.1921

21.I.21.

Паважаны Грамадзянін Старшыня,

сенека выяснілася, што Місыю ўсеж ткі трэба ліквідаваць, бо, як я і раней ведаў і казаў, — нажымаюць ад Hotel'я Бельвью[1]. Афіцыяльных

нотаў усходнікі не пасылалі, але некалькі разоў ужо прыватна ставілі пад увагу парушэньне дагавору латышамі, «трымаючымі ў сябе прэдстаўніцтва Ураду, змагаючагася з Усходам».

Я зрабіў захады прад літвінамі і латышамі, каб перадаць нашых грамадзян літоўскаму пасольству. Латышы на гэта згадзіліся, а літоўскі пасол запрашывае згоды Літоўскага Ураду. Трэба Вам пагутарыць з Пурыцкім, каб ён даў сюды належнае распараджэньне.

Я ўжо тры дні як загатовіў Вам ў гэтым сэнсі тэлеграму, але мне камісыя да гэтага часу забараняе Вам паслаць. Час ідзе і могуць быць непрыемнасьці, за якія я ўзяць на сябе адпаведнасьці не хацеў бы.

Вельмі прашу Вас зрабіць націск на Пурыцкага, каб літвіны срочна ўзялі на сябе абарону нашых грамадзян.

Тэхнічна справу можна былаб паставіць так, што адзін з нашых грамадзян мог бы працаваць пры літвінох, напрыклад Гр. Пігулеўскі, які добра знае справы консульства і яго ведае ужо наша грамадзянства тутака.

Што тычыцца мяне, дык я, на моцы наказа Вашага, даденага мне ў Коўні, казаў ўсім, а таксама і ў Міністэрстві Межнарадовых Спраў, што я выеду з Латвіі, як толькі Місыя будзе зліквідавана. С сабой я меў на мече узяць:

а) архівы;

б) грашовую адчотнасьць;

в) марку[2];

Пасля інфармацыі Гр. Вальковіча аб тым, што я павінен астацца ў Рызе, я ня ведаю як усе гэта сагласаваць і чэкаю Вашых тэлеграфных інструкцый.

З вялікай да Вас пашанай

К.Езавітаў

582.1.45:110&r

[1] Амбасада савецкай Расеі. [2] Маркі Асобнага Атраду БНР, выпушчаныя зь ініцыятывы К.Езавітава ў лютым 1920 году. Гл.: Jaeger W. Die Briefmarken des Weissrussischen Armeekorps // Der Baltische Philatelist (Libau). Nr.1. 20.04.1920. S.13-14.

2610. Ліст Васіля Захаркі (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 21.01.1921

Даражэнькі пане Вацлаве!

Справа с хворымі стаіць так як стаяла да адъезду Цьвіка. Сеньняка прыехаў Розенбаум. 8 гадзін вечэра павінен быць у нас. Негледзячы на гэто, я не думаю каб што перэменілася.

Сеньнека я яшчэ раз быу у Прэзыдэнта Чаксте у справе місіі. Афіцыальна місію прыдзецца зліквідаваць, прычына не афіцыальная заява Іоффе[1]. После такое заявы латышы баяцца інцыдэнтаў, асабліва с прыбліжэньнем вясны. Неафіцыальне пазваляецца усякая праца і мажлівая дапамога, так прынамся сказаў мне пан Прэзідэнт.

Мы тутака думаем даручыць засчыту інтэрэсаў нашых грамадзян Літоўскаму пасольству, на што апошні згадзіуся, пры варунках разрашэньня на гэто Міністра Пурыцкіса. Зрабеце крокі у гэтым напрамку перэд

Пурыцкісам і рэзультат тэлеграфуце Езавітау. Пры літоускам пасольстве павінен быць адзін наш чалавек.

Каго аставіць я не ведаю на мой погляд гэтым чалавекам павінен быць Пігулеўскі альбо Грунтоў. Рэвізыі я не рабіу дзякуючы таму што бухгалтэрыя ідзе у Коуно гдзе усе гэто можна будзе зрабіць ціхо і спакойна.

Бывайце здаровы

Васіль.

Я выезжаю у суботу альбо недзелю[2]

582.1.45:114&r-114a&r

[1] Старшыня савецкай дэлегацыі на мірных перамовах у Рызе. [2] 22-23.01.1921.

2611. Польскій грабежъ // Воля Россіи (Прага). №109. 22.01.1921

582.1.36:006

Камэнтар да закону аб надзяленьні зямлёй польскіх жаўнераў у беларускіх і ўкраінскіх паветах.

2612. Ліст Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Камітэту міністру замежных справаў Польшчы (Варшава) за ??.01.1921 у справе ўстрыманьня русыфікацыі праз школы й праваслаўную царкву

582.2.38:118&r — мк

Дакладная дата невядомая.

2613. Адкрыты ліст [Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Камітэту] да польскага грамадзтва ў справе закрыцьця міністрам унутраных справаў газэты «Беларускае Слова»[1] і рэпрэсіяў супраць Горадзенскага Беларускага Камітэту

582.2.38:119 — мк

[1] «Беларускае Слова» было зачыненае на загад горадзенскага старасты Рагалевіча. Гл.: Наша Думка. №5. 4.02.1921.

2614. Ліст Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Камітэту міністру ўнутраных справаў Польшчы (Варшава) за ??.01.1921 у справе выдзяленьня крэдыту на выплату Камітэтам даўгоў

582.2.38:120&r — мк

Дата невядомая.

2615. Пастанова за 23.01.1921 аб выплатах з Цэнтральнай Касы Беларускай Народнай Рэспублікі

23 студзеня 1921 году ухвалена:

выдаць з Цэнтральнае Касы Б.Н.Р.

1) Сябру Н.Р., п. К.Тарэшчанку у лік аканчальнай пэнсіі за студзень 2.000 м. і сутачн. за студзень 9.000 = 11.000 мар.

2) Віцэ-старш. Н.Р., п. Рак-Міхайлоўскаму сутачныя з 26 верасьня па 3 кастр. 2.400 мар. (пры паездцы з Горадні у Варш.), у лік аканчальнай пэнсіі за 1920 год — 3.000 м., сутачныя (Горадня—Варшава—Вільня, Варшава— Горадня—Вільня) за 11 па 31 студз. 1921 г. — 6.300 м. і пэнсія за студзень — 13.000 м. = 24.700 мар.

3) Сутачныя прадст. Ураду, п. Арк.Смолічу за студзень 1921 = 9.000 мар.
4) Сябру Найв. Рады, Ал.Уласаву, пэнсія за студзень 1921 г. = 10.000 "
5) Прадстаўніку Ураду, п. Л.Дубейкоўскаму пэнсія за студзень месяц і сутачныя з 14 па 19 студзеня = 11.800 "
6) Мейлаховічу за друк газэты «Белр. Слова» = 50.000 "
7) Рэдактору «Бел. Слова» п. Шалешку пэнсія за сьнежань 1920 г. = 3.000 "
8) Беларускай Гімназіі у Горадні 30.000 "

Разам 149.500 мар.
Рак-Міхайлоўскі
ЛДубейкоўскі
582.2.40:094 — ра

2616. Заява Рады Народных Міністраў БНР міністру замежных справаў Літоўскае Рэспублікі за 25.01.1921 (вых. №315)
Беларуская Народная Рэспубліка
Рада Народных Міністрау
25 студзеня 1921 года
№315.

Яго Дастойнасьці
Пану Міністру Міжнародовых Спрау
Літоускай Рэспублікі.

Згодна адбытай гэтага 25-го студзеня 1921 г. нарадзе пры Вашым пасрэдстве між мною і Прэдстаунікам Р.С.Ф.С.Р. у Літве грамадзянінам Аксельродам было адзначэна, што другі пункт нашай заявы пададзенай Вам 20-І,-21 пад №312 не здавальняе Р.С.Ф.С.Р. дзеля сваей якобы, неяснасьці што да нашых адносін да Савецкай Беларускай Рэспублікі, прычым была зазначэна грамадзяінам Аксельродам, што больш выразная формуліроука гэтага пункту магла-бы павясьці ад прыхільных да саюзных адносін з Урадам Беларускай Народнай Рэспублікі, абапертых на умоуных асновах.

Гэтым у дапауненьне нашай заявы ад 20-І,-21 г. паясняем:

Лічучы, што апавешчэньне і устанауленьне Беларускай Савецкай Рэспублікі есьць адна са ступеняй да поунага здзейсьненьня незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі ня толькі ня мае на мэці вясьці аружную ці іншую якую барацьбу з ею, але наадварот, будзе памагаць Савецкай Беларускай Рэспубліцэ, як у справе адраджэньня беларускага народу, так і у справе поунага здзейсьненьня незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі.

Ластоускі Старшыня Рады Народных Міністрау. Аусянік за Дзержаунага Сэкрэтара.-

З арыгіналам згодна:
М.Севасьцянюк
За Кірауніка Канцэлярыі Рады Народных Міністрау
582.1.15:273 — мк

2617. Матэрыялы «Для помѣщенія въ прессѣ» за 25.01.1921

Пра перанос базы арміі БССР зь Менску ў Кіеў (газэта «Время» (Бэрлін) за 17.01.1921); пра выбары Беларускага Савету Народных Камісараў; пра абсалютны цэнтралізм Масквы.

582.1.38:001-003 — мк

2618. Ліст шэфа Беларускай Місіі ў Бэрліне Леаніда Баркова (Бэрлін) канцылярыі Міністэрства Замежных Справаў БНР (Коўна) за 25.01.1921 зь перасланымі рэзалюцыяй інтэрнаваных беларусаў у Ліхтэнгорсьце і 3 камплектамі Бюлетэняў Прэс-Бюро за 1920 год (да №14 улучна)

582.1.46:014

2619. Ліст Тамаша Грыба (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.01.1921

Дарагі таварыш Вацлаў Ластоўскі!

Азнаёміўшыся з палітычным настроем у Рызе — мушу прызнацца што нашая справа, т.е. справа беларускага дзяржаўнага адраджэньня стаіць ня вельмі блага. Кажу ня вельмі блага, бо і ня вельмі хораша...

Справа ў тым: Беларусь становіцца цэнтрам палітычных інтрыг. З аднаго боку Польшча, Савінкоў, Булак-Балаховіч, а з другога Савецкая Расея. Польшча працягае свае рукі на Беларусь маючы на ўвазе як найдалей пашырыць свой уплыў на Заходзе, а Савінкаў з сваей грамадой розных кваліфікаваных «бандытаў і зладзеяў» стараіцца як небудзь «пятушком, пятушком», як той бязсьмертны Гоголеўскі Добчынскі і Бобчынскі, пралесці йзноў на верх палітычнага жыцьця і цаной розных тэрыторыальных уступак «расейскіх абласцей» дабіцца ад Польшчы права на сваё марнае жыцьцё ў Варшаве, каб потым праз нейкі час стаць героем у ролі збаўцы «святой і недзелімай матушкі Расеі».

Узапраўды мы перажываемо цекавы гістарычны мамэнт. Гэтаж ніколі хіба ў гісторыі нябыло такой подлай, ганебнай сьпекуляцыі ідэямі, лёзунгамі; гандлем народным сумленьнем, народнай воляй. І гэта ўсё робіцца ў наш дваццаты век!..

Расейскія комуністы сьпекулюць ідэямі комунізма, сьпекулюць соцыялістычным сумленьнем. Яны дайшлі да вертуознасьці ў гэтай сьпекуляцыі. Маленькі і дужа вялікі прыклад: для іх маленькі, а для нас вельмі вялікі — Беларусь абвешчана Незалежнай Савецкай Рэспублікай. Ужо трэці раз здаецца яны абвешчаюць гэтую незалежнасьць, а незалежнасьці гэтай пэўна-ж, як ня было так няма. Я не маю права судзіць аб тым што робіцца цяпер у Менску, але чую пасьля гутаркі з тутэйшымі савецкімі прэдстаўнікамі, што мала ёсьць там чаго цекавага. Усё гэта імі робіцца толькі для вельмі складнай бугальтэрыі — сьпекуляцыі. У іх шчырасьць я зусім ня веру. Бо ўсе яны перш маскалі, а пасьля ужо камуністы, як і тыя Расейскія эс-эры з Чэрновым і Керэнскім на чале што засядаюць у Парыжы разам з кадэтамі і на ўвесь сьвет крычаць аб «отторжении искони руских областей» чужаземнымі дзяржавамі, як напрыклад Бесарабіі Румыніей, а Дальняга Вастоку (Камчаткі і інш.) Японіей. Яны на ўвесь сьвет крычаць, што яны як адзін чалавек бяз розьніцы на партыйную

прыналежнасьць гатовы выступіць на абарону «единой и неделимой», а што справа новых паўстаўшых дзяржаў на тэрыторыі царскай Расеі ёсьць унутранная справа Расеі. Усім «инородцам» яны абяцаюць даць «культурно-национальную автономию». Татарскія прэдстаўнікі ім сказалі на гэта — дзякуй!.. Яны сказалі, што часы Івана IV прайшлі, што мэтад сабіраньня «единой и неделимой Русі» цяпер нельга прымяняць. Але дзе там — ад імя ўсей быўшай царскай Расеі эс-эры крычаць на ўвесь сьвет, што яны ёсьць цяпер (гэта на мейсца Врангеля і С<упол>кі) «блюстителями интересов единой и неделимой». Дзе-ж іх тагды соцыялістычныя ідэі? Дзе іх соцыялістычная эціка?

Розьніцы у гэтым пытаньні паміж цяперашнім расейскім Парыжам і Савецкай Масквой няма, а калі і ёсьць, то ў тым толькі, што Савецкая Масква ўжо сабірае Расею, а расейскі Парыж «думае» сабіраць.

А Савінкаў проста сабе рашыў, што (гэта усьлед ідучы за Савецкай Масквой) прызнаньне незалежнасьці дзяржаў паўстаўшых на тэрыторыі б. царскай Расеі ёсьць вельмі модна, то і чаму-б не надзець яму гэты модны касьцюм. А тым больш што гэта прыкрые крыху яго воўчыя зубы і зьмяіннае жала.

Так абстаіць справа з усходу. Гэткая вядзецца сьпекуляцыя лёзунгам «вольнае самаазначэньне народаў».

Польшча тая дрыжыць за сваю скуру цяпер як ніколі раней. Ей усё стаіць перад вачыма здань чацьвёртага і апошняга падзелу. Яна кідаецца як тая апошняга пашыбу прастытутка то таму то другому на шыю, а не то выступае ў пекнай вопратцы збаўцы эўрапейскае культуры ад дзікага усходу — Бачыця якая я пекная ў гэтай позе, якая прыгожая. Ну, хто больш заплаціць за мае ласкі?.. І разврашчонная Эўропа, як той стары развратны Рым чуіць свой ганебны канец, чуіць што дажывае апошнія свае дні гатова хоць які прыняць наркоцік, каб толькі хоць мамэнт, адзін мамэнт адцягнуць апошняю гадзіну сваей сьмерці. Гэтым наркоцікам, гэтым морфіем зьяўляіцца палітыка Антанты інтэрвэнцыі на Савецкую Маскву пад лёзунгам «права на вольнае самаазначэньне народаў», каб потым усіх іх аддаць у новую няволю, у новае рабство «единой и неделимой» трэцяй нібы дэмакратычнай Расеі. Але пакуль што няма гэтай трэцяй Расеі, ёсьць толькі Савецкая Масква, якая нясе згубу старой Эўропе, якая руйнуіць старыя ўжо нікуды нягодныя прыйшоўшыя ў ветхасьць ад часу турмы і заместа таго, як прапануюць некаторыя, іх напраўляць, рамонт рабіць, — яны руйнуюць гэтыя турмы а будуюць новыя турмы па ўсім спосабам сучаснай тэхнікі і культуры. Старушка Эўропа баіцца, вельмі баіцца гэтай новай турмы — бо ў ёй будзе крыху больш сьвету, але ня хочыць ці мо' ня можыць бачыць таго, што больш таўстыя у новай турме будуць краты, больш моцныя ланцугі няволі...

Усё-ж такі Антанта стаіць за тое, каб істнавала як доўга гэта ўсё роўна, але усё-ж такі старая турма, стары ганебны для чалавека спосаб жыцьця. Дзеля чаго яна і стараіцца падтрымаць Польшчу, а мо навет у хуткім часе і Латвію аб'еднае з Польшчай і Літву etc. Трэ стварыць новы калючы дрот. Авантура другой Расеі правалілася, трэцяя пад самненьнем, — трэба стварыць новы кардон проці Савецкай Масквы, яшчэ крыху адцягнуць час сваей сьмерці...

І вось паездка Майеровіча[1] у Парыж і Лёндан вельмі характэрна, як і спыненьне беларускага консульства у Рызе. Усе гэта паказавае, што тут ёсьць рука усё той-жа Антанты перад якой вы таварыш аклеветаны ясновельможнай панначкай Польшчай. Ня трэ-было сварыцца і вы былі-б у пачоце ў старушкі, бабці беззубай... А мо яшчэ бабця і зьменіць свой пагляд, бо ей у гэтай новай комбінацыі, ў гэтай новай авантуры патрэбны будуць і беларусы. Бяз іх і тут не абыйдзешся. Вось, мне здаецца падыходзе такі мамэнт, калі старушка бяззубая зашамкае: а дзе-ж тут мае беларусікі... І іх я хачу прыласкаць... прыгалубіць. Бачыця як абласкана мной Польшча, Лотва, Літва etc. Хадзі ка мне беларуска, якой скажа і стане Незалежная вольная Беларусь, аж пакуль не настане час трэцяй «единой и неделимой» Святой Расеі матушкі.

Польшча, Лотва, Літва карыстаюць з часу і поўнымі жменямі забіраюць, прыгортаваюць к сабе беларускае дабро, беларускія землі. Бо, бачыш, яны ў пачоце, ў асобым фаворы у бяззубай бабушкі... А беларуска, нібы нейкае неўдалае дзіцянё, як той Іванка прастачок з народнага эпасу, ніяк няможа прыстасавацца да бабулькі. А калі нарэшці бабулька і прыгалубіць то пэўнаж скажыць, каб не сварылася з Польшчай, Літвой, Лотвай — яны ў мяне старшыя... І будзе Беларусь абкрамсанай зусіх бакоў аж да другога прышэствія, калі ўзапраўды устануць усе із мертвых і пачнецца новае не зямное жыцьцё.

Дык вось дарагі таварыш у якім палажэньні знаходзіцца нашая беларуская [справа], у такім-жа аналогічным з нашым палажэньнем знаходзяцца і ўкраінцы.

Мо я памыляюся, але найбліжэйшыя месяцы пакажуць наколькі правільны мае ўвагі. Адно толькі можа зусім папсаваць усе гэтыя пляны Антанты, гэта упартасьць Літвы і Беларусі і навет Украіны. Глаўным чынам тут координальныя працеўлежнасьці ў тэрыторыальных інтэрас[ах] Польшчы з гэтымі трэмя народамі, бо Польшча, на колькі я зразумеў ні ў якім разе не адмовіцца ад сваей каланізацыйнай палітыкі на ўсход. А гэта ляжыць зусім не ў нашых інтарэсах, а ні ў інтарэсах Украіны, ані Літвы. Тут ёсьць глаўная загвоздка, якую Антанта ў бліжэйшыя часы і пастараіцца як небудзь выняць, каб пагадзіўшы паміж сабой гэтыя народы стварыць так званую Балтыцка-Чарнаморскую фэдэрацыю, як кардон проці Саветаў, да часу прыхода трэцяй Расеі, бо рэцівая Парыжская Расея хочыць ізнутры ўзарваць Саветы.

З другога боку пры уселякіх комбінацыях частка Беларусі ўсё-ж такі будзе пад Саветамі і на гэта трэба зьвярнуць пільную увагу.

Занавес падымаіцца, артысты ў розных косьцюмах выходзяць на сцэну, цекава было-б усе-ж такі ведаць, якую ролю адыграе Беларусь? А што нейкую роль адыграе, я ў гэтым пэўны!..

З таварышскім прыветам і
шчырай пашанай Тамаш Грыб.
26/І-921.
м. Рыга.
582.1.45:119&r-119a&r

[1] Прэм'ер-міністар Латвіі.

2620. Запрашэньне Міністэрства Замежных Справаў Літвы Вацлаву Ластоўскаму на вечарыну ў «Мэтраполі», якая мае адбыцца 29.01.1921

582.1.45:158

2621. Выпіска з пратаколу пленарнага пасяджэньня Рады Случчыны за 30.01 1921

Выпіска
з пратакола пленарнага пасяджэньня Рады Случчыны
ад 30 студня 1921 г.

Слухалі:	Ухвалілі:
Заметкі у польскіх газэтах аб рожных урадах на Беларусі, якіх налічывалі 8 штук	Падцьвердзіць, што Рада Случчыны увесь час лічыла і лічыць адзіным правамоцным дзяржаўным Урадам Б.Н.Р. Урад, на чале з В.Ластоускім, выбраны 13 снежня 1919 году. Уселякіе іншые Урады, каторые называюць сябе дзяржаунымі, ці бяруць на сябе часткі дзяржауных функцый бэз згоды на тое Ураду Рэспублікі лічым самазванымі і здраднымі.
Аб адносінах да Польшчы	Прымаючы пад увагу, што Урад Польшчы за увесь час паустанчэскага руху на Случчыне, пабачыушы, што гэта есьць запрауды нацыянальны рух, ня толькі не падтрымліваў змагаушуюся з Савецкім Урадам першую брыгаду Б.Н.Р. і Раду, але ен нават умыслна рабіў уселякіе перашкоды і правацыраваў справу баючыся пашырэньня руху, што пагэтаму усе спробы дабіцца ад Польшчы дапамогі аружжам, збожжам ці грашмі ня згубіушы сваей самастойнасьці, канчаліся нічым і аставаліся толькі абецанкамі; што за увесь гэты час ізнемагаушым у барацьбе з пераважнымі сіламі савецкіх акупантау галодным, неадзетым, азброеным толькі трафеямі, здабытымі у бойках, вайскам беларускім была атрымлена ад іх падачка: 100 пудоу збожжа ад цывільнай улады і 300 карабінау з патронамі і 3 кухні ад вайсковых часьцей;

меж іншым, як здрадніка Беларусі генерал Булак-Балаховіча Польшча падтрымлівала і дапамагала яму; Рада Случчыны падраховывае першые тры месяцы паустаньня (ад 1 лістападу 1920 г. да канца студня 1921 г.) прыходзіць да перакананьня, што і у папярэднія часы пры вызваленьні Бацькаушчыны ня можна спадзевацца на шчырую дапамогу Польшчы, што супольная з ей праца можа быць дужа шкодліва для дзяржаунасьці.

Аб генералу Булак-Балаховічу

Прыймаючы пад увагу, што генерал Балаховіч вядзе барацьбу ня толькі супраціу здабыткау мартаускай рэвалюцыі[1] і яе дальнейшых здабыткау а так сама супраціу рожных сацыялістычных партый;
што не толькі не вызнае законнага Ураду Б.Н.Р., але-ж нават вядзе з ім барацьбу і утварае пры сабе штучные Урады, кампрамітуе дзяржаную справу: Рада Случчыны лічыць яго толькі авантурнікам, а не народным і нацыянальным павадырам, як яго называюць яго наймiты — палітычны камітэт; уся-ж яго праца есьць вельмі здрадная для Беларусі.

Аб заметках у газэце «Народ» 5.I і «Работнік» 12.I.1921

Заслухаушы аб тым, што у польскіх газэтах надрукована: 1) інтэрвью (Оріента) з сябром гэтак званага палітычнага камітэту Сенькевічам, каторы заявіу, што генерала Балаховіча прызнае Случчына;
2) дэкларацыя аб арганізацыі «Зяленага Дуба», у якой так сама значыцца аб прызнаньні гэтай арганізацыі і Балаховіча Случчынай;
3) што ад імені Случчыны з дэкларацыяй выступау сябр Рады пар<учнік> Мацэллі ухвалілі: Рада, дэмакратычна выбраная на зьездзе Случчыны 15 лістапада 1920 году і рэпрэзэнтаваная усімі валасьцямі і местам Слуцкам, даручыушым ей усю грамадзянскую і вайсковую справы ка-

тэгарычна пратэстуе супраціу гэтых заяу якія есьць толькі фальсыфікацыя волі жыхароу Случчыны, бо ні раней, ні у гэты час ніколі не прызнавалі Балаховіча, палітычны камітэт пры ім і арганізацыю «Зяленага Дуба». Сябру Рады пар. Мацэлі, каторы выступау ад імені Случчыны з гэтымі заявамі, Рада абъяуляе выгавар.

(Падпісана усімі прысутнымі сябрамі — 9 чалавек)

Старшыня Рады Случчыны У.Пракулевіч.

[2]Пратакол падпісалі: У.Прокулевіч, Б.Русак, Ю.Радзюк, У.Дубіна, Ю.Лістапад, Я.Каўпак, П.Бабарека, Ц.Мяшочак, С.Бусел.[2]

582.1.32:001-004 — мк
582.1.32:005&r-006 — мк
582.1.32:007&r-008&r — мк
582.2.12:096&r-097 — мк

[1] Маецца на ўвазе абвяшчэньне незалежнасьці БНР 25.03.1918. [2-2] Дапісана рукой В.Ластоўскага.

2622. «Песьня Случчакоў»

Яшчэ Паляк ня быу панам тут на Беларусі
Яшчэ прыдзе час наш разам чужынцоу падушым
прыпеу: «Гэй наперад наш народзе
моц наша не слаба,
зараз з могілак выходзіць атаман Нябаба.
Пойдзе бойка роуным тэмпам, даунейшім ня горша,
Што заможным нашым панам не дасьць мейсца Польшча.
прып. «Гэй наперад і г.д.

582.1.32:009 — мк

Дата невядомая.

2623. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.01.1921

30.I.1921.

Даражэнькі Вацлаў Юстынавіч,

пасылаю Вам з Вальковічам камплект «Беларусі»[1], але на жаль не зусім полны, бо шмат нумероў да нас не даходзіла.

Пасылаю і замэткі Вашы, што знайшоў ў адным з атласаў. «Беларускі Гэрб Пагоня» напісаць ў гэтай катавасіі не змог, а таму усе клішэ пэрасылаю да Вас. Есьць тутака ў мяне шрыфт, але я не хачу выбіраць яго з тыпаграфіі: хай будзе на уселякі выпадак ў Рызе беларускі шрыфт.

Архівы часткай вязе Вальковіч, а рэшту прывязу я сам. Будьце ласкавы зараз жа пратэлеграфаваць мне ў Рыгу як мне ехаць ці з усім маім багажом, ці «налегке»: гэта, канешна, залежыт ад таго куды Вы мяне збіраецеся упхнуць.

З пашанай К.Езавітаў
582.1.45:098&r

[1] Газэта, выходзіла ў Менску пад польскай акупацыяй ад 21.10.1919 да 9.07.1920.

2624. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.01.1921

582.1.45:118&r

З дасланымі праз А.Вальковіча матэрыяламі Рыжскай Дэлегацыі і Нацыянальна-Палітычнай Канфэрэнцыі (20.10.1920).

2625. Пераклад ноты міністра замежных справаў Літвы д-ра Юозаса Пурыцкіса Старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за ??.02.1921

Пану Вацлаву Ластоўскаму
Старшыні Рады Міністраў Беларускай Рэспублікі

Ваша Дастойнасьць,

Як вынік з умовы ад 11-га лістапада 1920 г. паміж Літвой а Беларускай Рэспублікай, я маю гонар давесьці да Вашага ведама, што ў выпадку калі Літва будзе мець пабеду у плебісцыці паміж Польшчай а Літвой на тэрыторыі даўняй Гродзенскай губэрніі, — Літоўскі Урад выражае сваю згоду, каб з тэрыторыі, якая ляжыць на поўдзень ад міжы, зазначанай у літоўска-расійскай умове ад 12-га ліпеня 1912 [sic!] г., — зрабіць палітычную адзінку, якая будзе аўтаномнай на дэмакратычных асновах і з Літвой будзе знаходзіцца толькі у фэдэратыўнай сувязі.

падп. Д-р Пурыцкіс
Міністр Міжнародовых Спраў.
582.1.29:020 — пераклад на бел.м.

Дакладная дата невядомая.

2626. Ліст Сьцяпонаса Кайрыса (Коўна) Язэпу Варонку (Коўна) за ??.??.1921

Wielmi paważajemy Panie!

Wa utornik wiarnuŭsia z Vilni tw. Venclauskas ir priwioz dla Was pasyłku ir pisulku ad Waszej Pani. Książak dwie paczki. Nie maju czasu zajsci da Was i nie maju praz koho paslać, dyk praszu Was abo samamu zabiagczy, abo koho prislać pa toj list i książki. Kalib mine nie bylo doma, dyk spytajcie dzieŭczynu naszu. Doma bywaju zrania i pa abiedzi do 4-5 gad.

Najlepszyja żadannia

St.Kairys
Kaunas, Daukanto gv. 5, 6.1.
582.2.36:072 — pa

Дата невядомая.

2627. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.02.1921

2.II.21.

Даражэнькі Вацлаў Юстынавіч,

пасылаю Вам афіцыяльны даклад, вычэрпываючы становішча Місыі.

А тутака хачу Вам асьветліць два пытаньня:

1, чаму замест таго, каб разлічыцца з Захаркам, я даў яму вексель і

2, чаму я, глаўным чынам, хачу папасьць ў Эстонію.

Вы, памятаеце, далі мне 10.000 ням. марак, каб я разлічыўся са сваімі далгамі. Мне іх як раз і хапілаб, калі б я усе іх мог узяць ў пэнсыю, але на жаль я не змог гэтага як бы мне гэтага не хацелася, зрабіць, бо прышлося задаволіць за студзень служачых, а некаторым даць і наперад ліквідацыйныя за люты. Усе гэта, разам з іншымі выдаткамі па Місыі, прымусіла мяне, каб не пакідаць тутака незадаволеных, — разлічыцца з імі, і ў мяне на гэта выйшла роўна палова грошэй.

5.000 — я узяў ў лік пэнсыі.

З гэтых пяці тысячаў, 1000 адразу павінен быў пакінуць Вальковічу бо быў яму вінен, 1000 — даў Баку, а 3.000 узяў сябе на зубнога дохтара (які злупіў з мяне не толькі 3000, але 15.600 латвійскіх рублёў).

Вось чаму я без грошы і вось чаму я змушен прасіць як найхутчэй зрабіць ў мяне рэвізыю, каб я мог атрымаць належачую мне пэнсыю (13.400 н.м. за мінулы 1920 год і 4000 марак за 1921 год; усяго 17.400 нямецкіх марак), бо гэта есьць ўсе што ў мяне можа быць.

Папасьць у Эстію я хачу не толькі для таго, каб зрабіць перадачу беларусаў літвіном, але і затым, каб раз на заўсёды, карыстаючыся Вашай тэлеграмай разабрацца ў справах Василеўскага і Эльвенгрэна.

Вельмі прашу не адмовіць у маей просьбі наконта задаваленьня украінскіх прэтэнзый, бо не хацеў бы мець тутака непрыемнасьцяў ў сваей будучай працы, на якую Вы мяне тутака пакідаеце.

Грамадзянства наша зусім супакоілася і чуе сябе пакуль што добра.

Шчыры прывет і найлепшыя пажаданьня

К.Езавітаў

582.1.45:099&r-099a&r-099c&r

2628. Запрашэньне на вечар-спэктакаль Асобнага Беларускага Батальёну, які мае адбыцца 4.02.1921 у салі Тыльманса ў Коўне

582.1.45:100 — В.Ластоўскаму

582.2.36:068 — А.Аўсяніку

2629. Праграма вечара-спэктакаля Асобнага Беларускага Батальёну 4.02.1921 у салі Тыльманса ў Коўне

582.1.45:101

2630. Рахунак інвэнтарызацыі Беларускай Кнігарні (Вільня, Завальная 7) за 4.02.1921

582.1.45:147&r-147a&r

Усяго 109 назоваў у колькасьці ад 4 да 8 асобнікаў на агульную суму 4957 марак.

2631. Рэзалюцыі нарады загранічнае групы Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў у Коўне 6.02.1921

582.1.31:001-005 — мк

Зьмест:
I. Міжнародавае і унутранае становішча Беларусі
II. Адносіны да Ураду Савецкай Беларусі
III. Адносіны да Народнаго Ураду Беларусі
IV. Аб Венскім Міжнародовым Сацыялістычным Кангрэссе
V. Аб партыйнай звязі і аб інструкцыях партыйным арганізацыям на мейсцох

2632. Мэмарандум Ураду БНР Папу Рымскаму за 7.02.1921 у справе становішча беларусаў-каталікоў

Яго Сьвятаблівасьці
Сьвяцейшаму Айцу
Папе Рымскаму[1]

Ад Ураду Беларускай
Народнай Рэспублікі

МЭМОРАНДУМ.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі лічыць сваім абавязкам зьвярнуць увагу Апостальскага Пасаду, у інтарэсах Сьв. Каталіцкай Цэрквы, на тое, што у гэты час адраджэньня Беларускай нацыі хрысьціанская навука у касьцелі і у школах Беларусі ня можэ больш карыстацца польскай мовай, як тое гвалтоуна вайшло у звычай ад цяжкіх часаў польска-маскоускіх экспэрымэнтау дэнацыянналізацыі Беларускага народу. Беларуская мова павінна мец[ь] належачае ей мейсца і у беларускім касьцеле і у тым што датычэцца рэлігійнай навукі у беларускай школе.

Гэта есьць справа Беларускай нацыі і настау ужо час распольшчыць Беларускі касьцел. Каталіцкая цэрква, абыймаючая мала ня усе нацыі, якія есьць на сьвеце, як паказвае ея гісторыя, кожнаму народу у сфэры рэлігійнай дае тоя, што яму патрэбна, згодна з яго нацыянальнымі псыхічнымі і культурнымі патрэбнасьцямі. Подлуг гэтага Апостальскім Пасадам дазволена кождай нацыі ужываць сваю нацыянальную мову ля дадатнага набажэнства у касьцеле [2] [2] як у пацерах, малітвах, касьцельных набожных песьнях, такъ і у казаньнях і катэхізацыі, а такжа і у школах пры навуцэ хрысьціянскай. Гэтыя правы карыстацца роднай мовай у касьцелі маюць усе народы.

Толькі гаротны наш Беларускі Народ не карыстае гэтым сваім натуральным правам маліцца на роднай мове, а яшчэ горш усяго тоя, што ворагі нашы спольшчылі касьцел беларускі і у сваіх імпэрыялістычных мэтах, каб дэнацыяналізаваць нас і паняволіваць накінулі беларусам мала зразумелую польскую мову у малітвах і казаньнях. Гэткая вялікая кріўда і здзек тым болей атчуваецца беларусамі, што у даунейшыя часы беларусы-каталікі рэлігійна выховываліся у сваей Беларускай мове, пакуль варожыя гістарычныя варункі не затрымалі нацыянальнага разьвіцця і зрабілі нашу Беларусь абьектам польскіх і маскоускіх экспэрымэнтау прышчапляючы нам польскую або маскоускую «культуру».

Гісторыя сьведчыць, што Беларусь мела у XV-XVI сталецьцях сваю культуру і што культура беларуская была тады вышэйшая чым польская і маскоуская. Гісторыя сьведчыць, што Беларусь карысталася сваей мовай, як сьведчаць старыя хронікі, «пекнай мовай», і у Урадах, і у судох, і у касьцелах. Так, у 1501 годзе, у прамове да Папы Аляксандра VI пасол вялікага князя Літоускага Аляксандра канонік Эразм Вітэлі сьведчыу, што «у князьстве Літоускім звычайна гаворуць па беларуску, таму, што беларуская мова пекная і распаусюджэная». Аб тым жа сьведчаць польскія хронікі Длугоша, Ярашэвіча, Даніловіча, Стрыкоускага, Гаркнона[3] і іншых.

Пасьля Люблінскай уніі (1569 г.), зьвязаушай Літву і Беларусь з Польшчай, польская мова стала гвалтоуна прашчапляцца на Літве і на Беларусі, але дзякуючы правілам Трыдэнтскага Сыноду 1545 году аб Віленскія Сыноды 1604, 1607 і 1613 гадоу, такжа Віленскі Біскуп Мікола-Стэфан Пац у 1682 гаду і Магіл[е]ускі архібіскуп Станіслау Богуш-Сестржэнцэвіч у 1772 г. трэбавалі, каб у сьвята і у нядзелі у касьцелах казаньня і катэхізацыі вяліся на (простай) народнай мове, якой на Беларусі, была і есьць Беларуская.

Але с пачатку XVII сталецьця, як палякі узялі сілу на Літве і на Беларусі, яны пачалі перш-на-перша польшчыць касьцел ператвараючы яго у інструмэнт сваей палітыкі. Чынілі яны гэта апіраючыся на сваю дзяржауную сілу. Захапілі у свае рукі цэнзуру і друкарні; польскія кнігі пачалі распаусюджываць, а кнігі беларускія без пашчады нішчыць. Ня мала было такіх польскіх фанатыкау, каторыя мала не за сьвятую справу лічылі зьнішчыць як магчыма больш беларускіх кніг, асабліва рэлігійных. Як ймя Гыстрастрата[4] гісторыя захавала у сваіх хроніках толькі за тоя, што гэты варьят спаліу мастацкі храм Дзіяны Эфэскай, так і беларускія хронікі, не забудуць імяні Віленскага біскупа Валерыяна Пратасевіча, Юрыя Радзівіла Сіроткі, Акакія Гархоускага і інш., каторыя мэтай свайго жыцьця і сваей працы мелі як найбольш зьнішчыць беларускіх кніг і розных пісьменых дакумэнтау, каб прачысьціць шлях на Беларусі польскай мове і польскай кнізе, яны не шкадавалі грошы, — скуплялі беларускія кнігі.

Такім шляхам пачала ісьці на Беларусі польская «культура», такім шляхам вайшла і польская мова у Беларускі касьцел...

Не зауседы Апостальскі Пасад знау аб тым зьдзеку які тварыуся на Беларусі, і не зауседы загады Апостальскага Пасаду выпауняліся. Напрыклад, Папа Бэнэдыкт XIV у 1742 г. выдау буллу, згодна з каторай Віленскі Сынод 1744 году пастанавіу, каб казаньня і катэхізацыі і дадатныя набожэнства у касьцелах Літвы і Беларусі атпраулялiся «па старому звычаю мовай простанароднай». Здавалася бы, што «стары звычай» трэбавау у касьцелах Беларусі мовы беларускай, але палякі і гэтае правіла аб у сваіх імперыялістычных планах тлумачылі па свойму простанародную беларускую мову у касьцелах Беларусі паменялі мовай польскай.

Пасьля разьдзелу Польшчы калі Беларусь прылучана была да Расеі,

здавалася, што цяпер німа перапону для беларускай мовы у касьцеле, але расейскі Урад замест таго, каб памагчы беларусам адпольшчыць свой касьцел і увясьці у яго беларускую мову і тым адгарадзіць ад польскага гвалту Беларускі Народ памагау палякам яшчэ больш польшчыць яго, таму што не дазваляу беларускай мове вярнуцца у касьцел, таму што хацеу у сваіх імпэрыялістычных мэтах увясьці у беларускі касьцел мову расейскую, каб абрусіць беларусоу. Палякам тоя было надта на руку. Яны найлепш ля польскай справы скарысталі абмылкі расейскага імпэрыялізму умоцніушы польшчыну у беларускім касьцеле, каторы стау у іх руках праз усе XIX сталецьця інструментам ужо нерэлігійнай а нацыянальна-палітычнай барацьбы з Расейскім Урадам і спосабам да дэнацыяналізацыей беларусоу. Польскі пісьменнік Адам Міцкевіч у 1842 гаду так пісау аб гэтай ролі касьцела, як інструмэнце спольшчэньня беларусоу і украінцау: «Што гэта за бязмерная сіла, каторая падняла польскі народ і пасунула яго на рускія землі і адкінула за Днепр рускую народнасьць. Гэта — вялікая сіла касьцела каторы узяу-пад сваю апеку польскую справу і зрабіу польскую справу сваей справай»...

Аб гэткай ролі польскага касьцела на Беларусі будзе сказана яшчэ ніжэй, а цяпер трэба сказаць аб тых лепшых прэдстауніках беларускага касьцелу, якія жадалі, каб касьцел быу толькі мейсцам рэлігійнай прасьветы, а не арэнай палітычнага паняволеньня народау.

Так, пасьля першага разьдзелу Польшы 1773 году беларускі каталіцкі біскуп Станіслау Сэстрэнцэвіч прасіу у 1776 годзе дазваленьня Расейскага Ураду дру[ка]ваць касьцельныя кніжкі беларускай мовай, але расейскі Урад адмовіу яму. Напрацягу XIX сталецьця яшчэ не раз прэдстаунікі каталіцкага касьцелу на Беларусі аб тым жа зьверталіся да Расейскай улады, але на кожны раз адмауляла ім гэтага. Так адмоулена было Магілеускаму Біскупу Сымону, каторы пасьля гэтай адмовы, будучы у Рыме, падау другога верасьня 1896 году мэморыял Апостальскаму Пасаду, у якім сцьверджэна, што каталікам-беларусам дадатковае набожэнства . атпрауляецца на польскай мове, «каторай яны па большай часьці не разумеюць» біскуп Сымон прапануе Апостальскаму Пасаду дазволіць ксяндзам гаварыць для селян . Пры гэтым біскуп Сымон паясьняе, што Расейская улада адмовіла яму у тым.

Віленскі біскуп барон Ропп такжа сьведчыу, што у беларускіх касьцелах трэба даць мейсцэ беларускай мове, бо беларусы не разумеюць польскай мовы і што Апостальскі Пасад не адмовіу бы якбы гэтага стау вымагаць народ.

Але такія галасы лепшых прэдстаунікоу беларускага касьцелу якія стараліс аб хрысьціянскім выхаваньні беларусоу-католікау да каторых лепш усяго і скарэй падыйсьці можна праз родную іх мову, тапіліся у вадавароце польска-расейскага імпэрыялістычнага змаганьня і аставаліся «голасам клічучага у пустыні». А тым часам польская справа са усіх сілау працавала, каб ня выпусьціць беларускі касьцел з сваіх рук, каб не страціць уплыву на беларусау-каталікоу, на якіх палякі грунтуюць свае імпэ-

рыялістычныя планы, у стасунку да як яны называюць Беларусь, каторую хацелі прылучыць да Польшчы,

У гэткіх мэтах палякі выкарыстовывалі кожную абмылку, кожны пачын Расейскага Уряду. Так званая «злучэньне беларускіх уніатаў» 1839 году, а асабліва Холмскіх уніатаў 1875 г. далі кадры так званых «упорных» ці то такіх, каторых Расейскі Урад лічыу праваслаунымі, а самі яны хацелі заставацца каталікамі. Гэты гвалт Расейскага Уряду палякі цяпер карыстаюць з народнай цямнаты і прашчапляюць і каталікам-беларусам перакананьня, што паляк і каталік — адно і тоя-ж, хто каталік, той і паляк.

Бедны і цемны беларускі селянін, веручы сваім духоуным пастерам ідзе ведзены імі, на утрату сваей нацыянальнасьці, не пачувае таго, што яго беларуская мова у маліцьве ля яго таксама сьвятая, як для паляка польская. Ен не пачувае, што польская імперыялістычная справа прафануе яго чыстае, простае рэлігійнае пачуваньне, яго сьвятую шчырую веру. Ен не пачувае што праз яго простую веру польская справа пракладае мост праз Буг і Нарау на родную яго Бѣларусь, каб пасьля ея каланізаваць, а польскім капіталістам паняволіваць і трымаць у рабстве беларускі народ.

Усе тоя, што польская справа праз касьцел пры Расейскай уладзе рабілася патаемна, цяпер, з пачатку 1919 году, як пачалася польская акупацыя Беларусі, робіцца аткрыта і зьдзек польскі перайшоу уселякія межы...

Але усяму павінен быць канец.

Чорныя хмары, пакрыушыя Беларусь у XVII сталецьці, а асабліва у XVIII ст. і XIX ст., у апошнія часы разганяюцца, беларуская нацыя адраджаецца, нацыянальны рух разьвеяу злыя чары польскага і расейскага імпэрыялізму, і беларускі народ ламае ланцугі няволі, каторыя сковавалі ня толькі цела, але і душу яго. Беларус-каталік пр[а]снууся ужо, ен жадае, каб касьцел яго стау ізноу беларускім, каб мова яго бацькоу ізноу стала яму сьвятой мовай малітвы і у касьцеле і дома.

Наша Беларуская літэратура таксама праснулась ад доугага літаргічнага сну, шырыцца і дадаецца новымі выданьнямі па розных галінах навукі, у тым ліку і навукі рэлігійныя. У ліку новых выданьняу есьць Сьв. Пісьмо беларускай мовай, есьць такія жа малітаунікі, касьцельныя песьні і іншыя. Новае грунтуецца на старым.

Да ліку першых друкароу у Эуропе належыць Беларусь, Францішак Скарына з Полацка, які надрукавау спачатку у Празе у Чэхау у 1517-1519 гадох Псалтыр і 22 кнігі Старога Закону, а потым у м. Вільні у 1525 гаду надрукавау «Апостал», «Месяцаслоу» па касьцельнаму уставу, «Каронік». У Вэнэцыі у 1527 годзе надрукованы беларускай мовай «Каталіцкі Катэхізм». На працягу XVII ст. у м. Вільні надрукоано было беларускай мовай многа кніжак, у тым ліку рэлігійнага зьместу.

Беларускі нацыянальны рух апошніх гадоу зрушыу увесь абшар Беларусі, — ад Буга і Нарэва да Дзьвіны; ад Бабра і Немана да Прыпяці і Днепра, — увесь 12 міліонны беларускі народ і у Віленшчыне, Горадзеншчыне, Меншчыне, Магілеушчыне, Вітэбшчыне, Смаленшчыне, у Аугустоускім павеце Сувальшчыны і у іншых мейсцох, дзе жывуць беларусы.

Гэты нацыянальны Рух ускалыхнуу і каталікоу-беларусоу. Па расей-

скім перапісу 1897 году беларусоу-каталікоу лічылася:

1. у Віленшчыне 526.361
2. " Горадзеншчыне 225.878
3. " Меншчыне 152.320
4. " Магілеушчыне 28.318
5. " Вітэбшчыне 87.085
6. " Аугустоускім п. 14,859
7. " Ковеншчыне 33.677

———————————————————

Разам 1.068.468

Апроч таго, па афіцыяльным ведамасьцям, пасьля указу 17 красавіка 1905 году перайшло у каталіцтва:

1. у Віленшчыне 25.381
2. " Горадзеншчыне 4.242
3. " Меншчыне 14.846
4. " Магілеушчыне 1.456
5. " Вітэбшчыне 4.311
6. " Аугустоускім п. 16.012
7. " Ковеншчыне 1.148

———————————————————

Разам 67.396

Такім чынам Расейскі Урад лічыу беларусоу-каталікоу .... 1.135.864.

Ведама, што лік быу паменшаны. І тагды каталікоу-беларусоу было больш. Цяпер бэз абмылкі на усім абшары Беларусі трэба лічыць каталікоу ня менш як 2.000.000

Гэтыя два міліоны каталікоу-беларусоу поленізуюцца праз касьцел і палякі па усяму сьвету галосяць, што гэта ня беларуссы, а палякі, таму толькі, што яны прымушаны маліцца па польску і слухаць польскія казаньня. Ды каталікі-беларусы самі добра ведаюць, што яны не палякі, і жадаюць слухаць хрысьціянскую навуку і маліцца дома і у касьцеле на роднай беларускай мове, і каб у касьцеле іх ксендз быу не паляк, а беларус. Каталікі-беларусы шчыра аддадзены каталіцкаму касьцелу і Апостальскаму Пасаду. Яны спадзеюцца, што нацыянальнае іх вымаганьне ня будзе мець больш перашкод, што беларускі касьцел будзе служыць ня польскай справе, а толькі рэлігійнай асьвеце народу у яго роднай мове.

На аснове выжэй вылажэнага, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі ад імяні двох міліонау (2.000.000) каталікоу-беларусоу з вялікай павагай зьвертаецца да Апостальскага Пасаду і прапануе:

1) Каб у касьцелах Беларусі — Віленшчыны, Горадзеншчыны, Меншчыны, Магілеушчыны, Вітэбшчыны, Смаленшчыны і беларускіх парафіях Аугустоускага павету — казаньня, катэхізацыі, набожныя песьні і агульна усе дадатнае набожэнства атпраўляліся бы беларускай мовай, а не польскай.

2) Каб у духоуных семынарыях выклад беларускай мовы літэратуры і гісторыі быу абавязковы.

3) Каб у Менск дыоцэзыях біскупы былі беларусы, а не палякі, і каб у парафіях беларускіх каталіцкія ксяндзы-палякі заменены былі бы ксендзамі-беларусамі.

4) Апроч таго Урад Беларускай Народнай Рэспублікі зьвертае увагу Апостальскага Пасаду на тоя, што ксяндзы польскай нацыянальнасьці на Беларусі падмацняюць польскі імпэрыялізм, вядучы вялікую агітацыю на карысьць прылучэньня часьці Беларусі да Польшчы. У той час, як беларускі Народ цьверда і голасна выявіў сваю волю, каб уся Беларусь згуртавалася у адну незалежную і непадзельную дзяржаву. Цяпер частка Беларусі — Горадзеншчына і Віленшчына акупавана палякамі. Справа складаецца так, што можэ Ліга Народау пастановіць шляхам плебісцыту разьвязаць пытаньня аб будучыне Горадзеншчыны і Віленшчыны. Палякі яшчэ здауна «прыстасовываюць» дарогай агітацыі праз касьцел жыхароу да злучэньня з Польшчай, а польскія ксяндзы малююць пекнасьць жыцьця у Польшчы, ды пагражаюць праклёнам касьцелу страчэньнем збауленьня душы, пеклам і іншымі стратамі, — каб гэткім маральным гвалтам паралізаваць волю народа і не дапусьціць свабоднага выяуленьня праудзівых жаданьняу жыхарства. Урад Беларускай Народнай Рэспублікі лічыць, што гэткая «хрысьціянская» праца польскіх ксяндзоу Горадзеншчыны і Віленшчыны не карыстна ні для беларускага народу, ні для каталіцкага касьцелу. Дзеля гэтага Урад просіць Апостальскі Пасад загадаць польскім ксяндзам Горадзеншчыны і Віленшчыны, каб яны у часе плебісцыту ні яуна, ні патаемна ніпроста не датычна, ні словам, ні пісьмом, не вялі плебісцытнай агітацыі паміж сваіх парахвіанау і агульна паміж насяленьня і паустрымаліся бы ад запа[ло]хваньня тых каталікоу, каторыя шчыра кахаюць касьцел, але да Польшчы не прыхільныя.

582.1.45:088-088a-088h — мк
582.1.54:001&r-005 — мк

---

[1] Папам рымскім у 1914-1922 гадох быў Бэнэдыкт XV. [2-2] У пропусках тут і далей мусілі быць упісаныя ўстаўкі лацінкай. [3] Магчыма, памылкова замест Гваньіні. [4] Памылкова замест Герастрата.

2633. Мэмарандум дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Коўне Антона Аўсяніка брытанскаму камісару ў Коўне за 14.02.1921

582.1.45:102-102a-102d

У дакумэнце няма першай старонкі. Пра падрабязнасьці кантактаў А.Аўсяніка з брытанскімі дыпляматамі ў Коўне й Рызе гл.: Dingley J. Lastouski as Politician // The Journal of Byelorussian Studies. Vol.V, Nos 3-4. London, 1984. P. 20.

2634. Запрашэньне в.а. Прэзыдэнта Літвы Аляксандраса Стульгінскіса[1] Вацлаву Ластоўскаму з жонкай[2] на раўт у залі Ратушы з нагоды Дня Незалежнасьці, які мае адбыцца 16.02.1921

582.1.45:159 — д
582.1.45:160 — д

---

[1] Старшыня скліканага 15.05.1920 Устаноўчага Сойму Літвы Аляксандрас Стульгінскіс выконваў абавязкі прэзыдэнта да 21.12.1922, калі ён быў абраны на гэтую пасаду ў адпаведнасьці з нормамі прынятай Устаноўчым Соймам Канстытуцыі. [2] Жонка Ластоўскага Станіслава Кісель у тым часе жыла ў СССР.

2635. Ліст рэдактара газэты «Українське Слово» Д-ра Зэнана Кузэлі (Бэрлін) Язэпу Варонку (Коўна) за 15.02.1921 у справе абмену матэрыяламі

582.2.36:070 — ма

2636. Насилія польскихъ офицеровъ. — Балаховичъ «спаситель» Бѣлоруссіи. — Поляки закрываютъ бѣлорусскія школы // [Невядомая расейская газэта]. 15.02.1921

582.2.53:068,070 — д

2637. Верш-віншаваньне «Bratam Litwinam ad Bielarusau na 16 lutaho 1921 h.» ад Беларускай Нацыянальнай Сувязі

582.1.45:123 — мк
582.1.45:124 — мк

2638. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2?.02.1921

Паважаны Пане Вацлаве!

Калі не вымагалі таго варункі — я не лічыў магчымым прасіць таварышоў павялічыць мае кошты... Цяперака мне будзе цяжко — прыезджае семья (+6 душ!) — і я прынаймсі поў года прымушаны буду жыць далёка не у рамках свайго бюджэту. Летам пераедзем у Літву — там лягчэй!

І вось, зьвертаюсь да Вас з прозьбай: Павялічыць маю пэнсію і назначыць мне, прыймаючы пад увагу мае семейнае становішча, — грошы на кватэру, 1500-2000 мар. Інакш — ня выжыву. Ніяк! Пражытачны minimum, як ведаеце, 100 мар. у дзень, а нас будзе 7 душ! = 7.000 мар.

З свайго боку — далажу усё, каб фінансы нашыя палепшыць.

Не надта прыемна мне зьвертацца з гэтакай прозьбай — але варункі прымушаюць.

Зьвертаюсь толькі асабіста да Вас, таму што знаю Вас. Зрабіце адпаведную пастанову і вышліце чэк на пэнсію за два месяцы.

Цісну Вашу руку —
Ваш сябра АлдрЦвікевіч

Тэлеграфуйце:
а) Дзе дагавор Ладнова?
1) Куды ехаць Грыбу і Комарынцу, якіе хутка пріезджаюць сюды. Грошы ім ужо паслалі.
2) Ці ехаць Бароўскаму[1] у Вільню праз Коўна — ці адсюль у Варшаву. Парадзіўшысь з Гершовічам мы вырэшылі, што калі ён праедзе туды для зьвязі, то будзе больш карысьці, чым ён будзе тут сідзець. Добра, я лічу, яму было б паказацца хоць на адзін-другі дзень ў Коўне і тым сам рэпрэзэнтаваць нашу зьвязь з кооператывамі.
Ваш АлЦвікевіч
582.1.45:095&r

Дакладная дата невядомая. [1] Андрэй Бароўскі — член праўленьня Цэнтрабелсаюзу, у красавіку 1920 году выехаў у Бэрлін дзеля закупкі тавараў для сельскіх каапэратываў. 1.04.1921 прызначаны паўнамоцным прадстаўніком БНР у Бэрліне.

2639. Даклад Міколы Вяршыніна (Прага) старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 20.02.1921 (№193) з аглядам чэскага друку ў справе зьнешняе палітыкі Польшчы

582.1.35:001-004&r — ра

2640. Хадайніцтва Ларысы Дарашковай перад «панам Міністрам» аб атрыманьні пасады за 22.02.1921

582.1.45:125

Паведамленьне аб месцы працы: «кніжны магазын Альшэўскага».

2641. Суправаджальная запіска в.а.сакратара Місіі БНР у Нямеччыне Аляксандра Дзьмітрыева (Бэрлін) Старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 23.02.1921 (вых. №194) да перакладу ноты міністра замежных справаў Літвы д-ра Пурыцкіса

582.1.29:019
582.1.29:018 — канвэрт

2642. Ліст Міхася Какановіча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.02.1921

582.1.45:144&r

2643. 4 фатаздымкі Вацлава Ластоўскага, наклееныя на газэту «Свобода Россіи» (Рэвэль) за 5.05.20

1919 марц
1916 май
1916 чэрвень
1921 марэц
582.1.45:021

2644. Канвэрт

[Запіс алоўкам:] Новая Исторія Проф. Оскара Устера под ред. П.Н.Полвон. С.Петербург, Изд. Маркса

582.1.45:137а

Дата невядомая.

2645. Ліст Ураду БНР (Коўна) кнігавыдаўцу А.Г.Сыркіну (Вільня) за ??.03.1921 з праектам кнігавыдавецкай дамовы

582.2.12:098&r

Дата невядомая. Напісаны пасьля дамовы з Марголінам.

2646. Беларускія нацыянальна-культурныя пастуляты і каштарыс на ўтрыманьне беларускіх арганізацыяў, інстытуцыяў і школьніцтва на 1921 год

582.2.38:114&r-115&r — рк

Дата невядомая.

2647. Чарнавік каштарысаў на ўтрыманьне 4-тыднёвых курсаў удасканаленьня настаўнікаў беларускіх школаў і выданьне падручнікаў

582.2.38:116&r — рк

Дата невядомая.

2648. Ліст Антона [Аўсяніка?] (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 1.03.1921

ДАРАГІ ПАНЕ ВАЦЛАВЕ

Мы усе тутака уважна прыслуховваемся да падзеяу на усходзе.

З таго скупога матэр'алу, які маема з газэт і крыніц афіцыяльных, выносім праконаньне, што трэба мець гатовы плян для працы на Бацькаушчыне на выпадак далейшага разьвіцьця падзеяу.

Момант паважны і адказны. Можа быць карысны для нас калі загадзя абмяркуем і разважым.

Нашы цяперашнія хаурусьнікі гэта добра разумеюць і аб гэтым гавораць.

Вы бліжэй да праудзівых вестак, хуччэй аценіце момант, і паведаміце нас.

Чакаема вестак і дэрэктывау.

Ваш Антон
1/III-1921

Пігулеускі просіць перадаць пісульку Кастусю

582.1.45:130

2649. Ліст Міхася Кахановіча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.03.1921

Паважаны дзядзька ВЛаст!

Чэрапок перадаў мне некулькі слоў аб выдавецтве. Справа гэтая, як ужо пісаў Вам, вельмі пільная. Патрэбны найскарэй грошы і інструкцыя, бо з таго, што мне пераказаў Ч., ня усё можна зразумець, як трэба.

Мне-б здавалася, што каб справу выдавецтва добра паставіць, добра было-б купіць тыпаграфію т. зв. «Друку» — Знамяроўскага. Абойдзецца гэта па меры тысяч 15-20. Тады можна-б было паднаняць работнікаў і стаць хутка друкаваць кніжкі.

Калі-ж гэта ня можна, то можна і так, хоць разумеецца будзе даражэй каштаваць выданьне.

Што датычыць п. Семашкі і Краскоўскага[1], то учора, 28 лют., Кам<і-тэт> яшчэ раз абгаварыўшы свае адносіны да Семашкі, астаўся пры востра-варожым настрою да асобы гэтаго чалавека (С.) Што датычыць Кр., то кандыдатура яго сустрэнута прыхільна. Трэба толькі, каб з боку Літоўск. Ураду зроблены афіцыяльныя да нас захады на конта пажаданага для нас кандыдата — і тады Кр. пройдзе.

Чакаю інфармацый на конта выдавецтва.

Ваш МК
1921г. 1 лютага[2]
582.2.12:024&r

[1] Маецца на ўвазе абмеркаваньне кандыдатураў на пасаду міністра беларускіх спраўаў Літоўскага Ўраду. [2] Памылкова замест сакавіка.

2650. Ліст Янкі Чарапука (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.03.1921

2 сакавіка. Вільня 1921 г.

Даражэнькі Старшыня Власт!

Дабраўся счастліва; ўсе даручэньня выпаўніў, яны ужо праводзяцца у жыцьцё... Мы тутака у грамадзянстве нашым маемо вялікую апору. Пажаданне нам будзе зробляно. З Менска весткі кепскія. Мамонько, Трафімаў Бадунова, Маркевіч, Злоцкі Чэржынскі арэштаваны[1]. Хваля арэштаў перэкінулася на ўсю Ўсходнюю Беларусь. Падневоляных налічваецца каля 1.000 чэлавек. Асабліво у Ігуменю, Слуцку і Бабруйску пало ахвяр. Газэта «Змаганьне»[2] і Работніцкі Клюб — закрыты. Асобы правага палітычнаго напрамку (Лёсік Серэда і другіе) аслаболжаны — а рэшта будуць вывязяны у Маскоўскую Бутырку. З ўражаняў я прыпісываю арэшты не тактычнасьці Мамоньцы. Жонка Ваша, яшчэ да гэтых арыштаў была пасаджана і цяпер знаходзіцца у турме. Жонка Крэчэўскага на вольнасьці і збіраецца сюды. Захаркі па весткам знаходзіцца у Горадні, куды я выезджаю і пастараюся яе адшукаць. Жонка Зайца працуе на почце; хлопчык здаровы, спершу хварэў. Жонка Вальковіча працуе ў Кам. Народн. Гаспадарства. У Вільню прыбыў Шыло і ~~Каханоўіч~~ Алехновіч, змушаныя уцячы. Прычыны змушаюць мяне прыбыць толькі пасля Вялікдзяня. Прышліце як найхучэй грошы на выдавецтво.

Цалую Янка

582.1.45:157

[1] У лютым 1921 году ГПУ арыштавала каля 800 актыўных сяброў БПСР, у тым ліку сяброў ЦК партыі і Менскага губэрнскага камітэту. [2] Газэта, орган БПСР. Выходзіла ў Менску ад 6.11.да 24.12.1920.

2651. Ліст Файвэля Марголіна (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 3.03.1921

582.1.45:134&r

Паведамленьне аб тым, што « по всем делам переговоры мои начаты давно и они в ходу...»

2652. Ліст Сьцяпана Бубешкі (Нью-Ёрк) Міколу Вяршыніну (Прага) за 3.03.1921

Марта 3 го 1921

М.Г.

Господин Вершинин!

Получив от Вас письмо спиложением воззвания «КОВСЂМЪ» которое вдолось после некоторих хлопот напечатоть в Н.Р.С.[1] которое послал Вам атакже и газету В.Р.[2] зачто премного благодарен. Я Белорус выходец Гродненской губ. и уезда села Дубна, очень страдаю о своей Родине, стораюсь помоч сколько это возможно и вмаих силах. Но беда втом что наши земляки которих в Америке живет очень много, по подщоту Русских экономистов более двухсот тысяч остоются глухи, или индеферентны, ковсем воплям котория исходят из грудей наших родных, работаю всмысле организацй Белорусских кружков, писал в Русской пресе, выступал на

митингах и все тщетно, влучшем случае остоется без ответа а то просто приходится выслушиват подчас очень обидные обвинения, чут не впродательстве России. Люди не понимают, или немогут представит себе того ужаса, который угатовлен нашей Батковщине Рижским договаром.

Всякое выступление о самостоятельности Белорусскаго народа, встречается враждебно самими Белоруссами с Полесья, Бобруйска и д.м. говорящим только на Белорусском языке не знающим ни какого другого: привиде Белорусской литеротури, приходят в истерику зачем мол выкопали этот старый отживши язык, зачем портите «наш» Русский и т.д. и.п.

Собралось нас около 10-15 чел. Белоруссов которие могли бы выступать открито с воззваниями к колонии, но думаем что еще не время, да и неимеется достаточно подруками материалов с каторими можно выступить, нужны документы, о страданиях наших Белоруссов, кто и как тепер управляет нашей страной, мы живя в Америке незнаем кто управляет не занетой полякам[и] Белоруссии большевики ли или какое либо другое правительство, что знат необходимо мы незнаем точно границ, с польшей, Литвой и Россией.

Необходима информация о положении подробнее ибо незная что преисходит не возможно успешно работат, помоему нам Белоруссам необхадима своя инфармационная газета которая освещалабы правельно положение дел на родине и была бы центром возля котораго обединилисьбы все любещие свою Родину Белоруссы, знаю что нужны как интелигентныя силы так и средства но придружной работе можно достигнут цели.

Не лишним будет заметит что Русская колония состоит целиком или почти что исключительно из выходцев Белорусских губерний, есть огромное непочатое поле деятельности, но нет почвы нетидеала который заставил бы массы встат за поруганную на кусски разорванную нашу милую Белоруссь, ибо большинство и думат не хочет о Белоруссии хотя сами чистокровные Белоруссы.

Присылайте побольше материалов желательно былобы получат большев[и]тския газеты, больше фактов Вам там ближе более возможно дастоват чем нам.

А также желательно былобы имет постоянное саобщение с нашими Белоруссами.

Пишите буду очень рад атакже если необходимо буду вес к Вашим услугам.

С искренним Уважением к Вам пребываю
Ваш С.О.Бубешко
582.2.12:095 — ма
582.2.12:055 — мк

[1] «Новое Русское Слово» (Нью-Ёрк). [2] «Воля Россіи» (Прага).

2653. Ліст Сьцяпана Бубешкі (Нью-Ёрк) Кастусю Езавітаву (Рыга) за 3.03.1921

Увожаемые граждане.

Случайно получив опросный лист на которий считаю своим долгом ответит немедленно.

1) В Соединенных штатах Америки, нет ни одной Белоруской организаціи конечно чисто національных, есть много Белорусов идаже организованных но не національной почьве, проще говоря все организаціи[1], как политическіе просветительные и экономическіе состоят почти исключительно извыходцов Белорусии. Этим ответам исчерпывается и второй вопрос.

3) Никаких газет на Белоруском языке нет. Русскіе же газеты не охотно уделяют место для информацій.

4) С Американской пресой связи за вести очень легко а тем более если будут Белорускіе организаціи.

5) Пока нет организованаго выступленія оподдерке говоритьнеприхд.

6) Отношеніе ковсем безразличное, кроме поляков к которим накопляется не отвратимая злоба, а отношеніе к великоросам самое дружное.

7) Издательств нет и пока не возможно наладить, ибо нет интилигенціи да и капиталов для издательства неимеется.

8) Когда наладим организаціонныя дела можно будет говорить иокредитах этот ответ относится и к пункту девятому.

10) Литература нужна и легко можно распространит.

Что косаяется принципіальных вопросов то на первыя три вопроса трудно ответить, ибо из сотень тысяч Белорусов оче не многіе думают о Белоросіи, следовательно следовательно ответ может быт только отрицательный.

4) К большевикам с некоторой симпатіей, конечно не все более сознательная часть обсолютно против.

5) Обсолютно против всех бывших и за нероздельную единую Россию.

6) На все мелкія государства вышедшія из бывшего Россійскаго госуд. смотрят как на временное зло ибо большенство не уверенно, чт такіе небольшія государства как Латвія, Истонія, Литуанія могут существоват без России, а потому существует мненіе что рано или поздно придет время когда всѣ отколовшіяся государства сольются воедино.

Мы очень безпокоимся за судьбу Белоросіи той части которая находится тепер под польшей, вкоторой большія опетиты. Страх что можем попасть под иго к полякам толь ко и может нас тут организоват в Белорускія организаціи которія сумеют дат ипомощ и принадобности отпор.

А тепер пока мы организавываемся Вы присылайте нам побольше матеріалов както: о жизни под польшей, повозможности подробно желательно былобы имет факты, ожизни под большевиками, особенно желательно иметь по больше фактов ибо мы желаем выступит открито с обращеніем к Американскаму общественнаму мненію а для этаго нужен матеріал.

Думаю что унас скоро что нибуд выйдет всмысле організаціонном, начинаем писат в Русских газетах о Белоросіи.

582.2.12:056-057 — мк

[1] «Расейскія» арганізацыі ў Амэрыцы.

2654. Запіскі Клаўдзія Дарашкевіча аб зьверствах польскіх уладаў у м. Сэмятычах Гарадзенскай губэрні і ваколіцах (1918-1920)

582.2.16:001-020

Дата невядомая. Аўтар быў арыштаваны 4.06.1920, вызвалены 5.03.1921.

2655. Паведамленьне Літоўскага Інфармацыйнага Бюро ў Парыжы за 7.03.1921 аб паўстаньнях у Сярэдняй Літве супраць генэрала Жэлігоўскага

582.2.37:047 — мк

Пазначана:
«8/III 21 Париж
К дѣлу
Ладнов».

2656. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.03.1921

Прага 9 III 21

Паслаушы апошні раз №9 «Воли Расеи» і жальбу Беларускаго Ураду «Усім», я прасіу сябра Бубешко памясьціць у Амерыканскіх газэтах не толькі русскіх але і Англійскіх а польскіх злачынствах на Беларусі, што ен часцью і зрабіў. Цяперь я паслау яму №6, 7 і 8 «Нашае Думкі», просячы каб ен газэты з заметкамі а Беларусі пасылау так сама у Коуну у «Беларускую нацыянальную сувязь». Пасылаю так сама цікавы для нас вестачкі у «Нашу Думку» у Вільню, але неведаю ці яны туды даходзяць.

З прывітаннем М.Вершинин
Адрес п. Бубешко
S.Bubeshko
63 Park row
New York
Amerique

582.1.45:132&r

2657. Нота Ураду БНР Лізе Нацыяў, Урадам Польшчы й Літвы за 10.03.1921 у сувязі з адменай плебісцыту на Віленшчыне й Горадзеншчыне й перадачай справы на арбітраж

582.1.45:135-135a — р

Рукапіс П.Крэчэўскага. Зьмест: пратэст і патрабаваньне правесьці плебісцыт

2658. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 10.03.1921

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

вельмі рад, што магу Вас парадаваць добрай весткай: у Амэрыканскай расейскай прэссі пачалі пісаць аб Урадзе Ластоўскага і змястілі абвестку «да усіх».

Бубешку удалося мне упрасіць выступіць у прэссі, і ён гэта ужо зрабіў ў адной з вялікшых Амэрыканскіх расейскіх рабочых газэт — «Американские Известия».

Мала таго — да мяне хутка прыедзе чалавек ад Бубешкі з Нью-Іорку, з якім магчыма будзе гутарыць і ў нацыянальных і, глаўным чынам, ў эканамічных справах.

Чакаючы прыезду Пур<ыцка>га, патрошку агітую тутака за гарантыю.

Пасылаючы Вам адрэсы амэрыканскіх украінскіх і карпатарускіх газэтаў (расейскіе ужо павез Гладкі), вельмі прашу даць Ваш строгі наказ, каб Прэс-Бюро ў кожную з гэтых рэдакцый пасылала бюллітэнь. гэта для нас — жыцьце і сьмерць.

Асабліва будуць друкаваць усе, што проці палякоў.

Хай Лурье[1] не адмаўляецца, што шапірограф бяре толькі 30-40 штук: хай друкуюць 2 і 3 разы. У Амэрыцы мы мусімо зрабіць шум, бо бяз гэтага нічога не будзе з дапамогай і арганізацыей тамака нашых.

Шлю найлепшые пажаданьня

Ваш Кастусь Езавітаў

582.1.45:136&r

[1] Кіраўнік Беларускага Прэс-Бюро ў Коўне.

2659. Копія ліста Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Антону Луцкевічу (Вільня) за 10.03.1921

КОПІЯ

Бэрлін, 10 сакавіка 1921 г.

Яго Міласьці п. А.Луцкевічу.

у Вільні.

Каб даць магчымасьць стараннай асобе — Дру Абрамовічу адшукаць свае грошы, пераданые праз Вас п. Дубейкоускаму, даважу да Вашага ведама:

Грошы ад Л.Дубейкоускага я фактычна НЕ АТРЫМОУВАУ.

У дзень майго адъезду з Варшавы мы з ім умоуна абменяліся распіскамі: я дау ему распіску, што атрымау тры тысячы марак для перэдачы п. Абрамовіч у Бэрліне, а ен дау мне так сама распіску, што атрымау ад мяне тры тысячы марак у лік сум на утрыманьне варшаускау дэлегацыі.

Абмен распіскамі рабілі у той надзеі, што проціу распіскі п. Дубейкоускага я атр[ы]маю грошы для перадачы п. Абрамовіч з дзяржаунага скарбу. Між тым, грошы у Бэрліне не было, аб чым Дубейкоускага паведамілі як лістоуна, так і вусна пры асабістым спатканьні у Бэрліне. У прысутнасьці некалькіх асоб у Місіі яму зьвярнулі увагу на тое, што ен сам павінен клапаціцца, каб аддаць грошы п. Абрамовіч. Відаць ен палічыу за лепшае паказаць маю распіску і тым супакоіць свае сумленьне.

Дзеля таго, што грошы супроць распіскі п. Дубейкоускага я атрымаць не мог, я перадау яе на перахаваньне у Дзяржауны Кантроль, дзе яна ляжыць і дагэтуль.

Дзяржауны Кантроль пры першым запатрэбаваньні перашле яе па належнасьці Дру Абрамовічу, каб нарэшці грошы яму былі зьвернуты тым хто фактычна іх расходавау і не патуровіуся як трэба усе выясьніць і свой доуг аддаць. — гэта значыць ласкавым панам Дубейкоускім.

Я-ж таго, што не брау — нікому аддаваць не зьбіраюся і Вашы пагрозы дарэмны.

Што датыча Вашых дурацкіх ламэнтацыяу і сэнтэнцыяу, дык — даруйце — не знайходжу патрэбным на іх атказываць. Проста скажу, што да гэтага ліста я лічыў Вас больш разумным чалавекам.

Падпісау (А.Цвікевіч.)
582.2.12:093

2660. Рахунак кнігарні Ф.Топіча ў Празе (Narodni třída, 11) на кнігі, купленыя [Міколам Вяршыніным?] для Вацлава Ластоўскага й пераслaныя ў Коўна 12.03.1921

Slabikar 3.20
Neruda IV 19.80
два слоўнікі па 2.75
582.2.58:171-172

2661. Ліст Прэзыдыюму Рады БНР (Коўна) «групе Пяці» (Вільня) за 13.03.1921 з заклікам да адмовы ад супрацоўніцтва з палякамі й аб'яднаньня

Прэзыдыум Рады
Беларускай Народнай рэспублікі
13.III.21 Коуна

Грамадзяніну Тарашкевічу

Праца Рады Б.Н.Р. да 13 снежня 1919 г. йшла едыным нацыянальным шляхам. Група сяброу Рады Рэспублікі прыняушая польскую арыентацыю кіравалася да зруйнаваньня Рады Рэспублікі, прыкрываючыся с пачатку Менскім Нацыянальным К-там, а пасьля расколу 13 снежня тайна абраушы на прыватным сходзе новую арганізацыю «Пяці» т. зв. Найвышэйшую Раду, якая старалася узурпаваць правы Рады Рэспублікі проціу волі і жаданьня усяго беларускага жыхарства. Адмовіушыся ад чарговага сходу сэсіі Рады, не паддаушыся большасьці, усе аткалоушыеся сябры Рады с прыватнымі асобамі аткрыушы прыватны сход, не у памешканьні Рады, а па за яе сьценамі бэз уселякай да гэтага прычыны — стварылі ганебны для Рады Рэспублікі учынак, які мусіць карацца, калі не законам, то грамадзянскім сумленьнем.

Рада Рэспублікі, стоючы на дзяржауным грунце незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі хацела прыйсьці да згоды і тры разы пасылала дэлегатау да адкалоушыхся з прапазыцыяй ім мейсц у Прэзыдыуме Рады і Радзе Міністрау і запрашаючы на сход, але яны не прыйшлі, а нашых дэлегатау спаткалі насьмешкамі і зневагай. Адарваушыся самі, дзякуючы простай несьвядомасьці адных і злой волі другіх — унясьлі той самы разлад і у грамадзянства, даушы магчымасьць польскім акупантам, бязкарна арэштовваць сяброу Прэзыдыума Рады і Урад.

Беларуская група прыватнага сходу, якой спрыялі акупанты, ня толькі не пратэставала проціу гэтага зьдзеку над беларускай дзяржаунасьцю, а яшчэ наадварот, гаварыла, што палітычная барацьба аморальна і пры ей дапусцімы усякіе спосабы змаганьня.

Адступіушы ад дзяржаунага грунту раз, група «Пяці» ужо не магла устрымацца і пайшла на уступкі перад акупантамі, далей апусьціушыся да культурна-прасьветнай аутаноміі у польскай Дзяржаве.

Такая праца паленафільскай групы беларусоу, нават бэз умацаваньня гэтага на паперы, давала права Польскаму Ураду гаварыць за граніцай, што беларусы адмауляюцца ад Дзяржаунага будауніцтва і самі згаджаюцца на культурна-прасьветную аутаномію.

Стала яшчэ горш, калі гэтай самай групай была падпісана умова з Польскім Урадам аб культурна-нацыянальнай аутаноміі. Гэтай умовай і у Парыжы, і у Рызе анулявалася уся праца Рады Рэспублікі па здабыцьцю незалежнасьці і непаддзельнасьці Б.Н.Р.

Толькі дзякуючы гэтай умове, якой опэравау Домбскі у Рызе, Урад Б.Н.Р. ня быу дапушчаны, як самаістная старана на міравые перагаворы. Толькі дзеля гэтай умовы Беларусь была падзелена.

Польскі Урад выкарыстау гэту умову у найлепшым для сябе кірунку і абсалютна за гэта нічога не дау Беларусі. Бачучы гэта група «Пяці» не адвернулася ад іх, а яшчэ раз увыйшла у зносіны з Польшчай і дала сваіх кандыдатоу Іваноускага і Тарашкевіча у склад Ураду Срадковай Літвы, дзе ізноу іх скарысталі і, высмактаушы, выкінулі як нягодных і больш ім непатрэбных. За увесь здек і падломываньне групы «Пяці» да Польскай палітыкі Беларусь не скарысталась ні водным крокам і Беларусь як і раней лічыцца «крэсамі усходнімі» Польскім Урадам.

Такая праца шкодзіць да гэтай пары беларускай справе іначэй, як дзяржауная здрада разглядацца ня можэ, але патрэбуе толькі высьвятленьня, чы яна зроблена памылкова, ці зусім сьвядома.

У час, калі яшчэ раз у Брусэле будзе зноу разгледацца наша пытаньне[1] і можа зноу на аснове тэй самай умовы з палякамі захочуць нас дзяліць. Патрэбна зараз-жа ануляваць аткрыта, праз друк усе умовы з палякамі, якія нас увесь час абманывалі і стварыць зноу ядыны нацыянальны фронт для здабыцьця сваей дзяржаунай незалежнасьці.

Арбітражная камісыя у Брюселе паміж літвінамі і палякамі толькі і будзе апірацца на гэтыя умовы і даказываць, што Беларусь хочэ прылучыцца да Польшчы. Калі там мы усе разам не скажам, што хочэм жыць самастойна нас зноу раздзеляць і віну за гэты падзел вы павінны будеце узяць на сябе.

Дзеля гэтага група «Пяці» і палітычны камітэт у Варшаве, які быу вынікам разладу і шкоднай працы паленафільскай групы зараз-жа павінны злажыць свае паунамоцства і пайсьці на супольную працу з Урадам. Ні Балаховічам ні Савінкавым мы сябе не падапрэм, а справу сваю загубіць можэм.

Ужо некалькі разоу тэлеграмамі у Рыгу паасобныя члены «Пяці» віталі працу Ураду Ластоускага на карысьць Беларускай Дзяржаунасьці. Калі гэта шчырае пераконаньне, а не палітыканства, то трэба найсьці у сабе адвагу і сказаць гэта аткрыта усяму сьвету і парваць усякую зьвязь з палякамі.

Апроч таго, дэлегат «Пяці» у Рызе, Тэрэшчэнко, злажыу мандаты перад Урадам Ластоускага і што за прычына, калі да гэтай пары шкодная

праца гэтай групы вядзецца — няведама. У гэтым прыдзецца разьбірацца пасьля, а цяперака усе разам павінны здабываць сваю незалежнасьць.

Пара зразумець, што жэбрацкія капейкі на культурна-прасьветную справу, якія давала беларусам Польшча з іх жэ селянскіх грошей — бэз прызнаньня Ураду і тэрыторыі не павінны спыняць змаганьня з ею за Дзяржаўную незалежнасьць і непаддзельнасьць Беларусі.

Прыймаючы усе гэта пад увагу Прэзыдыум Рады Б.Н.Р. патрэбуе ад вас адкрытай і шчырай адповедзі у адносінах да Рады Рэспублікі і Ураду Ластоускага, як ядыных правамоцных абаронцау Беларускай Дзяржаунасьці і хочучы верыць, што ваша праца была толькі абмылковай — заклікае стаць пад бела-чырвона-белы штандар Беларускай Народнай Рэспублікі у абароне яе Дзяржаунай Незалежнасьці і Непаддзельнасьці і адрачыся голасна ад змоу і супольнай працы з палякамі.

Старшыня Рады Рэспублікі Крэчэускі
Намесьнік Старшыні В.Захарко
Сакратар К Душ
582.1.27:001-004 — мк
582.1.45:140-140а-140с — мк
582.2.37:048-051 — ма (Тарашкевічу)

[1] Маецца на ўвазе польска-літоўская канфэрэнцыя ў Брусэлі, якая адбывалася 20.04-3.06.1921.

2662. Часовае пасьведчаньне Міністэрства Замежных Справаў Літвы Вацлаву Ластоўскаму за 14.03.1921 у тым, што ягоны пашпарт знаходзіцца ў Міністэрстве

582.1.45:137

Падпісаў: в.а. загадчыка Аддзелу расейскіх справаў Усевалад Боеў.

2663. Ліст «Тутэйшага» (Трышкі) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.03.1921 з дасланымі літаратурнымі спробамі

582.1.45:141-141а

2664. Чужы. Добры католік. Апавяданьні «Тутэйшага»

582.1.47:001-023 — р

2665. Ліст рэдактара газэты «Воля Россіи» Ул.Лебедзева (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.03.1921

582.1.45:149

Адказ на дасланы ліст.

2666. Ліст адміністрацыі газэты «Воля Россіи» (Прага, Uhelny trh, 1) Язэпу Варонку (Коўна) за 16.03.1921 у справе пашырэньня газэты ў Літве

582.2.36:069 — ма

2667. М.Р. Бѣлорусская пропаганда // Американскія Извѣстія. 17.03.1921

582.1.36:012-014 — мк

Зьмест артыкула: беларускі палітычны рух — польская інтрыга.

2668. Старонка газэты «Голос Россіи» (Бэрлін). 17(?).03.1921 з карыкатурай «Россія въ кольцѣ»

582.2.12:025

Дакладная дата невядомая.

2669. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.03.1921

Бэрлін, 18 сакавіка 21 г.

Паважаны пане Вацлаве!

Я думаю было б вельмі карысным, калі б наш урад падау на імя Рады Лігі Народау пратэст проціу палітыкі польскага ураду, гальмуючай справу беларускай нацыональнай асьветы пад польскай оккупацыей. Пратэст трэба абаснаваць на §9 трактата аб ахароне нацыональных меншасцей у Польшчы, які быу далучан да Версальскае умовы і ратыфікаваны польскім соймам 1 жнівеня 1919 году. Праэкт тэксту я ці вышлю Вам, ці прывязу сам. Вы з свайго боку патуроуцеся каб сабраць хут[ч]эй патрэбны матэрыал.

Цісну руку АлЦвікевіч

Гл. «Kurier Polski» N7 ад 14/III 1921 — перэдавіца «W sprawie białoruskiej»

582.1.45:139

2670. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.03.1921

Пасылаю для перакладу свой проэкт запіскі на імя прэзідэнта польска-літоускай конфэрэнцыі у Бруссэле.

Г.Президент.

Польша и Литва, согласно постановленію Совѣта Лиги Націй от ..... приступают на предстоящей конференціи в Брюсселѣ к непосредственным переговорам о границах.

Как извѣстно, Польша и Литва граничат друг с другом только по линіи Августовскаго канала. Далѣе на восток и на сѣвер лежит безспорная бѣлорусская территорія, что признают как литовская, так и польская стороны и в чем Совѣт Лиги Націй убѣдился из ознокомленія с основаніями польско-литовскаго спора. С непререкаемой авторитетностью установил эту истину Версальскій договор пунктом ..... о восточных границах Польши.

Многомилліонное бѣлорусское населеніе этих земель имѣет полное право принять участіе в разрѣшеніи своей собственной судьбы. Оно имѣет

законное правительство, которое обязано защищать его интересы. Вслѣдствіе подавляющей военной силы большевиков и поляков, народ не смог защитить свою территорію от захвата и временнаго порабощенія и бѣлорусское правительство принуждено в настоящее время искать убѣжища в дружественной странѣ. Тѣм не менѣе это не лишает его права на защиту интересов родной страны.

В согласіи с заявленіем своим от 16 и 18 декабря Лигѣ Націй в Женевѣ, бѣлорусское правительство полагает, что найболѣе справедливым было бы передать бѣлорусскія земли законному бѣлорусскому правительству. Если по соображеніям каким либо это оказалось бы в настоящій момент трудным, бѣлорусское населеніе Гродненщыны и Виленщины предпочитало бы временно войти в состав литовской республики на основаніи федеративнаго соглашенія между бѣлорусским и литовским правительствами. Второе предложеніе диктуется исторіей дружественнаго органическаго сожительства Бѣлоруссіи и Литвы за все прошлое время их самостоятельнаго политическаго существованія и крѣпким политическим и экономическим тяготѣніем друг к другу в настоящем.

Наконец, если и это предложеніе по каким либо соображеніям оказывалось бы для Лиги Націй непріемлемым, бѣлорусское правительство соглашалось с мыслью о плебесцитѣ для выясненіе истинной воли бѣлорусскаго народа, при условіи дѣйствительных гарантій свободы этого волеизъявленія.

Теперь обращеніе к народу и выясненіе его политических стремленій пр[и]знано излишним и ненужным. (Рѣшеніе такое совершенно противорѣчит принципам прав народов на самоопредѣленіе.) Культурное бѣлорусское населеніе Гродненской и Виленской губерній предположено раздѣлить на основаніи соглашенія двух чуждых ему правительств — Литвы и Польши — как матеріальный объект или как африканскую колонію.

Поскольку между Польшей и Литвой не было войны и предстоящее разграниченіе спорных губерній не является слѣдствіем такой войны, бѣлорусское населеніе, в лицѣ своего правительства, имѣет право принять участіе в этом спорѣ в качествѣ самостоятельной стороны.

Отказ в выслушаніи мнѣнія правомочнаго представительства Бѣлоруссіи укрѣпит на мѣстах сознаніе полнаго игнорированія ея священных прав, неоднократно в теченіи семилѣтней войны нарушенных и лишній раз побудит изнуренное неслыханными бѣдствіями населеніе искать защиты своих интересов в дальнѣйшей революціонной борьбѣ и в неорганизованных стихійных выступленіях.

На основаніи изложеннаго, стремясь содѣйствовать мирному строительству страны, а не росту массоваго недовольства и большевизма, правительство БНР имѣет честь просить Вас, г. Президент, (возбудить вопрос?) допустить его полномочную делегацію на предстоящую под Вашим президентством польско-литовскую конференцію в Брюсселѣ.

Отвѣт на наше ходатайство просим направить в мѣсто временнаго пребыванія бѣлорусскаго правительства город Ковно, Метрополь.

Вышэй паданы проэкт трэба аккуратна разгледзіць па фразам и нават па словам. Хоць, прауду кажучы, я не пакладаю ніякіх надзей, каб нас

пусьцілі як старану на литоуска-польскую (сік!) конфэрэнцыю, дзеля таго што ніхто ні з палякау, ні з літоуцау не заявліся аб патрэбе азнаемленьня з нашымі дамаганьнямі, але усе ж такі трэба рэдагаваць запіску як мага сур'езней. Некаторыя выразы і словы (іх я пад[к]рэсьліу) можна апусьціть, ці заменіць. Калі Ладноу не пасьпее уручыць асабіста гэту запіску, дык прыдзецца так яе і закончыць. указаньнем адрэсу. Гэта дрэнна, разумеецца, былоб лепей, каб ен яе завез персонально і там жа на рукі атрымау адказ.

Лічу надта патрэбным азнаеміць п.п. Пурыцк[а]га і Клімаса[1], і надта было б добра — Гальваноускага[2] з тэкстам нашай заявы і спытацца іх аб парадку падачы. Формальнае пытаньне аб парадку, варунках і г.д. конфэрэнцыі для мяне не ясны. Выя[с]ьніце гэта з л[і]твінамі і пастарайцеся угаварыць іх хоць раз адкрыта нас падтрымаць, згодна нашаму дагавору.

Я усе чакаю Ладнова. Дау яму позаучора тэлеграму як разумець яго затрыманьне. Магчыма, што ен па дарозе заехау да жонкі у Вісбадэн. Не ведаю, ці вые[ж]джаць самому, не чакаючы яго, ці чакаць далей. Проста ен мяне нэрвуець! Я пачуваю сябе не зусім здаровым, неякая такая хворасьць прычапілась, як у апошні час у Коуні, ломіць усяго, спіну круціць так, што як стары хрэн скав[ы]чу увесь дзень і не магу павярнуцца. Толькі і можна, што сідзець за машынкай увесь час. Шмат працы з коррэктурамі і друкам.

Дэкларацыю з прываду гадавін незалежнасьці патуроулюся паслаць як мага хутчэй. Калі да 25 мы не прыедзем, дык трэба будзе запіску паслаць Гюімансу праз літоуцау, ці як небудзь другім шляхам. Дэкларацыю трэба разпаусюжыць як мага шырэй у прэссе.

АЦ 18.III.21. Berlin

Пашліце усе, якіе маюцца матэрыалы п. Бодры[3] — ен надта прасіу. А так сама усе новае. Адгэтуль нічога паслаць ня можна, бо немцы не пушчаюць!!

Запіску трэба паслаць адначасова (толькі зьменіушы тытул) у Раду паслоу у Парыжу і у к[о]піях французскаму і англійскаму міністэрству загранічных спрау.

АЦ

582.2.12:016&r

---

[1] Міністар і намесьнік міністра замежных справаў Літвы. [2] Міністар фінансаў Літвы, кіраўнік літоўскай дэлегацыі ў Брусэлі. [3] Сакратар беларускай дэлегацыі ў Парыжы.

2671. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму й Самуілу Жытлоўскаму (Коўна) за 18.03.1921 (?)

Многоуважаемые г.г. Ластоўскі і Жытлоўскі!

Только что — за полчаса до отъѣзда г. Красковскаго мы были у Лурье. Он от предоставленія нам кредита — воздерживается. — Этим самым, на мой взгляд, предрѣшается вопрос о дальнѣйшем его пребываніи в качествѣ нашего финанс. агента в Германіи.

Завтра будем искать других путей...

Дѣло с товарами стоит довольно прочно.

Как сообщает Вам особо А.Бароўскі — в среду пріѣзджает сюда Гл. Директор Iweg'a[1] со всѣми документами. Таким образом — будем ждать еще два дня.

Если в среду дѣло выйдет — дадим телеграмму, если же затянется — то также дадим телеграмму с просьбой Самуилу Іосиф. пріѣхать сюда.

тороплюсь — потому что нужно отправляться на вокзал.

Привѣт всѣм

Ваш ААЦвикевич

P.S. Заключаю проэкт записки, кот. г. Лурье предлагает послать в Вѣнскій Банк для «пріисканія» денег. Полагаю, что это вещь непріемлемая. Во всяком случаѣ пусть скажет свое слово Самуил Іосиф. как замѣст. Министра Торговли.

582.2.12:017&r

Дакладная дата невядомая. [1] IWEG (Internationale Waren-Export und Import Gesellschaft) — фірма (з галоўнай сядзібаю ў Нюрнбэргу), зь якою Урад БНР у 1921-1923 гадох вёў гандлёвыя апэрацыі.

2672. Даклад старшыні Горадзенскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту Сяргея Барана старшыні Рады Міністраў Літоўскай Рэспублікі за 19.03.1921

582.1.55:004-008 — мк

Пералічаныя ў дакладзе беларускія арганізацыі ў Горадні:

Горадзенскі Беларускі Нацыянальны Камітэт (21.01.1921 зачынены й працуе нелегальна), Грамада Моладзі, Беларуская гімназія, Беларускі прытулак, Саюз каапэратываў Горадзеншчыны, газэта «Беларускае Слова» (зачыненая 21.01.1921).

Кіраўніцтва ГБНК: старшыня С.Баран, намесьнік старшыні Якавюк, сакратар Антонаў.

2673. Каштарыс штомесячных выдаткаў на ўтрыманьне Беларускага Нацыянальнага Камітэту Горадзеншчыны ад 1.01.1921, далучаны да дакладу Сяргея Барана

582.1.55:009 — мк

2674. Каштарыс штомесячных выдаткаў на ўтрыманьне Беларускай Гімназіі й прытулку ў Горадні

582.1.55:010-011 — мк

2675. Тлумачальная запіска да каштарысаў штомесячных выдаткаў на ўтрыманьне Беларускага Нацыянальнага Камітэту й Беларускай Гімназіі й прытулку ў Горадні

582.1.55:012-013 — мк

2676. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.03.1921

Б.Н.Р.
УПОЎНАМОЧАНЫ ПА СПРАВАМ
ВАЕН.-ПАЛОН. БЕЛАРУСАЎ В ЧЭХА-
СЛАВАЦКАЙ РЭСПУБЛІЦЕ.
B.R.D.R.
CHARGÉ DES AFFAIRES DES PRI-
SONNIERS DE GUERRE
BLANCS-RUTHÉNIENS
DANS LA RÉPUBLIQUE TCHÉCO-
SLOVAQUE.

Сакавіка 19 дня 1921
№207
ПРАГА Praha II PRAGUE
Wenzigova 4

Пану Старшыне Рады Міні-
страу Беларускае Народнае Рэ-
спублікі
Коуна

Маю гонар прэдставіць пры гэтым пісмо грамадзяніна С.Бубешка з Ньюёрка ад 3 III г.г. на распараженне і данясьці, што атрыманыя мною ад п. Бубешка дзве амерыканскія газэты з яго артыкуламі адасланы у Беларускую Націянальную Сувязь у Коуні ужо тыдзень таму назад і тагды же пасланы п. Бубешка №№6, 7 і 8 «Нашае Думкі» у якой зачэплена пытане а «Беларусах у Амерыцы» і «Адозва да Амерыканскіх Беларусау» з указанем адрэса Беларускай Націянальнай сувязі. Перад тым былі посланы №109 «Воли Россіи» з артыкулам «а польскам грабеже беларускіх земель» і адозва Ураду Б.Н.Р. «Усім». Ніякай іншай літэратуры я не пасылау яму.

М.Вершынін
поунам. прэдстаунік ураду Б.Н.Р.
582.2.12:094

2677. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.03.1921

Паважаны пане Вацлаве!

Баркову трэба выслаць адстаўку з Коўны — на аснове пастановы Рады Міністраў. Матыў кароткі: за сокрашчэніем штатаў. Тэрмін — ад 20 сакавіка. Трэба указаць — што месячн. пэнсыя (заштатная) будзе яму пераведзена па адрэсу — які ён пакажэць у красавіку.

АлЦвікевіч
582.1.45:133

2678. «Поможемъ освобожденію дружественныхъ намъ бѣлорусскаго и украинскаго народовъ». Пераклад артыкулу з газэты «Le Moniteur du Commerce» №578 за 20.03.1921

582.1.36:011&r — мк

Надрукавана ў: Беларускі Звон. №5. 1921.04.28

2679. Ліст Янкі Чарапука (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.03.1921

Даражэнькі! Выехаць заразжэ мне нельга. Затрымваюць паважныя справы. Найвышэйшыя[1] задумваюць штосці паважнае. Усе у Варшаве — хутка варочаюцца назад. Мяне Тарас[2] затрымаў (напэуна паразумеушыся з імі) ён лічыць патрэбным бэзумоўна аб'еднаньне, яно думаю ня будзе мець перашкод, калі яны не згаварыліся у Варшаве. «Тато»[3] арудуе - яму спамагаюць. «Палюк»[4] тутака тое самое робіць супольна з ім. Але «Тато» падходзіць да зрабленьня кантакту з Вамі. Там дзе быў Язэп[5] ўсе пайшло старым і лепшым шляхам, але ён адвезяны далей[6]. Як толькі удасца паразумецца хуткож выеду. Чэкайце на святі.

нядзеля 20.

Янка Чарапук

582.1.45:150

---

[1] Дзеячы, згуртаваныя вакол Найвышэйшай Рады БНР. [2] Тарашкевіч. [3] С.Булак-Балаховіч. [4] Аляксюк. [5] Мамонька. «Там дзе быў Язэп» — у Менску. [6] У Казанскую турму.

2680. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20(?).03.1921

Высокапаважаны гр. Старшыня!

Карыстаюсь зручнасцьцю каб напісаць Вам некалькі слоў. Покуль што «зондзірую почву», но Ів<аноўскі> і См<оліч> выкліканы ў Варш. Ў тутэйшых «туга» да нас ёсць, тым болей, што з грашыма справа дрэнь. Пасля прыезду сюды Ів. і См. выеду ў Варш. Справа Укр<аінцаў> вельмі добра стаіць са ўсіх бакоў. Тымчасова трымаюсь як бы ў старане і карыстаюсь Янкам. Катэгарычна прашу інфармацый аба ўсім, а так сама інструкцый. Ня адмоўце зрабіць распараджэньне, каб пры ўселякай магчымасьці пярэсылаліс сюды бюллетэні, бо яны тут ня атрымліваюцца. Сувязь са мной можна падтрымліваць праз падаўцу гэтаго ліста звощыка Хонэ[1], а так сама праз Б.-ку[2]. Было б вельмі добра, каб падтрымаць грашыма Саюз С. Гасп., які істнуе, але Кузьма[3] ня маючы грошэй ня можэ яе пашырыць. Усё гэта можна зрабіць, бо грошы гэтые ня прападуць, калі у гэты саюз паступлю і я.

Ваш ЎП.

[Прыпісана рукою Ластоўскага:] 26.III.21 ВЛ.

582.1.45:151

Дакладная дата невядомая. [1] Хонэ Палецкі, кур'ер. [2] Асоба ня высьветленая. [3] Цярэшчанка.

2681. Ліст Давіда Анэкштэйна (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.03.1921 з паведамленьнем аб выніках плебісцыту ў Верхняй Сілезіі

582.1.45:129&r

У лісьце цытуецца тэлеграма ў варшаўскай газэце «Свобода», атрыманая 21.03.1921: «Беларускія паўстанцы занялі 16.III Менск. 8-ая савецкая дывізія пе-

райшла на старану паўстанцаў. Паўстанцы абвесьцілі Незалежную Беларускую Народную Рэспубліку».

2682. Ліст Лявона Зайца (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.03.1921

[Віншаваньне на візытоўцы:]

ЛЕАНАРДЫ ЗАЯЦ

Дзержауны Кантралёр Беларускай Народнай Рэспублікі

582.1.45:152

2683. Ліст Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.03.1921

23.III.21
Дзьвінск.

Даражэнькі Вацлаў Юстынавіч,

маю прыемнасьць Вас паведаміць, што спаткаў тутака неспадзеваныя прыемнасьці.

Свой прыезд сюды я падрахаваў такім чынам, каб прыняць удзел ў працы вучытельскага павятовага кангрэссу ў Дзвінску. На кангрэссі, які адбываўся 20-21 сакавіка была прысутна 200 вучыцелеў (расейцы, жыды, латышы, палякі і беларусы). Па маім данным мяне павінны былі цікавіць чалавек 15-20, якіе ужо паспелі зарэгістрыравацца як беларусы, але на мейсцу аказалася куды больш: каля 25-30.

Не лічучы магчымым выступаць на кангрэссі, хоць мяне аб гэтым і прасілі, я зрабіў некалькі інфармацыйна-літэратурна-вакальных сходак ў сябе у нумэру. Раздаў шмат літэратуры і зацекавіў не толькі беларусаў, але і латышоў.

З вялікай прыемнасьцьцю заўважыў я, што, хоць увесь кангрэс раз'ехаўся ноччу 21, ўсе беларусы затрымаліся яшчэ і 22, а некаторыя і 23 сакавіка.

Пастанавілі залажыць «Бацькаўшчыну», пры ей вучыцельскі беларускі хаўрус і дамагацца стварэньня курсаў беларусазнаўства для вучыцелеў, каб потым ў восені мець магчымасьць прыступіць да стварэньня беларускай школы.

Гутарыў у гэтай справі ужо і з інспектарам і з Управай і яны аднесліся зусім прыхільна.

Местовыя вучыцелі прышлі апошнімі, але і сярод іх знайшліся мае старыя знаёмыя, якія таксама бяруцца за працу.

Праз некалькі дзен раблю публічную лекцыю. Згоду на гэта атрымаў ешчэ ў Рызе ад Мін. Унутр. Спраў, што крыху і затрымала мой ад'езд. Згода дадзена на радок лекцый у Дзвінску, Люцыну, Рэжыцы, Крэслаўцы і Іллюксту.

На гэты аб'езд будзе патрэбна ня меньш месяца, а можа і больш, але рэзультаты, спадзеваюсь, атрымаюцца добрыя.

На вялікую уцеху сябе спаткаў некалькі сваіх былых вучаніц, якія цяперыка ужо вучыцелькамі. Яны вельмі дапамагаюць справе.

Вельмі прашу Вас спісацца з Вільняй, каб па першаму майму вызаву выехалі двое добрых лектараў на курсы і ўзялі з сабой як мага больш кніжак для навучэньня, бо яны ідуць найбольш, а у мяне іх нема зусім. Калі можэце пераслаць што-кольвек праз Літвіноў у Рыгу, дык перашліце на мой стары адрэс, а мне перашлюць сюды.

Дзвінскі мой адрэс Hotel Astorija N12, але пішыце мне па адрэсу: Дзвінск, Варшавская каз. здан. N5, кв. Эггерт — мне.

бо атрымліваць лісты на Hotel я не хачу, ды і потым калі я куды выеду, дык мне з Варшаўскай будуць дасылаць.

Бюлліцені хай па старому ідуць на Рыгу: там іх чытае ў мяне адзін каррэспандэнта і потым перасылае мне.

У Белпрес і наагул шырока нічога інфармаваць аб маей працы тутака пакуль што ня трэба, бо можа пашкодзіць.

Бывайце здаровы. Чэкаю вестак ад Вас. К.Езавітаў

582.1.45:142&r-142a&r

2684. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.03.1921

Б.Н.Р.
УПОЎНАМОЧАНЫ ПА СПРАВАМ ЦЫВІЛ.
І ВАЕН.-ПАЛОН. БЕЛАРУСАЎ В ЧЭХА-
СЛАВАЦКАЙ РЭСПУБЛІЦЕ.

Сакавіка 23 дня 1921
№210
Praha II
Wenzigova 4

Пану Старшыне Рады Міністрау
Беларускае Народнае Рэспублікі
у Коуні

Маю гонар данясьці, што у нядзелю 20/III вечарам прыехау у Прагу міністр закардонных спрау Б.Н.Р. пан Ладноу. У панядзелак мы разам зрабілі візыт чэскаму міністру закардонных спрау, які прыняу нас вельмі ласкава, сказаушы, што ім вельмі міла, што мы хочэм завязаць з імі больш блізкія-прыязныя адносіны. Пытауся а палажені нашых спрау і.т.д. Ва уторак мы былі у Украінскага пасла, з якім вялі доугую беседу. Здаецца што справы іх і нашы стаяць цяпер на лепшым грунце, чым перад тым стаялі.

Рускіе эсэры у Празе рады з пісьма, якое Вы ім прыслалі. Яны чакаюць прыезда сюды сваіх главароу.—

Дапускаючы мысьль, што бальшавікі хочуць саставіць кааліцыонны урад і шукаюць кампрамісау з эсэрамі і меньшавікамі, яны сумлеваюцца прыме-лі іх парція варункі бальшавікоу.

Я даказываў ім, што каліб яны цяпер прызналі незалежнасьць Беларусі, то гэтым зыскалі бы прыхільнасьць беларускаго народу і тагды саюз паміж намі і імі быу бы пэўны і моцны, бо быу бы гарантован взаемнымі сымпаціямі народау Беларускаго і Велікарускаго, дабравольна сашоушыміся як вольны з вольным і роуны з роуным.

Яны адказываюць што так сама кіруюцца гэтай мэтай і надзеюцца што прыдзе к дабравольнай федарацыі, але жалуюцца на тое што цяпер некатарыя новыя дзержавы ня хочуць мець з Расеей федарацыі і па узору Швэйцарыі ні Нямеччыны, стаяць на грунце поунай самастаяцельнасьці, вароже нарыхтованой праціу Расеі. Буду з імі размауляць далей.

Сягоння я аддау у «Волю Россіи» новую стацью а каланізацыі беларускіх земель польскімі салдатамі разам з перакладам сваім «распараженя» польскаго ваеннаго мінісьцерства, надрукованаго у «Gazecie Warszawskiej» ад 15 сакавіка г.г.-

М.Вершынін

Поунамоцны прэдстаунік Ураду Б.Н.Р.

Сягоння рана у 7 гадзін пан Ладноу паехау з Прагі у Вільну, адкуль прыедзе у Коуну.

582.1.45:148&r

2685. Ліст Сьцяпана Бубешкі (Нью-Ёрк) Беларускаму Прэс-Бюро (Коўна) за 23.03.1921

S.O.BUBESHKO
63 Park Row
New York

Марта 23 1921 год.

Белорусское Прес Бюро
Метрополь, 22
Ковно.

Уважаемыя граждане!

Последнюю неделю получаю от Вас бюллетени, за которыя очень благодарен, всвою очередь стараюс распространить, по возможности шире между нашими Белоросами, которих в Америке живет довольно много. К великому сожелению мы обсолютно не организованны, в Национальныя организации, пробуем, но пока разультатов еще не видно хотя маленькия расточки иест, Русская преса немного интересуется, и дает место на своих страницах хотя конечно по выбору, да и сами то Белоросы начинают понемногу интересоваться судьбой своей Батьковщины, дожидаем более подробных сведении из Берлина Риги а также иот Вас.

Огитацию ведем как устно на митингах, так и посредством печати, конечно не втаком маштабе, вкаком желательно былобы, для широкой огитации ест не початое поле деятельности, но нет почвы, ибо Белорусские крестьяне и тепер после того как их родину розорвали, не считают себя Белоросам[и] и ковсем делам косающимся нашей Белоросии, относятся совершенно индеферентно. При первом удобном случае организуем Белорускую организацию, которая займется прапогандой, между Американцев и Белорусов; наших Белоруских идей.

Сначала придется очен туго, но думается что и мы имеем право на самостаятельное существование, наровне с другими народами, апотаму смотрю бодро вперод и думаю что рано или поздно одумаются те которыя теперь ведут себя подобно разбойникам, ибо нам Белорусам жит без

своей родины также ужасно, как бы это было человеку между диких зверей... и только слепые или совершеньнейшие идиоты этаго видет не могут.

Поведение поляков очень много способствует тому, чтобы каждый из наших Белорусов призадумался над выборам быть ли рабом, или свободным гражданином, издвух вбор должен быть — и он будет, наблаго нашего многострадального народа.

Из полученнаго толькочто Вашего пистма, узнал что для просвещения нашего радного народа нужны средства, апотому рекомендую обратится через меня в Русско-Славянское общество взаимопомощи, членом котораго состаю и которое почти что одно из самих солидных обществ в Америке, состоячее целиком из Минчан да Гродненцов. Совместными силами обсудим и думается получется хорошие результаты. Если имеется Белорусская азбука иличтолибо вэтом роде пришлите. Пишите письмо спредложением о сборах для печатонья литеротуры, сприложением официалнаго и если взможно то подробнаго описания задач и целей которые преследует Белоруское правительство. Пишите чем могу служить или чем интересуетес буду по взможности весь к Вашим услугам. Попробую высылат регулярно одну из газет выходящую в Америке, желательнобылобы получат из Ковно. Я из Гродненской Губ. и уез. Села Дубна. Посылаю в этом письме копию письма посланнаго мной в Прагу, изкатораго будет более видно, атакже вопросный лист который послан в Ригу т.е. ответы.

Отвечайте по Белорусски
с искреньним к Вам уважением Ваш
покорный слуга С.О.Бубешко.
582.2.12:054

2686. Ліст палкоўніка Беньяшэвіча (Бялград) [Вацлаву Ластоўскаму (Коўна)?] за 25.03.1921

582.1.25:074&r

Адказ на «извѣщеніе от 10 марта 1921 г. за №342» і бюлетэнь. У лісьце сярод іншага паведамляецца: «Здѣсь очень много бѣлорусовъ всѣхъ будетъ до 600 человѣкъ и среди нихъ много было бы полезныхъ работниковъ на мѣстахъ т.е. въ Бѣлоруссіи, какъ по защитѣ ея от большевиковъ, такъ и отъ поляковъ, ибо всѣ эти бѣженцы не примиримые враги, какъ тѣхъ, такъ и другихъ, а также и при возсозданіи Бѣлоруссіи, но изъ нихъ могли бы уѣхать теперь maximum 150-200 чел. а остольные абсолютно безъ всякихъ средствъ».

Палкоўнік О.К.Беньяшэвіч — сябра Літоўскай Рады ў Бялградзе. Інфармацыя пра яго: Часопісь Міністэрства Беларускіх Спраў. №3-4. 11-12.1919.

2687. Адозва Прэзыдыюму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі «Усім Жыхарам Беларусі» за 25.03.1921, Коўна

582.1.11:038 — д
582.1.11:126 — д
582.1.16:001 — д

2688. Адозва Рады Беларускай Народнай Рэспублікі й Рады Міністраў БНР да беларускага й жыдоўскага народаў за 25.03.1921

25 сакавіка 1921 году прайшло 3 гады ад часу калі Беларускі Народ у асобе лепшых сваіх прэдстаўнікоў выявіў сваю непахібную волю да самаіснага дзержаўнага будаваньня і апавесьціў Незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі.

Ні векавое панаваньне шляхэцкай Польшчы, ні рабскі уціск Расейскага самадзержаўя ня вырвалі з душы народу яго сьвятога імкненьня да свайго вызваленьня ад векавых прыгнетчыкаў.

Наадварот, пракавечнае змаганьне за свае нацыянальнае бытаваньне выкавала ў ім непахібную волю да свабоды і загартавала лепшых сыноў народу ў імкненьні да зьдзейсьненьня сваіх нацыянальных ідэалаў.

Гістарычны шлях быў доўгі і цярністы. Многа ахвяр палажыў Беларускі Народ на аўтар свабоды. Многа жывых палягло ў самаахвярным змаганьні за шчасьце і дабро народу. Вечная слава волатам змагарным. Маці-бацькаўшчына будзе вечна праслаўляць іх імёны.

Ды не сам адзін быў Беларускі Народ ў сваім змаганьні. Побач яго цярпеў і бароўся другі Народ — пракавечны мучанік Народ Жыдоўскі — з незапамятных часаў паліваўшы зямлю беларускую сваім потам, сьлезамі і крывёй.

Бязьмерны — быу глум панявольнікаў над верай і жыцьцём сыноў Ізраіля.

Самадзержаўе Маскоўскае мяркавала, што яно ў крыві жыдоўскай патопіць народны гнеў, які не адзін раз парываўся разбурыць тыранскую ўладу, — шляхта польская шчыра памагала свайму-ж кату распаляць інстынкты разбэшчанай чэрні.

Жыдоўскі народ зразумеў ясна, што яму німа чаго чакаць ласкавасці ад сваіх панявольнікаў, — што толькі ў змаганьні жыды дабудуць правы на жыцьцё і свабоду.

Ўразумеўшы гэта жыды падалі прыязную руку свайму брату па нешчасьцю — Народу Беларускаму, дзеля супольнага змаганьня за Незалежнасць, змацаваўшы гэта актам 25 сакавіка.

Сталося: дзьве сувэрэнные нацыі, населяючые Зямлю Беларускую ўявілі сябе і аб'ядналіся ў адзін народ, дзеля далейшага змаганьня за сваю зямлю, культуру і дзержаўную незалежнасць.

Ў вялікі гістарычны дзень 25 сакавіка 1918 году — Дзень апавешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі першы раз была ясна і голасна на ўвесь сьвет высказана дзержаўная воля гэтых дзьвех сувэрэнных нацый. Ніякіе наймі́цкіе штыкі, ніякіе інтрыгі і авантуры, ап'янеўшых ад шовіністычнага чаду імпэрыялістаў не прымусяць Беларусаў зьвярнуць з раз выбранага імі шляху. Лёгіка гісторыі прымусіць прызнаць народы, каторые шчыра зацікаўлены ў тым, каб спыніць братабойчую разьню — што толькі поўнае прызнаньне правоў Беларускага Народу на мірнае дзержаўнае будаўніцтва, згодна з яго нацыянальнымі ідэаламі, супакоіць развогненую пасыю і дасць магчымасць усім іншым суседнім народам улажыць мечь у похвы і ўзяцца за плуг і молат.

Ў вялікі гістарычны дзень 25 сакавіка 1918 году Беларуская Рада, перэняўшая ўладу ад Ўсенароднага Беларускага Кангрэсу першы раз развярнула запраўды народны сьцяг на якім накрэсьлены запраўды сьвятыя словы:

1) Незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, як свабоднай працоўнай дзяржавы.

2) Перэдача ўсей зямлі працоўнаму народу і дзяржаўная абарона працы.

3) Сувэрэннасць нацый беларускай і жыдоўскай і поўнае аб'еднаньне іх у адзін дзяржаўны Беларускі Народ.

4) Грамадзянскае роўнапраўе ўсіх нацый населяючых Беларусь бяз розьніцы веры і поўнае здаволеньне рэлігійных і культурных патрэб.

Вялікія словы. Пад гэтым сьцягам шчасьце жыць і змагацца і пачэсна паміраць.

Ў трэція гадавіны вялікага народнага сьвяткаваньня Беларуская Рада і выканаўчая ўлада ў асобе Рады Міністраў не да сьмерці клічуць вас, грамадзяне, а да жыцьця і змаганьня за сьвятые ідэалы, пакінутые ў спадчыну нам вялікімі змагарамі за шчасьця і свабоду Беларускага Народу.

Грамадзяне! Мы цьвёрда верым, што ў гэты вялікі дзень на ўсей зямлі кождае чэснае беларускае сэрца б'ецца разам з намі і разам з намі клічэ:

Слава Беларускай Народнай Рэспубліцы! Ніхай жыве Беларуская Незалежнасць!

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі.

582.1.11:081-083 — мк бел
582.2.12:050,028-029 — м для друкарні бел
582.1.11:084-086 — мк рас
582.2.12:086-087 — д бел/жыд
582.1.37:004r-005 — д бел/жыд

2689. «Усяму культурнаму сьвету». Пратэст Ураду БНР за 25.03.1921 у справе падпісаньня Міравой умовы паміж Польшчай і Расеяй 18.03.1921 у Рызе

Усяму культурнаму сьвету.

У Рызе 18 сакавіка 1921 году учынен цяжкі праступак Урадамі Польскай і Савецка-Расейскай Рэспублікамі супроць 16 мільонным насяленьнем Беларусі.

Гэты ганебны праступак носіць названьне Міравой умовы паміж польскай дэмакратычнай Рэспублікай і Расейскай Савецкай Рэспублікай.

Польшча і Расея не маючы паміж сабою супольных граніц тры гады ваевалі на тэрыторыі Беларускай Рэспублікі: палілі, руйнавалі, грабілі і мучылі насяленьне, а урэшце завяршаючы безканечны рад сваіх безправій раздзерлі жывое цела Беларускага народу на двое. Польшча заграбіла заходніе, а Расея усходніе беларускіе землі.

Рыжскі Польска-Бальшэвіцкі мір гэта кашмарная насьмешка над дэмакрацыей і яе ідэаламі.

Імя яму насільле і грабеж.

Урад Б.Н.Р. імянем Беларускага народу заносіць самы гарачы пратэст перад усімі культурнымі дзяржавамі і народамі сьвету, шукаючы заступніцтва і справядлівасьці

і заяуляе:

1) Мір разрываючый на часці жывы організм Беларусі ніколі ня будзе прызнаны Беларускім народам.

2) Супроць гвалту і паняволеньня Беларускі народ бароуся і будзе бароцца да канца за сваю незалежнасьць і непадзельнасьць.

УРАД БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ.

25 сакавіка 1921 году.

582.1.06:026 — шк бел
582.1.06:078 — шк бел
582.1.07:001 — шк бел
582.1.07:002 — шк бел
582.1.11:076 — шк бел
582.1.19:003 — шк фра
582.1.20:021 — шк фра
582.2.51:138 — шк бел

2690. Дэкларацыя Ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі з прычыны трэцяй гадавіны абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі за 25.03.1921

Дэкларацыя.
Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі з прычыны трэцьцяй гадаўщчыны абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі.

Дзень 25 сакавіка — нацыянальнае сьвята Беларусі.

Тры гады таму назад у сталіцы Беларусі Менску, Беларуская Дзяржаўная Рада, выпаўняючы пастановы Ўсебеларускага Зьезду і баронючы Беларусь ад падзелу, абвесьціла наш край Дзяржавай вольнай і ад нікога незалежнай.

Гэтай граматай былі паложаны галоўныя падваліны Дзяржаўнага бытаваньня Беларусі:

а) што яна зьяўляецца Дзяржавай працоўных мас Беларускай Народнай Рэспублікі і што граніцы яе абхопліваюць усе тыя землі дзе ёсьць лічэбная перавага беларускага народу.

в) што у гэтай народнай дзяржаве ўся зямля павінна належыць працоўнаму селянству як стану, на які дзяржава апіраецца.

с) што ўсім нацыянальным меншасьцям Беларуская Народная Рэспубліка забаспечае ўсе грамадзянскія свабоды, поўнае роўнапраў'е перад законам і культурна-нацыянальную аўтаномію.

д) што моцны парадак дзяржаўнага жыцьця Беларусі ва ўсіх галінах зацьвердзіць яе галоўны гаспадар —Устаноўчы Збор.

З таго дня і дагэтуль Урад Б.Н.Р., разам з старшынамі Дзяржаўнай Рады, як адзінная нацыянальная ўлада Беларусі, не пакідаў змагацца за правы свайго народу, вылажэныя ў гэтых пастановах.

Тры гады мінуло ўжо ў безупыннай барацьбе. За гэты час на нашай зямлі гаспадарылі і госпадараць варожыя сілы. Пераходзячы з краю ў край нашу Маці-Беларусь чужацкія войскі палілі вёскі, руйнавалі гарады, пакідаючы за сабой голад і сьмерць.

С 1915 году мы ня можам адпачыць ад страшных жахаў вайны, ня можам пачаць спакойную, творчую працу. Зямля наша зруйнавана і дыміцца ад пралітай на ей крыві. Ва ўсім жыцьці цяжкі занепад.

Але моцна трымае Рэвалюцыйны Беларускі Урад у сваіх руках сьцяг незалежнасьці і непаддзельнасьці роднага краю.

Пад гэтым сцягам абъедналіся лепшыя сыны Беларусі, за гэты сьцяг аддалі яны сваё жыцьцё за волю народу гноящца яны ў концэнтрацыйных лагерох і турмах бальшавіцкіх і польскіх.

З гэтым сцягам прэдстаўнікі Ураду ішлі заграніцу і голасна пратэставалі перад Урадамі сьвету і перад міліённым працоўным народам Эўропы супроць зьдзеку і гвалтаў чужакоў у родным краю.

Усюды дзе толькі білося сэрцэ сыноў Беларусі, ва ўсе куткі Беларусі Урад пасылаў слова надзеі, загады барацьбы за сваю праўду.

І цяпер у дзень нашага нацыянальнага сьвята ў дзень 25 сакавіка 1921 г. перабываючы часова на тэрыторыі братняга нам літоўскага народу, мы клічам да цябе, Беларускі Народзе; і разам з табой да ўсіх народаў, якія жывуць на Беларусі.

Ня вер чужынцам, што твая доля ужо вырашана. Раней дзялілі нас фронтамі, цяпер улажылі граніцу, якой хочуць замацаваць разрыў твайго жывога цела.

Ня будзе гэтага.

Хочуць тваю зямлю замацаваць за польскімі панамі і маскоўскай камунай.

Ня будзе гэтага.

Хочуць насяліць да нас чужакоў, аддаўшы ім твае родныя полі, за якія ўміралі твае прадзяды, і якія абліты тваей крывёю і потам.

Ня будзе гэтага.

Жыла Беларусь і будзе жыць.

За папаленые будынкі, за рэквіраванае і паграблене дабро, павінна быць заплочэна.

Пад сьцягам Б.Н.Р., па загаду свайго ураду бійся за вольную і незалежную Беларусь, за яе непадзельнасць, за сваю зямлю і волю. Добра ведай, што ў барацьбе тваей разарвецца ярмо, якоя накідаюць чужакі на тваю галаву, згінуць граніцы, якімі хочуць падзяліць бацькоў ад сыноў, дзяцей ад маці. Недалёк ужо той дзень, калі ты вольны загаспадарыш у сваей вольнай дзяржаве.

Слава тым, хто загінуў у барацьбе за Бацькаўшчыну.

Чэсць усім тым, хто праліваў і пралівае кроў сваю за правы народу, за тых, хто ў ланцугох і за рашоткай ненавідных астрогаў.

Ніхай жыве беларуская рэвалюцыя!

Ніхай жыве працоўны беларускі народ

Ніхай жыве яго вольная дзяржава — Беларуская Народная Рэспубліка.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі.

582.1.16:004 — д
582.2.12:023 — д
582.2.12:013-015 - м для друкарні
582.1.45:163-167 — рукапісны чарнавік В.Ластоўскага

2691. Ліст Дамініка Сямашкі (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.03.1921 зь віншаваньнем з нагоды 25 сакавіка

582.1.45:138

2692. «Беларускія жыды яшчэ за вамі слово і праца». Зварот Сялянскага Саюзу (? пасьля 25.03.1921)

БЕЛАРУСКІЯ ЖЫДЫ ЯШЧЭ ЗА ВАМІ СЛОВО І ПРАЦА.

Ня было і німа яшчэ такой нацыі, якая б падобна да жыдоускай, гвалтам выкінутай з роднай зямлі і праследуемай з веку у век усемі дзяржавамі сьвету — якая б здалела так моцна захаваць сваю нацыянальнасьць, так дружно бараніць сваі звычаі, ралігію і мову.

Праз дзесяткі дзержау і народау прайшлі вы, жыды.

Дзесяткі рожных мов прасачылось праз вашую мову, з дзесяткамі рэлігій і звычаеу стыкалась ваша рэлігія і вашы звычаі.

Але вы, сыны Ізраіля, нават у самых цяжкіх варунках, як ніхто, захавалі у чыстаце сваю нацыянальнасьць, вы збераглі вашу старадаунюю мову, вы не згубілі сваей рэлігіі і да гэтага часу захавалі сваі родныя, яшчэ з Палестіны вынесеныя звычаі.

Увесь тысячегадовы цяжкі шлях вашага народу паліты бэзвіннымі сьлезамі і кроую.

Ня было ніводнай дзержавы, якая б вашых прадзядау, дзядоу і вас не выганяла, не прыгнетала, не прасьледывала, не здзекавалась над самым сьвятым што было і есьць у вас.

Мінуушая гісторыя вашага народу, уся перапоунена бэзвіннымі мукамі і крывей.

Сучасная гісторыя ваша — так сама тоне у бэзвіннай крыві сыноу вашага народу.

Нават двадцаты век, век вялікіх тэхнічных изобретеній (открытій), век вялікіх навуковых шчыр (истин), век сьветлых палітычных тэорый, — гэтая зара соціялізму і інтэрнаціоналізму ..... і нават гэты век не прынес вашаму народу супакою, не дау вам адпачынку ад крыві .....

Пагромы учыняюцца над вамі не толькі у чужых странах, а нават і у роднай вам старонцэ — у Палестыне.

Мала есць дзяржау дзе б жыды у поунай меры карысталісь усімі грамадскімі і палітычнымі правамі.

Толькі адна есць дзяржава у якой жыды прызнаны супольнай дзяржаунай нацыей — Гэта Беларуская Народная Рэспубліка.

25 га сакавіка 1921 году Урад Беларускай Народнай Рэспублікі у сваей дэкларацыей, зноу падцвержаючы сувэрэннасьць нацый беларускай і жыдоускай і поунае абьеднаньне у адзін дзяржауны Беларускі Народ, — кажэ:

«Не сам адзін быу Беларускі Народ у сваім змаганьні.

Пабачь яго цярпеу і бароуся другі Народ — пракавечны мучынік Народ Жыдоускі — з незапамятных часоу паліваушы землю беларускую сваім потам сьлезамі і крывей.

Бязьмерны — быу глум панявольнікау над верай і жыцьцем сыноу Ізраіля.

Самодзержауе Маскоускае мяркавала, што яно у крыві жыдоускай патопіць народны гнеу, які не адзін раз парываўся разбурыць тыранскую уладу, — шляхта польская шчыра памагала свайму-ж кату распаляць інстынкты разбэшчанай чэрні.

Жыдоускі народ зразумеу ясна, што яму німа чаго чакаць ласкавасьці ад сваіх панявольнікаў, — што тол[ь]кі у змаганьні жыды дабудуць правы не жыцьце і свабоду.

Уразумеушы гэта жыды падалі прыязную руку свайму брату па нешчасьцю — Народу Беларускаму, дзеля супольнага змаганьня за Незалежнасьць.»

Жыды беларускія. Ваш многавековы досьлед (опыт) змаганьня за сваю нацыянальнасьць, вашу трываласьць (стойкасьць) у абароне сваяго народу ад рожных прыгнетчыкоу, вы павінны выказаць цяпер памагаючы здабываць незалежнасьць беларускага, а разам і жыдоускага народу.

У незалежнай Беларускай Рэспубліцэ вы знайдзеце адпачынак ад незноснага здз[е]ку над вамі.

У незалежнай дзержаве беларускай, кожны сын вашага народу знайдзе аброну яго прау і шчырую прыхільнасьць і дапамогу у часе бяд[ы].

Успомніце толькі, што беларускі народ ніколі не крыудзіу вас і шчыра йдзіце яму на памошч. Словам і працай дапамагайце хучэй дасягнуць нашай агульнай незалежнасьці.

Пашырайце беларускую сьвядомасьць, пашырайце рух беларускі, пашырайце змаганьне з польскім засільлем, дапамагайце беларускім каапэратывам і уселякім грамадскім арганізацыям.

Жыды беларускіе, вашаго слова і працы чэкае беларускі народ ....

(Селянскі саюз.)

582.1.37:001-002 — мк праект

Дакладная дата невядомая.

2693. Ліст Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.03.1921

26.III.21.
Дзьвінск.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

сенека напісаў я стацьцю аб польскай агітацыі ў Латгаліі і паслаў яе ў Коўну да Лурье с дзьвюма просьбамі:

а, каб ён цалком, або часткай зьмясьціў яе ў бюлліценях и

б, каб ён загадаў ў сваей шапіраграфіі надрукаваць цалком экземпляраў 30 гэтай стацьці і, паслаўшы сюды мне штук 20, якія тутака вельмі патрэбны, рэшту распредзеліў бы паміж беларускімі дзеячамі і літоўскай і расейскай прэссай, як ў Коўні, гэтак і ў іншых мейсцовасьцях.

Справы пасоўваюцца добра, але не хачу папярэжваць здарэньнеў і таму — нічога не пішу. Прашу, вельмі прашу, толькі аб адным: спішыцеся з Вільняй, каб тамака былі гатовы прыслаць двух лектараў на курсы беларусазнаўства і падгатовілі падручнікаў і бібліятэчак на 15-20 школак. За ўсе гэты рэчы будзе заплачана. Папярэжываю, што разгалошываць і

рэклямаваць гэту справу — шкодна, бо паляки павядуць чорт-ведае якую агітацыю і могуць спужаць гаспадароў.

Калі есьць навіны — не адмоўце паінфармаваць.

Прывет усім. Хай не злуюць, што не пішу — страшэнна заняты.

Бывайце здаровы!

З вялікай пашанай К.Езавітаў.

582.1.45:156

2694. Плян дзейнасьці Балтыйскага Прэс-Бюро (М.Каган, І.Лур'е. Коўна, 26.03.1921)

582.2.12:026 — ма

582.2.12:027 — мк

2695. Загаловак справы 582.1.45

[Загалоўлена В.Ластоўскім:]

Асабістые дакумэнты і перапіска

«Ня вер нікому ня бойся нікога»

Нар. прыказка

582.1.45:тытульны аркуш

Дата невядомая.

2696. Візытоўка Мікаласа Сьляжавічуса

Mykolas Sleževičius

Dr. Juris

Membre de l'Assemblée Constituante de la Lituanie

Vilnius

582.1.71:032

582.1.71:034

582.1.71:049[1]

---

[1] З датай: 27.III.1921 г.

2697. Візытоўка Яўгена Кургановіча

Евгеній Валеріановичъ Кургановичъ

Инженеръ Путей Сообщенія

582.1.71:051[1]

---

[1] З датай: 27.III.1921 г.

2698. Візытоўка Усевалада Боева

Усевалад Мікалаевіч Боеў

Прысяжны адвакат

г. Коўна

[На адвароце:]

Vsevolodas Bojevas

Prisiekusis advokatas

582.1.71:052[1]

---

[1] З датай: 27.III.1921 г.

2699. Даклад Ураду БНР аб палітычным стане Беларусі за 29.03.1921, падрыхтаваны для Ўраду Літвы

29.III.21.

Господину Министру Иностранныхъ Дѣлъ
Литовской Республики

Въ цѣляхъ взаимнаго освѣдомленія и укрѣпленія дружественныхъ связей между Литвой и Бѣлоруссіей Правительство Б.Н.Р. имѣетъ честь представить Вамъ, Господинъ Министръ, слѣдующія соображенія относительно политическаго состоянія Бѣлоруссіи и указать на рядъ конкретныхъ мѣръ, осуществленіе которыхъ со стороны Литовскаго Правительства представлялось бы крайне желательнымъ.

I. Положеніе на Бѣлоруссіи.

Послѣднія извѣстія изъ Бѣлоруссіи, полученныя Правительствомъ Б.Н.Р. непосредственно съ мѣстъ благодаря партійной связи свидѣтельствуютъ, что ростъ національно-государственнаго сознанія въ бѣлорусскихъ массахъ за истекшій годъ чрезвычайно усилился. Этому росту способствовала какъ непрекращающаяся пропаганда бѣлорусскихъ партій, стоящихъ на платформѣ демократической государственности, такъ и факты текущей жизни: формированіе бѣлорусской красной арміи на основѣ территоріально-національной, которое предприняла большевистская власть послѣ занятія Минска, созывъ Центральнаго Совѣта Бѣлоруссіи и образованіе особаго краснаго бѣлорусскаго правительства. Борьба съ Польшей, которую вели подъ лозунгами защиты единства бѣлорусскихъ земель, Рижскій миръ признавшій независимость Бѣлоруссіи и въ то же время подвергшій ее раздѣлу и т.д.

Всѣ эти факты развиваютъ въ народѣ сознаніе своей особности, отдѣльности отъ остальной центральной Россіи противополагая ее одновременно Москвѣ и Варшавѣ и служили прекраснымъ орудіемъ бѣлорусскихъ организацій, число коихъ въ настоящее время исчисляется сотнями на губернію для пропаганды борьбы за независимость и недѣлимость. Этой пропагандѣ способствовали также всѣ отрицательныя стороны совѣтскаго хозяйничанія на Бѣлоруссіи въ земельномъ вопросѣ, обѣднѣніе городовъ, являющихся до сих пор руссификаторскими центрами, увеличеніе значенія бѣлорусской деревни, разрушеніе транспорта, слабая связь съ провинціей бѣлорусской, разрушеніе стараго порядка жизни, управлявшагося изъ Москвы и необходимость созданія новыхъ формъ и условій политическаго существованія и т.п. Характернымъ проявленіемъ силы бѣлорусскаго движенія является переходъ всѣхъ группъ стоявшихъ ранѣе на платформѣ россійскихъ с.-р-овъ (какъ напримѣръ группы Ярошевича и другихъ) на платформу государственной независимости Бѣлоруссіи.

Еще в бытность свою въ Минскѣ Правительство Б.Н.Р. дало кличъ всѣмъ группамъ обратить особое вниманіе на экономическую сторону борьбы съ большевиками и какъ на одинъ изъ способовъ — руководство бѣлорусской кооперацією. Согласно своевременнымъ донесеніямъ съ

мѣстъ было установлено, что въ 1920 году рѣшительно все кооперативное движеніе на Бѣлоруссіи оказалось въ рукахъ бѣлорусскихъ дѣятелей. Вмѣстѣ съ политическими партіями кооперативы въ настоящее время руководятъ движеніемъ на Бѣлоруссіи, занятой большевиками. Движеніе нынѣ выливается въ формы вооруженной борьбы, непрерывныхъ возстаній противъ насильственной власти, въ формѣ глухого но чрезвычайно упорнаго противодѣйствія всѣмъ ея распоряженіямъ. Независимо извѣстнаго возстанія десяти тысячъ крестьянъ въ Слуцкомъ, Игуменскомъ, Бобруйскомъ уѣздах, результатомъ чего было установленіе власти комиссаровъ Правительства Б.Н.Р. въ продолженіи полутора мѣсяца, за истекшее время было возстаніе призывныхъ въ Смоленскѣ[1], возстаніе Минскаго гарнизона (послѣ бурнаго митинга въ городскомъ театрѣ)[2], крупные безпорядки на почвѣ реквизицій и мобилизацій въ Оршанскомъ, Борисовскомъ и Гомельском уѣздахъ. Кромѣ этихъ чисто стихійныхъ проявленій народнаго недовольства въ губерніяхъ Витебской и Могилевской до послѣдняго времени дѣйствуютъ организованные повстанческіе партизанскіе отряды, имена предводителей которыхъ Бѣлорусскому Правительству извѣстны и которые находятся въ связи съ его политическими комиссарами.

Самые послѣдніе извѣстія говорят о том, что совѣтская власть предприняла форменный поход против основной бѣлорусссской партіи — бѣлорусских с.р. Вмѣстѣ с арестом Центральнаго Комитета партіи (во главѣ с командированным в Минск из Ковно Секретарем Рады Республики Я.Мамонько), аресту подверглись почти всѣ провинціальные комитеты и число арестованных активных работников достигло 1500 чел. Одновременно проявились преслѣдованія против кооперативных организацій, находящихся главным образом в руках с.р.-ских работников. Факты послѣдних дней говорят о том, что бѣлорусское движеніе является для большевисткаго господства грозным явленіем и что в связи с общим революціонным движеніем в Россіи и оно может оказаться для Совѣтской власти роковым. Занятія Минска бѣлорусскими повстанческими силами[3] — является одним из этапов этого движенія.

II. Состояніе бѣлорусскаго дѣла под польской оккупаціей.

Во время пребыванія делегаціи Бѣлорусскаго Правительства в Ригѣ при польско-русских переговорах было установлено, что полонофильская группа бѣлорусских работников раздѣляет точку зрѣнія польскаго правительства об организаціи трех-кантональной федераціи[4]. Нѣкот[о]рыя лица из этой группы были посвящены в план захвата Вильно и шли на полное сотрудничество с ген. Желиговским. На состоявшемся послѣ занятія Вильно засѣданіи бѣлорусских организацій города Вильно были сдѣланы лицами, пріѣхавшими непосредственно из Варшавы, доклады о необходимости поддерживать авантюру этого генерала в надеждѣ получить солидныя политическія уступки. Почва для тѣснаго сотрудничества была подготовлена в Варшавѣ и Лодзи. Бѣлорусское Правительство учло всю опасность такой тактики и приняло ряд мѣр по отношенію к намѣчавшемуся соглашенію. Послѣ подписанія нашего соглашенія с Литовским

Правительством борьба с польской оріентаціей в бѣлорусскіх партіях сразу пошла успѣшно, что выразилось в перемѣнѣ позиціи в вопросах предполагавшего[ся] плебисцита и созыва Виленскаго Сейма.

Ка[к] в средѣ бѣлорусских организацій под польской оккупаціей, так и в средѣ бѣлорусскаго населенія Гродне[н]шчины и Виленщины къ началу текущаго года укрѣпляется сознаніе, что имперіалистическія стремленія Польши противорѣчат бѣлорусскому государственному строительству и что обещанія національно-культурной автономіи не могут разрѣшить основных проблем жизни бѣлорусскаго народа, главным образом проблемы земельной.

Тѣм не менѣе польское правительство не только не думает об отказѣ от захвата Бѣлоруссіи и Литвы, но и все болѣе убѣждается в огромности своих интересов здѣсь. Правительство Б.Н.Р. имѣет опредѣленныя данныя, что вниманіе польскаго правительства в отношеніи Бѣлорусскаго движенія не только не ослабляется, но увеличивается. Заявленія польской печати даже столь реакціонной как «Рѣчь Посполита», удостовѣряют, что польская политика стремится ввести бѣлорусское движеніе в польское русло. Для этого первым способом должны служить бѣлорусскія національныя формированія, выпуски юнкеров, организація краткосрочных курсов инструкторов и т.п. Центром этой работы является, как извѣстно, Лодзь, гдѣ бѣлорусская войсковая комиссія не прекращает своей дѣятельности[5]. В случаѣ заключенія мира с большевиками Польша перечислит всѣ эти формированія, происходящіе под флагом «Бѣлорусской Народной Республики» в число своей арміи под наименованіем «бѣлорусских территоріальных войск». Ту же участь раздѣляют отряды Балаховича, среди которых пропагандируется желаніе перейти под непосредственное польское командованіе. Роль россійской группы Савинкова, Филосовова и Перемыкина и др. в этом вопросѣ еще не выяснена, но противодѣйствовать этим планам захвата всего бѣлорусскаго в польскую государственную систему они едвали пожелают, а в случаѣ пожелают, то не будут имѣть возможности противодѣйствовать. Единственным реальным противодѣйствіем этим планам была бы передача бѣлорусских формированій под иностранное командованіе; с этой цѣлью представлялось бы желательным начать соотвѣтствующую работу в Парижѣ, гдѣ почва для такого рѣшенія довольно благопріятная. Первым шагом должно было бы явиться назначеніе при миссіи ген. Несселя[6] представителя правительства Б.Н.Р.

Что касается положенія бѣлорусскаго населенія под польской оккупаціей, то оно общеизвѣстно: хотя жизнь здѣсь не так разрушена, как в Совѣтской Бѣлоруссіи, тѣм не менѣе народ страдает от всякаго рода гоненій, насилій и хищнических поборов не менѣе чѣм в Минской и Могилевской губ. Ведется жесточайшая полонизаторская политика, воздвигнут террор против всего, что называет себя бѣлорусским. В деревнях за одно признаніе себя бѣлоруссом арестовывают и ссылают в концентраціонные лагеря. Большенство гроденских національных организацій разрушено во главѣ с Гродненским Комитетом несмотря на их лойяльную ра-

боту только за то, что была установлена связь его с правительством Б.Н.Р. В Вильнѣ разгромлен бѣлорусскій клуб, хотя преслѣдованія в самой Вильнѣ не так бросаются в глаза. По данным Правительства в лагерях Домбѣ и др. томится нѣсколько тысяч бѣлорусских работников. Вслѣдствіе невыясненности отношеній между польским и бѣлорусским правительством, послѣднее не может предпринять ничего, что могло бы облегчить участь его граждан, находящихся в польских тюрмах.

III. Международное положеніе бѣлорусскаго вопроса.

До тѣх пор пока Правительство Б.Н.Р. будет находиться внѣ предѣлов Бѣлоруссіи, его международное положеніе нельзя назвать удовлетворительным. Поэтому свое главное вниманіе Бѣлорусское Правительство обращает не на заграницу, а на родныя поля. Будущее Бѣлоруссіи рѣшится только силою самого народа и на его полях. Тѣм не менѣе роль держав в строительствѣ бѣлорусской государственности весьма значительна. Об этом свидѣтельствует роль Лиги Націй в борьбе Литвы и Польши за территорію.

Спор польско-литовскій представляется в значительной мѣрѣ спором о судьбѣ Гродненской и бѣлорусской части Виленской губерій. Правительство Б.Н.Р. не может быть равнодушно к судьбѣ этих земель. Самой желательной формой их устройства является передача их законному бѣлорусскому правительству. Поскольку это в данный момент трудно реализовать, постольку Правительство Б.Н.Р. заинтересовано в разрѣшеніи литовско-польскаго спора.

Как было офиціально заявлено в меморандумѣ на имя Лиги Націй в Женевѣ 16-18 декабря 1920 года, для бѣлорусскаго населенія этих губерній представляется несравнено болѣе [желательнымъ?] войти на договорных началах в состав Литовской Республики, чѣм быть захваченным Польшей. Бѣлорусское Правительство не может ни в коем случаѣ согласиться с тѣм, чтобы какая либо часть бѣлорусской территоріи сдѣлалась предметом эксплоатаціи малопроизводительнаго польскаго капитала, чтобы бѣлорусское сырье стало источником обогащенія разоренной польской казны, чтобы бѣлорусское крестьянство, угнетенное національно и экономически увеличивало ряды польской арміи.

К сожалѣнію, предполагавшійся опрос населеія в формѣ плебисцита, отмѣнен. Правительство Б.Н.Р. разсматривает это рѣшеніе как безусловное пораженіе принципа самоопредѣленія народов, пораженіе чрезвычайно невыгодно отражающееся на международном положеніи бѣлорусскаго вопроса. Нынѣ судьбу его в указанных губерніях будут рѣшать постороннія правительства — литовское и польское. В виду того, что польское правительство своими связями и положеніем в ряду великих держав сильнѣе Правительства Литвы, представляется весьма опасным как бы разрѣшеніе территоріальнаго спора не оказалось в пользу Польши.

Будучи, как указано выше, заинтересовано в объединеніи бѣлорусских земель Гродненщины и Виленщины с Литовской Республикой, Правительство Б.Н.Р. рѣшило послать на предстоящую конференцію в Брюсселѣ свою полномочную делегацію для обоснованія разумности и неизбѣж-

ности государственнаго сотрудничесва бѣлорусскаго народа с народом литовским. С этой же цѣлью начата работа среди всѣх россійских партій и групп. Послѣ предварительных переговоров установлено, что почти всѣ представители россійской государственности раздѣляют точку зрѣнія бѣлорусскаго правительства и готовы его поддержать против Польши. На эту позицію стал и Комитет членов Учредительнаго собранія в Парижѣ. Здоровое строительство Бѣлоруссіи при содѣйствіи Литвы, как первоначальной базы, является нынѣ единственным противовѣсом планам Польши на востокѣ.

IV. Конкретныя пожеланія.

Однако вести борьбу с польскими имперіалистичесими планами Правительству Б.Н.Р. очень трудно. Эта борьба требует в первую очередь необходимых матеріальных средств, а затѣм опредѣленной политической поддержки. Бѣлорусское Правительство в правѣ считать, что Правительство Литовской Республики пойдет ему въ обоих отношеніях навстрѣчу. Представлялось бы в настоящій момент чрезвычайно желательным:

а) поддержать спеціальной нотой на имя Совѣта Лиги Націй или каким либо другим образом, заявленіе Правительства Б.Н.Р. о допущеніи его делегаціи на брюссельскую конференцію.

в) польское правительство располагает очень важным преимуществом: в руках его находятся бѣлорусскія военныя формированія. Бѣлорусское Правительство убѣждено, что всѣ тѣ силы, которыя имѣются в Польшѣ и составляют бѣлорусское войско, с большей охотой вступили бы в ряды бѣлорусских формированій, если бы они в соотвѣтственном масштабѣ развернулись бы в Литвѣ. Необходимо, чтобы Литовское Правительство поставило имѣющіеся бѣлорусскіе части в строго демократическія у[с]ловія, дало бы их в руки бѣлорусской коллегіи, а не случайной группы лиц, заинтересованных только в полученіи пайка. Необходимо, чтобы было создано на первое время хоть и небольшая, но в національнополитическом смыслѣ сознательная военная часть. Нужно сознаться, что благодаря наличію бѣлорусских формированій, Польша имѣет много шансов на вліяніе в бѣлорусском движеніи. Туда привлекаются лица, предпочитающіе реальную работу политическим разговорам. Благодаря этим формированіям создается прочная связь с бѣлорусским повстанческим движеніем, которое Польша всегда стремится использовать в своих цѣлях. В средѣ бѣлорусских офицеров и солдат стараются укрѣпить симпатіи к Польшѣ как таковой. В случаѣ крупнаго движенія на Бѣлоруссіи или паденія большевитской власти , Польша в лицѣ хотя бы одного бѣлорусскаго полка, всегда будет господином положенія и предупредит переѣзд Правительства Б.Н.Р. на собственную территорію созданіем полонофильствующаго правительства. Значеніе этих вліяній Бѣлорусское Правительство, конечно, не преувеличивает, но и не преуменьшает.

Поэтому оно обращает вниманіе дружественнаго Литовскаго Правительства на крайнюю необходимость бѣлорусских формированій в составѣ литовской арміи, если пока невозможно созданіе бѣлорусскаго войска, как силы Правительства Б.Н.Р.

с) Исключительно же важным в данный момент является наличность матеріальных средств. Литовскому Правительству хорошо извѣстно, что этими средствами Правительство Б.Н.Р. не обладает. Вести работу при такихъ условіях представляется совершенно невозможным. То, чего можно было бы при нормальныхъ средствах достигнуть в теченіи недѣли, на это приходится тратить мѣсяцы. Не только развивать свою дѣятельность, но даже поддерживать то, что было сдѣлано в предыдущіе годы, становится все труднѣе и труднѣе. Событія требуют от Правительства Б.Н.Р. [...?] за невозможностью оплачивать их труд. Масса сознательныхъ сил и масса драгоцѣннаго времени пропадает зря — все из-за отсутствія средств. В особенности скверныя послѣдствія имѣет это обстоятельство в отношеніи бѣлорусскаго дѣла под польской оккупаціей. Никто не может там положиться на помощь бѣлорусскаго правительства, ибо у него нѣт денежных средств. Ни один арестованый за бѣлорусскую агитацію также не может расчитывать на самую скромную поддержку. То обстоятельство, что Правительство Б.Н.Р. не располагает средствами, что оно безденежно ни в коем случаѣ не может служить фактором, укрѣпляющим его значеніе в глазах населенія, сравнительно с силой и вліяніем польской власти. То же относится и к бѣлорусским партіям, работающим под большевитской оккупаціей.

Извѣстіе о заключеніи дружественнаго договора между Бѣлоруссіей и Литвой и обѣщаніе поддержки Бѣлоруссіи, выраженное в этом договорѣ, вызвало во всѣх уголках, гдѣ есть сознательныя бѣлорусскія силы, чувство живой радости, подъем, укрѣпленіе в благополучный исход борьбы с полонизмом при дѣятельной поддержкѣ братской Литвы. К сожалѣнію, надежды эти и подъем начинают падать, ибо дѣло поддержки затягивается.

Правительство Б.Н.Р. убѣдительно просит Литовское Правительство обратить серьезное вниманіе на эту сторону дѣла. Если Литовское Правительство искренне желает поддержать Бѣлоруссію в дѣлѣ ея возрожденія, то необходима скорая и достаточная поддержка. Настоящая весна может принести в Россіи самыя неожиданныя осложненія и Бѣлорусское Правительство должно быть к ним готово. Только при этом условіи оно может укрѣпить свое вліяніе и власть на Бѣлоруссіи и не позволить вражеским силам, в первую очередь Польшѣ растроить дружественное единеніе бѣлорусскаго и литовскаго народов.

д) Если бы это представлялось возможным, Правительство Б.Н.Р. усиленно ходатайствует об освобожденіи из кон[7]

582.1.18:001-009

[1, 2, 3] Падрабязнасьцяў гэтых падзеяў выявіць не ўдалося. [4] Маецца на ўвазе «фэдэралістычная» канцэпцыя Пілсудзкага: «адраджэньне» гістарычнай Літвы ў складзе трох кантонаў з цэнтрамі ў Менску, Вільні й Коўне (зь перавагай адпаведна беларускага, польскага й літоўскага культурна-палітычных кампанэнтаў) у цеснай лучнасьці з польскай дзяржавай. [5] Беларуская Вайсковая Камісія працавала ў Лодзі ад 3.10.1920 да 15.05.1921. [6] Генэрал Анры Нісэль — кіраўнік французкай вайсковай місіі ў Коўне. [7] На гэтым дакумэнт абрываецца.

2700. Сьпіс мэмарыялаў і нот, датычных Рыжскага міру і Балтыцкай канфэрэнцыі, размножаных на шапірографе у 45 экз.

582.1.11:125

Дата невядомая.

2701. Сьпіс дакумэнтаў і матэрыялаў у адз. зах. №7

582.1.07:066&r

Дата невядомая.

2702. Ліст Янкі Чарапука (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.03.1921

Даражэнькі п. Власт! Мамоньку з Менска вывезлі у Бутырку. Жонка Ваша і дагэтуль сядзіць, але зараз будзе выпушчана. Паўстаньне, якія маюць нацыянальны характар многа прычыніліся да ўступак бальшэвікоў на палітычным і культурна-прасьветным грунце. Яны выдалі у апошні час адозву да ўсіх беларусаў, каб варочываліся у Менск для працы ўсе старое будзе дарована. Немаль што усіх з турм выпушчано, апрыч п. Язэпа і п. Станіславы[1].

Эугэнь[2] ужо на мейсцы. Зтуль прыбыў Лявон[3]. Сёньня адбываецца нарада у Браніслава[4] аб паразуменьні. Найвышэйшыя заўсім абанкроціліся. Аркадзь[5] скончыў кар'еру у Коопэратыве. Кузьма[6] арганізаваў Сельска-Гаспадарскі Саюз, але і ўсе ідзе благо.

Сымон Рак кажэ адно трэба рабіць за бомбы і рэвольвэры трэба узяцца. Бацько[7] арудуе яму перэдаюць нават і II адз. пры фронце. Ён парваў ўсе з Савінкавым, Гапан<овіч> таксама мае атрымаць II адз. другой арміі. Але арганізацыя вайсковая стаіць на тым самым мейсцу. Ўсе складываецца на вайну з Саветамі. З Менска паведамляюць, што Бунд (правы) паляй-цыон і расейскіе эс-эры пастанавілі Вас патрымваць (у прэсу няможна падаваць)

Мяне змушваюць справы яшэ затрымацца, калі будзе адказ ад Эўгеня, што я яму ня буду патрэбны зараз жэ выяду да Вас.

Пігулеўскі многа чаго зрабіў памылковаго што наша справа была прэдстаўляна у неналежных калерах. Баранаў і Пр<акулевіч> дабраліся счасліва ўсе прывязлі

Тут нарыхтоваецца энэргічная праца нашай грамады. Дрэннае уражэньне і некарыстные скуткі прарабляе Язэп В<аронка> сваімі лістамі...

Адносіну прэзыдыума Рады[8] уручыў усім пад распіску апрача Іваноўскаго якога няма і Луцкевіча які ня прыняў.

Бывайце

Янка

30/III-21 г.

P.S. Я навязаў зносіны з Лігай Народаў але ня час пісаць перэсылаю копію Перэсылаю Вам таксама газэт.

582.2.12:088&r-089

[1] Мамонька і Кісель-Ластоўская. [2] Ладноў. [3] Дубейкоўскі. [4] Тарашкевіча. [5] Смоліч. [6] Цярэшчанка. [7] Балаховіч. [8] Дакумэнт №2660.

2703. Ліст Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 31.03.1921

31.III.21.
Дзьвінск,
Hotel «Astoria».

Высокапаважаны
Вацлаў Юстынавіч,

атрымаў Вашэ пісьмо ад 18.III.21.

Вельмі дзякую за шчырые і цеплые словы, ў ім да мяне зьвернутые.

Ня можа быць дзьвёх думак, або двух адказаў ў паднятай Вамі справе:

— трэба ісьці да грамадзянства, хоць бы гэта была зусім сьвядомай ахвярай.

Вельмі шкадую толькі аб адным, што пісьмо Вашэ не прыйшло некалькі дзен раней, пакуль я не пачаў працы тутака.

Кідаць яе цяперыка будзе вельмі шкодна, бо не толькі затармазіць яе цяперыка, але можа дыскрэдыраваць яе і на будучыну.

Дзеля гэтага кашэтна [канэшна?] патрэбна, або мне папрацаваць тутака, ну хоць да травеня, або прыехаць каму-іншаму.

Я буду чэкаць тутака Вашага ліста, з Вашымі думкамі ў гэтай справе, а пакуль што буду працаваць далей.

Дзеля таго, што ў хуткім часе я маю на мэці выехаць, — згодна сваіх ранейшых пляноў і маршрутоў, а таксама і дзеля таго, каб з гэтага канца панюхаць, што робіцца ў нэйтральнай паласе, — ў Крэслаўку, дык вельмі прашу адрэсаваць мне пісьмо па адрэсу:

Latwija, Kreslawa, Ново-Александроўская, 6,

кв. Шакунъ — мне.

Пакэт адпраўляйце за сургучнай пэчаткай.

Страшэнна цэкаўлюся весткамі аб агульным становішчу справы, але, нажаль, ніхто нічога ня пішэ.

Шлю прывет і найлепшыя пажаданьня.

З вялікай да Вас пашанай
К.Езавітаў.

582.2.12:084-085

2704. Ад мора да мора. Машынапіс брашуры Юрыя Кучынскага (04.1921)

582.1.15:198-211 — мк
582.1.15:212-221 — мк
582.1.15:222-224 — мк

Дакладная дата невядомая.

2705. Машынапіс артыкулу К.(?) «За свободную Бѣлоруссію (Къ предстоящей конференціи въ Брюсселѣ)»

582.1.20:016-019 — мк
582.2.12:008-010,099 — мк

Дата невядомая.

2706. Граніцы Літоўскай зямлі (выпіска з кнігі «Живописное Обозрѣніе Россіи», Киркор, ст.13)

582.1.46:025 — м

Дата невядомая.

2707. Ліст Міхася Какановіча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ??.04.1921

Даражэнькі пане Ластоўскі!

Пішу вам парачку слоў. Скора Бруксэльская конфэрэнцыя. Што у Вас па гэтаму пытаньню намечаецца? Мне здаецца, што трэба было-б моцна падгатавацца да гэтай справы.

На чародным паседжаньнь Нац. Кам. трэба будзе вынесьці пастанову аб нашых адносінах да Польшчы і Сярэдняй Літвы. З прычыны гэтага хто небудзь павінен быў бы прыехаць ад Вас да нас. Лепей было-б, каб Ч<арапу>к.

Перагаворы, якія Вам ведамы, вядуцца без мяне. Цэнтр нашай палітыкі на мае зданьне не у гэтай плоскасьці. Найв. Рада — нуль. Трэба весьці сваю уласную лінію на пралом — разам з Ліцьвінамі, як бы мала яны нам ні сулілі. Усе роўна, мы возьмем свае — але толькі разам з Ліцьвінамі і проціў П<аляко>ў.

582.2.12:092

Дакладная дата невядомая.

2708. Ліст Старшыні Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі Вацлава Ластоўскага (Коўна) Руска-Славянскаму Таварыству (Нью-Ёрк) за 1.04.1921

Руска-Славянскаму Таварыству ў Нью-Ёрку

Красавіка 1

Ад імені Ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі звертаюся да Вас, Паважанае Таварыство, с просьбай памагчы грашыма на надрукаваньне патрэбных для беларускіх школ кніжак.

Не глядзя на ўселякіе перашкоды і перапоны са стараны Палякоў, якіе часта арэштовываюць нашых вучыцялёў і закрываюць школы, усё-ж такі на тэрыторыі занятай палякамі істнуе цяпер каля 500 пачатковых школ (у Віленшчыне і Горадзеншчыне), 3 гімназыі (у Вільні, Горадні і Гарадку, вілейскага павету) да 1 вучыцельская сэмінарыя (Баруны ашмянскаго павету).

Усе гэты школы ўтрымліваюцца на кошт беларускаго насяленьня. Многа пачатковых школ істнуе пакрыёма, дзеля таго, што палякі не даюць пазваленьня. І пры ўсіх труднасьцях барадзьбы за сваё нацыянальнае жыцьцё, у нас ешчэ вялікі недахват кніжак для школ. У некаторых школах на 5-10 вучнеў адна школьная кніжка, а мейсцамі справы с кніжкамі і ешчэ горэй.

Ня лепей наша культурная справа стаіць і у савецкай часці Беларусі. Праўда там аткрыта каля 5000 пачатковых школ і некалькі сярэдніх, але

кніжны голад там ешчэ вастрэйшы: часта на ўсю школу маюць усяго адзін камплект кніг, а ёсць школы, дзе дзеці вучацца саўсім бяз кніг, пішучы на досках. Тлумачыцца гэта найперш тым, што ў Савецкай Расеі наагул німа паперы і паразбіваны друкарні. Зрэшта адношэньня савецкіх уласцей да культурных патрэб беларускага народу прыхільны толькі на словах і ў газэтах, а фактычна каб нашы арганізацыі не падтрымлівалі самі сваёй культурнай справы, то з аднэй іхняй помачы трэба было-бы саўсім пазачыняць усе школы. Напрыклад на дзержаўнае савецкае беларускае выдавецтво апошнімі часамі асыгнавана аж 5 000 000 савецкіх рублёў. Перавёўшы гэты вялікіе грошы на долеры атрымаецца ўсяго... 250 доляраў. Ведама, што з такімі грошамі многа зрабіць ня можна.

Па самаму скромнаму падсчоту трэба надрукаваць для нашых школ 1000 аркушоў. Лічучы па 2500 ням. мар. (каля 38 доляроў) за аркуш друку без аплаты аўтарскіх гонорароў і кліш для ілюстрацыі, атрымаецца сумма 2 500 000 ням. марак. На аўтарскія і клішэ далічыўшы 1 500 000 атрымаецца круглая сумма ў 4 000 000 нямецкіх марак, або каля 60 000 доляроў.

Урад знаходзячыся на чужой тэрыторыі і вядучы палітычнае змаганьне за цэласць і Незалежнасць Беларусі с такімі сільнымі ворагамі, як польскі імпэрыялізм і расейскі цэнтралізм, ня можа здаволіць гэтые нашы патрэбы звертаючы ўсе свае сілы і ўсе кошты (вельмі ў дадатку кошты агранічаныя) на палітычную работу і змаганьне за лепшую будучыну. На сваё ўтрыманьне ўрад дабывае грошы праз нацыональные арганізацыі з абяднеўшаго і разбурэнаго вайной краю. Пры найлепшай ахвоце вялікіх грошэй выдаць ня можэ. Тым болей, што кнігі прыходзіцца раздаваць дзецям дарма, як гэта робяць і палякі ў нас з мэтай каб перэцягнуць дзяцей у свае школы, а значэ затрачэны капітал, можэ вярнуцца толькі ў незначнай частцы.

Калі-бы Паважанае Таварыство знайшло магчымым прыняць на сябе ўсе, або часць коштоў па выдавецтву кніг для беларускіх школ, то наша просьба да Вас перэвясьці азначэную падмогу тэлеграфна, каб скарэй можна было прыступіць да працы і каб на восень школа наша была ўжо забаспечэна кніжкамі. Грошы найлепей перэвясьці на Літоўскі Дзержаўны Банк у Коўне на імя нашаго Ўраду.

З вялікай пашанай

Старшыня Рады Народных Міністраў
Беларускай Народнай Рэспублікі
582.1.30:001 — мк

2709. Справаздача Уладзімера Пігулеўскага (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.04.1921

Грамадзяніну Старшыні Рады Н.М. Б.Н.Р.
Заўсім патаемна
1-IV-21 г.

Справаздача

У сучасны момэнт становішча беларускіх палітычных групп і агульная сытуацыя ў часткі Беларусі аккупіраванай Палякамі можэ быць абрысавана гэтакім чынам:

I Група Найвышэйшых

Цягне досыць кепскае істнаваньне як з матэрыяльнага боку, так і ў сэнсі сваёй аўтэрытэтнасьці у Палякоў. У сакавіку месяцы яны вялі пярэгаворы з Палякамі і ў звязку з гэтым См<оліча>м туды былі выкліканы Ів<аноўскі> і Гап<ановіч>. Сур'езных канкрэтных вынікаў яны ня далі, бо палякі ня толькі з імі мала лічацца, але яшчэ меньш ім давяраюць. У іх ачах здаецца вельмі нядвузначным ігнараваньне ўвесь час Вамі Найвышэйшых і Найвышэйшымі Вас. Тые вынікі якіх яны дабіліся па маючымся у мяне весткам сводзяцца к такому:

У Вільню на стала перэезжаюць ўсе яны. У Сярэдняй Літве арганізуецца Камітэт польска-беларускаго сбліжэньня на чале С<моліч> і Ів<аноўскі>. Камітэт мае вайсковую моц ў асобе Гап<ановіча> які павінен аб'еднаць пад сваім камандаваньнем ўсе беларускіе вайсковые арганізацыі на заход ад Радашковіч, ў тым ліку і вайсковую Камісію ў Лодзі, якая павінна зліквідавацца. Усяго можэ налічыцца ня больш 1.000 штыкоў. Іх помыслы зводзяцца пры магчымасьці разам з палякамі сунуцца на ўсход. Матэрыяльны бок выясніць ня удалось; вядома толькі, што Ів<аноўскі> астаўся у Варш<аве> нібытта атрымаць нейкіе грошы. Але ў ўселякім выпадку на што небудзь значнае спадзевацца ня можна. Па пытаньню аб аб'еднаньні Найвыш<эйшыя> раскалолісь на 2 группы: адна на чале са См<олічам> лічыць гэта аб'еднанье не на часе дзеля таго, што «Ласт<оўскі> звязаўся з Коўна, а гэтакім чынам сувязь з Ласт<оўскім> азначае звязь з Коўна, што ў сучасны момэнт пацягнула б за сабою поўную ліквідацыю нават ўсей нацыянальна культурнай беларускай працы, другая на чале з Р<акам>-М<іхайлоўскім> ўсецела стаіць на аб'еднаньні, гатова злажыць поўнамоцтва: нават Р<ак>-М<іхайлоўскі> сёнека мне заявіў, што апублікуе дагаворы пад якімі маецца яго подпіс.

II. Беларускі Палітычны Камітэт

Арганізацыя на чале якой стаіць Адам<овіч>, але якой фактычна кіруе Алекс<юк>. Да гэтай арганізацыі як вайсковая сіла належыць Б<улак>-Бал<аховіч>. Палітычная праца ў ёй стаіць на другім мейсцы і глаўная увага аддаецца справам вайсковым. Палякі да гэтаго часу адпускалі ім прадукты на 30.000 чэл. а цяпер выдаюць вопратку і пэнсію. Лік жоўнераў прыблізна: «Зялёны дуб» каля 10.000, іншые арганізацыі 5.000 і глаўнае ядро гэта дывізія Б<улак>-Б<алаховіча> каля 2.000 ч. Коні лікам каля 1.000 і гарматы каля 38 знаходзяцца пакуль што у Палякоў. У сучасны момэнт значная частка гэтых арганізацый ўходзіць з нарожнага боку ў польскае войска і займае фронт, афіцыяльна нясе пагранічную службу ад Радашковіч да Украіны. Асобные атрады згрупіраваны ў Слуцкам і Навагрудзкім паветах. Іх помыслы з асушкай грунту (а гэта ў раіёне Лунінца можэ наступіць ня раней як праз 3 тыдні) зводзяцца к пасуваньню ў сторану Менску і далей пад штандарам Б.Н.Р. Але для гэтаго ім прыдзецца на захвачэнай тэррыторыі стварыць трэці Урад, які магчыма будзе вясьці барацьбу і з Вамі і з Найвыш<эйшымі>. Па пытаньню аб аб'еднаньні яны гатовы ўсецела стаць на аб'еднаньне толькі з Урадам Ласт<оўскага> але ня с цяперэшнімі Найвыш<эйшымі>, але ўсе ж такі пад варункам

некаторай змены палітыкі Кабінэту бяз якой зразумела магчымасць разгрома Польшчай ўсей арганізацыі і арэшта яе членоў.

Ўсе перагаворы я тут веў неафіцыяльна з Тэр<эшчэнкам> С<молічам> Тар<ашкевічам> Р<акам>-М<іхайлоўскім> і інш. і больш-менш афіцыяльна, але саўсім канспіратыўные з Алекс<юком>. Як інфарматарамі карыстаўся Чэр<эпуком> і афіцэрамі. На мой погляд ўсе прэдстаўляецца ў такім відзе: Палякі ня адмовілісь ад думкі прагнаць больш<авікоў> за Бярэзіну, аб чым сьведчыць напр. іх тайная умова у Рызе. Так сама ім трэба затармазіць справу Віл<еншчыны> ў звязку з паражэньнем на Горн<ым> Шл<ёнску>. З гэтай мэтай ім патрэбна скарыстаць беларусоў і папутна інсцэніраваць бунт некаторых польскіх войск. Па маючымся ў мяне весткам ў Вільні да гэтаго ужо прыгатаваны 2 паўка пяхоты і Кавал. дівізія Домбровскаго, апрача таго робіцца арганізацыя і групіроўка афіцэраў і жоўнераў, выхадцаў з мяйсцовасьцяў[1]

582.2.12:052&r

[1] На гэтым дакумэнт абрываецца.

2710. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму і Пятру Крэчэўскаму (Коўна) за 2(?).04.1921

Паважаные Таварышы! п. Вацлаве і Петра Антон.!

1) Формальнасьць вымагае, каб спытацца Мін. Йургутіса — ці можна надрукаваць ў журнале фотаграфію з апошней страніцы дагавору. Вы аб гэтым забылі, а таму якнайхутчэй даведайцеся і дайце тэлеграму. Першы №[1] ужо гатоў да друку. Працы — страшна многа. Астаноўка — за грашмі.

2, Ні Сам<уіл> Іосиф<авіч>[2], ні Чэрэпук, ні інш. — ніхто не прыслал нічога. Атрымаў толькі артыкул Петра Ант<онавіча>[3], якій скарыстаю ў №2. Так працаваць нельга!

3, Прашу выслаць апошнія №№ «Эхо»[4].

4, Калі хто будзе ехаць у Бэрлін — надта прашу прывесьці мне 3 фунта тварагу — сьвежага!! Пачастую пасхай! і адзін фунт сьвежага масла!

5) Больш нічога! Бывайце здаровы! Добра было-б, каб прывязлі дзеравяную форму для пасхі.

Ваш АлЦвікевіч

582.1.25:071&r

Дакладная дата невядомая. На блянку-паштоўцы: «Выдавецкае Таварыства Вызваленьне (Менск—Вільня—Бэрлін)». [1] Маецца на ўвазе часапіс «Беларускі Сьцяг». Першы нумар удалося выдаць толькі праз год (красавік-травень 1922 году). [2] Жытлоўскі, ад сакавіка 1921 году — міністар у справах нацыянальных меншасьцяў БНР. [3] Крэчэўскі. [4] Ковенская расейскамоўная газэта.

2711. Зварот Ураду БНР за 6.04.1921 (вых. №362), пададзены на літоўска-польскую канфэрэнцыю ў Брусэлі на ймя старшыні канфэрэнцыі Поля Іманса

Беларуская Народная Рэспубліка

Рада Народных Міністрау

République Démocratique
Blanche-Ruthénienne
La Conceil des Ministres.
Le 6 Avril 1921
№ 362
Kovno.
Lithuanie

A MONSIEUR
LE PRESIDENT
de la Conférence entre
la Lithuanie et la Pologne
à Bruxelles.

Monsieur le Président.

Par la résolution cu Conseil de la Société des Nations la Pologne et la Lithuanie vont traiter à la Conférence de Bruxelles les questions concernant les frontières entre ces deux Etats.

C'est un fait que la Pologne et la Lithuanie n'ont qu'une frontière commune sur la ligne du canal d'Augustowo. Plus loin à l'ouest et au nord de cette frontière se trouve le territoire vraiment blanc-ruthènien, c'est le fait qui n'est pas disputé ni par les Lithuaniens, ni par les Polonais. Le Conseil de la Societe des Nations, après avoir examiné les causes du conflit polono-lithuanien, en est bien convaincu lui même. Le Traité de Versailles a établi cette verité avec une autorité indisputable. La population blanche-ruthénienne de ces territoires a le plein droit de prendre part dans la discussion de sa déstinée. Elle a son gouvernement légal qui doit defendre ses interêts. Vu la superiorité numerique des forces militaires polonaises et bolchevistes, le Peuple Blanc-Ruthénien n'a pas pu défendre son territoire contre l'agression hostile et l'asservissement temporaire. Ainsi le gouvernement Blanc-Ruthénien est obligé actuellement de chercher d'hospitalité dans un pays amical; néanmoins, ça le ne prive pas du droit de défendre les interêts de son Peuple.

D'accord avec les mémorandum's du 16 et du 18 décembre, adressés à la Société des Nations à Genève, le Gouvernement Blanc-Ruthenien suppose que pour la solution juste de cette question il faudra transmettre les territoires blanc-ruthéniens au gouvernement Blanc-Ruthénien légal. Si actuellement, par des raisons quelconques, ça serait difficile, la population blanche-ruthenienne des gouvernements Grodno et Vilna, vu l'accord fédérative existant entre les gouvernements de la Ruthénie-Blanche et la Lithuanie, préférera que son territoire entrera provisoirement dans les limites de la République Lithuanienne. Cette proposition est dictée par des liens organiques existant entre ces deux peuples dès les temps de leurs vie politique indépendante, ainsi que par les attraits economiques actuelles d'un vers l'autre.

Enfin, si même cette proposition sera considérée par des raisons quelconques inacceptable — le gouvernement Blanc-Ruthenien serait d'accord pour le plébiscite qui expliquera la volonté véritable du Peuple Blanc-Ruthénien, à condition, sans doute, des garanties pour la plein liberté d'expression de cette volonté.

Actuellement le plébiscite est reconnu comme superflu et inutile. On suppose à diviser, comme un objet matériel, la population blanche-ruthenienne de

Vilna et Grodno entre deux Etats: la Pologne et la Lithuanie. Une pareille decision est en opposition complète avec le principe du droit des peuples de disposer de soi-même.

Vu que la Conférence les problemes et les interêts les plus vitales de la population blanche-ruthenienne de provinces en contéstation, le gouvernement Blanc-Ruthenien tient pour nécessaire de prendre part dans la discussion susdite en qualite d'une partie independante et competente, tant plus qu'entre la Pologne et la Lithuanie l'etat de guerre n'existait jamais et les pourparlers actuels ne sont la conséquence d'une telle guerre. Le refus d'entedre la voix de la représentation de la Ruthenie-Blanche fortifiera dans la population la conviction de pleine ignorance de ses interêts, tant violés pendant sept ans de guerre, et la poussera une fois de plus vers des nouvelles luttes et insurrections révolutionnaires inorganisées pour defendre son droit et ses interêts.

Considérant tout susdit, le gouvernement de la République Démocratique Blanche-Ruthénienne, aspirant vers la vie paisible de son pays, a l'honneur de vous prier, MONSIEUR LE PRESIDENT, de bien vouloir admettre son délégation plénipotentiaire à la Conférence prochaine polono-lithuanienne à Bruxelles.

Lastouski
Président du Conseil des Ministres
et remplaçant du Ministre des Affaires Etrangères

K.Douchewsky
Secretaire d'Etat.

582.1.46:020&r-021 — ма
582.1.19:014-016
582.1.20:013-014
582.1.20:026-028

2712. Зварот Горадзенскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту да Лігі Нацыяў за 6.04.1921 з патрабаваньнем неадкладнага правядзеньня плебісцыту аб дзяржаўнай прыналежнасьці Горадзеншчыны

582.1.55:014-015 — мк
582.2.12:011-012 — мк

2713. Сьпіс бялізны Вацлава Ластоўскага (для рахунку з пральні?)

гр. Ластоускі
кашуль 2+10=12
нагавіц 4+1=5
манішкі =2
нарукаунікі 1 пара
шкарпэткі 3 "
насатак 1+1+1+1+4=8
мягк. каунярoў 2
цьв. кауняр. 12
манкеты 2 пары

6 IV. 1921 г.
582.2.53:072 — р

2714. Ліст Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.04.1921

8.IV.1921.
Дзьвінск.

Высокапаважаны
Вацлаў Юстынавіч,

атрымаў сенека Ваш ліст ад 31.III.21.

Гэтай жа датай і я паслаў Вам ліста, на які чэкаю адказу.

Вельмі прашу выбачыць за тое, што не паздравіў Вас 25-га марца са сьвятам: з аднаго боку — заняты, а з другого — маю шмат асабістых непрыемнасьцяў, аб якіх навэт не хочэцца пісаць.

— Досіць будзе, калі скажу Вам, што ад гнязда бацькоў маіх — астаўся толькі аблуплены фундамэнт, што на тым мейсцы, гдез калісь стаяла наша невялічкая дачка, — цяперыка расьце трава і крапіва, што дарагіе і любые мне па старым успамінам людзі, рэчы і нават цэлыя мейсцовасьці — больш не істнуюць.

Калі ж я да гэтага яшчэ дадам, што мяне значна і вельмі зло абрабавалі ў ноч з 3-га на 4-е, дык Вы зусім зразумееце мае настроі.

Але, — досіць аб гэтым.

Што Душэўскі едзе ў Амэрыку — добра, але хай жа ён ня спіць тамака так, як спаў ў Вільні, і хай не кланяецца і не заігрывае ў Амэрыцы з палякамі гэтак, як гэта рабіў ен у іншых мейсцах.

Жытлоўскі — таксама добра, надта добра, але не на пасадзе «Міністра Нацыянальных Меншасьцяў», бо гэта можа абразіць палякоў і расейцаў, а на пасадзе «Міністра Жыдоўскіх Спраў», або — фінансаў.

Ванштэйн — зарабіў сваё.

Фрумкіну — трэба шкадаваць[1].

Ці не збіраецца Урад ў Менск? і ці падтвердзілісь весткі аб забраньні яго?

— Тутака нічога не чуваць.

Віленскіе хай напішуць мне, ці змогуць яны зрабіць тое, аб чым я прасіў.

Усім шлю прывет і найлепшыя пажаданьня.

З вялікай да Вас пашанай

К.Езавітаў.

P.S. Ці зробіць мне Лурье тое, аб чым прасіў я яго?

Зверніце увагу на Дзьвінскую местовую марку, што наклеіў Вам на купэрт.

Дзьвінск ужывае гэрб Пагоні.

582.2.12:090-091

[1] А.Вайнштэйн і М.Фрумкіна — лідэры Бунду ў Менску. Пастановаю XIII надзвычайнай канфэрэнцыі Бунду ў Менску (сакавік 1921) партыя была распушчаная, на што, відаць, і спасылаецца Езавітаў.

2715. Справаздача Уладзімера Пігулеўскага (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.04.1921

Грамадзяніну Старшыні Рады Нар. Мін. Б.Н.Р.

Справаздача

Найв<ышэйшыя> чэкаюць Л<аднова> і покуль што ні да чога ня прыйшлі. См<оліч> асабіста складае паўнамоцтва бязварункова. Сёнека ў іх павінен адбыцца сход. Тарас запытаў Д<убейкоўскага> па тэлеграфу калі прыедзе Л<адноў> 10/IV атрымаў адказ: «Палкоўнік на днях будзе ў Вас, ляжу хворы».

Каля 10/IV у В<аршаве> склікаецца з'езд белар. дзеячоў з удзелам Крэсоўцаў для стварэньня «Краёвай Рады»[1]. Мэты: аутаномія белар. на тэррыторыі аккупіраванай Польшчай, пратэктарат Польшчы над ўсходняй Беларусіей, цесны кантакт з Крэсоўцамі, «прызнаньне крэсовых палякоў за сталых беларускіх жыхароў» (даслоўна з павесткі).

З'езд склікае афіцыяльна Адамовіч (але кіруе усім Ал<яксюк>) шляхам пасылкі канфідэнцыяльных павестак пэўным людзям. Ня малы удзел ў гэтым прымае Вернікоўскі.

Ідэя стварэньня гэтай Рады зараділась яшчэ 5-6 тыдняў назад, калі белар. часткі у ліку да 2.000 ч. якія раскінуты ў Случчыне і легалізованы як «Drużyny Robotnicze» зрабілі налёт ў бок бальшэвікоў на мястэчка М<ікашэві?>чы, дзе захапілі у кассе каля 3 мільёнаў царскіх. Дзеля таго, што як налёт, так і выкарыстаніе грошэй было праведзена арганізована (адзелісь, абулісь, залажылі свой каапэратыў), мясцовые крэсоўцы, на чале якіх стаў Эд. Вайніловіч ўгледзелі ў гэтам нешта паважнае і пачалі «Drużynie» дапамагаць уселякім чынам і высунулі пытаньне аб стварэньні нейкаго супольнаго органу.

На запытаньне аб ёй, А<ляксюк> сказаў, што ён зноў падкрэслівае ўсё, што было ім сказана пры нашых спатканьнях; Рада ня будзе прэтэндаваць на роль якога-небудзь Ураду ў межнар. сэнсі, есць проста арганізацыя моманту. «Склікаецца яна канфідэнцыяльна а гэта канфідэнцыяльнасць дае ў рукі законнаму Ураду вялікі козыр, каб у выпадку патрэбы дыскрэдіціраваць яе ў вачах Антанты».

Агульны настрой тут вельмі ваінственны. 10/IV адбыўся вялікі «Wiec» скліканы эндэкамі, на які грамадзянства заклікалась абвесткамі расклеенымі на кожнам доме, на кожнам вакне. «Трэба з аружжам ў руках бараніць Вільна! Ужо блізак гэты час! Трэба ўсім гатавацца!» Сярод вайсковых ходзяць упорные чуткі, што 15-17 пачнецца агульнае наступленьне на Коўна. Сёнека пасля абеду Тарас паведаміў, што ёсць чуткі быццам бальшэвікі пад відам беларусоў пачалі ужо наступленьне.

Адным словам ў горадзе досыць няпакойна.

УП.

11/IV 21 г.

582.2.12:053&r

[1] Арганізацыйны Сход «Краёвай Сувязі» (старшыня — Вацлаў Пупка) адбыўся 24.04.1921.

2716. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.04.1921

Высокапаважаны гр. Старшыня!

Чэкаю ўвесь час сюды Л<аднова>, а так сама інструкцыяў ад Вас.

Агэнта на з'езд ў В<аршаву> паслаў.

Перэдайце Чэр<эпуку>, што яму ехаць сюды нябяспечна. Касц<ялкоўскі>[1] казаў, што пасадзіць. Камітэт здаецца зачыняць, бо сёнека запатрэбавалі статут. Ярэм<іч> адмовіў.

Чэкаю Хонэ (фурмана).

Прывітаньне ўсім.

З вялікай пашанай.

Ваш Ў.П.

Калі патрэбна, то я магу прыехаць у Коўна.

582.2.12:053а

Дакладная дата невядомая. [1] Касьцялкоўскі — начальнік II аддзелу польскага генштабу на Вільню.

2717. Ліст Управы Прэсы й Прапаганды Заходне-Ўкраінскай Народнай Рэспублікі (Вена) дырэктару канцылярыі Рады Народных Міністраў БНР Юрыю Гладкаму (Коўна) за 12.04.1921

582.1.25:066

Адказ на ліст за 26.02.1921 (вых. №340) да д-ра Л.Мышугі з просьбай прыслаць кнігі.

2718. Нота Чичерина кн. Сапѣгѣ. Отвѣтная нота кн. Сапѣги // Невядомая расейская газэта (Варшава, пасьля 12.04.1921)

582.1.36:009&r

У справе Балаховіча і Пятлюры.

2719. Мэмарандум Цэнтральнай Беларускай Рады Віленшчыны й Горадзеншчыны і Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту за 14.04.1921 (Вільня) у справе этнічнага складу Віленшчыны й Горадзеншчыны, пададзены на літоўска-польскую канфэрэнцыю ў Брусэлі

[...] Nous aspirons que non seulement tout le territoire en discussion cédé par la Russie Soviétiste à la Lithuanie suivant le traité du 12 juillet 1920, mais que toutes ces terres blanches-ruthéniennes qui avaient été données par les Bolchéviques à la Pologne, soient annexées à la République Lithuanienne aussi sur les fondements acceptés par les gouvernements Blanc-Ruthénien et Lithuanien à Kovno le 12 novembre 1920.

Signé: Karabatch (au nom de la Rada Centrale Blanche-Ruthénienne des gouvernements de Vilno et de Grodno et au nom du Comité National Blanc-Ruthénien à Vilno

582.1.19:004-010 — шк фра
582.1.20:002&r-005 — шк фра
582.1.20:006-012 — шк фра
582.1.20:029-035 — шк фра
582.1.51:002-007 — шк бел

2720. Зварот Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі за 14.04.1921 (Вільня) у справе лёсу Віленшчыны й Горадзеншчыны, пададзены на літоўска-польскую канфэрэнцыю ў Брусэлі на ймя старшыні канфэрэнцыі Поля Іманса

582.1.19:011-013 — шк фра
582.1.20:023-025 — шк фра

2721. Запрашэньне Вацлава Ластоўскага на вечарыну «ўваходзінаў» МЗС Літвы, якая мае адбыцца 16.04.1921 ў залі Літоўскага Клюбу (былы «Мэтропаль»)

582.1.25:067

2722. Дэкляpацыя аб утварэньні Дзяржаўнага Камітэту Беларускай Народнай Рэспублікі 17.04.1921

Дзяржаунае будаўніцтва Беларускае Народнае Рэспублікі перажывае цяжкую хваробу. 13 сьнежня 1919 году паміж членамі Рады Рэспублікі прысланыя з Бэрліну агенты спровоціравалі раскол. Адна часьць радных аддала мандаты новавыбранай Найвышэйшай Радзе Беларускае Народнае Рэспублікі і загадала ей вясьці далей старую дзяржауную працу; другая часьць выбрала свой выканаучы орган, назваўшы яго Урадам Рэспублікі. У рэзультаце гэтага расколу беларуская дзяржауная праца была надоуга расстроена. Абодвы прадстаўніцтвы беларускае дзяржаунае ідэі аказаліся абязсіленымі. Дзяржауная праца Найвышэйшае Рады замерла. Прадстаунікі-ж Ураду Ластоускага павялі у Бэрліне работу, праціуную прынцыпам дэмократызму і беларускай дзяржаунай і нацыянальнай ідэі: яны зьвязаліся з цантральнай арганізацыяй расейска-нямецкай рэакцыі, якая кіруецца да адбудовы монархічнае Расеі і монархічнае Нямеччыны, разьбіушы усе новаутвораныя вольныя дэмократычныя рэспублікі, — і гэтым самым Урад Ластоускага зрабіу немагчымай сваю сувязь з беларускім дзяржауным будаўніцтвам.

Стварыушаеся палажэньне пагражае самаму існаваньню беларускае дзяржаунае ідэі, вольнасьці і сьветлай будучыне Беларускага Народу. Дзеля гэтага мы, прадстаунікі розных групау, што рознымі, часта спрэчнымі ідуць шляхамі, але аб'яднаны справаю нацыянальнага адраджэньня Беларускага Народу, злучаемся разам, каб супольнымі сіламі стануць на абарону незалежнасьці і непадзельнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі. Ня маючы магчымасьці склікаць у гэтым часе Раду Рэспублікі, мы, сябры Рады Рэспублікі, Цантральнае Беларускае Рады Віленшчыны і Горадзеншчыны, прадстаунікі мяйсцовых нацыянальных камітэтау і палітычных партый, карыстаючыся даверыем да нас беларускага грамадзянства, лічым сваім абавязкам безадкладна распачаць вольную ад знадворных уплывау беларускую дзяржауную работу, дзеля чаго завязываем ДЗЯРЖАУНЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ, зложаны з ніжэйпісаных асоб з правам далейшае кооптацыі.

Дзяржауны Камітэт пераймае усе функцыі і правы Рады Рэспублікі.

Цвёрда стоючы на грунце Устаунае Граматы Рады Рэспублікі з 25 сакавіка 1918 году, Дзяржауны Камітэт будзе дабівацца міжнароднага прызнаньня незалежнасьці Беларусі і у найцясьнейшай еднасьці з дэмакратыяй

суседніх народау рашуча змагацца з сусьветнай рэакцыяй, асабліва-ж з расейска-нямецкімі монархічнымі плянамі, пагражаючымі існаваньню усіх новапаустаушых дэмократычных рэспублік.

Для рэалізацыі сваіх дзяржауных ідэалау Дзяржауны Камітэт прыкладае усе свае сілы дзеля стварэньня БЕЛАРУСКАЕ АРУЖНАЕ СІЛЫ і дзеля падгатоукі дзяржауна-адміністратыунага апарату.

Дзяржауны Камітэт учыніць усё дзеля чымхутчэйшага скліканьня Рады Рэспублікі у поуным яе складзе, дапауняючы яе — згодна з законамі Беларускае Народнае Рэспублікі — выбранымі на дэмократычных асновах прадстаунікамі усяго насяленьня валасьцей і мест Беларусі у меру яе вызваленьня.

17 красавіка 1921 году.

582.2.11:009 — мк
582.2.37:062 — мк
582.2.37:063 — мк
582.2.37:066 — мк
582.2.37:071 — мк

Пра абставіны ўзьнікненьня Дзяржаўнага Камітэту БНР гл: Собственноручные показания А.И.Луцкевича. 30 октября 1939 г. // Нёман. №1. 1995. С.152.

У палітычным рэфэраце II аддзелу польскага генштабу паведамляецца гэткая інфармацыя пра дзейнасьць Дзяржаўнага Камітэту БНР:

«Пад уплывам дзеячоў з Найвышэйшай Беларускай Рады быў заснаваны Беларускі Дзяржаўны Камітэт як кіраўнічая палітычная інстытуцыя, надзеленая мандатамі шматлікіх групаў, з мэтаю кансалідацыі ўсяго беларускага руху.

Дзяржаўны Камітэт пакуль што дзеіў канспірацыйна, ён меў бясспрэчна антылітоўскі й антынямецкі характар і быў у сталым кантакце з Польшчай. Роля Камітэту ў выкрыцьці нямецкага кіраваньня «урадам Ластоўскага» была такая эфэктыўная, што яна падарвала ў значнай ступені некалі безканкурэнцыйны асабісты ўплыў Ластоўскага. Ластоўскі імкнуўся нават навязаць кантакт зь Дзяржаўным Камітэтам, не выключаючы залежнасьць ад яго.

Склад Дзяржаўнага Камітэту быў у 1921 г. такі:

Старшыня — Антон Луцкевіч
Намесьнік старшыні — Ладноў
Сакратар — Тарашкевіч
Скарбнік — Дубейкаўскі

Сябры: кс. Адам Станкевіч, Ярэміч, Гарэцкі, Рак-Міхайлоўскі, Смоліч, Будзька.

Спачатку ў склад камітэту не ўваходзілі эсэры, але канфэрэнцыі, праведзеныя з Пракулевічам і Жаўрыдам, прывялі да станоўчых вынікаў.

У сфэры ўплываў Дзяржаўнага Камітэту быў і ген. Станіслаў Балаховіч».

(Krótki zarys zagadnienia białoruskiego. [Referat II Oddziału Sztabu Generalnego]. S.127-128)

2723. Пастанова Найвышэйшай Рады Беларускай Народнай Рэспублікі за 17.04.1921 аб перадачы мандатаў Дзяржаўнаму Камітэту Беларускай Народнай Рэспублікі

Найвышэйшая Рада
Беларускае Народнае
Рэспублікі
.....192...
№ 85

Прынімаючы пад увагу сучасны падзел жывога цела Беларусі на часткі паміж прагавітых суседзяў, нездаволеньне працаю Найвышэйшае Рады з боку некаторых беларускіх дзеячоў і групаў, вінавацючых яе ў-ва ўсіх бедах, якія адбываліся і адбываюцца дагэтуль на Беларусі, немагчымасьць шырокае працы Найвышэйшае Рады ў справе здзейсьненьня сьвятых ідэалаў НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ І НЕПАДЗЕЛЬНАСЬЦІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ БЕЛАРУСІ, поўную немагчымасьць скліканьня да гэтага часу Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, што мела Найвышэйшая Рада сваей першай мэтай у адпаведны і магчымы мамэнт, -

НАЙВЫШЭЙШАЯ РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ, лічучы, што пераживаны мамэнт вымагае новых формаў арганізацыі беларускага дзяржаўнага будаўніцтва, ПЕРАДАЕЦЬ СВАЕ МАНДАТЫ ДЗЯРЖАЎНАМУ КАМІТЭТУ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ, ускладаючы на яго разам з правамі і свае абавязкі датычна скліканьня Рады Беларускае Народнае Рэспублікі.

ВІЦЭ-СТАРШЫНЯ: Сымон Рак-Міхайлоўскі

СЭКРЭТАР:

Змацаваў:
Старшыня Дэлегацыі Беларускае Народнае Рэспублікі:
582.2.37:064-065 — мк

2724. Асабістая анкета Тамаша Грыба

Фамілія ..... маё прозьвішча Грыб

Імя, отчэства ..... Тамаш, бацькі імя Тамаш

Калі радзіуся ..... у 1895 г. 7/III.

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... вёска Паляні, Вішнеўскай вол., Сьвенцянскага пав., Віленскай губ.

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... ў Нестанішным народным вучылішчы

Дзе вучыуся ..... Скончыў Тэхнічную школу Марскога Ведамства у Петраградзе

Дзе і якія закончыу навукі ..... Студэнт медыцынскага факультэту Псыхонэврологічнага Інстытуту у Петраградзе

Якія знае мовы ..... Беларускую, Рускую, Польскую і штудзірую Эўрапейскія мовы.

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... Сябра С<паўняючага> К<амітэту> Р<ады> З'езду, народны сэкрэтар земляробства - першага беларускага ўраду сябра Р.Б.Н.Р.

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... ў Беларускім культурна-прасьветным таварыстве ў Менску

Да якіх належау партый ..... да Р.П.С-Р; з 1917 г. да Б.С.Г. і

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... да Б.П.С-Р.

Ці працавау літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... Рэдактар «Грамадзяніна»[1] і «Роднага Краю»[2]

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... Погляд партыі Б.С-Р.

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць ..... Погляд Б.П.С-Р.

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржаўная праца ..... Погляд Б.П.С.Р.

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... Аткрытае змаганьне з окупантамі за дзержаўную незалежнасьць Беларусі.

Да чаго павінна кіравацца ..... да утварэньня свабодна выбраных радаў, да соцыялізацыі зямлі і г.д. (глядзі праграму Б.П.С-Р. і рэзалюцыі загранічнае групы Б.П.С.Р.).

Подпісь ..... Тамаш Грыб

17/IV—921.

м. Коўна

Фатаграфічная картачка ..... -----

582.1.62:011-012

[1] Вільня, 14.01-25.03.1919. [2] Горадня, 22.06-10.07.1919.

2725. Асабістая анкета Янкі Чарапука

Фамілія ..... Чарапук

Імя, отчэства ..... Ян Антонаў

Калі радзіуся ..... 1896 г. 12 жніўня

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... ў Горадзеншчыне Сакольскага павету мястэчко Новы-Двор

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... у Навадворскім Гарадзкім Учыліщу (расейскае)

Дзе вучыуся ..... у Горадні і Пецербурзі

Дзе і якія закончыу навукі ..... Пецербургскую Гімназію Відэмана

Якія знае мовы ..... расейскую, польскую, слабей нямецк. і франц.

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... ў 1917 г. быў Сэкрэтаром Украінскай Місіі у Пецярбурзі, затым быў адкам. да М.З.С. Укр. Н. Рэсп.; у Бел. Ураду быў за часоў Кабінэта Луцкевіча, Дыпламатычным кур'ерам затым Чыноўнікам спэцыальных даручэняў за Урадам Ластоўскага Сэкрэтаром Місіі у Латвіі і Эстіі за тым Дэлегатам Міністэрства Загран. Спраў

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... у Пецербурзі з'яўляўся Тав. старш. Культ.-Прасьвет. Тав. «Вольных Беларусоў», ў Кіеві Сябром Бел. Рады на Украіне і Сябром Рады Віленшчыны і Горадзеншчыны

Да якіх належау партый ..... зарганізаваў на Украіне бел. парт. незалежных-рэвалюцыянэраў, пасля у 1918 г. ўступіў да б. п. соц-рэв.

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... соц-рэвалюц.

Ці працавау літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... толькі у Газ. «Беларусь» у Горадні, у «Родным Краю» і ў «Нашай-Думцы» ў Вільні

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... --

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць ..... павінна быць Дэмакратычнай з шырокім соцыальным укладам

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржауная праца ..... у сучасны мамэнт толькі рэвалюцыйным змаганьнем з чужынцамі ўсходу і захаду дарогай ірляндзкіх сэйфанераў[1].

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... стварыць войско у Літве на Бацькаўшчыне падняць паўстаньне проціў усходнікаў і палякоў прылажыць стараньне над умацаваньнем выдавецтва

Да чаго павінна кіраваца ..... да цеснага хаўрусу эканамічнага і вайсковага з Прыбалтыцкімі Рэспублікамі, асабліва з Літвой і пасьля з Украінай

Подпісь ..... Ян Чарапук

Фатаграфічная картачка ..... -----

582.1.62:001-002

Дакладная дата невядомая. [1] Маюцца на ўвазе шынфэйнэры.

2726. Асабістая анкета Аляксандра Карабача

Фамілія ..... Карабач

Імя, отчэства ..... Александар Язэпавіч

Калі радзіуся ..... 22/VII 1878 года

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... у весцы Вехатніца Росскай вол Ваукав. павету Горадзен. губ.

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... Ваукав. павет вучылішчы

Дзе вучыуся ..... Сярэдніх агульно абразав. курсах і электротэхнічных курсах на мэханіка

Дзе і якія закончыу навукі ..... Электро тэхнічныя курсы мэханікаў

Якія знае мовы ..... беларускую, расейскую, польскую — патроху французскую і нямецкую

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... пры царскім рэжыме і пры часовым расейскім Урадзе памоцнікам Начальніка галоўнай палевой почты у Петраградзе

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... Віленскім Беларускім Нац. Камітэце і Цэнтральнай Беларускай радзе Віленшчыны і Горадзеншчыны

Да якіх належау партый ..... ніякіх

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... Белорускай партыі Сац. рэвалюц.

Ці працавау літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... Незалежнай Беларусі і Нашай Думцы

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... развіцце літэратуры і навукі знаходзіцца у сувязі з палітычным становішчом нашай старонкі і будзе іці паралельно з развіццем нац. свядомасці

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць ..... погляд партыі Сац. рэвалюц.

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржауная праца ..... шляхам партыі Сац. рэвалюціянераў.

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... Пашырэнне нац. свядомасці і рэволюціонірованне масс беларускага грамадзянства

Да чаго павінна кіраваца ..... да адбудовы незалежнай і непадзельнай бацькаўшчыны

Подпісь ..... АКараб...

Фатаграфічная картачка ..... -----

582.1.62:003-004

Дакладная дата невядомая.

2727. Асабістая анкета Ісака Лур'е

Фамілія ..... Лурье

Імя, отчэства ..... Ісак Грігорьевіч

Калі радзіуся ..... 11/23 VIII 1890

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... Пінск, Мінск губ.

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... дома

Дзе вучыуся ..... Пинское Реальное Училище

Дзе і якія закончыу навукі ..... Московскій Императорскій Археологическій Институтъ со званіемъ Ученаго Археолога и Демидовскій Юридическій Лицей.

Якія знае мовы ..... еврейскую, шведскую, датскую, нѣмецкую, французскую, бѣлорусскую и русскую

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... работалъ в Бѣлор. прессбюро в Копенгагенѣ и Ковнѣ

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... Сіонистская организація

Да якіх належау партый ..... сіонистъ

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... сіонистъ

Ці працавау літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... Диссертація «Скифскія древности в Зап. Европѣ», Москва 1911 г. Рядъ статей в «Разсвѣтѣ», органѣ Сіонистскаго Ц.К. в Петроградѣ в 1912-1913 г.г. и в шведской прессѣ в 1914-1918 г.г.

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... --

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць ..... Независимость Бѣлоруссіи единственный путь къ возрожденію бѣлорусскаго края и бѣлор. и евр. народностей

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржауная праца ..... Черезъ борьбу съ польскимъ и русскимъ имперіализмами къ государственной независимости.

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... Поднятіе бѣлорусской экономической жизни и сближеніе съ Балтійскими Государствами в первую очередь съ Литвой

Да чаго павінна кіравацца ..... Къ полной независимости и недѣлимости, дабы принять участіе в союзѣ восточно-европейскихъ народов и государств, какъ равная среди равныхъ.

Подпісь ..... И Лурье

Фатаграфічная картачка ..... [здымак]

582.1.62:005-006

Дакладная дата невядомая.

2728. Асабістая анкета Аляксандра Вальковіча

Фамілія ..... Вальковіч

Імя, отчэства ..... Александр Іванавіч

Калі радзіуся ..... у 1892 гаду

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... у Вільні; праісхажу і прыпісан да м. Ялоўкі Шымкаўскай вол. Валкавыскага павету Горадзенскай губ.

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... у народнай школе

Дзе вучыуся ..... у Віленскай Рэальнай школе

Дзе і якія закончыу навукі ..... студэнт Менскага Педагагічнага Інстытуту, закончыў вайсковую школу у Горадзе Горы, на Каўказе

Якія знае мовы ..... Расейскую, польскую

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... Консул і Асоба упаўнамочаны па бежанскім справам на Каўказе ад імені Б.Н.Р., Кіраўнік Канцэлярыі Рады Міністраў і В. аб. Міністра фінансаў

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... сябр Камітэту Вайсковай Рады у Маршавым б-ну 12 Сібірскай дывізыі. Сябр З'езду Беларускіх Вайсковых арганізацый Палуднева-Заходняго фронту. Сябр Беларускай Вайсковай Цэнтральнай Рады, Сябр і намеснік старшыні Беларускага камітэту на Каўказе, Сябр Рады Рэспублікі

Да якіх належау партый ..... Быў сябрам Беларускай Сацыялістычнай Грамады, пасьля сябр Партыі Беларускіх Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... Сябр партыі Беларускіх Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў

Ці працавау літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... -----

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... Безумоўна беларуская літэратура і навука ў будучыне займе сярод усіх народаў належнае мейсце.

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць ..... Беларусь павінна быць і будзе Незалежнай і непадзельнай Дзяржавай

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржауная праца ..... Перш за ўсе усі грамадзянска-нацыянальныя і палітычна нацыянальныя арганізацыі, а так сама і усі грамадзка-нацыяльныя дзеячы павінны сабе уясніць і цверда стаць на шлях адбудоўлі Беларусі як Непадзельнай і незалежнай Дзяржавы Бо толькі стаўшы на гэты шлях праца кожнага з Беларусаў прынясі карысть нашай бацькаўшчыне

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... Да аб'яднаньня усіх нацыянальных палітычных сіл як беларускіх так і іншых нацыянальнасьцей для выступлення агульным фронтам у абарону Незалежнай і непадзельнай Беларусі.

Да чаго павінна кіравацца ..... Да сабіраньня усіх беларускіх зямель у адну вялікую Дзяржаву

Подпісь ..... АВальков...

Фатаграфічная картачка ..... -----

582.1.62:007-008

Дакладная дата невядомая.

2729. Асабістая анкета Васіля Захаркі

Фамілія ..... Захарко

Імя, отчэства ..... Васіль Іванавіч

Калі радзіуся ..... 1го красавіка 1877 г.

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... веска Дабрасельцы Міжэрацкай вол. Ваўкавыскаго пав. Гродзен. губ.

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... дома

Дзе вучыуся ..... Лыскаўскай Настаўн. сэмінарыі

Дзе і якія закончыу навукі ..... Вытрымаў экзамен па праграмі Юнкерскаго учылішча і расейскай гімназыі

Якія знае мовы ..... беларускую, расейскую і польскую

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... Дзержаўнаго Скарбніка у першым сэкрэтарыяце, Міністра фінансаў у кабінетах Серады і Луцкевіча, цяпер Намесьніка Старшыні Рады Беларус. Н. Рэспуб., а таксамо Сэкрэтара Цэнтральнай Беларускай вайсковай Рады і членам Вялікай Беларускай Рады

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... -----

Да якіх належау партый ..... да Беларускай сацыялістычнай Грамады, цяпер да Беларускай партыі Сацыялістаў-фэдэралістаў

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... -----

Ці працавау літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... Калі ні калі даваў стацьі палітычнаго і нацыянальнаго характэру у пэріодычную прэсу

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... Бачу пышны разцвет яе

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць ..... Шчыро веру, беларускі народ дабудзе суверэнасьць і запраўды стане сам гаспадаром на сваей зямельцы

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржауная праца ..... Трэба як можна больш разьвіваць нацыянальнае самосазнаньне нашага народу, і дабівацца і моцна стаяць, пры усялякіх варунках, на незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі і толькі такім чынам што у канцы канцоу дасягнем нашых ідэалов

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... Аслабаненьне Беларусі ад акупантаў і чужацкаго уціску і перэходу улады у рукі Ураду Беларус Н. Р.

Да чаго павінна кіравацца ..... Дыплематыч. працаваць за граніцаю і вясьці безупыннную агітацыю па усей Беларусі у напрамку прэдыдущаго (па перэдняго) пункта

Подпісь ..... Намесьнік Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі В.Захарко

Фатаграфічная картачка ..... -----

582.1.62:009-010

Дакладная дата невядомая.

2730. Асабістая анкета Кляўдуша Дуж-Душэўскага

Фамілія ..... Дуж-Душэускі

Імя, отчэства ..... Кляудуш Стафанавіч

Калі радзіуся ..... 27.III.1891 г.

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... м. Глубокае Віленскай губ. Дзісенск. пав.

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... у Глыбокім

Дзе вучыуся ..... у Віленск. рэальн. вучылішча

Дзе і якія закончыу навукі ..... рэальн. вуч. і Горны інст. у Петраградзе

Якія знае мовы ..... апроч слав. крыху нямецк. і франц.

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... камісар Ураду Луцкевіча і Дзерж. сэкрэтар Ураду Ластоўскаго

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... 1. Сэкрэтар Студэнцкай Белар. Касы у Петр. 1912-14 г. і у усіх Петр. белар. арган, 2. сябра Белар. Н.К. 1917 г. у Менску, Старшыня В.Н.К. і Рад. В і Г і другіх арг.

Да якіх належау партый ..... Да Бел. Сац. Грамады і да Бел. Соц.-Рэв.

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... Б.С-Р.

Ці працаваў літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... працаваў як журналіст асобных прац не маю

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... разаўецца да каласальных размераў

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць ..... павінна быць Беларуская незалежн. і непадз. Дзержава

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржауная праца ..... Арганізацыйнай і рэволюцыйнай

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... Супрацоўніцтва з нашымі прыхільнікамі, агітацыя, мобілізацыя сіл, захват грам. інстытуцыяў у краі у Белар. рукі, прапаганда за кардон.

Да чаго павінна кіравацца ..... Незалежнасьці і непадзельнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі

Подпісь ..... КДуш...

Фатаграфічная картачка ..... -----

582.1.62:013-014

Дакладная дата невядомая.

2731. Асабістая анкета Пётры Крэчэўскага

Фамілія ..... Крэчэўскі

Імя, отчэства ..... Петра Антонавіч

Калі радзіуся ..... 7 жніўня 1879 г.

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... с. Дубно, Гродзенскай губэрні і павету[1]

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... с. Вярхолесьсе, Кобрынского пав.

Дзе вучыуся ..... Духоўным вучылішчы, м. Жыровіцы Слонім. п.

Дзе і якія закончыу навукі ..... Скончыў Віленскую Праваслаўную Духоўную Сэмінарыю

Якія знае мовы ..... Беларускую, Украінскую, Расейскую і Польскую

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... у Першым Сэкрэтарыяце Б.Н.Р. Дзержаўнога Контролера, другом Сэкрэтара грашовых спраў, Сэкрэтара Рады і Старшыні Рады Б.Н.Р.

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... Сябр Рады Усебеларускаго Зьезду і Споўняючаго Комітэту, Старшыня Беларускоя Торговой Палаты

Да якіх належау партый ..... расейскіх соц-революцыонероў і Беларускоя партыі соц. фэдэралістоў

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... соц. фэдэралістоў

Ці працавау літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... прымаў удзел у пэрыодычной і ежэднеўной прэсі. Асобных выданьняў німа.

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... Пасля 1905 году яна шырока пайшла у гору. Усе задаткі для развіцця літаратуры і навукі есьць, трэба як найхучэй абъеднаць літараурные і навуковые сілы і прыступіць да апрацоўкі сталай літаратурнай і навуковай мовы

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць .... народ Беларускі можа адрадзіцца толькі праз сваю Дзержаўнасьць і усе сілы павінны быць паложаны да таго, каб здзейсьніць ідэю Беларускай Дзержаўнасьці, як найхучэй

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржауная праца ..... у сучасны мамэнт яна можэ исьці толькі рэволюцыйным і культурна-прасьветным, уключна з коопэратыўным рухам. Мэта рэволюцыйнай барацьбы в[ызва]леньне паняволеных нацый

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... Барацьба з Польшчай і комуністамі, пры якой мы будзем мець заужды дапамогу народу. Селянскі рух і паўстанья рэклямаваць за граніцай, як імкненьне народу да Дзержаўнасьці

Да чаго павінна кіравацца ..... Да незалежнасьці і непадзельнасьці, без якіх ідэя Дзержаўнасьці будзе провізорычнай і разбіушы нашы сілы не дасьць магчымасьці забэзпэчыць Дзержаўнасьць ні у якой частцы, а ворагам дасьць права гаварыць а недаросласьці Беларускаго народу да Дзержаўнасьці.

Подпісь ..... ПКрэчэускі

18.IV.21.

Коуна

Фатаграфічная картачка ..... -----

582.1.62:015-016

---

[1] Пар. зь інфармацыяй пададзенай у Энцыкляпэдыі Гісторыі Беларусі: Кобрынскі павет Горадзенскай губэрні.

2732. Паўнамоцтва Дзяржаўнага Камітэту Беларускай Народнай Рэспублікі Аўгену Ладнову за 19.04.1921 (вых. №14)

N 14

ПАУНАМОЦТВА

Дзяржауны Камітэт Беларускае Народнае Рэспублікі гэтым пацьвярджае усе правы і мандаты, дадзеныя у розным часе Урадам Беларускае Народнае Рэспублікі Палкоуніку Эугенію ЛАДНОВУ, як Міністру Абароны і Міністру Загранічных Спрау, а такжа як Старшыні Дэлегацыі Беларускае Народнае Рэспублікі у Парыжу.

Вільня, 19 красавіка 1921 году.

Старшыня Дзяржаунага Камітэту:

Сэкрэтар:

582.2.37:053 — мк

2733. Паўнамоцтва Дзяржаўнага Камітэту Беларускай Народнай Рэспублікі Аўгену Ладнову за 19.04.1921 (вых. №15)

N 15

ПАУНАМОЦТВА

Дзяржауны Камітэт Беларускае Народнае Рэспублікі гэтым упаунамочывае свайго Сябра Прэзыдыюму Палкоуніка Эугенія ЛАДНОВА вясьці ад імя Камітэту перагаворы і падпісаць усе патрэбныя умовы з Генаралам Булак-Балаховічам у справе стварэньня АРУЖНАЕ СІЛЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ дзеля адбудовы НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БАЦЬКАУШЧЫНЫ.

Вільня, 19 красавіка 1921 году.

Старшыня Дзяржаунага Камітэту:

Сэкрэтар:

582.2.37:054 — мк

2734. Паўнамоцтва Дзяржаўнага Камітэту Беларускай Народнай Рэспублікі Браніславу Тарашкевічу за 19.04.1921 (вых. №16)

Comité d'Etat
de la
République Démocratique
de la Russie-Blanche

N 16

ПАУНАМОЦТВА

Дзяржауны Камітэт Беларускае Народнае Рэспублікі гэтым упаунамочывае свайго Сябра Прэзыдыюму, грам. Браніслава ТАРАШКЕВІЧА, вясьці ад імя Камітэту перагаворы і падпісаць усе патрэбныя умовы з Генаралам Булак-Балаховічам у справе стварэньня АРУЖНАЕ СІЛЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ дзеля адбудовы НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БАЦЬКАУШЧЫНЫ.

Вільня, 19 красавіка 1921 году.

Старшыня Дзяржаунага Камітэту:
Ант.Луцкевіч

За Сэкрэтара: Палкоўнік Э.Ладноў

582.2.37:052 — мк
582.2.37:055 — ма

2735. Статут Беларускага Таварыства Дапамогі Ахвярам Вайны (Варшава)

582.1.60:002&r-004&r — мк

Дакладная дата заснаваньня Таварыства невядомая. Паведамленьне пра заснаваньне падаецца ў газэце: Беларускі Звон (Вільня). 1921.04.28. Пералічаныя ў Статуце заснавальнікі Таварыства: Браніслаў Друцкі-Падбярэскі, Лявон Дубейкаўскі, Аляксандар Уласаў, Аркадзь Смоліч, Антон Трэпка, Вацлаў Іваноўскі,

Браніслаў Тарашкевіч, Міхал Федароўскі, Рамуальд Зямкевіч, Францішак Кушаль, Павел Жаўрыд, Гальяш Ляўковіч, Уладыслаў Сталыгва, Віктар Галаўня, Сяргей Баран, Лукаш Дзекуць-Малей, Эдмунд Якабіні, Адам Більдзюкевіч, Адам Курыловіч, Антон Борык, Станіслава Буйла, Эвэліна Ястжэмбска.

2736. Ліст Беларускага Таварыства Дапамогі Ахвярам Вайны (Варшава) невядомай установе за ?.??.1921 з просьбай даць Таварыству пазыку 500.000 польскіх марак

582.1.60:001&r

Дата невядомая.

2737. Ліст з друкарні Otto Elsner (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму за 20.04.1921 у справе друку папяровых грошай (Rubel) для Беларусі, аб тэхнічных умовах і магчымасьцях

582.1.25:003&r-004&r

2738. Асабістая анкета Самуіла Жытлоўскага

Фамілія ..... Жытлоускі

Імя, отчэства ..... Самуэль Іосифович

Калі радзіуся ..... 30 сентября 1870 года

Дзе радзіуся (губ., павет, і мейсца) ..... г. Витебск

Дзе атрымау пачатковую навуку ..... Витебск

Дзе вучыуся ..... в Смоленске, Смоленском Реальн. Училище

Дзе і якія закончыу навукі ..... в Московской Консерваторіи по классу скрипки и теоріи, и в Импер. Универ. Юрид. Фак. (вольнослуш.)

Якія знае мовы ..... Русскій, еврейскій, немецкій, французскій

Якія займау дзяржауныя становішчы ..... -----

У якіх грамадзянскіх арганізацыях працавау ..... Председ. правл. Обва прикащиков, Председ. совет. старшин 2го Общ. Собранія, член Правл. Ссудо-сберег. т-ва, евр. дешев. стол; член совета Коммер. училищ, торгов. классов и других общест. учреж. в Витебске; в Москве — Председ. об-ва Евр.; член Евр. Общины, Председ. Рабочаго дома и др.

Да якіх належау партый ..... беспартійный

Цяперашняя партыйная прыналежнасьць ..... беспартійный

Ці працавау літэратурна і якія друкавау літэратурныя працы ..... В Витебских ведомостях, Смоленск. вестнике, и столичной періодической прессе.

Ваш погляд на будучае разьвіцьце беларускай літэратуры і навукі ..... Необходимо устройство народных школ, средних и высших — в духе белорусской національности, необходимы професіон. и агрономич. школы, библіотеки, музеи, школы искусств — и твердо верю в расцвет белорус. литерат. и науки.

Ваш погляд на беларускую дзяржаунасьць ..... Независимая народная Белорусская Республика в своих этнографических границах

Якімі шляхамі павінна ісьці беларуская дзяржауная праца ..... Активная и политическая борьба. Об'единеніе всех политических, партійных и общественных групп. Полное единеніе народностей белорусской и еврейской.

Якія павінна беларуская дзяржаунасьць ставіць сабе бліжэйшыя мэты ..... Широкая пропаганда идеи независимости на местах. Концентрація кругом Белорус. Правительства всех общ. сил. — Агитація в Запад. Европе и Америке.

Да чаго павінна кіраваца ..... По достиженіи полной независиости Б.Н.Р. тесная федерація с соседн. государ. — в первую голову с Литвой. Вхожденіе в союз Балт. Государ. — Развитіе индустріи и промышленности, разработка природных богатств и осуществленіе социального строя.

Подпісь ..... С.Жытлоускі

20 Апреля

1921. Ковно

Фатаграфічная картачка ..... -----

582.1.62:017-018

2739. Ліст Міхася Кахановіча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.04.1921

20/IV 21

Дзядзька Ўласт!

Кам-т[1] атрымаў ад Вас дэклярацыі і бел.-жыд. дэклярацыі[2]. На жаль Ярэміч некуды-сь запрапасьціў паперу аб Сав. Беларусі.

Новага у нас нічога няма. К<араба>ч усе Вам расказаў. П<ігулеўск>і так сама мусіць дадаў.

Чакаемо грошаў, бо у Камітэце нічога няма і людзі сядзяць галоднымі.

Л<адно>ву мы пазычылі ад Школьнай Рады, з грошаў на выдавецтва, 3.000 мар-ост. Калі будзеце прысылаць нам грошы, будзьце ласкавы «учэсьць» гэтую суму. Найвышэйшыя прымоўклі. Наогул усе прыціхла і толькі эндэкі задаюць трэзвон. Напрыклад, учора, 19, сьвяткавалі 2 гады «вызваленьня» Вільні з пад бальшавіцкага іга. Прыехаў Рыдз-Сьміглы. Так моцна стралялі з Замк. Гары, што маса шыб з магазынаў і кватэр павылецяла. У адным толькі магазыне польск. вучыцельск. саюзу, што проціў Целятніка, вылецяла на 150.000 п.м. шыбаў. О, о, цуд! Тая ваконная шыба, перад каторай стаяў партрэт Піл<судзка>га, толькі адна асталася цэлай. На Замкавай вуліцы узьвіўся было польскі флаг, але праз гадзіны дзьве яго ізноў сьцягнулі й зьмесьцілі ізноў флаг Сярэдняе Літвы[3]. Гэта другі цуд нашае Віленскай сучаснасьці.

Ну, бывайце здаровенькі!

Ваш МКах.

582.2.12:051&r

[1] Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт. [2] Дакумэнты №№2687 і 2689. [3] Бела-блакітны.

2740. Ліст аташэ Місіі БНР у Нямеччыне Аляксандра Дзьмітрыева (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.04.1921 у справе апрацоўкі каталёгу ўсіх перададзеных ва ўласнасьць выдавецкаму таварыству «Вызваленьне» клішэ

582.1.25:077

2741. Ліст аташэ Міністэрства Замежных Спраўў Літвы капітана Гірдвайніса Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.04.1921 з дасланай карткай №51 сябра Літоўскага Клюбу

582.1.46:022

2742. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 24.04.1921

Бэрлін, 24.IV.1921.

Вельмішаважаны Пане Вацлаве!

Згодна нашае сёняшняе нарады — п. Заяц[1] раскажэ аб тым, што і як мы думаем аб шэрагу спраў, зьвязаных з апошнімі днямі. Апроч асабістай перадачы — пішу Вам пару слоў. Першае — Ладнова трэба прызваць да парадку[2]. Гэта — абавязкова. Аб форме — Вам скажа Лявон. Калі што — дык прыдзецца з ім растацца. Хоць цяжка — але нічога не зробішь. Другое — Жытлоўскі што-нешта ужо пачаў рабіць і можа што будзе. Ён ужо набыў тон, і, наагул, мае сваю апінію, крытычную. Выхаванасьць, лічу, йсьці у гэтым напрамку даст яму не патрэбнага рубу. Магчыма, справа пашырыца, але ўсё-ж такі трэба было-б арганізаваць за ім групу. Дубейкоўскі у Варшаве, відаць, ўжо рафініраваўся і трэба над ім і яго камандзёрам[3] паставіць крыж. Але пашпарты усё-ж такі ім выслаць, крыху. Нацыянальны зьезд — рэч добрая, але трэба яго склікаць так, каб не было глупства, а дапамога. Гэта залежыць ад нас і гэта трэба добра арганізаваць. З літоўцамі — я лічу патрэбнім захоўваць найлепшыя адносіны. Літва для нас — гэта ўсё пакуль што. Тавары — атрымоўваем[4], але на ласку Божаю — трэба з кооператываў атрымаць нашыя грошы (3 міл.) — а усё рэшту аддаць ім, ніхай яны займаюцца гандлем і самі за усё адказваюць. Ураду не трэба мешацца, каб пасьля ў выпадку чаго нас не лаялі.за «операцыі». З «Беларускім Сьцягам» — шмат працы. Наагул, гэта надта адпаведдая рэч — і я тут мазгую і турбуюсь. Першы нумар — аддаю ў друк. Ён ужо быў раней прыгатаваны — але не было грошы. Што нешта выйдзе. «Б. Сьцяг» будзе штомесячнай часопісью. Другі № выйдзе к 1 чэрвеня[5]. Кніга мая[6] — даканчываецца. Абрыдла яна ўжо мне!..

Раней думаў, што хто небудзь з Вас пад'едзе сюды — ці Вы, ці Пётра. Але відаць ніхто не прыедзе. Я прабуду тут-ка да канца друку — тыдзень, ці крыху больш. Краскоўскі — ў Вене. Мы далі яму дзьве тысячы з «Вызваленьня». Відаць, ён ужо будзе працаваць з намі. Яго крыху палаялі у «Волі»[7] і, здаецца, караблі ужо папалены.

Пасылаю Вам прозьбу Камарынца. Прашу яе здаволіць, бо усе-ж такі ён і ў турме сядзеў за нашу справу і ледзь не памер ад тыфу так сама пры працы. Стан яго наагул цяжкі, і ён морально такі нездароў. Трэба задаволіць яго прозьбу — яна зусім законная. «Вызваленьне» выдае кнігу аб Рыжскім міру. Ніхай Душэўскі вышле свае матэрыялы. Выдаем — «Песьні змаганьня» — абавязкова вышліце усё толькі што есьць. Ніхай Паўлінка напіша ноты «Пад гоман вясёлы». Так сама вы вышліце «Гэй, хто з намі» — словы і матыў. І наагул — все, што хто ведае. Але хутчэй!! Чы даст, урэшці, Варонка, брашуру аб Прушынскам?? Спытайце яго!.. Вітаю усіх! Дарма не пріехалі на чарку гарэлкі на Пасху!.

Жму руку Ваш АлЦвікевіч
582.1.25:080r-080

[1] Лявон Заяц у красавіку 1921 году пераехаў у Коўна. [2] Пасьля кантактаў Ладнова ў Вільні з былымі дзеячамі Найвышэйшай Рады. [3] Ладновам. [4] Паводле кантракту з фірмай IWEG. [5] Ні першы, ні другі нумар у 1921 годзе так і ня выйшлі. [6] «Адраджэньне Беларусі і Польшча». [7] Газэта «Воля Россіи» (Прага).

2743. Ліст Івана Краскоўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.04.1921

Високоповажаний пане Ластоўскі!

Вибачте, що пишу по-українськи — поки що лепше. На великий жаль поіздка моя в Вільно, чого я так бажаю як найскоріше, може затриматись по незалежним від мене обставинам, головним чином финансовим. В кожном разі постараюсь не забаритися. Справу с-р., що яку Ви зі мною говорили я обміркував і маю бажання, як буде треба, за нее взятись. Здається булоб дуже користній и значно полегчало б працю мою участь моя в Раді чи Правленні Виленского Союза кооперативов, про що слід було б сповістити Вільно особливо приймаючи під увагу що 26 буде з'їзд. До того часу я в кожном разі вже буду там. Мій щирий привіт всім приятелям і знаємим. Вітаю Вас з товарами, а значит і з можливісттю поширити працю поставівши ii на справжний шлях.

З товариским привітом
IКрасковскій
1921р. 25/IV
Берлін.
582.1.25:078-079

2744. Запрашэньне Паўнамоцнага Дыпляматычнага Прадстаўніцтва БНР у Літве Вацлаву Ластоўскаму на таварыскі абед у рэстаране «Вэрсаль» з нагоды сьвяткаваньня 3-й гадавіны Незалежнасьці БНР, які мае адбыцца 25.04.1921

582.1.46:017

2745. Даклад Тамаша Грыба, прачытаны на сходзе загранічнае групы Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў з прычыны трэцяе гадавіны абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. 25.III.1918 — 25.IV.1921

Тамаш Грыб

ДАКЛАД

прачытаны на сходзе загранічнае групы Беларускай партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэрау з прычыны трэцяе гадаушчыны абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. 25/III.1918г.-25/IV.21г.

Беларускі высвабадзіцельна-адраджэнскі рух пачынаючы з другой паловы XIX сталецьця, калі ен выяуляуся глауным чынам у адраджэньні літэратуры — значна узмацавауся у часе расейскае рэвалюцыі 1905-1906 г.

Прауда, мы ведаем, што у часе польскага паустаньня 1863 г. — Беларусь таксама узварухнулася і паустала на змаганьне за прывярненьне сабе волі. Кастусь Каліноускі — гэты першы беларускі рэвалюцыянэр, адзін з выдатнейшых начынальнікаў беларускага адраджэнскага руху заіснуушы у няроуным змаганьні з маскоускім царызмам і польскае шляхтай на Лукішскім пляцу у Вільні 7.III.1864 г. ад рукі маскоускіх катаў — голасна казау аб дзяржаунай незалежнасьці Беларусі, аб уваскрошаньні мінулай славы Літоуска-Беларускай дзяржавы. Ен змагауся і загінуу у імя зьдзейсьненьня гэтае «сваей прауды» — завешчау ен змагацца і нам, патомным сваім.

Беларуская Сацыялістычная грамада паустаушы да жыцьця у канцы 1905 г. у Менску — напісала на сваім чырвоным штандары змаганьне за незалежнасьць Беларусі*, як канцавую мэту, як максімум сваіх дамаганьняу, — прауда згаджаючыся прыймаючы пад увагу тагочасныя палітычныя варункі, на фэдэрацыю у мэтах расейскай дзяржаунасьці — гэта быу мінімум праграмы Б.С.Г.

Вялікая усесьветная вайна, а пасьля рэвалюцыя у 1917 г. якая сталася вынікам гэтае вайны — разбудзілі у беларускага народу драмаушую думку дзяржаунай незалежнасьці Беларусі.

З самага пачатку рэвалюцыйнага руху у лютым 1917 г., беларускі народ і уся сьвядомая беларуская інтэлігэнцыя прыймалі актыунае учасьце у змаганьні з маскоуска-царскім візантыйска-татарскім самадзяржауем і разам з рускай рэвалюцыйнай дэмакрацыей старалася устанавіць лад новага жыцьця у свабоднай федэрацыйнай расійскай дэмакратычнай рэспубліцы.

Беларускі Нацыянальны Камітэт у Менску, бежанскія беларускія арганізацыі у Маскве, Петраградзе, Арле, Яраславе, Казані, Кіеве і інш. выставілі і падтрымоувалі лезунг аб аутаноміі Беларусі у межах расейскай дэмакратычнай фэдэрацыі, моцную маючы веру, што рэвалюцыйная дэмакрацыя шчыра адносіцца да ідэі аб федэрацыйнай сувязі усіх народау Расеі.

Аднак, уся дзеяльнасьць часовага расейскага Ураду, ясна даводзіла, што рэвалюцыйны лезунг аб федэрацыйнай сувязі усіх народау Расеі есьць толькі на паперы, а на практыцы утварылася «единая и недѣлимая Расія» з «Всероссійскимъ Учредительнымъ Собраніемъ» на чале, якоя ужо ні бы з ласкі надзяляла аутаноміей усіх «инородцевъ».

Стала ясна і зразумела, што гэта будзе за аутаномія Беларусі, калі аб гэтым будзе пастанауляць не сам беларускі народ, а недзе там далека, у Петраградзе «Всероссійское Учредительное Собраніе» скліканае пад апекай штыкоу «усерасійскага часовага Ураду».

Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый у Менску, беларускія вайсковыя арганізацыі і інш. пачалі дамагацца скліканьня Усебеларускага Устаноучага Сойму, у якім бы сам народ зямлі беларускай свабодна мог заявіць аб сваіх жаданьнях, устанавіць лад свайго унутранага дзяржаунага жыцьця, а таксама і аб форме сувязі з народамі быушай Расіі.

5-17 сьнежня 1917 г. у Менску быу скліканы першы Усебеларускі Зьезд, на якім было каля 700 правамоцных прэдстаунікоу беларускага народу. З'ездам была уканстытуавана Беларуская Народная Рэспубліка і быу выбраны орган дзяржаунай улады у краі — Рада З'езду у складзе 54 асоб.

Гэтай сваей пастановай з'езд адразу увайшоу у востры канфлікт з расейскім «областнымъ комитетомъ Сѣверо-западнаго фронта и области», які адкінуушы усе прапазыцыі прэзыдыуму З'езда, каб знайсьці паразуменьне і устанавіць модус узаемных адносін дзеля змацаваньня здабыткаў рэвалюцыі, а карыстаючыся сваей часовай збройнай перавагай, сілай штыка і кулямета разагнаў Першы Усебеларускі З'езд.

Аднак, ня гледзючы на гэта, дзеяльнасьць Рады З'езду ні на адзін мамэнт не спынілася.

На канспірацыйным сходзе Рада З'езду пастанавіла увайсьці у падзямельле і з туль вясьці змаганьне з узурпатарамі народнай волі, — а дзеля большай канспірацыі выбрала з свайго складу Спауняючы Камітэт у складзе 17 асоб, якому і даручана было кіраўніцтва гэтым змаганьнем.

Спауняючы Камітэт Рады З'езду, папоуніушы свой склад прэдстаунікамі ад нацыянальных меншасьцяу супольна з Цэнтральнай Беларускай Вайсковай Радай распачау актыуную дзеяльнасьць па падгатоуцы паустаньня.

Прауда, ня усе сябры Спауняючага Камітэту — Вайсковай Рады ведалі аб арганізацыі паустаньня — невялікая толькі група фактычна займалася гэтай справай, у распараджэньнні якой даволі было аружжа і дзе якія беларускія вайсковыя часьці.

З 18-га на 19-е лютага 1918 г. у Менску выбухла паустаньне і уся улада перайшла у рукі паустанцау, гэткае-ж самае паустаньне выбухла у Вітэбску, Воршы, Барысаве і шмат у якіх іншых мейсцох Беларусі.

На чале паустанчага руху стау Спауняючы Камітэт Рады З'езду, які да скліканьня Рады З'езду абвесьціу сябе вышэйшай законнай уладай у краі і выбрау Народны Сэкрэтарыят — першы Урад Беларускай Народнай Рэспублікі.

Гэтую адзіна-законную і правамоцную уладу у краі прызналі земскія і гарадзкія дэмакратычныя самаурады і усе нацыянальныя меншасьці, прызнау і абласны камітэт р.п.с.р., які раней быу у апазыцыі да усяго беларускага высвабадзіцельнага адраджэнскага руху.

Шпарка пачала узмацоувацца адрадзіушаяся беларуская дзяржаунасьць. Штодня прыбывалі дэлегацыі з Магілеушчыны, Смаленшчыны і Віцебшчыны і рабілі заявы аб даверыі і падтрыманьні Народнага Сэкрэтарыяту.

Аднак, прыйшоушая у хуткім часе на Беларусь нямецкае акупацыя спыніла рэвалюцыйна-дзяржауную працу Народнага Сэкрэтарыяту на чале якога стаяу член Цэнтральнага Камітэту Беларускай Сацыялістычнай Грамады Язэп Варонко, а таксама спынілася праца і Спауняючага Камітэту Рады З'езду, старшыней якога быу Тамаш Грыб, член Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Зусім зразумела, чаму нямецкія акупанты адразу так жарстка аднясьліся да беларускага ураду — гэты урад быу дэмакратычны і складауся выключна толькі з сацыялістау.

У гэты самы час утвараецца «Беларускае Народнае Прэдстаўніцтва у Менску» на чале з п.п. Скірмунтам, Уласавым і Алексюком, якоя робіць розныя захады перад буржуазна-імпэрыялістычнай кайзараускай акупацыйнай уладай аб перадачы у рукі гэтага самазванага «народнага прадстаўніцтва» усей цывільнай улады на Беларусі.

«Беларуская Народнае Прэдстаўніцтва у Менску» — гэта панска-шляхэцкая арганізацыя, каля якой згуртаваліся ня толькі беларуска-шляхэцкія элемэнты, а і польскія паны з « »[1], у сваім органе «Беларускі Шлях» старалася збэсьціць Спауняючы Камітэт Рады першага Усебеларускага З'езду, гэты рэвалюцыйны орган працоунага народу Беларусі і давясьці акупантам, што толькі адно «Беларускае Народнае Прэдстаўніцтва» мае права казаць ад імя усяго беларускага народу.

Сама сабой, што усе гэтае «народнае Прэдстаўніцтва» было нішто іншае, як лоука прыдуманая панам Скірмунтам авантура, каб карыстаючыся з агульнага крытычнага палажэньня усей беларускай справы — свайго роду сьпекульнуць на ідэі беларускага адраджэнскага руху.

Еднасьць беларускага нацыянальна-палітычнага, высвабадзіцельна-адраджэнскага фронту была аснавацельна няруханa. Распачалося актыунае змаганьне беларускай рэвалюцыйнай дэмакрацыі з шляхтай і польскімі панамі дый паупанкамі.

Каб узмацаваць сваю пазыцыю перад акупантамі у абароне працоуных інтэрэсаў беларускага народу Спауняючы Камітэт Рады Зьезду на 18-е сакавіка назначае сэсію Рады Зьезду і запрашае прэдстаунікоу ад дэмакратычна-выбарных земстваў і гарадзкіх самаурадаў, а таксама і прэдстаунікоу ад нацыянальных меншасьцяу — жыдоускай, польскай і велікарускай прыняць учасьце у працах сэсіі Рады Зьезду. І вось 18-га сакавіка адбываіцца сэсія Рады Зьезду у новым складзе — увайшлі у склад Рады прэдстаунікі ад дэмакратычнага выбраных земстваў, і гарадзкіх самаурадаў і ад нацыянальных меншасьцяу: жыдоускай, польскай і велікарускай. У гэтым новым складзе Рада Першага Усебеларускага Зьезду прыймае назву — Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Якраз у гэты час у Берасьці расійскія бальшавікі дагаварываліся з нямецкімі кайзараускімі гэнэраламі аб падзеле Беларусі на часьці і от-жа Рада Беларускай Народнай Рэспублікі папоуніушы свой склад прэдстаунікамі ад Беларускай Рады у Вільні — гэта ад Заходняй часьці Беларусі, што знайходзілася пад старай нямецкай акупацыей — выносіць рашучы пратэст проці гэтага небывалага гвалту над беларускім народам і на засяданьні 25 сакавіка 1918 г. прыймае Устауную грамату у якой між іншым сказана: «Мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі скідаем з роднага краю апошяе ярмо дзяржаунай залежнасьці, якую гвалтам накінулі расійскія цары на наш вольны і незалежны край».

«Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвешчаіцца вольнай незалежнай дзяржавай.

«На моцы гэтага трацяць сілу усе старыя дзяржауныя зьвязі якія далі магчымасьць чужому ураду падпісаць і за Беларусь трактат у Берасьці, што забівае на сьмерць беларускі народ дзелючы яго зямлю на часьці.

«Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі дзе жыве і мае лічэбную перавагу беларускі народ, а уласьне: Магілеушчыну, беларускія часткі Меншчыны, Горадзеншчыны (з Горадней, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаушчыны і сумежныя часьці суседніх губерняу, заселяных беларусамі.

«Абвешчаючы аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада спакладае свае надзеі на тое, што усе любячыя волю народы дапамо-

гуць беларускаму народу у поунай меры зьдзейсьніць яго нацыянальна-дзяржауныя ідэалы.»

Здавалася-б, што пад гэтым павінны былі-б падпісацца усе чэсныя соцыялісты — аднако-ж, абласны камітэт р.п.с.р. уперся і галасаваў проці прыняцьця гэтае Устауной Граматы, а за ім неяк нясьмела, гуськом земствы і гарадзкія самаурады, але у апошніх нябыло еднасьці паглядау і галасы іх разьбіліся — часьць галасавала за прыняцьце Уста[у]ной Граматы.

Апазыцыя з боку абласнога камітэту р.п.с.р., а так-жа часьці земстваў і гарадзкіх самаурадау, што да абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, была выкарыстана, як асноуны матыу для узмацаваньня беларускай нацыянальнай большасьці у Радзе Рэспублікі тым, каб прыняць у яе склад амаль што ня усе Беларускае народнае Прэдстауніцтво: Асабліва на гэтым настаівалі адны з найстарэйшых членау Б.С.Г. браты Іван і Антон Луцкевіч. Гэткамуж настрою паддаліся і члены Ц.К.Б.С.Г. Язэп Варонко і Аркадзь Смоліч.

Пачаліся гутаркі у напрамку аб'еднаньня з «беларускім народным Прэдстауніцтвам» і к вялікаму задаваленьню братоу Луцкевічау, гэтае аб'еднаньне хутка было дасьцігнута. «Беларускае Народнае Прэдстауніцтво» — нягледзячы на пратэсты левай часьці Б.С.Г. на чале з членам Ц.К.Б.С.Г. Палутай Бадуновай — было прынята у склад Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Тая група, што галасавала проці абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, форменна сабатавала усе паседжаньні Рады Рэспублікі. Відаць было па усяму, што гэтая група чакала толькі удобнага мамэнту, каб зусім выйсьці з Рады Рэспублікі.

Падзеі так склаліся, што ня доуга прышлося чакаць гэтага «удобнага мамэнту». Нацыянальна сьвядомай беларускай большасьцю Рады Рэспублікі — гэта галасамі «Беларускага народнага Прэдстауніцтва» на чале з п. Скірмунтам — была прынята пастанова аб пасылцы тэлеграмы кайзару Вільгельму з падзякай за «вызваленьне Беларусі з пад бальшавіцкага гнету».

Гэтая злошчасная тэлеграма «гэніальнага палітыка і дыплемата» пана Скірмунта мела шмат благіх пасьледстваў.

Па першае, гэтую тэлеграму падпісаў член Ц.К.Б.С.Г. Язэп Варонко і ц.к. не захацеу у тое ці іншае форме рэагаваць на гэты недапусьцімы, з боку сацыяліста, паступак — гэтым самым Ц.К.Б.С.Г. салідарызаваўся з тэлеграмай Кайзару Вільгельму.

Тагды левая частка Б.С.Г. з рэвалюцыйна-народніцкім напрамкам на чале з членамі Ц.К. т.т. Палуты Бадуновай, Язэпа Мамонькі і Міколы Шыло і фракцыя у Радзе Рэспублікі у складзе — Томаша Грыб, М.Пашковіч, Н.Козіч, С.Немкевіч, Л.Сівіцкая і А.Карач — адкалолася ад Б.С.Г. і утварыла зусім самаістую арганізацыю — Беларускую Партыю Соцыялістау-Рэволюцыянэрау; адазвала сваіх членау з Народнага Сэкрэтарыяту: Томаша Грыба — Народнага Сэкрэтара Земляробства, Аляксандра Карача — Народнага Сэкрэтара почты і тэлеграфа і Палуту Бадунову — Народнага Сэкрэтара соцыальнага абеспэчаньня; аднак засталася у Радзе Рэспублікі, як апазыцыя.

Прэдстаунікі-ж земскіх і гарадзкіх самаурадау, а так сама і абласны камітэт р.п.с.-р. пачуушы, што гэта есьць найлепшы, удобны мамэнт, каб

выйсьці з Рады Рэспублікі і стаць у аткрытую апазыцыю да усей яе дзеяльнасьці, а пасколька ня было іншага беларускага нацыянальна-палітычнага цэнтру — гэтым самым сталі у апазыцыю да усяго беларускага адраджэнскага руху.

Узапрауды пачала надыходзіць чорная хмара на ясным небі беларускага высвабадзіцельна-адраджэнскага руху. З гэтага часу на чале большасьці у Радзе Рэспублікі стау пан Скірмунт з сваей хэурай.

Распачаліся тайныя «дыплематычныя» перагаворы пана Скірмунта з кайзароускім гэнэралам Фанкельгэйнам. Рада Рэспублікі даручае пану Скірмунту арганізаваць новы склад ураду; у паветры носіцца думка аб «беларускім вельможным пану Скоропадзкім». Ведама, ня трудна было дагадацца хто будзе «беларускім гэцьманам» з ласкі нямецкіх акупантау. І от-жа раптам аж галава закруцілася у быушага Старшыні Народнага Сэкрэтарыату Язэпа Варонкі — дасадна, чорт вазьмі, як гэта можна праваронiць... «беларускім гэцьманам» будзе пан Скірмунт, а не я — Язэп Варонко. Гэта-ж і я падпісау тэлеграму, і я вернападданічаскі біу сваім халопскім чалом кайзару Вільгэльму. І вось распачалася грызьня, інтрыгі, плеткі. Быушы старшыня народнага Сэкрэтарыяту Язэп Варонка не здае партфеля новаму старшыні пану Скірмунту, які між іншым у свой кабінэт запрасіу і вядомага польскага пана Хржэнстоускага. Пабядзіу нарэшці пан Скірмунт, які больш імпанавау акупантам, як пан і крупны земляусласьнік. Справа, што называецца, наладжавалася. Беларусь зусім аказалася прыгоднай для каленіі нямецкага імпэрыалізму. Аж як гром праняслася вестка аб рэвалюцыі у Нямеччыне; спыніліся залатыя чароуныя сны пана Скірмунта атрымаць у свае уладарства беларускі дзяржауны пасад.

Факт стауся, рэвалюцыя у Нямеччыне усе павярнула па-новаму. У Менску пры штабе Х-ай арміі утварыуся нямецкі «Soldatenrat». Земскія і гарадзкія самаурады супольна, калі не пад дыктоуку абласнога камітэта р.п.с.-р. утвараюць «Исполнительный Комитетъ земскихъ и городскихъ самоуправленій, профессиональныхъ союзовъ и политическихъ партій Бѣлорусскаго края» на чале з «тожэ» беларусам Н.Ярошэвічам. Гэты «исполком» абвесьціу сябе вышэйшай уладай у краі і паставіу сваей найбліжэйшай задачай склікаць «Учредительное Собраніе Бѣлорусскаго Края».

Аднак, ня усе партыі і ня усе профэсыйныя союзы згадзіліся з гэтай чудачлівай ініцыатывай абласнога камітэта р.п.с.-р.

Б.П.С.-Р. стоячы на грунце пастаноу Першага Усебеларускага З'езду выступіла з рашучым пратэстам проці арганізацыі гэткага «исполкома» і запрапанавала, каб земскія і гарадзкія самаурады, а так сама і абласны камітэт р.п.с.-р. йзноу увайшлі у склад Рады Рэспублікі, ці інакш кажучы, каб аб'едналіся з Радай Усебеларускага З'езду, гэтым усенародным беларускім прэдстаўніцтвам — каб такім спосабам выкінуць з Рады Рэспублікі групу пана Скірмунта «Беларускае народнае прэдстаўніцтво», утварыць Раду Рэспублікі у яе пачатковым складзе і устанавіць суд над тымі хто пасылау «вернападданічаскую» тэлеграму кайзару Вільгэльму.

Прапазыцыю Б.П.С.-Р. падтрымоувалі жалезна-дарожны саюз, Беларускі Вучыцельскі саюз і Саюз пачтова-тэлеграфных служашчых.

А «исполком» адкінуу гэтую прапазыцыю і дапамог групе пана Скірмунта у разьбіцьці еднасьці рэволюцыйнага высвабадзіцельна-адраджэнскага беларускага руху.

У гэты час нямецкія войскі пачалі выходзіць з Беларусі — сьледам за імі йшла большавіцкая навальніца.

З адходам нямецкія акупанты вывозілі з сабой усе народныя багацьці Беларусі.

І от-жа група членау Рады Усебеларускага З'езду (беларускіх эсэроу) — арганізуе паустаньні, разаружае нямецкія эшалоны і не дае вывозіць нарабованае народнае дабро з Беларусі. Уся Меншчына была у вагні паустаньняу. Але найбольш магутным было паустаньне у Піншчыне, на чале якога стаяу т. Астроускі, член Рады Усебеларускага З'езду.

Паустаушы проці нямецкіх акупантау — гэткімі-ж самымі акупантамі, гэройскія паустанцы Піншчыны і сумежных паветау Меншчыны, лічылі і надыходзіушую гразу маскоускага большавізму.

Гэтае паустаньне пасьля ужо вясной 1919 г. ціснутае з двух бакоу — з аднаго боку большавікамі, а з другога палякамі — у моры крыві было задушана акупантамі, а т. Астроускі зарыштаваны і адвезяны у Маскву у бутырскую турму.

З апошнім эшалонам нямецкіх акупацыйных войск, эвакуавауся з Менску і Урад Беларускай Народнай Рэспублікі — Рада Народных Міністрау на чале з Антонам Луцкевічам. Рада Рэспублікі распусьціла сябе на не азначаны час.

Не праявіушы ні у чым сваей актыунай дзеяльнасьці, а спадзеючыся на ласку нямецкіх «Soldatenrat'ау» адыйшоу на той сьвет «исполком» — гэтае мертва-роджанае дзіця абласнога камітэту р.п.с.-р.

Захапіушы Менск, большавікі абвесьцілі Незалежнасьць Савецкай Беларусі і сфабрыкавалі у Маскве Урад для незалежнай Савецкай Беларусі і у чэмоданах пераслаушы яго у Менск, каб ашчасьлівіць ім беларускае працоунае селянства. На чале гэтага ураду стаяу вядомы беларускі поэт Жылуновіч (Цішка Гартны).

У сваім маніфэсці да селян і работнікау Беларусі гэты урад абвесьціу «нізложанай» «буржуазную беларускую Раду» і без абароны закона Б.П.С.-Р.

А калі маскоускія большавікі захапілі Вільню і так сама штучна утварылі Незалежную Літоуска-Беларускую Савецкую Рэспубліку на чале з літоускім камуністам Міцкевіч-Капсукасам, Урад Савецкай Беларусі у Менску з «цэнтра» быу скасованы і быу дадзяны загад усім ехаць у Вільню. Спрабавалі было крыху камуністы беларусы паартачыцца, іх заарэштавалі, азялі з іх падпіску, што яны самаахвоць згаджаюцца на падзел Беларусі і на утварэньне «Літбела».

Што-ж, далі падпіску — пакарыліся Маскве.

Аднак, як кожная штучная падбудова — гэты «Літбел» ня сумеу заваяваць сымпатыі народнае масы, ня сумеу грунтоуна умацавацца, а як картачны домік разваліуся пры першым-жа націску з боку польскіх імпэрыалістау.

II.

Вясной 1919 году польскія імпэрыялісты пад знакам вайны з расійскімі комуністамі-большавікамі распачалі вайну на усходзе, карыстаючыся тым, што у калішняй Расіі ідзе вялікая унутраная нацыянальная грамадзкая вайна — яны хацелі коштам Беларусі і Украіны павялічыць сваю тэрыторыю.

Польская вайна на усходзе, ясна раскрыла увесь свой унутраны зьмест, як вайна імпэрыялістычная (дзеля захвата беларускіх і украінскіх земляу), калі пасьля заняцьця Горадні, дзе у той час знаходзіуся урад Б.Н.Р. — Рада Народных Міністрау на чале з Антонам Луцкевічам, дзе знаходзілася так сама і міністэрство па беларускім справам пры літоускай Тарыбе на чале з Язэпам Варонка — польскі гэнэрал Фалевіч адразу разаружыу беларускія вайсковыя фармаваньні, паразганяу усе беларускія установы і арганізацыі. Распачауся нечуваны тэрор проці усяго беларускага жыхарства.

Адразу усе турмы пазапауняліся беларускай сьвядомай інтэлігэнцыей і селянствам. Даволі было прызнацца, што ты беларус, як зараз-жа жандары хапалі, пры дапыце страшэнна ізьбівалі, адсылалі у лагер, або трымалі у турме. Сярод зарэштаваных між іншым былі: вядомы беларускі дзеяч у Горадзеншчыне — Дзекуць-Малей (беларускі эс-эр), вядомы поэт Дварчанін (беларускі эс-эр) і шмат іншых. Было зусім ясна, што польская клерыкальна-імпэрыялістычная буржуазія вядзе вайну за паняволеньня Беларусі, вайну з беларускім народам, з беларускім адраджэнскім рухам.

Па заняцьці Вільні, пан Пілсудзкі, як галоуны начальнік польскіх войск выдае маніфэст да народау гістарычнае Літвы. У гэтым маніфэсьці ен абецае даць волю жыхарам гэтага краю і заяуляе, што ен прывеу свае легіены не для паняволеньня, а толькі для высвабаджэньня з «пад большавіцкага гнету», каб устанавіць парадак «вольных з вольнымі і роуных з роунымі».

Настау вельмі крытычны час для усей справы адраджэньня беларускае дзяржаунасьці.

Урад Антона Луцкевіча змушаны польскімі наезьнікамі пакінуць родны свой край — эміграваў у Эуропу.

Шляхэцка-палонафільствуюшчыя беларускія элемэнты паверылі у пекныя словы абецанкі быушага сацыяліста (П.П.С.) пана Пілсудзкага і ад радасьці ім, як той казау, «в зобу дыханье сперло», яны кінуліся як тыя мухі на мед да ног пана Пілсудзкага і сталі біць сваім халопскім чалом, просячы у Яго Яснавельможнасьці панскае ласкі да засьцянковай беларускай шляхты.

На 10-е ліпня[2] 1919 г. быу скліканы у Вільні «беларускі кангрэс», які павінен быу «нізлажыць» урад Антона Луцкевіча і выбраць новы урад прыемлімы для польскіх акупантау. На чале гэтае авантуры былі: прыхвасьцень п. Скірмунта П.Алексюк ды Аркась Смоліч, міністр народнае прасьветы ураду Ан.Луцкевіча.

«Беларускі Кангрэс» быу скліканы, але такі «паганы» быу настрой у адносінах да польскіх акупантау у з'ехаушыхся беларускіх селян, што арга-

нізатары «беларускага кангрэсу» проста струхнулі і назвалі гэты «беларускі кангрэс», Беларускім З'ездам Віленшчыны і Горадзеншчыны. Не дапамог і званы банкет для членау З'езду, арганізаваны Недзялкоускім і Голувко, членамі П.П.С. сьпецыальна для гэтага прыехаушымі з Варшавы.

Тры дні і тры ночы высказываліся прамовы перд З'ездам; стараліся пераканаць беларускага селяніна, што ен пападзе у «зямны рай» толькі пры дапамозе пана Пілсудзкага і толькі праз Варшаву — аднак, беларускі селянін не надта падкі да пекных слоу і абецанак, ен хоча мець нешта грунтоуна-рэальнае, а перш за усе свае роднае беларускае. Бо ен разумее, ен любіць сваю Беларусь і зусім не хочыць мець нічога супольнага з панскае Польшчай. А пры гэтым надта яшчэ баляць раны нанесяныя самаупрауствам жандармерыі.

Гэтага маглі незразумець толькі гэткія тупыя галовы, як падлыжнік панскі П.Алексюк і вечна захопляны у чароуным сьне высокай дыплемацыі А.Смоліч ды іх прыяцелі Недзялкоускі з Голувко.

Як і трэ' было спадзявацца — З'езд Віленшчыны і Горадзеншчыны з трэскам праваліуся. Выступленьне на гэтым З'ездзе Б.П.С.-Р. з ясна сфармулаванай дэклярацыей расчыніла вочы беларускаму селянству — авантура была спынена.

Прауда, хутка па аканчаньні З'езда былі зарыштаваны члены З'езду беларускія эс-эры: т.т. Тамаш Грыб, выступаючы з дэклярацыей ад імя Б.П.С.-Р. на гэтым З'ездзе і Пауліна Мядзелка, а т.т. Янка Чарапук і Міхась Маркевіч толькі бегствам за граніцу уратаваліся ад польскае турмы.

Пераможны паход польскіх войск ішоу усе упярод ды упярод. Польскія імпэрыялісты захапілі усю пауднева-заходнюю Беларусь аж да Днепра, Бярэзіны і Дзьвіны, захапілі і Менск — гэты рэвалюцыйны асяродак беларускага высвабадзіцельна-адраджэнскага руху.

Усе што толькі было жывое, чыннае і чэснае — задушана было польскімі акупантамі.

На паверх жыцьця усплыла мерцьвячына на чале з Язэпам Лесікам, гэтым «найвыбітнейшым» рэдактарам «Звона» і «Беларусі». У гэтых двух органах — ды яшчэ у «Беларускім жыцьці», што выходзіла пад рэдакцыей па недаразуменьню неяк стаушага палітычным дзеячом, вядомага драматурга — Ф.Алехновіча — складаліся нізкія паклоны польскім панам і шчырая падзяка пану Пілсудзкаму за «высвабаджэньне Беларусі з пад большавіцкага гнету».

Цекава адзначыць, што у той час, як Віленшчына і Горадзеншчына стала пад знакам апазыцыі да польскіх акупантау, Менск стау асяродкам усяго беларускага полонафільства. Пачаліся новыя авантуры, новыя сьпекуляцыі на ідэі беларускага высвабадзіцельна-адраджэнскага руху.

Пры дапамозе «пілсудчыкау» была утворана «Беларуская вайсковая камісія» на чале з п. П.Алексюком, якая павінна была даць сыноу беларускага селянства у рады «беларускіх аддзелау польскага войска», каб абараняць польска-панскія інтарэсы на Беларусі.

І от-жа, каб спыніць уселякую асабістую палітыку розных авантурнікау, па ініцыятыве фракцыі Б.П.С.-Р. у Радзе Рэспублікі (пераважная група членау Рады Усебеларускага З'езду) — склікаіцца у кастрычніку 1919 г. Рада

Беларускай Народнай Рэспублікі папоуненая прэдстаунікамі ад валасных ды павятовых Беларускіх народных Радау.

Абсолютная большасьць у Радзе Рэспублікі была на старане фракцыі Б.П.С.-Р., якая у сваей дэкларацыі горача запратэставала проці самаупрауства акупантау у аснове нарухаушых дзержауную незалежнасьць Беларусі, заявіушы, што на Беларусі толькі сам беларускі народ мае права устанауляць сваю дзержауную уладу і дзеля таго, што Рада Беларускай Народнай Рэспублікі пераняушы сваю уладу ад Першага Усебеларускага З'езду, з'яуляіцца адзіна законным і правамоцным органам народнай улады на Беларусі — уся улада павінна належыць толькі Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі.

Гэтая дэкларацыя вельмі устрывожыла польскіх акупантау. Разагнаць Раду Рэспублікі ім было не выгадна. Яны выбралі іншы спосаб — узарваць Раду Рэспублікі знутры.

І вось знайшліся такія палітычна-адсталыя, шляхэцка-паланофільскія дробна-мешчанскія элемэнты, каторыя па загаду паноу Воеводзкага і Рачкевіча — гэтых двух прэдстаунікоу акупацыйнае улады на Менскі вокруг «Kresów Wschodnich» паднялі нечуваную траулю проці Б.П.С.-Р Амаль не што-дня у газэце «Беларусь» даводзілася, што Б.П.С.-Р. — адны маскалі і навет больш таго «агэнты большавікоу» у той час, як члены Менскай арганізацыі Б.П.С.-Р. т.т. А.Карач, Барташ і Заброцкі зарыштаваныя большавікамі вывязяны у бутырскую турму. Плеткі і мана газэты «Беларусь» былі відавочны. Ня меньш былі відавочны плеткі і брудная мана газэты «Беларусь» калі яна з дня на дзень нападала на Беларускі Педагогічны Інстытут дырэктарам каторага быу прафэсар Ігнатоускі, член Б.П.С.-Р. Газэта «Беларусь» не застанавілася навет і перад тым, каб ясна і аткрыта заявіць, што дзеля карысьці усей беларускай справы неабходна «ізоляваць» Б.П.С.-Р., ці інакш кажучы, гэты падгалосак панскі дамагаўся, каб акупанты спынілі «шкадлівую дзеяльнасьць» Б.П.С.-Р.

Для каго-ж была шкадлівая дзеяльнасьць Б.П.С.-Р.?

Пэуна-ж не для беларускага працоунага селянства, абарону інтарэсау каторага партыя зауседы ставіла у першую чаргу. А дзеяльнасьць Б.П.С.-Р. вельмі шкодзіла вось тое самае панска-шляхэцкае групе, што гуртавалася ля газэты «Беларусь» і «Беларускае жыцьце»; партыя была проці самаупрауства акупантау, а гэныя усе паночкі усімі спосабамі стараліся падладзіцца да акупантау нашае бацькаушчыны і адзін перад адным стараліся зрабіць сабе кар'еру на беларускай справе. Ідэйнасьці і беларускасьці у іх было на столькі, колькі вымагалі гэтага польскія окупанты.

Урад Антона Луцкевіча у гэты час знаходзячыся за граніцай неяк расклеіуся. Усе міністры яго кабінэту рабілі палітыку на свой рыск і страх. Адны міністры былі у Бэрліне, іншыя у Коуне ці у Парыжу, а сам А.Луцкевіч быу чамусьці у Варшаве. На сэсію Рады Рэспублікі з'явіліся толькі А.Смоліч і Тэрэшчэнко, што у той час выпадкова былі у Менску. Адным словам Урад А.Луцкевіча ня меу аднэй цьвердай лініі, ня быу вырашыушы аканчацельна сваіх адносін да польскіх акупантау. І што найбольш дзіунае, Антон Луцкевіч, каторы амаль ня усе свае жыцьце веу антыпольскую палітыку — раптам ен сядзіць у Варшаве, а значыцца вядзе полонафільскую палітыку.

Ведама, пры тым антыпольскім настрою, якім было ахоплена усе сьвядомае беларускае грамадзянства — урад А.Луцкевіча утраціу уселякую папулярнасьць. Больш чымся калі-небудзь час вымагау станоучасьці і яснасьці у палітыцы — урад А.Луцкевіча ні таго ні другога ня меу. Гэта і паслужыла к таму, каб у Радзе Рэспублікі было пастаулена пытаньне аб даверыі ураду А.Луцкевіча.

І вось настау час, калі трэ' было ясна сказаць: з польскімі акупантамі, ці проці іх; ад разрашэньня гэтага пытаньня залежала уся доля ураду Луцкевіча.

Аднак, Антон Луцкевіч, прыехаушы нарэшці з Варшавы апынууся у групе газэты «Беларусь».

Само-сабою, фракцыя Б.П.С.-Р. у Радзе Рэспублікі лёгічна прадаужаючы сваю палітыку і як большасьць у Радзе Рэспублікі азяушы на сябе ініцыатыву утварэньня левага ураду запрапанавала у гэтай справе вясьці перагаворы з правай часткай Рады Рэспублікі з групай беларускіх сацыяльдэмакратау. Ні дачаго ня прывялі усе гэныя перагаворы. Але за тоя 13-га сьнежня 1919 г., калі быу скліканы пленум Рады Рэспублікі, каб аканчацельна вырашыць гэтае пытаньне — шляхэцка-паланофільствуюшчая група на чале з А.Уласавым і беларускія сацыяльдэмакраты на чале з А.Смолічам не з'явіліся на засяданьне Рады Рэспублікі і на прыватнай кватэры абвесьціушы свой сход засяданьнем Рады Рэспублікі выбралі дырэкторыю з пяці асоб у складзе Александра Уласава, Язэпа Лесіка, Сымона Рак-Міхайлоускага, Кузьмы Тэрэшчэнко і Івана Сірады. Гэтую пяцерку яны назвалі Найвышэйшай Радай Беларускай Народнай Рэспублікі. Ураду Антона Луцкевіча было выражана поунае даверые.

А у гэты час зусім легальна у беларускім доме адбывалася засяданьне Рады Рэспублікі. Не зважаючы на тое, што дзьве групы не з'явіліся на засяданьне Рады Рэспублікі — кворум быу поуны. Да фракцыі Б.П.С.-Р. далучылася фракцыя беларускіх соцыялістау-фэдэралістау. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі выбрала новы урад у гэткім вось складзе: Вацлау Ластоускі — старшыня Рады Народных Міністрау, Александр Цьвікевіч — народны міністр справядлівасьці, Еугеній Ладноу — народны міністр загранічных спрау, Белевіч — народны міністр грашовых спрау, Тамаш Грыб (толькі што выпушчаны на волю з Горадзенскае турмы) — народны міністр унутраных спрау і прапаганды, Кляудыш Душэускі — дзержауны сэкрэтар, Лявон Заяц — дзержауны кантралер.

Факт стауся. Утварыліся два урады Б.Н.Р. Адзін урад шляхэцка-паланофільствуюшчы дробна мешчанскі, што хацеу абаперці усе дзержаунае будауніцтва Беларусі на панска-шляхэцкай Польшчы, а другі, а другі селянскі соцыялістычны урад, які абапіраючыся на уласныя сілы працоунага народу Беларусі дау покліч на змаганьне за Незалежнасьць і Непадзельнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі.

Зусім зразумела — польскія окупанты пачалі фліртоваць з «Найвышэйшай Радай», пачалі рабіць ізоляцыю Б.П.С.-Р. Зараз-жа былі заарыштаваны члены Ц.К.Б.П.С.-Р. т.т. Палута Бадунова, Язэп Мамонько і Наум Козіч, быу так сама заарыштаваны і старшыня новаго ураду Вацлау Ластоускі і пасаджаны у Менскую турму.

Але ня доуга прадаужауся флірт польскіх паноу з самазвнай «Найвышэйшай Радай». Выехаушы йзноу у Варшаву, каб рабіць там вялікую дыплематычную справу Антон Луцкевіч быу інтэрнаваны. Усім нарэшці стала ясна, да чаго давядзе полонофільская палітыка увесь беларускі высвабадзіцельна-адраджэнскі рух. Але прыехаушы з большавіцкага палону Вацлау Іваноускі новую распачынае «высока дыплематычную справу» з польскімі панамі. Як-жа, асабістае знаемства з панам Пілсудзкім і усе такое, каб гэта дай не памагло. З'ездзіушы некалькі разоу у Варшаву на бачаньне з панам Пілсудзкім Вацлау Іваноускі пачау усіх пераконаваць, што думка аб незалежнасьці Беларусі есьць не па часе, што у нас беларусоу няма сьвядомай інтэлігэнцыі і навет з нейкім таемным жахам пачау казаць: «а што-ж мы будземо рабіць, калі раптам дадуць нам незалежнасьць, мы нічога ня зробім, зусім ніякай рады недамо...» За Вацлавам Іваноускім пачалі плакаць ды гараваць і усе «найвышэйшыя».

А калі гэтая падгатоучая праца была зроблена — пан Вацлау Іваноускі а з ім Аркадь Смоліч падпісаваюць, як прэдстаунікі Беларусі дагавор з прэдстауніком польскага ураду п. Васілеускім аб культурна-нацыянальнай аутаноміі Беларусі у межах польскае дзяржавы. А пан Скульскі міністр загранічных спрау Польшчы абвешчае на увесь сьвет, што беларусы адракаюцца сваей дзяржаунае незалежнасьці... згаджаюцца толькі на культурна-нацыянальную аутаномію у межах польскае дзяржаунасьці. Гэтая заява была напраулена глауным чынам проці ураду Б.Н.Р. на чале з В.Ластоускім, які у гэты час прабрауся за граніцу і распачау акцыю перад усей культурнай Эуропай у справе абароны сувэрэнных правоу беларускага народу на вольнае незалежнае дзержаунае жыцьце.

Проці гэткае умовы з Польшчай групы «найвышэйшых» запратэставалі усе беларускія арганізацыі: Рада Віленшчыны і Горадзеншчыны, Віленскі беларускі нацыянальны камітэт, Горадзенскі беларускі нацыянальны камітэт, Менскі беларускі нацыянальны камітэт і шмат іншых арганізацыяу.

Ведама, гэтая здрадніцкая умова, як незаконная ні для каго з беларускага грамадзянства не абавязковая і беларускі народ ясна нарэшці уцяміць сабе хто яго есьць вораг і хто прыяцель, праудзівы абаронца яго працоуных інтарэсау.

І вось у той час, як самазваная «найвышэйшая Рада» падпісавала умову аб культурна-нацыянальнай аутаноміі зракаючыся дзяржаунай незалежнасьці нашай бацькаушчыны, а «Беларуская вайсковая камісія» на чале з Паулам Алексюком напружавала усе свае сілы каб уцягнуць беларускі народ у панска-польскую авантуру вайны з Савецкай Расіей дзеля здабыцьця гістарычных межау Польшчы з 1772 г. — у гэты самы час беларускі працоуны народ паустае проці польскай паншчыны і вядзе аткрытае змаганьне за Незалежнасьць і Непадзельнасьць Беларускай селянскаработніцкай Рэспублікі.

На чале гэтага усенароднага паустанчаскага руху стау Беларускі Цэнтральны Паустанчаскі Камітэт, які быу зарганізаваны па ініцыатыве Б.П.С.-Р.

І от-жа не расійская чырвоная армія, а беларускіе паустанцы у трауні і чэрвені 1920 г. праганяюць з роднага краю польскіх наезьнікаў-акупантаў.

Аднак, расійскія камуністы, карыстаючыся сваей збройнай перавагай йзноу прыходзяць на Беларусь і пры дапамозе сваей чырвонай арміі праводзяць «дыктатуру пролетарыята».

Йзноу абвешчаіцца незалежнасьць Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, штучна утвараіцца урад, «Совнарком» на чале з беларусам комуністам Чэ[р]вяком — йзноу падауляіцца воля народная.

І беларускае працоунае селянства пачынае разглядаць савецкую уладу Беларусі, як уладу маскоуска-акупацыйную і з пачатку недзе у глыбокім падзямельлі пачынаіцца ропат нездаволянасьці, а пасьля пераходзе у аткрытае браджэньне і нарэшці у аткрытае змаганьне за Зямлю і за Волю, за Незалежнасьць роднай Беларусі.

Гэтую нездаволенасьць працоунага селянства Беларускай Савецкай, а фактычна маскоускай комуністычна-камісарскай акупацыйнай уладай — стараюцца выкарыстаць дзеля сваіх чорных авантурністычных мэтаў розныя наймыты польскае буржуазіі, як Булак-Балаховіч, Алексюк, Адамовіч і С<упол>ка.

Яшчэ раз пры дапамозе клерыкальна-імпэрыалістычнай польскай шляхты робяцца новыя авантуры, новыя сьпекуляцыі вялікай і сьвятой ідэяй беларускага высвабадзіцельна-адраджэнскага руху.

Але здаровы інстынкт абароны свайго жыцьцевага істнаваньня, інстынкт абароны сваіх працоуных інтарэсаў і, нарэшці, здаровы творскі розум беларускага селяніна-земляроба, ясна падсказавае дзе істнуе небязпека яго жыцьцевым патрэбнасьцям і ен голасна заяуляе, як гэта было у часе Слуцкага паустаньня у лістападзе і сьнежні 1920 г., калі беларускія селянскія паустанцы папраганялі з сваіх радоу агэнтау Булак-Балаховіча — нам ня трэба ні паноу ні бальшавікоу, у сваей гасподзе лад новага жыцьця ствараць мы будзем самі.

Мы беларусы у часе гэтай вайны найболей выцерпелі і найболей палажылі ахвяр (фронт на нашай зямлі трывае ўжо 7мы год), але і абязсілілі фізычна і матэрьяльна. Мы ня можэм аружна барацца. Едыная наша дарога апэляваць да людзкога сумленьня. Гэтаго сумленьня німа у нашых найбліжэйшых суседзеў, дык можэ між Вамі, лепшымі людзьмі заходу, гэты апошні наш аргумэнт знайдзе адгалосак.

Мы хочэм, каб захвачэныя Польшчай беларускія землі (на ўсход ад лініі Керзана) былі узяты так, як і Усходная Галічына пад сувэрэнітэт Лігі Нацый і былі звязаны конфэдэрацыйнай зьвязьзю [з] Літвой, з якой мы ў гістарычным прошлым, як роўныя з роўнымі, пражылі 500 лет нашай гісторыі.

Маю надзею, што нашэ цяжкое палажэньне вызаве ў Вас спогад да нашай слушнай справы.

Прыміце запэўненьне у Вялікай да Вас пашане.

582.1.43:240&r-241&r — р бел

582.2.53:076&r,082 — мк фра

[1] Маецца на ўвазе Лязанская канфэрэнцыя 26-29.06.1916, у якой бралі ўдзел І.Луцкевіч і В.Ластоўскі.

2806. Ліст Яўгена Бачынскага (Жэнэва) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.06.1921 ў справе прапановы й пляну сфармаваньня Бюро прапаганды й абароны Беларусі ў Жэнэве

582.1.43:238-239

2807. Ліст Дэпартамэнту аховы грамадзянаў Міністэрства Ўнутраных Справаў Літвы за 28.06.1921 з тлумачэньнем адносна парадку вяртаньня грамадзянаў Літвы або іх блізкіх з Расеі

582.1.46:062

2808. Bjelarussisches (weißruthenisches) Pressebüro (Kowno, Metropolis 22; Riga, Nikolaistr. 20; Prag, Wenzigowa 4; Berlin W. 30, Motzstr. 21). Nr.25. 28.06.1921

Prof. Aszkenazy wegen der Wilnaer Frage. — Die Wilnaer Frage in Genf. — Sowjetweissruthenien gegen Polen. — Polen beschlagnahmen weissruthenische Zeitungen

582.2.53:086-088 — шк ням
582.2.53:097-099 — шк ням
582.2.53:121-122 — мк рас

2809. Ліст Яўгена Бачынскага (Жэнэва) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.06.1921

582.2.53:108 — ма

Дасланы разам з прапановамі аб заснаваньні ў Жэнэве Беларускага Прэс-Бюро.

2810. Ліст Юстына Ластоўскага (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.06.1921

Wilna
28/VI 1921h

Bratok moj daražeńki!

Natta ciažka žywiecca mnie u aposzni czas i duża b chaciełaby sia ciabie widzić i wykazać toja szto lažyć na dusze a szmat za hety czas sabrałasia. Ja saŭsim zrabiŭsia inwalidam jak duchowa tak i cialesna i mianie paczynaje straszyć buduczyna kanieczna nie maja ale dzietak padchodzi czas szto patreba jch uczyć a tut ja i na pražycio nie spraŭlajusia zarablać. Ciapier ja pracuju u Sajuzie[1] ale czuju szto ja nie adpawiedaju swajmu naz[n]aczeniu i nie mahu taj pracawać jak byłob patreba i heta samosaznanie jeszcze bolej adbiraje enerhiju, wos jak kažuć dusza nie namiejscy.

U nas ciapier mohczyma kupić kusok ziamli ale wos hetaho kupiła jak raz niechapaje, wos heta mysl usio czaściej i czaściej zasiedaje u mianie u Haławie. Mo heta ad taho szto życio stanawicca ciažej i ciažej dyk choczecca uczapicca za ziamielku.

Moj daražeńki kalib ty moh dapamocz mnie u nabyci kuska ziamli mo heta i kalis prydałosiob i dla ciabie by u kancy kancou siły apusciac i niedzie budzie prychinucca na starosci, wos padumaj.

Zatym pasyłaju pakłony ad usich damasznich całujuć ciabie krepka, ja toż szczyra i krepka całuju

twoj brat
Justyn

582.2.53:109&r — ра

[1] Саюз Каапэратараў у Вільні.

2811. Тэлеграма Казіса Грынюса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.06.1921 з падзякаю за віншаваньні з нагоды першае гадавіны працы Кабінэту Міністраў К.Грынюса

582.2.53:084 — а

2812. Ліст Тамаша Грыба (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна?) за 31.06?.1921

Даражэнькі Власт!

Даехалі мы добра. Тут усё ідзе добра.

Сягоньня бачыў пана Зайкоўскага. Ён быў там дзе хацеў быць. Усіх насьледнікаў знайшоў. Цяпер толькі справа аб публікацыі. Ці дадзяны належныя інструкцыі Івану Ляксандру Кузьмічу(?) аб якім Вас прасіў Зайкоўскі?

Прасіў перадаць Вам правітаньне. Яго адрэс: Акмянё Kadagi Zajkouski.

З пашанай Тамаш.

31/XI-921

P.S. Хоця-ж і ня так ужо цёпла — іду купацца ў Нёман. Ня вельмі смачна жыць у Коўні пасьля Палангі!

Перапрашаю, што не разрахаваўся за крупнік. Проста з галавы усё выляцела.

Т...

582.2.58:013&r — ра

Дакладная дата невядомая.

2813. Нататкі алоўкам Вацлава Ластоўскага (?)

Галдѣть — плакаць

Прыехаў зраніцы да Васільковўскаго. Пазнаў Чэрвякова
Быў у Літ. прэдст. Гіліса
Быў у Укр. Камітэце, пазнаў Шэўчэнко

582.2.53:092 — р

Дата невядомая. Згаданыя асобы жылі ў Рэвэлі, куды В.Ластоўскі езьдзіў у ліпені 1921 году.

2814. Нататкі алоўкам Вацлава Ластоўскага

1 Прыем новых сяброў П. і І.Е.

———————

II Ласт.	Смоліч	Стаха
II Душ.	Варонка	Караліна
II Езов.	Лесік	Драмовіч
II Галавін.	Цярэшч.	— —
II Захарко		Čornawok.
II Вальковіч		Nahrodzk.

IV Пігулеускі
IV Гладкі
IV Чэрапук
IV Казячы.

Заяц
Цвікевіч
Будзька
Крычэўскі
Корчынскі

2. Выбары перш. ступені.
582.2.53:093 — р

Дата й абставіны невядомыя. Магчыма, дакумэнт мае дачыненьне да Беларускага Брацтва. Гл.: Показания В.Ю.Ластовского 31-го июля 1920 года // Маладосць. №8. 1993. С.220.

2815. Ліст Файвэля Марголіна (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.07.1921
582.2.53:001&r — ра

З просьбай прыслаць грошы. («Мне сообщают, что к 5-6-му с/м Вы будете располагать весьма крупной суммой денег...»). 7.07.1921 В.Ластоўскі атрымаў у лік пазыкі Ураду БНР ад Ураду Літвы 100 000 аўксінаў.

2816. Рэклямная абвестка зь зьместам газэты «Вольная Литва» (Коўна). №22. 1.07.1921
582.2.53:085 — д

2817. Bjelarussisches (weißruthenisches) Pressebüro (Kowno, Metropolis 22; Riga, Nikolaistr. 20; Prag, Wenzigowa 4; Berlin W. 30, Motzstr. 21). Nr.26. 1.07.1921
Виленскій вопросъ въ Лигѣ Націй.
582.2.53:089-091 — мк рас
582.2.53:100-102 — мк рас

2818. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 1.07.1921 (№111)
Безъ равновѣсія. — Терроръ въ Виленщинѣ. — Пророчества М.А.Бакунина. — Бѣлорусскія культурно-просвѣтительныя учрежденія.
582.2.53:174 — шк

2819. Невядомая тэлеграма за 2.07.1921
Blonski 23 Bracka Varsovie 2/VII 21
Demande cabler jour exacte arrivé Kulwica Varsovie ainsi reseptions documents Wierycz
582.1.04:006 — рк

2820. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 2.07.1921 (№112)

Возстаніе въ Виленщинѣ. — Повстанческое движеніе въ Минской и Могилевской губерніи. — Фальсификація общественнаго мнѣнія.

582.2.53:095 — шк

2821. Нататкі алоўкам Вацлава Ластоўскага

Пасылаць бюлютэні:
Geneve
Rue du Marche, 18
Chambre de Commerce
Ukraino-Suisse
Mr. Batchinsky
582.2.53:096 — р

2822. Тэлеграма Кіпрыяна Кандратовіча (Парыж) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.07.1921

= lastowski hotel metropole kovno

paris 61808 13 2/7 11/50

=votre lettre pas arrivee probablement perdue envoyez copie kondratovitich "
582.2.53:106 — а

2823. Канвэрт ліста Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.07.1921

582.1.49:001

2824. Aux puissances du monde entier. Зварот Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі да дзяржаваў сьвету за 5.07.1921 (Коўна) зь інфармацыяй аб пачатку збройнай партызанскай барацьбы з Польшчай у знак пратэсту супраць мабілізацыі ў Сярэдняй Літве

582.1.11:041-042 — шк фра
582.1.11:043-044 — шк фра

2825. Ліст сям'і Жытлоўскіх (Шварцорт) Самуілу Жытлоўскаму (Коўна) за 5.07.1921

582.2.53:072&r-076&r
582.2.53:077 — канвэрт

2826. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 5.07.1921 (№114)

Современное положеніе бѣлорусскаго вопроса[1]. — Пріѣздъ секретаря Рады Республики.

582.2.53:173 — шк

[1] Пра інтэрвію з В.Ластоўскім у газэтах «Свободное Слово» (Ревель), №44 і «Виленское Слово» (Вільня), №284.

2827. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 5.07.1921 (№115)

Виленскій вопросъ въ новой стадіи.

582.2.53:172 — шк

582.2.53:186 — шк

2828. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 6.07.1921 (№116)

Повстанческое движеніе въ Виленщинѣ.

582.2.53:172 — шк

2829. Пратакол сходу загранічнае групы Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў пры ўдзеле прадстаўнікоў з месцаў у Коўне 7.07.1921

Былі прысутнымі: Т.Т. Т.Грыб, П.Мядзелко, А.Галавінскі, Я.Мамонько, А.Цьвікевіч, В.Ластоускі, А.Вальковіч, І.Краскоускі, Я.Черепук, Л.Заяц, К.Душеускі, У.Міхалевіч, Якімовіч, Казячы.

Парадак дня

1) Інфармацыйныя даклады:

а) т. Мамонькі, прыехаушага з Савецкай Беларусі

б) т. Краскоускага, прыехаушага з Прагі і Вены

2) Дыскусія па дакладам

Сход атчыняе ад імя камітэта загранічпай групы Б.П.С.Р. т. Грыб а 5-ай гадзіне па палудні і прапануе выбраць на старшыню схода т. Галавінскага і на сэкрэтара т. Міхалевіча. Прапазыція т. ГРЫБА сходам аднагалосна прыймаецца.

Т. Цвікевіч прапануе зьмяніць крыху парадак дня і першы чарод заслухаць інфармацыйны даклад камітэта загранічнай групы Б.П.С.Р.

Прапазыцыя т. Цвікевіча прыймаецца.

— —

Т. Грыб робіць даклад ад імя камітэта загр. групы Б.П.С.Р. аб гісторыі арганізацыі загранічнай групы і аб дзеяльнасьці камітэта.

Загранічная група Б.П.С.Р. - кажа т. Грыб - зарганізавалася у пачатку лютага 1921 г., калі адбылася у Коуні нарада усіх сяброу партыі, што знаходзяцца за граніцай і быу выбраны камітэт загранічнай групы з трох асоб. У камітэт былі выбраны т.т. ГРЫБ, ГАЛАВІНСКІ і ЧЭРЭПУК.

І-ая нарада загранічнай групы вынясла цэлы рад рэзалюцый аб адносінах да Савецкай Беларусі, да ураду Б.Н.Р., да Слуцкага Паустаньня і да Венскага кангрэсу.

Была намечана тактыка барацьбы з польскімі акупантамі заходняй часткі БЕЛАРУСІ.

У марцы месяцы была склікана другая нарада загран. групы пры учасьці прэдстаунікоу з мейсц ад Случчыны і ад Городзеншчыны.

ІІ-ой нарадай загран. групы Б.П.С.Р. былі прыняты рэзалюцыі аб адносінах партыі да так званай «Наівышэйшай Рады», да Балахоушчыны і.г.д., а так сама разглядалася партыйная праграма. Была прызнана пажаданым

больш дэтальна распрацаваць праграму партыі, а пакуль што заклікаць партыйных таварышоу моцна трымацца праграмы партыі прынятай на канфэрэнцыі партыі 4-7/III-1920г. у Менску.

17-18-га красавіка была склікана III-я нарада загр. групы Б.П.С.Р. пры учасьці прэдстаўніка партійнай арганізацыі з Віленшчыны[1], так званай «Сярэдней Літвы».

Падробна абгаварывалася справа барацьбы с польскімі акупантамі. Вынесена адпаведная рэзалюцыя.

Пачынаючы з трауня м-ца камітэт загр. групы [брау] чынны удзел у выданьні «Селянскай Долі» ды іншай агітацыйнай літаратуры.

Камітэт увайшоу у зносіны з Літоускімі, Украінскімі, Расейскімі ды інш. рэв. соц. партыямі і падтрымоувае цесны кантакт.

Заяц задае пытаньне, ці ведама камітэту, што у Франкфурце на 8-е ліпня склікаецца бюро Венскага міжнародовага соц. аб'еднаньня.

Т. Грыб, кажа што камітэт загранічнай групы у курсе спрау і прыняты належныя крокі [па] уваходзе нашай партыі у склад бюро.

Справа у тым, калі я быу на Венскім кангрэсе, то з прычыны яшчэ не наладжаных зносін з Менскам калі ня ведама была пазыцыя Ц.К. партыі аб адносінах да трэцяга інтэрнаціянала.

Цяпер гэта справа ужо выяснілася.

Даклад Язэпа Мамонькі

Я прыехау у Менск, - кажа тав. Мамонька у канцы студзеня 1921 г. Становішчэ нашай партыі выявілася вось як:

1) У сьнежні 1920 г. адбыуся партыйны з'езд у Менску. На з'ездзе намеціліся тры цячэньні. Першае на чале з т.т. П.Бадуновай і Трахімавым, якія стаялі на супрацауніцтве з камуністамі. Другая на чале з т.т. Некрашэвічам і Чэржынскім стаялі на тым, каб увайсьці у падпольле і пачаць актыунае змаганьне з камуністамі. Трэцяе на чале з т. Бернікам - лояльныя адносіны з камуністамі.

Напрамак Бадуновай, Трахімава узяу верх.

У менскай арганізацыі была зроблена перэрэгістрацыя.

З'ездам былі выключаны з партыі В.Ластоускі, Я.Чэрэпук і Вальковіч.

На з'ездзе была каля 40-ка прэдстаунікоу на мейсцох.

Быу выбраны Ц.К. у складзе т.т. Тамаш Грыб, Язэп Мамонька, Палута Бадунова, Маркевіч, Шыла і Асецімскі.

Старшынею Камітэта быу выбраны т. Тамаш ГРЫБ.

2) Ц.К. партыі выдавау у Менску свой орган «ЗМАГАНЬНЕ», але на адзінадцатым нумары мусіу спыніць выданьне. Бальшавікі рабілі розныя перашкоды і глаунае што не давалі друкарні (там усе друкарні націаналізованы).

Рэдактарам быу Маркевіч.

3) У Москве быу скліканы з'езд расейскай партыі соц.-рев. групы Вольскага. На гэты з'езд была запрошана і Б.П.С.Р. езьдзіу т. Маркевіч. Рабіу даклад аб беларускай справе. На з'ездзе вынесена рэзолюцыя аб прызнаньні незалежнасьці БЕЛАРУСІ у этнаграфічных межах, але у эканамічнай сувязі з Расеяй.

4) Тов. Трахімау стараўся дагаварыцца з камуністамі.

Расхаждженьня было у справе межау савецкай Беларусі, арганізацыя чырвонай арміі і аб справе выбарау чырвонай арміі у саветы Беларусі. У справе зямельнай, камуністы прынялі нашу праграму з невялікімі корэктывамі. Урад савецкай Беларусі 2/3 абшарніцкай зямлі перадае селянам, а 1/3 застауляе пад казну.

5) На з'ездзе Саветау Беларусі наша партыя мела паважны уплыу — т.т. Бадунова і Трахімау былі выбраны у прэзыдзіум з'езду. Наша партыя была проці разверсткі, але агулам з'езд прайшоу пры радзе і уступцэ з абедзьвюх старон (т.е. Б.П.С.Р. і камуністычнай партыі Беларусі.)

6) Цяпер у Менску працаваць аткрыта нельга. Вельмі трудна і у падзямельлі. Тов. Трахімава церпяць як каапэратара, тов. Бадунова сядзіць у турме.

Тов. Карач працуе у камісарыаце народнай асьветы па унешкольнаму аддзелу.

Аднак не гледзячы на гэта партыйная праца ідзе добра. Істнуюць на правінцыі партыйныя гурткі. (Пяцеркі).

Адно можна сказаць — усе партыйныя таварышы цяпер пераканаліся што з камуністамі абсалютна не магчымая ніякая працауніцтва нашай партыі.

Тов. Цьвікевіч задае пытаньне:

1) Ці працуюць як партыйныя таварышы у савецкіх установах, ці як безпартыйныя?

2) Ці мае вагу селянства?

Тав. Мамонька адказавае, што партыя наша у савецкай Беларусі знаходзіцца на нелегальным становішчы, ніякіх адпаведных пасад не займаюць. Працуюць, як безпартыйныя.

Селяне воража адносяцца да камуністау. Проста ня вераць ім.

Тав. Цьвікевіч яшчэ задае пытаньне:

Якія адносіны нашай партыі да абласных С.Р.[2]?

Тав. Мамонька кажа, што такой партыі фактычна не істнуе. Больш рэволюцыйны элемент далучыуся да нашай партыі, рэшта разсыпалася.

Тав. Вальковіч пытае: як цяпер працуюць усе тыя тры партыйныя групы разам ці не?

Так, працуюць разам - кажа тав. Мамонька - справа аб выключэньні з партыі адложана да партыйнага з'езду.

А як у самы апошні момэнт адносяцца камуністы да Б.П.С.Р. - пытае тав. Грыб?

У апошні час - кажа тав. Мамонька - камуністы пачынаюць лепш крыху адносіцца. Кнорын некалькі разоу ужо рабіу прапазыцію аб супрацоуніцтве, але наша партыя адкінула уселякія перагаворы, бо з Ч.К. немагчыма працаваць. Які можа быць з імі дагавор, калі яны нічога не выпауняюць.

Тав. Міхалевіч дадае, што яму у Вільні адзін камуніст прапанаваў ехаць у Менск і там зрабіць раскол нашай партыі. Потым т. Міхалевіч у кароткім нарысе дае характэрыстыку дзеяльнасьці нашай партыі пад польскай акупацыяй.

Аб дзеяльнасьці партыі у Горадзеншчыне інфармуя тов. Якімовіч. Агулам з інфармацый выясьняецца, што партыйная праца пад польскай акупацыяй ідзе ня дрэнна. Настрой селянства рэвалюцыйный, есьць партыйныя гурткі амаль што па усіх валасьцях. Веска цалком стаіць за намі.

Даклад тав. Краскоускага

Тав. Краскоускі кажа, што украінская партыя С.Р. мяе вялікі уплыу на Украіне, дзе кіруе паустанческімі атрадамі і наогул рэвалюцыйным рухам.

Сярод эмігрантау есьць тры напрамкі:

1) Цэнтральны — адзінство партыі.

2) Лев. Грушэускі (вельмі слабая група з русафільскім уклонам) і Шапавал (гэта паважная група, мае вялікі уплыу на паустанчаскі рух на Украіне).

3) (Правыя) М.Кавалеускі, Жэлезняк ды інш. У справе зямельнай стаяць блізка да народных саціалістау, прызнаюць зямельную уласнасьць.

Усе гэтыя групы грызуцца паміж сябе.

Выдаюць брашуры і кнігі.

Заслухаушы даклад т.т. Мамонькі і Краскоускага сход абгаварывау справу выключаных з партыі, справу арганізацыйную і тактыку партыі.

Тав. Душэускі высказауся, каб выключаныя таварышы маглі і на далей працаваць у загран. групе. Тут сталася нейкая памылка. Трэ зрабіць належныя захады перад Ц.К.

тав. Грыб справу выключэньня з партыі трох таварышоу тлумачыць тым, што адчувауся наогул раскол у партыі. Вышаушы з польскае турмы, я даведаушыся аб гэтым - кажа ен - выняс вельмі прыкрае уражаньне. Бязумоуна гэтую справу трэба найхутчэй уладзіць. З даклада тав. Мамонькі відаць, што цяпер больш як калі патрэбна еднасць у радох нашай партыі.

Конкрэтна ен прапануе выключаным таварышам падаць матывіраваную заяву у Ц.К. з прозьбай, як найхутчэй развязаць гэтую справу.

Тав. Цьвікевіч прапануе, каб загр. група уступілася за выключаных таварышоу і зрабіла адпаведныя захады перад Ц.К. партыі.

Аднагалосна прыймаецца рэзалюцыя:

«Заслухаушы даклад тав. Мамонькі, які давеу да ведама загран. групы Бел.П.С.Р. аб выключэньні з партыі т.т. Ластоускага, Я.Чэрэпука і А.Вальковіча, сход загр. групы Б.П.С.Р., лічыць неабходным увайсьці у разгляд матывау выключэньня з мэтай рэабілітацыі таварышоу перад новай канферэнцыяй партыі. Выключаныя тав. павінны падаць адпаведныя заявы у Ц.К. партыі».

У справе арганізацыйнай прыймаецца рэзалюцыя: «У працягу двух месяцау адбыць нараду загран. групы Б.П.С.Р. з мэтай разгляду праграмы партыі, а так сама запрапанаваць тое ж самае зрабіць Віленскаму і Гародзенскаму камітэтам.

Падняць пытаньне перад Ц.К. аб скліканьні агульна-партыйнага з'езду».

Тав. Мамонька кажа аб тактыцэ партыі. Ен даводзіць, што з бальшавікамі ня трэба міндальнічаць а пара паставіць кропкі над і і пачаць змаганьне усімі даступнымі спосабамі, бо камуністы жулікі яны абманываюць ня толькі нас, но і беларускіх камуністау.

Гэтак сама трэба паступаць і з польскімі панамі.

Тав. Ал.Цьвікевіч, падкрэслівае тое самае. Але да гэтай справы трэ адносіцца вельмі сэр'езна. А у канцы ен сказау: «А усе-ж такі мы будзем у Менску і мы будзем Б.С.Р.»

Тав. Краскоускі падкрэсьлівае неабхадзімасьць весьці змаганьне да канца з імперыялістычнымі замахамі расейскіх камуністау.

Тав. Душэускі высьвятляе практычны спосаб змаганьня на два фронты.

Тав. Грыб тлумачыць, што у справе тактыкі есьць рэзалюцыя першай нарады загр. групы ад 5-га лютага 1921 г. і рэзалюцыі III-й нарады ад 17-18-га красавіка.

У адносінах да бальшавікоу Сав. Белар. там сказана, мы застауляем за сабой права усестароньняй крытыкі, а у адносінах да польскай акупацыі — аружнае змаганьне.

Калі польскія паны адбіраюць ад селяніна землю, бьюць яго бізунамі — мы пакрыуджанаму кажам: «бяры касу серп у рукі... Бьюць цябе бі і ты не паддавайся».

Жывая чалавечая натура (асоба) - кажа т. Грыб, ня можа не рэагаваць на тоя што дзеіцца наувакола яе.

На тэрор мы павінны адказаваць тэрорам, заканчывае тав. Грыб. А канкрэтна ен прапануе, каб і на далей тактыка партыі, пакуль аб'ектыуныя абставіны не зьмяніліся, засталася такой самай.

Прапазыцыя тав. Грыба, аднагалосна прыймаецца.

Перад закрыцьцям схода прыймаецца пажаданьне, каб раз на тыдзень адбываўся сход загр. групы (тых сяброу партыі, што стала жывуць у Коуні).

А палове дзявятай сход зачыняецца.

Старшыня сходу

Сэкрэтар Уладз. Міхалевіч

582.1.31:006-012 — мк

---

[1] А.Карабача. [2] Маецца на ўвазе расейская партыя эсэраў (колішнія «областники»).

2830. Ліст Людвіка Зайкоўскага (Кадагі) Тадэвушу Ўрублеўскаму (Вільня) за 7.07.1921 з просьбай узяцца весьці спадкаемную справу Білевічаў

582.2.58:152 — ра

2831. Ліст Людвіка Зайкоўскага (Кадагі) Сьцяпану Бубешку (Нью-Ёрк) за 7.07.1921 з просьбай знайсьці паведамленьне аб сьмерці Юльяна Білевіча, які памёр у Амэрыцы паміж 1900 і 1906 гадамі

582.2.58:155 — ра

2832. Ліст Людвіка Зайкоўскага (Кадагі) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.07.1921 з просьбай пераслаць лісты С.Бубешку й Т.Урублеўскаму
582.2.58:156 — ра

2833. Расьпіска рэдактара газэты «Litauische Rundschau» Jonas'а [?] за 7.07.1921 аб атрыманьні кнігі А.Цьвікевіча «Адраджэньне Беларусі і Польшча»
582.2.53:077а — ра

2834. Расьпіска рэдактара газэты [...?] Filz'а [?] за 7.07.1921 аб атрыманьні кнігі А.Цьвікевіча «Адраджэньне Беларусі і Польшча»
582.2.53:078 — ра

2835. Расьпіска супрацоўніцы рэдакцыі газэты «Laisve» J.Stulgin. [?] за 7.07.1921 аб атрыманьні кнігі А.Цьвікевіча «Адраджэньне Беларусі і Польшча»
582.2.53:079 — ра

2836. Расьпіска супрацоўніка рэдакцыі газэты «Social-Demokratas» Гаврилова[?] за 7.07.1921 аб атрыманьні кнігі А.Цьвікевіча «Адраджэньне Беларусі і Польшча»
582.2.53:080 — ра

2837. Расьпіска супрацоўніка рэдакцыі газэты «Lietuva»за 7.07.1921 аб атрыманьні кнігі А.Цьвікевіча «Адраджэньне Беларусі і Польшча»
582.2.53:081 — ра

2838. Адрасы й час прыёму урадоўцаў БНР у Коўне

Прозвішча	Адрэс	Гадз. прыема
Гр. Крэчэускі Старшыня Рады Бел. Нар. Рэспубл.	Новая вул., №4	ад 10½ — 12
Гр. Захарка Віцэ-Маршалак Рады Бел. Нар. Р.	Праспэкт Вітаута №20, пам. гэнэр.Зарына.	ад 10½ — 11½
Гр. Ластоускі Старшыня Рады Нар. Міністроу.	Гот. «Мэтраполь» №2	ад 9 рана да 12 веч.
Гр. Жытлоускі Міністр Нацыян. Меньшасьцеу	Гот. «Дагмара» Лайсвес Аллея	ад 5 да 7 веч.
Гр. Вальковіч Міністр Фінансау	Шарлоніс вул. 11, п.1	ад 2½ — 3½ г.

Гр. Душэускі Дзержауны Сэкрэтар	Троцкая д.26	ад 9½ — 10½ рана.
Гр. Грыб Міністр Унутр. Спрау	Лясная вул. 11	ад 11 — 12 гадз.
Заяц Дз. кантралёр	Сэнатарская 10	

582.2.58:157 — мк

Дата невядомая.

2839. Суправаджальны ліст Рады Народных Міністраў БНР [за 8.07.1921], дасыланы з копіямі дакумэнтаў у справе падзелу Беларусі

8-га Ліпеня 1921 г.

Коуна.

ПАВАЖАНЫ ПАНЕ.

Перасылаючы Вам копіі дакументау датычачых падзелу Беларусі, мы лічым сваім абавязкам дадаць да іх зьместу кароткі агляд гістарычных падзей.

У дэклярацыі В.Ц.І.К., ад 23/9 1920 году, паданай на Рыжскіх перагаворах, прапановано Польскай дэлегацыі лічыцца з відавочным і нясуперэчным фактам выяуленьня самаапрэдзеленьня Украіны і Беларусі, адбыушыхся у 1918 году. У той-жа дэклярацыі сказана: «Ісходзя з полнага прызнаньня прынцыпа самаапрэдзеленьня Р.С.Ф.С.Р. ужо у 1917 году прызнала і неізменна прызнае безумоуна і без усякіх агранічэній незалежнасьць і суверэннасьць Польскай Рэспублікі, у 1918 году незалежнасьць і суверэннасьць Украіны і Беларусі, а у 1920 году падпісала мірны дагавор з незалежнай і суверэннай Літоускай Рэспублікай».

У 1918 году суверэнная воля Беларускага народу была выяулена Радай Беларускай Народнай Рэспублікі, абвясьціушай 25 сакавіка 1918 году незалежнасьць Б.Н.Р., у межах з этнаграфічнай лічэбнай перавагай беларускага населеньня.

Да сучаснага момэнту Радай і Урадам Б.Н.Р. захована прыемственнасьць гэтай суверэннай Беларускай Улады.

Такім чынам Р.С.Ф.С.Р. адмовілася ад сваіх суверэнных правоў на Беларусь, паскольк гэтыя правы належалі ей , як прыемніку суверэнных правоу ад Расейскай Імпэрыі, і прызнала, што беларускі народ сам відавочна і несуперэчна выявіу свае правы на незалежнае істнаваньне Беларускай Народнай Рэспублікі.

Вось чаму у складзе Савецкай дэлегацыі прыбыушай на мірныя перэгаворы у Рыгу ня было прэдстаунікоу ад Беларусі, інтэрэсы якой належала па праву бараніць дзяржаунаму органу беларускага народу — Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі.

Дзеля абароны гэтых інтэрэсаў прыбыла у Рыгу да пачатку перэгавораў дэлегацыя прэдстаунікоу Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі.

Яшчэ у пачатку Польска-Расейскіх мірных перэгавораў, калі яны адбываліся у Менску, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі сваею заяваю

ад 20-га VIII-га 1920 году пададзенай прэдстаунікам Польшчы і Расеі выказау свае жаданьне узяць учасьць у Польска-Расейскіх мірных перагаворах, бо Польска-Расейская вайна адбывалася на тэрррыторыі Б.Н.Р.

5-га кастрычніка 1920 году Беларускі Урад у ноце пададзенай прэдстаунікам Польскай і Расейскай дэлегацый на Рыжскіх мірных перэгаворах заявіу другі раз аб сваем жаданьні узяць учасьце у перэгаворах па пытаньню аб Польска-Беларускай і Расейска-Беларускай граніцах.

Польскія дыплематы перад расейскай дэлегацыяй увесь час адкладала пытаньне аб дапущэньні беларускай дэлегацыі на перагаворы, у той самый час яны паралельна і адначасна з расейскімі перэгаворамі вялі асобныя перагаворы з дэлегацыяй Беларускага Ураду.

Гэтыя Беларуска-Польскія перэгаворы адбыліся у Рызе у памешчэньні Польскага Пасольства. З боку Польшчы бралі учасьць у перэгаворах: Польскія афіцыальныя прэдстаунікі на мірных перэгаворах у Рызе: паунамоцны міністр польскі пасол на Прыбалтыку — Васілеускі, польскі пасол у Латвіі прафэсар Каменецкі і члены польскай дэлегацыі Крыжаноускі і Банкоускі. З боку Беларусі былі члены паунамоцнай дэлегацыі на Рыжскія перэгаворы — Старшыня Рады Міністрау Б.Н.Р. В.Ластоускі, Міністр Б.Н.Р. А.Цвікевіч і член дэлегацыі інжэнэр Аусянік.

Польска-Беларускія перэгаворы пачаліся 2 кастрычніка 1920 году і трывалі да 6 кастрычніка 1920 году.

Польшча, яшчэ так недауна (на Більдэрынзгофскай канфэрэнцыі прыбалтыйскіх дзяржау 1920 году) вуснамі таго самага пасла на Прыбалтыку Васілеускага, заявіушая, што яна жадае супрацоунічаць з дэлегацыей Ураду Б.Н.Р., цяперыка у Рызе, парашала свае граніцы з Беларусью устанавіць сама, — аднастароньней сілай сваяго штыка.

Гэта польская імпэрыалістычная палітыка адразуж была узята на увагу савецкай дэлегацыей, — сумеушай падстроіць Польшчы дыплематычную лавушку:

Вярхоуны дзяржауны Расейскі орган В.Ц.И.К. у сваей дэклярацыі ад 23 верэсня 1920 году на Рыжскія перэгаворы (якая дэклярацыя, дзякуючы спрыту старшыні Расейскай дэлегацыі — Іоффе, была прачытана у самым пачатку перэгаворау) заявіу:

«Расейская Рэспубліка прызнала і прызнае суверэнныя правы беларускага народу, ясна яшчэ у 1918 гаду, выявіушага сваю волю да незалежнага дзяржаунага жыцьця».

Гэтай заявай В.Ц.И.К. зусім зразумела і катэгарычна паставіу польскую дэлегацыю перад фактам істнаваньня суверэннай Беларусі; гэта значыць, што ні Расейская ні Украінская дэлегацыі, не маюць жадных правоу распараджацца этнаграфічнай тэрррыторыяй суверэннага (не будучага у вайне з Польшчай) беларускага народу.

Польская дэлегацыя ня толькі, ня пажадала учапіцца за выданай ей Савецкай дэлегацыяй козыра, — афіцыяльная адмова ад прытэнзій на Беларусь, а нават, не пажадала паказаць віду, што разумее зробленый Савецкай Расейскай дэлегацыяй крок і дэклярацыю В.Ц.И.К. «прапусьціла кола вушэй».

Нават больш таго польская дэлегацыя пажадала «не застацца у даугу» і таксама зрабіла «пекны жэст».

Старшыня польскай дэлегацыі Домбскі на паседжаньні 4 кастрычніка 1920 году у сваей дэкларацыі заявіў: «Польская Рэспубліка, не чакаючы пачыну з боку Расеі, прызнала незалежнасьць Літвы, Украіны і Беларусі».

Затым у самай Польска-Расейска-Украінска-Рыжскай умове сказана: «Абедзьві дагаварываючыяся стараны згодна з прынцыпам самаадзначэньня народаў, прызнаюць незалежнасьць Украіны і Беларусі».

І усеж-такі, ня гледзючы на тое, што першым параграфам Рыжскай умовы былі празнаны суверэнныя правы беларускага народу, Польшча, жадаючы ~~падпарадкаваць сабе~~ падтаптаць пад сябе Заходнюю Беларусь, пачала дамагацца, каб Савецкая дэлегацыя прыкрыла польскі імпэрыялізм «фігавым лістком» — каб расейцы, украінцы, благаславілі Польшчу на уладаньня паловай Беларусью (на што ні пад якім варункам ня згаджауся суверэнны беларускі народ) Савецкая дэлегацыя згодзілася на дыктуемыя тагочасным, пераможцам, умовы міру. У Рызе расейцамі і украінцамі з аднаго боку а палякамі з другога была праведзяна польска-беларуская граніца.

Заходняя Беларусь апынілася у сфэрэ уплывау шляхецкай Польшчы, а усходняя — у сфэрэ уплывау Маскоускіх камуністау.

Рыжскай умовай Расейцы і Украінцы атрымалі магчымасьць выйсьці з скрутнага становішча на фронце.

Забязьпечыушы свой фронт з боку Палякау, Савецкая Расея і Украіна адным ударам зліквідавалі укрыушыяся за крымскімі цьвярдынямі вайска Урангеля.

Польшча так сама задумала скарыстаць мамэнт. — Палякі паспыталі прарабіць аналагічную камбінацыю супраць Літвы. Яны нарыхтавалі прэуславатае выступленьне «Мяцежнага генэрала» — Жэлігоускага.

Расейска-Украінская савецкая дэлегацыя, правеушы з палякамі Польска-Беларускую граніцу, «прадала» палякам амаль што палову Беларусі, «прадала» тоя, што на заяве самай жа Расеі (Дэкларацыя В.Ц.И.К. ад 23/9 1920 г.) дауно ужо не належала расейцам «прадала» уласнасьць (стаушага яшчэ у 1918 году суверэнным) беларускага народу.

На усход ад лініі рыжскага прэлімінарнага міру быу, у прысутнасьці расейскіх акупацыйных войск (а значыць і пад расейскім такім, або іншым уплывам, а нават і дауленьням, пасколькі расейскія вайска бралі дачыненьне у выбарах,), скліканы 16 студзеня 1921 году зьезд Саветау Беларусі. Гэты зьезд рэволюцыйным парадкам, адцягнуу сабе ад Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі суверэнныя правы на Усходнюю Беларусь, і укан[с]цітуавау Савецкую Уладу у Усходнюю Беларусь.

Канешні, беларускі народ зауседы можа забраць назад перэдадзеныя ім у 1918 году Радзе і Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі свае суверэнныя правы, — і узноу можа выявіць сваю волю так, як яму будзе пажаданым. Але у данным выпадку зьезд быу зроблены пад прэсыей большэвікоу і выбраны зьездам Савецкі Урад не яуяецца голасам усяго насяленьня, а толькі голасам аднэй комуністычнай партыі.

Дапусьцім нават, што зьезд Саветау Усходней Беларусі адбыуся праведлова.

Ці меу ен паунамоцства перадаць Польшчы суверэнныя правы на Заходнюю Беларусь?

Не, 1) Заходняя Беларусь на зьезде не была прэдстаулена, а значыць зьезд сам не атрымау, ня меу суверэнных правоу на Заходнюю Беларусь і тым больш ня меу магчымасьці перадаць суверэнныя правы на Заходнюю Беларусь Польшчы, бо сам ня меу таго, што трэба было перадаць.

2) Сьезд Саветау Усходняй Беларусі рэцыфіцыраваушы пад прымусам Рыжскую умову, і гэтым адзначыу свае граніцы з Заходней Беларусьсю, апыніушайся пад Польскай Акупацыей. Тый-жа самы зьезд, адначасова выразіу пратэст супраць панаваньня Польшчы над Заходняй Беларусью і зрабіу заяву, што беларускі народ ніколі не пагодзіцца з падзелам Бацькаушчыны і з залежнасьцю яе ад чужынцау.

Абедзьві спыніушыя вайну і дагаварыушыяся у Рызе стораны зрабілі насільства над беларускім народам.

Мало таго, што у працягу трох гадоу руйнавалі і нішчылі край і жыхароу, напрыканцы замест таго, каб зьвярнуць нанесенныя нейтральнай Беларусью, дзякуючы вайне, страты, узноу зневажылі і крывала пакрыудзілі беларускі народ.

Польшча пабедзіцельніца, — Польшча прадзіктаваушая Умову Рыжскага міру, — Польшча усюды дэкляраваушая аб сваей прыхільнасьці да Беларускага народу і да беларускага вызваленчыскага руху, загнала справу беларускага адраджэньня у сваю турму.

Вось чаго варты і да чаго даводзяць пекныя абецанкі польскіх шляхецкіх заправіл.

Беларусь падзялілі. Падзялілі паміж сабою рызы абяздоленнага народу. Падзялілі тэррыторыю таго народу, суверэнныя правы якога толькі што былі урачыста вызнаны самімі-жа бязлітаснымі рэзьнікамі.

Падзялілі ня гледзючы на воплі пратэстау з усіх куткоу змучанай Беларусі.

Пратэстъ Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі ад 8/10 20 году супольна з галіцыйскімі украінцамі.

Пратэст Беларускай Дзяржаунай Нарады ад 20/10 1920 году.

Пратэст конфэрэнцый Беларускіх Соцыялістычных партый ад 21/10 1920 году.

Пратэст Беларускага Горадзенскага Нацыянальнага Камітэта ад 5 лістапада 1920 году.

Пратэставалі і з часткі Беларусі адышоушай у сферу уплывау Расейскіх - Зьезд - Саветау Усходняй Беларусі ад 1920 года.

Пратэставалі не адручаныя шовіністычным угарам і лепшыя сыны польскага народу (Варшауская рада рабочых дэпутатау 7/10-1920 году прыняла гэтакую рэзалюцыю: «Рада работніцкіх Дэлегатау стверджае, што прынятая лінія замірэньня разрэзаючая жывое цела Беларускага і Украінскага народау, ня можа быць усходняй граніцай Польшчы, бо уключэньне у Польшчу чужых народау грозіць Польшчы разьвіцьцем шовінізму і нацыянальных сварок. Асноваю для вызначэньня граніц павінен

быць прынцып этнаграфічны». Перапечатка з Варшаускай газеты «курьера параннага» у «Беларускім слове» у №9 ад 14 кастрычніка 1920 году.)

Разглядзім як Расея і Польшча выйшлі з досіць невыразнага, трымаючага у сябе унутранную суперэчнасьць становішча, — сваей Рыжскай Умовай, яны падзялілі у адсутнасьці дэлегатау, прызнанай імі суверэннай Беларусі, жывое цела беларускага народу.

Прымусіла свае дзецішчэ падпісаць Рыжскую Умову.

Затым у 1921 гаду была падпісана Расейскай і Беларускай, як-бы незалежнымі, савецкімі рэспублікамі, умова аб фэдэрацыі.

Не кажучы, ужо аб тым, што прэусловатая расейская фэдэрацыя нізьвела незалежную савецкую Беларусь у становішчэ аутаномнай у культурна-прасьветных справах, расейскай правінцыі.

Калі Польшча не жадае мець заслужанную ею, пазоручую яе клічку, — то яна павінна раздабыць сабе правы на Заходнюю Беларусь, або адмовіцца ад Беларусі.

Польшча павінна або дагаварыцца з Урадам Беларускай Народнай Рэспублікі, які зьяуяецца праведловым гаспадаром, пераданых яму населеньнем Заходней Беларусі суверэнных правоу, або раздабыць гэтыя правы безпасрэдна ад пауседнага суверэна сваіх правоу — самага населеньня Заходняй Беларусі.

У апошнім выпадку, для праведловага выяуленьня волі населеньня Заходней Беларусі, Польшча павінна:

1) Даць магчымасьць усім бежанцам Заходней-Беларусі зьвярнуцца на Бацькаушчыну.

2) Аслабаніць усіх заарыштаваных і інтэрніраваных за палітычныя «правіннасьці» — за тоя, што прызнаючы сябе грамадзянінам Заходней Беларусі, яны адстаівалі суверэнныя правы беларускага народу на Бацькаушчыне.

3) Польшча павінна вывесьці свае войскі і адміністрацыю, якіх павінна заменіць нейтральная або мяйсцовая улада. Гэта улада можа правесьці усенароднае галасаваньне (рэфэрэндум) і запытацца у населеньня ці жадае яно прылучыцца да Польшчы, ці не.

І калі большасьць населеньня выскажыцца аб сваем жаданьні прылучыцца да Польшчы, толькі у такім выпадку Польшча будзе уладаць Заходней Беларусью па праву.

Уселякое «выяуленьне волі» населеньня Заходней Беларусі, Польскай акупацыйнай уладай ня можа быць свабодным (бо акупацыйная улада сваекарыстна зацікаулена у выніках галасаваньня) а патаму уселякія подпісы якія вымагае Польшча ад населеньня Беларусі і іншыя камбінацыі акупацыйнай улады у справы «выяуленьня волі» населеньня зьяуляюцца зьдзекам і глумам над знішчаным абяздоленным населеньнем Заходней Беларусі.

Тоя, што вырабляе польская адміністрацыя і рожныя агенты акупацыйнай улады, ня можа дазволіць сябе ні адна цывілізованная шануючая справядлівасьць і законы дзяржава.

Так угледаюцца беларусы на усі захады, якія робіць на сваю карысьць у Заходней Беларусі Польшча.

Толькі над агульным кладбішчам беларускага населеньня Польшча можа запанаваць ад Заходней Беларусью.

Ніколі Беларускі народ, законным парадкам, не перадасьць сваіх суверэнных правоу над сваею Бацькаушчынай.

Рыжская умова таіць у сябе прэцындэнт (якога Польшча нікалі ня зможа палагодзіць) для вайны.

Гэта вайна неуніклена пры кожнай зьмене палітычнай сітуацыі на усходзе, або на Заходзе Эуропы.

Беларускі народ не жадае, каб яго бацькаушчына была арэнаю новых вайсковых пажарау.

Нам не пажадана здабраць свае нівы польскай, або чыей небудзь іншай крывею.

Беларускі народ жадае сталага, трываннага міру і спакою, а патаму ен не зможа пагодзіцца з Рыжскай міравой умовай.

К Вам, узяушым на сябе адпаведны абавязак даць змучаннаму чалавецству мір і парадак, к Вам Вялікія Дзяржавы і к вам грамадзяне вялікіх народау зьвяртаецца беларускі народ і просіць:

«Калі Вы жадаеце справядлівага сталага міру, то дамагайцеся перэгляду Рыжскай Польска-Расейскай-Украінскай Умовы, у справе граніц суверэннай Беларусі.

Справядлівы, сталы мір будзе толькі тады, калі ен будзе зроблен на падставах вялікіх лезунгау сучаснага чалавецства — мір на падставах самаадзначэньня народау».

«Беларускі народ жадае, а Вы можыця і забаавязалісь і даць такі мір чалавецству».

Ю.Гладкі-Ластоускі
Кіраунік Канцэлярыі Рады Народных Міністрау
582.2.58:164-168 — шк бел
582.2.51:001-007 — шк фра
582.2.53:025-031 — шк фра[1]
582.2.53:130-136 — шк фра

[1] Да дакумэнту далучаная візытоўка князя П.П.Тумбэра-Маліноўскага.

2840. Візытоўка князя П.П.Тумбэра-Маліноўскага
PRINCE P.P. TOUMBAIR-MALINOVSKI
GÉNÉRAL DE BRIGADE
582.2.53:024 — д

2841. Канвэрт ліста Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.07.1921
582.2.53:104

2842. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 8.07.1921 (№117)
Воззваніе Бѣлорусскаго Національнаго Союза.
582.2.53:184-185 — шк

2843. Справаздача Давіда Анэкштэйна (Бэрлін) з побыту ў Бэрліне старшыні жыдоўскай нацыянальнай Рады ў Літве Сымона Розэнбаўма за 9.07.1921

Справаздача з пабыту
старшыні жыдоўскай нацыянальнай Рады на Літве
п. С.Я.Розэнбаума ў Бэрліне

Пан Розэнбаум прыехаў ў Бэрлін у панедзелак 4 ліпеня зрану.

Мы спатыкалі яго на вагзале і прыгатовалі пакой ў місіі. Яшчэ ў той самы дзень мы устроілі яму сустрэчу з выдатным сіяністам д-ром Якобсоном, з якім ён таксама абгаварываў і нашыя справы.

5 ліпеня п. Розэнбаум быў у нямецкіх сіяністаў ў сваіх справах, аліж парушыў таксама і нашае пытаньне.

6 ліпеня ў вечару ён быў ў нас на дому і спаткаўся там з д-рам Сімховічам, п. Гурвічам і п. Блюменфельдт.

7 ліпеня мы з п. Бароўскім абгаварывалі з нім справу пазыкі. Ён казаў нам, што ён ужо абгаварываў гэта пытаньне з п. міністрам Пурыцкісам, і апошні казаў яму, што ён згаджаецца каб Літва дала або гаранціровала пазыку. Міністр Пурыцкіс таксама казаў, што ён гуторыў на конта нашай пазыкі і з Мееровічам, і апошні таксама згаджаецца. Калі я праважаў яго на вагзал ў Прагу, дык п. Розэнбаўм яшчэ раз абецаўся напісаць з Дрэздэна міністру Пурыцкісу ў гэтай справе.

Пан Розэнбаўм абецаўся, што калі ён будзе варачацца праз Бэрлін, дык ён нас аб гэтым паведаміць.

Трэба адзначыць, што той факт, што п. Розэнбаум стаяў весь час ў нас зрабіў вельмі прыхільнае ўражэньне на сіяністаў і наагул на ўсіх уплывовых жыдоўскіх дзеячоў.

Бэрлін, 9 ліпеня 1921 г.

Раднік місіі ў Нямеччыне Д.Ю.Анэкштэйн
582.2.12:001&r

2844. Канвэрт ліста Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.07.1921
582.2.53:019

2845. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 9.07.1921 (№118)

Бѣлоруссія и Святѣйшій Престолъ. — Декларація Бѣлорусскаго Національнаго Союза.
582.2.53:103 — шк

2846. Ліст былых сяброў Найвышэйшае Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Сымона Рак-Міхайлоўскага й Кузьмы Цярэшчанкі (Вільня) Браніславу Тарашкевічу (Варшава) за 10.07.1921

Яго Міласьці
Паважанаму Пану
Брониславу Тарашкевічу.

Дзеля таго, што ў апошнія часы ў месьце пашыраюцца праз кагось-ці чуткі аб істнаваньні Беларускага Ураду, які атрымаў свае паўнамоцтва ад Найвышэйшае Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, — гэтым падаём да агульнага ведама, як былыя сябры Найвышэйшае Рады, што такога Ураду не істнуе, sama Найвышэйшая Рада даўно ужо спыніла свае фактычнае істнаваньне — хаця ня мела магчымасьці фармальна ліквідавацца і з гэтае прычыны дакумэнты і паўнамоцтва, выдадзеныя ад Рады, страцілі сваю моц і ўсе выступленьня ад імя Найвышэйшае Рады Беларускае Народнае Рэспублікі з гэтага часу будуць лічыцца самазванчымі.

Вышэйшае абвешчаецца праз газэты. Перад гэтым паведамляем Вас аб зьмесьце вышэйшай дэкляpацыі і прапануемо спыніць чыннасьць б. дэлегацыі Найвышэйшае Рады.

Сымон Рак-Міхайлоўскі
KozTereszczenko
10-VII-1921 г.
м. Вільня
582.2.37:068 — ра

2847. Запрашэньне міністра нацыянальных меншасьцяў БНР Самуіла Жытлоўскага Вацлаву Ластоўскаму за 11.07.1921 прыбыць 12.07.1921 дзеля гутаркі на тэму «Жыдоўскае пытаньне ў Беларусі» у гат. «Мэтропаль» гаспода №22 (Коўна)

582.1.46:015

У архіве Беларускага Прэс-Бюро захаваўся тэкст паведамленьня аб гэтай сустрэчы:

Бѣлорусско-еврейское сближеніе.

12-го іюля состоялось въ Ковнѣ совещаніе бѣлорусскихъ и еврейскихъ дѣятелей и журналистовъ. Присутствовали бѣлорусскій премьеръ-министръ В.Ластовскій, министръ національныхъ меншинствъ С.Житловскій, государственный секретарь К.Душевскій, извѣстный бѣлорусскій дѣятель И.Красковскій, редакторъ «Вольной Литвы» Я.Воронко, совѣтники министерства иностранныхъ дѣлъ — А.Головинскій, М.Каганъ и И.Цвикевичъ, шефъ бѣлорусскаго прессбюро, д-ръ И.Лурье и еврейскіе общественные дѣятели и журналисты: М.Н.Крейнинъ, Л.С.Бабковъ, Бен-Адиръ, С.В.Познеръ, редакторъ газеты «Ди Идеше Штимме» Лейзеровичъ и др.

На совещаніи были затронуты вопросы объ объединеніи бѣлоруссовъ и евреевъ для совмѣстной борьбы за независимость Бѣлоруссіи; въ теплыхъ рѣчахъ г.г. Крейнинъ, Бабковъ и Лейзеровичъ отмѣтили то горячее сочувствіе, которое питаетъ національное еврейство къ бѣлорусскому дѣлу. С.В.Познеръ предло

Въ теплыхъ рѣчахъ гг. Бабковъ, Крейнинъ, Лейзеровичъ и Познеръ отмѣтили то сочувствіе, которое питаетъ національно настроенное еврейство къ бѣлорусскому дѣлу и подчеркнули готовность еврейскаго народа поддерживать бѣлорусскій народъ въ его борьбѣ за свѣтлую будущность. С.Житловскій въ краткомъ очеркѣ обрисовалъ взглядъ руководящихъ бѣлорусскихъ круговъ на совмѣстную [дѣятельность] съ еврейскимъ населеніемъ и прочиталъ декларацію бѣлорусскаго

правительства о суверенности еврейской націи въ Бѣлоруссіи. Послѣ рѣчей д-ра Лурье, Я.Воронки и Красковскаго съ краткой рѣчью выступилъ В.Ластовскій, въ яркихъ чертахъ охарактеризовавшій бѣлорусскія настроенія по отношенію къ евреямъ и выразившій надежду, что условія жизни на Бѣлорусии сложатся такъ, что оба народа сумѣютъ мирно развивать свою культурную и экономическую жизнь, не ассимилируя другъ друга и не препятствуя каждой изъ суверенныхъ націй Бѣлоруссіи занять подобающее ей по праву мѣсто въ странѣ. (LVA 634.1.01:010)

2848. Суправаджальная запіска Міністэрства Міжнародных Спраўаў БНР за 12.07.1921 (вых. №0437) Міністэрству Міжнародных Спраўаў Літоўскай рэспублікі да перасланых у адказ на «цэдулу ад 4-га Ліпня №7216» матэрыялаў аб Беларускім Таварыстве Апекі над Дзецьмі «Золак»

582.1.15:011 — мк
582.2.53:171 — мк

2849. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 12.07.1921 (№119)

О Бѣлоруссіи[1]. — Поляки и бѣлорусскіе бѣженцы. — Польскія власти и еп. Владимиръ. — Бѣлоруссы и евреи[2].

582.2.53:023 — шк

[1] Пра інтэрвію з В.Ластоўскім у газэтах «Путь» (Гельсынгфорс). №106. 30.06.1921 і «Свободное Слово» (Ревель) [тады ж]. [2] Пра артыкул у газэце «Вольная Литва» (Коўна). 10.07.1921 на тэму «жыды ў беларускім руху».

2850. Чарнавік адкрытага ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) Камісарыяту Асьветы РСФСР (Масква) за ?.??.1921

Адкрыты ліст да Камісарьяту асьветы Р.С.С.С.Р.

У часе акупацыі Вільні савецкімі войскамі ў канцы 1918 году, калі я быў загранічай, у маей кватэры, Завальная вуліца д. №7, пры некалькіх обысках былі забіраны розныя рэчы між імі рэчы мастацкай і гістарычнай вартасьці. Між іншымі рэчамі забраны пэргамэнтны сьпісак летапісі Турава-Пінскага княжства ў дубовай крытай чорнай скурай аправе з сярэбранымі аздобамі. Формат кнігі малы, in folio, чатыраста некалькі карцін, пісаны некалькі характарамі; найстарэйшая, першая часьць (63 лісты) датавана 6625 годам (1117 год Нар. Хр.), апошнія карціны у ліку 42 пісаны рукой Івана Васілевіча Яраславіча кн. Пінскага у пачатках XVI ст., які гэну летапісь укамплетаваў і аправіў, што відаць было з допісі на апошняй страніцы.

Адначасна з летапісьсю з маіх калекцый прапалі пэргамэнтныя граматы XV-XVI у ліку 60. Між імі важнейшая грамата Івана Яраславіча кн. Пінскага (дарчая); Стэфана Баторага (лацінская) наданьне Віленскай Акадэміі мураваных дамоў на Скапоўскай вуліцы; загад полацкага князя Брачыслава тысяцкаму Яворко быць з 800 комони на Вербную нядзелю у Плескова (без даты) з алавянай пячаткай, бульля Папежа Піуса VI да беларускіх біскупаў усходняга абраду з алавянай пячацьцю, рэшта грамат былі розныя наданьні прыватным асобам, царквам, манастырам і інш.

Пры обысках у маей кватэры былі:

Рэзыгнуючы што гэты рэчы мне зьвернуты ня будуць я, дзеля вялікай гістарычнай цэннасьці памянёных рэчэй, прашу Камісарьят Асьветы, калі яны, як я мяркую, ў яго руках знаходзяцца, перадаць іх ў ~~Петраградзкую~~ Менскі Інстытут Беларускай Культуры, а калі дагэтуль у К. Асьветы не паступілі далажыць высілкаў каб іх адшукаць і пераслаць па назначэньню

582.1.47:025-024

Дата невядомая.

2851. Выпіска з пратаколу сходу Прэзыдыюму Рады й Рады Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі за 14.07.1921

ВЫПІСКА

з пратаколу сходу Прэзыдыума Рады і Рады Міністрау Беларускай Народнай Рэспублікі 14 ліпеня 1921 году.

Праслухаушы даклады старшыні Рады Міністрау і міністра нацыянальных меньшасьцяу аб гвалтах, якія чыняцца у акупаваных бальшавікамі і палякамі частках Беларусі, бандытамі над мірным жыдоускім жыхарствам Прэзыдыум Рады і Рада Міністрау Беларускай Народнай Рэспублікі пастанауляе усімі магчымымі спосабамі спыніць гэтыя ганебныя і пазорныя чыны.

Для гэтага:

1) зьвярнуцца да народу беларускага з адозвай, каб ен не толькі не прымау учасьцьця у пагромах, але каб усімі спосабамі змагауся проціу іх;

2) пры помачы арганізацыі і асобных людзей у краі зарганізаваць рад лекцый, рэфэратау і мітынгау у справе жыдоускай, праводзячы там думку, што народы беларускі і жыдоускі есьць братнія і маюць поунае права жыць і разьвівацца на Беларусі побач, што пагромы не толькі есьць рэч пазорная, якая ганьбіць тых, хто іх падтрымлівае, але і некарыстныя, бо апроч ганьбы ніякіх рэзультатау не дае;

3) выдаць цэлы рад кніжак і брашур па жыдоускаму пытаньню;

4) зьвярнуцца да беларускіх палітычных партый і грамадзкіх арганізацый, каб яны падтрымалі і дапамаглі сваім голасам і чынам народу беларускаму і яго ураду змагацца проціу жыдоускіх пагромау на беларускай зямлі.

З арыгіналам згодна:
Дзержауны Сэкрэтар К.Душэўскі
582.2.58:035 — мк
582.2.58:177 — мк

2852. Зварот Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі да беларускіх партыяў і арганізацыяў у справе жыдоўскіх пагромаў у Беларусі

Праэкт.
К.Душэускага.

ДА УСІХ ПАРТЫЙ І АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСКІХ.

Цемныя людзі і банды праступнікау, хочучы з аднэй стараны апаганіць імя беларускае і скампраміваць Беларусь перад усім сьветам, з другой стараны проста хочучы паграбіць чужое дабро, пачынаюць ганебную справу — пагромы жыдоу на Беларусі.

Беларускія народныя масы у гэтых пазорных чынах учасьцьця не прымаюць, наадварот змагаюцца з гэтым. Але паасобныя людзі, будучы уведзенымі, дарогай нашоптау усякіх прахадзімцау, у заблуджэньне могуць прымкнуць да пагромшчыкау.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі клічэ усе партыі і арганізацыі на Беларусі а так сама усіх чэсных людзей дапамагчы народу беларускаму у яго барадзьбе проціу гэтых пагромшчыкау, каб ніводная кропля нявіннай крыві не была праліта на зямлі беларускай.

Арганізуйце лекцыі, мітынгі, рэфэраты, выдавайце адозвы і наагул кажучы высьветляйце усякімі спосабамі ганебнасьць і непатрэбнасьць пагромау і гвалтау над нявінным і братнім нам народам жыдоускім.

Памятуйце, што калі вам удасца выратаваць хоць аднаго чалавека ад страшнай сьмерці, то і гэта будзе ужо вялікая заслуга.

582.2.58:037 — мк
582.2.58:178 — мк
582.2.53:124 — мк

2853. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 14.07.1921 (№120)

Собесѣдованіе по еврейскому вопросу. — Бѣлоруссы въ Чехословакіи. — Польскій учебникъ географіи. — Къ судьбѣ Восточной Галиціи. — Рижскій миръ трещитъ.

582.2.53:128-129 — шк

2854. Тэлеграма Кляўдыюша Душэўскага (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Рыга) за 16.07.1921

= RIGA NIKOLAJEWSKAJA 20
ESOWITOF LASTOWSKI

= CHUCEJ PRIJEZZAJI KLAUDE

582.2.53:111 — а

2855. Хадайніцтва Старшыні Рады Народных Міністраў БНР перад кіраўніком Беларускага Аддзелу пры Літоўскім Прадстаўніцтве ў Латвіі Уладзімерам Грунтовым за 18.07.1921 (вых. №150) аб выплаце Кастусю Езавітаву належных яму 30.000 латвійскіх рублёў

582.1.29:016

2856. Паведамленьне Старшыні Рады Народных Міністраў БНР сябру Рады БНР Кастусю Езавітаву за 18.07.1921 (вых. №151) аб хадайніцтве перад кіраўніком Беларускага Аддзелу пры Літоўскім Прадстаўніцтве ў Латвіі Уладзімерам Грунтовым

582.1.29:015 — рк

2857. Weißruthenisches Pressebüro (Kowno, Metropolis 22; Riga, Nikolaistr. 20; Prag, Wenzigowa 4; Berlin W. 30, Motzstr. 21). Nr.28. 18.07.1921

Русско-польскій конфликтъ и Бѣлоруссія

582.2.58:023-025 — мк рас

2858. Паштоўка Людвіка Зайкоўскага (Кадагі) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.07.1921 з просьбай перадаць інфармацыю з Масквы пляменьніку Білевічу ў Коўне

582.2.58:153 — ра

2859. Ліст Зьмітра Дарашэнкі (Райхенаў) Беларускаму Прэс-Бюро ў Коўні за 18.07.1921 з падзякаю за дасланыя матэрыялы («Сялянская Доля» і інш.) і з абяцаньнем напісаць артыкул пра Беларусь у амэрыканскую украінскую газэту «Свабода»

[...] P.S. Як що кого з Ваших бібліографів се інтересує, то подаю звістку, що в №3-4 укр. бібліографічного журнала «Книжка», що виходить у Станіславові, надруковано мою рецензію на «Гісторыю беларускае літэратуры» М.Гарецкага [...]

582.2.58:175&r - ра

2860. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 18.07.1921 (№122)

Бѣлоруссы, литовцы и украинцы въ Америкѣ. — III Интернаціоналъ о Бѣлоруссіи. — Въ Совѣтской Бѣлоруссіи. — «Бандитизмъ въ Совѣтской Бѣлоруссіи».

582.2.53:123 — шк

2861. «Правілы для гасьцей», пісаныя Вацлавам Ластоўскім

Ку памети а ку розсудкови вашому Достоиные Гости

Полировность свецкая яко і обычайливость людзкая наказують заховывати в господе певные годные доброродчости Вашое прыстойности

а прото:

опалков серных, окурков папиросных і іншых речей, ачколечи зужитых, тым не меней плюгавостю тхнучых, на помостье не кидати, абы господа негоднаго осельніка, сердце Вамі свое веселячого, не уподоблялася стайни Аўгіевое, яко то часто крот часу струячого бывае.

О што просечи полецаюся полировности Вашое.

Негодны Послуг Слуг Вашых

582.2.58:154 — р

Дата невядомая.

2862. Weißruthenisches Pressebüro (Kowno, Metropolis 22; Riga, Nikolaistr. 20; Prag, Wenzigowa 4; Berlin W. 30, Motzstr. 21). Nr.29. 19.07.1921

Совѣтская Бѣлоруссія въ войнѣ съ Желиговскимъ?

582.2.58:026 — мк рас

582.2.58:027 — мк рас

582.2.58:028 — мк рас

2863. Ліст Кіпрыяна Кандратовіча (Парыж) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.07.1921 з паведамленьнем аб тым, што Альбэрт Бодры аддаў архівы Місіі БНР у Парыжы й друкавальныя машынкі Ладнову

582.2.58:148&r-149 — ра

2864. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.07.1921

19.VII.21.
Рыга.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

атрымаў сенека ў 12 гадзін Ваш паважаны ліст ад 10.VII.21 і страшенна здзівіўся:

1, ліст пісаны — 10.VII, здадзены ў Коўні — 14.VII, прыняты ў Рызе — 18.VII, а вручан мне толькі 19.VII;

канвэрт да ліста дадаю, каб Вы мелі магчымасьць апратэставаць яго перад літоўскай поштай за страшэннае затрыманьне;

2, «другі» пакет з газэтамі Вам пасланы не быў, бо я апрацоўвал выметкі з іх ў «Н<ашу> Д<умку>»; сенека на пошту здадзены;

3, пішаце, што ўсе лаюцца за памешчэньне Балаховіча ў «Graphic»[1] і дадаеце: «Я яшчэ раз прашу Вас перэстаць яго рэклямаваць побач з беларускімі дзеячамі і ў беларускай справе...»

Я на гэта, Вацлаў Юстынавіч, змушэн яшчэ раз Вам разстлумачыць, што ў «Graphic» і побач з Вамі і са мной Балаховіч папаў без маей на то згоды.

4, спраўкі ў Міністэрстві аб дазваленьні ўезда ў Латвію па морэ нашым дамам зроблены, але аказалася, што яны ніякіх тэлеграмаў і вестка ў з Ковенскага Латвійскага Консульства ў гэтай справе да гэтага часу не маюць;

трэба за кошт едучых, але праз Латвійскае Ковенскае Консульства, тэлеграфаваць ў Міністэрства [...] Рыгу, даўшы адначасна спраўку мне, ці Грунтову [...] (таксама па тэлеграфу) аб дне пасылкі тэлеграмы;

5, ў «другім пакэці» пасылаю Вам і фатаграфічныя карткі, якіх Вы ў мяне забыліся ўзяць;

6, ці перэдаў Вам і ці добра давез Янка Вам маю картку; чэкаю Вашай.

Новасьцеў пакуль што ніякіх нема.

Шлю прывет.

З вялікай пашанай

К.Езавітаў

P.S. Не адмоўце ў вялікай ласкі з дамамі пераслаць мне кніжкі Цвікевіча, як мага больш, а таксама і кнігі, якія пераховываюцца ў Язэпа Варонкі.

Добра б было каб Вы Вашым аўтарытэтным лістом падагналі «Вызваленьне» з высылкай выпісанных мной палтара месяца таму назад кніжак.

582.2.58:181-182 — ра

[1] У брытанскім тыднёвіку Graphic, №2683, 30.04.1921, быў зьмешчаны артыкул пра беларускі рух і сем фотаздымкаў, сярод іх — Балаховіча.

2865. Ліст невядомага аўтара ў рэдакцыю газэты «Эхо» (Коўна) з водгукам на артыкул «Странная позиція гг. бѣлоруссовъ» (23.07.1921)

582.2.58:173 — мк

2866. Нататкі Вацлава Ластоўскага. Накід пратэсту супраць парушэньня літоўскімі ўладамі дагавору 11.11.1920

...Літоўскіх уласцей парушае §3 нашай умовы ад 11.XI.20
~~Што даводзячы да Вашага ведама Ведама П.Д. чакаем~~
~~Апошнімі часамі~~

Урад Б.Н.Р. ~~пачынае~~ атрымлівае лісты і пакеты ускрытые і перэцэнзураваные Ковенскай почтай.

На аснове §3 нашай умовы ад 11.XI.20 Урад Б.Н.Р. ~~протэстуе супроць~~ карыстаецца правам экстэрыторыальнасьці у Літоўскай Дзяржаве
~~Урад Б.Н.Р. протэстуе супроць~~

Такое паступаваньне...

582.1.25:070r

Дата невядомая.

2867. Зварот Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі да Камісіі ў справе дапамогі эмігрантам былой Расейскай Імпэрыі з просьбай аб дапамозе беларускім эмігрантам і ўцекачам

582.2.58:160-163 — мк

Дата невядомая.

2868. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) міністру замежных справаў Літоўскай Рэспублікі за ??.07.1921

Яго Дастойнасці
Пану Міністру Міжнародных Спраў
Літоўскай Рэспублікі.

Выходзячы з векавечнай дружбы і ўзаемных прыязных адносін народаў Беларусі і Літвы Урад Б.Н.Р. _____

Апошніе падзеі на тэрыторыі захопленай Жэлігоўскім і імкненьня Польшчы выкорыстаць нацыональную разрозненнасць насяленьня Віленшчыны з мэтай унясьці раздор ў прыязные адносіны між Беларусамі і Літвінамі, а такжэ розныя злонамерныя выступленьня прэссы і разсеваные чуткі пра змену Бел. Літоўскіх адносін вымагаюць выражэньня на [зья? зне?] векавечнай дружбы і ўзаемных прыязных адносін, якіе знайшлі сваё выражэньне у Умове ад 13.XI.20 паміж Урадам Б.Н.Р і Урадам Літоўскай Рэспублікі.

Таму Урад Б.Н.Р. просіць Вас паведаміць ці не знаходзіць Урад Літ. Рэспублікі дзеля пацьверджэньня добрых адносін своечасным і карысным апублікаваньне вышэйпамянутай Умовы.

582.2.58:179&r — рк

Дата невядомая.

2869. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) міністру замежных справаў Літоўскай Рэспублікі за ??.07.1921

Яго Дастойнасці
Пану Міністру Міжнародных Спраў
Літоўскае Рэспублікі.

Паважаны Пане.

З вялікай прыкрасцю прыходзіцца мне сцвердзіць перад Вамі факты

а) злоснай дыскрэдытацыі і агітацыі супраць нашаго Ураду а такжэ беларускай дзержаўнасці літоўскай тэрыторыяльнай прэссай, пры істнаваньню, на аснове ваеннаго палажэньня, урадовай цэнзуры;

б) зневажлівае адношэньне да Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі і яе органоў са стараны урадовых устаноў і урадовых асоб Літоўскай рэспублікі;

в) часовае інтэрнаваньне служачых Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі;

г) не прызнаваньне пашпартоў, выданых грамадзянам Беларусі, нашым Консульствам, акрэдытаваным пры Урадзе Літвы і арэштовываньне грамадзян з нашымі дакумэнтамі, як безпашпартных.

582.2.58:180 — рк

Дата невядомая.

2870. Нататкі алоўкам — запыты ў справе становішча беларусаў у Літоўскай Рэспубліцы перад Міністэрствам Беларускіх Справаў

582.2.50:041 — р

Дата невядомая.

2871. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 20.07.1921 (№123)

Противъ погромовъ. — Въ Виленщинѣ. — Бѣлорусское Прессъ-Бюро въ Эстоніи[1]. — Въ Совѣтской Бѣлоруссіи. — Митрополитъ Роппъ о Бѣлоруссахъ

582.1.22:001

[1] Въ Ревелѣ начало функціонировать отдѣленіе Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро. Во главѣ Бюро стоитъ Н.Червяковъ. Адресъ для писемъ: Ревель, Пост-кастъ 153.

2872. Ліст сакратара Ўсходняй Камісіі (Коўна) рэдакцыі газэты «Вольная Литва» (Коўна) за 20.07.1921 з дасланай інфармацыяй аб забойстве ў Сужанах[1]

582.1.46:037

[1] Дакумэнт №2778.

2873. В Бѣлоруссіи (Отрывок из письма) // Воля Россіи (Прага). №258. 20.07.1921

582.2.59:015 — д

2874. Зварот Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі да Лігі Нацыяў і замежных Урадаў за 20.07.1921 (вых. №51) у сувязі з выбухам на Віленшчыне паўстанцкіх рухаў

582.2.53:116&r-117&r — мк

2875. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ («Метрополь», 22) за 21.07.1921 (№124)

Бѣлорусское движеніе и «Польская инсценировка». — Денаціонализація промышленности въ Совѣтской Бѣлоруссіи

582.1.22:002
582.1.22:003

2876. Ліст Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 21.07.1921 з паведамленьнем аб перадачы ў газэты інфармацыі пра Беларусь і з просьбай прыслаць грошы

582.2.58:151 — ра

2877. Ліст Файвэля Марголіна (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.07.1921 у справе вырашэньня фінансавых праблем, кампэнсацыі выдаткаў на «заготовленіе» беларускіх кніг у Бэрліне (выдавецтваў «Шлях» і «Вызваленьне») паводле дагавору з БНР за 10.01.1921

582.1.25:052&r-054&r
582.1.25:051 — канвэрт

Выкладзеныя ў лісьце абставіны: Ф.Марголін выехаў у студзені 1921 году з Коўна ў Бэрлін, дзе заснаваў выдавецтва «Шлях». С.Жытлоўскі быў у Бэрліне ў канцы красавіка 1921 году й патрабаваў гатовыя кнігі. Гатовыя на той час былі: «Граматыка» Тарашкевіча і «Зорка» ч.1., рыхтаваліся «Зорка» ч.2 і «Вершы» Янкі Купалы. Ад канца траўня Ф.Марголін працаваў у выдавецтве «Вызваленьне» А.Цьвікевіча.

2878. Бѣлоруссія: Русско-польскій конфликт и Бѣлоруссія // Воля Россіи (Прага). №260. 22.07.1921

582.2.59:014 — д

2879. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Нюрнбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.07.1921

Нюренберг 23 Іюля 1921.

Глубокоуважаемый Пане Старшыня!

Спѣшу написать до подробнаго доклада пару слов.

1. Банк. Справа Банка принципіально принята, причем «Ивег» дает для основного капитала 5.000.000 м. За их спиной будет стоять консорціум банков с большими капиталами. Наши интересы будут оговорены и обеспечены.

2. О наших товарах. Вслѣдствіе того, что нам товары не доставлены во-время, а также вслѣдствіе низкаго качества товаров, мы на нѣкоторые товары (костюмы) получили значительную скидку, нѣкоторые вернем им обратно (наприм. сельско-хозяйств. орудія), нѣкоторыя ны возвращаем обратно (5000 пар обуви) для продажи в Германіи и получили под них ссуду около 1.000.000 мар., причем окончательныя условія этого займа будут окончательно выработаны в понедѣльник.

Во всяком случаѣ твердо надѣюсь, что без наличных грошей из Нюренберга не уѣду и на товарах мы не очень потеряем. -

Очень хотѣл-бы знать, какіе результаты от Вашей поѣздки в Ригу. Надѣюсь, что согласно Вашего обѣщанія Вы соблаговолите меня поставить в извѣстность по этому вопросу.

Из Берлина в среду напишу подробно.

С искренним уваженіем имѣю
честь быть готовый к услугам
душевно Вам преданный
С.Житловскій

582.1.25:045&r
582.1.25:044 — канвэрт

2880. Ліст Вацлава Ластоўскага Міністэрству Міжнародных Справаў Літоўскай Рэспублікі ў справе перасланых 12.07.1921 у адказ на «цэдулу ад 4-га Ліпня №7216» матэрыялаў аб Беларускім Таварыстве Апекі над Дзецьмі «Золак»

Як быушы Старшыня Беларускаго Таварыства апекі над дзяцьмі «Золак» у справе атрыманых мною у 1918 гаду на патрэбы таго-ж Таварыства Ад Літоўскай Дзяржаўнай Рады 25.000 (двадцаці пяці тысяч) марак сведчу ніжэйпісанае.

За здадзеные у кассу Таварыства грошы Кіраўніцтво Таварыство купило:

400 мэтр. сукна а 25 м. 10.000
200 коўдар суконных а 40 м. 8.000
150 сеннікоў а 15 м. 2.250
200 пар. бялізны 4.750
Усяго 25.000.

У сьнежні таго-ж 1918 году я быў камандараваны Літоўскай Дзержаўнай Радай заграніцу і калі праз сем месяцоў (у Ліпні 1919 году) вярнуўся у Вільню ужо Таварыство было зліквідавана

Ластоўскі

582.2.58:150 — мк
582.2.53:170 — р В.Ластоўскага

2881. Паштоўка Валянціны Краскоўскай (Бэрлін) Івану Краскоўскаму (Коўна) за 25.07.1921

582.1.25:050&r

2882. Тэлеграма Вацлава Ластоўскага (Коўна) Аляксандру Цьвікевічу (Бэрлін) за 25.07.1921

25.VII.1921
Berlin
Motzstrasse 21
Mission Zwikiewicz

Kozdy dzien czekajem was stop szto raz horszyje stasunki prydziecca wyjezdzac stop paśpieszajcie adres hascinica lewinsona Kreczewski archiwy nie wiazicie Lastowski

582.2.58:176 — рк

2883. Ліст Міжнароднага Камітэту Чырвонага Крыжа (Жэнэва) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.07.1921

582.1.25:047
582.1.25:048 — канвэрт

Адказ на ліст за 5.07.1921.

2884. Паштоўка Кляўдыюша Душэўскага (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.07.1921

Даражэнькі

Я жыву покуль што на «Kaiser Str. N3III bei Wilkowski» але дзеля таго што магу кожную хвіліну выехаць, то падаю адрэс другі.

Пішы па адрэсу: Deutschland, Königsberg i Pr. Herrn K.Duschewski bei Frau Reimann Prinzenstr, 15III.

Покуль што КДуш

582.1.25:049&r

2885. Ліст паверанага ў справах Нямеччыны ў Літве Шёнбэрга (Коўна) рэдакцыі газэты «Вольная Литва» (Коўна) за 28.07.1921 з просьбай аб надрукаваньні ў газэце паведамленьня

582.1.46:035

2886. Сьпіс справаў Консульства БНР у Рызе й Вайскова-Дыпляматычнай Місіі БНР у Латвіі за 1919-1920 гады, здадзеных кіраўніком Канцылярыі РНМ БНР Юрыем Гладкім-Ластоўскім Васілю Захарку 28.07.1921

582.2.45:001&r — мк

2887. Сьпіс справаў Канцылярыі Рады Народных Міністраў БНР за 1920 год, здадзеных кіраўніком Канцылярыі РНМ БНР Юрыем Гладкім-Ластоўскім Васілю Захарку 28.07.1921

СПІС

Справам Канцэлярыі Рады Народных Міністрау Беларускай Народнай Рэспублікі, за 1920 г.

1) Справа №2-й, Асабістага складу Беларускай Народнай Рэспублікі.
2) Справа №3-й, Загады Рады Народных Міністрау.
3) Справа №3-а, Цыркулярау.[1]
4) Справа №4-й, Літоуска Беларускія умовы.
5) Справа №5-й, Зносіны з міссіямі Б.Н.Р.[2]
[№6 Зносіны з замежнымі дзержавамі[3]]
6) Справа №7-й, Міравыя перагаворы з Расеяй.
7) Справа №8-й, Рыжская Мірная канфэрэнцыя.
8) Справа №9-й, канфэрэнцыі Прыбалтыцкіх дзержау.[4]
9) Справа №10-й, канфэрэнцыя у Жэнэві.
10) Справа №11-й, канфэрэнцыі Нацыан. Паліт. Соцыал. Парт. у Рызе.[5]
11) Справа №12-й, Копіі выбываючых папераў.[6]
12) Справа №12-а, Вайсковыя справы.

13) Справа №13-й, Справа паступаючых паперау.[7]
14) Справа №14-й, Справа К.Душэскага.[8]
15) Журнал выбываючых паперау Рады Народных Міністрау Б.Н.Р.[9]
16) Журнал паступаючых паперау Рады Народных Міністрау Б.Н.Р.[10]
Сэкрэтныя справы
28.VII.1921 Ю.Гладкі-Ластоўскі
Кіраўнік Канцэлярыі

Усе выжэйпералічаныя справы здау. Ніякіх дакумэнтау да свайго ужытку мною не затрымана.
Ю.Гладкі-Ластоўскі

Справы прыняу В.Захарко
582.2.45:003 — ма

[1] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.095.
[2] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.059.
[3] Справа пад №6 за 1920 год з гэткім назовам захоўваецца ў НАРБ, 325.1.098.
[4] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.108.
[5] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.107.
[6] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.103.
[7] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.110.
[8] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.051.
[9] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.156.
[10] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.154.

2888. Сьпіс справаў Канцылярыі Рады Народных Міністраў БНР за 1921 год, здадзеных кіраўніком Канцылярыі РНМ БНР Юрыем Гладкім-Ластоўскім Васілю Захарку 28.07.1921

СПІС

Справам Канцэлярыі Рады Народных Міністрау Беларускай Народнай Рэспублікі, за 1921-й год.

1) Справа №1-й, Агульныя зносіны.
2) Справа №2-й, Зносіны з Замежнымі Дзержавамі.
3) Справа №3-а, Зносіны з місыямі Б.Н.Р.[1]
4) Справа №3-б, — — — —.
5) Справа №4-й, Зносіны з Беларускімі арганізацыямі у Краі.[2]
6) Справа №5-й, Асабісты склад канцэлярыі Р.Н.М. і усіх урадоуцау.
7) Справа №6-й, Для паперау фірмы «Івэг».
8) Справа №7-й, Умовы паміж усякімі дзержавамі.[3]
9) Справа №8-й, Беларуская Палітычная Нарада.[4]
10) Справа №9-й, Агітацыйная літэратура.[5]
11) Справа №10-й, Матэрыялы да Беларускай Агітацыйнай літэр.[6]
12) Справа №11-й, Копіі Мэморыялоу дэклярацый и г.д.
13) Справа №12-й, Зносіны Нацыянальных меншасьцеу і жыд. спр.[7]
14) Справа №13-й, Печаткі і Блянкі.[8]
15) Справа №14-й, «Выдавецтва».[9]
16) Справа №15-й, Прэссъ-Бюро.[10]
17) Справа №16-й, Зносіны з Літвой і Брюссэльская канфэрэнц.[11]

18) Справа №17-й, Копіі нот і дакумэнтау.
19) Справа №18-й, Рэлігыйныя справы.[12]
20) Справа №19-й, Паустаньня.
21) Справа №20-й, Дублікаты.
22) Выходзячый журнал.
23) Входзячый журнал.[13]

28.VII.1921 Ю.Гладкі-Ластоўскі
Кіраўнік Канцэлярыі

Усе выжэйпералічаныя справы здау. Ніякіх дакумэнтау да свайго ужытку не затрымау.

Апрача таго мною здадзены: адна круглая печатка (каучукавая) Канцэлярыі Рады Нар. Мін., адна такая жа печатка для ляку і усе штемпеля Канцэлярыі Рады Народных Міністроу.

Ю.Гладкі-Ластоўскі

Усе пералічаная прыняу В.Захарко
582.2.45:002 — ма

[1] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.147.
[2] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.115.
[3] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.096.
[4] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.169.
[5] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.164.
[6] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.220.
[7] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.119.
[8] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.208.
[9] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.129.
[10] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.112.
[11] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.167.
[12] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.128.
[13] Справа захоўваецца ў НАРБ, 325.1.157.

2889. Заява кіраўніка Беларускага Прэс-Бюро ў Коўне Ісака Лур'е старшыні Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму за 28.07.1921 з просьбай вызваліць яго ад займанае пасады
582.2.58:146 — ма

2890. Тутэйшы. Вясеньняя ноч. Апавяданьне. 29.07.1921
582.1.39:014-015&r — ра

2891. Ліст невядомай асобы Максиму (?)

Дорогой Максим!

Твои записочки я получил только две.

Жена еще не приехала, но получил письмо что скоро будет. Пишет что от П.П. привезет большое письмо.

Никонор на старом месте, П П тоже. Соломон чувствует себя хорошо — работает в каком то снабженіи. Получил сведение что в Пухов растрелян Председ Вол кома и помощник, боюсь не Пархомчик ли и Сырец, но

если так то волость в будущем наша. Остальное все то что и ты знаешь. Насчет голода преувеличено, комиссарчики смеются. Приехал Протас, говорит что выбрался ему помоч Блоусе [Белоусс] и твой Брат. с Бел эвака, они имели громадный скандал что дали твоей жене пропуск.

Пиши подробно, здесь хуже чем у тебя, наших газет нет, есть только все черносотенные и совдепския.

Петр [?] пишет с Праги, я его просил как бы приехать он отвечает что подал прошение в Мин Иностр Дел и обещает что в Варшаве дадут визу.

Когда жена приедет, то поехал-бы.

Если ты будешь в Праге то узнай у Пети на счет этого. Целую тебя твой Бом.....

Кланяйся жене и всем знакомым.

582.1.24:001

Дата, аўтар, адрасат і абставіны невядомыя.

2892. В.Масьляк. «Паход Налівайкі». Верш

582.1.24:030&r — мк

Дата невядомая.

2893. Нататкі Васіля Захаркі (8.1921 ?)

1. Прыняць належныя крокі к палягчэньню зварота бежанцаў, якіх не прапускаюць палякі. У ноте ці у прэс-бюро апісаць іх мукі

2. Напісаць ноту, а калі гэта не выпадае даць належныя стацьі у загранічную інастранную прэсу (можна адозву ад нацыанальнай сувязі) аб паланізацыі Беларусі, аб польскам казацствѣ, школках і на огул аб польскіх мэтах кіруючыхся да знішчэньня беларускаго народу.

3. Даць стацью пад загалоўкам «Вільня» аб закрыцьці беларускіх газэт і аб прэдпаложанай высылцы з Вільны, к часу сбору Сэйма, усіх няпэуных для палякаў людзей.

3. Спытацца у міністра прапаганды як расходзіцца літэратура, якой у Віленшчыні німа

Абязаць яго дастауленьнем перыадычных дакладау, праз каго калі куды і сколькі атпраўлено літэратуры.

4. Як раагаваць на павятовыя сэймікі і Віленскі сэйм. Чаму не вядзецца беларуская прапаганда у павятовых сэймiках

5. Моц Савінкова і слабасьць беларусаў

582.2.12:060&r-061&r

Дакладная дата й абставіны невядомая.

2894. Справаздача з сустрэчы палкоўніка Шардыньі зь невядомымі дэлегатамі ў Вільні

Polacy czy Białorusini.

W odpowiedzi przedstawicielowi Ligi Robotnoczej, Chardigny przyznał, że Wilno jest miastem polskim, ale po chwili dodał «polsko-żydowskim». Przyznał wreszcie, że ludność Wilna chce należeć do Polski, ale zastrzegł się że nic

nie wie o życzeniach ludności wiejskiej, która w pojęciu Chardignego jest w większości białoruską.

Prostując to twierdzenie, przedstawiciel Ligi Robotniczej stwierdził, że Polacy w Wileńszczyźnie stanowią większość również na wsi, że t.zw. Białorusini Katolicy nazywają siebie «tutejszymi» і uważają się za Polaków, że wreszcie nawet rząd rosyjski uważał wszystkich miejscowych katolików, o ile nie byli litwinami, za Polaków.

582.2.37:069 — шк

2895. Гістарычны нарыс [эсэраўскага руху ў Расеі й Беларусі?]

[1]ратычнай фэдэрацыі народаў Расіі і гэты лезунг быу адным з баявых лезунгаў Б.С.Г.

Аутономная Беларусь у складзе Расійскай дэмократычнай фэдарацыйнай Рэспублікі — вось была праграма мінімум Б.С.Г. За гэта яна змагалася і гэта было першым і аснауным яе дамаганьнем.

Рэволюцыйны рух 1905-6 г. быу задушаны. Практычнага ен мала што дау, але за тое тэорэтычна ясна выявіу тыя шляхі, на якіх пойдзе у будучыне высвабадзіцельнае змаганьне у Расіі. Гэтымі шляхамі і былі як раз тыя 15 нацыянальна-соцыялістычных партый, што былі запрошаны на з'езд расійскіх соцыялістычных партый 10-20 сакавіка 1907 г. І не для кога ня есьць тайнай, што па гэтаму руслу, глауным чынам, ішло рэволюцыйна-высвабадзіцельнае змаганьне з царскім самадзержауным гнетам у Расіі.

Само с[а]бой, гэтым нічуць не аслабляецца роль і заслуга рускіх рэвалюцыйна-соцыялістычных партый, але гістарычая прауда патрабуе яснага высьвятленьня. Справа у тым — не адны толькі гусі спасьлі Рым, а былі яшчэ іншыя, больш важныя фактары. Казаць, што толькі адны рускія соцыялісты вялі змаганьне з гнетам царызму, ім адным толькі прыпісываць глауную роль у гэтым змаганьні — гэта азначала-б не лічыцца з гістарычнымі фактарамі. Уласьне, найбольш рэволюцыйнымі былі нацыянальна-соцыялістычныя партыі і невелікарускі элемэнт у складзе рускіх рэволюцыйна-соцыялістычных партый.

2.

Вялікая рэволюцыя 1917 г. ва усей поунаце выявіла прорву памеж рускай рэволюцыйнай дэмократыяй і дэмократыяй т.зв. «інородческаго населенія». Шляхі рускіх рэволюцыйна-соцыялістычных партый зусім разыйшліся з шляхамі нацыянальных рэволюцыйна-соцыялістычных партый.

Прычына гэтай прорвы была у тым, што Р.П.С-Р. і Р.П.С-Д. (меншавікоу), посьле таго, як быу скінуты самадзержауны царскі гнет, лічылі свае першае і аснауное заданьне споуненым. І вось, стаушы у руля дзержаунай улады, яны чарговым сваім заданьнем пастанавілі умацаваньне палітычных здабыткау рэволюцыі і усімі спосабамі стараліся утрымаць непаруханы у спадчыне ім застаулены увесь бюракратычна-цэнтралістычны апарат прымусовай улады на мейсцох. Роль[1]

582.2.58:022 — мк

Урывак невядомага тэкста Тамаша Грыба. Дата невядомая. [1-1] Старонка 67.

2896. Ліст у рэдакцыю газэты «Эхо» — адказ на публікацыю артыкулаў, «отражающихъ раздраженное настроеніе нѣкоторыхъ круговъ по отношенію къ Правительству Бѣлорусской Народной Республики, бѣлорусской государственности и къ самому факту существованія бѣлорусскихъ учрежденій и бѣлоруссовъ» («Эхо» 23.07.1921)

Въ Вашей уважаемой газетѣ появился въ послѣднее время рядъ статей, отражающихъ раздраженное настроеніе нѣкоторыхъ круговъ по отношенію къ Правительству Б.Н.Р. [...]

[...[часто кончалось приготовленіемъ вкуснаго блюда изъ милыхъ гостей.

582.1.24:026&r-027 — м
582.1.24:028&r-029 — мк

Дакладная дата невядомая.

2897. Ліст Сьцяпана Бубешкі (Бруклін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.08.1921

1 августа 1921 г.

Г-ну Старшинѣ Рады Народныхъ
Министровъ Ластовскому

Только сегодня получил Ваше письмо отъ 10го іюля с.г. Письмо, адресованное на имя Русско-Славянскаго Общества мною передано по назначенію. Но въ виду моего отъезда на Дальній Востокъ я не мог принимать никакого дѣятельного участія за послѣднее время в организаціи.

Совѣтую Вам обратиться непосредственно к «Russia Slavonic Mutual Aid Society» по адресу: 284 Glenmore Ave. Brooklyn, N.Y.

А также совѣтую написать письмо одному изъ активнѣйшихъ бѣлорусскихъ работниковъ Михаилу Осиповичу Зварико по адресу 528 Amboy Street Brooklyn, New York. Оставляю N Y 5го августа с.г.

По пріѣздѣ займусь общественной дѣятельностью опять.

Мой адрес: Mr. S.O.Bubeshko
c/o Bank of Chosen Dalny South Manchuria
Намѣрен пробыть там 6 мѣсяцев.

С искренним уваженіем
S.Bubeshko
582.1.25:016&r

2898. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.08.1921

Берлин 1 Августа 1921.

Искренно-уважаемый
Вацлав Устинович,

Настоящим имѣю честь добавить к докладу, что сегодня на совѣщаніи с главным директором «Ивега» г. Лебо были установлены сроки выплаты нам 700.000 мк. Сроки слѣдующіе:

1/VIII — 100.000 м. (уже получены)
7/VIII и 13/VIII по 100.000 мк.
и 1/IX и 20/IX по 200.000 мк.

Таким образом я полагаю, что на нѣкоторое время мы обеспечены для спокойной работы. Это время нужно, конечно, использовать для добыванія новых средств, ибо настоящій момент я считаю боевым в связи с положеніем в Совдепіи; мы должны наладить тѣсную связь с Батьковщиной, чтобы в нужную минуту наши комиссары были на мѣстах; мы должны развить большую дѣятельность здѣсь за границей.

Из того, что Вы не соблаговолили меня извѣстить о результатах Вашей поѣздки в Ригу, я прихожу к заключенію, что положеніе с займом покуда для нас неблагопріятно. В Лондон я покуда не ѣду, во 1х потому что не имѣю еще визы, во 2х д-ра Іохельмана теперь нѣт в Лондонѣ и по случаю жары никого там нѣт.

Очень прошу Вас соблаговолите поручить д-ру Лурье позаботиться о том, чтобы наш протест[1] попал обязательно в англійскую и американскую еврейскую прессу, а также спеціальную статью о Бѣлорусско-Еврейских отношеніях в нашей Б.Н.Р. для Лондонской еврейской прессы. Это необходимо, чѣм скорѣе, чтобы появилась до моего пріѣзда в Лондон, чтобы подготовить мнѣ почву.

Из моего доклада Вы соблаговолите усмотрѣть, что я выдал «Ивегу» обязательство о предоставленіи ему преимущества на import и export при равных условіях. «Ивег» просит, чтобы это мое письмо было подтверждено Кабинетом. Я полагал-бы эту его просьбу удовлетворить, так как у меня имѣются надежды на дальнѣйшую поддержку со стороны «Ивега».—

Я нахожу, что нашему Правительству слѣдовало-бы каким-либо образом реагировать в смыслѣ помощи голодающему Русскому народу и чѣм скорѣе, — это имѣло-бы для нашего дѣла агитаціонное значеніе. С точки зрѣнія агитаціи я разсматриваю дѣятельность полковника Ермаченко, доклад котораго заслуживает вниманія.—

Ввиду невыносимаго здѣсь зноя и раз'ѣзда всѣх политических и общественных дѣятелей а также, чувствуя полное переутомленіе, так как по пріѣздѣ из Совдепіи я даже не успѣл придти в себя, как вошел в новую ответственную работу, я позволяю себѣ просить Вас разрѣшить мнѣ отдохнуть 8-10 дней с каковой цѣлью я проѣду к моей семьѣ. На случай экстренной надобности сообщаю мой телеграфный адресс:

Schwarz-Ort[2], Villa Flora, Schitlowski.

Прошу Вас, будьте добры, и передайте мой почтительный привѣт В. уваж. Супругѣ.

С пожеланіем всего лучшаго
глубоко уважающій Вас и душевно Вам преданный
Ваш С.Жытлоўскі
582.2.58:158&r-159&r — ра

[1] Супраць пагромаў ва Ўсходняй Беларусі, дакумэнт №2852. [2] Цяпер — курорт Юодкранте пад Клайпедай у Літве.

2899. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.08.1921

2.VIII.21.
Рыга.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

прачытаў я знамянітую стацьцю Гр. Сметоны[1] і дзіву даўся:

1, ня ўжо ж літвіны да гэтага часу не разумеюць, што іх палякі злопаюць, калі яны будуць з намі сварыцца, бо ніхто, апрача беларусоў, якіе будуць трывожыць польскі тыл, бараніць Літву ня будзе (Латвія ў Гэльсінгфорсе заявіла, што ў польска-літоўскім споре яна будзе трымаць нэйтралітэт)?

2, ня ўжо ж Гр. Сметона ня ведае, што ў Гродзеншчыне і Віленшчыне праўдзіва беларуская большасьць і што калі мы згаджаемся на тую ці іншую зьвязь гэтых тэрыторый з Літвой, дык гэта яшчэ не адзначае, што жывучые там беларусы павінны зрабіцца літвінамі?

3, ня ўжо ж Гр. Смятона хоча, каб мы ішлі разам з палякамі?

4, сколькі я памятаю Вы ў Вашым інтэрвью казалі аб «новым польскім карыдору», г. зн. аб тэрыторыях паміж лініямі літоўска-расейскай і польска-расейскіх міравых умоў, значыцца самые вялікіе літоўскіе апэтыты парушэны гэтай заявай не былі?

5, паўстаньня ў Польскім тылу робіць не Гр. Сметона, а беларусы, і гэтые беларусы-паўстанцы бьюцца за супольные літоўска-беларускіе інтэрэсы; чаму ж Гр. Сметона не толькі не едзе біцца з імі разам, не толькі не пасылае ім на помач літвіноў, але адмаўлае ім ў маральным падтрыманьню, ды яшчэ данасіцельствуе і аблівае памыямі беларускіх дзеячоў і Урад?

6, няўжо ж гэта агульна-літоўская пазыцыя?

У гэты цяжкі для Літвы момэнт беларускае пытаньне можа быць для Літвы і якорем спасеньня і асінавым колам. Залежна ад таго, як да яго будуць ставіцца самі літвіны.

Мы тутака, шчыра зьбіраўшыеся ісьці дабравольцамі, каб бараніць Беларусь і Літву ад Польшчы (я лічу, што вайна немінуема будзе), — страшэнна здзіўлены і абезкуражаны.

Беларусы з літвінамі ніколі ні біліся.

Неўжо ж гэтага хоча Гр. Сметона?

Каб нас ободвых зьела Польшча?

У тое, што Гр. Сметона баіцца «каб Беларусь не зьела Літвы» я зусім не веру. Гэта дзікі жарт.

Для каго ён патрэбен, — таксама ня змагу зразумець.

Шчыра жадаю Вам спакойна перанесьці гэты несалідны і несурьезны «Сметонаўскі штурм беларускай справы».

Пэўне ж найдуцца і сярод літвіноў разумные людзі, якіе зразумеюць якую шкоду нам і ім зрабіў Сметона гэтай брыдкай стацьцей.

З вялікай пашанй

К.Езавітаў

582.2.58:095-096 — ра

[1] Маецца на ўвазе артыкул Антанаса Сметоны ў газэце «Lietuvos Balsas». №38. 1921.07.??.

2900. Запіска Тамаша Грыба Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.08.1921

Тав. Власт!

Абмеркаваўшы справу паездкі АГ<алавінскага> я прыйшоў да перакананьня, што там у М<енс>ку можна будзе пашырыць нашу працу. Было-б надта добра, каб паслаць туды хоць-бы адну тысячу марак. З сваіх асабіста я пасылаю 200 т. сов<ецкімі> і 60 т. думскімі. Гэта будзе доказ таго, што мы разам і душой і целам з імі. Падніме настрой. Падумай аб гэтым. Заўтра каля 11-ай зайду.

Т.....

2/VIII.21.

582.2.58:147 — ра

2901. Карэспандэнцыя зь Вільні [у газэту?] з водгукам на спробу Поля Іманса зноў склікаць у Жэнэве 25.08.1921 польска-літоўскія перамовы аб Вільні

582.2.58:014 — мк

2902. Ліст Янкі Чарапука (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 3.08.1921

Даражэньні пане Старшыня,

Сёньня едзе у Рыгу мой добры знаемы. Сын Дырэктара М.У.С. Латвіі, ён сюды прыбыў па даручэньню Ульманіса — асоба пэўна і паважна, я знаю яго яшчэ з часоў Рыжскай Місіі, калі маеце, што перэслаць п. Станіславе, тагдэ паведамце мяне, калі зайсьці — ці прышлеце. Затым прашу Вашэй ласкі даць мне хаця 1.000 нам. мар. і 200 мар. каторыя я пазычыў Вам у Жылінскаса

Янка

3/VIII 1921

582.2.58:169 — ра

2903. Візытоўка Янкі Чарапука

J.Czerepouk

Délégué du Ministère des Affaires Etrangères de la Republique Démocratique Blanche-Ruthénienne

582.2.58:170 — д

На адвароце алоўкам напісана: «Лешково около Друскеник и Меричэм из Ярмошук Ив....»

2904. Візытоўка Джына Вівальбы

Gino Macchioro Vivalba

Ministre Plénipotentiaire de S.M. le Roi d'Italie

Riga

582.2.58:174 — д

2905. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.08.1921

4.VIII.21.
Рыга.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

пасылаю Вам фатаграфічную картку вялікага яшчыка, зробленаю тым жа спосабам, што і Ваша скрыначка (мозаіка).

Знайшоў у Рызе.

Таргую.

Але просяць вельмі многа.

Колькі, на Ваш пагляд, за гэту рэч магчыма б была даць?

І ці не цікавіць Вас гэта справа?

Скрынка паказана з адчыненай бакавой крышкай.

Відны маленькія яшчыкі.

Сенека бачыўся з Галав<інскім>, але нічога путнага ад яго не пачуў.

Ад Грунтова я нічога не атрымаў, апрача 2.000 латутаў[1].

Вальковіч маўчыць.

Кэпска зусім.

Курсы адчыніў.

Латышы даюць ўсяго 5.000 (абецалі, але яшчэ не далі).

Дварчаніна трымаю з уласных коштаў.

Шлю прывет.

К.....

P.S. Што тычыцца паездкі Гал<авінскага>, то яна, мне здаецца, дасьць нам меньш карысьці, чым шкоды.

Жонка ваша зусім паправлася і выгледае вельмі добра.

Вам было б трэба крыху аддахнуць і самаму.

К.....

582.2.58:091&r — ра

[1] Латаў?

2906. Фатаздымак інкруставанай скрыні, дасланы Езавітавым Ластоўскаму

582.2.58:092 — ф

2907. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.08.1921

4.VIII.21.
Рыга.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

учора праехаў Гр. Галавінскі. З гутарак з ім я убачыў, што нашы адносіны да літвіноў, а іх да нас, нібыта, палепшаюцца. Гэта добра, бо Літвінам без нас будзе кепска.

Лічу патрэбным зьвярнуць Вашу ўвагу, што Літвіны зусім не учыты-ваюць ўсей важнасьці Гэльсінгфорскай Канфэрэнцыі, якая для іх вельмі шкодна:

1, Латвія заявіла свой нейтралітэт ў Польска-Літоўскім канфлікце;

2, весткі аб латышска-польскіх трэніях на канфэрэнцыі — не адпавядаюць праўдзе;

3, ўсемі участнікамі канфэрэнцыі прыняты на сябе абавязак «не заключаць з кім бы то ні было дагавораў, скіраваных проці аднаго з канфірыруючых гаспадарстваў» і «кожная дзержава, заключаючая які-небудзь дагавор з іншымі дзержавамі, паведамляе аб гэтым ўсех канфэрыруючых»;

4, з гэтага выходзіць тое, што Латвія не будзе бараніць Літвы, калі на яе накінецца Польшча;

5, за гэто ж Польшча і Фінляндзія «абавязаліся супольна падтрымліваць законные патрэбаваньня Эстіі і Латвіі, каб іх прынялі ў Лігу Нацый».

Есьць і яшче адна цікавая рэч, якая пралівае сьвет на ўсю Канфэрэнцыю і яе тайные мэты:

«Лічучы заключэнныя з Расеяй умовы грунтам да мірных з ей адносін, Балтыйскіе Дзержавы пастанавілі ўзаемна падтрымліваць друг-друга ў выпадку парушеньня, або «неспоуненьня» Расеяй ўзятых на сябе абавязкоў».

Як чутна худка будзе коллекціўнае выступленьне ўсех канфэрэнтаў з нотамі, ў якіх будуць пералічаны ўсе выпадкі «парушэній» і «неспоўненій».

30.VII.21 Латвія гэткую ноту ужо ўручыла ў Маскве.

Польшча яшчэ не атрымала свайго золата.

Антанта вязе войска ў Силезію.

Г-кі[1] «аб'явіў вайну» і атправіўся ў дарогу.

Становішчэ вельмі пікантнае: і карыстнае і шкоднае ўдвайне. Наша справа ад яго не павінна стаць горшай, хоць і апошняе, як бачыце, не выключэна.

Справы тутака — нішто, каб ні адна вельмі пастаянная, нудная і брыдкая рэч, аб якой я ўжо не толькі не хачу пісаць, але не хачу навэт і думаць.

Курсы — адчынены. Працуюць добра. У прэссу аб гэтым даваць ня трэба, бо спалохаюцца палякі і пачнуць інтрыгі і проціў мяне і проці Дварчаніна. Курсантоў што дня — больш. Сенека атрымаў Дзьвінскі спісак ў 60 чалавек.

Становішча мае — все яшчэ невыразнае.

Магчыма, што прыдзецца прыймаць грамадзянства.

На гэты выпадак, хацеў бы мець не толькі ад Кіраўніка Канцэлярыі, але і ад Вас фармальную, кароткую і за пэчаткай паперу з паведамленьнем, што да выхада майго з грамадзянства з Вашага боку, як Ст. Рады Мін., перашкод нема.

Жонка Ваша зьбіралася ўжо ехаць ў Коўну, але я яе затрымаў і паспарта не візаваў. Як раз і добра, бо сенека атрымана Ваша пісьмо да Грунтова і яна супакоіцца аж да канца жнівеня, ці сярэдзіны вераснея.

Выглядае яна ўжо добра.

Каб упэўніць Вас ў гэтым сфатаграфавалі яе з Башкіравым, адпэчаталі і, навэт — без яе згоды, пасылаем Вам картку.

Учора, праз Гр. Генне, паслаў Вам ліста, таксама з карткай, але іншага зьместу.

2.VIII.21 паслаў Вам ліста поштай.

Літвіны можа яго прачытаюць, але — ніхай.
Чакаю адказу.
Шлю прывет і найлепшые пажаданьня.
З пашанай
К.Езавітаў.

P.S. Дзе Бонч-Асмалоўскі?
Чаму «Вызваленьне» не пасылае кніжак? — Яны тутака патрэбны да зарэзу.
582.2.58:099-101 — ра

[1] Магчыма, Якаў Ганецкі — дыпляматычны й гандлёвы прадстаўнік савецкай Расеі ў Латвіі (1920-1921).

2908. Ліст Аляксандра Галавінскага (Рыга) Старшыні Ўраду БНР Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4?.08.1921

Высокапаважаны грамадзянін Старшыня!

Шлю Вам свае пріветаньне. У мяне крыху не хапіла тых грошы, якіх я узяў пры сабе; бо прышлося плаціць каля пяці тысяч латутаў за праезд.

Грунтоў пазычыў мне з сваіх грашэй дзве тысячы латутаў. Будзця ласкавы перэшліця яму гэтыя грошы. Павінен Вам зазначыць, што у мяне зусім мала засталося грошы і на узварот, асабліва, калі буду ехаць з жонкай. Калі будзіць магчымасьць, то я вельмі прасіў-бы перэслаць к майго прыезду у Латвію. Аб грошах я толькі паведамлю, бо пасля трудна будзе аб гэтым давясьці да Вашага ведама.

У латышоў настрой ня кепскі да нас. Езавітаў працуе па арганізацыі асьветы. У Дзьвінску існуюць курсы, на якіх 45 вучыцялеў слухаюць лекцыі Дварчанінава па беларусазнаўству.

Костусь крыудзіцца, што не успамінаюць аб яго патрэбах. Між іншым ён просіць даставіціць яму яго кніжкі «Беларусы і палякі». За гэтую кніжку ён мог-бы атрымліваць грошы.

Зараз у Латгаліі вельмі патрэбна ачыніць курсы для вучыцелеў. У Люцыне — 40 чалавек. Крэслаўкі — 25 чалавек.

На гэтую справу па маей думцы трэ' зьвярнуць увагу. Костус шмат страціў на арганізацыю школьнай справы, яна амаль што зусім налажэна. Асігноўкі на курсы ад Латвійскага ураду мажліва чыкаць толькі па восіні, цяперыка-ж трэба скарыстаць вольнае лета вучыцялеў. Костус прасіў зазначыць, што ён доўгі час не атрымлівае пражытачнага мінімума.

Мая вялікая прозьба да Вас. Я не пасьпеў здаць свой пашпарт беларускі дыплематычны літвінам. Мажліва, што літвіны сачтуць як злая воля з майго боку — трэба гэты паспарт перэслаць — ён або у рэчах што засталіся у Грыба, або на старой квартэры. Будзьця ласкавы напомніць Чэрэпуку, каб ён мой пашпарт занес. Ваш АГ.

Ваша жонка патроху папраўляецца. — Бачыў фотаграфію.

Усім мае прыветаньне.
582.1.14:007&r-008&r
582.1.24:010,002 — мк

Дакладная дата невядомая.

2909. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.08.1921

Берлин 5/VIII 1921.

Глубокоуважаемый
Вацлав Устинович,

Как я имѣл честь Вам писать в прошлом письмѣ в предположеніи, что Вы ничего не будете имѣть против того, чтобы я немного отдохнул, я сегодня уѣзжаю на несколько дней к семьѣ.

За это время я здѣсь успѣл поговорить с очень многими вліятельными людьми, которые обѣщали мнѣ полное содѣйствіе при моей поѣздкѣ в Лондон с ручательством за успѣх.

Я также получил приглашеніе на Карлсбадскій конгресс сіонистов, имѣющій быть 1 сентября с.г., там я встрѣчусь с Соколовым, Моцкиным и Люсьеном Вольфом и другими общественными дѣятелями всѣх государств. Наша справа все болѣе и болѣе проникает в сознаніе людей, дѣлающих хорошую и бурную погоду и они начинают раздѣлять нашу точку зрѣнія и я твердо вѣрю, что в связи с событіями, которые теперь разыгрываются в голодной Россіи возможно, что наши мечты осуществлятся скорѣе, чѣм мы думаем. Нужное сочувствіе нетолько Германіи, но и Антанты нам будет обеспечено, а также и матеріальныя средства. Нам надо только пережить и переждать этот мертвый сезон. Само собою разумѣется, что во всѣх моих бесѣдах и выступленіях я провожу ту линію поведенія, которая глубоко проникает во всю нашу дѣятельность а именно, что Литва является нашей исторической союзницей в прошлом и дѣйствительной союзницей в настоящем и будущем. Я смѣло могу сказать, что работая для нас, я в тоже время работаю для Литвы. Здѣсь и в Лондонѣ прекрасно оріентируются и знают, что удѣльный вѣс Литвы без Бѣлоруссіи очень не велик. Мнѣ в бесѣдѣ сказал один из отвѣтственных редакторов «Берлинер Тагеблат»: «Еслибы Бѣлоруссіи не было, то Литва должна былабы ее выдумать!» Тѣм болѣе меня огорчают свѣдѣнія, переданные мнѣ г.г. Душевским и Гладким о том, что отношенія Литовцев к нам недостаточно дружественны и даже несовсѣм предупредительны. Еврейское общественное мнѣніе Европы и Америки очень встревожено усиливающимся антисемитизмом в Литвѣ и я смѣло заявляю, что г.г. Сметоны и подобные ему близорукіе политики, сѣющіе раздор между Литвой и Бѣлоруссіей, льют воду на польскую мельницу. Нам-же теперь необходимо полное единеніе и об'единеніе всѣх живых сил. Нам вѣроятно скоро придется выступить на политичекую арену. Я вѣрю, что мрачные дни остаются позади и что для нас начинает заниматься прекрасная заря. Я полагаю написать письма нѣкоторым отвѣтственным дѣятелям в Вильнѣ, как представитель еврейских общественных кругов с указаніем всей важности об'единенія в настоящій момент и гибельности различных оріентацій. Прошу Вашего мнѣнія и указанія по этому предмету.

Также имѣю честь Вас просить обратить вниманіе комиссіи по товарам, чтобы они обязательно передали товары Бус'у на правах собственности в опезпеченіе займа у «Ивега», иначе мы рискуем, что «Ивег» воспользуется нашей неаккуратностью и не выполнит договора.

Очень прошу почтить меня нѣсколькими словами о общем положеніи и настроеніи.

Сообщаю мой адресс: Schwarz-Ort, Memelgebiet, Villa Flora, Herr. S.Schitlowski.

Для телеграмм — подчеркнутое.

С искренним уваженіем и с пожеланіем всего лучшаго, имѣю честь быть всегда готовый к услугам Ваш

С.Жытлоўскі

582.2.58:097&r-098&r — ра

2910. Ліст Аляксандра Галавінскага (Масква) Ураду БНР (Коўна) за 8.08.1921

8-VIII-21

Высокапаважаныя грамадзяне Уласт, Александр Іванавіч і Тамаш!

Дабраўся я да Масквы добра, затрымаўся у Літоўскам прэдстаўніцстве у пакою №38. Пакуль што сьпяшу паведаміць Вас аб тым, што тутака гэтыя часы робіцца вельмі важная справа, якая у выпадку падтрыманьня нас з боку прыбалтыйскіх дзержаў магла датычыць і нас.

Ганецкій і Аралаў[1] распрацавалі праэкт эканамічнага саюзу паміж балтыйскімі дзержавамі: Літвой, Латвіей і Эстоніей і Савецкай Расеяй. Каліб нам удалося дабіцца падтрыманьня з боку прыбалтыйскіх дзержаў, то на мой погляд можна булоб дабіцца ад Сов. Расеі згоды на прызнаьне і уступку тэррыторыі Б.Н.Р. і уключэньне нашэй Бацькаўшчыны у Балтыйскій політычны саюз. Належныя інфармацыі я паслаў Кастусю.

Мая асабістая справа пакульшто кепска. Усі вельмі заняты і з некім було пагутарыць.

Пропуску для жонкі можа дадуць у Менск, а у Коўна наўдачу. Але вы самі разумееця, што гэта значыць. Хоць адносіны да мяне досыць добрыя, але застацца у полану ня хочыцца.

Буду інфармаваць Вас з кожным кур'ерам, а Вы адказывайця і давайця раду.

Зараз іду гутарыць з Некрашэвічэм у справе выдавецства.

582.1.14:013&r-014

582.1.24:004 — мк

[1] Дыпляматычныя прадстаўнікі савецкай Расеі ў Латвіі й Літве.

2911. Ліст Самуэля Жытлоўскага (Шварцорт) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.08.1921

Schwarzort, 9 августа 1921.

Глубокоуважаемый

Вацлав Устинович,

Мое письмо от 6/VIII Вы вѣроятно уже получили. Был-бы очень обязан, если бы Вы удостоили меня сюда письмом с сообщеніем о нашем положеніи, о результатах Вашей поѣздки в Ригу а также Вашего мнѣнія относительно предполагаемого моего обращенія к общественным Бѣлорусским дѣятелям в Вильнѣ.-

Для моей поѣздки в Карлсбад на всемірный конгресс сіонистов мнѣ необходимо от Вас официально имѣть слѣдующее: 1) Полномочіе привѣтствовать с'ѣзд от имени Бѣлорусскаго Правительства. 2) Сообщеніе о том, что благодаря протесту нашего Правительства против погромов, каковой протест разослан в большом количествѣ экземпляров на батьковщину — погромная волна немедленно спала и почти совсѣм затихла. 3) Чтобы дѣйствительно бороться с погромной агитаціей польских бандитов и других проходимцев нам необходимо имѣть во всѣх еврейских центрах спеціальных наших комиссаров, которые должны организовать крестьян против бандитских шаек, но для этого нам необходимы матеріальныя средства, которых у нас сейчас нѣт.

Было-бы хорошо, чтобы это письмо Ваше ко мнѣ было написано на Вашем бланкѣ за № и с Вашей печатью.

Я полагаю, что мнѣ удастся достать приличныя средства на нашу политическую работу и на борьбу с погромами, которую мы дѣйствительно интенсивно поведем. Было-бы хорошо издать в спѣшном порядкѣ небольшую брошюру о гибельности погромов для Бѣлорусскаго дѣла и нѣсколько десятков этой брошюры выслать мнѣ в Берлин до 28 августа. Об этом слѣдует поговорить с тов. Т.Грибом. Это имѣло-бы для всей моей дальнѣйшей работы в Лондонѣ и Америкѣ громадное значеніе.

Здѣсь я пробуду числа до 15-17 с.м. и потом поѣду в Берлин. На 20ое число у меня в Берлинѣ назначено засѣданіе с Бѣлорусскими евреями об оказаніи помощи голодающим в Россіи. Я увѣрен, что и Правительство наше выскажется по этому вопросу, несмотря на наше безденежье.

Прошу, будьте любезны и соблаговолите засвидѣтельствовать мое искреннее уваженіе Пану Маршалку а также передать почтительный привѣт всѣм членам кабинета.

Мой адресс: Schwarzort, Memelgebiet, Villa Flora, Herrn S.Schitlowski.

Прошу, примите, Пане Старшыня мое увѣреніе в искреннем к Вам уваженіи и почтеніи, душевно преданный Вам

Ваш С.Житловскій

582.2.58:032&r-033&r — ра

2912. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.08.1921

9.VIII.21.
Рыга.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

ні я, ні Гр. Сымсон — не дастаём, ўжо 2 тыдні, ні аднаго бюллітэня ад Пр-Бюро. Што гэта? ці не зачынілася часам?

Гр. Сымсон паведаміў мяне, што ведамы Вам ангельскі публіцыста згадзіўся надрукаваць добрую стацьцю аб Беларусі і прасіў срочна ў 2 тыдні перасланць яе праз Сымсона, разам з рожнымі матэрыяламі.

Дзеля таго, што справа гэта для нас вельмі важная і павінна быць напісана адпаведным чынам і у кірунку думак і плянаў Ураду БНР на будучыну, я, каб не вызываць потым на сябе нарэканьняў, ўзяцца за гэту справу не

адважыўся і вельмі прашу Вас напісаць, што трэба і прыслаць ці проста яму, ці мне. Будзе надрукавана.

Напісаць трэба адзін-два друкаваных ліста (ў 32 страніцы).

Справы тутака пасоўваюцца.

На курсах ў Дзьвінску ужо слухаюць 60 слухачоў.

Пазаўчора, ўчора і сёнека прыехалі яны аглядаць выстаўку.

Настрой добры.

А тут яшчэ паддаў духу і ахвоты Архібіскуп ўсея Латвіі Іоанн (праваслаўны), які адслужыў для экскурсантаў вячэрню, сказаў добрую прамову аб Беларусі і правазгласіў за беларускі і латышскі народ «Многая лѣта».

Некаторые спевалі «Многая лѣта» не толькі з дрожжю ў голасі, але, навэт, са слязой.

Сёнека едуць назад ў Дзьвінск.

Пачынаем рыхтавацца да выбарчай кампаніі, але тутака мейсцовых скарбаў на гэту справу німа.

Ўся надзея на Вас.

— Калі дапаможаце, дык будзем мець сваіх дэпутатаў ў Парламэнту.

У зьвязку з гэтым, трэба як худчэй даць мне прасімыя паперы, калі Урад дазваляе і благаслаўляе мой выхад.

Чэкаю адказу з Вальковічам.

Шлю прывет і найлепшыя пажаданьня.

Ціску руку.

К.Езавітаў.

P.S. Ці ня можаце Вы схлапатаць ў Літоўскім Дзержаўным Унівэрсытэці прыем і стыпэндзію Гр. Ігнату Дварчаніну?

У Вільню яму ехаць нельга.

582.2.58:093-094 — ра

2913. Ліст Аляксандра Галавінскага (Масква) Ураду БНР (Коўна) за 11.08.1921

Высокапаважаные браты-землякі і таварышы.

Сяжу я у Маскве пятый дзень, а пакуль што мала чаго трапілася зрабіць. Ніяк, нават пры дапамозе высокапаважанага грам. Б.[1] не удаецца спаткацца з тымі зь кім належыць гутарыць у важных справах.

Аралаў досыць спачувае нам і робіць рожныя захады кап крыху прасунуць беларускую справу.

Як бытцам-то выглядае так што к зіме, а мо' зімою можна будзе дабіцца ад Сав. Расеі стварэньне Беларусі з усіх этнаграфічных усходніх беларускіх паветаў.

Нацыянальная справа у Менску як відаць з гутарак туташніх беларусоў стаіць досыць добра.

Робяцца уселякія захады, каб зьвярнуць на Бацькаўшчыну раскінутых па усім куткам расеі беларусоў.

Меж інш важна:

У Менску у канцы Іюля склікаўся зьезд прэдстаўнікоў гаспадарскіх установ Меншчыны Вітэбшчыны, Смаленшчыны і Гомельшчыны на якім

падымалася пытаньне аб утварэньні адзінага цэнтральнага гаспадарскага органа для усіх губэрній. Гомельшчына не патрапіла зьявіцца на гэты зьезд і зьезд узноў будзе скліканы у кастрычніку.

Пасылаю Вам крыху газэт і некалькі бульлюценей комінтэрна. Пастараюся дабыць рэшту.

Як я даведаўся справа аб рэзалюцыі на конта заходней Беларусі была унесена нашымі коммуністамі, але прэзідыум не паставіў яе на агалошэньне[2]. Резалюцыя была пераведзена на рожныя мовы і дадзена загранічным прэдстаўнікам, дзякуючы чаму і зьявілася у печаці. Сур'езных пытаньнеў я яшчэ не ставіў.

Спадзеваюся, што худка гэто патраплю зрабіць. З чарговым кур'ерам прышлю поўны даклад у справе.

АГ.

11-VIII-21.

Худка Желуновіч і мажліва Некрашэвіч выедуць у Коўна і Бэрлін для друкаваньня кніжак усяго каля сотні рожных выданьняў.

582.1.14:015&r-016

582.1.24:005 — мк

---

[1] Магчыма, маецца на ўвазе Юргіс Балтрушайтіс, дыпляматычны прадстаўнік Літвы ў Расеі. [2] Падчас III кангрэсу Камінтэрну ў Маскве 22.06-12.07.1921.

2914. Ліст Марыі Ластоўскай (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ??.08.1921

Kochany Vacio!

Ja opatrzyłam ladną centrafugę, bym kupiła ale tropi mnie obawa czy Ty nie kupiłeś, w takim razie byłyby dwie a na nasze dobra to zawiele.

Groszy mam! pełną pończochę, niemyśl że chcę wyludzić.

Kiedy ja zobaczę p. St[1]? Chciałabym ją widzieć, byłam wtedy w ogrodzie ale był tam żydowski wieczor tedy zemknęłam, Was też pewno niebyło.

Czy nie wiecie adresu Miedziołki Gryb? zaprosiła mnie i mówiła adres ale skielbasiło się wszystko.

Jeżeli możesz odpowiedz co do centrafugi ja poczekam na skwerze.

Tym czasem wszystkiego dobrego, serdeczne uścisnienie p. St.

Peleda

582.2.53:113&r — ра

582.2.53:112 — канвэрт

Дакладная дата невядомая. [1] Станіслава Кісель.

2915. Ліст Янкі Быліны (Вільня?) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ??.08.1921 з просьбай памагчы перавыдаць кнігу Я.Быліны «На прызьбе»

582.2.53:114&r-115 — ра

Дакладная дата невядомая.

2916. Ліст Марыі Ластоўскай (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ??.08.1921

Kochany Vacio!

Jadę do domu, tedy do miłego vidzenia!

Centrafugę dostałam w «Niemnie» za 600 marek, jako Peledzie spuscił dyrektor taniej, sliczna maszyna!

Teraz, jak przyjedziesz to przyjmę Cię po krulewsku, kupiłam ładne przescieradła i koldrę ktorej niedam ni komu.

Hance udało się zebrać książki oprócz Lesebuch, ale zdaje się że taką jak trzeba przywiozłeś z Berlina tedy będą wszystkie. Pieniędzy mam.

Jeżeli masz co powiedzieć to ja poczekam na odpowiedź, przez tegoż posłańca wyszlij kartkę.

Wstyd mi Tobie przypominać, jednak korci mię co słychać z temi próbkami jeżeli w ogóle jaki lach jest czy jakie pantopli, to mogę je zabrać, ale nie myśl że jest wielka potrzeba i nie rob sobie z tem kłopotu.

p. St. pisała domnie i dała jakąś paczkę dla oddania dzeciam, w ich imieniu dziękuję za pamięć, jak wróci to powiedz jej otem.

Moje interesa dobrze stoją, lepiej jak myślałam dostanę 40,000 auksinow i teraz część, ile niewiem ale dostanę dzisiaj, oprócz tego mam i w .....

Całuję Cię serdecznie

Lazdynu Peleda

Jeżeli masz czasu napisz do Hanki o tych obrazkach żeby dodać ochoty do pisania, to rozwija umysł. Dostałam swoją maszynę do szycia!!!! Hura!!

582.2.53:119&r — ра

582.2.53:118 — канвэрт

Дакладная дата невядомая.

2917. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 12.08.1921

Рыга.
12.VIII.21.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

пасылаю Вам для спраў і ведама даклад мой на імя Бенасу (так радзіў бы я называць Беларускую Нацыянальную Сувязь).

Вельмі прашу Вас напісаць Вашые думкі па гэтаму дакладу мне, а таксама падтрымаць іх і перад Бенасу.

Гэты думкі — плод перабродзіўшага пачуцьця і есьць апошняе мае рашэньне.

Да выбараў ў Парламэнт асталася часу вельмі мала, а таму пажадана, каб просьбы мае былі споўнены срочна.

Шчыра жадаю Вам усяго лепшага.

Нецярпліва чэкаю адказу на ўсе лісты разам.

Прывет Станіславе Пятроўне.

З вялікай да Вас пашанай.

К.Езавітаў.

582.2.58:102 — ра

2918. «Беларусы ў Латвіі». Даклад Кастуся Езавітава Беларускай Нацыянальнай Сувязі за 12.08.1921

Дублікат

Беларусы ў Латвіі.

Беларусы ў Латвіі дзеляцца на дзве нераўные группы:

1, беларусы — грамадзяне Беларускай Народнай Рэспублікі — іна-странцы..... 6.000 чал.

2, беларусы — грамадзяне Латвійскай Рэспублікі .....60.000 "

Першые жывуць пераважна ў Рызе і Лібаве, дзе маюць свае крамы, майстэрскіе, заводы, а таксама працуюць і простымі рабочымі на іх.

Другіе жывуць у Латгаліі і Курляндзіі і займаюцца земляробствам ў паўднёвых і усходніх валасьцёх, дзе часта састаўляюць да 80% ўсяго жы-харства воласьці.

Першые, працай Вайскова-Дыплёматычнай Місьі Б.Н.Р., яшчэ ў концы 1919 года былі зарганізаваны ў «Беларускую Калёнію ў Латвіі», з Радай Каленіі і Беларускім Консульствам на чале, мелі свой клюб, Культурна-Прасьветнае Т-ва «Бацькаўшчына», Дамскі Камітэт помачы бедным, Гур-ток Моладзі, курсы беларусазнаўства, фінансавую камісыю помачы Ураду Б.Н.Р. і свой журнал (часопісь) «На чужыне».

Другіе да сярэдзіны 1920 году былі адрэзаны ад беларускіх уплываў і знайходзіліся пад бальшавіцкай і польскай аккупацыямі.

Толькі з сярэдзіны 1920 году, аглядаючыся з апаскай на палякоў і бальшавікоў і ня ведаючы яшчэ адносін да сябе Латвійскага Ураду, тры-маўшага і да гэтага часу трымаючага па ўсей Латгаліі вайсковае стано-вішчэ (военное положеніе), пачынаюць беларусы праяўляць першые знакі свайго жыцьця: зьяўляюцца «пагутарыць» і «паінфармаваць» ў Місыю асобные адзінкі і асабістые знаёмые Шэфа Місьі, цікавяцца беларускай і расейскай кніжкай аб Беларусі, шукаюць вестак аб беларускіх справах ў газэтах.

З'арганізаваць іх аднак ў якой-небудзь нацыянальны гурток не ўдаецца, бо, з аднаго боку, жыхарства тэррорызуецца бальшавікамі і ўвесь час чэ-кае і баіцца іх павароту (асабліва пасля вайсковых афэнзіў на Варшаву), з другога ж боку не дремлюць і палякі, распускаючы весткі аб аддачы Ла-твіяй Латгаліі паляком, каб загарадзіцца ад Расеі, агітуючы проціў Латвіі і Латвійскай аграрнай рэформы, адчыняючы польскіе школы, арганізуючы вялікіе касьцельные і крыжовые ходы з польскімі гэрбамі і харугвямі.

Запуганае беларускае жыхарства не адважываецца падняцца і прыступіць да працы над сваей культурна-нацыянальнай аўтаноміей, права на якую і належныя рэальныя абставіны мае згодна Латвійскім законам.

Папыткі Вайскова-Дыплёматычнай Місьі Б.Н.Р. пайсьці на спатканьне і падмогу беларускаму жыхарству ў Латгаліі і вызваць ў іх мейсцовую інітыатыву канчаюцца вельмі неудачна:

Предложенія поступающія правительству въ данный моментъ не могутъ быть использованны въ широкомъ масштабѣ изъ-за отсутствія территоріи. Напримѣръ, отъ одной изъ американскихъ крупныхъ фирмъ поступило правительству предложеніе доставить въ любое мѣсто и въ любомъ количествѣ каменный уголь и въ случаѣ крупнаго заказа доставка отъ порта въ глубь страны американскими локомотивами и вагонами. Консорціумъ американскихъ капиталистовъ предлагаетъ капиталъ въ милліардъ доларовъ для организаціи металлургической промышленности.

ОТНОШЕНІЕ ПРАВИТЕЛЬСТВА БѢЛОРУССКОЙ НАРОДНОЙ РЕСПУБЛИКИ КЪ ЛИТВѢ.

На основаніи договора, заключеннаго съ литовскимъ правительствомъ, цѣль котораго — взаимная помощь въ борьбѣ противъ польскаго имперіализма, Правительство Бѣлорусской Народной Республики пользуется гостепріимствомъ Литовской Республики и правомъ экстерриторіальности.

ОТНОШЕНІЕ КЪ СОВѢТСКОЙ РОССІИ.

Правительство Бѣлорусской Народной Республики считаетъ, что

1) созданіе изъ пяти съ половиной уѣздовъ Минской губерніи Совѣтской Бѣлорусской Республики;

2) вступленіе этой незначительной части Бѣлоруссіи въ федеративно-политическую связь съ Россіей въ силу необходимости;

3) присоединеніе къ Россіи территорій, населенныхъ бѣлорусскимъ народомъ Витебской, Гомельской, Мстиславской[6] и частей Смаленской и Черниговской губерній;

4) растущій московскій централизмъ въ отношеніи Совѣтской Бѣлоруссіи —

все это противоречитъ самому существу даже идіологіи Совѣтскаго правительства и является грубой насмѣшкой надъ идіологіей Третьяго Интернаціонала, а тѣмъ болѣе надъ народомъ положившимъ столько усилій для защиты своихъ правъ на самоопредѣленіе.

Правительство Бѣлорусской Народной Республики не принимало и не будетъ принимать участія въ вооруженной борьбѣ противъ Россіи исходящей изъ какихъ-бы то не было реакціонныхъ источниковъ, но протестовало и будетъ протестовать и бороться противъ всероссійскаго централизма и попранія законныхъ правъ трудящагося бѣлорусскаго народа на самоопредѣленіе и полную государственную независимость.

Правительство Бѣлорусской Народной Республики увѣрено, что въ ближайшемъ будущемъ правительство Россіи откажется отъ этнографической территоріи Восточой Бѣлоруссіи и сдѣлаетъ заявленіе Польшѣ, что отдача Западной части Бѣлоруссіи произошла въ результатѣ войны навязанной Польшею и что границу между Бѣлоруссіей и Польшею должны установить обѣ эти стороны мирнымъ путемъ.

Правительство Бѣлорусской Народной Республики считаетъ Рижскій миръ — имперіалистическимъ миромъ, прочность котораго обратно пропорціональна національному освѣдомленію народныхъ массъ Бѣлоруссіи и всѣхъ угнетенныхъ народностей.

ОТНОШЕНІЕ КЪ СОВѢТСКОЙ БѢЛОРУССІИ.

Въ отношеніи къ Совѣтской Бѣлоруссіи Правительство Бѣлорусской Народной Республики стремиться оказать всяческое содѣйствіе въ смыслѣ культурно-національномъ и пытается договориться и найти пріемлимыя точки соприкосновенія.

Правительство Бѣлорусской Народной Республики считаетъ, что Совѣтская Бѣлоруссія состоящая изъ пяти съ половиною уѣздовъ составляетъ только маленькую часть этнографической Бѣлоруссіи. Федерацію съ Совѣтской Россіей считаетъ слишкомъ централистичной и мѣшающей всестороннему возрожденію этой части Бѣлоруссіи.

582.1.15:137-155 — мк

[1] Як бачым, у 1921 годзе можна было дазволіць сабе ня вядаць напамяць псэўданіма Джугашвілі. [2] Пропуск у тэксьце. [3] 146 — новая пагінацыя. Адгэтуль рэзка мяняецца стыль і форма запіскі. [4] Памылкова замест кастрычніка. [5] Памылкова замест 1918. [6] Памылкова замест Магілеўская.

Дакумэнты, далучаныя да запіскі:

1) Нота пратэсту Рады Міністраў БНР за 2.01.1919 (Горадня) міністру замежных справаў Польскай Рэспублікі ў справе ўлучэньня этнаграфічных беларускіх тэрыторыяў у склад Польшчы (582.1.15:156)

2) Нота пратэсту Рады Міністраў БНР за 3.01.1919 (Горадня) міністру замежных справаў Польскай Рэспублікі ў справе абвяшчэньня ўсеагульнай мабілізацыі ў Вільні (582.1.15:157)

3) Нота пратэсту Рады Міністраў БНР за 8.01.1919 (Горадня), накіраваная дыпляматычным прадстаўнікам Амэрыкі, Англіі, Францыі і Італіі ў Спаа, у справе 1) выбараў у Польскі Ўстаноўчы Сойм, 2) далучэньня Аўгустоўскага павету да Польшчы й 3) абвяшчэньня ўсеагульнай мабілізацыі ў Вільні (582.1.15:158-159)

4) Нота пратэсту Міністэрства Беларускіх Справаў Літоўскага Ўраду за 13.02.1919 (Горадня) у справе акупацыі палякамі беларускай тэрыторыі, накіраваная ўпаўнаважанаму Нямецкага Ўраду ў Літве Э.Цымэрле (582.1.15:160)

5) Нота пратэсту Міністэрства Беларускіх Справаў Літоўскага Ўраду за 11.04.1919 у справе заняцьця палякамі г. Горадні, накіраваная ўпаўнаважанаму Нямецкага Ўраду ў Літве Э.Цымэрле (582.1.15:161)

6) Адказ упаўнаважанага Нямецкага Ўраду Э.Цымэрле за 14.04.1919 на ноту пратэсту Міністэрства Беларускіх Справаў (582.1.15:162)

2926. Ліст Аляксандра Галавінскага (Масква) Ураду БНР (Коўна) за 16.08.1921

Аралау казау, што аб нашым урадзе добрае уражэньне. «Дагаварывайцеся у Менску, Масква ні у чым перашкаджаць не будзе». Дайця інфармацыі Ів.Ів. Я буду гутарыць толькі аб партыйных і культурных справах, чэкаючы Вашых адпаведных інструкцый аб платформе згоды. Яе трэба я лічу даць праз Ів.Ів.

Мая справа яшчэ ня ведама як. Зараз буду гутарыць аб пропуску жонкі і затым закардон, пасьля Менска. Прышліце грошы. Я затрымаюся магчыма на месяц.

Аралау абецау зрабіць заяву аб асвабаджэньні Бадуновай. «Гэта трэба зрабіць і па палітычным саабражэньням» — былі яго словы. Я перадау яму інфармацыйную запіску.

Заутра буду гутарыць з прэдстаунікамі Нямеччыны з якімі толькі што пазнаеміуся. «Ваша фамілія нам знаема».

Нажміце на нашых жыдоускіх прэдстаунікоу, праз іх зьвязкі шмат можна зрабіць.

582.1.24:002 — мк

2927. Ліст Аляксандра Галавінскага (Масква) Ураду БНР (Коўна) за 17.08.1921

17-VIII-21.

Высокапаважаныя грамадзяне!

Прыняў мяне заведующы эвакуацый нямецкіх палонных, ён-жа выпаўнаяе і дыпломатычныя функцыі. Я асвятліў перад ім нашу справу і усю важнасьць як для нас, так і наогул для усіх, каго крыўдзіць польскі імперыялізм. Ен вельмі зацікавіўся маімі прапазіцыямі, абіцаў давесьці да ведама свайму Ураду.

«Вялікая напружаннасьць Верхне-сілезскага пытаньня вельмі звязывае ініцыатыву нямецкага ураду».

Я атказаў, што падняць зара пытаньне аб насільствах Польшчы у заходней Беларусі можа быць карысна і тым, што будзе лішнім даказацельствам немажлівасьці добрасуседскіх адносін з захватнічэскай Польшчай.

«Я пастараюсь давясьці да ведама мой урад і выясьніць усю важнасьць вырышэньня праблемы незалежнай Беларусі». Прасіў ад мяне даць яму матэр'ялы па Беларусазнаўству. Прасіў падтрымліваць з ім шчыльный зьвязок і так сама пытаўся наскольк моцна у нас зьвязь з нямецкім урадам.

Я атказаў, што у Бэрліне маецца наша прэдстаўніцство і там-жы жыве наш міністр загранічных спраў. Інфарміруем нямецкае предстаўніцство праз Бруно.

У мяне пасля гутаркі асталося уражэньне, што ён запраўды зацікавіўся.

Тётка Будунова па пастанове В.Ц.И.К. асвабождена учора, але я яшчэ не бачыўся з яе сястрою і ня ведаю як сябе чуе Палута і куды яна напраўлена..

С кожным кур'ерам я атпраўляю Вам інфармацыі, ці атрымліваеця? Ат Вас нічога не атрымаў.

Сягодні буду гутарыць з предстаўніком вышэйшай палітычнай установы і лічу мажлівым крыху паставіць нашу справу так, як я выяўляў яе сабе пры выезде з Коўны. — Каб дайсьці усіх пажаданых мэт трэба мець ат Вас пеўныя інструкцыі і платформу згоды з нашымі мяйсцовымі дзеячамі. Я застануся у Маскве яшчэ дзен 5 і калі да гэтага часу не будзе Вашых інструкцый, то дазвольця праявіць асабістыю ініцыатыву.

На праезд назад мне патрэбна 6 тысяч марак і тут так сама. Зараз білет ад Піцера да Масквы для інастранцаў каштуе 840.000 руб. Ня ведаю колькі будзе каштуваць да Менску.

Мае прыветаньне усім. АГ. Ідзе Ал<яксандар> Ів<анавіч>[1]? Парушце справу з немцамі.

582.1.14:005&r-006&r
582.1.24:011 — мк
582.1.24:032 — мк

[1] Цьвікевіч.

2928. Ліст Дыпляматычнага Прадстаўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі ў Літве (Коўна) сябру Рады БНР Язэпу Варонку (Коўна) за 17.08.1921 у справе закрыцьця гарадзкімі ўладамі Беларускага Сабраньня ў Коўне (старшыня — Язэп Варонка) з прычыны правядзеньня там азартных гульняў

582.2.36:031 — ма
582.2.36:030 — канвэрт

2929. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Шварцорт) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.08.1921

Schwarzort, Villa Flora 17/VIII 1921.

Высокоповажаны
Вацлав Устинович,

Меня очень удивляет, что я от Вас не получил до сих пор никакого отвѣта на мои письма. Меня очень безпокоят тѣ тревожныя свѣдѣнія, которыя доходят до меня и я, к сожалѣнію, лишен возможности разобраться, гдѣ истина и гдѣ ложь.

Еще раз имѣю честь Вас просить, написать мнѣ в Берлин, куда я завтра уѣзжаю, о положеніи нашем в Ковнѣ а также соблаговолите мнѣ прислать тѣ данные, которые я просил в послѣднем письмѣ для поѣздки в Карлсбад на всемірный конгресс сіонистов.

Оттуда я поѣду в Лондон, но для этой поѣздки я должен быть основательно информирован обо всем, чтó у нас происходит и, главное, об отношеніи к нам Литовцев в настоящій момент. Я лично, как и все наше Правительство, являюсь искренним сторонником самаго тѣснаго дружескаго сожительства с нашим историческим союзником — Литвой. И в этом направленіи я придерживаюсь во всѣх моих выступленіях. Но к сожаленію Литовцы в послѣднее время как будто отклоняются от линіи политическаго поведенія, которой держались до сих пор по отношенію к нам. Это тѣм болѣе странно, что газета «Lietuva» в редакціонной статьѣ по поводу отношенія Гюманса к Сувалкскому договору пишет: «чтó стоит политическое здравомысліе, если отсутствует справедливость, если международные договоры — клочек бумаги». Интересно было-бы спросить Литовцев, какого мнѣнія они сами относительно своих договоров: не превращают ли они их «в клочек бумаги», когда им кажется, что это для них выгодно? Но «политическая выгода» понятіе очень капризное: чтó выгодно сейчас, может оказаться очень невыгодным в ближайшем будущем. Я увѣрен, что д-р Пурицкус, этот поистинѣ дальновидный государственный ум должен это понимать и навѣрное столкуется с д-ром Цвикевичем о всѣх недоразумѣніях, мѣшающих нашей совмѣстной политической работѣ.

По приглашенію В.И.Захарко я положительно лишен был возможности поѣхать в Ковно, я был сильно переутомлен и нервы были очень расшатаны. За 10 дней пребыванія здѣсь я немного пришел в себя и опять всецѣло отдался нашей святой работѣ.

Прошу Вас, соблаговолите распорядиться, чтобы мнѣ выслали в Берлин: 1ое экземпляров 10-20 наших брошюр на англійском языкѣ для

Лондона (в Берлинѣ их нѣт) и 2ое экземпляров 100 нашей прокламаціи от 25/III с.г. на бѣлорусской и жидовской мовѣ для раздачи на Карлсбадском конгрессѣ.

В ожиданіи Ваших информацій и директив, прошу примите, Пане Старшыня, мои увѣрѣнія в чувствах искренняго Вам уваженія, душевно Вам преданный

ваш С.Жытлоўскі

582.2.58:030&r-031&r — ра

2930. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (?) Вацлаву Ластоўскаму (?) за ?.08.1921

Вельміпаважаны Пане Власте!

Лісты гэтыя[1] я атрымаў як урадовыя — па зьместу іх усе зрабіў і усе паслаў.

Адпачывайце!

Ваш АЦв

Прыміце не воража маю жонку!.. Хачу каб яна крыху паправілася!..

АЦ

582.2.58:034 — ра

Дакладная дата невядомая. [1] Дакумэнты №№2911, 2919.

2931. Пераклад урыўкаў зь невядомае літоўскае кнігі пра першыя крокі Літоўскага войска й пра адмоўную ролю віцэ-міністра абароны Літвы генэрала Кіпрыяна Кандратовіча

582.2.36:028&r-029 — рк

Дата невядомая. Артыкулы:
Первый год государственнаго строительства
Первые дни литовской арміи

2932. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30)[1] за 18.08.1921 (№134)

Бѣлорусская пресса въ Виленщинѣ. — Бѣлоруссія и Балтійскій Союзъ. — Передъ женевской конференціей. — Бѣлорусское національное движеніе въ Латгаліи. — Военное положеніе въ Совѣтской Бѣлоруссіи. — Наплывъ голодающихъ въ Бѣлоруссію.

582.2.12:077

[1] У жніўні 1921 году была нанятая кватэра на праспэкце Вітаўта, 30, куды перамясьціліся ўсе БНР-аўскія інстытуцыі.

2933. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 19.08.1921 (№135)

Бѣлорусское движеніе въ Гродненщинѣ. — Передъ Женевской Конференціей. — Еще одна жертва. — Новая бѣлорусская організація. — Нота Западно-украинской Республики.

582.2.12:076

2934. Ліст Аляксандра Галавінскага (Масква) Ураду БНР (Коўна) за 21.08.1921

21-VIII-21

Высокапаважаныя Грамадзяне!

Да гэтага часу не атрымаў ад Вас жаднай весткі.

Я пакуль што яшчэ прадаўжаю бадзяцца па Маскве. Думаю выехаць на Бацькаўшчыну у чэцьвір — 25/VIII.

Бачыў Желуновіча. Ён выяжжае 22/VIII у Коўну і назначын заведуюшчым тэхнічнай справай беларускага выда[в]ецства за кардонам на што мае належнае пасьведчаньне ад Красіна. На аванс для выдавецства яму пераведзена десяць міл'енаў царскіх рублей пяцісоткамі, выпуску (як ён казаў) да вайсковага часу.

Апроч выдавецства школьных падручнікаў ен вязе з сабою рукупісы: Янкі Купала 1 том (яшчэ не выдаваных твораў) Якуба Коласа 2 тамы; Бядулі 4 тамы Тішкі Гартнага 5 тамоў, Алеся Гаруна усі творы, таксама М.Багдановіча і яшчэ некалькі маладейшых пісьменьнікаў.

Грошы на выдавецства будуць павялічыны да патрэбнага ліку. Раней іх падбівалі выдаць кніжкі у Вільні, але ад гэтага прышлося адмовіцца, бо не зусім пеўнае там становішчэ і не зусім проста даставіць іх у Менск. Што я канешні пастараўся пад[...?]сліць. Некрашэвіча пакуль што не пушчаюць. Заўтры гэто пытаньне астатэчна будзе вырэшына. Луначарскій выдаў паперу у тым сэнсі, што Некрашэвічу канешні патрэбна выехаць за кардон, бо ён, як тэхнічный працаўнік ня можа быць кім небудзь заменен. Жэлуновіч жадае зьвярнуцца да вызваленьня[1], вялікім козырэм нашага выдавецства ёсьць налічнасьць шмат клішэ з нацыянальнай арнамэнцікай, гэта трэба прэдставіць у належнам сьвеці.

Жалуновіча Вы самі ведаеця. Чэлавек ён агулам кажучы нішто — досыць прыемны, але здаецца крыху з аўтарскай амбіцыей і капрызамі, як то кажуць — «з мухамі у носі». Калі ён даведаўся, што старшыней выдавецства Ал<яксандар> Ів<анавіч>[2] то сказаў «мне ня вельміб хацелася справу рабіць з ім, але нічога ня зробіш — прыдзіцца». Гэта трэба мець на увазі. Ці па палітычным абставінам, ці баіцца, каб А.І. яго не «абвярцеў кругом пальцу» мне уясьніць сабе не удалося — лічу што першая прычына больш пра[ў]дападобна.

Тэхнічную справу выдавецства форму, распарадак і гэт. далей ён жадае узяць у свае рукі. У каррэктары ён хацеў запрасіць Казячага (як парадзіў Маркевіч) я казаў што так сама добры каррэктар Паўлінка[3] ён таксама згодзіўся. У грашовых справах хоча зьвярнуцца за дапамогаю к Будзку, якому вельмі спачувае і даверае[4]. Грошы ён спадзяецца атрымаць перэодычна у вялікам ліку — пытаўся ці можна закупіць тыпаграфію. Да запамітаваў — у супрацоўнікі ен хацеў выпісаць А.Луцкевіча, якому меж іншым хочыць заказаць напісаць гісторыю бел. літературы. Так сама чыкае твораў М.Гарэцкага; меж іншым апошняга ён прасіў напісаць прадмову да яго твораў. Пакуль што гэтай прадмовы німа і не пашкодзіла, каб хто небудзь з нашых узяўся гэта зрабіць.

Даць большую характэрыстыку яму я затрудняюся — бо гутарыў з ім у кампаніі ня больш як гадзіны дзве.

На мой погляд ён цікавый беларус.

Ня прамінець крыху падхітрыць, але хітрасьці у яго ня больш чым звычайна.

Чалавек партыйный, але не партыйнасьць яго святая святых. Апошнім на мой погляд зьяўляецца пісьменство. Культуру ен разгледае не так як адукаваный соцыаліст павінен раз[г]лядаць. Па яго думкі уся справа у агульнай сьвядомасьці і нават пісьменнасьці (гэто адінае прынцыповае пытання быўшая у нашай гутаркі і трываўшая як тэма у працягу — 5-8 мінут) ініцыатыва надумана у перад, але арыэнтіроўка у маменці слаба.

Далей чэлавек ен чэсный, прямый і нават простый. На мой погляд ён ня любіць усякіх відавочных падходаў, камбінацый... Асьцярожный, але не зусімі, а толькі з тымі з кім загадзя парышыў, што трэба быць асьцярожным. Із непрыемных адзнакаў характэру, што можа затрудняць супрацоўніцство з ім гэта прэдвзятасьць і капрызнасьць (цьвердасьці волі у яго нема і запраўды хітрый чэлавек можа непрыкметнамі паступовымі крокамі падбіць яго на любую справу).

Агулам кажучы бедак ён, як і усі мы. Думае аб тым, як бы налепій апрануцца, каб ня горы быць ад другіх; пытаўся колькі каштуе адягнуцца у Коўні і дзе таней. Успалохаўся, калі я сказаў, што будзе каштуваць каля $2^1/_2$ - 3 тысяч нямецкіх марак.

Падайсьці к яму і дабіцца шчырасьці і даверыя можна прастатой і реальнай таварышскай дапамогай у рожных драбніцах і у справе. Відавочных ухажываній за сабою ня любіць.

Затрымаўся я вельмі на яго характэрысціке патаму, што лічу выдавецство вялікая справа і трэба нам унясьці у яе сваю лепту. Пачаць-жа працаваць, дзякуючы прэдвзятасьці і капрызу Желуновіча ня вельмі проста.

Цетка Палута асвабождена і з'мешчына у прыватную санаторыю. Апошнія часы к ей адняслiся з належным вніманіем. Зараз па пастанаўленьню В.Ц.И.К. тетка была звольнена чрезвычайкай. У санаторыю была адвезена на аўтамабілі. Усе гэта крыху прымірыла і удаўлетварыла цётку. Я яшчэ яе не бачыў, а пабуду гэтымі дзенькамі калі яна крыху ачуняе.

Справа правадимая мною праз комінтэрн неспадзевана для мяне сустрэла значную перашкоду з боку Міцкевіч-Капсукаса[5], якому на прагляд і заключеніе была дадзена перэсланная мною Вам інфармацыонная запіска. Ен вельмі крытычна і скептычна адносіцца атносіцца як да нас, так і да нашай працы і агулам да усіх беларускіх деячоў «хатеў знайсці хоць аднаго праўдзівага б.с.р., або бел. каммуніста і не знайшоў». Прывеў прыклад Жукоўскага і Грушэўскага, якія звярнуліся на Украіну працаваць. Кажа што мы зусім не вядзем працы у массах і не маем за сабою мас, адмаўлае нам у дачыненьні у паўстаньнях прошлага году на тылах польскай арміі і гэтага году пад польскай окупацыей. Кажа што мы урадовая партыя літоўскай дзержавы, якая растрэлівае за то што знайдзе на кватэру бомбу у яго таварышоў і гэт. дал. Закідывае нам што мы гатовы пайсьці на згоду хоць з чортам і кіўні нам бельведэр[6], то зараз-жа перакінемся і... Закідывае што де каторыя сучасныя дзеячы шукалі паразуменьня з кайзэром. Гэтакія і таму падобныя заявы не сур'езны і не павінны былі-б быць у запраўднага палітычнага дзеяча і на іх можна булоб начхаць калі-

б не во якая справа. Камінтэрн даручыў кіраўніцтво рэвалюцыйным рухам у Жэліговіі — літвінам, а у Горадзеншчыны палякам. Вам зразумела на колькі шкодна гэтакая не маючая пад сабою належнага грунту пастанова. Цяперыка зразумела пачаму у пратаколы зьезда[7] ня было унесена рэзалюція пратэсту бел. каммуністаў аб здеках у заходней Беларусі — гэта былі павінны патрымаць польскія каммуністы і яны ня пажадалі гэтага зрабіць. Будзь ласкаў Тамаш падгатуй належныя матэр'ялы аб працы як прошлага так і сучаснага году. Скажу па праўдзі што я ледзьві не разлаіўся з Капсукасам. Зазначыў што 3/4 таго, што зроблена у справе рэвалюціонірованьня мас, зроблена нашай партыей. Шкада што нема са мною інфармацый К<арабача?> аб рэвалюцыйнасьці у Трокскам, Свенцянскам, Віленскам і з другога боку у Ашмянскам, Лідскам, Вілейскам паветах ідзе большасьць беларуская. Гэты дакумент, на мой погляд, треба паказаць Аралаву і праз яго нажаць. Хоць Капсукас і прызнае што бел. рух зрабіў вялікія крокі, што, нават, у Вільні ёсьць беларуская абщэственнасьць, але у рэвалюцыйнасьць нашай партыі ня верыць і лічыць жаднае супрацоўніцтво не магчымым. Канешні ён зрабіў нам вялікую перашкоду, але я лічу не магчымым складаць рук бо наша праца сама за сябе гаворыць і што у рэкамендацыі нават Капсукаса мы не нуждаемся (што я яму у вочы і сказаў). Зараз у партыйных справах я раблю крок у Р.К.П. у польскіх так сама прышлося быць, але тутака я не спадзяюся; ды і зазначылі яны што трэба гутарыць на мейсцох. Як гэта не цяжка, а трэба мець на увазе, што палякі карыстаюцца бальшой павагай і уплывамі у Маскве, а патаму у гэтам пытаньні трэба быць вельмі асьцярожна і знайсьці належны крок, каб зьвязацца з пол<ьскімі> комм<уністамі>.

З расейцамі я буду гутарыць заўтры. Затым паспытаю дастукацца асоба уплывовых дзеячоў і толькі тады павяду апошнюю гутарку з камінтэрнам у справах рэвалюцыйнай барадзбы супраць польскіх окупантаў. Я падаў толькі інфармацыоную запіску, лічу што іна досыць асьцярожна складзена і асаблівых перашкод, калі б, нават і была апублікавана не было-б. Я нават хацеў занесьці яе Стеклову[8], але цяпер раздумаў. Які Ваш погляд?

Сягодні зрабілі загародную прагулку з грам. Б.[9] і былі у Л.Б.Каменева. Спаткаў ен досыць проста і прыветліва. Робіць уражэньне досыць сур'езнае. Гутарылі каля гадзіны (у дваіх, гр. Б. стараўся не учаняцца і выйшаў). Каменеў віленец, але выехаў чатырнадцаці гадовым хлопчыкам і з сваім родным краем стратіў зьвязь. У нашай справе ён ня вельмі паінфармован, але справу і нашы дамаганьня разумее. Я паінфармував яго аб нашай справе, перадаў інфармацыоную запіску, зазначыў што мы, як селянскі народ зацікаўлены ня толькі, соцыяльнаю, але і з нацыянальнага боку справай, паднятай рэвалюцыяй. Нам патрэбна выкінуць уласьнікаў маенткаў і мы, як селянскі народ зацікаўлены у тым, што працоўныя класы прыцягіваюцца да улады, што кап рабіць буржуазную уладу, то нам прышлось бы прасіць інанародную буржуазію і такім парадкам ганьбіць сваю нацыянальную справу. Вытлумачыў юрыдычный стан рэчаў у заходней Беларусі: упамянуў аб важнасьці для нас паразуменьня з жыдамі і адзначыў нашу безпасрэднюю зацікаўленнасьць у тым, каб атсунуць Польшчу ад уплываў на балтыйскій саюз.

Каменеў зазначыў, што яны разумеюць нацыянальнае пытаньне, што Ленін абараняў яго на кангрэссах другога інтэрнацыянала, калі супраць была Р.Люксембург (я ня ведаю ці запраўды гэта так?) і што ня гледзячы на гэто усі нацыянальныя абразаванія сталі папярок дарогі.

Затым задаў пытаньне аб соцыяльным становішчэ, я даў інфармацыі аб польскай каланізаціі і здеках над бежанцамі... ... Тады Каменеў, падчэркнуўшы што гутарыць не офіцыяльно, зазначыў, што рыжскі мір па яго глубокаму перакананьню будзе скасованы. Што прышлося падпісаць яго дзякуючы таму што мы быўшы у пятнадцаці вярстоў ад Варшавы апініліся у 500 верстах. Але яны прымушаны зараз афіцыяльна яго выпаўняць (хоць, па яго славам, і Польшча і Расея яго ня выконываюць) і што пытаньне аб выключэніі Польшчы з балтыйскага саюзу для іх первастатейнай вагі што яны вельмі дабіваліся супольнай з Літвой граніцы (і праз Літву з Германіей) але дабіцца гэтага не удалося. Што падняць пытаньне аб незалежнасьці этнаграфічнай Беларусі у такім маштабе як гэта нам пажадана, для іх выгадна (мы весьма-бы желали быть окруженными крестьянскими независимыми республиками), але ініцыатыва у гэтай справе ня можа ісхадзіць ад расеі, бо Расея гэтую справу можа вырышыць толькі аружжам. (Польшча-ж ухапіўшыся за рыжскі мір, падтрымлівае яго французскімі пушкамі і французскім ген. штабам). Што дзержавы антанты, ня гледзячы на пераход Польшчы лініі Керзона умываюць рукі (хоць-ба легка маглі прымусіць Польшчу заняць свае места — яго слава).

Што Літва не здолее справіцца да гэтага часу з Жалігоўскім, а Мееровіч лунае мрыямі аб міравой палітыкі (Каменеў путаў Літву з Латвіей ня ведаю для чаго ці хацеў іспытаць мяне, ці так мелка глядзіць на гэтыя дзержавы) і не бачыць у сябе пад носам што робіцца... Калі пытаньне аб незалежнасьці будзе пастаўлена у рэальныя рамкі, або калі-б можна булоб паставіць Польшчу перэд фактам, то Расея ня будзе перэшкаджаць (канешні урадовым парадкам аб гэтам у данный момент згаварывацца ня можна, трэба згаварыцца паміж партый — яго слава) наатварот пашырыць тэррыторыю і гэт. далей.

Я запытаўся, «возможно ли ту часть этнографической территории, какую занимает россия об'единить с Минском и противоречит ли это рижскому миру». — «Точно Вам ответить на этот вопрос я затрудняюсь — противоречит ли. Мы полагаем что означенная территория являецца в наших руках козырем большого достоинства и мы воспользуемся им в крупной игре; сейчас-же пустить его не является целесообразным, так как это не приведет к результатам и не будет должно оценено и взвешено». («Мы не желаем крупнаго козыря тратить впустую»).

Сістэматызуем погляд іх.

Мір — непаразуменьне. Пабудаваньне прыбалтыйскага саюзу з этнаграфічнай Беларусьсю — вельмі важная справа, паскольк яна магла адсунуць Польшчу да этнаграфічных граніц і спыніць яе захады умазацца у прыбалтыку.

3) Самі пачаць гэту справу яны ня лічуць магчымым. Самае большае (як ён казаў) гэта Чэчэрын можа саставіць ноту, але гэта (па яго думкі) не вырышэньне справы.

На мае катыгарычнае запытаньне «а сама расея пойдзе на (тэр<ытарыяльныя>) жэртвы у гэтай справе» атказаў «да». Канкрэтна запрапануваў згаварывацца з партыямі.

Мае агульнае уражэньне: справу можна парушаць далей. Трэба праца як тутака, так і закардонам, а асабліва на мейсцах. Пытаўся ці спрабувалі мы выявіць свае сілы у выбарах. Я адказаў, што такіх выбараў нема. У весках і паветах працуюць па назначэньню. У сойм выбары лічым не магчымымі, бо гэта значыла-б нашу згоду аб прылучэньні да Польшчы.

На гэта звярніця увагу і трэба абміркуваць як лепій зрабіць. Тутака лепшыя сілы пріймаюць дачыненьня у справе дапамогі галадаючым. Падумайця ці ня можна было нам справіць якій небудзь атрад дапамогі і для працы на мейсцы. Тадыб здалелі шмат чаго асягнуць.

Бывайце здаровы. З вялікай пашанай

А.Галавінскі.

Грам. Б. быў вельмі зацікаўлен гутаркай і здаволен пастаноўкай справы. Лічыць, што пойдуць далей чым абецаюць і уступяць.

582.1.24:019&r-022&r

582.1.24:012-018 — мк

---

[1] Выдавецтва «Вызваленьне» ў Бэрліне. [2] Цьвікевіч. [3] Мядзёлка. [4] Жылуновіч і Будзька былі знаёмыя зь Петраграду 1916-1917 гадоў. [5] Адзін зь лідэраў падпольнай Камуністычнай Партыі Літвы, дзейнічаў нелегальна на Віленшчыне, браў удзел у III кангрэсе Камінтэрну. [6] Польскія ўлады ў Варшаве. [7] III кангрэсу Камінтэрну (Масква, 22.06-12.07.1921). [8] Сьцяклоў — рэдактар «Известий ВЦИК». [9] Магчыма, Балтрушайтісам.

2935. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 22.08.1921 (№136)

Совѣтская Бѣлоруссія. — Съѣздъ представителей уѣздныхъ сеймиковъ и магистратовъ въ Виленщинѣ. — Новыя репрессіи въ Виленщинѣ.

582.2.58:020 — шк

2936. Загады па Беларускім Асобным Батальёне Літоўскага Войска ад 22.08.1921 да 2.09.1921 (м. Грынкішкі)

582.1.12:001-137

2937. Ліст лейтэнанта французскай арміі Лявона Кахоўскага (Meknès, Марока) «г-ну Министру» за 23.08.1921,канвэрт і пасьведчаньне, выдадзенае Аўгенам Ладновым Лявону Кахоўскаму 9.02.1921 аб прызнаньні за Дэлегацыяй БНР на Мірнай Канфэрэнцыі ў Парыжы доўгу і абавязаньнем выплаты

582.1.25:009&r-010

582.1.25:011 —канвэрт

582.1.25:012 — пасьведчаньне

З просьбай выплаціць належныя грошы («Съ начала октября мѣсяца 1920 г. и до середины февраля мѣсяца 1921 я состоялъ на службѣ въ качествѣ секретаря Делегаціи Бѣлорусской Народной Республики на Мирную Конференцію въ Парижѣ...»

2938. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 24.08.1921 (№137)

Въ «Виленскомъ Парламентѣ». — Эстонская пресса о Бѣлоруссіи. — Борьба съ бандитизмомъ въ Сов. Бѣлоруссіи. — Бѣлорусскій государственный музей. — Институтъ Бѣлорусской Культуры. — Помощь голодающей Россіи.

582.2.12:064

2939. Паштоўка Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.08.1921

582.1.25:015а

2940. Ліст Івана Карчынскага (?) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.??.1921 з просьбай прыслаць для друку «Малітоўнік»

582.1.25:015

Дата й абставіны невядомыя.

2941. Расьпіска Максіма Гарэцкага за 30.08.1921 аб атрыманьні ад Браніслава Тарашкевіча 10.000 польскіх марак авансу за «Родны Край» выд. IV Гарэцкай для перадачы аўтарцы

582.2.37:078 — р

2942. Блянк пасьведчаньня аб праслуханьні летніх курсаў беларусазнаўства ў Дзьвінску ад 27.07 да 30.08.1921

582.2.50:038&r-039&r — д

2943. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 31.08.1921 (№140)

Съѣздъ самоуправленій въ Вильнѣ. — Къ предстоящимъ выборамъ въ виленскій сеймъ. — Помощь голодающимъ. — Бѣлорусскіе студенты въ Чехословакіи. — Возобновленіе бѣлорусской газеты въ Вильнѣ.

582.2.58:021 — шк

2944. Зварот Адварда Будзькі (Віленскі Саюз Каапэратываў) да беларускіх эмігрантаў

Вы, каторыя гаворку маю разумеіця, каторыя родам з бацькаўшчыны нашай Белай Русі — з пад Вільні, Мінска, Оршы, Смаленска, Віцібска, Полацка, ці з пад Дзьвінска, Гродны, Беластока, Брэста, Пінска, Мозыра, Гомля, Мсьціслаўя, Магілева, Барысава, Смургонь, Ашмяны, Ліды, Баранавіч, Слуцка, Бабруйска, — адным словам: Беларусы, родныя мае! — Вас здаліоку вітаю шчырынька, мілінька, да Вас адзываюся, да Вас удаюся з гора і бяды, ад якіх марнеіць і гініць жыцьціо нашай роднай старонкі і яе людцау... Добрых чулых дзетак Беларусі апанавала трывога і жаль над марнай доляй бацькаўшчыны сваей... Яе дратуюць і пустошуць войскі усякія праз шэсьць ужо гадоў запар ад 1915 да цяперашняга 1921 году... Ад стрэлаў пагінула шмат вольнага люду, ад агню пагінула шмат

сяліб і сіолаў, ад напору войска на войска пагінула шмат дабра на полі, ад пастою войска усілякіх окупантаў пагінула шмат садоў, курэй, сьвіней, бычкоў, коні і усялякіх рэчы, а ад рэквізіцій — дабра, жывіолы і усякай усячыны, ды ад прыгону на стойку і на прымусовыя работы пагі[ну]ла шмат нават добрых гаспадарак... Мы гэта тут відзючы і ведаючы пераносім шмат зразот, надрываім здароўя парываючыся на ратунак суседзям блізкім і далейшым... Ды мала рада наша, бо нашы грошы — марныя грошы, малашто варты, нінабярэсься іх столькі каб якто кажуць — на ногі паўстаць гаспадару, дый ні дакупісься патрэбных рэчы, бо іх нідачыкацца — як гаршкоў, струмэнтаў, шкла, жалеза і шматшто іншага; дарагоўляж усьцяж яшчэ расьцець і нетведама аткуль у гаспадара возьміцца гатоўка, калі німа ужо чаго прадаваць. Каб асіліць народную бяду, каб адбудаваць зруйнаваны вайной край трэба здабыцца на сілы і на грошы. У грумадзе сіла, дык грумадзіцца мы павінны усюды; грумадой узяўшыся асілім намечаную работу. А з носу па грошу зкінуўшы казна вырасьціць, каторую мы павінны папаўняць ня пірастаючы складчыну рабіць, стараючыся каб хоць гэткім чынам услужыцца родным людцам і старонца роднай. Загранічныя грошы — дарагія грошы, і за іх на Беларусі шмат работы зрабіць можна, шмат дабра нажыць можна; дык і трэба каб дабыць загранічныя грошы. У гэтым дзеля эмігранты беларускія, выйхаушыя з Краю у сьвет на заработкі, вялікую і ніацаніоную услугу аказаць могуць тут нам у Краю пакінутым і тут пагалелым родным людцам. Хто ня можыць яшчэ скора вярнуцца і да работы у Краю здольнасьці і стараньня прылажыць той складчынай павінін як найхутчэй пасьпяшыцца на падмогу роднаму Краю. Грэшна будзіць варочацца на бацькаушчыну ня прыслужыушыся ей цяпер посьля яе ваеннага пагрому; грэшна будзіць занідбаушы старонку, дзе свае дзяцінныя ці маладыя леты правіоў, дзе рос і узгадаваўся, зкуль свой род вядзеш, якую ня з роскашы пакінуу... алі успамін каб лепшы аб ей мець дык для яе лепшай будучыны чымнебудзь прыслужыцца належыцца, інакш — ікацца будзіць як загінуўшаму дзіцяці на успамін ніпавіннай маці-старонкі роднай ды занідбанай... Рабіця складчыну адзін аднаго заахвочываючы і ні адкладаючы надалей, бо хто напару даець — якбы удвая даець. Лучыціся да сваяцкай грумады — да беларускай, бо у грумадзе сіла, бо грумада — вялікі чалавек. Давайця знаць аб сабе на бацькаушчыну у вядомую грумаду, высылайця туды сваю складчыну на патрэбны ужытак.

Адварды Будзька
Вільня
Саюз Коопэратываў
582.2.58:018-019 — ма

Дата невядомая.

2945. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 1.09.1921 (№141)

Обращеніе Правительства Бѣлорусской Народной Республики къ Совѣтскому Правительству [У справе пагромаў ва Ўсходняй Беларусі]
582.1.22:006

2946. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 2.09.1921 (№142)

Бѣлоруссія — единый хозяйственный организмъ

582.1.22:007

2947. Ліст дырэктара Ўсходняга Дэпартамэнту МЗС Літвы (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 3.09.1921 і канвэрт

L.R. Kaunas, 1921 m. Rugsėjo mėn. 3 d.
Užsienių Reikalų
Ministerija Ponui Lastauskiui
Nr. 11300 Gudų Respublikos Ministerių Pirmininkui.

Gerbiamasis,

Turiu garbės Tamstai pranešti, kad gautomis iš musų Atstovybės Rusijoje žiniomis pil. Stase Kisiel yra paliuosuota 7-8 sąvaites atgal iš kalėjimo ir išvažiavo lenkų tremtinių ešalonu per Minską.

Prašau priimti mano pagarbos pareiškimą

[Подпіс неразборлівы — А.Бізаўскас?]

Rytų Departamento Direktorius

582.1.29:008

582.1.29:009 — канвэрт

2948. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Карлсбад) Аляксандру Цьвікевічу (?) (Коўна) за 3.09.1921

Karlsbad 3/IX 1921.

Высоко паважанны
Пан Міністр

Имѣю честь довести до свѣдѣнія, что вчера вечером пріѣхал в Карлсбад. — Сегодня суббота нѣт засѣданій и этот день я использовал для визитов. Был у Президента Сіонистическ. всемірной организаціи проф. Х.Вейцмана, у Президента Конгресса Соколова и Вицепрезид. Моцкина. В 5 часов имѣю свиданія с д-р Kohn — предсѣдателем Бѣлорусских землячеств в Америкѣ. Контакт с ними нам очень важен и это подготовит почву для нашей делегаціи в Америкѣ, которая теперь становится всемірным центром политической работы.

Завтра состоится собраніе журналистов всѣх стран для интервью со мною по Бѣлорусскому вопросу. Я твердо вѣрю, что мнѣ удасться сдвинуть наше дѣло с мертвой точки, на которой нѣкоторым якобы нашим quasi-друзьям хотѣлось бы задержать. Я строго придерживаюсь в бесѣдах и выступленіях нашего основного тезиса: дружба и тѣсный союз с Литвой, которая является поистинѣ демократической страной. К сожалѣнію, послѣднее шовинистическое настроеніе низшаго и средняго чиновничества Литвы, а также направленіе полуофиціозной прессы (плохо-скрытый антисемитизм) сослуживает Литвѣ плохую службу. Приходится выслушивать много упреков, частью справедливых (паспортныя притѣсненія для евреев) еще болѣе несправедливых, которыя считаю долгом разсѣивать.

Просите д-ра Лурье дать маленькую замѣтку в «Вольн. Литвѣ» о моем пребываніи здѣсь и о встречах с отвѣтствен. сіонистич. дѣятелями.

Не получая от пана Старшыны за все время ни слова и не зная, гдѣ он, я ему не пишу.

Здѣсь останусь 4-5 дней откуда опять ѣду в Берлин и оттуда в Лондон.

Жду непремѣнно от Вас информацій и директив.

С искренним уваженіем

С.Житловс...

P.S. Просите д-ра Лурье выслать в Берлин всѣ наши англійскіе проспекты.

С.Ж.

582.2.58:016&r — ра

2949. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) Дырэкцыі Дзяржаўнай Бібліятэкі (Коўна) за 5.09.1921

Уважліва прашу Дзержаўную Бібліотэку выдаваць мне на дом кнігі навуковаго і грамадзянскаго характэру, за цэласць каторых бяру на сябе поўную адпаведальнасць.

Згары дзякую за выпаўненьне маей просьбы.

[Занатаваны алоўкам сьпіс кніг:]

Baliński Starożytna Polska

Jelski Historyja szlachty na Litwie i Rusi Litewskiej

Kutrzeba Historyja wewnętrznego ustroju Polski T IV? Litwa,

Wiszniewski Historyja literatury polskiej T VI. History Lit.

Малиновскій Рада Велик. Кн. Лит.

Истор. Смоленск. Кн.

Полоцкаго

Туровского кн.

Бранцева Истор. христ. Съв-Зап. края

582.2.58:017 — р

2950. Расьпіска Антона Аўсяніка[1] за 6.09.1921 аб пазычэньні ім у Браніслава Тарашкевіча 5.000 польскіх марак

582.2.37:067 — р

[1] Антон Аўсянік выехаў з Коўна ў Вільню ў траўні 1921 году. Дыпляматычным прадстаўніком БНР у Літве замест яго 23.05.1921 быў прызначаны Аляксандар Вальковіч.

2951. Ліст Язэпа Варонкі (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.09.1921

Редакція и контора
балтійскаго общественно-
историческаго, торгово-про-
мышленнаго и статистическа-
го альманаха-справочника
«ВСЯ БАЛТИКА».
Ковна, Аллея Свободы, 52.

7.IX.1921.

Многапаважаны Пане Вацлаве!

Вельмі дзякую за кнігі. Мне брак яшчэ выданьняў гэтага-ж выдавецтва[1] за апошніх 3 месяцы: №1, 2 «Сел<янскай> Д<олі>» і брашур. Калі ласка не адмоўце прыслаць. Кнігі (толькі адну — «Гісторыю Беларусі», бо другая не ведама дзе) дам Халецкаму сягоньня пад вечэр, бо яна у мяне у хаце!

За тым яшчэ просьба: чы не маглі-б мне пажычыць расейскую машынку на два тыдні у рэдакцыю, мне гэта прынесло бы многа карысьці.

З пашанай ЯВаронко

582.1.25:014

[1] Выдавецтва Міністэрства Беларускіх Спраўаў — маецца на ўвазе выдаваная беларускімі эсэрамі агітацыйная літаратура.

2952. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 7.09.1921 (№143)

Бѣлорусская національно-политическая конференція. — Школьное дѣло въ Западной Бѣлоруссіи. — Бѣлоруссія на конгрессѣ угнетенныхъ націй. — Бѣлоруссія и евреи

582.2.58:015 — шк

2953. Ліст старшыні Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту Фабіяна Ярэміча (Вільня) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.09.1921

Wilnia 8/IX 21 h.

Daražeńki Dziaćka Włast.

Pišu da was heny list i bajusia kab nia było pozno bo 25 wierasnia zusim blisko. W zwiasku z tym što majecca adbycca narada u Prazi u nas było pasiadženie Nacyjanalnaho Kamitetu dzie usie pryncypowo zhodzilisia jechać na naradu ale daručyli pryzydyumu zapytacca i wyswiatlić nie katoryja nie jasnasci što było zrobleno, posłany list ad Nacyjan. Kam. ale ješče da henaj pary nijakoho adkazu nie atrymali.

Pa majoj jncyjatywie była sklikana prywatnaja narada u Wilnie dzie byli zaprošany usie adpawiednyje i aktyŭnyje dziejaczy dziela abhaworu toj samaj sprawy t.e. pajezdki u Prahu, zrabiŭ ja heta dziela taho što u Kamitet nie usie uwachodziać aktyunyje pracoŭniki, pasla hutarki u prywatnaj naradzie wyjasniłasia i adnahałosno pryšli da pierakonannia što toj razkoł jaki da siońniašniaho dnia jość, heta zhuba dla Biełaruskaje sprawy. Patrebny supolny front i koordynacja sił. Ahulny [s]chod daručyŭ mnie uziać na siabie jncyjatywu kab znajsci darohu da parazumieńnia i ja uziau na siabie henuju ciažkuju sprawu, nie wiedaju ci adoleju. Ale uziau heta tamu što mnie prychodzicca wielmi adczuwać stojačy na čale apošniaj Biełaruskaj hramackaj palityčnaj arhanizacyi na baćkauščynie. Nia wiedaju i dla mianie asabisto nie zrazumieła čamu my nie zabiŭšy miadzwiedzia uzialisia skuru dzialić bo my tut atrymouwajučy wiestki wyklučna tolki a brudach jak z adnaho tak i z druhoho boku tracim hoławy i toj chto mohby choć trocho pracawać dyk i u taho ruki adwalwajucca, našyja pali-

tyki pačali jhrać u palitykaństwa ale pamiz saboju, nieužoš niama raboty bolš karysniejšaj. A dalej da sprawy.

Ja hawaryŭ z Antonam, Symonam, Tarasom i Arkadjam[1] jany zhod[n]y hawaryć ab parazumieni i ab zhodzie sprawa za wašaj zhodaj i za techničnym jee wykananiem ja liču što zhoda pawina nastupić perad naradaj. (matywaŭ nawat nia budu prywadzic bo heta zrazumieła) T<awary>š Wł<a>st. zrabicie usio machčymaje ad was. Kab usio było dobra bo ad henaho cierpić Biełaruskaja sprawa i dosyć uzo ihrać u pryncypu i asabistaści mnie zdajecca. Darahije Kowienskie tawaryšy kali wy woźmiecie hena da serca i ščyra razważycie to napeuna zhodziciesia z samnoju. Czakaju ad was adkazy ci najlapiej byłob kab chto pryjechau u Wilniu i tut abhawarylib a tady pajechalib u Prahu tady sapraŭdy naša narada byłab naradaj sierjoznaj a nie wyliwanniem usio tych że brudau samych na siabie. Czakaju adkazu. Kłaniajusia usim usim

Z Pawažaniem FJarem...

Wilnia

8/IX 21 h.

[На адвароце:]

Гэтым сьведчу, што ліст гэты атрыманы 21/IX. 1921. в.а. консула Я.Чарапук.

582.1.25:001&r-002

У публікацыі Я.Янушкевіча (Янушкевіч Я. Архіў Вацлава Ластоўскага // Голас Радзімы. №8. 25.02.1993) аўтарства гэтага ліста беспадстаўна прыпісана Максіму Гарэцкаму. [1] Луцкевічам, Рак-Міхайлоўскім, Тарашкевічам і Смолічам.

2954. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Аляксандру Цьвікевічу (Коўна) за 8.09.1921

8.IX.21.
Рыга.

Даражэнькі
Александр Іванавіч,

получыл сёнека тваю згоду на мой выхад з грамадзянства, але да гэтага часу нічога не маю ў адказ на свой даклад ад Бенасу.

А час ідзе.

Чаканьне зьвязвае працу.

Курсы вучыцелеў скончаны. Вучыцелі раз'ехаліся з вялікім ўражаньнем. Чакаюць цяперака ТОЛЬКІ КНІЖАК. Ад іх залежыць усё.

Што ж «Вызваленьне»? — Дайце кніжак!

Наладзілася труппа. Мае усьпех і ў Дзьвінску і па вёсках.

Трэба пачынаць каапэратыўную працу. Чаму Будзька затрымаўся?

Учора атрымаў вялікі ліст ад Кахоўскага, — супрацоўніка Ладнова па місыі. Мае прэтэнзыі на 3200 франкаў. Жыве ў Марокко. Служыць у французкім войску лейтенантам. Гразіцца жалавацца французкаму Прэдстаўніцтву ў Літве, Французкаму Ураду і свайму Вайсковаму начальству.

Напісаў яму ўспакаіваючае пісьмо. Прашу пачакаць.

Мей гэту справу на ўвазе.

Вальковічу скажы каб ён паслаў мне хоць крыху грошай. Пасля па-

ездак і рожных выдаткаў сіжу зусім на мелі. А тутака яшчэ трэба падтрымліваць Дварчаніна, які ўжо зноў не атрымлівае грошэй з курсаў і жыве за мой кошт.

Надзеі на дэлегатаў ў Прагу з Амэрыкі я не маю: Бубешка паехаў ў Японію і Манджурыю, а рэшта страшэнна занята сваімі ўласнымі інтэрэсамі.

Дварчаніна я для Канфэрэнцыі затрымаў і мандат яму ад «Бацькаўшчыны» ўжо зроблены, але ці пратрымаю яго і ці давязу — не ведаю. Гэта будзе залежаць ад Вальковіча.

Чакаю з Вільні дакумэнтаў тых, каго яны хацелі б направіць ў Пражскі Уныверсытет. А пакуль што загатовіў толькі дакумэнты Дзвінчан і Дварчаніна. Худка вышлю іх да цябе, каб ты паслаў Чэха-Славакам.

У Вільню напісаў каб, калі не паедуць у Прагу самі, дык прыслалі мандат Дварчаніну і мне.

Дапамажы мне, братка, атрымаць кніжкі ад «Вызваленьня» бо іначэ школы стануць! У Вільні падрушнікаў мала і высылаюць яны толькі тое, за што ўперад я перасылаю ім грошы. Грошай жа у мяне — брак, ды і прападаюць часта ў дарозе (гэтымі днямі прапала на «лапуўку» 200 марак ням., якія даручыў аднаму грамадзяніну перавесьці ў Вільню разам з тваей кнігай).

Паслаў, і ўжо маю паведамленьне аб атрыманьню Сымонам Р<ак>-М<іхайлоўскім>, 10 экзэмпляраў тваей кнігі «Адр<аджэньне> Бел<арусі> і П<ольшча>»

Ці прыехала ўжо Паўлінка з мора? і што яна зрабіла, — разам з Гр. Казячым, да якога я пісаў асобнага ліста — ў справе адшуканьня маей кнігі «Бѣл<оруссы> и Пол<яки>», якая захоўваецца у Семашкі ў Міністэрстве?

Не паляніся адказаць мне на ўсе пытаньня падробна, хоць і ведаю што ты страшэнна заняты.

Бывай здароў

Твой Кастусь.

P.S. Толькі што прынёс паштар пісьмо з Вільні. Вось кароткі змест яго:

1, 1.IX.21 адбылася нарада Віл. Бел. Кам. ў справе Прагі;

2, былі галасы, хоць і незначны лік, каб не ехаць, бо не вядома праграмма і невыразныя мэты, але пастаноўлена, не ўважаючы ні на што, — ехаць;

3, з кожнай арганізацыі едуць па аднаму;

4, названы гэткія асобы: Кахановіч, Антон[1], Гарэцкі, Сымон[2], Аркадзь[3], Трэпка, Янка С<танкевіч>, Ерэміч, — кожны ад сваей арганізацыі;

5, але ніхто з іх не мае пэўнасьці, што вырвецца, апрача таго ўсе — заняты службай і працай, а трэцьцяе, найважнейшае, — грошы німа;

6, адносіны да Ураду гэткія: «Варожых адносін ў віленчукоў ні да цябе асабіста, ні да ўсіх няма. Есьць ў адзінак крытыка і надта часамі рэзкая, але гэта не з боку усіх, кажу [канец?]».

7, чакаюць грошэй на дарогу і на сэмінарыю; (адказ у гэтай справе дай мне, а я зноў маю зручнасьць і паведамлю іх).

Дадаваемые да твайго лісту пісьма не адмоў перадаць па адрэсах. Выбачай за турботы, але эканомлю час і грошы.

Худчэй адказвай мне. Патарапі Бенасу.

Ці вярнуўся ўжо з мора В.Ластоўскі?

Перадай ліст яго жонцы. Ен быў пасланы да мяне.

Кастусь.

582.2.12:067&r-068

[1] Луцкевіч. [2] Рак-Міхайлоўскі. [3] Смоліч.

2955. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Карлсбад) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.09.1921

Karlsbad 9/IX 1921.

Высокаповажаны Пане Старшыня,

Настоящим имѣю честь освѣдомить Вас о той работѣ, которая мною продѣлана в Карлсбадѣ.

1. Я имѣл свиданія и продолжительныя собѣсѣдованія с Президентом XII Сіонистическаго Конгресса Н.Соколовым, а также членами Президіума г.г. Моцкиным, д-р Вейцманом (Президент экзекутивы Сіонист. партіи), Гольдбергом и другими. Г-ну Соколову я передал меморандум, в котором освѣтил политическую, экономическую и культурно просвѣтительную ситуацію Бѣларуси в настоящій момент, отмѣтил еврейскую проблему в Бѣларуси, намѣтил ту линію поведенія, которую, по моему мнѣнію, должна повести еврейская общественная мысль. Копію меморандума[1] пришлю Вам из Берлина. Мнѣ конкретно обѣщана моральная и матеріальная поддержка в Лондонѣ и Америкѣ, но не из средств Сіонист. партіи а из других общественных источников.

2. Я имѣл долгія собѣсѣдованія и интервью с редакторами и корреспондентами крупнѣйших еврейских газет Америки, Англіи и Франціи. Для многих из них Бѣлорусская проблема звучала новым открытіем, другіе были очень плохо, а многіе сознательно извращенно (с польской стороны) информированы. Слѣдует признаться, что с самой сильной державой настоящаго времени — прессой — мы до сих пор очень небрежно обращались. Я им раздал имѣвшійся у меня матеріал, освѣтил вопрос в надлежащем свѣтѣ и уже отсюда будут отправлены статьи руководящаго характера в наиболѣе вліятельныя газеты и журналы и таким образом почва для наших делегацій в Лондон и Америку будет подготовлена.

3. Я имѣл продолжительное собѣсѣдованіе с г. Министром по еврейским дѣлам Литовской Республики г. Соловейчиком. Содержаніе этой бѣсѣды я Вам подробно сообщу из Берлина.

4. Очень большой интересс к нашему дѣлу проявили извѣстные еврейскіе писатели-поэты Н.Бялик и З.Шнеур. Оба пользуются громадным вліяніем на интелегентные еврейскіе массы и привлеченіе этих сил на нашу сторону имѣет громадное для нас значеніе. Г. З.Шнеур — Бѣлорус (из Шклова) оказал мнѣ здѣсь очень много цѣнных услуг в смыслѣ знакомств и связей, очень много работает для нас и обѣщал удѣлить нашему дѣлу много вниманія. Чтобы его болѣе связать с нами, я предлагаю назначить

его совѣтником Министерства по дѣлам меньшинств, конечно без всякаго оклада, так он очень состоятельный человѣк и хочет работать по идейным побужденіям. Вслучаѣ Вашего согласія, я просил-бы официальнаго извѣщенія о его назначеніи.

Очень цѣнные услуги оказал и оказывает нашему дѣлу д-р В.И.Якобсон, котораго я полагал-бы слѣдует поблагодарить письмом от имени нашего Правительства. Он — директор «Judischer Weltverlag» в Берлинѣ, имѣет громадныя связи с нѣмецкой прессой и вліятельными кругами и искренно идейно предан нашему дѣлу.

В Прагѣ, 25 сентября с.г. имѣет состояться конгресс представителей всѣх общественно-благотворительных учрежденій (еврейских) в Европѣ и Америкѣ. Оттуда Украинское еврейство получает громадныя суммы для погромленных. Так как к великому несчастью у нас на Бѣлоруси тоже были погромы, то, конечно, очень важно было-бы присутствіе кого-либо из нас на этом конгрессѣ. Если идея національнаго с'ѣзда в Прагѣ не отпала, очем я к сожалѣнію не имѣю никаких сообщеній, то, конечно, мы немедленно войдем в контакт с главным комитетом в Лондонѣ и сумѣем наладить помощь нашим погромленным от поляков.

Убѣдительно прошу написать мнѣ пару слов о нашей работѣ и общем положеніи: при отсутствіи информаціи опускаются руки к работѣ и я считаю невозможным долѣе оставаться без контакта с Кабинетом.

Здѣсь остаюсь еще день и завтра выѣзжаю в Берлин, так как на 14ое с.м. назначено Общее Собраніе членов Бѣларускаго комитета помощи голодающим в Россіи.

Прошу примите, Пане Старшыня, увѣреніе в совершенном уваженіи и преданности.

С.Житловскій

582.1.25:007&r-008&r

[1] Дакумэнт №2956.

2956. Мэмарандум міністра нацыянальных меншасьцяў БНР Самуіла Жытлоўскага прэзыдэнту XII Сыяністычнага Кангрэсу ў Карлсбадзе за 8.09.1921 аб палітычным і эканамічным становішчы жыдоў у Беларусі і аб неабходнасьці выдзяленьня сродкаў на супрацьпагромную дзейнасьць

582.1.26:001-010 — мк

2957. Статут Саюзу Сялян-Беларусаў у Літве, прыняты 9.09.1921, зацьверджаны й зарэгістраваны ў Начальніка м. Коўна й павету 21.09.1921 пад №114 (Весьнік Ураду №74, ст.4)

582.1.40:103-100 — мк

2958. Ліст В.Анісковіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.09.1921

582.1.46:018&r-019&r

В.Анісковіч — бежанец зь Дзісенскага павету. У лісьце — просьба даслаць літаратуру і крытыка дзейнасьці Місіі БНР у Бэрліне.

2959. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 10.09.1921

10.IX.21
Рыга.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

атрымаў сёнека Ваш ліст аб Ладнове.

Супакоім яго.

А мо' ён і выступаць не будзе калі спачатку з ім належна пагутару.

Чэкаю ад Вас адказу на свае лісты.

Сімсон ўжо тры разы званіў наконта стацыці, аб якой я Вам ўжо пісаў два разы.

Ангельскі Кааператыўны журнал заказаў таксама стацыцю.

Хай яе напіша Будзька і прышле мне.

Са мной едзе Дварчанін. Я яго пасля сканчэньня курсаў папрасіў астацца.

Трэба яго абудзь і адзець (апрануць).

Хай Вальковіч аб гэтым паклапаціцца.

Атрымаў весткі, што Украінскі Урад злажыў свае паўнамоцтва і здаўся на міласьць бальшавікоў.

Калі гэта не утка — дык вельмі вялікая памылка. Латышы сьмяюцца: «Ці не зьбіраецца і Ваш урад зрабіць тое ж?»

Шлю шчыры прывет і найлепшые пажаданьня.

З вялікай пашанай

К.Езавітаў.

582.1.25:013r-013

2960. Ліст агенцтва «Argus Suisse et International de la Presse S.A.» (Жэнэва) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 10.09.1921 з прапановай падпісацца на дасыланьне выцінак артыкулаў сусьветнага друку на тэмы «Беларусы» і «Беларусь»

582.1.29:017

2961. Запрашэньне на сьвяткаваньне 500-годзьдзя Жамойцкага біскупства, якое мае адбыцца 11.09.1921 у Жамойцкай базыліцы ў Коўне

582.1.14:067 — д (В.Ластоўскаму)[1]
582.2.58:029 — д (А.Цьвікевічу)

[1] На адвароце запіс алоўкам:
Крэчэўскі 3.50
Душэўскі 1.50
Мамонько 1.50
—""— 40
Грыб 45

2962. Праграма сьвяткаваньня 500-годзьдзя Жамойцкага біскупства 11.09.1921 у Жамойцкай базыліцы ў Коўне

582.2.58:055 — д

2963. Абвестка аб раскладзе працы Консульскага Аддзелу Паўнамоцна-Дыпляматычнага Прадстаўніцтва БНР у Літве

582.2.58:056 — р

Дата невядомая.

2964. Параўнаўчая табліца нацыянальнага складу жыхарства ў паветах Віленскай і Горадзенскай губэрняў

582.2.58:059 — р

Дата невядомая.

2965. Параўнаўчая табліца рэлігійнага складу жыхарства ў паветах Горадзенскай губэрні ў 1914 годзе

582.2.58:060 — р

Дата невядомая.

2966. Зьвесткі аб сямейным становішчы чыноўніка Беларускага Батальёну Васіля Раковіча

582.2.58:061 — р

Дата невядомая.

2967. Зьвесткі аб тапографе Акіме Кавалёве зь Юр'ева, які жадае працаваць у Літве

582.2.58:062 — р

Дата невядомая.

2968. Ліст [Антона Аўсяніка] у невядомую газэту з просьбай надрукаваць зварот выдавецкага таварыства «Вызваленьне»

582.2.58:063 — рк

Дата невядомая.

2669. Ліст міністра жыдоўскіх справаў Літоўскае Рэспублікі Макса Салавейчыка (Коўна) Язэпу Варонку (Коўна) за ??.??.1921

Дорогой коллега,

Присемъ 4 брошюры. Въ одной из них (А.78.1921.VII) Вы найдете 2ой проект Hymans'a и наш контрпроектъ[1]. За этот контрпроект я не отвѣчаю: он был составлен до моего пріѣзда в Женеву и я против него (спец. против §6) письменно подал особое мнѣніе, имѣющееся в дѣлах делегаціи и в М.И.Д.

Адрес Корчинскаго узнали?

Привѣтъ

МС

582.2.36:071 — ра

Дакладная дата невядомая. [1] Другі праект Гіманса ў справе палагоджаньня літоўска-польскіх тэрытарыяльных спрэчак быў пададзены дэлегацыям Польшчы й Літвы ў Жэнэве 12.09.1921. Адказ літоўскай дэлегацыі быў пададзены Радзе Лігі Нацыяў 12.09.1921.

2970. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 12.09.1921 (№144)

Разстрѣлъ бѣлорусскаго уполномоченнаго. — Бѣлоруссія и Лига Націй. — Бѣлоруссія на конгрессѣ угнетенныхъ націй. — Народное образованіе въ Совѣтской Бѣлоруссіи. — Бандитизмъ въ Совѣтской Бѣлоруссіи. — Бѣлоруссы въ Латгаліи.

582.2.12:069

2971. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 13.09.1921 (№145)

Резолюція бѣлорусскихъ учителей. — Колонизація Бѣлоруссіи Совѣтской властью

582.1.22:005

2972. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Проспект Витовта, 30) за 14.09.1921 (№146)

Польское хозяйничаніе въ Восточн. Галиціи. — Совѣтская Бѣлоруссія и заготовки хлѣба. — Борьба съ бѣлорусской школой. — Опроверженіе

582.1.22:004

2973. Хадайніцтва Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі міністру беларускіх справаў у Літве за 20.09.1921 аб забесьпячэньні патрэбнымі коштамі дзесяцёх дэлегатаў ад Віленшчыны й Горадзеншчыны на Беларускую Нацыянальна-Палітычную Нараду ў Празе 25.09.1921

582.1.24:003

2974. Ліст расейскай кнігарні Н.Макарава (Лёндан, 18 Bury Street) рэдакцыі газэты «Вольная Литва» (Коўна) за 23.09.1921 з просьбай дасылаць дзеля продажу 3 асобнікі газэты

582.1.46:036

2975. Ліст Аляксандра Галавінскага (Масква) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.09.1921

23/IX 21

Высокапаважаные грамадзяне!

Учора зьвярнуўся з Менску и хацеу сяніка паехаць да Коўны, каб пасьпець хоць на канец пражскай нарады, але не удалося атрымаць візы для сябе і для жонкі.

Можа гэта і лепш, бо у зьвязку з меморандумам Польшчы наша справа тутака становіцца больш актуальнай і цяперыка ахатней гутараць з намі.

Сягодні у 10 гадзін вечэра буду у Меджынскага, а заутры у 11 ранніцы у Начальніка Ангельскай міссіі.

Враженьня аб Менску засталося добрае. Нацыянальная справа вядзецца добра, а таксама ёсьць падставы каб спадзевацца на худкае аб'яднаньне усей усходней Беларусі. Як мага худчэй друкуйця кніжкі. Атрымаў асобный заказ «Вызваленьню» на друк

1) Географія Беларусі = - 8,000 эк.
2) Сінтаксіс Тарашкевіча - 8,000 эк.
3) Гісторыя Бел. Літаратуры Гарэцкага 4,000-
4) Літаратурная грыстамація (піша Луцкевіч) 5,000-
5) Граматыка Тарашкевіча 10,000-
6) Сцэнічныя творы кожнай піэссы па 5,000 экзем.

Пасылаю копію тэлеграммы Желуновічу (якую Вы яму і перэдайце) — на заказ па 20,000 экз. граматыкі і лімен[тара?]

Прапазыцыю на пражскую нараду атрымаў толькі учора, а таму трудна спадзевацца, каб хто небудзь пасьпеў прыехаць хоць як я аб гэтым гутарыў (па асабістай ініцыатыве) у Менску то як бытцам то і згожываліся на гэта.

Пашліця ат меня тэлеграмму у Прагу «Вітаю сход і працу па дзержаўнаму атраджэньню і аб'еднаньню Бацькаўшчыны» Галавінскі.

Калі мне будзе патрэбна ехаць у Прагу, то прашу зрабіць візу.

Спадзеваюся выехаць у панядзелак 27/IX прыгатуйце для мяне і жонкі памешканьне.

Прашу падгатаваць для мяне з жонкай і сынам прытулак.

582.2.12:048&r-049&r

2976. Ліст Аляксандра Вальковіча (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Прага?) за 25.09.1921

Дарагі Вацлаў Юстынавіч,

За час Вашай адсутнасьці нічого не змянілася.

Літвіны не глядзючы на тое, што ім добра ведома як тяжко Вам будзе весьці на з'ездзе барадьбу з нашымі ворагамі — польскай арыентацыяй, аб чым я ім, што дзень пры сустрэчах у гутарках падкрэсліваю, сваей пазіцыі, якую яны занялі у апошніе часы да нас — не зьмяняюць.

Д-р Грыніус у гутарцы са мною у дзень 24 Верэсня калі я яго ад імяні Ураду паздравіў з прыняццем Літвы у Лігу Народаў, сказаў мне што тые інфармацыі якіе мы атрымліваем з бацькаўшчыны і даем ім не адпавядаюць дзействіцельнасьці.

Рэзка падкрэсліў, што паўстанцеў, а якіх ім мы гаварылі, што іх ёсьць да 6000 — нема, а што есьць неарганізованные невялічкіе банды з 75% крэмінальнага элемэнту. Я даказываў яму што яго погляд ёсьць памылковы; што паўстанцы нашы зарганізаваны і нават прынялі некалькі баеў з палякамі і, вельмі удачна. Ен на гэта мне адказаў, што пасыланные іхнымі арганізацыямі людзі данасілі ім, што у нас там нічога нема.

Аднак не гледзючы на гэта ен у сваей прамове у Сойму адзначыў, што у Віленскай абласьці большасьць беларусаў і, што калі літвіны беларусам предаставяць шырокую аўтаномію, то ен запэўнен, что беларусы выскажуцца за Літву.

У той жа дзень у гутарце з др. Пурыцкісым я вынес досіць прыемнае уражэньне.

Шчыра падзякаваўшы мяне за паздраўленьне ен сказаў мне, што літвіны паступаючы все больш і больш умацовываюць свае становішчэ і што прыняцці іх у Лігу Народаў падвіне на перад развязаньне Віленскага пытаньня. І што гэта умацуець і нашэ становішчэ.

Закончыў ен сваю прамову тым, што Літва і Беларусь маючы за сабой вялікае прошлае і цяпер пойдуць разам рука аб руку; Літва дапамагала і будзе дапамагаць свайму найбліжэйшаму саседу — Беларусі, чым толькі зможэ.

Я зкарыстаўшысь гэтымі словамі яшчэ раз пад[к]рэсліў вялікае значэньне нашай Канфэрэнцыі у Празе і прасіў яго да[па]мочь нам матэрыальна каб мы змаглі там моцна паставіць нашу агульную справу. Ен мне адказаў што Кабінэт прынцыпова згадзіўся зрабіць нам не вялікую краткасрочную пазыку, але што дэтальна аб гэтым у звязку з гарантыей таварамі прасіў Міністра фінансаў далажыць яму на бліжайшам паседжэньні.

Быў я яшчэ раз у Міністра Фінансоў і прасіў яго каб ен худчэй гэту справу правеў у Кабінэце і падтрымаў маю прозьбу, аб чым я яму падаў адпаведную заяву.

Думаю, што на гэтых днях справа грашовая вырэшыцца.

У Прэзыдэнта я асабіста ня быў, а паслаў яму на беларускай мове тэлеграмму. Тэкст тэлеграммы па расейску прыведзен у №227 газэты «Эхо».

З бацькаўшчыны ні якіх інфармацый не атрымаў на пісьме.

Прыбылі у Коўню гр.гр. Карабач і Шыла якіх я у ваўторак адпраўлю ў Прагу.

Для мяне зусім не зразумела тактыка гр. Краскоўскаго які затрымаў дэлегатоў да апошняга дня ня выдаўшы ім у належны час грошэй. Паміж іншым ён заявіў што Урад асыгнавал 10000 але іх ня выслаў.

Так ставіць пытаньня ідэйны беларус не можэ. Яму быў выдан аванс асабіста у ліку 12.000 і 3000 у лік 10.000. Неужош ен часова не мог даць з свайго авансу тысяч 5-6.

Пасля атрыманьня ім авансу прайшоў толькі адзін месяц. Значыцца калі Урад, або Міністэрства Фінансаў пачаму кольвечэк не змагло у належны час пераправіць яшчэ 7 тысячаў, то і ня трэба пасылаць дэлегатаў каб дапамагчы ратаваць палажэньне.

Ня ужо свае матэрыальнае становішчэ даражэй за ідэалы.

Я у гэтам нічога не разумею... Даруйце мне.

Калі будзе што кольвечэк вельмі цекавае, то зараз жэ напішу.

А цяперыка ад шчырага сэрдца жадаю пабеды над беларускай цемрай, да-бы больш умацаваць нашы ідэалы.

Нехай жыве Незалежная і Непадзельная Вольная Беларусь, слава!

Моцна цісну Вашу руку. Жадаю яшчэ раз поўнага успеху.

Ваш АВальковіч.

Грошы пастараюсь выслаць як найхутчэй.

582.1.25:017&r-020&r

582.1.25:021 — канвэрт

2977. Sonntagsblatt der Königsberger Hartungschen Zeitung. Nr.449. 25.09.1921

[З матэрыялам:] Juga und Hramawik. Eine weißruthenische Legende. Erzählt vom weißruthenischen Ministerpräsidenten W.Lastowski = Minsk. (Uebersetzt von Edm. Susemihl = Kowno)

582.1.66:002

2978. Пастанова грамады афіцэраў Беларускага Асобнага Батальёну ўзамен сьвяточнага абеду ў гонар гадавіны батальёну 27.09.1921 ахвяраваць Літоўскаму Чырвонаму крыжу 3500 аўксінаў на галадаючых у Расеі беларусаў і літоўцаў

582.1.15:269

2979. Рэзалюцыі, прынятыя на Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарадзе ў Празе 28.09 1921

I. Рэзалюцыя аб Рыжскім трактаце

Стоючы на грунце граматы Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 25-га сакавіка 1918 г., апавесьціушай незалежнасьць Беларусі у межах лічэбнай перавагі беларускага народу, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе, зложаная з прэдстаунікоу беларускіх палітычных партый і нацыянальных арганізацый с пад усіх цяперашніх аккупацый Беларусі, сабраушыхся у Прагу, аднагалосна заяуляе:

1. Беларускі народ веу, вядзе і будзе вясьці барацьбу за незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі;

2. што усе ранейшыя пратэсты беларускіх палітычных і нацыянальных арганізацый, у свой час заяуленыя супроць Рыжскага Трактату, дзелячага Беларусь паміж Расіяй і Польшчай, Нарадай аднагалосна падцьверджаюцца;

3. Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе заклікае усе актыуныя беларускія сілы да самай рашучай рэвалюцыйнай барацьбы усякімі маючыміся у іх распараджэньні спосабамі супроць падзелу Беларусі і заклікае лічыць ворагам беларускага народу кожнага таго, каторы згадзіуся бы прызнаць Рыжскі мірны трактат.

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.

582.1.21:007 — мк бел

582.1.06:086 — мк фра

II. Палажэньне беларускага народу пад акупацыямі

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе, разважыушы палажэньне беларускага народу пад расійскай і польскай аккупацыямі, сьцьверджае, што:

1) пад рассійскай аккупацыяй у гэты момант знаходзіцца больш як 206.000 кв.кл. беларускай тэррыторыі, з ліку якой расійскі савецкі урад 153.000 кв.кл. далучыу безпасрэдна да Рассіі, а на 53.000 кв.кл. утварыу фікцыю савецкай Беларусі. На тэррыторыі савецкай Беларусі расійскі савецкі урад устанавіу уладу, зложаную з чужых беларускаму народу элемэнтау, каторымі кіруе цэнтральны савецкі урад з Масквы. Шырока рэклямаваная толерантнасьць савецкай улады да беларускага адраджэнчэскага руху у савецкай Беларусі дагэтуль ня выйшла з чыста дэкляратыуных рамак; для нацыянальна-культурнага адраджэнчэскага руху у савецкай Беларусі дагэтуль нічога не зроблена.

На беларускай тэррыторыі, далучанай безпасярэдна да Расіі, беларускае насяленьне падлегае самай натужаннай руссіфікацыі і пазбаулена

усіх як палітычных, так і нацыянальна-культурных правоу: урадовай мовай зьяуляецца мова расійская, беларускія газэты забаронены, беларуская адраджэнчэская праца тлуміцца турмой і растрэламі;

2) пад польскай аккупацыяй знаходзіцца больш як 100.000 кв.кл. беларускай зямлі; на захопленых польскім імпэрыялізмам гэтых тэррыторыях бушуе цяпер нічым неагранічаны польскі шовінізм і нячуваны нацыянальны уціск і зьдзек над беларускім народам. З мэтай задушыць беларускі вызваленчы рух палякі нішчаць беларускую культуру і інтэллігэнцыю, кіруючыся да поунага зьнішчэньня на гэтых землях беларускага племені. Землі беларускіх уцекачоу польскі урад раздае салдатам ураджэнцам Польшчы. Сьвядомае беларускае селянства польскі урад гноіць па турмам і канцэнтрацыйным табарам, ен зачыняе культурныя, нацыянальныя і эканамічныя арганізацыі, забараняе друк, беларускую школу і мову.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада, у імя справядлівасьці і захаваньня беларускай нацыі і культуры, вымагае ад Лігі Нацый і усіх народау сьвету адкінуць агідны польскі шовінізм і імпэрыялізм у яго этнаграфічныя межы за Буг і Нарэу.

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.
582.1.21:008-009 — мк бел
582.1.06:088-089 — мк фра

III. Рэзалюцыя аб чыннасьці Балаховіча

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе, абмеркаваушы выступленьне Балаховіча пад нацыянальным беларускім штандарам і пастанауляе, што

1. Балаховіч не мае ніякага падтрыманьня з боку беларускіх нацыянальных і палітычных арганізацый;

2. звязаушы свае імя з беларускім асвабадзіцельным рухам, ен дагэтуль не ачысьціу сябе ад пазоручых беларускае імя абвінавачаньняу у жыдоускіх пагромах і грабежствах;

3. ен самавольна абвесьціу сябе галоунакамандуючым беларускіх вайсковых сіл і

4. дазволіу сябе выдаваць акты дзержаунага значэньня.

Дзеля гэтага Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе лічыць Балаховіча да таго часу, пакуль ен не апраудае сябе перад беларускім грамадзянствам, узурпатаром і авантурнікам.

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.
582.1.21:011 — мк бел

IV. Рэзалюцыя аб чыннасьці Савінкова

Прыймаючы пад увагу, што Савінкоу выступае за граніцай ад імені Беларусі і беларускім нацыянальным штандарам прыкрывае авантуры польскай і расійскай рэакцыі, арганізуючай на тэррыторыі усходняй Беларусі жыдоускія пагромы і правакацыйныя паустаньня, а у заходняй Беларусі

кіруючай абрусіцельнай працай, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе зазначае, што Савінкоу не мае ніякай зьвязі з беларускімі палітычнымі і нацыянальнымі арганізацыямі і з'яуляецца правакатарам беларускай дзержаунасьці і ворагам беларускага народу.

Прага-Чэская, 28-га верасьвя 1921 г.
582.1.21:012 — мк бел

V. Рэзалюцыя процiу жыдоускiх пагромау

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе, азнаеміушыся з дакладам аб меушых у апошнія часы мейсцо выпадках жыдоускіх пагромау, канстатыруе:

1. што на беларускай зямлі за весь час многавековай супольнай жызьні беларусоу і жыдоу ня было ні воднага выпадка, каб мірнае жыцьце 12 мільеннага беларускага народу з трох-мільенным народам жыдоускім ацемрылася якім колечы крывавым эксцэссам;

2. што быушыя у апошнія месяцы з паяуленьнем на Беларусі аккупацыйных польскіх і чырвонаармейскіх палкоу некалька выпадкау звярынскіх распрау з жыдамі забавязаны сваім паходжэньнем бандам Савінкова, Балаховіча і Будзеннага.

Дзеля таго, што гэтыя агідныя факты робяцца на беларускай зямлі і могуць мець уплыу на дзе-якія несьвядомыя массы беларускага селянства, — уцягнуць і справацыраваць іх на гэты крок, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе рашуча пратэстуе процiу агітацыі цемных сіл на беларускай зямлі і зьвертаецца да беларускага народу з перасьцярогай і прозьбай ня прыймаць часткі у гэтай працы бандытау, але усімі сіламі бароцца з ей.

З другога боку, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада падкрэсьлівае, што усе адозвы Ураду Б.Н.Р. да польскага і савецкага урадау з пратэстамі і вымаганьнем увясьці дысцыпліну у аккупацыйныя вайска і палажыць канец агіднай пагромнай агітацыі ня толькі ня далі дагэтуль дзе-якіх вынікау, але нават засталіся без адказу.

Дзеля гэтага усю адпаведнасьць за эксцэссы, магучыя быць у будучыне у межах аккупаванай Беларусі, Бел. Нац.-Паліт. Нарада цалкам вазлагае на сучасных аккупантау.

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.
582.1.21:010 — мк бел

VI. Рэзалюцыя аб слуцкім паўстаньні

Селянская Беларусь, праснуушаяся ад летаргічнага сну векавой няволі, распачала змаганьне за свае вольнае і роунае жыцьце сярод іншых вольных народау.

Чацьверты ужо год змагаецца Беларусь з насільствам рожных аккупантау. У гэтым змаганьні беларускі народ добра сябе усьвядоміу, што справа вызваленьня і адраджэньня яго бацькаушчыны есьць справа яго уласных рук. Беларускі народ пераканауся, што ні ад Масквы ні ад Варшавы яму няма чаго чакаць для палепшаньня сваей долі.

Цэлым радам паустаньняу, у працягу гэтых чатырох гадоу, беларускі народ ясна паказау, куды ен імкнецца і на каго пакладае ен усе свае надзеі.

Найяскраўшым момантам у гэтым гэраічным змаганьні, апрача паустаньняу у Вітэбшчыне, Віленшчыне, Ашмяншчыне і г.д., з'яуляецца паустаньне у Случчыне, калі сам сермяжны народ, стыхійна паустаушы з аружжам у руках за непадзельнасьць і незалежнасьць сваей бацькаушчыны, напісау на сваім штандары: ні польскіх паноу, ні маскоускіх каммуністау.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе канстатуе, што гэтае паустаньне было задушана пераважаючымі сіламі абодвых бакоу.

Слава паушым змаганьнікам.

Б.Н.-П.Н. прасьцерагае беларускі народ, каб не было непатрэбнага праліцьця крыві, устрымацца ад неарганізаванных выступленьняу, але моцна аб'еднаць свае сілы к таму моманту, калі праб'е час агульна-народнага рэвалюцыйнага змаганьня за права кожнага народу быць гаспадаром у сваім краі.

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.
582.1.21:006 — мк бел

VII. Рэзалюцыя аб дзержауным будауніцтве Беларусі

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе, абмеркаваушы пытаньне аб дзержауным будауніцтве Беларусі, у поунай сьвядомасьці надзвычайнай вагі гэтага пытаньня, зазначае:

а) Беларусь зьяуляецца краем працоунага беларускага селянства, рабочых і працоунай інтэллігэнцыі, дзеля чаго Беларусь павінна быць дзержавай працоунаго народу;

б) Беларусь павінна быць дзержавай непадзельнай і не ад каго незалежнай. Нарада зазначае, што ніякія гэтак званыя арэентацыі не могуць быць падставай дзержаунага будауніцтва Беларусі. Адзінай асновай дзержавы, адзінай сілай, якая збудуе Беларусь і забаспечыць ей нармальнае развіцьце зьяуляецца сам працоуны беларускі народ;

в) пасьля зьдзейсненьня беларускай дзержаунасьці, пасьля таго як на беларускай зямле запануе уласная ні ад каго незалежная улада, Беларусь працягне руку згоды дзеля вольнага саюзу усім народам, з якімі яна жыве побач і якіх яна лічыць за роуных братоу сваіх. Першай мэтай гэткага саюзу павінна быць узаемная абарона народных вольнасьцяу, якія здабудуць народы сваей барацьбой.

Прымаючы пад увагу сучасны стан Беларусі, Белар. Нац.-Пал. Нар. зазначае:

а) што адыным законадаучым органам Беларусі з'яуляецца Рада Б.Н.Р. маючая прэемсцьвеннасьць улады ад Усебеларускага Кангрэссу 1917 г.;

б) што адзінай законнай уладай Беларусі з'яуляецца урад Б.Н.Р., маючы мандат ад Рады Б.Н.Р.

Прымаючы пад увагу, што праца ураду Б.Н.Р. з'яуляецца адпаведаючай тым мэтам, якія прыняты Нарадай, і што у першаю чаргу яна кіруецца да абароны непадзельнасьці і незалежнасьці Беларусі, Бел. Нац.-Паліт.

Нарада пастанауляе аб'еднаць каля ураду Б.Н.Р. сілы усіх беларускіх партый, арганізацый і групп дзеля дзержаунага будаўніцтва Беларусі.

582.1.21:001-002 — мк бел

VIII. Рэзалюцыя па Віленскаму пытаньню

Прымаючы пад увагу, што пытаньне дзержаунай належнасьці Віленскай тэрыторыі, на якой беларусы складаюць пераважаючую большасьць, вырашана Лігай Нацый без учасцьця прэдстаунікоу беларускага народу і нават без фармальнага азнаемленьня з яго волей шляхам свабоднага народнага рэфэрэндуму, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе, стоючы на грунце абароны правоу народа на яго тэррыторыі, зазначае, што пастанову Лігі Нацый беларускі народ будзе лічыць часовай да момату скліканьня Найвысшага Законадаучага Органа Беларусі, якому адына прыналежыць права устанавіць сталыя межы Беларусі.

Пастановы Лігі Нацый, трактуючыя беларусоу у Віленшчыне, як нацыянальную меньшасьць, з'яуляюцца процівагаворучымі фактамі жыцьця, дзеля чаго Нарада рашуча процію іх протэстуе.

Прызнаваючы Літву за векавога гістарычнага сябра народа беларускага, з якім яе звязывае агульнасьць як палітычных, гэтак і эканамічных інтэрэсаў, Нарада выражае сваю пэунасьць, што Беларусь і Літва знойдуць цяпер, як і раней адпаведныя шляхі дабрасуседскага жыцьця. Слауная сталіца старога Беларуска-Літоускага Князства, Вільня павінна зьявіцца не яблакам спрэчкі паміж беларускай і літоускай дэмакратыямі, але фактарам іх аб'еднаньня.

З другога боку Беларуская Нацыянальна-Палітычная Канфэрэцыя заяуляе, што яна лічыцца з той небаспекай з боку польскага імпэрыялізму, якая схована у прынятай Лігай Нацый канстытуцыйнай канструкцыі новай Літвы і лічыць патрэбным, у згодзе з народам літоускім, прылажыць усе усільля да таго, каб плян захопленьня беларуска-літоускай зямлі і закабаленьня Беларускага і Літоускага народау Польшчай ня быу выкананы.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада з глыбокім жалем зазначае, што пастанова Лігі Нацый, аддаюшчая беларускае Гродно і усю Горадзеншчыну пад уладу Польшчы, з'яуляецца чарговым падзелам Беларусі, зробленым на гэты раз ужо не ваюючымі старанамі, але міжнароднай установай, павіннай быць Арэопагом справядлівасьці.

Гродзеншчына павінна быць зьвернута Беларусі. Гродзеншчына павінна быць аб'еднана з усей беларускай зямлей. Ніхай ведае беларускае насяленьне Гродзеншчыны, што сьвяты час гэтага аб'еднаньня хутка праб'е і ніхай ня траціць веры у гэтае у будучай барацьбе.

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.

582.1.21:003-004 — мк бел

582.1.06:091&r-090&r — мк фра

IX. Рэзалюцыя аб эканамічным палажэньні Беларусі

У момант, калі беларускі народ часова ляжыць распластаны і абезволены сваімі суседзямі, калі ен ня можа сам распаражацца сваім дабром,

калі мільены беларусоу яшчэ ня вернуліся з выгнаньня, у якім яны апыніліся за час вялікай эурапэйскай вайны, — аккупанты як з усходу, так і з заходу, як маскоускія камуністы, так і палякі хіжацка-эксплеатуюць, грабюць і распрадаюць дабро беларускага народа, стараюцца для падняцьця эканамічнага стану сваіх мэтраполій раздаць нявыгадныя для беларускага народу канцэссыі, стараюцца у рэшці насільна калянізаваць часова апусьцеушыя і нават неапусьцеушыя землі сваімі жаунерамі, ставючы Беларусь перад праблемай эміграцыі.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада, уважаючы цяперашніх гаспадароу на Беларусі, як часовых аккупантау, ня маючых права на дабро беларускае, рашуча пратэстуе проціу хіжацкай і грабежнай гаспадаркі аккупантау і заяуляе, што:

1) распрадажа лясоу, зямель і другога багацьця беларускага народу суседзямі-аккупантамі есьць грабежства, з каторым беларускі народ будзе вясьці барацьбу;

2) раздача аккупантамі канцэссый на Беларусі чужынцам есьць насільле, з якім беларускі народ ніколі ня згодзіцца, але наадварот, будзе вясьці барацьбу. Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада папярэджывае канцэссыянэрау, што права на канцэссыі, выданныя аккупантамі, Беларусь ніколі не прызнае;

3) насільная каленізацыя польскімі жаунерамі Віленшчыны і Гродзеншчыны робіцца без згоды беларускага народу, але, наадварот, супроць яго волі і протэстау. Дзеля гэтага Беларусь будзе вясьці самую рашучую барацьбу з каленізацыяй і ніколі ня прызнае каленістау за сваіх грамадзян.

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.
582.1.21:005 — мк бел
582.1.06:087 — мк фра

Х. Рэзалюцыя культурна-прасьветнай сэкцыі

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада у Празе, азнаеміушыся са становішчам беларускай культурна-прасьветнай працы на Беларусі і за межамі яе, сьцверджае:

1. У межах польскай аккупацыі на Беларусі, зробленых з мауклівай згоды вялікіх дзержау, пануе ганебнейшы уціск над беларускім народам і яго культурай; зачыняюцца сотні беларускіх школак, тэррорызуецца беларускае вучыцельства, забараняецца беларуская мова, арэштовываецца і высылаецца за межы сваей бацькаушчыны беларуская інтэллігэнцыя, вывозюцца беларускія дзеткі у глыб Польшчы у польскія прытулкі, душыцца беларуская прэсса, спыняецца беларуская выдавецкая праца і ва усім праводзіцца прымусовая поленізацыя беларускага народу.

2. У межах аккупацыі бальшавіцкай і г.зв. Савецкай Беларусі становішча мала чым рожніцца ад уціску польскага: беларускую школу адчыняюць з вялікай неахвотай і уступаючы толькі моцным вымаганьням беларускага селянства, беларускае выдавецтва усімі спосабамі тармазіцца, а у беларускую вышэйшую школу стараюцца уліць моцную струю руссіфікацыі.

Але беларускі народ, яго інтэлігэнцыя і вучыцельства моцна змагаюцца з ганебным уціскам аккупантау і, не шкадуючы свайго жыцьця, баронюць сваю культуру, прасьвету і мову.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада, адзначаючы прад усімі народамі сьвету зьдзек над беларускім народам, просіць і вымагае ад усіх іх і ад рэпрэзэнтацыйнага органу Лігі Нацый безадкладнага умешацельства у безкантрольнае гаспадарнічаньне на беларусай тэррыторыі чырвоных і белых імпэрыялістау-ассымілянтау і спыненьня іх шкоднай працы.

Адмечаючы ганебную, антыбальшавіцкую[1] працу сучасных аккупантау Беларусі, Нарада ня можа не вітаць дэмакратычна прауныя крокі Латвійскай і Літоускай Дзержавы, якія абвесьцілі правы на нацыянальна-культурную аутаномію беларускай нацыянальнай меншасьці у дзержавах і далі ім магчымасьць правесьці гэтае права у жыцьце.

Зварочываючыся да беларускага народу і яго інтэлігэнцыі, Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада вітае іх безупыннае і цяжкае змаганьне за сваю культуру і мову і заклікае нівадзін момант, ні у водным мейсцы не адступаць перад зьдзекамі і уціскам часова пануючых наездчыкау і усімі сіламі, усімі спосабамі бараніць сваю культуру і мову, якія з'яуляюцца грунтам нашай дзержаунасьці і непадзельнасьці

Прага-Чэская, 28-га верасьня 1921 г.

582.1.21:013-014 — мк бел

[1] Памылкова замест антыбеларускую.

XI. Рэзалюцыя сэкцыі дапамогі ахвярам вайны і галадаючым

Сэкцыя дапамогі ахвярам вайны і галадаючым, маючая у сваім складзе прэдстаунікоу: 1) ад Беларускага Т-ва Чырвонага Крыжа, 2) ад Беларускага Т-ва дапамогі ахвярам вайны і 3) ад Беларускага Грамадзкага Камітэту дапамогі галадаючым на Беларусі, просіць Нацыянальна-Палітычную Нараду давясьці да ведама усіх культурных народау ніжэйпаданую рэзалюцыю:

1) З 1914 да 1917 года тэррыторыя Беларусі была арэнай жорсткіх крывавых бітв паміж расейскай і нямецкай арміямі. На працягу гэтых трох страшэнных гадоу імпэрыялістычнай барацьбы, дабрабыт нашага працоунага народу быу зруйнаваны у шчэнт.

Па Берасьцейскаму міру, зложаннаму паміж Расеяй і Нямеччынай супроць волі нашага народу — Беларусь была аддана пад цяжкую аккупацыю нямецкай арміі. Нямецкая аккупацыя была надзвычайна цяжкай эканамічнай кабалой для нашага краю, гэта быу чарговы удар па дабрабыту нашага народу.

Пасьля адхода нямецкіх войскау, зараз жа на сьмену ім прыйшла яшчэ горшая і яшчэ цяжэйшая аккупацыя імпэрыялістычнай Польшчы. Мала гэтага, у той самы час, калі іншыя народы, як чэшскі, бельгійскі, літоускі і іншыя зруйнаваныя імпэрыялістычнай вайной, пачалі жыць спакойным жыцьцем і адбудовываць свой дабрабыт — новае цяжкае гора абхапіла Беларусь: яна ізноу стала арэнай новай імпэрыялістычнай бойні

Савецкай Расеі з Польшчай, ізноў многапакутны беларускі край задыхаўся у дыму пажараў і заліваўся крывей.

Па Рыжскаму трактату Беларусь жорстка падзелена паміж Савецкай Расеяй і Польшчай, якія сьвядома і па узаемнаму падтрыманьню вядуць беларускі народ да поунага матэрыяльнага і маральнага занепаду.

У часе міравой вайны каля 2-х мільенау беларускіх жыхароу было гвалтам выселена у глыбь Расеі, у Сыбір, Туркестан і Кауказ. Гэтыя бежанцы-беларусы ужо 7 гадоу жывуць на чужыне, церпяць голад і холад і не маюць ніякай магчымасьці вярнуцца на Бацькаушчыну. На працягу гэтых сямі гадоу і Расейскі Урад і Польскі ня толькі не дапамагаюць нашым уцекачом вярнуцца у родны край, але, наадварот, робяць уселякія перашкоды іх звароту. І цяпер, калі ад жаху перад галоднай сьмерцю у Паволжы, дзесяткі тысячау уцекачоу-беларусау кінуліся на Бацькаушчыну — Польскі Урад ня пушчае іх праз сваю граніцу і аддае іх на пэуную згубу ад голаду і эпідэмій. А тым беларускім уцекачом, якія, не глядзючы на польскія заставы і рыскуючы сваім жыцьцем прабіраюцца на родную зямлю, тым, якія, вярнуушыся дамоу, знайходзяць у сваей хаце і на сваей уласнай зямлі новага уласьніка свайго дабра — польскага жаунера, тым беларусам-уцекачам, якія з паводу гэтага, прымушаны жыць да гэтага часу у старых землянках і акопах і карміць сябе і сваіх дзяцей жабрацтвам — гэтым беларусам Польскі Урад не дае абсалютна ніякой дапамогі у той самы час дапамагаючы уцекачом украінцам і расейцам.

Дзесяткі тысяч беларускіх сыноу, насільна узятых у расейскае войска, ходам падзей, апыніліся у канцэ[н]трацыйных таборах Турэччыны, Баугарыі і Сэрбіі.

Сотні лепшых сыноу нашай Бацькаушчыны сідзяць у бальшавіцкіх і польскіх турмах, церпячы голад і здзек над іх нацыянальным пачуцьцем.

Сучаснае становішча беларускага народу, нявымоуна цяжкае, не толькі таму, што ен перанес дзьве страшэнных вайны, не толькі таму, што ен цярпеу і да сяго дня церпіць ад чужацкіх аккупацый, але яшчэ і таму, што сучасная культурная Эуропа нічым не дапамагла яму падняцца з руін і няволі і таму, што увесь культурны мір заставаўся і застаецца спакойным, калі беларускі народ задыхаецца у клешчах няволі і голаду.

Становішча беларусоу-уцекачоу у Савецкай Расеі, у бальшавіцкіх турмах і прымусовых табарах, палажэньне беларускіх уцекачоу, вярнуушыхся у родны край, знаходзячыйся пад польскай аккупацыяй і тых беларусоу, якія гніюць і паміраюць у польскіх турмах і канцэнтрацыйных табарах Польшчы, нячувана цяжкае і безвыхаднае таму, што ні Савецкі Урад, ні Польскі не дазваляюць нашым беларускім дабрачынным арганізацыям абсьледаваць іх цяжкае жыцьцё і прыйсьці ім на помач.

Беларуская Нацыянальна-Палітычная Канфэрэнцыя у Празе зьвертаецца да усіх культурных нацый, да усіх грамадзкіх і урадовых дабрачынных арганізацый і устаноу і асабліва да Жэнэускага Чырвонага Крыжа з прозьбай дапамагчы беларускаму народу праз яго дабрачынныя арганізацыі.

582.1.21:015-017 — мк бел

2980. Ліст С.Макарава(?) (Вільня?) Аляксандру Восіпавічу(?) (Коўна? Прага?) за ?.09.1921(?)

582.1.25:026г-026

Просьба паведаміць пра магчымасьць атрыманьня стыпэндыяў у Празе: «Нас траіх: я, Катовіч М. і вучыцель-праўнік Латышонак. [...] P.S. Здаецца хоча ехаць: Янка Станкевіч».

Дакладная дата невядомая.

2981. Пратакол камісіі прадстаўнікоў розных напрамкаў беларускай палітычнай думкі за 3.10.1921 (Прага) у справе абвінавачаньня Ладновым Ураду БНР на чале з В.Ластоўскім у супрацоўніцтве зь нямецкімі й расейскімі манархістамі

ПРАТАКОЛ

каміссіі прэдстаунікоу рожных напрамкау беларускай палітычнай думкі у асобах п.п. Б.Тарашкевіча, Л.Дубейкоускага, А.Карабача, С.Барана, у справе абвінавачэньня Ладновым Ураду БНР на чале з гр. Ластоускім у супрацоуніцтве з нямецкімі і рускімі монархістамі.

Прага Чэская, 3 кастрычніка 1921 году.

Разгледзіушы дакумэнтальныя данныя у вышэйпамяненай справе (ліст палк. Купчынскага графу Палену, апублікаваныя у «Волѣ Россіи» аб дакумэнты аб монархічнай змове з ген. Біскупскім на чале, ліст грамадз. Залевскага да Гравенгофа і інш.) і выслухаушы інформацыі у гэтай справе грам. Ластоускага, Мамонько, Цьвікевіча і Зайца, а так сама разгледзіушы дакумэнты, у якіх грам. Э.Ладноу абвінавачваецца (Ознобішыным, Кондратовічам і Кахоўскім) у зносінах з французкай контр-разведкай, — ВЫЯСЬНІЛІ:

1) Урад БНР на чале з гр. Ластоускім ні у цэласьці, ні у асобе каго колечы з сяброу сваіх да манархічнай змовы з ген. Біскупскім на чале ніякага дачыненьня ня меу (гл. «Воля Россіи» за №71 за 1920 г.) аб чым быу паведамлены увесь сьвет праз Бел. Прэс-Бюро у Бэрліне (прэс-бюро за №... ад ..... 1920 г).

2) Асабісты і прыватны ліст гр. Мамонько, падпісанный псэудонімам «Залевскій»[1] па свайму зместу і тону зьяуляецца вартым суровага зганеньня, але факты там паказаныя зьяуляюцца проста усхваляючым сябе вымыслам і нічога не маюць супольнага з тактыкай Ураду БНР.

3) Дзеля об'ектыунага разследаваньня справы Ладнова, запрапанаваць яму грамадзкі суд.

Пратакол зложан у двух орыгінальных экзэмплярах

Б.Тарашкевіч ЛДубейкоўскі С.Баран А.Карабач

582.2.37:043 — ма

[1] Дакумэнт №2057.

2982. Выпіскі з газэтаў «Воля Россіи» (Прага) за 15.12.1920 і «Послѣднія Извѣстія» (Парыж) за 22.12.1920 у справе недачыненьня Ураду БНР да «эўрапейскае манархічнае змовы»

582.2.37:044 — мк

2983. Пастанова сходу прадстаўнікоў розных напрамкаў беларускай палітычнай думкі за 3.10.1921 (Прага)

ПАСТАНОВА

сходу прэдстаунікоу рожных напрамкау беларускай палітычнай думкі у Празе Чэскай, 3 кастрычніка 1921 года.

Былі прысутнымі: сябры Рады БНР.: гр.гр. Ластоускі, Цвікевіч, Грыб, Заяц, Крэчэускі, Мамонько, Захарко, Шыло і Душэускі. Сябр Рады Рэспублікі і дэлегат Бел. Соц. Дэмокр. Партыі Тарашкевіч, Старшыня Бел. Нац. Камітэту у Варшаве Л.Дубейкоускі; прэдстаунік Віленскага Нац. Камітэту Карабач; прэдстаунік Горадзенскага Нац. Камітэту Баран, сябра Рады БНР і прэдстаунік у Латвіі Езавітау.

Разгледзіушы і абсудзіушы становішчэ, у якім апынуліся дзяржаунае будауніцтва Беларусі і беларуская нацыональная палітычная справа наагул, калі пасьля расколу Рады БНР 13 сьнежня 1919 г. зьявіліся рожныя варагуючыя паміж сабою «Урады», функцыануючыя ня толькі ад імяні Рады БНР, але і авантурыстычна самазванныя, німаючыя часам нічога супольнага з адраджэнскім беларускім рухам, - мы, ніжэйпадпісаныя, стоючы перад пагрозай разбіцьця і развалу усей беларускай справы у партыйных спорках і асабістай калатні, - прыйшлі да перакананьня у патрэбе абеднаць усе праудзіва беларускія сілы на грунце ніжэйпаданых пастаноу:

1) адзіна законнай правадаучай уладай на Беларусі зьяуляецца Рада БНР., як вышэйшы орган Беларускага Народу, бяручый свой пачатак ад усебеларускага конгрэссу 1917 году.

2) праунавыканаучым органам зьяуляецца толькі Урад, выбраный Радай БНР.

3) Усе другія «Урады» і арганізацыі, прэтэндуючыя на дзяржауна-урадовы характар, якія не маюць і ня могуць мець мандатау ад Рады БНР, уважаюцца авантурамі, шкоднымі для беларускага народу і дзеля гэтага з імі павінна вясьціся рашучая барацьба.

Пастанова уложана у двух орыгінальных экземплярах, з якіх адзін захоуваецца у справах Ураду БНР, а другі у справах Віленскага Нацыональнага Камітэту.

[Прыпісана Б.Тарашкевічам:]

Прызнаю, што ў даны момэнт ёсьць толькі адзін Урад БНР, не згаджаюся з тактыкай і палітыкай яго.

Б.Тарашкевіч

3.X.21. Прага

ЛЗаяц АдрЦьвікевіч К.Езавітаў Яз.Мамонько К.Душэўскі М.Шыла ТамашГрыб Ластоўскі ЛДубейкоўскі С.Баран А.Карабач

582.2.37:045 — ма

2984. Ліст Вацлава Ластоўскага (Бэрлін) Марыі Ластоўскай (Парогі) за 11.10.1921

Daražeńkije.

Uwieś čas niepakojusia jak tam ustroilisia dzieci u škole. Ja dumaju dobra bylo-by, a navat wielmi prasiŭ-by, kab pry dzieciach zaŭsiody u Kuršanach byŭ

chto sa staršych. Samo saboj najlepiej było-b kab ty Mariuś była, ale zważajučy na haspadarku, možeby papieramienna čeredawalisia s Peledaj — tydzień-dwa ty, tydzień-dwa Peleda. Ja wielmi prašu padumać ab hetym! Abiecaŭ ja kupić koŭdry dla dziaciej i abiecanki swajej trymajusia, ale nia mieŭ ja nijakaj mahčymaści dahetul jaje wypoŭnić: uwieś čas byu u razjezdach; ciapier-ža skora užo budu u Koŭnie. Može budzie chto u Koŭnie, to praz taho kahoś ja pieresłaŭby. Kališ nia budzie zručnaści, to Peledka ty padjedź u Koŭnu.

Zatym serdečna całuju usich Was

waš WL

[На канвэрце:]

Triški, Telšu apskryču dwaras Parogiaj, Poni Lastauskiene

582.1.25:006

582.1.25:005 — канвэрт

2985. Паштоўка Ядвігі Барткевіч (Прага) Станіславе Ластоўскай (Коўна) за 15.10.1921

582.1.14:066

Ядвіга (Ядка) Барткевіч — сястра Марыі Крэчэўскай.

2986. Паштоўка Марыі Крэчэўскай (Прага) Станіславе Ластоўскай (Коўна) за 15.10.1921

582.1.14:065

2987. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.10.1921

Паважаны Пане Вацл. Юстын.!

Здаючы кнігі у Дзярж. бібліотэку я зауважыў, што мне бракуе двох кніг: «Венгерова, Критико-біогр. словарь» і «Kutrzeba — Przeciwieństwa Rosyjsk. i Polskiej Kultury». Гэтыя дзьве кніжкі я павінен як найхутчэй здаць — але яны у каго сь у Коўне. Ня ведаю, ці у Вас, ці у Грыба, ці можа яшчэ у каго.

Будзце ласкавы — спытайцеся у ўсіх, пашукайце так сама у сябе — і на міласьць хутчэй вышліце заказным, бо гэта дарагая рэч.

Ваш АЦвікевіч

582.1.25:025

2988. Паштоўка Пятра Крэчэўскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.10.1921

Дарагі Вацлаў

Хучэй высылайце людзей на падмогу, аднаму працаваць немагчыма. Дагаварыцесь з Літвінамі аб едыным фронце дзеля абароны сваей самастойнасьці. Такую позыцыю прынімаюць усе.

Конфэрэнцы[я] Кубанцаў адчынілась — я учора вітаў. Жду падмогі. Справа з чэхамі зацягіваецца. 17.X.1921. Крэчэўскі

582.1.15:128

2989. Ліст Людвіка Зайкоўскага (Кадагі, Акмянскага павету) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 21.10.1921 у справе пошукаў сваяка, памерлага ў Амэрыцы

582.1.25:055&r

2990. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Андрэю Бароўскаму (Бэрлін) за 21.10.1921

21 кастрычніка 21

Яго Дастойнасьці
Пану Бороускаму
у Бэрліне.

Прашу купіць і пэрэслаць праз Александра Іванавіча 200 лістоу васковай паперы для ротатара і 6 лент для машынкі (2 хімічных у 13 мм. і 1 хімічную у 15 мм; 2 чорных у 13 мм. і 1 чорную у 15 мм.).

Трэба як найхутчэй перэкласьці і надрукаваць на машынцы 20 экз. рэзалюцый Пражскага зьезду у французкай мове. З Бэрліну рэзалюцыі не разсылайце заграніцу. Пашлем с Коуны.

Дашліце экзэмпляры чэскіх і другіх газэт у якіх было друкована аб зьездзе.

Я тут перэпытау усіх і ніхто ня ведае нічога аб кніжках, якіх паісківае Александр Іванавіч. Грыб кажэ, што ен у Бэрліне бачыу кніжку Венгерова у Александра Іванавіча на стале.

Прагледзіушы карэспандэнцыю знайшоу ліст ад Вашага брата з Амэрыкі[1], які ізноу пытае што з Вамі, дзе Вы і ці ня ведаеце што аб яго дзецях.

Патуроуце п. Анэкштэйна, каб крыху энэргічней павеу справу інфармацыі нямецкай прэсы аб Беларускіх справах. За грошы памешчаць заметкі — гэта ня выхад. Ніхай вяжэ стасункі з Баварскай і Прускай прэсай.

С пашанай
582.1.29:004&r — мк

[1] Сяргей Бароўскі, сьпявак Маскоўскай опэры, на гастролях у Амэрыцы.

2991. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Антыкваріату Русскихъ Книгъ «Россика» (Бэрлін) за 21.10.1921

21 октября 21

Антикваріятъ Русскихъ Книгъ
«Россика»
Берлинъ

Прошу выслать каталогъ имѣющихся у Васъ въ продажѣ книгъ.

Меня интересуютъ книги по исторіи Литвы и Бѣлоруссіи (Сѣверно-Западнаго Края), а также книги по исторіи русскаго языка.

С почтеніемъ
582.1.29:005 — мк

2992. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) Аляксандру Цьвікевічу (Бэрлін) за 22.10.1921

Высокапаважаны Александр Іванавіч!

Атрымаў сягоньня пісульку ад Петра Антонавіча у якой ён просіць прыслаць яму каго для помачы у працы. ~~У нас палажэньне тое-ж што і было г.зн. грошы німа, а дзеля гэтаго мы яму нікога адгэтуль паслаць ня можэм.~~ У кіруючых сфэрах с-р. тым часам німа выробленага пагляду на справы паднятыя Шапавалам. Нават болей іх настраеньне есць цягнуць чым далей. Дзеля гэтага добра было-бы каб Вы с П<ятром> А<нтонавічам> па магчымасці хутчэй прыехалі да нас і пазьней паехалі у Прагу.

Дабудзьце праз Цішку кнігу «Советская Россія і Польша» Москва 1921 г. (сентябрь). Там на 92 стр. спамянута Ваша фамілія і імя у ліку супрацоўнікоў Савінкава. Трэба чым хутчэй рэагаваць на гэта. Я думаю справа абстаіць з нейкім Вашым цёскам, якога трэба ўсе-ж такі выкрыць.

Аб кніжках, якіх Вы шукаеце я учора выслаў спраў у лісце да Бароўскага.

Як ідзе праца п. Бороўскага з [1] [1] і п. Жытлоўскага? Мы тут кожды дзень чэкаем ад Вас вестак у гэтых справах.

582.1.25:046r-046

[1-1] Прагал у тэксьце.

2993. Ліст Старшыні Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі Вацлава Ластоўскага (Коўна) Міхалу Зварыку (Нью-Ёрк) за 25.10.1921

Яго Дастойнасьці
Грамадзяніну Міхалу Язэпавічу Зварыка
у Нью-Ёрку

25 кастрычніка 1921

Я атрымаў ліст ад грамадзяніна Бубешко с паведамленьнем, што мой ліст с просьбай аб дапамозе на культурна-прасьветную працу ў Беларусі ім перэдадзен па назначэньню ў Руска-Славянскае таварыства. У тым-жа лісце ён, паведамляючы аб сваім выездзе на Далейшы-Ўсход, кажа, што ў час яго нябытнасці можна зносіцца з Вамі. Дзеля гэтаго выбачайце, што Вас турбую нашымі справамі, але палажэньне ў нас на бацькаўшчыне так цяжкое, асабліва цяжкое палажэньне нашай школьнай справы зь недастаткам кніг. Калі ніякім спосабам нельга дастаць ад нашай амэрыканскай калёніі падмогі на грамадзянскія ўстановы, каб яны маглі працаваць, то ці не маглі-бы Вы знайсці людзей, якія захацелі-бы улажыць у выдавецтво беларускіх кніг грошы дзеля заработку. Кніга беларуская мае цяпер вялікі попыт. Выдавецтво з вялікім капіталам мае вялікія шансы на працьвітаньне, разумеецца даход пачне даваць яно ня с першага, а с 5-6 году. Адзін толькі варунак — асоба ці пайшчыкі такога прэдпрыемства павінны быць беларусы. А гэта таму, што інтэрас пэўны і нашы грамадзянскіе ўстановы ня хочуць каб на нашай кнізе рабілі сабе маёнткі чужынцы. Можна было-бы злажыць акцыйнае «таварыство беларускай

кнігі». Асабліва падхадзячы гэта інтэрас для тых беларусоў, якіе с капіталам хочуць вярнуцца на бацькаўшчыну. Нам вядомы выпадкі што вярнуўшыся з Амэрыкі людзі, нават з вялікім капіталам, так няўмела пакіравалі грашамі, што ў некалькі гадоў асталіся с пустымі рукамі, толькі збагацілі розных прайдох. Уложаныя ж грошы у выдавецтва давалі-б ім пастаянны і саўсім пэўны, ў дадатку стасункова высокі, працэнт. Найтанней кнігі друкаваць у нас у краю, урад (праўленьне) таварыства павінно было-бы абаснавацца дзе небудзь у Літве, ці Латвіі, каб блізка было да бацькаўшчыны і каб тавар мог лежаць у баспечнасці.

Мы даўно ня мелі з Амэрыкі лістоў і няведама, што робіцца нашымі беларусамі. Што робіць прэс-бюро? Вестак ад яго мы даўно не мелі.

У нас адбылася ў Празе Беларуская нацыональна-палітычная конфэрэнцыя, вынесеныя рэзалюцыі пасылаю разам з гэтым лістом.

Астаюся з вялікай пашанай

582.1.30:005&r-006 — чарнавы рукапіс В.Ластоўскага
582.1.30:004&r — мк

2994. Н.Р-ч. Письма из Белоруссии // Правда (Масква). №240. 25.10.1921

582.2.59:012 — д

2995. Н.Р-Г. Письма из Белоруссии // Правда (Масква). №241. 26.10.1921

582.2.59:011 — д

2996. Ліст Пятра Крэчэўскага (Прага) [Вацлаву Ластоўскаму (Коўна)?] за 28.10.1921

28.X.21

Трудна пісаць, калі не хапае на маркі, але усеж такі павінен паведаміць, што палітычныя справы пашырылісь тут значна.

З усімі групамі і палітычнымі партыямі, як новапаўстаўшых Рэспублік, так і Велікаросаў акрэслян едыны фронт у барацьбе за самастойнасьць і незалежнасьць. Умоў пэуных яшчэ німа, бо трэба для подпісу і адпаведных асоб, але яны могуць быць кожны момэнт падпісаны. Як мы усе думаем можна відаць з тых рэзалюцый, якія намі агульна прыняты проці замаху Гаусбурга на незалежнасьць Чэхаў. Адну выняслі усе разам з расейцамі да Мілюкоўскаго толку уключна, другую з украінцамі. Першая гаворыць аб нашай агульнай салідарнасьці, а другая аб салідарнасьці новаутвораных Рэспублік і гатоўнасьці барацца за Чэскую свабоду у форме Украінскіх, Беларускіх і Кубанскіх легіоноў.

Аб утварэньні іх будзем заутра супольна мець гутарку з Бенашам, Вайсковым Міністрам і Старшыней Парлямэнту.

Асобна Масарыку і Бэнашу я паслаў прывітальную і спачуваючую тэлеграмму у дзень 28 кастрычніка — дзень абвешчэньня Чэскай незалежнасьці.

Пасля Вашаго адъезду нарады у нас адбываюцца па два і тры разы у дзень, я зусім збіўся з ног. Калі будуць дазволены нашы нацыянальные ле-

гіоны буду рабіць захады аб дазволе выезду нашым беларусам вайсковым з Констант<ынопаля>, Софіі і Белграда, а так сама Неметчыны. Разумеецца вялікай сілы мы не створым, але моральна змацуем і сябе і шчыра патрымаем Чехоў. Падзеі развіваюцца так, што гэта мусі будзе магчыма.

У грашовую справу да гэтай пары не торкаўся, бо чекаў прыезду Цвіка чы Клаўдуша — без рэальных прапазыцый з нашаго боку не можна гаварыць з банкамі. Урадовая дапамога да новага году будзе немагчыма, але і з гэтай стараны была з нашаго боку зроблена абмылка ў тым, што я адразу не зрабіў нікому з ураду візытаў.

Калі пасля адъезду я торкнуўся да Гірса, то ен дыплематычна мяне не прыняў і разумеецца ужо да Бенеша йсьці я не адважыўся і толькі цяпер можэ разам з украінцамі і кубанцамі я зламаю той лед, які быў створаны нашай агульнай абмылкай.

Кепска, што і Вы не інфармуеце мяне ні аб чым, што робіцца у Вас і на Бацькаўшчыне, я не пісаў, бо канкрэтна яшчэ і цяпер на пы[1]

[1]усяго даць не магу. Вам жэ трэба і Літвіноў прыцягнуць да гэтаго і апавесьціць мяне аб іхней згодзе на нашы умовы: 1) Агульны фронт усіх новапаўстаўшых Рэспублік у барацьбе за сваю самастойнасьць і незалежнасьць на падставе:

a) Нацыянальна-тэррытар. самаадзначэньня

b) Вызнаньня незалежнасьці адных другімі

c) Прызнаньня дэмакратычна-рэспубліканскага ладу.

Дэманстрацыя гэнаго абъеднаньня ужо дана у рэзалюцыях, аб якіх я казаў вышэй, а дэкляратыўная частка будзе дана пасля утварэньня Саюзу Усходня-Эўропэйскіх народаў быўшай Расеі, мы усе стаім на грунце, што Расеі німа, а есьць Усходня-Эўропэйскіе народы, якіе і павінны утварыць Злучаныя Штаты Самастойных Рэспублік, бэз уселякаго звязку з расейскай праблемай, бо і Велікаросія есьць частка Усходня-Эўрапэйскага пытаньня.

Ваш неадказ на тэлеграму мяне паставіў у цяжкіе варункі, я і цяпер ні маю ні фэніга і не прыймаў ніякіх крокаў — так сама нічога не мае і Вершынін. Кінуты на праізвол лесу я нават не магу спакойна працаваць і выкарыстовываць усе тые палітычныя магчымасьці для нашай справы, якіе бы мог выкарыстаць, а пагроза, што мяне хутко выставяць з Готэля зусім паралізуе працу — сталась так як я і гаварыў з пачатку у Празе.

Копіі прамовы на кубанскай конфэрэнцыі, рэзалюцый і праэктаў згоды, чы згод для зацьверджаньня і Ураду і партый хутко вышлю.

Ад Вас чэкаю інфармацый. Якіе нашы адносіны да балтыцкіх конфэрэнцый?

Шлю ліст праз Бэрлін, каб і там мелі поуные інфармацыі.

З пашанай ПКрэчэўскі.

Венок на біблію Скарыны і адрэс не выкупляны — за адрэс просіць 1500 кор. Бегаў сягоньня каб пазычыць у каго грошэй, нічога не знайшоў, усе бедные. Справа з легіонамі пасуваецца. У панядзелак уручым рэзалюцыі.

Крэчэўскі

582.1.25:036&r-037&r

[1-1] Абрэзаны ніз старонкі.

2997. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.10.1921

29.X.21.

Глыбокапаважаны Вацлаў Юстынавіч!

Пісьмо Вашае атрымаў. Зусім гаджуся з Вамі, што П<ятру> А<нтонавічу> і мне трэба прыехаць у Коўну. У гэтым сэнсі я напісаў П.А. і папярэдзіў яго, што наагул праэктаваная умова[1] мае шмат «але». Галоўнае «але» у тым, ці зможа новы хаурус утрымаць нашую справу, калі нам прыдзецца пакінуць нашае цяперашняе месцо пабыту. Я асабісце думаў яшчэ тк сама прыехаць у Прагу — але затрымлівае адсутнасьць грошы. Ня ведаю — як прыдзецца дзьвігнуцца да Вас? На працягу тыдня П.А. павінен мне адказаць — і мы выедзем.

Пашто Вальковіч тэлеграфуе сюды аб грашох, ды яшчэ срочных? Дарма, як кажа Лявон, выдае грошы на тэлеграмы. Пакуль што не відаць нічога, і як будзе далей — тк сама няведама.

Гдзе Галава[2]? Чаму аб ім нічога не чуваць? Таму, што у Вашым пісьме німа аб ім ніводнага слова, я прыходжу па пракананьня, што і наагул нічога німа. Калі яго «акцыя» закончылась прывозам жонкі ,— то і то добра! Хоць адно нешта рэальнае!!.. Ніхай паклоніцца ёй і пажадае усяго найлепшага.

Што там было з Грыбам? Паўлінка кажа, што было голасна! Разумею!..

Яшчэ мяне цікавіць — чаму тк доўга сядзелі «мейсцовыя» і як яны выбраліся? Ці скарысталі у пэўных напрамках віленцаў? Аб гэтым прыдзецца, зразумела, даведацца на месцу ад Вас, бо у пісьме не усё можна напісаць.

Зьбіраўся да Вас у гэты панядзелак, але па усяму відаць, што нічога ня будзе. Трэба шукаць на што жыць — тошно усе гэта і выхаду не відаць.

Скончыў сваю стаццью аб Безсонаве. Пачынаю новую больш-менш значную працу аб постулятах нашага руху. Гэта зацягнецца на добрыя паў-года. Думаю, што будзе карысна. Трэба працаваць і у гэтай дзедзіне.

Справа з друкам — ідзе слаба. Дагавор маем, а грошы нічорта. Пакуль што друкуем адну «Граматыку». Быў тут два дні Тарас. Прыездзжаў да Цішкі, відаць, за гонорарам. Але тк і уехаў без нічога з абецанкай. Падгатавалі да друку «Лемантар» Некрашэвіча і гатуем «Крыніцу» Лёсіка. Убачым, што будзе.

Камітэт галадаючых тк сама цягнецца — усё мае надзеі. — Кланяйцеся усім! Калі атрымаю весткі ад П.А. — паведамлю.

АлЦв...

P:S: Я згодзен прызначыць Гладкага сэкрэтаром нашага прэдстаўніцтва у Чэхіі. Напішэце, калі ласка, яму адпаведную паперу з Коўна, бо адсюль не выпадае.

АЦ

П:А: прасіў нас, каб выслаць грошы. Мы паслалі тэлеграмы Гурэвічу і Шапавалу, каб яны пазычылі яму. Як стаіць у яго цяпер гэта справа —

не ведаю. У кожным разе мы бяз грошы ня дзьвігнемся і ў Коўну. Німа нават чым за кватэру плаціць і наагул жыць. А у Коўне аба мне здаецца зусім ня думаюць і не цікавяцца відаць чым і як я жыву. Адным слова — буду чакаць вестак ад П.А. і ад Вас.

582.1.25:041r-041

---

[1] Праект стварэньня ў Празе Саюзу Ўсходнеэўрапейскіх Народаў былой Расеі. [2] Галавінскі.

2998. Ліст радніка Місіі БНР у Нямеччыне Давіда Анэкштэйна (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.10.1921 і канвэрт

582.1.25:028&r-029&r

582.1.25:030&r — канвэрт

Аб падрыхтоўцы паездкі ў Лёндан з Жытлоўскім. Д.Анэкштэйн у бел. руху з траўня 1919 году (Беларуская Вайсковая Арганізацыя). Швагер — прадстаўнік румынскіх каапэратываў.

2999. Н.Р-ч. Письма из Белоруссии // Правда (Масква). №244. 29.10.1921

582.2.59:009 — д

3000. Запісаны на аркушы паперы адрас

Henrikas D. Žilevičius
Convict Albertinum
Fribourg, Schweiz

582.1.25:042

Дата невядомая.

3001. Ліст «Коленьки» [Івана Краскоўскага?] (Вільня) «Тетушке» [Вацлаву Ластоўскаму?] (Коўна) за ??.10-11.1921

Дорогая Тетушка!

Письмо Ваше мы получили и очень обрадовались! Я по пріѣздѣ в Вильно довольно серьезно вздумалъ болѣть — конечно перемѣна климата вредно повліяла на меня — но теперь понемногу выздоровливаю. На днях напишу Вам подробно, а пока нѣсколько слов. Печально состояніе Ваших финансов, но мы тут надѣемся, что Вы скоро разбогатѣете и тогда всѣ Ваши родственники возликуют, а Ваши дѣла развернутся. Хотя и без денег мы сдѣсь дѣла дѣлаем и не унываем. Много мѣшает нам наш безпутный кузен Алексѣй[1] — знаете такой красивый малый, но к сожалѣнію безпутничает получая большія деньги на это от своего сіятельного дядюшки. Поѣхал он теперь кутить в Варшаву. Вся остальная наша семья живет довольно дружно и работает оживленно. Привѣт всѣм родным.

Ваш племянник Коленька.

582.1.25:059&r

Дакладная дата невядомая. Паводле почырку й зьместу гэты ліст быў напісаны Іванам Краскоўскім і адрасаваны ў Коўна, Вацлаву Ластоўскаму або Аляксандру Цьвікевічу. [1] Хутчэй за ўсё П.Аляксюк.

3002. Візытоўка Баліса Стадзявічуса
B.Stadzevičius
582.1.14:069

3003. Наша Зямля. №3. Лістапад 1921. Коўна, вул. Кейстучыо №15. Друкарня Бр. Гурвіч, Коўна, вул. 16 Лютага, №2
582.1.15:173&r-180&r
582.1.15:181&r-188&r

3004. Селянская Доля. №4. Лістапад 1921. Год I. Выдавец: Сувязь Беларускага Працоўнага Сялянства
582.1.15:231&r-246&r — д

3005. «На змаганьне!» Улётка-адбітак зь «Сялянскай Долі» за подпісам Г.Дрыль
582.1.15:189&r — д

Дата невядомая.

3006. Ліст старшыні Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі Аляксандра Галавінскага (Коўна) Сымону Мацьвеевічу Ермакову (ЗША) за ?.11.1921
582.1.24:031&r,023&r,024&r,025 — мк

Дакладная дата невядомая. Адказ на ліст за 15.09.1921 і падзяка за прывітаньне Беларускай Нарадзе ў Празе.

3007. Ліст Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.11.1921

1 лістапада.
Берлін.

Паважаны п. Ластоўскі.

Хацеў было пісаць аб Каліноўскім але на жаль у тутэйшай бібліотэце німа гэтай кнігі «Ратча аб паўст. 1863 г.» Так сама патребна гэта кніга каб скарыстаць «катэхізіс» польскі.

Матэрьялы аб шляхце тут нашоў, але пакуль мала. Кнігу Ельскага «Dzieje szlachty na Litwie i Białej Rusi» тут німа (аб ёй вы мне казалі). Атрымаў гэтага Jelska'га другую — «Zarys obyczajów szlachty w zestawieniu z ekonomiką i dolą ludu w Polsce i Litwie» Tom I. 1897 г. Можа гэта й ёсць аб якой вы казалі? Ёсць у бібліот. яшчэ цікавая кніга Ельскага на беларускай мове, якую толькі сягоньня вазьму.

Усе ж ткі шляхту прыпяку як сьлед.

Думаю тэму сваю скараціць, бо часу малавата. Тэма будзе — «Роль польск. шляхты на Беларусі».

Перашкаджае думаць і пісаць каррэктура[1], ад якой к вечару аж міга-ціць у вачах і дубеюць мазгі.

Гэтымі днямі рабіў каррэкту хрэстамаціі Лёсіка. От жа, ведаеце, сабралі сьмецьцё якоесь на сотні тры старонак і гэта будзе называцца «хрэстамація».

Калі б гэта ад мяне залежала — я бы проста здаў бы яе ў архів, як памятку аб тым як ня трэба пісаць хрэстамаціі. Нью, плачу, сьлёз, магілак, пахавункаў, нуды столькі, што чытаючы яе чуеш як вошы заядаюць.

Сьветагляд вузенькі, не сягаючы далей аколіцы нашае беднае вескі з гноем, анучамі і вераб'ямі.

З нашай гісторыі — нічога німа!

З лепшых нашых пісьменьнікаў — амаль нічога німа. Аб гісторыі літэратуры — ні слоўка. Аб навуке і тэхніцэ — ні слоўка. Не, яшчэ німа педагогаў на Беларусі! Запраўды ўстыд, калі гэтулькі грошы будзе ўсаджана на Лёсікаву прамудрасць. Вершы бадай аднаго толькі Я.Коласа (кажуць што ен сваяк Лёсіку?!) ды пару Цішкавых, ды два-тры Купалы.

Але што цікавей усяго, дык гэта адно апавяданьне «Гутарка» у якой я знайшоў выраз: «прададуць жыдам на мацу»! Ось табе й менскія камуністы-інтэрнаціоналісты! Слана — й не угледзелі. Цішка аж падскочыў калі я сказаў яму. Выкрэслілі гэтую «крушэваншчыну», і маўчым, нікому ня кажэм, бо ўстыд. А калі б так надрукавалі ды пусьцілі ў сьвет?! Ганьба на усе вякі!

А пра Бога ды пра цара і князеў — так сама ёсць.

Сам чорт не зразумее, што гэта за новая метода!

Урэшьце, ніхай, абы кніга для школы, бо пакуль што і гэткай німа.

Цешу сябе надзеяй — мо' праз 40 гадоў будуць і ў нас добрыя падручнікі!

~

Будзьце ласкавы — туды прыедзе Гершовіч дык праз яго прышліце мае запіскі й кнігу «Ратча аб 1863 г.».

Паклон вашай жонцэ і ўсім хто не забыў мяне.

Усяго найлепшага.

Ваш Ів.Цвік...

582.1.25:038&r-039&r

[1] І.Цьвікевіч працаваў карэктарам у выдавецкай групе З.Жылуновіча ў Бэрліне (Навукова-Літаратурны Аддзел Камісарыяту Асьветы БССР).

3008. Белорусский Университет // Белорусская Деревня (Менск). №59. 1.11.1921

582.2.59:019 — д

3009. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.11.1921

Паважаны Пане Вацлаў Юстынавіч!

Атрымаў я з Жэнэвы ад Бачыньскага вельмі цікавую кніжку «Про багацтво да бьеднасць», пьераклад з украйінскаго, Жаньева, Друкарньа «Роботника» j «Громади», 1881 (in 16°).

Ці Вы ведаеце пра гэтую кніжачку? Як відаць з параўнаньня году выданьня з працаю М.П.Драгоманова і інш. супрацоўнікаў «Громады» у Жэнэве, а так сама як відаць са зместу — гэта кніжка напісана кімсь-ці з той «Громады». Цікава, як бачыце, орфографія яе. — Адкажыце, ці вядома

яна беларусам, і калі не — то я падам дэтальную вестку аб ей у «Бел. Ведамасьці».

Кнігі свае я знайшоў. Ваш пакет атрымаў.

Ваш АлЦв

582.1.25:027&r

3010. Ліст Камітэту загранічнай групы Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў (Коўна) тав. Ластоўскаму і Кісель (Коўна) за 5.11.1921 у справе перарэгістрацыі сяброў партыі і ўплаты ўзносаў

582.1.29:010

3011. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.11.1921

6.XI.21.

Рыга.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

з вялікай прыемнасьцьцю паведамляю Вас, што Беларускі Аддзел[1] ўжо прайшоў праз ўсе рагаткі і стадзіі і ўжо прыступіў да працы.

Здаў я яму наследства сваей працы — у ліку 17 беларускіх школак, беларускага театру, 43 беларускіх вучыцелеў, скончыўшых летніе курсы, і гэткагажа ліку жадаючых такія-ж курсы скончыць. Худка адчынім.

Цяперыка перахожу да працы эканамічнай і палітычнай.

Ад Вас, ды і, наагул кажучы, ні ад каго нічога ня маю, ні лістоў, ні вестак.

Як адрэзала.

Бюллітэні нічога не кажуць.

Вальковіч — маўчыць: не толькі не надсылае грошы, але навэт, ніхоча зрабіць тых паперак, што я прасіў і якія-б маглі мяне тутака дапамагчы.

Страшэнна цікаўлюся ходам спраў.

Цікавіцца імі і Вільня.

Не адмоўце ў ласкавай згодзе даць інфармацыі.

Хочу ехаць і ўжо трэба ехаць ў Латгалію, але не магу падняцца.

Аддзел на бок нічога даваць пакуль-што не можа, бо абмежаваны цеснай смэтай штатаў і школы.

Аляксюк лаецца ў Вільні на усіх, як пес, а Польскае Агенства прэссы праз радзіо, як той, нераўняючы, вецер — носіць гэту брахню па ўсяму сьвету.

Я тутака ўжо пералаяўся ў друку з «Рыжскім Курьерам» з поваду Алексюкоўскага інтэрвью аб Кангрэссі, надрукаваным ў «Р.К.» 18.X.21.

Вы, пэўне, маеце гэта інтэрвью і ведаеце яго і мой адказ з дакладу Прэс-Бюро, а таму я не распрастраняюся.

Дзе Ал.Ів.Ц<ьвікеві>ч?

Якія адносіны цяперака з Л<уцкевічам — ?>?

Ладноў пачынае новые крокі, але весткі аб іх даходзюць вельмі глуха.

Шлю ўсім прывет і найлепшыя пажаданьня.

З пашанай К.Езавітаў.

P.S. Вельмі прашу Вас, калі Вамі ўжо скарыстана гісторыя Турчыновіча, праслаць яе сюды: патрэбна для курсаў і працы.

Шчыры прывет Вашай жонцы.

Ці атрымала яна лісты з Вільні, якія я пераслаў ў Палангу, але яны вярнуліся сюды і зноў былі перасланы мной ў Коўну?

Як імя Кн. Святаполк-Мірскага і ці мае ён уласнасьць ў Крыму і на Украіне?

Вучыцель Антонаў, што працуе ў Семашкі выпускае кнігу сваіх успамінаў[2], у якой ёсьць вялікія і вельмі некарысныя (я чытаю цяперыка рукапіс, подліннік якога здадзены ужо ў тыпаграфію) памылкі з боку беларускай Дзяржаўнасьці і ў асьвятленьні спраў на Горадзеншчыне. Я напісаў свае думкі Антонаву, але ня пэўны ў тым што ён зробіць папраўкі. Звярніце на кнігу увагу!

582.1.25:064&r-065&r

[1] Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Асьветы Латвіі. [2] Антонаў, Іван Г. Успаміны аб польскай акупацыі Горадзеншчыны у 1919-1921 г.г.: Малюнкі гвалту і зьдзеку фацэтных польскіх паноў на Беларусі: (Мае перажываньні). Б.м., 1921, 83 с.

3012. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.11.1921

7.XI.21.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Палажэньне П<ятра> А<нтонавіча>[1] зусім крытычнае. Ен зварочваецца сюды, каб яму што выслаць, але тут нічога німа. Ня ведаю, — як здолее ён пераехаць сюды. Ведаю толькі, што дзьвігнуцца адсюль у Коўну я не маю жаднай магчымасьці — больш таго, я зусім ня ведаю як, на што жыць далей. Ужо я залез у доўг на 6 тысячаў — і як выберусь з яго — так сама не ведаю. Калі-б былі грошы якія у вас там у Коўне, то бы мне дапамаглі, але відаць, што і там нічога няма. А тут за кватэру і пр. трэба плаціць.

Працую над кнігай[2].

Крыху пасоўваю выдавецтва — але у Цішкі[3] з грашыма зусім швах, немагчыма разменяць.

Абдумываю палітычную сітуацыю і пачынаю прыходзіць да дзе якіх вывадаў. Але падзяліцца з імі можна толькі пры асабістым спатканьню.

Ці маеце Вы што небудзь ад Івана Ігнатавіча[4]? Ці ня можа ен прыехаць хоць да Новага Году на нараду?

Жытлоўскі зьбіраецца у Лёндан. Яшчэ ня ведама, ці атрымаюць візы. Усе абецае!! На якогось «Александра Цвікевіча» у Савінкава я рэагаваць не зьбіраюся — хоць бы таму, што акцыі Сав. ужо спыняны.

Ці чыталі Вы заяву Дуба[5] (у адказ на інсынуацыі Алексюка) аб адносінах да нас? Вельмі характэрная — але не цікава, бо Дуб застаецца самім сабой. Склізкім вужом, які рад служыць усім гаспадам.

Ад Тараса[6] на прапазіцыю маю яшчэ адказа німа, ды і ня трэба, бо пакуль што не відаць ніякіх рэальнасцей.

Ці атрымалі праз Гершовіча пакет з пісьмом і рахункамі?

Калі у Вас будзе хоць крыху грошы — вышліце мне, каб вылезьці з бяды!

Кланяйцеся усім!

Ваш АЦвікевіч

582.1.25:031-032&r

[1] Крэчэўскага. [2] Магчыма, над «Западно-руссизм'ам». [3] Жылуновіча. [4] Краскоўскага. [5] Магчыма, Дубейкоўскага. Абставіны невядомыя. [6] Тарашкевіча. Абставіны невядомыя.

3013. Ліст Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.11.1921

8 лістапада
Бэрлін.

Многапаважаны п. Ластоўскі!

Выбачайце, што дакучаю вам з гэтымі тэрмінамі, але ніхто ня можа мне памагчы ў гэтым.

Надзёбваецца магчымасьць друкаваць рожныя табліцы для школ нашых і трэба будзе зрабіць надпісы на нашай мове. Апрача гэтага трэба ўсеж-ткі перакласьць для сярэдніх школ зоологію й яшчэ якія-неб. кніжкі. Калі ласка прышліце праз Бароўскага мой пераклад — якой я рабіў у Коўне, разам з кніжкай.

Так сама прышлеце тую кніжачку «Природоведеніе» — што я зьбіраўся пералажыць. Так жа праз Бароўскага прышлеце «Ратч'а — аб паўстаньні 1863 г.» — мне вельмі патрэбна як матэр'ял аб Каліноўскім. Тут у бібліот. яе німа.

Ёсьць, праўда, іншыя цікавыя кнігі, але не аб гэтым пытаньні.

Адшукаў і далей шукаю беларускія кнігі, друкаваныя ў старыя часы. Любячае сэрца ўсюды знойдзець сваё роднае, йзноў выцягне на сьвет божы, каб ведалі людзі, што ня мы, сучасьнікі, — першыя й апошнія. Жылі й будзем жыць.

Хоць часам душа чарнее ад страху за свой народ, ад страху — колькі працы яшчэ на дзесяткі гадоў нам — маленькай горстачке інтэллігентаў, але вочы глядзяць у сьветлую даль, рукі самі цягнуцца да працы, каб адагнаць, каб супакоіцца ад чорных думак.

Гэта нашая маленькая горстачка эмігрантскай беларускай інтэлігенцыі — якая яна слабая ў параўнаньні з усімі іншымі нацыянальн. группамі!

У гісторыі нацыянальн. рухаў, бадай ня было нацыяналіст.-эмігрантаў бяднейшых за нас, бадай нікому тк мала спачувалі як нам.

Усе ж такі мы ня ўмёрлі дый ня хочэм уміраць. Як краты мы сочым пад зямлей пакуль свае ходы, мы робім паціху свае падкопы пад расейскамаскоўскую идэалёгію, пад гоноровую шляхецкую ідэалёгію й прыйдзе час калі мы ўзарвем гэтыя распухшыя на чужой працы й крыві гмахі, мы выйдзем на волю, на сонцэ й пакажам, што мы здольны да усясьветнай культуры, што мы пад бруднымі сапагамі пензенскіх самахвалаў і пад лякераванымі боцікамі варшаўскіх франтаў усе ж такі выкулі непахібную

волю, што мы падкапаліс пад самыя сэрцы іхняга самахвальства й маем сілу скінуць к чортавай мацеры напіханую ў нас гвалтам чужацкую культуру і адначасна сарваць з іх бліскучыя адзежы «культурнасьці», пад якімі схаваліся штык і зубы.

Ах, толькі б сілы ў душы хапіла, толькі б не памерці раней чым ся прыйдзе лепшы наш час!

Бывайце здаровы.

Шчыры прывет усім. Ваш Ів.Цвік...

582.1.25:022&r-023&r

582.1.25:024 — канвэрт

3014. Тэлеграма Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.11.1921

= lastowski vitautas 30 kowno

berlin 30+ 167/30 12 9 12-45 s =

= pryjechac niemahu boniema hroszy barouski budzie czacwierh[1] = ewikiewicz

582.1.25:040

[1] 10.11.1921.

3015. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.11.1921

9.XI.21.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Сення атрымаў ад Вас тэлеграму, каб безадкладна прыехаць у Коўну. Але гэта немагчыма — бо німа грошы. Чым выклікан мой вызаў? Палітычнымі прычынамі, ці матэр'яльнымі? У справах матэр'яльных едзе п. Бароўскі. Усе, што будзе магчыма зрабіць з таварамі — разам з ім у Коўне можна будзе зрабіць. Што датыча мяне — то я змагу прыехаць толькі тагды — калі атрымаю грошы на падарож. Пакуль гэтай магчымасці німа. У кожным разе, калі толькі мне удасца знайсьці тысячу-другую то я хутчэй пашлю іх П<ятру> А<нтонавічу> які знайходзіцца у Празе у самым крытычным становішчу. Позаучора прыехаў Гладкі, і кажа, што П.А. не абедае. Жонку і сястру ён лічыць патрэбнім перавесьці у Бэрлін, а сам застанецца у Празе. Працу там кінуць немагчыма. Палітычна яна стаіць вельмі добра, і ён лічыць нават патрэбным, каб хто небудзь прыехаў да яго на падмогу. Але гэта так сама немагчыма.

Ад Вас атрымаў сеньня так сама адкрытку. Лістоў ні ад каго німа. З ліста Вашага да Івана бачу, што справы у Вас стаяць зусім дрэнь. Аб Галаве нічога не чутно — што ён зрабіў[1]? Як справа са стрэльцамі і батальенам[2]? Няужо-ж усё так блага?

Я рыхтую справу выдавецтва разам з Сыркіным. Можа што выйдзе. Трэба гэта скончыць. Летаю што дня — шукаю грошы!

Чакаю вестак ад Вас

Ваш АЦв...

Абавязкова прышлеце усе белар. кнігі, якія у Вас есць!!!

Для выдавецтва (для справак!) патрэбны усе бел. кнігі, — якія ужо выйшлі. Прышлеце іх — асабліва «Географію», «Гісторыю літэратуры» і усе падручнікі — разам з Бароўскім!!

582.1.25:033&r-034&r

582.1.25:035 — канвэрт

---

[1] Маецца на ўвазе паездка А.Галавінскага ў Маскву й ягоныя кантакты па лініі Камінтэрну. [2] Партызанскія атрады пры Саюзе Літоўскіх Стральцоў і Беларускі Асобны Батальён Літоўскага Войска.

3016. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.11.1921

Поважаный Пане Старшыня!

К сожалѣнію, покуда ничего отраднаго сообщить не могу. К поѣздкѣ в Лондон вполнѣ подготовлен и как только получится разрѣшеніе из Лондона на выдачу нам виз, я с д-ром Анекштейном немедленно поѣду.

За это время я успѣл написать всѣм видным общественным дѣятелям в Лондонѣ и таким образом подготовил немного почву для моего пріѣзда.

О дѣлѣ «Iweg'a» Вам подробно доложит г. Боровскій.

Свидѣтельствуя мое глубокое уваженіе, прошу вѣрить в полную мою к Вам преданность

С.Жытлоускі.

Берлин.

9/XI 1921.

582.1.29:011

3017. Ліст Канстанціна Арцем'ева (Коўна) «Господину Министру» (?) за 10.11.1921 з просьбай выдаць паліто

582.1.25:063&r

Урад БНР праводзіў гандлёвыя апэрацыі зь фірмай IWEG, прадаючы розныя тавары, пераважна адзеньне.

3018. Н.Р-ч. Письма из Белоруссии // Правда (Масква). №253. 10.11.1921

582.2.59:013 — д

3019. Паштоўка Антыкваріата Русскихъ Книгъ «Россика» (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.11.1921

М<илостивый> Г<осударь>

Письмо наше от 28 октября осталось без отвѣта. Покорнѣйше просим Вас сообщить нам причину этого. С соверш. почтеніем

582.1.25:062&r

3020. Ліст Дэпартамэнту Дзяржаўнага Скарбу Літвы Язэпу Варонку за 12.11.1921 з просьбай сплаціць запазычанасьць Літоўскай дзяржаўнай друкарні (1383 аўксіны 75 ск.)

582.2.06:029

3021. Ліст Людвіка Зайкоўскага (Кадагі, Акмянскага павету) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.11.1921 з лаянкай, што нічога ня зроблена ў справе пошукаў сваяка, памерлага ў Амэрыцы

582.1.25:056&r-057
582.1.25:058 — канвэрт

3022. Умова паміж Беларускім Вобчаствам Чырвонага Крыжу і расейскім Вобчаствам Чырвонага Крыжу // Савецкая Беларусь (Менск). №256. 16.11.1921

582.2.59:018 — д

«Савецкая Беларусь» — паводле пазнакі алоўкам. На выщінцы абрывак падтытулу: выданьне Ц.К. і менскага павятова-гарадзкога камітэту К.С.М.Б. — «Чырвоная Зьмена»?

3023. Паштоўка Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.11.1921

582.1.25:061&r

У справе магчымага пасрэдніцтва у пашырэньні беларускага друку ў Эстоніі, Фінляндыі, Латвіі й Літве.

3024. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19(?).11.1921

Паважаны Пане Вацлаў Юстынавіч!

Пісьмы Вашы атрымаў. Атрымаў тк сама і тысячу мар. ад Вальковіча на прыезд у Коўну. Але самі разумееце — што гэта жарты — выехаць з Бэрліну за тысячу марак, калі у доме німа ні граша, і трэба заплаціць срочныя даўгі...

Але як ніяк — я шукаю магымасьці выехаць. Трэба выехаць, каб урэшці вырашыць усе пытаньня. Цяпер ужо магу сказаць, што я зусім гаджуся з Вашымі думкамі што да сакрашчэньня грамады. Даўно пара. Але трэба абмазгаваць усім разам — як гэта зрабіць. — Шукаю магчымасьці, ці бліжэй грошы. Калі знайду — дам тэлеграму. Калі дастанеце Вы там у сябе — вышліце. Бо тут мала надзеі.

Ваш АлЦв...

582.1.25:043&r

Дакладная дата невядомая.

3025. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.11.1921

23.XI.21.

Паважаны Пане Вацлаў Юстынавіч!

Дзень за днем сходзіць, а у мяне магчымасці выехаць адсюль усё німа. І німа ведама ці будзе наагул. Я у такім самым палажэнні, у якое трапіў П<ётра> А<нтонавіч>. З ім парадзіцца я тк сама не магу, бо ні ен да мяне, ні я да яго дзьвігнуцца ня можам.

Як ідзе справа з ліквідацыяй тавараў? Усе ж такі пакуль гэта адзіная рэальная магчымасць. Ці падымалі пытаньня аб асвабаджэнні іх ад пошлін?

— Выдавецкія справы ўжо сталі на мель, бо Ж<ылуновіч> грошы не мае. Запраудная Ж<...>!! Аб якіх 50.000 Вы пішаце? Я аб гэтым нічога ня чуў. Напішэце, — Быв. здаровы. АлЦв....

Я ведаю, што Бар<оўскі> атрымаў на падарож 10 тыс. з якіх я палучыў 500 марак!.. Увесь час жыву пазычкамі і чакаю лепшых дзен!

582.1.25:060&r

3026. Запрашэньне на гутарку аб беларуска-жыдоўскіх пытаньнях, якая мае адбыцца 24.11.1921 на кватэры д-ра Льва Гарфункеля ў Коўне

582.1.14:068

Падпісана: Я.Варонко, Л.Гарфункель, 23.11.1921.

3027. Мэмарандум Ураду БНР да Высокай Канфэрэнцыі Вялікіх Дзяржаваў у Вашынгтоне

Высокой Конференціи Великихъ Державъ въ Вашингтонѣ.

Правительство Б.Н.Р., будучи непосредственно заинтересовано, поставленными въ программу конференціи вопросами объ упроченіи мира и побуждаемое національно-политическими и культурно-экономическими организаціями края, этимъ имѣетъ честь обратиться къ Высокой Конференціи съ просьбой — создать основы для нормальной хозяйственно-политической жизни и прекратить неописуемые семилѣтніе страданія Бѣлорусскаго Народа.

Занимая весьма выгодное какъ въ экономическомъ такъ и въ стратегическомъ отношеніи, центральное географическое положеніе и связывая своими могучими многочисленными рѣками Югъ Восточной Европы съ Сѣверомъ и Востокъ съ Западомъ, территорія Бѣлоруссіи, въ продолженіи многихъ вѣковъ, была объектомъ соперничества и борьбы двухъ найболѣе сильныхъ славянскихъ центровъ Москвы и Варшавы за гегемонію надъ Бѣлоруссіей.

Многочисленныя войны, вевшіеся сосѣдями Бѣлоруссіи на ея территоріи унесши громадныя человѣческія жертвы, разрушили въ конецъ культуру и экономическое состояніе знаменитой въ исторіи федераціи — Великаго Княжества Литовскаго, въ которомъ Бѣлорусскій Народъ быъ главенствующимъ государственнымъ факторомъ.

Но найболѣе тяжелыя и мучительныя жертвы понесла Бѣлоруссія въ послѣднія семь лѣтъ, за время мировой войны, затѣмъ Русско-Польской войны и общей неурядицы въ Восточной Европѣ.

По приказу главнаго командованія державъ согласія (по плану, предусматривавшему, хозяйственно-экономическими затрудненіями, принудить Германію просить мира) около 2-хъ мил. Бѣлоруссовъ (въ моментъ отступленія Русской арміи) принуждены были покинуть родныя мѣста. Стихійно ринувшіеся бѣлорусское населеніе лишилось всякихъ средствъ къ существованію: жилища и урожай были преданы огню, живой и мертвый сельско-хозяйственный инвентарь погибъ.

Таково было начало скорбнаго пути Бѣлорусскаго Народа. Затѣмъ трагедія развивается во все болѣе ужасающихъ размѣрахъ: до Сибирской тайги и до знойнаго Туркестана грунтовыя дороги Россійской Имперіи усѣяны, какъ вѣхами по скорбному пути, наскоро сдѣланными крестами, подъ ними покоются свыше 100 тысячъ младенцевъ бѣлорусскихъ бѣженцевъ.

Семь лѣтъ большинство бѣлорусскихъ изгнанниковъ «по независящимъ причинамъ», не можетъ вернуться къ своимъ роднымъ пепелищамъ и пренуждено скитаться на чужбинѣ, прося сочувствія и хлѣба.

На земли этихъ обездоленныхъ (во имя побѣды державъ согласія) людей устремился польскій воинствующій шовинизмъ.

Этнографическая Польша, не располагая природными богатствами въ количествѣ могущемъ сколько либо замѣтно вліять и предоставить Польшѣ выдающуюся роль въ мировомъ хозяйствѣ, не удовлетворяетъ польскихъ мегаломановъ. Послѣднія, желая хозяйственно-экономическое значеніе Польши увеличить національными рессурсами Украинскаго, Бѣлорусскаго и Прибалтійскихъ Народовъ, рѣшились насиліемъ овладѣть имѣющимися въ распоряженіи вышеназванныхъ народовъ рынками сырья и рынками сбыта готовыхъ товаровъ.

Кромѣ этихъ ближайшихъ и непосредственныхъ выгодъ польскіе анекссіонисты расчитывали использовать оккупированныя ими территоріи, какъ барьеръ, отгораживающій ~~изобилующій природными богатствами~~ Востокъ Европы отъ промышленнаго Запада.

Сдѣлавшись такимъ образомъ посредника[м]ъ въ мировой торговлѣ, Польша по мненію отечественныхъ имперіалистовъ, возродитъ свою промышленность и займетъ почетное мѣсто въ ряду Великихъ Державъ.

Рижскій миръ является первымъ этапомъ польскихъ захватчиковъ, присвоившихъ часть вѣковѣчныхъ земель Белорусскаго и Украинскаго (Галицкаго) Народовъ.

Бѣлорусская общественность не можетъ принять Рижскаго мира — этаго чудовищнаго эксперемента, заключеннаго через голову сувѣреннаго Бѣлорусскаго Народа; такая сувѣренность признана обѣими договаривающимися сторонами (Польшей и Россіей) въ 1918 году и закрѣплена тѣмъ-же Рижскимъ трактатомъ, четвертовавшимъ территорію этнографической Бѣлоруссіи.

Сувѣренный Бѣлорусскій Народъ не призналъ и не признаетъ Рижскаго мира, въ которомъ несправедливость и насиліе соперничаютъ съ безумiемъ и безстыдствомъ.

Сувѣренный Бѣлорусскій Народъ не уступалъ и не уступитъ своихъ правъ на самоопредѣленіе, установленныхъ международными законами переживаемой эпохи.

Бѣлорусскій Народъ желаетъ установленія мира на прочныхъ законныхъ основаніяхъ, гарантирующихъ свободу дѣятельности населенія по возстановленію руинъ и по возрожденію культурнаго благосостоянія своей родины.

Рижскій миръ, разорвавшій территорію этнографической Бѣлоруссіи и парализовавши Бѣлорусское государственное строительство тѣмъ самимъ,

разорвалъ и обезсилилъ, представляющій изъ себя единое цѣлое, хозяйственный организмъ страны. Бѣлоруссія (какъ въ части, очутившейся въ сферѣ компетенціи польскихъ оккупаціонныхъ властей, такъ и къ Востоку отъ нея) будучи отрѣзанной отъ своихъ естественныхъ Сѣверо-Западныхъ торговыхъ путей, связывающихъ ее съ промышленными государствами, потеряла свое самодавлѣющее положеніе въ хозяйственномъ отношеніи. Рессурсы страны, долженствующіе быть направленными на возстановленіе разрушенной хозяйственно-экономической жизни Бѣлорусскаго Народа, силой обстоятельствъ, попадутъ, въ видѣ куртажа, спекулянтамъ польской великой державности. Рижскій миръ сдѣлалъ невозможнымъ проведеніе необходимыхъ для процвѣтанія края грандіозныхъ работъ по меліораціи и по строительству водныхъ путей въ Бѣлоруссіи, имѣющихъ громадное торгово-промышленное значеніе для всей Восточной Европы.

Рижскій миръ не только не удовлетворяетъ правосознанію бѣлорусскихъ массъ, но также не оправдалъ надеждъ обѣихъ подписавшихъ его сторонъ — Польской и Россійско-Украинской; а равнымъ образомъ не разрѣшаетъ и не ликвидируетъ вѣкового спора за первенство въ славянскомъ мирѣ между Москвой и Варшавой.

Статусъ, установленный Рижскимъ миромъ, за годъ своего существованія, нѣсколько разъ подвергался опасности быть нарушеннымъ и послужить новымъ поводомъ къ войнѣ.

Годовщина Рижскаго мира показала, что не со стороны Россіи, ни со стороны Польши нѣтъ безусловно необходимыхъ здоровыхъ экономическихъ связей съ оккупированными или частями этнографической Бѣлорусской территоріи:

Россія располагая (какъ абсолютно такъ и относительно) гораздо большими естественными богатствами оставила Бѣлоруссію внѣ сферы своихъ хозяйственныхъ перспективъ и къ тому-же не располагаетъ и не можетъ доставить необходимыхъ кредитовъ для упорядоченія хозяйственно-экономической жизни разоренной Бѣлоруссіи и для строительства водныхъ путей въ Бѣлоруссіи, на территоріи которой сходится верховье почти всѣхъ Восточно-Европейскихъ рѣкъ.

Польша (благодаря предусмотрительности прибалтійскихъ республикъ, уяснившихъ себѣ на примѣрѣ Бѣлоруссіи и Украины непосредственную опасность польскаго имперіализма и подъ давленіемъ разразившагося въ Польшѣ экономическаго кризиса) имѣетъ достаточно фактическихъ данныхъ чтобы понять необоснованность и несбыточность своихъ великодержавныхъ претензій.

Видимо чувствуя непродолжительность своей интервенціи польскія оккупаціонныя власти принялись за безхозяйственное уничтоженіе всего уцѣлѣвшаго еще послѣ міровой войны природнаго богатства Бѣлоруссіи (такъ — вырубка извѣстныхъ бѣлорусскихъ лѣсовъ, согласно польской статистики въ десять разъ привысила хозяйственно допустимую норму).

Игнорируя потребности мѣстнаго разореннаго населенія, оккупаціонныя власти, съ изумительнымъ безсердечіемъ, наблюдаютъ трагедію Бѣлорусскаго Народа, частью вернувшагося къ своимъ пепелищамъ и

вымирающаго семьями отъ голода и эпидемій по окопамъ и землянкамъ оставшимся послѣ міровой войны. Съ нескрываемымъ злорадствомъ польскія статистики, констатируя, что въ «обезлюдѣвшихъ» уѣздахъ, оккупированной ими Бѣлоруссіи количество населенія на квадратный километръ упало съ 45 до 10, предвидятъ увеличеніе земельнаго фонда для польскихъ колонистовъ.

Расположеное по обѣ стороны, установленной Рижскимъ миромъ Польско-Россійской государственной границы, разоренное и обнищавшая за послѣдніе катастрофическіе семь лѣтъ, брошено на произволъ судьбы, бѣлорусское населеніе явится резервомъ, откуда будутъ черпать силы оппозиціонныя, будирующіе элементы съ обоихъ сторонъ новой границы.

Рѣзко проявленная, въ продолженіи всѣй исторіи Польши ~~(начиная отъ Люблинской уніи 1569 года, навязанной Бѣлорусскому Народу Польшей и ею же нарушенной и до настоящаго момента)~~ національная нетерпимость и не передъ чѣмъ не останавлювающаяся насильственная колонизація, въ каждый моментъ, могутъ создать поводъ для активнаго выступленія широкихъ массъ противъ оккупаціонныхъ властей.

Бѣлорусскій Народъ, заплатившій за время государственно-политическаго сотрудничества съ Польшей неисчислимыми человѣческими жертвами и вмѣстѣ съ тѣмъ своею богато развитой культурой и наконецъ — независимостью, наученый горькимъ опытомъ не желаетъ болѣе поддерживать худосочныхъ болѣзненныхъ про[...]леній польскихъ мегаломановъ, — не желаетъ быть звеномъ въ творимыхъ польскими политиками коридорахъ.

Мы полагаемъ, что возможное, объ устраеваемой польскими политиками искуственной политической комбинаціи, экономическія выгоды «умчатся въ вихрѣ коридорныхъ сквозняковъ» — будутъ съѣдены вызываемымъ этими комбинаціями милитаризмомъ, долженствующимъ «демонстрировать хотя-бы провизаричную, проблематическую видимость безопасности государственныхъ границъ[»].

Проведеніе въ жизнь устраеваемаго, по польскому плану, «второго коридора» создалобы единственно-возможное, реальное основаніе и очевидную необходимость для военнаго союза Россіи съ Германіей: ни Русскій ни Германскій Народы никогда не помирились-бы съ тѣмъ, чтобы, за счетъ ихъ труда, содержался и богатѣлъ третій паразитарный и притомъ явно враждебный, искуственно созданный польскими мегаламанами, государственный ортганизмъ.

При первомъ измѣненіи политической ситуаціи въ Европѣ, два вышеупомянутыхъ народа, вооруженной силой, принудятъ ликвидировать стеснительныя искуственно «дренажирующія» ихъ хозяйственное благополучіе, перегородки.

Главную тяжесть, при ликвидаціи «дѣтища» польскихъ имперіалистовъ придется выносить на своихъ плечахъ Бѣлорусскому Народу. — Бѣлорусскій Народъ, «не желаетъ уподобляться тому святому, который самъ вызывалъ чорта для того что-бы затѣмъ его бояться», не можетъ брать на себя отвѣтственность и поддерживать какіе бы то нибыло комбинаціи польскаго имперіализма.

Бѣлорусскій Народъ желаетъ мира и единственную опору этому долгожеланному миру и своему существованію видитъ въ своей государственной самостоятельности и независимости и въ правѣ свободнаго добровольнаго выбора себѣ союзниковъ. — Таковыхъ союзниковъ приготовила бѣлорусскому народу его исторія и экономическая неохбодимость въ лицѣ прибалтійскихъ республикъ: хозяйственно дополняя одинъ другого, этнографическая Бѣлоруссія и Прибалтийскія государства составятъ вполнѣ жизнеспособный и хозяйственно-законченный организмъ, который не будетъ нуждаться ~~(а потому и воздержится)~~ въ томъ, что-бы налагательныя депрессіи на товарообмѣнъ Востока съ Западомъ. ~~какъ это намѣрена продѣлать Польша.~~

Въ политическомъ отношеніи союзъ прибалтійскихъ республикъ со включеніемъ въ его этнографической Бѣлоруссіи даетъ прочное логическое разрѣшеніе вѣковому спору между Москвой и Варшавой за первенство: вышеупомянутый союзъ, практически будетъ представлять изъ себя нейтральный буферный государственно-политическій организмъ, примиряющій интересы активныхъ воинствующихъ государствъ.

Мы просимъ Высокую Конференцію проявить соотвѣтствующее воздѣйствіе для пересмотра Рижскаго мира, въ части, касающейся бѣлорусской сувѣренности и бѣлорусскія государственныя границы.

Просимъ защитить отъ колонизаціи земли бѣлорусскихъ бѣженцевъ, принесшихъ многочисленныя жертвы для общаго блага и обезпечить имъ возвращеніе на родину.

Просимъ возможно скорѣе наложить вэто на расхищеніе оккупаціонными властями природныхъ богатствъ Бѣлоруссіи и обратить реализацію ихъ на возстановленіе культурной и хозяйственно-экономической жизни края и на помощь мѣстнымъ бѣженцамъ, черезъ посредство бѣлорусскихъ благотворительныхъ организацій.

582.1.07:005&r,006,003&r,004&r — мк

3028. Поляки не разрешают белоруссам молиться по белорусски. Пераклад артыкулу з газэты «Laisvė» за 24.11.1921

582.1.36:010 — мк

3029. В Белоруссии // Известия (Масква). №264. 24.11.1921

582.2.59:007 — д

3030. Ліст Тамаша Грыба (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.11.1921

Пану Старшыне Рады Народных Міністраў Б.Н.Р. грамадз. В.Ластоўскаму.

Ваша Дастойнасьць!

Згодна ўчарашняй нашай гутаркі у справе меморандуму ад Ураду Б.Н.Р. на Вашынгтонскую Конфэрэнцыю — вы сказалі, што паставіця ў парадак дзённы бліжэйшага сходу Р.Н.М. каб падробна абгаварыць гэту справу.

Сёньнекаж — Вы заяўляіця, што меморандум ужо разасланы і што няма патрэбнасьці склікаць Р.Н.М.

Меморандум можна будзе давясьці толькі да ведама Р.Н.М.

От-жа на колькі мне ведама, меморандум яшчэ не разасланы, а прыймаючы пад увагу нашу папярэднюю гутарку, што меморандум выклікае шмат пунктаў супярэчнасьці — я катэгарычна прашу і настаіваю склікаць сход Р.Н.М. каб абгаварыць падробна зьмест меморандума і ўжо са згоды Р.Н.М. пасылаць яго на Вашынгтонскую конфэрэнцыю.

Тамаш Грыб
міністр унутраных спраў
і прапаганды Б.Н.Р.

25/XI-21.

582.1.29:012r-012

3031. Экономический Отдел. Трест «Западнолес» // Правда (Масква). №267. 26.11.1921

582.2.59:038 — д

3032. Товарообмен в Витебской губернии // Правда (Масква). №279. 29.11.1921

582.2.59:010 — д

3033. Справаздача Самуіла Жытлоўскага (Бэрлін) доктару Юліусу Сімону (Лёндан) аб становішчы жыдоў ва Ўсходняй Эўропе й асабліва ў Беларусі за 30.11.1921

582.1.26:011-020 — мк
582.1.26:021-030 — мк

Аб палітычным і эканамічным становішчы жыдоў у Беларусі і аб неабходнасьці выдзяленьня сродкаў на супрацьпагромную дзейнасьць.

3034. Массовый митинг протеста белороссов в Чикаго // Новое Русское Слово (Нью-Ёрк). №3231. 30.11.1921

582.2.59:021 — д

Мітынг адбыўся 19.11.1921.

3035. Праект дадатковага пагадненьня да дагавору ад 11.11.1920 паміж Літвой і Беларусяй аб пашпартох для грамадзянаў Беларускай Народнай Рэспублікі, якія паходзяць з тэрыторыі, што знаходзіцца паводле Рыскага дагавору пад часовай польскай акупацыяй

582.1.15:351-353 — мк

Дата невядомая.

3036. Селянская Доля. №5. Сьнежань 1921. Год I

582.1.15:190&r-197&r — д

У нумары пералічаныя агітацыйныя брашуры-выданьні Сувязі Беларускага Працоўнага Сялянства: 1) Народны прыгавар; 2) Расейска-Польскі баль і беларускае пахмельле; 3) Вышэй галаву, беларускі селянін; 4) Ад мора да мора; 5) Чаму-ж ты маўчыш, кабета сялянская? 6) Чаму-ж усыхаюць кветачкі польскія на гною беларуска-літоўскім? (вершам); 7) Зямлі беларускаму селянству! 8) Селянская

Доля (вершам); 9) Хто вінават? 10) Стыдна маўчаць і чакаць; 11) Наша крыўда; 12) Спэкулянты Беларускай душой; 13) Чаго чакаць беларусам ад Польшчы?

3037. Чарнавік Вацлава Ластоўскага «сьпісу выдаткаў на звозчыка пры развозцы дакумэнтаў»

Адрасаты: Прэзыдэнту, Грыніусу, Міністэрства загранічных спраў, Сьметоне

582.1.15:345

Дата й абставіны невядомыя.

3038. Паведамленьні Беларускага Прэс-Бюро з Варшавы

Улучшеніе русско-польскихъ взаимоотношеній. — Дюпонъ въ Варшаве. — Польша какъ свободная дорога для коммунизма. — Данцигъ, «этотъ автономный польскій округъ»

582.1.15:316

Дата невядомая.

3039. Запіска невядомай асобы

Panu Łastowskiemu Serdeczne pozdrowienia Strasznie go lubię a już życie nasze komuną nigdy nie wyjdzie mi z pamięci najpzyjemniejszy moment był ten, kiedy Pan Łastowski leżał przed palącym się piecem między babami i uświadamiał nas anegdotkami Ucałuj Ty go za to

582.1.15:307&r

Дата й абставіны невядомыя. Магчыма, згадваюцца часы супольна пражытыя ў Рызе.

3040. Вольны Сьцяг (Менск). №6(8). 12.1921

[З артыкуламі:] N. Нашы старажытнасьці; Беларускае нацыянальнае пытаньне і камуністычная партыя (Тэзісы).

582.1.69:002&r-005&r

3041. В Белоруссии (Беседа с председателем СНК Белоруссии тов. Вайнштейном) // Экономическая Жизнь (Масква). №270. 1.12.1921

582.2.59:024 — д

3042. Рэзалюцыя Камітэту загранічнай групы Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў у справе выбараў у Віленскі Сойм (Сойм «Сярэдняй Літвы») 2.12.1921

582.1.41:030-036 — мк

3043. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага Міністру [Абароны? Замежных Справаў? Прэм'ер-Міністру?] Літоўскай Рэспублікі

Сэкрэтна.

Пане Міністру!

5.XII.1921. Згодна з заявай даведзенай мне б. Міністрам Прэзыдэнтам грам. Грыніусам у прысутнасьці Вайсковага Міністра грам. Шымкуса, Мі-

ністра Закардонных Спраў грам. Пурыцкага, Міністра Беларускіх Спраў грам. Семашко і Дырэктара Усходняй Камісыі грам. Жэмайціса што Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі прапануецца: 1) прыняць удзел у беларусізацы рэарганізацыі і папаўненьні Беларускага Батальёну;

2) прыняць удзел у вэрбаваньні жывых сіл для стрэлецкіх арганізацый

На аснове вышэй азначаных прапаноў маю гонар давясьці да Вашага ведама ніжэйпісанае[1]

582.1.40:060&r

[1] Далей — тэкст Дакладной запіскі?

3044. Дакладная запіска ў справе рэарганізацыі Беларускага Батальёна, адрэдагаваная В.Ластоўскім

582.1.40:061&r
582.1.40:056 — чарнавік праекту
582.1.40:055 — чарнавік праекту

Дата невядомая.

3045. Праект умовы паміж «Беларускім Стралецтвам» і «Літоўскім Стралецтвам»

582.1.40:054&r — мк

Дата невядомая.

3046. Выпіска з пратаколу сходу Прэзыдыюму Рады Народных Міністраў БНР за 6.12.1921

ВЫПІСКА ПРАТАКОЛУ СХОДУ
Прэзыдыума Рады Народных Міністраў
Беларускай Народнай Рэспублікі 6.XII.1921 году.

Слухалі: Аб сазыве Сойму Срадковай Літвы.

Пастанавілі: Дзеля таго, што тэрыторыя так званай Срадковай Літвы штучна выразана з цэлага краю і не становіць ні эканамічнага, ні палітычнага самаістага арганізму, што выбары ў Сойм маюць адбывацца пад польскай акупацыяй і пад прэсыяй акупацыйных ўлад, што актыўныя беларускія сілы загнаны акупацыйнымі ўладамі Сярэдняй Літвы ў турмы, канцэнтрацыйныя лагеры і ў эміграцыю, а астаўшыяся на мейсцы тэрорызаваны — выбары у Віленскі Сойм актыўна байкатаваць.

З арыгіналам згодна: В...
582.1.15:350 — мк

3047. Адозва Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі «Да Усіх» у справе скліканьня польскімі акупацыйнымі ўладамі выбараў у Віленскі Сойм

582.1.15:303&r-304 — мк

Дата невядомая.

3048. Рэзалюцыя Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі ў справе скліканьня польскімі акупацыйнымі ўладамі выбараў у Віленскі Сойм

582.1.15:304r — мк

Дата невядомая.

3049. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.12.1921

Высокапаважаны Пане Старшыня!

Настоящим имѣю честь довести до Вашего свѣдѣнія о слѣдующем:

1. Визу в Лондон до сих пор не получили, но надѣюсь, что на этих днях мы ее всетаки получим и мы с д-ром Анекштейном поѣдем. Вся нужная предварительная работа, как переписка с нужными общественными дѣятелями мною продѣлана. Я им послал цѣлый ряд докладов, в которых достаточно ясно очерчена Бѣларуско-Еврейская проблема.

2. И здѣсь в Берлинѣ я вошел в контакт с «Союзом Русских евреев в Берлинѣ»; этот союз совершенно не был освѣдомлен о Бѣлорусском вопросѣ. Для нѣмецких евреев этот вопрос тоже terra incognita. Приходится продѣлывать большую общественную работу, чтобы пропагандировать нашу идею. В конечном результатѣ эта работа безусловно даст свои плоды моральные и вмѣстѣ с ними и матеріальные. Нельзя строго осуждать евреев, которые при настоящей ситуаціи не подходят к нашему дѣлу, так как они до сих пор совершенно не ознакомлены с нашей идеей. Для привлеченія еврейских масс до сих пор ничего не было сдѣлано. С моим вступленіем в Кабинет только началась работа, которая одному человѣку и без средств не под силу. Но я с чувством удовлетворенія могу сказать, что я наше дѣло среди еврейства сдвинул с мертвой точки и чѣм дальше, тѣм путь будет шире и наша идея, как справедливая и жизненная, сама уже будет привлекать к себѣ массы. Нужно только немного терпѣнія и побольше довѣрія к своим товарищам по тернистому пути.

Я подошел к дѣлу не ради славы и матеріальной корысти, которых, как Вы знаете, я не имѣю, и нѣт той силы, которая могла-бы меня оторвать от нашего святого дѣла, которому отдаю всѣ мои силы и все мое время. Но я очень сожалѣю о том несочувствіи, которое замѣчаю среди нѣкоторых наших товарищей, которые по близорукости своей не понимают, что для нашего дѣла важнѣе всего моральный успѣх а матеріальный за ним придет вслѣд сам-собою. Я в это твердо вѣрю и по этому пути иду и не намѣрен сворачивать.

Прошу примите, Пане Старшыня,
увѣреніе в моих чувствах глубокого
уваженія и искренней преданности
Ваш С.Жытлоўскі

Берлин-Шарлотенб.
8 Декабря 1921.
582.1.15:313&r-314

3050. Паштоўка Пятра Крэчэўскага (Прага) Васілю Захарку (Коўна) за 11.12.1921

11.XII.21

Дарагі Базыль! Тэлеграму атрымаў, але адказываю адкрыткай, бо кожная карона на рахунку. Зняцца мне зараз трудна, калі буду мець толькі на падарож, бо ужо аброс даўгамі з гаспадынямі, крамкамі і добрымі знаемымі — і разумеецца выехаць не разлічыўшысь ніякім чынам не магу.

Калі маеце чым трохі дапамагчы, то зрабіце, бо усе ж такі трудно два разы у тыдзень абедаць і разлічываць па загранічнаму кожны галер. Ведаю, што мучыцесь і Вы там, але і мне не лягчэй паміж чужымі людзьмі.

Працы маю досыць. Саюз ужо стварылі народаў Усходняй Эўропы — цяпер вядзем дыспуты па нацыянальнаму пытаньню публічные. Апошні дыспут будзе у середу, а у панядзелак дыспут, чы магчыма згода з бальшевікамі. Наша ідэя Саюза народаў Усходняй Эуропы ужо прасачываецца у чэскае грамадзянства і за граніцу.

Хоць галодны, але бодрасьці духу не трачу і увесь час таўкусь паміж усімі групамі і партыямі.

Хутко с праф. Ляцкім устроім беларускую лекцыю, ен літэратурную, я гістарычную частку — Ляцкі зусім пераходзіць на наш бок. Рыхтуем прыхільнікаў чэскіх і украінскіх прафэсароў. Ніхай Цвікевіч прывязе мне хоць боты, бо ужо босы хаджу, а калі можна, то і другіе рэчы.

Твой Петра.

582.1.15:311&r

3051. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.12.1921

Вельмі прашу Урад Б.Н.Р. высылаць мне грошы хоць на садзержане Канцэлярыі, бо як за канцылярскіе матэріалы, так і за пачтовыя і тэлеграфные расходы я не у сілах сам плаціць. Часам самая пільная праца тармозіцца. Акром таго ужо дауно студэнт Гладкі падау мне счот на 308 карон, якіе ен расходавау з сваіх у часе Конферэнціі у Празе (пакупка газэт і г.д.). Ен кожны дзень бегае ка мне за гэтымі грашыма, бо сам галее бяз грошай. Так сама художнік Суслоу прыхадзіу ка мне нескалькі разоу за грашыма за адрес презыдэнту Масарыку. Ен угражае, што падасьць у суд і апублікуе у газеце. Вось гэтыя патрэбы трэба як найхутчэй заспакоіць.

Прага 11 XII 21. М.Вершынін.

582.1.15:312&r

3052. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.12.1921

Прага 11 XII 21

Варшаускі радіо-телеграф разнес сягоньня па сьвету ніжэйпадаваемую абвестку:

Варшава. Радіо 11 XII 21:

«Центральный комитетъ Бѣлорусскаго Національнаго союза въ Вильнѣ призываетъ всѣхъ бѣлорусовъ къ поголовному участью въ предстоящихъ выборахъ, чтобы такимъ образомъ проявить свою волю соединенія съ Польшей. Подобное заявленіе было подано и отъ партіи бѣлорусскихъ сельскихъ хозяевъ».-

Парадзіуся з Петро мы пакуль што удзержаліся ад дэмэнтаваня гэтых абвестак, хоць і лічым іх правакаціею. Гэта работа пэуна Алексюка і польскіх паноу «сельскіх хозяеу». Вы там бліжэй стаіце к справе і будзеце усе лепей ведаць. Калі будзеце дэмэнтаваць, то проста пашліце ад себе аправержене въ гэтакія газэты у Празе: «Prager-Presse», Jungmanová 21, «Tribuna» Karlovo nám. 15, «Čas» Mala Štepanská 11, «Narodní Listy» Marianska 3, «Pravo Lidu» Hybernska 17, «Venkov» Hybernská 20.-

Апроч таго газэты пішуць, што мін. Росзенбаум, які недауна вернуўся з Варшавы у Коуну, заявіу журналістам, што сваею паездкаю ен даволен і што зараз паедуць літоўскіе дэпутаты у Варшаву каб ака[н]чацельна дагаварыцца на счот Віленщыны.-

Разам з гэтым калі можна зьвярніце увагу каго трэба на тое што бюлэтні Вашаго Прес-бюро і другія лісты з Коуны з пачатку пападаюць у Маскву, а потым праз месяц прыходзяць у Прагу. Ці не лепей былоб важныя справы пасылаць заказнымі? Бо калі гэтак будзе рабіцца далей, то лепей з Коуны нічога не пісаць. Калі Вы не пэуны у гэтым то дайце, то дайце мне телеграмму толькі з адным словам «dementujcie» і я адсюль аправергну польскую правакацію.

Ваш Мікола.

582.1.15:308&r

3053. Заява Аляксандра Вальковіча сакратару Дыпляматычнага Прадстаўніцтва БНР у Літве Янку Чарапуку за 14.12.1921 у справе недастойнага выпаду, дапушчанага Я.Чарапуком днём раней за гарбатай у гонар II-й гадавіны Ўраду БНР

Сэкрэтна
NB Пільна

Грамадзяніну Сэкрэтару Дыплематычнага Прэдстаўніцтва
Беларускай Народнай Рэспублікі у Літве Я.Чэрапуку.

Учора 13 сьнежня 1921 году за гарбатай у памешканьні Прэдстаўніцтва ў звязку з 2й гадаўшчынай істнаваньня Нашага Рэвалюцыйнага Ураду, на якой быў прысутны увесь Урад і госьці, Вы ў сваёй прамове дазволілі зрабіць недастойны ні толькі як Урадоўца Нашага Ураду, а і як грамадскага дзеяча выпад па адрэсу Ураду: «Трэба міністэрскую лавачку зачыніць».

Вас я у той момант астанавіць ня мог па прычыне таго, што Вы у сваіх мажлі[вых] абеленьях маглі-б еще больш глупств сказаць, абражаючых Урад.

Сеннека я Вам стаўлю афіцыяльнае запытаньне:

а) На якой такой падставе Вы сябе дазволілі абразіць Урад Беларускай Народнай Рэспублікі

б) Чы лічыце Вы, пасля такога выпаду па адрэсу Урада мажлівым для сябе далейшую супольную працу з нашым Урадам.

Аб гэтым прапаную Вам даць мне у дзенны тэрмін адказ, бо за такіе выпады да Ураду ня толькі што 24 гадзіны, але нават і 24 секунд Урадовец ня мог бы астаавацца на пасадзе.

582.1.15:309&r

3054. Заява Францішка Аляхновіча старшыні Рады Народных Міністраў БНР за 14.12.1921

П<ан>у Старшыні
Рады Белар. Народ Міністр.

Заява
Фр.Аляхновіча

Дзеля таго што мае злошчасныя ковенскія прыгоды[1] ўжо, як я чуў, ведамы ў Вільні, я баюся, кап гэта ня мела ўплыву на нармальны выхад «Беларускага Звону», тым больш, што мною не былі зроблены патрэбныя зьвязаныя з маім выездам фармальнасьці (я спадзяваўся хутка вярнуцца).

Дзеля таго што мне дорага істнаваньне часопісі, якую я заснаваў, і важны на мой пагляд той палітычны напрамак, па якому ідзе «Белар. Звон», маю гонар прасіць у імя грамадзкае справы, каб мне была дадзена магчымасьць выезду з Коўны туды, гдзе друкуецца часопісь з маім подпісам, каб не было перарыву ў яе выхадзе.

14/XII 921 ФрАляхновіч

582.1.15:310

[1] Ф.Аляхновіч прыехаў у Коўна, дзе быў арыштаваны як польскі шпіён. Празь некалькі дзён выпушчаны, 23.12.1921 пехатою вярнуўся ў Вільню.

3055. Урадовая дэклярацыя ў справе аб Віленскім Сойме, абвешчаная прэм'ер-міністрам Казісам Грынюсам ва Ўстаноўчым Сойме Літоўскай Рэспублікі 17.12.1921

582.1.46:063 — д
582.1.46:064 — д
582.1.46:065 — д
582.1.46:066 — д
582.1.46:067 — д
582.1.46:068 — д
582.1.46:069 — д
582.1.46:070 — д
582.1.46:071 — д
582.1.46:072 — д

З пратэстам у справе выбараў у Віленскі Сойм, якія маюць адбыцца 8.01.1922. У дэклярацыі сярод іншага гаворыцца: «Беларускі народ, з якім літоўцы мірна жылі сотні гадоў, можа быць пераконаны, што ў Літоўскай Рэспубліцы будуць абаронены яго мова, культура і рэлігія. Пад абаронай Гаспадарства пытаньні гэтыя будуць застаўлены ў веданьні культурна-аўтаномных устаноў. Заселяная беларусамі і іх потам палітая зямля дастанецца ім самім, а не чужацкім каланістам [...]»

3056. Рэзалюцыя па дакладу т. Вайнштэйна аб адраджэньні прамысловасьці Беларусі // Савецкая Беларусь (Менск). №283. 17.12.1921

582.2.59:020 — д

3057. Запрашэньне Міністра Аховы Краю Літоўскай Рэспублікі Вацлаву Ластоўскаму на ўрачыстасьці з нагоды 3-й гадавіны Літоўскага Войска, якія маюць адбыцца 18.12.1921

582.1.15:136

3058. Ліст Пятра Крэчэўскага (Прага) «дарагім таварышам [Ластоўскаму? Цьвікевічу? Захарку?]» (Коўна) за 21.12.1921

21.XII.21.
Прага

Дарагіе таварышчы!

Чэкаю, не дачэкаюсь ад Вас пэўнай інфармацыі, дзякуючы чаму і сам не разварачываю працы у Празе так як яе тут можна было б развярнуць — усе ж такі Прага цэнтр усей Эуропэйскай палітыкі. Калі б можна было б выпусціць хоць прэс-бюро і то добра было б, але што зробіш калі ні машынкі, ні паперы, нічога нема.

Самі з дзяцкай[1] і з сямьямі абедаем толькі раз у тыдзень, а часамі і таго німа, дзе ж ужо тут думаць аб чым небудзь.

Тое, што я пісаў у адкрыццы, я зусім не хацеў зрабіць які небудзь непалітычны крок, а пісаў знарок каб чыталі і Літвіны, у якіе цяжкіе варункі яны нас ставяць, чым разумеецца слабых могуць пхнуць зусім не туды, куды ім хочацца.

Аб Амэрыцы я нічога пэунаго не магу сказаць, бо не ведаю як гэта зрабіць бэз грошэй. Калі у Вас не хапае грошэй, каб прыслаць нам на абед, то як можна думаць аб Амэрыцы.

Я думаў к святам Вы хоць трошкі нам падашлеце — аджыць, але бачу, што з гэтаго мусі нічога не будзе. Зараз каб нас усіх забіць разам трое Вершыніных і нас трое, то не знойдзеш па дзесяць галераў на душу — ходзім і паветра нюхаем.

Цяжка, надзвычайна цяжка!

Рад, што Вольная Литва зноў пачала выходзіць, дайце яму[2] інфармацыю і статут Саюзу народаў Усхода Эуропы, хай ен зоймецца гэтай справай.

Аб пастановах Вил. Камітэту і Вашым ужо надрукавалі у чэскіх газэтах «Trybuna», хутко будзе у Голасі Расеі.

Заутра будзе па Віленскаму пытаньню вынесена рэзалюцыя Саюзу народаў Усходняй Эуропы, думаю змест хутка Вам прыслаць.

Будзце здаровы.

Падашліце колькі можэце.

Зпашанай Петра.

582.1.15:315&r

[1] М.Вяршыніным. [2] Рэдактару «Вольной Литвы» Я.Варонку.

3059. Запіска Янкі Чарапука Вацлаву Ластоўскаму («п. Старшыні») за 21.12.1921

Паседжаньне у Усх. камісіі не адбудзецца

582.1.15:132

3060. С.Михеевичъ. Почему не надо идти въ Виленскій Сеймъ? // Вольная Литва (Коўна). №101. 22.12.1921
582.2.59:017 — д

3061. Виленскій вопрос. Выборная комедія // Голос Россіи (Бэрлін). №848. 24.12.1921
582.2.59:002 — д

3062. Biełaruskaja Krynica (Adnadnieŭka). Wilnia. 25.12.1921
Pastanowa Biełaruskaha Narodnaha Kamitetu ŭ sprawie niaŭdziełu ŭ wybarach u Wilenski Sojm (Sojm «Siaredniaj Litwy»). — Alaksiukoŭski zdradnicki zjezd (11 i 12.12.1921)
582.1.15:164&r-166&r — д
582.1.15:167&r-170&r — д

3063. Пастанова Беларускага Народнага Камітэту ў справе выбараў у Віленскі Сойм
582.1.15:305-306 — мк

Дата невядомая. Машынапіс — перадрук з «Krynicy».

3064. Голас Праўды (Аднаднеўка). Аўторак 27.12.1921. Вільня, Палтаўская, 13-6
582.1.15:171&r-172&r — д

3065. Ліст Місіі БНР у Бэрліне міністру вайсковых справаў Літвы праф. Ёнасу Шымкусу за 28.12.1921 (вых. №542) з просьбай забясьпечыць праезд зь Нямеччыны ў Літву беларускіх вайскоўцаў для службы ў Беларускім Батальёне
582.1.15:355

3066. Ліст Місіі БНР у Бэрліне Місіі БНР у Коўне за 28.12.1921 (вых. №543) з просьбай перадаць міністру вайсковых справаў Літвы праф. Ёнасу Шымкусу ліст у справе забясьпечэньня праезду зь Нямеччыны ў Літву беларускіх вайскоўцаў для службы ў Беларускім Батальёне
582.1.15:354

3067. Раковскій Григорій. Парижскіе митинги по національному вопросу // Голос Россіи (Бэрлін). №850. 28.12.1921
582.2.59:001 — д

3068. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.12.1921

Высокоповажанный Пане Старшыня,

Настоящим имѣю честь поздравить Вас с наступающим Новым годом и пожелать Вам лично счастья, здоровья и всего лучшаго а нашему Святому дѣлу скорѣйшаго приближенія к своей завѣтной цѣли.

Я здѣсь работаю что́ могу и как могу. Вступил в контакт с союзом Русских евреев в Берлинѣ. Имѣл с ними два засѣданія, прочел им доклад о Бѣлоруси и о еврейской проблемѣ на Бѣларуси.

В Лондон еще не езжу из за визы. Видѣл проѣздом через Берлин президента всемірной сіонистической организаціи профессора Х.Вейцмана. Условились, что на обратном пути остановится в Берлинѣ в первых числах Января спеціально для переговоров со мною. Он мнѣ поможет в полученіи визы для проѣзда в Лондон, с ним мы выработаем дальнѣйшую тактику общих совмѣстных дѣйствій в нашем дѣлѣ. Если сіонисты искренно и честно пойдут с нами, то и мы честно будем с ними работать. Если-же они откажутся нам помочь, то я ни минуты не задумаюсь отстать от них и начинать самостоятельную акцію, если даже таковая временно пойдет и против их тактики.

До тѣх пор, покуда я не убѣждусь, что я для нашего дѣла ничего сдѣлать не могу, я от его ни за что не отойду. Но я еще надежды не теряю. Приходится таранить много стѣн, и самая твердая стѣна — это еврейская.-

Мои личныя дѣла очень печальны. Моих грошей я еще до сих пор не получил. Все задерживают. Жалованья я, как Вам извѣстно, с 15го Іюля не получал. Да еслиб я его и получил, то его хватает только на оплату за квартиру, и при существующей дороговизнѣ с моей большей семьей мнѣ очень и очень тяжело. Но я всетаки никаким иным дѣлом не считаю возможым заниматься и терплю до лучших дней, в которые вмѣстѣ с Вами глубоко вѣрю.

Прошу, напишите хоть пару слов для бодрости.

Примите, поважанный Пане Старшыня, мои увѣренія в искреннем уваженіи и глубокой преданности.

С.Жытлоўскі.

Berlin, Charltb.
Waitzst N28.
29 Декабря 1921.
582.1.15:346&r-347

3069. І[осифъ] В[оронко]. Общій праздникъ // Вольная Литва (Коўна). №102. 29.12.1921
582.2.59:016 — д

3070. Канвэрт зь візытоўкамі
[На канвэрце:]
Ponui Lastauskui B.T.R. Ministeriui-Pirmininkui.
(D-ras M.Soloveičikas. Žydų Reikalų Ministeris. Kaunas).
זיין עקסעלענץ ה מיניסטר לאסטאווסקי

[У канвэрце:]
а) Візытоўка капітана Гірдвайніса
Capitaine Ghirdvaïnis
Attaché au Ministère des Affaires Étrangères de Lithuanie.
[З тэкстам:]
Присылаетъ 4 билета. Имѣетъ честь присовокупить: плата при входѣ съ мужчинъ 100 м., съ дамъ - 50 м. 23.12.21

б) Візытоўка Казіса Грынюса

Dr. K.Grinius
Lietuvos Respublikos Ministeris Pirmininkas

в) Візытоўка Івана Антонава

Іван Грыгоравіч Антонаў
[Тэкст на адвароце:]
З Новым Годам 1922!

г) Візытоўка Алены й Анатоля Рэшкаў

Елена Михайловна
и Анатолій Николаевичъ Решко

д) ВізытоўкаАнатоля Рэшкі

Анатолій Николаевичъ Решко

Што датычэ Суслова, то прашу п. Вершыніна зайсці да яго і сказаць каб ен лішне не гарачыўся, бо толькі дарэмна псуе сабе здароўе. Найперш заказ на адрэс ён дастаў не ад мяне асабіста, а ад Конфэрэнцыі дык усе яго пагрозы могуць аказацца дарэмны. Па другое адрэс быў заказаны на тэрмін да выезду прэзыдыуму Конфэрэнцыі і ён на азначаны тэрмін заказу не выпоўніў. Сягоньня яго адрэс ужо не актуальны. Я у марцы буду у Празе дык калі работа будзе адпаведаць пастаўленым вымогам (скарыноўскі шрыфт і др.) магу заказ прыняць. А калі яму хутчэй патрэбны грошы, ніхай заказ вышле почтай. Ката у мяшку не купляюць і калі ён нам ня верыць і ня хочэ выслаць работы, то і мы яму такое-ж маем права ня верыць і не высылаць грошы.

582.1.15:061

Дакладная дата невядомая.

3122. Chwila historyczna. Улётка Związku Obrony Woli Ludności należenia do Polski

582.1.40:025 — д

Улётка прысьвечаная ўхвале Віленскага Сойму аб прыналежнасьці Вільні й краю да Польшчы за 20 лютага 1922 году.

3123. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ за 22.02.1922 (№17)

Совѣтская Бѣлоруссія. — Результаты безсистемнаго хозяйства. — Дѣло православной церкви въ Бѣлоруссіи. — Украинская демонстрація противъ Польши въ Вашингтонѣ

582.1.15:070
582.1.15:071
582.1.15:072

3124. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) в.а. міністра фінансаў БНР Аляксандру Вальковічу (Коўна) за 22.02.1922

Яго Дастойнасьці
Выпаўняючаму Абавязкі Міністра Фінансаў
грам. Вальковічу

Дзеля таго, што многаразовыя мае вустныя Вам заявы аб тым, каб усе паступаючыя у Дзержаўны Скарб грошы унасіліся у банк на бягучы рахунак Ураду, усе яшчэ, дагэтуль, не выпаўняюцца — зьвертаюся да Вас с катэгорычным вымаганьнем:

Каб з гэтай даты абавязкова усе паступаючыя суммы: з тавароў, пазычак, консульскіх і др. даходаў былі здаваны у банк (Lietuvos Ukio Bankas

№1103) на бягучы рахунак па ордэру заверанаму Дзержаўным Кантралерам і контр-асыгнаванаму Дзержаўным Скарбнікам.

Выдаткаваньне сумм паміма Дзержаўнага Скарбу і не прайшоўшых праз Дзержаўнага Кантралера і Дзержаўнага Скарбніка, будзе мной разгледацца як надужыцьце па службе. Так сама будуць мной разглядацца і ўсе зробленыя кім-бы-то ні было пазычкі ад імені Ураду, бяз контр-асыгнацый Дзержаўнага Кантралера і Дзержаўнага Скарбніка.

Разам з гэтым прашу Вас не пазьней першага марца бягучага году здаць мне, рахункова закончаную, кассовую кнігу за мінуўшы 1921 год і представіць, дзеля кантроля касовую кнігу за бягучы год.

Ластоўскі

582.1.40:027&r

3125. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Эйдткунэн, па дарозе з Коўна ў Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 24.02.1922

Паважаны Вацл. Юстынавіч!

Плацкарту, дзякуй Богу, атрымаў. Думаю, што пакуль не сустрэнемся за сталом — офіціально, ад [...]дата Т.Г<рыба> трэба устрымацца. Трэба быць лепш асьцярожным, і пачакаць — чым-сь адразу сапсаваць усю будучыну. Калі можна будзе сурьезна сустрэнуцца — дайце тэлеграму.

Хутчэй адпраўляйце А.А.<Бароўскага?> . Памажэце грашыма А.Кузьм. <Дзьмітрыеву?>. Не забудзьце — карту пры меморандуме (у канец!), № і г.д.

Напішыце ліста Шебедеву, што мы будзем рады — калі ён паможэ нам. Ляцкі згадзіўся. Цікава, што канец пісьма ён напісаў па беларуску і добра.

АЦ

582.1.15:067

3126. Гр. Ц-н. Голод, Голод... // Звезда (Менск). №47(1048). 24.02.1922

582.1.40:093

3127. Запрашэньне Вацлаву Ластоўскаму і Станіславе Ластоўскай на маскаваны баль, які мае адбыцца ў Літоўскім Клюбе 25.02.1922

582.1.15:060

582.1.15:059

«Įeinant svečiai paliekia à discretion šius kvietimus ir įmoka vyrai 50 a[uksinų], maskos gi ir Ponios 25 a[uksinus]».

3128. Ліст Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.02.1922

Паважаны п. Ластоўскі

Прашу выбачыць, што выкарыстваю вашу веду, але да каго ж я зьвярнусь? Пачаў сурьёзна пісаць слоўнік — пераважна для сябе, але Бог дасьць з часам можа ён «падрасьце» і калі-небудзь можна будзе і выдаць першую спробу вялікага слоўніка.

Просьба такая: буду перыадычна пасылаць вам лісткі з словамі — на якія будзьце ласкавы рабіць усе патрэбныя папраўкі, націскі і г. д. Прысылайце мне і я буду ужо начыста перапісываць згодна вашым папраўкам. У ход пайшоў ваш той слоўнік і хацелася бы, каб вы як-небудзь пераслалі выданны у Вільні — маленькі такі[1]. Я бачыў яго у вас. Трэба ж рабіць, хай на яго ліха! Вам, я ведаю, часу няма, а так — я буду вясьці ўсю чорную працу, а вы рэдакцыйную.

Яшчэ раз прашу выбачыць за турботу, але іншае рады няма. У гэтым слоўніку будзе блізка 30.000 слоў. Для спробы, думаю, гэтага будзе даволі.

Тыя словы — што нельга ператлумачыць адным словам — пішыце сэнс двума-трыма словамі па-беларускі. — Ужо будзе падмога — для будучыны. Як бы там ні было, а слоўнік патрэбен — асабліва для перакладаў. У канцы — я думаю зрабіць аддзел спэцыяльна навуковых і тэхнічных тэрмінаў (а можа і чужаземных слоў). Памагіце мне у цяжкай і не па маім слабым сілам працы.

А прыйдзе час — і я думаю хутка — мы надрукуем першы «солідны» слоўнік пад вашай рэдакцыяй. Прынаймсь «будзе што ў рукі узяць», як кажуць!

I-шая пасылаемая частка — літара А (4 стр.).
Дабаўце, калі трэба яшчэ словы, якіх няма тут.
Літару Б высылаю праз пару дзён.
Ці атрымалі кнігу «Ратча»?
Пішыце, калі будзе час.
Усяго найлепшага.
Ваш І.Цвік.
25/II 22. Бэрлін.
582.1.15:090&r

[1] Братоў Гарэцкіх (2-е выданьне, Вільня, 1920).

3129. Запрашэньне Вацлаву Ластоўскаму на five o'clock tea, якія маюць адбывацца кожнага аўторку ў залі Літоўскага Клюбу а 5 гадз. увечары

582.1.15:006

Дата невядомая. Ад імя Арганізацыйнае Камісіі запрашэньне падпісалі D.Sleževičienė, M.Balutienė, B.Klimienė.

3130. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ за 27.02.1922 (№18)

Восточная Галиція и Польша. — Рижскій миръ будетъ пересмотренъ. — Французско-большевитское сближеніе и Польша

582.1.15:073
582.1.15:074
582.1.15:087

3131. Ліст Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.02.1922

27/II
Бэрлін

п. п. Ластоўскі.

Пасылаю літару Б (ад 5 да 24 стр.) Ад брата даведаўся, што вы якраз заняты гэтай жа самай працай.

Калі па-вашаму пачатая мною праца дарэмна і робіцца ня так як трэба дык напішыце і я спынюсь.

Думаю толькі, што варункі там у вас ня вельмі спрыяюць, каб вы доўгі час маглі сістэматычна вясьці працу і трудна вам будзе скончыць, калі чарнавую працу ніхто ня будзе рабіць.

Як вы лічыце? Напішыце, калі ласка. Мяне адно важна — каб гэта праца не стаяла, бо славянская жылка — «авось да небось» ёсьць на жаль і у нас. А годы мінаюць і мова [к]руціцца з шчупленькім лексіконам. Значыцца — пакуль што далей пасылаць ня буду — аж атрымаю ад вас адказ.

Потым, будзьце ласкавы, перадайце Лявону[1]: брат тк і ня ўзяў рукапісы, што пакінуў Будзька і якія патрэбны тутка для друку; няхай, Лявон — запакуе іх і аддасьць с першым з нашых, хто паедзе у Бэрлін. Справа надта сьпешная. Або ў крайнім выпадку — няхай часткамі перашле на мой адрэс ці міссіі — заказн. бадэрольлю усе рукапісы, што у яго ёсьць.

Расходы Цішка вернець зараз-жа.

Паклон жонцэ і усім.

Ваш І.Цвік

Чакаю весткі.

582.1.15:010

[1] Зайцу.

3132. Мэмарандум Ураду БНР на канфэрэнцыі дзяржаваў у Генуі

Беларуская
Народная Рэспубліка

Конфэрэнцыі Дзержаў у Генуі.

Праблема адбудаваньня нормальнага эканомічнага жыцьця Эўропы натыкаецца на галоўную перашкоду — праблему палітычнага упарадкаваньня Усходу Эўропы.

У свой чарод, праблема упарадкаваньня палітычнага статуса на Усходзе Эўропы у свой чарод натыкаецца на галоўнае пытаньня — аб расійска-польскіх ўзаемаадносінах.

Гісторыя польска-расійскіх адносін ад першых крокаў дзержаўнага істнаваньня Расіі і Польшчы сьведчыць, што гэтыя адносіны арганічна варожыя. Польшча пачувала сябе супакойна толькі у тыя пэрыоды, калі падупадала значэньня Расіі, і, наадварот, Расія пачувала сябе супакойна, калі ей надаралася абмежаць дзержаўную сілу Польшчы. Наагул можна сцьвердзіць, што гісторыя польска-расійскіх адносін ў мінулым — гэта гісторыя безупыннага змаганьня паміж Масквой і Варшавай.

Той самы малюнак заўважаецца і ў цяперашні час: як толькі Польшча паднялася з попелу небыцьця, то на другі-ж дзень пачалася вайна яе з Савецкай Расіяй.

Як сьведчыць гісторыя, змаганьне паміж Польшчай і Расіяй пачалося і дагэтуль трывае за абладаньне Беларусьсю (і адначасна заходнай часці Украінскага абшару). Маскоўска-польскія войны за абладаньне Беларусьсю пачаліся з 1501 году (паход цара Іоана III Васільевіча) і цягнуліся да 1667 г. (Андрусаўскі мір). За гэты 150 з лішнім гадоў згубнай вайны, Беларусь утраціла сваю незалежнасьць і з красуючага, пышнага сваей культурай (Літоўскі статут) края абярнулася ў крушню руінаў пакрытых лесам. Па Андрусаўскай угодзе Польшча замацавала за сабой Беларусь. Але фактычнага міру Андрусаўскі трактат не ўтварыў: ужо цар Аляксей Міхайлавіч назваўся царом Беларусі, праваслаўныя Беларусы пацягнулі да Масквы. Прэтэнсьі апошняй пачалі узмацовывацца і закончыліся ўключэньнем Беларусі у склад Расіі, шляхам падзелу Польшчы у 1772 году.

Паказаныя гістарычныя факты агульна вядомы і не запярэчны.

Сучасныя нам падзеі лішні раз сьцверджаюць гэты прынцып: змаганьне Польшчы і цяперашняй Савецкай Расіі адбываецца за панаваньне над Беларусьсю. Хоць клічы імпэрыялістычных імкненьняў гэтых дзержаў і перамяніліся, але істота асталася тая самая.

Усе-ж, у цяперашні час адносіны крыху зьмяніліся, дзякуючы двом прычынам:

а) Беларусь у працэссе Рэвалюцыі абусьвядоміла сябе нацыянальна незалежнай адзінкай і ўступіла ў змаганьне як трэйцяя старана за права свайго дзержаўнага самаазначаньня;

б) абедзьве стараны, ні Расія, ні Польшча на гэты раз не аказаліся стасункова на гэтулькі сільнымі, каб захапіць ўсуцэль ўсю тэрыторыю Беларусі.

Адпаведна гэтым двом абасновам, у выніку польска-расійскай вайны вынырнуў абапольны кампраміс: па першае, будучы прымушанымі лічыцца з фактам беларускага нацыянальна-дзержаўнага адраджэньня Расія і Польшча прызналі незалежнасьць Беларусі і, па другоя, памяненыя варагуючыя староны падзялілі паміж сабой тэрыторыю Беларусі.

Не гледзючы на ачавістую супярэчнасць падобнага рашэньня, азначаны кампраміс замацаваны у адным тым самым Рыжскім трактаце.

Дзякуючы Рыжскай угодзе на Беларусі стварылося гэткае палажэньня:

а) Пад націскам беларускага нацыянальна вызвольчага руху Савецкая ўлада у цэнтральнай часьці тэрыторыі Беларусі абвесьціла Беларускую Савецкую Рэспубліку са сталіцай Менскам. Гэтая Савецкая Рэспубліка, абыймаючая пяць паветаў быўшай Менскай губэрні, роўных прыблізна абшару Латвіі, уходзіць у склад Расійскай Савецкай Фэдэратыўнай Рэспублікі і мае толькі тры самаістых міністэрствы (камісарыяты). З прычыны вельмі вялікіх асобнасцяў народнай гаспадаркі Беларусі, Савецкая ўлада не праводзіць у Савецкай Беларусі поўнасьцю сваей камуністычнай праграмы.

б) Усходняя часьць Беларусі — быўшыя губэрні Магілеўская і Вітэбская, а такжа часць Смаленскай, — далучана да Савецкай Расіі.

в) Заходняя Беларусь, лежачая з гэтага боку Рыжскай лініі, да рэк — Прыпяці, Заходняга Бугу і Нарава, акупаваны палякамі.

г) Урэшце часьць тэрыторыі акупавана войскамі генерала Жэлігоўскага.

Само сабой ясна, што тоўпячый ў сабе непрымірымыя супярэчнасьці — Рыжскі трактат, ня можа лічыцца актам, закладаючым асновы міра на ўсходзе Эўропы.

Рыжскі мір падзяліў старонку суцэльную у нацыянальным і эканамічным адношэньнях. Высокачэсныя імкненьня беларускага народу да свайго нацыянальнага адраджэньня прыдушаны воражай вайсковай акупацыяй. Уся Беларусь пастаўлена перад неунікнёнасьцю эканамічнага занепаду і абядненьня, бо збурана натуральная гаспадарчая сувязь яе часьцей. Збурана натуральная, векамі злажыўшаяся сувязь Беларусі з Прыбалтыкай, да якой цяжэ і усходняя Беларусь.

Польшча імкнулася апраўдаць Рыжскі трактат патрэбай злучыць пад сваім дзержаўным кіраўніцтвам каталіцкі элемэнт Усходняй Эўропы. Ды толькі гэткае сярэднявечная імкненьня пярэчыць праўдзе: калі праўда, што большасьць Віленшчыны каталіцкая, то гэтак сама праўда, немаль ўся ўсцяж Горадзеншчына, больш блізкая да Польшчы — праваслаўная.

Фактычна, статус, устаноўленый Рыжскай угодай, замацаваў сабой лінію, на якой здарэньнем спынілося зьвяканьне польска-расійскага аружжа. Рыжскі мір абярнуў гэту лінію у дзержаўную мяжу, даўшы магчымасьць абедзьвем старанам перадыхнуць да таго моманту, калі Рыжская «дзержаўная граніца» ізноў абернецца у тоя, чым яна ёсьць — у лінію польска-расійскага фронту.

Угода, вытвараючая падобнае палажэньне падлягае перагляду і адмене. Будаваць на ей якія колечы пляны будучага было-бы палітычнай неагляднасьцю.

Прызнаньне за Рыжскім трактатам моцы міжнароднага акту было-бы разам з тым аграмаднейшым гвалтам над Беларускім Народам, гвалтам роўным падзелу Польшчы у 1772 гаду.

З падобным гвалтам нацыянальна адраджаючаяся Беларусь ніколі не пагодзіцца. Замест міру — край будзе засуджан на безперапынную глухую барадзьбу з акупацыяй. Народ не спыніць змаганьня датуль, пакуль не даб'ецца свайго вызваленьня і аб'еднаньня.

Імкненьне да міру ня можэ быць рэалізавана шляхам падзелу Беларусі.

II.

У момант упадку расійскага самадзержаўнага ладу і ў той час, калі Польшча ня выступіла ешчэ на політычную арэну, Беларусь арганізавала на сваей зямлі нацыянальную ўладу. Дзержава была утворана у форме Беларускай Дэмакратычнай (Народнай) Рэспублікі з дзержаўным цэнтрам у Менску. На чале кіраўніцтва краем стануў выбарны прадстаўнічы орган — Рада Рэспублікі, пакліканый уцелаісціць Беларускі Устаноўчы Збор. Беларуская Дэмакратычная Рэспубліка атрымала прызнаньне сваіх суседзяў, у тым ліку Рады Рэгенцыйнай Польшчы, і, пазьней, заключыла дзержаўную сувязь з Літоўскай Рэспублікай.

На жаль, незалежнасьці Беларусі ня суджана было праістнаваць больш доўгі час. Няўдоўзе узнавілася гістарычнае змаганьня Масквы і Варшавы. Беларусь распаложаная паміж дзьвема гэтымі краінамі, апынулася спертай з двох бакоў. Змагацца на два фронты было ей ня ўзмогу і яна, пасьля чатырох гадоў эўрапэйскай вайны, паноўна абярнулася ў арэну панаваньня акупацыйных войскаў.

Гэткім чынам вайна лютуе на Беларусі ужо семы год. Гэта звыш сілаў Беларускага Народу. Але калі культурныя дзяржавы сьвету не ўмешаюцца у справы Устока Эўропы і ня прыміруць ў істоце расійска-польскія адносіны — наша бацькаўшчына доўга не збавіцца ад страхоцьцяў разбураньня, голаду і пошасцяў.

Істнаваньню адвечнага змаганьня паміж Расіяй і Польшчай павінен быць учынен канец, прычым Беларусь з аб'екта спрэчак павінна абярнуцца у элемэнт міра паміж імі. Апошняе магчыма толькі апасьля таго, як Высокая Конфэрэнцыя Дзержаў у Генуі прызнае, што прэтэнсыі Сав. Расіі і Польшчы на тэрыторыю сувэрэннага Беларускага Народу не маюць пад сабой ніякіх асноў.

Замірэньне польска-расійскіх адносін магчыма толькі шляхам прызнаньня незалежнасьці Беларусі.

Падобнае прызнаньня апіраецца на сьледуючых асновах:

I. Беларусь выяўляе сабой край з самаістым па сваей нацыянальнасьці жыхарствам, са сваім асобным укладам жыцьця, гісторыі, культуры. Народ беларускі у працэссе змаганьня даказаў сваю здольнасьць да дзержаўнай арганізацыі. Свае змаганьня за вызваленьне Беларусі вядзе і ў цяперашнім часе, аб чым Урад Беларускай Народнай Рэспублікі не раз даводзіў да ведама Эўропы. Той варунак, што беларуская дзержаўнасьць аказалася раздушанай часова пераважаючымі сіламі суседзяў, ня можэ служыць аргумэнтам супроць прызнаньня незалежнасьці Беларусі. Падобнага націску з двох старон ня мог-бы вытрымаць ніводзін народ, пачаўшый дзержаўна арганізавацца на тэрыторыі быўшай расійскай імпэрыі.

II. Беларусь у мінуўшчыне, пачынаючы ад X і да XVII ст., мела ўласную дзержаўнасьць, будучы пад канец ў лучнасьці з Літвой. У той час Беларусь выявіла выключныя творчыя сілы, як у палітычнай, так асабліва у культурнай дзедзіне. Аб гэтым сьведчаць памятнікі яе гісторыі. У тэй або іншай форме Беларусь гатова і цяпер узнавіць быўшую блізасьць да Літвы і Прыбалтыкі.

III. Беларусь, будучы натуральным гінтэрляндам Прыбалтыкі, абладае зусім выстарчаючымі эканамічнымі магчымасьцямі дзеля незалежнага істнаваньня.

Лесавыя багацьця Беларусі (8,9 мільенаў гэктараў, што становіць 71 акр. на душу) змогуць даць беларускаму скарбу зваротныя суммы дзеля адбудоўкі краю. Рэкі Беларусі, маючыя аграмаднае таргова-прамысловая значэньне для ўсей Усходнай Эўропы чакаюць дастасаваньня саліднага капіталу, дзеля выкарыстаньня іх. Торфяныя багацьця Беларусі, маючыя даць краю да 500 мільёнаў пудоў сухога торфу штогодна, паслужаць

разам з белым вугалем крыніцай энэргіі дзеля патрэб транспарта і краёвай прамысловасьці.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі думае, што ні Сав. Расія, ні Польшча ня будуць пратэставаць супроць прызнаньня незалежнасьці Беларусі. Тым больш, што стоючы на прынцыпе прызнаньня права народаў на самаазначаньне, абедзьве памянёныя дзержавы, як сказана вышэй, урачыста дэкляравалі прызнаньне незалежнасьці Беларусі ў Рыжскім трактаце.

Безстаронна абмярковываючы пытаньне, трэба думаць, што як Сав. Расія, гэтак сама і Польшча зацікаўлены у прызнаньні незалежнасьці Беларусі. Бо дзякуючы прызнаньню незалежнасьці Беларусі, адпадае крыніца несканечных закалотаў паміж імі.

Ведама, што Расія, які ня быу-бы ў ей лад, ніколі не пагодзіцца з тым, каб на Беларусі, ў пераважаючай большасьці праваслаўнай, панавала польская ўлада. У свой чарод Польшча ніколі ня можа згодзіцца, каб коштам Беларусі узмацовывалася і сумежыла з ей расійская улада. У той-жа час, як ведама, абедзьзве стараны годзяцца з думкай аб устанаўленьні на Беларусі нэўтральнай для іх, беларускай ўлады.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае грунт думаць, што інтэрасы як Польшчы так і Савецкай Расіі дыктуюць ім, каб Беларусь з арэны цяжкой, і, як паказывае гісторыя, бязплоднага для іх змаганьня, абярнулася у край спакойнай і творчай працы. Дзякуючы прызнаньню Беларусі, устанаўленьня на ей дэмократычнага ладу і зацікаўленьня ею капітала, разбураны вайной край гаспадарча аздаровіцца, што спрыяйна адабьецца на эканамічным палажэньні яе суседзяў.

У прыпадку прызнаньня незалежнасьці Беларусі можна думаць, што Сав. Расія і Польшча здолеюць аблегчыць свой абцяжаны вайсковымі выдаткамі бюджэт, бо разам з прызнаньнем незалежнасьці Беларусі адпадае для іх патрэба акупацыі захопленых цяпер часьцей Беларусі. Частковае разброеньне абедзьвех дзержаў выяўляецца пры гэтым зусім магчымым.

На аснове вылажанага, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае гонар прасіць Высокую Конфэрэнцыю Дзержаў у Генуі паставіць у праграму Конфэрэнцыі пытаньня аб пераглядзе Рыжскага міра і як вынік адмены яго прызнаць незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае глыбокае перакананьне, што прынцыпы міра і справядлівасьці запануюць у пастановах Высокай Конфэрэнцыі і наша Бацькаўшчына ўздыхне супакойна і свабодна пасьля цярпеньняў цяжкой сямілетняй вайны.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі.

582.1.15:001&r-003&r — д фра
582.1.15:118-126 — мк фра
582.1.15:049-057 — мк фра
582.1.15:247-256 — мк рас — праект2
582.1.15:260-268 — мк рас — праект1
582.1.40:049-042 — мк бел
582.1.41:008&r-010&r — д фра

582.1.41:011&r-013&r — д фра
582.1.41:014&r-015&r — д фра
582.1.41:016&r-018&r — д фра
582.1.41:019&r-021&r — д фра
582.2.11:002&r-004&r — д фра
582.2.11:005&r-007&r — д фра
582.2.12:078&r-080&r — д фра
582.2.12:081&r-083&r — д фра

Дата напісаньня невядомая.

3133. Выцінка зь невядомай украінскай газэты з артыкулам «Населенє Польщі» (паводле перапісу 30.09.1921)

582.1.15:037

Дата невядомая.

3134. Візытоўка Баліса Сліжыса

Balys Sližys
Ministre de la Défence Nationale

582.1.15:036

3135. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) прафэсару В.Шэбедзеву (Генуя) за ??.03.1922

Яго Дастойнасьці Пану Прафэсару Шэбедзеву.

Высокапаважаны Пане Прафэсару.

На аснове ліста ад грам. П.А.Крэчэўскага, які паведамляе мяне, што Вы, Пане Прафэсару, далі сваю прынцыповую згоду на супрацоўніцтва з беларускім дзержаўна-адраджэнчым рухам і на выступаньне у абарону яго інтэрасоў, звертаюся да Вас з гэтым лістом.

Лічу сваім абавязкам выказаць Вам шчырую падзяку затое, што Вы ахвяровываецеся лажыць свае сілы на карысць нашай справы. Мы упалнамачываем і просім Вас выступаць ад імені Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі. Маючы у сваіх радах такога дасьведчанага і практычнага работніка мы пэўны, што здолеем болей ярка маніфіставаць нашы крыўды і дамаганьня перад Заходна-Эўропэйскім грамадзянствам і хутчэй давядзем справу да пажаданай завані.

Аб палажэньні нашай справы і заданьнях яе на бліжэйшы час, паінформуе Вас наш Міністр Закардонных Спраў грам. А.І.Цвікевіч, каторому я аб гэтым пішу у асобным лісце.

Прыміце, Пане Прафэсару, запэўненьне праўдзівай пашаны да Вас.

582.1.15:031 — мк
582.1.15:032 — мк
582.1.15:033 — мк
582.1.15:034 — мк
582.1.15:035 — мк
582.1.15:066 — мк

Дакладная дата невядомая.

3136. ערשטער זאמלהעפט. ליטע. Літэ (Літва). Першы сшытак. Коўна, 1922

582.1.15:317-344

На слупкох 67-76 Артыкул В.Ластоўскага
("ליטע" פאר (שפעציעל געשריבן «וויסרוסלאנד»
«Беларусь» (Напісана спэцыяльна для «Літэ»)

3137. Фотаздымак Івана Краскоўскага

582.1.15:005

Дата невядомая.

3138. Аўтограф верша Власта «Наперад, змагарна наперад...»

582.1.40:085 — ра

Дата невядомая.

3139. Ліст міністра замежных справаў БНР Аляксандра Цьвікевіча (Коўна) міністру-прэзыдэнту й міністру замежных справаў Латвійскай Рэспублікі Зігфрыду Мэеровіцу (Рыга) за ?.03.1922 у справе пераезду ў Латвію былога старшыні Віленскага Нацыянальнага Камітэту Івана Краскоўскага, з падзякаю за падтрымку беларускай нацыянальнай меншасьці ў Латвіі

582.1.40:181&r — мк

Дакладная дата невядомая.

3140. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.03.1922

2.III.1922.
Berlin.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Дзеля таго, што ад Вас німа паведамлення, я відаць затрымаюся тут больш доўгі час. Будзе вельмі смутна, калі мы ня здоляем дабіцца гутаркі... Гутаркі, зразумела, сурьезнай і па адпаведнай программе. Усё-ж надзею на гэта я не трачу і пакуль што раблю у адпаведным напрамку сярод мясцовых літвіноў і немцаў, каб падперці справу і з гэтага боку. Толькі ўсё-ж — увесь цэнтр вагі не тут, не за кардонам. І не сюды трэба зьвертаць увагу.

У Бэрліне наша справа зусім заглохла. Трэба вызнаць, што А<ндрэй> А<ляксандравіч>[1] чалавек хоць добры, але як палітычны працаўнік — слабават. Не дурак выпіць і пагутарыць, але далей гэтага звычайна ня йдзе. Яго трэба папіхаць, яму трэба даваць працу, — бо сам ён мала мае ініцыятывы. Мала рабіў і Ж<ытлоўск>ій і Бр<уна> К<арлавіч>[2]. Да ўсяго — яны паміж сабой не жылі у ладу, не працавалі разам і наагул стварылі невыразны стан рэчы. Адзін аднаго ня любіць і бэсьціць, а хто з іх лепшый — німа ведама. Вядома толькі тое, што усе глядзелі у рожныя бакі і клапаціліся аб грашах. Як далекі яны ад нашага паважанага П<ятра> А<нтонавіча>[3]. Калі-б былі патрэбныя грошы — ладу і дыстыпліны было-бы больш.

Усе-ж Ж-ій нешта рабіў. Што рабіў А.А. ня ведаю, за той кароткі час, што ён быў у Коўне — я не здолеў атрымаць ад яго дакладу. З таго, што застаў тут відаць, што нічога не рабілася. За апошнія два месяцы не выпушчана ніводнага ліста прэс-бюро. Анэкшт<эйн> так сама абсалютна нічога не зрабіў. Адным словам — зьявішча сумнае. Канешне, трудна вымагаць ад людзей працы, калі ім абвешчана, што яны не атрымоўваюць пэнсыі, але... хацелася-б бачыць хоць што-небудзь. У кожным разе яны усе на грошы яшчэ разлічаюць!..

Паведамляю, што Ж<ытлоў>скі атрымаў візу у Лёндан і зьбіраецца ехаць разам з Анэкшт<эйнам> як найхутчэй. На падарож па яго разрахунку трэба 70 тыс. мар. (70 фунтаў). Дзьве візы адна каштуець 2 фунта. Сорак тысяч ён, па яго слову, дастае тут, а тысяч трыццаць яму не хапае. Ен просіць гэтыя грошы яму надаслаць. Як вы там вырашэце гэтае пытанне — ня ведаю, але думаю, што хоць маленькую сумму — але прыдзецца выслаць. Калі не 20, то хоць 15 тысяч, перэпрасіўшы, што больш ня можам. Ці дастане ён там нешта, ці не — сказаць трудна; ен, як звыкла абецае, што хоць пару тысяч фунтаў, але дастане. Я асабісьце думаю, што гэта не так легка, хоць хацелася-б верыць яму. Ведаю толькі, што добра і тое, што ён пабывае у Лёндане і убачыцца з адпаведнымі людзьмі. І то хлеб, і то добра у параўнанню з нічым. Сення ен атрымаў ліста ад Салав<ейчыка>, — які праездам у Л<ёндан> будзе тут і прапануе Ж<ытлоўскаму> ехаць разам. Трэба будзе добра накруціць яго, каб дапамог нашаму Ж.

Трэба каб Вы магчыма хутчэй прыслалі некалькі экзэмпляраў нашага мемарандума на англійскай мове а так сама і др. матэр'ялаў (кніжка Дов<нар>-Зап<ольскага>[4]). Спеціальна карыстаючысь падарожай Ж<ытлоўскага> я напішу яшчэ асобный мэмарандум для Англ. Ураду.

Як Вы глядзіцё на выданьне «Бел. Сьцягу»? Ці не было-б добра выдаць хоць пару нумероў? Можна было-б даць хроніку і шэраг стацей па рожным пытаньням, у тым ліку проф. Ляцкага. Разьмер журналу ня больш 16-32 страніц і як мага дзешавей; лік — штук 500. Калі вырашыце актуальна — дык падашліце матэр'ял: апошнюю хроніку, оф. дакумэнты, стацьці Віленцаў (М.Гарэцкага асабліва), па 1 экз. нашага прэсс-бюро за апошні месяц, №№ «Эхо» і іншае. Можна было-б выпусціць 25 сакавіка і прывесьці да Вас. Толькі павядомце хутчэй, не адкладаючы ні воднага дня і вышліце адпаведныя грошы, думаю тысяч дзесяць.

Каб не забыць: мэмарандум Конфэрэнцыі — не друкуйце назову (каму!) і дату часу. Німа ведама, дзе і калі Конфэрэнцыя адбудзецца! Адпаведныя папраўкі трэба зауважыць і у тэксце (канец).

Трэба, каб А.А.<Бароўскі> даў патрэбны адчот у працы і у грашах. Трэба, каб ён азнаеміў Вас з тымі паперамі, даручэнямі і інш., якія ён мае для падарожы у Менск. Наагул, трэба вымагаць, каб праца усіх была арганізавана і дыстыпленавана. А то публіка траціць сьвядомасьць адпаведнасці і адказнасьці.

Справу з кватэрай я амаль што залатвіў. былі значныя выдаткі. апрача таго прыйшлося даць грошы хоць крыху Миллеру, Дзьмітр<ыеву> і вось цяпер яшчэ жонцы Бароўскага, што разам будзе да 3х тысяч. Будзь яны згарэлі, гэтыя грашовыя справы; сколькі ні латаеш — усе дзіркі! Ці зробім мы сабе новую вопратку, ці не? Даражыня страшная — а бюджэт

зусім не акрэсьляны! Што будзе з маей пэнсыяй — няўжо-ж будзе увесь час лічыцца тое, што запісана? Разглядзіце урэшці гэтае пытанне!

Пачаў працу — далей пішу брашуру. Іван скончыў аб Каліноўскім[5] — працуе над попул. медзіцынскімі кніжкамі і слоўнікам. Асабліва цікава апошняе — і ён туды-ж!!! Проста дзіва! Друк у Жыл<уновіча> ідзе слаба, здаецца толькі сёньня атрыманы першыя каррэктуры. Госыздат — ліквідуецца, заразам ліквідуецца у будучыне і беларускі аддзел. Жыл<уновіч> думае аб прыватным выдавецтве. Трэба, трэба ставіць справу бел. кнігі на шырокі шлях. Трэба знайсьці час для арганізацыі і узмацненьня «Вызваленьня»!

Пішыце і бывайце!

Ваш АлЦвікевіч

582.1.15:029&r-030&r

[1] Бароўскі. [2] Мюллер. [3] Крэчэўскага. [4] «Асновы дзяржаўнасьці Беларусі». [5] Праца надрукаваная ў часапісе «Беларускі Сьцяг» (Трызна Іван. Канстантын Каліноўскі (Гістарычны нарыс) // Беларускі Сьцяг. №4. 1922).

3141. Чарнавік ліста Юрыя Верашчакі [Вацлава Ластоўскага] (Коўна) Інтэрнацыянальнай Злучцы Маральнага Выхаваньня (Institut J.-J.Rousseau, Taconnerie 5, à Genève, Suisse) за 4.03.1922

Даведаўшыся з украінскіх газэт аб істнаваньні інтэрнацыянальнай злукі моральнага выхованьня пасьпешаю напісаць пару слоў аб Беларусі. Пры гэтым прашу выбачэньня, што не пішу ў мове для Вас зразумелай, таму што не знаю ніякай чужой мовы, акром сваей і пару суседніх, славянскіх.

Ніхто хіба не вымагае так Вашага сьветлага ўплыву, паважаныя панове, як наш народ беларускі, каторага у часе гэтай ўсесьветнай вайны дэморалізаваў сямілетні вайсковы фронт. Каторага ужо трэйці год дэморалізуе польская окупацыя, закрываючая беларускіе школы, забіраючая беларускіх дзяцей у польскія інтэрнаты у якіх дзяцей вучаць зневажаць сваю родную мову, свой народ і свае звычаі. Да гэтага народ наш раздзелен рыжскім мірам на дзьве часці: 100.000 кв. кілёмэтраў заграбілі палякі, 180.000 кв. кіл. заграбілі большэвікі. Пад большэвікамі ня менш дэморалізуюць нашых селян і іхніх дзяцей расейскія комуністы.

Нацыянальнай інтэлігенцыі у нас вельмі мала дый тая была заўседы незаможная, а цяпер і саўсім зруйнавана. Народ-жа галадае. У нас німа кніжкі для нашага народу. Калі Вы, панове, задаліся высокай мэтай даць людзкасці шляхі да моральнага выхованьня і то бяз розніцы веры і нацыі, дык ці не маглі-бы Вы хоць некалькі моральных брашурак надрукаваць і ў беларускай мове для нашага народу?

Зрэшта я буду Вам вельмі ўдзячэн калі мяне паінфармуеце аб Вашых мэтах і заданьнях, бо можэ ўплыванье друковаым словам безпасярэдна на народныя массы ня ўходзіць у Ваша заданьня.

Юры Верэшчака.

4.III.22.

582.1.15:065 — рк

3142. Ліст Генрыха Жылевіча (Фрыбург, Швэйцарыя) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.03.1922 з падзякаю за дасланы «Бюллетень Бѣлорусского Пресс-Бюро» №15 за 14.02.1922

582.1.15:048

3143. Паштоўка д-ра Кірылы Трылёўскага (Вена) Беларускаму Прэс-Бюро ў Коўне за 6.03.1922 з просьбай даслаць большы артыкул у Віленскім пытаньні для інфармацыі ў мясцовым друку

582.1.40:097

3144. «Виленский Вопрос и Польша». Машынапісны артыкул невядомага аўтара

582.1.40:092-090 — м

3145. Пратакол сходу Рады Народных Міністраў БНР пры ўчасьці Прэзыдыюму Рады БНР 8.03.1922 ў Коўне

Пратакол сходу
Рады Народных Міністраў пры учасьці Прэзыдыума Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі 8 сакавіка 1922 года
г. Коўна.

Былі прысутны ад Рады Народных Міністраў В.Ластоўскі, і Л.Заяц; ад Прэзыдыума Рады Рэспублікі — В.Захарко і Я.Мамонько.

Слухалі:	Пастанавілі:
Ліст Міністра Нацыянальных меншасьцяў С.Жытлоўскага аб тым, што ім ужо атрыманы візы на паездку у Лёндан аб чым ён паведамляе Урад і просіць атпусьціць грошы на падарожжа.	Прынімаючы пад увагу цяжкі стан Дзержаўнай касы прасіць Міністра Жытлоўскага паклапаціцца дастаць грошы на старане, якія с падякай могуць быць зьвернуты с тых грошы, якія ён дастане у Лёндане.
Просьбу беларускіх студэнтаў гуртка імяні Ф.Скарыны у Празі-Чэскай ад 12 лютага г.г. за №3 аб выдачы гуртку грашовай дапамогі на пакупку учэбнікаў.	Выслаць пяць тысяч марак.

Старшыня Рады Народных Міністраў.

З арыгіналам згодна:
За Дзержаўнага Сэкрэтара
Намесьнік Старшыні Рады Рэспублікі В.Захарка.

582.1.15:063 — мк

3146. Мэмарандум беларускага пытаньня

582.2.52:083&r-094 — мк

Дата й абставіны невядомыя. Подпісы: NACZELNIK WYDZIAŁU; REFERENT.
З прапановай наданьня тэрытарыяльнай аўтаноміі паветам: Дзісенскаму, Вялейскаму, Наваградзкаму, Баранавіцкаму, Слонімскаму й Пінскаму ды часткова

Кобрынскаму й Пружанскаму. Характэрны фрагмэнт: «...ogromnym błędem dyplomacji polskiej było oddanie Mińska. Przez oddanie Mińska Rosji przenieśliśmy centrum ruchu narodowego w tak zwanej Zachodniej Białorusi do Wilna, zupełnie niepotrzebnie podnosząc w ten sposób znaczenie kwestji białoruskiej w Wileńszczyźnie. Bolszewikom zaś daliśmy możność utworzenia w Mińsku ogniska całego białoruskiego ruchu narodowego, ogniska, do którego w przyszłości będą prawdopodobnie ciężyć wszystkie ziemie białoruskie...»

3147. «Польскія мары». Агляд друку. Прага, 9.03.1922

582.1.40:087-086 — р

Агляд падпісаны псэўданімам «Папрiка». Почырк П.Крэчэўскага.

3148. Пратакол сходу Рады Народных Міністраў БНР пры ўчасьці Прэзыдыюму Рады БНР 10.03.1922 ў Коўне

Пратакол сходу
Рады Народных Міністрау пры учасьці Прэзыдыума Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі 10 сакавіка 1922 года.
г. Коуна.

Былі прысутны ад Рады Народных Міністраў В.Ластоускі, А.Валькавіч, Л.Заяц; ад Прэзыдыума Рады Рэспублікі В.Захарко і Я.Мамонько.

Слухалі:	Пастанавілі:
Даклад гр. Ластоускага аб зацьвердджаньні інструкцыі аб парадку прыёма і выдачы грошай і запісі іх па кнігам.	Далучаемую да гэтага інструкцыю зацьвердзіць.
Даклад гр. Ластоускага аб устанаўленьню парадка сьвяткаваньня 25 сакавіка 1922 г. чацьвёртай гадаўшчыны абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі і аб асыгнаваньні на гэта грошай.	Пажадана зрабіць 25 сакавіка вечар (файфа-клёк) у клюбі «Метраполь» на які запрасіць прэдстаўнікоў дыпляматычных, прэдстаўнікоў Літоўскага Ураду і іншых атказных асоб, на другі-ж дзень, 26 сакавіка, даць абед, на які запрасіць прэдстаўнікоў нашага Ураду, урадоўцаў і служачых. Асыгнаваць на гэта пятнадцаць тысяч марак.

Старшыня Рады Народных Міністраў.

З арыгіналам згодна:
За Дзержаўнага Сэкрэтара
Намесьнік Старшыні Рады Рэспублікі В.Захарка.
582.1.15:064

3149. Пратакол сходу Рады Народных Міністраў БНР пры ўчасьці прадстаўнікоў Прэзыдыюму Рады БНР 10.03.1922 ў Коўне

Пратакол сходу
Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі
пры учасьці прэдстаўнікоў Прэзыдыума Рады Рэспублікі
10 сакавіка 1922 году у м. Коўне .

Былі прысутнымі ад Рады Народных Міністраў: Старшыня В.Ластоўскі, Міністр загранічных спраў А.Цвікевіч, кіраўнік міністэрства фінансаў А.Вальковіч і Дзержаўны Кантралёр Л.Заяц; ад Прэзыдыума Рады Рэспублікі: Намесьнік Старшыні Рады Рэспублікі В.Захарко.

Слухалі:	Пастанавілі:
1. Даклад Старшыні Рады Народных Міністраў В.Ластоўскага аб тым, што не гледзячы на вельмі карысную працу у Празе Старшыні Рады Рэспублікі П.Крэчэўскага, яго ўсё-ж такі трэба зтуль атазваць па прычыне вельмі нізкага курса нямецкай маркі і высокага курса чэшскай кароны. Дзержаўнай касе, маючай, у вельмі агранічаным ліку нямецкія маркі, не пад сілу утрымліваць пана Крэчэўскага у Празе, дзе ўсе пражыцьцё разлічаецца на высокай вартасьці чэшскую крону.	1. Даклад прызнаць слушным і прасіць Старшыню Рады Рэспублікі выбраць дзеля свайго пабыту старану дзе пражыцьцё каштуе не больш чым у Нямеччыне ці у Літве.
2. Даклад Старшыні Рады Народных Міністраў В.Ластоўскага аб назначэньні асобы дзеля выпаўненьня яго абавязкаў на час яго адсутнасьці у зьвязку з паездкай на Генуэзкую конфэрэнцыю у складзе дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі.	2. Прасіць Намесьніка Старшыні Рады Рэспублікі В.Захарко узяць на сябе часовае выпаўненьне абавязкаў Старшыні Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі, згода якога Старшынёй Рады Народных Міністраў ужо атрымана.
3. Далучаемую да гэтага заяву члена Рады Рэспублікі Я.Чарапука аб выдачы яму пазычкі у ліку 20.000 марак на нацыянальна-грамадзкую працу у Амэрыканскіх Злучаных Штатах.	3. Цяжкі стан Дзержаўнай касы к жалю не дае магчымасьці пайсьці на спатканьне просьбе грам. Чарапука, дзеля гэтага у здавольненьні памяненай просьбы адмовіць.
4. Ліст грам. Будзько ад 5 красавіка[1] 1922 г. на імя Старшыні Рады Народных Міністраў аб як найхутчэйшым звароце яму грошай разначасова пазычаных у яго Кіраўніком Міністэрства фінансаў А.Вальковічам.	4. Прасіць Дзержаўнага Кантралёра тэрмінова устанавіць фактычную лічбу дзержаўнага доўга, які, пасьля гэтага, разрэшыць заплаціць з атрымліваемых за тавары сум Гандлёвай Камісыяй.

Старшыня Рады Народных Міністраў Ластоўскі

582.1.41:051&r — мк

[1] Памылкова замест сакавіка (?).

3150. Ліст Антона Луцкевіча (Вільня) Прэзыдэнту Рады Міністраў Латвіі Мэеровіцу за 12.03.1922

Son Excellence
Monsieur le Président du Conceil des Ministres de Latvia
M-r Meierovitc

Monsieur le Président!

J'ai l'honneur de Vous adresser mes salutations sincères et de Vous prier de preter Votre aimable attention aux questions, qui Vous seront expliquées par la Délégation des organisations nationales blancruthéniennes, composée de Messieurs: le Colonel Eugène Ladnoff et M-r Doubieykovsky, Président du Comité Blancruthénien à Varsovie.

Je compte mon devoir de Vous communiquer, que la problème en question est également importante pour la République Latvia, que pour la population blancruthénienne en Pologne.

Veuillez agréer, Monsieur le Président, mes compliments les plus distingués.

Antoine de Loutckevitch
le Président du Comité National Blancruthénien à Vilna.

Vilna, le 12.III.1922
582.1.14:056-057 — рк

3151. Ліст Віталя Бендэроўскага (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 12.03.1922
582.1.43:095&r

Віншаваньне зь Вялікаднем. Пра вяртаньне з Коўна ў Рэвэль і спробы прадаць партыю тавару.

3152. Ліст Адварда Будзькі (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.03.1922
582.1.15:038&r-039&r

Пра культурна-асьветную дзейнасьць у Латгаліі, настаўніцкія курсы ў Дзьвінску, пра актыўнасьць Езавітава й неабходнасьць разьлічыцца зь ім.

«[...] Я нескулькі разоў выручаў урадавую казну пазыкай грошы. Цяпер лічыцца 54 тысячы мне доўгу. Абіцаў мне іх выплаціць тут Вальковіч. Аліж я яго тут злавіў ды грошы ні атрымаў. Цяпер мне яны на гвалт патрэбны, я іх мушу вярнуць каму належыцца [...] Для працы тут прастор, бо народу беларускага многа кругом. Толькі бяда з цэнтрам: мала дзеячаў [...]».

3153. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.03.1922

14/III

Паважаны Вацлаў Юстын.!

Пісьмы Вашы атрымаў. Выехаць магу кожнага дня, але 1) чэкаю сюды Петра[1] і Ляцкага, якія меліся прыехаць сення і прыедуць на гэтых днях; і 2) не маю грошы. Выдаткі мае становяць у месяц да 8 тыс., а за тры месяцы я атрымаў толькі 15 т. за якія сам так сама жыў у Коўне.

Становішчэ безвыхаднае. Я павінен забаспечыць сямью прынайм-сь на 1 месяц — значa магу выехаць калі будзе выслана мне 10 тыс. Чакаю Вашага адказу.

Бывайце АЦ

582.1.15:043

На паштоўцы карыкатура: «Далоў ганебны рыжскі падзел! Ніхай жыве Вольная Непадзельная Селянская Беларусь!». [1] Крэчэўскага.

3154. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга-Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.03.1922

Konstantin Jezovitov
Rīga, Nikolaja ielā, 20, dz.1. Tel. 10-87
Daugavpilī, Vitebskas iel,, 16.
14 марца 1922

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

шмат цікавага ёсьць ў мяне напісаць Вам, але пэўне-ж Гр. Краскоўскі ўжо тое-сее пераказаў Вам

Езджу бяз конца.

Устаю

Гуляюць нэрвы, як ў летку 1920 году.

Але праца ідзе

Нема толькі памошнікаў.

Прыходзіцца раздзірацца на пятнаццаць кавалкаў і адзін дзень быць ў некалькіх мейсцах.

Як манны нябеснай чакаю прыезду яшчэ і яшчэ людзей, каб запраўды умацаваць становішча нашай тутака нацыянальнай меншасьці.

Маленечкі тутака маштаб працы, але зацягнуў ён мяне ўжо з галавой.

Будзьце ж здаровы!

К.Езавітаў

P.S. Чаму не адказалі Вы мне на мае нэрвовыя лісты?
чаму маўчыце?

582.1.40:001

3155. Ліст Максіма Гарэцкага (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.03.1922

15/III 1922г.

Глыбокапаважаны Пане!

Пры гэтым дзеля фармальнасьці пасылаю Вам копію з доктарскага пасьведчаньня аб стане майго здароўя.

Важуся яшчэ прасіць Вас, калі грошы мне на падарожу дагэтуль ня высланы, выслаць іх па майму даручэньню ці перавесьці на маё імя (тут ёсьць філія Рыскага Камэрцыйнага Банку). Прашу гэтак дзеля таго, што цяпер ня маю грошы навет выехаць, каб залатвіць замежную падарожу, а другое — хачу, каб усе грошы, якія мне дасьцё, атрымаць адразу, бо надта баюся непрадбачаных акалічнасьцей, асабліва ў зьвязку з магчымымі пераменамі ў палітычнай абстаноўцы Усходняе Эўропы. Калі мяне адрэжуць ад грошы ці зробіцца штось падобнае — будзе не лячэньне, а яшчэ горшая хвароба.

Чытаньне лекцыяў скончу к 25/III.
Надта а надта прашу выбачыць мне за гэтае пісьмо, наагул за дакуку.

З паважаньнем
МГарэцкі

Адрас: Latwija, Daugawpils, Бульварная, 30
582.1.15:058

3156. Мэдычная даведка Максіму Гарэцкаму за 7.03.1922

Копія.

Удостовѣреніе

Дано сіе Максиму Горецкому въ томъ, что онъ страдаетъ острымъ малокровіемъ, неврастеніей и хроническимъ катарральнымъ бронхитомъ, вслѣдствіе чего онъ безусловно нуждается въ усиленномъ питаніи, продолжительномъ отдыхѣ (отъ 3хъ до 3½ мѣсяцевъ) и въ курортномъ леченіи до полнаго поправленія своего здоровья.

Двинскъ, 7 марта 1922 г.
Врачъ Б.Камеразъ

З аўтэнтыкам згодна: 7/III-1922
Адварды Будзька
582.1.15:040

Далучаная да ліста за 15.03.1922.

3157. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.03.1922

16.III.22.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Пасьля таго, як паслаў адкрытку, падумаў, што магчыма яна ня дойдзе дзякуючы малюнку. Таму пішу яшчэ раз.

Чакаю са дня на дзень Петра Ант<онавіча> і Ляцкага. Заўтра 17га яны павінны прыехаць. П.А. думае пераехаць у Бэрлін, бо тут таней. Можа захаплю яго да Коўны на сьвята. Сам я магу выехаць кожнага дня, але німа грошы. З 10 тыс. што я атрымаў апошні раз — тры прыйшлося заставіць у Коўне, адна на дарогу — рэшта за даўгі тут. Сёньня у дома 1 тысяча не гледзючы на тое, што за апошні месяц прадалі некторыя рэчы. Абрыдла гэта. Выехаць магу толькі пасьля таго, як атрымаю 10 т. — бо на месяц жыцьця трэба да 8 т. Вышліце тэлеграфам праз «Extrans». Паклон усім Ваш АЦ.
582.1.15:042

3158. Ліст Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.03.1922

Паважаны п. Вацлаве!

Дзякую, атрымаў літару Б. Шкада толькі што не прыслалі разам сваю працу, бо нельга зрабіць патрэбныя ўносКі. Слоўнічак Гарэцкіх так сама атрымаў, за што яшчэ больш дзякую, бо як раз патрэбны мне для перакладу працы аб шляхце. На усе вашыя прапазыцыі згодзен, бо навет ня лічу сябе ў сілах брацца за такую працу — як слоўнік. Над моваю я толькі пачынаю працаваць і сьмешна было б каб лічыць, што мне пазво-

лена узяцца за гэта без вашае помачы і фактычна вашае галоўнае працы. Я толькі стрэлачнік і ні на што не прэтэндую. Я хачу толькі, каб быў добры салідны слоўнік.

Пасылаю Вам спробу з літар. А. Калі так будзе добра, дык пасылайце вашу літару Б, каб я перапісаў па такому ж пляну. Атрымаўшы ваш адказ, згоду і літару (вашу) Б., я зараз жа высылаю вам літ. В. Яшчэ адно пытаньне. У Гарэцкіх ёсць словы — якія у нас ператлумачаны інакш — напр. алый — (у нас) — пунсóвы

а у Гар. — румяны

ахінея — (у нас) ахінэя

у Гар. — лухта, бязглуздзіца.

багрец — (у нас) — пурпура (пурпурны)

у Гар. — барвень (барвяны, барвісты)

і г.д. Як тут быць? Ці ня добра было б — прыпісываць і іхнія тлумачэньня? Каб слоўнікі не пярэчылі адзін аднаму, а дапаўнялі.

Напішыце аб гэтым, растлумачце.

Чакаю.

Ваш Ів.Цвік.

Паклон усім.

16/III 21[1].

Бэрлін.

582.1.40:015&r

[1] Памылкова замест 22.

3159. Запіска Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) (03.1922)

Калі грошы прыдуць — я выеду ва ўторак[1] разам з Дзьм<ітрыевым>. Яму-ж тожа патрэбна на падарож хоць тысяча.

Калі Генуя не адбудзецца — будзе нашае шчасьце!

Трэба – яшчэ выждаць пару месяцаў і вясна можа прынесьці шмат чаго.

АЦ.

З размоў Т.Г<рыба> і К<араба>ча пакуль што нічога не выходзіць. Можа нічога і ня выйдзе. Я ўмяшаўся і раю не выязджаць пакуль не будзе выяснена аканчальна — ці «да», ці «не». Наагул — увесь характар размоў маець якій-сь непаважны характар. Зрэшта я раблю так, што гэта іх справа. Таўкачы як адзін, так і другі.

582.1.15:041

Дакладная дата невядомая. [1] 22.03.1922.

3160. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.03.1922

17.III.22.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Карыстаюсь тым, што Т.Г<рыб> едзе і паведамляю:

1) Сюды прыезджае Петра Ант<онавіч>[1] і Ляцкі. Магчыма, што П.А. будзе сення увечары, ці заўтра. Калі-б была магчымасьць (грашовая) дык можна было-б паехаць разам да Коўны.

2, Я зьбіраюсь выехаць, што дня. Але не магу гэтага зрабіць із-за тэй самай «магчымасьці». Трэба забаспечыць сямью, трэба на дарогу, трэба выдаць хоць 1 тыс. Дзьмітрыеву на падарож, а у мяне усяго каля тысячы. Ня гледзячы на тое, што за гэты месяц (люты—сакавік) прадалі мы некаторыя рэчы. Вышліце тэлеграфам праз «Extrans» 10 т. і я выеду разам з Дзьм. ва ўторак.

3, Матэр'ялы для «Сьцягу» гатовы. Выдадзім відаць у Коўне.

4, Жытл<оўскі> зьбіраецца у Лёндан на будучым тыдню. Мэмарыял напісаны. Шкада, што Вы паслалі мала мэмарандума у Геную.

5, Пасылаю Вам 100 шт. адкрытак[2] для распаўсюджаньня у Віленшчыне. Трэба, каб гэта йшло не ад нас.

6, Дзе якія захады робім адсюль у сэнсі націсканьня на «суседзяў».

7, Аб выніках падарожы Т.Г<рыба> і А.К<арабача> раскажа сам Т<амаш>.

8, Аб «новай тактыцы» — так сама.

Бывайце! АЦ

582.1.15:014&r

---

[1] Крэчэўскі. [2] «Далоў ганебны Рыжскі падзел!».

3161. Ліст Андрэя Бароўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.03.1922

[...] Пасылаю вам васковаю паперу [...]

[...] Дмитріевъ выѣдет вмѣстѣ с А.И.Цвик<евичем> в понед. или вторник[1]. С ними я пришлю отчет [...]

582.1.15:044

---

[1] 21-22.03.1922.

3162. Тэлеграма Андрэя Бароўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.03.1922

Tamasz budzie czecwerg[1]. Kamitetbsr

582.1.40:010

Дакладная дата невядомая. [1] 24.03.1922.

3163. Пратэст Бюро ЦК Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў Савету Народных Камісараў РСФСР за 18.03.1922 супраць суду РКП над Расейскай Партыяй Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў, прызначанага на 20.03.1922

582.1.40:003 — мк

582.1.40:002 — мк

3164. Паштоўка Кастуся Езавітава (Корсаўка) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.03.1922

Корсаўка. 18.III.22. Латвія.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч!

Седзючы на станцыі і чакаючы цягніка, успомніў я, што хоць і на самым паўночным атрозе, на самай мяжы, але усе-ж-ткі на роднай зямельцы[1]

сіжу я, і што шмат нашых працаўнікоў адарвалося ад роднай глебкі і пакутуе начужыне, даўным-даўно ня чуючы шум бацькаўскіх лясоў, не бачучы жартаўлівай мяцеліцы і не удыхаючы смаліста-сасновага паветру.

Усім ім, ў паважанай асобе Вашай, шлю я свой шчыры прывет і найлепшыя сяброўскія пажаданьня.

Хай спорна і шпарка ідзе агульная праца! Хай моцна і дужа трымаецца кожны з яе тварцоў.

Кастусь

582.1.40:024

[1] Корсаўка, паводле карты Карскага — самы паўночны пункт беларускай этнаграфічнай тэрыторыі. Цяпер — Карсава, Латвія.

3165. Афіша Беларускай Вечарынкі 19.03.1922 у салі гарадзкога клюбу ў Дзьвінску

582.1.15:357

Арганізатары вечарынкі — «Аматары да сцэнічнага штукарства з паміж слухачоў беларускіх вучыцельскіх курсаў у Дзьвінску».

3166. Ліст Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.03.1922 у справе дасылкі віленскіх выданьняў

582.1.40:006

3167. Ліст Вацлава Ластоўскага міністру загранічных справаў Літоўскай Рэспублікі за 20.03.1922 (вых. №62, 63; копія праф. Эдуарду Вольтэру, сябру Археалягічнай Камісіі)

ЯГО ДАСТОЙНАСЬЦІ
Пану Міністру Загранічных Спраў
Літоускай Рэспублікі
ВАША ДАСТОЙНАСЬЦЬ,

У верэсьні (сентябрь) месяцы 1921 г. разам з літоўскім архівам рэавакаванымі з Масквы прыбыу вагон у спіску каторага значыуся адзін яшчык «бумаги и документы Ластовскаго».

Гэта есьць той яшчык дакумэнтау, які большевікі, у часе окупацыі Вільні у 1920 гаду, рэквізавалі, разам з другімі рэчамі і адаслалі у Маскву. У гэтым яшчыку былі дакумэнты XVI-XVIII сталецьцяу, датыкаючыя гісторыі Беларусі.

На мае старэньня у Маскве, праз маіх знаёмых, гэты яшчык быу далучэн да архівау высыланых у Літву, аб чым я дастау павєдамлєньнє з Масквы і па прыбыцьці вагону у Коуну, пацьверджэньне ад камісыі па выпауненьню мірнай умовы з Расеяй, што запрауды у спісках маецца адзін яшчык абазначаны маім імем.

Уважліва прашу Вас, Пане Міністру, распарадзіцца каб азначаны яшчык, дзеля яго высокай гістарычнай вагі для гісторыі Беларусі, быу адшуканы і выданы мне, як уласьніку яго.

Прыміце Пане Міністар запэуненьне у глыбокай пашане да Вас.

582.1.15:045&r — мк

582.1.15:046&r — мк

3168. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 21.03.1922

21.III.22.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Сення ўторак, 22го, грошы німа, німа ніякага паведамленьня — знача я, відаць, 25га ў Коўне ня буду. А шкада — бо хацелася-б ў гэты дзень быць разам са ўсімі.

Калі я ня буду да 25-1/IV у Коўне, дык паўстае пытаньне, як быць далей з маім часам.

Па-першае, трэба выясьніць, калі мы едзем у Геную? Калі да 10/IV дык мне німа чаго і ехаць да Коўны. Але мне здаецца, што ехаць да 10 — німа чаго. Усе роўна да сьвят нічога ня будзе. Мэморандум усім трэба разаслаць цяпер (я лічу, што Вы яго ужо разаслалі) — пры чым абавязкова з картай Душэўскага, інакш толку будзе мала; а самім ехаць на трэці чацьверты дзень сьвята. Мы зробім у Генуе толькі прапаганду — спадзявацца вырашэньня нашага пытаньня — трудна. Для гэтага трэба прабыць там ня больш тыдня. Аб гэтым трэба параіцца з літвінамі.

Па-другое, як быць з праф. Ляцкім. Ен тут і я з ім гутарыў дэтальна. Ехаць у Геную ён годзіцца, але кажа (тк раіў яму Б<энэ>ш у Празе), што у нашай справе больш можна зрабіць у Лёндане. Ен прапануе: паехаць у Лёндан праз Парыж і з Лондана, калі трэба будзе, прыехаць у Геную. Але зазначае, што зробіць тк, як мы яму прыкажэм. Папярэджвае, што ехаць у Геную трэба у добрай вопратцы, (якой у яго німа), у той час, як у Лёндан ён можа ехаць у звычайным касьцюме. У Парыжу па нашаму даручэньню ён можа прыняць наш архіў і машынкі (калі яны засталіся) і направіць куды трэба.

Я яго пазнаеміў з Жытлоўскім, які едзе у канцы гэтага тыдня. Яны будуць дзеяць арганізавана. Л<яцкі> даў яму лісты.

Петра не прыезджае і ня пішэ і я ня ведаю чаму.

Вельмі шкада, што я ня еду у Коўну. Трэба было-б некаторыя прынцыповыя рэчы абгаварыць. А у пісьме ня можна усё гэта распісываць.

Незалежна ад таго, ці еду я у Коуну ці не — будзьце ласкавы вышліце мне грошы на жыцьце. Даражыня страшная, ў кішэні пуста, а на вуліцы нічога знайсьці нельга. Ужо пазычыў на пару дзен — і трэба вертаць.

Бывайце здаровы. АлЦвікевіч.

Вітаю Вас і усіх з дарагім сьвятам!

Жадаю добрага настрою і цьвёрдых надзей на лепшую будучыну!

АЦ.

582.1.40:008&r-007&r

3169. Ліст Тамаша Грыба (Коўна) сябру Выканаўчага Камітэту Венскага Міжнароднага Сацыялістычнага Аб'яднаньня Аляксандру Шрэйдэру (Вена?) за 21.03.1922 у справе перагляду Рыскага міру з нагоды зьезду трох Інтэрнацыяналаў у Бэрліне 2.04.1922

582.1.40:039-028 — мк

3170. Тэлефанаграма камандзера Беларускага Асобнага Батальёну маёра Розманаса Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі за 25.03.1922 зь віншаваньнем з нагоды Дня Незалежнасьці

582.1.40:099

3171. Тэлеграма Івана Карчынскага і Ўсевалада Боева Беларускай Місіі ў Коўне за 25.03.1922 зь віншаваньнем з нагоды Дня Незалежнасьці

582.1.40:095

3172. Тэлеграма «Беларускай калёніі ў Бэрліне» (Жытлоўскі, Бароўскі, Міллер, Анэкштэйн) Беларускай Місіі ў Коўне за 25.03.1922 зь віншаваньнем з нагоды Дня Незалежнасьці

582.1.40:096

3173. Запрашэньне на ўрачыстае сьвяткаваньне 25 сакавіка ў памешканьні Беларускай Місіі ў Коўне

24 сакавіка 1922

Ваша Дастойнасьць.

З нагоды абходу чатырохлецьця апавешчэньня незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі прашу Вас учціць нас сваім прыбыцьцем на пабедную гарбатку 25-га сакавіка, а гадзіне 5 да 7, якая адбудзецца у памешканьні нашай Місьіі (Вітаўта праспэкт, №30).

З глыбокай пашанай

Ластоўскі

582.1.40:016 — мк
582.1.40:011 — мк

3174. Рукапіс Вацлава Ластоўскага (Тэкст прамовы на ўрачыстым сьвяткаваньні Дня Незалежнасьці Беларусі (?) 25.03.1922)

Утраціўшы на зарэ гісторыі сваю незалежнасць, доўгія сталецьця Беларускі народ выносіў цяжкую і непасільную барадзьбу, за сваю культуру і мову, у межах Рэчыпаспалітай Польскай. Шляхэцка-езуіцкая Польшча атабрала у нас багацейшыя станы, загнала наш народ селянскі у цяжкую прыгонную няволю.

Пасьля распаду, перагніўшай у сваіх недрах, Рэчыпаспалітай польскай Беларусь апынулася пад Расіей. Усім цягаром, займаўшы шостую частку ўсяго сьвету, расійскі царызм хапіў Беларусь у «братнія» абоймы і як пачварны спрут, апутаўшы тысячамі сваіх лап стаў высысаць беларускую кроў. Але не адзін расійскі царызм смактаў і душыў Беларусь: побач яго і ў перамежку апаясавалі Беларусь лапы старога польскага спрута, якога, забраўшы Беларусь Расія не адкінула з цела Беларусі, а толькі прыдушыла яго пад сабой на беларускім жывым целі. Сто гадоў Беларусь лежала распасцертай пад д[в]умя гэнымі агіднымі пачварамі высысаўшымі кроў і душу Беларускую. І ня дзіва, калі пад канец мінуўшага сталецьця Беларусь ужо не аказывала знакаў жыцьця. І ня дзіва, калі тысячы сыноў Беларусі выходзячы, у гэтым пэрыядзе, з лона беларускага Народу навекі

ад яго адрываліся, уліваючыся у расійскую, або польскую стыхію. А спруты апаясываўшые цела Беларусі усё глыбей і глыбей запускаючы свае шчупальцы ў душу беларуса, вычуваючы, што ён ужо абязсілеў і канае, прагалосілі усяму сьвету, што беларускага народу німа ужо. І запраўды беларусоў як жывога народу ужо не было: была толькі этнографічная беларуская селянская масса немаючая ужо ні дзержаўных, ні нацыональных ідэалоў, але ўсё-ж такі з незразумелай гарачай прывязаннасцю да сваей, усімі пагарджанай і асьмеіванай мовы, са сьляпой прывязаннасцю да сваіх правечных звычаеў і абычаеў.

Урэшце наступіў 1905 год. Пад ўплывам неўдач вайны з Японіяй, скалыхнулася ўся аграмадністая Расея, траханула цяжэўшае на ей ярмо царызму. Страханулася і Беларусь. Пасьля доўгай амлеласьці і летаргу, пачала прабуджацца на Беларусі політычная думка. Сперша дзіцяча бязсілая і слабая, але згодам пачаўшая борзда крэпнуць. Перад ўсесьветнай вайной беларуская політычная думка пачынала ужо ставіць сабе свае мэты і заданьня культурна-нацыональнага разросту у межах расейскай фэдэрацыі.

Выбухшая вайна забрала лепшыя беларускія політычна-нацыональныя сілы. Трох гадовы фронт ўсесьветнай вайны на беларускай тэрыторыі знішчыў і зруйнаваў матэрьяльна беларускі народ. Двесці з лішнім верст у доўжкі і немаль сто вёрст у шыркі на Беларусі, пасьля фронту асталіся папаленыя гарады, мястэчкі і вёскі. Нямецкая окупацыя вынішчыла ў Беларусі натуральныя лесавыя багацьця.

Пад ўплывам агульна-расейскага зруху, калі відаць было, што вялікая турма народаў — Расія — распадаецца, Беларусь, дагэтуль верна і геройска праліваўшая кроў поплеч з народамі Расіі на фронтах, пачала старацца уратаваць сваю зямлю ад расхвату. Першы Усебеларускі Кангрэс вуснамі 1762 поўнамочных дэлегатоў сабраўшыхся у Менску 17 сьнежня 1917 году прагалосіў Беларускую Народную Рэспубліку, у фэдэратыўнай зьвязі з народамі быўшай Расіі. Але калі большэвікі у часе перэгавораў з немцамі у Бярэсьці Літоўскім паднялі руку каб разарваць Беларусь, аддаючы пад абладу немцам заходнюю часць яе, выпаўняючый орган Усебеларускага Кангрэсу Рада Беларускай Народнай Рэспублікі запротэставала супроць гэтага і 25 сакавіка 1918 году на урочыстым сходзе, апавесціла незалежнасць і сувэрэннасць Беларусі.

25 сакавіка 1918 году, пасьля доўгіх сталецьцяў паняволеньня і рабства прагучэў магутны вольны голас, вольнага Беларускага народу.

25 сакавіка 1918 году, паваротны пункт у гісторыі Беларускага народу, гэта першы дзень, калі на беларускай зямлі устрамлен быў беларускі сцяг сымвал сваей, ад нікога незалежнай, дзержаўнасці.

25 сакавіка 1918 году першы дзень нашай барадзьбы аткрытай і яўнай за нашу незалежнасць і сувэрэннасць, дзень у каторы паложэн быў першы камень у падваліны нашага дзержаўнага незалежнага істнаваньня.

Год 1918 прайшоў пад цяжкай нямецкай окупацыяй, якая была заняўшы без мала усю Беларусь. Немцы датрымліваючы Берасцейскай умовы не дазвалялі Беларусі дзержаўна арганізавацца. Урэшце восеньню тагож 1918 году у сьлед за адступаючымі немцамі нахлынулі на Беларусь

большэвікі. Прыйшоўшы у Менск 1 студня 1919 году большэвікі выдалі маніфэст аб арганізаваньні незалежнай Беларуска-Літоўскай дзержавы.

Першую гадаўшчыну незалежнасці Беларусі Урад Беларускай Народнай Рэспублікі сьвяткаваў у Горадні.

На вясну 1919 году палякі пачалі наступаць на Беларусь. У хуткім часе была занята палякамі Горадня, за ей Вільня, а далей Менск і ўвесь край па Дзвіну і Бярэзіну. Вітаўшае спачатку палякоў, як збаўцоў ад цяжкой большэвіцкай окупацыі, жыхарства Беларусі хутка перэканалася, што новы польскі наездчык ані ня лепшы за большэвікоў. У дадатку, палякі прыйшоўшы на Беларусь і ня думалі ушанаваць самаазначэньне Беларускага народу. Польская окупацыя прынесла з сабой нечуваны нацыональны гнет, не пашанаваньне соцыальных і чалавечых правоў ды стала абмярковываць колонізатарскія і імпэрыялістычныя пляны. У найлепшым здарэньні Беларусь мела стацца аўтаномнай правінцыей у сыстэме польскай дзержаўнасці. Занепакоенае беларускае грамадзянства, праз Урад Беларускай Народнай Рэспублікі пачало рабіць старэньне у окупантоў, каб дазволена было імі склікаць у Менску Раду Беларускай Народнай Рэспублікі. І адзінадцатага грудзеня[1] 1919 году быў склікан у Менску беларускі прадпарлямант. Пасьля месячных нарад у фракцыях 13 сьнежня вынесена была рэзолюцыя вымагаючая ад Польшчы безадложнага прызнаньня незалежнасьці Беларусі і выводу окупацыйных войск. На гэтым-жа сходзе Рада Рэспублікі зрабіла перавыбары Прэзыдыуму Рады і Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі. Пасьля гэтага пайшлі арэшты беларускіх палітычных дзеячоў.

Другую гадаўшчыну Незалежнасці Беларусі Урад Беларускай Народнай Рэспублікі сьвяткаваў у польскай турме. К вясьне 1920 г. сябром Ураду і прэзыдыуму Рады Б.Н.Р. удалося вызваліцца с польскіх турэм і уцячы заграніцу. Урад Беларускай Народнай Рэспублікі распачаў далейшую сваю працу на тэрыторыі Латвіі, у Рызе. Летам гэтага году адбыўся славэтны паход бальшэвікоў пад Варшаву пасьля якога адбылася ганебная уцечка аж за Менск. Праваеваўшы два гады між сабой палякі і большэвікі, ешчэ горш знішчылі і зруйнавалі Беларусь. Урэшце яны, восеньню 1920 году у Рызе зьехаліся дзеля міравых перэгавораў паміж сабой. Не дапусціўшы дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі на перэговоры, па над галавой сувэрэннага Беларускага народу, яны паміж сабой заключылі мірную умову. Па якой прызнаўшы незалежнасць Беларусі, пасьля яе тэрыторыю — ня глядзя на пратэсты Ураду Б.Н.Р. раздзялілі паміж сабой[2]

582.1.40:023-017

[1] Памылкова замест лістапада. [2] На гэтым тэкст дакумэнта абрываецца.

3175. Чарнавік сьпісу (Memento) [запрошаных на ўрачыстае сьвяткаваньне 25 сакавіка(?)]

582.1.40:012&r

Сярод запрошаных (з жонкамі й без): Сметона, проф. Жэмайтіс, проф. Шимкус, Семашко, Грыніус, Galvanauskas, Jurgutis, Oleka (Вн.Д.), Sližys (Воен.), Juodakis

(Н.Просв.), Karoblis (Юстиции), Dobkevičius (Финанс.), Aleksa (Землед.), Zubrickas (Контроль), Soloveičikas (Евр.Д.), Вилейшисъ (Ж.Дор.), Климасъ, Керпе, Папечкисъ, Гринкевичъ, Лисовскій и Вилейшисъ, Балутисъ, Дайлиде (общ.деп.), Дайлиде, кап. Гирдвайнисъ, Думбрисъ, Янінас, Стульгинскій, кс. Стаугайтисъ, д-р Стаугайтисъ, кап. Наткевичъ, Пожелло, Кайрисъ, Слежевичъ, д-р Лашас, Krupavičius, Vailakaitis, д-р Розенбаумъ, Рахмилевичъ, сэкрэтар Прэзыдэнта Літ. Рэсп., ген. Станайтисъ (главноком.), полк. Кравцевичъ, ген. Котис, Моркус, бурм. Вилейшисъ, Меркисъ, ком. Бразулевичъ...

Крэчэўскі, Ластоўскі, А.Цвікевіч, Захарка, Мамонька, Грыб, Заяц, Валькавіч, Галавінскі, Душэўскі, Чэрапук, Варонка, Рэшко, Боеў, Кургановіч, Зары[...], Краскоўскі, Пракулевіч, Якубецкі, Міхалевіч, Бэндэроўскі, Башкіраў, Ружанцоў [...]

3176. Візытоўка Зігмаса Жэмайціса

Zigmas Žemaitis

582.1.40:013

3177. Весткі Аддзелу Друку Міністэрства Жыдоўскіх Спраўаў Літвы, [пасьля 25.03.1922]

4-rių Metų Baltgudžių nepriklausomybės šventė Vilniuje

582.1.40:089-088 — мк

Дакладная дата невядомая.

3178. Ліст Стяпаса Кайрыса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.03.1922

Vielmi pavažajemy Panie

Skladajuczy u waszej Pavažajemaj Asobie mai najlepszyja žadannia walniejszaj owocnai pracy na dobra bielaruskaho narodu i jego palitycznaho wyzwalennia, džiakujuczy Wam, Panie Starszyna Rady Narodnych Minis[t]rau, za zaprosiny być uczastnikom abchodu czatyrachleccia apawieszczenia nezależnasci Bielaruskai Narodnai Respubliki, razam szczyra Was perepraszaju, szto warunki nie pazwolili skarystać hetym razam prawiaści razam z lepszymi pracownikami bielaruskaho narodu kolki milych chwil.

Z paszanaj Stepas Kairys

26.III.22

582.1.40:014

3179. Паведамленьне міністра замежных спраўаў Літвы Владаса Юргуціса Вацлаву Ластоўскаму за 28.03.1922 (вых. №8039) аб атрыманьні мэмарандуму Ўраду БНР на Генуэскую канфэрэнцыю

582.1.40:009

3180. Ліст Асобнага Аддзелу ў Справах Выкананьня Мірнага Дагавору з Расеяй МЗС Літвы Вацлаву Ластоўскаму за 30.03.1922 (вых. №2305)

Užsienių Reikalų Ministeriui Ponui Jurgučiui pavedus, Ypatingasis Skyrius taikos sutarčiai su Rusija vykdyti į Tamstos raštą iš 1922 m. kovo mėn. 20 die-

nos Nr. 62, turi garbės pranešti, kad Švietimo Ministeris yra prašomas daryti žygius Tamstos raštą patenkinti.

582.1.40:098

3181. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Яну Райнісу (Рыга) за 30.03.1922

Дастойны Пане!

Культурна-нацыянальная аўтаномія для беларускай меншасьці у Латгаліі, Вашымі захадамі і старэньнямі, ужо закончана.

Ральля да засеву прыгатавана: патрэбны цяпер добра сьвядомыя справы сяўцы, якіх ешчэ нажаль паміж тамтэйшымі мейсцовымі сіламі вялікі недахват.

Мы па магчымасьці дзяліліся людзьмі і некаторыя ужо працуюць у Двінску.

Цяпер прасілі паехаць у Латгалію грамадзяніна І.І.Краскоўскага, нашага старога і вядомага грамадзянскага працаўніка, выкінутага палякамі з яго роднай Вільні. Ён згодзіўся. Але бяз Вашай ласкавай апекі яму трудна будзе даць раду з такой маладой ешчэ беларускай справай як у Латгаліі.

І я уважліва прашу Вас, Дастойны Пане Райніс аказаць яму і далейшаму будаваньню беларускай справы у Латгаліі, помач сваей дасьведчанай радай, апекай і пратэкцыяй.

Пляны працы грамадзянін Краскоўскі вылажыць Вам асабіста.

Сэрдэчна прашу выбачэньня, што пазваляю сабе ўжо другі раз турбаваць Вас.

Прыміце Дастойны Пане выразы глыбокай да Вас пашаны.

30.III.22 Ластоўскі

582.1.40:005-004 — рк

3182. Ультыматум Акружнога Атамана Беларускіх партызанаў Германа Скамароха (Беларусь, Дзейны Кансьпіратыўны Штаб) Начальніку Рэчы Паспалітай Юзэфу Пілсудзкаму (Варшава) за 30.03.1922

582.1.41:047-049 — мк

3183. Аўтограф казкі Вацлава Ластоўскага

[І] Была вёска і ў тэй весцы жылі тры сястры прыўкрасны, як зоры ясны. Ужо усякага дабра поўны скрыні набралі, ужо залатых пярсценкаў накупілі — а жаніхоў німа дый німа.

Сталі сестры журыцца, пачалі сваім горам дзяліцца, а затым умовіліся пайсці да варажбіткі.

Варажбітка выслухала іх дый пытае:

— А за каго-б вы хацелі павыходзіць?

Старшая кажа:

— Я хацела-бы за ваяра.

Сярэдня кажэ:

— А я за крамара.

Найменшая-ж маўчыць.

— Чаго ты маўчыш? — пытае варажбітка. — Можа ты за караля хочаш?

Яна пачырванела дый адказавае:

— Мне усё роўна, хто-бы ня быў мой суджаны, абы быў мне па сэрцу ды на мысьлі.

[II] —Добра, кажа варажбітка, — зраблю па вашаму хаценьню. Дайце мне вашы пярсценкі, я іх так зачарую, што каму яны трапяць у рукі, той зара закахаецца і ажэніцца. Як будзе сьвята, то ідзіце на шырокі гасцінец, там палажыце кождая свой пярсцёнак і ваша доля прыйдзе да вас.

Варажбітка зрабіла свае чары і сестры вясёленькія пабеглі да дому.

Прыйшло сьвята. Раным рана сёстры выйшлі на шырокі гасцінец і кождая палажыла свой пярсцёнак асобна на самай дарозе, а самі схаваліся у высокае жыта і сочаць.

Вось далека па гасцінцы закурэў пыл: ляціць юнак на вараным каню у чырвоным жупане, а пры боку ў яго шабля ў срэбнай похве.

Харошы юнак, прыгожы!

Убачыў пярсцёнак старшай сястры, за рара[?] на ўсім разгоне перахіліўся аж да зямлі, ухапіў персцень і паімчаўся далей.

Вясёла выскачыла старшая сестра з жыта і пабегла дамоў.

Так, у абед[н]ю пару зноў курава курыць: коціць каляска[1]

582.1.41:052 — р (I)

582.1.14:054-055 — р (II)

Дата невядомая. [1] На гэтым тэкст абрываецца.

3184. Зварот Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі да Генуэскай канфэрэнцыі

582.1.40:059-057 — мк

582.1.41:037-040 — мк

3185. Пераклад артыкулу: М.Слежевичъ. По вопросу о національныхъ меньшинствахъ // Lietuvos Žinios. №38. ?.04.1922

582.1.42:019-021 — мк

582.1.42:022-023-N — мк

582.1.42:035-037 — мк

582.1.42:038 — рк

Дакладная дата невядомая. На блянку Аддзелу Друку Міністэрства Жыдоўскіх Справаў Літвы.

3186. Візытоўка Габрыэля Падовані

Gabriel Padovani

Délégué Français en Lithuanie. Kovno.

[Тэкст:]

prie Monsieur le Président du Conseil blanc-ruthèn. de vouloir bien recevoir — Monsieur Jean Pélissier

582.1.43:041

Жан-Мары-Габрыэль Падовані — афіцэр французскай ваеннай місіі ў Коўне (прыбыў у Літву 19.03.1919).

3187. Візытоўка Жана Пэлісье

Jean Pélissier
Licencié ès-Lettres
Lauréat de l'Institut
Directeur du Bureau des Nationalités
Téléph. Fleurus 05-65 243, Bould St Germain

582.1.43:054

На пачатку 1922 году наведаў Клайпедзкі край, пісаў пра гэта (гл. Mūsų Žyninas, 1933, nr. 101, psl. 160)

3188. Ліст Давіда Анэкштэйна (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.04.1922, дасланы разам з мэмарандумам на нямецкай мове, складзеным паводле найноўшае статыстыкі, для распаўсюджваньня на Генуэскай канфэрэнцыі

582.1.40:084

3189. Memorandum über die Lage des Republik Bielorus

[Разьдзелы:] «I. Land und Leute. — II. Die wirtschaftliche Lage Weissrutheniens. A. Wasserwege. B. Andere Kommunikationswege. C. Landwirtschaft. D. Wäldereien. E. Industrie. F. Export, Import und Transit. — III. Geschichte der weissruthenischen Nationalbewegung bis zur letzten Zeit. IV. Die gegenwärtige politische Lage Weissrutheniens. V. Die weissruthenische Frage und das Ost-Europäische Problem

582.1.40:083-062 — мк

3190. Абрывак старонкі часапіса з тытулам: Nové Illustrované Listy. Ročník XXIX., číslo 14. 8.DUBNA 1922. Vychazí každou sobotu v Brně.

582.1.43:052

3191. Ліст Зьмітра Дарашэнкі (Бэрлін) Антону Луцкевічу (Вільня) за 10.04.1922

582.2.46:136&r — ра
582.2.46:135 — канвэрт

У справе ўладжаньня дзяцей Ів. Ігн. (Краскоўскага?) у Празе.

3192. Ліст Пятра Крэчэўскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму й Аляксандру Цьвікевічу (Бэрлін) за 11.04.1922

11.IV.22.

Дарагіе Вацлаў Юстынавіч і Аляксандр Іванавіч.

Я узяў з кніжных грошэй Эугенія Александравіча[1] 500 карон, і пасылаю Вам для абмену дзве тысячы ост-марак — выплаціце Е.А. за іх маркамі нямецкімі. Выеду, як толькі прышлеце візу. Вазьміце у Міністэрстве Закардонных спраў візу для праезда ад Прагі да Бэрліна і назад — Тэлеграмму Вам паслаў аб гэтым.

З пашанай Петра.

582.1.14:052

[1] Ляцкага.

3193. Ліст Старшыні РНМ Вацлава Ластоўскага (Коўна) вык. аб. Міністра Фінансаў Аляксандру Вальковічу (Коўна) за 11.04.1922 (вых. №137)

Прашу вас пісьменна паведаміць:

1) Што Вамі зроблена у справе ліквідацыі умовы з Ліфшыцам на марку Б.Н.Р.[1] 21 лютага Урад даручыў Вам скончыць справу з Ліфшыцам, разьлічаючыся з ім маркамі на сумму 40.000 марак.

2) Ці паведамлен Вамі Грунтоў аб спыненьні яму пэнсыі, згодна майму загаду, ад 1 красавіка, і прашу перэслаць мне копію Вашай ў гэтай справе цэдулы.

3) Прашу копію Вашай цэдулы, аб спыненьні выплаты пэнсыі грам. Ярмачэнко[2].

4) Грам. Вершынін у адным з лістоў пісаў, росьцячы прэтэнсыі на выплату яму пэнсыі не маркамі, а кронамі, аб чым была мова ў Радзе Міністроў, — ці напісалі Вы Вершыніну, прастуючы яго неслушныя дамаганьня, згодна выплачыванай яму ад 1921 г. пэнсыі і сьмеце зацьверджанай Урадам 11.VIII.21.

5) Паўтараю просьбу маей цэдулы №124 ад 9.IV.22.

Адповедзь на гэту цэдулу, па пунктах, прашу даць пісьменна з падробнай абрысоўкай палажэньня справы і зробленых Вамі крокаў з прылажэньнем копій пісаных Вамі ў кождай справе цэдул і дакумантаў.

Ластоўскі

582.1.43:226 — мк

[1] Паводле падпісанай у лютым 1920 году ўмовы, Аркадзю Ліфшыцу надавалася манапольнае права на продаж маркі Асобнага Атраду БНР. [2] Пастанова аб ліквідацыі консульства БНР у Канстантынопалі была прынятая 14.06.1922.

3194. Ліст Старшыні РНМ Вацлава Ластоўскага (Коўна) Дзяржаўнаму Кантралёру Лявону Зайцу (Коўна) за 11.04.1922

Уважліва прашу Вас:

1) Спраставаць пісьменна цэдулай Вершыніну неслушнасьць яго дамаганьня на выплату што месячна 3.000 карон, замест належачых яму па сьмеце 3.000 марак і зрабіць адпаведны начот на яго справадачу.

2) Затрэбаваць ад грам. Лурье справаздачы аб пераходзе сумм ў яго дэлегатуры.

3) Затрэбаваць падробную грашавую адчотнасьць ад грам. Грунтова і ў магчыма скарэйшым часе праверыць яе і, ў выпадку не акуратнасьці, затрэбаваць грам. Грунтова у Коўну, для аб'ясьненьня.

4) Згодна маей на Ваша імя цэдулы ад 9.III.22 прашу Вас даць падробны спіс начотаў да сакавіка месяца на урадовыя установы і асобы.

5) Скантраляваць згоднасьць з дакумантамі рахунковасьці нашага Консульства у Коўне: паводле а) журналу выбываючых пашпартоў, б) квітар'юшаў і в) кассавых запісей. Рэзультаты кантролю даць на пісьме.

У выпадку немагчымасьці выпаўненьня каторага з пунктаў, прашу выпіску з гэтай маей цэдулы скіраваць у адносную установу і па кождаму пункту цэдулаю паведаміць мяне аб выніку Вашай чыннасьці.

Ластоўскі

582.1.43:227 — мк

3195. Беларус-Вайсковы. Вялікодная часопісь (Коўна). 1922.04.16. («Kario» 15№ priedelis)

582.1.40:053-052 — д
582.1.40:051-050 — д

3196. Візытоўкі ў канвэрце

а) Візытоўка Алены і Анатоля Рэшкаў:

Елена Михайловна и
Анатолій Николаевич Решко

б) Візытоўка Мікаласа Сьляжавічуса:

Mykolas Sleževičius
Dr. Juris
Membre de l'Assemblée Constituante de la Lituanie

в) Візытоўка Аляксандра Ружанцова:

Majoras Aleksandras Ružancovas
Karo Mokslo Skyriaus Knygyno Užveizda

[Тэкст на адвароце:]
Chrystos Ŭvaskros!

г) Візытоўка Яраслава Галі:

Prof. Jaroslav Galia
Viceconsul de la République Tchécoslovaque
Kaunas

582.1.43:094

3197. Чэк аб уплаце фірме «Schäfer & Clauss» (Бэрлін) 13.830,- ням. марак за 18.04.1922

582.1.43:067

Падпісаў Аляксандар Цьвікевіч. (За друкавальную машынку?).

3198. Пратакол нарады сяброў Ураду БНР 19.04.1922 ў Бэрліне

Пратакол
Нарады сяброў Ураду Б.Н.Р. ў Бэрліне 19.IV.22.

Парадак дня:
1. Інфармацыя гр. Грыба аб конфэрэнцыі 3х інтэрнаціоналаў
2. Даклад гр. Жытлоўскага аб паездцы ў Лёндан.
3. Бягучыя справы.

1. Інфармацыя грам. Грыба

Прыняць да ведама і дзякавалі за практычную працу.

2. Грам. Жытлоўскі дакладае, што гаварыў з Вэйцманам (старшыней Ўсесьветнай Сыяністцкай арганізацыі) праз якога дабыў англіцкую дыплёматычную візу дзеля паездкі у Лёндан. Салавейчык даў лісты да сваіх знаёмых у Лёндане, засьцерэгаючы пры гэтым, што вялікай по-

Паездка абавязкова патрэбна. Грошы трэба дастаць тут на мейсцы, у Бэрліне. Ехаць разам з Анэкштэйнам, які мае ахвоту там астацца.

мачы там беларускай справе не знайдзе. На паездку грам. Ж. грошы асабістыя не мае, але лічыць, што гэта паездка абавязкова адбыцца павінна. Калі лічыць Урад што трэба ехаць, то трэба каб асыгнаваў на гэта грошы, хоць-бы з пэнсыі належачай яму з Ліпеня месяца 1921 г. Паездка карысна была-бы разам з гр. Анэкштэйнам, як сэкрэтаром.

З паездкай у складзе дэлегацыі праф. Прыняць да ведама.
Ляцкага дагэтуль ня выясьнена.
Паедуць Ластоўскі і Цвікевіч праз
Прагу і Вену.

Ластоўскі Жытлоўскі Цьвікевіч Грыб
582.1.41:053&r-054

3199. Расьпіска Вацлава Ластоўскага за 20.04.1922 (Бэрлін) аб выплаце Яўгену Ляцкаму 500 карон за Пятра Крэчэўскага і 300 карон за Міколу Вяршыніна

582.1.14:053&r

На адвароце адрас: Joachimfriedrichstr. 6.

3200. Справаздача прыбыткаў і выдаткаў у рассылцы бюлетэняў прэс-бюро і іншай карэспандэнцыі за красавік 1922 году

582.1.41:026 — мк

Дакладная дата невядомая. Склаў загадчык канцылярыі М.Севасьцянюк.

3201. Інфармацыя пра паштовыя маркі слуцкіх паўстанцаў

Удостовѣреніе

Сим удостовѣряется, что 1 Декабря 1920 г. штабом белорусской бригады (гор. Слуцк Минской губ.) оперировавшей против большевиков были выпущены марки с перепечаткой на польских марках достоинством в 25 грошей на 5 грош. (зеленая) и 50 грош. на 15 грош. (розовая).

Перепечатка: ручной чернильный штемпель изображающій «погоню» и буквы «Ч.Р.Сл.» (Часовая рада Случчыны).

Всего успѣло выйти из полевой почты достоинством в 50 грош. около 200 шт. и достоинством в 25 грош. около 20 шт., остальныя погибли во время пожара.

В настоящее время сохранилось только нѣсколько штук 3 (три) комплекта.

Подлинность представленных здѣсь марок удостовѣряем.

582.1.43:063&r — р

Рукапіс сінім алоўкам. Аўтар і дата невядомыя.

3202. Запіска Вацлава Ластоўскага (Коўна) невядомай асобе

Ваше Превосходительство

Мне прислали из Латгаліі мѣдную, повѣсную, золоченую печать княжества Курляндскаго и Жмудскаго с просьбой предложить литовскому музею для покупки. Деньги предназначаются на культурно-просвѣтительныя цѣли. Печатка оцѣнена 50 руб. золотом. Если Вас интересует данная печать соблаговолитѣ извѣстить когда Вы хотѣли-бы ее осмотреть.

582.1.43:064

Дата невядомая. Магчымы адрасат — дырэктар Ковенскага Гарадзкога Музэю, археоляг Эдуард Вольтэр.

3203. Візытоўка Владаса Юргуціса

Vladas Jurgutis
Užsienių Reikalų Ministeris.
Kaunas

[Тэкст на адвароце:]
Глубо[ко]уважаем. г. Министр.
Постараюсь все устроить на 23 с.м.
Съ глубм. ув... ВЮ
582.1.43:065

3204. Ліст невядомай асобы Вацлаву Ластоўскаму (Коўна)

Daražeńki dziadźka!

Warunki žyćcia u jakich ja ciapier apynuŭsia, zmusili mianie da taho, kab źwiarnucca da Was z prośbaj ab pomaczy. Užo skončyłasia try miesiacy jak siadžu bez pracy, nia majučy nijakoj nadziei atrymać jaje u chutkim časie, dziela taho, što pry pałažeńni jakoje tut wytwaryłasia, zrabić heta wielmi ciažka. Čuŭ ja, što i u Was z hetym nia duža dobra, ale pamiatajučy dobra Wašyja słowy i mocna im wieručy spadziajusia, što kali nie ciapier, to pry pieršaj mahčymaści Wy zrobicie ŭsio kab mianie prystroić. U kožnym wypadku prašu z łaski swajej dać adkaz, atrymaŭšy jaki budu wiedać što rabić dalej, bo čakać bolš nia možna i treba zhadzicca z losam.

[Подпіс]

P.S. Ci addać Jasakaru jaho zborniki, ab jakich jon prasiŭ, kali budzie mahčymaść?

582.1.43:043&r

Дата й абставіны невядомыя.

3205. Рукапісная візытоўка Платона Янкоўскага

Platonas Jankauskas
Dr. Ing.
Lietuvos Universiteto professorius
Kaune Universitete

582.1.43:198

3206. Адрасы падпісчыкаў «Беларускага Сьцягу»
генэрал-маёр Аляксандар Галубінцаў (Сафія)
Бачынскі (Жэнэва) — Укр.-швэйц. гандл. палата
Гэнрык Жылевіч (Фрыбург) — Рыма-катал. акадэмія
Henri Simson (Riga)
Dr. Wetwitsky Mission Ukr. Paris
«Голос Россіи» (Берлін)
Кандратовіч у Францыі (Neuilly sur Seine)
A.Kozak, 543 East. 11 st. NEW YORK N.A.America
582.1.47:096-101

Дата невядомая. Першы нумар «Беларускага Сьцягу» датаваны красавікомтраўнем 1922 году.

3207. Чортъ за работой // Эхо (Коўна). №125. ??.05.1922
582.2.59:022-023 — д

Дакладная дата невядомая. «Чорт» — псэўданім Яна Грыцука, камандзера баявога атраду, які дзеіў на Беласточчыне.

3208. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) невядомаму адрасату (Вільня?) [лета 1922?]

Высокапаважанае грамадзянства,

Зацішша патрывае цяпер даўжэйшы час, магчыма да будучай вясны, але яно немінуча закончыцца бурай, ў горне якой мы павінны выкаваць наш ідэал. Маюцца ~~ў маіх руках~~ некаторыя туга нацягнутыя ніці, якія ўвесь гэты час будуць іграць над Бугам і Немнам прэлюдзіі да будучых песень.

Што да будучых выбараў, пакуль не замацаваны межы на ўсходзе, наша тут думка — стрымацца, бо гэта было-бы адносным бытцым прызнаньнем прыганятага, якога ешчэ сільныя сьвету дагэтуль не прызналі. Ў кождым разе вельмі было-бы добра каб падзяліліся з намі сваімі аб гэтым думкамі: можна праз жыдоў.

«Бацькаўшчына» хочэ склікаць на восень у Двінску зьезд «Беларускай культуры і школы». Якія Вашы аб гэтым думкі і які модус прэдстаўніцтва на зьезд вы-бы пропанавалі?

На восень ладзім дэлегацыю у Амэрыку, ці не далі-бы каго аднаго ад Вас у склад яе?

У Прагу можна паслаць ешчэ чэлавек 20 студэнтаў у восень. Трэба цяпер зрабіць Вам выбар, каб дабраная ~~атрымаўся кампа~~ па сьвядомнасьці ~~была~~ атрымалася грамада.

Патрэбен мэморыал ~~ад бел духавенства~~ да Папы. ~~Могуць самі выслаць, але лепей каб праз нас~~. У мэморыале важны акуратна разпрацаваны матэрьял, магчыма вычэрпываючый справу. Мы пашлем праз нашых прыяцеляў, якія там на мейсцы дапільнуюць адповедзі.

~~Высокапаважаны,~~

~~Зацішша, панючае цяпер, закончыцца бурай у горне якой трэба будзе выкаваць і ўцелаіесьціць наш ідэал. У руках маіх маюцца многія, туга нацягнутыя ніці, па звону якіх можна угадываць будучыя песьні.~~

~~Тоя невядомае мы павінны сустрэціць адзінай воляй, адзіным высілкам. Выходзячы з вышэйпісаных мяркаванняў мяркуем склікаць на верасень зьезд Беларускай школы і культуры: з усіх часьцей Беларусі сабраць, асоб 30-40~~.

582.1.43:029&r

3209. Нарада Трох Інтэрнацыяналаў і пазыцыя Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў. Справаздача Тамаша Грыба. 1.05.1922

582.1.40:134-104 — мк

Пазначана алоўкам рукою В.Ластоўскага: «Прачытаўшы перадай другому!»

Справаздача аб Нарадзе выканкамаў Венскага Міжнароднага Сацыялістычнага Аб'яднаньня, II Інтэрнацыяналу й III Інтэрнацыяналу, якая адбылася ў Бэрліне 2.04.1922, дзе Т.Грыб удзельнічаў на правох гасьцей, бо БПС-Р не ўваходзіла ў склад ніводнай з гэтых трох арганізацыяў

Зьмест:

Дыскусіі ў справе перагляду мірных дагавораў, надзеі на разгляд пытаньня аб Рыскім міры;

Аб ходзе Нарады: Рэзолюцыя Нарады Трох Інтэрнацыяналаў. — Заява Венскага Аб'яднаньня. — Заява II-га Інтэрнацыяналу. — Заява III-га Інтэрнацыяналу. — Заява І.Цэрэтэлі. — Заява Нямецкай С.-Д.ціі;

Высновы. Аб поглядах бальшавікоў на права нацыяў на самавызначэньне.

3210. Суправаджальная запіска Дэлегацыі БНР да Мэмарандуму Ўраду БНР, пададзенага старшыні Генуэскай канфэрэнцыі Л.Факта і ўсім дэлегацыям 2.05.1922

Délégation de la République
Populaire de la Ruthène Blanche.

Gênes, 2 mai 1922.

La Délégation du Gouvernement de la République Ruthène Blanche a l'honneur de vous envoyer le mémoire exposant un des éléments du problème politico-économique de l'Europe Orientale. Par suite des événements actuels le Gouvernement de la République des Ruthènes Blancs n'est pas reconnu par les Puissances Alliées et n'a pas été invité à participer à la Conférence de Gênes. Néanmoins ce fait ne prive pas le dit Gouvernement qui représente une population de douze millions d'habitants d'être écouté comme son seul représentant.

Le peuple Blanc-Ruthène ne consentira jamais à être un objet à partager entre la Russie et la Pologne. Si la Haute Conférence disposait des Blancs-Ruthènes en faveur de Moscou — Bolchéviste ou de Varsovie — Agressive le peuple continuera à lutter pour son indépendance. Ce peuple qui a sacrifié tant de victimes et qui attend sa liberté pour son développement ne se soumettra jamais à l'esclavage d'un Etat lui étant étranger et hostile. Au nom du Peuple que nous representons nous osons espérer que la Justice due aux Blancs-Ruthènes sera reconnue de Votre Excellence.

Veuillez agréer, Monsieur ..... l'expression de notre haute considération.

582.1.40:180
582.1.40:179

3211. Паштоўка Ясафата Жана (Генуя) княгіні Магдалене Радзівіл (Коўна) за 2.05.1922

Altesse,

J'ai été très heureux d'apprendre par S<on> E<xcellence> le Premier Ministre Lastovski que Vous demeurez à présent dans un pays de liberté en attendant l'heureux moment où Votre Altesse pourra en jouir "at home".

Depuis mon départ de Varsovie je travaille sans relâche pour la Sainte Cause des Opprimés et j'espère que bientôt luira le vrai soleil de la Paix et de la Justice.

In Christo Josaphat Jean O<rdini> S<ancti> B<asilii> M<agni>.

[На здымку:]

Tombeau de saint Josaphat offert par ma famille. Eglise de Sainte Barbe à Vienne où je demeure habituellement. Franziskanerplatz 4 Wien I.

582.1.43:044

3212. Фатаграфія з надпісам «Тіло сьвятого Йосафата у Відні»

582.1.43:042

3213. Улётка «Свят. Священномученик Йосафат Кунцевич»

582.1.43:051 — д

Партрэт, на адвароце тэкст у трох мовах.

3214. Ліст міравога судзьдзі II-ой Ковенскай акругі Язэпу Варонку за 2.05.1922 з паведамленьнем аб завочнай судовай пастанове: спагнаць на карысьць Я.Варонкі з Юозаса Этынгера 565 аўксінаў.

582.2.06:030

3215. Зварот Дэлегацыі БНР на Генуэскай канфэрэнцыі да мансіньёра Джозуэ Сіньёрі, арцыбіскупа Генуэскага за 2(?).05.1922 (вых. №17) у справе становішча беларусаў-каталікоў пад польскай акупацыяй

582.1.41:022-023 — мк

582.1.41:024-025 — мк

Дакладная дата невядомая.

3216. Зварот Дэлегацыі БНР на Генуэскай канфэрэнцыі да старшыні канфэрэнцыі Л.Факта за 3.05.1922 (вых. №18)

Дэлегацыя
Беларускай Народнай Рэспублікі
№18
Гэнуя, 3 травеня 1922 г.

Яго Дастойнасьці п. Факта, Старшыне
Канфэрэнцыі дзержаў у Генуе, Старшыне
Рады Міністраў Яго Велічэства Караля
Італіі.

Пане Прэзыдэнт.

Прыймаючы пад увагу, што пытаньне дзержаўнай прыналежнасьці Віленскай тэрыторыі мае вялікае значэньне з пункту гледжаньня падтрыманьня міру у Усходняй Эўропе, дэлегацыя Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі мае гонар прэдставіць Вашай Дастойнасьці жаданьня насяленьня

гэтай тэрыторыі і прасіць рэкамэндаваць іх прыхільнай увазе міжнародавай Канфэрэнцыі у Гэнуі.

Дзьве дзержавы прэтэндуюць на Вільню: Літва, якой Вільня усёгды была стольным местам і якая, пазбаўленая гэтага эканамічнага і умысловага цэнтру ня можэ нормальна развівацца; і Польшча, якая апірае свае прэтэнсьі на праве заваеваньня. Але ні факт ваеннай акупацыі Вільні, ні яе гістарычнай прошласьці не складаюць рашучых фактараў канфлікту.

Дзеля урэгуляваньня гэтага пытаньня трэба асабліва апірацца на сучасныя жыцьцёвыя інтарэсы і на волі насяленьня Віленскай тэрыторыі.

Беларускі народ пераконан у тым, што:

1) прылучэньне Вільні да Польшчы аддзеліць гэтае места ад Балтыцкіх прыморскіх зямель з якімі беларускія землі зьвязаны эканамічна самой прыродай; гэтае прылучэньня засудзіла-бы гаспадарку, гандаль і прамысловасьць Віленшчыны на поўны застой. Да гэтага дадаліся бы другія варункі, выцекаючыя з паняволяньня беларускага насяленьня Польшчай, няздольнай забаспечыць яму яго поўнае палітычнае і эканамічнае разьвіцьцё.

2) Прылучэньне Вільні да Польшчы раўнялась бы для беларускага селяніна звароту пад фэадальнае ярмо польскіх паноў. Польскае панаваньня праціўна характару і жаданьням беларускага селяніна. Для яго Польшча зьяўляецца дзяржавай антыдэмакратычнай і варожай яго нацыянальнай, рэлігійнай і соцыяльнай эволюцыі.

Польскія улады сілкуюцца прыдушыць нацыянальнае беларускае адраджэньня, вярнуць нашых селян у няволю і эксплоатаваць прыродныя дары нашага народу дзеля адзінай выгады польскай культуры.

Беларуская нацыя ніколі не пагодзіцца з падобным становішчам і будзе працівіцца усімі сваімі сіламі процію хоць бы часовага прылучэньня якой небудзь са сваіх тэрыторый да Польшчы.

Беларускае насяленьня Віленскай тэрыторыі поўнай меры сьвядома мэт, інтэрэсуючых Польшчу у яе Віленскай акцыі, і асіміліруе агрэсіўную палітыку Польшчы у гэтым пытаньні з іншымі несправядлівымі вымаганьнямі такога роду, як тыя, якія маюць аб'ектам адбудаваньня польскіх граніц 1772 году, абхопліваючых Беларусь, Усходнюю Галіцыю і Польскія Інфлянты.

Вымаганьня Польшчы не маюць ніякай моцнай астоі, і дзеля гэтага беларускае насяленьня спадзеваецца, што міжнародовая Канфэрэнцыя у Гэнуі не падтрымае агрэсыўную палітыку Польшчы.

Што датычыцца Літвы, то беларускае насяленьня годзіцца з тым, каб Вільня стала тым, чым яна заўсёды была — стольным местам Літоўскай дзержавы. Прызнаньне Вільні за Літвой адпаведала бы эканамічным і нацыянальным інтэрэсам гэтага краю.

Мы сьведчым перад міжнародовай Канфэрэнцыяй, што гэта ёсьць погляд беларускага насяленьня Віленскай тэрыторыі і што беларусы і літоўцы ужо сталецьця аб'еднаны супольнасьцю інтэрасаў і шчырай дружбай. Будучыня гэтага краю павінна быць аснавана на літоўска-беларускім аб'еднаньні, а не на несталых адносінах з Польшчай, якая жыве імпэрыялістычнымі тэндэнцыямі з ваінственнымі знешнімі праяўленьнямі.

Вось прычына дзеля якой беларускае насяленьня сьвядомае безадкладнай неабходнасьці прылучэньня Вільні да Літоўскай Рэспублікі

уважліва просіць Канфэрэнцыю зьвярнуць сваю увагу на карыснасьць двух ніжэйпададзенных мер:

1) Віленская тэрыторыя, пасьля далучэньня яе да Літоўскай дзяржавы, будзе карыстацца самай шырокай аўтаноміяй і будзе мець уласны Парлямант, які зьявіцца гарантыяй палітычных правоў ня толькі большасьці насяленьня беларусоў, але і меншасьцяў — жыдоўскай і польскай названай тэрыторыі.

2) Аўтаномная тэрыторыя Вільні ня будзе агранічана межамі даўняй губэрніі таго-ж імяні, але у яе увойдзе уся тэрыторыя эканамічна залежная ад Вільні і знаходзячаяся на захад ад лініі Керзона.

Прыміце, Пане Прэзыдэнт, запэўненьне у нашай глыбокай пашане.

Старшыня Рады Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі.
Міністр Загранічных Спраў.
582.1.41:055-057 — мк бел
582.1.41:027-029 — мк анг

3217. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Витовта пр. 30) за 4.05.1922 (№28)

Бѣлорусская Делегація въ Генуѣ. — Религіозныя преслѣдованія. — Пожары лѣсныхъ заготовокъ. — Смерть Александра Бурбиса.

582.1.40:138
582.1.40:135

3218. Пасьведчаньне, выдадзенае Вацлаву Ластоўскаму як кур'еру Літоўскае дэлегацыі на Генуэскай канфэрэнцыі 4.05.1922

Delegation de Lithuanie
à la Conférence de Gènes
no31
Gènes, le 4 Avril [sic!] 1922

Certificat

Nous, Délégation de Lithuanie à la Conférence de Gènes, certifions que Monsieur Waclaw LASTOWSKI, porteur du présent certificat, est chargé par nous de remettre le paquet diplomatique no 32 au MINISTERE DES AFFAIRES ETRANGERES du GOUVERNEMENT LITHUANIEN à KOVNO.

L.Bistras Premier Secrétaire de la Délégation

582.1.43:062

3219. Чарнавік тэлеграмы Дэлегацыі БНР на Генуэскай канфэрэнцыі дэпутату Італійскага Парлямэнту ад Сялянскай Партыі Скотті за 4.05.1922 (вых. №19)

582.1.41:050&r — p

Прывітальная тэлеграма была дасланая перад ад'ездам дэлэгацыі з Генуі. Падпісалі Ластоўскі й Цьвікевіч.

3220. Квіток аб уплаце 9 ліраў за тэлеграму з Генуі ў Монтогроссо за 4.05.1922

582.1.43:070

3221. Цэтлік замовы №3099 на тавары ў фірме «Schäfer & Clauss» (Бэрлін) за 8.05.1922

582.1.43:066

Замоўнік — Аляксандар Цьвікевіч.

3222. Ліст Пятра Крэчэўскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму й Аляксандру Цьвікевічу (Паланга?) за 9.05.1922 з праектам Грыгорыя Ракоўскага «Краткія, бѣглыя соображенія по вопросу объ организаціи Прессъ-Бюро при берлинскомъ Бѣлорусскомъ представительствѣ»

[...]

9.V.22.

Вось праэкт Прэс-бюро накіданы Ракоўскім, разглядзіце яго і разумеецца перш наперш трэба ведаць якімі сродкамі мы можам распалагаць, каб што небудзь запрапанаваць рэальна яму. Калі б удалось гэта зрабіць наша інфармацая сталаб на цьвердые ногі — ен ужо па троху вядзе перэгаворы з газэтамі і журналамі.

Учора паслаў Вам ліст, сягодня пішу другі, але не пэвен у тым, што Вы дома. Трэба Вам усе-ж такі напісаць да якога часу будзеце у Бэрліне, каб добра спісацца аб усіх справах.

Паінфармуйце мяне аб палажэньню у Няметчыне.

Хай яна сгарыць тая Ваша Гэнуэзская Конфэрэнцыя, яна мяне так сама падвела на 200 карон з тэлеграмамі, пры нашай беднасьці, гэта чорт ведае што; бо прышлось паслаць тую тэлеграмму, што я Вам ужо пісаў, усім тром — Факта, Ллойд-Джорджу і Барту.

Усе інфармацыі аб Конфэрэнцыі і нашай дэлегацыі павінны зьявіцца заўтра, чы пасля заўтра, як у чэскай, так і расейскай прэсі.

Пакуль што давайце як мага больш інфармацый і добра гатуйце матэрыял, якім бы можна было проста кідацца у час вырэшэньня Віленскаго пытаньня у Лізе Нацый. Гэта нічога, што як бы цяпер на нас не зварачаюць увагі, але у час вырэшэньня трэба, каб у нашых прыяцелеў, а так само і у змагальнікаў з Францыей і Польшчай было як мага больш матэрыялу, якім бы яны маглі апэраваць у патрэбны час.

Цяпер як ніколі нам трэба быць на чэку, бо можэ гэта апошняя хвіліна, дзе мы адчуем жывем мы, чы не. Момэнт адпаведны і напружэньне павінно быць вялікае. Гэнуя раскрыла усе слабые стороны як Эўропы, так і Масквы — цяпер трэба біць толькі па адпаведнаму мейсцу.

Я яшчэ не ведаю выследаў Вашых размоў у Гэнуі, але пэвен у тым, што для Вас цяпер ясна, што трэба рабіць. — Мажліва што Бэнэш адыйдзе і будзе назначаны у Лендан — трэба падумаць і аб тых гутарках, якіе былі з Ляцкім — калі можна, то трэба было б каб ен праехауся у Парыж і Лендан.

Усе ж такі шкода, што Вы не заехалі у Прагу, усе было б відней, а так зноў прыдзецца чэкаць і думаць, а час не жджэ.

Калі ж Вы усе заберецесь у Палангу, то тады ад Вас не дачакаешся і слова, а чы змагу я што рабіць тут пры безграшовьі — неведама.

Пішыце хучэй, будзьце здаровы —

Прывет усім. Ваш Петра.

582.1.43:011&r-012&r

3223. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Витовта пр. 30) за 11.05.1922 (№29)

Делегація правительства Бѣлорусской Народной Республики въ Генуѣ: — Врученіе меморіала. — У Генуэзскаго Архіепископа. — Совѣщаніе въ Генуѣ. — Бѣлорусская делегація въ Англіи[1]

582.1.40:139

[1] «11 мая выѣхала въ Лондонъ Делегація Бѣлорусской Народной Республики во главѣ съ Министромъ Національныхъ Меньшинствъ С.Жытловскимъ».

3224. Расьпіска Бронюса Казіса Балутіса (МЗС Літвы) у атрыманьні пакета №32, дастаўленага Вацлавам Ластоўскім з Генуі за 11.05.1922

582.1.43:197

3225. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (Витовта пр. 30) за 12.05.1922 (№30)

Делегація Бѣлорусской Народной Республики въ Генуѣ: — Крестьянскій интернаціоналъ. — Фашисты о бѣлорусскомъ вопросѣ. — Нейтральный поясъ.

582.1.40:137
582.1.40:136

3226. Ліст Міністэрства Замежных Справаў Літоўскай Рэспублікі Беларускай Місіі ў Коўне за 13.05.1922 (вых. №12217) зь інфармацыяй аб урачыстасьцях 15.05.1922 у гонар II-й гадавіны скліканьня Устаноўчага Сойму

582.1.40:140

3227. Ліст дырэктара Цэнтральнага Дзяржаўнага Архіва Літвы (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.05.1922 (вых. №325)

Gudų Ministerių Tarybos Pirmininkui p. Lastauskiui

Turiu garbės pranešti, kad prie išrinkimo dėžių su reevokuotu iš Rusijos turtu, vienoje iš skrynių, tarp bylų ir knygų įvairių įstaigų, rasta ryšulys su Tamstos dokumentais.

Reikalui esant, kalbamieji dokumentai gali būti išduoti Tamstai sulig sąrašo ir po įnešimo nustatytos sumos išlaidų už pervežimą.

E. p. Centralinio Valstybės Archyvo Direktorius Andrej...

582.1.43:050

3228. Ліст Старшыні РНМ Вацлава Ластоўскага вык. аб. Міністра Фінансаў Аляксандру Вальковічу за 18.05.1922 (вых. №152)

Пры усіх пастановах Рады Міністраў грам. Вальковіч быў, а будучы пры пастановах і падпісываючы павінен іх ведаць. Акром пастаноў маецца цэлы рад дакумэнтаў гаворачых аб патрэбе звядзеньня рахунковасьці, між іншым даручан грам. Вальковічу пратакол рэвізыйнай Камісыі ад 18.VIII.21 за подпісямі грам. Грыба, Зайца, Мамонькі.

Грам. Вальковіч добра ведае, што ўсе пратаколы Рады Міністраў знаходзяцца у Дзержаўнага Кантралёра і заўсёды адкрыты для ўсякіх справак сябрам Ураду. Сам грам. Вальковіч дагэтуль карыстаўся спраўкамі з пратаколаў у Дзержаўнага Кантралёра. Вымаганьня выпісак я разумею як спробу грам. Вальковіча гэтай дарогай ешчэ адцягнуць і так да бязбожнасьці зацягнутую справаздачу па міністэрству фінансаў.

Дзержаўны Кантроль дакладае мне ад 27.IV за №16, што Вы, грам. Вальковіч, не глядзя на ўсе яго, Кантралёра, стараньня і запатрэбаваньня дагэтуль не далі абаснованага і закончанага адчоту і абецаліся, пад прэтэкстамі жыцьцёвых абставін — прэдставіць у пачатках травеня. Сягоньня другая палавіна травеня.

Дзеля гэтага, калі да 22 травеня ня будзе Вамі дадзен поўны адчот, я буду прымушан назначыць Камісыю дзеля прыему ад Вас рахунковасьці.

582.1.43:228 — мк

3229. Арыгінал артыкулу: Д.Семашко. Литовско-бѣлорусскій вопросъ и вопросъ о національныхъ меньшинствахъ въ Литвѣ // Lietuva. №112. 19.05.1922

582.1.42:005&r-006 — мк
582.1.42:044&r-045 — мк

3230. Lietuva. №112. 19.05.1922

[З артыкулам:] D.Semaško. Lietuvos gudų ir tautinių mažumų klausimas Lietuvoje

582.1.42:N - паміж 045 і 046

3231. Lietuvos Žinios. №67. 20.05.1922

[З артыкулам:] Konstitucijos 80 str. ir Baltgudžių Ministerija

582.1.42:047

3232. Пераклад артыкулу: 80 статья Конституціи и Министерство Бѣлорусскихъ Дѣлъ (Рэдакцыйны артыкул) // Lietuvos Žinios. №67. 20.05.1922

582.1.42:007&r — мк
582.1.42:043&r — мк

3233. Пераклад артыкулу: 80 статья Конституціи и Министерство Бѣлорусскихъ Дѣлъ (Рэдакцыйны артыкул) // Lietuvos Žinios. №67. 20.05.1922

582.1.42:024-026 — мк
582.1.42:027-029 — мк
582.1.42:032-034 — мк
582.1.42:040 — рк

Іншы тэкст перакладу. На блянку Аддзелу Друку Міністэрства Жыдоўскіх Справаў Літвы.

3234. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Паланга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.05.1922

20.V.22.
Palanga.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Пасылаю Вам запіску Ракоўскага с пісьмом П:К<рэчэўскага>. Думаю, што разгледзім пытаньне аб Рак<оўскім>, калі прыеду.

У Бэрліне, па рэкамэндацыі Б.К. Міллера я прызначыў вык. абав. нашага гандлевага агента у Вене нейкага пана Сьпіро. Даручыў яму зьбіраць грошы на наш Чырвоны Крыж і разглядзець справу з банкам і друкам. Можа што і выйдзе. У кожным разе будзе адрэс і асоба для рожных даручэньняў. Між іншым у Вену прызначан Савецкі Пасол Шліхтэр — магчыма, што мой добры знаёмы па Маскве. Тагды можна будзе пачаць нейкую акцыю.

Жытлоўскі ужо выехаў у Лёндан.

Бар<оўскі> выезджае у Маскву каля 10/VI.

Бывайце АлЦвікевіч.

582.1.43:013

3235. Паштоўка Аляксандра Цьвікевіча (Паланга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 24.05.1922

24.V.22.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Прыехаўшы сюды — я апынуўся у глупым становішчу: трэці дзень пазычаем харчы у доўг. Пісаў Вам — каб выслалі мне пэнсыю за красавік і травень (за вычэтам Вашых трох тысяч) але праходзіць тыдзень, і грошы німа. Гаспадару трэба плаціць за дачу. Сей час пасылаю тэлеграму — патурбуйцесь, зрабіце ласку, бо гэткае «дачнае» палажэньне — ніхай яго ліха. Па атрыманьні грошы — выеду. Ваш АлЦвікевіч

582.1.43:028

3236. Паштоўка Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна, Vytauto, 30) за 30.05.1922

30.V.22.

Паважаны п. Ластоўскі!

Як жа будзе з той друкарскаю машынаю? Ужо даўно мяне паведамілі, што машына ў парадку и чакаець нас каб хутчэй купілі яе. Грошы няма ні ў мяне ні ў Бар<оўскага>, каб заплаціць гэткую суму.

Сёньня выяжджае Паулінка ў Коўна[1]. Застаюся я адзін тут сіратою. Усё ганяюсь па Бэрліну і зарабляю на жыцьцё. Працую нават у вайсковам расейскім журнале — хоць я самы заўзяты ненавісьнік вайны і всяго вайсковага. Тó сьмяецца лёс з мяне!... Свае працы усе прыпыніў — няма вольнай гадзіны нават. Жонцэ вашай паклон. Пісьмо яе адправіў у Вільню.

Усяго найлепшага. Ваш І.Цвік...

582.1.14:003

[1] Аб працы П.Мядзёлкі ў Бэрліне гл.: П.Мядзёлка. Сцежкамі жыцця. Менск, 1974. С.206-207.

3237. Пераклад артыкулу: Из отдѣла «Обзоръ печати» // Lietuvos Žinios. №74. 30.05.1922

582.1.42:017-018 — мк
582.1.42:030-031 — мк
582.1.42:041-042 — мк

На блянку Аддзелу Друку Міністэрства Жыдоўскіх Спраўаў Літвы. Пра становішча жыдоў у Літве.

3238. Ліст Старшыні РНМ у Цэнтральную Ўправу Саюзу Літоўскіх Стральцоў

582.1.43:242 — мк

Дата невядомая. Просьба адказаць на ліст за 8.06.1922 (вых. №154), «з прапазіцыяй аб устаноуленьні пры [СЛС] сваяго прэдстаўніцтва у мэтах супольнай брацкай барацьбы з ворагам, акупаваўшым літоускія і беларускія землі».

3239. Гектаграфаваны артыкул «Колас і Купала. Штрыхі» (Да 40-годзьдзя Коласа й Купалы)

582.2.06:056-058

3240. Паштоўка Давіда Анэкштэйна (Лёндан) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.06.1922

London, 2nd of June 1922

Вельмі паважаны пане Старшыня! Нам вельмі патребны альбомы з газэтамі Čas, і іншымі з часу Пражскай канфэрэнцыі, гдзе ёсьць процію-пагромныя рэзалюцыі, а таксама і іншыя выразкі з газэт, з якіх відаць, што наш Урад выступіў на абарону жыдоў. Патрэбен толькі такі матэрыял, які быў надрукован ў газэтах, часопісях, або выдан як брашурка. Пісаў на конто гэтаго п. Бароўскаму аліж не спадзеваюсь, каб ён зараз жэ выслаў. Са шчырай пашанай Д.Анэкштэйн.

582.1.43:040

3241. Lietuva. Nr. 123(945). 2.06.1922

[З артыкулам:] Gudų reikalai

582.2.06:011

3242. Ліст Віталя Бендэроўскага (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.06.1922

[...] Костюм якій Ви доручили продати — вже продав за дві тисячі марок більше неяк невдалось взяти бо була дуже кепська ткань. Гроши на днях Вам пересилаю, а также і ті три тисячі які Ви були так ласкові мені пожичити. [...] Для Вас [...] я маю дуже цікаву колекцію марок і грошей [...]

582.1.43:055

3243. Позва Вацлаву Ластоўскаму на пасяджэньне Цэнтральнай Рады Саюзу Сялянаў-Беларусаў у Літве, якое мае адбыцца 9.06.1922

582.1.43:061

Паседжаньне ў справе адчыненьня настаўніцкіх курсаў для беларускіх пачатковых школ.

3244. Пераклад артыкулу: Бѣлоруссъ. О министерствѣ бѣлорусскихъ дѣлъ // Lietuvos Žinios. №86. 14.06.1922

582.1.42:008&r-009 — мк

Рэакцыя на артыкул Д.Сямашкі «Литовско-бѣлорусскій вопрос...». Псэўданім у літоўскім тэксьце — Gudas.

3245. Паштоўка Янкі Чарапука (Данцыг) Тамашу Грыбу (Коўна, Vytauto pr. №30) за 15.06.1922

Даражэнькі

Шлю мае сардэчнае прывітаньне усім сябрам Грамады. Сеньня моцно помню наш дэвіз

змагаймося — зможам

Цалую ўсіх

Ваш Я.Чарапук

Параход «Латвія» перад ад'ездам у Амерыку.

582.1.14:064

3246. Паштоўка Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Аляксандру Цьвікевічу (Коўна) за 17.06.1922

[...] Калі прыедзеш? [...] Бароўскі ўжо зьбіраецца да ад'езду ў Маскву.

582.1.14:004

3247. Паштоўка Станіславы Ластоўскай (Паланга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.06.1922

22.VI.1922. Палонга.

Дарагі Ваценька,

Што у Цябе чуваць? Ці прыехала Ганка? Як з кватерай. У нас усе зімна і зімна, а ужо тыдзень прайшоў. Шкада кожнаго прайшоўшаго дня. Настрой добры, толькі думаю як ты там сабе раду даеш. Мо завітаеш да нас?

Цалую крэпка Стаха. Пішы

582.1.14:063

3248. Арыгінал артыкулу: Д.Семашко. Кое-что про бѣлорусскія дѣла. Отвѣтъ на статью дискуссіи г. Бѣлорусса въ №86 [газ. «Lietuvos Žinios»] отъ 14 іюня с.г. «Про Бѣлорусское Министерство» // Lietuvos Žinios. №92. 22.06.1922

582.1.42:002-003-N — мк

582.1.42:010-012 — мк (іншы пераклад)

Датавана 16.06.1922.

3249. Ліст прадстаўнікоў Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту Аляксандра Карабача і Ўладзімера Пракулевіча (Коўна) старшыні Ўсходняй Камісіі прафэсару Зігмасу Жэмайцісу (Коўна) за 22.06.1922 з паведамленьнем аб зьняцьці зь сябе прадстаўніцтва ВБНК перад літоўскімі ўстановамі й просьбай вярнуць каштарыс аб дапамозе віленскім беларускім арганізацыям

582.1.43:082 — мк

3250. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 24.06.1922

24.VI.22.
Рыга.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,
пасылайце мне срочна з Вальковічам матарьялы для друку:
аб Гэнуэскай Канфэрэнцыі,
" працы ў Вільні,
" бел. нац. меньшасьці ў Літве і
" працы Ураду БНР.

У панядзелак, 26-га, пачынае выхадзіць безпартыйна-дэмакратычна-незалежная газэта. Мова — расейская. Назва — «Маяк». Тыднёвая (на большае не змаглі адшукаць грошы). Бараніць будзе вялікарускія (не расейскія) і беларускія інтэрэсы.

Друкавацца — у Рызе. Рэдактар — Н.Бордонос.

Я не чакаў адказу Вашага, бо лічыў і быў пэўны, што, незалежна навэт ад Конфэрэнцыі, Вы добра разумееце патрэбу незалежнай і вольнай ад Ковенскіх уплываў газэты і падтрымаеце яе.

Буду тутака да аўторка: 27-го выеду ў 12½ часоў ночы да Дзьвінску.

Інструкцыі прышліце з Вальковічам.

Аб яго прыездзе тэлэграфуйце ў Рыгу.

З пашанай К.Езавітаў

582.1.14:045&r-046

3251. Паштоўка Р.Абрамсона (Коўна, Gardino 51) «копетану Г-ну Карповскому (Kaunas, бывш. Михайловскій пр. 30, против кладбища)» за 24.06.1922

582.1.14:002

3252. Lietuvos Žinios. №97. 29.06.1922

[З артыкулам:] N.N. Gudų bruzdėjimai

582.1.42:046

3253. Ліст Дэпартамэнту Працы, Камунікацыяў і Публічных Работаў (Вільня) Віленскай Праваслаўнай Эпархіяльнай Радзе за 30.06.1922 з паведамленьнем аб пастанове Дэпартамэнту Працы, Камунікацыяў і Публічных Работаў за 30.06.1922 (вых. №2758) аб перадачы будынкаў базыльянскага кляштару (Вострабрамская, 9) у Дзяржаўны Скарб

582.2.52:099&r — odpis

3254. Плян Прагі. Orientační plán sídel. hlav. města Prahy

582.1.43:260

Дата невядомая.

3255. Паштоўка Станіславы Ластоўскай (Паланга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.07.1922

У адной з сваіх адкрытак пішеш аб бялізне. Патрэбны посцілкі і ручнікі, але ужо фактычна большую палова вакацыі прайшла, бо ужо трэйці

тыдзень, а як прыедуць усе мужы зразу то жыць не будзе дзе, а каля першаго мае прыехаць і Александр Іванавіч. А як наконто хаты ў Коўне, дзе цяпер жывеш, у якім пакою? Я усе яшчэ мела надзею што прыедзеш у Палангу, як не дык да хуткаго пабачэньня у Коўне.

Цалую крэпка Стася

582.1.14:062— памылковая нумарацыя, мусіла б быць 63

3256. Выпіска з загаду Беларускага Асобнага Батальёну Літоўскага Войска №184 за 1.07.1922

ВЫПІСКА
з прыказа БЕЛАРУСКАГА Асобнага батальену
№184
Ліпеня 1 дня 1922 года, м. Вількавішкі
ЧАСЬЦЬ ШЫХОВАЯ
§1.

Для усіх афіцэрау і вайсковых чыноунікау даручанага мне батальену устанауліваю курсы Беларускае мовы пад кірауніцтвам афіцэра ПЛЕСКАЧЭУСКАГА.

Апошняму патурбавацца, каб у працягу 2-х месяцау ад пачатку заняткау на курсах знаеміць слухачоу з усімі галоунымі асаблівасьцямі мовы, з выдатнейшымі творамі мастацкае Беларускае літэратуры і г. д. Канчатковая мэта навучэньня — ауладаць вуснаю і пісьмоваю Беларускаю моваю натолькі, каб у часе заняткау з жаунерамі і на огул ува усіх публічных мейсцох ужываць і карыстацца толькі ею.

Па сканчаньні 2-х месячных заняткау будзе учынены экзамен і тыя з п.п. афіцэрау і чыноунікау батальену, якія ня вытрымаюць яго, будуць належаць да адлічэньня у разэрву чыноу згодна прыказу па войску №283 §1 п.2.

Орыгінал падпісаў: Камандзер батальену, МАЕР РОЗМАНАС.

582.1.43:231

3257. Ліст Беларускага Нацыянальнага Камітэту (Вільня) дэлегату Ўраду Рэчыпаспалітай Польшчы ў Вільні за 4.07.1922 у сувязі з пастановай Дэпартамэнту Працы, Камунікацыяў і Публічых Работаў за 30.06.1922 (вых. №2758) аб перадачы будынкаў базыльянскага кляштару (Вострабрамская, 9) у Дзяржаўны Скарб

582.2.52:027&r-028 — odpis
582.2.52:097&r-098&r — мк
582.2.52:103&r-105 — рк фра
582.2.52:112&r-113 — odpis
582.2.52:114&r-115 — odpis
582.2.52:116&r-117 — odpis

3258. Ліст Антона Луцкевіча (Вільня) прэм'ер-міністру Чэха-Славацкай Рэспублікі Бэнэшу (Прага) за 5.07.1922 з просьбай дадаць да выдзеленых дагэтуль 20-ці яшчэ 50 стыпэндыяў для беларусаў у вышэйшых навучальных установах Чэхаславаччыны

582.2.20:007-007a-007b

3259. Ліст Пятра Крэчэўскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму й Аляксандру Цьвікевічу (Коўна) за 7.07.1922

7.VII.22. Прага.

Дарагія таварышчы!

Надта прыкро мне было прачытаць у «Украінскам Прапоры» ад 1 ліпеня аб тэй бойцы, якая была у вас[1]. «Паліцэю по галаві», як піша прапар у вас разрубаны гордзіеу узял, не ведаю толькі, чы прынцыповаго, чы асабістаго характэру. І у адным і у другім выпадку справа ясная, да вырэшэньня суду (будзь то партыйный, чы трэцейскі і найменш Урадовы, бо ен можа быць толькі компромитацією, ужо нават бэз права апэляцыі, куды бы то ні было) павінны быць адстранены ад спаўненьня свайго абязку.

Так трэба было зрабіць ужо даўно, бо тут німа ніякого крызысу, а звычайная рэч.

Мне Базыль пішэ, што калі я не прыеду да 15 ліпеня, чаго я і сам надта хачу і можа і здолею, а калі спознюсь, то не надоўга, то ен прымецца за справу сам. Так і трэба было зрабіць адразу.

Но справа не у тым цяпер есьць справы больш паважныя. На 17 ліпеня у Лендане збіраецца Вярхоўная Рада Лігі Нацый на павестку дня пастаўлена пытаньне об меншасьцях у Польшчэ, гэта значыць у адносінах да нас — Гродзеншчыне і Віленшчыне. Аб гэтым я ужо пісаў Вам і раней, думаю што адпаведны мемарьял і подпісы хаця бы выгнаннаго з Вільны Нац Камітэту маеце, а калі не, то трэба тэлеграмай даць у Лендан больш менш важные рэчы у гэтай справе і прасіць апроса мейсцовых жыхароў.

Як раз у час заўтра выйдзе Воля Расеі з артыкулам аб уцісках беларусоў, думаю заставіць што небудзь у гэтым сэнсі напісаць і Голас Расеі.

Добра было б каб да зьезду Рады у Лендану выдаць лістоўку на расейскай, ці французскай мове аб усіх здеках у Польшчы і пераслаць у Лендан і Парыж. Думаю, што матэрыялу есьць аж досыць.

У Празе гатуемся да агромнай дэманстрацыі у дзень сканчэньня працэсу с-р. Прыймаюць з чэскага боку усі соцыялістычные партыі і з нашаго боку усе нацыянальнасьці, у якім мае сымболізавацца едыны соцыялістычны фронт проціў камуністаў і правых.

Салідарызацыя сіл поўная.

Вышліце больш «Беларусскаго Сьцягу» няужож Вы прыслалі два нумэры толькі на паказ. Нам трэба не менш як экземпляраў 50-100, бо трэба даць усім. Мы так маем мало друкованых рэчэй, што трэба хоць такім чынам здавальняць публіку, а спрос досыць вялікі. Маем мейсцэ дзе можна былоб выставіць і на продаж.

Бывайце здаровы да хуткаго пабачэньня. Пётра.

P.S. Дзе Жытлоўскі, то усе гэта можна зрабіць праз яго калі ен у Лондане, калі не, то трэба усе рабіць як найхучэй. Бо палякі штось надта спешаюцца з гэтай справай.

Петра.

582.1.43:261&r

[1] Український Прапор (Вена). №26. 1.07.1922:

«Білоруські справи. Про відносини на Білоруси одержали ми в останнім часі допись з тамошніх громадянських кругів [...] При кінці дописі жалується автор на здичіннє, спричинене лихоліттєм чотиролітньої еміґрації і пише про такі події: В

Ковні, теперішнім осідку білоруської народньої республики (Ластовського), мали в останніх часах місце дуже прикрі сцени. І так ударив на однім засіданню міністер державної контролі Заяц (с.-р.) міністра внутрішніх справ і пропаґанди Томаша Гриба (с.-р.) палицею по голові. Справу покищо віддано під партійний суд. Знов-же редактор орґану білоруської партії Антонау зайшов до міністра білоруських справ у литовськім уряді Семашка й по суперечці з ним кинувся на нього з кулаками. Тільки завдяки тому, що міністер мав коло себе револьвер (!), удалося йому оборонитись перед хоробрим с.-ром!».

3260. Пераклад ліста супрацоўніка МЗС Літвы Усевалада Боева рэдакцыі газэты «Lietuvos Žinios» // Lietuvos Žinios. №104. 8.07.1922

582.1.42:013 — мк

Рэакцыя на артыкул Д.Сямашкі «Кое-что про бѣлорусскія дѣла».

3261. Ліст Дамініка Сямашкі рэдакцыі газэты «Lietuvos Žinios» за 13.07.1922

582.1.42:014 — мк

Адказ на ліст У.Боева рэдакцыі газэты «Lietuvos Žinios».

3262. Пераклад ліста былога супрацоўніка Міністэрства Беларускіх Справаў Літвы Івана Антонава рэдакцыі газэты «Lietuvos Žinios» // Lietuvos Žinios. №110. 15.07.1922

582.1.42:015&r — мк

Датавана 2.07.1922. Рэакцыя на артыкул Д.Сямашкі «Кое-что про бѣлорусскія дѣла».

3263. Заява Аляксандра Карабача Ўраду БНР за 19.07.1922 з просьбай выплаціць яму пэнсію за 1921 год па абавязку камісара Ўраду на Віленшчыну

582.1.43:024

З рэзалюцыяй міністра ўнутраных справаў і прапаганды БНР Т.Грыба за 20.07.1922 (Коўна) — прапанова А.Карабачу прадставіць падрабязную пісьмовую справаздачу за яго дзейнасьць у якасьці камісара. «Гэтак сама і ў справе Пракулевіча (на Меншчыну) і Барана (на Горадзеншчыну)».

3264. Ліст Дэпартамэнту Агульных Справаў Міністэрства Асьветы Літвы былому старшыні беларускага таварыства «Золак» Вацлаву Ластоўскаму за 21.07.1922 (вых. №5516) з просьбай даць справаздачу за атрыманыя таварыствам ад Міністэрства ў 1918-1919 гадох 25.000 аўксінаў

582.1.43:201

3265. Ліст загадчыка тэхнічнага аддзелу Амэрыканска-Літоўскага Гандлёвага Таварыства «Ford. The Universal Car» (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.07.1922 аб аплаце рамонту матора «OTTO Deuten»

582.1.43:001

3266. Рахунак на аплату 10.589 аўксінаў 91 скатікаў за рамонт матора

582.1.43:002-003

3267. Ліст міністра вайсковых справаў Украінскай Народнай Рэспублікі Сальскага (?) д-ру Захару Біскаму (Варшава) за 22.07.1922 з прапановай выехаць за мяжу ў справе закупу авіяцыйнае тэхнікі для ўкраінскага войска

582.2.52:100 — мк

3268. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Паланга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.07.1922

25.VII.22.
Palanga.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Пасылаю Вам «Задачы чароднай нарады». Тк сама як і стацьцю аб незалежнасьці — прашу прыслаць мне хуценька копію для папраўкі. Разам з тым прашу Вас праглядзець яе з боку зьместу (і, канешне, русафізмаў!) — і дапісаць усе тое, што знойдзеце патрэбным. Магчыма, што я нешта упусьціў. Адзін экзэмпляр калі можна паслаць Езавітаву, каб азнаеміўся. Перэпісываць на чыста не магу — німа упрост сілы перапісываць — гэта я рабіў звычайна у момант на машыне, — ды і паперы брак!

Значa — нарада склікаецца выключна як культурная. Важна, каб Езавітаў сьпісаўся з дакладчыкамі, каб наагул нарада выглядала сур'езна. Ці годзіцеся Вы з маей аргумэнтацыяй — чаму ня трэба палітыкі? Мне здаецца, што яна слушная.

Нараду трэба падрыхтаваць і — я перэдумаў! — яе трэба склікаць не раней 1.X. г.зн. больш менш у той час я[к] і пражскую.

Калі №2 ужо кончыўся друкам, дык Вы можэце пачаць №3 друкам Вашай стацьці —

Значa: 1) Незалежнасьць як праграма
2) Задачы чароднай нарады
Верш!
3) ..... (Ваш артыкул ці які другі есьць пад рукамі)
4) ..... так сама
Раб. Тагор!
5) К.Каліноўскі
6) П.Безсонаў
Хроніка — палітычная
Прэса
Усяляк абвесткі[1]

Сколькі займаюць дзьве першыя стацьці Вы можэце вылічыць больш менш! Вельмі хацеў бы каб зьмясьціць Раб. Тагора — добрая рэч!

Сёньня саджусь за «Усход — Захад — і мы». Тэма цікавая, але заразам адказная. Яшчэ ня ведаю, ці што выйдзе.

Пасьля 4га думаю ехаць у Коўну, бо мяне страшэнна непакоіць справа з кватэрай, — ды і наагул, трэба пачынаць васеньнюю кампанію. Ці ня

можэце парадаваць мяне чым небудзь у кватэрнай справе? Якія захады зрабіў Вальковіч? Я яму пісаў. Спытайце яго! Калі нічога не знайду — ня ведаю, што буду рабіць. Скандал!

Ці прыехаў Базыль[2] і з якімі вынікамі? Чаму ня едзе Петра[3]?

Чакаю адказу

Бывайце!

АлЦвікевіч

Паведамьце Езав<ітаву> , што найважнейшым заданьнем іх будзе — угаварыць Менск, каб хто небудзь (5 асоб) прыехалі = знача гаварыць аб культуры, граматыцы, тэрмінолёгіі! А можа!

582.1.43:027&r,030&r

[1] Зьмест «Беларускага Сьцягу» №4 (жнівень-верасень 1922):

Незалежнасьць—як програма сёнешняга дня (А.Галынец)

Заданьня чароднай нарады (І.Яцьвяг)

Канстантын Каліноўскі (Гістарычны нарыс) (Іван Трызна)

«У хмарах Захаду»—з Рабіндраната Тагоры (Пер. І.Ц.)

Пагляд П.Безсонава на беларускую справу (даканчаньне) (Др. А.Цьвікевіч)

З Беларуска-Літоўскай мінуўшчыны (Ластоўскі)

Нашыя прозьвішчы (Станкевіч)

Мікалай Галубовіч. Повесьць. Разьдзел І некалькі слоў аб паходжаньню гэрбу і протоплястах фамілії пана Мікалая Галубовіча, гэрбу Разходнік (Власт)

«Эўразійцы» (новыя шуканьня расійскай думкі) (А.Ц-ч)

Палітычная кроніка

Агляд прэсы

З усіх старон

Бібліографія

Свая почта

Абвесткі

[2] Захарка. Абставіны невядомыя. [3] Крэчэўскі. Выехаў з Прагі на пачатку жніўня.

3269. Lietuvos Žinios. №119. 26.07.1922

[З артыкулам:] Gudas. Tautinės Gudų Ministerijos Uždaviniai

582.1.42:016

3270. Ліст міністра беларускіх справаў Літоўскай Рэспублікі Дамініка Сямашкі [Вацлаву Ластоўскаму?] за 28.07.1922

Пры гэтым перэсылаю «полеміку»[1] — вывад уже зробіце самі [...]

582.1.42:004 — pa

[1] Дакумэнты №№3185, 3229-3233, 3237, 3244, 3248, 3252, 3260-3262, 3269.

3271. Паштоўка Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 31.07.1922

Нешта не маю 2-га № «Сьцягу» і Вашых лістоў з канкрэтнымі рахубамі.

Чакаю.

Ці не можаце Вы выслаць мне экзэмпляраў 100 кожнай з адкрытак у справе падзелу Беларусі.

Вельмі патрэбны!
К.Езав.
Вітаю ўсіх
582.1.14:001

На паштоўцы: Першы Урад Беларускай Народнай Рэспублікі. Выданьне «Таварыства імя Ф.Скарыны». №5. 1919.

3272. Суправаджальная запіска Цэнтральнага Дзяржаўнага Архіву Літвы да пасьведчаньня аб уплаце грошай за перавозку дакумэнтаў Вацлава Ластоўскага з Расеі за 31.07.1922
582.1.43:204

3273. Пасьведчаньне Вацлаву Ластоўскаму аб уплаце на рахунак МЗС 28 аўкс. 50 ск. за перавозку яго дакумэнтаў з Расеі за 31.07.1922
582.1.43:205

3274. Беларускі Партызан. Месячн. безпартыйная часопісь Змагароў за Бацькаўшчыну. №1. Жнівень 1922. Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Галоўны Штаб Беларускіх Партызанаў — Белавежская Пушча. Рэдактар Герман Скамарох
582.1.43:248-251 — д
582.1.43:266-269 — д

3275. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Марыі Ластоўскай (Парогі) за 2.08.1922

Darahaja Mariuś.

Što da pieradadzienaha Stasiam prajektu atrymliwańnia u Parohach dla dzieučat korepetytara, ja liču hety prajekt niepažadanym i škodnym, ot z jakich pryčyn:

1. Korepetytar-litwin budzie doraha kaštawać: płacić treba budzie, a za wyniki harantyj nijakich, jak zrešta zaŭsiody bywaje z "damowaj nawukaj",

2. Nieminuča zamiest nawuki wywiažucca amory, prydziecca hrošy płacić nie za nawuku, a za "zabawy".

Dziela hetaha nichaj Hanka pryježdžaje u Koŭnu. Kali choče wučycca, tut možna wučycca, a nia choče wučycca — to treba pracawać; dyk prystroju dzienibudź da pracy. Na zimu ŭ Parogach biez nijakaha zaniaćcia pakidać jaje niamožna. Staśku najlepiej addać u Wiekšni kali nia ŭ pieršuju, dyk choć u pryhatoŭčyu klasu.

Dyk u paławinie hetaha miesiaca čekaju Hanku u Koŭnie, bo užo u Wieraśni pačynajucca nawuki.

Wychodzić usio-ž taki, što z Hanki chwalonaj Wiekšnianskaj pracawitaści ničoha nia vyjšła: ekzaminaŭ z 4 klas nia wydzieržała. Ja dumaju najlepiej byłoby jaje prystroić na ferčerskije kursy. Skončyŭšy kursy, kali budzie wučycca, a heta značе nie hultaić a pracawać, — može pastupić u Uniwersytet i być doktaram. U koždym razie i felčerycaj biaz chleba siadzieć nia budzie. Haloŭnaje

i najważniejšaje kab mieła Hanka akreślenuju pracu, nia kisła na wioscy i nie razwiwała histeryi. Dyk čekaju terminowaj adpowiedzi.

Całuju Wacłaŭ

2.VIII.22

582.1.43:053&r

3276. Запіска Міхала Рёмэра (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.08.1922

Szanowny i Kochany Panie Wacławie!

Przyrzekliście mi odesłać nazajutrz udz[i]elony Wam przezemnie w niedzielę wypis z czasopisma francuskiego. Pomimo że upłynęło odtąd 5 dni — nie otrzymałem go dotychczas. Proszę Was przeto albo mi go odesłać zaraz przez dziewczynkę, która Wam list niniejszy doręczy, albo też — jutro do Trybunału w kopercie na moje imię.

Łączę serdeczny uścisk dłoni

Wasz Michał Römer

4.VIII.1922

582.1.43:047

3277. Ліст Янкі Чарапука (Гранд Рапідз) Аляксандру Галавінскаму (Коўна) за 5.08.1922

Даражэньке Алесь! Ня дзівуйся мой дружэ, што можэ табе здаецца чаму я гэтак позно пішу гэты ліст да цябе. Адзін тыдзень я быў у Нью-Yорку, дзе хацелося мне разузнаць место. Чэлавечы розум папросту поўны падзіверьня як гэта ўсе можна было выбудаваць. Калі прышлося быць, каля найбольшаго дому у сьвеце, альбо каля помніка «Свабода» Пасьля я прыехаў да свайго бацькі у Grand Rapids. Тут таксама шмат часу прашло на чыста сямейныя справы. Працу грамадзкую распачаць заража трудно. Цяпер я знаемлюся толькі з агульным становіщэм у гэтым краю. І заводжваю знаемства з беларусамі, украінцамі, і літвінамі. Выступаць цяпер чынна на грунце грамадзкім і палітычным ніяк нельга. Прычыны такія. Не разуменьне ангельскай мовы — ня дае магчымасьці выступіць і узяцца за працу. Німа тут сапраўды ні адной беларускай арганізацыі, якая маглабы памагчы хоць часова у працы і жыцьцю. Напрыклад дэлегатам Літвы, Польшчы ці Украіны — тут легка працаваць, таму што па ўсей Амэрыцы раскіданы іх арганізацыі нацыянальныя. І вось калі яны прыежджаюць ўсе памененыя установы паведомляны і толькі чэкаюць іх прыезду — дагэтага служыць іх пресса і арганізацыйныя грошы. Нам жа беларусам трэба рабіць тое, што палякі, літоўцы і украінцы рабілі 50 лет таму назад. З гутаркі з Беларусамі у Detroit, Grand Rapids, New-York'y і Chicago у якіх ужо мейсцах я быў мне удалося устанавіць, што сьвядомасьць ёсьць паміж імі — але каб з іх зрабіць сапраўды беларускіх грамадзян патрэбна многа многа працы і то мазольнай. Калі гаворыцца а беларусах, та іх трэба раздзеліць на две катэгорыі. У першую трэба залічыць беларусаў-католікаў, якія паддаліся папросту шаленаму ўплыву польскаму клерыкалізму і так называемаму «Polskiemu Związku Narodowemu». Апошні у Амэрыцы ёсьць самай сільнай арганізацыяй «дэмакратычнай» польскай з вялікім капіталам багатай дамовай маемнасьцю, школамі, унівэрсытэтам у Кэмбрідж. Да другой

группы гэта беларусоў праваслаўных — тут ужо кірунак працы другі павінен быць — гэта элемэнт соцыялістычны і збальшэвічаны. Ужо з гэтай кароткай маей інфармацыі відаць, што адной асобе як мне няякім чынам няможна вясьці працы у адным і у другім лагеры. Трэба выбраць адзін — злучыць тыя два лагеры у адзін на грунце нацыянальным гэта рэч вельмі трудная і спачатку немагчымая. Паперш трэба у іх яшчэ разбудзіць нацыяналізм.

Вос[ь] гэтая мая пакуль што кароткая інфармацыя для Сувязі[1] і для Ураду аб становіщу беларускум тут у Амэрыцы. Цяпер некалькі слоў скажу аб складзе той дэлегацыі, якую намерываецца сюды выслаць Урад. Пасылаючы Урадум дэлегацыю належыць кіравацца той думкай і тым разлічэньнем, што дэлегацыя павінна больш кіравацца на падтрыманьне амэрыканцоў, чым беларусоў. А на грунце гэтаго зноў павінно лічыцца з амэрыканскай палітыкай. Цяпер урадуе «рэспубліканская партыя» з Гардіннгом[2] Яна групуе каля сябе моцно капіталізм фабрыканство, вялізарную прамысловасьць. Другая партыя гэта «дэмократычная» стаўленнік яе быў Вілсон[3] — цяпер яна не урадуе Гэта дзве самыя моцныя партыі і трецья соцыялістычная з Дэбсам[4] на чале, але ён сядзіць у турме соцыялісты яшчэ ні на адных выбарах ня атрымалі «крэсла прэзыдэнта» Затым ідуць уніісты — гэта арганізацыя адпаведае расейскай «Союз профессіоных Рабочих» але гэта чыста эканамічная арганізацыя у палітыцы нічога яна чыннага ня адыгрывае. У звязку з усім сказаным і прыняўшы пад увагу беларускае становіщо і амэрыканскую палітыку. Я лічу, што галавою дэлегацыі павінен быць не соцыаліст, бо іначэй нічога з працы рэальнага ня выйдзе, затым павінен быць ксендз, для працы сярод католікаў. і для працы сярод праваслаўных выдатны соцыаліст, добры прамоўца і літэратар. Пэўны, што такі склад дэлегацыі і меўбы успех Галава дэлегацыі могбы атрымаць падтрыманьне для справы з боку амэрыканскіх урадовых сфер, ксендз з боку духавенства, бо высшыя мейсцы духоўныя занімаюць ірландцы і немцы-католікі кардынал і арцыбіскуп.

Прыняць таксамо трэба пад увагу мову, бо бяз мовы тут ні шагу няможна ступіць Напершы пачатак хаця трэба выучыцца штокольвек, пасля ужо знаючы што небудзь можна лічыць што праз 1 год ужо можна добра знаць нават і выступаць з мовай. Затым, адна асоба мусіць знаць добра мову. А іначэй прыдзецца афіцыальнасьць схаваць і ісьці працаваць да фабрыкі — бо інтэлігэнтнай працы атрымаць трудно, не знаючы мовы. Калі можэ ёсьць труднасьці з прыездам, та я іх магу ліквідаваць — мне ужо удалося мець знаемасьць з Сэнатарам вельмі уплывовым праз якога можна нават і хутко урегуляваць справу. Што датычыць грошай та я таксамо прылажу усе стараньня каб 1.000 даллароў пажычыць і выслаць шыфскарты I класа, хаця і на 7%; калі будзе дана гварантыя звароту на акрэсляны час. Вось усе тое чым магу падзеліцца цяпер. У канцы гэтага яшчэ некалькі слоў напішу а сабе.

Апошнім часам я прыступіў да выучэньня мовы. кожны дзень 3 гадзіны. Атрымаў працу у фабрыцы вельмі добрую. Працую 8 гадзін ад 7 зрана да 5 п.п. і адну гадзіну маю на абед. Атрымаў ужо першыя паперы грамадзянства, бо бэз іх нельга мець работы за 6 мѣсяцаў буду лічыцца поў амэрыканінам, а цяпер як тут кажуць яшчэ «зелены чалавек» а праз

2 гады можна будзе атрымаць другія паперы грамадзянства, тагдэ ужо лічыцца амэрыканскім грамадзянінам. Атрымаў ад знаемага адваката запэўненьне, што калі захачу аканчываць юрыдычны факультэт, та ен за мяне унясе залог і я магу вучыцца а пасля толькі мушу у яго праз 2 гады працаваць Перэдай каму належыць — ніхай вышлюць рахунак доўгу які я вінен Ураду, а я пастараюся яго сплаціць часьцямі.

Шлю прывітаньне усім Янка 5/VIII 1922.

Adress John Czerepuk
585 Stocking Av.
Grand Rapids Mich.
North America

P.S. Прысылайце газеты, літэратуру і прэс-бюро

582.1.43:257&r-259&r

---

[1] Беларуская Нацыянальная Сувязь. [2] Ўорэн Гардынг, прэзыдэнт ЗША ў 1921-1923 гадох. [3] Вудро Ўілсан, прэзыдэнт ЗША ў 1913-1921 гадох. [4] Юджын Дэбс, сацыялістычны лідэр, у 1900-1920 гадох пяць разоў кандыдаваў у прэзыдэнты.

3278. Ліст рэдактара газэты «Правда» Віктара Гладзіка (Osyphant, Пэнсыльвэйнія, ЗША) Беларускаму Прэс-Бюро ў Коўне за 5.08.1922

М<илостивый> Г<осударь>.

Имѣю честь сообщить, что всѣ сообщенія Бюлетина №36 переведены на англійскій языкъ, были пересланы Правительству С<оединенныхъ> Штатовъ и въ американскія газеты. Не подлежитъ сомнѣнію, что по ходатайству нашихъ карпаторусскихъ организацій, дѣлу будетъ данъ розголосъ въ Америкѣ. Понятно, что поляки будутъ стараться опровергать все сообщенное въ Бюллетине №36 и по этому слѣдовалобы освѣдомить кого слѣдуетъ, чтобы пострадавшіе не давали польскимъ гонителямъ никакихъ подписовъ на ихъ опроверженія, какъ это было когда писущій эти стро[к]и въ 1920 г., поднялъ протестъ въ Англіи противъ разборки православнаго собора въ Варшавѣ.

Желательнымъ было бы, чтобы о гоненіяхъ поляками бѣлороссовъ, было сообщано мнѣ обовсемъ подробно, а я постараюсь, при соучастію здѣсь жіющихъ бѣлороссовъ, указать на гоненія и истязанія бѣлороссовъ, не только американскому правительству и народу, но также европейскимъ народамъ и ихъ правительствамъ.

Остаюсь съ совершеннымъ почтеніемъ,
Виктор Петровичъ Гладикъ,
редакторъ «Правды»

582.1.43:096

3279. Ліст капітана Пятра Дзехцярова невядомаму адрасату за 12.08.1922

582.1.14:050-051&r

У справе прыняцьця на стыпэндыю. Адрас: «9 p. L.K.V. pulkas, I kuopos vadui Kapit. Diechtierovui».

3280. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Пятру Крэчэўскаму (Коўна) за 14.08.1922

Прага 14 VIII 22

Дарагі Пятро!

У той дзень, як ты ад'ехау, я атрымау пісьмо ад Жытлоускаго, які просіць каб яго двухъ сыноу прыняць у Прагу на стыпендыі. З іх адзін яшчэ не мае аттестата спеласьці. Ты ведаешь тутэйшае палажене, ведаешь як з Гладкім было. Можэ лепш вышлаб каб яны тутака былі, чым калі іх не будзе. Дык вось я яму адказываю, так як справа стаіць, цыціруючы афіцыальную старану. Ен пытаецца а тваем адрэсе, пэуна што будзе табе пісаць. Каб у нас не вышла розніцы ва узглядах пасылаю табе копію адказа пану Жытлоускаму. Калі ен табе напішэ, то было-б пажадана, каб ты так сама падтрымау мой адказ, бо і дапрауды у нас яшчэ нічога канкрэтнага німа, апроч абецаня на славах. Добра былоб каб аб гэтым ведалі Ластоускі і Цвікевіч, калі яны будуць гаварыць з Жытлоускім.

Усяго добраго, паклон пані і усім знаемым.

твой Мікола

582.1.14:048r-048

3281. Копія ліста Міколы Вяршыніна (Прага) Сямёну Жытлоўскаму (?) за 14.08.1922

Копія

Многоуважаемый г. Житловскій!

Еще съ весны этого года я хлопоталъ въ министерствѣ о добавленіи стипендіи для нашихъ студентовъ и наконецъ подалъ письменный меморандумъ. Въ Іюлѣ я получилъ письменный отвѣтъ слѣдующаго содержанія:

«На Ваше желанье будетъ обращено вниманіе при окончательномъ замѣщеніи въ началѣ 1922/23 учебнаго года свободныхъ мѣстъ, если таковыя окажутся».

Такимъ образомъ я и самъ не знаю, сколько можетъ быть принято новыхъ студентовъ на стипендіи. Въ настоящее время стипендіи не даются, ибо еще въ началѣ каникулъ студентамъ было объявлено, чтобы они искали себѣ на лѣто занятій гдѣ угодно. Много ихъ ушло на полевыя работы. Тѣмъ, которые почему либо не получили работъ было впослѣдствіи выдано сокращенное пособье на два мѣсяца впередъ. Съ какого времени начнутъ выдаваться стипендіи вновь еще неизвѣстно.

Запись въ Технику начнется съ 1го Сентября, а въ Университетъ съ 1го Октября. Въ высшія учебныя заведенія принимаются только имѣющіе аттестаты зрѣлости. Вольнослушатели и лица учащіяся въ нѣмецкихъ учебныхъ заведеніяхъ стипендіями не пользуются. Тѣмъ которые не живутъ въ общежитьяхъ, а на частныхъ квартирахъ стипендіи выплачиваются по 450-500 корон въ мѣсяцъ. Здѣсь большой квартирный кризисъ. Комната стоитъ минимумъ 300-400 кор. въ мѣсяцъ (Кричевскій платилъ по 700 кор. въ мѣсяцъ за одну скверную комнату). Кромѣ освѣщенія и отопленія. Но студенты живутъ по 2-3 въ одной комнатѣ и поэтому имъ обходится дешевле. На скромное существованіе одно[го] человѣка въ Прагѣ требуется минимумъ 1000 кор. въ мѣсяцъ. Кушанье студенты получаютъ въ студенческой столовой (по 7 кор. за обѣдъ) и всегда жалуются на

голодъ. Пражскія учебныя заведенія ни въ чѣмъ не уступаютъ такимъ же заведеніямъ другихъ Европейскихъ столицъ.

Петръ Ант. Кричевскій уѣхалъ въ Ковно.

Вотъ все, что могу сообщить Вамъ конкретнаго.

Съ глубокимъ уваженіемъ къ Вамъ пребываю

Н.М.Вершинин

Прага 14 VIII 22 г.

582.1.14:047&r,049&r

3282. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга-Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.08.1922

16.АВГ.1922

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

атрымаў я Вашы «Задачы»[1] і з імі згодзен.

Але гэтага яшчэ мала: трэба ведаць і мець яшчэ апрацоўку «рэальных магчымасьцяў» яе склікаць.

Інфармацый з гэтага боку ад Вас німа зусім.

А гэта выбівае грунт з пад ўсіх плянаў.

Мы цяперыка ў паласе выбараў:

валастных,

местовых,

парламэнтскіх.

Валасныя прайшлі — нішто, апрача двох-трох валасьцеў, дзе нас пабілі палякі і маскалі.

Местовыя — пачаліся (з іх Люцын — прайшоў добра).

Парламэнтскія — насоўваюцца і худка будзе падача спіскаў.

У зьвязку з гэтым вельмі прашу Вас, каб пярэсланыя мной, — праз Аккермана і Вальковіча, — рахубы — былі срочна, самым тэрміновым парадкам, задаволены і выдаткі зьвернуты.

Аб дапамозе зьверх таго, што мне належыць, я ужо і не прашу.

— Здаецца — безнадзейнасьць поўная.

Незадавальненьне ж пасланых рахубаў будзе нам вельмі шкодна, а магчыма, і трагічна скіруе самыя выбары.

Палякі і расейцы гуртуюцца і зьбіраюцца даць бой па ўсіх правілах.

Сыплюцца: грошы, кляўзы, газэты, лістоўкі, лаянка, агітацыя і закіды.

Мы — маўчым.

Німа «свабодных» магчымасьцяў.

Казенныя кошты астаюцца казённымі і ідуць на выдаткі буджэтнасмэтныя.

Ня маю часу на дробныя тлумачэньня, бо страшэнна сьпяшаюся (з 15 дзен гэтага месяца я ужо 12 дзен быў ў дарозе і раз'ездах).

Жадаю усяго найлепшага.

З пашанай К.Езавітаў

582.1.43:236&r

[1] Артыкул «Задачы чароднай нарады». Гл. дакумэнт №3268.

3283. Старый бѣлоруссъ. Бѣлоруссы въ Латвіи. (Улётка да выбараў у Латвійскі Сойм)

582.1.43:247&r — д

Дата невядомая. Выбары ў парлямэнт Латвіі меліся адбыцца ў сьнежні 1922 году.

3284. Ліст Віталя Бендэроўскага (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.08.1922

582.1.43:179&r-180

Аб перасылцы грошай — вяртаньне Ластоўскаму пазыкі й грошай за прададзены гарнітур.

3285. Квіток аб пераводзе 8.000,- аўксінаў з Коўна Лявону Зайцу (Паланга) за 25.08.1922

582.1.43:071

3286. Ліст сотніка Пятра Дзехцярова (?) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.08.1922

[...] Дужа жаль, што не зрабілі Вы поўнаго клішэ з адрэсу пану Масарыку.

[...] пачтовых стасункоў между Вільней і Коўнай даселе немашыка!

[...] Пастараюсь ў скорым часі адыслаць Вам некалькі віньэтак, малюнкоў і карыкатур [...]

582.1.43:175&r-176&r

3287. Ліст В.Шэбедзева (Генуя) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.08.1922 у справе падрыхтоўкі да выданьня кнігі «Національне питання Східної Европи»

582.1.43:244-245

3288. Паштоўка Ларысы Дарашковай (Жыжморы) Станіславе Ластоўскай (Коўна) за 31.08.1922

582.1.43:196

3289. Фатаграфія Вацлава Ластоўскага ў капелюшы

582.1.43:073 — ф

Дата невядомая.

3290. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Паланга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.09.1922

Паважаны Вацл. Юст.!

Былі мы з Зайцам толькі што у тутэйшага «поэта» — Касьцевіча. Старый нішто — пагутарыць з ім крыху часу прыемна, але і толькі.

Сярод «твораў», прыпамінаючых Марцінкевічаўскую «Селянку» — знайшлі «Stacji», — якія Вам пасылаю. Я у гэтых справах разумеюся мала, але мо' Вы і знойдзеце карысным гэтую рэч аддрукаваць для касьцельнага

ужытку. Трэба, каб Віленскі Біскуп даў згоду — (я думаю ён ахвотна дасьць) — і літоўскія ксендзы пакрыюць выдаткі па друку.

У кожным разе — Вам лепей знаць. Аўтар прасіў толькі ня згубіць гэтай рукапісі, — бо яна адна.

Адкажэце!

Ваш АлЦвік...

P.S. Атрымалі Ваш ліст — і зьбіраемся сёньня разам з Лявонам адказваць. У кожным разе — на усе гэты рэчы трэба плеваць з высокай гары. Апроч, зразумела, згубы рукапісу Вашаго. Гэта гісторыя вельмі цікавая і яе трэба абавязкова давесьці да канца. Я лічу, што тут без злой волі не абойдзецца.

Стацьці для 3го № перапісываю на чыста.

Прывітаньне П. Станіславе!

Паважаючы Вас АлЦвікевіч

582.1.43:252&r

Дакладная дата невядомая.

3291. Даведка Ковенскага адраснага бюро аб адрасе Магдалены Радзівіл: Šaltkalvių 3/13

582.1.43:235

Дата невядомая.

3292. Litania Narodu Białoruskiego. Шапірографнае выданьне

582.1.43:271&r-272&r — ш

Дата невядомая.

3293. Ліст Язэпа Мамонькі (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.??.1922

Даражэнькі Власт!

будзь ласкавы памажы Базылю Русаку выяхаць сюды у Прагу мы яго тут устроім вучыцца на матурныя курсы пры украінскай акадэміі

Калі будзе ехаць то нехай захваціць кніжкі Берлінскага выданьня бо тут німа ні годнага экземпляра у Берліні так сама німа

Правітаньне усім

Язэп.

582.1.43:234

Дата невядомая.

3294. Заява Акружнога Атамана Германа Скамароха Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі за 1.09.1922

Пану Старшыні рады Беларускае Рэспубліцы

А<тамана> Б<еларускіх> П<аўстанцаў> Г<ермана> С<камароха>

Заява

Прынімаючы пад увагу: 1) што грошы на утрыманьне арганізацыю партызан атрымаются вельмі у малым ліку, якія не здавальняюць і 1/10

патрэбы адпаведальных працаўнікоў у сучасны момант, 2, што велізарныя мэты, пастаўленыя нам у барадзьбе за Бацькаўшчыну, у змаганьні за незалежнасьць і неподельнасьць яе, за асвабадждэньне первым чынам народу ад гвалту і зьдзекаў польскіх паноў абшарнікаў і іх жандараў, накладваець на нас і велізарныя маральныя абавязкі як мага палягчаць варункі жыцьця і працы у лясу знаходзячыхся гэрояў нашых партызан; 3, што ужо наступаець осень, і нужда у сродках павялічываецца, асабліва у час ліквідацыі на зіму арганізацыі і 4, што з прычыны майго адъезда я пасылаю на мейсце человека для працы і сувязі — я маю гонар прасіць Вас, Пане Старшыня, як шчырага старага дзеяча ініцыятара і піанера усея Беларускае Справы, найці магчымасьць даць нам якуюсь небудзь грашовую дапамогу па свайму пагляду і сродкам.

Арганізацыя ахоплівае чатыры паветы; мы верым у Вашу прыхільнасьць да яе і наперад шчыра дзякуем Вам. Вельмі былі рады і вельмі дзякуем за дадзеныя нам праз грам[а]дзяніна Карабача пяць тысяч аукс[інаў], якія прывез нам А.Угрумый на арганізацыю. Шчыра кранул партызан гэты падарунак, шчыра вітаюць партызаны свой родны Беларускі Урад.

Окр. Атаман Герман Скамарох.

1/IX 1922 год

582.1.43:097&r

3295. Krynica. Sialanskaja hazeta. Wilnia. №1. 2 wieraśnia 1922

582.1.43:262&r-265&r — д

Нумар прысьвечаны выбарам у Варшаўскі Сойм і Сэнат 5.11 і 12.11.1922.

3296. Ліст кс. Антона Шышкі (Рым) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.09.1922 з просьбай аб матэрыяльнай дапамозе

582.1.43:229&r-230&r

Антон Шышка — знаёмы В.Ластоўскага зь віленскіх часоў.

3297. Паштоўка Лаздіну Пяледы [Софіі Пшыбылёўскай] (Парогі) Людасу Гіру (Коўна) за 5.09.1922

Piszę i piszę do Stardasa bez skutku, zajdz z laski svajej ir pawiedz zeby mi przysłał choć trochę pieniędzy.

Mania umierająca — bez życia przyniesli ją z [obor?obos?oboz? abos?] — był ksiądz i doktor — polovą ciała niewładała, lezy słaba leży i prawdopodobnie nie wstanie — Sama nie wiem co robić a te czarty ani myślą o pieniądzach.

Peleda

582.1.43:072&r

3298. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Паланга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.09.1922

6.IX.22.

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Сіджу тут і ня ведаю, калі і як рушу. Хвароба дочки трымаецца — тэм[п]эратура ад 37,5 да 39,5. Пры гэтых варунках ехаць немагчыма. А так зрабіць, каб мне выехаць, а сямью пакінуць, каб ехала сама — зусім немагчыма. Столькі людзей, рэчаў ды яшчэ хворае дзіцё (— яго трэба

будзе несьці на руках) — без мяне нічога ня зробяць. Па агульнаму разважаньню — выехаць прыдзецца ва уторак, 12га. Да гэтаго часу акурат хапае грошы, якія я прывез (5 тысяч.), нават, магчыма і ня хопіць. Дарога цяпер каштуе шалена — усе на 100% вышэй. Каб даехаць да дому (Шанцы!) — я падрахаваў трэба агульна больш 7 тысяч., і я цяпер ламаю галаву як гэтыя грошы дастаць. Думаю нават пайсьці пазычыць у Гальв<аноўска>га але ён, кажуць, выехаў. Залажыць якую рэч нельга, бо як выкупіць з Коўны?, а прадаваць за безцану — шкада! Тым больш, што сума па сёняшняму курсу ерундовая.

Зьвертаюся да Вас — пазычце для мяне якім небудзь чынам дзесяць тысяч; можа Вас<іль> Ів<анавіч>[1] пазычыць, ці Вальковіч (калі прыехаў) ці хто. Усе-ж у Коўне гэта лягчэй зрабіць як тут, калі усе выехалі. Але трэба прыняць пад увагу, што почта тут ходзіць толькі два разы у тыдзень і таму я прашу Вас даць тэлеграму.—

Знача можа быць тк: 1) Грошы німа (што мяне здорава падсячэ!) 2) Грошы вышлем у такі-то дзень. Калі, знача, грошы атрымаеце — дык пасылаць трэба толькі тэлеграфам, ці праз почту (але, здаецца, почта па тэлеграфу не прыймаець!), ці праз Банк. Думаю — Lietuvos Ukio Bankas. Тагды, калі вышлеце, дайце адначасова тэлеграму: грошы выслалі праз такі-то Банк на Крэтінгу.

Такім парадкам — я магу буду аріентавацца.

Вельмі прашу Вас, Вац. Юст. дапамагчы, а галоўнае — хутчэй, бо Заяц выязджае у пятніцу ці у суботу — і я тут застаюся буквальна адзін. Трэба хоць ведаць прыблізна, калі рушыць!.. І кожны дзень лішні — лішніх 500-700 мар.

Чакаю адказу = тэлеграмы!

Бывайце здаровы

АлЦвікевіч

Як справа з кватэрай маей — спытайце Ермачэнко?

582.1.43:255&r-256

[1] Захарка.

3299. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Паланга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.09.1922

Пане Власт!

Выручыце — прыглядзіце — каб Ів. Ів. Ермачэнко, Галавінскі — маглі б устроіць нешта з кватэрай. Хвароба дочкі йдзе, дзякаваць Богу, нормальна і калі ня будзе чаго неспадзяванаго можна будзе у субботу-нядзелю дзьвінуць у Коўну. Але куды прысланіць галаву?

Разумееце — што за крытычнае забойчае пытаньня?! Трачу галаву. Ехаць у Коўну і пасьля назад — ерунда, немагчыма. А без мяне тут ня выедуць...

Прыглядзіце!

Паведамце!

Ваш АЦ

582.1.43:253&r

3300. Паштоўка Preussische Staatsbibliothek (Бэрлін) рэдакцыі часапіса «Беларускі Сьцяг» (Коўна) за 7.09.1922 з падзякаю за дасланы №1 «Беларускага Сьцягу» за 1922 год і просьбаю дасылаць наступныя нумары.

582.1.43:254&r

3301. Ліст Янкі Дразда (псэўд. Шпаковіч, Баркун) (Мэрач) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.09.1922

Пры гэтым перасылаю крывавыя страніцы з жыцьця шматпакутнага беларускага і літоўскага народа [...]

582.1.43:246&r

3302. Ліст Тамаша Грыба (Дзьвінск) Уладзімеру Пракулевічу (Коўна) за 10.09.1922

10.IX.22.
м. Дзьвінск.

Паважаны Грамадзянін У.Пракулевіч!

Ліст Ваш ад 6.IX.22 пісаны Вамі «па даручэньню схода» — я атрымаў. Зараз-жа пішу адказ.

Перш за ўсё я хацеў бы высьвятліць што гэта за «сход загранічнай групы» ў ліку некалькіх асоб (Радзюк, Пракулевіч, Ластоўскі, Карабач, Палікша, Душэўскі); на якой падставе незначная лікам група асоб называе свой прыватны сход за шклянкай гарбаты, сходам загранічнай групы? Хто ім даў гэтае права? — Бо, як гэта ведама, за граніцай ёсьць у некалькі разоў больш сяброў партыі, чымся памянены лік «сходу», нават і ў самой Коўні ёсьць больш — таму я рашуча протэстую супроці ўзурпацыі правоў загранічнае групы і злоўжываньня яе іменьнем!

Далей. Вы пішаце, што я выехаў з Коўні нікога не паведаміўшы — гэта ёсьць непраўда! Аб сваім выязьдзе ў Дзьвінск я казаў яшчэ на сходзе 30.VIII.22, калі была гутарка аб трэцейскім судзе; Вы так сама былі на гэтым сходзе — значa... Вы, паважаны грамадзянін ведалі аб маім выездзе. А ў дзень майго выязду, я меў гутарку з грамадз. Ластоўскім у справе майго выязду ў Дзьвінск, каторы нават пазычыў мне 200 ost. mar. на дарогу — у мяне нехапіла некалькіх сот марак разьлічыцца з даўгамі ў Коўні. Ведаў аб маім выязьдзе і грамадз. Карабач — я вёў з ім гутарку ў справе перасылкі дакумэнтаў Жылкі. — Дык няўжо-ж усё гэта магло так хутка забыцца? — Узапраўды, дзіўлюся, грамадзяне, Вашай кароткай памяці!

Вы пішаце, што я ведаў аб Вашых перагаворах «з вызначанымі па абаюднай згодзе персонамі» — першы раз аб гэтым чую! Ніхто мне аб гэтым нічога не казаў. Наадварот — я зрабіў Вашай персоне, паважаны грамадзянін Пракулевіч, адвод, калі аб гэтым на сходзе 30.VIII.22. паднялася гутарка, сумлеваючыся ў Вашай безстароннасьці ў данным выпадку. Аб гэтым я аткрыта казаў тады, кажу гэта і цяпер.

Вы пішаце, што «на заўтра» Вы сабралі сход сяброў «гоноровага суда» а 8 гадзіне вечара. Я выехаў «на заўтра» (гэта-ё: таго-ж самага дня, калі адбыўся сход «гоноровага суда») з цягніком а 5 гадзіне — роўна за тры гадзіны да схода. Дык няўжо Вы, паважаны грамадзянін Пракулевіч, не маглі мяне паведаміць хоця-ж-бы за тры гадзіны да сходу «гоноровага

суда»? Яж падсудзімы, па Вашай думцы, то ці не павінен быў я ведаць, калі адбудзецца суд нада мной?

Ітак, яшчэ раз падкрэсьліваю — я ня ведаў хто вядзе перагаворы, (бо і А.Цьвікевіч быў старшынёй схода 30.VIII.22!) «з вызначанымі па абаюднай згодзе персонамі»; ня ведаў калі адбудзецца сход «гоноровага суда» ці «назаўтра» ці мо' праз тыдзень, праз месяц і г.д. Мне аб гэтым ніхто нічога не казаў. Аб усім гэтым я толькі сёньнека даведаўся з Вашага ліста з гатовай ужо рэзолюцыяй «схода загранічнай групы» аб маей неяўцы на «ганаровы суд». Дзеля гэтага я рашуча заяўляю свой протэст супроці гэткай пастаноўкі справы!

Вы пішаце аб тое прыкрасьці, якая сталася ў выніку маей адсутнасьці на сходзе «гоноровага суда». Я ня ведаю дасканальна ў якім сьвеце Вы, паважаны грамадзянін Пракулевіч, выявілі прычыну маей адсутнасьці. Вы толькі напісалі у лісьце, што Вы прасілі ў судзьдзяў прабачэньня і тлумачылі, што «зразумела, без пільных патрэб адказны грамадзкі дзеяч і лідэр партыі не пазволіў-бы сабе гэтага»... А хто мяне папярэдзіў хоцяж-бы за тры гадзіны перад тым аб сходзе «гоноровага суда»? — Таму, як гэта ня сумна, але ўся адпаведнасьць за тую прыкрасьць, якая сталася з прычыны маей адсутнасьці, падае на таго, хто ўзяў на сябе абавязак вясьці перагаворы «з вызначанымі па абаюднай згодзе персонамі»!

Цяпер аб «інцындэнце», пару слоў аб пратаколе за 4.IX.22 і аб «гоноровым судзе».

Мушу яшчэ раз падкрэсьліць тое, што мной было сказана на сходзе 30.VIII.22. Ласьне: Я грамадз. Карабача ні ў чым не абвінавачваю. Я толькі па таварышчаску кажу і папераджаю, што ў Бюро Ц.К. партыі ёсьць такія вось і такія весткі, компрометуючыя яго імя. (У гэтым лісьце я ня буду паўтараць гэтых вестак — за надта брудныя!) Гэта самае раней мною было сказана ў прысутнасьці грамадз. Ластоўскага і А.Цьвікевіча, а пасьля, па прозьбе грамадз. Карабача і на сходзе 30.VIII.22. А калі ў мяне грамадз. Карабач спытаўся ці веру я ўсім гэным весткам, — адказ мой быў такі: я ня веру і не ня веру. Я хачу толькі усестароньня высьвятліць гэтую справу і спыніць паганыя компромітуючыя чуткі. Грамадзянін Карабач ды і Вы грамадз. Пракулевіч, пасьля таго, як агалошаны быў мной псэўдонім грамадз. Карабача пад якім ён займае пасаду ў пэўнай установе, аб чым я тут у Дзьвінску яшчэ больш падробныя атрымаў весткі — Вы пачалі вымагаць ад мяне каб я указаў тую асобу, якая перадала мне такія весткі. Я адмовіўся, матывуючы свой адказ тым, што мне гэта было сказана пад чэснае слова (слова гонару!) што я нікому не скажу імя таго, хто мне гэта перадаў. Вам угодна было паставіць справу асабіста, што быццам-то я сам «пускаю такія чуткі»... Але, я так далёка стаю ад тых, хто з асабістага пункту гледжаньня адносіцца да грамадзка-палітычнай справы, што проста не зьвярнуў увагі на Вашы не дастойныя сталых людзей словы. Таму, калі грамадз. Карабач запрапанаваў трэцейскі суд, а не ганаровы, як Вы аб гэтым пішаце, то я, каб адкінуць ўселякія асабістыя амбіцыі, згадзіўся на трэцейскі суд. Аднак, я згадзіўся на гэта не як на ганаровы суд дзеля разбора інцыдэнта паміж Грыбам і Карабачом, а выключна толькі з тае мэтай, каб высьвятліць прычыну гэных компрометуючых чутак, прычыну іх паяўленьня і на колькі яны праўдзівы. Аб

гэтым я аткрыта казаў на сходзе 30.VIII.22. Пры гэтым я дадаў, што асабіста ўсё-ж такі, я гэтую справу сам вырашыць не магу, а перадам гэта на разгляд Бюро Ц.К. партыі, а мо' калі гэта магчыма будзе, то на разгляд чарговага партыйнага з'езду, маючы на ўвазе, што мо' ўдасца хутка склікаць з'езд партыі, асабліва, калі прыняць пад увагу, што дзе-якія сябры партыі вельмі далёка адыходзяць ня толькі ад намечанай апошнім з'ездам тактыкі партыі, адыходзяць ад пастаноў нарадаў загранічнае групы пры ўчасьці прэдстаўнікоў з мейсц, а вядучы чыста асабістую палітыку, далёка адыходзяць ад праграмы партыі, адмаўляюцца ад уласнаручнападпісаных пастаноў і г.д. ўносячы такім чынам дэзорганізацыю і компрометуюць нават, часамі, імя самой партыі.

Дый у інтарэсах нарэшці самога грамадз. Карабача, калі ён ні ў чым не віноўны, усестароньне высьвятліць гэтую справу, а не хавацца за пастанову прыпадковага схода. Таму я рашуча адкідаю тое мейсца ў пратаколе за 4.IX.22. дзе гаворыцца аб тым, што «Грыб кінуў абразу на Карабача». Заяўляю — я ніякай абразы на грамадяніна Карабача ня кідаў — я толькі папярэдзіў, лічучы гэта сваім моральным абавязкам зрабіць, што ў Бюро Ц.К. партыі ёсьць компрометуючыя яго імя весткі і што ў мяне няма пэўнасьці, што чуткі аб тым што я казаў, ня будуць пашырацца з іншых крыніц сярод ковенскага грамадзянства, а мо' і далей. І калі грамадз. Карабач мяне не зразумеў, мяне як старога таварыша, а злосна ўхапіўся за мае словы, перавярнуўшы іх навыварат, жадаючы скомпрометаваць маё імя, як старога рэволюцыянэра — гэта яго справа. Гэтым толькі ён больш сам сябе скомпромітуе, аб чым я не магу не шкадаваць, бо да гэтага часу лічыў я грамадз. Карабача сваім таварышчам, рэволюыйным народнікам соцыялістам і нават адказным партыйным работнікам.

У пратаколе за 4.IX.22 сказана яшчэ: «пасуліць т. Грыбу ў працягу двух тыдняў, ад сягоняшняга дня, даць вычэрпаваючыя высьвятленьні кінутых на К-ча абвінавачаньняў». У праціўным выпадку «т. Карабач, пакуль ня будзе Грыбам даказана яго віноўнасьць, лічыць чыстым ад закідаў зробляных Грыбам». — Што-ж, адно толькі на гэта магу сказаць: насільна міл ня будзеш — вольнаму воля. Грамадз. Карабач ды інш. могуць паступаць як ім гэта ўздумаецца; можаце лічыць грамадз. Карабача чыстым, але ад гэтага справа не меняецца. Хацеў-бы і я лічыць грамадз. Карабача чыстым, але — на вялікі жаль — яго паступкі — судзьдзі яго, як і Ваш паступак, паважаны грамадз. Пракулевіч, у справе перагавораў «з вызначанымі па абаюднай згодзе персонамі» хай будзе Вашым уласным судзьдзею!

Я усё зрабіў што мог. Я напружаваў усе свае сілы, каб усе нашы хатнія справы вырашаліся ў сваёй хаце, каб не вынасіць сьмецьця з сваей хаты на «сьвет цэлы» — Вы, грамадзяне, інакш справу паставілі. Хай-жа тагды на Вас і падае ўся адпаведнасьць за тыя вынікі, якія магчымы ў рэзультаце Вашай «тактыкі».

Аб «гоноровым судзе» я першы раз ад Вас гэта чую. Я даў сваю згоду на суд трэцейскі дзеля разбору і усестароньняга высьвятленьня тых вестак, якія маюцца ў Бюро Ц.К. партыі у справе дзеяльнасьці грамадз. Карабача, паскольку ён з недаверыем аднесься да маей таварышчаскай

перасьцярогі і нават знайшоў столькі нагласьці, каб мяне абвінаваціць асабіста ў недастойных компрометуючых чутак аб ім.

Вот-жа, неадказаваючыся ад трэцейскага суда, у тым яго значэньні, як аб гэтым я казаў на сходзе 30.VIII.22, я разам з гэтым дамагаюся партыйнага суда цяпер над грамадз. Карабачом і тым грамадзянінам, каторы вёў перагаворы «з вызначанымі па абаюднай згодзе персонамі», абвінавачываючы ў паступках недастойных сяброў Б.П.С.Р.

Аб усім гэтым я лічу сваім абавязкам моральным давесьці да ведама ўсіх сяброў партыі а так сама і вызначаных трэцейскіх судзьдзяў Янушкевіча і Кагана.

ТамашГрыб.

P.S.

Што датыча выбараў у Літоўскі Сойм і заключэньне агульнага блёку беларускім селянскім саюзам з «саюзам русских граждан», то, само сабой, я стаю на старой сваей пазыцыі, а ласьне: тыя з сяброў партыі, каторыя ідуць на выбары па аднаму сьпіску з расейскімі чорнасоценцамі, адвечнымі ворагамі беларускага селянства і наогул усяго адраджэнскага беларускага руху — ужо гэтым самым тыя партыйныя таварышы ставяць сябе уне арганізаваных радоў Б.П.С.Р.; яны ужо гэтым самым выходзяць з партыі. А па другое, як грамадзяне Літвы, яны ня могуць быць у радох тае партыі, якая вядзе барадзьбу за незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі.

ТамашГрыб

582.1.43:019&r-022&r

3303. Ліст Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.09.1922

11-9-22.
Бэрлін

Паважаны п. Ластоўскі!

Спазьніўся я крыху, але былі варункі перашкаджаўшыя працы. Пісаў гэты артыкул па часткам і таму ён такі нудны. Прашу вас — выправіць яго з боку мовы і стылю, але так-сама прашу даглядзець каб у канцы артыкула ня было друкарскіх абмылак (там дзе гаворыцца аб правапісу) бо абмылкі зьменяць увесь сэнс напісанага.

Наагул жа ў «Б<еларускім> С<ьцягу>» абмылак так многа, што прыкра чытаць. Там столькі людзей ёсць — няўжо-ж нельга каго-небудзь прымусіць раз у месяц зрабіць карэктуру — хаця бы па Тарашкевічу.

Прашу вас, прышліце мне 4 нумар «Б.С.», калі ўжо вышаў.

Не магу дачакацца Вашага слоўніку: так патрэбны, так патрэбны! Каб вы уявілі сабе гэта то напэўна ўжо пачалі хоць па часткам прысылаць мне. Паміж іншым Марголін хоча ўзяцца выдаць ваш слоўнік. Ад хаценьня да рэальнасьці дыстанцыя парадачная, але ўсё ткі гэта трэба мець на увазе. Напішыце вашу апінію і прышліце хоць частку лістоў для калькуляцыі, а я буду падбіваць яго на гэта. Можа й пойдзе. Мне для перакладаў слоўнік патрэбны да зарэзу. З-за гэтага стаіць мая праца!! Маючы пад рукою слоўнік я і для «Б.С.» зрабіу бы некалькі цікавых перакла-

даў (літэратурн., кароценькіх) — спроб. Можа й пайшлі б у друк.

Ваш ліст, «Б.С.» і свой ліст паслаў Земковічу[1] у Варшаву і чакаю адказу. Прасіў яго пісаць у «С.».

Паўнамоцтва Бароўскаму перадаў, але ён чакае самога мэморандуму! Можэ мэморандум згубіўся на пошце?

Брату, калі ня выехаў у Палангу, перадайце, што гаспадыня — [Fr.] Caspari ўжо два тыдні таму як кончыла жыццьцё самагубствам (атруцілась) і з прычыны гэтага ўсе яе рэчы апячатаны паліцыей і увайсьці ў кватэру нельга.

Чакаю загаду з тэмаю для «Б.С.» — як я прасіў.

Ад вас чакаю слоўніка.

Пішыце — будзе час.

Паклон вашай жонцы.

Пісьмы яе даўно пераслаў у Вільню. Сабака паправіўся.

Ваш І.Цвік...

582.1.43:232&r-233&r

3304. Ліст Аляксандра Ружанцова (Коўна) Кляўдыюшу Душэўскаму (Коўна) за 15.09.1922 у справе выкарыстаньня ў «Беларускім Сьцягу» матэрыялаў J.Hraboŭskaha, дасланых Езавітавым

582.1.43:270&r

3305. Ліст Людаса Гіры (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.09.1922

[На візытоўцы:]

Liudas Gira
Valstyb. Liet. Dramos Teatro
Direktorius
Kaunas

Kaunas, 16.IX 22

Wielmi Šanoŭny p. Wacławie!

Siahonnia pryjšła da mianie pisulka ad Peŧedy: pišeć jana, što Wašaja žonka, pani Marija, lažyć pry śmiarci; nadta ciažka balejeć ad jakohaś nerwowaha prypadku. I na dochturaŭ i na leki treba hrošy šmat, a ich — ni hu-hu! Prosić mianie Peŧeda, kaby ja razdabyŭ jaje na lečennie pani Marji hrošau u kniharni čy z kul. Ale jak na tuju pryhodu — z kniharni adłučyusia tarhawiec, z katorym u Peŧedy jość porachunki i ja nie maju mahčymaści dabyć patrebnyje hrošy. Mabyć Wy, panie Wacławie, ŭ hetym što pamožecie, bo sprawa nadta pilnaja.

Pryjmijcie słowy pašany
Waš kališnij
Liudas Gira.

582.1.43:200

3306. Сьпіс урадовых асобаў Беларускай Народнай Рэспублікі, якія маюць местам побыту м. Коўна

СПІС

Урадовых асоб Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі, маючых местам свайго пабыту м. Коўну.

РАДА РЭСПУБЛІКІ (Прэзыдыум)

1. Старшыня Рады Рэспублікі грам. Петро КРЕЧЭУСКІ, жонка его, Марыя КРЭЧЭУСКАЯ,

2. Віцэ-Старшыня Рады грам. Васіль Захарко, жонка яго Пауліна ЗАХАРКО

3. Сэкрэтар Рады Язэп МАМОНЬКА, жонка яго Александра МАМОНЬКА

РАДА НАРОДНЫХ МІНІСТРАУ (Габінэт Міністрау)

4. Старшыня Рады Нар. Міністрау грам. Вацлау ЛАСТОУСКІ, жонка яго Станіслава ЛАСТОУСКАЯ,

5. Віцэ-Старшыня Рады і Міністр Загранічных Спрау грам. Александр ЦВІКЕВІЧ, жонка яго Зінаіда ЦВІКЕВІЧ,

6. Дзяржауны Кантралер Леанард ЗАЯЦ, жонка яго Кляра ЗАЯЦ,

~~7. Міністр Унутраных Спрау Тамаш ГРЫБ~~

КАНЦЭЛЯРЫЯ РАДЫ МІНІСТРАУ

8. Прафэссор Генюш ЛЯЦКІ, Раднік Міністэрства Загранічных Спрау (жыве у Празе, Чэхія)

9. Раднік Міністэрства Загранічн. Спрау Александр ГОЛОВІНСКІ, жонка яго Анна ГОЛОВІНСКАЯ,

10. Ураднік для асобых даручэньняу Іван ЕРМАЧЭНКО, жонка яго Вера ЕРМАЧЭНКО.

11. Машыністка Рады Міністрау Ларысса ДАРАШКОВА,

ДЫПЛЕМАТЫЧНАЕ ПРЭДСТАУНІЦТВО У ЛІТВЕ

~~12. Дыпламатычны Прэдстаунік у Літве Алексеандр ВАЛЬКОВІЧ, жонка яго Алексеандра ВАЛЬКОВІЧ~~,

13. Сэкрэтар Прэдстауніцтва Александр ДЗЬМІТРЫЕУ,

14. Канцэлярыст Макары СЕВАСЬЦЕНЮК.

582.1.43:243

Дата невядомая.

3307. Ліст капітана Пятра Дзехцярова (?) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.09.1922 у справе магчымасьці паступленьня ў Праскі ўнівэрсытэт

582.1.43:150&r-151&r

3308. Ліст Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Пятра Крэчэўскага (Прага) Старшыні Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.09.1922

Глыбокапаважаны Вацлау Юстынавіч.

Пісьмо Вашае ад 20 верасьня г/г. атрымаў. Гэтым даю сваю згоду на тое, каб у склад Колегіі Ураду Беларускай Народнай [Рэспублікі], зло-

жанай па рабочаму прынцыпу, вайшлі разам з Вамі, п. Старшыня, грам. А.Цвікевіч, як Міністр Загранічных Спрау и Юстыцыі, и грам. С.Жытлоускі, як Міністр па Справам Нацыональных Меншасьцяу.

Жадаю Колегіі Ураду якнайкар[ы]сьнейшай працы.

Застаюся з шчырай да Вас пашанай

Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

582.1.43:225 — мк

Дакладная дата невядомая.

3309. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.09.1922

Вельміпаважаны Пане Ластоўскі!

Учора паслаў Вам expres адзін ліст. але па абмылцы не напісаў Вашага прозьвішча, а толькі «Беларуская Місія». Вы яга ўсё-ж такі прачытайце, бо там ё' некаторыя справы, якіх у гэтым лісьце няма.

У гэтым лісьце зварочуюся да Вас з вялікаю просьбаю. Просьба гэтая датычыць 4-х сяброў Беларусоў з Наваградзкага павету, якія ў скорым часе будуць і сябрамі студэнтамі. Людзі гэтыя вось якія: Клаўсуць, Лаўскі, Сак Юльян, Сак Аляксандар. Яны кіруюцца ў Прагу і 26-27 верасьня мусілі перайсьці граніцу каля Друзґенік. Дык вось просьба: 1) не дапусьціць, каб ліцьвіны вярнулі іх назад пад польскую акупацыю, а таксама каб не пасадзілі ў концэнтрацыйны лагер; 2) дастаць усім 4-м пашпарты й чэскія візы на праезд у Прагу. Першыя тры матурысты і прыняты праскаю Грамадою на дадзеныя чэскім урадам стыпэндыі, а Сак Аляксандар не матурыст, але гэта нічога, бо ён тут будзе на кошт брата, які, будучы каморнікам, зарабіў улетку грошай, вучыцца на матуральных курсах. Уцякаць ён мусіць, бо інакш забе́руць у польскае войска. 3) Я ведаю, што ў Ураду цяпер няма грошай і дзеля гэтага не патрэбна, каб Вы ім давалі грошай на дарогу, але калі ў іх ня будзе ставаць на дарогу грошай, дык пазычце ім, а я ручаюся, што першыя тры самі адашлюць Вам і то не пазьней, як за месяц па прыезьдзе ў Прагу (бо дастануць падмогу), а за апошняга як га адашле брат.

Адначасна з гэтым пасылаю ў «Б<еларускі> С<ьцяг>» стацьцю «Дзьве праўды». Хроніку маю прыслаць крыху пазьней. Ня шкодзіла-б мне, каб Вы напісалі, якія наагул стацьці Вам патрэбны.

Прывет знаёмым.

Ваш Янка Станкевіч

30га верасьня 1922. Прага.

Мой адрэс цяпер на Вяршыніна або: Praha VI, Albertov na Slupi, Studentsky domov, мне

582.1.43:206-207

3310. Беларускі Партызан. Месячн. безпартыйная часопісь Змагароў за Бацькаўшчыну. №2-3. Верасень-Кастрычнік 1922

582.1.43:188-191

582.1.43:192-195

3311. Ліст Віталя Бендэроўскага (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.10.1922 з просьбай паведаміць аб атрыманьні грошай

582.1.43:203&r

3312. Паштоўка Андрэя Бароўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.10.1922

7/X.

Многоуважаемый Вацлав Юстинович,

Спѣшу увѣдомить Вас, что сегодня наконец, послѣ долгих трудов, массы раздраженія и непосильных для моей кассы расходов, удалось добиться отправки вещей. Как и что, напишу на днях подробно. Сейчас хотѣлось только для общаго успокоенія сообщить о наконец совершившемся фактѣ. Отправлены в Ваш адрес Эйдкунен Ковно: архив, книги, клишэ, паспортные бланки, типогр. станок и желѣзная кровать. На оборотѣ значится адрес бюро Миссіи, а мой личный адрес в Фриденау пока старый (Gosslerstr. 20). Я буду весьма признателен, если вся корреспонденція для меня и представительства будет направляться непосредственно по одному из этих всѣм Вам в Ковно извѣстных адресов. Меня сильно теребят Iweg и Колоніальный Банк. Шлю всѣм, кто меня помнит, привѣт. Жму руку.

Ваш А.Боровскій.

582.1.43:216&r

3313. Ліст Андрэя Бароўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.10.1922

Многоуважаемый Вацлав Юстинович,

Как уже сообщал Вам открыткой от 7 октября, вещи отправлены наконец, послѣ долгих хлопот и непріятностей. К сожалѣнію нарвались на очень неисполнительную транспортную контору, с которой чуть не пришлось судиться, т.к. когда я в концѣ августа потребовал или немедленной отправки или передачи вещей другой болѣе солидной экспедиціи, то задержку объяснили ошибочной засылкой нѣсколькихъ наших ящиков на швейцарскую границу. Мнѣ пришлось два раза рыться в громадном складѣ и лично разыскивать наши вещи. А наша машинистка чуть не каждую недѣлю ѣздила на склад и безуспѣшно добивалась скорѣйшей отправки. Безчисленных телефонных разговоров я уже не считаю. Слава Создателю, наконец удалось это мучительне дѣло уладить. Не обошлось конечно без подмазки. Всѣх расходов по этой отправкѣ у меня набралось до 3000 марок. Вещи направлены в Эйдкунен в адрес трансп. конторы «Karl Deyke Nachfolger». Эта контора переотправит Вам в Ковно.

О наших дѣлах здѣсь разскажет Вам Брюно Карлович[1]. К сожалѣнію приходится опять искать помѣщенія для Миссіи: к 8 ноября хозяйка просит очистить комнаты, за которыя в октябрѣ пришлось уплатить уже 5000 м. Дороговизна на все растет в геометрической прогрессіи. Жить стало невыносимо тяжело. Завтрашній день пугает своей полной неизвѣстностью. К матерьяльным заботам однако я привык относиться довольно спокойно. Тяготят и смущают меня создавшіяся отношенія. Если

бы у меня было хоть немного денег, я уже давно пріѣхал бы к Вам, чтобы выяснить всѣ вопросы и устранить накопившіяся недоразумѣнія.

Сообщите через Брюно Карловича, что дѣлать с долгом Колоніальному Банку и Iweg'у. Написанное нами послѣднему письмо прилагаю.

Искренно желаю Вам всего лучшаго.

Привѣт супругѣ. Жму руку.

Ваш А.Боровскій.

16/X

Friedenau b/Berlin

Gosslerstr. 20III

582.1.43:093&r

[1] Мюллер.

3314. Ліст Віталя Бендэроўскага (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.10.1922

582.1.43:177&r-178

Камэрцыйна-гандлёвая інфармацыя. «Тут дуже смачні кількі і добра горілка. Я часом випиваю кількі кілішків доброї горілкі і вспоминаю, як торік в Ковні в мороз ми пили перцовку. Як буду іхати до Ковно, то обовязково возьму с собою — звітце трохі спирту».

3315. Ліст Балтыйскай Транспартнай Акцыйнай Суполкі (Коўна) Беларускай Місіі (Коўна) за 26.10.1922

Del: siuntimo knygų per Rygą į Rusiją.

Kaip mums praneša musų korespondentas — Rygoje, p. Žimunavičius del tų knygų persiuntimo neatvyko ir jokių avansų persiuntimo išlaidoms neįnešė.

582.1.43:224

3316. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.10.1922

582.1.43:214&r

У справе атрыманьня дадатковых стыпэндыяў (замест абяцаных 27 далі толькі 20, падалі заяўку яшчэ на 10 у Прагу й 7 ва Украінскую акадэмію ў Подзебрадах).

3317. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 31.10.1922

Вельміпаважаны Пане Ластоўскі!

Адначасна з гэтым пасылае п. Вяршынін Вам (адрэс: Belmission) тэлеграму аб тым, што Цытавіцкі і Яноўскі ўнесены ў сьпісак на стыпэндыі, пададзены чэскаму міністэрству, і пасьведчаньне, якое ў гэты канвэрт укладзена. Апрача гэтага, калі будзе патрэбна, добра было-б, каб яны падалі ад студ. бел. арганізацыі пасьведчаньне аб тым, што яны едуць на ўсеславянскі студэнскі конгрэс у Празе. Найляпей гэта было зрабіць адразу, але мо' й цяпер удасца.

Ліст Ваш праз Дзехцярова дастаў, вельмі дзякую. Зробім дзеля яго ўсё, што будзе магчыма; спадзяюся, што гэта ўдасца. На ліст Ваш адкажу за некалькі дзён. Цяпер-жа напішу аб Усяславянскім студэнскім Конгрэсе. Конгрэс гэты будзе ў Празе перад Калядамі. Мае на яго права

прыслаць свайго прадстаўніка кожная славянская нацыя кожнага універсітэцкага места. Вельмі добра было-б, каб прыехалі нашыя прадстаўнікі з Вільні, Менску, Горы-Горак, Мар'іна Горкі, Віцебску й Масквы. У кожнае з гэтых месц пасланы лісты, але надзеі на прысланьне дэлегатаў (па адным дэлегаце) няма. Пішу гэта Вам, каб ведаючы ў чым справа, Вы маглі часам аказаць магчымую падмогу. Прыезд сьвядомых беларускіх прадстаўнікоў — студэнтаў (навет хоць-бы ad hoc не упаўнамочаных) з Савецкае Беларусі і Расеі нам у многіх адносінах шмат памог-бы ў чэхаў і, хоць меней, у іншых славян. Падчас конгрэсу некалькі чалавек дэлегатаў мы тут удзяржалі-б з свае студэнскае касы ды складчынаю. Цікаўна, што дагэтуль у Арганізацыйным Комітэце гэтага конгрэсу, дзе ёсьць нашы 4 прадстаўнікі (у тэй лічбе й я) маскалі паразумеліся з палякамі проці Беларусоў і Украінцаў; з маскалямі-ж солідарна выступаюць яшчэ сербы. Мы згодна выступаем з Украінцамі і (прынамся дагэтуль у Камітэце) нас і украінцаў паддзержуюць чэхі і лужыцкія сербы.

Канчаю пісаць, бо трэба несьці тэлеграму на пошту. З шчырым паважаньнем

Ваш Янка Ст.....

31/X 22.

582.1.43:213&r-214&r

3318. «Вечны пакой». Апавяданьне невядомага аўтара

582.1.43:059&r-060& — р

Дата невядомая.

3319. Разьбітая лялька. Апавяданьне «Тутэйшага»

582.1.47:102-107

Дата невядомая.

3320. Абавязкі мужоў даверу партыі Польскі Цэнтар (Obowiązki mężów zaufania stronnictwa Polskie Centrum)

582.1.01:035&r — мк

Дата невядомая. Партыя Stronnictwo Polskie Centrum атрымала 6 месцаў у Польскім Сойме ў выніку выбараў 5.11.1922.

3321. Занатоўка Кляўдыюша Душэўскага за 2.11.1922

Дражняць стараверaў

«Тятя, тятя, дай какоры*»

* Какора — неякая еда. Нето перапечка, не то ешчэ нешта.

2.XI.22. КД.

582.1.43:004

3322. Ліст Янкі Чарапука (Гранд-Рапідз, Мічыган, ЗША) панне Гэлене (?) (Коўна) за 4.11.1922

Wielce szanowna panno Heleno!!

Wstyd mi ze do tej pory do Was nienapisałem — lecz lepiej pózno, a nizeli wcale. I właśnie dzisiaj wspomniałem po raz pierwszy Kowno i Wasz ten

cudowny miły domek gdzie tak "sielsko i anielsko" jak opiewał Kornel Ujejski. Postanowiłem kilka słów napisać, choć z pewną trwogą, bo moze juz przyjemna i miła Helunia nie "panna" "a pani". Proszę bardzo mi odpowiedzić, jak Wasze zycie płynie. Co robi kochana Babunia i Mamusia i jak zyje tamta co pokoje ubierała — imię jej zapomniałem. W tą chwilę chciało by się być znowu blizko Was zartować, jak kiedyś i sobie "kołdunków spozyć", a czasami i "krupniczku" popić.... Bo u nas tu bardzo "sucho" t-j. pod zadnym warunkiem w całych Junejdet Stets nie mozna za dobry pieniądz nigdzie dostać, ani wódki, ani likieru, ani innych trunków, tu tylko piją tak zwany "munszajn" t-j. wyrob kazdego obywatela własny trunek. Nie ktore z robotniczej klassy na tym interesie zrobili szalone pieniądze. Prosze sobie wyobrazić ze ja od czasu kiedy wstąpiłem na amerykański brzeg ani nawet i nie powąchałem — tak ze gardło, za przeproszeniem zbyt jest za suche. Powodzi się mi dosyć dobrze. Mam dwie posady zarabiam świetnie. Na wiosnę kupuję automobil i poczynię staranie wziąść na wypłatę, złozywszy pewną gotówkę i swój dom. Pod względem materjalnym odczuwam zadowolnienie. Ale teraz pracuję od 7 rana az do 10 wieczorem. Oprocz tego uczę się angielskiej mowy, z którą jednak trudności wielkiej nie mam, ale juz czuję się jak u siebie w kraju. Udało się mi zgrupować koło siebie sporą liczbę białorusinów, tak ze to jeszcze milej odbija się na ogólnej harmonii zycia.

Miasto Grand Rapids zajmuje 3 miejsce po piękności w Ameryce. Cała w alejach pełnych uroczego widoku a pózniej jeziora, Miczygańskie jeziora pełne poetycznych opisów. Tu nie widać ni halasów New-Yorku ni dymów kominowych "czarnego" Chicago, do którego jazdy tylko 6 godzin. Oto w krótkiej treści — ten ogród gdzie przebywam. Na pierwszy początek jestem zadowolniony z Ameryki. Proszę jak najobszerniej opisać o sobie i swem zyciu o balach, o kawalerach i o pannie «Ludzie»...

Przy tem proszę serdecznie oddać ode mnie ukłon pani Ginz, a takze poprosić jej adres, bo ona tyle dobrego mnie zrobiła w moich spełnieniach rządowej posady. Chcę bardzo nakreślić jej parę słów — lecz nie znając adresu tego nie mogę.

Wogóle proszę nie skąpić się na pisanie bo tu jest juz wprost chorobą, ze jezeli człowiek otrzyma wiadomość od znajomych z kraju to u niego zawsze energii przebywa więcej niz wartość dolara.

Zawsze Wasz przyjaciel
John Cherepuk
585 Stocking Ave.
Grand Rapids, Mich.
U.S.A.
4 listopada 19222
582.1.43:056&r-057&r-058

3323. Ліст Міхала Рёмэра (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.11.1922

Kochany Panie Wacławie!

Sprawa, o której ze mną mówiliście, przekazana została przez nas do zreferowania Janowi Vilejšisowi; jemu też dorączyłem złożony przez Was odpis

dokumentu. Ponieważ w przyszłym tygodniu referat zapewnie dojdzie do skutku, więc było by dobre, gdybyście m[ogli sa]mi z J.Vilejšisem[1] pomówić poprzednio i u[dzielić je]mu dokładnych niezbędnych wyjaśnień. Ponie[waż] z J.Vilejšisem byliście razem za czasów Wileńskich i wiedzieliście o sobie, więc nie popełniam niedyskrecji, wskazując Wam na niego, jak również nie będzie niedyskrecją zgłoszenie się Wasze do niego.

Łączę wyrazy prawdziwego uszanowania oraz pozdrowienia braterskie

Wasz Michał Römer

Kowno, 9.XI.1922

582.1.48:268 — pa

582.1.48:295 — канвэрт

[1] Бурмістар Коўна.

3324. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ёнасу Вілейшысу (Коўна) за 9.11.1922

Szanowny Panie.

Chciałbym w tym tygodniu pomówić z Panem o sprawach białorusko-litewskich; uprzejmie więc proszę o naznaczenie czasu i miejsca spotkania.

Z głębokim Szacunkiem

W.Łast

9.XI.22.

582.1.48:269

3325. Ліст Ёнаса Вілейшыса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.11.1922

Szanowny Panie W.Łastouski!

Bardzo będę rad zobaczyć się z Panem dla omówienia spraw w przyszłą sobotę[1] o godzinie 6-7 wieczorem w moim mieszkaniu przy Lukšio gatve N12-6 gdzie będę na Pana oczekiwać.

Z szacunkiem

Jonas Vilejšis

582.1.48:270

[1] 10.11.1922.

3326. Ліст міністра беларускіх спраўаў Дамініка Сямашкі (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.11.1922 з просьбай паведаміць аб умовах перадачы Міністэрству правоў на выданьне падручніка «Незабудка»

582.1.43:211

3327. Дублікат акту аб продажы Вацлавам Ластоўскім права на чацьвертае выданьне кнігі «Незабудка, першая пасьля лемантара чытанка» Міністэрству Беларускіх Спраўаў за 15.11.1922

582.1.43:208 — мк

3328. Запрашэньне Дамініка Сямашкі Вацлаву Ластоўскаму за 15.11.1922 на паседжаньне ў пытаньні арганізацыі ў Коўне выставы беларускага друку, якое мае адбыцца 16.11.1922

582.1.43:217

3329. Канадійская Жизнь (Вініпэг). №16. 15.11.1922

[З артыкулам:] Польща и бѣлоруссы («Маяк»)

582.2.59:025-026 — д

Канадійская Жизнь. Единственная русская газета въ Канадѣ. Выходитъ 2 разы на мѣсяць. Предплата на годъ $1.50. Издается Русскимъ Православнымъ Обществомъ Просвѣщеніе. о. В.Басалыга, редакторъ. Адресъ редакціи : — CANADIAN LIFE 643 Manitoba Ave., Winnipeg, Man.

3330. Позва Вацлаву Ластоўскаму і Станіславе Ластоўскай на агульны сход сяброў Беларускае Грамады ў Коўне, які мае адбыцца 18.11.1922 ў памешканьні Цэнтральнае Сялянскае Рады (вул. Міцкевіча, 13а)

582.1.43:222 — В.Ластоўскаму

582.1.43:223 — С.Ластоўскай

3331. Запіска Мікаласа Сьляжавічюса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.11.1922

Высокапаважаны Пане.

Сегодня буду свободенъ только въ 4½ часа пополудни не болѣе получаса. Если Васъ это устраиваетъ, милости просимъ. Въ случаѣ, если это время вамъ неудобно, тогда я предложилъ бы Вамъ завтрашній день тоже в 4½ часа пополудни.

Съ глубокимъ почтеніемъ

MSleževičius

22/XI 1922

582.1.43:221

3332. Ліст рэдактара двухмесячніка «Mūsų Žinynas» Аляксандра Ружанцова (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.11.1922 з прапановаю аб супрацоўніцтве

582.1.43:210

3333. Квіток №5 аб атрыманьні ад Вацлава Ластоўскага сяброўскіх узносаў за 1922 год (1 Літ) Беларускай Грамадой у Коўне за 25.11.1922

582.1.43:183

Падпісаны: Намесьнік старшыні Л.Заяц, Скарбнік Гр.Казячы.

3334. Ліст Міколы Дзямідава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) [за ?.11.1922]

Найпаважанейшы Пане Старшыня Рады Міністраў!

Лёс мой злажыў так варункі, што мусяў я пакінуць, цяпер ужо назауседы, Польшчу і перабрацца ў Дзьвінск, дзякуючы чаму маю магчымасьць

падзелицца з Вами, Пане Старшыня, сваім жыццьцем за апошніе годы з таго моманту як пакінулі Вы мяне ў Менску. Вам ведама, што з працы «Ўсевялікай» Беларускай Вайсковай Камісыі, якая фактычна была, за малым выключэньнем некатарых сяброў, аддзелам польскай дэфэнзывы, нічога ня вышла, дзеля гэтаго я пакінуў гэту арганізацыю і перашоў на службу да Балаховіча, каторы даручыў мне сфармаваць «самадзельны Беларускі баталіён[»] і назначыў мяне Камандзером яго. Гэты час я лічу найлепшым момэнтам маго жыцьця. Каб Вы, Пане Старшыня, [бачылі] жаўнераў-беларусаў маго баталіону, то і Вашае сэрдцэ забілася бы радостна ад таго вражэньня, якое ён рабіў. Ня буду шмат апісываць, а скажу толькі, што па ліквідацыі арміі Балаховіча, адзін Беларускі баталіон стрымліваў націск войск бальшавіцкіх, а потым на мой прызыў ня покідаць роднай зямелькі і утрымаць у сваіх рукох хоць маленькую частку нашай Бацькаўшчыны, ўсе жаўнеры, як адзін, згодзіліся на гэтае. Ў студзеню 1921 г. мы ня мелі што есьці, патроны вышлі, опраткі жаўнераў заўсім знішчыліся і я, ня хочаці рабаваць жыхароў прымозырскай палясы, гэта была наша тэрыторыя, змушаны быў выяхаць у Варшаву прасіць Польскае камандаваньне дапамагчы нам в гэтым. У гэты момэнт мы мелі злучыцца з Слуцкімі беларус. паўстанцамі, з каторымі я трымаў кантакт. Ў Варшаве згадзіліся даць патрэбнае і калі ужо ўсе паперы былі гатовы выдачу іх мне затрымалі. Аказалася, што Аляксюк і Балаховіч былі у Пілсудзкаго, упрэдзілі яго, што я разыгрываю Начальніка паньства беларускага, — страшэнны вораг палякоў і т. д. (Аляксюк меў злосьць на мяне ящэ ў арміі Балаховіча, гдзе ён быў глаўным актыўным дзеячом Беларускаго Палітычнаго Камітэту, за тое, што ўсе 26 афіцэраў маго батальону апрэдзяліўшы і разоблачыўшы яго правакацыйную дзейнасьць, пастанавілі Аляксюка забіць. — Даведаўшыся аб гэтым ён уцёк за-граніцу да палякоў, гдзе, як наша пагоня яго настігла, Комэндант - польскі ў Альшанах яго схаваў). — Скуткам гэтых плётак была тоё, што мяне інтэрновалі ў лагер ў Радома, куды потам прыслалі і цэлы мой баталіон.

Ў чэрвеню 1921 г. мяне звольнілі. 1-го ліпня я атрымаў пасаду Кіраўніка 7-кляс. «szkoły powszechnej» в Горадку Беластоцкаго павету, ў моём роднам мястэчку, гдзе радзіўся і вырас... За рок маго прэбываньня тутака я залажыў

1) шпіталь эпідэмічны, 2) залажыў каапэратывы і быў Старшынею Цэнтральнаго Праўленьня, чаму меў магчымасьць сбіраць сходы і разам з гэтым будзіць нашэ селянство ад нацыянальнай спячкі. Пісаў жалабы ад селян ў Сойм на Польскую адміністрацыю і т. д. Наканец падашлі і выбары у Польскі Сойм[1]. Мяне выставілі кандыдатам па спіску №16 ад Беластоцкага Вокругу і назначылі Старшынею Беластоцкага Паветовага выбарнага Камітэту. І вось заворушыліся ўсе полякі-тутэйшыя. Вам ведама як добра для нас прашлі выбары, бо мы ня спалі. Аляж гэтаго мала. Скуткам маіх прамоў на міцінгах было тое, што селяне Горадокскай гміны выгналі з вёсак польскіх вучыцелеў, запатрэбавалі выкладоў у беларускай мове. Гэта была 8 лістападу, а 9 о гадзіне 8 раніцою паліцыя, вызванная з Беластоку акружыла маю школу, зрабіла обыск, забрала ўсю беларускую літэратуру (была і тая што Вы прыйслалі праз Матэйчук з Прагі) карэспандэнцыю маю і жонкі мене арэштавалі і павезлі у Беласток.

Тутака пратрымалі цэлы дзень і толькі у вечэры, аб'явілі што я арэштованы за антыпаньствоваю агітацыю, взбунтованьне беларусоў і т. д. Затым сфотографовалі мяне, адпечаталі пальцы, змерылі і посадзілі пад арэшт. Трымалі да 14 лістапада, калі пад канвоем адвелі да Пракурора Суда, гдзе следоваць мене часова звольніў. Вернуўшысь да хаты застаў ужо новаго кіроўніка школы. Паехаў ў Вільню, зкуль пры дапамозе п.п. Луцкевіча, Тарашкевіча і іншых перебраўся сюды да п. Езавітава.

Шкада вельмі была пакінуць роднае гняздо, але лёс мой нехай будзе такім, як ўсех Вас, прымушаных працаваць на чужыне;..

Цяпер выбачыце, пане Старшыня, што змушаны фатыгаваць Вас і прасіць, калі ласка дапамагчы мне. Вам ведама, з першых вучыцельскіх курсоў ў Вільні, калі Вы чыталі нам лекцыі, што я, як вучыцель, быу на гэтых курсах. Сеньня я звернуўся да п. Крычеўскаго с просьбай как бы мне беларускі Урад выдаў (можна ад Міністра Беларус. Спраў у Літве) пасьведчаньне ў тым, што я есьць вучыцель, і здаў экзамен на вучыцеля гісторыі і рас. мовы (прі Віленском вучэбн. вокругу) «городских по положенію 1872 г. 31 мая, (В.у.) училищъ» а так сама у 1919 праслухаў 1-ые белор. вуч. курсы, і што безпрарыўна ад 1.VIII 1907 году да 18.VII 1914 г. быў вучыцелем калі меня забралі на вайну. В арміях быу да 1.VI 1921, а апошні час з 1.VII 1921 г. і да гэтага часу быў кіраўніком 7 кляс. школы у Горадку Беластоц. павету. Без гэтакіх дакумэнтаў я не маю магчымасьці атрымаць тут пасады, бо пры пераходзе граніцы мусяў знішчыць свае дакумэнты.

Вы не паверыце пане Старшыня, як хацеў бы я быць блізка каля Вас, тым бардзей што ў Коўні і п. Душэўскі, якому шлю свае прывітаньне, а панічкі цалую рукі. Душою я заўседы быў з Вамі. Але памятаю Вашае абецаньне, што калі кольвек і я атрымаю магчымасьць працаваць пад Вашымі загадамі, — буду чакаць!

Шчыра аддадзены Вам
Ваш Мікола Дзямідаў

582.1.43:048&r-049&r

Дакладная дата невядомая. [1] Выбары ў Сойм адбыліся 5.11.1922.

3335. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.11.1922

Вельміпаважаны Пане Ластоўскі!

Ваш ліст з 27.X праз сябру Дзегцярова дастаў і за яго Вам шчыра дзякую. Адказаваю на паасобныя справы.

1. Дзегцяроў ужо якісь час як прыняты на стыпэндыю. Робіць ён здаецца на ўсіх добрае ўражаньне. Група нас студэнтаў мае выдаваць тут шапірографаваны месячнік. Дзегцяроў будзе ў нас друкаром і ілюстратарам. Бяда толькі, што будуць літары пісаныя а ня друкаваныя, бо ня маем пішучае машынкі.

2. Я і ўсе нашыя студэнты вельмі цэняць «Беларускі Сьцяг» і лічуць яго вельмі патрэбным. Лічым, што ён ужо зьяўляецца вельмі добрым. Палепшаваццa-ж ён будзе, мне здаецца, па меры далейшага выдаваньня[1], уцягаваньнем у працу цяперашніх яго супрацаўнікоў і павялічэньнем лічбы іх

новымі. Каротка кажучы, справа далейшага яга разьвіцьця залежыць толькі ад часу.

3. Што да арганізацыі Ц. Бел. Студ. Саюзу, дык аб гэтым думаем, але й баёмся, ці ўдасца, бо можа прыехаць вельмі мала.

4. Што да «Y.M.C.A.»[2] дык з гэтым справа лягчэйшая й можа што ўдасца зрабіць. Ужо было-б гэта зроблена, каб нашыя «слаўныя» эсэраўскія лідэры не перашкаджалі гэтаму, баючыся навет цені хрысьцянства.

5. Што да захаваньня групы ня толькі фактычна, але й офіцыяльна ідэолёгічна чыста незалежніцкай, дык з Вамі зусім згаджаюся.

6. А цяпер маю да Вас гэткую вельмі важную справу: Як Вы ведаеце, многія (калі ня ўсе) сьвядомыя Беларусы нездаволены нашым цяперашнім назовам «Беларус» і г. д. Прызнаючы яго непрактычнасьць і шкоднасьць пры адраджэньні й наагул жыцьці нашага народу, як рэклямуючага нас, як нейкую часьць, дадатак «рускіх», я прастудыёваў ўсе нашыя нацыянальныя назовы ў розныя пэрыоды гісторыі нашага народу, напісаў аб гэтым даволі вялікі рэфэрат, у якім з усіх нашых быўшых і цяперашніх нацыянальных назоваў як Крывічы, Русіны й Беларусы, Літоўцы, у канцы даводжу, што найправільнейшым, найпрактычнейшым і найлепшым нашым нацыянальным назовам зьяўляецца Крывіч, край Крывія і прымета крывіцкі або крыўскі[3]. Рэфэрат гэты я прачытаў на зборцы ўсіх нашых праскіх студэнтаў. Рэфэрат зрабіў даволі вялікае ўражаньне і блізу ўсе нашыя студэнты бяз розьніцы соцыяльных і іншых паглядаў са мной згадзіліся, што трэба ўжо памалу, але сыстэматычна гэты назоў уводзіць. Як даведаліся аб гэтым украінцы, дык дадалі нам яшчэ балей ахвоты. Ведама якісь час ужываліся-б абодва тэрміны — Крывіч і Беларус, потым Крывіч стаў-бы пераважаваць і наканец сапхнуў бы зусім тэрмін беларус, які ўжываўся-б толькі дзеля абазначэньня тых, каго мы цяпер завём тоже-бѣлоруссомъ і też-białorusinem. Разумеючы аднак усю вагу гэтае справы, я пакуль што не адважаваюся друкаваць (хоць на шапірографе) свайго рэфэрату і хачу пачуць у гэтай справе Ваш пагляд. Прызнаюся, што спадзяюся ад Вас пахвалы «крывічу», прыпамінаючы, што Вы самі ў 1917 г. выдавалі ў Вільні журнал «Крывічанін»[4] і значыцца былі першым ініцыятарам увядзеньня гэтага назову. Дык з нецярпеньнем чакаю Вашага адказу.

Шчыра прашу выбачыць, што я доўга ня пісаў. Перашкаджала гэтаму як нястача часу, так і нястача паштовых марак.

З глыбокай пашанаю
Янка Станкевіч
27.XI 22.

Мой адрэс: або на Вяршыніна
або: Praha, Žižkov, Palackého třida, č.28/III
bytem u p. Karabce
582.1.43:215&r

[1] «Беларускі Сьцяг» спыніў выданьне на №4 (жнівень-верасень 1922). [2] Young Men Christian Association. [3] У гэтым лісьце згаданыя тэрміны ўжытыя першы раз як альтэрнатыва тэрмінам Беларусь, беларускі ігд. [4] Адзіны нумар часапіса «Крывічанін» выйшаў у кастрычніку 1918 году.

3336. Візытоўка Леонаса Бістраса

Dr. Leonas Bistras
Seimo Pirmininkas

582.1.43:220

3337. Ліст Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) [за ?.??.1922]

582.1.43:218

Дата невядомая. У лісьце Зузэміль прапануе за свой кошт выдаваць у Кёнігсбэргу беларускія кнігі . А таксама: «О плодахъ моей бѣлорусской агитаціи въ Германіи Вы, надѣюсь, узнали изъ ругательствъ польской печати, которая никакъ не можетъ догадаться, какимъ образомъ бѣлорусскій вопросъ былъ недавно поднятъ даже въ германскомъ парламентѣ».

3338. «Аб неабходных канкрэтных мерапрыемствах». Дадатак да запіскі аб беларуска-літоўскіх узаемаадносінах.

Конфиденціально.

ПРИЛОЖЕНІЕ
к запискѣ о бѣлорусско-литовских взаимоотношеніях.

О НЕОБХОДИМЫХ КОНКРЕТНЫХ МѢРОПРІЯТІЯХ.

В основаніе конкретных мѣропріятій, которыя по нашему мнѣнію необходимо осуществить в цѣлях оздоровленія и укрѣпленія бѣлорусско-литовских взаимоотношеній, необходимо положить слѣдующія руководящія соображенія:

1. Дѣятельность бѣлорусских политических и національных организацій, направленная на возрожденіе независимости Бѣлоруссіи, не может быть отдѣлена от дѣятельности бѣлорусских организацій, находящихся на территоріи Виленщины и Гродненщины и направленной в первую очередь на оборону этой территоріи от поляков и передачу ея Литвѣ. Бѣлорусская работа должна разсматриваться как нѣчто цѣльное и в зависимости от этого должна инструктироваться одним центром. Таковым центром является Правительство Бѣлорусской Народной Республики, пользующееся, с одной стороны, признаніем всѣх бѣлорусских національных сил и, с другой стороны, твердо стоящее на платформѣ тѣснаго сотрудничества с Литвой.

2. В виду того обстоятельства, что в Литовской Республикѣ обслуживаніе бѣлорусских интересов принадлежит Министерству по бѣлорусским дѣлам, необходимо установить слѣдующій принцип: а) в предѣлах Литвы до демаркаціонной линіи[1] дѣлом помощи и организаціи бѣлорусскаго населенія вѣдает исключительно Министерство по бѣлорусским дѣлам; b) в предѣлах от демаркаціонной линіи до линіи 12 іюля[2] бѣлорусская работа ведется солидарно с Министерством по бѣлорусским дѣлам и Правительством Бѣлорусской Народной Республики; с) за линіей 12 іюля бѣлорусская работа ведется исключительно Правительством Бѣлорусской Народной Республики.

Проведеніе в жизнь этого положенія необходимо как потому, что при этом будут облегчены условія дѣятельности бѣлорусских организацій под враждебной оккупаціей в смыслѣ юридической отвѣтственности — при этом условіи выступленія против оккупаціонных властей должны разсматриваться как народныя волненія, а не как измѣна и шпіонаж в пользу чужой державы; так и потому, что это положеніе соотвѣтствует позиціи виленских и гродненских бѣлорусских организацій.

3. Борьба за Вильно, как самая главная очередная задача, не может протекать успѣшно, если не будет выработан общій план и общія принципы этой борьбы. В этом смыслѣ найболѣе существенным представляется установленіе срока, хотя бы приблизительнаго, на который эта борьба при настоящих условіях должна быть расчитана. Без установленія этого срока представляется невозможной правильно поставленная органическая работа.

4. Матеріальная помощь бѣлорусскому дѣлу оказывается только в формѣ займа Правительству Бѣлорусской Народной Республики, каковой заем подлежит возврату на условіях, установляемых в соотвѣтственном договорѣ. В вопросѣ о помощи необходимо указать на одно весьма важное обстоятельство: поддержка должна оказываться не на короткій срок и не по мѣсяцам, как это имѣло мѣсто до настоящаго времени, а на болѣе долгій срок, во всяком случаѣ такой, чтобы была возможность спокойной работы, без опасеній, что завтра по каким-либо случайным или намѣренным обстоятельствам, поддержка будет пріостановлена.

Признаніе перечисленных общих положеній в извѣстной степени опредѣляет собой и необходимыя практическія мѣропріятія.

I.

Остановимся прежде всего на мѣропріятіях, имѣющих своим объектом Виленщину.

О р г а н ы : Для выработки плана борьбы за Вильно необходимо участіе двух сторон — литовцев и бѣлоруссов. Строить предположенія одной из сторон явно несостоятельно. Не представляется обязательным участіе в выработкѣ этого плана третьей стороны, ибо дѣло это в главных и найболѣе существенных чертах своих конфиденціально и выносить его на широкія собранія нельзя. (Общеполитическія мѣропріятія, касающіяся одновременно всѣх элементов населенія, должны обсуждаться совмѣстно). Вмѣстѣ с тѣм мы думаем, что организація для этой цѣли постояннаго органа не требуется. Бѣлорусскую сторону представляют — Правительство Бѣлорусской Народной Республики и Министерство по бѣлорусским дѣлам в Литвѣ.

План: Бѣлорусская работа в Виленщинѣ и Гродненщинѣ ставит своей задачей: a) расширеніе симпатій бѣлорусскаго населенія этих земель к Литвѣ и b) борьбу против польской оккупаціонной власти. Развитіе симпатій к Литвѣ возможно как путем поддержки бѣлорусскаго національнаго движенія на мѣстѣ, так и путем созданія благопріятных условій для бѣлоруссов в Литвѣ. В первом смыслѣ необходимо, чтобы національныя организаціи края

пользовались поддержкой в своих начинаніях — культурных, политических, экономических, поскольку эти начинанія способствуют бѣлорусско-литовскому сближенію. В этом смыслѣ особенно важна поддержка бѣлорусской прессы. В отношеніи второго положенія необходимо добиться, чтобы каждый бѣлорусскій дѣятель в краѣ был увѣрен, что в случаѣ если он пострадает за общее литовско-бѣлорусское дѣло, он всегда найдет в Литвѣ пріют и работу.

Для достиженія послѣдней цѣли не нужно прибѣгать к мѣропріятіям благотворительности. Необходимо использовать тѣ институціи, которыя имѣются в Литвѣ или могут быть легко созданы. Прежде всего необходимо, чтобы бѣлорусскій батальон, существующій в составѣ Литовской Арміи, не хирѣл вслѣдствіе невнимательнаго к нему отношенія и явнаго противодѣйствія, а развивался нормально. Благодаря батальону бѣлорусская молодежь, вслѣдствіи возстаній и т.п. потерявшая возможность легально жить под польской оккупаціей, могла бы устроиться в батальонѣ и не порывать начатой работы, проходя воинскую школу.

Независимо от батальона необходима организація в Литвѣ бѣлорусской учительской семинаріи или учительских курсов с интернатом хотя бы на 30 человѣк. Представляется очень печальным, что до настоящаго времени эта школа бѣлорусско-литовскаго содружества не организована, несмотря на усилія мѣстных бѣлорусских общественных дѣятелей. Если вырабатывать план борьбы за Вильно на болѣе долгую скалу, то без подобных учрежденій ни в коем случаѣ не обойтись. Они должны поставлять кадр работников для края, они должны быть «штабом», «головой» того движенія, которое происходит под польской оккупаціей.

Борьба за Вильно, как указано выше, должна также протекать в формѣ активной борьбы населенія с оккупаціонной властью. В то время, как работа перваго рода (укрѣпленіе симпатій к Литвѣ) может носить легальный характер, работа второго рода может быть только нелегальной, строго конспиративной. В послѣднее время эта работа ведется бѣлоруссами в контактѣ с Литовскими Стрѣлками. Однако в этой работѣ нѣт твердо установленной программы. По причинам извѣстным, мы не можем здѣсь указать на детали как культурной, так и политической работы в краѣ. Они должны быть разработаны в спеціальной комиссіи.

II.

Что касается помощи бѣлорусскому дѣлу вообще, то самым фактом неотдѣлимости бѣлоруссов Виленщины от общебѣлорусскаго дѣла, она в опредѣленных своих развѣтвленіях распространяется и на Виленщину. В этом отношеніи найболѣе важной представляется помощь на культурную работу.

Культурная работа бѣлорусской группы, опирающейся на Литву и с Литвой связывающей надежды на возрожденіе Бѣлоруссіи, имѣет исключительно важное значеніе. Голая политическая пропаганда, не опирающаяся на культурный фундамент, есть как извѣстно, постройка на пескѣ. Никакіе политическіе лозунги не могут быть осуществлены, если

народная масса культурно недостаточно подготовлена. К сожалѣнію, мы должны констатировать, что культурное воспитаніе бѣлорусскаго народа отстало в сравненіи с политическим. В критическій момент ненормальность эта может сказаться весьма чувствительно, если не погубить всѣ плоды политической работы.

Помощь Литвы в культурной области может оказаться в формѣ кредитов на изданіе бѣлорусских книг, в первую очередь учебников. Кредиты должны отпускаться как ссуда, подлежащая возвращенію на опредѣленных условіях. Вообще, постановка издательскаго дѣла, которое бы обезпечило многомилліонное населеніе Бѣлоруссіи книгой в потребном количествѣ — задача не терпящая отлагательства. Ни Вильно ни Минск этой задачы выполнить не могут, ибо бѣлорусское дѣло там под подозрѣніем; очень важно, чтобы эта аполитическая помощь, пріемлемая всѣми партіями и группами, исходила от Литвы. Это будет найболѣе глубокой и прочной основой бѣлорусских симпатій к Литовскому Государству. Подчеркиваем, культурная помощь (издательская дѣятельность) должна носить не благотворительный характер, а строго дѣловой. В данный момент у нѣкоторых бѣлорусских издательств есть весьма солидныя заказы на учебники, но реализовать их не представляется возможным за отсутствіем средств.

Делегація в Америку: Вопрос о бѣлорусской делегаціи в Америку выдвигался бѣлорусскими дѣятелями в Литвѣ неоднократно. Но как и большинство других начинаній до сих пор висит в воздухѣ. Почему Литва не идет на встрѣчу бѣлорусскому возрожденію в этом дѣлѣ — непонятно. Между тым, посылка бѣлорусской делегаціи в Америку, организованная на братских началах, важна не только в цѣлях пропаганды бѣлорусско-литовской дружбы, но и в цѣлях матеріальной поддержки всего бѣлорусскаго освободительнаго движенія, которое питается до сего времени случайными средствами, подчас носящими характер мелкой подачки. Согласно статистических данных в Свв. Амер. Соединенных Штатах имѣется выходцев из Бѣлоруссіи около 1 милліона. У нас имѣются свѣдѣнія, что там уже образованы бѣлорусскія организаціи, но организаціи эти захвачены или русскими или польскими руководителями. Для установленія живого контакта, для пропаганды и сбора пожертвованій необходима поѣздка особой, хотя бы самой небольшой (3-5 человѣк) делегаціи из Бѣлоруссіи. Принимая во вниманіе курс денег, поѣздка, организованная в Америку не только могла бы себя оправдать, но и дать значительныя средства для борбы Бѣлоруссіи за свое освобожденіе. Это одно. Другое — делегація в Америку безусловно разбила бы ту вредную работу, которую ведут поляки среди католиков-бѣлоруссов, совращая их в число «поляков с окраин».

Своими силами Правительство Бѣлорусской Народной Республики организовать делегацію в Америку не может. Для Литовскаго государства, для литовской общественности эта задача не тяжела. Необходимо только, чтобы кто-нибудь этим дѣлом заинтересовался.

Политическая поддержка за границей: Бѣлорусскій вопрос опредѣленно замалчивается литовскими представителями за-границей. Из различных

соображеній, но об Бѣлоруссіи стараются не упоминать. Можно смѣло сказать, что ни одна карта Литвы, вышедшая за границей для литовской политической пропаганды не показывает, что на восток от Литвы лежит Бѣлоруссія. Если дѣло бѣлорусско-литовской дружбы не может компромитировать Литву на мѣстѣ, то почему иначе дѣло выглядит за-границей. Твердо проведенная поддержка бѣлорусскаго вопроса в Европѣ лежит в интересах обѣих сторон — и бѣлоруссов и литовцев.

582.1.43:075-081 — мк
582.1.43:083-086,089-092 — чарнавік з праўкамі А.Цьвікевіча
582.1.43:087&r-088&r — рукапіс А.Карабача

Дата й абставіны невядомыя. [1] Да мяжы зь Сярэдняй Літвой. [2] Да мяжы, зацьверджанай літоўска-расейскай дамовай 12.07.1920.

3339. Запрашэньне за 2.12.1922 Вацлаву Ластоўскаму на жалобную імшу ў гонар 100-годзьдзя першага літоўскага драматурга Аляксандра Фрома-Гужуціса, якая мае адбыцца 4.12.1922 ў Жамойцкай Катэдры

582.1.43:219

3340. Ліст Зігмаса Жэмайціса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.12.1922

Вельмі паважаны Пане Міністре!

Перепрашаючы вельмі за апазданьне с паведамленьнем аб ведомым Вам пасеженьню, маю гонар хоць цяпер паведаміць, што тыя асобы, якія былі у нашой супольной гутарке намечаны, згаджяюцьца і уважаюць за патрэбнае ўспамянутае пасеженьне, толькі з прычыны сваіх групавых спраў, аб якіх Васпан здаецьця ведаеце, ані сяганьня ані заўтра не могуць прыняць учасьця и просяць Васпана выбачыць, калі пасеженьне адбудзецьця у каньце бліжшага тыдня. Аб дню и гадзіне я буду мець гонар яще даведацьця у Васпана.

З глыбокай пошанай для Вас, Пане Міністре,

С.Жемайтис

582.1.43:209

3341. Ліст Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) невядомай асобе (А.Карабачу?) для Вацлава Ластоўскага (Коўна) за 10.12.1922

582.1.43:202&r

З прапановай купіць 2000 асобнікаў беларускага перакладу «Закона Божага» Чальцова пад рэд. Пачобкі лацінскім шрыфтам. «По оканчаніи этого дѣла я готовъ приступить къ изданію русско-бѣлорусскаго словаря г. Ластовскаго [...]»

3342. Акт за 12.12.1922 аб перадачы Вацлавам Ластоўскім правоў на выданьне сваіх кніжак Міністэрству Беларускіх Справаў Літвы

АКТ

Я ніжэй падпісаушы аутар Вацлау Ластоускі, гэтым передау пану Міністру Беларускіх Спрау Літоускага Ураду усе свае правы у поуную уласнасьць на выданьне кніжак сваіх перекладау пад назвамі:

1) Л.Толстой — Байкі,
Казкі Андэрсэна;
2) Салавей,
3) Якая ж тут сумлеука,
4) Сон,
5) Брыдкае Качэне,
6) Пяро і коламар,
7) Куфар Самалет,
8) Маці,
9) Каралеуская вопратка,
10) Гордая іголачка;
11) Японскія апавяданьня: Назараэру, О-Тэі, Пахованая Тайна, Дзікінікі, Дыплематыя;
12) Сьпева[к] Блондэль
13) Сьмерць Ролянда,
14) Сьвяты Юры і зьмей,
15) Падарожа воладта Оффэра,
16) Бадзячая кошка -Сытон -Тамсона:

За сумму триста літау, с тым што ордэр у Дзяржауную Скарбніцу на гэту сумму будзець выпісаны на мае імя.

Гэрбовы падатак прымаю на сябе.

Ласт....

582.1.43:212

3343. Ліст Яна Ермачэнкі (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 13.12.1922

Прага 13/XII 1922 г.

Глыбокапаважаны Ватцлаў Юстынавіч!

Я і жонка шлем Вам і жонце свае прывітаньня і жадаем Вам усяго найлепшаго. У гэтым лісце я хачу расказать Вам пра свае і агульнае нашэ беларускае студэнтскае жытьте.

Перш на перш тут адбываецца вельмі шкоднае здарэньне а іменно што беларусы падзелілісь на два лагера у адным Станкевіч і яму сачуствуючые, а так сама і жадаючые працавать только у напрамку карысьці бацькаўщыны у другой партыі ці группе Грыб і Мамонька якіе мне здаецца прыехалі у Прагу не учыцца а збівать з дарогі моладзь якая яшчэ не мае сталых поглядоў. Пры гэтым гэты два тіпа, я навыт не назваў-бы іх беларусамі, бо беларус не будзе вясьці шкоднай для свайго народа працы, а якраз такую шкодную працу вядуць яны бо разедіняюць тут беларусоў. Дзякуючы гэтаму у нас цяпер нічого не можна зрабіць добраго бо січасжэ з'яўляецца оппозіцыя якая не глядзіць об'ектыўна а толькі з боку сваей группы. Недаўно чытаў рэферат Станкевіч аб гісторычным руху на бацькаўщыне і назове «Беларусь» так смела, што былі прамовы з боку Грыба і яго прысных только таму што гэта ідэя ідзець ад Станкевіча. Наогул усе што ідзець ад Станкевіча і адналькова з ім мыслячых усе ім вызнаецца за неправідловае. Вось яшчэ Вам такій прыклад: сабраліся мы 15

асоб і залажылі свой журнал якій думалі будзе высьветляць усе думкі беларускаго студэнства. калі я як сябра рэдакцыйнай камісіі, на агульнам студэнтском сходзе аб'явіў аб гэтым утварэньні журнала і прасіў усіх сяброў прынять удел у праце то січас-жэ яны выступілі і заявілі што яны не хочуть прыймать ніякого удзела бо іх не запыталісь раней.

Яшчэ па другое. Я прашу Вас калі можна прыслать мне гісторычный матэріал аб паходжэньні беларусоў ад геттоў, я хачу даказать гэтым безграмотным у гісторыі людям якіе навыт Вашаго автарытэта па гісторыі не вызнають, усе-ж такі калі убачуть матэрыал то можа згодяцца з праўдай. Тяжка і горка наблюдать на той вялікій раскол якій пачайся з іх прыездом сюда.

Паважаны Ватцлаў Юстынавіч!

Сягоньня я атрымаў ад Галубінцэва ліст дзе ен просіць пераслать прыкладзены пры гэтым ліст у Коўну Генералу Радж-Зенковічу. Можа будзе Ваша ласка і Вы перадасьце гэты ліст я буду Вам вельмі удзячны.

Можа Вы маглі-бы паслать мне што небудзь з беларускай літэратуры.

Мой цяперэшній адрэс:

Praha. Kateřinska ul.

Anatomicki Ustav.

Studentu Janu Ermačenko.

Бывайце здаровы. Перадайте мае прывітаньня усім паважаным сябрам беларусам.

З павагай Ян Ерма...

582.1.43:152&r-153&r

3344. Ліст Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.12.1922 у справе расцэнак на друкарскія працы ў Кёнігсбэргу

582.1.43:185

3345. Інфармацыйны Бюлетэнь Цэнтральнага Беларускага Прэс-Бюро (Не для прэсы). №1. 15.12.1922. Коўна

582.1.43:121-123

З паведамленьняў:

«• Вярнуўшыся з падарожа да Лёндана С.Жытлоўскі часова знаходзіцца у Нямеччыне, дзе ён заняты устаноўленьнем зьвязі паміж жыдоўскімі арганізацыямі Беларусі і за межамі. Адрэс: Бэрлін, Мотцштрасэ, 21.

• У пачатку будучага году у Дзьвінску мае адбыцца культурна-прасьветны зьезд [...]».

3346. Ліст Міколы Вяршыніна (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.12.1922

Прага 16 XII 1922 г.

Многапаважаны пане Старшыня!

9 і 13 гэтаго месяца я паслау два пісьма і кніжку Пятру Антонавічу[1] у якіх прасіу каб ен паінфармаваў Вас або усім што робіцца у нас.

Цяперака з тэлеграммы я даведауся, што П.А у Дзьвінску разам з А.І.[2]. Калі П.А не хутка вернецца адтуль дык будце ласкавы п. Старшы-

ня распечатайце гэтыя лісты і прачытайце, каб мець аба усім справы, тым больш што к Вам у Коуну паехау Мамонка. У нас цяперака нічога новаго. Польскія газэты «Słowo» ужо больш не прыходзяць. «Нашу Будучыну» і іншыя цікавыя газэты буду прысылаць Вам. Працую цяперака над меморандумам аб 40 студэнтах для вучыцельскаго інстытуту, але сам не пэуны ці выдзе што з гэтаго, тым больш што трудна будзе раптам набраць вучэнікоу і добра кваліфікованых прафэсароу, каліб нават чэскі урад і сгадзіўся на гэта. Вядома што для Гродзенскіх і Наваградскіх шлях ляжыць праз Коуну. Дапусьцім што візы яны дастануць. Але ж ці у сілах Вы будзеце атпрауляць іх сюды? (Я дагаварыуся каб нашых студэнтау у ліку 7 чалавек дадатачна было прынята у Украінскую гаспадарскую акадэмію у Подэбрадах і паслау пісьмо у Вільню каб іх не пасылалі праз Коуну, калі не будуць мець сваіх грошай на усю дарогу.)

Мне хацелася-бы ведаць Ваше здане па гэтаму поваду. Я сусім не веру тым, што кажуць «Урад грошы мае», бо каб ен меу, то пэуна што дау бы ім на праезд. А калі не будзе мець, то тагды што?

У нас ужо зарганізавалася тов. журналістау «народау Востока Европы» і выдае інформаціонные бюлетні два разы на тыдзень. Нам патрэбны найнавейшыя справы з мейсц. Дык вось зрабіце калі ласка загад каб справы гэтыя дастауляліся мне як найхутчэй (калі толькі справы верныя). Аб гэтым раблю зносіны з Варшавай і Вільняй таксама.-

14 г.м. быу маленькі канцэрцік нашых студэнтау разам с квартэтам (музыкальным) чэскіх студэнтау у памяшчэні «Руско-Чэскай Едноты» На першы пачатак ен вышау нічога сабе. З украінцау было нескалькі «камітэтчыкау» але правые украінцы недавольны гэтым. Яны кажуць: «Вы ідзеце разам з чорнасоценнымі маскалямі і чэхамі» і г.д. Канцэрт гэты рабіуся бяз маяго ведама і я за яго не адпавядаю, але калі я быу пастаулен перад гатовым фактам, то павінен быу быць там як прэдстаунік і негледзячы на некатарые недастаткі (малую рэпетыцыю у пеніі, неуменя дзержацца і г.д.) скажу, што ен вышау не сусім дрэнна.-

Калі ласка абсудзіце справу на шчот арганізаціі новай парціі, аб якой я пісау П.А. і паведамце міне.-

Віншую Вас, Вашу пані і усіх знаемых з наступаючымі святамі Каляд і Новаго году.

Будце здаровы М.Вершынін

Хацеласяб як найхутчэй атрымаць адказ аба усім.

582.1.43:161&r-162&r

[1] Крэчэўскаму. [2] Цьвікевічам.

3347. Квіток аб уплаце за багаж 600,- за 16.12.1922

582.1.43:069

3348. Рахунак за 23.12.1922 аб уплаце фірме «Gerschonowitsch & Spiess» 7.930,- нам. марак за перасылку памнажальнага апарата

582.1.43:068

3349. Паштоўка Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.12.1922

Вельміпаважаны п. Ластоўскі!

Віншую з Калядамі й Новым Годам і жадаю ўсяга найлепшага.

Ваш Янка Станкевіч

26/XII. 22.

582.1.43:016

3350. Ліст Рамуальда Зямкевіча (Варшава) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.12.1922

Яго Міласьці Пану Власту.

Вельміпаважаемы Дзядзька!

Толькі цяпер адказываю на Ваш ліст. Вельмі усьцешыўся, што наканец узяліся у Вас да працы і пачалі выдаваць такі надта паважны месячнік «Беларускі Сьцяг».

Нарешці беларуская эміграцыя увайшла пад правільны сьцяг і на добры шлях!

Віншую Вас з гэтым і жадаю спору ў працы!

Аб маей працы для Вас і гутаркі быць ня можэ: падтрымаю усімі маімі сіламі. Стацьці буду перасылаць або з Варшавы або з Гданска, скуль буду высылаць скаромнае. Сяджу цяпер і гатоўлю для Вас спэцыяльна літэратурна-гістарычна-крытычна-інфармацыйны матэр'ял аб уселякіх справах. Стаю я цяпер з боку, але пільна узіраюся навакол мяне. З гадам Антонам[1] я у надта халодных стасунках. З Дубейкоўскім на нажах, бо ён на службе у дэфэнзывы, што мне удалося раскрыць і даказаць.

Працую над гісторыяй паходу арміі Генэрала Булак-Балаховіча. Як ні як ён адваеваўшы кавалак Беларусі апавесьціў і зрабіў першы рэальную «незалежнасьць». Калі б не інтрыгі Савінкова, Алексюка і жыдоў, справа выглядала бы іначэй. Архіў «генэрала» у маім распараджэньні. Нататкі нябошчыка Ядвігіна Ш., каторы ішоў з арміяй, я перапісаў у сына, што жыве цяпер у Варшаві. Апрача гэтага запісаў я са слоў Дзергача (=Адамовіча) шмат фактаў, каторыя праверяю у гутарках з ваякамі Балаховіча і сьв. пам. Семенюка. Зрабіць гэта разумеецца трэба і то якнайхутчэй, бо падзеі у памяці заціраюцца, а не напісанае і не друкаванае не дасьць ніколі будучым пакаленьням зразуменьня праўды. Гісторыя партызанткі Семенюка, а так сама «Зялёнага Дуба» цікавіць і займае маю увагу, але кожнае па асобку.

Разумеецца, што усё гэта у адрыўках будзе Вам послано для друку у «Бел. Сьцягу».

Пагляд мой на стацьцю: «Пагляд П.Безсонова на беларускую справу»[2] не надта добры. Абсолютна не згаджаюся з думкамі аўтара стацьці! Скажу што тутака матэр'ял апанаваў аўтара а не ён яго!

Справа у тым, што Безсоноў проста па-нашаму злодзей, а па літэратурнаму плягіятар. «Сборникъ бѣлорусскихъ пѣсенъ. Москва 1871» не яго уласнасьць, бо Безсоноў ніколі не зьбіраў этнографічнага матэр'яла на Беларусі, дзе коратка быў, а выдаў гатовы матэр'ял беларускага этно-

графа Адама Чарноцкаго (Zoryan Dołęga-Chodakowski), этнографа першаго у цэлай Славяншчыне!

Шмат на гэтую тэму я гаварыў у 1917 гаду у Петраградзе з Эпімахам-Шыпіллай і з акадэмікам Карскім. Карскі у сваіх «Беларусах» пішэ аб гэтым. Справа гэта ужо аканчацельна разьвязана. Аўтар стацьці называе Безсонова «адным з першых расійскіх этнографаў». Гэта так сама непраўда. Аўтар стацьці ня ведае што П.Борычэўскі беларус і пісаў па беларуску (рукапісы у мяне), што і П.Баброўскі і М.Кояловіч так сама беларусы, хоць як царскіе «чыноўнікі» і атщепенцы.

У расейскай навуцы Безсоноў даўно ужо вядомы як плягіятар. Не адзін Венгероў, а усе паважныя крытычныя расейскія сілы робяць вялікія закіды у гэтым кірунку, як Якушкін, Ягичъ, А.А.Котляревскій, А.И.Кирпичниковъ, А.Н.Пыпинъ, Ѳ.И.Буслаевъ, Н.Ѳ.Сумцовъ. — П.И.Якушкін гэтак піша аб Безсонове: «Родственники ли, друзья ли Киреевскаго, никто не имѣлъ права его трудами позволить дѣлать имя кому-нибудь: это грѣхъ не только передъ памятью его, но это уголовное преступленіе передъ обществомъ. Какъ могло Общество любителей русской словесности или кто другой позволить приписать труды покойника живому человѣку, на томъ основаніи, что покойникъ умеръ и ему не надобны блага мірскія, а живому человѣку, хоть бы этотъ человѣкъ былъ и Безсоновъ, отдать труды покойника для прославленія своего имени? Позволить на первыхъ же строкахъ трудовъ покойника обругать всю дѣятельность его!» (стран. 471)

А зрабіў жэ так Безсонов з працамі Рыбнікова, Кірэеўскаго і гэта вучоныя падкрэсьлілі і Безсонова справядліва асудзілі. Ня ведалі толькі аб Хадакоўскім!

Песьні зборніка «Безсонова» усе адносяцца да Гомельскаго павету, дзе у Патёмкіна Чарноцкі (Долэнга-Ходакоўскі) іх зьбіраў. У перадмове да «Пѣсней» Безсоноў ясна піша, што меў пад рукамі рукапіс, пісаны лацінкай, польскімі літэрамі. Аўтар гэтае стацьці шмат знайшоў бы аб Безсонове у Берліне у бібліятэцы унівэрсытэта, бо вучоны польскі Aleksander Brückner, прафэсар Берлінскаго Унівэрсытэта добра стараўся каб у бібліятэцы усё было. Рабіў гэта раней яго папярэднік праф. Ягіч.

Так сама не магу згадзіцца з п. Іванам Трызнай[3], каб К.Каліноўскі мог знаходзіцца пад уплывам Маркса, Бакуніна, Огарева ці Герцэна. Нічога падобнаго! Ён быў пад уплывам дэмакратычнай левай эмігранцкай польскай літэратуры, пад уплывам ідэй Ворцэлля, Лелевэля, Конарскаго, Камінскаго..... Пану Івану Трызьне невядома гэта літэратура, хацябы з працы Ліманоўскаго: Historya demokracji polskiej (2 выданьне). А без спэцыяльных студый немагчыма пісаць беларускай літэратуры, бо гэта будзе такой «крадзенай» чужою, а пададзенай як за сваю, як «літэратура» Гарэцкаго[4], поўная абмылак, недахватаў і непраўды.

Партрэты Бэзсонова, Каліноўскаго і другіх маю. Студыяваў я іх пільна: першаго як «этнографа», бо гісторыя беларускае этнаграфіі — гэта гісторыя пачатку нашага рэнэсанса. Аб Каліноўскім перапісаў матэр'ялы у Кракаве і Раппэрсвілю (польскі музей у Швайцарыі). На апрацоўку трэба часу і спакою (пэўнасьці кавалка хлеба), тады работа пойдзе маланкою.

Калі маеце для мяне што цікаваго ды скаромнаго, прысылайце па адрэсу: Danzig. Poste restante. Herrn ingenieur Romuald Ziemkiewicz.

Буду там за два тыдні, дык забяру.

Прашу камплекты Вашых беларускіх газэт і брашуры. Адплачу тым жа.

Паклон Душэўскаму. Пішыце, што з кніжак, брашур і газэт Вам патрэбна, дык вышукаю і вышлю, каб дапоўніць Вашу эмігранцкую бібліятэку. Будзеце у можнасьці працаваць. Польскія працы аб беларускім пытаньню так сама, як раней Варонцы магу пасылаць. Бывайце здаровы!

Моцна цісну Вашу руку.

Варшава, 27.XII.1922 Рамуальд Земкевіч

582.1.43:154&r

---

[1] Луцкевічам. [2] Праца А.Цьвікевіча, надрукаваная ў №№2-3 і 4 за 1922 год часапіса «Беларускі Сьцяг». [3] Гаворка йдзе пра гістарычны нарыс Івана Трызны (Івана Цьвікевіча) «Канстантын Каліноўскі», надрукаваны ў №4 за 1922 часапіса «Беларускі Сьцяг». [4] «Гісторыя беларускай літэратуры» М.Гарэцкага выйшла ў Вільні ў лістападзе 1920 году.

3351. Ліст Аляксандра Ружанцова, маёра пяхоты й сакратара рэдакцыі часапіса «Mūsų Žinynas» Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.12.1922

582.1.43:174

3352. Зьмест часапісу «Mūsų Žinynas» за лістапад-сьнежань 1922

582.1.43:173 — мк

3353. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.12.1922

Вельмішаважаны Пане Ластоўскі!

Ваш ліст з 4.XII дастаў і вельмі дзякую.

Пахвалюся аднэй навіною. Не пазьней як за два тыдні ў нас выйдзе журнал «Беларускі Студэнт»[1] і будзе выходзіць акуратна што месяца. З прычыны нястачы грошай прымушаны мы друкаваць яго на шапірографе. Журнал мае мець гэткія аддзелы: стацьці балей-меней публіцыстычныя, навуковыя, бэлетрыстыка, шырокая хроніка з студэнскага жыцьця, бібліографія. Мае быць ілюстраваны нашымі студэнскімі мастакамі, якіх ёсьць тут 3-х. Апрача таго маем двух студэнтау-шапіраграфшчыкаў, якія будуць друкаваць на шапірографе, а перад тым два іншыя напішуць на пішучай машынцы. Нашая мэта: 1) уцягнуць да літэратурнае працы нашае студэнства ў Празе, 2) пры помачы журналу усьвядамляць беларускіх студэнтаў усюды, дзе яны та[к] ці інакш ёсьць (Баўгарыя, Фрыбург, Жэнэва, Парыж і г. д.). Віл. Бел. Студэнскаму Саюзу дазволім усё перадруковаваць і гэткім парадкам яны будуць мець балей матар'ялу. 3) Па чэскаму звычаю дзелім усіх на студэнтаў вышэйшых школ і студэнтаў сярэдніх школ, а дзеля гэтага будзем пасылаць яго ў бібліятэкі ўсіх беларускіх гімназій.

Вы ўжо, мусіць, чулі аб Усяславянскім Студэнскім Конгрэсе[2]. Прыехалі на яго дэлегацыі 8-х слав. народаў (у гэтай лічбе палякоў і лужыцкіх сербаў). Я быў старшынёю беларускае дэлегацыі, у якой апрача мяне былі Сак Язэп, Астапкевіч, Шышкоўскі, Ермачэнка й Грыб. Конгрэс не адбыўся, бо не пагадзіліся дэлегацыі сербская з баўгарскаю, але запраўды не дапусьцілі да конгрэсу дэлегацыі маскоўская й польская. Маскалі хацелі памсьціцца на баўгарах за Урангеля, а палякі хацелі паказаць, што зьезд ня ўдаўся, бо чэхі склікалі. Маскоўская й польская дэлегацыя й накручавалі сербаў. Мы шмат зрабілі тым, што кожны дзень у працягу тыдня выступаючы на розных публічных прыймох-вечарох ад Клёфача й Крамаржа[3] й да Бэнэша раўнапраўна з іншымі славянскімі народамі, гэтым дэмонстравалі сваю справу.

Варочаючыся яшчэ да журналу. Хоць журнал студэнскі, але з падзякаю будзем друкаваць стацьці й іншае й ня студэнтаў. Дык калі маеце каго на ўвеце (увазе) парадзьце, каб пісалі. Асобна зьвярнецеся, калі ласка, ад майга імя да п. майора Ружанцова. Ён мае літэратурную жылку. Так сама да Язэпа Варонкі. Няхай спомніць студэнскія часы. Ведама, наўперад жадалі-б мець што небудзь ад Вас, калі дарагі час Вам гэта дазволіць. Яшчэ спомніце калі ласка Душэўскаму. Перадайце калі ласка прывет Ружанцову, Карабачу, Душэўскаму й Варонцы.

Усё-ж такі шкада, што журнал будзе друкавацца на шапірографе, а не на літографе. На шапірографе можам выпусьціць толькі 40-50 экз. кожнага месяца. Каб да тае сумы, якую забавязалася складаць што месяца група нашых студэнтаў, яшчэ дадаць 150 ч<эскіх> кар<он>, дык можна было-б друкаваць у літографіі 100 экз. кожнага месяца, а гэта ўжо быўбы знак у нашай нацыянальнай рабоце на эміграцыі і навет у Бацькаўшчыне (гімназій 5). Яшчэ 50 кр. панатужыўшыся мы тут сабралі-б. Але адкуль узяць 100 кр.? Ведаючы, што ў Вас цяпер няма грошай, я да Вас не зварочаваюся з просьбаю, але мо' магло-б памагчы гэтай справе Беларускае Міністэрства Літвы? Гэта тым болей можна было-б зрабіць, што добрая частка нашых студэнтаў якраз з тых зямель, што паводле літоўска-маскоўскага міру 1920 павінны былі адысьці да Літвы. Калі ласка пашчупайце гэтую справу. У прыпадку магчымасьці падмогі «Беларускаму Студэнту» грошы прысылаць можна або на Вяршыніна для рэдакцыі «Беларускага Студэнта» або на адрэс нашага скарбніка Язэпа Сака (Praha, Žižkov, Poděbradová třida č. 9/II).

З шчырым паважаньнем

Я. Станкевіч.

29/XII. 22.

P.S. Скора ўжо будзем мець тут сэкцыю беларускае студэнскае імкі[4], толькі трэба легалізаваць

582.1.43:017&r-018&r-18a

[1] Першы нумар часапіса датаваны студнем 1923 году. [2] Меўся адбыцца ў Празе 16-22.1922. [3] Лідэр нацыянальна-сацыяльнай партыі Вацлаў Клофач і лідэр маладачэхаў Карэл Крамарж — прыхільнікі панславізму й палітычныя апанэнты «заходнікаў» Т.Масарыка й Э.Бэнэша. [4] YMCA.

3354. Смык Беларускі Сымона Рэўкі з-пад Барысава (Ф.Багушэвіча). Перадрук з IV выданьня. 1922. Друкарня А.Бака. Коўна. Ожэшко, 5/14

582.1.40:178-162 — д

3355. Карта: Lituanie sous le règne du grand duc Vytautas 1392-1430. Echelle 1:7,500.000. Kummerly u. Frey, Berne. Edité par A.Viscont.

582.1.40:161 — д

Дата невядомая.

3356. The Vilna Problem. With Five Maps. Lithuanian Information Bureau. 10, Palace gate, Kensington. London, W.S. 1922

582.1.40:160-141 — д

3357. Ліст Антона Матача (псэўд. Базыль Базылеўскі) (Жасляй) рэдактару «Беларускага Сьцяга» (Коўна) за 31.12.1922 з просьбай надрукаваць верш «Жыцьцё селяніна»

582.1.47:108

3358. Запрашэньне Прэм'ер-Міністра й міністра замежных справаў Літвы Вацлаву Ластоўскаму з жонкай на сустрэчу Новага 1923 Году ў памешканьні Літоўскага Клюбу

582.1.43:181

Дакладная дата невядомая.

3359. Бібліяграфічныя нататкі: выбраная літаратура па гісторыі

582.1.47:111-114

Дата невядомая.

3360. Візытоўкі ў канвэрце

а) Візытоўка Анатоля Рэшкі:

Colonel Anatol Rechko
Attaché de la Mission Diplomatique
Blanche-Ruthénienne en Lithuanie. Kovno

б) Візытоўка Алены й Анатоля Рэшкаў:

Елена Михайловна и + т.с.

582.1.43:184

3361. Розныя нататкі й выпісы Вацлава Ластоўскага на гістарычныя тэмы

582.1.47:026-033

Дата невядомая.

1923

3362. Пераклад Ноты намесьніка наркома замежных справаў Расеі Максіма Літвінава міністру замежных справаў Вялікабрытаніі Керзану, міністру замежных справаў Францыі Пуанкарэ й прэм'ер-міністру й міністру замежных справаў Італіі Мусаліні за 22.12.1922 з патрабаваньнем дапусьціць расейскую й беларускую дэлегацыі да абмеркаваньня й вырашэньня пытаньня аб лёсе Мэмэля

582.1.43:129-130

Дата невядомая.

3363. Карткі з матэрыяламі да гістарычнага слоўніка (В.Ластоўскі)

Гараднічы
Календар
Пяруны
Ірэй
Ядыкул
Цівун
Шеляг
Шэстак
Падпечнік
Траяк
Тынфа
Кадук

582.1.48:276-284

Дата невядомая.

3364. Малюнак алоўкам «Пагоні» на кардоннай папцы (В.Ластоўскі)

582.1.43:039

Дата невядомая.

3365. Ліст Віталя Бендэроўскага (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 31.12.1922 з навагоднімі віншаваньнямі

582.1.48:296 — ра
582.1.48:275 — канвэрт

3366. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.01.1923

582.1.43:015&r

Аб беларускім настаўніцкім зьезьдзе ў Латгаліі, аб канфлікце на ім Езавітава—Дзямідава з Краскоўскім—Пігулеўскім.

3367. Ліст Бруна Міллера (Бэрлін) Аляксандру Вальковічу (Коўна) за ≈1.01.1923

[...] Посылаю пропуск для пана Ластоувскаго. [...] Выѣхать въ Кенигсбергъ я могу въ любой день. Прошу лишь указать время и мѣсто встрѣчи с п. Ластоувскимъ в Кенигсбергѣ [...]

582.1.43:146&r

Дакладная дата невядомая.

3368. Інфармацыйны Бюлетэнь Цэнтральнага Беларускага Прэс-Бюро (Не для прэсы). №2. 2.01.1923. Коўна

582.1.43:124-125

3369. Ліст Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.01.1923

Многапаважаны п. Вацлаве. Кінем дашуквацца — хто прычынаю спыну нашае перапіскі. Добра й то, што калі-некалі і перакінемся пісьмамі. Апошнія два тыдні — усе Коляды і Новы Год — ляжу ў пасьцелі. Апанавалі мяне фурункулы з прычыны пераутомы арганізму і недакровіцы. Страшныя болі і апатыя да ўсяго на сьвеце. Калі выдаюцца гадзіны палёгкі — як от зараз — то чытаю ці думаю. Пару дзён таму прышла пошта ад Зенкевіча[1]: 2 пісьма і розныя адозвы выбарчага моманту[2]. Пісьма цікавыя (гл. ч. па абяцанкам прыслаць матар'ялы аб Балаховічу і Каліноўскім), але адозвы яшчэ цікавейшыя. Б'е ў вочы тое, як высока пачалі «цаніць» і «лічыцца» з нашым селянінам там «на Крэсах». Пачулі гады, якая тут страшная сіла крыецца. Праўда сіла гэта пакуль толькі у лічэбнасьці, але паднімаючаяся сьвядомасьць падымае гэту сілу ў 20 ступень!!.. Расейская чорная сотня пад асабістаю апекаю і ініцыатываю (як гэта падобна на парадокс!!) Naczelnika Panstwa Язэпа Пілсудскага ў часе выбараў разьвіла агітацыю «на Крэсы» дзеля падтрыманьня польскіх сьпіскаў беларускімі галасамі. Ясна, што ўся надзея была на абсалютную цемнату вёскі. Вынікі паказалі адваротнае.

Цікава, што Ладнов з Балаховічам ходзяць і езьдзяць па Беларусі і не знайшлося там людзей каб размажжыць ім чэрапы!

Калі нічога ня будзе зроблена у гэтым сэнсі на будучыну, то партыю бел. эс-эраў трэба біць дубінаю па галаве да таго часу, пакуль зразумее. Язэпа[3] — трудна, а гэтых чарнасоценцаў-велікаросаў і беларусаў, гэту сволач мы павінны былі даўным-даўно схаваць са свету. Ці ж ня стыд, ці ж ня ганьба, што А.[4] не ўсадзіў Ладнову кулю ў яго подлы чэрап? Гэта трэба было зрабіць яшчэ год назад!.. Чаму ваш урад хвост падабраў і губу склеіў, калі Ладнов аказаўся правакатарам? Трэба было чэсна на увесь сьвет крычаць, што расеец-чарнасоценец, белагвардеец падшыўся пад бел. справу і справацыраваў яе, што служыў у франц. ахранке і усё, усё трэба было вылажыць! Трэба было з гэтага зрабіць монстр-skandal, а урад сядзеў за печкаю і са злосьці грыз сам сябе [?...]... Цяпер Ладнов тытулуецца «председателем белорусск. делег. на Парижск. конференцию», трэцца на нашай Бацькаўшчыне, баламуціць, а галоўнае памагае

палякам душыць нашу справу. Ён — «председатель белорусской секции Государств. об'единения на Кресах», ён склікае з'езды, ён піша адозвы, ён зарабляе грошы на беларуск. справе. А мы ціхенька сядзім, мы маўчым, мы нібы-то ня ведаем хто такі Ладнов. Сваім маўчаньнем вы пакрываеце яго чорную пагромную працу[5] — адна мэта каторай задушыць беларускі рух, прадаць яго палякам...

А «бацька» Балаховіч — правая рука Ладнова? ці ня сорам што гэты бандыт і злодзей яшчэ жыве? Хто прычынаю — ваша парт. эс-эраў!!! Будзьце пэўны, калі б сталася, што магчыма было усім вам паехаць на бацькаўшчыну — Балаховіч з 20-30 сваімі граміламі усіх вас перадушыў бы у цёмных кутках!..

Што ён робіць цяпер? Зенкевіч[1] (што гэта за птах? ці ня адной кампаніі гэтых бандытаў і шпікоў польскіх?) піша, што ён працуе «як інжынер» разам з Балаховічам і «салдатамі яго быўшае арміі». Як вы думаеце — чаго па[сл]алі пагромшчыка Балаховіча з яго бандай у Белавежск. Пущу?

Ясна — гэта асабістая ахрана і наагул «ахранка» каля тых, хто выцінае беларускія лясы. Гэта банда бароніць палякаў ад нашых партызан, гэта банда сьцяной стаіць на абароне польск. капіталістаў, яны нагаямі падганяюць нашых бедных сялян, што ідуць рубіць лес каб не памерці з голаду!

Каб спыніць гэта ёсьць адзін шлях — схаваць ініцыятараў назаўсёды.

Пачытайце адозву Балаховіча — яна ўся моліць і заклінаець эс-эраў, каб гэта было апошні раз.

Што да Зенкевіча, то з яго пісем чуецца штось склізкае, падобна да Дубейкоўскага. Два бота — пара. Але трэба яго высмактаць да канца, матар'ялы вы можа й не надрукуеце, але яны прыдадуцца для чаго іншага. Партрэт Каліноўскага я ад яго хоць хітрасьцю хоць ахвяраю двух-трох кніжак, але выдзеру і надрукую на пачтоўках.

Зьвязь з ім парываць ня трэба, бо праз яго магчыма дастаць патрэбныя дакумэнты і матар'ялы (напр. аб Дубейкоўскім, аб Ладнове, аб Зял. Дубе), атрымаць інфармацыю аб таемных махінацыях варожых вам груп і т.п. Як відаць — ён пралаза добры!

Барані Божа толькі авансавацца перад ім! Ніякіх абяцанак, ніякіх асобых праў на выступленьня перад грамадзянствам.

Яшчэ пару слоў хачу сказаць аб адносінах Коўны да Вільні. Я так да сяго дня ня ведаю — згадзіліся вы з выбарамі ці не, рады вы што ў Варшаўскі сойм пайшлі дэпутаты беларусы ці не? «Нявыразны твар» — ваш ковенскі лёзунг, будзь ён праклятый ва векі вякоў! Вы ў нац. русла хочаце зьліць дзесяткі крыніц — тут і незалежнікі, тут і фэдэрацыя, і самаўрад, і аўтаномія — верачы што зробіце моцную амальгаму. Мыліцеся — алей з вадой не зьмяшаць вам.

А<ляксандар>[6] піша, што ён хоча спаткацца з Тарашкевічам, з Луцкевічам... Пашто? Гутаркі, гутаркі! Значыцца вы заадно з аўтаномцамі, са сьпіскам №16[7] і яго праграмай, калі вы лічыце магчымым і пажаданым (!?) з імі страчацца! Ці вы можаце сядзець за адным сталом з тымі, хто б'е гвазды у гроб, каб на 100 гадоў пахаваць нашу незалежнасьць?

Ці ж магчыма спадзявацца, што беларускія паслы зробяць так як украінскія — сказаць у Сойме, што яны прыехалі у сойм каб барацца за Незалежн. Укр. дзяржаву?

Палякі праваляць усё, бо проці нас будзе блёк ад паноў да с-дэкаў! На што ж спадзявацца? На дзіва, на усенароднае паўстаньне — слабая уцеха.

Маску трэба зьняць і сказаць: мы — незалежнікі, мы проці выбараў на акупаванай тэрыторыі ды яшчэ у Варшаўск. польскі сойм (хоць бы так як [у] Менску — свой беларускі з'езд), мы не падтрымаем дэпутатаў, а будзем барацца з імі да канца усімі сіламі, мы лічым учасьце у польск. сойме на польск. тэрыторыі — ганьбай для беларуск. пасла і здрадай беларуск. нац. барацьбе.

Вы — незалежнікі мусіце сказаць урэшці раз назаўсёды: «Хто не з намі за цэльную незалежную Беларусь — той проці нас, той наш вораг, з тым мы борамся». А то я вас не разумею — як пытаньне пасур'ёзней, пытаньне прынцыповае, ад якога залежыць усё, вы робіце невыразны твар і чакаеце. (падобна як з літвінамі — поў года ня можаце атрымаць просты і чэсны адказ). Гонару болей, самапавагі да сваёй праграмы (калі ёсць толькі?). Жыцьцё адапхне вас з дарогі, адсуне узад!

У вас ва усіх там няма аканчальнай рэвалюцыйнасці, вы увесь час ідзеце паўкрокамі («шаг вперед, шаг назад! Два шага направо, два шага налево»!), вы ўсе адзін аднаго стрымліваеце, заместа таго каб падбіваць на сьмелы крок. Гісторыя, а рэвалюцыя асабліва, толькі тых адмячае хто ніколі не ставіўся сьпіною да ворагаў. І за такімі пойдуць масы народныя.

Кіньце цацкацца з польскім соймам (хаця ж свой сойм — гэта ваша праграма, вашае сьвятое сьвятых!!) кідайце «паслоў»... яшчэ ляпей — змагайцеся з імі.

Адзіны стары-стары кліч: «Вон палякоў-паноў і польскія войскі з Беларусі» падыме сялян, бо ён ім зразумелы, блізкі, выкукоблены у муках і сьлязах і крыві!

Цяжка лежачы пісаць ды й галава якаясь дурная ад двухтыднёвага ляжаньня. Але мушу з вами падзяліцца некаторымі думкамі.

А<ляксандар> злуецца, што нельга атрымаць газэту з Менску. Гэта ж сорам! Перавядзіце ў рэдакцыю газэты праз банк адпаведную суму грошы — за патрэбны вам тэрмін і будзеце мець кожнаю поштаю сьвежую «Сав. Беларусь». Праўда, дарагавата, але верна. Урад можа «позволіць сабе» гэта. З Вільні так сама: выпісалі б праз мяне на Берлін, а я вам дасылаў бы. П[а]радку ў вас няма, выбачайце за шчырасьць!

Міністр загран. спраў ня ведае, што творыцца на бацькаўшчыне. Як жа можна вясьці палітычную працу? Здохнуць можна з вамі ад сьмеху, даль-бог!

У інформац. бюл. №1 піша што у Менску — Кнорын і Адамовіч тое і тое. Па праўдзе ж Кнорына ужо даўно (з лета) няма там[8], а Адамовіч[9] вучыцца у Маскве ў Акадэміі ген. Штаба. Што варты будуць вашыя інформацыі, калі яны будуць выдумляцца А<ляксандрам> за добрым куфлем піва?!

Асабліва, калі інфармац. прызначаецца дзеля свайго ужытку, не для прэсы, куды часамі трэба бывае пусьціць качку.

Пасьля... аб стварэньні «Партыі беларускіх незалежнікаў». Але аб гэтым можна напісаць дзесяць такіх пісьмаў і ня кончыць. Партыя мусіць быць ультра-дэмакратычная, накшталт камуністычнай, з ярка выяўленым селянскім характарам, з дэтальна апрацованай праграмай і г.д. Першым крокам яе — партыйны маніфэст, у якім даць схему парт. праграмы і паказаць тактыку, сказаць народу як трэба ісьці да Незалежнасьці.

А<ляксандар> кажа — трэба шмат часу каб распрацаваць асобн. пункты праграмы, напр. аграрнае пытаньне. Усе гэта ужо распрацавана добра і ляпей ня выдумаць.

Тут справа ў тым, каб іскру высячы, бо «ваш» невыразны твар як мыдла абрыд усім і «вам» у першую чаргу.

Пісьмо з Вільні калі адчыняў, адарваў разам з надворнаю кувэртаю таксама уложаную і не зауважыўшы выцягнуў пісьмо і адкрытку. Выбачайце.

Пасылаю усё разам.

Будзе ахвота і час пішыце

Усяго лепшага

Жонцы вашай нізенькі паклон

2/I 23. І.Цв.

582.1.43:131&r-136&r

---

[1] Зямкевіч. [2] Маюцца на ўвазе выбары ў польскі Сойм і Сэнат 5 і 11.11.1922. [3] Пілсудзкага. [4] Магчыма маецца на ўвазе Аляксандар Цьвікевіч. [5] Інфармацыйную запіску пра дзейнасьць Ладнова Ўрад БНР выдаў 10.05.1923. [6] Цьвікевіч. [7] Адзіны выбарчы сьпіс нацыянальных меншасьцяў, у якім кандыдавалі прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў і партыяў. [8] Кнорын ад лета 1922 году — у апараце Маскоўскага гарадзкога камітэту ВКП(б). [9] Язэп Адамовіч.

3370. Запрашэньне Вацлаву Ластоўскаму на Баль Артыстаў Дзяржаўнага Драматычнага Тэатру, які мае адбыцца 5.01.1923 у залі Літоўскага Клюбу

582.1.43:014

3371. Ліст Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.01.1923

6.I.1923.
Дзьвінск.

Даражэнькі Вацлаў Юстынавіч,

добра разумею я і становішча Ваша і настроі Вашы і ад усяе душы спачуваю!

У палітычна-грамадскай працы здараюцца штодзенна прыклады гэткага змаганьня, а часам і у шмат горшых формах: — яшчэ сёнека гудзіць па Польшчы рэха ад выстрэлу Невядомскага і чарнее крэп на траурных павязках ў памяць Першага Прэзыдэнта, Гр. Нарутовіча[1].

Дык — не сумуйце.

Час — найлепшае лекарства.

Пішыце успаміны, зьбірайце дакумэнты.

Правых і вінных разбярэ гісторыя, а мо' дажывем яшчэ і да таго, што разбярэ грамадзянства пры канцы жыцьця нашага.

Кр<аскоўскі> вядзе гэткую-ж палітыку, што і Л<уцкевіч>: «солнцэ павінна сьвеціць толькі там, дзе яны, і толькі ад іх павінен ісьці сьвет; рэшта — павінна быць у цені, а калі яна і у цяні сьвеціць, дык закідаць яе брудам».

Ен пачаў тутака з падкопаў пад Сахарава[2], бо ня меў веры у тое, што Гімназыя адчыніцца, і хацеў быць у Рызе. Я змагаўся. Ен зьліўся. Дайшло да асабістых з яго боку мне абраз. Але я вяду працу у старым маштабе: на Люцын і Дзьвінск.

Пасылаю Вам копію ліста майго да яго.

У Прэсу пакуль што не давайце, бо суд яшчэ не адбыўся. А потым я дам знаць.

Напішыце мне што Вы усё, з поваду гэтага ліста, думаеце і як пагляд Вас на Гр. Краскоўскага. Напішыце і аб тым, якую ролю ён іграў у працы Ураду БНР.

Тутака выбрыкі яго спачатку мелі усьпех, дзякуючы таму, што у яго чорная барада і што я сам яго дужа рэкламаваў. Цяперыка-ж ён страціў шмат павагі і разсварыўся з рожнымі дзеячамі і грамадскімі коламі.

Шчыра вітаю Вас усіх з Новым Годам і крэпка жадаю, каб Ураду БНР удалося у гэтым годзе умацаваць свой аўтарытэт і уплывы, як на бацькаўшчыне, гэтак і па-за межамі яе. Думаю, што, калі Віленшчына і Горадзеншчына убачаць як мала могуць дабіцца нашые паслы у Сойму і як цяжка ім тамака працаваць, — думка аб Незалежнай Беларусі з новай сілай захопіць шырокія народныя массы, інтэллігэнцыю, ды і саміх паслоў і ўсе яны аднадумна і адналітна перайдуць да арганізаванага змаганьня за Незалежнасьць. А таму гэты новы перыад руху, перыад парламентарны, будзе новым крокам да Незалежнасьці.

К.Езавітаў

582.1.43:182&r

---

[1] Прэзыдэнта Габрыэля Нарутовіча 16.12.1922 застрэліў эндэк-тэрарыст Элігіюш Невядомскі. [2] Загадчык Беларускага Аддзелу Міністэрства Асьветы Латвіі.

3372. Дасланая Вацлаву Ластоўскаму копія ліста Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Івану Краскоўскаму (Дзьвінск) за 1.01.1923

Копія.

Грамадзяніну Яну Ігнатавічу КРАСКОУСКАМУ.

Паважаны Грамадзянін,

блізка году таму назад, задыхаючыся тутака у Латвіі пад непамерным ціжарам нацыянальна-культурнай працы, пры поунай адсутнасьці нацыянальна-усьвядомленых элементаў, якім можна-б было даручаць самастойнае спауненьне тых, ці іншых, нацыянальна-культурных заданьняў, — Беларускае Культурна-Прасьветнае Таварыства «Бацькаушчына» з Вашай згоды і жаданьня, а па маей рэкамэндацыі, просьбе і націску, запрасіла Вас і прэдставіла Латвійскаму Ураду для працы у Дзьвінскай Беларускай урадовай Гімназыі.

Ніхто у Латвіі Вас не ведау і аб Вас не чуу.

Не быу знаемы і я асабіста з Вамі.

Але адно імя беларуса і беларускага дзеяча адчыніла Вам мае сэрдца і сэрдца тых, што працавалі са мной разам.

Братнім пацалуем спаткау я Вас і, з усею шчырасьцьцю, на яку[ю] толькі здольна беларуская душа, зрабіу усе, каб адалець усе прэпоны і, для карысьці справы, правесьці Вас на пасаду Дырэктара Гімназыі.

Ні на водную хвілінку не пауставала у мяне ніводнай цемнай адносна Вас думкі і з вялікай увагай адносіуся я да кожнае Вашае прапазыцыі і добрае думкі.

Але худка, і як раз з Вашага боку, былі вызваны першыя спрэчкі.

Вы прыехалі у Латвію з прэдузятым паглядам як наконта мяне самаго, гэтак і наконта іншых мейсцовых беларускіх працаунікоу.

Пачалося з таго, што Вы запрапанавалі мне скінуць з пасады Кірауніка Беларускага Аддзелу, Грамадзяніна С.П.Сахарава, і замяніць яго у Рызе маей асобай, а Гр. С.Сахарава зусім адкінуць ад беларускіх спрау у Латвіі, пакінуушы яго Дырэктарам Расейскае Гімназыі у Люцыну.

Ведаючы С.П.Сахарава, як шчырага беларускага дзеяча, з вялікай адвагай і энэргіяй узяушагася за беларускую працу у Латвіі, — я рашуча адмовіуся ад гэтага кроку.

Не глядзючы на мой рашучы адказ, Вы потым у працягу некольких месяцау зноу і зноу зварачваліся да мяне з гэтаю тэмай, і калі я, вычарпаушы усе довады і усю энэргію у абарону С.П.Сахарава, высунуу, як новы матыу, тое, што я не лічу сябе здольным і належна падгатаваным да кірауніцтва Аддзелам, Вы зараз-жа зрабілі заяву аб тым, што есьць у Вас і другіе падхадзячые для гэтае пасады кандыдаты.

Нежаданьне мае пайсьці на дыктуемы Вамі крок, зауседы вызывала дужа вялікае незадавальненьне Ваша і Вы пачыналі пужаць мяне тым, што у такім разе Вы самі уедзеце з Латвіі. У рэшці-рэшт Вы заявілі мне, што пойдзеце сам-на-сам у барацьбу супроць Грамадзяніна С.Сахарава і што усе, хто у барацьбе гэтай будзе не на Вашым баку, будуць разглядацца Вамі, як Вашы ворагі.

Я зусім не разумеу на што нам беларусам такая барацьба патрэбна і, наадварот, усякую унутранную барацьбу у сучасны момант лічыу шкоднай і здраднай, ды апрача таго думау, што рэальная праца над будовай Гімназыі і рамонтам будынку сьцішыць Вашы ваяунічые настроі і дасьць Вашай энэргіі творчый напрамак, а таму і не прыдавау заяве Вашай дужа важнага значаньня.

Праца над Гімназыяй запрауды сьцішыла спрэчкі аб Кірауніку Аддзелу, але выклікала затое новыя.

Вам не падабаліся некаторыя мае увагі, як Члена Рамонтнай камісыі, і Вы зауседы дужа востра на мяне нападалі, а іншы раз і даволі груба абрывалі.

Я — маучау, бо ведау, што Вы іншы раз бываеце хворы, ды апрача таго шмат было у Вас у той час чыста асабістых непрыемнасьцей і ударау.

Далей вышлі некаторыя затрымкі у высылцы грошэй з Беларускага Аддзелу.

Затрымкі гэты былі выкліканы тым, што Вы самі не спаўнялі сваечасна патрэбных фармальнасьцяу, без якіх, па законам Латвійскай Рэспублікі, гэткія высылкі немагчымы, але Вы ні з чым лічыцца не жадалі і аб'весьцілі, што Ва усіх гэтых справах вінен Грамадзянін Ян Шчорс, Дзелавод Беларускага Аддзелу, якога Вы зараз жа і пажадалі звольніць з Аддзелу, патрабуючы замены яго знаемым Вашым, Гр. Дмітрыевым, з Коуны.

Я сам, асабіста, узяўшы ад Вас усе патрэбныя паперы, паехаў у Рыгу і праканаўся у тым, што тутака віна не Я.Шчорса: па прэдстауленні у Дзержауны Кантроль належных дакумэнтау усе справы былі залатвлены.

Вы аднак і да сенешняга дню усе яшчэ не задаволены Гр. Я.Шчорсам і пры кожным падхадзячым здарэньню зноу падымаеце справу аб яго звальненьні, хоць гэты чалавек мае вялікі службовы стаж і опыт і у нас німа другога кандыдата-беларуса з грамадзян Латвіі, які мог бы яго замяніць. Гэта свае незадаваленьне стараецеся Вы штодзенным паутарэньням і унушэньням прывіць і акружаючым Вас супрацоунікам Вашым, у чым ужо, нажаль, і мелі некаторы усьпех.

Баронячы гэтага чалавека, таксама мусіу я вызваць незадавальненьне Ваша.

У сярэдзіне лета аказалася магчымым і патрэбным адчыніць у Люцыну Беларускую прыватную Гімназыю Таварыства «Бацькаушчына». Вы не хацелі зразумець яе карысьці і патрэбы для нас і рашуча змагаліся за тое, каб гімназыі гэтай не было і каб замест яе аставалася у Люцыну гімназыя расейская. Спрэчкі за гімназыю былі досіць вострымі і закончыліся, к вялікаму незадавальненьню Вашаму, яе адчыненьнем[1].

Далей не падабалася Вам пастаноука працы у Т-ве «Бацькаушчына», дзе, па пагляду Вашаму, а таксама і Гр. Кастылюка, я задужа многа брау на сябе ініцыатывы і адвагі у правядзеньні рожных справау. Наслухаушыся даволі закідау і нарэканьняу Вашых, зрабілі мы Агульны Сход Таварыства і выбралі Вас Старшынею яго.

Але Вас не задавольнілі гэтыя выбары і Вы сталі дамагацца спачатку таго, каб я не вайходзіу у Прэзыдыум Прауленьня, а потым і савершэннага выхаду майго са складу Прауленьня, пагражаючы у праціуным выпадку павесьці працу да ліквідацыі самаго Таварыства.

З гэтага моманта, зауважыу я, што спрэчка пераносіцца Вамі на асабісты грунт. Прычыны мне не вядомы, але факт той, што у гэтай асабістай Вашай супроць мяне кампаніі Вам шчыра дапамагау Гр. Кастылюк, Член Прауленьня Дзьвінскага Аддзелу «Русскаго Общества въ Латвіи», якое зауседы дужа варожа адносілася і да гэтага часу ставіцца да беларускага нацыянальнага руху.

І хоць на выбарах у склад Прауленьня я, на Агульным Сходзе Т-ва 17-IX-22, атрымау галасоу болей за усіх новых членау Прауленьня, але я, выбраушы першы падхадзячы момант, уступіу жаданьням Вашым і выйшау са складу Прауленьня.

Я лічыу і лічу, што выхад мой з Прауленьня для спрау узгадаванага мной Таварыства будзе шкодным, але спасаючы еднасьць беларускага нацыянальнага фронту у Латвіі і старанна унікаючы уселякіх спрэчак, якія могуць разваліваць справу, — я уступіу Вам цалком кіраунічую працу у Таварыстве.

У маем жыццю я першы раз спаткау гэткія да сваей асобы адносіны і з вялікім задзіуленьнем прыглядауся да Вас і з уважлівасьцьцю аглядаюся на самаго сябе, шукаючы у працы сваей памылак, а у адносінах да Вас якіх-небудзь абразьлівых для Вас крокау.

Але не знайшоу ні таго, ні другога.

Наадварот: у мінулым — за мной былі, калі і не надзвычайные, дык усеж-ткі даволі значныя заслугі у беларускім руху, асабліва у той апасны яго перыад, калі далека не усе беларускіе дзеячы адважываліся актыуна працаваць у Беларускім Руху, а некаторые, навет, пакінулі зусім сваю Бацькаушчыну; у сучаснасьці — я зусім не жыву асабістым жыццьцем і не маю ніякіх асабістых уцехау, аддаючы усе свае жыццьце і працу Вялікай Беларускай Справе; што да Вас, дык зауседы стараюся толькі аблегчыць і умацаваць Ваша становішча, як адной з асей беларускай справы, і не толькі не стараюся зрабіць Вам якой-кольвек непрыемнасьці, але не хацеу навэт дапушчаць думкі аб тым, што усе выступленьня Вашае супроць мяне — есьць вынік злое волі.

Занятая Вамі у адносінах да мяне пазыцыя аставалася для мяне незразумелай, а асабістая трауля мяне, як беларускага дзеяча, дужа абражала і дзівіла, але ніводным словам, ніколі і нікому я аб гэтым не хацеу казаць, каб не вынасіць бруды з беларускае хаты і гэтым не псаваць той справы, для якой я ахвяраваў жыццьце сваё.

Адначасна шчыра верыу я і у тое, што, калі справа наладзіцца і усё пойдзе рауней, — Вашы асабіста-непрыязныя адносіны да мяне перамяняцца.

Тым часам падасьпела выбарчая кампанія у Латвійскі Сойм.

Вы не толькі не дапамаглі нам у ей, але наадварот, абвесьціушы сябе аполітычным культурна-прасьветным дзеячом, зусім адмежаваліся ад усей выбарчай працы і, навэт агітавалі за тое, каб з яе вышлі і супрацоунікі Вашы.

З вялікім сумам бачыу я на будынку кіруемай Вамі Гімназыі абвесткі жыдоу і немцау і не было тамака толькі места абвесткам беларускім.

[...][2] Вашы і з прасьветным і грамадзкім стажам Вашым, здольны на асабістасьці. Усё яшчэ думалася, што на первым мейсцу у Вас справа, а не асабістыя якіясь-ці разрахубы.

Але, у працягу апошніх двух тыдняу, здарылася тры выпадкі, з якіх я пераканауся у тым, што маеце Вы нешта асабістае супроць мяне і шукаеце спосабу зрабіць мне як мага болей непрыемнасьцяу, зусім не лічучыся з тым якія могуць быць з гэтага вынікі для беларускай справы тутака.

17-га сьнежаня, у нядзелю, пасьля раду непрыемных для мяне, а таксама і для Вас, хвілінау, перажытых у мінулай начы на вечары Барыса-Глебскага Прыходу, зайшоу я да Вас, каб высьветліць некаторыя пытаньня і залатвіць некаторыя непаразуменьня.

Прыслуга пайшла далажыць Вам аб маім прыходзе.

Вы былі у хаце і ведалі, што я чую, але зумысьля голасна прыказалі сказаць мне, што Вас нема у хаці. І калі прыслуга пачала нешта паціху Вам тлумачыць, Вы зноу голасна крыкнулі ей, каб яна перадала мне, што Вы не жадаеце мяне бачыць.

Крокі прыслугі вывялі мяне са сталбняку і я вышау у поуным і цяжкім недауменьні.

Прыйшоушы да хаты, знайшоу я на стале пакет з Беларускага Аддзелу аб скліканьні Вучыцельскага Кангрэссу.

Па зьместу паперы трэба было мне зноу пагутарыць з Вамі, але ужо службова.

Не жадаючы натыкацца на новую абразу, я паслау Вам паперу аб жаданьні гутарыць з Вамі і адначасна папярэдзіу, што на другі дзень, у 8 гадзін, у вечары, ад'езджаю у Люцын на Сход Павятовай Управы.

Вы, навэт не самі асабіста, а праз дзелавода, прыслалі мне і то толькі на другі дзень, за 1Ĺ гадзіны да адходу цягніка, паведамленьне, што па справам службовым прыймаеце ад 2 да 3 гадз., гэта значыцца, што калі б я, атрымаушы пакет уздумау паехаць да Вас, дык Вы зноу бы не прынялі мяне, бо часы прыема гэтага дню былі ужо прапушчаны і я зноу змог «не знайсьці» Вас у хаце.

Але і на гэтыя асабістыя і ужо службовыя абразы не хацеу я зварачываць увагі і, лічучы, што самая добрая сварка, горэй за самы кепскі спакой, пры прыездзе Гр. Сахарава зноу быу у Вас і гутарыу з Вамі гэтак, якбы паміж намі і нічога ніколі не было.

Ды вось учора, перад тым, як ісьці да Вас у Гімназыю на спатканьне Новага Году, атрымау я ад Гаспадара спаткальнай Куцьці, вучыцеля Корці, ліст, у якім ен просіць выбачэньня за тое, што, не ведаючы становішча маіх з Вамі адносін, запрасіу мяне на вячэру, а цяперыка атрымау ліста ад Вас, у якім Вы катэгарычна патрэбуеце маей адсутнасьці.

Гэта апошняя абраза, выразна асабістага характэру, яскрава малюе мне Вашы да мяне адносіны і настроі.

Не ведаючы за сабой ніякіх учынкау, даючых Вам права на гэткія абразы, і усей душой хварэючы за той разлад, які пачынаеце Вы настойчыва уносіць у працу, я прымушэны зьвярнуцца да абароны свайго гонару і беларускае справы да Беларускага Грамадзянства у Латвіі і заклікаю Вас, Ян Ігнатавіч, на Грамадзкі Суд Гонару.

Заклікаючы Вас на Грамадзкі Суд, адзначаю, што і цяперыка яшчэ німа у мяне да Вас ніякае асабістае злобы, а баліць мае сэрдца ад незаслужанай абразы і крывяніцца яно за лёс той справы, якую давялося мне, пачынаць тутака у Латвіі.

1-І-1923 году.
Дзьвінск, Латвія.
К.Ез.
582.1.43:157-159 — мк

[1] Гімназія адчынілася 1.09.1922. [2] Ніз аркуша абрэзаны.

3373. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.01.1923

[...] Дадаю да гэтага ліст ад п. Нагродзкай да п. Станіславы[1], які сёнека атрымаў. Ад Вашага брата покуль ніякіх вестак няма [...]

Магу Вас «парадаваць» апошняй навіной. У Вільню прыехала «Цётка П<алута>»[2]. Жыве там ужо 3 тыдні і здаецца нелегальна. Збіраецца ехаць ці сюды, ці ў Прагу, але мы маем думку парадзіць ей ехаць да Вас. Так што трымайцесь [...]

582.1.43:149

Дакладная дата невядомая. [1] Ластоўскай. [2] Бадунова.

3374. Заява беларускіх арганізацыяў у Літве Прэзыдэнту Літоўскай Рэспублікі за 12.01.1923

Яго Дастойнасьці Прэзыдэнту Літоўскай Рэспублікі.

П. Прэзыдэнт!

У згодзе з пастановай Нарады ад 15-17 сьнежня 1922 году, ніжэй падпісаныя маюць чэсьць зьвярнуцца да Вас, п. Прэзыдэнт, з заявай чароднага зьместу.

Сьвядомасьць гістарычнае беларуска-літоўскае еднасьці і салідарнасьці прымушае нас, прэдстаўнікоў Беларускага Народу ў Літве, сказаць ў Вашай асобе Народу Літоўскаму праўду аб нашых беларуска-літоўскіх узаемаадносінах. Абавязак сказаць гэтую праўду ляжыць, ласьне, на нас, бо мы зьяўляемся найбольш сьвядомымі і найбольш пераконанымі саюзьнікамі Літоўскага Народу неаднаразовыя сьведчаньня чаму ачывісты; бо на нашую долю выпаў гонар рэпрэзэнтаваць Беларускі Народ [у] Літве і ў меру сіл змацняць брацкую сувязь абодвых Народаў. Праўда, якую мы прымушаны сказаць Вам выражаецца ў тым, што пры стварыўшыхся варунках мы ня можам выканаць нашай нацыянальнай задачы. Варункі гэты гэткія, што ўсе спробы нашыя падайсьці сур'ёзна і шчыра да справы ўзмацненьня беларуска-літоўскага супрацоўніцтва зьнікаюць на нішто, сустракаючы ці незразуменьне, ці няспогад з літоўскае стараны, ў выніку чаго самы гонар на нас лежачый, абертаецца ў панадсільны цягар. Варункі гэты гэткія, што мы ня можам гварантаваць беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ад магчымага ахалоджаньня нават у самай бліжэйшай будучыне.

Як вядома, з першых жа крокаў будовы Літоўскае дзяржавы адносіны да беларускай проблемы былі дваякімі: з аднаго боку, беларусы вызнаваліся як асобная этнаграфічная рознаякасьць і, як гэткім, ім ішлі насустрач, — з другога боку, беларусы не вызнаваліся як нацыянальна-палітычнае цэлае, зацьверджаючае сваю волю да незалежнага дзяржаўнага істнаваньня. У зьвязку з апошнім, адносіны да іх былі яўна нэгатыўнымі. Пералом у адносінах паўстаў толькі пасьля таго, як Літоўскі Урад у 1920 годзе прымушан быў пакінуць Вільню. Толькі пасьля гэтага паміж абедзьвемі старанамі была заключана дзяржаўная умова аб узаемным падтрыманьню і накінут у агульных рысах плян барацьбы супроць незаконнага польскага захвату.

Беларуская старана чэсна выканала свае абавязкі згодна умове. На мейсцох быў утвораны цэнтр барацьбы за пагвалчаныя правы Беларусі і Літвы, беларускія массы ўперш пачулі ад нас, што такое для іх народ

Літоўскі і яго дзяржава і чаму яны павінны аддаць яму свае сымпатыі. Скрыты плебісцыт у форме Віленскага Сойму нашымі сіламі быў бліскуча правалены і Літва магла спакойна глядзець на далейшае разьвіцьцё падзей у Віленскай вобласьці. Высылка польскімі ўладамі 12 сяброў Віленскага Нацыянальнага Камітэту, дзесяткі і сотні заключонных у польскіх турмах і падлегаючых сяродвечным тартурам за выяўленьне сымпатый да Літоўскай дзяржавы, ўрэшце, пралітая за тую-ж справу беларуская народная кроў, — вось сьведчаньня чэсных адносін беларускай стараны да сваіх абавязкаў.

Што-ж мы бачым за гэты час з боку Літвы. Апрача незначнай матэр'яльнай дапамогі, выданай у форме тэрміновай і працэнтнай пазычкі, якое падтрыманьне амаль цалком было выдаткавана на прапаганду праў Літвы на спрэчную тэрыторыю Віленшчыны — нічога. З боку Літвы адносіны былі гэткія, што высланыя з Вільні ў Коўну прэдстаўнікі Віленскага Нацыянальнага Камітэту павінны былі 22.VI.1922 г. злажыць з сябе поўнамочча па прэдстаўніцтву, матывуючы сваю пастанову тым, што «пры злажыўшыхся варунках яны лічаць дапамогу Літвы безнадзейнай» (заява на імя Старшыні Усходнай Камісыі).

Пасьля правалу Віленскага Сойму літоўская старана пачала занадта спакойна ставіцца да справы змаганьня за Вільню, ў аканчальным выніку спадзяючыся, што захопленая тэрыторыя будзе зьвернутая Літве міжнароднай інстытуцыяй, ці, як прынята фігуральна выражацца, упадзе ў лона Літоўскае дзяржавы як дасьпеўшае яблыка на моцы непахібных эканамічных варункаў. Сымпатыі беларускага жыхарства да Літвы пачалі лічыцца явішчам непрамінаючым і само сабой разумеючымся, пачало лічыцца за правіла, што сымпатыі беларусаў да Літвы павінны ўзмацоўвацца толькі самым фактам польскіх гвалтаў. Падобны зьневажлівы да нашай нацыянальнай годнасьці стасунак да беларускага руху, валок за сабой поўную бязчыннасьць, інэртнасьць тут у Літве, дзе павінна была горача кавацца справа ўзаемнага збліжэньня і падтрыманьня. Мы неаднойчы зьверталіся з заявамі і да Літоўскага Ураду і да яго грамадзянства ў асобе яго перлямантарыяў, у якіх казалі, што падобная пасыўнасьць згубна для справы, што калі ня будзе праведзяна сумесна з беларусамі цьвёрдая программа дзейнасьці, дык беларуска-літоўская акцыя у краю можа заглохнуць. Мы намагалі на тоя, што ўзмацаваньня супольнае справы патрэбна ці арганізацыя новых, ці развіцьцё старых устаноў у самой Літве, якія ўстановы павінны былі-б зьяўляцца школай ўзаемнага зьбліжэньня. Быў адзін момант, калі здавалася, што рэальнае супрацоўніцтва беларусаў з Літвой можа зысьціцца. 6.XII.1922 году адбылося супольнае паседжаньне некаторых сяброў Літоўскага Габінэту Міністраў з прэдстаўнікамі Беларускага Ураду, на якім паседжаньні былі намечаны некаторыя канкрэтныя захады, павінныя зьдзьвігнуць усю справу з мёртвага пункту. Аднак, добрым імкненьням, зазначаным на памянёным паседжаньню, зысьціцца не прышлося, дзеля прычын, аб якіх беларуская старана магла толькі дагадвацца.

У даны момант у Літве німа ніводнае установы, якая сьведчыла-б аб рэальным падтрыманьні беларусаў у іх барацьбе, пры чым ня толькі ў палі-

тычнай сфэры, але і ў сфэры культурнай. Да сяго часу мільённае беларускае жыхарства акупаваннай вобласьці застаецца бяз кнігі і культурнае адраджэньне яго — высілак выключна мейсцовых беларускіх арганізацый.

За ўсе два гады, прайшоўшыя ад дня падпісаньня беларуска-літоўскай умовы, беларуская старана (за выключэньнем спроб арганізацыі Тарыбы Усходняй Літвы) толькі адзін раз была запрошана не па сваей ініцыятыве для абмяркавання бягучых спраў. Усе сустрэчы, у якіх трэба было выясьніць набалеўшыя пытаньня, адбываліся толькі па ініцыятыве беларускай стараны. Кіраўнікам літоўскай палітыкі за гэты доўгі тэрмін ці не было чаго сказаць прэдстаўнікам беларускага руху, ці казаць гэтага яны не знайходзілі патрэбным. Ходам падзей стварылася ўражаньне, што у Літве не цікавяцца беларускім пытаньнем, а самае гэтае пытаньне абертаецца ў нешта другараднае і пры тым службовае. Адносіны да беларускіх грамадзян, былі і засталіся гіранічна толерантнымі. Наперакор умове, Літва нічым не падтрымала беларускага пытаньня заграніцай, але, наадварот, у асобе сваіх прэдстаўнікоў замаўчывала беларускую справу і ў сваіх выданьнях, картах і інш., не пераставала цьвердзіцьл, што на ўсход ад Літвы ляжыць ці Польшча, ці Расія, але у кождым разе не Беларусь.

Можна было думаць, што пакідаючы без прынцыповага вырашэньня і без увагі беларускую проблему ў цэлым, Літва на мейсцох вядзе дзейную і шырокую акцыю. Нажаль, гэтага нельга сцвердзіць. Можна адкрыта сказаць, што калі на мейсцох нешта і робіцца, дык робіцца гэта сіламі самога беларускага вызвольчага руху, пры чым стасунак літоўскай стараны да гэтае працы прыхільны толькі на словах. Пасьля правалу Віленскага Сойму праходзілі месяцы і месяцы, а літоўская старана не выяўляла ніякай актыўнасьці, — а тым часам зьвязі руйнаваліся, людзі разачароўваліся, ўся справа барацьбы з польскай окупацыяй пачынала йсьці іншымі шляхамі. Беларускае жыхарства Віленшчыны ведала, што, ня гледзячы на заявы сымпатыі, у Літве маюць мейсца арэшты беларускіх працаўнікоў, прымушаных скрывацца ад польскага тэрору на літоўскай зямлі, маюць мейсца упорныя спробы высылкі іх назад пад польскую акупацыю, што праводзіцца сыстэма, пры якой фактычна беларусам адмаўляецца ў праве ўбежышча і г. п. Беларускія арганізацыі краю не маглі ня ведаць, што ўсе спробы беларускіх дзеячоў у Літве наладзіць справу барацьбы згодна запатрэбаваньням жыцьця разьбіваюцца аб глухое неразуменьне, ці аб сьвядомае укланеньне.

Ці можна пасьля гэтага падзіўляцца, што беларускае жыхарства пад польскай акупацыяй пайшло на выбары у Варшаўскі Сойм?

Небасьпекі, скрытыя ў данны палітычны момант пад польскай акупацыяй, заключаюцца, канешне, ня ў тым, што беларускае жыхарства пайшло на выбары. Небасьпека для літоўска-беларускае згоды ляжыць у тым, што пад уражэньнем стварыўшыхся варункаў, беларускае жыхарства можа пайсьці далей не па шляху барацьбы з польскай дзяржавай за свае вызваленьне, а па шляху лойяльнай палітыкі, па шляху барацьбы за беларускую аўтаномію ў межах Польшчы. Пэўныя указаньня такога звароту беларускай палітычнай думкі ужо маюцца, — і нашая супольная беларуска-літоўская задача іх зьліквідаваць.

Нам вядомы шмат якія прычыны, дзякуючы каторым гэтулькі натуральнае і арганічнае супрацоўніцтва беларусаў з Літвой не разьвівалася, але затрымлівалася. Мы ня будзем на іх застанаўляцца за поўнай няўжытнасьцю гэткага аналізу. Лічым патрэбным указаць толькі на адну прычыну, — гэта на нэгліжаваньне, непрызнаньне сілы і значэньня беларускага вызвольчага руху. Можна спадзявацца, што пасьля выбараў у Віленскі і Варшаўскі Соймы, гэтаму падчас умысьльнаму скэптыцызму ня будзе больш мейсца: сіла беларускай вызвольчай ідэі гаворыць сама за сябе.

А калі гэта так, калі кіраўнікі літоўскай палітыкі вызнаюць і сілу і важнасьць беларускага руху, дык патрэбна, каб адносіны да гэтага руху мелі адпаведны характар. Калі беларускае адраджэньне фактар вялікага значэньня для будучага сужывецтва абодвых народаў, дык трэба, каб адраджэньне гэтае ва ўсіх сваіх этапах было зьвязана з Літвой, не парывала з апошняй блізкага жыцьцёвага контакту. Калі гэта так, дык трэба раз на заўсёды умовіцца, як датычна прынцыпіяльнае стараны беларуска-літоўскага супрацоўніцтва, так і датычна праграммы і тактыкі тае барацьбы, якая па нашаму перакананьню павінна вясьціся сумесна ў агульных мэтах.

Больш чым поўгада таму назад прэдстаўнікам Беларусі было абецана, што падобная програма выпрацоўваецца. Ці апрацавана яна цяпер, ці не — нам невядома, але наскольк можна бачыць па інформацыйнай нарадзе за 28 кастрычніка г. г. — цьвёрда прынятай праграммы німа. Калі не ставіць тэрмінаў, дык, па прыкладу мінулага году, рашучага абмяркаваньня пытаньня можна чакаць яшчэ новыя месяцы, калі ўселякае абмяркаваньне будзе спозненым за адсутнасьцю працаўнікоў, на якіх можна было-б абаперціся: апошнія пойдуць служыць таму самаму ідэалу, але ў другіх варунках.

У інтэрасах агульнае справы і ў інтэрасах справы, за якую мы лічым сябе адказнымі ня меньш чым прэдстаўнікі Літвы, — мы зьвертаемся да Вас, п. Прэзыдэнт, з заявай, што пытаньне аб беларуска-літоўскім супрацоўніцтве павінна быць паддадзена ўсестароннаму компэтэнтнаму абгавору ў парадку тэрміновасьці.

У інтэрасах Літвы і Беларусі ў самай бліжэйшай будучыне павінен быць апрацаваны дэтальны плян дзейнасьці, пры чым павінны быць створаны варункі, гарантуючыя яго выкананьне.

Мы зьвертаемся з нашай заявай безпасярэдна да Вас, п. Прэзыдэнт, бо лічым нашае пытаньне справай ня толькі таго, ці іншага складу Ураду і не об'ектам палітычных разрахункаў, а справай нацыянальнай, справай народнай, заданьнем нацыянальнай беларуска-літоўскай палітыкі.

Мы зьяўляемся ў данным выпадку голасам, ласьне, нацыянальнай беларускай палітыкі і сьцьверджаем, што ўсё тое, што тут вылажана, сустрачае аднадумнае падтрыманьне усіх беларускіх груп у краю, вяжучых з Літоўскай Рэспублікай сваю барацьбу з гвалтоўным польскім імпэрыялізмам.

Мы пераконаны, што нашая заява, выкліканая найглыбейшымі пажаданьнямі дабра Літве і Беларусі, будзе пачута і тлумачана правільна.

Мы спадзяемся, што сьвядомасьць важнасьці і тэрміновасьці нашае заявы падзьвігне літоўскія кіруючыя кругі на актыўнае рашэньне і што нашае пажаданьне сумесна папярэдзіць сумны, але магчымы бег падзей, — не павісьне ў паветры. У адваротным выпадку мы павінны будзем прызнаць для сябе задачу, лёсам на нас узложаную, не да выкананьня, і прызнаць гэта адкрыта прад тымі усімі, хто з нашымі імёнамі зьвязвае нацыянальныя беларускія абавязкі.

П.Крэчэўскі
Старшыня Дзяржаўнай Калегіі Беларускай Народнай Рэспублікі

В.Прокулевіч
б. Віцэ-Старшыня Віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту

А.Карабач
Старшыня Цэнтральнай Рады Селян-Беларусаў у Літве

Л.Заяц
ад імені Прэзыдыуму Беларускай Грамады у Коўне

А.Галавінскі
Старшыня Беларускай Нацыянальнай Сувязі.

Коўна.Kaunas.
1923
Студзень—Sausio.
12/I-23 г.

582.1.43:025&r-026&r — д
582.1.43:098&r-107&r — карэктуры з памылкамі ў літоўскім тэксьце
582.1.43:108-114 — беларускі машынапіс
582.1.43:115-120 — літоўскі машынапіс
582.1.43:163-172 — чарнавік

3375. Ліст Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.01.1923

14.I.23.

Даражэнькі Вацлаў Юстынавіч,

пісаў я Вам, што не хачу шырокага агалошаньня майго ліста да Яна Ігнатавіча Краскоўскага, а таму прашу Вас болей нікому яго не паказываць, а найлепей павярнуць мне, бо я не хачу, каб ён з маей віны і рукі папаў у прэсу.

Справа яшчэ цягнецца.

Я вымагаю выбачэньня.

Ян Ігнатавіч вымагае ліквідацыі ліста.

Чакаю думак Вашых і ліста майго.

З пашанай

К.Езавітаў

P.S. Зьбіраецца яго публікаваць Ян Ігнатавіч са сваімі тлумачэньнямі.

Я процiў вынясеньня бруды на вуліцу, але калі ён будзе публікаваць, дык хай пачынае ён, а я не хачу гэтага рабіць.

Хай і Алякс. Іванавіч[1] нічога не дае аб гэтым у бюлліцені.

Выбачайце за мазаны ліст: пішу «на ляту», бо еду праз гадзіну на рэвізыю школак у Краслауку.

Буду у Дзьвінску праз 3 дні.

Кастусь

582.1.43:147&r-148&r

[1] Цьвікевіч.

3376. Інфармацыйны Бюлетэнь Цэнтральнага Беларускага Прэс-Бюро (Не для прэсы). №3. 15.01.1923. Коўна

582.1.43:126-128

3377. Ліст Самуіла Жытлоўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.01.1923

Berlin 17/I 1923

Высокапаважаны Вацлав Устинович,

Ваше уважаемое письмо с поздравленіем с благодарностью получил. В свою очередь позвольте мнѣ поздравить Вас с новым годом и пожелать Вам здоровья, счастья и всего лучшаго а главное успѣха в нашем всѣм нам родном и дорогом дѣлѣ.

Меня нѣсколько удивило, что Вы мнѣ через три мѣсяца послѣ моего предложенія отвѣтили о том, что считаете неподходящим теперь заниматься коммерческими дѣлами. Теперь вообще об этом не может быть разговора, ибо настало время для иной работы, для нашей прямой дѣятельности к которой мы призваны и за которую мы должны давать отвѣт. Прошу ознакомьтесь с моим письмом к п. Маршалку[1] и прошу сообщите мнѣ немедленно о Ваших намѣреніях для ближайшей дѣятльности.

Я здѣсь прилагаю письма г.г. Боровскаго и Мюллера об урегулированіи наших отношеній к Iweg'у. Их необходимо кое-как урегулировать. Единственный наш козырь здѣсь в Берлинѣ это то, что мы хотя бѣдны, но честны. На нас здѣсь смотрят как на представителей опредѣленной политической группы, которая не занимается авантюрами, шиберством и т.д. Но если мы потеряем наше реномэ, то мы все потеряем. А новый директор «Iweg'а», который горячо взялся за ликвидацію нашего дѣла, не остановится пред мѣрами вплоть до передачи нас прокурорской власти и в первую голову лиц, подписавших договор и чек. Слѣдует этого всѣми мѣрами избѣгать для спасенія престижа нашего Правительства. Если им сейчас (до 28го/I) дать около 10% долга, то остальную сумму можно будет разсрочить на довольно выгодных условіях. Как никак, хотя товар был и дрянной, но мы его всетаки продали и вырученныя деньги служили нам поддержкой, так-что мы теперь обязаны кое-как ликвидировать это дѣло.

Жду Ваших распоряженій на этот счет и прошу отвѣтом не замедлить, ибо потом, пожалуй нам не удасться ликвидировать дѣла на выгодных для нас условіях, да и скандала не избѣгнем.

Что касается капитала для Бѣларусскаго издательства, то я к этому предмету вернусь.

С искренним уваженіем преданный Вам
Ваш С.Житлов...
582.1.43:023&r

1 Маршалак Прэзыдыюму Рады БНР — Пётра Крэчэўскі.

3378. K.Jezovitovs. Par baltkrieviem un lielkrieviem Latvijā. Rīgā, 1923. «Izglītības Ministrijas Mēnešraksts». Nr.1, separatnovilkums (К.Езавітаў. Аб беларусах і вялікарусах у Латвіі. Рыга, 1923. «Месячнік Міністэрства Асьветы». №1, асобны адбітак)
582.1.43:137&r-145&r — д

3379. Паштоўка Кастуся Езавітава (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.01.1923

19.I.23.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

ці атрымалі Вы маю стацыю-адбітку на латышскай мове?

Я Гр. Цвікевічу перадаў гэту-ж стацыю ў расейскай мове з просьбай, каб ён адбіў яе ў «Бел. Сьцягу», а таксама і асобнай адбіткай, але штосьці нічога не чуваць!

Не маю я і абецаных нумэроў №4-га «Бел. Сьцягу», якога да гэтага часу не чытаў.

З пашанай К.Езавітаў.

Прыехала Палута! Яна у Вільні. Зьвярнулася да мяне па грашовую дапамогу. Колькі мог я ужо выслаў. Дапамажыце і Вы! Яна — хворая! Зьбіраецца у Прагу! Просіць перавесьці 300.000 н.м. Я выслаў 50.000.
582.1.43:199

3380. Ліст Яўгена Ляцкага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.01.1923

23-га студзеня 1923 года
м. Прага, Сміхов на Ватслявцэ

Дарагі Ватцлаў Юстынавіч!

Магчыма Вы не атрымалі майго ліста, якое я адправіў ужо даўно на адрыс А.І.Цьвікевіча ў Палаген[1]. Паўтараю, што пашпарт атрыманы мной ад п. Бароўскага застаецца ў мяне ў поўнай незачэпнасьці, аб чым у свой час і паведаміў п. Бароўскага. Вельмі Вам удзячны за прысылку мне біллюценяў, якія даюць мне магчымасьць хоць крыху сьлядзіць за тым што Вамі робіцца. Ведама ў іх мала ёсьць вестак, каб можна было высьвятляць Вашу дзеяльнасьць у печаці. Гэта здаецца у цяперашніх абставінах адзіная форма ў якой я мог-бы для Вас быць карысным, але для гэтага было-б неабходным мець матэрыял, якога не магу атрымаць ад тых землякоў з якімі спатыкаюся ў Празе. Не магу скласьці сабе яснага погляду ні а Вашых адносінах да Літвы, ні аб агульных Вашых пэрспэктывах. Яшчэ было-б цікава даведацца, ці ня прыймаеце Вы учасьце ў якіх небудзь коопэрацыях і ці не маюць яны зьвязку з коопэратывамі, якія працуюць

у Расіі. Калі я быў у Бэрліне, там шмат казалі аб дзеяльнасьці коопэратываў у пашырэньні кніг. Тут гэтая справа стаіць такім чынам, што каліб была магчымасьць атрымаць заказ, хаця-ж бы і не вялікі на якія небудзь школьныя або іншыя кнігі, то можна было-б утварыць пры Вашым учасьці, вялікае выдавецкае таварыства.

Не запамятаў я і майго абецаньня адносна Гісторыі Беларускай Літэратуры. Нажаль я магу узяцца за гэтую працу не раней як з'явіцца цьвёрдае пераконаньне у магчымасьці яе выданьня, па крайняй-меры у трох мовах. Пакуль з'явіцца гэтая магчымасьць, дазвольце напомніць Вашу абецанку даставаць для мяне кнігі і асабліва творы Карскага. Вельмі важна з'яўленьне таго гістарычнага матэрыалу, аб якім Вы мне казалі у Бэрліне.

Не прапускаю здарэньня, на колькі хапляе часу і магчымасьці, прапагандаваць Беларусь у тутэйшым грамадзянстве. Знаёмлюся па троху з землякамі, якія, па маім весткам працуюць удачна. Меньш вестак маю аб тым, на колькі яны пакараюцца сьвядома і самаахвотна эўрапейскай культуры. Спадзяюся, што і ў гэтай справе яны праявяць пэўную долю сьвядомасьці і добрай волі.

Сэрдэчна кланяюся Вам, сям'і Цьвікевіча і Пятру Антонавічу Крэчэўскаму.

Ваш ЯЛяцкі

582.1.43:038&r

Ліст пісаны рукою Тамаша Грыба, які, магчыма, і пераклаў яго на беларускую мову. [1] Палангу.

3381. Нататкі Вацлава Ластоўскага на аркушах паперы

Harelica stukatucha
Nia jdzi ŭ halawu idzi u brucha
I stuča i hruča
kala kostačak iduču

1. Словарь
2. Хрэстоматія
3. Слоўнік тэхн.
4. Фізыолёгія
5. Гісторыя
6. Казкі
7. Журнал

[Малюнак алоўкам дому]

Riga
Rytterstr 84, 1
J.Bejnar.

Riga
Купеческая 6
фірма Алідак
Ал. Ив. Алидак

John Charapuk
1041 N.Wood str.
Chichago, Ill.
582.1.49:194-195

Дата невядомая.

3382. Ліст Тамаша Грыба (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 13.02.1923

13.II.23
м. Прага

Паважаны Вацлаў Юстынавіч!

Мінула з таго часу больш аднае трэці году. Па дарозе з Дзьвінску ў Прагу, куды ехаў я для паступленьня ў Карлаў унівэрсытэт, застанавіўся я ў Коўні, каб прывесьці ў парадак там мае справы. Прабыў я ў Коўні ўсяго некалькі дзён. Але й за гэтыя некалькі дзён я лішні раз яшчэ пераканаўся, што далей мне заставацца ў Коўні няма ніякага сэнсу. Адносіны з маімі коллегамі па ураду Б.Н.Р. і з быўшымі партыйнымі таварышамі да таго сапсуліся, што ня толькі ня было ахвоты пры спатканьні падаць руку для прывітаньня, але й глянуць у той бок было неяк гідка, праціўна — і потым яшчэ нейкі час, калі я прыехаў у Прагу, пры адным нават успаміне аб «ковенскім балоце» проста мурашкі праляталі па целу. Так — «ковенскае балота» — я й цяпер не магу спакойна ні думаць ні пісаць аб ім. Занадта сьвежая рана — яшчэ не пасьпела зажыць — сьвежыя ўспаміны — У маіх вушах гудзіць хаўтурны звон — няма ўжо больш Ураду Б.Н.Р. — няма больш незалежнай беларускай дзержаўнасьці. Коўня — апошняя станцыя — экспрэс незалежнай беларускай дзержаўнасьці зваліўся пад адкос — на трусочкі разбіўся — ягоныя часткі або іржа раз'ядае, або — точуць сьляпыя чарвякі — І гэта ўсе? Больш нічога? Няўжо толькі гэткія сумныя вынікі першага аткрытага бою за незалежную беларускую дзержаўнасьць? — Пяць гадоў шалёнай напружанай працы — усё здарма?! — Беларускі адраджэнскі рух экспрэсам імкнуўся ўпярод — было натхненьне — было захопленьне — аж да самаахвярнасьці — Гэта было чыстае прыгожае — чароўнае — першае каханьне — расьцьвет вясны — калі думка вольным сокалам узьнімалася ў нябесную вышыню — калі бязьмежны былі парывы маладых сіл — калі не істнавала ніякіх перашкод — Дарогу мужыку! — Аткрываецца новая страніца гісторыі — на ёй няўмела выводзіць сваё імя — крывымі літэрамі — малапісьменны беларускі мужык — Ён ня розумам сьцяміў а сэрцам нешта вялікае — і бязудзержу імкнецца ўпярод, каб зьдзейсьніць гэта нешта вялікае і сьвятое — Гэта была рэволюцыя — Былі пэўныя лятуценьні — Кожны больш менш значны народны рух мае свае лятуценьні — сваю сьвятыню — сваю веру — Хай сабе рух пасьля будзе і задушаны, сьцерта памяць гэрояў — застаюцца патомкам лятуценьні — застаецца мара — застаецца надзея — чыстая, сьветлая, бадзёрачая дух ідэя — сьвяты покліч: змагарна ўпярод!

І гора таму народу, які нямае сваей сьвятыні — які ня мае сваей уласнай мары, сваіх лятуценьняў — Гора таму народу, які рукамі сваіх-жа

правадыроў нішчыць гэтыя сьвятыні — лятуценьні — застаўляючы вялікае нішто — бязьмежную пустату — засуджаваючы гэтым сябе на нямінучую сьмерць — у найлепшым выпадку быць на задворках гісторыі.

——— »« ———

Не, я не аб гэтым меўся пісаць да Вас. Я даў сабе чэснае слова не падымаць з Вамі больш гутаркі на палітычныя тэмы — у палітыцы мы варвары адзін да аднаго і ня думаю, каб мы змаглі хоць калі дагаварыцца да чаго небудзь. Мы людзі розных стыхіяў і тоя што для аднаго з'яўляецца сьвятыняй, для другога толькі спосабам палітычнай гульні.

Не раз я думаў: дык што між намі можа быць агульнага? Што нас можа злучаць? Любоў да бацькаўшчыны? — Але-ж няма ў нас супольнай бацькаўшчыны — мы кожны па свойму разумеем сваю бацькаўшчыну, кожны па свойму выяўляемо сваю любоў — Мы ўкладаемо зусім розныя паняцьці ў слова бацькаўшчына ~

Любоў да народа? — Мы так сама па рознаму разумеем і любім народ ~

Мо' гістарычная мінуўшчына, літэратура, поэзія? — тут здаецца супольны грунт мы зможамо знайсьці — хоць і не заўсёды але ў большасьці выпадках гэта магчыма — Я аб гэтым суджу па тым гутаркам, якія між намі былі аб гістарычнай мінуўшчыне нашага народу, ў справе казкі і песьні народнай, у справе роднай мовы у аснаўной ячэйцы беларускага грамадзянства — у сям'і — (чаго як ня прыкра, але няма яшчэ —) мы здаецца мелі ў гэтай справе супольны грунт; магчыма, што зможамо мець яго і ў будучыне.

——— »« ———

Перад намі стаіць цяпер зусім конкрэтнае пытаньне: накапленьне культурных вартасьцяў беларускага адраджэнскага руху. Сьвядомых сіл мала. А тыя што ёсьць ваўком глядзяць адзін на аднаго, запутаўшыся ў розных палітычных супярэчнасьцях. Няма культурнага цэнтру. Ні Менск, ні Вільня, ні Дзьвінск, а па даўна Коўня, ня могуць ім быць пры сучасных абставінах. Застаецца Прага, дзе спрыяюць абставіны для творскай навуковай і літэратурнай працы. У Празе ёсьць ужо каля сотні беларускага студэнства: ёсьць такім чынам грунт для культурнай працы.

Дык вось — маючы на ўвазе нашу апошнюю гутарку, пад час маей бытнасьці ў Коўне, калі Вамі было высказана пажаданьне пакінуць «ковенскае балота», я даў Вам слова зрабіць усё што толькі магчыма будзе, каб дапамагчы Вам зьдзейсьніць гэта. Тагды я меў на ўвазе Укр<аінскую> Сельск<а->Гасп<адарчую> Ак<адэмію>, дзе, мне думалася, можна будзе што небудзь зрабіць для Вас. Вёў адпаведныя гутаркі з належнымі асобамі. У выніку рашано было зрабіць захады перад Ч<эха->С<лавацкім> урадам аб адкрыцьці тут у Празе Беларускага Вучыцельскага Інстытута. Ад імя Бел. Грамады адпаведны мэморандум падалі. Чакаемо вынікаў. Вы напэўна ад Н.М.В<яршыні>на ведаеце што небудзь аб Інстытуце, таму я буду кратак і скажу толькі як стаіць справа з прафэсарскім пэрсоналам. Намячалася: Вы, Ляцкі і Дарашэнко. Я няпісаў Вам аб гэтым нічога, бо ня было нічога конкрэтнага, а даў Вам тады слова напісаць, як ужо напэўна нешта будзе.

Аб чым напэўна я маю цяпер Вам напісаць?

А вось аб чым: трэцяга дні я меў гутарку з Е.А.Ляцкім у справе выдаўніцтва. Ён кажа: калі б Вы маглі ўнясьці адну трэць (1/3) капіталу, ўзяць на сябе 1000-1200 экз. выдадзяных кніг, то ён змог-бы дастаць крэдыт (2/3) і рэшта кніг ужо само выдаўніцтва прадавала-б. Справа ставіцца зусім конкрэтна. Неабходна даць зараз-жа адказ. (Проста на адрэс Е.А.Ляцкага і на ягоная імя; ён між іншым вельмі дзівіцца, чаму Вы не даеце адказу на ягоны да Вас ліст). Я пішу Вам гэты ліст дзеля ягонай просьбы; неабходна пасьпяшыць (разьмер 1/3 устанаўляецца па дагавору~) можна т<ым> ч<асам> залажыць тут у Празе саліднае беларускае выдаўніцтва (цяпер друк у Празе таней каштуе, як у Нямеччыне, а гэта ў залежнасьці ад справы вугля; у Нямеччыне цэны на друк страшэнна цяпер падняліся з прычыны недастачы вугля).

Да гэта[га] магу дадаць (са слоў Е.А.Ляцкага), што пры Вашай згодзе магчыма будзе (стоіць толькі распачаць справу!) атрымаць яшчэ большы крэдыт і розныя льготы на надрукаваньне-

Як мага хутчэй гэта абсудзіце і зараз-жа дайце адказ.

З пашанай і прывітаньнем.

Тамаш Грыб

P.S. Калі захочаце чыркнуць пару слоў і мне, то мой адрас на Вяршыніна pro~

582.1.43:031&r-035

3383. Ліст Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.02.1923

[...] Если Вы съ г-ей Станиславой или г-нъ Коробачъ по какой либо причинѣ будете въ Königsberg'e, то приходите прямо съ вокзала ко мнѣ, такъ какъ моя комната всегда въ Вашемъ или г. Коробача распоряженіи.

[...] Приготовьте для нашего бѣлорусскаго издательства («Weissruthenischer Volksverlag, Genossenschaft mit beschränkter Haftung») интересныя рукописи [...]

582.1.43:007

582.1.43:008 — канвэрт

3384. Ліст Прадстаўніка БНР у Чэхаславакіі Міколы Вяршыніна (Прага) Дзяржаўнай Калегіі БНР (Коўна) за 17.02.1923 (вых. №472)

[...]Пэўна што у Прагу зараз прыедзе пасол кс. Адам Станкевіч.

№472

Прага 17.II 1923 г.

Прыем студэнтау у вышэйшыя школы будзе зачынен 21-23 лютага. калі хто потым прыедзе то ужо паступіць будзе трудней. На матурытныя курсы ужо усе вакансіі замяшчэны. Чарнецкаго пасылаем на курсы за высокашкольскую вакансію.

М.В.

582.1.43:009&r-010&r

3385. Ліст Аляксандра Карабача (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.02.1923

Коўна 20/II 23

Высокапаважаны
Вацлаў Юстынавіч!

Не адмоўце прыслаць мне, калі можаце па 100 беларускіх марак усіх сартоў. Пастараюся яшчэ раз заклеймiць іх праз свайго чалавека, які на днях едзе на правінцыю. Міллер проста жыцьця не дае. Прыстае да непрылічча прыслаць яму заклейменых марак. Тыя маркі, што Вы далі некулькі штук раней, мною былі пасланы Дабравольскаму і знача прапалі.

Ваш АКарабач

[Расьпіска А.Карабача:]
Атрымаў па аднаму лісту кожнай сэрii 21/II 23 г.
АКарабач
582.1.48:297&r

3386. Ліст Івана Цьвікевіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.02.1923

24/II 23.
Бэрлін.

Шаноўны п. Вацлаве!

Чаму ж змоўклі? Я, па-праўдзе, чакаў з вашага боку «пяруноў» і рэзкага адпору, каб загарэўся агонь і крыху ачысьціў задушную атмосфэру... Праўда ж, у Коўне цяжка дыхаць. Гэта нават тут адчуваецца.

Можа вы мае выпады проці палітычных партый лічыце за асабістую абразу, то гэта блага, бо адзін чалавек ня можа адказваць за усіх сяброў... Розныя сябры бываюць!

Наагул жа, мяне дзівіць, што вы нічога не адказваеце. Я ужо даўно зьбіраюсь запытаць вас пару-другую слоў, якія мне патрэбны для фізыялёгіі, але думаю, што вы можа злуеце на мяне і таму к чорту пашлеце мяне з маімі «словамі».

Ці чыталі вы №1 «Беларускага Студэнта»[1]? От, ведаеце, есць аб чым сказаць! Гэта ж пальцы абсмокчаш пасьля такога нумарочку! Што, ці не мая праўда была, калі я пісаў аб Станкевічу і Ко, што яны забрудзяць беларускую работу?

Хто там у пашане? — белы афіцэр з чарнасоценным «душком» — Ермачэнко!!! Як кандыдатура высуваецца пры кожнай новай арганізацыі. Ен верхаводзіць стварэньнем «Саюзу Адраджэньня Беларуск. студэнцтва», які будзе кіравацца ў сваёй чыннасьці «Хрыстовымі ідэаламі». Чорт ведае да чаго дайшлі! Ці не падобна гэта будзе да «Саюзу Архангела Міхаіла»? А сымптомы на гэта маюцца даволі выразістыя. Пачытайце артыкул «Рупмася аб сабе», дзе іронізіруюць над «Нашай Нівай» за тое, што кіраўнікі яе апрача беларусаў бачылі на беларускай тэрыторыі якіясь яшчэ народнасьці. Сьмяюцца над часопісью віленскіх студэнтаў, якія лічаць жыдоў таксама за людзей. Жыдожэрчы твар хоць крыху і хітра, але паказаўся.

А праграма стварэньня сялянскага саюза з кулачкоў і шляхцюкоў, каб процістaвіць яго рабочым арганізацыям, якія хочуць толькі сялянскімі

рукамі жар выграбаць?!! (гл. артыкул «Да ідэалёгіі беларускай моладзі»). У гэтай жа стацьці гаворыцца аб небасьпечнасьці соцыялізму. Ergo: далоў беларускіх соцыялістаў і няхай жывуць беларускія «хрыстовыя дэмакраты», бей жыдоў і спасай Беларусь! Сумна робіцца ад гэткай «ідэалёгіі» белар. моладзі...

Уважліва прачытаўшы відаць, што усё, калі не падпісана, то выпраўлена і інспірыравана Я.Станкевічам — злым геніем пражскіх мал[а]дых студэнтаў, бо яны слухаюць відаць яго і лічаць яго за аўтарытэт. Агідлівей усяго чытаць чыста іезуіцкі падход да сялян у сфэры палітыкі, гэтая прапаганда з мэтаю пасварыць вёску з горадам. За ідэал грамадзкі высуваецца не еднаньне сялян з рабочымі (такімі жа сялянамі — але прышоўшымі з вёскі на час або на заўсёды) але нацковываюцца работнікі зямлі на работнікаў фабрыкі, зусім так як гэта рабіў царскі ўрад.

#

Тады як быў тут Карабач і Душэўскі я прасіў іх узяць у Коўну новую часопісь менскую «Полымя»[2] і крыху газэт, але яны умовіліся з Варонка спаткацца (бо Варонка прачытаўшы павінен быў перадаць) і не спаткаліся. Цяпер гэта часопісь тут. Спадзяюсь, што Русак забярэ.

Вельмі шкода, што маю толькі першую частку вашага слоўніка; можа тады калі б меў усяго не дакучаў бы вам з праверкаю маіх слоў.

У прадмове да кнігі[3], калі дазволіце — зьмяшчу падзяку вам за падмогу пры стварэньні і фактычнае стварэньне тэрмінаў, без чаго пераклад ня меў бы ніякай цаны.

Вам мусі ведама аб маіх плянах — з цяплом ехаць у Менск[4]. Цяжка мне тут аднаму, паеду на жывую працу. У Літве я лічу беларуск. акцыю безнадзейнай.

Апроч самім сябе, беларусы нікому непатрэбны. А раз не — то ня трэба і прасіць. Хай іх усіх чорт! Ляпей сваімі асабістымі справамі займацца — хто што любіць і да чаго здольны — чымся прасіць чыёй бы ні было ласкі.

Або — або. Іншага шляху няма.

#

Дык, не адмоўце пракінуць вокам і паправіўшы гэтых пару дзясяткаў слоў — адаслаць мне сюды. І яшчэ вялікая прозьба у выпадку — мой пераклад будзе друкавацца без мяне там у Коўне — будзьце ласкавы прагляньце апошнюю корэктуру. Толькі вам давяраю у сэнсе мовы і стылю. Уперад згаджаюся са усемі вашымі папраўкамі.

Гатовы к услугам

І.Цвікевіч

Чакаю слоў і пісьма.

28/II 23.

582.1.43:005&r-006&r

---

[1] Датаваны студнем, выйшаў у лютым 1923 году. Дзеля таго, што ніводнага асобніка №1 ня выяўлена, падамо ягоны зьмест (паводле: Новае Жыцьцё (Вільня). №1. 3.03.1923): Ад рэдакцыі. — Да ідэолёгіі беларускай моладзі. — Брачыслаў Скарыніч: Дзьве праўды. — Брачыслаў Скарыніч: Рупмася аб сабе. — Марка Вочнік: Усеславянскі студэнцкі кангрэс у Празе 16-22 сьнежня 1922 г. — Гу-

марыстычны куток. — Я.Ст.: Важная справа. — Я.Станкевіч: Нацыянальны назоў Беларусаў. — Грыневіч: Паміж двух агнёў. — Вацюк Слаоўскі: Аблава на медзьведзя. — З жыцьця Белар. Прав. Царквы. — Хроніка. [2] Першы нумар «Полымя» выйшаў у сьнежні 1922. [3] Магчыма, гаворка йдзе пра перакладзены І.Цьвікевічам падручнік Малышава «Анатомія й фізыялёгія чалавека». [4] І.Цьвікевіч выехаў у Менск у траўні 1923 году.

3387. Брачыслаў Скарыніч. Рупмася аб сабе
582.1.48:290-292 — м

Дата невядомая. На машынапісе прыпісана алоўкам: «Друкаваць, мне здаецца нельга». Артыкул быў надрукаваны ў «Беларускім Студэнце» №1, 1923.

3388. Ліст афіцэра Анатоля Плескачэўскага (Марыямпаль) Вацлаву Ластоўскаму за 15.03.1923 з просьбай даслаць матэрыялаў для падрыхтоўкі сьвяточнага рэфэрату на 25 Сакавіка
582.1.43:036&r-037

3389. Запрашэньне Міністэрства Беларускіх Спраўаў дырэктару Дзяржаўнай Бібліятэкі на выставу беларускага друку, якая мае адчыніцца 25.03.1923
582.1.49:196

3390. Запрашэньне Міністэрства Беларускіх Спраўаў Вацлаву Ластоўскаму на сход у справе лекцыяў беларускай мовы й беларусазнаўства, які мае адбыцца 28.03.1923 у памешканьні Міністэрства (вул. Міцкевіча 13а)
582.1.49:196

3391. Канвэрт ад невядомага ліста
582.1.48:274

3392. Праграма курсаў беларусазнаўства й літоўскае мовы. Коўна. 10.04.-19.05.1923
582.1.48:289

Кіраўнік курсаў К.Дуж-Душэўскі.

3393. Ліст Стэфана Салаўёва (Русэ, Баўгарыя) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.04.1923 з просьбай паведаміць аб магчымасьцях атрыманьня беларускага пашпарта для таго, каб «...выбраться из чуждаго нам по духу и культурѣ Балканскаго полуострова...»
582.1.48:293&r

3394. Якъ отдавали Польшѣ русски земли (Резолюція Рады Амбасадоровъ въ Парижѣ, которою были признаны Польщѣ границы Рижского договора и Вост. Галичина) // Правда (ЗША). №36. 27.04.1923
582.2.59:003,006 — д

Пра пастанову аб прызнаньні усходняй мяжы Польшчы 14.03.1923.

3395. Польская газета о прошломъ Польщи // Правда (ЗША). №36. 27.04.1923
582.2.59:005,008 — д

3396. Kurjer Poranny (Варшава). №658. 26.05.1923
582.2.59:035-036 — д

3397. Myśl Niepodległa (Варшава). №658. 26.05.1923
[З артыкулам:] Proces Białorusinów
582.2.59:027-034 — д

3398. Ліст Ігнаса Янінаса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.06.1923 у справе перакладу на беларускую мову твораў Ёнаса Білюнаса, за якія меўся ўзяцца Аляксандар Ружанцоў
582.1.49:189

На блянку:
Litauische Regierung
Ministerium
fur Weissruthenische
Angelegenheiten
Grodno,
Sophieenstrasse, 26.

3399. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.06.1923

Вельмішаважаны Пане Ластоўскі!

Ад імя Рэдакцыі і ад сябе шчыра дзякую Вам за прысланыя 20 (дваццаць) даляраў. Так сама дзякую за ліст, які я дастаў сяганьня. Грошы я дастаў і перадаў скарбніку нашага журнала некалькі дзён таму назад, але не адпісаў Вам адразу, бо быў гарачы экзаменацыйны час.

Дзякую за запросіны мяне ў супрацаўнікі «Крывіча». Прыймаю гэта з удзячнасьцяй. Але ў чэрвенявы № мая стацьця не пасьпее. №2-3 «Бел<арускага> Ст<удэнта>» вам паслалі, ня ведаю, чаму Вы яга не дасталі. З экз. гэтага №4-5 пасылаем адначасна з гэтым лістом. Экспэдыцыя нашая спазьнілася, бо з прычыны экзаменаў мусілі перарваць працу.

Калі ласка прышлеце мне № або некалькі № «Крывіча». Думаю, што ў «Крывічы» будуць і палітычныя стацьці, бо гэта так сама патрэбна.

Чаму Вы выступілі з Дзяржаўнае колегіі[1]? Мне здаецца, што гэта пашкодзіць справе.

Як Вы пеўне ведаеце, Грыб з Мамонькаю хацеў зрабіць тут у Празе ня толькі эсэраўскі цэнтр, але й адначасна зруйнаваць цэнтр ковенскі. Дзеля гэтага паміж іншым маў служыць яму і праектаваны Вуч<ыцельскі> Інстытут.

На жаль інстытуту ня будзе (а калі-б і быў, ды ня з ласкі Грыба ці Мамонькі). Агітацыя паміж бел. ст<уд>. Грыбу не ўдаецца. Ёсьць цяпер у Празе эсэраў якіх 7-8 чал. Дзеля гэтага ён зьляпіў «Аб'яднаньне», аб якім сусім праўдзіва напісана ў №4-5 «Бел. ст.».

Мамонька тут страшна компромітуе сябе і беларусоў. Нядаўна ў Подзебрадах, дзе ён залічаны ў Акадэмію, стаўся гэткі скандал: Мамонька з Буслам зайшлі ў піўную. Там сядзелі Чэхі. Мамонька пачаў Чэхам даводзіць, што няма украінскага руху, але ё нямецкага інтрыга; немцы хочуць аслабіць Расею і дзеля гэтага свайме грашыма робяць укр. справу. Але ў карчме было некалькі студ. украінцаў, якіх мусіць Мамонька ня згледзіў. Украінцы запротэставалі і выйшлі з карчмы. Але ахамянўшыся, гукнулі на помач балей сваіх сяброў і вельмі зьбілі М. і Б., асаблва аднага з іх. Справа гэтая перададзена таварыскаму суду студэнскаму. Яна стала галосная ў Падзебрадах і навет у Празе. Аб ёй мне расказаваў ст. Бідноў. А ён чуў ад свайга бацькі, які прафэсарам у У<краінскай> Акад<эміі> ў Падзебрадах. А тымчасам Мамонька ў Акадэміі і ў Празе заўсёды заяўляе, што ён «сакратар рады Рэспублікі».

Вельмі добра, што ё магчымасьць паслаць у Амэрыку 4-х Беларусоў. Я падумаю аб кандыдатах і напішу Вам за некалькі дзён.

На Амэрыку і на Лацьвію мусім зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Што гэта значыць, што Змагар-Чарапук комун. расейскую газэту «Свабодная Расія» так рэклямуе ажно ў Вільні[2]? Гэта-ж калі бел. адраджэньне будзе йсьці ў Амэрыцы праз «Св. Расію» ў зах. Беларусі праз такія «Наш Сьцяг» (віленскі, ня ковенскі), «новае жыцьцё», «Нашае жыцьцё»[3], дык бел. рух перастане быць сам сабою, а стане галіною камуністычнага руху. Мо' Вы напісалі-б у чым тут прычына і што можна рабіць проці гэтага?

Выбачайце, што так накрэмзаў.

Буду вельмі ўдзячны, калі адпішаце. Ваш ЯСтан...

582.1.49:192&r-193&r

[1] Маецца на ўвазе выхад В.Ластоўскага з усіх структураў БНР 20.04.1923. [2] Рэклямная абвестка была надрукаваная ў: Новае Жыцьцё. №9. 1.05.1923. [3] «Наш Сьцяг» выходзіў 5.06-12.08.1923, «Новае Жыцьцё» — 3.03-18.05.1923, «Нашае Жыцьцё» — 30.05-25-06.1923.

3400. «Калі і як запалонілі нас чужакі?». Артыкул Вацлава Ластоўскага

Калі і як запалонілі нас чужакі?

Пэўне-ж няма ўжо у нас такога цёмнага чалавека, які-бы ня ведаў, што мы Крывічы, ці як пазьней нас празвалі, Беларусы, мелі сваю вольную дзяржаву, якая дзялілася на некалькі асобных князьстваў: Полацкае, Смаленскае, Тураўскае, Менскае і інш. У тыя часы былі у нас свае князі і свае войскі і суд і школа і цэрква. І усе гаварылі і пісалі ўсе дакуманты ў нашай мове і ніхто яе не называў «простай».

Пазьней, зьядналіся мы з Літвой і разам уладзілі адну дзяржаву, ці як тады называлі — гаспадарства. Пражылі мы з літвінамі у згодзе і прыязьні больш 300 гадоў і наша гаспадарства разраслося, падужэла. Пры князю Ольгердзе Маскву ня раз былі зваяваўшы, ня раз палякаў і такі добра пабілі. Але прышло няшчасьця. Віленскі Вялікі князь Ягайла ажаніўся з польскай каралеўнай, Ядвігай. Пасябраваўся з палякамі, а

тыя дай ды навучы яго, як добрага дурня, што нібы-то трэба у нас лепшыя парадкі пазаводзіць. Як бытцам-жо у нас былі благія парадкі!

А гэты новыя парадкі вось у чым былі:

Народ у нас быў увесь вольны. Тыя што што ў войску служылі называліся баярамі, ці ваярамі (ад слова «ваяваць»), а тыя што не хадзілі на вайну называліся цяглымі людзьмі. Баяры, за вайсковую службу карысталіся большым абшарам зямлі, цяглыя, меншым абшарам. Але кожды цяглы чалавек мог пайсьці у баяры, калі меў брата ці сына даць у войска, і наадварот кожды баярын станавіўся цяглым, калі пераставаў служыць у войску. Дык, знача не было патомных, з бацькі на сына ні баяраў, ні цяглых людзей ці то сялян.

Вось палякі і настроілі Ягайлу, каб ён завёў у нас патомнае войска, з бацькі на сына і унука, што гэта будзе лепшае войска.

Той паслухаў, а з гэтага вышла вун што:

Баярын, які станавіўся патомным, прыймаў назову шляхціца. Раней ён датуль большай зямлёй карыстаўся дакуль у войску служыў, а пераставаў служыць, другі на гэту зямлю садзіўся, які браў на сябе вайсковую службу.

Цяпер-жа, хто прыймаў шляхэцтва атрымліваў зямлю патомна, станавіўся яе ўласьнікам.

Раней зямля належала да дзяржавы і ніхто ня мог ей таргаваць, а цяпер, шляхціц, мог сваю зямлю прадаць, ці прыкупіць ад каго хацеў.

Калі у часе вайны адзін награбіўся на вайне чужога дабра, то вярнуўшыся скупляў сабе землі і мала памалу станавіўся магнатам, а другія стаўшыся беззямельнікамі ішлі да яго на службу.

З гэтага пачала расьці паншчына, ці як іншыя завуць — прыгоншчына.

Год за годам што раз горш станавілася: адны багацелі, другія што раз горш бяднелі. Што раз трудней было дзяржаве з бедных выбіраць падаткі, а багатыя казалі, што ім трэба плаціць толькі за тую зямлю, што яны ад дзяржавы дасталі, а за тую, што дакупілі нікому не павінны плаціць падаткаў.

Гэта цягнулася больш сотні гадоў. Урэшце шляхта, якая акрэпла і разбагацела падала такі праект:

— Мы будземо плаціць усе падаткі самі, але няхай кароль зацьвердзіць закон, што ўсе землі цяглых людзей пераходзяць на ўласнасьць шляхты. Закон гэты быў зацьверджан. Усе селянскія землі перайшлі на шляхту. Кожды селянін павінен быў плаціць чынш, або калі нямае грошы адрабляць плату за арэнду сваей зямлі шляхціцу. А далей — болей сяляне сталіся і поўнымі нявольнікамі шляхты.

Вось як наступіў падзел у нас аднаго народу на шляхту і мужыкоў. Адны сталі панаваць, а другія гараваць.

Першыя, шляхта, пасябраваліся з палякамі, панавучаліся мовы польскай, бо думалі, што, яны сталіся іншымі людзьмі разбагацеўшы, баяліся прызнацца самі перад сабой, што сваіх братоў ў няволю запалонілі, дзеля гэтага выракліся сваіх братоў сялянаў, выракліся мовы сваей.

Калі зьбіраліся на сэймы то гаварылі там не аб сваім краю, а аб Польшчы і самі сябе урэшце пачалі лічыць палякамі.

Гэтак вось нашае баярства, за шляхэцтва, за багацьце, за паняволеньне сваіх братоў сяляняў, прадало сваю дзяржаву і сваю бацькаўшчыну палякам.

Яна, шляхта наша запрапасьціла волю і долю нашу, вырасла сама на поце і слязах нашых, здрадзіла свой народ.

Хай жа праклята будзе памяць яе і яе патомства!

Але ня ўся шляхта нясе на сабе віну здрады і годна праклясьцьця. Дробная засьцянковая шляхта не вінавата ў гэтым, яна як і селянства мела гаротнае жыцьцё на сваіх маленькіх засьценачках, яе найбольшая віна ў цемнаце яе, што ня бачыла куды цягнуць магнаты і што праз сваю цемнату ішла за панамі-магнатамі. З гэтай дробнай шляхты нашай, даўнейшых баяраў выходзяць цяпер мсьціцелі паном, за паняволеньне народу, за здраду яго.

Змаганьне за лепшую долю свайго народу ёсьць першы і найважнейшы абавязак кождага грамадзяніна, а гэта лепшая доля і свая ўласная воля можа быць толькі ў незалежнай сваей дзяржаве.

Мы Беларусы (Крывічы) дагэтуль ня маем сваей дзяржавы, наш народ на усіх сваіх землях ня ёсьць сам сабе гаспадар, усюды ён мае над сабой чужакоў, ворагаў, якія валодаюць і гаспадараць у нашых землях.

Падаткі плоцім мы ў чужы скарб, на утрыманьне сотняў тысяч чужакоў дармаедаў, якія наляцелі на нашу зямлю каб варачаць намі як нявольнікамі сваімі.

Наша моладзь служыць у чужацкім войску каб у патрэбе праліваць кроў сваю за тых, якія закавалі ў ланцугі няволі і абіраюць нас.

Нашу родную зямлю раздаюць рожным прыблудам.

Багацьця нашае народнае, лясы і пушчы высякаюць і вывозяць заграніцу.

Нашых дзяцей заганяюць ў чужыя школы, каб адвучыць іх ад роднай мовы і ашуканствам навучыць дзетак нашых спрыяць тым, каторыя згубы нашай шукаюць.

Ці чалавек, які усё гэта бачыць, які разумее ў якім страшным упадку, ў якой страшной няволі мы знаходзімся, ці можа такі чалавек з усім гэтым пагадзіцца, злажыць рукі і нічога не рабіць?

Не, тысячу разоў не!

Хто ўсё гэта бачыць, хто разумее ўсю нашу нядолю, ніколі не пагодзіцца з панаваньнем над намі чужакоў-ворагаў нашых. Вось чаму лепшыя, разумнейшыя людзі змагаліся і змагаюцца у нас з кождым чужым панаваньнем.

Змаганьне з чужакамі насеўшымі на нас, сьвятая павіннасьць кождага і гэтага змаганьня ня мае права ніхто спыніць датуль, пакуль мы не здабудзем сабе сваей вольнай і незалежнай дзяржавы, пакуль мы не станемся самі гаспадарамі на сваей ўласнай зямлі.

Кожды хто робіць спробы пагадзіцца з ворагамі, пакуль яны трымаюць нас у няволі, блага робіць. Блага, бо здраджае свой ўласны паняволены народ, бо затрымлівае час прыходу волі ўсяго народу.

Між воўкам і аўцой, між каршуном і курчацям, між катам і катаваным няможа быць згоды!

Мы дабіваемся поўнай волі, поўнай свабоды. Дзеля гэтага мы кажамо: Вон, чужое панаваньне. Мы няхочам ніякіх ласк, ніякіх нібыто уступак ні ад палякаў, ні ад маскалёў пакуль яны сядзяць жамярой агіднай на нашых карках і ссуць нашу кроў.

Мы няхочам ніякіх ласк ад расійскіх ці польскіх палітычных партій, ніякага заступніцтва іхняга, бо ведаем, што кожды чужынец, хто-б ён ня быў, таму да нас лашчыцца, што хоча нашым потам і крывей пасьля карміцца.

~~Хай нашым клічам будзе: Беларуская (Крыўская) зямля крывічом (беларусам)! Вон набрыдзь чужую!~~

~~Вон чужое чыноўніцтва!~~

~~Вон чужую паліцію!~~

~~Вон чужое войска!~~

~~Вон чужую школу!~~

~~Вон чужых духоўнікаў!~~

Мы няхочам чужой школы на сваей зямлі, бо яна адбірае ад нас дзяцей нашых, якія кончыўшы чужыя школы становяцца служкамі пануючых над намі чужынцаў, а тыя іхнімі рукамі будуць нас ў няволі трымаць.

Мы няхочам чужога духавенства, якое бароніць не нас паняволеных і пакрыўджаных, а падтрымлівае чужое над намі панаваньне. Хрыстос сказаў каб кожды маліўся ў сваей мове, чаму-ж у нас ксяндзы молящца па-польску, а папы па-расейску? Таму што яны ворагі нашы, што яны хочуць каб мы ніколі ня вызваліліся з няволі, толькі адны нас цягнуць у Варшаву, другія у Маскву. Гэта не праўдзівыя духоўнікі, гэта юды якія прадалі свайго Бога або паляком, або маскалём, ня верце ім, верце толькі тым, якія нас не чураюцца, які гавораць нашай роднай мовай.

Вон чужую ўладу!

Вон чужую навуку!

Вон чужое духавенства!

582.1.47:034-042

Дата невядомая.

3401. «Беларусы» ці «Крывічы». Артыкул Вацлава Ластоўскага

«Беларусы» ці «Крывічы».

З найдаўнейшых часаў і мы самі сябе і нас усе называлі «Крывічы». Калі было у нас сваё незалежнае князьства, то яно называлася «Крыўскае» князьства, а князёў называлі «крыўскімі князямі».

Гадоў таму каля тысячы назад на усходных славянаў напалі вялікія разбойніцкія банды немцаў, якія звалі сябе «Русь». Гэты банды немцаў заснавалі у Кіеве сваю дзяржаву і давай падбіваць акалічныя князьствы. Гэтак мала-памалу усё расла і расла тая дзяржава «Русь» і накідала сваю ўладу што раз большым абшарам славянскіх зямель. А урэшце, пры царыцы Кацярыне 150 гадоў таму назад заваявала і наш край і стала Русь называцца Расійскай імпэрыей. У гэту дзяржаву «Русь» уходзілі рожныя землі і дзеля гэтага адным яны давалі назову Чырвоная Русь, другім — Чорная Русь, трэцім, Белая Русь, чацьвертым Малая Русь і г.д.

Так сама, як цяпер улезьлі да нас у край палякі і хочуць назваць наш край Белай Польшчай.

Калі народ наш утраціў сваю незалежнасьць, стала забывацца і яго праўдзівае імя. Тым больш што ворагі, якія запанавалі над намі заўсёды называлі нас па свойму.

Гэтак замацавалася у нас назова Беларусь.

Гэта назова «Беларусь», служыла нам доўга, так што прырасла да нас. Але усё-ж такі наша старое і праўдзівае імя гэта — Крывічы, а край — Крывія.

Крывіч, гэта значa сваяк (польскае «krewny»), родны, блізкі чалавек. І запраўды мы усе сабе крывічы, бо ўсе аднаго роду, аднаго племя, аднэй гаворкі. І лепш і праўдзівей нам і называць сябе Крывічы, хоць няма чаго чурацца і назовы «Беларус»: і тое і другое адно азначае. У многа якіх народаў маецца па два іменьні; прыкл.: мы кажам Немцы, а самі яны сябе называюць Дойч, Палякі ведамы яшчэ пад назовай Ляхі, Рускія — Маскалі і г.д. Дык і нам няма чаго баяцца, што у нас маецца наша старая і навейшая назова.

582.1.47:043-044

Дата невядомая.

3402. Янка Палын. Дзьве дзяўчыны (Эскіз)

582.1.47:076-080

Дата невядомая. Янка Палын — літаратурны псэўданім Віктара Вальтэра.

3403. Ліст Рамана Галіцкага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ??.??.1923 у справе украінска-беларускіх палітычных кантактаў

582.1.48:293&r

Дата невядомая.

3404. Ліст Ігнаса Янінаса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 3.07.1923 з просьбай даслаць аркуш «Крывіча» з вокладкай, асобнік «Беларускага Студэнта» (Прага) і копію ліста Янкі Станкевіча

582.1.49:158

3405. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.07.1923

Вельмішаважаны Пане Ластоўскі!

Карыстаючыся з магчымасьці дармавое перасылкі, пасылаю Вам у «Крывіч» стацьцю «Аб Беларусох лаціньніках»[1]. Думаю, што можна будзе яе надрукаваць. Пішучы яе, я кіраваўся таей думкаю, якую выказаваю спачатку і ў канцы гэтае стацьці — гэта зьвярнуць Беларусоў увагу на патрэбу інтэнсыўнейшае працы дзеля адраджэньня Беларусоў-каталікоў.

Калі-б ня можна было стацьці надрукаваць, або калі-б Вы мусілі зрабіць у ёй вялікшыя папраўкі, дык увабодвух выпадках (у другім надрукаваўшы) вельмі прашу пры здарэньні адаслаць мне арыгінал назад.

Калі яшчэ заўтра ўгледжу гэтую студэнтку Bubienas, дык перайшлю яшчэ ў «Крывіч» малую стацейку філёлёгічнага характару. У праціўным

выпадку пашлю яе ажно за тыдзень, бо перад дастаньнем мес. стыпэндыі няма грошай на пашт. маркі.

Калі-б Вы малі часінку часу, дык калі ласка напішэце, ці магла-б быць надрукавана стацьця ў «Крывічу», якая зьяўляецца шырокай і грунтоўнай рэцэнзыяй «маскоўска-беларускага слоўніка» братоў Гарэцкіх. А так сама стацьця аб патрэбе нам прыняць іншыя нац. колеры, значыцца адкінуць бела-чарвона-белы, які мяшаюць з нéпрыяцельскім польскім і прыняць іншыя.

Ці дасталі Вы мой ліст з расьпіскаю? Як Вам пісаць на Вітаўта 30 ці 10?

Кандыдата ў Амэрыку знайшоў пакуль што толькі аднага, але вельмі добрага. Гэта Уладыслаў Грыневіч, чалавек, які можа ўсестаронна працаваць у Амэрыцы (навет пісаць у газэты, гэта яга апавяданьне «паміж двух агнёў» у «Бел. Студэнце», цяпер ён напісаў повесьць «За што?»). Грыневіч студэнт-хімік. Ён згаджаецца страціць у Амэрыцы 1-2 гады унівэрсытэцкіх студый, але затое навучыцца англіцкую мову і будзе чалавекам культурным. Праўда ён каталік, але-ж аднага з каталікоў туды можна паслаць як відаць з Вашага лісту. Аб іншых кандыдатах ціха даведаваюся.

Мне было-б пажадана, каб мова маіх пісанін рэдакцыяй не папраўлялася. Але, калі Рэдакцыя ня будзе згаджацца з маёю моваю, дык маглаб зрабіць «агаворку», што за маю мову яна не адказуе.

Выбачайце за такі неэстэтычны ліст і аставайцеся здаровы.

Ваш Я.Станкевіч.

Прага 4 ліпня 1923 г.

P.S. У Празе зьявілася адозва Амэр. Бел. Камітэту да Амэр. Бел., у якой камітэт гукае бел. амэрыканцаў даваць грошы на бел. працу і паміж іншым кажа, што ў Беларусі пад Польшчаю арганізуецца патайная бел. армія, ёсьць штаб яе там і г.п. Думаю, што падобныя паперы ня трэ' было-б даваць паляком у рукі, тым балей, што ўсё гэта няпраўда. Трэба весьці бел. прапаганду неяк інакш. Ці ня можна было-б на амэр. камітэт зрабіць у гэтым сэнсе ўплыву?

582.1.49:190&r-191

[1] Артыкул надрукаваны ў: Крывіч. №2. 07.1923. С.28-35.

3406. Ліст Ігнаса Янінаса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.07.1923 у справе разьліку з Бакам за выданьне беларускіх казак

582.1.49:159

3407. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.07.1923

5.ІЮЛ.1923
KONSTATIN JEZOVITOV
LATVIJA, LATGALE, LUDZE.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

сёнека атрымаў адразу два ліста Вашых: адзін з Дзьвінску, а другі з Коўны.

Дзякую за запросіны[1].

Колькі буду мець час, — пастараюся даваць такі-сякі матар'ял.

Ці будуць у Вас клішэ?

Пасылаю Вам пачку газэтаў і рожныя абвесткі.

Дужа буду задаволены, калі зьмесьціце на абложцы, ці дзе ў іншым мейсцу абвестку а 2-й Гімназыі.

Калі ў Вас прэдугледжаны пэдагагічны аддзел, дык можна туды зьмесьціць інфармацыі аб тым, як пабудавана школа у Латвіі (І частка). Напісана ў мяне тамака дужа элементарна, бо назначалася для вёскі, ну а Вы перарабіце (калі-ж у №1 ужо не пападзе, дык напішыце, — я перарабіць змагу сам).

Што [да] перасылкі, дык я магу паспрабаваць паслаць некалькімі партыямі журнал у Вільню і Варшаву.

Думаю, што дойдзе.

Толькі вот наконта грошэй — адказнасьці на сябе узяць не магу, бо Вільня прывыкла болей атрымліваць, чым выплачываць.

Калі-б гэта трошку раней, дык можна-б было зрабіць пераучот, бо мы былі вінны Вільні, а Вільня Вам, дык Вы маглі-б атрымаць грошы ад нас, а мы паслалі б у Вільню замест грошы Вашы распіскі.

Прысылаць сюды трэба экзампляраў з 10, за якія я асабіста змагу грошы сабраць, а калі аб гэтым ня дужа ходзіць, дык прысылайце яшчэ 10 для раздачы вучням (вучнеўская Грамада будзе падсылаць і матар'ял і, часам, ахвяры).

Зусім зразумела, што пажадана б было атрымліваць куды больш, але я баюся у Вас прасіць, каб потым не было на мяне незадаваленьня.

Справа ў тым, што наш тутэйшы рух знайходзіцца тутака, раўнуючы да Вільні, у стане 1907 году (з боку народнае неусьведамленнасьці і «нераскачаннасьці», ну а з боку констытуцыйна-праўнага і інтэллігентска-ініцыатыўнага — сусім іншае: калі-б нашыя магчымасьці, ды ў Віленшчыну, ці наагул у большы тэррыторыяльны маштаб, дык ўсё выглядала-б зусім добра) і патрабуе безграшовых навін, інфармацыяў, газэт і кніжак.

Рух тутака яшчэ толькі «прыемлецца» і «выслухоўваецца», а ад гэтага да шырокай зацікаўленнасьці і да «самаахвярнасьці» яшчэ дужа далека (ніяк ня меней чатырох-пяці гадоў пешага ходу).

Шчыра жадаю Вам удачы

З пашанай К.Езавітаў

582.1.49:160&r

[1] Да супрацоўніцтва ў «Крывічы».

3408. Прыпіска Вацлава Ластоўскага на запросінах на сход Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў 7.07.1923 (Коўна)

Пасьля таго як Старшыня загранічнай групы Б.П.С-Р. грамадзянін Карабач, выстауляе сваю кандыдатуру у Сойм на адным лісьце з грамадзянінам Вяроукіным і зн[а]йшоў магчымым у выбарах у гэты Сойм падпіраць кандыдатуру Ерына іменем Бел. Сел. Рады, я асабіста, да часу, пакуль Ковенскую групу с-р. будуць прэдстауляць палітычна невядомыя людзі ад сумесных сабраньняу адмауляюся. Зрэшта мне вядома, што у

Празе існуе другая група мяняючая сябе «Камітэтам Загранічнае групы Партыі С-Р.», якая прадстауляе Загранічную групу Б.П.С-Р. на апошніх міжнародных зьездах.

В.Ластоускі.

P.S. Калі загранічная група Б.П.С-Р. (Пражская) здойме свой пратэст супроць якшаньнеся Ковенскай с.р., у асобе грамадзяніна Карабача, з манархістамі, ня буду мець нічога супроць належаньня да перафармаванай групы.

В.Л.

582.1.44:058 — мк

3409. Пратакол сходу Беларускае Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў (Загранічная група) 7.07.1923 у Коўне

582.1.44:059-061 — мк

Былі прысутныя Л.Заяц, А.Цьвікевіч, Г.Казячы, А.Галавінскі, К.Душэўскі, А.Вальковіч, А.Карабач, Радзюк, В.Пракулевіч і Палікша. Разглядалася справа аб «правакацыі» В.Ластоўскага: створаная камісія ў складзе Карабача, Заяца й Цьвікевіча.

3410. Заява Аляксандра Карабача Камітэту Б.П.С.-Р. за граніцай за 7.07.1923 у сувязі з «правакацыяй» Вацлава Ластоўскага супраць яго

582.1.44:063 — мк

3411. Ліст Кляўдыюша Душэўскага (Коўна) Станіславе Ластоўскай (Бэрлін) за 7.07.1923

7.VII.1923.

Вельмі Паважаная Пані Станіслава.

Выбачайце, Панічка, што я толькі цяпер змог Вам успомніць аб сваім істненьні, але ведаеце, навін у нас не шмат. Вацлаў піша, піша і зноў піша. Я вярчуся, так сама памаленьку. «Крывіч» выйдзе з друку ма быць у гэтых днях. Журнал, апошнімі днямі займаў увесь час як мой, так і Вацлава. Ні з кім не прыходзілася за гэты час ні бачыцца, ні гаварыць, ні павесяліцца. Не лішне добрыя адносіны і паміж усімі беларусамі. Ідуць сваркі патрэбныя і непатрэбныя. У некаторых з беларусоў есьць новыя «idee fixe». Прыкладам Ал. Ів. Цьвікевіч зьбіраецца як ён кажа: «хоронить Ластоўскага па першаму разраду». Дзіўны ён усе-ж такі чалавек. Я думаў што ён больш паважны. Але кінем аб гэтым. Нудна. Вы бы хоць асьвяжылі нашы голавы якімі небудзь прыемнымі і цікавымі весткамі з Вялікага Бэрліну. Толькі барані Божа не палітычнымі. Дайце хоць на адну хвіліну забыцца аб істненьні гэтай галіны жыцьця чалавечага.

Напішыце, Панічка, хоць пару слоў, а тады я Вам напішу вялікае, вялікае пісьмо.

Пакуль што бывайце здаровінькі

З пашанай К.Душ...

582.1.49:161&r

3412. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.07.1923

Вельміпаважаны Пане Ластоўскі!

Дастаў ліст Ваш з 30.VI і К.Душэўскага з 29.VI. Пастараюся адказаць на абодвы лісты гэтым адным, бо цяжка з паштовымі маркамі. Дзеля гэтага прашу выбачэньня ў Душэўскага, што ня пішу яму асобнага ліста, а Вы дайце яму прачытаць гэты ліст.

Дык адказаваю на ўсе справы абодвух лістоў.

1. Згаджаюся, што трэба зьехацца й пагутарыць, але дзе? Мне найляпей было-б, каб зьехаліся ў Чэхаславаччыне, бо трэба шмат страціць часу, каб дастаць чэскі загранічны пашпарт. А тымчасам я сёлета ўвосень маю поўгаспадарсьцьвены екзамен, дык ня мог-бы прыняць учасьце ў зьеханьні не ў Чэха-Славаччыне. Думаю, што дзеля такое нарады шмат людзей не патрэбна, але важна, каб гэта былі людзі шчырага беларускага сэрца й працы. З Ант. Навіной угледзіцца ня шкодзіла-б. Але добра было-б, каб яшчэ хто быў з зах. Беларусі апрача А.Навіны[1], прыкл<адам> Тарас[2], ці кс. А.Станкевіч. А.Навіна пры ўсёй сваёй палітычнай навытараннасьці мае адну загану — гэта заўзятасьць увадносінах да асоб. Не хачу гэтым сказаць, што ён цяпер што-небудзь мае проці В.Ласт. ці кага іншага, бо ведаю, што гэтага няма, але думаю, што было-б карысьней, каб апрача А.Н. быў яшчэ чалавек крыху іншага складу.

Карысьць з гэткіх угледзін і зьеханьня была-б бяссумлеву.

«Крывіча» ў Празе я магу ўзяцца прадаваць. Але тут яга шмат ня купяць. Але ўсё-ж ткі прадаваць трэба. Дык на першы раз прышлеце дваццаць (20) экз. а потым будзем глядзець ці павялічыць ці зьменшыць гэтую лічбу. Каб не дэморалізаваць, нікому з праскіх Беларусоў дарма журналу пасылаць ня трэба, а толькі адзін экз. «Бел. Ст.» і адзін Вяршыніну.

З Прагі у заходнюю Беларусь я магу паслаць колькі трэба №№ «Крывіча», аднак зварочую Вашую ўвагу, што з Прагі дорага стоіць перасылка поштаю. Прыкладам паслаць з Прагі за граніцу Чэха-Сл. рэспублікі адзін экз. «Бел. Ст.» стоіць 1 (адну) чэс. карону. Дзеля гэтага калі-б Вы малі пеўных людзей у Нямеччыне або ў Аўстрыі, дык танней абышлося-б, каб яны паслалі.

Вельмі добра Вы кажаце, што канечна патрэбна ў зах. Беларусі апазіцыйная да палякоў беларуская група, якая адначасна ня лезла-б у горла (а мо і яшчэ куды) маскоўскай гідры. Аб гэтай патрэбе я кажу двум нашым студэнтам Аляксандру Сасноўскаму і Улад. Грыневічу, якія маюць магчымасьць зьезьдзіць на лета дамоў. Думаю, што зьеханьне (аб якім гутарка вышэй) палажыла-б пачатак гэткай групе. Спадзяюся, што гэткую групу стварыць удасца.

Да Чарапука напішу. Але прасіў-бы, каб Вы ў лісьце да яга закінулі за мяне слаўцо, бо інакш з майга пісаньня карысьці мусіць будзе мала. Пеўне яму Грыб з Мамонькаю мяне апісалі вельмі чорнаю хварбаю. Мамоньку з украінскае Гаспадарскае акадэміі за скандалы выдаляюць і ён, кажуць, хоча паехаць у Амэрыку. Дурны будзе Чарапук, калі прышле яму грошы на дарогу, бо ён там толькі шкодзіў-бы справе.

Ці кс. Цікота ўзноў паехаў у Амэрыку?

Заўтра дасьць друкарня каштапісь (смету) на 16 стр. друку фармату «Нашае Нівы» (думаю, што «Н.Н.» таго часу, калі яна мела фармат кніжны, а не газэтны), дык я заўтра Вам аб гэтым напішу ў асобным лісьце.

Паслаў Вам ліст і вялікую стацьцю ў №2 «Крывіча»[3] праз студэнтку ліцьвінку Бубенас.

«Абсурд» (Аб'яднаньне паступовага беларускага студэнства) фактычна ўжо рассыпалася. Ё небясьпечнасьць, што маскалюючая яе часьць можа перайсьці да Маскалёў.

Грыб едзе ў Лацьвію (калі дастане візу латыскую) і па дарозе мае заехацца ў Коўню.

Студэнт В.Грышкевіч, сьвядомы але дурны й неразьвіты Беларус, дастаў загранічны пашпарт у Літву, але пакуль што яму не дае літоўскі консул візы. Дык Грышкевіч даў у Коўню ў гэтай справе тэлеграму. Мне здаецца, што Грышкевіча пасылае ў Коўню Грыб, каб ён (Грышкевіч) быў яга там «вокам і вухам».

Едзе ў Коўню і Я.Ермачэнка, але ён справе не павінен пашкодзіць. Добра было-б, каб у Коўні Вы Ермачэнку як належыць орыентавалі ў сітуацыі, бо гэта чалавек, які ўмее працаваць. Бальшавікоў ён ненавідзіць.

Заўтра пагутару з аўтарам «Людзкога» Левам Леўскім (Мазалеўскім).

Аставайцеся здаровы

ЯСтанкевіч.

Прачытаўшы яшчэ раз Ваш ліст, я ўбачыў, што Вы хочаце ў Амэрыку дзеячоў, а ня звычайных рабачаёў у беларускім руху. З гэтым справа цяжэйшая, бо добрых дзеячоў, якія маглі-б паехаць у Амэрыку цяжка знайсьці. Гэткіх-жа дзеячоў, як Карабач або Казячы ня можна пасылаць. У Амэрыку патрэбны такія людзі, каб яны там маглі рабіць усе бел. работы: арганізаваць, чытаць лекцыі, быць аратарамі, арганізатарамі тэатру, публіцыстамі. Але гэткіх цяжка знайсьці. Мне здаецца, што калі няма дзеячоў, дык можна было-б паслаць людзей пеўных сьвядомых нацыяналістых, такіх, з якіх-бы пеўне вырабіліся дзеячы.

Дык калі ласка адпішэце, якія маюць быць гэта людзі.

ЯСт...

582.1.49:162&r-166&r

[1] А.Луцкевіча. [2] Б.Тарашкевіч. [3] «Аб беларусах-лаціньніках».

3413. Ліст Янкі Чарапука (Чыкага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.07.1923

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАМІТЭТ У ІЛЛЫНОЙС
Whiterussian National Committee of Illinois
1632 N. Robey Street

«У БАРАДЗЬБЕ ЗДАБУДЗЕМО
ЗЕМЛЮ, ВОЛЮ, ВОЛЬНУЮ БЕЛАРУСЬ».

CHICAGO, ILL., 9 ліпня 1923

Паважаны і Дарагі дзядзька Вацлаў:

Забудзем мінуўшчыну і аб ей ня будземо нават і ўспамінаць. Падамо руку згоды і далей станем тымі прыяцелямі, якімі мы былі ад часу першага

знаемства і ў працы, аж да майго ад'езду ў Амэрыку. Вы знаеце, якім я быў праз ўвесь час з Вамі і пры Вас у супольнай палітычнай працы. Аб гэтым ня буду ўспамінаць, бо кожны з нас, калі загляне ў успамін прыпомніць. Цяпер падзелюся з Вамі тым, што ёсьць у мяне тут. Прыезд мой ў Амэрыку адбыўся пры самых цяжкіх варунках. Выяхаў з Коўны без нямецкай маркі, а хто, калі ня я аддаваў ня толькі урадовыя, но і сваі асабістыя грошы, каб устанавіць добрые адносіны з іншымі пасольствамі і з ўплывовымі чыноўнікамі Літвы.

Мае становішчо зноў ў Амэрыцы было адным з самых страшэнных з'явішч у маём маладом жыцьцю. Ўсе аддаваў, ня для сямейных спраў, ня для асабістых выгад, а пасьвеціў на Вялікую Справу Вызваленьня Беларусі з ярма польскага і маскоўскага. І дзеля гэтага пастанавіў нават парваць тое, што было і дарагое для сэрца т-е. асвабадзіць і самога сябе ад сувязі... сямейнай масковіі. Паступіў добра! Праз такое становішчо падняў сьцяг Беларусі у шырокім маштабе на зямлі Вашынгтона. Як ужо самые ведаеце чужаземная прэсса загаварыла аб беларускай справе, поўсталі і самые беларусы. Бэзумоўна ўсе маладое, але калі яно поўстало, дык будзе жыць, але патрэбные новые людзі, з новай энэргіяй, якіе павелі бы справу далей. Справедліво пра мяне напісалі галічане «што аднаму дужа цяжко працаваць на ніве, якая нікім ўперад ня была гарана». Першая баразна ужо згорана беларускім плугам, патрэбны людзі якіе павінны дакончыць са мною, альбо і бяз мяне. Таму я зьвярнуўся да галічан с по[м?]ачай. Яны абецалі мне выпісаць 4[х] челавек, гэтымі днямі я напісаў да іх ліст з просьбай каб далі часова магчымасьць аднаму прыехаць, другога зможамо ужо на свой кошт. Усероўна у самым хуткім часе пастараемося і рэшту выпісаць. Чаму я так руплюся? Я віджу патрэбнасьць у стварэньню ў Амэрыцы паважнага грамадзка-палітычнага цэнтру, які бэзумоўна у справах міжнарадовых і на Бацькоўшчыне фінансова і палітычна дапаможэ у змаганьню за вызваленьне Беларусі. Вялікая шкада, што Вы вышлі з Ураду. Я думаю, але мажліва мыляюся, што у сучасны момэнт ніхто ня будзе паважна лічыцца з Цэнтрам у Коўне. Амэрыканские беларусы будуць толькі дапамагаць арганізацыям на Бацькоўшчыне. Зразу мы думалі рабіць ўсе праз Коўну, але цяпер там стварылося становішчо, якое дыктуе новую праграму дзейнасьці. Наогул мы будземо чакаць весткі аб тым, як там ўсе уладзіцца... Сам я хутка варочацца на Бацькоўшчыну ня думаю, негледзючы што здароўе страшэнна пагоршылося. Недаўна быў такі выпадак, калі гаварыў прамову раптам кроў пайшла праз горло і мяне замлеўшага вынеслі. Тыдзень таму назад адбылася апэрацыя горла (выціналі грыголы) у працягу 3[х] месяцаў забароняно дактарамі выступаць з прамовамі. Надзвычайна цяжка перанасіць амэрыканскую жару, прыбыўшым з Еўропы. У працягу чэрвеня ад жары памёрло 43 чэлавекі. Мне вельмі пажадана мець весткі аб арганізацыях на Бацькоўшчыне, якія заслуговываюць давера — з якімі можна было бы знасіцца. Ці маеце Вы пэўные зносіны праз Коўну з Вільняй — куды можна было бы перасылаць даляры??

Дужа буду Вам ўдзячны за газэту. Карэспандэнцыю вышлю Вам гэтымі днямі. Пажадана мець Ваш адрэс. У другом лісьце напішу болей падробна.

Ваш Ячарапук
Mr. John Charapook
1041 N. Wood Str.
Chicago, ILL.
U.S.A.
582.1.49:168&r-169

3414. Білет-запрашэньне на Вялікі пікнік Беларускага Камітэту ў штаце Іліной, які мае адбыцца 19.08.1923, дасланы Янкам Чарапуком у лісьце за 9.07.1923
582.1.49:167

3415. Выпіска з пратаколу сходу Беларускае Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў (Загранічная група) 7.07.1923 у Коўне, дасланая Вацлаву Ластоўскаму
582.1.44:062 — мк

3416. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.07.1923

11.VII.1923

Вельміпаважаны Пане Ластоўскі,

дапісаваю тут тое, чага не напісаў у пярэдніх лістох.

Яшчэ «Крывіча» я не дастаў і ніхто ў Празе не дастаў.

Вельмі патрэбна дзеля прапаганды беларускае справы літэратура аб Беларусі у нямецкай, францускай або англіцкай мовах. Дзеля гэтага калі маеце ў Коўні, дык вельмі прашу прыслаць мне ў спомненых мовах а так сама і ў роднай мове «Асновы Дзяржаўнасьці Беларусі» Даўнар-Запольскага і кніжку аб Беларусі надрукаваную здаецца ў 19 г. ў Бэрліне панямецку[1].

З літэратуры ня дзеля прапаганды палітычнае прышлеце калі ласка «Сьпевака Блондэля»[2].

ЯСтан...

582.1.49:170

[1] Jäger Walter. Weißruthenien: Land, Bewohner, Geschichte, Volkswirtschaft, Kultur, Dichtung. Berlin, K.Curtius, 1919. [2] Сьпявак Блёндэль. Англійская легенда / Пер. Власт. Коўна, Выдавецтва Міністэрства Беларускіх Спраў, 1922.

3417. Адозва старшыні Рады БНР Пятра Крэчэўскага за 12.07.1923 да сяброў Рады БНР і да ўсіх беларускіх арганізацыяў

АДОЗВА

Сябрам Рады Беларускай Народнай Рэспублікі і усім беларускім арганізацыям.

Падзел Беларусі Рыжскім трактатам, анэксыя яе усходняе часьці Масквой, а заходняй — Варшавай, здзек над беларускім нацыянальным адраджэньнем у форме стварэньня гаспадарча нежыцьцёвай Савецкай Беларусі з шасьці паветау, урэшці — безпраўнае, перэчачае самаакрэсьляньню народаў, замацаваньне падзелу нашае Бацькаушчыны Конфэрэнцыяй паслоў Антанты актам 14 сакавіка г.г.[1] — усе гэто ставіць акрэсьляна мяжу у поступах барадзьбы Беларускаго Народу за свае вызваленьне і патрабуець надзвычайнай цьвердасьці і пэўнасьці у працы ад усіх сьвядомых яго сыноу.

Неабходна срога прааналізаваць варункі барацьбы у сучасны момант і яскрава зазначыць сваю праграму і тактыку на будучыну.

Як Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, я сьцьверджаю што асновы нашаго нацыянальна-дзержаўнаго і соцыальнаго будаўніцтва і у гэтую цяжкую хвіліну застаюцца нязьменнымі і згоднымі з волей Усебеларускаго Зьезду, у свой час выяуленай у Устауных Граматах 21 лютаго і 9 Сакавіка і у Устауной Грамаце Рады Рэспублікі 25 сакавіка 1918 года.

Абавязак Сяброу Рады захаваць вернасьць воле Народу і яго пастановам.

Скрываулены і абязсілены у барацьбе з акупантамі за свае вызваленьне Беларускі Народ патрэбуе і ад Вас, сябры Рады, такіх самых ахвяр, якія кладзе і сам. На Вас як прэдстаўніках Народу у гэты цяжкі час ляжыць самая адказная і ганаровая роля — арганізавана скіраваць вызвольную барацьбу у русло дзержаунасьці згодна волі народу і нашай конституцыі.

Побач з Вамі пойдуць нацыянальныя і культурныя арганізацыі і усе сьвядомыя беларускія сілы, згуртаваныя каля Рады Беларускай Народнай Рэспублікі і яе праўнаго Ураду.

Німа той сілы, якая магла бы спыніць гістарычны бег Беларускага Адраджэньня. Жорсткая несправядлівасьць Эуропы, злостная дыскрэдытацыя беларускаго руху ворагамі, пагарда і зьдзек суседзяу — нішто не павінна спыняць нашае працы у справе зьдзейсьненьня Незалежнасьці. На усе перашкоды адкажам падвойнай энэргіяй. Трупы рас[т]рэляных і загінуушых у барацьбе няхай будуць для нас прыкладам і залогам таго, што іх жыцце не прапала дарэмна. Нашы браты і сестры, раскіданыя па турмах нашых ворагау няхай пачуюць ад нас радасны крык вызваленьня. Абернем зьдзек над нашым нацыянальным правам, прыкладам чаго быу нядауні Беластоцкі суд[2] — у слезы і праклены саміх судзьяу.

Справядлівага і спакойнаго вырашэньня нашаго пытаньня мы ні ад кого не дачакаемся. Патрэбны уласныя сілы і уласная нязломная воля у дасягненьні пастаулянай мэты.

Я чэкаю ад Вас, сябры Рады, і усіх грамадзкіх арганізацый бэзупыннай і самай упартай працы на карысьць Роднаго Краю.

Раскіданыя усюды і стогнучыя пад чужым ярмом мы усе ж такі творым адзінае цела духа і волі.

Я пераконаны што нашы надзеі хутко зьдзейсняцца і заклікаю усіх на барацьбу за зьдзейсненьня нашых ідэалау.

Няхай жыве вольны Беларускі Народ!

Няхай жыве Беларуская Народная Рэспубліка!

Слава палеглым у барацьбе!
Чэсьць і перамога боручымся!

ПКрэчэускі
Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

12 ліпеня 1923 г.
582.1.04:068&r — мк

[1] Аб прызнаньні ўсходніх межаў Польшчы. [2] Працэс 45-ці над беларускімі паўстанцамі адбыўся ў траўні 1923 году ў Беластоцкім акруговым судзе.

3418. Адказ Вацлава Ластоўскага Камітэту Б.П.С.-Р. за граніцай за 12.07.1923 у сувязі з заявай Аляксандра Карабача і рэзалюцыяй сходу 7.07.1923

Тав. Л.Зайцу.

У адповедзь на Вашу цедулу, пісаную ад імя Загр. Гр. П.С-Р. ад 10 ліпеня 1923 г. даю сваю, згодна Вашаму жаданьню, адповедзь на пісьме.

I. Датычна сямех пунктау у якіх апраудываецца Карабач.

1. Няпрауда, што аб выступленьнях Карабача «не было нават гутаркі». Пасьля першага яго выступленьня на адным спіску з Вяроукіным, па усім горадзе Коуне былі публікаткі высьмеваючыя яго нетактычны крок, акром гэтага былі заметкі у газетах. Гаварылося многа і між беларускім грамадзянствам і я, у гэтай справе, меу нагоду многа раз і перад многімі людзьмі высказывацца, апраудываючы Карабача, як чалавека непрактычнага. Пасьля першага выступленьня, я, другое яго выступленьне станоуча асуджау, бо ен пайшоу на выбары, у гэты, другі (селетні) Сойм, наперакор большасьці, лічыушай што ісьці на выбары, без надзеі правесьці свайго кандыдата нельга, што мы ніякім чынам ня можам беларускімі галасамі падпіраць расійскіх і польскіх кандыдатау і што блекаваньнеся з палякамі компромітуе беларускую справу. Не глядзя на усе гэты довады, Карабач ад імені Селянскага Саюзу прыняу учасьце у выбарах. Пасьля гэтага, другога, выступленьня, я ужо ня мог паступак Карабача тлумачыць палітычнай ня вырабленнасьцю «памылкай» і для мяне яго палітычнае «с[redo]» стала пад знакам запытаньня, ен стауся для мяне «невядомым палітычна».

2. Пункт другі гаворыць бытцым Карабач адмауляуся ад выстауленьня кандыдатуры і толькі яго «прымусілі» быушыя у Коуне партыйныя таварышы, а галоуным чынам я, як галава Ураду. Аб выступленьнях партыйных таварышоу пастанауляюць не Урады, а партыйныя Камітэты і Сходы. Магчыма, што якісь «партыйны» сход прымусіу Карабача выставіць яго кандыдатуру у Сойм, але я на такім сходзе ня быу і дагэтуль аб ім нічога ня ведаю. Цікава было-б азнаеміцца з пастановамі такога сходу. Як галава Ураду я, запрауды, на прынцыповае пытаньне Карабача «ісьці» беларусам на выбары у Сойм, ці не? Дау яму прынципова адповедзь у тым сенсе, што, калі есьць магчымасьць правесьці свой спісак, то ісьці. Але гэта не значыць, што я дау «дазваленьне» Карабачу выступаць па аднаму сьпіску з Вяроукіным.

3. Ластоускі здауна вядзе дружбу з Душэускім і гэта яго прыватная справа. Але Душэускі і сам ведае, якая была вялікая памылка, што ен згодзіуся паставіць сваю кандыдатуру побач Вяроукіна, — і чэсна гэта прызнае. Памыляцца-ж кожды можа і памылкі не ганьбяць чалавека, калі ен іх усьвядамляе і імкнецца паправіць.

4. Так, пры мне адбыліся выбары Карабача на Старшыню Загр. Груп. Б.П.С-Р. і я падаваў свой голас за яго. Гэта даводзіць, што я тады верыу у тое, што Карабач можа быць здольным кіраваць Загр. Групай, цяпер у мяне гэтай веры няма. Веру гэту забіла яго нявыразнае паступаньне.

5. У надзеі, што Карабач патрапіць наладзіць беларускую грамадзка-агітацыйную працу праз Мін. Бел. Спрау, справа гэта абгаварывалася у Дзярж. Калегіі Б.Н.Р. і пастановай (5 галасоу Дзярж. Калегіі + участваваўшый пры гэтым сам Карабач), у якой я карыстауся роуным з усімі голасам без ніякае перавагі, рэкомандавалася Карабачу узяць працу у Міністэрстве Бел. Спрау у Літве. Што да культурнай працы, аб якой Карабач можа з такой самай компэтэнцыей гаварыць, як і аб каналізацыйных работах на Марсе, есьць запісь у пастановах Дзярж. Калегіі за подпісамі усіх, а не маей аднэй, а, знача, і на пастанову прыпыніць «культурную працу[»] Карабача, я меу уплыу у 1/5 часьці ні болей, ні менеі.

6. Я магу нясьці адказнасьць толькі за свае, а не чужыя паступкі.

7. Я узяуся за культурную працу прты Міністэрстве спачатку па пастанове усей Дзярж. Калегіі, як Старшыня Культурна-Асьветнай Камісыі. Пасьля выхаду з Ураду, шукау працы на пражыцьце у тым самым Мін. Бел. Спрау, гдзе працуе і грам. Карабач. Чаму Карабач і др. таварышы працуючы у Міністэрстве не ламаюць «фронту», а я бяручы работу ламаю? Зрэшта апошнія месяцы бытнасьці маей у Урадзе, кіраунічую ролю меу не я, а грам. Цьвікевіч, які плянова веу работу, кіруючыся да заняць становішча Старшыні у Урадзе (якому я урэшце і уступіу, выходзячы з Ураду) і так звана «агульны фронт» які адным вуглом націскау на мяне, усецэла яго ініцыятыва, помысл і інструмант, хто у гэтай акцыі разчараваўся, той і павінен прэтэнсыі свае зварачваць па належнаму адрэсу, а не да мяне.

II. П а п о в а д у р э з о л ю ц ы і .

Ці-ж высказаньне агульна вядомых прауд правокуе Камітэт Загр. Гр. П.С-Р.? Ці-ж Камітэту не вядома, што у Празе істнуе другі Загр. К-т Б.П.С-Р. у ліку якога знаходзяцца засноуцы партыі і яго датыхчасовыя ідэолегі, якія выступаюць на міжнародных сацыялістычных зьездах і вінавацяць сяброу Ковенскай группы Б.С-Р. у «якшаньніся з монархістамі» нават у друку? Усе гэта вядома, то якім-жа грамадзкім і моральным правам К-т піша у сваей рэзолюцыі аб маей «спробе спровакаваць палітычна К-т»?

III. Што да Камісыі выбранай разгледзіць інцындэнт.

Дзеля таго, што у склад камісыі уходзяць сябры Ураду, якія здауна мяне падтачывалі і, нідауна, спаміж якіх адзін (А.Цьвікевіч) пахваляуся,

што ен зьбіраецца «хараніць Ластоускага по первому разряду», я лічу, што безстароннага суда у памяненым складзе Камісыя вынесьці ня можа. Маючы-ж абразу са стараны Карабача і у рэзолюцыі, са стараны К-ту, я трэбую трэцейскага суда і прапаную у склад суда т.т. Кайрыса (літ.с-д.), Янушкевіча (літ.с-р.) і Кагана (р.С-Р.). Бо ад стараны з якой ідуць нагрожкі і нападкі, я безстароннасьці і прауды не спадзяюся, веры да яе не маю і на яе суд не згаджаюся.

Падпісау В.Ластоускі.

582.1.44:064-065 — мк

3419. Запіска Вацлава Ластоўскага (Коўна) Кляўдыюшу Душэўскаму (Коўна) і адказ К.Душэўскага за 13.07.1923

Даражэнькі

Памажы, хоць крыху рабіць экспэдыцыю. Я прост фізычна не магу справіцца, а журнал надрукаваны ляжыць каторы ужо дзень. Ты заўчора абецаў, учора абецаў прыйсьці памагаць і ўчора прышоў толькі вечарам, а сягоньня хіба ізноў вечарам толькі прыдзеш. Мне аднаму і пісаць, і карэктаваць рукапісы і блізка ня ўвесь друк, бегаць у друкарню, запрагаць сваю жонку да помачы — поцяжка. Ты павінен узяць палавіну работы на сябе.

ВЛаст...

Заўсёды магчымы гэткія рэчы і нападкі калі няма арганізаванасьці. Дзеля гэтага лічу неабходным. 1. Пунктуальна акрэсьліць якая работа на кім ляжыць 2. Хто за што у першы чарод зьяўляецца адпаведным. 3. Павінны быць хоць прыблізна вызначаны дні і гадзіны на работу, патрэбуючую супольнай працы. Інакш будзе вечная навязка у рабоце, трата часу на хаджэньне адзін да другога і несмак.

На сколькі я уцяміў, выданьне журналу патрэбуе:

1. Пісаньне аддзелу I (або падбор матэрьялаў)
2. " " II
3. " " III
4. " " IV
5. Рэдакцыя " I
6. " " II
7. " " III
8. " " IV
9. Здача матэрьялаў у друкарню і усе перагаворы з друкарняй
10. Карэктура
11. Экспэдыцыя
12. Здача на камісыю
13. Скарбніцтва
14. Рахунковасьць
15. Зносіны з падпішчыкамі
16. " " пісьменьнікамі
17. " " гандлевымі агентурамі
18. Зносіны з Літвінамі
19. Унутраны распарадак

Лічу патрэбным, знача, каб кожды з нас узяў на сябе роўны, па рабоце, лік працы і пільнаваў у першы чарод гэту працу. Пэўнеж есьць работа і сумесная, таксама трэба і дапамагаць адзін другому і у працы безпасарэдна да яго недатычачай.

Калі гэта ня будзе праведзена у жыцьце, то магчымы заўсёды непрыемнасьці.

Кляудуш.

582.1.49:171&r

3420. Выпіска з пратаколу сходу Беларускае Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў (Загранічная група) 14.07.1923 у Коўне аб выключэньні Вацлава Ластоўскага й Кляўдыюша Душэўскага з Загранічнай групы БПСР у Літве

582.1.44:081&r — рк

3421. Квіток аплаты за тавар, куплены Ластоўскім у фірме «Danzig-Rumänische Bank u. Handelsgesellschaft m. b. H.» за 1.175.000 марак 17.07.1923

582.1.49:175

3422. Нататкі Вацлава Ластоўскага на аркушы паперы

калі ехаць і куды
аб хлопцах
адбітка
казкі
амэрыка
перапіска на маш
слоўнік

Гн. Ласт есть? — Выехал.
Заяц.
Латв. паслу: Л. служыць у нас.
Янінас выступіў не па сваей волі

582.1.49:176

Дата невядомая.

3423. Тэлеграма «Якубоўскага» [Вацлава Ластоўскага?] (Данцыг) «Езукевічу» [Адаму Станкевічу?] (Вільня) за 1?.07.1923

jezukiewicz
Kosciol swientego Mikolaja
Wilno
Dla Cikoty Stop
Dotychczas niedostalem obiecanej oplaty za renkopis geografji[1]. Czekam natychmiastowego wyslania Kirschbaum Brotbaenkerstr Nummer elf Danzig
Jakubowski

582.1.49:177 — рк

Дакладная дата невядомая. [1] Гэты паўтараны ў наступных дакумэнтах крыптаграфічны тэрмін застаецца неразгаданым.

3424. Тэлеграма «Якубоўскага» [Вацлава Ластоўскага?] (Данцыг) «Езукевічу» [Адаму Станкевічу?] (Вільня) за 1?.07.1923

jezukiewicz
Kosciol swientego Mikolaja
Wilno
Dla Cikoty Stop Kiedy bendzie wyslany renkopis geografji telegrafujcie Kirschbaum Pfefferstadt 78 Danzig Stop
Jakubowski
582.1.49:178 — мк

Дакладная дата невядомая.

3425. Тэлеграма «Цэкоўскага» [Андрэя Цікоты?] (Вільня) «Якубоўскаму» [Вацлаву Ластоўскаму?] (Данцыг) за 18.07.1923

jakubowski kirszbaum
brotbaenkergasse 11 gdansk

190/18 wilno 5394 15/14 18/7 11 30
=podrecznik geografji jeszcze nie skonczony przekazalem go innym
= cekowski + vgl jakubowski kirszbaum 11 +
582.1.49:174

3426. Квіток уплаты за пражываньне ў гатэлі «Deutscher Hof» (Данцыг, Pfefferstadt 78) 16-19.07.1923

582.1.49:173

3427. Паведамленьне Камітэту Загранічнай групы БПСР (у Літве) Вацлаву Ластоўскаму за 20.07.1923 аб пастанове агульнага сходу 14.07.1923 выключыць яго зь ліку сяброў групы

582.1.44:066 — мк

3428. Справаздача Вацлава Ластоўскага з авансу на паездку ў Данцыг 14-20.07.1923

Справаздача з авансу на паездку у Данцыг ад 14.VII да 20.VII 1923 году

Атрымаў авансам ад п. выпаўняючага абавязкі Міністра Беларускіх Спраў долараў 15.-

Усяго Доляр. 15.-

Пятнадцаць долараў. ВЛастоўскі

5 долараў зьмяніў у Эйдкунен а 150.000 —	750.000
5 " " у Данцыгу а 180.000	900.000
Разам	1650.000

Выдаў:

Білет да Кенігсбэрга	50.000
Начаваньне у Кенігсбэргу	60.000
Білет да Марьенбурга	80.000
Начаваньне у Марьенбургу	40.000
Білет параходам да Данц.	30.000

Звозчык з вагзала	30.000
Звозчык у справах	30.000
Гасьцінніца у Данцыгу	240.000
Білет да Кенігсбэрга	100.000
Готэль у Кенігсбэргу	100.000
Білет да Вірбаліс	50.000
Харчаваньне за ўвесь час	840.000
Усяго мр.	1650.000
Астатак	========
Білет да Эйдкунен	8.00
Абед у Вірбаліс	4.00
Білет да Коўны	8.00
Звозчык	3.00
Літаў	23.00

Усяго выдана 10 долараў і 23 літы
10 долараў = 100 літам + 23 = 123 л.
Атрымаў 15 долараў = 150 літ. – 123 = 27 л.
Дваццаць сем літаў вяртаю пры гэтым

14.X.23. ВЛаст...
582.1.49:172

3429. Ліст Міколы Чарнецкага (Ёзэфаў) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.07.1923

582.1.49:179&r

Пра зацікаўленьне «Крывічом», з крытыкай «Беларускага Студэнта», пра Амэрыку: «[...] Атрымалі «Прызыв» Антона Змагара. Ў Амэрыццы пачалі працаваць людзі, адарваныя сыны рыхтуюцца дапамагчы Бацькаўшчыне ў змаганьні яе з ворагамі і ліхою доляю [...]».

3430. Ліст Пятра Дзехцярова (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 24.07.1923

[...] Я выехаў з Вільні у Літву у пачатку (у красавіку) 1919 ад польск. репрессый и служыў як добраволец (прымаў учасьце ў бойках проціў полякоў) ў літоўск. воіскі да лістапада 1922 г. Усе вышей напісанае можа пасведчыць маіор Ружанцоў. [...]

582.1.49:181&r-182
582.1.49:186 — канвэрт

Пятро Дзехцяроў вучыўся ў Празе на архітэктурным факультэце.

3431. Фатаграфія віншавальнага адрасу Беларускага Сакольскага Гуртка (Прага) Рэнаце Тыршавай за 18.04.1923. Мастак Пятро Дзехцяроў

582.1.49:187

Бацька й муж Рэнаты Тыршавай — Індржых Фюгнэр і Міраслаў Тырша — заснавальнікі чэскага сакольскага руху.

3432. Cyrilo-Method. Věstník Studentský (Příloha Jitra)
[3 артыкулам:] Ferd. K. Rones. My a idea cyrilometodějská.
582.1.49:188

Дата невядомая.

3433. Злічво за надрукаваны матэрыял у №1 «Крывіча» за 25.07.1923

Злічво

За надрукаваны матэрьял ў №1 «Крывіч»
выплачана гонорараў:

За ўступны артыкул 41 р. а 30 цн.		12.30
Вершы В.Ластоўскага 112 р. х 50 "		51.00
Апокрыф М.Богдановіча 74 х 30		22.20
Прыповесьць аб старым мужу 64 х 30		19.20
Аб найменьнях Гуды-Крывічы-Русь		
Лесаўчыкі	750 р. а 30	225.00
Старабеларуская школа		
Беларусь і водка	200 а 30	60.00
Два вайсковых статуты	135 х 30	40.50
Думкі і разважаньні	150 х 30	45.00
Запіскі		
Агляд культ. жыцьця		
Агляд прэссы		
Спад Расіі		
Спад Польшчы		
У Латвіі		
У Літве		
З усіх старон		
Тэрміналёгія		
Бібліографія	1235 р. х 14	172.90
		648.10
	Усяго	~~653.40~~

Шэсцьсот пяцьдзесят тры літы 40 цэнтаў выплачана з атрыманага мной авансу В.Ластоўскі

Коўна
25.VII.1923 г.
582.1.49:183

3434. Злічво выдаткаў рэдакцыі «Крывіча» ад 1.06 да 25.07.1923

Злічво

выдаткаў Рэдакцыі Крывіч ад 1.VI да 25.VII.1923.

1.VI. Па злічву цынкографіі за клішэ	78 12
12.VI " " "	18 00
2.VII За перапіску слоўніка Дарашковай	42.50
3.VII " для Рэдакцыі "	41.50
3.VII Куплена марак для Рэдакцыі	12 10

5.VII Гэрбавы збор і заява		8 40
[...].VII Папера на экспэдыцыю, ножніцы		6 10
23.VII Заплочана Баку за друк №1		1200 00
" " " " за паперу для Рэдакцыі		40 00
10.VII Маркі на экспэдыцыю	Усяго	100 00
		1546 72
		8
		1554 72

200.
1554.72
648 10
2.402.82

У Латвію	60.-	
У Прагу	40-	
У Амэрыку	40-	
Почтай у Літве	64-	
" заграніцу	267-	267
	571.	40
		1,0689

582.1.49:184

3435. Ліст Тамаша Грыба (Радацін каля Прагі) Антону Луцкевічу (Вільня) за 26.07.1923

26.VII.23
Radotín u Prahy
Č. 266.

Паважаны Антон Іванавіч!

Вы магчыма вельмі зьдзівіцеся атрымаўшы ад мяне ліст, тым часам, магу ад усей шчырасьці вас запэўніць, гэта зусім натуральна — пішу бо маю шмат аб чым памяркавацца з вамі, хоць нават проста высказацца ці-то выгаварыцца перад вамі і то, мне так думаецца, шмат лягчэй стала б на сэрцы, бо як-бы там ня было, а вы, Антон Іванавіч, з'яўляецеся адзіным прэдстаўніком таго пакаленьня беларускай адраджэнскай інтэлігэнцыі, якая падняла сьцяг змаганьня за беларускую культурную індывідуальнасьць, за вольную Беларусь, таму, зьвяртаючыся да вас, неяк асабліва пачынае біцца сэрца і з'яўляецца яшчэ большае жаданьне з вамі падзяліцца думкамі, калі кругом пануе безладзьдзе, мана, ашуканства, калі выныраюць на паверх грамадзка-палітычнага ды культурнага жыцьця розныя прайдзісьветы, нівэчуць справу, з сьвятых ідэалаў вольнасьці ды незалежнасьці робяць сабе нейкае рэмясло, сьвяты парыў змаганьня пераварачаюць у самы подлы гандаль, калі розныя дэгэнэраты пачынаюць «выяуляць волю» народную і ў корні падрываюць тую справу, за якую лепшыя сыны народа аддалі сваё жыцьцё: адны ў аткрытым баю, а іншыя за пісьменным сталом. — Так шмат рознага бруду набралася ў беларускім адраджэнскім руху, з тысячы нораў павылазілі, казаў той Ѳ.М.Дастаеўскі, «бесы», разліўся бруд, сталецьцямі сабраны бруд; усплыло напаверх пракляцьце продкаў — подлае хамства, гэтая сьмяротная

пятля на шыі падняволянага народу. Людзі бяз гонару, без пачуцьця пашаны сваей чалавечай асобы, гэтага звычайнага чалавечага пачуцьця, кіруюць справай, хочуць кіраваць, яны нат' думаюць, што кіруюць, а тым часам з'яўляюцца самым звычайнейшым аружжам у чыіхсьці руках, сьляпым аружжам. Распачаўся торг, подлы, праступны торг імям беларуса і канца краю гэтаму ня відаць; над беларускай зямлёю навісла чорнае пракляцьце тупой чыста нявольніцкай пакоры, плоскадоннай хітрасьці, жабрачай сваекарысьці — адным словам: нешта з радні «сьмердзякоўшчыны», толькі ў нашым беларускім стылю. Паверце, я гэта кажу з надзвычайнай мучыцельнай у грудзях больлю. Я за надта шчыра верыў у чалавека, у адраджэнца-беларуса — гэта вера мне бокам вылазіць. Я пабачыў і пераканаўся, што няма яшчэ таго, што з'яуляецца аснаўной неабходнасьцю: няма у людзей веры ў тое, што яны робяць, яны не здаюць сабе справаздачы з сваіх паступкаў, не уяўляюць яшчэ сабе слова Беларусь. Ўзапраўды — конкрэтна мала яшчэ хто уяўляе сабе што гэта за Беларусь, які сэнс адраджэньня беларускага народу, якая вартасьць адраджэньня беларускай культуры. Бо каб уяўлялі, то ня былі-б так легкаверны і так да праступнасьці лёгкадумны; не менялі б так часта і з такой лёгкасьцю свае пераконаньні, свае credo, ось нібы тая паўночная птушка свае ўборы. І што найбольш характэрнае — то гэта поўная адсутнасьць у людзей якой-бы то ня было адказнасьці за свае паступкі — ось, што ўбіў то і паехаў. Абсолютная адсутнасьць уселякіх моральна-этычных нормаў, без чаго ня можа нават істнаваць і самая звычайнейшая сабе грамада канакрадаў, бо тыя і то нават маюць пэўныя свае канакрадзкія звычаі, пэўныя агульна-абавязковыя нормы павядзеньня, істнуе пэўная норма кары за недарэчныя паступкі, напраўленыя супроць агульнай грамады, як істнуе свой суд. А што мы? Няўжо мы горш канакрадаў, мы прэдстаўнікі адраджэнскай думкі? Дык ці можам мы тады лічыцца прэдстаўнікамі, ці то сынамі тае нацыі, якая ось нібы той пясок разсыпаецца і ня гледзячы на усе зусільлі зьвязаць, аб'еднаць, скрапіць, усё роўна разсыпаецца. Няма таго што-б усіх еднала, няма скрэпаў. Кожны дзьме у сваю дудку і няма ніякага сэнсу ў агульным гомане — няма гармоніі.

Вось вы недаўна зьмясьцілі стацьцю у «Нашым Сьцягу» аб богу[1]. Прыводзіце думкі дзе якіх нашых песьняроў, з якіх відаць, што лепшыя сыны беларускага народу воража становяцца што да царквы а так сама і касьцёла — проста кажучы адкідаюць як бізантыйска-татарскую хандру праваслаў'е гэтак і клерыкальна-іезуіцкае каталіцтва, якія і па форме і па зьместу з'яўляюцца чужымі для нашага народу і пры тым яшчэ шкодныя, бо дзеляць народ на часьці, не кажучы ўжо аб іх рэакцыйнасьці. Рэлігія не аб'ядновае а дзеліць беларускі народ, таму зусім зразумела што рэлігія адкідаецца. Але што тагды аб'ядновае? Што можа замяніць народу гэтыя дзьве (па праўдзе адны толькі страшыдлы для вераб'ёў) гістарычныя веры? Як відаць з вашае стацьці, і вы проці бога, аб якім нам кажа царква ці то касьцёл, то якога новага бога вы нясіцё? Чаму аб гэтым вы не кажыце? А гэта трэба сказаць, трэба голасна сказаць: прэч з старым нявольніцкім богам! А які-ж новы бог?

Дык вось: калі і вы прызнаеце, што з аднаго боку праваслаў'е, якое па суці з'яўляецца рускім, велікарускім (мо' калісьці і было беларускім, але не цяпер), а каталіцызм — усё-ж так пад добрым польскім сосам, ад якога вельмі трудна пазбавіцца і найлепшым беларускім ксяндзам, што абедзьве гэтыя веры, па колькі яны служаць фактарам ня злучэньня, а раз'еднаньня беларускага народу, чаму, само сабой, з'яуляюцца злом, то мы іх адкідаемо, але чым запаўняемо пусты прастор? Нацыянальным беларускім касьцёлам і нацыянальнай беларускай царквой, каб яшчэ большы унясьці раскол у беларускую народную гушчу? — Не! Гэта зусім не карысна для адраджэнскай справы, бо для шырокага і буйнага узросту адраджэньня неабходна каб быў цьверды фундамант, каб была нейкая адзіная скрэпа, якаяб усіх еднала ў адну грамаду сыноў аднэе маткі, — неабходна утварыць такія культурныя вартасьці, якіяб маглі быць аднолькава сваімі для ўсіх напрамкаў соцыальна-палітычнай думкі. Толькі пэўная ясна-скрышталізаваная культурная вартасьць можа аб'еднаць беларускі народ у нацыю ў поўным сэнсе гэтага слова, зрабіць яго жывым колектывам, а не сыпучым пяском, якім ён цяпер з'яўляецца. На зьмену праваслаў'я і каталіцызму мусіць прыйсьці Вольная думка; на зьмену гэных дзьвух вераў, чужых, з'яўляючыхся аружжам у руках лоўкіх дыплёматаў для падняволеньня нашага народу, мусіць быць утворана сувязь вольнае думкі, беларуская сувязь вольнае думкі. Тагды будзе адзіны культурны цэнтр, адзіная культурная беларуская індывідуальнасьць, магчыма будзе ўстанавіць пэўныя нормы, нормы дазволеных і бязумоўна забароненых паступкаў. Тагды можна будзе тварыць беларускія культурныя вартасьці, калі будзе паложаны цьверды фундамант, гэтым фундамантам, на мой пагляд, і павінна з'явіцца вось сувязь беларускае вольнае думкі, якая ў аснову свайго сьветагляду кладзе веду як науку, а не хіромантыю якуюсь. Па мойму гэта ёсьць адзіны выхад, іншага няма і калі будзе ўзрост беларускага адраджэньня, то толькі пад сьцягам вольнае думкі. Гэтак я ўяўляю сабе змаганьне супроць бога, што вы на гэта?

А цяпер вось што: вы чыталі першы нумар беларускай часопісі «Крывіч» пад рэдакцыяй В.Ластоўскага і К.Душэўскага? Вы зьвярнулі увагу на заяву В.Ластоўскага, надрукаваную на перад'апошняй старонцы? — Ён тут паказаў сябе на што ён здатны! Аканчальна раскрыў і выявіў сябе чалавек. Скажу вам праўду, яшчэ на «Krywičaninie» і на сувязі «Zołak» я ня іначай думаў, але гэта патрэбна было для пераконаньня іншых, якія на жаль зрабілі страшэнную памылку ў свой час. Асабіста я ўжо другі год як нічога супольнага ня маю з гэнай публікай. Яшчэ за справу вядомай вам «запіскі» у Генуі падпісанай В.Ластоўскім і А.Цьвікевічам[2], цяпер страшэннымі ворагамі, ды за выбары ў Сойм варшаўскі мы разыйшліся, вось з тае пары мы, казаў той «варвары» адзін да аднаго. Адно пагана — узьляцеўшы сокалам сесьці жуком, гэта ўжо зусім нават пагана. А так сталася. Урад Б.Н.Р. больш ня істнуе, разваліўся і прэзыдыум Рады Б.Н.Р. — «Дзяржаўная колегія»[3]? — Гм — гэта-ж ужо шантаж, звычайная сабе авантура, тая-ж самая алексюкоўшчына. Пакуль што аткрыта мы супроць гэтай авантуры не выступалі, але мусіць прыдзецца, бо, як відаць, за надта ўжо публіка пачынае варушыць «собскі» сьметнік.

•/•

Пару слоў аб студэнтах беларускіх у Празе і аб новых стыпэндыях.

Як вы ужо ведаеце напэўна студэнства раскалолася на дзьве часьці: «Селянскую партыю» (Саюз беларускай нацыянальнай моладзі) і Аб'яднаньне беларускага паступовага студэнства. Гісторыю раскола апісаваць ня буду. Скажу толькі, што гэтаму расколу шмат прычынілася Коўня (Станкевіч з В.Ластоўскім — абое рабое, клерыкалы, а цяпер то за лаянку у «Бел. Студэнце» атрымлівае Ст<анкеві>ч, ад Л<астоўска>го грошы на ягонае выданьне, што ахвотна гатовы падтрымаць і падтрымліваюць літоўскія ксяндзы — тупыя шовіністы, усё за тую-ж віленскую справу і за выбары). На старане Коўні стаіць і наш пан «профэсар» Вершынін. Усе яны чамусьці ўбілі сабе ў голаў, што быццам-то я хачу утварыць нейкі новы нацыянальна-палітычны цэнтр. І ваююць нібы той Дон-Кіхот з млынам. — А тым часам тут у Празе можна было-б значна пашырыць беларускую справу, пры пэўным падтрыманьні рускай дэмократычнай групы у асобе нашага прыяцеля, родам беларуса, проф. Ляцкага. Фактычна толькі дзякуючы ягонаму стараньню мы ў мінулым годзе атрымалі дваццаць стыпэндый. Атрымалі б і Вучыцельскі Інстытут, але ніхто з нашых загранічных «тылігэнтаў» не захацеў заняцца позытыўнай творскай працай. Яны лепш для сябе знайшлі капацца на «собскім» сьметніку.

У гэтым гаду думаем атрымаць каля 35 стыпэндый. Калі і атрымаемо, то ўзноў такі дзякуючы проф. Ляцкаму, бо ў міністэрстве загранічных спраў, асабліва ў аддзеле дапамогі эміграцыі, фактычна яны свае там людзі, а Ляцкі пры гэтым яшчэ řadný профэсор Карлава унівэрсытэта. Трэбаж ведаць, што ўсе нашы студэнты прыняты на стыпэндыю з фонду эмігранскай дапамогі, ось нібы эмігранты. Гэтага ніяк ня могуць уцяміць нашы тутэйшыя клерыкалы, яны думаюць што бог з неба ім пасылае стыпэндыі, от таўкачы!

Дык вось, Антон Іванавіч, мая да вас просьба: 1) ці не магліб выслаць ад імя Школьнай Рады пасьведчаньня на імя студэнта Вячэслава Макоўскага, аб тым што ён узапраўды ёсьць эмігрант, хоцяж і выехаў з бацькаўшчыны па польскаму пасу, ў праціўным разе могуць быць розныя няпрыемнасьці, а хлопец добры, стараннa вучыцца, як наогул усе вашы вучні, акончыўшыя віленскую гімназію па-першае добра вучацца, а па другое як адзін — паступоўцы[4].

2) у канцы жніўня атпраўце ў Прагу чалавек з дваццаць добрых разьвітых хлапцоў, за якіх-бы можна было паручыцца — усе будуць устроены, даю чэснае слова, бо і мне так сказалі. А там мо' і больш удасца прыстроіць. Хай едуць так і Ўл.Жылка.

3) Тут ёсьць крупнае выдавецтва рускае «Пламя» пры учасьці чэскіх прафэса[ро]ў , Бідло, Нідэрле і інш. Адзін з кіраўнікоў гэтага выдавецтва Е.А.Ляцкі. Дык вось у чым справа, ёсьць магчымасьць выдаць некалькі беларускіх кніг. У першаю чаргу думаем выдаць зборнік беларускай поэзіі, лістоў так на шэсьць. Мо' у вас ёсьць якія небудзь рукапісы, то будзьце ласкавы зараз-жа, не адкладаючы ні аднэй хвіліны прышліце сьпісак іх. Трэба выкарыстаць!

Бывай здаровы. З пашанай і прывітаньнем
Тамаш.

P.S. Шчырае прывітаньне ад вашых вучняў: [Коржа], Грышкевіча, Макоўскага, [Ігна]товіча —

582.1.14:017&r-022&r — ра
582.1.14:023 — канвэрт

[1] Ант.Навіна. «Бунт проці Бога». // Наш Сьцяг. №9. 1923.07.04. [2] Гл. дакумэнт №3216. [3] Дзяржаўная Калегія БНР была ўтвораная 11.10.1922. [4] Сябры Аб'яднаньня Беларускага Паступовага Студэнцтва.

3436. Ліст Ігнаса Янінаса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.07.1923 з просьбай зайсьці й прынесьці паквітаваньні з друкарні Бака

582.1.49:185

3437. Карэспандэнцыя ў газэту «Наш Сьцяг» аб звальненьні 28.07.1923 працаўнікоў Міністэрства Беларускіх Справаў Літвы

Загадам міністра Галванаўскаса, падпісаным 28.07.1923 у Парыжы, звольненыя А.Карабач, У.Пракулевіч, Чэркас, Палікша, Дубіна.

Гэткім чынам беларуска-літоўскія адносіны даходзюць — ды фактычна дайшлі ужо — да фармальнага абсурду. У якой форме і на якім грунце магчыма гэты абсурд ліквідаваць — ніхто ня ведае, ды й ніхто гэтым пытаньнем з беларусаў не цікавіцца. Занадта далека ужо зайшло. У правячай літоўскай партыі[1], якая давяла да гэтага абсурду, магчыма ёсьць надзея выйсьці з яго стварэньнем «крывічскай группы», якая мае разглядаць сябе як «літвіноў крывічанскага паходжаньня» і быць падпарадкаванай клерыкальнаму Цэнтру. Але на гэтую «акцыю» пакуль што ёсьць толькі два кандыдаты — понас Ластаускас і понас Душэускас, рэшту спадзяюцца выпісаць з Вільні.

582.1.04:067 — мк

[1] Хрысьціянскіх дэмакратаў.

3438. Ліст старшыні Рады БНР Пятра Крэчэўскага (Коўна) дыпляматычнаму прадстаўніку БНР у Чэхаславаччыне Міколу Вяршыніну (Прага) за 30.07.1923

Рада
Беларускай Народнай
Рэспублікі
Прэзыдіум
Ліпеня 30 дня 1923
№80.

Копія.

Дыплёматычнаму прадстаўніку
ў Чэхаславакіі М.Вершыніну.

Беларуская акцыя ў Літве лопнула. Сьвядома ці несьвядома Літва адмовілася даць правы і патрэбную дапамогу жыхарству Віленшчыны а

тым самым і злажыла з нас абавязкі падтрымліваць братнія суседзкія адносіны у стасунку да Літвіноў. Мы цяпер маем зусём вольную руку і ў звязку з заявай Сэйды ў Варшаўскім Сойме і Ллёйд-Джорджа ў Лёндане разглядаем сябе як часовую Эльзас-Лётарынгію.

Мы былі й будзем об'ектам торгу ужо не паміж Літвой і Польшчай, а паміж Польшчай і Савецкай Беларусьсю, што надае нам больш годную позыцыю і ў палітычным і ў нацыянальным сэнсе.

За злажыўшуюся сытуацыю усю адказнасьць павінны ўзяць на сябе Літвіны, бо мы ў данным выпадку не карысталісь толькі опініей офіцыяльных дзяржаўна-політычных кругоў а таксама опініей Сэйма і грамадзка-політычных дзеячоў, якія не хацелі і не змаглі адкрыта вынесьці наша пытаньне з кулуароў ў шырокія кругі грамадзянства — прэсу. Аб заграніцы няма чаго й гаварыць.

Цяпер мы павінны трымацца самі і вясьці барацьбу за сваю незалежнасьць і непадзельнасьць уласнымі сіламі.

Што-б не чакала нас, навет галодная сьмерць, усё роўна са свайго паста мы зыйсьці не павінны, так ганебна як з яго зыйшоў гр. Ластоўскі і Душэўскі.

Наш сьцяг незалежнасьці даражэй нам самога істнаваньня Літоўскага, Польскага ці Савецкага чыноўніка.

Хлебнай палітыкі ў нашым сьвятым змаганьні за адраджэньне нашага народу — няма, ёсьць сьмерць ці пабеда.

Нарэшце, здаецца, ад нас адыйшло усё тое, што было ня наша, а карыстала беларускую справу ў сваіх асабістых выгодах.

Такія адломы маем: у Варшаве — Ладноў, Дубейкоўскі, ў Коўне — Ластоўскі, Душэўскі і ў Менску — комуністаў.

Гэтым групам Польшча, Літва й Савецкая Расея даражэй ніж Беларусь, а сваё самае становішча даражэй ніж гэтыя дзяржавы.

Наш фронт і нашы дамаганьні ў Літве разьбіты Ластоўскім і Душэўскім, якім, таксама як і ў Польшчы ў свой час Аляксюку, кінута падачка на журнал «Крывіч», які хутка выйдзе, але гэты крывіч будзе куплен цаною беларускай крыві крывому сумленьню Ластоўскага й Душэўскага за пагвалчаныя правы беларускага народу ў Літоўскай Дзяржаве.

Трудна пісаць гэта аб тым, каму верылі да апошніх часоў і лічылі амаль не правадыром беларускага руху, але з фактамі нічога ня зробіш — прыходзіцца констатаваць і больш асьцеражней адносіцца да людзей, якія бралі на сябе манаполію беларускасьці і самай шовіністычнай «шчырасьці» у адносінах да ўсіх іншых.

Прыміце гэта ўсё да ведама, паінформуйце грамаду й студэнства, а калі будзе патрэбна, то і вынесіце адпаведныя рэзолюцыі па гэтым пытаньням, бо ў даны мамэнт нам як найбольш патрэбна консолідацыя нашых сіл.

Усе групы тут, у Вільні, Горадні і Менску, стоячыя на грунце незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі, ідуць разам з намі і прызнаюць наш цэнтр едыным кіруючым цэнтрам, так як ні ў Вільні пад польскай окупацыей, ні ў Менску пад бальшавіцкай окупацыей такога цэнтру стварыць нельга. Па яго загаду усе выконываецца і каля яго усё гуртуецца.

Апроч таго Прага у апошнія часы не дае ніякіх вестак ні з палітычнага, ні грамадзкага ні навет студэнскага жыцьця.

Да гэтай пары ня маем афіцыяльнага паведамленьня, што сталося з прадстаўніцтвам? Мы маем афіцыяльнае завераньне, што нічога не зьмянілася, а адносіны да нас сталі куды лепшымі.

Не віна чэхаў, што Вы нічым не праяўляеце свайго жыцьця. За цэлы год ні ў чэскай ні ў расейскай прэсе ня было ніводнай строчкі аб беларускім жыцьці ў Празе; навет аб сходах Грамады, рэфэратах, ці чым небудзь іншым.

Мая падарож да Вас хутка адбудзецца. Прычыны гэтага Вы знаеце, хаця да гэтага часу адказу ад Вас ня маю.

Адказны момант патрабуе ад усіх прадстаўнікоў БНР адказнага чыну. Цяпер ідзе перагляд усей нашай політыкі і трэба каб усе былі на варце нашых беларускіх інтэрэсаў.

Чакаю пільна адказу на ўсе пытаньні агульнага становішча ў Празе.

Старшыня Рады Рэспублікі (—) ПКрычэўскі
582.1.04:069&r-070&r — рк

3439. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Тамашу Грыбу (Прага) за ?.??.1923

Высокапаважанаму Т.Грыбу ў Празе.

Я запратэставаў супраць таго, 1) што ковенская група С-Р з Карабачом на чале імкнецца рэпрэзэнтаваць партыю Б.С-Р. загранiцай, я ссылаўся на тое, што ў Празе ёсьць другая група, якая ў сваіх радах мае заснаўцоў і ідэолёгаў Б.П.С.Р., якія прадстаўляюць яе інтэрасы на міжнародных соцыялістычных зьездах; 2) выткнуў Карабачу яго невыразную лінію. Тое, што пры выбарах у прошлы Сойм ён паставіў сябе побач з Вяроўкіным я тады апраўдываў яго памылкай, непрактычнасьцю, але ж ён і ў гэты, апошні сойм, даў беларускія галасы ад імені Селянскай Рады для падпіраньня Ерына і даў супроць выразнай апазыцыі ўсіх [блека?]. За такую работу я назваў яго невядомым мне палітычна чалавекам. Гэта выклікала страшэнную буру супроць мяне. Я-бы прасіў Вас даць свой погляд на гэты справы, як галава Б.П.С-Р. групуючыхся ў Празе. У рэшце рэшт трэба было-бы гэту груповасьць давясьці да парадку, бо ніхай-жа партыю прадстаўляюць тыя, каторыя ведаюць якія яе шляхі. Могуць быць мясцовыя групы, але нельга каб былі дзьве групы якія імкнуцца рэпрэзэнтаваць усіх Б.С-Р. загранiцай. Трэба гэта прывясьці ў парадак. Што да мяне, то я быў і буду народнікам, але да упарадкаваньня Б.П.С.Р. хачу астацца безпартыйным, бо па свайму умысловаму складу я магу быць толькі радавым яе членам пры кіраўніках да каторых будзе ў мяне вера. Не глядзя на непрыемнасьці якія Вы мне пішаце ў сваіх лістох, я хачу з Вамі захаваць зносіны.

Што да заметкі ў «Krywičanie» аб матцы каталіцкім касьцеле, то яна нажаль не зьяўляецца маім творам, а прыналежыць Кс. Пятроўскаму. Паявілася яна ў гэным відзе праз недагляд. Зрэшты абвінавачываць Вы майстар, але якая-ж цэль, калі я і не імкнуся нават пярэчыць Вашай рабоце, а

наадварот хачу быць Вам карысным у працы, нават без ніякае падзякі ад Вас. Дык, от, дайце адповедзь на пастаўленыя пытаньня, а там далей пры абмене думкамі мо і знайдзецца грунт да ўзаемнага разуменьня.

Ваш ВЛ...

582.1.48:298&r — рк

Дата невядомая.

3440. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ??.08.1923

Вельміпаважаны Пане Ластоўскі,

Гонорар за стацьці «Думкі і разважаньні»[1] 132 кр.ч. дастаў. Вельмі дзякую. Наагул мае патрэбы крыху вялікшыя чымся маладога студэнта, хоць-бы й таму прыкладам, што мушу шмат лістоў пісаць. А дзеля гэтага я крыху й задоўжыўся. Матар'ял у новы № прышлю на гэтых днёх. Я рад, што друкуецца стацьця «Аб Беларусах-лаціньніках». Вы ў лісьце да мяне не напісалі, ці будзе надрукавана мая стацейка «Канчаткі жаноцкіх назоўных іменьняў, якія адпавядаюць мужчынскім на -ель і цель»[2]. Калі-б гэтая стацейка не друкавалася, а так сама ў будучыні й іншыя падобныя, дык прасіў-бы Вас па магчы[ма]сьці, пасылаючы ліст мне, укласьці й іх разам. Мушу апраўдацца перад Вамі, што дагэтуль не паслаў Вам новага матар'ялу. Сталася гэта таму, што ў гэты час я тут быў надзвычайна заняты. Наагул-жа лічэце мяне заўсёдным супрацаўніком.

З прысланых мне 20 экз. «Крывіча» пакуль што прададзены толькі чатыры. Рэшта дадзена на камісію ў украінскую кнігарню Лаврова, у маскоўскую «Наша рѣчь» і ў Земгор. Вы не напісалі па чом прадаваць асобны экз., дык парадзіўшыся з Вяршынінам супольна ўстанавілі цану 4 кр. за экз. За тыя-ж экз., што здадзены на камісію дастанецца грошай меней, бо кнігарні возьмуць сабе траціну. Тут ё такі пагляд, што прадаваць па 4 кр. экз. подарага. Дык калі ласка напішэце па чом прадавац асобны №. Адзін экз. я даў рэдакцыі журналу «Украінскі Студэнт», а яны за гэта абяцалі паслаць свой журнал. Пакуль што й новага № прышлеце 20 экз.

Вы мяне ня сусім зразумелі. Я не прапанаваў угледзіцца ў Празе, але дзеля тага, што Вы зьвярнуліся з думкаю аб такіх угледзінах, я адказаў, што мог-бы толькі ў Празе прыняць учасьце ў пабачаньні. Наагул сёлета я ніякага актыўнага ўчасьця ў палітычнай працы прыймаць не магу, бо мушу старацца як найбарджэй скончыць унівэрсытэт.

Нічагусенькі ня ведаю хто ад А<нтона> Н<авіны> маніўся быць у Гданску, наагул аб гэтым я нічага ня чуў. Цьвікевіч быў тут. З студэнтамі ён нічагусенькі зрабіць ня мог.

Грышкевіча й Ермачэнкі ў Коўне няма, бо ім літоўскае консульства не дало візы, дык Грышкевіч астаўся ў Празе а Ермачэнка паехаў у Румынію.

Чарнецкі належыць да групы Грыба, але лічыцца там дагэтуль найпасыўнейшым.

Галубянка пасьведчаньне дастала, але яе справа яшчэ тут не разглядалася.

Які мой пагляд аб «Крывічы»? Мне здаецца, што ён можа быць нішто журналам. Варта зьвярнуць памойму ўвагу на 2 рэчы — 1) павялічэньне лічбы супрацаўнікоў а гэтым самым і на ажыўленьне зьместу (паміж іншым Леў Леўскі на гэтых днёх мае прыслаць вялікшую бэлетрыстычную стацьцю) і 2) на тое, каб мова была балей прыродная. Наагул рэдактары «Крывіча» павінны перастаць быць філёлёгамі, а астацца толькі літэратарамі. Ня злуйцеся на мяне за гэта. Адказую толькі шчыра на Вашую просьбу. «Тэрміналёгія да анатоміі і фізыолёгіі» мне здаецца слабою. У ёй няма консэквэнтнасьці (робіць яна ўражаньне вялізарнае штучнасьці)[3]

582.1.49:155&r

Дакладная дата невядомая. [1] Артыкул «Думкі і разважаньні» надрукаваны ў №1 «Крывіча» за 1923 год. [2] Артыкул надрукаваны ў №2 «Крывіча» за 1923 год. [3] Наступнай старонкі няма.

3441. Ліст Klaudii (Коўна) Антону Луцкевічу (Вільня) за 3.08.1923

Szanowny Panie Antoni.

List Pana pisany 12.VII do Berlina otrzymałam. Czekam niecierpliwie dalszych wiadomości i wyznaczenia terminu kiedy będę mogła zobaczyć się. Proszę telegrafować do siostry mojej Anny, a ona mi przekaże depeszę. Adres Anny możno się dowiedzieć u podawcy niniejszego.

Nie wiem Pana adresu. Proszę o zakomunikowanie jak do Sz. Pana pisać, a również wskazać adresy wspulnych znajomych. Chciała bym bardzo nawiązać z nimi stosunki.

Niecierpliwie oczekująca od Pana wiadomości
Pozostaję
Klaudus
3.VIII.1923 r.
K.

[На канвэрце:]
W.P. Antoni Łuckiewicz w Wilnie.
[На адвароце:]
Łasioŭka, Przyjaźń 4, Kuryłowicz
582.1.14:029 — ра
582.1.14:030 — канвэрт

Аўтар ліста найпраўдападобней Кляўдыюш Душэўскі.

3442. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) рэдакцыі невядомай газэты за 3.08.1923

Милостивый государь
Гнъ Рэдактор.

Въ Вашей уважаемой газетѣ, от 3/VIII. с.г. №169, ~~помѣщена замѣтка под заглавіем: «Въ Литовском Министерствѣ по бѣлорусскимъ дѣлам», въ коей, косвенно, задѣта Рэдакція «Крывіч», которая, якобы, въ противовѣс потерпевшимъ за православную вѣру свободомыслящим бѣлоруссам (между прочим анонімным) протежируется названным министерством как католическая.~~ в отделе хроники имеется заметка где параллельно со

словом «католики» стоит названіе журнала «Крывіч» и редакция выставляется в противовес «потерпевшим за православную веру белоруссам».

С самого начала бѣлорусского движенія, всѣ бѣлорускія дѣятели, старались и стараются тушить разжигаемую русской и польской чорной рэакцыей, религіозную рознь въ средѣ бѣлорусского народа.

Кромѣ людей ~~потусторонних, въ отношеніи~~ стоящих вне бѣлорусскаго возрожденія и народа, из среды бѣлорусовъ ни одинъ дѣятель, ни одна групировка не посмѣла базироватся на религіозном дуализмѣ бѣлорускаго народа, вносить этот момент въ бѣлорускую жизнь.

Всѣ бѣлорусскія газеты, а их выходило от 1905 г. свыше 40, не исключая даже клерикальных ~~о католическихъ («Кгуніса» под редакціей ксендза Станкевіча)~~, въ вопросѣ религіозной вѣротерпимости выступали солидарно со всѣм бѣлоруским движеніем: въ духѣ примирительного единенія сыновей единой бѣлорусской нацыі.

За всю свою двадцатилѣтнюю дѣятельность на поприще бѣлорусского возрожденія я, с горечь[ю] въ первый раз вижу попытку использовать какими-то анонимными силами, этот больной для бѣлорусского народа момент въ их личной борбѣ. І мне весьма скорбно, что попытка эта нашла мѣсто на страницах литовского органа, которій между прочим является принціпіально благожелательным въ отношеніи бѣлорусского возрожденія.

Как один изъ первых поднявших знамя бѣлорусского возрожденія я от імені всего бѣлорусского народа апелирую ко всѣ[м] литовским дѣятелям — зная что въ их рада[х] имѣется много дѣйствительно искреннихъ друзей нашего національного возрожденія — не поддерживать попыток имѣющих цѣлью вбить, въ изстрадавшуюся грудь Бѣлоруссіи, о[си]новый кол религіозной ~~розьні~~ распри. Бѣлорусскій народ един, цѣли и стремленія едины. ~~религіозная принадлежность того [или] иного члена націи — вопрос частных убѣж[де]ній или семейных традицій, не имѣющій [от]ношенія въ общественной жизни.~~

Эті мыслі положены въ основу прог[рам]мы журнала «Крывіч» о чем весьма красно[рѣ]чиво свидѣтельствует его содержаніе, а так[же] то, что въ числѣ сотрусников его состо[ят] и православныя и ~~белору~~ католики ~~бѣлорусы~~.

Примитѣ завѣреніе въ искреннем почтеніи.

ВЛаст...

3.VIII.23

582.1.49:108-109&r

3443. Ліст [Веры Маслоўскай] зь Беластоцкай турмы (Беласток) за 4-5.08.1923

582.1.49:151&r

Дасланы Палутай Бадуновай у лісьце В.Ластоўскаму за 4.09.1923 — пра галадоўку зьняволеных беларусаў і зьдзекі турэмнай адміністрацыі.

3444. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.08.1923

582.1.49:153

3445. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Прага) Антону Луцкевічу (Вільня) за 10.08.1923

10.8.23. Praha.

Глыбокапаважаны Антон Іванавіч!

У свой час — гады два, ці тры таму назад — паміж намі меў месца даволі несур'езный інцыдэнт, выкліканый якімі-сь грашыма. Ня думаю, каб Вы прыдавалі яму да гэтай пары значэньня — і таму пішу да Вас проста, як да старога таварыша. Заданьнем майго ліста, як і наагул далейшай перапіскі, калі яна завяжацца, есьць высьвятленьне найбольш важных пытаньняў нашага сёнешняга палітычнага дня і устаноўленьне згоднага разуменьня усяго таго, што і як трэба рабіць. Мне здаецца, што падобная перапіска будзе для справы карысна — яна будзе па-першае сьведчыць, што скончана старое непаразуменьне і што мы з Вамі ня «ворагі», а па-другое яна дасьць нам абодвым матэр'ял да разважаньня. Вам гэтая перапіска дасьць інформацыю аб замежным стане рэчаў, мне — аб унутраным.

Першае, што мяне цікавіць, гэта — як стаіць у Вас у Вільне, пытаньне аб адзінай беларускай партыі? Я меў магчымасьць гутарыць аб гэтым з многімі вельмі паважнымі таварышамі з краю, якія гутаркі перэканалі мяне у безварунковай патрэбе падобнаго ідэолёгічнага аб'еднаньня. У нашых группах ужо з даўнага часу есьць імкненьне перагледзіць сваю праграму і стварыць нешта свае, беларускае, адказываючае нашым уласным патрэбам і згодным з тымі вывадамі, якія зрабіла жыцьце. Тое, што было і, асабліва, тое што есьць у беларусаў у сэнсе партыі — нікога па мойму задаволіць ня можа. У той самы час як патрэба у партыі — вочавістая. Без гэтага немагчыма ніякая арганізаваная палітычная праца. Мы доўга і сумлённа думалі аб гэтым, мелі цэлы шэраг конфэрэнцый з віднымі тэорэтыкамі, займаючыміся тым жа пытаньнем у сходных з нашымі абставінах — і прайшлі да вось якога пераконаньня:

1) Сучасны стан адраджэнскаго руху вымагае, каб істнавала сур'езная, дысцыплінаваная беларуская нацыянальная партыя, якая-б партыя давала-б здаровыя і ясныя лёзунгі руху і устанаўлівала-б тактыку — і тым уводзіла-б усю працу у стройныя арганізацыйныя рамкі.

2, Падобная партыя павінна быць пабудавана на народніцкай аснове (не марксісцкай — бо нацыя есьць об'ект ідэалістычнага разважаньня, і па другое, беларус = гэта значыць = селянін) — з вызнаньнем права уласнасьці селяніна на зямлю (+ право уласнасьці — «не священно».)

3, Партыя павінна спавядаць соцыялістычны ідэал і вязаць свой лёс з лёсам панявольных клясаў (беларусы — паняволены народ).

Гэта — галоўныя пункты. Рэшта — так сама вельмі важныя, але аб іх — другі раз.

Паведамьце — як Вы на іх глядзіце. Можна пісаць праз М.Вяршыніна (Praha), ці праз І.Краскоўскага. Было-б вельмі добра пабачыцца асабісьце — але гэта трудней.

Кланяйцеся жонцы і усім таварышам як ад мяне, так і ад усей нашай грамады.

Паваж. Вас А.Цвікевіч

582.1.04:077&r — ра
582.1.04:078 — канвэрт

3446. Пастанова камісіі, выбранай агульным сходам Загранічнай групы БПСР 14.07.1923 дзеля разгляду інцыдэнту паміж Ластоўскім і Карабачом за 11.08.1923

582.1.44:067 — мк

3447. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Міколу Чарнецкаму (Ёзэфаў) за 14.08.1923

Паважаны Пане Чарнецкі.

Вельмі рад быў я з Вашага пісьма, бо хачу трымаць кантакт з нашай моладзьдзю. Хачу яшчэ працаваць на роднай і дарагой мне беларускай ніве. Вы ужо ведаеце, што мне прышлося выступіць з Ураду, галоўная прычына — ўнутраныя трэньня, а часьцю і тое, што нашы с-ф[1] здумалі ўзяць кіраўніцтва дзяржаўнай калясьніцай. Атрымалася такое палажэньне, што з аднэй стараны с-р. 99 пробы аказаліся непрыхільнымі да мяне, а з другой — прышлося прыймаць ўсё ўдары на сябе як на с-р. Але гэтага мала: А.І.Цьвікевіч узяў ўрэшце Урад у свае рукі, справа пашла непамысна і каб апраўдаць сябе — ўсе накінуліся на мяне. Найгоршае-ж абураньне выклікаў «Крывіч», чаму я пачаў яго выдаваць. І, ось, сталі шукаць спосабаў «пахаваць» мяне. За прэтэкст узялі, што я, калі Карабач, першы раз ад выезду з Коуны Грыба і Мамонькі, прыслаў мне павестку прыбыць на сход загранічн. групы с-р., зрабіў на павестцы дапіску і вярнуў павестку назад.

Дапіска была гэткая: 1) на сход пад кіраўніцтвам Карабача не пайду, бо ён невядомы мне палітычна чалавек, а гэта вось чаму: у прошлы літоўскі сойм ішоў па аднаму сьпіску з Вяроўкіным, (тагды я яго бараніў, што чалавек непрактычны, ўсыпаўся, то што-ж рабіць) а ў выбарах у гэты, другі сойм ён даў беларускія галасы без надзеі правесьці свайго кандыдата і ўрэшце былі выпадкі ў правінцыі блёкаваньняся с палякамі, якія тут б.ч. памешчыкі. Па другое указаў што ковенская група ня можа прэтэндаваць на прадстаўніцтв[а] Б.П.С.Р. заграніцай, што ёсьць другая група (ў Празе) якая пасылае сваіх прадстаўнікоў на міжнародн. соц. зьезды і лічыць ў сваіх радах заснаўцоў і датыхчасовых ідэолёгаў партыі. Гэта вызвала самае вострае абураньне і пад духовым кіраўніцтвам Цьвікевіча сход вынёс абражаючую мяне рэзолюцыю. Тады я запрапанаваў трэцейскі суд, які гэтымі днямі павінен ужо адбыцца.

Дык вось, якія у нас тут навіны. У дадатку за бязчыннасьць звольнілі з міністэрства[2] Карабача, Прокулевіча, Палікшу, атмасфэра яшчэ пагоршала.

Я рашыў месячнік выдаваць не аглядаючыся на нашых крыкачоў, а выдаваць яго безпартыйным таму рашыў, што трэба культурную справу вынесьці па за рамкі ўсякай палітычнай грызьні, да якой народы пражыўшыя доўгае рабства вялікія аматары.

Пішу усё гэта думаючы, што ў труднай працы ўзятай на сябе, я знайду у Вас асабіста і між моладзьдзю падтрыманьне і помач, знайду зразуменьне патрэбы у нас культурнай працы. Зрэшта я хацеў-бы каб з паміж студэнцтва знашліся пісьменнікі і ім я ахвотна чым дуж буду памагаць і радай і працай.

Мне таксама «Беларускі студэнт» не саўсім падабаецца, але чаму-ж другой няма часопісі? Гэта-ж так ня трудна адбіць на літографе якіх 100 нумэроў. Што да кірунку яго, то я скажу, што — усе дарогі вядуць у Рым, г.зн. ўсе адценкі мысьлі патрэбны беларускаму адраджэньню, але блага калі, толькі адзін які адценак мае голас, а іншыя маўчаць.

Што да інстытуту, то, ведама, пры апазыцыі нашых с-ф. і тых, якія слухаюць іх у Празе няможна было штоколечы зрабіць.

Зрэшта пакуль мы ня выйдзем з чаду фанатызму і нетолерантнасьці, не дарасьцем да пашаны чужой мысьлі, чужога погляду, чужой веры, сьветагляду, будзем падыходзіць на ўсякага іначай аб нас думаючага, веручага, іначай шукаючага дарог, як да ворага з якім будзем адразу кідацца ў ахватку, то мала што ў нас будзе разьвівацца і ўдавацца.

Дужа будзе прыемна мне, калі Вы напішыце яшчэ раз, падзеліцеся сваімі думкамі са мной наагул і выскажэце свой погляд на «Крывіч». Я хацеў бы, не шкадуючы працы, даць яго як найлепшым, а сам ня ўсё дагледзіш — здалёку шмат што відней. Заўтра выйдзе з друку №2, які Вам будзе пасланы. Ці няможна было-б наладзіць у Вас прадажу яго? А мо можна было-бы сабраць і падпіскі. Бо хоць я карыстаюся нейкай помаччу збоку, але дужа цяжка выкручывацца, бо помач в<ельмі> аграніčаная, а дарагоўля у нас і ўсякіх патрэб многа.

Засылаю Вам і ўсім знаёмым паклоны, асабліва, калі бачыцеся, Маманьцы.

Затым бывайце

Ваш ВЛаст...

14.VIII.23.

Прысылайце карэспандэнцыі у Крывіч.

582.1.49:156&r-157&r

[1] Эсэфы — дзячы Беларускай Партыі Сацыялістаў-Фэдэралістаў П.Крэчэўскі, В.Захарка, А.Цьвікевіч. [2] Міністэрства Беларускіх Справаў Літвы.

3448. Ліст Тамаша Грыба (Радацін каля Прагі) Антону Луцкевічу (Вільня) за 17.08.1923

17.VIII.23
Radotín.

Паважаны Таварышу!

Даруйце, але выйшла маленькае непаразуменьне — калі я да Вас зьвярнуўся ў справе студэнскай, я зусім ня меў на мэці жаднай беларускай установы, я проста хацеў падзяліцца з Вамі думкамі аб новых кандыдатах і як на мой пагляд, было-б найлепш зрабіць, каб тыя стыпэндыі, якія нам даюцца ў Празе, ўзапраўды былі выкарыстаны, з усіх бакоў, а не тое што, каб прыезжалі сюды людзі і здарма марнавалі і свой час і займалі мейсца іншага. Аб гэтым ласьне я і хацеў Вас прасіць, як старога і найбольш адпаведнага беларускага дзеяча, каб Вы зьвярнулі ўвагу на студэнства і сваім уплывам часамі, якім Вы безумоўна карыстаецеся, далі напрамак карыснае пазытыўнае працы тым маладым сілам, якія марнеюць у самоце і бядоце ў краі не маючы змогі карыстацца сонцам веды.

Для гэных сіл, лепшых з найлепшых, і трэ' было б даць магчымасьць праехаць у Прагу. Гэны адбор хай робіць і Шк<ольная> Р<ада>, але-ж нікому не сакрэт, што душа і мозг усей справы — гэта Вы і ніхто іншы, таму зьвяртаючыся непасрэдна да Вас я зусім не хацеў уносіць ніякага анархізму. Божа мяне сьцеражы. Калі ўзапраўды Шк. Рада мае кіраваць усей прасьветнай справай — дужа добра, хай кіруе. Я так мала паінфармаваны аб узапраўдным стане адносін у Вільні, што мог у сваім лісьце ўжыць такое неасьцярожнае слова, якое мо' Вам і паказалася як пэўная дэструкцыйнасьць. Але верце мне, я шчыра Вам кажу гэта, — ніколі так ня вымагалася абставінамі жыцьця найбольшага напружаньня ўсіх канструкцыйных здольнасьцяў беларусаў, як цяпер, калі кожны дзень прыходзіцца ствараць тое, што ўчора варожая сіла зруйнавала, калі амаль не што дня прыходзіцца рабіць усё з пачатку. Я добра ведаю цану абаім мэтадам працы і дэструкцыйнаму і канструкцыйнаму — спробы ўласнага жыцьця шмат чаму навучылі. І ўжываць мэтад дэструкцыйны, калі якраз патрэбна творскае напружаньне канструкцыйнай працы, безумоўна гэта было-б найвялікшым праступленьнем. І ведаеце што мне часамі прыходзе ў голаў: мы беларусы вельмі шмат атрымалі ў праклятай спадчыне маскоўскага царызму ласьне гэтай дэструкцыйнасьці — усё руйнаваць і руйнаваць, а там будзь што будзе. Мы неяк ня можам цьвяроза заглянуць на немінучыя вынікі нашае працы. — «Не зважай на ўражай — жыта сей!» — гэта наш покліч, свайго роду філёзофія чыну. Гэта мо' і ня былоб такім страхацьцём у нашым жыцьці, каб мы ня мелі і яшчэ аднэй спадчыны — гоноровай шляхэцка-польскай ніперад кім адпаведнасьці за свае паступкі; адсутнасьць пачуцьця адпаведнасьці — найвялікшае зло ў нашым беларускім высвабадзіцельна-адраджэнскім руху. — Гэта ўсё разам ёсьць тая дэструкцыйнасьць супраць якой, на маё перакананьне, трэба вясьці самае рашучае змаганьне. Годзе ўжо гэтага. Павага справы вымагае і паважнага адношаньня — ўдумчывага, сэр'ёзнага, чэснага, разумнага. Без гэтага не магчыма жадная конструкцыйная дзеяльнасьць, а гэта дзеяльнасьць цяпер нам і патрэбна — ва ўнутрана-беларускім нацыянальна-культурным і палітычным жыцьці. Затое ў вонкавай дзеяльнасьці — тут я безумоўна падтрымліваю і ў данны момэнт самую актыўную дэструкцыйную дзеяльнасьць. Адзін мэтад працы напраўленай ва ўнутр, другі ў вонкі. Конструкцыйны мэтад на ўзмацаваньне нашага культурнанацыянальнага арганізму, а другі, дэструкцыйны мэтад на змаганьне з вонкавымі абставінамі, якія перашкаджаюць у жыцьці і разьвіцьці нашым. З гэтага пункту гледжаньня выходзячы неабходна прызнаць, што сярод беларусаў, якія змагаюцца за сваё уласнае самаістае істнаваньне культурнае, палітычнае, дзержаўнае і г.д., патрэбны людзі розных настрояў, розных тэмпэрамантаў, патрэбны людзі рознага духоўнага складу. Адно толькі — моцна аб'еднаных нейкім вышэйшым абавязкам, вышэйшай праўдай, думкай, ідэяй, за якую гатовы кожны на сваім мейсцы, хто-б ён ня быў, — песьняр, ваяка, работнік, селянін, аддаць сваё жыцьцё. Гэта ня будзе самаахвярнасьць — гэтага вымагае павіннасьць, вышэйшая праўда. Адсюль, ясна: зразумела, павінна быць пэўная моральна-этычная

норма як у адношаньні між сябе гэтак і да «чужых», а так сама і спосабаў вядзеньня змаганьня за ўцелаішчаньне гэнай вышэйшай праўды — волі народа, незалежнасьці бацькаўшчыны, вольная сувязь народаў і г.д. Які наш беларускі ідэал? Ці ёсьць у нас гэна вышэйшая праўда? Ці ёсьць у нас моральна-этычныя нормы ў нашым ўзаемаадношаньні, у адношаньні да «чужых»? Усе гэныя пытаньні я ўжо не раз перадумаваў, яны мяне тузаюць, не даюць супакою. Хто мы і куды мы ідзём? Якія новыя вартасьці нясе з сабой наш адраджэнскі рух? Якое мейсца сярод іншых народаў мае заняць наш беларускі народ у гісторыі людзкасьці? — Аб усім гэтым я нешта пісаў у сваім папярэднім да Вас пісьме. Пішу і цяпер, бо заўсёды аб гэтым думаю, з нейкай надзвычайнай смагай шукаю адказу і не знаходжу. Часамі нат безрадна апускаюцца рукі... За надта ўжо вялікую спадчыну атрымаў наш народ, каб змог вытварыць нешта сваё ўласнае, чуіцца голас разсудку. Асабліва калі ўважліва прыгледзішся да сучаснай беларускай інтэлігэнцыі, прааналізуеш яе мэты і заданьні, яе духоўную мізэрнасьць, кволасьць, дый студэнства наша пражзскае мала дае надзеяў на нешта трывалае, моцнае, сваё ўласнае... Не, я ўсё-ж такі далёк ад пэсымізму. Хутчэй за ўсё я станаўлюся часамі жорсткім сцэптыкам і нямілосэрна гатоў біць усіх і кожнага бізуном, лупіць каб пачуў што мае ён сваю ўласную самаістую індывідуальнасьць і мусіць яе развіваць, усестароньня, гармонійна (гармонійна ў агульна нацыянальным абхваце). І з таго, што цяпер няма яшчэ выразна скрышталізаванай культурнай беларускай індывыдуальнасьці я не раблю выснаўку што яе ня будзе. Яна будзе, прыйдзе, яна ўжо радзілася. Пытаньне толькі ў тым: якая яна мае быць? Якой формы? Якога зьместу? Бо як-жа ад нас шмат залежаць прыдаць тую або іншую рысу і як-жа таміцца душа каб гэтая — наша ўласная урэшта-рэшці — індывідуальнасьць была найбольш дасканальнай, найбольш прыбліжанай да ідэалу. А які ідэал, у чым ён? — І так уваходзіш у круг, ў зачараванае кола, дзе няма ні пачатку ні канца. Іх то і трэба знайсьці. Бо бяз іх мы сьляпыя, аддадзяныя на волю лёса; народ які не ўсьвядоміў яшчэ свае ўласнае гісторыі — ня можа лічыцца народам і марыць аб волі. Інакш гэта будуць адны толькі, казаў той, «мары, мары, лятуценьні»... Мы павінны мець нейкі конкрэтны ідэал, каб праводзіць канструкцыйна-дэструкцыйны мэтад свае дзеяльнасьці. Як падняволены народ іначай мы і ня можам; мы ніколі ня выйдзем з гэнага зачараванага кола, калі ня будзем мець конкрэтнага, для ўсіх абавязковага ідэалу, з ясна акрэсьляным зьместам. На ўтварэньне гэнага конкрэтнага ідэалу, нашай беларускай праўды і павінны быць напраўляны ўсе нашы беларускія культурныя сілы. У гэтым ёсьць нашае чарговае заданьне. Я так сабе уяўляю аснаўную мэту ў здабываньні веды беларускім студэнствам тут у златэй Празе. Усё ўзяць што толькі можна для вызваленьня бацькаўшчыны і стварэньня сільнай беларускай культурнай індывідуальнасьці, а ў першы чарод — стварыць конкрэтны ідэал. Як адказ на гэтае пытаньне мы дзе-што можам знайсьці ў паэме Ўл<адзімера> Ж<ылкі> «Уяўленьне»[1]. Гэты малады наш песьняр творыць вялікія вартасьці. Я з Вамі згодзен — за ім вялікая будучына. Тут ёсьць яшчэ адзін самародак

— ён піша апавяданьні. Чудоўны мае стыль. Вось калі-б нам удалося выдаць сваю часопісь, або проста зборнік літэратурна-навуковых твораў, Вы-б тады пабачылі і адчулі аб чым сумуе душа тых некалькі беларусаў, якіх злая доля закінула на чужыну, пазбавіла бацькаўшчыны.

Так, паважаны таварышу...

Можаце цяпер судзіць аб тых мэтах якія мы тут сабе ставім, аб тых заданьнях, якія стараемося вырашыць. І ня думайце, — о, я ведаю, Вы маеце розныя інформацыі, шмат розных плётак з нашага жыцьця і судзіця часамі па іх аб нас, праз чужыя акуляры гледзючы, — то ня думайце, будзь ласка, што мы тут гразьнім у эмігранскім балоце, стараемося быць разам з маскалямі і ўсё-такое. Я ведаю, мяне чамусьці заўседы лічылі і цяпер шмат хто, асабліва «Бел. Студэнт» — масквафілам, амаль не правакатарам беларускай справы, або, як гэта не так даўна напісаў П.А.К<рэчэў>скі «здраднік беларускай дзержаўнасьці», «кар'ерыст» і г.д. — усе гэта ёсьць рэфлексы чыста асабістага адношаньня, асабістай амбіцыі. П.А.К-скі ніяк няможа, напрыклад, мне дараваць, што і я разам з ім ня выступіў супроць выбараў у Варш. Сойм. А я перш за ўсё хачу быць чэсным сам з сабой і заўсёды казаць тое што думаю проста, шчыра, аткрыта. Гэта шмат каму не даспадобы і вось пачынаецца тая блазнота, аб якой і вам пэўна чуць надаела. Хаця я асабіста найменьш зьвяртаю на гэта увагі. Бо тое, ў чым я сьвята пераконаны, я буду рабіць і ніякімі лаянкамі, ніякай брахнёй ніхто мяне не пераканае, я вымагаю доказаў больш сэр'езных. Таму я так больш чым з раўнадушнай пагардай адношуся да іхнага, недастойнага ўзрослых людзей, занятку. Больш паважныя ёсьць справы. А лаяцца з п. С<танкевічам>, з п. Х+Y+Z ня хочу. На бязглуздую лаянку мяне у «Б<еларускім> Ст<удэнце>» ні словам не адказаваю. Ня лічу патрэбным. Ведаю пры гэтым, што ў большасьці гэта ідзе з К<оў>ны, там сядзіць пан Л<астоўскі>, які надуў губу за нешта на маю грэшную асобу і, якія самі, такія і сані, дурань заўсёды па дурному робіць, кажа прыказка — у хаўрусе стараюцца, ну і дай бог ім усяго найлепшага...

У канцы мушу сказаць пару слоў што да М<амонькі>. Вы шмат памыляецеся аб ім — гэта дзіўны тып беларускага мужыка-рэволюцыянэра, зусім мала асьвечанага, але з гэніяльным прыродным розумам і такой чыста мужыцкай хітрасьцю У працягу некалькіх гадоў я добра яго ізучыў. Безумоўна, ад яго нельга вымагаць таго, што ад выраблёнага асьвечан[а]га чалавека, але ў яго ёсьць здаровая бунтарска-мужыцкая душа і ён безумоўна чэсны. І ведаеце што, каб яму ды раней асьвету даць — о, з яго выйшаў-бы сільны індывідуум. Дый так нішто, патроху вучыцца, кульцівіруецца. І па мойму лепш усё-ж такі захаваць такую сілу, чым закінуць у нябыцьцё, а глаўнае — ён ужо не адзін раз праявіў сябе, мае пэўную заслугу перад беларускім рухам, таму мае поўнае моральнае права, скажу больш, ён у тысячу разоў мае больш права карыстацца студэнскай стыпэндыей чым хто небудзь іншы. А для справы беларускай, з майго пункту гледжаньня, патрэбны ня толькі п. Л<астоў>скі, п. С<танкевіч>, п. М<амонько> і г.д., але патрэбны і п. Ш<...?>, п. В<...?>, Ц<ьвікевіч?>,

З<ахарка?> і г.д. — толькі пад адным варункам: кожны свярчок знай свой сучок. Кожны хай робіць тое ў чым ён найбольш компэтэнтны, да чаго пачувае сябе больш здатным, у чым найбольш можа прынясьці карысьці для агульнай справы. Найвялікшая карысьць, найвялікшая удача і расцьвет агульнай справы — вось крытэрый моральна-этычнага павяздзеньня кожнага сьвядомага беларуса. Хто аб гэтым можа судзіць? — Вынікі самой працы, вынікі таго або іншага паступаваньня. Цяпер наш абавязак даць конкрэтную позытыўную працу гэным сілам, а іх многа такіх ня выкарыстаных марнуецца... яшчэ больш будзе. А дзеля гэтага, з чыста нават уцілітарнай мэты — эканоміі жывых сіл — даць ім працу, конкрэтную пазытыўную працу. А працы многа, непачаты вугал яшчэ. І ведаеце, мне крыху не зразумелы Вашы словы аб тым, калі вось прыйдзе час актыўнай палітыкі, то і г.д. Я сабе так справу уяўляю: актывізм у беларускай палітыцы ні на адзін момант не павінен слабець. Усё пытаньне толькі ў тым, каб у належны час даць належны напрамак праяўленьню гэтага актывізму. І вось, з соцыалёгічнага пункту гледжаньня, ў нас не павінна быць ні воднай лішняй сілы — кожнай трэ' даць занятак. Ясна — дзеля гэтага патрэбна арганізацыя, цьвёрдае правядзеньне конструкцыйнага мэтаду, мо' нат утварэньне адзінага нацыянальнага цэнтру, не палітычнага, а чыста культурнага. Неабходна аб'еднаньне на чыста культурным грунце, трэба устанавіць супольныя вартасьці і выкінуць тых, якія не маюць жадных духоўных вартасьцяў. І то скажу, мо' нат і ня выкінуць, а ўмела выкарыстаць для агульнай справы, — гэта шмат ляпей. Аб гэтым варта было-б добра і зусім такі цьвяроза падумаць, абдумаць, вырашыць і нешта ў гэтым напрамку пачаць рабіць. Бо час ідзе, а разам з тым у нас адбываецца працэс не накапленьня сіл, а нейкае фатальнае распыленьне, адбываецца бяз конца і меры дыфэрэнцыацыя, расклад на атамы. Працэс гэты натуральны, што і казаць, але за ім мусіць ісьці другі працэс, усведамленьня ня толькі таго што нас усіх раз'ядновае, але і таго што злучае ў адну грамаду, ў адну нацыю, ў адзіны беларускі народ.

Спадзяюся, што Вы мяне зразумелі і на гэты раз ня будзе ўжо таго прыкрага непаразуменьня, што да «анархізацыі». Я вельмі Вам дзякую за папярэдні Ваш ліст і думаю, што Вы, паважаны таварышу, не адмовіце, ў вольную хвіліну чыркануць узноў мне пару слоў. Буду вельмі рад і ўдзячны Вам.

З пашанай і правітаньнем

Ваш Тамаш.

582.1.14:031&r-036&r

[1] Рэцэнзія Т.Грыба на «Уяўленьне» Ул.Жылкі датуецца 1923.11.02 (надрукаваная ў часапісе «Перавясла» №1, 11-12.1923).

3449. Паведамленьне Камітэту Загранічнай групы БПСР (у Літве) Кляўдыюшу Душэўскаму за 20.08.1923 аб пастанове агульнага сходу 14.07.1923 выключыць яго зь ліку сяброў групы

582.1.44:080 — ма

3450. Даклад Палуты Бадуновай. Данцыг, 22.08.1923

Даклад ПАЛУТЫ БАДУНОВАЙ

Вілінскія Беларускія арганізацыі (.....) даручылі мне перадаць беларускім дзеячам, якія знаходзяцца і працуюць у Літве, наступнае:

АДНОСІНЫ ДА ЛІТВЫ. Вілінскія беларускія арганізацыі лічаць Літву безумоўна спрыяючай і прыхільнай да беларускага народу і беларускага дзяржаунага адраджэньня і свайго боку шчыра хочуць і ахвотна будуць супрацоунічаць з Літвой, тым больш у галіне культуры.

Адносіны гэты пабудаваны не на тэй матэрыяльнай падставе, якую Літоускі народ аказывал і можа аказаць нам у цяперашні трагічны момэнт Беларускага жыцьця, а на усей гісторыі Беларуска-Літоускага супольнага жыцьця, а таксама на супольнасьці інтэрэсау абодвых народау у цяперашні час і у будачыне.

Віленскія беларускія арганізацыі шчыра вераць што калі Літва мае магчымасьць дапамагчы беларускаму народу у яго змаганьні з захватніцтвам Польскага шовінізму і імпэрыалізму; то яна дапаможа, а калі не дапаможа, дык значыць не мае магчымасьці і не на гэтым матэрыяльным грунце аснованы прынцыпова добрыя адносіны Беларускага Народу да Літоускага.

Беларуска-Літоускія адносіны не павінны станавіцца выключна партыйнымі справамі, бо гэта есьць справа якая стаіць зьне партый. Карысьць захаваньня добрых адносін паміж народамі, прывыкшымі жыць у згодзе праз усю сваю гістарычную эпоху, павінна вызнаваца усімі без рожніцы партыямі.

Адносіны Віленскіх арганізацый ды і усяго Беларускага грамадзянства, пачынаючы ад інтэлігенцыі і даходзячы да самае гушчы селянскага жыхарства да В.Ластоускага і К.Дуж-Душэускага самыя найменшыя [sic!] і шчыра гарачыя.

Увесь Народ Беларускі, а за ім і усі арганізацыі і партыі глыбока паважаюць В.Ластоускага і лічуць яго галоуным правадыром сваім. Для усяго Народу Беларускага, як і для усіх арганізацый і партый беларускі[х] імя В.Ластоускага зьявляецца зьместам усіх нацыянальных ідэй і надзей. Імя гэта аб'еднала каля сябе усе жывыя сілы нашыя і зьяуляецца для нас сьвятым і гэраічным імям.

К.Дуж-Душеускі карыстауся і карыстаецца вялікай папулярнасьцю і любоую сярод бел. грамадзянства. Яго лічылі і лічуць адным з найвідатнейшых працоунікоу Беларусі, вучыцелям і правадыром Беларускай інтэлігенцыі. Яго імя і праца асабліва у Віленшчыне і Гарадзеншчыне для усіх зьяуляецца вельмі сьветнымі і незопомненнымі. Німа у Віленшчыне і Городзеншчыне тых грамадзянскіх арганізацыяу, над утварэньнем, альбо падтрыманьнем каторых не папрацавау бы Д.-Душэускі.

Народ Беларускі і бел. арганізацыі дужа добра ведаюць скуль ідзе прыказ і ініцыятыва апаганіваць наілепшых нашых працоунікоу і правадыроу. Віленцы і Городзенцы, як і увесь Бел. Народ уявляюць сабе, хто зацікаулены у тым, каб пакінуць Народ Беларускі без сьветных і паважаных іменау. Але ворагі нашага народу цяжка памыляюцца, калі думаюць, што

Беларускі Народ так проста паверыць ува усе нападкі, якія сыпяцца на нашых паважаных працоунікау.

Міністэрства Беларускіх Спрау. Віленскае і Горадзенскае бел. грамадзянство лічаць, што Міністэрства Беларускіх Спрау у Літве можа прыняьці велікую карысьць, тым больш у справае культурнай, і зліквідаванне Міністэрства было бы вельмі некарысным для бел. справы. Грамадзянства бел. спадзяецца, што пры навязаньні нармальных адносін паміж бел. грамадзянствам і Літвой на челе Бел. Міністэрства будзе стаяць беларус.

Журнал Крывіч, як і усе на агул друкі спатыкаюцца Бел. грамадзянствам вельмі шчыра і прыхільна. Чытаецца усе з вялікім зацікауленьнем і ахвотай і наогул вітаюцца, як уклад у Беларускую Культуру, а таксама свабоднае слова, якое толькі і можа прыйсьці з-за кардону.

ПАЛУТА БАДУНОВА.

22 жніуня 1923 году Данцыг.

З арыгіналам згодна:
582.1.44:057&r — мк

3451. Выпіска з пратаколу агульнага сходу грамадзян і палітычных дзеячоў Беларускай калёніі ў Літве 22.08.1923 аб правале беларуска-літоўскага супрацоўніцтва й зьняцьці зь сябе абавязку «маральнай салідарнасьці з Літвой», аб «штрэйкбрэхерстве» Вацлава Ластоўскага й Кляўдыюша Душэўскага й абвяшчэньні ім «маральнага байкоту беларускага грамадзянства»

582.1.44:068 — мк

3452. Дэкларацыя Ўраду Беларускай Народнай Рэспублікі 24.08.1923

Дэкларацыя
Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі 24 жніуня 1923 года.

24 жніуня 1923 году, згодна даручэньня Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, як вышэйшай нацыянальнай улады усея Беларусі, новаутвораны Урад прыняу на сябе абавязкі кірауніка беларускай палітыкі. Праца, якая узложана на Урад і якую падзеляе з ім усе сьвядомае грамадзянства, зьяуляецца выключнай па сваей труднасьці і адказнасьці. Урад падымаецца на гэту працу у момант, калі здавалася-б, што імя Беларусі як асобнай Краіны і асобнай Дзяржавы выкрэсьлена з ліку жывых іменау. Урад падымаецца на гэтую барацьбу у момант, калі здавалася-б, што жыцьце нашага Народу аканчальна задушана, што яму застаецца толькі цягнуць ярмо няволі на радасьць пануючым пераможцам. І таму першае слова, якім мы адкрываем нашую бар[а]цьбу, есьць слова непарушнай веры у сілы Беларускага Народу, есьць сьведчаньне яго нязломных імкненьняу да сваей волі і сваей незалежнасьці.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі сьвядом правоу Народа на самастойнае дзяржаунае істнаваньне і на цэласьць яго уласнай прадвечнай зямлі.

Гэтыя правы жывуць разам з Беларускім Народам і ніхто і ніколі ня можа яго пазбавіць. У граматах Выканаучаго Камітэту Усебеларускага Зьезду і у Устаунай Грамаце Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 25 сакавіка 1918 года яны зазначаны раз і на зауседы. З гэтай сьвядомасьці вынікае, што уселякія пастановы аб долі нашага краю, зробленыя бяз згоды народу, уселякія падзелы супроць яго волі і пратэстау — зьяуляюцца ганебным гвалтам над Беларускім Народам, агідным, ніколі не забываемым зьдзекам. Яны не абавязкавы для Беларусі. Яны зьяуляюцца цяжкім, але часовым злом. Так сама як загінуу у свой час Берасьцейскі трактат, будаваушы славу нямецкага царызму на крыві і касьцях нашага Народу, так сама загіне і шчэзьне з памяці людзкай сучасны падзел у Рызе, будуючы на крывавых цярпеньнях селянскай Беларусі славу і блеск панскай Польшчы. Парукай у тым наша уласная сіла.

На мейсцу разарванай, заціснутай у кайданы аккупацый Беларускай Зямлі, павінна паустаць Аб'еднаная, Незалежная Беларуская Дзяржава. Беларуская Дзержава, змагацца за якую есьць вялікі абавязак Ураду, есьць Дзяржава Працоунага Народу, — яго селянства, як стану, на плячох якога спачывая галоуны цяжар дзяржаунай будовы, яго вытворчага рабочага стану і нацыянальнай інтэллігэнцыі. Беларуская Дзяржава будуецца намі не па гнілым прыкладам старога часу, з яго эканамічным, соцыяльным і нацыянальным уціскам і эксплеатацыей. На гэтым старым ладзе стаіць печатка праклену і маладое беларускае адраджэньне не вяжа з ім сваяго лесу. Але разам з тым будаваньне Беларускае Дзяржавы павінна быць пазбаулена гіблых абмылак апошняга часу, зьявіушыхся вынікам голых разумаваньняу, адарваных ад жыцьцевай глебы. Згодна з гэтым, улада на Беларусі павінна быць пабудавана на аснове Народных Рад, выяуляючых голас працоунага жыхарства. Селянства павінна валадаць зямлей, згодна асабліваму стану сельскай гаспадаркі на Беларусі, на правох уласнасьці. Дзяржава рэгулюе гэтае валаданьне на параунаучых падвалінах, каб атрымаць ад зямлі найбольш гаспадарчага зыску й не дапусьціць гандлевай спэкуляцыі зямлей.

Уся зямля абшарнікау, а так сама і усіх тых, хто у часе барацьбы за адраджэньне Беларусі працаваў на карысьць чужых дзяржау, бяз выкупу залічаецца у Дзяржауны Зямельны Фонд, з якога надзяляецца у першую чаргу беззямельнае і малазямельнае селянства. Землі асаднікау так сама пераходзяць у Зямельны Фонд, а самыя асаднікі высылаюцца за межы Беларусі. Усе уцекачы з краю за часу Вялікай вайны пры нацыянальнай беларускай Уладзе павінны вярнуцца дамоу і атрымаць ад дзяржавы дапамогу на адбудову зруйнаваных сяліб.

Лясы і іншыя багацьця краю, маючыя дзяржауную вартасьць, пераходзяць у безпасрэднае распараджэньне Дзяржавы для разумнага карыстаньня у інтэрэсах працоунага народу.

Вытворчы стан работніцтва, разьвіваючы адно з найбольшых багацьцяу краю — прамысловасьць, павінен быць абаронен Дзяржавай ад эксплеатацыі капіталу. Васьмігадзінны дзень працы, страхоука, пэнсія на дажытак і іншыя здабыткі рэвалюцыі, павінны быць забеспечаны у дзяржаунам законе.

Побач з гэтым і здаровы капітал павінен мець рамкі свабоднай дзейнасьці, каб забяспечыць развіцце краявому гандлю і прамысловасьці, але не ператварыцца у прагавітага смока, што праз меру эксплеатуець народны дабрабыт.

Дбаючы аб магчыма шырэйшым гаспадарчым росквіту Беларусі, нацыянальная улада будзе імкнуцца да таго, каб шляхам узмацаваньне усіх родау коопэрацыі і адпаведнага законадаўства, перавясьці усю гаспадарку у Дзяржаве з асноу прыватна-уласніцкіх на асновы соціалістычныя, якія зьяуляюцца найбольш справядлівымі і дасканалымі.

Свае месца павінна заняць у Дзяржаве працоуная інтэлігенцыя, на абавязку якой ляжыць зьберагаць і разьвіваць беларускую культуру на яе нацыянальным грунце. Месца прыгнечаньню і прыгону уселякіх гатункау, што могуць апірацца на спаведаньне рожнай веры няма у Беларускай Нацыянальнай Дзяржаве. Рэлігія зьяуляецца справай сумленьня кожнага грамадзяніна і ня можа дзяліць адзіны народ. Усе грамадзяне без рожніцы вызнаньня карыстаюцца адналькавымі правамі. Няма мейсца у Беларускай Дзяржаве і уселякім чорным сілам, што жывуць коштам працоуных, усім панам, што імкнуцца абярнуць вольнае селянства у быдла. Адраджоны і аб'яднаны пасьля доугіх вякоу пакуты Беларускі Народ будуець сваю Дзяржаву толькі для тых сваіх сыноу, што жывуць працай рук сваіх.

Імя гэтай Дзяржавы — Беларуская Народная Рэспубліка.

Лес судзіу, каб Урад Беларускай Народнай Рэспублікі у гэтыя цяжкія для народа дні, працавау не на роднай Зямлі, а на чужыне, сярод чужых і часам зусім неспрыяйных варункау. Сілы Беларускага Народу у гэтую сумную хвіліну яго барацьбы яшчэ не так адпаведна згуртаваны, каб адбіць варожую навалу і даць магчымасьць Ураду гаспадарыць на уласных абшарах. Але гэта ня можа спыніць працу Ураду. Часовае перабываньне на суседняй тэрыторыі ня можа прымусіць яго выпусьціць з рук Сьцяг Народнай Волі. Гісторыя другіх паняволенных народау сьведчыць, што і у іх жыцьці бывалі такія ж жалобныя часы. Усе верныя сыны Беларусі сьвядомы гэтага і тое падтрыманьне, якое Урад Б.Н.Р. мае ад іх у сваей штодзеннай працы, пераконвае яго у правідловасьці абранага шляху. І першае заданьне, якое ставіць сабе Урад, гэта арганізацыя шырокіх народных мас для аканчальнай пераможнай барацьбы і замацаваньня Беларускай нацыянальнай улады на усім абшары Беларускай зямлі.

Урад Б.Н.Р. надзвычайна ценіць кождую ахвяру Народа, надзвычайна сьвята яму кождая капля Беларускай крыві, каб ен легка згаджауся на яе праліцьце. Асабліва асьцярожна Урад будзе ставіцца да новых ахвяр, калі зауважыць, што для мэт беларускага вызваленьня дамешваюцца старонныя яму мэты. Вядучы палітычную барацьбу выключна для асягненьня Незалежнасьці, Урад Б.Н.Р. нікому і не [на] якіх варунках не дазволіць спэкуляваць на сіле беларускага адраджэньня, як гэта здаралася у мінулым і як гэта можа кім небудзь плянавацца на будучыну. Мы будзем стаяць на варце таго, каб Беларускі Народ змагауся толькі за сваю уладу на сваей зямлі. Урад сьведчыць што у гэтым напрамку ен ня звязан ніякімі забавязаньнямі і падобых забавязань ні пры якіх варунках ня дасьць.

Урад будзе дбаць аб тым, каб безупынна трымаць сталую, дзейную і усестаронную зьвязь з самымі шырокімі гушчамі Народу Беларускага. Мы дабьемся таго, каб кожды крык яго боляу, кождая страта яго, кождая яго думка , — была намі пачута і занатавана для чароднай адплаты. Мы дабьемся з другога боку таго, каб кожды крок Ураду у абароне правоу і інтэрэсау Народу быу ня толькі вядом сьвядомаму грамадзянству, але і кождай самай глухой весцы. У гэтым напрамку Урад Б.Н.Р. патрабуе ад кождага беларуса і загадвае, даводзіць да яго ведама аб кождым зьдзеку над беларускім селянінам з боку акупантау і паноу памешчыкау; аб кождай спалянай весцы, і пабуранай хаце; аб кождай закрытай беларускай школе; асабліва-ж аб кождым асадніку. З гэтай апошняй язвай, раз'ядаючай беларускае цела, Урад загадвае змагацца усмі спосабамі.

Урад будзе дбаць аб тым, каб у меру сваей сілы і магчымасьці падтрымоуваць нацыянальна-культурныя установы Края, якія зьяуляюцца правадырамі сьвядомасьці у массах і гварантыяй яго агульнага адраджэньня.

Урад Б.Н.Р. будзе імкнуцца да наладжэньня і захаваньня добрых адносін да усіх народау. Пачуцьце братэрства ен будзе захоуваць асабліва да тых народау, якія прыходзяць яму з дапамогай са шчырасьцю, выкліканай адзіна спачуваньнем Беларусі у яе цяжкім становішчы.

У адносінах да Саюзу Савецкіх Соціялістычных Рэспублік Урад Б.Н.Р. будзе дабівацца зьнішчаньня Рыжскага Трактату і адмовы Расіі ад прэтэнзій на беларускія тэрыторыі.

У барацьбе з Польшчай Урад Б.Н.Р. будзе дабівацца зьнішчаньня польскай акупацыі над Заходняй Беларусью і устанауленьня дзяржаунай граніцы на захадзе па Бугу і Нарву.

Урад Б.Н.Р. ставіць сваім заданьнем быць у зносінах са усімі урадамі сьвету, цікуючы за тым, каб яны зналі прауду аб Беларускім Народзе, аб яго жаданьні быць самастойным, аб гвалтах над ім яго ворагау. Шырокі сьвет павінен аб гэтым ведаць, каб не падтрымоуваць гвалтоунікау, уціскаючых нашу Бацькаушчыну. Нажаль, дзякуючы інсынуацыям Польшчы, у Эуропе і Амэрыцы часта абмылкова судзяць аб Беларусі, ня лічуць яе асобнай краінай, годзяцца з тым, што беларускаму селяніну добра жыць пад панскай апекай. Гэтая шкодная мана павінна быць нішчана у самым карэньню. Урад Б.Н.Р. лічыць абавязковым пры уселякіх варунках захаваць з гэткімі труднасьцямі устаноуленую зьвязь Беларусі з Захадам, дзеля абароны яе нацыянальных інтэрэсау.

Урад Б.Н.Р. павінен быць тым зьвяном, што еднае Беларускую эміграцыю з Бацькаушчынай. Роля эміграцыі для нашага адраджэньня вельмі пачэсная, пры чым першая роля безварункова належыць беларускай эміграцыі Амэрыкі і Канады. Браты нашы у далекай заокеанскай краіне не забылі, мы пэуны, сваей многапакутнай Бацькаушчыны і чакаюць спосабу прыйсьці ей у сумную гадзіну на помач. Урад Б.Н.Р. пасылае да амэрыканскай эміграцыі свайго паунамоцнага прэдстауніка і чакае ад яе споуненьня сваіх грамадзкіх абявязкау.

Не гледзячы на цяжкі матэр'яльны стан, Урад Б.Н.Р. ня мае такога доугу, які залічвауся-б на кошт Беларускага Народу. Рыхтуючысь і на

далей ня зьвязвацца падобнымі даугамі, Урад прыступаець да пераведзеньня самаападаткаваньня як жыхарства у краі, так і усей эміграцыі. Разам з тым Урад зробіць захады, каб праца яго, скіраваная на вызваленьне Бацькаушчыны, была матэр'яльна забяспечана і незалежна ад нікога. З гэтай мэтай ен выпускае унутраную дзяржаўную пазычку, аб варунках якой будзе выдан адпаведны статут.

НАРОДЗЕ БЕЛАРУСКІ

Шмат ахвяр палажыу ужо Ты на аутар свайго вызваленьня. Не адна сотка тваіх гэрояу загінула у няроунай барацьбе, не адна тысяча сыноу тваіх пазбаулена волі і марнуець свае маладое жыцьце за кратамі варожай турмы. Але ты ня хіліш сваей галавы пад чужацкае ярмо. Ты ведаешь, што як бы цяжка ня было змаганьне, яно усе-ж такі лепш за тую няволю, [у] якую хочуць уцягнуць цябе і тваіх патомных твае ворагі. Ведай, Беларускі Народзе, што перамога іх часовая. Рэвалюцыя, што разьбіла кайданы папярэдняй няволі, ня спынена. Яна йдзе сваім жалезным крокам, — і ужо набліжаецца пара, калі трэснуць краты тваей турмы і над галавамі тваіх сыноу узойдзе сонца свабоды. Ты жывешь непадзельны ад Буга да Дзьвіны, ад Немана да Дняпра. Ніякія межы ня могуць разарваць адзінства твайго духа і твайго цела. На усім абшары роднае Краіны жывеш ты аднэй воляй, адным жаданьнем — Вызваленьня. Гэтую зямлю, амытую тваім потам і тваею крывею, ты не аддасі нікому. Не адмовішся ты ніколі і ад сваей свабоды, што песьціу столькі вякоу у сваей душы. Сьвядомы свайго права — горда нясі цярпеньня сучаснага. Сьвядомы сваей сілы — спакойна чакай дванадцатай гадзіны змаганьня.

Усіх сыноу Беларускай Зямлі Урад Б.Н.Р. заклікае да барацьбы за Вольную Аб'еднаную Незалежную Беларускую Народную Рэспубліку.

П.КРЭЧЭУСКІ.
старшыня Рады Б.Н.Р.

А.ЦВІКЕВІЧ.
Старшыня Ураду і Міністр загр. Спрау.

Я.ВАРОНКА
Міністр прасьветы і Паунамоцны Дэлегат у Амэрыку

В.ЗАХАРКА.
Намесьнік Старш. Рады Рэсп. і вып. аб. Міністра Фінансау.

Л.ЗАЯЦ.
Дзяржауны Кантралер.

В.ПРАКУЛЕВІЧ.
Дзяржауны Пісар.

Коўна, 24 жніуня 1923 года.
582.1.04:073,074,076 — мк

3453. Паведамленьне для прэсы аб Дэкляцыі Ўраду БНР
582.1.04:075 — мк рас

3454. Ліст Аляксандра Карабача (Коўна) Мікалаю Янушкевічу (Коўна) за 24.08.1923 аб устрыманьні ад суду гонару з Ластоўскім з прычыны маральнага байкоту, абвешчанага апошняму 22.08.1923

582.1.44:074 —мк

3455. Ліст Антона Луцкевіча (Вільня) Аляксандру Цьвікевічу (Коўна) за 25.08.1923

Вільня, 25 жніуня 1923 г.

Міласьцівы Пане,

ня гледзячы на прыкрыя успаміны, якія падняло ува мне Вашае пісьмо, я пішу Вам, маючы на увазе перш за усё справу грамадзкую. А справа гэта, якая нас з Вамі зьвязывае, зайшла ў тупік, і мы тутака ня менш паважна шукаем выхаду з гэнага тупіка, чым Вы за межамі Бацкаушчыны.

Перад усім трэба проста глянуць праудзе у вочы і адкрыта сказаць: у асноуным пункце мы праіграліі. Праіграліі, бо тыя, хто узяу на сябе вясьці нашу дзяржауную справу, лягкамысна паставілі усё на адну стауку[1], заплюшчыушы вочы на тое, што іх партнэры былі звычайнымі палітычнымі шулерамі... Вось чаму праіграна уся стаука, вось чаму так цяжка знайсьці выхад з утварыушагася палажэньня...

Чым цяжэй нашае палітычнае палажэньне (а яно у Заходняй Беларусі пасьля ліквідацыі дз[я]ржаунае работы за граніцай ачывіста пагоршала, дый на Усходзе ішоушая так добра справа павялічэньня БССР на Вітэбшчыну, Магілеушчыну і Смаленшчыну прыпынілася!), тым болей выяўляецца патрэба абмену думкамі і стварэньня нацыянальнага цэнтру, які бы злучыу высілкі розных груп, скіраваныя да аднае мэты. І, зусім згаджаючыся з большасьцяй Вашых галоуных пунктау, на якіх Вы хацелібы будаваць «адзіную» партыю, я лічу аднак прапанаваную Вамі дарогу неадпаведнай.

Тварэньне партыйнае арганізацыі было-бы магчыма, калі-б мы усе былі на аднэй тэрыторыі, у межах аднаго, хоць-бы найбольш варожага гаспадарства. Цяпер-жа ужо хаця-бы з пагляду на немагчымасьць зносін цераз нялічаныя межы, з пагляду на немагчымасьць мець цантральны і ўсё абыймаючы орган у краю, а такжа немагчымасьць для партыі шырэйшае работы, калі-б ён быу па-за межамі краю, — гаварыць аб партыі ня прыходзіцца. Ня прыходзіцца яшчэ і затым, што нельга паутарыць старое абмылкі стауляньня усяго на адну стауку, а партыя бяз гэтага немагчыма. Немагчыма і тая штодзенная работа, якая кіруецца да захаваньня нашага нацыянальнага «я», прыкладам, пад уладай Польшчы, калі мы усе афарбуемся у адзін партыйны колер, калі паддамося пад кіраўніцтва загранічнага цэнтру: пры сучаснай усё пранікаючай правакацыі няма нічога тайнага, што заутра не станецца яуным (прыклад: у французскім пасольстве у Варшаве ёсьць арыгіналы дакумэнтау найтайнейшых з уласнаручнымі подпісамі Ласто[у]скага і другіх![2]). А як раз партыя як тып шырокае арганізацыі, найменш гварантуе тайну.

Вось тыя прычыны, тыя думкі, дзеля каторых праект партыі лічу немагчымым. Тым больш, што польская «ахранка», якая пэрлюструе усе пісьмы, асабліва загранічныя, напэуна ужо папярэджана аб Вашым праекце:

непэрлюстраваных пісем я не атрымліваю... Наагул лічу усялякую перапіску праз польскую почту ня толькі непажаданай, але проста шкоднай, хаця другімі дарогамі яе падтрымліваць трэба.

На мой пагляд, ідэалам была-бы такая зусім заканспіраваная цантральная арганізацыя, у якой маглі-бы злучыцца усе кіраўнічыя элемэнты, — ведама, апрача тых, хто заусёды служыу чужым багам і цяпер служыць ім. Хіба факты Вас аб некаторых асобах пераканалі: тое, што Вы апісывалі у Вашым папярэднім пісьме да Вільні, для Вас мо' было неспадзявана, але мяне зусім ня зьдзівіла... Але як гэта зьдзейсьніць пры нашым безграшоуі і немагчымасьці зносін праз граніцы? На гэта я пакуль што не знаходжу лякарства.

Думаю усё-ж такі, што трэба знайсьці спосаб найрацыянальнейшага выкарыстаньня нашых загранічных сіл. Гэтае пытаньне нас усіх тут вельмі займае. У прыложанай вырэзцы Вы знойдзеце адбіцьцё бадай-што агульнага пагляду віленскіх дзеячоу на гэту справу, дадаушы тое, чаго у газэтнай стацьці нельга было напісаць адносна да пасылкі людзей на Усход... Агульны наш пагляд: калі на мясцох ня будзем будаваць Беларусі — у сьвядомасьці народу, апіраючыся на ачывістай рэальнасьці: культурнанацыянальных цэннасьцях (ведама, праудзівых, а не кшталтам першага нумэру «Крывіча»!) — дык загранічная работа будзе пустой пагоняй за міражамі...

Вось што пішу Вам пакуль-што ад сябе самога. Спадзяюся, што у пачатку будучага месяца удасцца зрабіць невялікую нараду аб нашых агульных справах палітычных, дык мо' што новага з гэтага выклюецца. Тады знойдзем хіба магчымасьць падзяліцца гэтым і з Вамі, — ведама, не праз польскую почту.

Шлю прывет усім, хто, ня гледзячы на абмылкі, астауся верны нашаму супольнаму ідэалу. З пашанай

582.1.04:079 — мк

[1] Маецца на ўвазе супрацоўніцтва Ўраду БНР зь Літвой. [2] Дакумэнты найпраўдападобней перадаў французам А.Ладноў.

3456. Канвэрт

582.1.04:047

Адрасаваны: Wilno, Wilenska N8 m.3 Doktor Zofia Abramowicz. Штэмпэль: МАРЬИНА ГОРКА МИН; 27.8.23

3457. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.08.1923

Вельмішаважаны п. Вацлаве!

Пасылаю тут дзьве стацьці, з якіх адна й другая зьяўляюцца рэцэнзіямі. Выбачайце, што позна.

№2 «Крывіча» дастаў. Колькі прададзена №1 аканчальна ўстанаўлю 1 верасьня, але не балей, як 8 экз. №3 прышлеце толькі 15 экз. «Крывіч» выглядае нішто. На гэтым тыдні пастараюся прысласць крытыку Вашае тэрмінолёгіі. Чаму Вы не карыстаецеся тэрмінолёгіяй, апрацаванай у Менску і Вільні? Апрацоваваць тэрмінолёгію аднаму чалавеку зьяўляецца вялікай рызыкай.

Надрукуйце цяпер у «Крывічы» і друкуйце потым, дзе ў Чэхіі можна купіць «Крывіча». Зьмест прыкладаю.

Выбачайце, што так брудна, перапісаваць надта ня маю часу.

Ваш Янка Станкевіч.27/VIII 1923

Прага.

P.S. Ці ня можна пісаць стацьці на абодвух бакох ліста, каб меней каштавала пошта?

582.1.49:154&r

3458. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Мікалаю Янушкевічу (Коўна) за 29.08.1923

29.VIII.1923.
Коуна.

Высокапаважаны Таварыш Янушкевіч.

Азнаеміўшыся з заявай А.Карабача, пададзенай на Ваша імя, як аднаго з судзеу, у якой ен, ссылаючыся на рэзалюцыю «Дзеячоу Беларускай Калоніі у Літве» (ад 22 VIII г.г.) укланяецца ад таварыскага суда чэсьці, лічу абавязкам зазначыць:

Арганізацыя, мянуючая сябе «Дзеячы Беларускай Калоніі у Літве», — якой засланяецца А.Карабач і хаваючыйся за яго, яго дырыгент, нехта А.Цьвікевіч, які пахваляуся і пахваляецца «хараніць» мяне, — зьяуляецца пэрсональна у большасьці тэй-жа самай групай, якая мае адвагу мянаваць сябе Загр. Каміт. Б.П.С-Р. Перасеушы другім парадкам, перэмянаваушы сябе і дабраушы некалькі безадказных людзей, у тым ліку сваіх жонак, яны-ж самі, будучы пад судом чэсьці, галасавалі і выносілі рэзалюцыю «аб моральным байкоце Ластоускаму», гэтым засланяюцца каб унікнуць таварыскага суда чэсьці.

У данным здарэньні маем дачыненьне з самым грубым, з самым бяз сорамным шантажам, выклікаючым адзіна агіду чэсных людзей.

Прымаючы усе гэта пад увагу, я пакідаю за сабой свабоду выбару спосабаў дзеля высьвятленьня, укланіушыхся ад суда чэсьці клеветнікоу і шантажыстау.

З пашанай да Вас і удзячнасьцю за паднятыя труды, застаюся

В.Ластоускі.

582.1.44:075 — мк

Мікалай Янушкевіч — літоўскі эсэр.

3459. Паштоўка [G.Brocher?] (Лязана) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.08.1923 аб інфармаваньні швэйцарскага грамадзтва аб беларусах і Беларусі

582.1.49:131 &r

3460. Герхарт Гаўптман. Стрэлачнік Ціль. [Пераклад Кляўдыюша Душэўскага?]

582.1.47:045-075a

Дата невядомая. На адвароце арк.66 пачатак ліста, датаваны 24.09.1923.

3461. Ліст Палуты Бадуновай (Данцыг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.09.1923

Данцыг 4/IX 1923 г.

Даражэнькі сябер Вацлаў!

Пэўна ж, сябер Клаўдзій ўсе Вам раскажа аб чым і як мы з ім умовіліся. Але учора я атрымала «Вольны Сьцяг» №2 ад 29га жніўня г.г., дзе прачытала вось што: Яшчэ аб вобысках сярод беларусаў. «У ноч з 24га на 25 жніўня паліцыя была ў гэткіх беларускіх установах: Бел. Шк. Радзе, Сэкратырыаце Бел. Пасольск. Клюбу, Б. Грам. Сабраньні, Бел. Гімназіі, Бел. Кнігарні і г.д., а таксама і ў памяшканьні Старш. Бел. Пасольск. Клюбу Б.Тарашкевіча, п. Р.-Міхайлоўскага, Рэд. Вольн. Сьцягу Лагіновіча, пісьм. Л.Родзевіча і прочая бяз конца... Усюды шукалі Чарвякова і П.Бадунову, г.з. мяне ды чаму то прыплялі Чарвякова.

Ось чаму мы з Клаўдзіям нікога не дачакаліся з Вільні. Яны мяне выпусьцілі, а пасьля, мусіць, спалохаліся і давай шукаць, ажно мой, як кажуць сьлед прастыў. Нейкім цудам лічу я тое, што яны далі мне пашпорт, прост вышэйшая сіла дапамагла мне выратавацца ад гэтых гадаў. А Лагіновіч з Родзевічам яшчэ горача кожны дзень прасілі мяне застацца у Вільні, ці ў Горадні. Праўда, яны думалі мяне заканспіраваць, але ж дзе там! Столькі ўжо часу я там адкрыта жыла, усе шпікі ведаюць ды маюць маю фатаграфію: мяне ж у Навагрудку здымалі ў дэфэнзіве з дашкой на грудзях, бо пакуль Міхайлоўскі не пасьведчыў маю асобу (спэцыяльна прыязджаў у Нясьвіж, дзе я сядзела пад арэштам) дык мяне абвінялі, як бальшавічку.

Цяпер з гэтага усяго я зрабіла гэткія вывады. Ні ў Літву ехаць мне ня можна, бо тагды могуць моцна пацярпець усе бел. віленскія арганізацыі. Як бачыце палякі ведалі дзе я бывала і з кім мела сувязь. Цяпер яны даведаўшыся, што я у Літве могуць абвінаваціць іх у зносінах з Літвой праз мяне. Далей, што тычыцца зьезду, аб якім, мусіць Вам ужо казаў с<ябер> Клаўдзій, дык і ён, дзякуючы гэтаму павінен быць адложаным альбо ўжо прыдзецца сабрацца у Празе, у верасьні як і назначылі нашы сябры. Толькі Прага вельмі шумная. Дужа ўжо многа там беларусоў, а паміж імі непрыкметна прыюціўшыхся польск. шпіонаў. Ось чаму лічыла-б я лепш Бэрлін. Ну да яшчэ спішымся. А цяпер значa сьпяшу паведаміць Вас, што я еду ў Прагу праз Берлін. Ад Цвікевіча атрымала добры ліст, дыплематычн. паперу, абецанку здабыць візу і пяць даляраў. Зараз пішу яму аб тым, што еду ў Прагу праз Берлін. Можа Захарка туды пад'едзе, я напішу, каб мы маглі пагаварыць сурьезна. Яны ўжо хацелі ў Мамонькі і Грыба адабраць дып. пашпарты, ды яшчэ кароткі рукі. Перадайце сябру Душэўскаму, што грошы перадам яго сястре сама, але мусіць прыдзецца 5 д. дзяліць папалам, бо мне не хопіць даехаць да Прагі. Пасьля я уплачу ўжо ей рэшту.

Ага, дзеля таго, каб палякі супакоіліся, калі будзе мейсца, надрукуйце ў «Крывічы», што П.Бадунова выехала праз Данцыг і Берлін да Прагі, дзе думае заняцца побач з партыйнай працай — навукай. Гэта іх пераканае, што я не паехала ў Літву. Прыкладаю тутака ліст Маслоўскай з Бел<астоцкага> Вастрогу[1]. Калі можна будзе, дык надрукуйце яго асобнай лістоўкай, а ў журнале не памяшчайце, а то яго не [...]пускаць у Польшчу.

Цалую і мілую Стаху, цісну крэпка Вашу руку. Ваша сяброўка Палута.

З Бэрліна перашлю да Вас сваю драму для прагляду, завецца яна «Цётка». Я хочу даць у ёй характ. эпохі «Нашае Долі», а галоўнае асьвятліць асобу «Цёткі». Вельмі прашу, каб Вы перадалі яе на прачытаньне Кейрысу, каб Вы і ён напісалі мне у чым і як я памыляюся і што і дзе трэба дадаць, альбо замяніць.

582.1.49:152&r

[1] Дакумэнт №3443.

3462. Дзёньнікавыя нататкі Вацлава Ластоўскага з побыту ў Бэрліне й Жэнэве ад 7.09 да 28.09.1923

7.IX. Прыехаў у Бэрлін. Бачыўся з п. Пурыцкім, які выясьніў да рэшты плян намечанага паступаньня. Выясьнілася, што будуць у Жэнэве прэдстаўнікі ўсіх меншасьцей Польшчы: Літвіны, Беларусы, Украінцы, Немцы, Жыды, Рускія. (Barbarossastr. 13)

8.IX. Быў у нямецкага прадстаўніка (меншасьці нямецкай у Польшчы) Д-ра Бэнса. Ня мог з ім згаварыцца, бо ён не знае ніводнай славянскай мовы, а я замала знаю нямецкую. Умовіліся сустрэцца ў Пурыцкага заўтра.

9.IX. Быў у Прэзыдэнта Петрашэвіча. Гаварылі, між іншым аб выступленьнях робленых супроць мяне Цвік і Ко. Падышоў ў часе размовы Пурыцкі. Пры Пурыцкім Др. Петрашэвіч сказаў што мае інформацыі зусім згаджаюцца з тым, як інформаваў яго Олесьніцкі.

Прыехала Бадунова, была у гасьцінніцы, вечарам я яе здыбаў у Анэткі. Яна сказала што ехаць у Жэневу згаджаецца і лічыць паездку патрэбнай. На 6-ю в<ечара> запрасіў да сябе Пурыцкі мяне і Бадунову. У Пурыцкага сустрэў Пфайля, z якім умовіўся што да перакладу нашага мэморьялу. Пурыцкі сказаў што у яго былі Цвік і Крычэўскі і запрапанаваў сустрэцца нам у яго. Мы згодзіліся. Адбылася бурная размова пры прышоўшым разам з Цв. і Крэч. Краскоўскім і Пурыцкім. Бадунова востра станула супроць Крыч. і Цьвік. У выніку размовы Цвік. і Крыч. заявілі Пурыцкаму што калі я паеду у Ж<эневу> то яны будуць протэставаць. З гэтым вышлі. Вечарам гаварылі яшчэ у гасьцінніцы і умовіліся, што я і Бадунова прыедзем на дзень у Прагу, дзе будзе пастаноўлена Прэзыдыумам Рады хто паедзе.

10.IX. Працавалі з Бадуновай над мэморьялам. Аддаў паспарты візаваць у Літ. пасольства. Вечарам былі у Пурыцкага дзе адбылася сустрэча прадстаўнікоў меншасьці: Пурыцкі (Літвін), я і Бадунова (Беларусы), Петрашэвіч (Украінец), Др Б[э]нц (Немцы). Спэцыяльнай гутаркі аб справах не было, толькі перазнаёміліся.

11.IX. Працавалі мы з Б<адуновай> над мэморьялам, сьпяшаліся каб кончыць да 1й, г.зн. да поезду у Прагу, але аказалася віза не гатова.

12. Чакалі візы Б<адуновай>. Я здаў у пераклад мэморьял.

13. Візы усё яшчэ німа. Зрабілі націск на Пурыцкага.

14.IX. Адбылося сабраньне у Ропа. (Kurfurstenstr №107) былі: Я, Бад., Пур., Рэйніс, Петрушэвіч, Др. Бэнс. Абмаўлялі парадак выступленьня.

15. Віза для Б<адуновай> гатова. Затрымка была праз нас што трэ было зьмяняць пашпарт на літоўскі.

А 1.15 ад'ехала у Прагу цьвёрда абяцаўшы вярнуцца у нядзелю рана каб вечарам выехаць разам у Жэнэву. Быў у мяне Пфайль з перакладам які я прачытаў з праф. Рэйнісам і парабіўшы папраўкі аддаў у перапіску на чыста.

Будучы у мяне Пфайль падняў гутарку, што ён добра знаёмы з Ракоўскім, які цяпер назначан паслом у Лёндан, што ці ня добра было-бы з ім пабачыцца і пагаварыць.

16.IX. (Нядзеля) Раніцой званіў Пурыцкі каб зайсьці да яго пазнаёміцца з жыдоўскім прадстаўніком. Мы з Рэйнісам пайшлі. Жыдоўскі прадстаўнік Др. Вікер(т?) выедзе пару дзен пазьней. Яму я перадаў білет куплены для Бадуновай.

Выехаў я з Рэйнісам а 6.50 з Ангальтэр бангофу.

Забыўся адмеціць. А [12]ай гадзіне атрымаў я тэлеграму ад Б<адуновай> з Прагі гэткага зьместу: «таварышы рашуча процiў маей паездкі рабіце як самі думаеце». А знача — яна ведае, што я думаю каб ехаць.

17.IX. Быў у дарозе і вечарам прыехаў у Жэнэву. Затрымаўся Hotel des Alpes.

18.IX. Злажыў візыты Лозінскаму, Сідзікаўскаму, Янінасу, Раўлінайтису.

19. Пабачыўся з Gabrysam і Др. Янам. Аддаў ў пераклад на англіцкую мову мэморандум і ў корэктуру французкі пераклад. Была сустрэча з іншымі: Петрушэвіч, Лозінскі, Gabrys, Я, Рэйніс. Гаварыў з Янінасам.

20. Напісаў Кляўдушу аб паездцы ў Прагу. Улажыў тэкст да агульнай рэзалюцыі.

21.IX. Адбылося сабраньне у Hotel d'Ekiu у украінцаў

22. Здаў мэморьял у друк

23. Гасьціў у Габрыса ў горах. Бачыў у яго стараславянскі псалтыр пісаны уставам з застаўкамі.

24. Адбылося чароднае сабраньне

25. Было бурнае сабраньне з прычыны Вікера, які дамагаўся каб зварот у Лігу Нац. насіў легальны характар, а не палітычнай дэмонстрацыі. Урэшце пастаноўлена было без жыдоў рабіць выступленьне.

26. Чароднае сабраньне бяз Вікера і рэдагаваньне супольнай рэзолюцыі зьезду. Рэзолюцыя прынята.

27. Былі у Лорда Робэрта Сэсіля і у Нансэна.

18. Сьніў Стаху сівой.

28. Перад выездам з Жэнэвы сьніў што я знашоў ў зямлі скарб з сярэбраных манэт: што капну то горсьць серабра кругом старога пня, ўрэшце адвярнуў кавалак пня, аж і той сярэбраны. Былі пры гэтым Юстын і Бацька. Ўвесь засыпаўся серабром аж па грудзі.

[Нататкі на адваротных старонках:]
[8r:]
Dr. Владим. Акимович Викер
Barbarossastr. 14
Тел. Notendorf 61-39

Dr. Bruns
Turmstr. 76a

* Postsdamer str. 121c
Союз Рускіх Ар[...]

[9r:]
Пурыцкі Barbarossa
str. 13

Сидзикаўскіс
Kurfurstendam
242 Litauische
Gesandschaft

Dr. Pietruschewitz
Petruševič
Eizenacher str. 59
Portal I

[10r:]
Грыб
Radstin u Prahy
Č 266 u p. Hermanove
pro T.Hryb
Tsechoslovakie

R.Z.[1]
Warszawa
Chmielna 68, 32

Princenstr 15a
bei Fr. Reiman

[11r:]
A.Duschewska
bei Wienieke
Filanderstr 34
Berlin Steglitz

John Charapuk
Whiterussian Kommittee
1632 N. Robejstr.
U.S. of America
Chichago Il.

[12r:]
Алексей Александравіч Пфайль

[13r:]
Profesorius
Rejnis, Laisve alleja
61.

Dr. Петрушэвіч
Berlin,

[14r:]
Рэйнскі вадапад
пры ст. Шафгаузэн[2]

Herrn
D.Aneckstein
Schöneichs
bei Berlin Friedrichshagen

Rahnsdorferstr. 72
bei Schülter

[15r:]
Адрэс Палуты Б.
Filanderstr. 34
bei Frau Neuman
Duschewska.

Віталій Копысевъ
Полёва 8
W

[16r:]
Між красой дабром
мысль жывым
скача серабром
прышчэ
582.2.60:008-018 — р

[1] Р.Зямкевіч. [2] Першы раз В.Ластоўскі наведаў Рэйнскі вадаспад разам зь Іванам Луцкевічам у 1916 годзе. Памяці І.Луцкевіча прысьвечаны верш «Рэйнскі вадапад» (надрукаваны ў №2 часапісу Крывіч за 1923 год).

3463. Запіска Палуты Бадуновай (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Бэрлін) за 9.09.1923, пакінутая ў гатэлі

г. Ластовский

Я приехала из Данцига повидаться с Вами. Остановилась у Душевской. Сегодня же надо нам во что бы то ни стало повидаться.

Уваж. Ваша Тетушка Палута
582.2.60:085 — ра

3464. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 10.09.1923

10.IX.1923

Вельміпаважаны Пане Вацлаве!

Дастаў ад Вас ліст і чэк на грошы (а па чэку й грошы). Вельмі дзякую. Пасылаю тут расьпіскі (дзьве).

Новай часопісі ў Празе няма. Гэта Украінцы кажуць аб «Бел. Студэнце», якога мы пасылалі ў усе белар. арганізацыі й сяр. бел. школы

па некалькі экзэмпляроў а так сама пасылалі і будзем пасылаць паасобны[м] людзём, якія ў даным прыпадку маглі замяніць арганізацыі.

Аб тым, што Вы прыслалі 20 дал. на «Бел. Ст.» я нікому не казаў апрача сяброў рэдакцыі. Расказаў-жа аб гэтым публічна дырэктар украінскіх матуральных курсаў у Езофове здаецца Крывец ці Швец. Цяпер як Вы прыслалі проста па чэку мне, дык аб гэтым ніхто не даведаецца. Ляпей пішэце проста на маю кватэру (Praha II, Ječná 15 u pana Janče), бо Вяршынін хоць і добры чалавек, але калі слаць праз яго, дык ён аб усім што пішацца можа даведацца.

Гадавік «Н<ашай> Н<івы>» 1913 году выпішу. Ужо напісаў, каб прыслалі.

«Крывіча» прынялі ў Празе нішто, але Грыб і найбліжэйшыя да яго вельмі «Крывіча» ня любяць, хоць і прымітыўным хлапцом ня могуць давесьці чым ён благі.

Вучыцца тут у Празе адзін студэнт Беларус з Лепельшчыны Янка Капецкі. Я яго бліжэй знаю. Хоць ён дастае стыпэндыю праз маскоўскі (расейскі) камітэт, але сьвядомы Беларус. Гэта культурны чалавек, ён ужо вэтэрынарны лекар (вэтэрынарыю скончыў у Расеі) і цяпер у Празе на апошнім курсе мэдыцыны. Ён піша навуковыя стацьці па вэтэрынарыі й гігіене. Друкаваў іх дагэтуль у маскоўскіх (расейскіх) журналах, але цяпер хацеў-бы друкаваць ў беларускіх. Дык напішэце калі ласка ці маглі-б дру[ка]вацца яго стацьці па вэтэрынарыі й гігіене ў «Крывічы».

З паважаньнем Я.Станкевіч.

P.S. Пасылаю тут разам стацьцю «Патрэбна борздая падмога»[1] і заметку ў хроніку. Напісаў усю праўду й шчыра. Апрача гэтага, ці ме маглі Вы пастарацца падмогі на Беларускую Гімназію ў Вільні ад Літоўскага Ураду? Калі гэтай падмогі ня будзе, дык плата за навуку ў гімназіі ў Вільні ўстаноўлена будзе высокая і там астануцца адны жыды, паповічы й г.п., бо ўвесь сялянскі элемэнт прымушаны будзе выступіць [з] яе.

582.1.49:112&r

[1] Артыкул надрукаваны ў №4 «Крывіча» за 1923 год.

3465. Тэлеграма Палуты Бадуновай (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Бэрлін) за 15.09.1923

Lastowski berlin
hardenberg hotel am 200 =
praha: 4189 17, - 15, - 22, - 25, -
=nasy tawarysy rasuca procis majej pojezdki.
rabicie jak sami dumajecie = paluta +

582.2.60:084 — а

3466. Ліст Вацлава Ластоўскага (Жэнэва) Леапольду Родзевічу (Вільня) за 20.09.1923

Высокапаважаны пане Л~~еапольдзе~~.

Бачыўся з цёткай П<алутай>. Вельмі дзякую усім, хто не даў веры напасьцям супроць мяне. Ўся гісторыя в<ельмі> несмачная бо абаснавана на асабістых амбіцыях, а не на стасунку да справы.

От-жа у рэчах першай грамадзкай вагі мне трэба бачыцца або асабіста з Вамі, або з С<~~ташкевіча~~>м і то чым хутчэй тым лепей. Пішыце адповедзь-павядомленьне на той адрэс што пішэ аддаўчыня гэтага да Стахі, затрымайцеся там, дзе затрымлівалася яна калі бачылася са Стахай. Акром Вас двох, знача С., ніхто аб гэтым не павінен ведаць.

Ваш, заўсёды шчыра паважаючый Вас — Власт.

20.IX.

82.2.60:049 — рк

3467. Ліст Вацлава Ластоўскага (Жэнэва) п. Язе (?) (Вільня) за 20.09.1923

Шаноўная і даражэнькая п. Яга!

Засылаю сэрдэчнае павітаньне Вам з Швайцарыі, дзе я часова баўлю. Буду в<ельмі> удзячан калі прыложаны да гэтага лісток перадасьце п. Леапольду Родзевічу, памагчымасьці каб ведалі аб ім толькі Вы і ён. Затым ўсяго лепшага шчыра сэрдэчны — Вацлаў.

20.IX.23

582.2.60:050 — рк

3468. Ліст Юозаса Пурыцкіса (Жэнэва) Вацлаву Ластоўскаму (Жэнэва) за ??.09.1923

582.2.60:051 — ра

Дакладная дата невядомая.

3469. Ліст Кляўдыюша Душэўскага (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Бэрлін) за 21.09.1923

Даражэнькі Вацлаў.

1. Захарка гневаецца чаму Ты паехаў у Жэнэву, а як яму сказалі, што дзякаваць Богу, што будзе хто небудзь ад беларусоў тамака, то ён сказаў: «Усе гэта добра, але чаму не з намі?

2. Яны відаць хочуць склікаць конфэрэнцыю. Мала я пакладаю надзей на конфэрэнцыю, дзе будуць верхаводзіць людзі проблематычнай этыкі. Конфэрэнцыя ім патрэбна на тое, каб пасьля мець мотывы на зьбіраньне (рачай стрыжэньне) грошы.

3. Карабач і Палікша яшчэ жывуць у Міністэрстве у кабінэце міністра, і здаецца выяжджаць не зьбіраюцца.

4. Слоўнік у друк не здадзены, бо ня ведаю хто і як павінен афармляць «заказ». Наагул цягнецца гэта справа лішне ўжо доўга, аж абрыдла.

5. У мяне шмат часу выходзіць на рэмонт, які яшчэ не закончаны.

6. Экспэдыцыя зроблена уся. Курсантам разаслана.

7. Ня ведаю, што рабіць з чытанкамі?

8. Пару дзён таму гаварыў з П. Боевым. Ен называе Цьвікевіча і к-о «глупымі дзяцьмі» і нават горш.

9. Ёсьць магчымасьць адчыніць некалькі пачатковых школ: ёсьць вучыцялі і грунт. Як прыедзеш Ты і п. Іонінас, тады пагаворым.

10. У мяне вельмі цяжка з грашмі.
11. Пішу у 4№ Крывіча тое-сёе.
12. Нудна.
13. (ня хочу запаўняць)
14. Бывай здароў. Кланяйся Палуце[1] і Анэтцы[2].
15. Перадай Палуце, што толькі пры бязумоўнай сталасьці, шчырасьці і пашане магчыма супрацоўніцтва паміж людзьмі наагул. Без бязумоўнага даверья і адданасьці супрацоўніцтва немагчыма. Пішу гэта ведаючы наперад, што Палута можа быць добрым таварышом. Няхай яна ведае, што лепш мець аднаго таварыша, але пэўнага, чым 1000 ды «часовых». Тутака аб ёй пушчаюць чуткі што яна гістэрычка. Хто гэта робіць, лёгка дагадацца.
16. Твая Панічка здарова.
17. А.Бухаў[3] зьмесьціў фэльетон аб Лізе Нацый на аснове «Крывіча». Вырэзку не пасылаю (згубіў).

Покуль што бывай здароў.

КДуш...

P.S. 18. П. Крупчанко раіў Табе угледзіцца з палк. Коновальцем праз п. Ільніцкаго. Адрэс пасылаю пісаны рукой п. Крупч. але можаш дастаць у п. Прэзыдэнта Петрушэвіча. Апошняга адр. Motzstr. 78(?)

582.1.49:150&r

[1] Бадуновай. [2] Ганне Душэўскай. [3] Рэдактар ковенскай газэты «Эхо».

3470. Mémoire des Lithuaniens du territoire de Vilna, présenté au Conseil et aux Délégués à la IVme Assemblée de la Société des Nations. Genève, 23.09.1923

582.2.60:001-007 — д
582.2.60:019-025 — д
582.2.60:026-032 — д

3471. À la Haute Société des Nations à Genève [Mémoire de l'Union des Allemands expulsés de Pologne]

582.2.60:033-040 — д
582.2.60:041-048 — д

Дата невядомая.

3472. Паштоўка Віктара Вальтэра (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.09.1923

Прага. 25/IX 23г.

Вельміпаважаны грам. Рэдактар!

Выбачайце, што я турбую Вас сваёй пісулькай, адрываючы, магчыма, ад бягучай справы, але ўсё ж ткі я хацеў бы троху напомніць Вам аб сабе, аб тым, ласьне, што мной было адаслана Вам апавяд. «Аднабочнікі», і што дагэтуль, ня гледзячы на маю просьбу выслаць як найхутчэйшы адказ, адказу няма. Дзеля гэтага ласкава прашу Вас не адмовіцца адказаць караценька: 1) ці атрымалі Вы маё апавяд., ці не? 2) Ці будзе яно друкавацца?;

калі будзе, дык калі й на якіх умовах[1]. 3) калі не, дык не адмовьце, я Вас асабліва аб гэтым прашу, адаслаць непрыняты рукапіс...

Затым, застаюся з шчырым паважаньнем

Вальтэр Віктар.

Адрэс:

Česko-Slovensko. Praha, Košiře. Švédska ul. č.737.

Выбачайце яшчэ раз за турбаваньне.

ВальтэрВіктар

582.1.48:040&r

[1] Апавяданьне «Аднабочнікі» было надрукаванае ў №4 і 5 часапіса «Крывіч» за 1923 год.

3473. Résolution des représentants ukrainiens, biélorusses, et lituaniens, opprimés par la Pologne et des Allemands expulsés par le Gouvernement polonais, réunis en Conférence à Genève, les 23/25 Septembre 1923

582.2.60:052 — шк анг
582.2.60:095 — шк фра
582.2.60:053 — шк фра
582.2.60:096 — шк анг
582.2.60:097 — шк анг
582.2.60:098 — шк анг
582.2.60:099 — шк анг

3474. Суправаджальны ліст да рэзалюцыі і мэмарандумаў прыгнечаных Польшчай народаў, пададзеных Лізе Нацый у Жэнэве 25.09.1923

582.2.60:054 — шк фра
582.2.60:055 — шк фра

3475. À la Haute Société des Nations à Genève [Mémoire des représentants du peuple Biélorusse opprimé par la Pologne]

582.2.60:062-066 — д фра
582.2.60:067-071 — д фра
582.2.60:056-061 — д анг
582.2.60:086-094 — мк фра

Дата невядомая.

3476. Communiqué aux Membres du Conseil. C.552.1923.1. Protection des minorités. Questions de procedure. Bericht des Baron de Rio-Branco.

582.2.60:072-077 — мк

Дата невядомая.

3477. Тэкст выступу прадстаўнікоў прыгнечаных Польшчай народаў на паседжаньні IV Асамблеі Лігі Нацыяў (?)

582.2.60:078-081 — мк

Дата невядомая.

3478. Ліст беларускіх палітычных зьняволеных зь Беластоцкае турмы

582.2.60:082 — мк

Дата невядомая.

3479. Нататкі на аркушы паперы

Barbarossastr. 13
bei Woelmer
Tel. Lütuw 42-04

582.2.60:083 — р

Дата невядомая.

3480. Ліст Палуты Бадуновай (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.09.1923

Так, так, сябер Ластоўскі, Вы былі правы калі пісалі Душэўскаму, што цяжка працаваць, калі няма каму верыць, няма на каго палажыцца, няма з кім параіцца. Пэўна, так кепска працаваць, цяжка, немагчыма. А я, родны мой, зараз якраз стала ў такое бязвыходнае палажэньне. Мая доля такая, аб якой Купала кажа: Што дасі заўтра, доля зьмянлівая, спадзяюся пацехі я мала; адно знаю, што ўсе нешчасьлівае ты мне толькі дагэтуль давала.

І глядзіце, што зрабілася, ці лепш, што нарабілася. Паехала да Прагі на адзін дзень, каб вярнуцца зараз жа і ехаць да Жэневы і заместа гэтага цяпер только ось учора паднялася з ложка, у яком пралежала тыдзень хворая і гэта не ў Празе, а ў Бэрліне, у Анэты Душэўскай. Здарылася усе так. Пакуль мы з Вамі пісалі мэморьял у абарону нашага бязмерна задушаннага палякамі народу, — Цвікевіч і Краскоўскі, які аказаўся інтрыганам лепшым ад усіх чорных сілаў, — накручавалі у Празе сваю юдину валынку, ось затое атрымалі мы тэлеграмму з подпісам Язэпа. А калі я прыехала, дык Тамаш Грыб і Мамонька усю ноч правялі ў самай гарачай сварцы са мной. Яны даводзілі мне, што я не маю права ехаць да Лігі Нацыяў, як сацыялістка, а гэта, мол, арганізацыя буржуазная. Я ім адказавала, што цяпер сацыялісты усіх кірункаў зьмянілі сваю тактыку і калі раней не йшлі на выбары разам з буржуазіяй, дык цяпер ідуць, не баючыся сядзець з імі радам. Што нам, бел. сацыялістам, якія толькі адны і выступаюць на абарону праў свайго гаротнага сялянскага народу няма нават аніякага граха усюды дзе толькі слухаюць нас гаварыць аб гнеце і бядзе свайго народу. У нас няма буржуазіі, ну і хто ж будзе гаварыць з міравой бурж. з буржуазнымі гаспадарствамі калі не мы. А мы замаўчым, і ўсё замаўчыць... а палякі, польскія магнаты толькі падзякуюць нас за гэта і назавуць сваімі сябрамі. Нарэшце, я казала, што буду ў Жэневе выступаць толькі перад сацыялістычнымі арганізацыямі, што перад працоўнымі усяго міру падыму голас мой на абарону свайго народу. Дзе там! Яны і слухаць не хацелі. Тамаш ажно грозіць пачаў — паедзеш, дык будзем у газэтах пратэставаць, напішам, што не маеш права выступаць ад партыі, бо партыя не дала згоды. — Я буду выступаць не ад Вас, сказала я, упаўшы таксама ў страшэнную злосьць, — вы посьле гэтага не сацыялісты, я ня

хочу з Вамі працаваць. Тагды яны на другі дзень пачалі мне безадступна даводзіць, што я пагублю усю партыю, калі не застануся у Празе, што усе ў іх развалілася, што моладзь уся шукае новых дарог і не знаходзе, што (гэта ужо казаў Мамонька па сэкрэту) Тамаша усе перасталі лічыць за сацыяліста, і нават Дварчанін, старшыня парт. камітэту і той адваліваецца і хоча перайсьці да камуністаў. Што толькі уся надзея на мяне была і раптам я выезджаю. — На вошта ж Вы мяне цяпер звалі, казала я ім, я зьездзіла бы ў Жэневу і вярнулася да Вас. — Мы думалі, што ты не прыедзеш саўсім (мусіць чулі, што я не хочу жыць у Празе, а ў Бэрліне).

На другі дзень адбыўся урадовы сход, на каторым Цвікевіч трымаў сябе недазваліцельна — чытаў дагаворы з літвінамі, пісьмо Міхайлоўскага да яго і гэта пры Станкевіче і яшчэ нейкіх невядомых студэнтах, мо і польскіх шпіках! Ці можна з ім вясьці працу? Гэта ж сорам, а не дыплёмат. Тутака прыйшлі да згоды, што ніякіх пратэстаў яны проці Ластоўскага пасылаць ня будуць, калі, мол, Бадунова не паедзе ў Жэневу. Цяжка мне было, так цяжка, што я ледзьве трымалася на нагах ад усяго таго гвалту, крыку, перасудаў, інтрыг, якія яны паднялі тутака. Зноў яны выступалі проці Вас, зноў у соты раз я абаранялася. Нарэшце, я выйшла вечарам уже позна з hotela і пайшла на вакзал. Грыб і Мамонька йшлі за мной і чаго толькі яны не гаварылі мне, якія гарачыя словы, якія скорбныя вочы, якія папрокі, што усіх убіваю, што усё разбіваю, што Ластоўскі сам усе зробіць, што калі проці яго хто выступіць, тагды уся партыя выступіць проці Ураду... Што мне было рабіць, я згадзілась, яны паслалі пры мне Вам тэлеграмму.

Назаўтра Грыб, адкрыта не выпаўняючы свае слова, выступіў проці Вас на сходзе гэтак востра, гэтак нядобра, як некалісь, памятаеце у Менску пры маім ад'ездзе ў Маскву а Вашым загранiцу. Я не развітаўшысь з ім выйшла са сходу і разам з Мамонькай мы прышлі да перакананьня, што Грыб губіць сябе і свой сацыялістычны твар, што ён трымае сябе горш, чымся абывацель, што яму, мусіць, дзяржаўная гульня падабаецца больш чымся праўдзівая сацыялістычная работа, што ён пастаноў нашых партыйных не трымаецца...

Грыб і сам зразумеў, мусіць, свае паведзеньне і два дні не зьявіўся да Мамонькі, дзе я жыла. — Бачыш, Язэп, сам сказала я М.-ке, мне тутака інтрыжкамі займацца некалі, я прапусьціла яшчэ толькі два дні (было 19-е) і яшчэ даганю Ластоўскага. Мо я не паеду ў Жэневу, мо ў другім горадзе буду весьці агітацыю і тым дапамагаць Власту у яго імкненьні абараніць народ свой, але я еду, совесьць мне не дазваляе быць тутака ні хвілінку больш.

Вечарам 19га, я тайна, не развітаўшыся ні с кім, апрача Мамонькі з жонкай, якія са слязамі правадзілі мяне на вакзал, выехала да Бэрліна. Але на жаль я ехала простым пачтовым поездам цэлыя суткі, была разстроена да варьяцтва, нават, мала помніла куды і як еду і на перасадках у Боденбахене і Дредздене так прастыла, што з 20 ажно 28 праляжала ў ложку з павыш. темпэтарурай. Якраз учора прыехаў Клаўдзій і перадаў мне аб тым, як Вас растроіла мая тэлеграмма, з якім горкім пачуцьцем пакінулі Вы Бэрлін. Родны мой, выбачьце мне, але ж гэта няхай мне і Вам будзе навука — больш Грыбоў ня слухаць, а рабіць так, як падказвае

ўласны розум. А ён нам падказваў правідловую дарогу тагды, калі мы рашалі адразу ехаць у Жэневу, а потым заехаць да Прагі. Але ж на жаль Анэта не дае мне дакончыць, дужа сьпяшае ісьці да пошты.

Бывайце здаровы. Душэўскі заўтра едзе да Прагі, няхай пагаворыць, як не лайся, а трэба згаварывацца. Ды яго якраз яны там да нябёс чамусь хваляць, прасілі, каб я яму наісала і пазвала пераехаць на жыцьце і працу да Прагі. А я буду чакаць Вашага прыезду, бо даведалася ад Клаўдзія, што Вы на гэтым тыдні прыедзіце.

Цяпер усе з Вамі абгаворым, а потым будзе відна, дзе жыць, куды ехаць, што рабіць. Ужо учора мела урок нямецкае мовы, на усіх парах буду гатавацца.

Пішыце да Анэткі.

Палута.

З Днем Ангяла усе вітаем Вас і жадаем многа, многа жыць на сьвеце і працаваць для свайго народу.

Anetka

А Клаўдзій сьпіць.
29-IX-1923 г.
Бэрлін.
582.1.49:145&r-146&r

3481. Розныя кароткія нататкі Эдмунда Зузэміля, дасланыя для друку ў «Крывіч»

582.1.47:081-095

Дата невядомая. Сярод іншага: артыкул у «Deutsche Rundschau» за 7.10.1923(?) — пра Крывічоў і «Крывіч»; «Бѣлорусскія слова въ нѣмецкомъ языкѣ».

3482. «Хлеб салдацкі — не пшаніца...». Пераклад Вацлава Ластоўскага (?)

582.1.48:285&r-288&r — рк
582.1.47:109-110 — р В.Ластоўскага

Дата невядомая.

3483. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Коўна) рэдакцыі газэты «Вольны Сьцяг»

582.1.14:041&r

Дакладная дата невядомая. Аб Заяве Ўраду БНР бягучай сэсіі Лігі Нацый пра становішча беларускага жыхарства пад польскай акупацыяй. Нататка пра гэта надрукаваная ў: Вольны Сьцяг. №16. 5.10.1923.

3484. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Коўна) Антону Луцкевічу (Вільня) за 6.10.1923

6 кастрычніка 1923 г.

Глыбокапаважаны Пане!

Пісьмо Вашае ад 28 жніуня атрымау толькі праз месяц. З прычыны яго мы мелі тутака некалькі нарад, на якіх абгаварывалі усе закранутыя

Вамі пытаньня. Думка Ваша аб тым, што справа праіграна дзякуючы таму, што была «адна стаука» — да пэунай меры правільна. Але не менш прычынілась да проігрышу «акція пары гнѣдых»[1], якія без ніякага сораму пайшлі на службу, на цеплае месца і тым разарвалі усю сістэму пэрэгавораў. Імя гэткім «гнѣдым» адно — сволочь, хлебная публіка, чыноунікі. Але ліха з ім! Што да пытаньня аб тым, ці лепш утварыць нацыянальны цэнтр, які бы злучыу высілкі рожных груп, ці адзіную партыю , — я адкажу: патрэбна і першае і другае. Партыя на мой пагляд абавязкова патрэбна таму, каб даць магчымасьць шырокаму (неакрэсьляна!) кругу асоб браць удзел у палітычным жыцьці края, — а нацыянальны цэнтр, — каб мець формальны кіраунічы орган для пэунай конкрэтнай працы. Партыя патрэбна, каб на аснове яе программы, — якая будзе вядома усім, хто гэтым цікавіцца, — зьбіраць сілы людзей пэуных палітычных паглядаў, сімпатый, соц. інтэрасаў і г.д. Партыя патрэбна для таго, каб весьці барацьбу з іншымі палітычнымі групіроукамі (прыкл. комуністамі, якія як мне вядома бьюць нас, — нацыяналістаў без паліт. программы), каб весьці прапаганду пад пэуным лезунгам (ня толькі нацыянальным), тварыць літэратуру і інш. Нацыянальны цэнтр патрэбны, каб аб'еднаць выдатнейшыя сілы (кіраунікоу) магчыма нават розных паглядаў. Але мне здаецца што сярод беларускай працоунай інтэллігэнцыі («балахоуцы» і уся іхняя «группа» сюды ня уходзюць!) і сьвядомых элемэнтаў селянства няма вялікіх разьбежнасьцяу у разуменьню палітычных і соцыяльных патрэб Беларусі. Таму мне здаецца, што усё жывое, апрача рознай гнілізны і спэкуляцыі (+ глупасьці) — усе нацыянальна і палітычна здаровае (+ разумнае) можа вайсьці у новую нацыянальную партыю, якая фактычна і будзе нашай адзінай сур'езнай партыяй. Гэта была-б нашая сіла!.. Программа яе у агульных рысах можа быць угледжана у нашай дэклярацыі, тэкст якой да гэтага далучаю. Мне здаецца, што без партыі — прадуманай, сур'ёзна і сумленна збудаванай, дысцыплінаванай, — нельга весьці як сьлед палітычнай барацьбы. Што да легальнасьці, ці нелегальнасьці партыі, — дык гэта пытаньне другараднае. Калі бел. школа нелегальна, дык трудна думаць, што-ж можа быць па істоце легальна. Але па форме я-б думау, што найлепш было-б дабіцца яе легалізацыі. Для палітычнай партыі гэта лягчэй чым-сь для чаго іншага. Дзе-б павінен быу бы быць ЦК — гэта так сама пытаньне далейшае; лепш, каб ен быу у краю, але можа быць і за межамі яго. Важна толькі, — ці лічыце Вы нормальным той стан партыйных рэчау, які пануець у нас, ці не; ці лічыце Вы, што тое, што есьць — найлепшае, ці, наадварот, далекае ад звычайнага добрага. — Што датыча адносін паміж ЦК і нацыянальным цэнтрам, дык яны самі сабой установяцца. Гэта, як я казау вышэй, будуць дзьве па істоце розныя установы, паміж якімі я не прадвіджу ніякай конкурэнцыі.

Наскольк я разумею, формальны нацыянальны цэнтр у данны момант есьць (Урад БНР). Я наперад гаджуся, што шмат што у ім далека ад ідэалу. Але пакуль што гэта «нешта», і мы яго трымаемся. Мы многа думалі аб тым, як палепшыць яго, шмат гаварылі на гэтую тэму з Барадой[2] у часе апошняй сумеснай падарожы, але так нічога практычнага і не прыдумалі. Бо, як ведама, ва усім першую ролю граець нэрвус рэрум, якога у нас апошнім часам брак і нават вялікі. Мы усе чыста згодны з тым, каб

з Вільні пад'ехалі людзі, — выдатнейшыя, для адпаведнай працы. Думалі між іншым аб Вас і другіх. Але як гэта зрабіць, чым забаспечыць? З другога боку цяжка бачыць, што наш жыцьцевы (неформальны!) цэнтр — Вільня, — слабеець на сілах. Мы тут пераконаны, што для бел. руху важней, каб былі кіраунікі на мяйсцох, чым на эміграцыі. Урэшці, што — і як — і калі зрабіць, каб запрауды мець кіраунічы цэнтр, адпаведна аутарытэтны і адпаведна зьвязаны з краем — аб гэтым трэба безупынна думаць і клапаціцца. Цяпер, калі да пэунай меры мы знайходзім базу для працы у Празе — можна мяркаваць аб гэтым больш менш практычна. У кожным разе маем падставу сказаць, што калі з Вільні прыедзе туды адказны працаунік, каб браць учасьць у нашым цэнтры, — дык матэр'яльна (г.зн. на жыцьце) ен будзе забаспечан. Да таго — хутка павінна выясьніцца справа з Амэрыкай[3]. Маем надзею, што тагды будзе лягчэй дыхаць.

У справе партыі я гутарыу вясной з Сымонам[4]. Перэгаварыце з ім яшчэ раз і калі Вільня знойдзе патрэбным яе закладаць, дык паведамьце нас сюды. Мы з свайго боку даложым высілак, каб апрацаваць як сьлед праграмму. Трэба цяпер жа перэгаварыць з кім сьлед аб легалізацыі партыі. Думаю, што у гэтым дапаможа нам Сеймовая лявіца. Матэр'ялу для першаг[а] партыйнага маніфэста у мяне знойдзецца, — але ня хочацца рабіць гэтага тут у эміграцыі; трэба каб гэта йшло з краю, а гэта у сваю чаргу магчыма толькі пры варунку, калі на мяйсцох, г. зн. галоуным чынам у Вільні сярод сур'езных таварышоу адбылось падобнае рашэньне. Трэба каб у беларускай Вільні стварылась адпаведная группа асоб, лічучых за свой абавязак прыдаць нашаму нацыянальнаму руху цяпер жа пэуны соцыяльна-палітычны зьмест і узяць у гэтым сэнсе кіраўніцтва у свае рукі. Няужо-ж бяз конца захоуваць за анальфабэтамі громкія тытулы, калі ім трэба вучыцца? (што яны цяпер робяць, але, прызнацца, вельмі дрэнна[5]). Няужо-ж з другога боку сьпіращца на фікцыі, ці у найлепшым выпадку на программу «чужых»? Паутараю, я пераконаны, што ужо час настау, каб мець нешта свае і сур'езнае. Я ведаю, што гэткае пераконаньне ня первы месяц, а мо' і год — жыве сярод украінцаў. Тут вядомы паралелізм, — фазы народнага руху. Больш таго, — гэта цяпер агульнае зьявішча, як вынік перажываных катастроф, гібелі старых багоу і программ.

Цяпер некалькі слоу аб нашым сучасным палітычным становішчу. Факт разыходжаньня з Літвой — ясны. Мы ня можам дайсьці з ёй да ладу, бо 1) мы хочам роунага супрацоуніцтва, 2) яна хоча службы. Ад нас вымагаюць: зьліквідаваньня самастойнага цэнтра незалежнай беларус[к]ай палітыкі, перэтварэньня ся у арганізацыю больш мейсцовага характару для абароны правоу беларускай меншасьці пад Польшчай у карысьць Літвы і для абароны правоу Літвы на граніцу 12 ліпеня[6]. Іначэй кажучы нам прапануюць перэтварыцца у дрэннай памяці «Горадзенскую Беларускую Управу»[7] з Боевым, г. зн. цяпер з Ластоускім на чале. Ластоускі гэтае амплуа (раней — Боеускае) прыняу, але на вялікі свой жаль «Управы» ніяк злажыць ня можа: ніхто ня хоча йсьці у парабкі. Заданьнем літоускай палітыкі есьць разьбіць наш адзіны фронт, стварыць группу «сваіх» людзей, для чаго тут есьць Л<астоўск>ій, а у Віленшчыне кс. Цікота. Правячая партыя у Літве, як вядома, — хрышчоная дэмакрацыя[8], і таму мы наконадзі стварэньня «беларускай партыі хрышчоных

дэмакратау». Сучасная літоуская палітыка не вызнае, як я сказау, самастойнага беларускага пытаньня і на другі дзень пасьля таго, як Вільня адойдзе (калі наагул адойдзе!) да Літвы — яна пагодзіцца з адзінавернай Польшчай (і адзіна партыйнай), праз галаву Заходняй Беларусі. Падтрымоуваць нас, г. зн. народніцкую, соцыялістычную группу, — месцовым ксяндзам не на руку, бо гэта значыць, ізноу такі у выпадку далучэньня Вільні да Літвы, капаць сабе яму: беларусы скруцяць галаву хрышчоным у агульналітоускім сойме. Трэба да зарэзу мець сваіх «хрышчоных» беларуса[у], лагодных, умяркаваных, ня суючых носа куды ня трэба, такіх, якія, як кажуць, з рук кушаюць. Як бачыце, прычыны нашага разыходжаньня вельмі глыбокія, і канешне, не матэр'яльныя, а палітычна-прынцыповыя.

Наш пагляд так сама ясны і акрэсьляны: Калі Літва хоча карыстацца беларускай сілай, — дык няхай жа будзе ад гэтага карысьць беларусам, г. зн. Літва павінна падтрымаць беларускі рух як гэткі і ў адпаведным масштабе. Паганага «Крывіча» для гэтага мала. Думаю, што Вы з гэтым згодзіцесь. Па другое, калі Літва хоча, каб мы разам з ёй змагаліся за «літоускую» Вільню, дык стасунак наш павінен быць саюзьніцкі, а не службовы і павінен быць абаперты на адпаведнай умове, зразумела, пісьменнай. Паскольку паміж намі і Літвой есьць грунтоунейшае разыходжаньне у разуменьню узаемных забавязань і правоу (а правоу то мы аккурат на сваей беларускай старане па проэкту літвіноу ніякіх ня маем), — дык адсюль выцякае... Вы можаце дагадацца, што ласьне выцякае, ці можа выцячы у бліжэйшым часе. Справа йдзе усе аб тую самую Вільню, якой яна павінна быць. — Ва усей гэтай вельмі паважнай барацьбе нам надзвычайна важна знаць пагляд Вільні: ці годзіцеся Вы з намі, ці не. Мы чаму-сь усе пераконаны, што Беларусы Вільні разам з намі, што наша тактыка Вамі падзеляецца. Але на вялікі жаль Вы нідзе і нічым гэтай солідарнасьці з намі не паказваеце. Між тым ад гэтага шмат што залежыць, нават у сэнсі усьпеха нашае барацьбы за сваю программу. Я разумею, што Вам трудна сказаць па гэтаму пытаньню свае пераконаньне публічна, але трэба, абавязкова трэба знайсьці спосаб сказаць Вам свае рашучае слова ва усей гэтай гісторыі, пры чым сказаць так, каб аднаразова яго ведалі і мы і літвіны. Сказаць так, як гэта адпавядаець нашай годнасьці, сказаць так, каб усе гэтыя «гнѣдыя» зьвінулі хваста, і каб раз на зауседы літвіны зразумелі, што зрабіць беларускае пытаньне службовым для Літвы нікому ня удасца.

Я ведаю, як невыгодна нам разыходжаньне з Літвой. Але з двох шкод трэба выбіраць меншае, — ці ліквідавацца самім, ці ліквідаваць нашыя адносіны. Мы выбіраем апошняе. У зьвязку з гэтым шукалі сабе новую базу і цяпер можам сказаць цьверда, што гэткую базу знайшлі. Да таго маем яшчэ і Амэрыку, аб чым Вы пісалі зусім слушна ў №23 «<Нашага> Сьцягу»[9] (за гэты артыкул — дзякуем, шкада толькі, што прыходзіцца пісаць эзопаускаю моваю, што у справе «служачых чужым багом» можа і не так ужо абавязкова. Добра было-б проста паставіць точкі над і). Мы кажам: жылі беларусы сотні гадоу без літвіноу, — абойдуцца і надалей без ніх. Таму формула сеняшняга дня: паварот сьпіной з гатоунасьцю, калі пастукаюць у нашыя дзьверы, — адгукнуцца. Але самі ужо больш стукаць у іхнія дзьверы ня будзем. Годзі! Замест гэтага — зьбіраем матэр'ялы для «Жоутай кнігі» аб беларуска-літоускіх адносінах.

Убачыцца нам патрэбна абавязкова. Але я так сама не знайходжу пакуль што магчымасьці. Адзіна тая, што была раней з др. таварышамі. Вельмі цікавіць нас усіх, — як закончылась Вашая нарада, аб выніках якой Вы ласкава абецалі мяне паведаміць. Напішэце.

Пастараюся паслаць свайго ліста так сама конспірацыйна, як Вы вашага, г. зн. каб Вы ня ведалі, калі і кім ен быу пераданы (Вашага ліста знайшлі у кішэні). Наагул справа перапіскі — у данны момант найважнейшая. Вельмі важна знаць адрасы, куды пасылаць можна было-б зусім спакойна.

Усе тое, што напісау Вам, — падзяляець уся наша эміграцыя, за выключэньнем «пары гнѣдых».

Бывайце здаровы. Прывет усім — асабіста Вашай жонцы.

Паважаючый Вас АЦвікевіч

ПС. Калі знойдзеце карысным, — азнаемце з гэтым лістом усіх нашых друзей. Бо перапіска, як самі ведаеце, вельмі затрудненая.

Яшчэ некалькі слоу аб некаторых справах. 1) Прага павінна стацца нашым новым цэнтрам. Амаль усе туды мы выезджаем. «Пара гнедых» так сама хацела-б нешта там рабіць, асабліва сярод моладзі, але апошняя падарож туды К-Д<ушэускага> ск[о]нчылась як мы ведаем нічым. Ен езьдзіу туды даводзіць, як гэта мы «сапсавалі» справу з Літвой, што мы занадта «требовательны» і г.д. 2) Ехаць на усход пакуль што мы лічым для справы — немагчымым. Рэч ня у нашых асабістых выгодах, ці невыгодах, але у тым, што адраджэнцкі рух вымагае безварункова захаваньня нацыянальнага цэнтру, вядучага самастойную, ні ад каго незалежную беларускую палітыку. Так што апрача некаторых, другарадных, ніхто туды не зьбіраецца. Абавязкова, каб у Прагу пад'ехау і нехта з віленцау. Што датыча усходу, дык мы больш менш у курсе таго, што ен думаець. Годзімся з Вамі, што Амэрыка — выхад. Зьвязь самая моцная у нас ужо есьць. Але двох асоб там замала. Трэба яшчэ прынаймсь двох. У кожным разе рэалізацыя зьвязяу і працы у Амэрыке — справа яшчэ ня так хуткая. Поугода, а мо' і больш пройдзе, пакуль рух адчуе нешта адтуль.

Бывайце. АЦ

---

* Што Вы там зрабілі з «дамай з яечкамі»? Яна прыехала з гэткімі дыфірамбамі В.Л<астоўскаму> — што аж жах нас агарнуў. Але аб гэтым — асобна у другі раз!

582.1.04:080-082

---

[1] В.Ластоўскі й К.Дуж-Душэўскі. [2] Магчыма, з Крэчэўскім. [3] У жніўні 1923 году ў Амэрыку з паўнамоцтвамі ад Ураду БНР выехаў Язэп Варонка. [4] Рак-Міхайлоўскім. [5] Магчыма, гаворка йдзе пра Язэпа Мамоньку. [6] Усталяваную паводле расейска-літоўскай дамовы за 12.07.1920. [7] Горадзенская Беларуская Ўправа дзейнічала ў 1918-1919 гадох, складалася зь дзеячоў расейскай арыентацыі, змагалася за правы палітычнага прадстаўніцтва зь Горадзенскай Беларускай Радай і супрацоўнічала зь Літоўскай Тарыбай, якая прызнала яе за мясцовае беларускае прадстаўніцтва. Двое сяброў управы — Карчынскі й Бялецкі — увайшлі ў Тарыбу пасьля выхаду зь яе Івана Луцкевіча й Янкі Станкевіча. [8] Хрысьціянска-Дэмакратычная Партыя (літ. krikščionių demokratai, адкуль беларуская «мянушка»). [9] Маецца на ўвазе артыкул: Лаўрыновіч [А.Луцкевіч]. У новы сьвет! // Наш Сьцяг. №23. 1923.08.10

3485. Ліст Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.10.1923

[...] Все идетъ очень хорошо и обѣщаетъ дать наилучшія результаты. Помѣщикамъ нужны рабочіе, помѣщеніе будетъ, заводъ сильно интересуетъ. [...] Надѣюсь, что останетесь довольны моей бѣготней [...]

582.1.49:132

3486. Ліст Давіда Анэкштэйна (Шэнайхе) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.10.1923 з просьбай дапамагчы выехаць з жонкай у Швэйцарыю

582.1.49:135&r-136

582.1.49:134 — канвэрт

3487. Ліст Юозаса Пурыцкіса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.10.1923

Глубокоуважаемый Господинъ Ластауски!

Вмѣстѣ съ этимъ посылаю Вамъ копію нашихъ рѣшеній. Мы дальше совѣщаемся и результаты этихъ совѣщаній пришлю Вам скоро.

О бѣлорусскихъ дѣлахъ узнаете отъ Гна Душевскаго. Мнѣ кажется, нужно дѣйствовать быстро и рѣшительно.

Всѣго хорошаго, преданный Вамъ

JPuryckis

582.1.49:137

3488. Нататкі ў справе заснаваньня Камітэту паняволеных Польшчаю нацыяў (рукапіс Юозаса Пурыцкіса)

582.1.49:133

Дата невядомая.

3489. Рэцэнзія на кнігу А.Ладнова Les protocoles de Ludendorff-Stinnes-Tchitchérine // Tribune de Genève. 13.10.1923

Les protocoles de Ludendorff-Stinnes-Tchitchérine, par Eugène Ladnoff, ancien président de la délégation de la Russie blanche à la conférence de la paix à Paris, en 1919. Varsovie, édition du comité national blanc-rusien.

Brochure de 40 pages, curieux spécimen de psychose d'après-guerre. Les documents publiés, pour autant qu'ils sont authentiques, ne prouvent nullement ce qu'on veut leur faire prouver. Mélange extraordinaire de truismes et de roman chez la portière; produit malfaisant, en ce qu'il tend à empêcher l'avènement d'une paix de bonne volonté entre les hommes, lesquels ne seront pas toujours forcément les jouets d'une poignée de malfaiteurs et ne sont pas aussi docilement qu'on voudrait nous le faire croire les pions inertes d'une infernale partie d'echecs. — C.

582.1.49:052

Рэцэнзія дасланая Я.Бачынскім у лісьце В.Ластоўскаму за 14.02.1924.

3490. Ліст віцэ-старшыні Рады БНР Палуты Бадуновай і сакратара Рады БНР Язэпа Мамонькі (Прага) старшыні Прэзыдыюму Рады

БНР Пятру Крэчэўскаму і віцэ-старшыні Васілю Захарку (Коўна) за 14.10.1923

Старшыне Прэзыдзіуму Рады Б.Н.Р.
П.А.Крэчэускаму і Віцэ-старшыне В.І.Захарко

Паважаныя Грамадзяне!

Наскольні нам вядома, пры Вашым учасьці у Коуні утварыуся Урад А.Цьвікевіча. Мы лічым, што гэты Урад зьяуляецца незаконным таму, што згодна констытуцьі Урад Б.Н.Р., павінен выбірацца Пленумам Рады Б.Н.Р., што ня было захована пры яго утварэньні, і што у гэтым прымалі удзел толькі два сябры Прэзыдзіуму Рады Б.Н.Р., у той час, як мы сябры Прэзыдзіуму, нічога аб гэтым ня ведалі. Дзеля гэтага прапануемо Вам зрабіць адпаведны загад, каб утвораны пры Вашым учасьці Урад А.Цьвікевіча спыніу зараз-жа сваю урадовую працу і усе справы здау Прэзыдзіуму Рады Б.Н.Р.

У далейшым для вядзеньня нацыянальна-палітычнай акцыі заграніцай, мы лічым патрэбным склікаць Прэзыдзіум рады Б.Н.Р. не пазьней першага лістапада 1923 г. у Празе для вырашэньня гэтых спрау.

Калі-ж да гэтага часу сябры Прэзыдзіуму грам. П.Крэчэускі і В.Захарко не дадуць ніякага адказу і ня прыедуць у Прагу, дык мы выступім адкрыта супроць незаконнага Ураду і нарушэньня Вамі констытуцьі Б.Н.Р.

З пашанай Віцэ-старшыня Р.Б.Н.Р.
П.Бадунова
Сэкрэтар Я.Мамонька

14.X.1923г.
Прага
582.1.44:076 — мк

3491. Расьпіска І.Ключынскене за 15.02.1924 аб атрыманьні ад рэдакцыі «Крывіча» 50 літаў задатку за здымкі

[На візытоўцы:]
I.Kliučinskienė, Kaune
582.1.49:054

3492. Даведка дзяржаўнага кантралёра БНР Лявона Зайца (Коўна) за 15.10.1923 у справе Дзяржаўнай пячаткі БНР

БЕЛАРУСКАЯ
НАРОДНАЯ
РЭСПУБЛІКА
ДЗЕРЖАЎНЫ КАНТРОЛЬ
15 кастрычн. 1923 г.
№10.-

Спраўка

1га Лістападу 1920 г. Радай Народных Міністраў Б.Н.Р. у справе «Дзяржаўнай Печаці» постаноўлена: «Праэкт прыняць і даць майстру выбіць печатку на медзі паводле прыложэнага да гэтага пратаколу рысунку».

14 Лістападу 1920 г. на сходзе Надзвычайнай Дэлегацыі БНР ў Літве подпісамі ўсіх сяброў Дэлегацыі зацьверджаны рахунак выдаткаў Дэлегацыі, прычым на канцэлярскія выдаткі (сярод якіх значыцца і «Дзяржаўная медяная печатка») выведзена дзьве тысячы (2000) н.мр.

Гэты рахунак Дэлегацыі запісаны ў кнігі бухгальтэрыі пад ст. выд. за №19 ад 2/XII 1920 г. і зацьверджаны Дзяржаўнай Контрольнай Камісіяй 16 жніўня 1921 г.

Аб усім вышэйпаданым і сьцьверджаю
Дзяржаўны Кантралёр ЛЗаяц
582.1.49:138

3493. Паштоўка Палуты Бадуновай (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.10.1923

Дарагі сябер Вацлаў.

Прыехала у Прагу для мэтаў, аб якіх Вам вядома ад Клаўдзія. Усе зроблена добра. Пасланы патрэбныя паперы. Пішыце да мяне па адрэсу Язэпа. Ці хутка вярнуся да Бэрліна, ці не — ня ведаю, бо не маю матерьяльнай магчымасьці, а здароўе зноў раскідалася, тыдзень праляжала ў ложку, аслабнула вельмі.

З пашанай, Палута.

Praha. Vršovice. Halkova ul. 53 II p. u p-ni Fogl. pro Mamonko dla P.B.

Прывет Клаўдзію ад мяне і Мамонькаў. Прывет Стахе.

Ці прыехала Анэтка[1]? Як яе здароўе.

Газэта у Празе не палучаецца. Родзевіч уехаў у Менск[2].

582.1.49:139

[1] Сястра К.Душэўскага. [2] Нелегальна.

3494. Ліст Пятра Крэчэўскага (Коўна) у Дзьвінскую Беларускую Гімназію за 18.10.1923 у справе адмовы выпускніком Дзьвінскае гімназіі ў праскіх стыпэндыях дзеля незаплянаванага прыезду 30 студэнтаў зь Вільні.

582.1.04:088 — мк

Копіі ліста дасланыя Школьнай Радзе ў Вільні і праскай беларускай грамадзе.

3495. Ліст Палуты Бадуновай (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.10.1923

22-X-1923 г.

Вельмі паважаны сябер Вацлаў!

Насьпех паслала Вам адкрытку, бо была салідна хворая і не мела сілаў пісаць даўгі ліст. Цяпер ужо трохі паднялася і вось, як бачыце, прынялася за пісаніну.

Навін шмат. Першае, хлопцы, якія прыехалі з Вільні, кажуць, што з Віленск. гімназіі выйшла каля трэці вучняў, не маюць магчымасьці плаціць высокую плату. А тым часам Вы можэце помач гэтую даць. Дыk вось яны верныя два хлапцы бярэцца ў гарах устроіць спатканьне з кім-небудзь з віленцаў. Трэба, канешня, калі Вы яшчэ не паслалі нічога праз

Валка, прыехаць інкогніта сюды і пераслаць грошы, а мо яшчэ лепш спаткацца ці з Р<акам?>, ці з Т<арашкевічам> або М<ятлой?>. З газэты №20 «Вольн. Сьцягу» відаць, што нават Луцкевіча праняло мэморыялам нашым[1]. Глядзіце артыкул «Рызыкоўная заява», Лаўрыновіча-Луцкевіча.

Сягодні прымем дэкларацыю аб польск. уціскаў і апублікуем ува усіх сац. газэтах Нямеччыны, а мо і ў другіх. Штейнберг абецаў надрукаваць у 12 газэтах, а мяне чакае у Бэрлін, каб там сярод рабочых арганізаваць мітынгі, яны абецаюць даць мне добрага перакладчыка і ўсе абставіць, як трэба. Па мойму ж, Нямеччыну ўжо няма чаго і агітаваць, яна і так добра адчувае польскі уціск на сваей сьпіне. А вось каб паехаць да Англіі і там сярод работніцкіх мас павясьці агітацыю — гэта іншая справа. Там знаходіцца і II інтэрнац. у Лёндане, а ў ім засядаюць «левыя» з пр<авага?> боку П.П.С. Каб асьвятліць добра усе палажэньне перад работ., тагды і П.П.Сам стане цесна у II інтэрнац., як іхняй буржуазіі ў Лізе Народаў пасьля нашых мэморьялаў. (Глядзіце арт. «З Польскага Сойму» Вольн. Сьцяг №20.) П. Вітас журыцца аб дрэнным палажэньню загранічнай палітыкі і жаліцца на жалабы меншасьцяў у Лігу Народаў.

А П.П.С. — гэтыя пройда-сацыялісты, як вужакі круцяцца каля нашага беднага сялянскага народу, павыганяўшы нас заграніцу і пасаджаўшы усю народную інт<элігенцыю> у турмы разам са сваім правадыром Пілсудскім. Яны ужо тэрытарыяльную аўтаномію абецаюць. Мусіць трудна на «Крэсах».

А п. Кернік пра Вас успомніў, гэта мін. унутраных спраў. Патрабуе ў Сойме новых падаткаў на пашырэньне паліцыі проці «банд Ластоўскага».

Усе добра, але вось што ліха. Жыць у Бэрліне не маю ніякае магчымасьці — не хапае сілаў фізычных. Анэтка[2] сягодні прыслала мне ліст, што хварэя і галудуе, доктар вялеў па 6 раз у дзень есьці, а што? Вось запытаньне. Хвораму на легкія патрэбна малако, у Бэрліне ж яго нават у кансэрвах не адшукаеш. Анэтка таксама здаецца хоча пераехаць у Прагу. Мусіць, што і я застануся тутака ня меней як да Каляд. Сілы мае саўсім падупалі. Мне трэба паправіцца. Ня ведаю, як я устроюся, ў панядзелак пайду на раду да украінцаў — Шаповала.

Цяпер жа мушу чакаць яшчэ ад Вас паведамленьня аб тым, як з газэтай, ці то з журналам. Шаповал казаў мне, што яны да гэтага часу выдавалі журнал «Нова Україна» (выдаюць Віннічэнка і Шаповал) у Бэрліне, але зараз пераносяцца ў Прагу, бо у Бэрліне безумныя цэны і няма магчымасьці выдаваць. Ось жа і нам мусіць трэба гэтак зрабіць. А то можна і так прыгатаваць усе тутака, а выдаць — адаслаць да Бароўскага [ці самой з'ездзіць, хаця не маю палета цеплага і затое прастудзілася цяпер, але праз месяц спадяюся усім абзавясьціся]. А к Калядам мо к лепшаму усе нарыхтуецца, і я адпачыну, напьюся досыта малака, прывяду ў парадак свае сілы і сваіх таварышаў, якія тутака распусьціліся, як рожы ў садзе, і нічога ня робяць. Уся моладзь жывець пьянствам і мусі картішкамі. Трэба клюб. Я ужо зрабіла разам з Язэпам[3] адзін сход. На другім пакончым справу. Перавязу сюды Анэтку — будзе народныя бел. песьні сьпяваць. Сама ж я буду чытаць лекцыі па літэратуры. Наогул, пастараюся, каб час майго тутака жыцьця не прайшоў бязследна.

Аб Урадзе Цвікевіча мы ужо прынялі і партыйную пастанову і удвох з Мамонькай, як члены Прэзыдыуму — скасаваць Урад Цвікевіча, як незаконна выбраны. Склікаць зьезд Прэзыдыуму Р<ады> Рэспублікі на 1 лістапада г.г. у Празе і на зьездзе вырашыць, дзе і як будзе выступаць Прэзыдыум , як Бел. Нац. Цэнтр загранічай. Аб гэтым ужо паслана аф<і-цыйная> папера заказным лістом Крэчэўскаму ў Коўну.

Загранічную групу с.р. у Коўне парашылі распусьціць і даручыць Міхалевічу перадаць мне усе дакумэнты не пазьней 1га сьнежня г.г. Пасьля чаго будзе Ц.Б. зроблена новая перарэгістрацыя сяброў партыі. Ну, усяго найлепшага, мой паважаны адважны духам таварыш. Чакаю альбо Вашага прыезду, альбо ліста. Жыву ў Язэпа на хлябах. Бьецца ён тутака, як рыба аб лёд. Жонка слабая і хваравітая. Прывет сяброўскі Клаўдзію з жонкай і цалую Стаху. Перасылаю ёй лісты, якія выпадкова да мяне папалі. Пурыцк<аму> напішу зараз жа. З паш<анай>. Палута.

P.S. Ад Езавітава атрымала сягодні ліст. Ён будзе працаваць з Вамі. Пішыце да яго.

582.1.49:140&r-141&r

[1] Мэмарыял прыгнечаных Польшчаю народаў Лізе Нацыяў (дакумэнт №3471). [2] Сястра К.Душэўскага. [3] Мамонькам.

3496. Паштоўка Давіда Анэкштэйна (Шэнайхе) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.10.1923 у справе магчымага выезду ў Монпэлье (Францыя)

582.1.49:142

3497. Запіска Клаўдыюша Душэўскага (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.10.1923

Браце.

П. Іонінас просіць цябе зайсьці цяпер у Міністэрства і узяць з сабой дзесятак «мэморьялаў» на французскай мове[1].

Кляўд...

27.X.1923г.

582.1.49:143

[1] Дакумэнт №3471.

3498. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Палуце Бадуновай (Прага) за 28.10.1923

28.X.22

Даражэнькая Цетка Палута.

Вашага ліста я вельмі чакаў, бо такое палажэньне як цяпер у нас ёсьць доўга трываць не павінна, калі-ж будзе трываць, то яно давядзе да таго, што нам усякую работу нельга будзе рабіць у тым ліку і работу школьную. Вы кажаце, што я магу дастаць грошы і іх не дастаю, гэта не зусім так: паверце, што прыватнаму чалавеку, апіраючыся толькі на тыя ці іншыя адносіны, даставаць грошы вельмі цяжка, блізка немагчыма, бо палажэньне робіцца маё невыразным, а з другой стараны той хто можа даць

грошы, па істоце сваей вымагае формальнасьцяў правам устаноўленых. На аснове Вашых слоў я казаў, што край не падзеляе тактыкі вайсковага стану у бок нашых прыхільнікаў[1], што край мне давярае. І было-бы ўсё добра каб запраўды край даў свой голас, але край маўчыць. Учора я парушыў усе свае стасункі; прышлося гаварыць і з праціўнікамі (бо ня ўсе так глядзяць, як наш знаёмы з Барбароса[2]). Кажуць: «мы гатовы прыйсьці з помаччу, але калі Вы адзін, ці вас трое, з намі, то самі разумееце — маштаб помачы ня можа разцягацца на тых, хто супроць нас актыўна ці пасыўна». Усё-ж такі крыху дастаў і перасылаю Вам, а Вы ўжо з Прагі пашліце цэнным пісьмом, застрахаваным на сумму ўложанага у пісьмо чэка: 50 долараў Школьнай Радзе і 50 долараў Нац. К-ту, калі Камітэт робіць якую работу, а то усе 100 долараў школьнай Радзе, я думаю найлепей на імя Мятлы ці Рака*. У пісьме-ж трэба іх папрасіць каб яны у газэце паквітавалі гэткім чынам: «ад А.Якубоўскага, праз Прагу атрымана на Школьную Раду 100 долараў». Акром гэтага для Вас асабіста на Вашы патрэбы пасылаю 20 долараў. Пры гэтым прашу пераслаць мне паквітаваньне у атрыманьні ад мяне дзеля перасылкі у Вільню 100 долараў на падтрыманьне беларускіх культ-нац устаноў, з далажэньнем квіта пачтовага аб перасылцы цэннага ліста, і, асобна, другое паквітаваньне у атрыманьні ад мяне 20 долараў на падтрыманьне беларускай палітычнай эміграцыі. Паквітаваньні чым хутчэй вышліце тым лепей: здаўшы паквітаваньня можна будзе гаварыць аб далейшым.

Я вельмі прашу Вас прыслаць мне копіі а) даручанага Вамі з Мамонькам пратэсту Крэчэўскаму і б) партыйнай пастановы. З часопісьсю пачакаем, калі Вы крыху адпачнеце. Разфармаваньне Ковенскай С.-Р групы в<ельмі> разумная пастанова. Затым прыміце сэрдэчнае прывітаньне ад шчыра паважаючага Вас ВЛаст...

* Чаму не на Рака, а гэта каб не зьвяртаць лішне на яго увагі, так я думаў, але Вы усё гэта лепей ведаеце і зрабіце як трэба. NB. В<ельмі> прашу каб у Празе ніхто ня ведаў аб гэтай пасылцы, бо у Празе сьцерагчыся ня будуць, а праз Прагу могуць даведацца і далей. ВЛ.

582.1.49:144&r

[1] Літвы. [2] Юозас Пурыцкі, дыпляматычны прадстаўнік Літвы ў Бэрліне (Прадстаўніцтва месьцілася на Барбароса-штрасэ).

3499. Чарнавік запіскі Вацлава Ластоўскага ў справе бюджэту на працу сярод беларусаў пад польскай акупацыяй за 29.10.1923

Запіска

У справе бюджэту на працу сярод беларусаў пад польскай акупацыяй

Заданьні якія павінны быць дасьцігнуты у наступным гаду працай пад польскай акупацыяй

1. Першым і найважнейшым заданьнем працы у наступным гаду (1924) павінна быць падтрыманьне і пашырэньне опозыцыйнага настрою супроць Польшчы беларускага жыхарства Віленшчыны і Горадзеншчыны, якое, паміж цяперашняй граніцай Літвы і Лініяй Рыжскага міру, становіць пераважаючую большасьць.

2. Зьвярнуць палітычныя сымпатыі беларускага жыхарства у старану Літвы.

3. Зсолідарызаваць імкненьня беларусаў з вымаганьнямі літоўскай палітыкі, а праз гэта дасьцігнуць солідарных выступленьняў і мець уплыў на ход падзей ў краю.

4. Вясьці актыўнае змаганьне з полёнізацыяй ў Віленшчыне і Горадзеншчыне.

Характар намечанай працы.

Па свайму характару стаўленыя мэты на наступны год разпадаюцца на 2 галоўныя кірункі: працу палітычную і культурную, цесна паміж сабою зьвязаныя і ўзаемна дапаўняючыяся.

Палітычная праца разпадаецца на чат[ы]ры галоўныя аддзелы:

1. Прэса
2. сталы кантакт з краем
3. організацыі і партыі
4. агітацыйная літэратура.

Культурная праца галоўную увагу павінна зьвярнуць на

1. Школу
2. Беларускую кнігу.

Способы дасьціжэньня пастаўленых мэт.

1. У кождай палітычнай рабоце галоўную ролю іграе прэса, якая надае кірунак мышленьню данага грамадзянства, умацовывае яго пераконаньні, служыць агітацыйнай трыбунай, кіруе ім і г.д. і г.д. Адводзячы першае мейсца прэссе, ў будучым гаду трэба: а) пастарацца мець ўплыў на ўсе беларускія часопісі, выходзячыя пад окупацыяй, і на эміграцыі; б) утрымліваць цэнтральны орган, кіруючый на тэрыторыі Літвы і цесна ад яго залежачый партыйны (Эс-Эроўскі) орган за межамі Літвы.

2. Каб зсолідарызаваць імкненьня беларусаў з вымаганьнямі літоўскай палітыкі, трэба шляхам некалькіх спорадычных зьездаў з прэдстаўнікамі беларускага грамадзянства з пад польскай окупацыі, констатаваць факт супольнасьці інтэрасаў у змаганьні з польскай окупацыяй і намеціць план ўзаемаадносін на будучыну. Акром гэтага падтрымліваць пастаянную зьвязь, шляхам рэгулярных сустрэч.

3. Опозыцыйны настрой рэволюцыйных элемэнтаў да Польшчы трэба выкарыстаць на утварэньне кадраў актыўных змагароў, шляхам пашырэньня арганізацый стрэлецкага характару. Рэволюцыйным партыям трэба даць магчымасьць разьвіць агітацыйную дзейнасьць ў духу рэволюцыйна-незалежніцкім.

4. Для падтрыманьня і кіраваньня настроямі рэволюцыйных элемэнтаў і для пропаганды мас ў духу рэволюцыйна-незалежніцкім трэба выдаваць загранічай і пашыраць у краю адпаведную нелегальную літэратуру.

Усякая рэволюцыйная праца магчыма толькі там, дзе маецца контынгент нацыональна-сьвядомага элемэнту. Дзеля гэтага галоўным заданьнем культурнай працы павінна быць нацыональнае усьвядомленьне праз

школу і кнігу. Палажэньне беларускай школы у наступным гаду, з прычыны адабраньня ей урадовых крэдытаў, будзе выключна цяжкім, і ў гэтым выключна цяжкім палажэньні трэба ей прыйсьці з дапамогай, хоць у 1/6-1/7 часьці яе бюджэту.

Школа беларуская дагэтуль не абаспечана беларускай кнігай, што страшэнна падрывае яе аўтарытэт у жыхарства, асабліва пры істнуючых побач, польскіх школах з давольным лікам танных і добрых польскіх школьных падручнікаў; трэба пайсьці на дапамогу беларускай школе школьнымі падручнікамі.

Грамадзянства беларускае дагэтуль не мае кнігі для сямейнага і пазашкольнага чытаньня. Дзеля таго, што добрая кніга зьяўляецца найважнейшым фактарам пашырэньня нацыянальнай сьвядомасьці трэба утварыць выдавецтва падабраных па зьместу кніжак, хоць штомесяц па кніжцы сярэдняга фармату, стран. 120 кождая.

Патрэбныя кошты на правядзеньне намечаных мэт:

1. 1 газэта (3 разы у тыдзень) гражданкай у Вільні 12 № у месяць па 40 долараў ---------- 480.-
2. 1 " (3 разы у тыдзень) лацінікай " ---------- 480.-
3. 1 месячнік у Коўне ---------- 250.-
4. 1 месячнік партыйны загранічай ---------- 60.-
5. Падтрыманьне эмігранцкай, студэнцкай прэсы ---------- 60.-
6. Зьезды і рэгулярная зьвязь з краем ---------- 50.-
7. На партыйную працу ---------- 100.-
8. На арганізаваньне кадраў актыўных змагароў (суммы не стаўлю не будучы ў курсе гэтай справы, якая і цяпер вядзецца адпаведнымі арганізацыямі у краю.

1.480.-

Культурна-нацыянальная работа:

9. Падтрыманьне гімназый ---------- 500.-
10. Утрыманьне 2 інструктараў-агітатараў якія аб'ежджалі-бы край і праводзілі адкрываньне беларускіх школ і на іх разьезды 100.-

Месячна 2080.-

11. На надрукаваньне 6 кніг школьных па 10 аркуш друку (50х60) 3.600.-
12. На надрукаваньне 12 кніг да чытаньня па 8 аркуш (8х60) 5.760.-

У год 9.360.-

Акром вышэй вылажаных захадаў пажадана было-бы ў мэтах прыцягненьня сымпатый і збліжэньня беларускага грамад<зянства> утварыць пры Ковенскім унівэрсытеце катэдру Беларусаведаньня і, падобна чэхам, устанавіць стыпэндзіі для студэнтаў-беларусаў з Віленшчыны і Горадзеншчыны. Гэта апошняе мела-бы аграмаднае маральнае значэньне для усяго падрастаючага пакаленьня эвэнтуальных кандыдатаў, прымусіла-бы іх знаёміцца з літоўскай мовай, падтрымліваць стасункі з літоўскім грамадзянствам на мейсцы, а пасьля акончаньня студый быць праваднікамі ідэі літоўска-беларускага збліжэньня.

Аргумэнтуючы патрэбу помачы стараўся я выходзіць з інтэрасаў Літвы, бо з беларускага пункту погляду патрэбу помачы аргумэнтаваць не прыходзіцца.

Разам на ўсю працу, акром стрэлецкай,
(18.960+7200+9360) — 35.520 долараў

Пры апрацаваньні гэтага каштарысу былі узяты пад увагу толькі сьцісла рэальныя сілы, якія трэба утылізаваць. Пры нотованьні цыфр выкарыстаны ў гэтай матэрыі запіскі перасыланыя з краю.

В.Ластоўскі
29 кастрычніка 1923г.
582.1.49:119-125

3500. Ліст Канцылярыі Рады Народных Міністраў БНР Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.10.1923 (вых №245)

Грамадзяніну Ластоускаму.

Гэтым Канцэлярыя Рады Народных Міністраў просіць Вас вярнуць у Канцэлярыю застаушуюся у Вас Дзяржауную Печатку, вялікую круглую медзяную на фоне герба Скарыны (аб гэтым далучаецца Спраука Дзяржаунага кантролю)[1]. Разам з тым прашу Вас зьвярнуць у Канцэлярыю Р.Н.М. дыплематычныя пашпарты — Ваш і Вашай жонкі, разам з літоускімі ахароннымі граматамі, — якія дакуманты выданы былі Вам у свой час як Старшыне Ураду Б.Н.Р.

УПракул<евіч>
Дзяржаўны Пісар
582.1.49:147

[1] Дакумэнт №3492.

3501. Ліст Давіда Анэкштэйна (Шэнайхе) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 31.10.1923 аб атрыманьні трох нумароў «Крывіча» і з падзякай за клопаты

582.1.49:149

3502. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.11.1923

Вельмішаважаны Пане Вацлаве!

Дзякую Вам за два лісты і падмогу на «Б<еларускі> Ст<удэнт>» Сюды прыкладаю расьпіску. Маю 12.XI сур'ёзны екзамен (паўгаспадарсьцьвены), дык, як мне не няпрыемна, не змагу напісаць у «Крывіч» ніякае стацьці. Найраней мог бы выслаць 14.XI, але ў гэты №5 ўжо спазьнілася-б. Аднак 14-15.XI нешта пашлю, на колькі гэта будзе навуковае наперад цяжка сказаць.

Чаму ня прысылаеце №5 «Крывіча»? Я папрасіў, каб займалася продажай яга Галубянка, бо яна шмат балей за мяне мае часу. Дык калі ня маеце нічага проці, дык шлеце ёй (адрэс на Вяршыніна). Справаздачу за

прададзеныя экз. дам па 12.XI, бо цяпер ані часінкі ня маю свабоднае. Па 12.XI напішу і папраўкі да фізіол. тэрмінолёгіі. Лісты й кніжкі з Вільні буду Вам перасылаць. Паслаў ужо ліст у Кнігарню.

Выбачайце, што пішу на такім кусочку, шкадую часу (ён перад экзаменам дарагі!) йсьці купляць.

З шчырым паважаньнем
Я.Станкевіч
7.XI-1923
582.1.49:110&r
582.1.49:110а — канвэрт

3503. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.11.1923

8.НОЯ.1923
KONSTANTIN JEZOVITOV
LATVJA, LATGALE, LUDZE.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

дужа мяне лаюць тутака некаторыя ведомыя Вам грамадзяне, а таксама і ковенцы за тое, што я падтрымліваю зносіны з Вамі, але я іх падтрымліваў і падтрымліваць буду, бо бачу ў асобе Вашай аднаго з тых беларускіх працаўнікоў, якія ўжо самазаклалі сябе для беларускае справы і з гэтае Вялікае Справы нікуды ўжо ня ўцякуць, як з жэртвенніка, як з кастра-вогнішча.

№4 «Крывіча» сёнека атрымаў і паслаў далей.

Пасылаю Вам «Змаганьне».

Ці атрымалі Вы ўжо ад Беларускага Аддзелу спісак нашых школак, для якіх я прасіў Вас выслаць першыя 4№ «Крывіча», як пробныя, а потым можна будзе пасылаць іх і надалей, а я тутака пастараюся сабраць з іх грошы праз той жа Аддзел, ці сам, ці праз наш Нацыянальны Вучыцельскі Хаўрус.

Што да перасылкі грошэй у Вільню у цьвёрдай валюце, дык гэта справа цяперака дужа простая: я пасылаю часта грошы на газэты і кнігі і раблю гэта ужо не праз прыватныя канторы і заказныя лісты, як рабіў раней, а ужо праз цэнныя паштовыя пакеты, якія цяперака ужо прыймаюць у Польшчу і тамака грошы выдаюцца тыя самыя, што запечатаны былі тутака у купэрту.

Паквітаваньня, аб якіх Вы спамінаеце, павінны быць нават у 2-х экзэмплярах: адно паквітаваньне пошты а другое — з Вільні.

Чакаю паведамленьня Вашага на папярэдні мой ліст: аб прадажы 200 экз. «Бѣлоруссы и Поляки», літвіном для агітацыі у Гродзеншчыне, аб перасылцы 200 экз. тэй жа кнігі Варонцы у Амерыку і аб высылцы рэшты кніжак сюды да мяне.

Кнігі, як я ужо і пісаў, перахоўваюцца з 1919 году у Міністэрстве Беларускіх Спраў у вялікай скрыне, што заўсёды стаяла у пярэдняй.

Для мяне гэтая справа — дужа важная справа і я вельмі Вас прашу яе пасунуць.

Прывет жонцы і Кляудзюшу з жонкай.

Прышліце мне экзэмпляраў па 3 усіх Ковенскіх выданьняў, пачынаючы з 1919 года (зразумела беларускіх) — патрэбна ў бібліятэчкі гімназіі, гораду і пач. школы.

З пашанай К.Езавітаў.

P.S. Няўжо-ж літвіны хочуць рашуча пасварыцца з беларусамі і няужо-ж яны не падтрымаюць грашова, навэт беларускія гімназіі, у Віленшчыне, як не захацелі падтрымаць беларускую палітычную акцыю? Ці робіце Вы захады аб падтрымцы 5 бел. гімназіяў у Віленшчыне? Гэта-ж абавязак літвіноў!

582.1.49:111&r

[1] Газэта, выходзіла ў Вільні 28.10.1923-31.01.1924.

3504. Ліст Палуты Бадуновай (Збраслаў) Вацлаву Ластоўскаму й Клаўдыюшу Душэўскаму (Коўна) за ?.11.1923

Zbraslav-Zavisi u Prahy, Bilka ul. 101,
u p. A.Zemara pro P.Badunowa.

Глыбокапаважаныя
сябер Ластоўскі і сябер Душэўскі!

Вашы лісты я атрымала. Мы іх усе разам, ці верней, па адіноку, але ж усе прачыталі. І добра, што Вы пішыце такія агульныя лісты, бо ведаеце, дарагія таварышы, што ворагі нашы не дрэмлюць і свараць нас на кожным кроку, сыплюць свае агідныя брэхні, як баба засявае мак. Бо што-ж яны нічым апрача інтрыг не займаюцца. І вось жа Тамаш і Язэп адкрылі мне Амэрыку. Аказваецца, ці Заяц, ці мо Жылкіна работа, а Жылка мае пэўныя заданьні ад Луцкевіча распусьцілі тутака брэхні брыдкія нават не варта мараць паперу аба мне і Ластоўскам. Ось жа цяпер мне адчыніліся вочы на дзеі маіх таварышоў, якія не пускалі мяне ў Жэневу. Нават і цяпер Тамаш ня можа успомніць без нейкага унутранага здрыганьня аб маей паездцы да Бэрліна, яму ўсе здаецца, што я па асабістым справам еду.

Дык кажу Вам, што пішыце агульныя лісты, як і робіце апошнія часы, бо бруду з іх галоў трэба развеяць. А што датычыцца банды Цвікевіча, дык яна тутака спачатку задрала нос і Крыч<эўскі> заявіў, што калі мы ня возьмем заяву назад, дык яны ня будуць з намі гаварыць. Я адказала ім, што і праўда з мертвымі аб жывым не варта гаварыць; Язэп і я і Тамаш усе выйшлі з hotela пастанавіўшы больш з імі не гутарыць і зараз жа выступіць у газэтах. Прайшло тры дні, я пераехала на новую кватэру да гарадка Zbraslava і цяжка захварэла, раптоўна неяк, ледзьве не адправілася за адну ноч к бацьку Аврааму. Але дохтар украінец тутака жыве і мяне выратаваў, аднакаж уклаў на тыдзень у ложка і знайшоў катар левага легкага і правага вярхушкі — Анюткін калега, словам. Ну, дык я ляжу, а яны робяць. Абнюхалі усю Прагу і спачатку мусіць насы дралі, што спадзяваліся без нас абыйсьціся. Але потым украінцы, як прыперлі іх, дык яны раптам апынуліся усе на сходзе партыі і рабілі даклад аб сваей ковенск. працы. Язэп, як мне перадавалі бо я ж ляжу, запытаўся іх,

за вошта яны выключылі Ластоўскага і Душэўскага, дык яны змаўчалі, усе скамкалі, але брэшуць — мы іх прыпром і каго трэба вычысьцім. А Цьвікевіч ужо пусьціўся у Укр. хату рабіць даклад і так моцна напіраў на свой сацыялізм, што ажно маладыя хлопцы сьмяяліся.

Наогул жа, мы парашылі, што Мамонька зьездзіць у Літву і ліквідзіруе усю справу. Зараз там трэба, каб Вы заклалі Нац. Камітэт, не адкладаючы ні на адзін дзень. Сябра Душэўскага можна старшыней паставіць. Напішам і Бароўскаму, каб гэта зрабіў. Чэкі я атрымала. Толькі дзякуючы Вашай дапамозе я магла выехаць у Zbraslav і лепш устроіцца. Адзін парт. чэк яшчэ у банку, калі будзе ехаць Язэп у Літву — атрымаем і яму на дарогу дадзім. Вы яму паклапаціцесь візу, ці пашпарт. Наогул, найлепей яму праехаць да Амэрыкі, бо на яго тутака, як пугала паказваюц[ь] пальцамі. Дык яму тутака матерьяльна не вытрымаць. Каб Душэўскі сюды прыехаў вучыцца, мо б лепш зрабіў бы, маладыя хлапцы усе хорам яго хочуць тутака бачыць. Але ж няхай кожны робіць, што яму лепш, і там патрэбны людзі, дык яшчэ як! Распіскі Язэпка там выдасьць, як прыедзе, але ж яны проці уселякіх распісак. За сябе я вышлю зараз жа, разам з копіямі пастаноў. Дзе Анэтка, напішыце мне!

Усім Вам крэпка цісну руку Ваша хворая Палута.

Тутака заклаўся федеральны беларуска-украінскі гурток сац. народнічскай моладзі — кіруюць бел. і укр. с-р. На першым сходзе старшыней быў Грыб, а даклад чытаў укр. Кобэрскі. Гэта адчынілася народніцкая школа. Дужа усей моладзі спадабалася. Заметку аб гэтым памясьціце у Крывічу.

582.1.49:065&r

Дакладная дата невядомая.

3505. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1?.11.1923

Вельміпаважаны Пане Вацлаве!

Вы пеўна на мяне вельмі злуіцёся, што я дагэтуль ня прыслаў матар'ялу, але ведаеце, я ня шмат і вінен.

12.XI здаў экзамен т.зв. філёзофічна-пэдагогічны, які здаецца посьле трох гадоў навукі. Гатуючыся да экзамену, не хадзіў на лекцыі й семінары, дык трэ' было потым даганяць. За год буду маць права скончыць, але ці скончу за гэты час, вялікае пытаньне, мо прыдзецца павучыцца яшчэ даўжэй. Дык цяпер працую, колькі хапае сіл. Гэта будзе мой запраўдны працоўны год. Пачаў пісаць працу на дактарат, дык апрацовуючы, спадзяюся, што можна будзе тое-сёе пасылаць у «Крывіч».

Цяпер-жа пасылаю разгляд Вашэ тэрмінолёгіі і ст. «Славакі».

Як я пісаў, я згаджаюся перасылаць Вам віленскія друкі. Ужо мне прыслалі гадавік «Н.Н.» за 1913 г. цана 50 цэнтаў амэр., кніжку «Вялікая шышка» Я.Нарцызавага цана 15 ц. ам., «Навука сьпеву» А.Грыневіча цана 15 ц. ам. і «Анельчына вясельле» цана 2 ц. ам. разам 82 ц. ам. Цяпер нічагусенькі ня маю грошай, дык як дастану стыпэндыю за сьнежань (каля 10.XII), тагды Вам іх пашлю. Ліст з рукапісямі мог Вам паслаць ужо ты-

дня паўтара, але ня было грошай на пашт. маркі. Цяпер магу паслаць толькі дзякуючы таму, што пазычыў Вяршынін. Бачыце, гэты месяц у мяне грашавы крызіс, бо памог двом знаёмым студэнтам, якія прыехалі сюды й дагэтуль не дастаюць стыпэндыі, а так звычайна бывае ляпей.

Што да перасыланьня Вам віленскіх газэт, то іх ужо ад якогась часу, ня ведаю чаму, перасталі прысылаць Вяршыніну, дык я ня маю адкуль браць. Калі Вы хочаце даставаць, дык падпішэцеся на якісь час (цяпер выходзіць «Змаганьне» і «Крыніца»).

Мяркаваньні ў стацьці «Мова, народ, раса» дра Чужыловіча[1] мне падабаліся. Ён піша аб рэчах элемэнтарных і наагул ведамых, але надзвычайна важна тое, што не глядзіць на палітыку і не баіцца маскалёў. Хто гэта такі др. Чужыловіч[2], адкуль ён і дзе жыве?

З Вашым паглядам аб назову «Крывіч» сусім згаджаюся. Мо' што тут і ўдасца зрабіць.

На зьмену назову «Беларус» на Крывіч тут студэнты Беларусы глядзяць вельмі добра і то як з «Сэкцыі» так і з «Аб'яднаньня». Можна на't сказаць, што захоплююцца гэтым.

Як я ужо пісаў «Крывіч» з №4 будзе прадаваць Галубянка. З першых трох нумэроў я крышку прадаў, крышку потым раздаў, згодна з Вашым лістом, а астачу аддаў Галубянцы, расьпіску яе сюды прыкладаю.

Прадаў гэтулькі: №1 — 3 экз студэнтам па 4 кр.ч. = 12 кар. чэс., 2 экз. ў «Нашей Рѣчи» па 2,60 кг.ч. (35% спуску) = 5.20 к.ч.; №2 — 3 экз. студэнтам па 4 к. = 12 кар. і 1 экз. у «Н. Рѣчи» па 2 к. 60 = 2.60 к.ч.; №3 — 2 экз. студэнтам па 4 кар. чэск. (8 к.ч.) і 1 экз. у «Н. Рѣчи» па 2.60 = 2.60. Разам 42,40 кар. чэск., якія прашу вылічыць з належнага мне гонорару.

«Бел. Студ.» №6 паслаў Вам 4 экз., пеўна Вы дасталі. Скора будзе № новы. Напішэце калі ласка, калі-б журнал стаўся толькі літэратурна-навуковым, мог-бы ён карыстацца, як і цяпер, падмогаю ад Вас?

Тут у нас ня ўсё добра. З тых, што сёлета прыехалі ё каля 30 чал. без стыпэндыі. На гэтым галодным грунце разьвіваецца «зьменавехаўства». «Аб'яднаньне паступовага бел. студэнства» разьбілася на дзьве часьці. Там утварылася група марксістаў, запраўды «зьменавехаўцаў» (я радзіў ім звацца зьменатычнікамі) ці як яны хочуць «камуністых» — на чале з Цьвятковым. Марксістаў бадай што ня меней як с.-р. Калі-ж дадаць, што апрача «камуністых» ё яшчэ акдрытыя маскоўскія манархістыя, дык у «Аб'яднаньні і г.д.» с.р. астаюцца ў меншасьці. На't Дварчанін выступіў з с.р. і назваў сябе беспартыйным марксістым, а запраўды ўсё робіць што хоча ад яго Цьвяткоў, пакінены вонках камуністычнае арганізацыі, каб мог свабадней агітаваць.

Грыба, Мамоньку й Бадунову хацелі прыняць сябрамі ў Беларускую Раду, чаго яны вельмі дамагаюцца, але з прычыны гэткага разьбіцьця «Аб'яднаньня» з імі перасталі лічыцца і здаецца ня прымуць. Я ўжо думаў, ці не сказаць тут, што Вы пасылаеце с.р. у месяц 20 дал., бо гэтым можна было-б папсаваць ім усю музыку, але дзеля таго, што Вы пісалі мне гэта пад сакрэтам, узьдзержыўся. Аднак, калі-б дайшло да прыйманьня іх у Раду, ці не зрабіць гэтак? Гэта быў-бы найлепшы спосаб удзяржаць гэтых інтрыганаў.

Адпішэце.
Кага Вы паслалі ў Амэрыку?
Ваш Я.Станкевіч.
582.1.49:113&r

Дакладная дата невядомая. [1] Артыкул надрукаваны ў №4 «Крывіча» за кастрычнік 1923 году. [2] Эдмунд Зузэміль.

3506. Янка Станкевіч. Кароткі разгляд «Тэрмінолёгіі да анатоміі і фізыялёгіі»

Кароткі разгляд «тэрмінолёгіі да анатоміі і фізыялёгіі
(глянь «Крывіч» №1)

Агульная загана тэрмінолёгіі тая, што аўтар блізу што сусім не паказуе жарол, якімі ён карыстаўся пры ўкладаньні яе.

Можна бяссумлеву прызнаць, што слоў з дзесяток ужыта дзеля перакладу добра. Вось гэтыя словы: ныркі, крохкі, зенка, зрэнка, чхаць, спаткнуцца, прастор, самапачуцьцё, мяхі, паддувалы, паходжаньне, функцыі арганізму, комплікацыя, жоўчны. Гэтыя словы ўжываліся агульна й дагэтуль у беларускай літэратурнай мове.

Ніжэйшыя тэрміны мо' можна было-б прызнаць добрымі, калі-б былі мотываваны прыкладамі з народнае мовы, з песьняў, казак і г.п. або паказана, што ўтвораны па анолёгіі з будоўляй іншых беларускіх слоў, а пакуль гэтага няма, дык нельга аб іх сказаць ні добрага, ні благога: рашчына, рашчыньнік, рашчыняць; цекладзь, цякоміна. Прыпамінаю, што дзеля азначэньня «жидкости» ё яшчэ слова «жыжка», прыкл.: Гушчу зьеў, а жыжку на кагал. Кіпень, кіпячая вада. Зацемлю, што «кипятокъ» пабеларуску «вар», «варатак». Мочеточникъ перакладзена мачацёк, посік; отбросы — адкідзьдзе, адпадзьдзе, ападкі; мозжечекъ — маждок; четырехолміе (въ мозгу) — чатырагорбіцца, затылочная кость — патылічная косьць; рябь на водѣ — таласа; драхлость — друзласьць; ворсинки на кишечной стѣнкѣ — пыхцікі; селезенка — салюзаўка; кіслота — кісладзь; але калі-б гэтае слова было благое, дык малое бяды, бо маем народнае беларускае «кісьля» (Ашм. п.). Печечная лоханка — нырковая шуплянка, шуплавіна. Наагул трэба сказаць, што спомненыя ў гэтай часьці тэрміны на беларускага філёлёга ня робяць благога ўражаньня.

Далей адцемлю словы, што няправільна пабудаваны або неадпавядаючыя слову перакладанаму.

углекислота — воглякісь. Адкуль-жа ўзялося гэтае *во*? Можа быць *вуглякісьля*, а калі-б была добрая *кісладзь*, дык і *вуглякісладзь*. Таксама няправільна ўтвораны словы: воглякісты газ, воглявод, воглік; гэтае *во* бы з неба звалілася.

Свертываніе вельмі магчыма, што будзе *сьцінаньне*, але ня сьцінаньнеся, бо *ся* на канцы дзеяслоўнага іменьня адзнака польскае мовы.

Питать, ся добра адпавядае беларускае *сыціць, ца*; ё яшчэ ў гэтымжа значэньні беларускае слова *жывіць, ца*.

Питаніе ня можа быць *насытнасьць*, наагул гэткага слова ў нашай мове немагчыма ўтварыць, але будзе *сыценьне* (націск на ы, бо з націскам

на другім складзе значыла-б «жирѣніе») або жыўленьне, *насыщеніе* — насы́ценьне; *насыщенность* — насы́ценнасьць.

Питательный — сытны, *питательность* — сытнасьць. Ад гэтых слоў адхінаецца слова *сыты*, што значыць «жирный», *сыціня* (мяса, жывёлы, чалавека) — «тучность», *сыце́ць* — жирѣть, *сыце́ньне* — жирѣніе.

Маскоўскаму слову «жиръ», «жирный» адпавядае польскае tłuszcz, tłusty а гэтым абодвум беларускае *тук*, *тучны*, а потым ужо тук дзеліцца на скром, шмалец, лой, сала, здор. Клусты, клушч пераробка польскага tłuszcz, tłusty (у беларускай мове бывае, што *тл* або і адно *т* пераходзіць у *к*). Што гэта так, бачым з таго, што слова tłusty паходзіць ад тълстъ, якое ў беларускай мове дало тоўсты (або таўсты) а ў польскай і чэскай tłusty (стаўся пераскок ъ). Жировая ткань, клѣтка, вещество будзе тукова́я тканка, клѣтка, матэрыя, а жирный суп — тучная страва.

Страва гэта тое, што памаскоўску «супъ» («первое блюдо»), а *еміна* наагул усё тое, што есца, дык *пища*, *пищевой* будзе *еміна*, еминны; пищевой балансъ, продукты — емінны балянс, продукты; *пищевод* было-б *емявод* (бо побач з *еміна* ё і *емя* як семя, плямя і г.п.), так сама і вадавод.

Рот гэтак і будзе а напару яго назавуць *губаю*.

З песьні й прыказкі відаць, што ё слова *знадбень*, але з іх нельга зрабіць вываду, што яно значыць *прадмет*, але — судзіна; гэта адпавядае й чэскаму nádobí.

На «поносъ» скажуць у іншых мясцох *лякса*, але гэтае слова па свайму паходжаньню небеларускае, характар яго жаргонны; затое ё народнае беларускае *ганячка* (Ашм. п.).

Ё *печані* (множны лік), а кожная з дзьвюх печаняў будзе *печань*.

Рычагъ наагул вага, а тады ўжо дзеліцца на асьвер і г.п.

Шовъ — бел. шво, множны лік *швы*, а *сушво* (але не сошвы) магло-б значыць тое месца, дзе зыходзяцца два швы (як суток, сумежны і г.п.).

Заместа *канчавіны нэрваў* і *скорча мускулаў* здаецца ляпей было-б ужываць *канчаткі нэрваў* і *скарачэньне мускулаў*.

Крестообразна будзе *на-крыж* а ня *крыжавата*, якое было-б прыслоўе ад *крыжаваты*, але дзеля таго, што прымета *крыжавы* ня можа маць зьмяншальнае формы, няма крыжаваты, а значыцца й крыжавата немагчыма.

Ня ведаю, адкуль аўтар узяў слова *павохнасьць* дзеля перакладу «обоняніе». Дагэтуль мы ведалі слова *нюх*, а «обонятельные нервы» — нюхальныя нэрвы.

Лицевые нервы будуць нэрвы твару, нэрвы аблічча, тварныя нэрвы, але не «натварныя нэрвы» (*на* азначае на чым, а яны не на твары, а ў твары).

Вкусовые нервы — нэрвы смаку, але не «смачавыя».

Познаніе нельга перакладаць праз *умеласьць*. Калі мы каго або што пазнаём, ды[к] гэта будзе *пазнаньне*, калі проста знаем, дык *знацьцё*. Чалавек, які ўмее штось *рабіць*, будзе маць *уменьне*, будзе *ўмелым* чалавекам, адгэтуль *умеласьць*.

Умственное занятіе і *одаренность* не умысловая праца і здольнасьць, але разумовы занятак і здольнасьць, бо маем розум, а ня умысл.

Будзе не «краваток», а крыватак, бо ў слове *кроў о* не пераходзіць у *ы* толькі пад націскам.

Ад слова пачырванець будзе пачырваненьне, а не пачырвеньне.

Возбужденіе перакладзена *ўздойм*. Аўтар тут крыху ўзышоў на сьцежку, але ня сусім. Скажуць «даняць», «даняло»; адгэтуль і можна ўтварыць назоўнае імя, якое будзе значыць «возбужденіе». Чэхі ад гэткага слова маюць dojem, у нас-жа па прыкладу займо, наймо будзе даймо.

Высота звука пер. «вышыня голсу». Называем «звук» гукам, дык будзе вышыня гуку. Аўтар аднак хоча ўжываць «голс» замест гук. Слова «голас» у праславянскую пару, як кажуць адны, або ў балта-славянскую пару, як даводзяць другія, мала форму «golsъ», але каб ужываць яго цяпер у беларускай мове, на гэта трэба маць прыклад з беларускае мовы. Сказанае адносіцца і да ўсіх тых слоў, што ўтвораны ад «голс».

Прихотливый будзе пабел. пераборлівы або перабірлівы, але ня «прыхоцьлівы», бо апошняе зьяўляецца зьбеларушчаным маскалізмам.

«Прамені» полёнізм, але каса, коска, касуля, касулька беларускія народныя словы, ужываюцца ў значэньні маск. «луч» і польскага promień паміж іншым у Сакольскім і Віленскім п.

Лінаць значыць мяняць старую шэрсьць на новую, блекнуць — траціць свой спачатны колер, а *вянуць* — пачынаць сохнуць, дык «линять» перакладзена блага.

Ад *мяняць* маем імя «мена», «менка», дык «обмѣнъ веществъ» будзе мена, менка матэрый.

Недомоганіе будзе няўздоленьне.

Маем *якасьць* або *якіня*, дык «доброкачественный» будзе *добраякасны* або *добраякінны*.

Маск. словам *походка* і *поступь* адпавядае нашае *хада*. Чалавека па хадзе пазнаеш (Ашм. п.).

«Валва» ё перакручанае маскоўскае «волна» і песьня тут нічога не даводзіць. У гэткім беларускім слове *л* мусіла-б перайсьці ў ў, што й маем у — воўна (у авечкі), бавоўна. Дык воўна ў авечкі, але *хваля* на рацэ.

Столбнякъ ня можна перакладаць сутаргай, бо сутарга гэта сусім што іншае.

На «гной» (у скуле, вадыры) у Ашм. п. скажуць «возалак» (ад зала). Слова сусім добрае. Ці добра «глюз», ня ведаю.

Пытаньне: на чым апіраўся аўтар перакладаючы «брыжейка» праз *кавісма*, членъ (тѣла) — чэляс, чувство — чоў, чувственный — човесны, чувствительный — чоўкі, чувствующій — човісты?

Я.Станкевіч.

582.1.49:114-118

Дата невядомая.

3507. Студэнт-Беларус [Янка Станкевіч]. Славакі (Артыкул)

Дасланы для публікацыі ў «Крывічы»

582.1.49:093-095

Дата невядомая.

3508. Канвэрт ліста Альбэрта Курляндзкага (Данцыг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 13.11.1923

582.1.49:180

Альбэрт Курляндзкі — савецкі агент у Данцыгу, 4.07.1923 быў прызначаны кіраўніком Беларускага Прэс-Бюро ў Данцыгу замест Ісака Лур'е.

3509. Расьпіска Віктара Вальтэра (Янкі Палына) за 20.11.1923 аб атрыманьні ім 470 карон чэскіх у якасьці ганарару за надрукаванае ў №4 «Крывіча» апавяданьне «Аднабочнікі»

582.1.49:126

3510. Дакладная запіска Аляксандра Мілінкевіча Прэзыдыюму Літоўскіх Стральцоў за 27.11.1923 аб партызанскай дзейнасьці на акупаванай Польшчаю тэрыторыі, арышце й зьдзеках у турме, з просьбай аб дапамозе

582.1.49:127&r-128

3511. Ліст рэдакцыі часапіса «Mūsų Žinynas» (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.11.1923 з просьбай перадаць для публікацыі ў часапісе «Mūsų Žinynas» артыкул «Гэрб Пагоні як разьвіцьцё сонцавага міфа» у сувязі з плянамі паданьня ў Сойм у 1924 годзе праекту зьменаў у літоўскім дзяржаўным гербе

582.1.49:129

3512. Ліст Палуты Бадуновай (Збраслаў) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.11.1923

Глыбокапаважаны дарагі таварыш Вацлаў!

Ці атрымалі Вы мае апошнія два «хворыя» пісьмы, бо пісала я іх у гарачцы. Калі атрымалі, то пэўна ж даведаліся з іх, што тутака ў Празе Крычэўскім і Цвікевічам утворана «Беларуская Рада ў Чэхаславакіи». Учора быў у мяне Заяц, ён чамусьці якраз папаў у Збраслаў на жыцьце, разам з Пракулевічам зьнялі сабе тутака пакой. Пэўна ж есьць мэта мяне сагітаваць у свой бок. Праўду скажу, што я саўсім згодна з Вашымі думкамі, выказаннымі яшчэ ў Бэрліне аб тым, што ня трэба нікога адкідаць ад беларускае працы, калі ён зьяўляецца карысным дзеля яе. Пакуль яны вядуць такую лінію: 1, заяўляюць сябе не Урадам, бо чэхі гэтага не дазваляюць, а Беларускім Нац. Цэнтрам за граніцай; 2, усімі мерамі хочуць выявіць сябе, як эс-эры, бо як і раней пісала Вам, украінцы іх моцна прыціснулі і мусілі яны — круці ня круці — зьвярнуцца да нас. Але гэтага мала, Цвікевіч усімі мерамі хоча, як мне здаецца, выказаць сябе амаль не правадыром эс-эраў беларускіх: чытае даклады на тэмы аб народніцтве і не вылазіць з украінскае хаты, дзе якраз зьбіраецца наша фэдэральная «Вольная Грамада». Мо ліст мой не дайшоў да Вас дык я паясьню, што такое В.Г. Арганізацыю гэту заклалі бел. с-ры і украінск. с-ры з мэтай прыцягнуць да народніцтва сацыялістычна думаючую студэнтскую моладзь. Гэта як бы школа народніцтва, куды можа прыходзіць кожны, хто

цікавіцца, паслухаць даклады і дэбаты. Але разам з тым уваходзяць туды і ўсе бел. і украінск. эс-эры. Вельмі думка добрая і карысная, як для развіцьця народніцкіх ідэй, так і для гуртаваньня моладзі, а разам тутака закладаецца моцны фундамент узаемаадносін паміж сацыялістычнай Украінай і такавой жа Беларусью. У будучыне такія знаемства і такое цеснае сяброўства памогуць нам устанавіць добрыя адносіны паміж маладымі нашымі рэспублікамі.

Усе добра, але чаму Цвікевічу хочэцца быць нашым тутака лідэрам? Канешня, ён папаўшы ў атмасфэру ўкраінскага эс-эраўства, хоча ў іх вачах паказаць сябе нашым «галоўным» важаком. «Мы, прагаварыўся Заяц, так сказаць важакі беларускага руху загранiцай», а пасьля схамянуўся і паправіўся гм... я хацеў сказаць частка важакоў... Ён казаў на тэму аб тым, што быццам палякі афіцыяльна пратэставалі перад чэхамі па поваду іх пераезда сюды, але чэхі супакоілі палякаў тым што, мол, Урад беларускі пераязджае ў Чэхію не як Урад, а як звычайныя палітычныя эмігранты, проці каторых чэхі нічога не маюць. Палажэньне іх матэрьяльнае пакуль што яшчэ неяснае. Здаецца ім дапамаглі украінцы — далі пазычку на кармленьня 30 бел. эмігрантаў студэнтаў, якіх чэхі да Нов. году ня маглі прыняць на стыпендзію за-тое, што позна зьявіліся. Ось жа, па славам Зайца яны цяпер займаюцца гэтым кармленьням, ну, канешне, і самі кормяцца. Што-ж гэта добрая справа, абы чэсна працавалі... Адно толькі для мяне ясна, што і тутака яны, асабліва Цвікевіч, хтка праявіць свае растачыцельныя замахі. У гэтым я пэўна. Пэўна я яшчэ і ў тым, што ён лезе ў партыю, каб нас там ізнутры разваліваць і вось Вам добры прыклад.

Як толькі прыехалі ковенцы, Мамонька, які да іх зьвярнуўся два разы у адзін дзень, раптам аб'явіў мяне сваім ворагам і нават так сурьезна паставіўся да мяне, што я ў тэй жа дзень выехала ад яго у Zbraslaw. Апрача таго ён так паскудна накляміў на мяне Грыбу, усе, што усімі разам гаварылася у яго хаце і ім і яго жонкай — усе зьвярнуў на мяне... і выйшла гнусная сьмердзякоўская плётка, якая нас так пасварыла з Тамашом, што мы вось ужо я хворая з 8га лістапада, а цяпер 28, ні разу не бачыліся і не гаварылі. Праўда, сьмердзякоўскі паступак Мамонькі не пашкодзіў яму на мае прыглашэньне зьявіцца у Zbraslaw. Але ён так упадачна сябе трымаў і такія жалкія словы казаў, «ат, мол, які я там сэкрэтар Рады», выходзіла так, няхай яны усе робяць, а мы людзі маленькія. Калі так казаў Мамонька, дык пэўна ж у іх адна думка з Грыбам, — яны далі ім шырокую дарогу, а самае горшае, карыстаючыся маей хваробай, яны дапусьціліся да таго, што спекулянт Цвікевіч ледзьве не апынуўся ў вачах украінцаў і грузінаў правадыром Бел. партыі с-р.

Канешня, гэта ўсе так кашмарна, так мяне абурыла спачатку, што я ня ведала і не хацела нават ведаць аб усіх гэтых справах. Тым тяжелей было мне, што я цяжка хворая лежала адна, усімі забытая на руках чэшскай сялянкі, маей гаспадыні. Добра, што украінец доктар прафэсар Укр. Інст. (дзе я залічана на стыпендзію, хаця і ня вучусь дый ня ведаю ці буду вучыцца, бо не маю сілы па 11 гадзін высіджываць на лекцыях, якія мяне ні каліву не цікавяць) Літоў па прозвішчу узяўся мне дапамагаць, выклапатаў пашпарт, дапамогу ад Укр. Грамадскага Каміт., хаця грошы у мяне

былі яшчэ Вашы. Тутака шмат жыве рускіх эмігрантаў, вось мяне даглядала жонка вядомага В.Булгакава, сэкрэтара Льва Толстого, дужа добрая жанчына, якая і цяперь кожны дзень даведываецца мяне. А з беларусаў бачыла я у сябе толькі маладзенькага, добрага таварыша Сяргея Бусла.

З гэтага Вы бачыце, мой добры сябру, што проці мяне тутака зроблена ўсё, каб апарочыць мае імя, бо пушчана агідная плетка аб тым, што калі я Вас падтрымліваю, дык значыць у нас есьць нейкія інтымныя адносіны, нагаворана яшчэ мусіць тысячу карабоў, ды пакуль што да мяне не дакацілася. Ах, як я цяжка страдала і стагнала ад душэўных ран... Але дух мой зноў уваскрос і вось мае ворагі (я іх лічу разам з тым і ворагамі беларускага народу, бо яны спыняюць нармальнае развіцьце нашае працы за граніцай) даведаўшыся, што Бадунова папраўляецца і скора прыдзе на сходку, паслалі свайго красамоўнага Зайчыка, каб мяне разпалажыць і прымірыць. Што ж, я казала ўжо вышэй, каб я спадзявалася, што яны стануць шчыра і добра працаваць ну, і добра, усе мае асабістыя крыўды я заўсягды выбачаю і забываю, хаця гэта нават задзевае і маю чэсьць, як чалавека і кабеты. Але ж я добра ведаю гэтую нізкую публіку, якая ў мутнай вадзе рыбку ловіць — і мне цяжка. Так, даведалася ад Мамонькі, што яны пісалі да Грыба ліст такога зьместу, няхай, мол, Бадунова адмовіцца падтрымліваць Ластоўскага, тагды мы будзем разам з ею працаваць у Грамадскам Каміт. А справа тутака так абстаіць, — Грыб, хаця і ня бывае у мяне, дзякуючы Мамонькавай правакацыі, але, відаць, дабіваўся, каб я папала у гэту саму Бел. Раду. Меў ён на увазе, як мне здаецца тое, што там я буду лепш забезпечена матэрьяльна і буду мець больш вольнага часу. Канешня, з гэтага боку ён добры таварыш і больш нічога. Але ж палітыкі тутака няма аніякай. Я яшчэ раней сказала і потым праз Мамоньку перадала Грыбу, каб ён не рупіўся аба мне і за мяне і аба мне з імі не гаварыў, бо за грошы я яшчэ ад таварышаў не адмаўлялася і за грошы ніколі нігдзе не таргую беларускай справай. Ось жа пасьля таго на Zbraslawскам горізонте зьявіўся Заяц.

Усежтакі ім карціць, каб я ад Вас адмовілася, яны ня хочуць прымірэньня. Ось жа я цяпер скажу ім, што мы склічемо зьезд партыі, там адчытаемся усе адзін перад другім, пачысьцімся і прымірыся, а тады пачнем працу пад строгай партыйнай дысцыплінай і рукаводствам. Ніхто ня будзе у нас ні разтачаць грошай грамад. ні гандляваць беларускай справай, ні займацца гульней у профэрансы і кутежамі па рэстаранах, ні плётак, ні брудных размоў сярод сваіх і чужых мы не дазволім і, ось калі яны згодзяцца і чыстасэрдэчна пачнуць выпаўняць свой абавязак перад бел. народам, то пэўна ж можам і разам працаваць.

А калі інтрыгі нізкія, плёткі агідныя, як і раней, будуць выходзіць з іхняго стану, дык хаця мае сябры і пойдуць з імі (а Мамонька кожны дзень меняе палітыку, калі даведаўся, што літоўцы адмовіліся даць візу, дык адразу вецер падуў у другі бок. Я кажу, ці ж с. Ластоўскі вінен у тым, што табе не далі візу, што ж ты лічыш яго гаспадаром Літвы, ці што?) дык, калі усе пайдуць з імі, я астануся адна і ніколі не акунуся ў бруднае балота, якое на-сьмерць заб'е нас як сацыялістычную партыю.

Скажу шчыра, Мамонька ува ўсей гэтай гісторыі трымаўся так, — сягодні са мной, заўтра з імі, мне гаворыць адно, ім другое. Калі мы ужо напісалі пратакол пратэсту проці іхняго нахальнага нежаданьня з намі, сябрамі Прэзыдыуму Рады Рэспублікі, гаварыць, дык Мамонька адмовіўся назаўтра яго падпісаць і заявіў, што ён пойдзе яшчэ раз і як «чэсны» чалавек папярэдзіць, што мы будзем з імі змагацца і публічна пратэставаць, калі яны дазваляюць сабе выступаць ад імя Ураду. Я казала яму, што мы ўжо гэта сказалі, гаварыць больш не аб чым, а калі ён пойдзе, дык зноў завязьне ў іх інтрыгах. Праўда аказалася на ліцо. Яны Мамонькай круцяць, як хочуць. Я ўжо нават перастала цікавіцца, што і як там робіцца, так абрыднялі мне усе гэтыя інтрыгі і сам Мамонька разам з імі.

Ну, да усежтакі прыкладу стараньняў прывясьці партыю да парадку. Мо прыдзецца шмат выбачыць, шмат каго падцягнуць і усім разам падцягнуцца, але ворагам — палякам і камуністам ня можна даваць аружжа ў рукі, а то яны добра на свой бок скарыстаюць наш развал за граніцай.

Ітак, пакуль што нічога не пішыце аб тым, што ужо Ураду няма. Ня трэба палякам падаваць радасьць. Створым моцную партыю, тагды новая сіла заменіць старую ужо спарахнеўшую. Я пісала ўжо Вам, паважаны сябер, каб Вы разам з с. Душэўскім утварылі у Літве заразжа Нац. Камітэт на чале з Вамі, тагды усе работу бел. у Літве можна будзе рабіць без замінкі і рукі будуць развязаны.

Пры гэтым я прыкладаю распіску на заказн. лісты Стахі, якія адпраўлены да Вільні і распіску маю у атрыманьні грошай, 20 доляраў. А калі зрасходуем на якую-небудзь грамадзск. справу друг. 20 доляраў тады ад тае арганізацыі вышлю Вам расп.

Тутака ж прыкладаю копію, хаця не падпісаную, нашае заявы на імя Крычэўскага і пратакол нашае размовы з Прэзыдыумам Рады Рэсп. Захавайце іх, як гістарычн. дакумэнт. Ага, Заяц тутака многа казаў аб маім днеўніку, які заховываецца у Стахі[1], быццам Вы яго паказвалі Крычэўскаму і сьмяяліся над маімі душэўнымі перажываньнямі. Канешня, усе Зайцавы словы і словы Крычэўскага для мяне неважны, але цікава, што яны разглашалі, быццам Вы мяне гэтым днеўнікам трымаеце у руках і выкарыстовываеце. Падлецы толькі подлае і думаюць.

Прывет Клаўдію, Стахе і Анэтке.

З шчырай пашанай П.Бадунова.

P.S. Пішыце па адрэсу майму, гэта лепш будзе ад усяго: Čechoslovaque. Zbraslaw u Prahy. Bilka ul. N101 u Antonina Zemara, pro P.Badunova.

Пратакол прышлю пасьля.

582.1.49:085&r-086&r

[1] Дакумэнт №2228.

3513. Ліст Палуты Бадуновай (Збраслаў) Клаўдыюшу Душэўскаму (Коўна) за 30.11.1923

Вельмі паважаны і даражэнькі таварыш Душэўскі!

Два лісты твае адрасаваныя на Язэпа я чытала і калі ні табе дык сябру Ластоўскаму пісала два разы, хаця і кароценькія лісты і трэці ліст заказны

на твой адрэс. Мне ж здаецца Вы там павінны чытаць іх, ці па крайней меры перадаваць зьмест адзін аднаму. Ось чаму я асобна ня пісала табе. Але ж, бачу, што мусіць і Вы там паміж сабой не саўсім адкрыта гаворыце і падзеляецеся думкамі і весткамі. Дык ось жа я табе і пішу асобна. Але прашу перадаць гэты ліст і сябру Ластоўскаму, каб і ён ведаў аб нашых тутэйшых прыгодах.

Я ўжо пісала, што ляжала хворая каля месяцу. Цяпер яшчэ толькі паднялася і выходжу прагуляцца каля хаты, бо далеко ня маю сілаў і доктар забараніў.

Ажно ось што нарабілася за гэты час.

Уся ковенская камарыльля зьявіўшыся сюды перш-на-перш па свайму звычаю пачала з унутраных і вонкавых інтрыг ды інтрыжак. Ужо праз два дні, як яны зьявіліся — Язэп на мяне чамусьці надуўся. А вядома чаму салодзенькі Зайчык яму чагосьці намазаў. Але ж гэта скажу табе такая брудная кумпанія, што аб ей і не варта многа казаць. Адным словам, яны нас так пасварылі, што мае таварышы, забываючы нават свой ня толькі сацыялістычны доўг і абавязак перад кожным чалавекам, але сяброўскі доўг перад хворым таварышам пакінулі мяне адну у цяжкую хвілю смяртэльна апаснай хваробы. Я пераехала на сваю уласную кватэру у Zbraslav, невялічкі гарадок верстах у некалькі ад Прагі. Там пры пераездзе я ператамілася і прастудзілася. Слава Богу, што здарыліся добрыя людзі рускія і украінцы — яны мяне і лячылі і даглядалі і адхаялі нарэшце.

Ці няпраўда, сябер Клаўдзій, што піша мне Валодзін «кожны з беларускіх дзеячоў жыве толькі для сябе і сам сабой, справа ідэевая вельмі далека ад іх стаіць». А другі чужы сацыяліст піша: «кожны з бел. дзеячоў за граніцай жывуць асабістымі перажываньнямі, плёткамі, да звадкамі і такую развялі загранічай мутную ваду, што далей ісьці некуды»

Так, гэта усе праўда. Мы загранічай, як паложым і ўсе эмігранты толькі ваду муцім. Але ж хто ў гэта[й] мутнай вадзе рыбку ловіць, дык гэта кампанія Цвікевіча і Крычэўскага. Яны тутака спачатку павялі атаку проці мяне. І штож свайго дабіліся — цэлы месяц я нават не ведала, што і чаму так, а не інакш, робяць мае таварышы. Яны самі з імі хадзілі, гутарылі, упусьцілі іх у партыю, далі ім магчымасьць пазычыць у украінцаў грошай. Праўда, як учора тлумачыў сябер Грыб ён хацеў, каб яны тутака затрымаліся і наладзілі культурную працу. А яны затрымаліся і... пачалі з таго, што унясьлі ледзьве не развал у партыю.

Кажу табе адкрыта, яны зрабілі было тое, што я сама толькі чакала выздараўленьня, каб выйсьці з Пражскае арганізацыі куды яны увайшлі праз правакацыю Жылкі, гэтага агента Луцкевіча.

Але усякае дзела, даведзенае да абсурда дае і добрыя вынікі. Таварышы мае скора пераканаліся, што з іх працы будзе такая ж карысьць, як і ў Коўне. Ось жа яшчэ пераканаўся т. Грыб у тым, што яны проста шантажыруюць проці мяне. А выйшла гэта так. Захарко напісаў Тамашу ліст, дзе паставляны былі такія крючкатворныя запытаньні аба мне, на якія ён мусіў справядліва хаця і не саўсім прыгожа адказаць, што гэта усе

«брахня». Мусіць ім гэта не падабалася, і яны парвалі гутаркі і з Тамашом, тагды вочы на іх дзеяльнасьць адчынілася і ў тых хто яшчэ пітаў да іх нейкую павагу. Словам, чым далей у лес, тым болей дроў.

А тое, што яны хваляцца, што мы змушаны маўчаць, дык гэта нас ніскольке не пужае. Бо учора адбыўся у мяне сход Ц<энтральнага> Б<юро>, і мы прынялі рэзалюцыю аб павядамленьні ува усіх газэтах аб нашым выхадзе і аб развале усяго гэтага Ураду. Але я сама настаяла на тым, каб яшчэ пачакалі з яе апублікаваньням з тыдзень, затое, што, ах, як рады будуць гэтаму развалу і камуністы і палякі — яны аб гэтым летуцелі даўно. Ось чаму няхай дзело дойдзе да лёгічнага канца. Мы хочем тутака утварыць не Бел. Раду, як яны сябе агаласілі, а Грамадзянскі Кам. накшталт украінцаў. Тагды і мы зможам увайсьці ў яго і працаваць.

Наогул жа кажучы ня трэба так многа зьвяртаць на іх увагі. Усе роўна іх песьня сьпета. Так, напрыклад у шантажным пісьме да Грыба Цвікевіч, вуснамі ці літэрамі, пісанымі рукамі Захарко, пытаецца у Грыба, на якім, мол, аснаваніі Бадунова заявіла Крэчэўскаму і Захарко: «Больш нам няма аб чым гутарыць, гнілое няхай гніе». А каб ты ведаў, што я гэта праўда што сказала, бо лічу іх «парахней», як палітычнай так і нацыянальнай, аб сацыялізме ж я з імі ніколі і не гутарыла... Уяві сабе такое дзіўнае здарэньне: пішу, ажно адчыняюцца дзьверы і уваходзіць Заяц з філіжаначкай у руках — гэта ён мне, як хворай вареніца прынёс. Трогательно і умилительно, як кажуць па рассейску. Аказываецца, іх так прыпер Грыб, які прэд'явіў украінцам гэткую прапанову — альбо з Цвікамі, альбо з намі, бо мы шантаж іх увесь раскрылі. Ось жа беднага гэтага Зайчыка і паслалі да нас, як прымірыцеля. Ён ужо нічога не мае проці адводу Ураду Цвікевіча: «Вы яго увекавечылі, кажа ён, гэтым ультыматумам». Гэта пад ульт. разумеецца наша з Язэпам заява аб непрызнаньні яго законным. «Але няхай сабе, мы ужо ня будзем яго адстаіваць. А Прэзыдыум трэба захаваць, хаця ўсе-роўна адкрыта тутака немагчыма ніякая праца. Мы зьбяромся зноў і пагутарым. Я яму сказала паміж іншым, што Ковенск. группа распушчана, што на-днях мы патрабуем здачы усіх парт. спраў мне. Ён доўга сядзеў, ажно да першай гадзіны. Шмат аб чым гаварыў. Ось калі праснулісь, калі чужыя падагналі. Я яму прачытала наш пратакол, ужо падпісаны і мной і Мамонькай, аб выхадзе з Прэзыдыуму і аб непрызнаваньні Крэчэўск<ага> і Зах<аркі> за Прэзыдыум. Яго гэта спужала. «Ужо пасьпелі, ужо пасьпелі. — Але, кажу я, ня можна балота ковенскае пераносіць у Прагу. Альбо нешта агульнае, альбо барацьба адкрытая. Словам, паглядзімо. Главар і ўдахновіцель Цвікевіч выехаў да Коўны. Безумоўна, яны хочуць і назад, як ты пішаш, але ходу няма і яны хапаюцца і тутака за усе. Пажывем, пабачым. А аб Урадзе Цвікевіча усероўна апублікуем.

Прывет шчыры тваей жонцы, Анэтке я пішу тутака — перадай ей. Сябру Ластоўскаму паслала заказны ліст, ці атрымаў. — Хай напіша.

Адрэс: Zbraslav-Zavisi u Prahy. Bilka ul. N101 u p. Antonina Zemar pro P.Badunovu.

582.1.49:087&r-088&r

3514. Ліст Палуты Бадуновай (Збраслаў) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.11.1923

Čzechoslawaque. Zbraslaw u Prahy. Bilka ul. 101. u A.Zemara, pro P.Badunowa.

30/XI 1923 г.

Паважаны і даражэнькі
сябер Ластоўскі!

Сягодні паслала Вам заказны ліст[1] з падробным апісаньням усіх здарэньняў з Урадам Цвікевіча. До гэтаго часу паслала Вам два лісты, хаця кароткія, бо ляжала ў гарачцы. Цяпер паднялася, але яшчэ на вуліцу не выходжу і таму на мяне напала самненьне, што можа мае першыя лісты прапалі, а мо загіне і гэты заказны. Ня то што я не давяраю таму ліцу, якому аддаю пісьмы, а так хто яго ведае. Дзіўна, чаму Вы не адказалі ні на адно, дык думаеце, што і не атрымаеце і гэтага. Пайду на почту сама, мо неяк даплятуся. Дык у заказным пісьме я паслала разам з поўнай інфармацыяй і копію з нашае заявы на імя Крэчэўскага, дзе мы не прызнаем законным Урад Цвікевіча. Там жа распіска мая і квітанцыя на пісьмы Стахі, якія перасланы да Вільні.

У трох словах паўтару тое, што там напісана. Прыехаўшы сюды, яны заявілі, што да таго часу ня будуць адчыняць зьезд, пакуль мы не забяром назад заяву аб незаконнасьці Ураду Ц<ьвікевіча>. А інакш нам няма аб чым гаварыць. Я сказала, што калі яны так кажуць, то няхай жа на іх і упадзе адказ за развал апошняго загранічнага бел. цэнтру. Бо мы хацелі, каб Прэзыдыум захаваўся і ў патрэбны час выступаў, а калі яны хочуць, як і раней інтрыгаваць на чале з Цвікевічам, дык мы на гэта ня згодны і парываем з імі саўсім. «Я і адзін магу рэпрэзэнтаваць Беларусь заграніцай заявіў Крэчэўскі. Падумайце, каб Вы усе вымярлі, пэўна ж я адзін бы і рэпрэзэнтаваў». Ці чулі Вы гэтую самадаўлеючую мудрасьць сьвятога інтрыгана. — Але ж пакуль мы не павымярлі, адказала я, дык Вы ня будзеце выступаць, як Урад. Мы яго утварылі, Вы на нашай творчасьці прасідзелі тры з паловай гады, а цяпер мы кажам Вам, годзе! Пэцкаць імя беларускае заграніцай і карыстацца нашым чэсным імям не будзеце. — Ну дык і Вы ж не Прэзыдыум, адказаў ён. — І мы не Прэзыдыум, а застаемся, як былі сябрамі Прэзыдыуму і не складаем з сябе свайго імя, але з Вамі усе кончана».

Мы пашлі усе трое я, Тамаш і Язэп[2]. Цяпер яны утварылі «Беларускую Раду у Чэхаславакіи». Што і як яны думаюць рабіць мне добра невядома. Адно толькі вядома, што карыстаючыся маей хворасьцю і разладам, які утварыў Язэп паміж мной і Тамашом, а таксама нейкім недобрым духам Мамонькі, які узлаваўся, што яму літ<оўцы> не далі візы, яны сумелі ужо і ў партыі пасідзець і нават Цвікевіч выступае з дакладамі аб народніцтве і марксізме. Няхай паходзяць, пакуль я паздаравею, а тагды усежтакі спадзяюся, што дадзім усяму раду.

Трэба, канешня, зазначыць, што яны усімі мерамі і плеткамі на мяне і на Вас (прыдумалі, быццам Вы мяне інтрыгуеце і трымаеце ў руках маім дняўніком, які Вы паказвалі быццам Крэчэўскаму, а калі і паказвалі дык я нічога асаблівага не маю, бо там апрача маей таскі нічога кепскага няма) стараюцца нас знутры разбіць.

Заяць і Пракулевіч перасяліліся у той гарадок, дзе я жыву і Заяц ужо быў у мяне. Я не проч памірыць усіх і была б нават дужа таму рада. Але не верыцца мне, каб гэты агідны Цвікевіч стануў на чысты шлях чэснае працы. Дык пішыце зараз жа, ці атрымалі усе мае лісты, тагды я напішу яшчэ падробней.

Усяго добрага мае таварышы Вацлаў і Клаўдзі.

Ваша сяброўка Палута Бадунова.

У тых лістох я пісала, каб Вы неадкладна заснавалі Бел. Нац. Кам. у Літве на чале з Вамі і тагды дзе выступаць патрэба, дык ад імя яго. Нях хай спачатку у ім будуць і тры чалавекі — гэта неважна.

582.1.49:130&r

---

[1] Дакумэнт №3512. [2] Грыб і Мамонька.

3515. Жаночая доля, паводле беларускай народнай песьні. Дасьледаваньне Вацлава Ластоўскага

582.1.47:115-125

Дата невядомая. Зьмест: І. Нарадзіны дачкі; ІІ. Дзявоцтва; ІІІ. Каханьне. Праца няскончаная.

3516. Падрыхтоўчыя матэрыялы, нататкі й выпісы да працы «Жаночая доля»

82.1.47:126-170

Дата невядомая. Рыхтаваныя Вацлавам і Станіславай Ластоўскімі. На адвароце некаторых аркушаў — карткі з словамі для «Расійска-крыўскаа слоўніка».

3517. Сшытак з практыкаваньнямі ў нямецкай мове (?)

582.1.47:171-177

Дата невядомая.

3518. Дыктоўка ў расейскай мове

582.1.47:178

Дата невядомая.

3519. «Списокъ темниковъ»

582.1.47:179-181

Дата невядомая.

3520. Ліст Аляксандра Ружанцова (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.12.1923 з падзякай ад рэдакцыі часапіса «Mūsų Žinynas» за дасыланы «Крывіч»

582.1.49:090

3521. Паштоўка Макса Фасмэра (Ляйпцыг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.12.1923

Многоуважаемый Господин Редактор!

Только сегодня мнѣ предоставился случай навести справку относительно нужных Вам книг в здѣшней Университетской библіотекѣ. К сожаленію, не могу Вам сообщить ничего утѣшительнаго: не оказалось ни нужной Вам книги Савича, ни Lelewel'a. Сомнѣваюсь, чтобы их вообще можно было найти в Германіи, т.к. французская литература здѣсь плохо представлена.

С удовольствіем напишу кое-что для Вашего журнала, если будет что нибудь подходящее. Не знаю, интересует ли Вас вопрос о собираніи памятников народной словесности или матерьялов для бѣлорусскаго словаря. Такого рода собранія имѣли бы для науки большое значеніе.

Комиссар по бѣлорусск. дѣлам в Литвѣ недавно писал мнѣ, что посылает Славянск. Институту в Лейпцигѣ всѣ блр. изданія комиссаріата. Пока ничего не получено. Знаете ли Вы его? Сердечный привѣт!

Готовый к услугам

М.Фасмер

582.1.49:091&r

3522. Паведамленьне Беларускай Партыі Сацыялістаў-Рэвалюцыянэраў за 8.12.1923 (Прага)

ИЗВЕЩЕНИЕ

Белорусской Партии Социалистов-Революционеров

В связи с тем, что в последнее время за границей появилось много разных «представителей» белорусскаго народа и «защитников» его интересов, Бюро Ц.К.Б.П.С-Р. считает своим долгом опубликовать нижеследующее извещение:

1.- Правительство Белорусской Народной Республики (Совет Народных Министров во главе с В.Ластовским), избранное Радой Белорусской Народной Республики 13 декабря 1919 года в Минске под польской окупацией как противовес в то время образовавшейся с ярко полонофильской тенденцией т.наз. «Найвышейшей Раде», - уступая вооруженной силе окупационных властей вынуждено было оставить границы родного края и уже в эмиграции заключив договор с правительством Литовской Республики переехало в Ковно, продолжая выступать в обороне права белорусскаго народа на свободное самоопределение и государственную независимость, перед правительствами Европы, как единственно законное правительство Белоруссии. Это правительство в условиях длительной эмиграции в связи с разногласиями среди его членов по целому ряду вопросов тактики борьбы с окупантами стало переживать внутренний кризис, который весной 1922 года, в связи с неудачным выступлением делегации правительства в Генуе, закончился расколом и правительство фактически перестало существовать. В апреле м-це 1923 года председатель правительства В.Ластовский сложил свое полномочие вследствие чего Правительство Б.Н.Р. и юридически перестало существовать.

2.- Точно также распался на эмиграции и перестал существовать как представительный орган Белоруссии и Президиум Рады Б.Н.Р. избранный 13 декабря 1919 года в Минске во главе с П.Кречевским, В.Захарко, П.Бодуновой.

3.- Созданная в Ковне т.наз. белорусская «Дзяржауная Калегія» во главе с П.Кречевским, - как бывшим председателем президиума Рады Б.Н.Р., - которая по мысли ея организаторов должна была заменить собой и правительство Б.Н.Р. и президиум Рады Б.Н.Р. как организация искусственно созданная, не имеющая никакой связи с краем, также незаметно прекратила свое существование как и возникла.

4.- Так называемое «правительство» А.Цвикевича, искусственно созданное на эмиграции и пребывающее в Ковне, не может считаться законным правительством Б.Н.Р., так как, согласно конституции, правительство избирается исключительно пленумом Рады Б.Н.Р. Как организация частная, не имеющая никакой связи с ответственными белорусскими партиями и организациями как в крае так и за границей это правительство является безответственным и самозванным.

5.- Вся «деятельность» в Литве г.Я.Воронко, как в бытность его литовским чиновником-министром белорусских дел при литовском правительстве, так и по выходе его в отставку, который в 1918 году во время немецкой окупации подписывал благодарственную телеграмму кайзеру Вильгельму вместе с Р.Скирмунтом, П.Алексюком и др., против чего решительно протестовала Белорусская Партия Социалистов Революционеров, и, который в настоящее время поехал в Америку как делегат самозваннаго «правительства» А.Цвикевича, является сплошной «воронковщиной» ничего общаго не имеющей с подлинным белорусским освободительным движением.

6.- Созданная в Праге так называемая «Белорусская Рада» во главе с П.Кречевским и А.Цвикевичем есть ни что иное, как новое авантюристическое предприятие, новая попытка спекуляции на идее белорусскаго освободительнаго движения и его представительства за границей, группы политически обанкротившейся и дозорьентированной, недавно примкнувшей к белорусскому движению интелегенции, потерявшей всякие нормы политическаго мышления и морально этическаго поведения.

7.- Ковенская группа социалистов революционеров во главе с А.Карабачем и В.Прокулевичем, присвоившая себе наименование, ранее существовавшаго в Ковне «Комитета заграничной группы Б.П.С-Р.» и подписывавшая протесты и меморандумы от имени этого комитета сознательно делала формальный подлог. Эта группа Б.С-Р. в Литве (Ковно) организовав т.наз. «Беларускую Селянскую Раду у Літве», во главе с теми же А.Коробачем и В.Прокулевичем, самочинно выступила на выборах в Литовский Сейм в блоке с реакционно-черносотенными союзом русских граждан в Литве, во главе котораго стоял бывший генерал-губернатор, царский сотрап, крупный землевладелец, ярый русификатор — Веревкин. Принимая участие на выборах в Литовский Сейм, ковенская группа Б.С-Р. этим самым принимала политическую платформу национальнаго меньшинства в Литве в современных границах которой не входит ни одного клочка территорий с большинством этнографически-белорусскаго населения, в то время как партия в лице ея ответственных органов ведет борьбу за независимость Белоруссии, формулируя это в следующем выражении: на территории с большинством этнографическаго белорусскаго населения вся полнота власти должна принадлежать белорусскому народу.

Оторвавшись от идейных партийных центров, ковенская группа Б.С-Р.-граждан Литвы от внутренняго политическаго и моральнаго разложения начала распадаться и в конце выявила полную свою безпринципную примитивность и духовное убожество принимая участие в организации «правительства» А.Цвикевича. Постановлением Бюро Ц.К.Б.П.С-Р. за 17 октября 1923 года эта группа считается выключеной из организованых рядов Б.П.С-Р. представляя право бывшим ея членам подавать заявления в Бюро Ц.К. о своей принадлежности к партии.

Бюро Ц.К. Белорусской Партии
Социалистов Революционеров

8.XII.23.
(Прага)
582.1.44:077-078 — мк
582.1.44:054-056 — мк

3523. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.12.1923

Вельміпаважаны Пане Вацлаве!

Ня ведаю, чаму Вы пытаецеся, ці выдаваць «Крывіч» у 1924 годзе. Ведама, што выдаваць; гэта маё шчырае перакананьне. Магчыма, што ён слаба разыходзіцца а мусіць яшчэ меней мае платных падпішчыкаў, бо загранiцай заўсёды будзе разыходзіцца слаба а пры высокай валюце літоўскай і пагатове, але карысьць з яга пеўная. Я разумею, што Вам цяжка, бо прыходзіцца аднаму запаўняць блізу ўвесь №. Мне стыдна, што я Вам надта мала памагаю, але апраўдаваюся тым, што тут увесь час займае навука.

З вялікай прыемнасьцяй я прачытаў апошні №5 «Крывіча». І мова шмат паправілася. У гэтым № мова ўжо нішто, хоць ведама і тут ё непатрэбныя нэолёгізмы й барбарызмы. Спачатку я адносіўся крытычна да Вашае (а мне здаецца ляпей «Вашэцінае») языкаведнае працы, але цяпер бачу, што з яе будзе карысьць. Толькі захапіўшыся мовай, не выдавайце (гэтым я не хачу сказаць, што Ваша выдаеш) за народнае тое, чага народ ня ведае, бо гэтым найбалей пашкодзілі-б мове. Калі «голс», «галшчыць» (*с* пера *ч* заўсёды пяройдзе ў *ш*), «голскі» кажуць «ад Друі да Бешанкавіч», дык і добра; значыцца яга можна ўжываць і ў літэратурнай мове. Няма дзіва, што я яга ня ведаю, бо Вы беларускага фольклёру больш начытаўшыся за мяне.

Дазвольце, што я падзялюся крышку з Вашэцяй свайміі думкамі, што да Вашэціных «Беларускіх аднасловаў»[1]. Мне здаецца, што ў крывіцкай мове ё толькі розны і г.п., якое і ўжываецца ўва ўсіх Вамі прыведзеных значэньнях. Добра выясьнена «ведаць», «благі» і «болагі», «казаць», гаманіць, гутарыць, гукаць і г.д. але прапусьцілі тут слова «мужаваць», аб якім, здаецца, мне калісь казалі і якое кажацца ў Валожынскім цяперашнім павеце, яно значыць яшчэ сур'язьнейшую гаворку чымся «гутарыць». А «друга» ўсё-ж ткі ў беларускай мове няма. Вы й самі яга толькі навукова выводзіце. Калі ё ў крывіцкай мове дружба і г.п., дык гэта яшчэ ня значыць, што мае быць і «друг», бо «друг» быў у агульнаславянскую

пару, а ў беларускай мове яго не асталося. Гэткіх прыпадкаў у славянскіх мовах шмат. Добра выясьнілі, што значыць «кветка» і добра кажаце, што на «цвѣтокъ» трэба казаць заўсёды «краска», але ня можна заместа «цьвет» і «цьвісьці» заўсёды казаць краса, красаваць. Дрэвы (ігрушы, яблыны, ліпы і г.д.) і краскі (рожа, мак, лён, грэччына і г.д.) цьвітуць а травы (мятліца, жыта і г.д.) красуюць; на дрэвах і красках ё цьвет, а на траве краса. Калі прыраўнуем, прыкл., красу жыта да цьвету яблыны ці маку, дык угледзім, што хоць назначэньне іх адно, але яны розна выглядаюць. Дык ляпей і захаваць гэтыя абодвы словы, будзе можна адцеміць адценак і мова будзе багацейшая.

«Адказ» мае значэньне, памойму, маскоўскага отвѣтъ, а «адказнасьць» — отвѣтственность, але адказ напару можа ўжывацца і ў значэньні «адказнасьць», так як і маск. «отвѣтъ» напару ўжываецца ў значэньні «отвѣтственность». На мой отвѣтъ. Адповедзь была-б полёнізмам.

Прышлеце калі ласка мне «слоўнік геомэтрычных і трыгономэтрычных тэрмінаў і сказаў»[2].

За прысланыя Вамі грошы мы выдалі «Б. Ст.» №4-5 і №6 і яшчэ асталося на №7[3].

Падмога ад Вас ведама нікога не компрамітуе, але ясна, што калі-б с.-р. даставалі ад Вас падмогу і аб гэтым было ведама, дык не маглі-б яны йсьці й не маглі-б быць прыняты ў Беларускую Раду Цьвікевіча, асабліва-ж у характары палітычных дзеячоў, хоць-бы і без палітычнае работы.

З шчырым паважаньнем.

Я.Станкевіч

582.1.49:092&r

[1] Артыкул В.Ластоўскага, надрукаваны ў №6 «Крывіча» за лістапад 1923 году. [2] Выйшаў у Коўне ў лістападзе 1923 году. [3] №7 «Беларускага Студэнта» быў апошнім.

3524. Паштоўка Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.12.1923

582.1.49:098&r

Пра немагчымасьць далейшага супрацоўніцтва ў «Крывічы» дзеля матэрыяльных цяжкасьцяў. « [...] Въ №5 я помѣстилъ три артикула общею сложностью въ $4^3/_4$ страницы [...]

[...] Λευκορουθενοστασις. Это по гречески, а не по еврейски. Угадайте, что это такое? Никогда не угадаете и, вѣроятно, не узнаете.»

3525. Ліст Віктара Вальтэра (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 13.12.1923

Прага. 13 сьнежня 1923 г.

Высокапаважаны, пане рэдактар!

Адсылаючы Вам паквітаваньне, я дазволю сабе адаслаць Вам і свой глыбокі дзякуй за тое, што не гледзячы на маё слабенькае й мала-культурнае «Я», Вы ўсё ж ткі надрукавалі слабенькія «Аднабочнікі»[1].

Дзякуючы Вам, я ўбачыў свой твор значна лепшым, чым спадзеваўся, хоць у некаторых мейсцах зауважыў зьмену проста грунтоўную, як напрыклад, з «Апошняго Даруй», Лебядзька выкінута было слова: удавы!

Ласьне, ў гэтае слова ўпіраецца ўся думка чалавека-самагубца, бо жыццё, па яго думцы, ёсьць ня толькі турма, ня толькі «джбан вады вышэйшай істоты», але проста — зьвярынец, акварыум гэтых удаваў...

Затым, шмат друкарскіх памылак вельмі часта шкодзіла мове самай, а мяйсцамі проста зьменівала сэнс, як напрыклад, у №5, заместа таго, каб было: мы, як птушкі, надрукавана: мы, як пятушкі, пачалі й г.д.

Ведама, й пятушкі выпушчаюцца часам з клеткі й распрамляюць крыльлі з сваім ку-ка-рэ-ку! Але ж ці лепш падабаюцца гэтыя пеяньня й «адраджэньне» пятушкоў, за сьпевы вольнай птушкі на зялёным дрэве пад купалам блакітнага неба...

Хаця, ці варта пісаць аб гэтым? Цяпер гэта ўжо — гістарычная даўнасьць, бо так ці інакш «Аднабочнікі» надрукаваны й здадзены ў архіў.

Балей, пакуль што нічога ня маю, ды ці буду мець балей, — ня ведаю...

Вы пытаеце адносна зацікаўленнасьці студэнцкіх кругоў «Крывічом»? Цяжка сказаць аб гэтым што-небудзь канкрэтнага, як цяжка знайсьці якую-небудзь акрэсьляную форму ў тумане. Студэнства, як цэлага, трэба сказаць, няма. Ёсьць пэўны кангламэрат, мазаіка людзёў, зьвязанных толькі прыналежнасьцей да аднаго беларускага будынку. У гэтым будынку можна разгледзіць два бакі: адзін належыць узгрупаваньню, г.зв. беларускай студэнцкай сэкцыі, другі: «Аб'еднаньню Паступовага Студэнцтва». Гэтыя ўзгрупаваньні жывуць сваім асобным жыццём, ніколі ня стыкаюцца разам на паседжаньнях (за выняткам выключных мамэнтаў), так як быццам — дзьве палаты Парлямэнту.

Але зноў такі, гэтыя ўзгрупаваньні ёсьць толькі драбнейшы падзел той самай мазаікі людзёў, прымазанных да цэлага рукою, часьцей Выпадку, вельмі рэдка Пераконаньня.

Адсюль і адносіны студэнства да «Крывіча» самыя разнастайныя. Адны дзеля надта чырвоных пераконаньняў нават «зусім ня цікавяцца гэтай газэткай» (!), другія — мала цікавяцца, й толькі трэцяя, большасьць, запраўды цікавяцца й ахвотна чытаюць, хоць грошы любяць выкідываць толькі на што-небудзь «канкрэтнае». Прысланныя Вамі нумяры я толькі з нацяжкай распаўсюджыў. Так я зьбіраю рысы адносінаў студэнтаў да «Крывіча» ў тумане студэнцкага індыфэрэнтызма.

Адзначу пажаданьні, якія я чуў ад большасьці чытаючых студэнтаў. Не падабаецца ў «Крывічы» непрапарцыянальна багаты археолёгічны й гістарычны матар'ял, цікавы хіба для спэцыялістаў, побач з малым літэратурным матар'ялам, дзе шмат перакладаў, але мала арыгінальных рэчаў. Гэта, прыдае часопісі від нейкіх археолёгічных запісак й таму не адбіваецца так моцна на студэнстве, поўным агульных праклятых праблем й шуканьнем жыццёвага сьветапагляду.

Рэзумуючы ўсё, скажу, студэнства часопісь прыймае да ведама. Затым, прыміце шчырае запэўненьне ў глыбокай да Вас пашане.

Вальтэр Віктар.

582.1.49:096&r

[1] Апавяданьне надрукаванае ў №№04 і 5 «Крывіча» за кастрычнік і лістапад 1923 году.

3526. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 13.12.1923

582.1.49:097&r

З падзякай за дасланы №5 «Крывіча». Аб плянах напісаць дысэртацыю на тэму «Таргоўля ў Полацку XIII-XIX ст.»

«[...] Мне, як гісторыку, зразумела больш усяго па сэрцу «Запіскі». Гэта здаецца зярнятамі запраўднага металю сярод такога шлаку як «Аднабочнікі» [...]»

3527. Ліст Івана Краскоўскага й іншых беларускіх дзеячоў Латвіі (Дзьвінск) Аляксандру Цьвікевічу (Коўна) (не раней за 19.12.1923) аб памылковым насьвятленьні беларускіх справаў у Латвіі ў справаздачы А.Цьвікевіча ў Край, аб канфлікце І.Краскоўскага з К.Езавітавым

Высокапаважаны гр. А.Цьвікевіч.

У Вашай апошняй справаздачы у Край аб становішчы беларускага руху Вы, ня гледзячы на папярэджэньне аб тым, што Латвія не ўваходзіць у Ваш агляд, адвялі значнае мейсца беларускай працы у Латвіі і пры гэтым выявілі поўнае неразуменьне і незнаньне той справы, аб якой з гэтакай самапэўнасьцью Вы гаворыце.

Дзеля таго, што гэты Ваш афіцыяльны дакумэнт можа атрымаць шырокае аглашэньне і такім чынам беларускае грамадзянства вынясе памылковае ўражэньне як аб становішчы беларускае справы у Латвіі, так сама і аб нашай працы, мы прымушаны у форме адкрытага ліста да Вас даць некалькі паясьненьняў.

1) «Здароваму ўзросту культурнай працы у Латгаліі перашкаджае барацьба паміж Краскоўскім і Езавітавым. На наш пагляд прычыны гэтай сваркі пераважна персанальныя» - гаворыце Вы і далей самі пераходзіце, выбачайце, да наіўнай казуістыкі і пробуеце давясьці, што прынцыповага разыходжаньня тут няма, а есьць толькі разыходжаньне тактычнае.

Няўжож Вы, грамадзка-палітычны дзеяч, не разумееце, што тактычнае разыходжаньне у працы паміж дзьвюма группамі зьяўляецца разыходжаньнем прынцыповым, а не пэрсанальным.

2) Тактычнае разыходжаньне згодна Вашых слоў заключаецца у тым, «як фармуляваць свае адносіны да расейскага элементу у Латгаліі, якую тактыку у стасунку да яго прыняць, чы паступова-толеруючую, чы актыўна-варожую і непрымірымую».

Гэты Ваш вывад базуецца толькі на незнаньні справы, якой аб'ектыўна Вы і знаць не маглі, бо ніхто з нас ні прыватна, ні афіцыяльна Вас аб ей не інфармаваў.

Аснова гэтага разыходжаньня ляжыць не у паступова-талеруючым чы непрымірыма-варожым адношаньні да расейцаў, а ляжыць яна у самых прынцыпах працы.

Адна группа дзеячоў, стаўшая с пачатку сваей працы на шлях бязмернага пашырэньня толькі беларускіх назоў, прылажыўшая цэнтр вагі не да істоты справы, а толькі да яе павярховасьці, не хоча цяпер зыйсьці з гэтага шляху, перайсьці да ачышчэньня беларускае справы ад варожага і

шкоднага элементу і ня гледзючы на кадры нацыянальна сьвядомых беларускіх маладых рэзэрваў, лічыць патрэбным супрацоўнічаць нават з асобамі, адкрыта ганьбячымі усе беларускае.

Другая группа, якая у аснову сваіх мэтадаў працы паклала паглыбленьне справы, ясна усьвядамляючы усю катастрафічнасьць рэгрэсіі беларускай справы у Латвіі за 3 гады, рэгрэсіі вочавіднай ня толькі для абедзьвюх группаў, але і для чужых, ясна угледжываючы прычыны гэтай рэгрэсіі у вочавіднасьці слабага шырокага развалiваючагася фронту, гэтая группа падлічыла усе маючыяся у Латвіі сілы беларускіх працаўнікоў і для ратунку справы прызнала патрэбным, шляхом замены шкоднага элементу маючыміся маладымі рэзэрвамі, стварэньне можа меньшага, але моцнага фронту запраўдных нацыянальна-сьвядомых працаўнікоў.

Такім чынам з гэтага паясьненьня для Вас можа быць зразумелым, што справа ідзе не аб тым чы іншым адношаньні да расейцаў і зразумела не аб пэрсанальнай барацьбе паміж Краскоўскім і Езавітавым, а справа ідзе выключна аб прынцыповым разыходжаньні у поглядах на мэтады працы.

3) «Абедзьве стороны апелююць у сваей сварцы да Латвійскага ураду і Сойму» гаворыце Вы. Вам, як юрысту, павінна быць вядома, што апелююць толькі у выпадку незадаваленьня якім небудзь рашэньнем.

Мы ня ведаем, чы апелявала і у які спосаб апелявала іншая группа, а што датыча нас, то мы лічылі патрэбным, павядоміўшы сваечасна кіраўніка Беларускага Аддзелу, падаць 19/XII.23 г. Міністру Прасьветы заяву аб тым, што «мы не лічылі для сябе магчымым пры сучасным становішчы падзеляць адпаведальнасьць за тыі пасьледствы, якія могуць зьявіцца вынікам сучаснага напрамку».

На наш пагляд гэта ня есьць апеляцыя пакрыўджанага, а акцыя грамадзкіх працаўнікоў, ясна усьвядамляючых усю важнасьць іхняе працы і усю адпавядальнасьць, якая на іх ляжыць.

4) «У Прыбалтыцы» (г.е. і у Латвіі) «наша праца маглаб разьвівацца больш актыўна, каліб для гэтага быў хоць невялічкі лік здольных працаўнікоў з атпаведнымі палітычнымі і арганізацыйнымі здольнасьцямі» сурова крытыкуеце Вы далей.

Гэта значыць Вы пазбаўляеце нас атэстатаў працоўнай нацыянальнай здольнасьці.

Што можна Вам адказаць на гэты глыбакамудры прыгавор.

Кожны, хто прачытае Вашую справаздачу, кожны, каму нашыя прозьвішча не зьяуляюцца невядомымі, сам зробіць вывад аб вартасьці Вашага прыгавару.

5) «Па маючымся у мяне данным, сварка можа прычыніцца да поўнага развалу беларускае справы у Латгаліі. Латвійскі Урад і Сойм пачынае з рэзэрвай ставіцца да пытаньня аб далейшым падтрыманьні», зазначаеце Вы, пераходзячы ад аналізу да маляваньня становішча беларускае справы у Латвіі.

У праўдзівасьці гэтых данных мы дазволім сябе усумніцца, бо у нас есьць многа фактоў запэўненьня з боку адпаведных прэдстаўнікоў Латвійскага Ураду і Сойму як раз у працілежным. Таму што па зразумелым

Вам прычынам, гэтыя факты не падлягаюць шырокаму абвешчаньню, таму мы не адважываемся апублікаваць іх.

Мы можамо толькі зазначыць Вам з свайго боку, што да таго часу, пакуль беларуская справа у Латвіі будзе мець хоць невялічкую, але моцную нацыянальна сьвядомую армію, беларускіх працаўнікоў, да таго часу яна знойдзе уселякую падтрымку з боку Латвійскага Ураду.

Паьсля ўсяго вышэй сказанага мы пэўны, што з паясьненьняў беларускай працы у Латвіі, якія мы прымушаны былі даць гэтым пісьмом, Вы зразумееце усю памылковасьць Вашай справаздачы у частцы датычна Латвіі і знойдзеце спосаб для ануляваньня гэтай часткі, а разом з тым і для прыданьня Вашай справаздачы большай верагоднай вартасьці.

І.Краскоўскі
У.Корці
П.Жэрдзі
А.Якубецкі
У.Пігулеўскі
П.Мядзіолко-Грыб

582.1.04:071-072 — мк

3528. Квіток аплаты за мэдычныя аналізы — 4 літы, 20.12.1923
582.1.49:099

3529. Паштоўка Купчанкі (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.12.1923 з калядным віншаваньнямі
582.1.49:089

3530. Ліст Анатоля Плескачэўскага (Вілкавішкі) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.12.1923 з просьбаю памагчы пераехаць зь сям'ёю ў Менск
582.1.49:100&r-101
582.1.49:100а — канвэрт

3531. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) народнаму камісару асьветы БССР Усеваладу Ігнатоўскаму (Менск) за 27.12.1923

У Камісарьят Асьветы Б.С.С.Р.
Камісару Асьветы т. Ігнатоўскаму.

Мы ужо поўгода дарэмна бьемося стараючыся наладзіць абмен выдавецтвамі з «Савецкай Беларусьсю» і месячнікам «Полымя» Высыланыя намі нумэры нашай часопісі вяртаюцца з Масквы назад. З трыдцаці адрэсоў на бібліотэкі і навуковыя установы не вяртаюцца толькі адрэсаваныя у Петраградзкую публічную бібліятэку ды Румянцаўскі Музэй. Рэшта усе, не выключаючы Дзяржаўнай Бібліотэкі Б.С.С.Р. у Менску, варочаюцца. Мне параілі у тутэйшым прэдстаўніцтве Р.С.С.Р. напісаць аб гэтым да Вас, яны лічаць, што часопісь адрэсаваная у бібліатэкі павінна даходзіць. Нам, а, здаецца і Вам важна каб абмен быў наладжан. Мы ахвотна друкуем усе весткі аб культурнай у Вас працы, а гэта-ж усё разыходзіцца

шырока па заграніцы і інформуе ня толькі беларускага, але і чужаземнага чытача. Гэта тым болей важна, што апошнія весткі, як пашырэньне тэрыторыі Б.С.С.Р., як беларусінізацыя дзяржаўных устаноў, культурная праца і інш. яднае Вам праўдзівых прыхільнікаў. Дык німа што хаваць гэта. З другой стараны у нашай часопісі шмат тоўпіцца цікавага матэрьялу па беларусаведаньню, што павінна цікавіць менскія навуковыя кругі. У сваей часопісі мы дагэтуль трымаліся у стасунку да Савецкай Ўлады лояльнай опозыціі, дык, думаю, гэта ня можа быць перашкодай да абмену выдавецтвамі.

Калі знойдзеце магчымым зрабіць абмен, прашу адрэсаваць друкі, пасыланыя у Рэд. «Крывіч» гэтак: Lietuva, Kaĭnas, Užsieniu Ministerija ponui Joninui del Red «Krywič», або Дыпл. Прэдст. Р.С.С.Р. Міцкуну, для Рэд. «Крывіч».

Мы ахвотна будземо памяшчаць агляды, а ў паасобных здарэньнях і разбор надрукаваных у Менску беларускіх кніжак, калі іх будзем атрымліваць. У нас робіцца даволі значная работа па тэрміналёгіі, прасіў бы перасылаць прынятую у Вас тэрміналёгію. Маю шмат матэрьялаў да вайсковай тэрміналёгіі і мог-бы калі патрэба дапамагчы Вашым Камісіям, калі можна гэта наладзіць.

582.1.49:102&r

3532. Ліст Сымона Дарафеева (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.12.1923 з дасланымі для публікацыі ў «Крывічы» вершамі

582.1.49:056
582.1.49:056а — канвэрт

3533. Вершы Дзеда Сымона (С.Дарафеева): «Родная мова», «Па катах!», «Недаспеўшая»

582.1.49:057&r

3534. Ліст Браніслава Эпімаха-Шышілы (Петраград) рэдакцыі «Крывіча» (Коўна) за 30.12.1923

Пецярбург, 30го сьнежня 1923.

Вельмі паважаная Рэдакцыя!

Тыдні два таму назад у Бібліятэку Пецярбургскага Унівэрсытэту прышла першы раз заказная бандэроль с 5ым (Лістападовым) нумэрам пекнага беларускага месячніка «Крывіч» (тытул літэрамі доктора Францішка Скарыны). Дужа я усцешыўся, пабачыўшы першы раз гэты родны часопіс, аб каторым я дагэтуль ня чуў і няведаў. Ці гэта толькі адзін гэты 5ты нумэр прыслала паважаная Рэдакцыя, ці мо' і першые чатыры, але яны не дашлі?.. Вот жа дарагіе і каханые рэдактары, пане Вацлаве і пане Кляўдыушу, успомніце аб сваім старым земляку, каторы цудам праве уцалеў дагэтуль, астаўшыся тут адзінокім, як палец і перажыўшы вельмі цяжкіе гады холаду, голаду і небязпекі. Будзьце ласкавы прыслаць мне поўны камплект гэтага дарагога для мяне Вашага выданьня, пачынаючы ад нумэру першага, адрэсуючы толькі у Бібліятэку Унівэрсытэту, не выменяючы

майго назвіска, каб іх не затрымалі, а паставіўшы толькі гдзе нібудзь на бандэролі ініцыалы Б.Э.Ш. незначна, каб ня кідаліся дужа у вочы. На міласьць Боскую прашу Вас аб гэтым. Буду Вам вельмі і вельмі ўдзячны за гэта і гатоў заплаціць, сколькі скажэце. Напішыце толькі якімі грашмі і якім пуцём зробіць гэта. Аж слёзы ад радасьці брызнулі ў мяне з вачэй, як пабачыў я Вашы назвіскі: «Пад рэдакцыяй В.Ластоўскага і К.Дуж-Душэўскага». Чакаючы з вялікай нецярплівасьцю весткі ад Вас і спаўненьня маей просьбы, сэрдэчна усьціскаю Вас, дарагіе браты-землякі і, пасылаючы Вам і ўсім там беларусам свой нізінькі паклон, астаюся с пашанай

адданы Вам

Броніслаў Эпімах-Шыпілло.

P.S. Заўчора атрымаў я з Менска ад Выдавецтва «Савецкая Беларусь» 1) Беларускі работніцка-сялянскі каляндарь на 1924ы год і 2) Цішка Гартны. На дзень пятнаццацёхгадовага юбілею яго літэратурнай працы 1908—1923. Аўтобіаграфія. Крытычны нарыс. Пасьвячэньні і Выбраные яго творы. Выданьне Інстытуту Беларускай Культуры. Менск 1923 (Стр.(2)+79 і партрэт). З Чыкаго (Амэрыка) меў я несказаную радасьць атрымаць пісульку ад Язэпа Варонкі, каторы пішэць, што высылаець мне адначасова пакет с тамтэйшымі беларускімі выданьнямі, але я дагэтуль нічога не атрымаў.

Бывайце здаровы і вясёлы, каханые і дарагіе маі!!!

Ваш Бр. Эпімах-Шыпілла

582.1.49:103&r-104&r

582.1.49:103а — канвэрт

3535. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Дзьвінск) Станіславе Ластоўскай (Коўна) за 31.12.1923 з навагоднім віншаваньнем

582.1.49:105

3536. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 31?.12.1923

Вельмішаважаны Пане Вацлаве!

Грошы 645 (шэсьцьсот сорак пяць) карон на журнал сягоньня дастаў. Ад імя Рэдакцыйнае Колегіі шчыра дзякую. Сюды прыкладаю расьпіску.

Мне «Вялікая шышка»[1] вельмі падабаецца. Аўтар здаецца мае талент. Склад лёгкі, чытаеш з цікаўнасьцяй, характары добра змаляваны. Аўтар яе Язэп Драздовіч, Вы мусіць знаеце. Ён адначасна й маляр. Чалавек вельмі арыгінальны, мае ў сабе шмат «вар'яцкага без вар'яцтва», што абяцае ў сваім гэроі ў далейшай кніжцы апісаць. Загана «Вял. шышкі», што няма шырыні, аўтар мае дзела толькі з двума-трыма тыпамі. У мове аўтара ё шмат добрага, але і шмат благога. З мовай ён відаць шмат не цэрамоніцца, дапушчае барбарызмы лёгка. Драздовіч індывідуалісты ажно да анархістычнасьці. Паміж іншым гэта праявілася ў яго пробках «мовы Полаччыны» (у канцы кніжкі), дзе ён чуе тое, чага нельга ані вымавіць, ані пачуць, прыкл. удаласьцьцю (два *ц* тут ніводзін чалавек у сьвеце ня скажа).

Часу знайду весьці карэспандэнцыю аб мове, хоць мо' ня шмат. Не заўсёды аднак я буду магчы сказаць штось неўнае. Дзеля гэтага патрэбна было-б толькі гэтым займацца, дый то ўсяга неўнага ня было.

Вось і не магу цяпер адказаць на неўна што да слова «пан». Гэта ня так важна, ці яно аднага паходжаньня з бан, фон, ван. Важней тое, што яно ў нашай мове не спрадвеку, а мусіць зьявілася так у стагодзьдзі 15-16, але ўжо мае правы грамадзянства па ўсёй Беларусі, дык і няхай астаецца. Гэта-ж самае з маскоўскім «хозяинъ». Розьніца толькі ў тым, што мы пераняліз Захаду, а маскалі ад татар. Пытаньне можа быць толькі ў тым, ці яга ўжываць толькі ў значэньні «помѣщикъ», ці й яшчэ ўжываць як ветлы тытул «господинъ».

№6 «Крывіча» яшчэ тут не дасталі. З маладымі пісьменьнікамі а la Вальтэр (ня Вольтэр) не цэрамоньцеся, бо яны перастануць з Вашэцяй цэрамоніцца. Гэта маскоўская хвароба пісаць парнаграфію.

Жадаю Вашэці й Вашэцінай жонцы вясёлых сьвят і шчасьця ў Новым 1924 годзе.

Кл. Душэўскаму калі ласка перадайце гэтую пісульку. З ашчаднасьці не пасылаю яму асобна, няхай выбачае.

З шчырым паважаньнем
Янка Станкевіч
582.1.49:106&r-107&r

[1] Я.Нарцызаў [Я.Драздовіч]. Пабраціцы і вялікая шышка. Вільня, 1923.

1924

3537. Статут Саюзу Настаўніцкіх Арганізацыяў Балтыкі
582.1.44:089-090 — мк

Дата невядомая.

3538. Ліст Палуты Бадуновай (Збраслаў) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.01.1924

4—I—1924г. Zbraslav

Даражэнькі сябер Вацлаў!

Вітаю Вас, і с<ябра> Клаўдзія, і Стаху, і Анэтку з Новым Годам. Пасылаю Вам свой сердэчны прывет і сэрдэчнае дзякую за журналы. Справа абстаіць так, што скора мы тутака зможам арганізаваць бібліятэку-чытальню і тагды можна там-жа устроіць прадажу «Крывіча». Апошні номер (6) надзвычай робіць добрае ўражэньне. На мяне аграмаднае ўражэньне зрабіў верш «Адзінокі»[1]. Родны мой! Ці не сябе Вы лічыце адзінокім. Пакіньце Вашы сумныя думкі, за Вамі сачаць мільлены вачэй беларускага прыгнечанага народу. І праўду трэба шукаць толькі там у самай гушчы народнай ды яшчэ ў сваім уласным сэрцу. Бо тая жалкая інтэлігенцыя беларуская, якая трэплецца па загранiцай і пляміць Ваша добрае імя, сама не варта нуля, і ня сярод яе, або ў ёй трэба шукаць праўды. Ось жа тутака

разумныя чэхі іх добра раскусілі, не вераць ім аніяк. Зайца правялі старшыней новага прэзыдыуму Беларускай Грамады ў Празе, а я намесьнік старшыні. Але з Беларускай Радай мы нічога супольнага не маем і мець ня хочам. Няхай варацца ва ўласным саку, здаецца пераварацца ў юшку. Заяц казаў, што з Амерыкі ім таксама нічога не шлюць, нават не адпісываюць, на дзьве телеграмы на імя Варонкі не атрымалі зусім адказу. А прафесор Ляцкі, з якім я пазнаемілася, зьбіраючы грошы па падпісному лісту для галодных беларускіх студэнтаў, казаў мне, што міністерство ня хоча нават з імі гаварыць. Усежтакі ім удалося здабыць пяць тысячаў, але цяпер не удасцца, затое, што я расказала Ляцкаму аб палажэньні 26 бел. студэнтаў, аб іх голадзе і холодзе, і ён вялеў пры мне свайму сэкратару выдаць дзьве з палов. тысячы на грамаду. Пры гэтым ён страшэнна скардзіўся на грубасьць прост непрасціцельную Станкевіча, які вылаяў яго ў журнале. Аднакаж, пасьля маей размовы з ім, ён памягчэў, падабрэў і ахвяраваў 300 карон на студэнтаў. Я правадзіла яго на вакзал, ён ад'ехаў ў Італію, але хутка вернецца. Была я тутака ў Земгораўцаў[2], пазнаемілася з многімі праз жонку Віктора Міхайловіча Чернова. Яна прыехала сюды жыць з дачкой. А мы з ей вялікія прыяцелькі па турме. Ось жа усімі сіламі клапачуся, каб неяк падтрымаць студэнтаў. Тым часам ужо хутка абецаюць зацьвердзіць на стыпендзію — тагды уздыхнецца лягчэй. У Земгоры ужо даюць абеды студэнтам (а раней не давалі у тым і была бяда) а матурантам не даюць. Ну, з гэтымі ужо неяк пераб'емся, тым болей, што Чырвоны Чэшскі Крыж выдаваць пачаў дапамогу па 3 кароны на душу ў дзень.

Каб Вы ведалі, родны мой, які бой кіпеў на выбарах. Проці мяне галасавала уся група Станкевіча і усе камуністы — якая згода ці няпраўда, паміж імі. Станкевіч сябе так нядобра трымае, што нават з ім як з шаленым ня можна гаварыць. Я вельмі не хацела, каб мяне праводзілі ў Прэзыдыум, бо лічыла сябе хворай, дый уся гэта грызьня цяжка адбіваецца на маіх нэрвах. Але Грыб уперся, каб абавязкова я не здымала сваю кандыдатуру, дый мне неяк шкада стала усю гэтую бедную моладзь, якая таўчэцца на адным мейсцу і не бача выхаду з палажэньня.

Каб Вы ведалі, як яны радаваліся, калі мы устроілі спатканьне Новага Году разам усе: тыя хто атрымлівае стыпендзію далі па 25 карон і выйшло, што усе недапамагоўцы маглі разам з намі спаткаць Новы Год. Мяне яны спаткалі, як тыя дзеці, матку. Трэба сказаць, што наогул тутака работы непачаты кут. Выявілася, што 400 бел. студэнтаў вучацца на рассейскай стыпендзіі і лічацца пры Земгоры. Бачыце, што стары прэзыдыум, асабліва ж шавінізм Станкевіча не дапускаў да сябе гэтых людзей. Цяпер мы пачынаем трохі усе шавеліць, мо знойдзецца магчымасьць аб'еднаць іх каля сябе: ужо кой-што робіцца намі ў гэтым напрамку. Толькі тое і няшчасьце, што не хапае здароўя. Робяць мне уколы мышьяку. Дзень чуюся нічога, дзень ляжу. Ну, проста цягну лямку непасільную. А тут яшчэ розныя душэўныя цяжкія перажываньня не даюць пакою, так і жывеш, як гарох пры дарозе. Ня ведаю, ці доўга, ці коратка буду тутака. Клімат кепскі. Ніколі у мяне не балелі легкія, а тутака, як прабуду дзень у Празе — не магу дыхаць — каменны вугаль так і забівае грудзі.

Цяпер з украінцамі справа абстаіць так, што яны лічацца толькі з намі, группа Цвікевіча для іх выяснена аканчальна Тамашом. Таксама Тамаш паслаў ліст Янушкевічу, дзе вытлумачыў нашы адносіны да Беларускай Рады. У хуткім часе чакаем у Прагу Штейнберга, які абецае тутака зрабіць рад дакладаў па сацыялізму. У Бэрлінскае Народніцкае Аб'еднаньне ад нашага Ц.Б. делегіравана я. Праўду скажу, што мы працуем саўсім мала ў параўнаньні з тым, што трэба рабіць у палітычным кірунку, але ж і цяжка тутака працаваць сярод гэтых раз'юшаных Станкевічаў і жалам сваім атручаючых камуністаў. Я б рада была каб мы наладзілі хаця бы курсы беларусазнаўства — мая мечта зрабіць гэта як наіхутчэй.

Вы учора мне прысніліся. Але ж так нядобра, што ўся душа павярнулася. Быццам Вас убілі, дый мы з Стахай шукаем Вас і ня можам знайсьці, бо Вы прапалі без следу. Праснуўшыся, я доўга думала аб усім нашым палажэньні і прышла да цяжкого вываду, што мы акружаны ворагамі і нават Вы там таксама небезпечны. Мае заўсегдашнія перакананьні такія, што нам усім лепш і безапасней былобы жыць у Бэрліне, але нажаль нема зашто там жыць, а зарабіць ня зможам — цяжка. Я пераходжу на новую лепшую кватэру. Страшна рада, буду плаціць танней, а пакой куды лепшы. Але пішыце па старому адрэсу.

З гарачай сяброўскай пашанай П.Бадунова.

582.1.49:058&r-059&r

582.1.49:058а — канвэрт

[1] Драматычны абразок «Адзінокі» быў надрукаваны ў №6 «Крывіча» за сьнежань 1923 году. [2] Земгор — Аб'яднаньне Расейскіх Земскіх і Гарадзкіх Дзеячоў у Чэхаславацкай Рэспубліцы.

3539. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.01.1924

KONSTANTIN JEZOVITOV
LATVIJA, LATGALE, LUDZE.
8.ЯНВ.1924.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

напісаў я Раку аб грашох, але адказу не маю.

Сёнека паслаў Вам афіцыяльны ліст, а цяперака яшчэ пішу дадаткова.

«Крывіча» тутака чытаемо з увагай. З увагай чытаюць яго і у Вільні.

Дужа ўсім падабаецца усё, што друкуе «Крывіч» аб старасьведчыне, хоць ідэі «Крывіі» і «крыўскага народу» многія лічуць для справы некарыснымі: разьбівае гэта наш яшчэ нескалочаны рух і ставіць у тупік інастранцаў. Мала таго — нашы драгвічы і радзімічы крыху абражаны. А што найгорш, дык гэта можа выклікаць раскол і стварэньне Чорнай Русі, ці Белапольшчы.

Пасьля адпраўкі ліста даведаўся, што школы ўжо «Крывіча» атрымліваюць, бо прыехалі вучыцелі, з якімі я і гутарыў аб «Крывіі».

Да стр. 50-й №6-га маю увагу.

Здаецца мне, што імя Юры (сьвяткуецца 23-красавіка) зьвязаны з «Юрам», «юрасьцьцю». Адсюль «Юрачка», «юрачка» ў песьнях і у

жыцьцевых гутарках, як хлопец, у якім ўжо «юрыць» юрасьць. Адсюль і другое — Юрага сьвяткуюць тады калі «юрыць» прырода пачынаючы новае жыцьцё, пачынаючы вясну.

Другое. Ад «істба» ёсьць у латыскай мове «istaba» — комната.

Наагул-жа кажучы у латыскай мове шмат беларускіх словаў з тымжа беларускім значаньнем, што і у нас. Над збёрамі гэтых слоў я працую і з імі падзялюся з «Крывічом».

«Ластаўку»[1] дужа хацеў бы выдаваць літаграўскім спосабам, але зусім не знаёмы з гэтаю справай.

Мо Вы маглі-б мне падробна яе апісаць у лісьце, ці у «Крывічу» у стацьце «як зрабіць літаграфію», паказаўшы тэхніку працы, атрамэнты, спосабы вырэзыванья па ліноліуму і дрэву.

Гэта было-б дужа важна і карысна.

Тады-б я зараз-жа наладзіў тутака працу.

Напішыце?

Чакаю!

З пашанай К.Езавітаў

Зпазьніўся з атрыманьнем Вашага ліста і адказам, бо увесь час у дарозе.

Атрымаў на Каляды, а пішу толькі цяперака.

Паслаў Вам сваю фатаграфічную картку. Ці атрымалі?

582.1.49:060&r

[1] Літаратурны часапіс навучэнцаў Люцынскай Дзяржаўнай Беларускай Гімназіі. №1 датаваны 1923 годам.

3540. Паштоўка Давіда Анэкштэйна (Ганд) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.01.1924

582.1.49:061

Аб перабраньні ў Ганд (Гент), Бэльгія

3541. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.01.1924

J.M.
Valsts 2. Baltkrievu
Vidusskola.
Урадовая 2-ая беларуская
Гімназія
9 Студня 1923 г.
№714
Ludza.

Гр-ну Рэдактару штомесячніку «Крывіч».

Гэтым маю гонар паведаміць Вас, што «Крывіч» кожны раз акуратна, у той-жа дзень, калі паступае да мяне у Люцын, перасылаецца далей у Польшчу, дзе і атрымліваецца праз два дні; такім чынам на 3-4-дзень, пасьля яго выхаду, ен можа ужо быць прачытаным беларускім польскім грамадзянствам і газэтамі.

Ня ведаю як рэагуюць на яго газэты польскія, але газэты беларускія адмечаюць выхад кожнага нумуру.

Ад аднаго з польскіх дзеячоу, прозьвішча якога я не магу разчытаць, атрымау ліст падзякі з некаторымі запытаньнямі, ліст гэты перасылаю Вам, каб Вы адказалі на яго у паштовай скрынцы Крывіча.

Раджу Вам да соймавых ад[р]эсоу беларускіх і украінскіх, апрача места Варшавы дадаваць яшчо вуліца Вэйска.

Ці пасылаеце Вы «Крывіч» прафэсарам — Карскаму (Петраград, Васіль[е]ускій вострау, 7 Лінія, дом 2, Кв.9), і Мелешке — (Менск, Георгіеуской і Наберэжной ракі Сьвіслачы 10/2), трэба ім пасылаць і абавязкова заказной бандэрольлю, калі яшчо не паслалі, дык вышліце камплект.

Ці атрымалі Вы ад беларускага Аддзелу сьпісак беларускіх школ Латвіі і ці пасылаеце у іх «Крывіч». Калі пасылаеце, дык паведамце мяне, каб сабрац[ь] з гэтых школ грошы.

Грошы гэтыя сабраць трэба на гэткіх варунках:

1) апавясьціце Вы праз абвестку, на апошняй страніцы абложкі Крывіча аб тым, што прадстаунікамі «Крывіча» зьяуляецца у Латвіі гр. К.Езавітау, Люцын, Себежская 64;

б) у Празе гр. Вершынін (Вэнзегова 4);

ц) у Эстоніі — Н.Чэрвякоу (Рэвель, паштовая скрынка №153);

д) у Амэрыцы — Я.Чэрэпук і г.д.

2) пералічыце у паштовай скрынцы прозьвішча вучыцеля і назву беларускай школы у Латвіі, якім Вы пасылаеце «Крывіч» і загадайце ім, каб грошы за мінулы год (за 6 экз.) і за наступаючы год (12 экз.) пераслалі пераводамі на мае імя.

3) пастауленая Вамі цэна — 3 літы, дужа вялікая наагул а на нашы грошы асабліва. Дзеля гэтага вышэй як 30 рублеу з перасылкай лічыць ня можна. Гэту цану у 30 руб. для Латвіі я і прашу Вас абвесьціць у «Крывічу», агаварыушы, што гэтакая паніжаная цана устанауліваецца «для беларускіх школак і беларускіх вучыцялеу у Латвіі».

4) сабраным грошам пры канцылярыі, даручанае мне Гімназыі, будзе вясьціся учот, для чаго прашу выслаць мне квітацыйныя кніжкі для прыему падпіснае платы і невялікі штамп-пячатку, дзеля накладываньня на квіткі і адрэсы;

5) адначасна з гэтым прашу выслаць мне на афіцыяльным бланку рэдакцыі «Крывіч» даручэньне-пасьведчаньне на памяненае іх прадстаўніцтва.

Не пашкодзіць, калі да гэтага пасьведчаньня будзе выпісана яшчэ і другое пасьведчаньне на літоускай і беларускай мовах аб тым, што я зьяуляюся супрацоунікам часопісі.

Да ліста гэтага маю гонар дадаць зборнік «Заходняя Беларусь»[1] (атрыманы мной з Вільні), як навагодні Вам прэзэнт.

Вітаю Вас з Новым Годам і жадаю усяго лепшага

К.Езавітаў

582.1.49:062

[1] Заходняя Беларусь: Грамадзка-палітычны, навуковы і літэратурна-мастацкі зборнік. Вільня, Беларускае Выдавецкае Таварыства, 1923.

3542. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 10.01.1924

10.ЯНВ.1924
KONSTANTIN JEZOVITOV
LATVIJA, LATGALE, LUDZE.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

сёнека атрымаў я — «Працэс 45-ці беларусаў у Беластоку» (паводле справаздачы спэцыяльнага карэспандэнта). Выданьне Беларускага Пасольскага Клюбу. Вільня. 1923 г. Стр. XVI+393. Разьмер — 12x16 сантым.

Кніга гэта ў Вільні — сканфіскавана.

Атрымаў я нумэр — выпадкова збрашураваны.

Мяне просюць — ў што-б тое не было, але — кнігу перадрукаваць.

Грошы на гэту справу німа.

Ці ня зможаце Вы перадрукаваць яе ў Вас у Коўні за тыя-ж грошы, што і «Крывіч» ідзе?

Кнігу варта-б было даць з фатаграфіямі араштаваных.

Частка фатаграфіяў есьць у Вас на кангрэссу. Можна-б было зрабіць клішэ.

Выданьне кнігі гэтай стараньнем Вашым мела-б дужа важнае палітычнае значаньне для усяго Беларускага Руху. Мала таго — асабіста для Вас яна разчыніла-б многія лёдам пакрытыя, па рожным здарэньням, беларускія сэрдца. А гэта дужа важна не столькі асабіста для Вас, колькі зноу-жа для Нашага Руху, для Беларускае Справы.

Чакаю адказу.

З пашанай К.Езавітаў

P.S. Кнігу прывёз С.Казеко, які ездзіў на Каляды у Вільню і Горадню.

Шкада, што Вы не пераслалі мне ў свой час грошы.

Яму легка было іх перавясьці ў Вільню і куды трэба.

Пасылаю Вам пачатак майго ўспаміну-агляду:

«Беларуская Цэнтральная Вайсковая Рада»,

які Вы хацелі выдрукаваць у «Крывічу»[1]. Успамін напісаны 2 гады таму назад, а таму канец трэба паправіць. Буду рад яго тамака бачыць, пачынаючы ўжо з гэтага-ж нумару.

Канец — дашлю неўзабаве.

Пасылаю яшчэ і хроніку з Латвіі.

Раджу ў тым-жа «Крывічу» прасіць наша вучыцельства, каб пасылала хроніку да «Крывіча».

«Бел. Цэнтр. Вайск. Рада» было-б добра выдаць яшчэ і асобнай адбіткай, каб папоўніць лік беларускіх вайсковых кніжак.

582.1.49:063&r

[1] Надрукаваны ў №1 «Крывіча» за студзень-сакавік 1924 году.

3543. Хадайніцтва Міністэрства Замежных Справаў Літвы перад кансулятам Чэхаславаччыны ў Коўне за 12.01.1924 аб выданьні Вацлаву Ластоўскаму візы для паездкі ў Чэхаславаччыну празь Нямеччыну ў справах Міністэрства Замежных Справаў

582.1.49:066

3544. Ліст Янука Косьцевіча (Паланга) рэдакцыі «Крывіча» (Коўна) за 14.01.1924

582.1.49:067&r

Аб атрыманьні не выпісываная ім і непатрэбнага яму «Крывіча». «Karystajuczy z akazii dałuczaju szczyptku swajej barzganiny [...]» (на адвароце ліста — верш «Pamiaci daunych czasaŭ»). Адрас: Palanga, Gimnazijalnaja wulica N9, Swaja chata.

3545. Ліст Палуты Бадуновай (Збраслаў) Вацлаву Ластоўскаму й Клаўдыюшу Душэўскаму (Коўна) за ?.01.1924

Твой, сябер Клаўдзій, ліст, апрача мяне, ніхто не чытаў.

Даражэнькія сябры,
Ластоўскі і Душэўскі.

Пішу Вам абодвым адразу, бо атрымала Вашы лісты, а галоўнае немаю грошай на лішнія расходы, у гэтым месяцу мушу у другі раз меняць кватэру і расходы не па сілам. Пішу немнога, бо здаю, ці то гатуюся вельмі сьпешна да коллеквіума. А мне гэта вельмі шмат адыймае часу, бо лекцыяў я не слухала з-за хваробы, а кніжак саўсім амаль няма, адна напр. на шесьдзесят чалавек. Дык ось пішу каротка, выбачце, але затое выразна. Па-першае, ніякага лісту да каго-кольвек, апрача Вас у Коўну я не пісала і не пасылала і дзіву далася, калі пачула, што Якавюк нейкі мой ліст чытаў. Ці ня выйшла тутака якая-небудзь іншая афера. Справа ў тым, што Заяц нас так правеў, як і палагаецца Зайцу і Ко. Ён у той час, калі 25 студэнт. бел. стаяць голыя і галодныя кожны дзень перад нашымі вачамі — адмовіўся ад старшынства і мы апынуліся у разбітага карыта, а галоўнае — другога сходу некалі зьбіраць усе страшэнна перагружаны працай. Прыйшлося мне і зборы рабіць на іх і делегацыю да Міністерства арганізаваць і словам, мяне замучыла уся тутака абстаноўка. А Вы не верьце тым, што перайшлі да Вас ад Цвікевіча, памятайце, што яны усе пад адну дудку скачуць. Цяпер яшчэ адзін скандаль — здаецца Зайчыха урвалася неяк раз (яшчэ у часы добрых адносін[)] у мой пакой і залезла у чемадан з паперамі. Там ляжалі усе лісты у сшытках — мусіць яна штосьці прачытала, а мо і з сабой ухапіла — мо які-небудзь ліст мой такім чынам і папаўся у рукі Цвікевіча. Ва ўсякім разе Заяц на другі дзень голасна гаварыў пры другіх аб распісках, якія я павінна была выслаць сябру Ластоўскаму, калі ён выслаў мне дапамогу у часы маей хваробы. Значыць, чытала. Не лайце мяне моцна, каб Вы ведалі, якія тут ведзьмы гаспадыні — дык Вы б зразумелі чаму я забываю іншы раз заперці свой чемадан. Наагул, жыцьце не маліна, як Вам, так і мне.

Цяпер жа перадайце Якавюку, што я напісала Вам і калі ён чэсны, дык няхай ведае з кім мае дзела. Але Мамонька аб ім нядобра штосьці думае. Наогул кажучы твой ліст сябер Клаўдзій вельмі запозьніўся, мы ужо даўно забылі свае сваркі і выступаем дружна і згодна. Паведамленьне напісаў Грыб па нашай агульнай пастанове і ніякіх рознагалосіц у нас па гэтаму пытаньню няма. Здаецца, мы опублікуем хутка усе. Цяпер Стаху прашу выбачыць вельмі за адзін ліст, які яна праз мяне пасылала да сястры. Я перабіралася на кватэру і толькі цяпер праз месяц знайшла яго у кішэні, хацела паслаць назад у Коўну — разарвала канверт, ажно бачу грошы, я ужаснулася, каб ты яшчэ чаго кепскага не падумала... і пасылаю яго

заказным тваей сястре — грошы ніколі не позна пасылаць... «Крывіча» мне шкада да сьлёз. Не вініце мяне, што я нічога не рабіла для журнала — я жыву і працую як у гарачцы, кожны дзень думаю, што сьмерць лепш чымся такое жыцьцё і не маю сіл пісаць...

Ваша Палута.

P.S. Напішыце аб усім Язэпу на адрес Тамаша, бо я Язэпава ня ведаю, а сама ухоходжу з кватэры. Ліст твой Клаўдзі я спаліла, павер чэснаму слову, а пасылаць яго назад дорага каштуе.

P.S. Прыехаў учора Штейнберг, будзе чытаць даклады.

582.1.49:064&r

582.1.49:064а — канвэрт

Дакладная дата невядомая.

3546. Бюллетень Бѣлорусскаго Прессъ-Бюро въ Ковнѣ (проспектъ Витовта №30) № 1 за 20.01.1924

582.1.44:079

Аб ліквідацыі Міністэрства Беларускіх Справаў, «Беларускай Грамады ў Коўне», «Рады Сялян-Беларусаў у Літве», «Беларускага Жаночага Гуртка». Аб прыбыцьці ў Коўна С.Якавюка з мэтай арганізацыі супольна з Урадам БНР дэлегацыі ў Лігу Нацыяў для абароны беларускіх нацыянальных інтарэсаў пад акупацыяй

3547. Ліст Давіда Анэкштэйна (Ганд) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.01.1924

582.1.49:069&r-070

582.1.49:068 — канвэрт

З просьбай прыслаць «Крывіч» і іншую літаратуру. «Хацеў бы, праўду кажучы, кінуць Эўропу на-векі да паехаць ў Амерыку...»

3548. Lietuvos Žinios (Коўна). №19. 23.01.1924

[З артыкулам:] K. Vilnijos klausimu

582.1.44:001b

3549. Ліст Зэнона Кузэлі (Бэрлін) рэдакцыі «Крывіча» (Коўна) за 24.01.1924

582.1.49:073

582.1.49:072 — канвэрт

На блянку выдавецтва «Українське Слово» (Бэрлін), з артыкулам «Навуковае Таварыства імя Тараса Шаўчэнкі ў Львове» для публікацыі ў «Крывічы» (надрукаваны ў №1(7) «Крывіча» за 1924 год). У канвэрце — каталёг выдавецтва

3550. Справаздача Вацлава Ластоўскага з авансу на паездку ў Данцыг 21-25.01.1924

Справаздача з авансу на паездку у Данцыг 21.I—25.I 1924 г., атрыманага мной у ліку дваццаці пяці (25) долараў і пяцьдзесяці (50) літаў

Расход у літах:

Білеты з Коўны да Эйдкунен і назад		29.80
Абед у Вірбаліс	21.I	6.40

Абед у — " — 25.I	5.80
За мыццё у фрызіерні	1.00
Звозчык з вагзалу і на вагзал	10.00
	53.00
Расход у марках	
Білеты ад Эйдкунен да Маріенбурга і назад	22.80
Готэль у Марыенбургу	6.60
Сьнеданьне і гарбата на вячэру	12.00
	41.40
Расход у гульдэнах.	
Білеты ад Маріенбурга і у Данцыг і назад	12.60
Сталаваньне	27.40
За готэль	22.50
	62.50

582.1.49:071

3551. Lietuvos Žinios (Коўна). №23. 27.01.1924
[З артыкулам:] Patriotas. Baltgudžiai ir mes
582.1.44:001

3552. Ліст Кляўдыюша Душэўскага (Коўна) Усеваладу Боеву (Коўна) за 28.01.1924 з просьбай даць тлумачэньні адносна пастановы «сходу грамадзян» 22.08.1923 і меркаванага старшыняваньня ім Боева
582.1.44:069 — мк

3553. Паштоўка Яна Ермачэнкі (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.01.1924
582.1.49:074
582.1.49:075 — канвэрт

На паштоўцы: «Беларускі Сакол». Просьба пашыраць паштоўку па Коўне

3554. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.01.1924
[...] Вучыцялі пачатковых белар. школ атрымалі павесткі з пошты аб прысылцы на іх імя пасылкі з «наложаным плацежом» на 110 л.руб. ад К.Езавітава. Некаторыя вучыцялі гэтыя пасылкі выкупілі. Аказалась, што гэта Езавітаў такім чынам распаўсюжывае Ваш трыганаметрычны слоўнік. Вучыцялі незадаволены [...]
582.1.49:082

3555. Ліст Уладзіслава Грыневіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.01.1924
582.1.49:083&r-084

Аб падрыхтаваным для друку рукапісе аповесьці «За што?» — пра падзеі польскай акупацыі Беларусі 1920 году.

3556. Расьпіскі Вацлава Ластоўскага й Канстантына Барысовіча (Коўна) ў справе продажу часапіса «Крывіч» на суму 1000 літаў за 1.02.1924

582.1.49:002&r

3557. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Дзьвінск) Кіраўніку Беларускага Аддзелу (Рыга) за 2.02.1924

582.1.44:049 — мк К.Езавітава

З выказам незадавальненьня рассылкаю Езавітавым «Слоўніка геамэтрычных і трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў» настаўнікам беларускіх школ у Латвіі «наложенным платежом».

3558. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Кіраўніку Беларускага Аддзелу (Рыга) за ??.02.1924

582.1.44:048 — мк

Дакладная дата невядомая. З тлумачэньнем справы аб рассылцы «Слоўніка геамэтрычных і трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў» настаўнікам беларускіх школ у Латвіі.

3559. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) Уладзімеру Пігулеўскаму (Дзьвінск) за ??.02.1924

Я не саўсім разумею што значa Ваша нэрвовае пісьмо да мяне. Езовітаў правініўся перад кімсьці у тым што паслаў накладной платай беларускую кнігу. Магчыма, што гэта брыдкі паступак. Зрэшта як хто глядзіць: тут погляды могуць разыходзіцца. Я знаю такіх людзей якія лічаць, што беларускі друк прыносіць карысьць беларусу, асабліва профэсіональны друк профэсіональнаму інтэлігенту, але знаю і іншых, якія супроць усялякіх беларускіх друкаў і лічаць найбольшай шкодай народу шырэньне паміж яго друкаў у беларускай мове.

Калі-ж Вы хочаце выткнуць мне маю віну у тым, што я споўаўтар названай Вамі кніжкі, то прашу прыняць пад увагу, што зачыншчыкам яе зьяўляецца Душэўскі, а не я. Зрэшта ні Душ., ні я, не зьяўляемся выдаўцамі. Дык гэта-ж будзь што будзь павінна прад Вамі зьмякчыць нашу віну. А калі гаварыць на чыстату, то я і віны на сабе не пачуваю. Можа гэта паходзіць ад таго, што пісаньнем і друкаваньнем беларускіх кніжак многа грашыў я ў сваім жыцьці і анёлападобную чыстату нясьпісьменніцтва многіх нашых дзеячоў, даўно утраціў. Мабыць з гэтай самай прычыны я і не магу разам з Вамі абурацца, што беларускі вучыцель у Латвіі, раз ў тры гады, хоць бы з дозай прымусу, купіць сабе беларускую кніжку цаной у 60 даваенных капеяк. Ці Вы думаеце, што гэты 60 к., выданыя ім на беларускую кніжку, яго зруйнуюць? Кніжка мала патрэбная для вучыцеля? У кождым разе яна дае магчымасьць добрародным натурам адзначыцца на полі змаганьня з ёю і выступіць абаронцамі пакрыўджаных, а ці-ж гэта ўжо не карысьць? Можа за гэта адно варта яна зьмякчаючага суда? Я меў нагоду бачыць пахвальную паўстрымліва[с]ць выдаткаваньня грошы на беларускую літэратуру, прасьвячонага Пана Дырэктара Вашай гімназіі[1],

які ў бытнасьць сваю ў Рэдакцыі вылічыў, што з 15 ці 20 тысяч латвійскіх рублёў месячнай яго пэнсыі ён ня можа выдаткаваць на беларускі журнал 75 руб. у месяц. Я быў захвачан прыкладнай яго ашчаднасьцю, і, думаю, будзе ею захватывацца наша патомнасьць. Слава усім тым, якія няўмеючы правільна злажыць па беларуску фразы, не чытаюць беларускай літэратуры (акром пашквіляў на беларускую справу пісаных Ладновымі, зрэшта ў культурнейшай маскальскай мове), слава ім кажу, бо яны ў сваіх гімназіях узгадовуюць беларускае маладое пакаленьне далёкае ад пакус сэпаратызму, ў міласьці і любові чужацкага полеру. Слава ім, прасьвячоным ваяром супраць беларускага жывога і друкаванага слова. Ім, каторыя шчасьліва унікнулі мук і ахвяр на раскошна-цярністым шляху беларускага адраджэньня і мазольнымі інтрыгамі, крывапрысяжніцтвам дайшлі да магчымасьці мудра і выгодна пажынаць карысьці гэтага нягоднага руху для сябе, ў той-жа час брыкаючы сваімі капытамі тых, хто цярпеў і мучыўся, хто прыгатаваў ім хлеб з маслам.

Дык, як бачыце, паважаны таварышу я, здаецца, не ў разьбежнасьці з Вамі, і паскольк мне пазваляе худы мой розум, зразумеў Вас.

Прыміце запэўненьне ў шчырасьці майго да Вас пісаньня.

Ваш нягодны слуга

В.Ластоўскі

582.1.49:076-081

Дакладная дата невядомая. [1] І.Краскоўскага.

3560. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.02.1924

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч!

маю да Вас просьбу!

Характар яе Вам можа і пакажацца крыху ня сур'езным, але я выказваю яе зусім сур'езна.

Ведаеце Вы маё кальцо, што нашу я на указальным пальцу левай рукі. Кальцо — залатое з выгравіраваным на ім малюнкам Пагоні, пад якой выгравіраваны сноп жыта, а на ім скрэшчаны (скрыжаваны) каса і граблі[1]. Кругом абоіх малю[н]каў вырэзаны літары: «1.Н.С. Б.Н.Р.» (Першы Нар. Сэкрэтар Бел. Нар. Рэсп.).

Часта мяне пытаюць аб гэтым кальцу.

Дык хачу я каб яно было мне «пажалавана» як 1 Вайсковаму Беларускаму Міністру на памятку аб працы і пажалавана Урадам Беларусі.

Калі я думаў «які Урад» і «хто» павінен падпісаць мне гэту грамату, дык перабраўшы усіх, з кім я працаваў, спыніўся я на Вашай асобе.

Ад Вас хачу яго мець.

Ад Вас і буду насіць яго надалей з пашанай і добрым успамінам аб былым сапрацоўніцтве.

Прыўрочыць грамату, мне здаецца, варта-б было да 1 лютага 1921 году, калі я разьвітаўся з Вамі і пачаў працу тутака.

Малюнак кальца гэткі: [*малюнак*]

Чакаю адказу Вашага.

Як справа з друкам «Працэсу 45 беларусаў»?
З пашанай
К.Езав...
582.1.49:044&r-044a&r
582.1.49:043 — канвэрт

[1] Эмблема Народнага Сакратарыяту, першы «герб» БНР.

3561. Ліст Усевалада Боева (Коўна) Кляўдыюшу Душэўскаму (Коўна) за 7.02.1924

[...] мяне запрасілі гр.гр.П.А.Крэчаускі і В.І.Захарко зайсьці у Беларускае Прэдстаўніцтва (пр. Вітаута №30) на «прашчальнае паседжаньне» з прычыны ад'езду Урада Б.Н.Р. з Літвы [...]
582.1.44:070-073 — мк

Пра абставіны скліканьня «агульнага сходу грамадзян і палітычных дзеячоў Беларускай калёніі ў Літве 22.08.1923», на якім была прынятая пастанова аб абвяшчэньні «маральнага байкоту беларускага грамадзянства» В.Ластоўскаму й К.Душэўскаму. Гл. дакумэнт №3451.

3562. Ліст в.а. Дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Літве Аляксандра Вальковіча (Коўна) Міністэрству Замежных Справаў Літвы (Коўна) за 7.02.1924

[...] У зьвязку з заявай В.Ластоускага, што Літоускі Урад мае камандыраваць яго у набліжаючую сэсію Рады Лігі Народау для прэдстаўніцтва беларускага жыхарства пад польскай акупацыяй — маю гонар паведаміць Міністэрства Загранічных Спрау, што п. Ластоускі голаса беларускага жыхарства не рэпрэзэнтуець, ніякага мандата ад беларускага жыхарства на гэта не маець і ніводнай з беларускіх устаноу на падобную рэпрэзэнтацыю не упаунамочаны [...]
582.1.44:083 — мк

3563. Білет Вацлава Ластоўскага на ўваход у Kasino Zoppot 9.02.1924
582.1.49:045

На адвароце запісана: Berlin-Schöneberg, Schliessfach 17.

3564. Запіска Ігнаса Янінаса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1?.02.1924 з дасланым талёнам ордэра на 3.150 літаў дзеля разьліку з Бакам
582.1.49:049

Дакладная дата невядомая.

3565. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Дзьвінск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 10.02.1924
582.1.49:046&r

Аб непаразуменьнях зь Езавітавым: «[...] не магу я асабіста змагацца з Ез. бо не лічу яго вінаватым. Утыкалі яго, гэтага добрага «малога» паўліньнімі перьямі і ён запраўды паверыў, што «l'etat c'est moi» — «Беларусь — гэта я» [...]»

3566. Ліст в.а. Дыпляматычнага прадстаўніка БНР у Літве Аляксандра Вальковіча (Коўна) Міністэрству Замежных Справаў Літвы (Коўна) за 11.02.1924

[...] Апошнім часам у Коуне распаусюджаны весткі, што Літоускі Урад мяркуець камандыраваць у Амэрыку дзеля працы сярод беларускае эміграцыі п. Душэускага [...]

Гэтым маю гонар давесьці да ведама Міністэрства Загранічных Спрау, што нацыянальныя арганізацыі амэрыканскіх беларусоу не выражалі жаданьня бачыць п. Душэускага у сваей сямьі. Так сама не выражалі жаданьня бачыць п. Душэускага у Амэрыцы і беларускія арганізацыі края [...]

582.1.44:082 — мк

3567. Ліст Уладзіслава Грыневіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.02.1924

582.1.49:048&r
582.1.49:047 — канвэрт

Адказ на ліст за 4.02.1924, з дасланымі разьдзеламі аповесьці «За што»

3568. Ліст Яўгена Бачынскага (Жэнэва) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.02.1924 з падзякаю за дасланы «Крывіч» і з просьбаю дасылаць «Крывіч» беларусу Канстанціну Крывашэю, закрыстыяну расейскай праваслаўнай царквы ў Жэнэве

582.1.49:053
582.1.49:051 — канвэрт

3569. Справаздача Вацлава Ластоўскага за выдаткі на атрыманыя ад Ігнаса Янінаса 10 даляраў за 16.02.1924

Да расьпісак Яна Бутрымовіча на сумму 1290+450+10 даляраў.

Справаздача:

З 10 (дзесяці) даляраў атрыманых ад п Іонінаса у ліку (150 даляраў) для перадачы ў край на культурна-нацыянальныя патрэбы ў сьнежні 1923 г.

За 150 даляраў купленых у L.Ukio Bankac (заплаціў 1.545 літаў), даплочана літаў	45-
Пачт. расх. на перасылку двох чэкаў па 20 даляраў Бодуновай	2.40
Выдаткавана на карэспандэнцію з краем і эміграцыяй у 1923 году	52.60
Усяго літ.	100.00

100 літаў = 10 даляраў

В.Ластоўскі
16.II.1924 г.
582.1.49:050

3570. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.02.1924

17.II.24.

Пасылаю Вам, Вацлаў Юстынавіч, па просьбе Краўцова Макара дзьве яго стацьці, якія не прапушчаны Антонам у «Змаганьні».

Просіць, каб былі выдрукаваны у «Крывічу».

Пасылаю проста з пошты, дзе расчыніў лісты, каб худчэй дайшло да Вас.

З пашанай
К.Езавіт.
582.1.49:055

3571. Ліст Давіда Анэкштэйна (Ганд) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.03.1924

582.1.49:032&r-033
582.1.49:031 — канвэрт

З падзякаю за дасланы ліст.

3572. Паштоўка Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.03.1924

М.Г.

Прошу по очень спѣшному дѣлу какъ можно скорѣе посѣтить меня. Ожидаю Васъ непременно.

Вашъ Чужъ
Prinzen
Königsberg
582.1.49:034

3573. Ліст Антона Шышкі (Рым) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.03.1924 з падзякаю за дасланы «Крывіч»

582.1.49:036
582.1.49:035 — канвэрт

3574. Паштоўка Вальтэра Андэрсана (Дэрпт) Клаўдыюшу Душэўскаму (Коўна) за 25.03.1924

Милостивый Государь!

По порученію нашего лондонскаго посла, д-ра О.Калласа[1], посылаю Вамъ переводъ одной эстонской народной пѣсни и одной сказки.

Очень желательно было бы мнѣ просмотрѣть корректуру бѣлорусскихъ переводовъ обоихъ текстовъ. Кромѣ того я просилъ бы Васъ послѣ напечатанія прислать мнѣ оттискъ этихъ переводовъ или же экземпляръ соотвѣтствующаго номера журнала.

Съ искреннимъ уваженіемъ
проф. В.Андерсонъ.
582.1.49:037

[1] З прафэсарам Оскарам Каласам К.Душэўскі пазнаёміўся падчас свайго падарожжа ў краіны Балтыі ўвосень 1919 году.

3575. Ліст Давіда Анэкштэйна (Ганд) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 25.03.1924

582.1.49:039&r
582.1.49:038 — канвэрт

З прапановаю даслаць для «Крывіча» матэрыялы аб флямандзкім мастацтве. «Што так чуваць сярод нашых у Празе і у Амерыце? Я гэтакім чынам зусім адбіўся ад руху».

3576. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.03.1924

28.III.24.
Люцын.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

пабачыцца з Вамі я заўсёды рад, а калі тутака яшчэ і справы, ды ў дадатак яшчэ й важныя, дык я — у Вашым распараджэньню.

Тэрміну не устанаўліваю: выбірайце самі, але так каб гэта прыпадала на якое-кольвек сьвята, або нядзелю. Аб выездзе загадзя пішыце, або тэлеграфуйце, бо мне трэба вясьці лекцыі у Гімназіі.

Яшчэ-б было ляпей, каб Вы прыехалі да мяне у Люцын. Пабачылі-б маіх гімназыстаў, паслухалі хор, дэклямацыю, аркестр.

Вам жа гэта патрэбна як паветра, ці хлеб штодзённы.

Візу бярыце ў Рыгу, а з туль — сюды (без ўсякіх ужо візаў!)

«Вітабскую старыну» хоць яна і дужа мне ўжо патрэбна, пазычу Вам з ахвотай.

Маю надзею худка Вас пабачыць!

Бывайце здаровы!

Прывет жонцы!

З пашанай

Ваш К.Езавітаў

582.1.49:041&r-042
582.1.49:040 — канвэрт

3577. Паштоўка Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.03.1924

Дужа зацікавіўся я было пабачыцца з Вамі, але Вы зноў неяк нічога аб гэтым не пішаце. Калі-ж выйдзе «Крывіч»? Калі будзе «Слоўнік» Ваш? Чакаемо яго з вялікай цікавасьцьцю!

З пашанай

К.Езавітаў

582.1.49:033

Дакладная дата невядомая.

3578. Нататкі алоўкам на аркушы паперы

Наркоминдел. Бикнеру. Для передачы Матушеўскаму

Latwija Daugavpils. Bulwarna iela, 30. Мицкун[1]

582.1.49:009a

Дата невядомая. [1] Супрацоўнік кансуляту савецкай Расеі ў Дзьвінску.

3579. Паштоўка Ўладыслава Грыневіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 3.04.1924 з пытаньнем аб лёсе дасланага ў «Крывіч» рукапісу «За што?»

582.1.49:011&r

3580. Ліст Рамуальда Зямкевіча (Варшава) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.04.1924

Даражэнькі Пане Вацлаве!

Ліст Ваш атрымаў і ўраз адказываю.

Гэта другі Ваш ліст, які дайшоў да мяне. Першы быў з Берліна з запрашэньнем мяне да супрацоўніцтва ў Вашым месячніку. Лісты і рукапісы высылаў Вам на адрэс гэтаго «Хлестакова» Цьвікевіча. Ні адказу не атрымаў, ні мае працы надрукаваны нігдзе у Вас не былі. Думаў ужо я, што мяне ніхто знаць і ведаць ня хочэ.... Перш на перш шчыра і горача дзякую Вам за прысланы мне камплект «Крывіча». Па адрэсу пісанаму Вашай рукою пазнаў я, што гэта Вы мне яго выслалі з Кролеўца (=Кэнігсбэргу). Ня маючы Вашаго адрэсу, зьвярнуўся я да рэдакцыі «Голаса Беларуса»[1] і прасіў, каб у адказе ад рэдакцыі (лістовая скрынка) далі некалькі слоў ад мяне рэдакцыі «Крывіча». Хацеў я гэткім спосабам навязаць з Вамі ніць перапіскі. Але нічога не выйшло, бо Ваш «шчыры прыяцель» Антон Луцкевіч спрацівіўся гэтаму. Мусі быць ня хочэцца гэтаму пану, каб я быў з Вамі у зносінах. Лішне ужо многа я ведаю, маю ядавіты язык і мог бы непажаданае ... пісаць у карэспандэнціях да закордонных газэт ..... Будучы у Вільні у рэдакцыі ніякаго загранічнаго адрэсу я дабіцца ня мог!

Вось прычыны дзеля якіх нічога не выходзіло з майго стараньня.

Калі я Вашых лістоў не атрымовываў, дык магчыма, што былі яны канфіскаваны «чорным кабінэтам», бо я ад часу Беластоцкага працэссу[2] знаходжуся пад вялікай апекай «польскіх патрыётаў» — шпікоў тайнае паліцыі. Асабліва пасьля таго як Якавюк уцёк[3], аб чым я нічога ня ведаў, папаў я пад падазрэньне, што гэта я памог і дарадзіў яму выезд у Гданск. Якавюка шукалі на маёй кватэры, гвалтам упэўнялі маю (пакойную цяпер) матку, што ён у мяне кватэраваў, хаваўся і я павінен яго выдаць. Шмат непрыемнасьцей і нэрвіроўкі перажыў я ад 31.XII.1923 (дзень засуду Якавюка) да гэтаго амаль часу. Што рабіць, сьмелым і праўду рэзка кажучым людзям заўсёды кепска на сьвеці....

Прапазіцыю Вашу супрацоўніцтва прыймаю ахвотна. Са свайго боку уважаў бы аднак, што для кніжкі[4] лепшы быў бы загаловак: Памяці Францішка Скорыны. У 400 летні юбілей беларускаго друку. Кніжка павінна быць вялікай, злажыцца працамі на яе павінны усе беларускія пісьменьнікі паважнаго і ідэйнаго напрамку. Хай кожны пастараўся бы ушанаваць памяць вялікаго культурнаго і ідэйнаго працаўніка Беларусі. Трэба кніжку злажыць і выдаць гэтак, каб паказаць сьвету, што такое беларусы. Варта было бы перадрукаваць белы верш Бядулі аб Скарыне[5], хаця ён ужо і друкаваны. Адным словам у кнізе павінно быць усё: проза, паэзія, гісторыя, навука, штукарства, бібліаграфія — словам усе аддзелы. З

гэтаго я бяру на сябе: бібліяграфію, іллюстрацыі, гісторыю беларускаго друкарства і друкароў, аддзел рукапіснае літэратуры. Што датычэ беларускіх рысоўнікоў і рытаўнікоў — справа цяжкая, але я цяпер канчаю польскую бібліографію рытаўніцтва, каторую як здам у друк, дык яна як друкаваная польская праца, дасьць мне доступ у польскія бібліятэкі, як напрыклад, у бібліятэку графоў Пржэздзецкіх (з Патав) у Варшаві, на каторую я астру зубы, бо праца у ёй утруднена надзвычайна, а па вестках шмат у ёй беларускага матэр'яла. Пржэздзецкіе дасталі гэтые скарбы ад графоў Тызэнгаўзоў і сама бібліятэка перавезена з Вялейшчыны у Варшаву.

У кожным разе аб беларускім рытаўніцтве магу даць хоць невялічкую, але добрую стацыю.

Сваей прапазыцыі загалоўка я не адстаіваю. Рабеце як уважаеце самі. Падкрэсьліваю толькі што трэба напружыць усе сілы каб гэтакі 400 летні юбілей паважна і дастойна адсьвяткаваць.

І Купала і Колас і усе больш выдатные сілы ня могуць не паказацца на страніцах гэткай юбілейнай, надзвычайнай кніжкі.

Затым прашу Вас напішэце яшчэ да мяне, бо гэтакую справу трэба паважна і дэтальна абдумаць і абгаварыць.

Навяжыце стасункі з Кролеўцам або з Гданскам, каб можна нам было перапісывацца. Пастарайцеся знайсьці у гэтых гарадох асобу, якая будзе пасреднікам нашае карэспандэнцыі і пасылкі кніг, брашур, газэт. Маю дублеты, хацеў бы іх выме[ніць]. Вашых выданьнёў амаль нічога ня маю. Прашу вышліце іх ці праз Гданск, ці праз Кролевец, ці праз Латвію. За мною астаноўкі ня будзе. Патрэбны мне камплекты «Бел. Сьцягу», Сьветазара[6], Бел. вайсковаго[7], Селянскай Долі[8], Беларус<кага> Пар<тыза>на[9] і наагул усіх Вашых закордонных газэт. Судзячы з таго, што «Крывіча» я атрымаў, думаю што і іншыя «скаромныя» газэты і рэчы дойдуць да мяне, калі будуць, напрыклад добра зьмешаны з іншымі газэтамі. У цэнзуры тутэйшай шмат галічан-палякоў, якіе рускіх літэр не разьбіраюць, а калі друк такі ідзе з Нямеччыны, дык яго і не прагледаюць. Ахвотна, нават з радасьцю пачну Вам пасылаць друкаваны уселякі матэр'ял патрэбны Вам да варстата працы!

Жыву ціха і скромна. Працую у інстытуцыі «Najwyższa Izba Kontroli Państwa» у інжэнерным аддзелі чыгунак. Зарабляю у месяц 540 мільёнаў марак, якіе ледзь хапаюць на жыцьцё. А маю на сваім утрыманьні: дачку, сястру і двое яе дзетак. Выбіла мяне з калеіны сьмерць маей маці (27.II.1924), за кошт хаўтур мяне здорово рэзанула. Працую ціха і нікаму ня лезу у вочы. Праз справу Якавюка і яго уцёк амаль мяне не выкінулі са службы. Атстаялі мяне коллегі інжэнеры (па службе у Кантролі), усе родам з Крэсаў. Прыходзіцца мне цяпер сядзець як мыш пад венікам, бо жыць трэба, а жыцьцё у нас дарагое.

Шмат цікаваго мог бы Вам сказаць аб усім і аб усіх. Пісаць аб гэтым усім і цяжка і трудна і шмат часу бы занело. Калі дастану на службе urlop wypoczynkowy дык можа зраблю захады каб з Вамі з'ехацца дзеколечы: Бэрлін, Гданск, Кролевец ці Тыльжа[10].

Кланяйцеся ад мяне Душэўскаму і Якавюку.

Як бы мне зьвязацца перапіскай з Янулайтісом і з Біржышкай. Маю цікавыя рэчы да абгаварэньня з імі у дзедзіне літоўскай гісторыі ды літэратуры. Кланяйцеся ім і скажыце што заўсёды знойдуць мяне шчырым і атданым іх прыяцелем.

Кожны дзень ад 4-10 гадзіны вечара пасьля службы працую у бібліятэках. Матэр'ял расьце. Кніжкі мяне не цікавяць, бо я іх ужо даўно прагледзеў. Цікавяць мяне адны газэтныя стацьці ды рукапісы і гравюры. Гэтым я цяпер і займаюся. Гатоўлю да друку: Bibliografię litewską — усё што аб літвінах і Літве (праўдзівай, этнаграфічнай) напісано у польскай мове. Маю такі матэр'ял аб якім бібліограф Балтрамайтіс і Gawełek нічога ня ведалі. Хачу гэта выдаць папольску, але з літоўскай перадмовай.

Што да беларускае бібліаграфіі хацеў бы сарганізаваць моладзь, каб парабіць выпіскі з газэтных стацей аб Беларусі, выпіскі такіе збрашураваць і ... злажыць у «Беларускай Бібліятэцы імяні Ф.Скорыны» для карыстаньня нашых цяперашніх і будучых пісьменьнікоў і працаўнікоў. Тое самае ў перадмове літоўскай бібліяграфіі запрапаную літвінам. Цікавы я, як будзе прынята мая ідэя?

Шмат, шмат аб чым хацелося бы мне напісаць да Вас, але нідахват часу (пішу гэты ліст у маім бюро Kontroli) не пазваляе мне зрабіць гэта цяпер.

Канчаючы мой ліст прашу Вас часьцей пісаць, на адказы і супрацоўніцтва з майго боку лічыць можэце сьмела і пэўна (прашу толькі назначыць мне тэрмін-срок). Газэты і кніжкі пачну Вам высылаць, калі дастану, больш даступны (што да часу атрымовываньня праз Вас лістоў) Ваш адрэс.

Шчыра прыхільны і прыязны Вам

Р.Земкевіч

582.1.49:012&r-013

---

[1] Газэта, выдавалася ў Вільні 14.02-19.04.1924. [2] Р.Зямкевіч выступаў на працэсе як сьведка. [3] У Літву. [4] В.Ластоўскі рыхтаваў кнігу, прысьвечаную 400-годзьдзю беларускага друку. Сабраныя матэрыялы леглі ў аснову «Гісторыі крыўскай кнігі». [5] Магчыма, маецца на ўвазе верш «Беларусь» (зборнік «Пад родным небам», 1922). [6] «Сьветазар» — пэрыядычнае выданьне для вайскоўцаў Беларускага Батальёну Літоўскага Войска, выходзіла ў Коўне ў верасьні 1921 - красавіку 1922 году. [7] «Вайсковы» («Karys») — двутыднёвік для беларусаў-вайскоўцаў Літоўскага Войска, выходзіў у Коўне ў траўні 1921 - красавіку 1922 году. [8] «Сялянская Доля» — часапіс, выдаваны Міністэрствам Беларускіх Справаў, выходзіў у Коўні ў чэрвені 1921 - красавіку 1922 году. [9] «Беларускі Партызан» — часапіс беларускіх партызанаў, выходзіў у Коўне ў 1922 годзе. [10] Тыльзіт, цяпер — Савецк у Калінінградзкай вобласьці.

3581. Ліст Аляксандра Ружанцова (Панямуне) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.04.1924

[...Wacław Biržyška] z pryjemnaściu abiacaŭ padtrymać Wašuju prośbu ab wysyłcy knih z Dorpatu da uniwersitetskaj biblioteki u Koŭni [...]

Praf. Wacł. Biržyška prosić Was zajści da jaho biblioteki (uniwersiteckaj), jon maje dziela Was niekalki knižok ab staradrukach biełaruskich [...] «Kry-

wič» jamu spadabaŭsia wielmi i ab dumcy stwaryć B.Tawarystwa jon dekłaravaŭ pamyślić i dapamahčy [...]

582.1.49:014&r

3582. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.04.1924

11.IV.24.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

толькі што атрымаў ліста ад гр. Земкевіча з дадаткам лісту да Вас.

Перасылаю зараз-жа.

Калі трэба будзе, дык буду рабіць гэта і ў будучыне.

«Крывіч»[1] атрымаў (першых 14 экзэмпляраў) і ужо паслаў у Польшчу.

Чакаю далейшых.

Чаму Вы не напісалі, каб Латвійскія адрасаты уносілі мне грошы, як мы з Вамі умаўляліся.

Бяз гэткага папярэджаньня у «Крывічы» я зьбіраць грошы не магу, бо зноў могуць быць рожныя гутаркі.

А сабраць грошы трэба, бо перасылка у Польшчу каштуе шалёныя грошы, асабліва калі (некаторым сваім) пасылаеш заказной бандэролью.

Дужа прашу абвестку гэту зрабіць у чарговым нумару.

«Крывіча» прагледзіць з увагай яшчэ не пасьпеў, але робіць ён дужа паважнае ураженьне.

Стацьцю маю дужа сапсаваў каррэктарскі недагляд (выпушчаны словы у сярэдзіне сказаў), а таксама блага і тое, што Вы далі яе не пад псэўданімам, бо пісаць аб сваёй працы сабе самому неяк нязручна.

З пашанай К.Ез.

582.1.49:015&r

[1] №1(7) за студзень-сакавік 1924 году. [2] «Беларуская Вайсковая Цэнтральная Рада, 25.XI.1917-25.XI.1924».

3583. Паштоўка Вальтэра Андэрсана (Дэрпт) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 12.04.1924

Многоуважаемый г-нъ Ластоўскі!

Въ отвѣтъ на Ваше письмо долженъ сообщить Вамъ, что книги здѣшняго университета частнымъ лицамъ по уставу не высылаются, но могутъ быть высланы Ковенской Университетской Библіотекѣ подъ ея отвѣтственность. Совѣтую Вамъ обратиться въ эту библіотеку (прямо или черезъ кого-нибудь из профессоровъ) съ просьбой послать соотвѣтствующее официальное письмо нашей унив. библіотекѣ. — Владимировъ, Ф.Скорина у насъ есть (номеръ: II f 271 zz 1, томъ 90); другой его книги повидимому нѣтъ. Нѣтъ и обѣихъ книгъ Каратаева (есть только его старая книга: Хронолог. [опи]сь слав. книгамъ, напеч. кир. буквами, Спб. 1861: номеръ XV 377 f). Сахаровъ, Хронол. роспись есть (номеръ: XV 615 g), другой его книги нѣтъ. Миловидовъ есть въ томъ случаѣ, если Ваша цитата «Ч.О.М.У. 1908, I» указываетъ на «Чтенія въ Имп. Общ. Ист. и Древн. Росс.» (номеръ: XIII b 62, 33a).

Въ свою очередь я хотѣлъ бы обратиться къ Вамъ со слѣдующимъ вопросомъ: извѣстны ли Вамъ какіе бы то ни было варіанты бѣлорусской

пѣсни про Яся и невѣрную Мариську кромѣ указанныхъ у Карскаго (Бѣлоруссы т.III 1, стр.332-3): Записки Географ. Общ. по отд. этн. V 275 № 22; Шейнъ, Матеріалы I 1, 321 сл. №376-7; Романовъ I 158 №136 — ?

Съ искреннимъ уваженіемъ В.Андерсонъ

582.1.49:017&r

3584. Паштоўка Яна Ермачэнкі (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.04.1924 з падзякай за атрыманы «Крывіч»

582.1.49:016&r

3585. Ліст Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.04.1924

582.1.49:020&r

582.1.49:018 — канвэрт

Аб перасылцы «Крывіча», аб захапленьні «госпожи Рейманъ» «Крывічом».

3586. Адкрыты ліст псэўданіма «Amicus rerum historiarum Crivitschorum» [Эдмунда Зузэміля] (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.04.1924

[...] За послѣдніе годы вопросъ о расѣ сдѣлалъ во всѣхъ странахъ, а особенно въ Германіи огромную эволюцію. Признакомъ народности принято сегодня въ Германіи считать не языкъ и не религію, а единственно расовую принадлежность [...]

Надъ этой проблемой слѣдуетъ еще много потрудиться бѣлорусскимъ дѣятелямъ. Расовая проблема, если она будетъ правильно разрѣшена, и если из этого рѣшенія будутъ сдѣланы логическіе практическіе выводы, поставитъ всю кривичскую политику на совершенно новую базу и откроетъ кривичскимъ дѣятелямъ совершенно новые горизонты [...]

582.1.49:019&r

З развагамі на тэму «Что представляютъ собой такъ называемыя ильменскіе славяне?» з гледзішча расавай тэорыі.

3587. Расьпіска А.Бака за 17.04.1924 у атрыманьні ад Вацлава Ластоўскага 3.150 літаў за надрукаваньне 7 аркушаў «беларуска-расейскаго слоўніка» (ад 11 да 17 аркуша ўключна)

Таково настоящее положение «БЕЛОРУССКОГО ДЕЛА», заключающего в себе 2 стороны: 1) следствие над отдельными лицами и 2) следствие над белорусским национально-культурным движением в Латвии.

И подобно тому как белорусское учительство скомпрометировано в глазах г. Министра Образования самым фактом нахождения под следствием, так еще в большей мере этим фактом скомпрометировано белорусская культурная и школьная работа среди широких масс. Ибо самый факт судебного следствия над белорусским национальным движением с допросом 350-400 свидетелей неуклонно ведет к обессилению белорусской культурно-школьной работы, к ея дискредитации, особенно в тот момент, когда начинается учебный год, когда начинаются среди меньшинств Латгалии подготовительные работы перед переписью населения.

В связи с допросами крестьянских детей, учеников белорусских основных школ, среди темного, невежественного, на 70% безграмотного белорусского крестьянского населения Латгалии растет опасение, что обыскивают и судят всех белорусских учителей только за то, что они занимались в белорусских школах, а вместе с тем созревает намерение в целях безопасности, не посылать своих детей в белорусские школы.

~~Доводя о всем вышеизложенном до сведения Латвийского Правительства, мы нижеподписавшиеся просим:~~

~~1) Выяснить основательность обвинений, пред'являемых лицам, находящимся под следствием, и необходимость проверки этих обвинений путем такого широкого следствия,~~

~~2) Рассмотреть необходимость выяснения белорусского национально-культурного движения в Латвии путем судебного следствия,~~

~~3) Предоставить белорусскому населению Латвии возможность начать наступающий учеб. год в мирных и спокойных условиях.~~

У Пігулеускі.

582.1.44:112-120 — мк

Дакладная дата невядомая.

3624. Mémoire concernant les territoires biélorussiens sous la domination polonaise présenté à la Vme Assemblée de la Société des Nations. Genève, Septembre 1924

582.1.44:091-098

Дакладная дата невядомая. Падпісана:
V.LASTOVSKI m.p.
Ancien Président du Conseil des Ministres
de la République Bielorussienne

3625. Нататка з газэты «Дни» (Бэрлін). №553. 2.09.1924
82.1.44:038а

Ліст Т.Грыба ў рэдакцыю за 21.08.1924 з абвяржэньнем інфармацыі аб супрацоўніцтве з «Грамадзкім Голасам».

3626. Les droits des minorités et les revendications des peuples opprimés // L'Ère Nouvelle. N2495. 2.09.9124
582.1.44:042

Інтэрвію з доктарам Міхалам Лазінскім, прафэсарам міжнароднага права, былым намесьнікам дзяржсакратара замежных справаў Заходнеўкраінскай Рэспублікі, прэзыдэнтам Камітэту прыгнечаных народнасьцяў. Дата невядомая.

3627. Адкрыты ліст Рады БНР да «чэсных сяброў Сялянскага Студэнцкага Саюзу» за 2.09.1924
582.1.44:087 — мк

Пратэст супраць рэзалюцыі Сялянскага Саюзу за 30.08.1924 у падтрымку дэлегаваньня В.Ластоўскага на сэсію Лігі Нацыяў у Жэнэву, спасылка на пастанову Краёвага Цэнтру за 11.03.1924, паводле якой да Ластоўскага й Душэўскага належыць ставіцца выключна як да прыватных асобаў.

На лісьце надпісана алоўкам: «гр. Гарошко».

3628. Экспазэ Камітэту Паняволеных Польшчай Народаў Асамблеі Лігі Нацыяў у Жэнэве за 20.09.1924
582.2.52:162-167 — шк

3629. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Коўна) невядомаму адрасату (Прага) за 21.09.1924

Дзеля таго, што есьць пэуныя весткі аб тым, што літоуская агітацыя супроць беларускіх аб'яднаных сіл пранікла ужо і у Прагу і пагражаець і там зрабіць такі самы развал, які стауся у мінулым годзе тут у Коуне, я пішу да Вас з мэтай знайсьці супольны язык у супольнай справе. Вы маеце уплыу сярод сур'езна думаючага студэнцтва і таму можаце растлумачыць тым, хто не разумее — сучасную сітуацыю.

Тое, што сталася цяпер, г.зн. нашыя выступленьня супроць Літвы, падгатаулялась і сьпела, як Вы самі ведаеце, ужо дауна. Для старонніх людзей подобны стан беларуска-літоускага разыходжаньня часта незразумелы: чаму, казау той, беларусы ня могуць дайсьці згоды з літвінамі, калі яны натуральныя саюзьнікі і нават, як яны самі кажуць, браты. — Але гэтак здаецца толькі для старонных асоб, а не для нас, якія ужо ня першы год варуцца у гэтым соку. Так, нашае разыходжаньне з сучаснай літоускай палітыкай — факт і мы ня толькі ня хочам закрываць на гэта вочы, але лічым патрэбным аб гэтым заявіць голасна. Чаму? — Вось чаму:

1) Есьць фактам, што літоуская палітыка апошняга году з паловай есьць палітыка разьбіцьця адзінага беларускага нацыянальнага фронту. Тое, што сталася з Ластоускім ні у якім выпадку ня есьць прынцыповае разыходжаньне паміж ім, а намі, — як гэта офіцыяльна засьведчана у

адпаведных заявах, — але есьць вынік упартых, штодзенных высілкаў дырэктара па беларускім справам Іонінаса, — разьбіць нас і вылушчыць з сярод нас такіх асоб, якія згадзіліс бы служыць Літве, як сваей другой бацькаушчыне. Служыць у літаральным значэньні гэтага слова, г.зн. знайходзіцца на пэнсыі штомесячнай, як кожны іншы літоускі чыноунік, міністэрства загранічных спраў. Літвінам надзвычайна пашанцавала: да іх пайшоу на службу былы старшыня незалежнага беларускага ураду.

2) Разьбіць беларускія сілы на варожыя группы і узяць некаторыя з іх сабе на службу літвінам патрэбна затым, каб пазбавіцца на будучыну небаспекі узроста беларускай самастойнай палітыкі і каб спакайней спэкуляваць надалей на беларускім вызвольным руху. Вядомы Вам Кайрыс (с-д.) яшчэ у 22 годзе казау на адкрытым сходзе прэдстаунікоу літоускага грамадзянства, што «Літва спэкулюе на беларусах». Гэта было мне у той момант не зусім зразумела, бо я шмат чаго ня ведау. Але цяпер гэта для мяне факт. Кожная дзяржава есьць дзяржава для сябе, а не для другіх. Яна надзвычайна эгоістычна, — і няма чаго дзівіцца, што Літва углядаець у нас толькі матэрьял, які трэба скарыстаць у сваіх мэтах. Я не магу Вам тут раскрыць усяе тае ілжы, якая распаусюджваецца літвінамі што да беларусау Віленшчыны. Яны проста гавораць, што «беларусы гэта абмаскаленыя літвіны,» — інакш яны і ня могуць гаварыць, таму што тагды ня будуць мець ніякага права на Вільню, якая як Вам добра ведама мала падобна на літоускую. Кожная дзяржава хоча бачыць сваіх суседзяу слабымі, — і Літва ня робіць з гэтага выключэньня нават у стасунку да гэтак слабых беларусау.

3) Аднак, скажаце Вы, Літва ня хоча рваць з беларусамі і даводзіць так сама фактамі, што яна гатова дапамагаць беларусам. Сьведчаньне — камандыроукі Ластоускага загранічу. — Вось у гэтым акурат і крыецца найбольшая небаспека. Роля Ластоускага, у данным выпадку надзвычайна небаспечная і вось чаму. Калі літоускі урад у 21 і 22 годзе дапамагау нам у палітычнай працы грашыма, дык гэтая помач рабілася, як Вам напэуна ведама, у форме пазыкі беларускаму ураду. Беларускі урад зьяуляуся самастойнай адзінкай, якая мела зауседы сваю вольную руку і запрауды вяла справу так, як было найбольш карысна для Беларусі. Было шмат выпадкау, калі мы знайходзіліс у гострай апазіцыі да літоускай палітыкі — так было з батальенам, з г.зв. тарыбай усходняй літвы, з міністэрствам Семашкі, з партызанскімі арганізацыямі і г.д. Урад веу і вядзе самастойную беларускую палітыку, мае адказваць толькі прад беларускім грамадзянствам. Ці можа такую самастойную палітыку весьці Ластоускі, калі ен зьяуляецца рэфэрэнтам міністэрства загранічных спраў Літвы з пэнсыяй 800 літ у месяц (Душэускі — 600 літ). Я Вам кажу факт, што абедзьве гэтыя асобы — супрацоунікі міністэрства загр. спраў, бо міністэрства па беларускім справам німа, яно не істнуець — зачыняно згодна пастанове аб тым Сойма. — Ластоускі сам таго ня ведае, якім дальнім мэтам ен служыць. У данны момант гэта дальняя мэта есьць стварэньне партыі беларускіх хрышчоных дэмакратау. Гэта так сама факт і з гэтай мэтай нават хочуць, як казау Гальваноускі прад сваім адъездам у Лендан выпісаць з Вільні ксяндза Адама[1]. Калі-б стварылась наша

хрышчоная дэмакратыя беларускімі рукамі, дык да гэтага можна было б ставіцца як каму па смаку, але да гэтага павінна было-б ставіцца як да пытаньня унутранна-беларускага. Калі-ж гэтая справа робіцца чужымі рукамі, маючымі акрэсьляны інтэрас у беларускім адраджэньні (узяць сабе Вільню), — дык да гэтага інакш, як акрэсьляна воража паставіцца нельга. Гэта есьць закардонная інтрыга, умешваньне ся у нашае унутранае жыцьце. Канешне, кс. Адам не паедзе сюды, дарма яны клапоцяца, але характэрна, што гэта пастаулена на парадак дзенны. — Так, літоускі урад дапамагае беларусам тым, што камандыруе Л<астоўскага> заграніцу для пратэстау супроць палякау. Ведаеце хто арганізуе усе гэта, у чыіх руках ніткі «камітэта паняволеных». У руках Пурыцкага, які сядзіць у Бэрліне. Чаму-ж пан Пурыцкі не мог дагаварыцца з паслом Варшаускага Сэйма Якавюком, які па праву павінен быу быць заграніцай як прадстаунік беларускага жыхарства? Таму, што Якавюк з намі, таму што ен мае акрэсьляныя інструкцыі ад краю быць разам з цэнтрам беларускай, а не літоускай палітыкі. Літоуцы вядуць у беларускай справе у данны момант даволі прылічную палітыку вонкава, але па істоце за гэтым крыецца жаданьне узяць наш цэнтр пад апеку, пазбавіць яго самастойных пазіцый. Таму яны ня хочуць дапамагчы Ураду, а дапамагаюць у піку нам Лас<тоўскаму>, падпіраюць Л<астоўскага> чым можна (галічанамі, долярамі для некаторых беларускіх арганізацый і інш.). Ласт. яны дапамагаюць таму, што не баяцца яго, што яны пэуны, што Л. знайходзячысь на іхняй службе ня можа адважыцца пайсьці супроць іхняй палітыкі цяпер. А калі пазьней можа адважыцца, дык будзе ужо позна. Бо — тады беларускія сілы яшчэ больш разваляцца, як есьць цяпер, і будзе створаны новы цэнтр, працуючый у сьціслым контакце з літоускім клерыкальным цэнтрам. Гэтую спэкуляцыю трэба рвануць цяпер, адразу — пакуль яна ня пусьціла карэньняу, пакуль каля яе не сабраліся новыя людзі.

4) Нашая группа, г.зн. Урад зауседы гатовы і будзе гатовы працаваць разам з Літвой. Я асабісьце, як і усе амаль нашы сябры сьвядомы патрэбы і нават неунікненасьці беларуска-літоускага супрацоуніцтва. Не таму, што мы гатовы браць ад Літвы падтрыманьне, але таму, што гэтае паразуменьне есьць справа арганічная. Але, — есьць вялікае але у гэтым супрацоуніцтве: мы ня можам быць служкамі Літвы, а павінны быць роунай ей стараной. Я асабісьце праверыу усе магчымасьці, усе формы для такога ласьне супрацоуніцтва і усе магчымыя формы былі літоускім урадам адкінуты. Нам прапанавалі проста — службу. Даваджу да Вашага і іншых сяброу ведама офіцыяльна: я прапанаваў міністэрству загр. спрау склікаць беларускую агульную конфэрэнцыю з прэдстаунікоу усіх нашых группіровак, склікаць гэтую конфэрэнцыю у Коуне, каб абгаварыць усе пытаньня разам з імі, літвінамі, каб выясьніць усе непаразумен[ьні] і дагаварыцца. І што-ж? Віцэ-міністр загр. спрау Балутіс мне адказау, што гэта ня уваходзіць у заданьня міністэрства, што яны супроць такой нарады. А рабіць келейна справу падыходзіць? а браць на службу былога старшыню Ураду БНР падыходзіць? а карыстацца яго імянем як «былога» выгодна? Я казау ясна: «магчыма урад БНР мыліцца у сваім разуменьню беларуска-літоускіх адносін — няхай жа скажа свае слова агульная

канфэрэнцыя з дзеячоу усіх напрамкаў. Вам гэта будзе на карысьць[»], — але не: мая прапазіцыя была некарысна літоускай палітыцы, бо яна не выносіць грамадзкага высьвятленьня, ня выносіць сьвета. Больш таго: дзеля таго, што той жа Балутіс не раз казау мне, што, вось, урад гэта для іх невыгодна, што гэта занадта афіцыяльна, што лепш весьці справу у прыватны спосаб і т.п. — я запрапанавау яму стварыць «цэнтральны бел. камітэт заграніцай». І што-ж бы Вы думалі? Нават і гэтая, здавалась бы для іх выгодная комбінацыя, не падайшла. Чаму? Усе таму, што гэта была-б грамадзкая арганізацыя з якой трэба было-б умауляцца, а не службовыя асобы, якім можна загадваць, якія можна камандыроуваць. Умауляцца яны ні у якім выпадку ня хочуць і ня хочуць браць на сябе ніякіх забавязань. Вось словы Балутіса: «мы готовы вам помогать, пока может быть незначительно, потом надѣюсь больше, но никаких условій мы заключать не намѣрены.» Мне асабісьце абецалась віза дыплематычная на выезд у Жэнэву і грошы (слухайце, слухайце!) але, калі я дам слова не рабіць так, як гэта не уваходзіць у пляны Літоускага урада. Але толькі — «без всяких соглашеній». Я гэтую прапазіцыю адкінуу, хоць мог бы скарыстацца і падъемнымі і сутачнымі і іншае. Чаму? Вось чаму:

5) Наш стасунак з Літвой як з дзяржавай можа апіравацца толькі на адпаведных умовах, а не на службе. У гэтых умовах мы павінны выступаць як старана; у якой форме, ці то урада, ці то камітэта — гэта ужо ня так важна. Толькі умова са узаемнымі забавязаннямі можа ляжаць у аснове нашага супрацоуніцтва. Гэтага вымагае той агульны і галоуны прынцып беларуска-літоускай палітыкі, што —

«Вільня ня есьць толькі літоуская, але нагэтулькі жа і беларуская». —

Мы ня можам дазволіць літоускай палітыцы разглядаць віленскае пытаньне, як толькі свае унутранае пытаньне, мы ня можам пакінуць на літоускую ласку сотні тысяч беларусау віленскага абшару, якіх яны лічуць ва усіх загранічных выданьнях «абмаскаленымі літвінамі». І калі літоускі урад супольнасьці Вільні вызнаць ня хоча, дык шчырых адносін у нас з ім быць ня можа. Вось чаму мы разыходзімся з сучаснай Літвой, вось чаму яны ня могуць падтрымліваць нас, выяуляючых гэты прынцып, а падтрымліваюць Ласт<оўскага> які гэты прынцып сьвядома, ці не сьвядома затушоуваець. Мы павінны мець з Літвой умову, у якой абгаварыць гэтую супольнасьць, а яны рашуча ад уселякіх умоу адмауляюцца. — Урад БНР мае з Літвой умову ад 11.XI 20 года. Магчыма, пры сучасных варунках трэба было-б яе рэвізаваць, замяніць другой. Але літвіны на гэта ня годзяцца, яны упрост яе адкідаюць, — і што вельмі цікава, літоускі урад ня хоча прыслаць нам паперу, што ен гэтую умову абвешчае нядзейнай. Вы разумееце, што гэта за брутальная палітыка? Яны ня хочуць, каб беларусам стала вядома, што Літва адмауляецца ад сваіх ранейшых забавязань і што другіх забавязань рабіць ня хоча. Калі-б літ. мін. загранічных спрау абвесьціла-б ранейшую умову скончанай, — мы яе пакінулі-б у супакою, давеушы толькі аб тым да ведама грамадзянства. Але пакуль умова істнуе, — і пакуль у гэтай умове есьць забавязаньне, што:

а) вызнаньне намі віленскага абшару уваходзячым у склад Літвы есьць часовым і

в) Літва павінна надаць гэтаму абшару тэрыторыяльную аутаномію, — мы пакінуць яе у супакою ня можам і павінны высьвятляць яе спэкулятыуныя тэндэнцыі.

6) Камандыроукай Ластоускага загранiцу літвіны паставілі нас у вельмі невыгоднае становішча. Мы прымушаны б былі пратэставаць супроць яго падарожы, як прэдстауніка беларусау. Я згодзен, што гэта карысьці нашай справе не прыносіць, што гэта падрывае справу наогул. Але у данным выпадку мы павінны былі выбіраць з «двух зол — меншее». Мы зрабілі гэта у сьвядомасьці ня толькі свайго права, як абаронцау беларускага нацыянальнага ідэалу, але так сама у сьвядомасьці свайго абавязку, як группы, якая адказвае за кожны свой крок прад беларускім грамадзянствам. Будучына пакажа, ці рабілі мы правідлова. Я у гэтым пэуны. Памятуеце — малюнак, як Тарас Бульба застрэліу свайго сына Андрэя. Так мы робім і будзем рабіць з Ластоускім, калі ен не адмовіцца ад службы Літве. Што можна было дазволіць Семашцы (а нават і яму мы не дазвалялі, асабліва Вільня і усе віленцы), таго ні у якім выпадку ня можна дазволіць былому старшыне бел. нацыянальнага ураду. Гэтага вымагае апрача усіх вылажаных вышэй аргумантау наша проста зразумелая чэсьць. — Тут ня можна ставіць справу так, што быццым, калі камандыравалі ня нас, а Л<астоўскага> дык мы супроць яго. Што мы як бы абражаны, ці што там. Тут граюць роль фактары паважнейшыя за асабістыя жаданьня, калі-б у якіх дурняу яны былі. Тут на карту ставіцца істотныя інтэрасы, будучы лес нашага руху, яго напрамак, будучына цэлага краю і наш нацыянальны гонар. Падход да гэтага пытаньня з меркай, што «нехта есьць жулік і скрау дзесь-ці грошы» — есьць сьведчанне убогага палітыкана, бязпомачнага, які хапаецца за ілжу, каб адвесьці вочы ад важнейшага, ад істоты. Няхай нашыя супраціунікі скажуць: «у чым іхняя вера што да Вільні», тады будзе ясна, якая іхняя роля у гэтай справе.

7) Павінен Вам сказаць, што мы у разуменьні пытаньня нашых адносін з Літвой не адзінокі: на нашай старане, з намі згодна ня больш ня менш, як палова літоускага сойму бяз чатырох галасоу. Уся опозіцыя хрышчоным дэмакратам згодна з намі, чаму есьць фактычныя сьведчаньня. (Пазнаемцесь з артыкулам Грыніуса — галавы літоускіх народнікау, прачытайце артыкул Сьметоны і інш. — аб нац. меншасьцях і соц-дэмакратах німа чаго гаварыць). — Я прыводжу гэты факт не для таго, каб давесьці правільнасьць нашых пазіцый і каб паказаць нашую сілу у барацьбе за свой прынцып. Калі-б нават на нашай старане ня было ні воднага літоускага голасу і тагды-б мы, будучы пераконанымі у правільнасьці, у карыснасьці сваіх погладау для беларускай справы, трымаліс бы і білісь бы за іх да апошняга. Лішнім аргумантам у нашу карысьць гаворыць і тое, што усе без выніку загранічныя прадстауніцтва у Літве дзівяцца паводжаньню сучаснага літоускага ураду і ня могуць згадзіцца з яго у стасунку да нас тактыкай. — Агульны лезунг усей літоускй опозіцыі у пераживаны момант: «Ізоляцыя хрышчоных дэмакратау, стварэньне каля іх

адпаведнай атмосфэры ізоляцыі». Барацьба ідзе па усяму фронту, пачынаючы выбарамі у самаурады і канчаючы соймам. І кожны, хто падтрымлівае палітыку хрышчоных у стасунку да беларусау, тым самым йграець у дудку цяперашніх валадыроу Літвы. Але ня трэба забывацца, што час іх убягае што дня, а што прынясе дзень наступаючый — невядома. Важна ведаць, хто чаго хоча. Вось чаму і роля беларускага студэнцтва у Празе мае свае значэньне, вось чаму трэба кожнаму сьвядомаму беларускаму грамадзяніну паставіцца да спроб сучаснага літоускга ураду яшчэ больш разьбіць нашыя сілы, — крытычна.

Бывайце здаровы. Моцна цісну Вашую руку
Паважаючый вас АлЦьвікевіч
21/IX-24 г.

Дадаю: а) Мы раней, як толькі атрымалі пастанову Краевага Цэнтра ад 11 сакавіка 1924 года аб пазбауленьні Ластоускага права на палітычныя выступленьня, папераджалі літоускі урад, што супроць уселякай спробы даручыць яму палітычныя функцыі мы будзем пратэставаць. Аднак, ня гледзючы на нашыя папярэджаньня і як бы сьмеючысь з іх, літоускі урад зрабіу па свойму. Не нашая віна, што цяпер барацьба пойдзе без уселякіх фігавых лісткоу і уселякімі захадамі. На поу-дарозе мы не застановімся і усе роуна не дапусьцім, каб чужыя чыноунікі рэпрэзэнтавалі бел. справ[у].

в) Хрышчоныя вядуць, як тут кожнаму ведама, не нацыянальную літоускую палітыку, а палітыку клерыкальную. Разам з тым значная частка іх ня хоча і чуць аб Вільні. У кожным разе, калі яны і імкнуцца адабраць Вільню, дык пры варунку, каб яна была «хрышчоная», — бо на другі дзень пасьля таго як Вільня войдзе у склад Літвы такой, якой яна есьць у данны момант — хрышчоным будзе канец. Таму яны і лічуць патрэбным яе «храсьціць» — шляхам стварэньня бел. хр-дэм.

582.2.52:005-008 — ма

[1] Станкевіча.

3630. Ліст Кляўдыюша Душэўскага (Коўна) Аўгусту Іванавічу Калніну (Рыга) за 22.09.1924 у справе арышту ў Дзьвінску Кастуся Езавітава й іншых беларускіх дзеячоў

582.1.44:099-101 — мк

3631. Паведамленьне («Извѣщеніе») Вацлава Ластоўскага й Кляўдыюша Душэўскага ў газэце «Lietuva» за 24.09.1924 аб неправамоцнасьці «Ўраду Цьвікевіча» (дасланае В.Захаркам зь лістом у Вільню 1.11.1924)

С газеты Летува №215 от 24 IX 24 г.

ИЗВѢЩЕНІЕ.

Белорусское правітельство, избранное в Минскѣ 13 XII 1919 г. пленумом Рады Бѣлорусской Народной Республики в противовѣс явно полонофильской «Найвысшей Радѣ» прекратило свое существованіе 20 мая 1923 г.

когда глава Правительства В.Ластовскій сложил свои полномочія. Новое Правительство не могло быть сформировано, так как не было правомочнаго органа, который мог бы его избрать. По конституціи же Бѣлорусское Правительство должно избираться исключительно пленумом Рады Республики.

Посля этого нѣсколько лиц (семь, восемь человѣк) желая использовать для своих личных цѣлей имя уже несуществующаго Бѣлорусскаго Правительства, назвали себя таковыми, и нѣкто г. А.Цвикевич стал во главѣ его. Эти лица в настоящее время в количествѣ 5 человѣк (А.Цвикевич, А.Валькович, Яковюк, Бедрицкій и А.Головинскій), пытаясь присвоить себе право говорить от имени бѣлорусскаго народа выступають от имени пяти несуществующих организацій, как то:

1, от имени Правительства Бѣлорус. Народн. Республики

2, от имени Бѣлорускаго Національнаго Союза.

3, от имени Бѣлорусской колоніи в Литвѣ

4, от имени Бѣлорусскаго пресс-бюро и кромѣ того, в связи с нѣсколькими лицами, находящимися в Прагѣ

5, от имени Бѣлорусской Рады.

Новообразованное, так называемое правительство опротестовано оффиціальным протестом от 14 X 23 г. самими членами Президіума Рады Бѣлорусской Народной Республики, в котором между прочим говорится: «Мы считаем, что это Правительство является незаконным, ибо согласно конституціи Правительство Б.Н.Р. должно избираться пленумом Рады Б.Н.Р. что не было соблюдено при его созданіи... Правительство А.Цвикевича сейчас должно прекретить сваю работу».

Бюро Ц.К. Б.П.С-Р., (партіи, на которую Белорусское Правительство главным образом опиралось) разослало 8 XII 23 г. свае оффиціальное извѣщеніе, § 4 котораго гласит: Так называемое Правительство А.Цвикевича искуственно созданное на эмиграціи и прэбывающее в Ковно, не может считаться законным Правительством Б.Н.Р., так как согласно конституціи Правительство избирается исключительно пленумом Рады Б.Н.Р. ... Как организація частная, не имѣющая никакой связи с соотвѣтствующими бѣлорусскими организаціями и партіями, как в Краѣ, так и заграницей, это «Правительство» является безотвѣтственным и самозванным.

В таком же духѣ неоднократно высказывались по этому вопросу и другія бѣлорусскія организаціи, а также бѣлорусская пресса.

Существовавшій в Ковно Бѣлорусскій Національный Союз, по выходѣ с него партіи бѣлорусских саціолистов-революціонеров, бѣлорусских организацій, находящихся под польской оккупаціей и бѣлорусских организацій в Литвѣ послѣдній нынѣ несуществует, давно уже перестал существовать. Оставшимися бланками и печатеми пользуется теперь для своих цѣлей «Правительство» при посредствѣ А.Головинскаго, одного из бывших членов союза.

Организаціи, именующійся «Бѣлорусская колонія в Литвѣ» никогда не существовало и несуществует и таким образом все выступленія от имени таковой являются узурпаціей.

«Бѣлорусское пресс-бюро», издаваем[о]е в Ковно, является личным предпріятіем А.Цвикевича, А.Вальковича и состоящаго в них на службѣ Бедрицкаго. Дѣятелность названнаго пресс-бюро в послѣднее время проявилась в рядѣ клевѣтнических, вредящих бѣлорусскому дѣлу инсинуацій.

«Бѣлорусскую жэ Раду», созданную в Прагѣ, вышеупомянутое извѣщеніе Ц.К. Б.П.С-Р. характеризует так: Созданная в Прагѣ так называемая Бѣлорусская Рада во главѣ с Кречевским и А.Цвикевичем есть ни что иное как новое авантюристическое предпріятіе, новая попытка спекуляціи на идее бѣлорусскаго освободительнаго движенія и его представительства заграницей, группы политически обанкротившейся и недавно примкнувшей к бѣлорусскому движенію интеллигенціи, потерявшей всякія нормы политическаго мышленія и морально-этическаго поведенія.

И дѣйствительно, ряд поступков вышеозначенной группы подтверждает правильность этого мнѣнія. Так, распространяемыя этими лицами свѣдѣнія об якобы объявленном кѣм то бойкотѣ Ластовскому и Душевскому, основано на подложном протоколѣ, сфабрикованном этими лицами, что удостовѣряется письменными показаніями свидѣтелей. В подлогѣ протокола принимали активное участіе г.г. Цвикевич, Валькович, Головинскій, а также г.г. Коробач и Козячій и др. Послѣдніе, называя себя с-р., ярко выступаушія против коммунистов, послѣ переѣзда в Минск сразу же объявили себя коммунистами и работают нынѣ там.

За клевѣту и инсинуаціи этой группы В.Ластовскій в концѣ 1923 г. вызвал А.Карабача, А.Цвикевича, А.Вальковича, Г.Козячаго, А.Головинскаго и нѣкоторых других на суд чести. Суд чести был ими принят. Обѣ стороны согласились на слѣдующих судей: быв. члена Гос. Думы Н.Янушкевича, инженера Кагана и третьяго члена Литовскаго Сейма Кайрыса, но по прошествіи нѣкотораго времени эта группа от суда чести уклонилась, прикрившись вышеупомянутым подложным протоколом, сфабрикованным лицами, вызванными на суд чести, спеціально чтобы уклонитьс я от этого суда.

В.Ластовскій, быв. Предсѣдатель Совѣта Министров Б.Н.Р.
К.Душевскій, быв. Государственный Секретарь Б.Н.Р.
582.1.04:085&r — мк

3632. Праект адозвы Старшыні Рады БНР Пятра Крэчэўскага (Прага) за 27.09.1924 да Саўнаркому Беларусі ў Менску, Пасольскага Клюбу, Нацыянальнага Камітэту і часовай Беларускай Рады ў Вільні

АДОЗВА

Совнаркому Беларусі у Менску, Пасольскаму Клюбу,
Нацыянальнаму Камітэту і часовай Беларускай Радзе у Вільні.

Падзел Беларусі на часткі выклікаў да жыцьця краевые центры ва усіх акупаваных мяйсцох Беларусі. Тварылісь яны і творацца не па добрай волі беларускага народу, а з бяды і пад прымусам чужынцоу, каб абараніць свае правы. Ні водны з гэных центрау не можа сказаць, што ён выяуляе волю многапакутнага беларускага жыхарства.

Дзеляцца краевые цэнтры і паміж сабой — на незалежные ад акупантау і лояльные да апошніх. Пад польскай акупацыей адны арьентуюцца на Савецкую Беларусь, другіе на Польшчу; пад Савецкай Беларусьсю адны — на Маскву, другіе — на сваю уласную Беларускую Дзержаву.

Аднак ні тые, ні другіе не могуць аткрыта выявіць сваю волю і робяць толькі тое, што магчыма у сучасных варунках.

Акупанты з свайго боку стараюцца як мага разбіць беларускія сілы на маленькія, варожыя паміж сабой гурткі, абецанкай то там, то сям культурнай аутономіі.

Галодны, змучаны, часта і сьвядомы беларускі дзеяч, не гаворучы аб несьвядомых апынаецца у руках варожай сілы і робіць працу шкодную для Беларусі. За падзел Беларусі працуюць цяпер усе нашы суседзі і чым больш яны намагаюцца, тым больш мы павінны еднацца каля едынага центру, які рэпрэзэнтуе усю Беларусь.

Не знойдзецца ні воднага беларуса, які бы не прызнау жывой крыніцы нашага адраджэньня — Усебеларускага Кангрэсу — 1917 г. — за волю усяго беларускага жыхарства ад Смаленска да Буга і Нарава.

Усебеларускі Кангрэс перадау уладу Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі, а Рада Рэспублікі 13- сьнежня 1919 г. перадала абарону правоу усяго беларускага народу — Прэзыдіуму Рады і Ураду, прымушанаму выехаць загранiцу.

Ні адзін із краевых цэнтрау Менска, ці Вільні не мае права і не можа зьмяніць пастанову Рады Рэспублікі, як не можа бэз паразуменьня з вышэйшай уладай Беларусі прымаць тыя, ці іншыя крокі дзержаунага характэру.

Усякае сэпаратнае выступленьне гэных цэнтрау, ёсьць стверджэньне падзелу Беларусі і пераход з незалежнасьці на фэдэрацыю, ці нават культурную аутаномію. Такая чыннасьць краевых цэнтрау павінна разглядацца як здрада незалежнасьці Беларусі і Рада Рэспублікі усім сваім юрыдычным і маральным правам патрэбуе ад краевых цэнтрау спыненьня шкоднай для беларускай справы акцыі.

Адсутнасьць фактычных мер для спыненьня такой працы, не ёсьць бэзсілье Рады, бо права юрыдычнае і маральнае за ею, а за краевымі цэнтрамі — праванарушеньне, а значыць і адказнасьць за чыннасьць супроць Рады. Часткі не могуць рэпрэзэнтаваць целага, бо гэта права належыць Радзе Рэспублікі, як і адказнасьць за агульную палітыку.

Зьвертаюсь да краевых цэнтрау не дзеля таго, каб узмацовываць прэстыж Рады, ён замацованы у народзе самой Радай. Мне гэта патрэбна для таго, каб мець вольную руку пры справаздачы і адказнасьці за усё тое, што рабілась і робіцца на абшарах нашай многапакутнай Бацькаушчыны ужо не чужынцамі-акупантамі, а сваімі беларускімі арганізаціямі, прэтэндуючымі на краевае прэдстаўніцтва.

Мае сумленьне павінна быць чыстым перад волей Беларускага Народа. Я мушу споуніць тое, што даручыла мне Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, папярэдзіушы краевых народных прэдстаунікоу, што яны мусяць адказываць за сваю чыннасьць, як перад Радай Рэспублікі, так і перад Беларускім Народам не толькі сваей часткі, але усей разарванай Беларусі.

Нехай жыве незалежная, непадзельная Беларуская Народная Рэспубліка.

Старшыня Рады Беларускай
Народнай Рэспублікі П.Крэчэускі

27- вересьня 1924 г.
ПРАГА.
582.1.04:084 — мк

3633. Ліст Пятра Крэчэўскага (Прага) Антону Аўсяніку (Вільня) за 15.10.1924

5/X-24 г.

Дарагі Антон.

Невядома для каго ад 20- вересьня гэтага году за №88 прысланны камунікат за подпісам старшыні Б.Тарашкевіча і за пісара А.Станкевіча, дзе гаворыцца, што адзіным прэдстаўніцтвам Заходняй Беларусі (хібаж падзел ужо Беларусі факт дакананы) зьяуляецца Пасольскі Клюб і Нацыянальны Камітэт у Вільні. Ласкава дазваляецца выступаць і іншым асобам (мусіць Ластоускім, а мо нават і Ладновым) у абарону беларускага народу, хоць бы і са спэкулятыуных разрахункау, но больш відаць нікому, бо аб Радзе Рэспублікі і Урадзе нічога не сказана, а нават досыць яскрава падкрэсляна, што каліб хто і пачау пратэставаць супроць такой спэкуляцыі на беларускай справе, то Пасольскі Клюб і Камітэт будуць ганіць усякія варожыя адносіны да такой акцыі.

Запрауды як я бачу мусіць і у Вас ідзе не усё добра. Сягоньня некаторыя становяцца на абарону сэпаратнага выступленьня у Літве Ластоускага, чамуж заутра не стаць на абарону той самай акцыі, але у больш шырокім масштабе — Паулюкевіча і Валейшы. Ня ужож зноу нашы сілы будуць разбіты тым самым Рачкевічем так, як былі разбіты у Менску у 1919-20 г. Не можем мы станавіцца на пагляд Ваш, так як Вы пісалі калісь аб Ластоускам, мае права працаваць прыватна як захоча і у гэтым яму ніхто не мае права забараніць. Прыкрыцьцё Ластоускага культурай прывяло да палітычных выступленьняу под кірауніцтвам Літвіноу, разумеецца на іхнюю карысьць. Картачнае выступленьне Валейшы з Грамадскім сабраньнем ужо стварыла часовую Беларускую Раду. Мо гэта таксама культура. А што будзе калі яны з ласкавай панскай рукі склічуць з'езд Заходняй Беларусі утвораць хоць не зусім полнапрауную, але для Еуропы усеж прауную арганізацыю. Польшча ідзе за уселякую цану замацаваць Заходнюю Беларусь за сабой. У далейшым не выключеная рэч, аб тэрыторыальнай аутаноміі яна і спрэчацца не будзе, а паустане пытаньне аб незалежнай Беларускай Дзяржаве, як барьеру супроць Расеі. Пакуль ідзе пытаньне аб усесьветнай рэвалюцыі Саветчыкі выкарыстовываюць усё што падаецца ім пад руку але — будзьце пэуны, калі паустане аб іхнем супакою і істнаваньні, то яны і пальцам не крануць, каб абараняць Заходнюю Беларусь ад Палякоу. Каліб паустала што іншае на усходзе, то уселякае заігрываньне нашэ з камуністамі будзе для нас найвялікшым мінусам.

Вось чаму мы Вас заўжды паперэджалі і паперэджаем, каб Вы, трымаючы у сваіх руках галоўны нэрв захадне-беларускай палітыкі не перагіналі кія ні у адзін бок ні у другі, а велі сваю незалежную беларускую палітыку, тую самую, якую мы намагаемся увесь час вясці і не кінем яе да тэй пары пакуль не прасьведчымся, што ідея наша збанкрутавала і трэба ісьці на пьемонты, ці іррыдэнты.

Што Вы робіце цяпер. Вы самахоць, папёршы на усход як быкі задраўшы хвост прэцесь самі не ведаючы куды і аддаючы свае правы на абарону беларускага жыхарства пад Польшчэй у рукі ігорнага дома Валейшы і комп. Разумеецца, Палякі зробяць з Вамі тое самае што у 19- годзе пасля сходу Рады зрабілі з намі. Частка мусіць уцячэ на усход, частку пасадзяць у турмы, а панамі палажэньня будуць Палякі і Паулюкевічы-Валейшы. Я не пэвен яшчэ у тым, што калі акцыя камуністаў будзе скончэна, што і уцёкшы на усход ня вернуць з пагранічча назад у Польшчу. Няужож старые абмылкі нас нічому не навучылі і мы па шчырасьці прэм без аглядкі туды, куды каму уздумаецца. Нічога не можна былоб сказаць, каб Вы на гэтай справе адыгралі палітыку Радіча, але як бачу у Вас навэт німа такіх заданьняу.

Цяпер зноу паустае пытаньне ці запрауды Вы, выключыушы Раду Рэспублікі і Беларускі Урад ствердзілі падзел Беларусі і пераходзіце, хто на фэдэрацыю з Масквой, хто з Польшчай, а хто мо нават і з Літвой. Мы сваей пазыцыі кіруючага незалежнага цэнтра усей этнаграфічнай Беларусі здаць ніколі не можэм, бо склікаць Раду Рэспублікі зараз не магчыма. Ніякая другая інстытуцыя ні Усходней Беларусі ні Заходней зьменіць гэтай пастановы не можэ. Нават момэнт пры сучастнам разбродзе беларускіх сіл нам забараняе гэта зрабіць, бо мы аказалісь бы дэзэртырамі з поля бойкі у самы цяжкі момэнт. Трэба адкінуць уселякія асабістасьці і еднацца каля едынага цэнтру, які мае права і павінен бараніць усю Беларусь.

Пачау ліст пісаць яшчэ да прыезда у Прагу Тараса[1] а цяперака прадаужаю, бо мн[о]гое стало ясней.

Стала ясна, што Ластоускага нікаторая частка паслоу падтрымлівая і нават пры спатканьні у Данцыгу (летам гэтаго году) дала яму славесную згоду на палітычныя выступленьня у Жэневе і Парыжу супроць пастановы Вашэй жэ ад 11 сакавіка г.г.

Усе гэта робіць надзвычайна сумнае уражэньне і разгледаецца намі як спецыальны выпад супраць Рады Рэспублікі і Ураду. Мы усе-ж такі лічым, што да тае пары, пакуль аканчальна не вырашэны усходнія граніцы Польшчы, ліквідацыя дзяржауных устаноу усей этнографічнай Беларусі будзе памылкова, калі не сказаць больш.

Склікаць адпаведны з'езд, каб былі прэдстаунікі не толькі Захадне[й] але і Усходней Беларусі будзе надзвычайна трудна а можа нават і не магчыма. Тварыць фікцыю камітэту, які не будзе карыстацца нават ні якай павагай сярод беларускаго грамадзянства загранiцай, німа ні якаго сэнсу. Зрабіць большаго чым есьць цяпер прэдстаунічаго органа мы незможам, а толькі дамо прыклад кожнаму хто захоча па прымеру Ластоускаго і Валэйшы тварыць камітэты такія, якія ім у сучасны момэнт патрэбны. Нашы

імены, што ні гаварэце, а ва усей Эўропе ведомы як прэдстаунікоу беларускага дзяржауна-незалежніцкага напрамку. Недармо ім карыстаецца, хоць і з прыпіскаю быушы і Ластоускі, бо добра ведая, што нават яго членство Парыжскага камітэту прыгнечэных народау на міжнародовым палітычным форуме ні адыгрывая ні якай ролі.

Нас хочуць замірыць з Ластоускім, але калі ен не спыніць свае здраднае дзейнасьці та гэта не магчыма аднак такая канфэрэнцыя мая адбыцца на Каляды у Празе. Мы настайваем каб абавязкова такая канфэрэнцыя адбылася у Празе, бо у Данцыг ні хто з нас, ні Коуны выехаць незможа. Добра было-б каб на гэтую канфэрэнцыю прыехалі абавязкова усе напрамкі пасольскага клюбу.

Мы пераконаны у тым, што толькі адзіны цэнтр зможа устрымаць тую вакханалію лояльных орыентацый Волэйша, Ладноу, Ластоускі і К-о не гаворачы ужо аб пазыцыі беларускіх эсэрау у Менску, альбо Станкевіч, Грыб, Мамонько і Бадунова у Празе. Мы цьверда верым, што Ваш здаровы розум і двухгадовы палітычны стаж у Сойме возьме верх і зьменіць фэдаратыную палітыку, гранічачую з падзелам Беларусі на часткі, на палітыку незалежную беларускую.

Да гэтага дадаю праэ[к]т адозвы[2] разгледзь яе і калі згодзе[н] ці не згодзен адкажы мне. Яна скірована выключна супраць усякіх сэпаратных акцый, напрауленых проці незалежнасці Беларусі адкуль-бы яны ні выходзілі.

З пашанаю Петра.

15 кастрычніка 1924 г.
м. Прага
582.1.04:083&r

[1] Тарашкевіча. [2] Дакумэнт №3632.

3634. Нац. меньшинства въ Польшѣ // Последнія Новости (Парыж). 15.10.1924
582.1.44:038в

Аб прыняцьці закона аб мовах.

3635. Повстанческое движеніе на польско-совѣтской границѣ // Руль (Бэрлін). 19.10.1924
582.1.44:038б

3636. «Бѣлорусская» сенсація; Возстаніе расширяется // Эхо (Коўна). 21.10.1924
582.1.44:033

Аб паўстаньнях на тэрыторыі Сав. Беларусі, аб перамовах палякаў зь беларусамі-палянафіламі ў Празе (побач прыпіска: Падаў п. А.Цьвікевіч). У апошнім выпадку гаворка йдзе аб спробах палякаў наладзіць кантакт зь беларускімі дзеячамі ў Празе празь Вячаслава Разумовіча-Хмару. Гл. дакумэнт №3661, а таксама: Razumovič-Chmara V. Grimasy světové války. I část. Brno, 1938. S.213-221.

3637. Даклад Кляўдыюша Душэўскага аб паездцы ў Прагу 14-22.10.1924

Даклад К Душэўскага аб паездцы ў Прагу 14-22.X.24

У суботу 11.X вечарам мы дасталі тэлеграму з Прагі, што туды прыехау пасол Тарашкевіч і хоча з намі угледзіцца. Змаглі мы выехаць з Коуны толькі 14.X.1924 г. і 15-га вечарам былі ужо у Празе.

На другі дзень мы спаткаліся з Янам Станкевічам, які нам сказау што Тарашкевіч выехау якраз у той самы дзень і нават поугадзінай пазьней нашага прыезду. Ен не дачакауся нас дзеля таго што точна ня ведау у які дзень мы прыедзем, а галоунае, што у яго вычэрпаліся усе грошы.

Са слоу Я.Станкевіча мы даведаліся, што аднэй з галоуных мэтау яго паездкі была «ліквідацыя Ураду Б.Н.Р.». У яго асталося уражаньне, што «Урад» дабравольна не зліквідуецца і што віленчукам прыдзіцца прымаць меры. І прауда віленчукі ужо «прымаюць меры». Так у № 7 «Селянскай Прауды» у стацьці «Прычыны паражэньня меншасьцяу у Лізе Нацыяу» паміж іншым гаворыцца:

«Ведама, што мэморыял аб беларускай справе у Польшчы падау толькі Ластоускі. ..... тое-ж, што зрабіла пражская група беларусау,-так званы «урад» Б.Н.Р., публічна заявіушы аб адсутнасьці паунамоцтвау у аутора мэморьялу,-гэта-ж папросту праступленьне!»

Далей Тарашкевіч казау, што віленскія беларусы ніякіх поунамоцтвау «ураду» ня толькі не давалі, але, наадварот, трэбавалі каб яны зліквідаваліся.

Для вядзеньня беларускай работы за граніцай віленскія беларусы упаунаважылі на Чэхію гр. Я.Станкевіча, а на Літву гр.гр. В.Ластоускага і К.Душэускага, аж да часу, калі будзе скліканы за-граніцай зьезд і устаноулены моцны загранічны беларускі цэнтр. Віленчукі высказываюць пажаданьне склікаць такі зьезд каля новага 1925 году у Чэхіі.

Цікава адзначыць, што сябры «Ураду Б.Н.Р.» хацелі недапусьціць Тарашкевіча ні да кога з беларусоу і нават скрыць яго прыезд. Так, калі Станкевіч, ведаючы аб прыездзе Тарашкевіча, прышоу да Вершыніна, у якога ен у той момэнт сядзеу, то Вершынін сказау, што ен «ня чуу нават аб прыезьдзе пасла у Прагу[»].

Апрача Я.Станкевіча мы бачыліся з многімі беларускімі студэнтамі маючы з імі нарады, гутаркі і сабраньні, а такжа з многімі украінскімі дзеячамі.

СТУДЭНЦКІ СХОД

На нядзелю 20.X.24г. нас запрасілі студэнты на агульна студэнцкі сход і хацелі праслухаць нашы даклады.

Інцыдэнт:

У пачатку дакладу здарыуся маленькі інцыдэнт. Прысутны гр. Вершынін прасіу голаса прачытаць неякую заяву. Яму студэнты не хацелі пазволіць, і толькі на просьбу гр. В.Ластоускага яму урэшце далі голас. Гр. Вершынін стау чытаць цэлую літанію аб «праступках» Ластоускага. Аб тым, што ен зьяуляецца «чыноунікам» Міністэрства Загранічных Спрау Літвы, што Ластоускі «запрадау» Літве Беларусь, аб тым, што ковенскіе

беларусы яго байкотуюць і г.д. і урэшце прызывау усіх выйсьці і пакінуць Ластоускага аднаго.

Нехта са студэнтау спытауся ад чыйго імя і хто падпісау заяву. П. Вершынін сказау, што «ад імя дысцыплінаванага грамадзянства, а заява нікім не падпісана». Нехта крыкнуу «заява дысцыплінарнага батальёну» і г. д. Пасьля прачытаньня і закліку усім выйсьці - вышау адзін Вершынін пад агульны сьмех. Усе-ж засталіся і прыступілі да дакладу В.Ластоускага.

Даклад

В.Ластоускі у сваім дакладзе расказау аб Парыжскай і Жэнеускай працы, аб камітэце паняволеных Польшчай нацыяу, аб культурніцкай рабоце у Літве, аб адносінах паміж літвінамі і беларусамі. Аб апошнім ен сказау, што Літва у цэлым адносіцца да беларусау вельмі прыязна і добра, аб чым сьведчыць і тая беларуская культурніцкая работа, якая пры дапамозе Літвы робіцца. Прауда, есьць групіроукі, галоуным чынам скрайныя, якія хочуць выкарыстаць беларускае пытаньне у сваіх партыйных мэтах і партыйнай барадзьбе, але гэты групіроукі і ня лічныя, ды проціу беларусоу, як такіх не выказываюцца. Мы-ж, беларусы, стараемся ставіць беларускае пытаньне не партыйным а агульным пытаньнем усіх партыяу, і ня хочам, каб беларускае пытаньне сталася аб'ектам унутранай, міжпартыйнай барадзьбы.

Даклад

Душэускага насіу агульны характар. Пасьля дакладу былі

Дыскусіі і пытаньні,

у якіх выясьнілася, што студэнты цікавяцца «мандатам» які выдау В.Ластоускі з А.Цьвікевічам у свой час у Генуі. Студэнцтво, пад уплывам агітацыі п.п. Крэчэускага і інш. думало, што гэты «мандат» на «абарону беларускіх інтэрэсау» выдадзены Літве на «векі вечныя». Пасьля выясьненьня В.Ластоускага у тым сэнсе, што гэты «мандат» зьяуляуся бягучым актам на Генуэскую конфэрэнцію, што Літва ня думала і ня думае яго выкарыстываць, што ен у свой час быу патрэбен. Студэнты зразумелі і справа была полагоджана. Культурніцкая работа у Літве зрабіла на студэнтау вялікае уражаньне і была усімі вітана. Комуністы рабілі закід у сэнсе, што «ня трэба вясьці перагаворау з буржуйнай Лігай Нацыяу» і г. д. Закончыуся сход вельмі цепла і дружна.

ГРУПІРОУКІ БЕЛАРУСКІЯ

у Празе есьць тры: 1) Селянскі Саюз пад лідэрствам Я.Станкевіча — гэта дэмократычна нацыянальнае аб'яднаньне, якое налічае сяброу 25-28 і да 40 прыхільнікау. 2) Бел.С-Р. налічаюць ядро у 6 чалавек (пад лідэрствам Грыба, Мамонькі і Бадуновай) і чал. 25 прыхільнікау. 3) Беларускія Камуністы пад лідэрствам Бабровіча і Цьветкова, налічаюць сяброу і прыхільнікау 14 чалавек (ядро 3 і 11 прыхільнікау). 4) Рэшта беспартыйныя. Усяго студэнтау беларусау у Празе есьць каля 350, але толькі палавіна з іх (г.зн. каля 150 ч.) дастае т.зван. «беларускія стыпэндыі», рэшта 150-200 разьмешчаны па камітэтах рускіх і украінскіх і ня могуць безпасярэдна прымаць удзел у беларускім студэнцкім жыцьці.

ПРЫВАТНЫЯ ГУТАРКІ

выясьнілі, што Пражскія беларусы вельмі цікавяцца усім, што робіцца у Літве. Іхныя адносіны да Літвы вельмі прыязныя, хоць было шмат закідау палітыцы Літоускай.

Нам указывалі, што у той час як у Сав. Беларусі, у Польшчы і наогул усюды дзе істнуе «беларускае пытаньне» рух беларускі усе больш разрастаецца, а у Літве наадварот усе больш сходзіць на нет. Прыкладамі прывадзілі і бел. батальен, і белар. Міністэрства і абсалютная атсутнасьць актыунасьці Літвы у палітычнай рабоце.

ГУТАРКА з п. БАРОУСКІМ

22.X.24г. у Бэрліне мы бачыліся з пан. Бароускім і паміж іншым ен нам казау наступнае:

Тыдні два таму да яго зьвярнууся у Бэрліне капітан Разумовіч і прасіу яго дапамагчы праехаць у Прагу да «Ураду Б.Н.Р.» Разумовіч выехау у Прагу па просьбе Захаркі і мае там па даручэньню Польскага Гэнэральнага Штабу «вясьці перагаворы з «Урадам Б.Н.Р.» аб тым, каб апошні пераехау у Варшаву. Разумовіч перадавау, што афіцэры польскага гэнэральнага штабу 12.VII.24. назначылі «Ураду Б.Н.Р.» і п. Якавюку спатканьне у Данцыгу, але апошнія не змаглі, хоць і хацелі, прыехаць.

Кап. Разумовіч прасіу п. Бароускага паехаць у Прагу для вядзеньня гэтых перагаворау, але Бароускі заявіу яму, што «Польская работа» для яго (Бароускага) няпрыемлема.

Калі п. Бароускі спытауся у кап. Разумовіча скуль той мае грошы на разьезды, то апошні сказау, быццам ен прадау неякую маемасьць (дом) у Гродне і на гэты грошы раз'яжджае[1].

Прыняушы усе гэта пад увагу, зьяуляецца зразумелым, чаму «Урадам» была паслана у Жэнэву тэлеграма з пратэстам процiу В.Ластоускага.

23.X.1924 г.

(К.Душэускі)

582.1.44:050-053 — мк

[1] Падрабязьней пра згаданыя абставіны гл. у: Razumovič-Chmara V. Grimasy světové války. I část. Brno, 1938. S.213-221.

3638. Ліст Васіля Захаркі (Прага) беларускім дзеячом у Вільні за 1.11.1924

Таварышы!

Надышоушая найпаскуднейшая пара, калі людзі страцілі усе, што у чалавека павінна быць — гонар і сумленьне, прымушая мяне зьвярнуцца да Вас з гэтым лістом, ні уважаючы на тое, як Вы паглядзіце і аднесецеся да яго.

На гэты раз, я прыпадношу Вам новае «Извѣщеніе»[1] — твор аддзела «ізяшчнай літэратуры» тых самых асоб, якія з погляду нікаторых з Вас, робяць «карыстную культурную працу», якой, па Вашему, ні хто ні павінен ні перэшкажаць ні забараняць.

Магчыма, што і пасля гэтага «Извѣщенія» там — у Вільні, будзе вырэшэна, што не злая чыннасьць штрэйбрэхерау павінна капітуляваць, а тыя, якія, пры надзвычайна трудных і цяжкіх варунках, змагаюцца з ею.

Знаючы рожныя Вашы меркі, якія за адналькавую дзеяльнасьць Аксюка, Ладнова і Валейшу караюць, а Ластоускага і Душэускага з купленаю імі кампаней мілуюць, можна спадзевацца усяго.

Воля Ваша, рабеце што хочаце. Можа па Вашаму і сапраўды есьць рожніца паміж «Абухам»[2] і «Извѣщеніями», якой мы ні бачым.

Мне горка і балюча пісаць у таком тоне і прыбегаць к папрокам, але што зрабіць, калі унутрэньні прымус застауляя. Ен властна патрэбуя сказаць Вам, што калі-б ні было Вашаго скандальнага кампраміса з ластоушчынаю, та ні было-бы і падобных «Извѣщеній». Я ні пазволіубы сабе папрокау, каб не знау таго, што уся дзеяльнасьць Ластоускага і Душэускага Вам ведома. Вы такжэ добра ведаеце і тое, што дзеяльнасьць гэта сьведомым беларускім грамадзянствам у Коуні асуджэна і байкатавана і, што яна выклікая агіду не толькі у беларусау, але нават і у чужынцау. Калі Вы усе гэта ведалі і знаяце, тагды дазвольце запытацца як Вы рэагавалі на яе? А вось як: З пачатку маучалі, потым якбытццам стараліся мірыць, а за тым..., за тым благаславілі яе, Вашымі пастановамі, гутаркамі і коммунікатамі. Такім чынам, злостнае штрэйхбрэхерство як-бы легалізавалася праўда, за компенсацыю «культурнай працы».

Прыкрыўшыся фігавым лісточкам «Крывіча», Вашы «культурнікі» ужо больш слабодна павелі працу, толькі не у напрамку Вашых надзей, а тую, дзеля якой яны былі наняты хрышчонымі дэмакратамі Літвы, падцьвержаньнем чаго можа служыць далучаемае «Извѣщеніе».

Аднак аставім на хвілінку усе у старане і, пастараемся падсумірваць толькі «культурныя здабыткі» за $1^1/_2$ год працы Вашых «культурнікау». Падсумірава[у]шы яе, мы атрымаем 5-6 нумэроу «Крывіча», адну кніжку пераклада батанікі і два «Извѣщенія», да плюс да іх яшчэ рэзалюцыю Я.Станкевіча. Вось і усе. Чаго тут і у гэтым больш дабра ці зла, судзеце самы. На мой погляд, досыць нават аднаго «Извѣщенія» каб працу «культурнікау» назваць подласьцю. Думаю, што такога пасквіля, да яшчэ ад сваіх, ні мела ні адна нацыя.

Вы самі убачыце, сколькі трэба было подласьці, каб так лжыва аблiваць брудам усе беларускае. Возьмем дзеля разтлумачэньня хаця-бы першы артыкул «Извѣщенія» каб паказаць на сколькі яно фальшывіць.

Як Вам ведама, пасьля ведомай запіскі, паданай у 1922 г. Генуэскай канфэрэнцыі, у справе Вільні, кабінет 1919 году вышау у адстауку. На мейсцо яго, у канцы 1922 г., Ластоускім быу зложаны новы кабінет, зацьвержджаны Старшынею Рады Рэспублікі. У гэты кабінет уходзілі толькі Ластоускі, Жытлоускі, Цьвікевіч і Заяц. Значыць, такім чынам, Ластоускі вышау 20 IV 1923 г. не з кабінета 1919 г., як ен гэта піша у сваем «Извѣщеніи», а з гэтага другога кабінета 1922 г. (глядзі «Крывіч» №1). Такою, калі ні большаю «праудаю» прамочаны і усе рэшта пункты «Извѣщенія». Разтлумачваць іх я не буду ужо хаця-бы таму, што гэтым займецца Ковенскі Міравы Суд, па просьбе асоб, якім закідваецца абвінавачываньне у падлозе дакумэнтау байкоту штрэйбрэхерау.

Вось да чаго давела благаславенная «культура на Літве». Ніштo сабе «здабыткі».

Паложым, усе гэта дзеля нас не ново. Мы ужо мелі нешчасьце быць сьветкамі нават таго, калі былы Беларускі Прэмьер старауся, праз літоускі

суд, зьняць беларускі сьцяг і выселіць Беларускую місію з таго будынку, у яком ен сам тры годы седзеу, да яшчэ пры тым большую частку безплатна.

Уся гэтая чорная і брудная праца «культурнікау» робіцца па загаду і пры падтрымцы саюзнікау Ластоускага — хрышчоных дэмакратау Літвы.

Што да апошніх, та па праявам іх былі гадасьці і раней аднак, такіх магільшчыкау, якімі сталі «культурнікі», хрышчоныя раней ні маглі знайсьці ні у асобе Боева, ні у асобе Семашкі.

Я думаю, што Вы досыць арыентаваны у палітыцы цяперашняго Літоускага Ураду і добра ведаеце што ковенскім чорнасоценцам, так жэ як і варшаускім, не прыемна беларускае адраджэньне і чым больш яно набірае сілы, тым больш яно іх страшыць. Яны яшчэ гатовы былі-б цярпець беларусоу як службовы падпарадкаваны ім элемент, а ні больш.

Стоячы на таком поглядзе, хрышчоныя стараліся і стараюцца разрушаць і руйнаваць усякую беларускую арганізаванасьць. Прышоўшы жэ да улады, яны зарас жэ астатэчна прыкончылі батальен, міністэрства і усе іншае, ім пад'уладнае і, павелі атаку на Беларускі Урад.

Маючы велікую апазыцыю і баючыся атказнасьці, хрышчоныя аднак не асьмеліваюцца адкрыта рваць Беларуска-Літоускі дагавор. За мейсца адкрытага разрыва дагавора яны хочуць знішчыць беларускую старану так, каб ні кога ні асталосе як на варце дагавору, так і на варце беларускіх інтэрэсау. Аднак і гэтую працу яны стараюцца вясьці замаскіравана і, што найгорш, беларускімі рукамі. Цяперака такімі рукамі у іх Ластоускі і Душэускі.

Вось Вам і увесь «культурны плян» на Літве, які досыць энэргічна выпауняюць Вашыя «культурнікі».

Чорная і брудная іх праца адчуваецця ні толькі у Коуні і Празе, але і у Вільні.

Трудна і, як кажуць цяпер, супраць доляра ні папрэш, аднак мы, не гледзячы на усе цяжкое наша становішчэ, думаем перці і далей, бо лепшага выхаду ні для гонару ні для справы ні бачым.

Бывайце здаровы

З вялікаю да Вас пашанаю В.Захарко

1 XI 24.

Прага.

582.1.04:086&r-087&r

[1] Дакумэнт №3631. [2] «Абух» — аднадзёнка, выйшла ў 1924 годзе ў Вільні.

3639. Тэлеграма сташыні Рады БНР Пятра Крэчэўскага (Прага) прэзыдэнту Латвійскай Рэспублікі Чакстэ (Рыга) за 18.11.1924

ТЭЛЕГРАМА

Рыга. Прэзыдэнту Чакстэ

Шчыра вітаю з вялікім днём незалежнасьці. Пераконаны, што беларускі працэс у Латышска-Беларускім жыцьці — сумнае непаразуменьне, выкліканае ворагамі беларускага адраджэньня.

Старшыня Рады

Беларускай Народнай Рэспублікі Крэчэускі

18.XI.24, Прага

582.2.11:010 — мк

3640. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Вальтэру Андэрсану (Дэрпт) за 6.12.1924

Вельмішаважаны Пане Прафэсару.

Не пісаў я так доўга да Вас бо усё лета і немаль аж дагэтуль быў за-граніцай ў Парыжы, Бэльгіі і Швайцарыі ў палітычных справах. Для азнаёмленьня з характарам маей працы загранічай пасылаю Вам брашуру і мэморьял які я падаў у Лігу Націй. Палажэньне нашага крыўскага народу такое цяжкое, што прыходзіцца хапацца ўсякіх спосабаў абароны.

Разам з гэтым лістом пасылаю карэктуру Вам для прагляду. Вельмі прашу лішне доўга не затрымаць, бо нашы ковенскія друкарні ня маюць шрыфтоў і будуць чакаць на корэктуру нічога далей ня робячы.

Праз свае паездкі затрымаў я выданьне «Крывіча», цяпер хачу, хоць у канцы году выдаць нумар[1].

Гэтымі днямі выйдзе з друку мой «Расійска-Крыўскі Слоўнік», над выданьнем якога я працаваў цэлы год. Экзэмпляр Слоўніка прышлю Вам Пане Прафэсару і буду вельмі ўдзячны калі захочаце выказаць свой пагляд на гэту маю працу.

582.1.48:249&r — рк

[1] Крывіч. №2(8). Красавік-сьнежань 1924.

1925

3641. Позва Вацлаву Ластоўскаму з запрашэньнем зьявіцца 2.01.1925 у камэру Міравога Судзьдзі (Laisves Al. 72) у якасьці абвінавачванага паводле арт. (5)33 крымінальнага кодэксу (справа №2419)

582.1.48:198

3642. Машынапісная нататка (інфармацыя для друку?)

В зале Мирового Судьи I-го участка слушалось дело белорусских общественных деятелей возникшее по следующему поводу.

В № 215 «Lietuva» Ластовский и Душевский довели до всеобщаго сведения, что группа, состоящая из Карабача, Цвикевича, Казячаго, Головинского, Вальковича и друг. распространяла порочащия честь Ластовского и Душевского инсинуации на основании подложного протокола.

Головинский подал в суд на Ластовского и Душевского, обвиняя их в клевете. Суд, разсмотрев и признав протокол действительно не правильным, обвиняемых Ластовского и Душевского оправдал.

582.1.48:248

3643. Ліст Міхайлы Лазінскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.01.1925 з паведамленьнем аб звальненьні яго з пасады прэзыдэнта Камітэту Паняволеных Народаў лістом прэзыдэнта Ўкраінскай Нацыянальнай Рады Д-ра Яўгена Петрушэвіча за 29.11.1924

582.1.48:254&r

3644. Паштоўка Вальтэра Андэрсана (Дэрпт) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.01.1925

Дерптъ, 8.1.25.
Lossi t. 15 k.7.

Многоуважаемый г-нъ Ластоўскі!

Съ глубокой благодарностью извѣщаю Васъ о полученіи оттисковъ и Вашего словаря. Послѣдній производитъ очень хорошее впечатлѣніе, и ему несомнѣнно суждено сыграть огромную роль въ дѣлѣ формированія бѣлорусскаго литературнаго языка. Пробѣловъ повидимому немного (не хватаетъ напр. глагола «трещать» = трашчэць).

Съ глубокимъ уваженіемъ
Вашъ В.Андерсонъ
582.1.48:250

3645. Паштоўка Францішка Чарняўскага (Рым) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.01.1925

[...] Słoŭnik trapiŭ ni tamu, kamu pasyłali. Šyški užo nimašaka u Rymi. Pa im zastalisa naśledniki troch Biełarusaŭ Ksiandzoŭ [...]
582.1.48:251

3646. Позва Вацлаву Ластоўскаму з запрашэньнем зьявіцца 12.01.1925 у камэру Міравога Судзьдзі (Laisves Al. 72) у якасьці абвінавачванага ў справе Гутаўскайте (справа №1964)
582.1.48:252

3647. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.01.1925

Вельмішаважаны Пане Вацлаве!

З прыкрасьцяй мушу Вашэці наказаць, што із Сразьнеўскім нічога ня выйшла. Да 9.I была бібліятэка «Земгору» зачынена, а як я пайшоў 10.I, дык даведаўся, што ён на якісь час ад'ехаўся і вернецца ў канцы месяца. Ён не зьяўляецца беспасярэднім загадчыкам, але толькі агульным, балей нагляднікам як загадчыкам. Думаю, што нічагусенькі ня будзе. Галубоўскага так сама няма, так сама як у іншым месцы няма і Сразьнеўскага. Наагул у Празе шмат якіх рускіх выданьняў нямаш.

Думаю аднак, што Вы шмат гэтым ня страціце, што ня будзеце маць Сразьнеўскага, хоць магчыма страціце ня маючы Галубоўскага. Для Вашэцінае працы сусім даволі Карскага.

Здаецца, што ў тым томе Карскага, які я Вашэці пазычыў, у прадмове ё некалькі словаў аб тым, што ў супрасльскай рукапісі і ў Тураўскім евангельлі сустракаецца месны склон множага ліку з канчаткам на -ох. Каліб гэта было так, дык гэтым самым было-б даведзена, што гэтыя кнігі зьяўляюцца памяткамі крывіцкае мовы.

З шчырым паважаньнем
Я.Станкевіч.
Ці дастаіцё віленскія газэты?
582.1.48:253

3648. Krynica. Nr.3. 18 Studnia 1925
[З артыкулам:] Ł.Mamonič. Pa biełarusku, ci pa polsku?
582.1.50:035&r

3649. Ліст дырэктара Архіва й Бібліятэкі Прэзыдэнта Чэхаславацкай Рэспублікі Томаша Масарыка (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 21.01.1925

Vážený pane,

pan president Československé republiky přijal s upřímným zájmem Váš rusko-běloruský slovník, který jste mu laskavě zaslal a zařadil jej do své soukromé knihovny.

Jeho jménem vyslovuji za Vaši milou pozornost díky

582.1.48:256
582.1.48:255 — канвэрт

3650. Ліст Андрэя Бароўскага (Бэрлін) Кляўдыю Душэўскаму (Коўна) за 23.01.1925

Пишу Вам, дорогой Клавдій Степанович, в один из самых критических моментов нашего прозябанія. Работы все нѣт. Вездѣ, гдѣ можно было занять занято и частью под звѣрскіе проценты. И к довершенію удовольствія адскія ревматическія боли не позволяют ни двигаться, ни что либо дѣлать. Из письма к В<ацлаву> Ю<стинови>чу узнаете подробности моих неотложных нужд. Цвикевич до сих пор не удосужился мнѣ возвратить мнѣ ниодной марки. Между тѣм, говорят, он открыл в Ковно книжный магазин. Из Праги тоже не имѣю никаких вѣстей. К сожалѣнію и от Вас ни слова. Получили ли Вы в свое время карты? Я послал их заказным. Напишите же хоть что нибудь. Неужели у Вас так много работы что нѣт времени чиркнуть даже коротенькую открытку. А вѣдь и в самой коротенькой открыткѣ можно сообщить так много важнаго и интересующаго меня. Напр., не увидимся ли мы в ближайшем будущем и т.д. Ну словом, что же Вас учить: сами грамотный, понимаете, как и что написать. Было бы желаніе.

К Вам обращаюсь с той же просьбой, что и к В<ацлаву> Ю<стинови>чу: выручить меня по товарищески из невозможнаго положенія. Может быть соединенными усиліями Вам удалось бы устроить для меня заем марок в пятьсот, чтобы я мог расплатиться со всѣ[ми] мелкими долгами и хоть навремя вздохнуть посвободнѣе. Но во всяком случаѣ помогите мнѣ и как можно скорѣе.

Ваша сестра была больна. Тоже сѣтует на Ваше молчаніе. Она в ближайшее время переѣзжает в домой, на родину. Обѣщала перед отъѣздом зайти.

Посылаю оба письма по Вашему адресу, чтобы не попали в ненадлежащія руки и из экономіи в одном конвертѣ.

Ну вот пока и все. Не заставьте долго ждать отвѣта. Повѣрьте, что только крайняя нужда вынудила меня обратиться к Вам с просьбой о поддержкѣ.

Жена и я шлем привѣт Вашей супругѣ и Вам. Всего Вам лучшаго. Жму руку.

23 Января 1925 г. Ваш АБоровскій

582.1.48:218

3651. Ліст Андрэя Бароўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.01.1925

Глубокоуважаемый
Вацлав Юстинович!

Прежде всего, очень Вам признателен за присылку словаря. И сам словарь, и факт памяти весьма меня порадовали. К сожаленію больше никаких вѣстей ни от Вас, ни от Клавдія Степановича не получал. Между тѣм в связи с нашим разговором, дальнѣйшая неизвѣстность нервирует меня ужасно.

Мое матерьяльное положеніе за это время значительно ухудшилось. В настоящій момент оно стало совсѣм катастрофично. Если есть у Вас возможность хоть сколько нибудь меня поддержать, сдѣлайте это Бога ради, не откладывая ниодного дня. Может быть мнѣ удастся к первому апрѣля освободиться от обременительнаго контракта на помѣщеніе миссіи без потери всего моего имущества, тогда станет немного легче, да и работу обещали мнѣ в недалеком будущем. Словом как будтобы мерещется улучшеніе. Но вѣдь горизонтов и самых радужных рукой не достанешь. А доставать надо сію же минуту, ибо срок за квартиру был перваго, а сегодня — 23. Телефон, газ, налоги и т.д. тоже не желают ждать. Живем под постоянной угрозой судебнаго пристава. Это, конечно, самочувствія не улучшает.

Хуже всего однако это то, что я вот уже вторую недѣлю не могу ходить и плохо владѣю руками. Тычу вот одним пальцем на машинкѣ, но и это минутами причиняет невыносимыя боли, так что приходится бросать. Ревматизм и ишіас замучили меня до потери самообладанія.

Напишите пожалуйсто хоть пару слов о ближайших перспективах и не откажите помочь в мѣру Ваших сил. Когда нибудь сочтемся. Вѣрю, что настанет такое время.

От души желаю Вам всего лучшаго. Жму Вашу руку и остаюсь искренно преданный Вам

23 января 1925. Ваш АБоровскій

582.1.48:219

3652. Дакладная запіска былога камандзера літоўска-беларускіх партызанаў старшага лейтэнанта Вячаслава Хмары-Разумовіча паўнамоцнаму прадстаўніку Літоўскага Ўраду ў Нямеччыне (Бэрлін) за 24.01.1925

Полномочному Министру Литовскаго Правительства в Германіи

Бывшаго Командира литовско-бѣлорусских партизан, ст. лейт. Хмары-Разумовича.

Докладная записка.

В 1920 г. на основаніи порученія «Союза селян бѣлоруссов на Литвѣ» я прибыл в г. Ковно и представил проэкт организаціи партизан в цѣлях борьбы против польской оккупаціи Виленской и Гродненской губ. Означенный проэкт Центральным Управленіем Союза Литовских Стрѣлков был принят и 3-го сентября т.г. мнѣ было выдано соотвѣтствующее полномочіе, которое было утверждено Нач. Генер. Штаба генералом Клещинским и впослѣдствіи еще раз подтверждено нач. Генер. Штаба генералом Катхэ.

Быстрый подступ войск польскаго генерала Желиговскаго и эвакуація г. Вильно навремя измѣнили план развитія дѣятельности партизан. Набранные люди для связи и иных функцій штаба партизан были переданы в вѣденіе полк. Успенскаго ввиду того, что ему было поручено начать формированіе Бѣлорусскаго Стрѣлковаго Батальона. Лично я, как литовскій гражданин, был мобилизован и опредѣлен на должность адьютанта в формируемый батальон. Не смотря на это, установленная ранее связь с оккупаціей прервана не была и на основаніи инструкцій, даваемых через Центр. Управ. Союза Лит. Стрѣлков организація и дѣятельность партизан в оккупаціи развивалась.

По сформированіи Бѣлор. Отдѣльнаго Батальона в мартѣ 1921 г. он был отправлен на фронт и занял участок от Меркине до Капчамисте. Штаб батальона стал в мѣст. Сереях. Благодаря этому обстоятельству создалась обстановка болѣе благопріятная для непосредственных сношеній с оккупаціей. Перед св. Пасхой из Ковно прибыл предс. Союза Литовских Стрѣлк[ов] г. Путвинскій со своим помощн. г. Михалкевичем на совѣщан[іе] со мною и вызванными к этому времени из Гродно начальн[и]ком отдѣла г. Яковюком и его замѣстителем г. Меленкевиче[м] (оба теперь находятся в Ковно). Совѣщаніе состоялось у [ме]ня на квартирѣ и затянулось до 3-4 ч. утра. Затѣм гг. Яко[вюк] и Меленкевич были отвезены на автомобилѣ к границѣ, а г[г.] Путвинскій и Михалкевич на том же автомобилѣ уѣхали об[рат]но в г. Ковно.

Еще до этого совѣщанія в Сереях произошли слѣдующія событі[я,] которыя послужили в дальнѣйшем причиной для цѣлаго ряд[а] провокаціонных донесеній на меня лично настоятелем сер[ей]скаго прихода, кунигасом Граевским, агентом олитской кон[тр-]развѣдки Ярмошуком, ея начальником Лазаревым и др. лицами.

1) Из оккупаціи поступило ко мнѣ сообщеніе, что нѣ[кто] Пузырев направился к литовской границѣ с цѣлью увидѣть протоіерея Корчинскаго (его он знал до войны) и заручит[ься] рекомендаціями для проникновенія, как в литовскія, так и [в] бѣлорусскія организаціи в цѣлях освѣдомленія поляков. В[ви]ду нерешительности к<оманди>ра батальона, я Пузырева арестовал [и] отправил через два дня в олитскую контр-развѣдку. В то [вре]мя когда Пузырев слѣдовал под конвоем в Олиту, поступ[ила] телефонограмма от г. Лазарева передать ему Пузырева. По[...] слѣдствіи Пузырев был осужден армейским судом, аппелиро[вал,] оправдан был верховным трибуналом, вернулся в Польшу и [вы]ступал в качествѣ

обвинителя литовско-бѣлорусских партизан. кои были судимы в Бѣлостокском Окружном Судѣ в апрѣ[ле-] маѣ мѣсяцах 1922 и осуждены на разные сроки в каторжн[ые] работы.

2) Получив через партизан связи свѣдѣнія, лично задержа[л ?] пудов сахарной контрабанды. Узнав об этом кунигас Граe[вскій] обратился к к<оманди>ру батальона с требованіем сахар освобо[дить,] т.к. ему мол извѣстно, что этот сахар был вскладчину ку[плен] крестьянами нейтральной зоны. Какой же был конфуз куни[гаса] Граевскаго, когда из составленнаго протокола в это вре[мя] выяснилось — подводчики сознались в провозѣ контрабанды из м. Серей, а на предложеніе сообщить, кому принадлежит, категорически отказались...

Эти два первоисточника послужили причиной провокаціи гг. Лазарева, Граевскаго и др. лиц. Немедленно послѣ этого случая кунигас Граевскій ложно донес в Ковно, что солдаты бѣлоруссы разоряют и глумятся над католическими гробницами. Послѣдовал запрос из Военнаго Министерства. Произведенным дознаніем была установлена ложь кунигаса Граевскаго и послѣдній, убоясь непріятных послѣдствій, явился с извиненіями к к<оманди>ру батальона. Не смотря на это было рѣшено лично доложить весь матеріал вице-министру Билло, послѣ чего дѣло это попало «под сукно». Озлобленный неудачами, что его, Кунигаса Граевскаго, просьбы об отводѣ с фронта Бѣлорусскаго батальона не удовлетворяются, кунигас Граевскій по соглашенію с другими лицами рѣшился на крупную провокацію, послѣдствіем коей Бѣлорусскій Отд. Батальон был уведен с фронта в Олиту, здѣсь обезоружен, а я при слѣдованіи эшелона на станціи Ковно, ночью, был арестован с женой и оба подвергнуты весьма тщательному обыску; затѣм я был отправлен в каторжную тюрьму, гдѣ впервые познакомился с своим будущим начальником г. Микуцким.

Защищая честь мундира от грубаго обращенія администраціи тюрьмы, я был подвергнут насилію, когда меня тащили в карцер и лишь случайный приход офицера контр-развѣдки за мной, прекратил дальнѣйшую безобразную сцену. На слѣдствіи я категорически отказался слѣдовать в тюрьму и был переведен на гауптвахту лишь к вечеру другого дня ареста, будучи лишен в продолженіе 48 часов пищи...

Через 10 дней общаго ареста, за недостатком улик, что я был якобы намѣрен увести батальон в Польшу, меня освободили из под ареста и вслѣдствіе тяжелой болѣзни жены, на почвѣ нервнаго разстройства, получил заграничный отпуск для сопровожденія ея в санаторію.

По возвращеніи из за-границы меня вызвал г. Путвинскій и предложил перейти на службу в Союз Литовс. Стрѣлк[ов.] На основаніи приказа по Арміи от 1 октября 1921 г. я бы[л] прикомандирован к означенному союзу, а 15 октября выѣха[л] в м. Меречь для формированія штаба партизан и непосредственнаго руководства организаціей в оккупированной обла[сти.] Из имеющихся в моем распоряженіи документов видно, что [с] 3 сентября 1920 г. по день расформированія моей группы всего израсходовано было 2400 долларов при наличіи орг[а]низованных мною 9 отдѣлов, 36 районов и нѣскольких деся[т]ков боевых сотень и отрядов, и

кромѣ того была штабная [ко]манда в составѣ 160 человѣк для связи, террора, пропаган[ды] и др. обязанностей. Насколько серьезно была создана орга[ни]зація партизан, говорят за себя сами факты: провал выбор[ов] в Виленскій Сейм «Сродковой Литвы», сбор матеріалов и м[е]морандумов для отсылки в Лигу Націй, экономическій и политическій террор, свѣдѣнія для штаба литовской арміи, (ста[тис]тика — 2300 случаев и по пол[ь]ской оффиціальной статистикѣ[),] уничтоженіе громадных запасов строевог[о] лѣса в Бѣловежс[кой] Пущѣ англійско-польскаго акц. общества и цѣлый ряд стат[ей] в польской же прессѣ о признаніи силы и значенія растущей организаціи.

Я не говорю уже о тѣх жертвах людьми, которые отда[ли] свою жизнь за идею и любовь к родинѣ. Касаясь себя личн[о,] укажу на два случая: 1) когда я был арестован в апрѣлѣ м[-цѣ] 1923 г., то через мѣсяц из оккупаціи прибыла делегація [с] адресом, копію коего прилагаю. 2) Это характеристика меня послѣ ревизіи б. верховн. воен. инстр. майором Заскевичем [и] показаніе н<ачальни>ка Союза Лит. Стрѣлков капитана Климайтиса [в] камерѣ военнаго слѣд. по особо важным дѣлам полковника [(ны]нѣ генерала) Энглера; показаніе гласит почти буквально: [Ра]зумович — плохой[1] организатор, ревизіей растрат не обнаруж[ено,] оставляем был в должности командира группы, т.к. пользов[ался] популярностью в оккупаціи!?»... Кромѣ того обо мнѣ могу[т] дать характеристику: гг. Путвинскій, Михалкевич, проф. Крев[е-]Мицкевич, протоіерей Корчинскій, кунигас Бакшиц (из Мерки[не)] и вообще люди не заинтересованные, чтобы меня скомпрометировать, подобно гг. Микуцкому, Лазареву, Граевскому, Барановскому и т.д.

Послѣ присылки польской ноты с требованіем остановить мою дѣятельность и назначенія «главковерхом» всѣх групп г. Микуцкаго-Зауниса, я понял всю ненормальность создавшейся обстановки для меня лично.

В началѣ 1923 г. я предложил предс. Союза Лит. Стр. проф. Креве-Мицкевичу образованіе Центр. Рады Союза Бѣлор. Стрѣлков. С своей стороны бѣлорусскіе дѣятели предложили заключить соотвѣтствующій договор с украинскими организаціями. В мартѣ состоялся съѣзд от всех групп и образовалась Центр. Рада Бѣлор. Стрѣлков. В силу заключеннаго в Берлинѣ договора Бѣлорусскому Союзу на организаціонные цѣли была ассигнована солидная сумма — 30.000 долларов в год. Я лично попал в состав рады, оставлен был в прежней должности и отправился на фронт. В апрѣлѣ мѣсяцѣ я пріѣхал в Ковно за полученіем «авансов» для группы за январь, февраль, март и апрѣль мѣсяцы но был арестован и отправлен на шестой форт.

Мнѣ были предъявлены обвиненія: 1) в противодѣйствіи развитію Литовскаго Государства, 2) ограбленіях мирных граждан, 3) превышеніи власти, 4) растратѣ казенных денег и т.д.

По всѣм этим обвиненіям я в свое время дал надлежащее показаніе и просил о преданіи меня суду, а затѣм был в маѣ мѣсяцѣ освобожден из под ареста и, как это ни странно, вновь командирован в штаб на ликвидацію группы.

При этом считаю обязательным подчеркнуть, что меня буквально промучили 8 мѣсяцев, провѣряя каждый клочек бумажки, в то время как напр. счета командира 6-ой группы были приняты без оправдательных расписок (группа, которая ничего не дѣлала, имѣла по списку 240 стрѣлков и в вѣдомости на жалованье не оказалось ни одной расписки?!), и много иных было злоупотребленій, ярким примѣром чему служит покупка собственных автомобилей г. Заунисом, командиром 2 группы и т.д. По освобожденіи из под ареста узнал, что г. Цвикевич и старш. Рады Бѣлор. Стр. Карабач были пригл[ашены] кап. Климайтисом в Шаулю Саюнгу и там объявили им, что [если] не будет возвращен договор, подписанный в Берлинѣ, то их арестуют и вышлют в Польшу. Документ был возвращен, но копію успѣли снять и засвидѣтельствовать. Затѣм произошел арест всѣх партизан бѣлоруссов и отправка их к польской границѣ. Послѣ усиленных просьб этот жестокій приказ бы[л] отмѣнен, и люди избѣгли вѣрнаго разстрѣла в Польшѣ.

12-15 мая прибыло из Мос[к]вы уполномоченное лицо ко мнѣ лично (свиданія происходили у Мицкуна на квартирѣ торг. предст. у г. Журко) с предложеніем перейти к ним на службу и передать им людей команды. С послѣдним я согласился. Были составлены списки, куда я включил и гг. Кара[ба]ча и Козячаго. Всѣ люди команды прошли до Минска поход[ным] порядком, кромѣ Карабача, Козячаго и нѣсколькихъ начальн[иков] районов. Так закончилось расформированіе 4-ой группы п[ар]тизан на Литовской территоріи.

Я был уволен со службы фактически в мартѣ мѣсяцѣ (Atsargos Liudymas №274), а приказом по Шаула Саюнгѣ про[ве]ден с 1-го января 1924 г., — это с тѣм, чтобы лишить меня [жа]лованья за три мѣсяца.

Кромѣ того с меня было удержано жалованье за ок[тябрь,] ноябрь и декабрь мѣсяцы на том лишь основаніи, что по[ка я] был под арестом, многіе партизаны, избѣгая ареста и от[прав]ки в лагерь, бѣжали из штаба и унесли обмундированіе. [Я ос]тался без всяких средств. Жена жила под лѣстницей в ка[мор]кѣ сторожа лѣсного департамента, а я пользовался безп[лат]но квартирой Бѣлор. Ми<нистерст>ва. Пришлось дѣлать долги, чтобы [пи]таться с семьей. В апрѣлѣ 1924 г. были получены докуме[нты] из Москвы для ликвидаціи недвижимого имущества жены м[оей] в Гродно. Для покупки закладных листов Виленскаго Поз[емельнаго?] Банка и уплаты мелких долгов потребовалось 550 долла[ров]. Деньги были получены в Кооперативном Банкѣ под поруч[итель]ство кап. Климайтиса и г. Дауздварда. Получив разрѣшені[е на] выѣзд за-границу от кап. Климайтиса и прокуратуры (за мной числится дѣло о превышеніи власти), я выѣхал в Ме[мель] для поѣздки в Данциг, куда должен был пріѣхать из Гродно покупатель дома. Так как мнѣ в визѣ было отказано, то я лично обратился к г. губерн. Будрису и послѣдній любезно согласился запросить по телеграфу министерство. Отвѣт послѣдовал неожиданный: «Разумовичу выдать визу без права возвращенія в Литву».

Я телеграфировал кап. Климайтису и отвѣта не получил. Сочтя это за недоразумѣніе и имѣя крайнюю нужду в деньгах, я рѣшил ѣхать с тѣм,

что недоразумѣніе выяснится. Должен замѣтить, что когда я просил визу, то в этот же день визу получил нѣкій Владимир Галин, который оказался моим попутчиком и чичероне, — я не знаю нѣмецкаго языка. Этого г. Галина я еще раньше встрѣчал под видом торговаго агента, корреспондента газеты «Эхо», в редакццо названной газеты, Бѣлор. Мин-вѣ и познакомился с ним лично при слѣдующих обстоятельствах. Правительству нужен был спирт. Я рѣшил попытать счастья в торговлѣ и отправился в Мемель. Здѣсь случайно познакомился с г. Галиным у г. Иваненко. Г. Галин рекомендовал фирму «Vereinigte Spirit u. Brauhaus». Правительственный подряд я получил с торгов, но к сожалѣнію в день подписанія договора г. директор Іоделис уѣхал неожиданно в командировку, а замѣститель отказался выставить условленный с г. Мин. Финансов аккредитив, каковой выставил и я в лицѣ Кооперативнаго Банка. Подряд был сорван и правительство понесло впослѣдствіи громадные убытки, т.к. по договору с фирмой «Браугаус» я мог доставить спирт (фирма выставила аккредитив мнѣ на Эмиссіонный Банк) по 20 голланд. гульден. за гектолитр с гарантіей за отсутствіе метила. Я позволяю себѣ нѣсколько подробнѣе остановиться на этом подрядѣ, т.к. послѣ этой исторіи меня в литовских газетах обрисовали авантюристом, а высокоуважаемому г. директору Іоделису эта исторія стоила жизни.

Итак я 10 мая 1924 г. прибыл с г. Галиным в вольный город Данциг. Г. Галин попросил меня обождать на бульварѣ, а сам вошел в подъѣзд большого дома, сказав, что через полчаса придет. Прошло болѣе 2-х часов а Галин не являлся. Не зная города, я рѣшил разыскивать Галина и отправился к подъѣзду, гдѣ увидѣл вывѣску: «Польскій Комиссаріат». Тог[да] я вернулся на бульвар, рѣшив ждать Галина. Еще через час он ~~вернулся~~ пришел и на мои замѣчанія сказал, что задержался с разными разсчетами по полученію денег за газетн[ые] объявленія. Должен замѣтить, что покупатель, благодаря мо[ей] задержкѣ в Клайпедѣ, уѣхал из Цопота, гдѣ он ждал меня у своих родных. Галин предложил услуги посредника и разыг[рав] роль «друга» уѣхал якобы без визы в Гродно. Через недѣлю я вдруг получил письмо из Вильны, что у него не хватило денег на обратный проѣзд, а посему он пѣшком идет прямо [в] Ковно. Я написал сам в Гродно, но мой купец отлазался от сдѣлки и прислал отвѣт 2 іюня. 4 іюня ко мнѣ явился нѣкій Олейничаковскій в качествѣ купца, а затѣм заявил, что он офицер польскаго генеральнаго штаба и предложил мнѣ пе[рей]ти к ним на службу. Я категорически отказался. Намекнул [о] репрессіях. Тот же результат. Пригласил в ресторан пообѣдать, я тоже отказался и в свою очередь предложил обѣд у себя в номерѣ. Так шли переговоры в теченіи 10-12 дней [и?] я не выходил из пансіона. Наконец договорились, что я бу[ду] посредничать для польско-бѣлорусскаго соглашенія. По от[ъѣз]дѣ г. Олейничаковскаго через 3-4 дня пріѣзжал офицер З[а?]вильковскій. Затѣм был офицер Ягас, редактор газеты: «Вызволенье», г. Соколовскій и так почти безпрерывно меня пос[ѣща]ли сіи господа пока не явился опять г. Галин. Поняв роль послѣдняго, я сообщил о ходѣ переговоров кап. Климайтису, прося дать инструкціи и

указанія, а также прислать обр[ат]ную визу для пріѣзда с личным докладом. Кап. Климайтис о[твѣ]тил: до тѣх пор пока я не уплачу банку денег, он со мно[ю не] желает имѣть дѣла и считает мое сообщеніе вымыслом. Ме[жду] тѣм из Гродно перестали отвѣчать на мои письма и прод[ажа] дома остановилась. Пришлось занять денег у Галина, т.к. [я] никого здѣсь не знал. Вскорѣ послѣ послѣ обмѣна письмами [и] телеграммами с поляками было мною получено конкретное [пред]ложеніе подготовить почву в Прагѣ и выехать туда на к[он]ференцію. Я опять написал кап. Климайтису, описал роль Г[али]на, посовѣтовал слѣдить за ним и поличным соображеніям послал письмо это через г. Боева, прося его копію сообщить члену Сейма Францу Ив. Радзевич. Письмо это осталось без отвѣта. Дом был наконец продан за бесцѣнок, и я 3 сентября уѣхал в Прагу, гдѣ застал нѣкоторых бѣлоруссов из Вильно. Конференція в результатѣ не состоялась, т.к. правительство Б.Н.Р. поторопилось послать в Женеву телеграму с протестом о претензіях Литовскаго Правительства на чисто бѣлорусск. земли и незаконное участіе на конференціи г. Ластовскаго. Поляки конечно это использовали так, что конференція стала совершенно ненужной в Прагѣ.

Бѣлорусскіе «дипломаты» в свое оправданіе нашли одно сказать, что я их «здрадзіу» .... но всю переписку от поляков всетаки забрали.

Затѣм Бѣлорусское Правительство послало в декабрѣ мѣсяцѣ Литовскому «ультиматум» с трехнедѣльным сроком для отвѣта, а мнѣ был дан приказ заготовить всѣ матеріалы, подтверждающіе факты посылки с литовской территоріи вооруженных людей в оккупацію, составить счет личных и по организаціи партизан убытков, т.е. что причиталось и не доплачено, включая сюда и 30000 долларов на основаніи договора в Берлинѣ и затѣм в Ковно.

Документальныя данныя о том, что я получал пр[и]казы с вѣдома Воен. Министерства имѣются и могут быть возвращены через мое посредство, т.к. я до сих пор уклоняюсь от составленія подробной докладной записки на имя правительства Б.Н.Р. в Прагѣ.

Лично имѣя документ, что я служил добровольцем и был офицером Литовс. Арміи, каковое дает право на земельный надѣл лицам, безпорочно и на пользу Литовс. Государству служившим, прошу удовлетворить в размѣрѣ той суммы, каковая опредѣляется земельным надѣлом для офицеров добровольцев.

С своей стороны обязуюсь всѣ денежныя обязательства в г. Ковно уплатить.

Прошу неш счесть моей просьбы за политическій шантаж, т.к. имѣю всѣ юридическія и моральныя права на удовлет[во]реніе моей просьбы, в силу выше всего изложеннаго, что [аб]солютно вѣрно и может быть провѣрено в Ковно.

Б. офицер Литовской Арміи
Старшій лейтенант В.Разумович.

Гор. Берлин.
Января 24 дня 1925 года.

Копія.

Командиру 4-ой группы
Вячеславу Хмара-Радзевичу[2]

Мы, ніжэй подписаные, районные начальники і стралкі[,] прымаючы пад увагу Вашу безкарыстную цяжкую службу, Ва[шу] гатоунасьць, засведчаную многімі прыкладамі, зауседы і ус[юды] ахвіарна ісьці з намі за ідэю нашаго вызваленья з пад польска-панскаго ярма, з другога боку, відзячы Вашы стро[га] бацькоускія, безстаронныя, правідловыя да усіх стралкоу (без розніцы нацый) роуныя адносіны, Вашу заботлівасьць [аб] палепшеньні нашаго лесу, Вашу чэстнасьць, лічым сваім нр[ав]ственным абавязкам пры разьвітаньні сказаць Вам апошня[е] шчырае, прыязнае, беларускае ад усяго сэрца — «дзякуй».

Просім Вас прыняць выразы нашага пачуцьця, удзячна[сь]ці, як дань глубокага паважаньня і пашаны.

Слѣдуют от разных уѣздов и волостей Гродненской и Виленской губерніи более 60 подписей на бѣлорусском, ли[тов]ском и еврейском языках.

582.1.48:257&r-261&r — мк

Падрабязьней гэтыя ды іншыя прыгоды В.Разумовіча апісаныя ў дакумэнтальна-біяграфічнай трылёгіі: Razumovič-Chmara V. Grimasy světové války. Č.I. Šalebný svět. Praha, 1930 (другое выданьне — Brno, 1938); Č.II. Bez masky. Brno, 1935; Č.III. Kují se okovy. Brno, 1936-1937. [1] Відаць, памылкова замест неплохой. [2] Памылкова замест Разумовічу.

3653. Позва Вацлаву Ластоўскаму з запрашэньнем зьявіцца 28.01.1925 у камэру Міравога Судзьдзі (Laisves Al. 72) у якасьці абвінавачванага паводле артыкулу 507 крымінальнага кодэксу (справа №2561)

582.1.48:262

3654. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ігнасу Янінасу (Коўна) за 29.01.1925

Вельмішаважаны Пане Іонінас.

Ваш ліст з высловам згоды на закупку паперы для друкарні на скарбовы кошт атрымаў. Пункт аб адлічаньні з кождага рахунку ~~кошту~~ вартасьці паперы дасьць друкар асобным лістом.

Але перад здачай кнігі у друк я прасіў-бы Вас акрэсьліць мой аўтарскі ганарар за кнігу. Я хацеў-бы каб мая праца была цэнена згодна устаноўленаму тарыфу для літоўскіх навуковых кніг г.зн. 20% аўторскіх з прадажнай цаны, паводле комэрційнай разцэнкі.

Акром таго прасіў-бы даць мне ў помач двох карэктароў: Борысовіча і Матача, якія, саўсім слушна, просяць назначыць ім даплату за гэту працу якая займе ім іх свабодны вячорны час. Я думаю ~~слушна~~ даволі было-бы дадаць за корэктуру кождаму з іх месячна па 100 літаў.

Ці ў бегучым 1925 году я магу разлічаць на субсыдзію для далейшага выдаваньня «Крывіча»? На выпадак калі ў гэтым году ня спынена субсыдзія, то прасіўъбы, дзеля таго што кошт друку ў гэтым году ~~падарожаў~~ падняўся на 20%, падвысіць субсыдзію да 5.000 літаў на нумар ў 120 балонак.

Затым прыміце запэўненьне праўдзівай ~~да Вас~~ пашаны.
В.Ласт...
29.I.25.
582.1.48:226&r

3655. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) невядомаму адрасату (?) за 29.01.1925

Вельмішаважаны Пане!

Ці атрымалі Вы мой слоўнік, які я ўжо даволі даўно Вам выслаў? калі атрымалі, то ці не знайдзеце магчымым памесьціць у украінскай прэсе рэцэнзію аб ім, або хоць заменку.

Вы разумееце ў якой цяжкой атмосфэры прыходзіцца мне працаваць і аб'ектыўны пастаронны суд ў такіх здарэньнях падтрымлівае сілы.

Затым прыміце шчырае запэўненьне ў глыбокай да Вас пашане.
В.Ластоўскі.
29.I.25.

Мой адрэс:
Lietuva, Kaunas
red. «Krywič»
Vytaŭto prosp. №30.

582.1.48:263

3656. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.01.1925

Вельмішаважаны Пане Вацлаве!

Дзякую Вашэці за прысланы слоўнік (адзін экз. мне, адзін Галубянцы), 14 экз. «Крывіча»[1] і ліст. З Вашэцінага ліста можна зразумець, што Ваша паслаў мне некалькі слоўнікаў дзеля перасланьня ў Край, але я апрача аднаго экз. сабе і аднаго Галубянцы іншых не дастаў. З 14 экз. «Крывіча» часьць паслаў знаёмым у Бацькаўшчыну а 6 экз. пакінуў, бо ня ведаю, ці маю я паслаць так сама ў бел. рэдакцыі і пад.

Ніхто ня ведае, што Ваша пакінуў мне грошы; так сама ніхто ня ведае, што Клімовіч дастаў падмогу. Каб хоць крыху ведалі, дык я спачыўся-б вельмі добра. Калі-ж пасылаюць Вашэці лісты із просьбаю грошаў, дык пеўне таму, што ўсе ведаюць аб прысланай Вамі падмозе ў 50 дал. Сокалу, ну і некалькі чалавек ведае ад падмозе Сял. Саюзу (250 літ). Могуць некаторыя ўгадаваць, што дастаў падмогу Клімовіч, але толькі ўгадаваць. Было-б вельмі добра, каб Ваша адпісаў Ермачэнку, напісаўшы чаму ня можаце яму памагчы. Ён ведаеце будзе злаваць не таму, што ня прыслалі, а таму, што не адказалі.

2) «Slavie» гэта ё навуковае выданьне (вялікі журнал, выходзіць чатыры разы ў год) славянскага аддзелу філёзофічнага факультэту ў Празе. Яго рэдактар, проф. Гуер запрапанаваў мне напісаць рэцэнзію аб філёлёгічнай часьці «Крывіча» з 1923 г. Гэта я ўжо напісаў і аддаў яму. Калі дзеля мноства матар'ялу ня зможа быць надрукаваны ў гэтым №, які ўжо ў друкарні ды будзе надрукаваны ў № другім. Да другога-ж № (выйдзе ў красавіку) гатую й рэцэнзію Вашэцінага слоўніка. У гутарцы рэд.

Гуер сказаў мне, што «Крывіч» прыходзіць на менку, дзеля гэтага я й думаў, што дастаіцё «Slavie».

3) Хочаце напісаць Вашэці прыватна думкі аб Вашэціным слоўніку. Дык вось пішу, што думаю. Слоўнік не навуковы, гэта Ваша сам кажаш у прадмове, але ён і непрактычны, бо ня можна ім радзіць практычна карыстацца, бо ў ім шмат і шмат абмылаў. Дык як жа можа не адумысловец разабрацца, дзе дарагое а дзе звычайнае каменьне. І гэта яшчэ нічога, што ён непрактычны, гарэй за ўсё, што ў ім не навукова забраны матар'ял да слоўніка навуковага а тым самым і практычнага. Я дзіўлюся з вялізарнага слоўнага багацьця, якое Ваша забраў і туды ўлажыў, але ж гэтае добрае ад благога адрозьніць можа толькі адумысловец-філёлёг і то пры цяжкай працы. Як шкада, што не пастаўлена адкуль узядзены словы або дзе запісаны. Каротка трэ сказаць слоўнік не навуковы й непрактычны, але дае гэтулькі багацьця бел. крыв. мовы, што зьяўляецца важным жаралом для філёлёгаў, для бел. культуры патрэбны карысны; па меры павелічэньня лічбы крывіцкіх філёлёгаў, будзе мець вялікае значэньне. Шкода, што ня выданы інакш, але трэба дзякаваць, што наагул выданы.

4) У рэзалюцыі Крывіцкага Сялянскага Саюзу ў справе «Камітэту Паняволеных Польшчай народаў» кажацца: «група людзёў ..... каторая прысабечыла назоў «Беларускага Ураду» і каторая, апрача таго завецца «Беларуская Рада ў Празе» («Крывіч» №8, 91). Я думаў, што ведаеце аб ёй. Як яны пераяжджалі ў Прагу, дык чэскі ўрад ім заявіў, што недазволіць ім жыць у Празе як «ураду», але толькі як эмігрантам. Дзеля гэтага каб мець якуюсь арганізацыю, на якую можна было-б даставаць грошы ад чэхаў, яны падалі на зацьверджаньне статут «Беларускае Рады ў Празе» як арганізацыі культурнай. Посьле зацьверджаньня статуту яны ўсе ўвыйшлі ў гэнаю раду і апрача сябе нікога ня пусьцілі, навет якія й хацелі ўвыйсьці (Грыб, Мамонька). Гэтак было да верасьня 1924 г. У гэтым месяцы (верасьні) пасьля рэзалюцыі Сялянскага Саюзу, калі яны пачуліся ў небясьпечнасьці, то прынялі крыху спагадна да іх настроеных студэнтаў (Жылка, Грышкевіч) і нат увялі аднаго ў Прэзыдыум і аднаго ў рэвіз. камісію. Апрача гэтых двух студэнтаў, усе іншыя сябры прэзыдыуму й рэв. камісіі складаюцца з іх самых. Яны ўсе належаць да гэтае «Рады». Фактычна «Рада» і «ўрад» тое самае.

5) З Бадуновай блага. Яна хворая псыхічна, праўда ў лёгкай форме. Была 2 тыдні ў вар'яцкім доме. Цяпер здаецца ёй ляпей, аднак нэрвы надта напяты. Калі будзе ёй пісаць, аб гэтым не спамінайце ёй, бо ўсялякае асаблівае зварочаваньне на яе ўвагі ёй шкодзіць.

6) Перасланы ліст Раку адаслаў і прыпісаў, што казалі.

7) Што да ініцыятывы, дык мне здаецца так, што калі яны вінны (а гэта-ж пеўна так) і шкодзяць крывіцкай справе (і гэта пеўня так сама так) і вы проці іх выступіце адкрыта, проста й будзеце віноць іх гэтулькі, на колькі яны вінны, дык усё будзе ў парадку і Вы гэтым споўніце сваю павіннасьць. Мне здаецца, што гэта было-б добра тым, што разьясьнілася-б усім справа і ачысьцілася-б паветра. Гэткае маўчаньне, якое было дагэтуль, балей дэмаралізуе грамадзянства, як усялякія галасьлівыя справы.

8) Радзіў-бы Вашэці, калі ня можаце супачыць тры месяцы, дык хоць месяц. Праз сілу нічога ня зробіце.

9) «Крывіч» вельмі ўсім падабаецца.

10) Пры здарэньні калі ласка даведайцеся, якая ё літоўская драма, якую варта было перакласьці на крывіцкую мову. Важна каб яна ня была абмежана літоўскай, але мела значэньне агульналюдзкое а тым самым была-б карысна і ў нашай літэратуры. Тут ё дзяцюкі, што ўмеюць па-крывіцку й літоўску й маюць ахвоту перакласьці.

11) Калі-б у Вашэці пыталіся з Прагі, ці дастаю я гонорар за свае стацьці ў «Крывічы», дык не кажэце, што дастаю, бо мне гэтулькі не далі-б з Камітэту, праз які дастаём падмогу.

12) Колькі мне належыца гонорару за стацьці ў №8 (апошнім) «Крывіча»?

13) Гэта мне ведаць ня так сьпешна, але вельмі сьпешна патрабую ведаць, колькі належыцца гонорару за надрукаваньня некалькі бачынаў транскрыпцыі з «Аль-Кітабу», каб я мог перадаць грошы транскрыбавацелцы, а то маё прыкрае палажэньне.

14) У Украінскім Пэдагогічным Інстытуце ў Празе мае ў скорым часе выкладацца крывіцкая мова. Як ведама ў нас гатовых прафэсароў на гэтае месца няма, дык прыдзецца здаволіца людзьмі бяз тытулаў і меней прыгатаванымі, проста кажучы студэнтамі, якія сёлета канчаюць. Канчаюць-жа сёлета толькі два: я і Дварчанін. Вы Дварчаніна знаеце. Быў-бы скандал, калі-б ён быў назначаны чытаць крывіцкую мову. А гэта можа стацца, бо украінцы у нашых справах не разьбіраюцца, а каб ня браць на сябе адказнасьці, гатовы будуць прыняць таго, каго запра[па]нуе «урад» ці інакш «Бел. рада ў Празе». Дык вось да Вашэці просьба, каб Ваша запрапанаваў мяне. Мне здаецца, што гэта найляпей было-б зрабіць гэтак: На імя рэктара Белецкага прыслаць Украінскаму Пэдагогічнаму Інстытуту імені Міхайла Драгоманова падзяку за тое, што яны стараюцца ўвесьці выкладаньне ў сябе крывіцкае мовы і адначасна запрапанаваць маю кандыдатуру, як чалавека, які яшчэ да паступленьня ў універсытэт выкладаў крывіцкую мову ў гімназіі і на вучыцельскіх курсах і які цяпер таксама піша стацьці ў журналах аб крывіцкай мове. Шмат не хвалеце, бо студэнта шмат хваліць не выпадае. Помнеце, што я Вашэці казаў сёлета ўвосень у Празе, чаму Дварчанін пайшоў падзержаваць Крачэўскага. Я тады вычуў добра*.

Адрэс Інстытуту:

Praha, Smíchov, Malatová ul. č.19

Ukrajinský Ustav Pedagogický.

15) А «царкве» і «панэ» другім разам.

З шчырым паважаньнем

ЯСт...

---

* Думаю, што ня шкодзіла-б, каб Ваша ў гэтай справе напісаў лісты да сваіх знаёмых украінцаў у Празе, асабліва Шапавала й Лазінскага.

582.1.48:264&r-267&r

---

[1] Крывіч. №2(8). Красавік-сьнежань 1924.

3657. Ліст Паўліны Мядзёлкі (Дзьвінск) Вацлаву і Станіславе Ластоўскім (Коўна) за 2.02.1925

Даражэнькія Пане Вацлаве і Стаха!

«Jestem wolny!» — казаў той Заглоба. Вось і я цяпер «wolna jestem» і маю час пісаць усім сваім знаёмым і прыяцелям. Хацелася-б апісаць Вам увесь шлях нашай працы з узростам, расцьветам і упадкам, з яе радасьцямі і прыкрасьцямі, але — няма сіл... Душа так змучана перажыванькнямі апошніх часаў, што адна думка аб школе, якую мы стварылі і паднялі на належную выжыню і якая цяпер руйнуецца подлымі рукамі, — можа зьвясьці з розуму. Хочацца аб усім забыцца, хоць на якісь час адпачыць. Шчыра заздрошчу цяпер Кастусю — ён ня бачыць, ня чуе усей тэй подласьці і ўсяго жаху, сярод якога мы цяпер жывем. Трудна усё перадаць у пісьме. Хацелася-б пабачыцца з Вамі і пагутарыць.

Пане Вацлаве! Прыяжджайце у Дзьвінск на наш працэс! Паслухаеце, пабачыце самі, паталкуем...

Дзякуючы зьмене палітыкі латышоў у адносінах да беларускай меншасьці, не чакаючы вынікаў суду, Краскоўскага і мяне звольнілі ад вучыцельства. Краскоўскага будзе замяняць Сахараў, а мяне — Красьневіч, — абодва ня ўмеюць добра гаварыць і пісаць пабеларуску, не гаворачы ўжо аб тым, што аб літэратуры і наагул аб беларусазнаўстве паняцьця ня маюць.

Ну, Бог з імі — ня буду іх лаяць.

Адным словам — мы цяпер «адпачываем» у хаце, а пасьля суду, магчыма, будзем адпачываць на казённым «курорце». Аднак я не хачу марна час траціць і бяруся за пёрка. Сваіх твораў я баюся людзям паказваць — хай адляжацца; прывадзіць у сыстэматычны парадак сваю стылістыку і хрыстаматыю да яе — цяпер абсалютна не магу — мазгаўніца адказваецца працаваць, — а дзеля гэтага выбрала сабе найбольш лёгкую для сучаснага стану духовага работу — пераклады. І вось у гэтым пытаньні хачу з Вамі параіцца — што найбольш пільна трэба перакладаць?

Пачала перакладаць Тальбот'а «Старшыні вільбайскай школы» — дужа добрая рэч для моладзі (пераклад гэтага твору ёсьць і на украінскай мове, хоць яго ня бачыла).

Калісь атрымала дар за прачытаную у Краслаўцы лекцыю — усе 4 томы Баршчэўскага «Szlachcic Zawalnia». Брат, Зыгмусь, азяўся рабіць поўны пераклад. Ужо І том пераложаны. Але ці патрэбна гэта? Ці нойдзецца выдавец на гэты рэчы? Пытаньне аб патрэбных у сучасны момант перакладах для мяне, да пэўнай меры, зьяўляецца пытаньнем куска хлеба. З таго, што мне належыць атрымаць з гімназіі — месяц перажывем удваіх, а што будзе далей — баюся і думаць. У бядзе-горы кожны з нас быў — да гэтага не прывыкаць, неяк-жа ды перажывем — мо' і не замром з голаду, але вось горшая бяда тая, што цяпер ня зможам аплаціць абаронцаў. У свой час на нашу нацыянальную групу (Кастусь, Краскоўскі, Якубецкі, Пігулеўскі і я) азялі 4^{x} адвакатаў — што будзе каштаваць каля 300.000 лат. руб. За абарону аднаго Кастуся запрасіў Гольцман 50 тысяч. Гольцман — быўшы міністр юстыцыі. Нас бароняць Шаблоўскі (прыяцель Тадэуша Врублеўскага) Шмідт і Будоўскі. Апрача Будоўскага — усе Рыжскія — таму і дарагія. На сколькі нам перадавалі тутэйшыя судзьдзі загадзя вырашылі нас засудзіць — а ўжо у другой інстанцыі, у

Судовай Палаце, мы пэўны у нашым апраўданьні, але на ўсё гэта патрэбна энэргічная і добрая абарона. Пасядзець якісь час у вастрозе для мяне асабіста ня страх — больш гонару, адпачынак і можна у спакойнай цішы што і напісаць — хацябы свае успаміны, але правал наш на судзе — гэта правал беларускай справы у Латвіі. Тое, што карысна часам у Заходняй, ці Ўсходняй Беларусі — у Латвіі шкодна. Сяляне ужо напалоханы, а як нас не апраўдаюць — то і зусім перастануць пасылаць дзяцей у беларускія школы. І дзеля гэтага трэба ратаваць не нас, як такавых, а справу. Як мы мелі пасады — можна было пазычыць гдзе на абаронцаў — з часам выплацілі-б, а цяпер?.. Кастусь сядзіць, мы бяз службы... Якубецкі і Пігулеўскі і самі на службе ды і жонкі іх добра зарабляюць — яны змогуць сваю долю аплаціць, а мы?.. На добры лад павінен быў-бы Цьвік пастарацца для нас грошы, бо-ж праз яго уся каша у нас заварылася, але... на яго слабая надзея.

Пане Вацлаве! Памазгуйце крыху — дапамажэце нам абараніць нашу справу ад нягоднай напасьці, якая фабрыкуецца у варшаве. Чакаем Вашай дапамогі...

А цяпер перадаю просьбу Кастуся да Стахі: 1) просіць прыслаць слоўнік Власта (можо ўжо і мне ў гэтым не адмовіце). 2) У архіве Міністэрства Бел. Спраў найці і зьняць копію (яе неабходна пасьведчыць) паперы, пры якой Міністр Семашка і кіраўнік канцэлярыі Шэпф, у 1921 годзе, у студні, ці то ў лютым, выдалі Езавітаву са складу Міністэрства кнігі для прадажы. Напісаў-бы ён і сам, але можа адправіць толькі адно пісьмо у тыдзень. Была я на бачаньні адзін раз. Выглядае ня надта каб кепска, даволі бодры. Толькі схапіў рэўматызму, а цяпер забалелі вочы — ня можа чытаць. Перадавалі мне, што у прокуратуры знаходзіцца пісьмо да Кастуся з Прагі ад нейкай студэнткі вельмі інтымнага і пікантнага зьместу — здагадываюся, што гэта ад П.Б<адуновай>. Хоць-бы тут не сьмяшыла сябе і яго!

Пасьля суду Краскоўскі, калі апраўдаюць, паедзе мабыць у Прагу — яму прапануюць катэдру пры Укр. Пэд. Інст. а што мне рабіць? У Прагу мяне толькі нядоля загоне — ня хочу лезьці у гэта эмігранцкае балота, а пры тым... баюся быць там лішняй. Пачынаю думаць аб Івану Іван-чу[1] — успамінаючы Бэрлінскую працу. Што Вы на гэта? Ці ў яго інтарэсе нойдзецца мне мейсца[2]?

Цісну руку пана Вацлава і сэрдэчна цалую Стаху

Ваша Паўлінка

582.1.48:244&r-245&r

[1] Іван Цьвікевіч. [2] Ад траўня 1923 году Іван Цьвікевіч працаваў у Белдзяржвыдавецтве ў Менску.

3658. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ігнасу Янінасу (Коўна) за 4.02.1925

Вельмішаважаны Пане Іонінас.

Згодна Вашаму зычэньню аб рукапісу «Гісторыі крыўскай (беларускай) кнігі» падаю ніжэйпісанае:

1. Рукапіс які абыймае 2.000 пісаных страніц паўстаў дзякуючы доўгалетняму зьбіраньню матэрьялаў і мазольнай працы.

2. Акром накладу працы я меў выдаткі грашовыя на літэратуру.

3. Калі я абыймаў выдавецтва пры Міністэрстве Беларускіх Спраў Вамі было зазначана, што: «хоць пэнсія невялікая, але папоўніцца гонорарамі за апрацаваныя кнігі».

4. Калі Вы выплачывалі гонорар за пераклады (Івану Цьвікевічу за кепскі пераклад 102 пісаных страніц «Анатоміі» заплочана 500 літаў), то арыгінальны твор тым больш заслужывае аплаты паложанай на яго працы.

Разумеецца калі Вы прыйшлі да перакананьня, што: «беларуская справа цяпер не актуальная», ці мо, што «лепей перанясьці выдавецтва у Вільню», то зацісканьне магчымасьці працаваць зразумела: непатрэбных людзей ставяць у такія варункі каб яны чулі што іх трымаюць не за працу, а з ласкі. Гэткае маё ўражаньне з апошніх часаў пачынаючы ад ігры з ліквідацыяй банды Цьвікевіча, справай Беларуска-Літоўскага Таварыства, пытаньнем кватэры і падзеямі апошніх дзён, якімі я пастаўлен ў такія варункі, што павінен адмовіцца ад дарагой мне працы.

Прыміце запэўненьне ў праўдзівай пашане

В.Ластоўскі

4.II.1925 г.

582.1.48:168&r

3659. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ігнасу Янінасу (Коўна) за 4.02.1925

Вельміпаважаны Пане Іонінас.

Згодна учарашняй нашай размове даю ніжэйпісаныя аргуманты ў карысьць слушнасьці аплаты гонорару за «Гісторыю крыўскай (беларускай) кнігі».:

1. Рукапіс які абыймае да 2.000 пісаных страніц паўстаў дзякуючы доўгалетняй працы па зьбіраньню матэрьялаў і мазольнай працы па парадкаваньню яго ў тыя часы, калі я не займаў яшчэ службовага палажэньня пры Выдавецтве Міністэрства Беларускіх Спраў у Літве.

2. Мной паложаны ~~так сказаць~~ жывы ўласны грош на пакупку патрэбнай літэратуры.

3. Калі я абыймаў выдавецтва пры Міністрэстве Беларускіх Спраў у Літве Вамі было між іншым зазначана, што аўторскі гонорар будзе выплачывацца ~~па існуючаму тарыфу~~.

3. Міністэрства Асьветы выплачывае ганарар за друкаваныя працы, без ўзгляду на тое ці аўтор займае, ці не займае службовага становішча.

Я быў сягоньня у п. Міністра Закардонных Спраў, між іншым і ў гэтай справе. Пан Міністр знаходзіць што справа спыняецца аб форму ў якой бы можна было здаволіць маю просьбу і я пэўны, што Вы гэту форму знойдзеце, а дзеля гэтага не бачу з маей стараны прычын дзеля якіх ня можна былобы здаваць у друк кнігі.

Што да прыплаты п. Борысовічу за корэктуру, то ўважна разабраўшыся ў нашым месячным бюджэце я знаходжу, што яму можна было-бы месячна дадаць 60 літаў (Пэнсыі 1.810, арэнда 70, электрычнасьці 20, часопісь 13, канц. расходы 10, пачт. расх. 10, а ўсяго 1933, ці інакш з 2000 астаецца 67 літаў).

582.1.48:222&r-223

3660. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ігнасу Янінасу (Коўна) за 4.02.1925

Вельмішаважаны Пане Іонінас.

Згодна Вашаму ~~вымаганьню~~ зычэньню аб рукапісу «Гісторыі крыўскай (беларускай) кнігі» падаю ~~маю весткі~~ ніжэйпісанае:

1. Рукапіс які абыймае 2.000 пісаных страніц паўстаў дзякуючы доўгалетняму зьбіраньню матэрьялаў і мазольнай працы.

2. Акром накладу працы я меў выдаткі грашовыя на літэратуру.

3. Калі я абыймаў Выдавецтва пры Міністэрстве Беларускіх Спраў Вамі было зазначана, што: «хоць пэнсія невялікая, але папоўніцца гонорарамі за апрацаваныя кнігі».

4. Калі Вы ~~Пане Іонінае~~ выплачывалі гонорар за пераклады (Івану Цьвікевічу за 102 пісаных страніцы «Анатоміі» заплочана 500 літаў), то арыгінальны твор тым больш заслужывае аплаты паложанай на яго працы.

Разумеецца калі Вы прыйшлі да пераконаньня, што: «беларуская справа цяпер не актуальная», ці мо, што «лепей перанясьці выдавецтва у Вільню», то ~~Вашае~~ заціскаць магчымасьці працаваць зразумела: непатрэбных людзей ~~трэба~~ ставяць у такія варункі каб яны чулі што іх трымаюць не за працу, а з ласкі. Гэткае маё ўражаньне з апошніх часоў пачынаючы ад ігры з ліквідацыяй банды Цьвікевіча, справай кватэры і ~~урэшце пытаньнем аб гонорары. Усімі апошнімі падзеямі~~ падзеямі апошніх дзён, якімі я пастаўлен ў такія варункі, што павінен адмовіцца ад дарагой мне працы.

Прыміце запэўненьне ў праўдзівай пашане

В.Ластоўскі

582.1.48:224-225

Чарнавік дакумэнта №3658.

3661. Ліст Эвальда Амэндэ (Пэрнаў) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.02.1925

582.1.48:243

582.1.48:242 — канвэрт

Аб прыняцьці парлямэнтам Эстоніі Закону аб культурнай аўтаноміі нацыянальных меншасьцяў 5.02.1925

3662. Візытоўка Эвальда Амэндэ

Dr. rer. pol. Ewald Ammende

«Revaler Bote»

582.1.04:048

3663. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ігнасу Янінасу (Коўна) за 4.02.1925

Вельмішаважаны Пане Іонінас.

Блізка два гады таму назад калі я адмовіўся пад націскам Цьвікевіча і яго банды пайсьці на «ізоляцію Літвы ад уплыву на беларускую справу» я спадзяваўся, што ачысьціўшы беларускую справу ад шкодных ей элемэнтаў, можна будзе вузлы еднасьці паміж двумя братнімі народамі

пражыўшымі доўгія сталецьці сваей гісторыі разам, цясьней зацісьнуць. Справа запавядалася вельмі добра: у краі былі чысьленныя прыхільнікі беларуска-літоўскага яднаньня. Трэба было толькі палітыцы «ізаляваньня Літвы» навеянай з Усходу процістаўіць рэальную працу. І гэта рэальная праца гэтак сама добра запавядалася: праз мае рукі некалькіх першых месяцаў шла падмога віленскім беларускім арганізаціям, па 150 долляраў у месяц; у Коўне разпачалася праца выдавецтва школьных кніг і «Крывіча»; група Цьвікевіча мела быць ліквідавана у Літве.

Але далей пайшло ня лепш, а горш.

Хутка, бо ў пачатку 1924 году, была спынена праз мяне падмога віленскім беларускім арганізаціям. Грошы пайшлі праз іншы шлях і выдаваліся на мейсцы ў роўнай меры як ворагам, так і прыхільнікам ўходзячым у склад К-ту. З маіх рук была выбіта магчымасьць ўплываць на віленскія беларускія арганізацыі.

Група Цьвікевіча, яўна варожая і знаходзячаяся пад камандай варажых сіл, замест быць ліквідаванай, знайшла ў Літве грунт да двохгадовага падрыванья літоўска-беларускіх ўзаемаадносін, бьючы ўвесь час па мне як выразіцелю т.зв. «літоўскай орьентацыі». Нічым не гамаваная дэмагогія гэтай групы падзеленай на тры фронты: Ковенскі, Пражскі і Менскі вяла шырокую работу пропагуючы орьентацію на Менск пад сьцягам Б.Н.Р.

Калі я паднімаў пытаньне аб патрэбе палітычнай працы, то атрымліваў[1]

582.1.48:227-228

[1] На гэтым тэкст абрываецца.

3664. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ігнасу Янінасу (Коўна) за 4.02.1925

Вельмішаважаны Пане Іонінас.

Блізка два гады таму назад, калі я адмовіўся пад націскам Цьвікевіча і яго банды пайсьці на «ізоляцію Літвы ад уплываў на беларускую справу» я спадзяваўся што ачысьціўшы беларускую справу ад шкодных ей элемэнтоў можна будзе вузлы еднасьці паміж двумя братнімі народамі пражыўшымі доўгія сталецьці сваей гісторыі разам, цясьней зацісьнуць. Справа запавядалася вельмі добра: у краі былі чысьленыя прыхільнікі Беларуска-Літоўскага яднаньня. Трэба было толькі палітыцы «ізолёваньня Літвы, навеянай з Усходу, процістаўіць рэальную працу. І гэта рэальная праца таксама добра запавядалася: праз мае рукі некалькіх першых месяцоў ішла падмога віленскім беларускім арганізаціям па 150 долляраў у месяц; у Коўне разпачалася праца выдавецкая школьных кніг і «Крывіча»; група Цьвікевіча мела быць зьліквідавана у Літве.

Але далей пайшло ня лепш а горш:

Хутка, бо ў пачатку 1924 году была спынена праз мяне падмога віленскім беларускім арганізаціям. Грошы пайшлі праз ~~Віленскі Нац. камітэт не для падмогі выключна групе якая бы нас падтрымліваля, а у агульную кассу з якой засіляліся там і ўходзячыя ў склад К-ту комуністычныя элемэнты~~ іншы шлях і выдаваліся на мейсцы ў роўнай меры як ворагам, так

і прыхільнікам ўходзячым у склад К-ту. З маіх рук была выбіта магчымасьць ўплываць на віленскія беларускія арганізацыі.

Група Цьвікевіча, яўна варожая і знаходзячаяся пад камандай ~~Уходніх ўплываў~~ варажых сіл, замест быць ліквідаванай, знайшла ў Літве грунт да двохгадовага падрыванья літоўска-беларускіх ўзаемаадносін, бьючы ~~ў першы чарод~~ ўвесь час па мне як выразіцелю т.зв. «літоўскай орьентацii». Нічым не гамаваная дэмагогія гэтай групы падзеленай на тры фронты: ковенскі ~~(Цьвікевіч, Галавінскі, Вальковіч, Захарчыка)~~, пражскі ~~(Крычэўскі, Захарко, Заяц, Прокулевіч)~~ і менскі ~~(Карабач, Казячы, Міхалевіч і інш.)~~, зьвіўшы сабе галоўнае гняздо у Коўне біла па Літве і літоўска-беларускіх ўзаемаадносінах не знаходзячы ніякіх перашкод для сваей работы са стараны Літвы. У выніку атрымаўся пераход рэволюцыйных элемэнтаў у краі на старану комунізму, які кідаў у гэтым часе на віленшчыну і людзей і літэратуру і сродкі.

Калі я паднімаў перад Вамі пытаньне аб патрэбе вясьці політычную работу — атрымліваў адповедзь што я павінен агранічыцца толькі работай культурнай якая адзіна уходзіць у закрэс Міністэрства Беларускіх Спраў у Літве.

Урэшце калі факты жыцьця прымусілі згодзіцца ~~Вас~~ на мой праект утварыць Літоўска-Беларускае Таварыства, якое-бы дало клічы завіраючыя дзяржаўна-палітычную канцэпцію для беларускай стараны, высунутую літоўскай грамадзкай апініяй, то гэта справа не магла пасунуцца далей апрацаваньня Статуту такога таварыства, ~~я і Вы разумеем што тут затрымка не~~ бо з літоўскай стараны не знайшлося групы якая хацела-бы і мела-бы што сказаць беларусам у гэты момант.

І вось ~~абсэнтэізм~~ гэта паўзьдзержлівасьць ад актыўнай палітыкі ў беларускай справе, а з другой стараны часьцю літоўскага грамадзянства падтрымліваньне групы Цьвікевіча, а часьцю групы Ластоўскага рабіла і робіць уражаньне, што ў беларускай справе Літва адзіна орьентуецца на «divida et impera», так прынамні ўрэшце рэшт формулавалі стан літоўска-беларускіх адносін ~~ў апошнія часы~~ у Віленшчыне.

~~І дзеля таго, што~~

Два гады таму я ўзяў цяжкое заданьне з верай што ~~мне ня прыдзецца аднаму~~ чым далей тым к лепшаму пойдзе ў Літве беларуская справа, нажаль сталася наадварот і сталася не па прычыне беларускай.

Два гады на мяне сыплюцца каменьні з боку кампаніі Цьвікевіча. Жыву у літэральна турэмных варунках абляганы штодзеннымі прыкрасьцямі з боку раззухваленай, выслухіваньнем у міністэрстве яе плётак, гаспадыні дому, з другога боку сталымі нападкамі кампаніі Цьвікевіча якая засела палавіну маей кватэры, сьціснуўшы мяне ў адным пакойчыку. Не маючы моральнай падмогі ў гэтым змаганьні за будзь-што будзь абарону Літвы, са стараны Літвы і урэшце ~~трактаваны як абузэ~~ трактаваньне апошнімі часамі мяне асабіста і маей працы як каштоўнай абузы утрымліванай з ласкі, змушае мяне з болям сэрца адыйсьці ад справы якую я з такой верай і з накладам вялікай энэргіі разпачаў два гады таму назад.

Учарашняя наша з Вамі размова мяне толькі ўзмацніла ў маім перакананьні: так гавораць толькі з людзьмі непатрэбнымі...

Затым прыміце запэўненьне ў праўдзівай пашане

ВЛастоў...

582.1.48:229-233

Чарнавік дакумэнта №3663.

3665. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.02.1925

Вельміпаважаны Пане Вацлаве,

дапісую ў гэтым лісьце тое, чаго не напісаў у пярэднім з 29.I.

У перадрукаваным у «Крывічы» слоўніку Зызанія[1] ё гэткія словы на бачыне 55: **Глумлю**, прохожуюся, проиджаюся; гнушаюся, брыджуся; горджусь. Бачына 58: **лещу**, зраджаю; бачына 59: **навѣтую**, зраджаю; бачына 60: **абваждаю**, агиджую, обрѣджую; бач. 63: **совѣтованье**, порядженье, совѣтую, раджу, **сужду**, суджу; бач. 65: **яруся**, серджусь. Як Ваша пеўна зацеміў, я тут усюды падчыркнуў *дж*. Ці не абмыла ў Вашэці гэта, ці не напісана ў Сахарава ж або жд? Калі не абмыла, дык вельмі цікаўна, калі-ж абмыла, дык філёлёгі зь ёй разьбяруцца (проста глянуць да Сахарава ці арыгіналу). Быў-бы Вашэцю ўдзячны, калі-б Ваша паглядзеў да Сахарава і напісаў мне, як стаіць там.

Калісь я Вашэцю паслаў у «Крывіч» адно перакладзенае апавяданьне з чэскае мовы і адну стацьцю аб словах з пачатным о-е (алень-елень, одзін, един и г.п.), калі яны ня будуць друкавацца ў «Крывічы», дык зрабеце ласку, пішучы мне, адашлеце іх разам. Выбачайце, што гэтай просьбаю забіраю Вашэці крыху часу.

Прачытаў Вашэцявага слоўніка ўжо 400 бачынаў. Цікаўна, што чым балей чытаю, тым ён мне балей падабаецца; ці то Ваша пішучы вучыўся, ці я вучуся чытаючы, трэ будзе гэта скантраляваць.

На асобных лісткох адказы на словы «царква» і «панэ».

З шчырым паважаньнем

ЯСт

7.II.1925

Аб «царква».

Праславянскае сьгку перайшло ў крывіцкай мове да катэгорыі словаў гэткіх, як вада, мяжа, жана́ і г.п. Большасьць гэтых словаў маюць націск на канчатку. Тое, што сваім націскам гэтае слова у нас розьніцца ад тагож слова ў іншых слав. мовах, паказуе, што гэты націск у нас устанавіўся незалежна ад чужых уплываў. Ніколі ня бывае, каб тое самае слова, ўжытае ў значэньні абстрактным, розьнілася націскам ад свайго значэньня конкрэтнага. Дык значыцца у значэньні грамадзкасьці верных і ў значэньні будынку заўсёды будзе націск на канцы (царква́).

Я.Станкевіч.

7.II.1925

582.1.48:239&r-240

3666. Ліст Андрэя Бароўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму й Кляўдыю Душэўскаму (Коўна) за 10.02.1925

Дорогіе Вацлав Юстинович и Клавдій Степанович!

Прошло уже больше двух недѣль со времени приступа к сей корреспонденціи. Мучительныя боли и матерьяльныя непріятности не дали мнѣ возможности даже отправить уже написанное. Сейчас из экономіи времени и энергіи пишу Вам обоим вмѣстѣ.

Подтверждаю просьбу изложенную в первых письмах (от 23.1) и прошу в наших общих интересах не медлить ни одного дня с отвѣтом. За это время и в моих личных дѣлах и в наших общих наступили весьма серьезныя измѣненія, требующія немедленных энергичных дѣйствій. Мнѣ необходимо с Вами сейчас же повидаться, чтобы обстоятельно переговорить. Проѣздом из Данцига в Прагу здѣсь опять был тот офицер, о котором я Вам в свое время говорил[1]. В обстоятельной докладной запискѣ на имя здѣшняго литовскаго посла[2] он изложил всѣ перепитіи своего удаленія с литовской службы, а также и за время пребыванія за границей. Записку я передал по назначенію. Копія имѣется у меня. Но конечно важнѣе устная информація. Ввиду возможности непоправимых шагов наших обезумѣвших пражских «дипломатов» безусловно необходимо попытаться предотвратить несчастье пока не поздно.

Жду немедленнаго отвѣта.

Всего Вам лучшаго. Горячій привѣт.

10.2.25 Ваш АБоровскій

A.Borovsky
Berlin-Charlottenburg
Joachimsthalerstr. 4,III
b. Hillgenberg
Tel.: Bismark 2909

582.1.48:217
582.1.48:215 — канвэрт

[1] В.Разумовіч. [2] Дакумэнт №3652.

3667. Тэкст Канкардату паміж Ватыканам і Польшчаю, падпісанага ў Рыме 10.02.1925

582.1.50:016&r-021&r — д

3668. Расьпіска Аляксандра Вальковіча Вацлаву Ластоўскаму за 11.02.1925 (Коўна) у атрыманьні ад апошняга рэчаў Прадстаўніцтва БНР у Літве ў сувязі з высяленьнем Прадстаўніцтва

[...] пры высяленьні Прэдстаўніцтва Мейсцовай (Літоўскай) Уладай з памешканьня на Вітаўта пр. №30 у памешканьне па Дарбінінку gve №111 (Барак Гарадзкой Управы для бедных) [...]

1. , Канцэлярскій стол (адзін); 2., Стульляў шэсьць і 3., адну настольную электрычную лямпу [...]

582.1.48:238

3669. Ліст В.Шэбедзева (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 12.02.1925

582.1.48:206

З просьбай пазычыць 120 літаў. Прыпіска Ластоўскага:

«12.II. Пазычыў 12 долараў «на тыдзень», спусціўшы два тыдні на ліст не атрымаў я адповедзі і п. Шэбедзеў саўсім перастаў да нас заходзіць.

ВЛаст...

16.III.25.»

3670. Паштоўка Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 12.02.1925 з прапановай купіць кнігі пра Беларусь

582.1.48:235

3671. Ліст Яна Ермачэнкі (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 12.02.1925

Zbraslav u Prahy;
Vaclavova ul. č.92.
12/II 1925.

Вельміпаважаны Пане Ластоўскі!

Вельмі дзякую Вам за прысланые мне 2 нумэра часопісі Крывіч — вельмі добра выйшла што я атрымаў іх 2 бо адзін я аддаў, старасьце Чэхаславацкага Сакольства якій вельмі цікавіцца нашым рухам.

З яго падмогай маніліся выдаць на Чэскай мове - пераклад з кнігі «La Ruthenie-Blanche» якую Вы пэўна ведаеце. Зьвертаюсь да Вас з гэткай рэч'ю.

Я маю напісаны і гатовы для друку найважнейшыя рэчы аб Сакольству! Ці не знайшлі-бы Вы магчымым і патрэбным зь'месьціць гэты матэрыал у Крывічы?

Матэрыалу будзе на друкаваны аркуш — акром таго я-б Вам паслаў ці патрэбные клішэ, ці альбомы і рысы якія належалі-б да тэксту — каб гэты агляд сучаснага Сакольства быў паўнейшы.

Чакаю Вашага адказу.

Ад жонкі і ад мяне щыра вітаем Вашу супругу і Вас і жадаем усяго найлепшага.

З пашанай

Ян Ермачэнка

P.S. Ці не маглі-б Вы падпісаць мне мой пашпарт, які я хацеў-бы працягнуць на некаторы тэрмін. У гэтым леце я хацеў-бы яшчэ даведацца у Турэччыню каб ліквідаваць там справы. Я добра ведаю што Вы выйшлі з саставу Ураду — але я думаю што толькі таму што ён быў у гэтым складзе — і таму я зьвертаюсь да Вас прызнаючы толькі Вас за старшыню Беларускага Ураду аб гэтай справе!

Ян Ерм...

582.1.48:236-237

3672. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 13.02.1925 з просьбай даслаць грошай на адваката Езавітаву

582.1.48:234&r

3673. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ігнасу Янінасу (Коўна) за 18.02.1925

Вельмішаважаны Пане Іонінас.

Я хацеў-бы зьездзіць у Кенігсбэрг да окулісты. Калі Вы не маеце нічога проціў, то прасіў-бы звольніць мяне дзеля гэтай паездкі і даць пазваленьне на завізаваньне пашпарту. Воліў-бы я паехаць пасьля пераезду на новую кватэру, выбраўшы больш свабодны час, дык каб мець заўсёды на пагатове візу, прасіў-бы паставіць мне візу на месяц.

Пакуль будзе новая кватэра, ці не далі-б Вы пазваленьня адкрыць дзьверы ў суседні пакой вольнай кватэры, бо проста душымся без паветра.

З глыбокай пашанай ВЛаст...

18.II.25.

582.1.48:220

3674. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Ігнасу Янінасу (Коўна) за 18.02.1925

Вельмішаважаны Пане Іонінас.

Я хацеў-бы зьездзіць у Кенігсбэрг да окулісты. Калі Вы не маеце нічога проціў гэтага, то прасіў-бы звольніць мяне дзеля гэтай паездкі на 3-4 дні і даць пазваленьне на завізаваньне пашпарту. Воліў-бы я паехаць па пераезьдзе на новую кватэру, выбраўшы больш свабодны час, дык каб мець заўсёды на пагатове візу, прасіў-бы паставіць на месяц.

Пакуль будзе новая кватэра, ці не далі-б Вы пазваленьня адкрыць дзьверы ў суседні пакой вольнай кватэры, бо проста душымся без паветра.

З глыбокай пашанай ВЛаст...

582.1.48:221

3675. Квіток аб уплаце Вацлавам Ластоўскім 4,- літаў за 25 патронаў для рэвальвэра 6.35 калібра за 21.02.1925

582.1.48:241

3676. Ліст Андрэя Бароўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму й Кляўдыю Душэўскаму (Коўна) за 23.02.1925

Дорогіе Вацлав Юстинович и Клавдій Степанович,

Не получая от Вас отвѣта на свои письма, посланныя десятаго с. мѣсяца, рѣшаюсь отправить Вам копію докладной записки, поданной здѣшнему лит<овскому> представителю[1]. По моему весьма важно было бы предпринять хотябы попытку отговорить наших «дипломатов» в Прагѣ от их безрассудных намѣреній. Я охотно взял бы на себя посредническую роль и думаю, что мнѣ удалось бы их уговорить не дѣлать новых непоправимых и непростительных глупостей. Необходимо для этого немедленно съѣздить в Прагу, ибо конечно только устно возможно вести такіе переговоры с разсчетом на успѣх. Но для поѣздки прежде всего нужны денег, нужны деньги и для других безотлагательных расходов. Об этом

я писал в прошлых письмах, но к сожалѣнію до сего времени не имѣю от Вас никакого отвѣта. Это, положим, тоже отвѣт, но я почему то думал, что заслуживаю лучшаго.

Итак, бывайте здоровы и напишите хоть нѣсколько слов. Жму руки.

23 февраля 1925 г. Ваш АБоровскій

582.1.48:216

[1] Дакумэнт №3652.

3677. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Коўна) Краёваму Цэнтру (Вільня) за 28.02.1925

28.2.25 г.

Дарагія Таварышы.

Дасылаю Вам сваей адмены «дэклярацыю» народных сялян[1] па нашай справе. Можа скарыстаеце у прэссе. Як бачыце — тон у стасунку да нас (урад БНР — «безработные», увесь беларускі народ — «несчастный») — вялікадзяржауны. Ласкавы. Абецаюць, што нешта будзе, але сеньня, калі усе-ж такі нешта могуць зрабіць, — ня робяць абсолютна нічога. Трэба Вам ведаць, што гэткая пазіцыя «сялян» выклікаецца іхняй оппозіцыяй да хрышчоных[2]. Для іх мы, і нашая справа наогул, — адзін з захадау унутраннай барацьбы з «хрышчонымі». Трудна думаць, што «калі-б да яны прыйшлі, дык» і г.д. Объектыуна, стасунак літоуска-беларускі ня можа быць цяпер, пасьля банкруцтва ідэі супольнай дзяржавы, такім, якім хацела-б яго бачыць «літоуская дэмакрацыя». Пытаньня, — чыя есьць Вільня — павінна быць вырашана ею згодна нашым нацыянальным і дзяржауным інтэрасам. А гэта — у свой чарод пакуль што (гл. заданьні сучаснай беларускай палітыкі да Літвы) ложыць крэс паміж намі а імі. Пакуль што, кажу я, — бо раней ці пазьней але яны усе перэканаюцца, што новы наш лезунг есьць справядлівы і для іх адзіна магчымы. — Сеньня даведауся, што конкордат з Ватыканам у Польшчы падпісан у гэткім выглядзе, што адкідаецца уселякая надзея літвіноу на Вільню. Аб гэтым тут абс. нічога не гавараць, скрываюць, — мне казау адзін з загранічных прэдстаунікоу. Яшчэ адзін лішні крыж на літ. імкн. да Вільні. Трэба выпростуваць лінію.

Пішу я Вам (у каторы раз.), — але ізноу ня маю надзеі на то каб атрымаць адказ. Сумна гэта і абразьліва, для мяне. Аднак справа майго адъезду у Менск нагэтулькі сур'езна для агульнай нашай лініі, што мне здаецца, што на мая цяперашняе паведамленьне Вы павінны адгукнуцца. Вы напэуна больш дэтальна ведаеце аб апошніх арыштах бел. камуністау у Менску і аб прычынах гэтых арыштау. Я даведауся аб гэтым з адпаведных літоускіх крыніц, з якімі устанауліваю сувязь. Заутра між іншым буду шмат што ведаць аб варунках менскай працы наогул. Падчорківаю яшчэ раз паутараю, — што сваю падарож я хацеу бы зьвязаць з «заходнім фронтам» і на гэтым грунце дабівацца уступак у сэнсе беларусізацыі тамтэйшага жыцьця. Усе залежыць ад Вас. Паведамьце мяне. — Вестка аб радыкальна-сэпаратыстычным зьмесьце нова-прынятай констытуцыі[3]

Менска абляцела эуропэйскую прэссу, — але гэта, зразумела — дутая штука.

Шмат хацелася-б паразважаць з Вамі аб сучасным становішчы нашае працы, аб надзеях і паглядах на будучыну, аб шмат якіх пытаньнях агульнага руху, — але што зробішь. Ніяк не дастацца да Вас, ніяк не убачыцца. Адна надзея, што хоць і адарваныя — мы мысьлім і спавядаем адналькова. Гэткая ужо «дыялектыка» нацыянальнай працы: яна, гэтая праца, яе разьвіцьце і павароты (а галоунае — істотны, змест, сутнасьць) мае свае жалезныя законы, сваю непахітную легіку, свае цямноты і яснасьці, — якія абавязковы і якія ясны незалежна — дзе і пры якіх варунках гэтая праца адбываецца. Вось на гэтую «абавязковасьць» — і пакладаю я сваю надзею, калі разважаю тут адзін (бо фактычна я ужо год як адзін), седзючы у Кауне. Але усеж такі гэта цяжка, асабліва у некаторыя моманты, калі хацелася-б з кім небудзь падзяліцца думкамі з ліку старых таварышоу.

Прэдстауніцтва нашае тут зачынена. Выселена сілай паліцыі. Штандар сарваны. Кватэру прадстауніцтва, як і трэба было спадзявацца, заняу «монж зауфаня» хрышчоных пан Ластоускіс, літоускі Валэйша. Абяцаўся служыць «верай і праудай», — затое і «обласкан». Ліха з ім, няхай жывіцца.

Аб латышскіх падзеях. Вы добра напісалі. Шкада, што ніяк не дабярэцеся, каб напісаць у гэткім жа духу аб літоускай «вялікадзяржаунасьці» і службе монжэф.

Бывайце.

582.2.49:001&r — ма

---

[1] Літоўская партыя ляўдзінінкаў. [2] Літоўская партыя хрысьціянскіх дэмакратаў. [3] Магчыма, маецца на ўвазе пастанова студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б 1925 году аб беларусізацыі.

3678. Адбітка пячаткі і кароткая інфармацыя Яна Крыўкі пра Гурток Беларускай Сацыялістычнай Моладзі ў Калузе

Адбітка печаткі «Гуртка Беларускай Соцыялістычнай Моладзі» арганізацыі моладзі з уцекачоў у гады вайны 1914-1918 у Калузі.

Арганізацыя адчынілася у 1917 году у восень і пасля рээміграцыі уцекачоў на Бацькоўщыну зачынена была у 1920 году. Старшынямі былі: Ян Крыўка і пасля Петр Лесун. Большая частка пратаколаў сабраній і экземпляры статуту былі канфіскованы Калужской Губчека у гр. Крыўка у 1920 году у маі м-цы.—

Ян Крыўка

582.2.49:002&r — ра

Дата невядомая.

3679. Копія артыкулу: Ks. Jan Urban. Sprawy Konkordatu // Przegląd Powszechny, Nr.495, Marzec 1925

582.1.50:021b-021c — рк

3680. Krynica. Nr.9. 1 Sakawika 1925
[З артыкулам:] M.Krušyna. Konkordat i Biełarusy
582.1.50:034&r

3681. Ліст Аляксандра Цьвікевіча (Коўна) Краёваму Цэнтру (Вільня) за 2.03.1925

2 Сакавіка 1925 году.

Дарагія таварышы.

Толькі сеньня адпрауляю свайго ліста. Дакладаю яшчэ адну вырэзку — з «Летувы» — офіцоза літоускага уряду. Як бачыце ен вельмі ахвотна зьмесьціу перадрук з «Крыніцы», у якім дадаецца яшчэ адна порцыя да «характарыстыкі» Уряду БНР, яго значэньня і іншае. — Я маю гонар да сеняшняга дня стаяць на чале гэтага Уряду. Мне ня столькі прыкра, сколькі цяжка чытаць падобныя перадрукі — арыгінальнага нумару «Крыніцы» я ня маю. Цяжка таму, што калі брыкае чужы чалавек, дык гэта адно, а калі брыкае свой, — дык гэта другое. Апошняе у шмат разоу непрыемней, чым першае. — Калі Вільня, ці лепш казаць точна — Краевы Цэнтр лічыць (ці лічыу) істнаваньне Уряду БНР непатрэбным, дык трэба было аб гэтым зрабіць адпаведную пастанову і перавесьці яе мне. Я зрабіу бы з таго належныя вывады. Калі ў сакавіку Краевы Цэнтр напісау мне адно пісьмо (яно адным і засталося наогул за усе гады апошняе нашае працы) — у якім зазначыу аб патрэбе «помпэознай здачы мандатау Менску і заснаваньні Нац. Камітэту які меу бы працаваць з другім інтэрнацыяналам», — дык я тагдыж вытлумачыу колькі мог несурьезнасьць гэткай пастановы, і у кожным разе яе нерэальнасьць. — На мае тлумачэньне я ніякага адказу не атрымау. Што я мог пасьля таго думаць? — Чорт яго ведае! — Вы ведаеце мой пагляд на урад БНР і яго патрэбу. Я аб гэтым таксама вельмі дэталічна пісау Вам. Мне лепш як каму-небудзь іншаму вядомы яго плюсы і мінусы. І аднак я, як і усе мы, трымаюся старой формы, пакуль маглі, а галоунае, пакуль ня мелі ні Вашых аканчальных пастаноу, ні рэальных магчымасьцяу сарганізаваць нешта іншае, лепшае. Я не бараню свае становішча, як галавы Уряду БНР, але я бараню самы гонар беларускага імя, беларускай нацыянальнай установы. — За увесь убегшы час ніхто, ніколі і ні у чым не сказау там у Вас у Вільні хоць бы слова у нашу карысьць. Вы кажаце цяпер, што Урад БНР ня мае (і ня меу? калі быу В<ацлаў>Л<астоўскі>). сувязі з народам. Што гэта значыць, як ня камень у нашу твар, як не цягчэйшае абвінавачаньне нас ня толькі у нашых уласных вачох, ці вачох літвіноу, — але і наогул у вачох кожнага палітычнага дзеяча загранiцай, з якім мы гаварылі, прад якім мы агітавалі, каму прыносілі скаргі, пратэсты і патрэбаваньня. — Пасьля падобных «характарыстык» зразумела, кожны плюнець на нашу працу тут закардонам і абазве нас, па прыкладу літвіноу «безработнымі» інтэллігэнтамі. — Пасьля гэтага наогул нашае перабываньне загранiцай, — як і наагул уся нашая праца да сеняшняга дня носіць характар чагосьці недарэчнага, несурьезнага, з чым ня варта лічыцца, чаму нельга верыць. — Вы пасылаяце гэткімі

«характарыстыкамі» да чортавай мацеры усе нашыя мэморандумы супроць польскага гвалту, супроць падзелу і гэтак далей, — вы вырываеце грунт з пад ног нашае пропаганды незалежнасьці Беларусі, — бо, цяпер кожная сабака можа брахаць, — што нашая праца — не адпавядае імкненьням Краю, мы не зьяуляемся тлумачамі волі народа.

За гэткія «характарыстыкі» можна толькі падзякаваць, — і надалей гэты гонар «высокага прадстауніцтва», які выматау у мяне у канцы канцоу усе нэрвы — з сябе зьняць. Зняць з пратэстам супроць тых, хто павінен быу бы хоць крыху, хоць у чым небудзь, апрача дыплематычнага маучаньня, дапамагчы нам у рабоце.

Паутараю, — калі Краевы Цэнтр рашыу бы аканчальна зьмяніць форму нац. прадстауніцтва закардонам, і давеу бы гэта да майго ведама, — я бы ведау бы што рабіць. Але лягаць — заднім чыслом, як кажуць,— і пускаць «на смарку» усю папярэднюю працу, — гэта, даруйце таварышы, занадта.

Вы пратэставалі у «Бел. Долі» супроць ганебнага і сапрауды глыбока хамскага паводжаньня літоускага ураду у справе разрыву. У артыкуле «Летувос Жыніос» мы знайходзім гэткае жа справядлівае абураньне захадамі сеняшніх гаспадароу Літвы. Аднак усе Вашае абураньне, — а тым самым і абураньне літоускае оппозіцыі вылятае у трубу, калі «Летува» робіць перадрук з «Крыніцы», што усе мы былі адарваны ад краю і не рэпрэзэнтавалі народу. З самазванцамі, як называюць нас у офіцыяльных установах Ласт. і Душэускі, — ня толькі ня трэба лічыцца, але, запрауды, іх трэба гнаць у шыю. Выходзіць, што беларусы пазайзросьцілі гогалеускай унцер-афіцэрскай удаве.

«Характарыстыка» Крыніцы, а за ей «Летувы» набірае асаблівай вагі прад наступаючай сэсіяй Лігі Нацый, куды мы ізноу зьбіраліся падаваць мэморандум. Быць у дурацкім становішчу нікому не салодка — і таму я сваей подпісі туды ужо не пашлю. Я занадта паважаю «Крыніцу», каб не лічыцца з яе голасам, — тым больш, што гэта здаецца першае здарэньне у жыцьці нашае палітычнае працы закардонам.

Усе разам узятае, узмацняе мяне у пераконаньні, аб якім і пішу у папярэднім лісьце, — што настау час пераезда «да дому». Дзякаваць Богу і я тады буду мець магчымасьць гаварыць аб працуючых закардонам, што яны — адарваны ад народу і працуюць «на сваю руку». —

Бывайце здаровы, ваш

Ал.Цьвікевіч

582.2.49:003&r — ма

3682. Ліст Аляксандры Мамонька (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.03.1925

[...] Вельмі шкадую, што ня была ў Празі ў той час як Вы пріехалі [...]

Думаю што сестра мая Вам раскаже ўсі падробнасьці, як на граніцы бальшэвікі узялі ўсе паперы нашы і майго швагра [...]

Маю шмат працы, спеваю, прыймаю учасьце у канцертах украінскіх і чэшскіх.

Не маю слоў Вам выразіць, як ўсеж-такі цяжка і сумна нам жывецца і як чакаю хвіліны калі змагу хоць на кароткі часць прыехаць у Коўню.

Цягнуцца дні адналькoвые — шэрые — у хлопатах і недастатках.

Палута нам зусім захварэла, памещена ў клініку для душевнохворых. Доўга прышлось-бы пісаць, каб перадаць ўсю карціну сумбуру што зацямняе яе хворую, бедную душу [...]

582.1.48:214&r

3683. Ліст Юозаса Пурыцкіса (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.03.1925 з паведамленьнем аб немагчымасьці сустрэцца ў дамоўлены час

582.1.48:213

3684. Ліст Альбэрта Курляндзкага (Данцыг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 12.03.1925 з просьбай даслаць «Слоўнік»

582.1.48:212

На блянку «Weissruthenisches Pressebüro. Danzig».

3685. Ліст адміністрацыі часапіса «Slovanský Přehled» (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 13.03.1925 з паведамленьнем аб аднаўленьні выдаваньня часапіса пад рэдакцыяй Адольфа Чэрнага ад 15.04 і прапановай абмену выданьнямі

582.1.48:211

3686. Мэмарыял Заходне-Ўкраінскага Таварыства Лігі Нацыяў, дадзены ў Вене 14.03.1925 у справе каляніяльнай палітыкі Польшчы на ўкраінскіх землях

582.1.48:207&r-210&r

3687. Расьпіска К.Барысовіча за 17.03.1925 у прыняцьці ім ад Вацлава Ластоўскага 40 літаў за прададзеныя 2 асобнікі «Расійска-Крыўскага Слоўніка»

582.1.48:205

3688. Ліст М.Гуттэн-Чапскай (Коўна?) невядомай асобе (Коўна) за 18.03.1925

Szanowny Panie,

Wspomniana w liście Pana osoba[1], która chciała papiery albo książki z r. 1560 przejrzyc, mogła by do Berżau przyjechać, gdyż moja matka chętnie papiery pokaże, tylko prosi aby to na miejscu uczynić.

Z poważaniem

M.Hutten-Czapska

18.III.25

582.1.48:204

[1] Магчыма, гаворка йдзе пра Вацлава Ластоўскага.

3689. Ліст Івана Краскоўскага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 21.03.1925

Перасылаю Вам, прысланае з Вільні Ант. Іванавічам запрошаньне на Скорынінскую Акадэмію, на якую на жаль ні Вы, ні я ня зможамо прыехаць. 2/IV наш суд [...]

Прывітаньні ад мяне братам Біржышкам, Міх. Ромеру, Жамайтісу [...]

582.1.48:203

3690. Рахункі за пражываньне Вацлава Ластоўскага ў гатэлі «Hotel de Russie» (Рым) ад 22.03 да 8.04.1925

582.1.50:038-041

3691. Гасьцявое пасьведчаньне Вацлава Ластоўскага на ўваход у гатэль «Hotel de Russie» (Рым) ад 22.03 да 8.04.1925

582.1.50:038-041

3692. Візытоўка Яўгена Анацкага

Eugenio Onatzky
già Segretario del Parlamento Ucraino
Membro benemerito dell'Istituto per l'Europa Orientale
Tel. 31-398. Corso d'Italia 6

582.1.50:048

3693. Рэклямная картка пансыянату «Onazki» (Рым)

[На адвароце рукою Ластоўскага напісана:]

Поўны пансіон з кватэрай 40 лір у дзень. Перад прыездам трэба сьпяршa сьпісацца

582.1.50:049

3694. Паштоўка Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.03.1925

582.1.48:202

У справе дасылкі кніг. «Маю многа сэрій беларускіх марак»

3695. Ліст Б-ча (Варшава) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 24.03.1925 зь перасланым мэмарыялам беларускага каталіцкага духавенства

582.1.50:021a

3696. Запрашэньне Ураду Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні Вацлаву Ластоўскаму на ўрачыстую акадэмію памяці Францішка Скарыны ў 400-я ўгодкі закладзінаў у Вільні першае друкарні, якая мае адбыцца 25.03.1925 ў актавай залі Віленскай Беларускай Гімназіі

582.1.48:201

3697. Ліст Адміністрацыйна-Юрыдычнада Аддзелу Міністэрства Замежных Справаў Латвіі (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.03.1925 аб атрыманьні «Слоўніка»

582.1.48:200

3698. Паштоўка Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 28.03.1925

[...] Мне атказалі у васстанавленіі у правах грамадзянства Беларускай радавай рэспублікі. Цяперь у мене астаўся эмігрантскіі пашпарт. Візу можна палучіць толькі у Аргэнтыну [...] У Эстіі цяперь дужа тяжка стала жіць [...]

582.1.48:199

3699. Запрашэньне Вацлаву Ластоўскаму на мастацкую выставу твораў Мсьціслава Дабужынскага, якая мае адбыцца 29.03.1925 ў Коўне па вул. Міцкевіча, 13

582.1.48:176

3700. Пэрсанальны дазвол на ўваход у Ватыканскую Базыліку дзеля ўдзелу ў імшы, якую мае адслужыць Папа Пій XI 31.03.1925

582.1.50:036

3701. Візытоўка а. Паўла Сандальджы

Rev. Paul J. Sandalgi D.D.
113 Via delle Quattro Fontane
Citta

582.1.50:037

3702. Мэмарыял Вацлава Ластоўскага за 7.04.1925 Папу Рымскаму Пію XI у справе канкардату паміж Ватыканам і Польшчаю, падпісанага ў Рыме 10.02.1925

582.1.50:001-010 — р
582.1.50:011-015 — мк

Падпісаны: «В.ЛАСТОЎСКІ, Старшыня Сувязі національна-дзяржаўнага вызваленьня Беларусі; быўшы Старшыня Рады Міністроў Беларускай Народнай Рэспублікі».

3703. Мэмарыял беларускага каталіцкага духавенства за ?.0?.1925, уручаны апостальскаму нунцыю ў Варшаве дзеля перадачы Папу Рымскаму Пію XI у справе канкардату паміж Ватыканам і Польшчаю, падпісанага ў Рыме 10.02.1925

582.1.50:022-025 — мк бел
582.1.50:027-033 — мк іта

Дакладная дата невядомая.

3704. Паштоўка В.Бандрыўскага (Вена) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.04.1925 зь Велікоднымі віншаваньнямі

582.1.48:194

3705. Ліст Антона Матача (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (?) за 9.04.1925

582.1.48:196&r-196a

Аб выдавецкай працы.

3706. Ліст выдавецтва «Orbis» (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.04.1925

Slovutný pane,

podepsané nakladatelství «ORBIS» dovoluje si věnovati Vám jako významnému pracovníku na slovenské idei jeden výtisk «Slovanského Přehledu 1914-1924», který soućasně zasilá.

582.1.48:197

3707. Паштоўка Яўгена Канавальца (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 10.04.1925 зь Велікоднымі віншаваньнямі

582.1.48:191

3708. Ліст Рамуальда Зямкевіча (Варшава) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1?.04.1925

Даражэнькі Пане Вацлаве!

Кожны Ваш ліст для мяне вялікая радасьць. Усьцешыўся надта калі яго дастаў і адразу з адрэсу пазнаў Вашу руку. Дзякую за памяць і за навязаньне перапіскі. Езавітаў ужо свабодны і яго вораг латвійскі пасол Вержбіцкі (карэспандэнт «Kurjera Warszawskiego» пад псэўдонімам: A.Laszcz) дастаў гэтым па носе за свае даносы. Віншаваў я у лісьце Езавітаву і прасіў яго навязаць з Вамі перапіску, гэтак для мяне патрэбную і цэнную. Амаль ніякіх выданьняў Вашых ня маю, хаця труднейшыя выданьня да атрыманьня з Менску, ёсьць у мяне. «Крывіча» год І-шы ня маю ад №5 да канца, бо мне у чытаньні загубілі. «Крывіча» №2 не маю (з 1924 г.) №1 (1924 г.) ёсьць у мяне. Калі ласка прышліце. Слоўнік мне патрэбны. Ня маю яго, а бачыў у Луцкевіча 3 экзэмпляры. Для газэты «Крывіча» меў бы шмат заметак, дробных а надта цікавых нататак бібліяграфічна-гісторычнаго зьместу, у рэшці гравюры, літаграфіі і т.п. для рэпродукцій.

Ад палітыкі я далёкі, хоць цікаўлюся ёю надта і стараюся уцяміць усе нашыя абмылкі і прычыны гэткае сабачае долі, якая нам цяпер усім дакучае. А каб забыцца і залечыць балючыя раны я займаюся гісторыяй, літэратурай і працамі навукова-археалягічнымі. Ва усіх бібліятэках і архівах ведаюць мяне добра і памагаюць у працы. У Вільні праўдзівы катух: Луцкевіч архіў і бібліятэку трымае моцна у сваіх руках, лічыць сябе адзіным кампэтэнтным знаўцам і спэцыялістам, прабуе нават уступаць у сьляды нябошчыка Івана, бо купляе усялякія рэчы, але не хапае у яго: веды,

шчасьця і носа. Ніхто абсалютна доступу да гэтых калекцый ня мае. Парадку у іх няма. Часьцей ужо людзі (Тарашкевіч, Уласаў, Ант. Грыневіч) карыстаюцца маімі зьберкамі кніг, чымсьці у Антона Луцкевіча. Маю дублеты, мог бы Вам іх паслаць, бо Вам яны там вельмі патрэбны. Дзеля таго толькі не даю іх Луцкевічу, хаця ён мяне просіць аб гэтым.

Аб Вас у Вільні ідуць частыя гутаркі. Ведайце што я, Тарашкевіч, Уласаў і Антон Грыневіч заўсёды Вас моцна баронім. Пішу гэта затым, каб ведалі гдзе Вашыя прыяцелі.

На Ваш праект сесьці манахам да ціхае творчае культурнае працы пайду напэўна.

Сэрцэ мяне баліць, што справа з маей «Гісторыяй беларускае літэратуры» і «Беларускай Бібліяграфіяй» зацягіваюцца. «Бібліяграфія» мая будзе накшталт Балтрамайтіса але куды большая за яго работу. Аб Скарыне празевалі момант. Дзякуючы Луцкевічу усю справу выданьня памятковаго хоць бы «Альманаха» калі ужо ня спэцыяльнаго нумэру «Заходняе Беларусі» пахавалі. На гэта «няма грошы» — пры 900 злотых пэнсіі кожнаго пасла і сэнатара. Вось Вам і патрыёты. Я паршывы чыноўнік зарабляю у месяц 360 злотых і жыву сабе нішто, купляю кніжкі, рукапісы, памяткі старасьвеччыны, а яны «ня маюць грошай».

Ня ведаю, ці хто ёсьць у нас, што зразумеў бы мае абурэньне і пагарду гэтым «нашым вялікім да маленькіх інтэрэсаў». Лік кніжак выдадзены у 1924 годзе у Вільні такі маленькі, што трэба у сабакі вачэй пазычыць, каб гаварыць аб разгоне беларускаго руху. Мне у Варшаве у гутарках з інтэлігэнтнымі людзьмі прыходзіцца ілгаць, каб падняць сваю чэсьць і гонар народу. Пакуль што гінем, гібель немінуюча, калі не падняць культурнае працы дык прападзём да званьня. Гэтаго ніхто у нас бачыць ня хоча.

А я як «варшаўскі беларус» спатыкаюся як і даўней з недаверыям, усьмешкамі, бо я-ж «варыят» які усё пастаянна гаворыць аб культуры аб працы, аб ідэйнасьці — рэчах зусім непатрэбных і некарыстных, бо не даюць грошаў. Гэта усё, і маё пракляцьце і адначасна маё сонца жыцьця і радасьць і пах кветак для набалеўшае душы. Іншае мэты, другое працы я ужо аддацца не магу, у маіх летах — гэта немагчыма. Перамена ідэі — гэта была бы для мяне сьмерць, бо зробленаго і у пляне будучаго да работы —ня было бы сілы у мяне кінуць ці зніштожыць.

Але ня варта аб сабе гаварыць і так лішне многа непатрэбнаго выліося у мяне.

Факт той, што астаецца мне з Вамі асабіста пабачыцца заграніцай, абгаварыць сур'ёзна, спакойна і аб'ектыўна усё і намеціць плян далейшае працы. Я бы думаў запрасіць да гэтага і Антона Грыневіча, майго асабістаго вялікаго і шчыраго прыяцеля.

Прыехаць у Бэрлін, ці Прагу Чэскую, а мо нават у Кролевец, каб Вас пабачыць і пагаварыць,-я бы мог. Маглі бы спаткацца і у Гданску, куды і Вам лёгка было бы прыехаць.

Уважаю што кантакт са мною даў бы Вам многа чаго да магчымасьці працы у эміграцыі. Разумеецца культурнай, бо за палітычную не вазьмуся.

Журналы і кніжкі прысылайце па адрэсу маей службы:
Pologne — Warszawa
inż. Romuald Ziemkiewicz
Izba Kontroli Państwa ulica Złota 22
тады ніякая сабака з тутэйшае цэнзуры не пасьмее [мн?]е нічога сканфіскаваць. Прыватны мой адрэс: Chmielna 68. Пад гэтым адрэсам атрымовываў кніжкі з Масквы, Кіева і Менска. У сацыяльнай пазыціі па службе я стаю моцна. Раней працэс у Беластоку і асоба Якавюка шмат мне шкодзілі, але у Кантролі людзей сьмела кажучых праўду — цэняць і шануюць. Паклон і прывет Душэўскаму і іншым знаёмым і сябрам
Цэлую вас моцна
Заўсёды да Вас прыхільны і шчыры Р.Земкевіч
Хрыстос Уваскрос!
Вясёлых сьвят!
582.1.48:195&r-195a&r

Дакладная дата невядомая.

3709. Ліст Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.04.1925

11 красавіка 1925 г.
Люцын,
Латгальская, 66.

Даражэнькі Вацлаў Юстынавіч,

шчыра дзякую за памятку і прывітаньня!
Вітаю ўсіх і дзякую.
Мае апраўданьне і звальненьне было для многіх не толькі нечаканым, але і сумным здарэньням.
Ніякіх крокаў да звароту сабе страчаных становішчаў пакуль-што я не раблю: чакаю пакуль пастанова суда набярэ праўнасьці.
Працую над залатвеньнем няскончаных спраў.
Да вашых знаёмых і Вас маю пытаньня і нават некаторыя просьбы.
1, Ці можна надрукаваць некаторые мае пераклады (па каапэрацыі і літэратурныя рэчы)?
2, Ці магу я разьлічаць на платнае супрацоўніцтва ў «Крывічу» і на якіх варунках?
3, Як падабаюцца Вам мае вершы? Ці пойдуць яны? і на якіх варунках? калі?[1]
4, Ці не можаце Вы надаслаць мне Вашых кніжак аб Скарыне, «Ботаніку», Гісторыю Віппера, «Крывіч» №2(8) і «Слоўнік» па 15-25 экзэмпляраў кождае? Худка будзе тутака канфэрэнцыя вучыцялеў, а таму усе гэта патрэбна ў значным ліку. Не пашкодзіла-бы экзэмпляраў з 30-50, але я пакуль-што не адважваюся ў Вас прасіць столькіх кніжак, бо перасылка шмат каштуе. Пасылайте поштай на мае імя, у Люцын.
Для пачатку пасылаю Вам заказной бандэролью «Горкі аладак» — Д.Айзмана (дужа карысная рэч для выпрацоўкі пашаны да кабеты ў

нашае моладзі). Здаецца мне гэты пераклад можа ісьці ў «Крывічу», а потым і быць адбітым асобна. Ён малюе тып маскоўскага інтэлігэнты, з якім мы змагаемося.

Адначасна з ім ідзе кніжыца К.А.Пажытнова «Папулярныя очэркі па тэорыі каапэрацыі» з маей прадмовай. Гэта — падручнік.

Ды жменька маіх вершаў.

Аб лёсе іх чакаю адказа як мага худчэй.

Калі ня зможаце надрукаваць як выданьні Міністэрства Асьветы, дык будзьце ласкавы зьвярнуць назад.

Што да вершаў, дык іх можна-б было патрошку друкаваць ў «Крывічу».

Аб настроях і ўраджаньнях сваіх не пішу.

Хай адстаяцца.

Трэба й агледзіцца.

Жонцы Вашай, гр.гр. Душэўскім і Біржышкам — шчырае прывітаньне.

З пашанай К.Езавітаў.

Са сьвятам! Вітайце маёра Ружанцова!

Надсылаю Вам працяг маей стацьці «Беларуская Вайсковая Цэнтральная Рада» (пачатак у №1(7) «Крыв.»).

Надсылаю 20 экзэмпляраў «Ластаўкі». Выдана яна яшчэ год таму назад, але Пігулеўскі не паслаў нікуды, нават у беларускую прэсу ніводнага экзэмпляра. На выданьні ляжыць доўг. Дык не адмоўце пашырыць некалькі экзэмпляраў па 1-2 літу. І выбачце за гэту дробную турботу.

582.1.48:193&r

[1] У №9(1) «Крывіча» за студзень-чэрвень 1925 году надрукаваны верш К.Езавітава «Малітва Пяруну», датаваны 14.02.1925.

3710. Паштоўка Кастуся Езавітава (Люцын) Вацлаву й Станіславе Ластоўскім (Коўна) за 13.04.1925

Высокапаважаную Станіславу Пятроўну і Вацлава Юстынавіча вітаю сьвятам!

Сёнека атрымаў Вашую пісульку ад 18.IV.1924 года. Паслаў яе далей у Wilno.

З пашанай

Костусь

582.1.48:192

На паштоўцы з Гербам БНР: M.Arnheim, Berlin W. 50.

3711. Ліст Міхайлы Лазінскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.04.1925 з падзякай за дасланы «Слоўнік»

582.1.48:185&r-186&r

3712. Маніфэст Украінскага Пасольскага Клюбу за 16.04.1925 аб калянізатарскай польскай палітыцы на ўкраінскіх землях

582.1.48:187&r,189&r-190 — мк

3713. Справаздача Вацлава Ластоўскага з паездкі ў Данцыг і Рым ад 16.03.1925 да 12.04.1925

Справаздача з падарожы у Данцыг і Рым (ад 16.III да 12.IV 1925 году).

Білеты з Коўна у Эйдкунен і назад	28.-
Білеты з Эйдкун. у Бэрлін і назад	289.-
Білеты з Бэрліна у Рым і назад	610.-
Омнібус з Маріенбурга у Данц. і назад	50.-
Даў у зварот дарожных дэлегатам Віленшчыны	500.-
Сутачныя за 25 дзён	2.600.-
	———
	4.077
Атрымаў авансам:	
Ад п. Міністра Балутіса	1.500
Ад Літоўскага Пасольства ў Бэрліне (2000+200)	2.200
	3.700
Астаецца даатрымаць:	— 377

Належыцца мне даатрымаць трыста семдзесят сем літаў.

ВЛастоў...

21.IV.1925

582.1.48:188

3714. Ліст Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 23.04.1925

[...] Я абхадіў усіх консулов у Ревлі і візу можна здабыц толькі у Аргентіну, Бразылію і Венецуэлу. Яшче ня ведаю як быць, а у Эстоніі німа ні якій працы [...]

582.1.48:184

582.1.48:183 — канвэрт

3715. Ліст Адольфа Чэрнага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.04.1925

582.1.48:178

582.1.48:177 — канвэрт

Падзяка за перададзеныя нумары «Крывіча» і «Слоўнік», паведамленьне пра рэцэнзію на «Слоўнік» у №1 «Slovanského Přehleda».

3716. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Станіславе Ластоўскай (Коўна) за 27.04.1925

27.IV.25.
Рыга.

Высокапаважаная Станіслава Пятроўна,

аб настроях маіх пакуль што не пытайцеся!

Справа простая: я быў год зусім адрэзан ад сьвета, а цяперака — аглядаюся.

Аглядаюся нэрвова, бо ўсе наўкола лаюць друг-друга, даводзючы, што толькі яны добрые людзі і шчырые беларусы, а рэшта — здраднікі, дурні і яшчэ лепш.

Калі заўсёды чуеш ўсё гэта, дык цяжка захаваць спакойнае і разважлівае настраеньне. Ды гэтага і ня можна, бо калі слухаеш бяз нэрваў, дык гэта тлумачыцца, як санлівае або неспачуваючае адношаньне.

Перадраліся-ж тутака вельмі моцна.

Не памылюся, калі скажу, што «усе супраць аднаго і адзін супраць усіх».

А між тым, кожды нешта робіць. Маглі б зусім добра працаваць. Перэшкаджае манія дыктатарства.

Стараюся слухаць усіх і знайці шляхі да паразуменьня. Дужа цяжкая і няўдзячная роля. Аднак надзеі не трачу.

Не пісаў таму, што ўсе ў раз'ездах.

Сёнека атрымаў Вашы пісьма, адрасаваныя ў Люцын. Просьбы споўню. Засылаю прывітаньне.

Хай Вацлаў Юстынавіч паверне мне назад мае пераклады (на Люцын), бо яны мне тутака будуць патрэбны.

Аб сабе асабіста пахваліцца, пакуль што німа чым. На пасаду у Люцын мяне пусьціць не жадаюць. Што будзе — яшчэ ня ведаю.

Вітаю Вас і Вацлава Юстынавіча.

Шчыра дзякую за спачуваньне.

Паклон маёру Ружанцову і гр. Душэўскаму з жонкай. Хай не абражаюцца, што не пішу.

Не пішацца.

Дужа патрэбны тутака «Слоўнік».

Колькі ён каштуе?

Цісну руку.

З пашанай

К.Езавітаў

582.1.48:180&r

582.1.48:179 — канвэрт

3717. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.04.1925

Даражэнькі Вацлаў Юстынавіч,

дзякую за прывітаньня, спачуваньня і ласкавыя словы!

Аб настроях не пішу.

Прычыны — чытайце ў лісту да Вашае жонкі.

Падрабязна аб усім напішу Вам пазьней. Цяперака-ж ня хочацца спыняцца і на драбнотах.

Ян Ігнатавіч[1], Мядзіолко і я, здаецца, аканчальна выкінуты са службы.

Хачу наладзіць — і ужо пачаў — грамадзкую працу, ды бракуе грошы.

Як выйду са становішча — яшчэ ня ведаю.

Да зарэзу патрэбна свая газэта.

Раблю ўсе высілкі. Мо што і удасцца наскрэсьці. Надзей мала.

Але — трэба-ж!

Што да вершаў маіх, дык, відаць, трэба іх кінуць. Што тамака на старасьці пісаць вершы. Хай пішуць маладзейшыя.

Пераклады будзе ласкавы павярнуць на Люцын.

Дужа тутака патрэбны «Слоўнік».

Напішыце колькі ён каштуе і вышліце 10 экзэмпляраў. Я прадам і вышлю грошы.

Больш пашырыць пакуль-што не бяруся.

Разойдуцца, дык падашлеце яшчэ.

Дзіўна, што «выдаўцы» хочуць яшчэ нажывацца на беларускіх кніжках. Гэта для іх сорам.

Маглі-б кінуць на беларускую справу невялічкую жменю грошэй.

Чаму яны так жмуцца?

Ці мо лічуць, што беларусы ім многа вінны?

Ці хочуць за грош купіць цэлыя абшары?

Ці мо думаюць спэкуліраваць на беларускім друку?

Пішу па-свойску, дык напішыце і Вы мне у чым рэч. Чаго «сьціснуліся выдаўцы»?

З пашанай

Кастусь

582.1.48:181&r

---

[1] Краскоўскі.

3718. Ліст Купчанкі (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.04.1925 з падзякай за дасланы «Слоўнік»

582.1.48:182

3719. Ліст Літаратурнай Камісіі Інбелкульту (Менск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.05.1925 з просьбай дапамагчы ў падрыхтоўцы акадэмічнага выданьня твораў Максіма Багдановіча

582.1.48:161

3720. Ліст а. Паўла Сандальжы (Рым) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 3.05.1925

582.1.48:173-174

Падзяка за ліст за 19.04 і за перададзеныя нумары «Крывіча».

3721. Паштоўка Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 3.05.1925

582.1.48:175

Падзяка за перададзеныя нумары «Крывіча», «Слоўнік» і паштоўкі. «У поўдзеннай Амэріце дужа цікавяцца беларускім пытанем»

3722. Расьпіска Адама Станкевіча (Вільня) за 4.05.1925 аб атрыманьні ад Янкі Станкевіча ў Празе 25 даляраў на выданьне «Крыніцы»

582.1.48:109

3723. Ліст Францішка Чарняўскага (Рым) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.05.1925

582.1.48:170&r-170a

582.1.48:169 — канвэрт

3724. Ліст Эвальда Амэндэ (Пэрнаў) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.05.1925
582.1.48:171

3725. Праект Эвальда Амэндэ «Gründe, Richtlinien und Programm für eine Tagung der Vertreter aller nationalen Minderheiten in Europa»
582.1.04:049-064 — мк

3726. Ліст Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.05.1925
[...] квартира г-жи Рейман съ 30. Мая (суботa) къ Вашимъ услугамъ [...]
Если у Васъ есть какая нибудь интимная близкая подруга, то она также можетъ здѣсь остановиться [...]
Остальныя темы Вашего письма [за 29.04] я здѣсь не буду затрагивать, такъ какъ это слишкомъ деликатное дѣло [...]
582.1.48:172

3727. Ліст Міхайлы Лазінскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 5.05.1925
[...] Шкода, що в Празі не зустрілися [...]
582.1.48:153&r

3728. Ліст В.Бандрыўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.05.1925 з просьбай перадаць жонцы віншаваньні з нагоды імянінаў
582.1.48:162

3729. Ліст Мікіты Шапавала (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.05.1925
582.1.48:163&r-164

Аб пэрспэктывах разьвіцьця вызвольнага руху. «Мене дуже зацікавила пропозиція Вашого колеґи...»

3730. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.05.1925

Вельміпаважаны Пане Вацлаве!

Дзякую Вашэцю і Вашэцінай жонцы за павіншаваньне з Вялікаднем і адначасна выбачайце, што я не павіншаваў.

Думаю, што гэнаю заяву ад «Беларускае рады ў Празе» падпісаў студэнт Дыліс, пісар гэнае «рады» і адначасна адзіны студэнт у прэзыдыуме яе, а рэшта ўсё «ўрад». Дыліс Ліцьвін, за якога і сам сябе лічыць, хоць усюды бывае з Крывічамі і скончыў Крывіцкаю гімназію ў Вільні.

Аб брахні Цьвікевічаўскай у справе Вашага мэмарыялу у Ватыкан тут нічога ня чуваць.

Напісаў, каб прыслалі №3 «Студ. Думкі». Спадзяюся, што калі яны зачапілі, дык прышлюць. Дастаўшы як га пашлю Вашэцю.

5 экз. №4 Вашэці паслаў. З прычыны пераезду на новаю кватэру з высыланьнем вілен. газэтаў выйшла некаторая задзержка. Далей буду пасылаць акуратна.

Пасылаю ў гэтым лісьце 3 апавяданьні з «Аль-Кітабу». Апрацаваў іх прадумана і акуратна, паправак ніякіх ня будзе. Калі апрача гэтага № «Крывіча», што друкуецца цяпер, ня выйдзе яшчэ аднаго № у чэрвіні або ліпні, дык пажадана, каб усе тры гэтыя апавяданьні былі надрукаваны ў № гэтым[1]. Калі-ж выйдзе яшчэ ў чэрвіні ці ліпні, дык першае (Гісторыя аб Мар'яме) або першае і другое (спрэчка Мэккі з Мэдынаю) друкуйце ў гэтым № а трэцяе (Калі Пан Бог розум стварыў) у №, што выйдзе ў чэрвіні або ліпні. Гэта ўсё аднак толькі пажадана. Першаю карэктуру зробіце ў Коўні, а другую трэба, каб прыслалі мне. Прысылаючы карэктуру, прышлеце разам і мой арыгінал гэтае карэктуры. Пасылаючы ўпісанай бандэроляй, перасылка будзе мала даражэй стоіць.

Яшчэ ўспомню аб адным мне важным. Я ўмовіўся із транскрыбавацелкаю, што, як будзе друкавацца, дык за друкаваны тэкст «Аль-Кітабу» яна дастане гонорар. За друкаванае ў №2(8) я ёй як га заплаціў. Дык пры друкаваньні цяпер пасыланага майце гэта на ўвéце, каб не паставіць мяне ў нягоднае, бязвыхаднае палажэньне.

Із шчырым паваж... ЯСт...

Паказі як друкаваць пасыланы тэкст «Аль-Кітабу».

1)На кожнаю балону «Крывіча» памяшчаць толькі, колькі ўвойдзе, але кожнаю балону «Аль-Кітабу» адлучаць ад другое, далейшае яго балоны дзьвюма лінейкамі (думаю гэтак найляпей) як паказана ў мяне ў рукапісе.

2) На боку паказаць балоны «Аль-Кітабу» (як напісана ў мяне)

3) Радкоў не ламаць.

4) Выясьненьні зробіце ў канцы кожнае балоны «Крывіча».

5) Другую карэктуру прышліце мне.

Я Станкевіч

7.5.1925

582.1.48:166&r-167

[1] Крывіч. №9(1). Студзень-чэрвень 1925.

3731. Ліст Рамуальда Зямкевіча (Варшава) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.05.1925

Даражэнькі Дзядзька!

Доўга чаканы ліст Ваш атрымаў. Атрымаў такжа «Слоўнік» і камплект «Крывіча». Пасылкі прыйшлі без паметкі цэнзуры, без аплаты пошліны (сła) да майго бюра, возны Кантроля іх квітаваў, адным словам проста знамяніта. У нас накладаюць пошліну (сło) на кожную англійскую, французскую, нямецкую і наагул загранічную кніжку. Трэба Вам ведаць што нашае «Najwyższej Izby Kontroli Państwa» у Польшчы страшэньне баяцца, бо мы даказываем зладзействы усюды нават у міністэрствах, аддаемо пад суд, а залежым адно толькі ад Сойму і Сэнату, не слухаючы апроч іх нікога і ня лічачыся ні з кім. Як бачыце служба мая у гэткай установе дае мне шмат улады і «гоноровае» важнасьці. А і кавалак хлеба нішто. Як працоўнік «чугуначнаго аддзелу» маю безплатны білет I клясы на усе польскія чугункі. Прыходзіцца езьдзіць «па рэвізіі» вельмі

часта. Дзеля таго лёгка мне кожны раз з'ездзіць у Гданск. Але усё гэта аддаў бы, ня думаючы хвілінкі, каб толькі мог працаваць для сваіх і у сваіх у Вільні.

За усё высланае шлю Вам шчырую ад сэрца падзяку. У даўгу не астануся, буду Вам высылаць усё больш менш цікавае з новае літэратуры і дублеты якія ёсьць у мяне. Перадайце паклоны ад мяне панам: Ромэру, Янулайтісу і Біржышцы і перадайце што хацеў бы навязаць з імі літэратурныя зносіны (шмат цікавых кніжак, ім ня знаных мог бы ім пасылаць). Наладзіць гэткія зносіны як з Вамі так і з імі лічыў бы вельмі патрэбнымі і узаемна карыстнымі. Пана Ромэра бачыў у Вільні у Луцкевіча, калі ён перад Калядамі праз Латвію з Коўна у Вільню дастаўся. Людзі гэтыя для мяне вельмі сымпатычныя і высока іх шаную. Адносіны іх да мяне заўсёды былі добрымі — а я гэта добра памятаю. Могуць заўсёды шчыра да мяне адносіцца і ва усіх іх патрэбах памагу ад шчырага сэрца. Думаю што мая прапазіція павінна быць праз іх прынята. Дык выкарыстайце мяне як чалавека у моцнай маей пазыціі у Польшчы.

З літоўскіх выданьняў патрэбны мне: бібліаграфічны журнал «Knygos» ад 1922 году да апошнягу часу і кніжка: Ptaszek, Podręcznik do nauki języka litewskiego. Не маю камплекта «Беларускаго Сьцягу» і іншых Вашых ковенскіх беларускіх газэт. Калі ласка — прышліце.

Мушу Вас павіншаваць са стацьцёй аб Скарыне у №8 «Крывіча»[1]. Так я разумею выдаванне студыяў аб нашых пісьменнікаў. Без іллюстрацый выдаваць не павінны. Падкрэсьліваю факт надта важны (аб чым я ужо у 1917 годзе у «Вольнай Беларусі» пісаў) усе рысункі, літары і застаўкі Бібліі Скарыны дзе толькі на іх нарысаваны гэрб Скарыны (сонца і поўмаладзік) ёсьць яго уласнымі рысункамі. Гэрб у данным выпадку заступае подпіс. Аб гэтым ніхто неяк ведаць ня хоча. Подпіс пад партрэтам Скарыны ТМЗ не ёсьць подпісам беларуса мастака, а подпісам вядомаго штыхара, прозвішча якога не пам'ятаю, але гэта расшыфравалі ужо расейцы Стасовъ і Ровинскій. Аб Скарыне як аб першым беларускім «графіку-мастаку» гатоўлю стацьцю. Хацеў яе друкаваць у «Заходняй Беларусі» але скарэй за усё пашлю Вам да «Крывіча»[2].

У Гданску трэба нам пабачыцца. Калі думаеце далей выдаваць «Крывіча» дык дам шмат матэрыялу нават палітычнаго. Хачу апісаць свае уражэньні з Беластоцкаго працэссу. Ці гэта бы падыйшло? Наагул з палітычнаго боку ведаю шмат, але надта кампрамітуючаго нашых дзеячоў, бо ёсьць паслы беларусы што служаць у палітычнай дэфэнзыве, іншыя дык проста у паліцыі. Адны другіх лаюць і сваю віну зваліваюць на другіх. Кажу Вам шчыра: гэткаго катуху з памыямі мусі быць нігдзе няма. Вось да чаго дажылі. Цешуся што паміж намі навязаліся ізноў зносіны. даўно гэта трэба было зрабіць. Я як інтэлігентная сіла мог быць памоцным шмат у чым. Памятайце аб гэтым і выкарыстывайце пры кожнай зручнасьці. Быў я у зносінах з Варонкай але ён ня умеў ці не хацеў мяне зразумець. Што з ім цяпер? Кланяйцеся Якавюку.

Бедны Антон Грыневіч з голаду прымушаны быў уцячы з Вільні у Менск. Там яму далі эмэрытуру да канца жыцьця, а у Вільні Луцкевіч і нашыя «ідэовыя» дзеячы глядзелі спакойна як ён галадаў. Гэткая грязь і балота у Вільні абурывае мяне страшэньне. А я страціў найбліжэйшаго

мне па сэрцу і думцы прыяцеля у Вільні, бо з Менскам зносін не маю і трудна іх навязаць. Канчаю мой ліст і прашу Ваш пісаць магчыма найчасьцей. Кніжкі як толькі разьбяруся з пакамі — вышлю Вам.

Затым бывайце здаровы

Ваш

Р.Земкевіч

Варшава

8.V.1925

Пішыце на адрэс Izby Kontroli Państwa

582.1.48:158&r-158a&r

582.1.48:156 — канвэрт

Ліст перасланы праз Бандрыўскага (Бэрлін). [1] Доктар Францішак Скарына: (1525-1925) // Крывіч. №2(8). Красавік-сьнежань 1924. [2] У №10(2) «Крывіча» за ліпень-сьнежань 1925 году надрукаваны артыкул М.Н. «Крыўскія рытаўнікі».

3732. Ліст адміністрацыі часапісу «Slovanský Přehled» (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.05.1925

582.1.48:160

582.1.48:159 — канвэрт

Паведамленьне аб аднаўленьні выдаваньня часапіса пад рэдакцыяй Адольфа Чэрнага пасьля 11-гадовага перапынку й прапанова супрацоўніцтва.

3733. Ліст Рамуальда Зямкевіча (Варшава) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 11.05.1925

Даражэнькі Дзядзька Вацлаў!

Пасылаючы Вам у другі раз ліст, які мне назад адаслалі, яшчэ раз дзякую за высланыя нумэры «Крывіча», даносячы пры зручнасьці што пісулькі у сярэдзіну «Крывіча» уложаныя атрымаў без ніякіх перашкод. Асабліва дзякую Вам за іх, бо іх тут у нас ніхто ня бачыў і ня ведае. Дублеты аддаў Леўчыку, Гапановічу ды іншым беларусам.

Пакуль што з кніжак пасылаю Вам:

A.Jabłonowski, Akademia Kijowsko-Mohilańska. Kraków 1899, у якой шмат знойдзеце да беларусазнаўства.

Далейшыя кніжкі высылаць буду ад часу да часу.

Прашу Вас не забываць аба мне і высылаць Вашыя, пражскія, бэрлінскія і савецкія выданьня. У даўгу не астануся і рэчы добрыя, а нязнаныя Вам прышлю.

Ваш Р.Земкевіч.

Прашу да мяне адрэсаваць у гэткім парадку слоў:

Izba Kontroli Państwa

dla inż. Romualda Ziemkiewicza

ulica Złota 22, III piętro

Warszawa / Polen

P.S. Антон Грыневіч у вялікую пятніцу (нов. стылю) уцёк з Вільні у Менск. Пагражаў яму прысуд да 5 гадоў вастрога за нелегальны праход граніцы (у 1920 годзе!) і за ліст які адтуль прывёз (з Менску), які цяпер толькі расшыфравалі.

Бедны у Вільні галадаў, тамака у Менску дастае эмэрытуру да канца свайго жыцьця за грамадзкія заслугі.

Страціў я цяпер у Вільні найлепшаго і найбліжэйшаго мне прыяцеля. Няма чаго туды езьдзіць, бо Ант. Луцкевіча нашаго важнаго «архі-бонзу» я не надта паважаю за яго устрымовываньне культурнаго беларускаго разьвіцьця.

Р.Земкевіч

582.1.48:157&r

582.1.48:155 — канвэрт

Ліст перасланы праз Бандрыўскага (Бэрлін).

3734. Ліст Міколы Ільляшэвіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 15.05.1925

582.1.48:154&r

Разам з дасланымі для «Крывіча» артыкуламі «Гдзе старыя белар. грошы» і «З кніжнае выстаўкі С.С.С.Р.».

3735. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.05.1925

Вельмішаваны Спадару Вячаславе,

Пішучы Вашэці ліст, забыўся я Вашэцю папрасіці, каб Ваша прыслаў мне гэнаю выпіску, зь якое відаць, што аўтар выдадзенага ў Вільні крывіцкага слоўніка 1596 г.[1] паходзіў зь Віленшчыны. Дык калі ласка прышлеце мне гэнаю выпіску. Прасіў мяне Ільляшэвіч (нішто дзяцюк) пераслаці Вашэці дзьве ягоныя зацёмкі. Адначасна тут пасылаю заяву на кніжкі. Калі будуць прысланы, дык думаю пасылаць па крысе знаёмым нашых студэнтаў крывічом загранічаю і ў Бацькаўшчыне, каб гэткім парадкам шырыць сьвядомасьць. Прывітайце ад мяне сваю жонку і перадайце падзяку Вашэцінму памагатыру (памагаю, памачніку) із слонімскага павету за прысланыя кніжачкі «Гутарка Тараса з Панасам».

Із шчырым паважаньнем

Я.Станкевіч.

18.V.1925

P.S. Ільляшэвіч канчае вельмі мякка для бальшавікоў, трэ было-б кончыць нагонкаю ім.

582.1.48:151&r

[1] Л.Зізані.

3736. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Станіславе Ластоўскай (Коўна) за 20.05.1925

20.V.1925.

Рыга.

Высокапаважаная Станіслава Пятроўна,

даць Вам свой «сталы адрас» ніяк пакуль што не магу, бо ніякае сталасьці цяперака, асабліва ў адрэсе і службовым становішчы, у мяне німа.

Жыву «часова» ў рыжскіх беларусаў ўжо з месяц. Чакаю са дня на дзень «вазстанаўленьня» ў правох і пасадзе, але справа тармазіцца.

Лісты з Люцына мне сюды пасылаюць, а таму пашлюць і ліст ад Вашае сястры.

Я-ж ўжо яго не затрымаю.

Ваша пісьмо ей паслаў ў той жа дзень, як атрымаў.

Не пішу Вам таму, што дужа заняты, ды і пахваліцца пакуль-што німа чым.

Сёнека зацьвердзілі, нарэшці, палітычнае беларускае Т-ва «выбаршчыкаў-беларусаў».

Худка выязжаю на арганізацыю адзелаў.

Працую над стварэньнем тутака беларускае газэты.

Як «Крывіч»?

Ці выйшаў № далейшы?

Будзьце ласкавы, да рэчы, выслаць па камплекту «Крывіча» рыжскім беларускім культурна-прасьветным Т-вам:

1) «Рунь» Riga, Lačpleša iela, 155.

(лепш старшыні Т-ва у хату

Riga, L. Maskavas iela 80 кв. 18

I.Ščorsu)

2) «Biełaruskaja Chata» —

Riga, Tumes iela, 2.

У апошнім Т-ве я цяперака жыву. На гэта Т-ва мне можна і пісаць, зноў жа — «часова».

Вітаю Вацлава Юстынавіча і маёра Ружанцова.

З пашанай К.Езавітаў

Аб сумных навінах — на пасьледак:

ўчора вячэрнім цягніком ад'ехала ў Менск Паўлінка[1] з Зыгмусям.

582.1.48:148&r-149&r

[1] Мядзёлка.

3737. Ліст Эдмунда Зузэміля (Данцыг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.05.1925

[...] Меня спѣшно только что вызвали въ Danzig на совѣщаніе [...]

582.1.48:145&r

3738. Ліст Эдмунда Зузэміля (Данцыг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.06.1925

[...] встретилъ ожидаемыхъ «заморскихъ гостей» [...]

582.1.48:143

3739. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Інстытуту Беларускай Культуры (Менск) за 2.06.1925

Інстытуту Беларускай Культуры ў Менску.

У мяне маюцца лісты і крыху твораў М.Багдановіча, але не пры мне, ня ў Коўне, і ў хуткім часе дабыць іх няздужаю. З большых паэмак ёсьць ў

маім архіве «Каханьне і сьмерць», але, спадзяюся, Вы гэта знайшлі такжа ў паперах нябошчыка Максіма. Спробую, і калі мне удасцца выпісаць мае архівы і ў цэласьці атрымаць іх, то ўсё, што маю ахвотна перашлю Вам.

Што датыча успамінаў аб М.Богдановічу, то яны прыгатаваны ў мяне да чароднага нумару «Крывіча»[1] і калі Вам падойдуць — друкуйце ў сваім зборніку.

Разам з гэтым лістом пасылаю Вам свой Слоўнік. Прашу на абмен выслаць мне апрацаваную Інбелкультам тэрміналёгію.

Мне для навуковых прац бывае патрэбна літэратура, якую я дагэтуль пазычаў з бібліятэк нямецкіх і эстонскіх. Ці Інбелкульт нямог-бы часам служыць мне сваімі кнігамі? Паруку за цэласьць кніг можа даць Літоўскі Унівэрсытэт, а ўсе кошты зьвязаныя з перасылкай я ахвотна бяру на сябе.

З пашанай ВЛастоўс...

2.VI.25.

Коўна

582.1.48:144&r

[1] Надрукаваныя ў №1(11) «Крывіча» за студзень-чэрвень 1926 году.

3740. Копія ліста Яўгена Петрушэвіча (Бэрлін) Міхайлу Лазінскаму (Прага) за 6.06.1925 у справе Парыскага Камітэту Паняволеных Нацыяў

582.1.48:141

3741. Ліст Яўгена Петрушэвіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.06.1925 у справе Парыскага Камітэту Паняволеных Нацыяў

582.1.48:142

3742. Ліст Унівэрсытэцкай Бібліятэкі (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.06.1925

[Просьба вярнуць да 15.06 узятыя ў бібліятэцы кнігі:]

Wiszniewski. Hist. lit. polsk. T.7[1]

Шахматовъ. Пов. врем. дѣлъ T.I[2]

Шахматовъ. Сказ. о призв. вар.[3]

Шахматовъ. Изслѣд. о Двин. Гр.[4]

582.1.48:135

[1] Wiszniewski M. Historya literatury polskiej. T.7. Kraków, 185?.

[2] Шахматовъ А. Повѣсть временныхъ лѣтъ. Т.1. Петроградъ, 1916.

[3] Шахматовъ А. Сказаніе о призваніи варяговъ. СПб., 1904.

[4] Шахматовъ А. Изслѣдованіе о Двинскихъ грамотахъ XV в. Ч.1-2. СПб., 1903.

3743. Копія ліста Міхайлы Лазінскага (Прага) Яўгену Петрушэвічу (Бэрлін) за 11.06.1925 у справе Парыскага Камітэту Паняволеных Нацыяў

582.1.48:127&r — рк

3744. Ліст Давіда Анэкштэйна (Ганд) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.06.1925

582.1.48:137&r
582.1.48:136 — канвэрт

Аб маючым адбыцца «беларускім працэсе» ў мясцовым судзе - Д.Анэкштэйн супраць Аляксандра Экка, «фальшывага расейскага прафэсара»

3745. Ліст Мікіты Шапавала (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.06.1925 аб сустрэчы ў Празе з Канавальцам і Галавінскім

[...] З того, що говорив Головинський, я зрозумів, що він де-що знає про ту справу, про яку Ви і п. П. говорили зо мною в квітні місяці [...]

582.1.48:134

3746. Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага (Коўна) Кастусю Езавітаву (Рыга) за ??.06.1925

Высокапаважаны Канстантын Барысавіч.

Атрымаў учора ад Вас тры брашуркі: 2 статуты і праграму. Але чаму гэта надрукавана «гарацкія»? Слова горад пішацца-ж не праз «т» (Горад, а ня горат). Выглядае гэта спамылка больш чым брыдка, бо наводзіць на мысль, што аўтор ці карэктар запраўды пішуць: горат, хлеп, боп, лоп, гвозт...

Прынамні ужо пяты раз прашу у Вас пазычыць мне «Витебскую Старину» і не атрымлівую ніякай адпаведзі. Самі ведаеце, што мне гэта кніга патрэбна не для забавы, а для сурьёзнай работы. Дык вельмі прашу Вас адкажыце ўрэшце так ці іначы.

Перад судом я праз п. Сахарава паслаў Вам на працэс сваіх асабістых грошы, пазыкова, 50 доляраў. Не маючы дагэтуль ад Вас пацьверджаньня ў атрыманьні гэтай пазычкі, ня ведаю што маю думаць: атрымалі Вы яе, ці не?

Да мяне зьвярнуўся адзін з выдатных Латвійскіх дзеячоў з гэткай прапановай. ~~Калі беларусы ў Латвіі хочуць каб ім латвійскі урад аказываў шырокую дапамогу, то латвійскі урад будзе аказываць падтрымку беларускаму руху ў Латвіі як і раней, а нават шырэй яшчэ, калі ў латвійскіх беларусаў знойдзецца група якая будзе цесна супрацоўнічаць з латвійцамі і вырачэцца сэпэратызму...~~

82.1.48:147&r, 150

Дакладная дата невядомая.

3747. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.06.1925

16 чэрвеня 1925 г.

Высокапаважаны Вацлаў Юстынавіч,

паслаў Вам №1 газэты «Голас Беларуса»[1] і прашу не адмовіць напісаць аб ураджаньнях Вашых.

Вельмі шкадую, што ўсё яшчэ не магу задаволіць просьбы Вашай аб «Вітабскай Старыне», бо мая бібліятэка ў Люцыне, а я часова ў Рызе.

Грошы Вашы ад гр. Сахарава я атрымаў ужо з месяц часу, бо яны увесь час былі як залог унесены за мяне Суду, пакуль пастанова не вайшла ў законную моц.

За зробленую Вамі падтрымку ў цяжкі для мяне момант шчыра дзякую. Маю надзею, што буду мець магчымасьць паквітацца з падзякай.

Дзеля таго, што я увесь час нашуся па весках, прашу пісаць мне на рэдакцыю. Мне падышлюць.

На рэдакцыю-ж прашу выслаць мне і «Крывіч».

Будзьце ласкавы напісаць якім чынам магу я атрымаць хаця-ж бы штук з 10 Вашых «Слоўнікаў», бо тутака просяць вучыцелі. Яны гатовы і заплаціць за іх, але ня ведама каму, куды і колькі падаслаць.

Думкі Вашы аб дзяржаўным будаўніцтве Беларусі я падзяляю, хаця-ж лічу, што яны не супярэчаць тым фактам і тэндэнцыям, што выкладзены у маіх успамінах аб «Белвайскцэнтрадзе», бо іншы раз здрада аднаго чалавека пераварочвае ўсю справу да гары нагамі. Што сілаў у нас мала — гэта праўда, але гэтага я ня мог афішыраваць у сваіх успамінах.

Па лісту Вашаму адчуў я нейкую нэрвовасьць.

Як Вашы справы, Вацлаў Юстынавіч?

Цісну руку. Вітаю Станіславу Пятроўну.

З пашанай К.Езавітаў

P.S. Як справа з юбілейнай Скарынаўскай кнігай? Ці худка выйдзе?

582.1.48:139&r

3748. Ліст Міхайлы Лазінскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.06.1925 у справе Парыскага Камітэту Паняволеных Нацыяў

582.1.48:125&r-126

3749. Заклік да Лігі Нацыяў і цывілізаванага сьвету Парыскага Камітэту Паняволеных Польшчай Нацыяў за ??.06.1925

582.1.48:128&r-129&r — мк

582.1.48:130-133 — мк

Дакладная дата невядомая. Складзены М.Лазінскім — у справе польскага тэрору.

3750. Ліст Францішка Чарняўскага (Рым) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.06.1925

582.1.48:121a&r-121d&r

582.1.48:120 — канвэрт

3751. Паштоўка Кастуся Езавітава (Рыга) Станіславе Ластоўскай (Коўна) за 25.06.1925

25.VI.25. Рыга.

Высокапаважаная Станіслава Пятроўна,

ці ня можаце Вы мне парадзіць як атрымаць «Слоўнік» для тутэйшых вучыцялеў? Я хацеў бы мець на камісію 10-20 экзэмпляраў. Зараз ідуць летнія курсы. Кожын хоча мець «Слоўнік», а я ня маю. Вучыцялі заплацюць і грошы, але трэба-ж каб «Слоўнік» быў тутака.

Напішыце мне яго кошт, а калі можна, дык разам і вышліце першы дзясятак. Я дам абвестку у газэце, сьпішуся з вучыцялямі, з некаторымі прост пагутару, бо яны у Рызе, і справа пойдзе. Трэба-ж даць магчымасьць «Слоўнікам» карыстацца.

З пашанай К.Езавітаў
Пішыце на Рэдакцыю.
Хацеў бы пасылаць газэту Душэўскаму і Біржышко, ды згубіў адрасы іх.
582.1.48:119

3752. Ліст палкоўніка Яўгена Канавальца (?) Прэзыдыюму Саюзу Беларускіх Стральцоў (Коўна) за 26.06.1925 у справе Парыскага Камітэту Паняволеных Нацыяў
582.1.48:123&r-124d&r
582.1.48:122 — канвэрт

3753. Тэлеграма [Адама] Станкевіча (Данцыг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.06.1925
=czattan dwa dni najcie akanczalny adkaz na warszawu ci praz litoucau ab prajektach szto zhawarylisea z haroniaj = stankiejicz=
582.1.48:272

3754. Тэлефанаграма Антона Матача (Коўна) Вацлаву Ластоўскаму (Пакярпе) за 30.05.1925
Pakerpė: Ukmergės apskritis, Musninkų valstis
Antanas Matačas per telefoną prašo Tamsto, tuojaus pirmu traukiniu grįžti Kaunan.
Buktai yra gauta iš užsienio telegrama labai svarbiais kokiais ten reikalais.
Sakyta, kad už nunešimą šio bus atlyginta pasiuntiniui Tamstos lėšomis.
582.1.48:118

3755. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 2.07.1925
RIGA, 2 ліпеня 1925
Высокапаважаны Вацлау Юстынавіч,
дужа усьцешаны я Вашаю цікавасьцьцю да газэты нашае і Вашым абяцаньнем парады.
Дауно ужо зьбіраюся я выпусьціць тутака хаця-ж бы самую маленькую беларускую газэтку але перашкодзілі рожныя спрэчкі і слабыя сродкі. Цяжка з апошнімі і цяперака, але, як у №3 угледзіце, усе-ж грамадзянства адгукнулася. Мо і пратрымаемося.
За зробленыя увагі шчыра дзякую. Яшчэ болей бы дзякавау, калі-б Вы не адмовіліся даваць такія-сякія матарыялы, асабліва-ж для народу, бо з гэтым у мяне зусім блага, — прызнаюся.
Наконта лекцыяу Вашых спарушыу справу. Пасылаю Вам копію разасланае паперы.
Напрамак газэты, як бачыце, зусім не аппазыцыйны да Ураду. Мы толькі адзначаемо свае крыуды, каб на гэта зьвярнулі увагу. Інфармацыі у нас вузкаватыя, бо мы хочама наупэрад даць асьветленьне нашым тутэйшым локальным справам.
Пагутарыць з Вамі вельмі пажадана і я хацеу-бы худчэй тутака Вас пабачыць.
Чакаемо і чарговы № «Крывіча».

Маю да Вас вялікую просьбу: дапамажыце мне атрымаць на камісыю штук 20 Вашага новага «Слоуніка». Паперу аб гэтым да Міністэрскага Склада дадаю, каб Вы перадалі яе асабіста, тады, я у гэтым пэуны, справа пойдзе худчэй.

З надзвычайнай няцярплівасьцьцью чакаемо усе мы тутака кнігі Вашае аб Ф.Скарыне і аб беларускай кнізе наагул.

Маю для Вас цікавую навіну: у Дзьвінску закладаецца беларускае культурна-прасьветнае таварыства пад назовам «Крывіч». Гэта — вынік Вашае працы. Прывіваецца крывіцкі тэрмін і нашае моладзі. Можаце гэта прасачыць па вершам «Ластаукі» (ці атрымалі Вы друкаваны зборнік яе) ды і у газэце будуць, матарыялы ужо есьць.

Шчыра вітаю

К.Езавітаў

582.1.48:115

582.1.48:116 — канвэрт

3756. Ліст Цэнтральнага Праўленьня Беларусаў-Выбаршчыкаў (Рыга) праўленьням Дзьвінскага, Люцынскага й Краслаўскага Аддзелаў Таварыства за 2.07.1925 з просьбай абмеркаваць прапанаваны прыезд В.Ластоўскага дзеля чытання лекцыяў для латыскіх беларусаў

582.1.48:117

3757. Ліст Прэзыдэнта Ўкраінскай Нацыянальнай Рады Яўгена Петрушэвіча (Бэрлін) Міхайлу Лазінскаму (Прага) за 3.07.1925 у справе Парыскага Камітэту Паняволеных Нацыяў

582.1.48:112-114 — мк

3758. Ліст Прэзыдэнта Ўкраінскай Нацыянальнай Рады Яўгена Петрушэвіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 4.07.1925 у справе Парыскага Камітэту Паняволеных Нацыяў

582.1.48:110&r-111

582.1.48:97 — канвэрт

3759. Заява Вацлава Ластоўскага (Коўна) «дырэктару Міністэрства Закардонных Спраў» Ігнасу Янінасу (Коўна) за 6.07.1925

ЯГО ДАСТОЙНАСЬЦІ
ДЫРЭКТАРУ МІНІСТЭРСТВА ЗАКАРДОННЫХ СПРАЎ
п. І. ІОНІНАСУ

Грам. В. Ластоускага, Вітаута пр. №30

ЗАЯВА

Па Вілкомірскім Шоссэ на Зяленай гарэ мною куплены дом №147, у якім прапаную «Беларускаму Цэнтру у Літве» заняць 6 пакояў.

Дзеля таго, што дом вымагае грунтоунага рэмонту, на які трэба выложыць значную сумму грошы, уважліва прашу Пане Дырэктару даць сваю згоду і зрабіць захады аб узысканьні згоды п. Дзяржаунага Кантралера на выдачу мне авансам за кватэру пад «Беларускі Цэнтр у Літве» шасьці тысяч (6.000) літау на гэткіх варунках:

Атрымаушы згары 6.000 літау я здаю у арэнду у маім доме шэсьць пакояу «Беларускаму Цэнтру у Літве» на чатыры гады, што будзе станавіць па 1.500 літау гадавой арэнды або па 125 літау у месяц.

У выпадку калі-б «Беларускі Цэнтр» з якіх колечы прычын перастау істнаваць, то арэндны тэрмін на кватэру астаецца у распараджэньні п. Дырэктара Міністэрства Закардонных Спрау

582.1.48:108 — мк

3760. Ліст Казіміра Кулака (Рым) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 08.07.1925

582.1.48:105&r-106&r
582.1.48:104 — канвэрт

Аб спробе ўвесьці назоў «Крывічы» сярод беларускай хадэцыі; палеміка з Ластоўскім вакол ягонай прапановы «стварыць сваю ўласную веру».

3761. Ліст Тамаша Грыба (Радацін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 8.07.1925

8.VII.25, Radotin.

Даражэнькі Вацлаве!

Ніяк не магу дагадацца, што магло такога здарыцца ў апошні час, што ты не адпісваеш на мае пісьмы. Я зусім шчыра быў паставіў некалькі запытаньняў адносна нарады, якая ўжо адбылася — наша адношаньне да гэнай нарады гл. у Бюлетэні №1 Загр. Гр. Б.П.С.-Р. Але з Коўні поўнае маўчаньне. Знача ня хочуць мець ніякага дачыненьня ці што? Але чаму? Што думаюць рабіць тыя, якія не прыймалі учасьце ў Нарадзе? Будуць маўчаць? Поўны адказ ад палітычнай дзеяльнасьці? Можа не? То што тагды? Цяпер больш чым калі небудзь патрэбна выразнае адношаньне да адбываючыхся падзеяў. А вы, паважаныя сябры, маўчыцё.

Найбольш нас дзівіць, што ні слова няма ад Язэпа М<амонь>кі. Абецаў пісаць, як ехаў і на табе — ні слуху ні духу. А тут у Празе чорнай зьмяёй паўзуць розныя плёткі. Людзі цьвердзяць, што Язэп быццам-то з Літвы высланы. Куды? — ніхто гэтага ня ведае. Тым больш пачынае нас трывожыць яго доля. Што з ім і дзе ён? Ці ня мог бы ты што небудзь напісаць. Тым больш што ён бываў у цябе. Калі ўзапраўды ён высланы з Літвы, то дзеля якой прычыны? Ня буду ад цябе гэта хаваць: твае ворагі пашыраюць тут чуткі, што быццам-то па тваей просьбе ён быў высланы з Літвы. Мы ў гэта ня хочамо верыць. Просім дакладна высьвятліць нам справу. Нас трывожыць, як сам факт высылкі, калі яна узапраўды адбылася, гэтак і плёткі, якія снуюць па Празе аб тваім учасьці ў гэнай высылцы. Даражэнькі Вацлаве, зараз-жа напішы, як і што. Чакаю. Бывай.

Цісну руку. Тамаш

582.1.48:107&r

3762. Паштоўка Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.07.1925

Даражэнькі Вацлау Юстынавіч,

да гэтага часу ня маемо мы новага нумэру «КРЫВІЧА»[1]. Вы пісалі, што ен нібыта ужо вышау з друку. Будзьце ласкавы паслаць на Рэдакцыю некалькі намяроу.

Ці перадалі Вы паперу маю у Міністэрства Беларускіх Спрау, і што яны мне не адказываюць на маю просьбу?

Вучыцельства хутка раз'едзецца з курсау і тады будзе патрэбна разсылаць «Слоунік» па весках, а гэта зноу будзе каштаваць лішнія грошы.

З пашанай чакаю адказу.

К.Езавітаў.

582.1.48:102

[1] Крывіч. №9(1). Студзень-чэрвень 1925.

3763. Ліст Яўгена Ляцкага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.07.1925 у справе кнігаабмену з выдавецтвам «Пламя» і бібліятэкай Славянскага Інстытуту ў Празе

582.1.48:103

3764. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.07.1925

Вельміпаважаны Спадару Вацлаве,

Нічагусенькі ад Вашэці ня чуваць. Як із «Крывічом»? Ці выйдзе ён[1]? Калі ня будзе друкавацца пасланая Вашэці транскрыпцыя з «Аль-Кітабу», дык зрабеце ласку адашлеце мне яе назад.

А калі выйдзе «Крывіч» і яшчэ ня позна, дык я хацеў-бы прыслаць чыста навуковаю стацьцю «Аб ацьвярдзеньні *л* ў крывіцкай мове». Займе 4-5 балонак «Крывіча». Чытаў яе рэдактар «Славіі» проф. Гуер і пахваліў. Яе мне толькі трэба перапісаць пабеларуску на чыста. Адпішэце пісулькай. Калі можна прыслаць, дык я на другі дзень пашлю*. Ня хачу друкаваць у «Slavii», бо 1) няма ведама калі далейшы № «Slavii» выйдзе а 2) што дзеля крывіцкае літаратурнае мовы гэта будзе мець і практычнае значэньне. Мог бы яшчэ Вашэці прыслаць разбор «Беларускага правапісу» Р.Астроўскага, крытыку гісторыі Пічэты («заместа рэцэнзіі») і рэцэнзію «Нарысы гісторыі літаратуры» Янчука. Хачу з Вашэцям параіцца, што маю рабіць з рэцэнзіяй Вашэцевага слоўніка. Яна напісана па чэску і аддадзена ў «Slaviju». Але хто ведае, калі выйдзе гэты № «Slaviji», бо № папярэдні, той у які я даў рэцэнзію аб «Крывічу» яшчэ ня выйшаў (карэктуру рэцэнзіі я ўжо чытаў). Напеўна ня выйдзе раней як у лістападзе а мо' й пазьней. Бачыце, «Slavija» выходзіць 4 разы ў год, пры гэтым часта злучаюць 2 № (два нумэры) ў адзін. Апрача таго «Slavia» так сказаць абстрактна навуковае выданьне. Дзеля гэнага ў ёй шмат аб слоўніку не напішаш, бо не надрукуюць. Усё грамадзка-нацыянальнае значэньне гэтага слоўніка не магло-б быць апісана. Ведаю гэта ўжо і з собскага дазнаньня. Рэцэнзію аб «Крывічы» мне проф. Гуер скараціў болей як тры разы. Друкаваць жа рэцэнзію аб слоўніку на якія дзве балонкі выглядала-б несур'ёзна. Калі-ж ня ў «Slavii», дык можна было-б надрукаваць у «Крывічы» або можа у «Przeglądzie Wileńskim». Хацеў-бы ведаць Вашэцяў пагляд на гэтую справу.

Пасылаю вашэці ў гэтым конвэрце квіт на 25 (дваццаць пяць) даляраў. Значыцца з грошай дадзенымі Вамі мне асталося яшчэ неапраўданымі дзьвесьце пяцьдзесят літаў або 25 даляраў. З гэтага дзесяць даляраў я расходаваў і за якісь час прышлю Вашэці расьпіскі.

Аб 150 літах прачытайце ніжэйшае. Сто літаў і сто чэскіх каронаў у мяне ўкралі па маёй неасьцярожнасьці. Я палажыў іх у старую адзежу, якую потым захацеў прадаць. Прадаючы адзежу, прадаў разам і грошы. Рэшта каля двух далярaў праеў на зяленіве, лечачыся ад пачаткаў цынгі. Мне, вядома, ніколі ня прыходзіла ў дум, што гэтыя грошы ў мяне прападуць. Я думаў, зараблю і ўжыву згодна з назначэньнем. Але з гэтым заробкам ня так лёгка. Вы ня мелі грошаў заплаціць мне гонорар, за матар'ял друкаваны ў апошнім № «Крывіча»[2]. Я Вам прапаную зрабіць гэтакаю рэч. Замеcта грошай на суму, на якую надрукавана, прышлеце мне расьпіску, што на гэнаю суму дастана ад мяне апраўдальных дакумэнтаў. А я вам пашлю расьпіску, што на гэнаю суму дастаў ад Вашэці гонорару**. А потым із сваіх грошаў папоўніце грамадзкі фонд, ведама ўжо без ніякіх адносінаў за мной. Калі гэтак зробіце, дык здымеце з маіх грудзёў цяжар. Зазначу яшчэ, што гонарар за транскрыпцыю з «Аль-Кітабу» ў гэткае разьлічэньне ня мог-бы ўвайсьці, бо за друкаванаю транскрыпцыю я мушу плаціць заўсёды гонорар транскрыбаваделцы.

З Вільні пішуць, што надзеі выдаваць там беларускаю ґазэту ці часопісь чыста беларускаю, г. зн. не ў камуністычным кірунку не ўдаюцца. Пастарайцеся пераканаць Ліцьвіноў, што гэткая ґазэта ня толькі патрэбна нам але і ім. Пакуль ня будзе гэткай ґазэты, патуль варожыя Ліцьве розныя «Іскры» будуць мець уплыў.

Вы ўжо ведаеце, што ў Празе арганізавана «Крывіцкае (Беларускае) Культурнае Т-ва Д-ра Фр. Скарыны». Праўдзівая корэспондэнцыя аб ім была надрукавана ў адным № «Крыніцы».

Добра, што пад назовам «Крывіч» мае арганізавацца т-ва ў Лацьвіі. У ваднаднёўцы «Жыцьцё вёскі» надрукавана проці назову «Крывіч» а разам і нас з Вамі правакацыйная корэспондэнцыя, у якой што ні слова, то мана. Ніякія «дрыгвічы» ў Празе не зьявіліся і ніколі проці назову «Крывіч» не пратэставалі; так сама як і ніхто не протэставаў. Нашае т-ва дасьць афіцыяльны адказ на гэтую провокацыйнаю ману.

Прывітаньне Вашэцявай жонцы.

Што чуваць аб бел.-літ. супрацоўніцтве, аб чым Вы казалі ўвясну ў Празе.

Я.Ст...

Мой адрэс цяпер:
Praha, Pankrac
Podlipného ul. H. 463
u p. Fr. Pavlička

---

* Ня маючы пеўнасьці ці можа друкавацца ў Вас, я не перапісую і цяпер не пасылаю, бо надта ня маю часу. ** Гэтак будзем рабіць датуль, пакуль не ліквідуем гэтых 150 літаў.

582.1.48:095&r-096&r

---

[1] №9(1) за студзень-чэрвень 1925 году. [2] №2(8) за красавік-сьнежань 1924 году.

3765. Ліст Івана Бартовіча (Бэрлін) «Пану Президенту» (?) за 18.07.1925

582.1.48:098

Аб аб'яднаньні 11.07.1925 у Львове ўсіх украінскіх нацыянальна-палітычных групаў ва Ўкраінскае Нацыянальнае Аб'яднанье пад кіраўніцтвам д-ра Зьмітра Лявіцкага.

3766. Ліст загадчыка Бібліятэкі Інстытуту Беларускае Культуры Івана Серады (Менск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.07.1925

Інстытут Беларускае
КУЛЬТУРЫ
18 Ліпеня 1925 г.
№1335
Менск, Рэвалюцыйная 21

Дужа паважанаму
Дзядзьку В.Ластоўскаму
КОЎНА.

Бібліотэка Інстытуту Беларускай Культуры з вялікаю прыемнасьцю адтрымала надаслаую праз Вас кніжку «Про багацтво да бьедносьць» выдан. у Жаневе у 1881 г. і засылае сваю шчырую падзяку за дбайнасьць аб папаўненьні Беларускага Аддзелу Бібліотэкі ІБК рэдкаснымі выданьнямі.

Адначасна Бібліотэка паведамляе, што яна у сакавіку г.г. адтрымала высланы праз «Наркоминдел» у Маскве 1 экз. Вашага Расійска-Крыўскага слоўніка. З свайго боку Бібліотэка ІБК выслала праз Маскву (Загадчыка п/о Прыбалтыкі і Польшчы «Наркоминдела» СССР) для перадачы Літоўскаму паслу гр. БАЛТРУШАЙЦІСУ пасылкаю 30 беларускіх кніг апошніх выданьняў у абмен на выданьні Міністэрства беларускіх спраў у Літве.

Але да гэтага часу ніякага адказу праз Маскву ня маем, між тым як патрэба Бібліотэкі у Вашых выданьнях з кожным днём павялічваецца, асабліва у «Крывічы» і у «Слоўніку».

З вялікаю пашанаю
Загад. Бібліот. ІБК (Член ІБК) І.Серада

582.1.48:100
582.1.48:099 — канвэрт

3767. Ліст В.Бандрыўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1?.07.1925 аб дзейнасьці Камітэту Паняволеных Нацыяў

582.1.48:101

Дакладная дата невядомая.

3768. Расьпіска Вацлава Ластоўскага за 22.07.1925 аб атрыманьні ад Янкі Станкевіча апраўдальных дакумэнтаў на 150 літаў, выдадзеных яму на культурна-асьветныя патрэбы

582.1.48:008

3769. Ліст Тамаша Грыба (Радацін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.07.1925

22.VII.25
Radotín.

Даражэнькі Вацлаве!

Дужа перапрашаю, што гэтак даўна я нічога ня пісаў. Быў вельмі заняты. Шмат маю працы і цяпер, але ўжо не так. Ды і горача цяпер. Таму дазволіў сабе па абедзе адпачынак. А што ёсьць чалавеку найбольш прыемнае, як ня тое, калі ён у час свайго адпачынку, адагнаўшы ўсе благія думкі ды настроі, зусім шчыра, з аткрытай душой пачне гутарку з самым сабою, з сваей сьвядомасьцю, з сваім сумленьнем, яшчэ больш прыемна, калі ён падзеліцца гэнымі сваімі гутаркамі, з сябрамі, ведама, калі іх мае.

Я стаўлю перад сабой запытаньне: ці маю я сяброў? Калі маю, то хто яны, дзе? А калі ня маю, то чаму?

У розны час я па рознаму адказваю на гэтыя запытаньні. Адзін раз — здаецца нікога блізкага наўвакол мяне няма, а ні аднэй жывой душы. Я адзін. І моцна цешуся ў сваей адзіноце. Вось я адзін і нічога сабе — жыву. Атручваю паветра, жыцьцё іншым. І адным маім жаданьнем, з'яўляецца — змагацца з усей гэнай людзкой грамадой, якая, хоцяж нічога благога асабіста мне і ня робіць, але мае нагласьць быць няшчаснай, плакаць, цярпець, стагнаць і ў той-жа самы час моўчкі цягне ярмо сваей нядолі, не пратэстуе, не змагаецца. Я злы тагды, перастаю любіць і паважаць чалавека. А іншым разам — я сумую ў сваей адзіноце. Сумна і больна да сьлёз. Ня маю злосьці, ня маю і крыўды на людзей. Усе мы няшчасны на гэтай няшчаснай сьлязьмі і крывёю палітай зямлі. Заместа злосьці да людзкой грамады ў маім сэрцы гарыць каханьне. Хачу кахаць людзей, кожнага; хачу дараваць усім што некалі зрабіў хто мне благога, пакрыўдзіў, прасіць каб і мне даравалі. Усе мы людзі і кожны з нас чалавек; кожны мае свае слабасьці, свой грэх; кожны мае сваю бяду, сваё няшчасьця; кожны па свойму змагаецца за лепшую долю; кожны чалавек ёсьць больш добры чым благі. Трэба умець бачыць толькі гэна добрае. «Калі ты бачыш у чалавеку толькі благое, то які-ж ты благі сам, чалавеча...» І як-жа хочацца тагды вырвацца з сваей адзіноты, хочацца быць з людзьмі такім самым як і ўсе людзі; тагды мне хочацца мець сяброў. Шукаю іх, аднак — не знаходжу. Чаму? Ды ці я ведаю. Я ворагаў маю аж за шмат. Ваюю з імі. А сяброў ня маю. І гэтак з дня ў дзень праходзіць маё жыцьцё.

Няўжо я выродак нейкі?

Асабіста ў жыцьці нічога ня хочу; мне нічога ня трэба. Я гатоў жыць у самых скромных абставінах. Жыву даволі скромна і цяпер. Што-ж я — скромны студэнт філёзоўскага факультэту Карлавага Унівэрсытэту ў Празе. Свае жыцьцёвыя патрэбнасьці зьвёў да крайняга мінімума. Увесь аддаўся студыям. Дзеля чаго? — каб знайсьці праўду. Я толькі праўду шукаю.

Тры гады ўжо мінае, як я упарта працую. Акуратна хадзіў на лекцыі ўнівэрсытэцкія, пільна прынімаў учасьце ў сэмінарах: пісаў рэфэраты,

прыймаў учасьце ў дыскусыях. Прачытаў шмат кніг па філёзофіі, лёгіцэ, псыхолёгіі, соцыолёгіі, біолёгіі, гісторыі, этыцы, пэдагогіцы; паўтара гады студаваў славянскую філялёгію і літэратуру. І што-ж: знайшоў праўду? Дзе яна, тая праўда?

Да гэтага мушу дадаць, што за гэты час я шмат перажыў. О, што я перажыў за гэты час... Асабліва за апошні год. У маім асабістым жыцьці адбылася цяжкая драма. Трэ было перажыць. І я перажыў. Чую, што шмат пастарэў. Ні вайна, ні рэволюцыя гэтак на мяне ня мелі ўплыву, як ўсё тоя, што сталася тут на чужыне, ў адносна мірных умовах. Магчыма і тоя, што гэта была рэакцыя на ўсе папярэднія уражаньні — усё ў адзін раз паўстала, ўзбурылася. Скажу проста: я перажыў глыбокую ўнутраную рэволюцыю. У ціхім Радоціне, пад Бэрункай я больш адчуў і перадумаў чым за ўвесь час майго папярэдняга жыцьця. І ні адзін раз ка мне прыходзіла думка аб самагубстве. Усё ідзе ня так, як гэтага я хачу, то хай споўніцца хоць адно маё жаданьне — жаданьне сьмерці. Але інстынкт сябезаховы браў верх. Думка аб самагубстве зьнікала. Тагды з'яўлялася іншая мара: мо' я хворы, вар'ят і маё мейсца вун там, у Богніцах[1]? Дзе крытэрыон праўды? Што можа перасьведчыць мяне, што я не вар'ят? Успамінаю словы св. Тамаша Аквінскага: veritas est adaquatio rei et intelectus. А ці тоя, што я думаю разыходзіцца з істотнасьцю ці-то рэчавістасьцю? Не. Правяраю ў каторы ўжо раз і пераконываюся, што не, мае думкі не разыходзяцца з істотнасьцю. Знача я не ўтраціў пачуцьці рэальнасьці, знача я не вар'ят. Бо першая ступень вар'яцтва — ўтрата пачуцьця рэальнасьці. Чалавек пляце тоя, чаго ўзапраўднасьці няма. Інакш кажучы — чалавек пачынае жыць ня ў сьвеце рэальнай істотнасьці, а ў сьвеце ім самым створаных галюцынацый.— Адлятае і мара вар'яцтва.

Але там у вар'яцкім доме за жалезнымі кратамі сядзіць мой былы сябра[2]: чым дапамагчы ёй? Падымаю на ногі найбольш выдатных прафэсароў-псыхіатраў, дахтароў-практыкаў. — Усё марна. Аднагалосна ставяць прысуд: не зьлячыма. Дык што -ж тая навука, што тая мэдыцына, калі вось жывы канкрэтны чалавек гібее? На што ўся філёзофія, соцыолёгія, лёгіка, псыхолёгія, этыка, калі яны бязсільныя ў бядзе? Дык няўжо ўсе гэныя веды не для чалавека, ня дзеля таго каб скрасіць жыцьцё чалавеку? — У маіх вушах гудзіць страшэнным гоманам слова сказанае перад сьмерцю Дюбуа-Рэймморнам[3]: ignorabis et ignorabimus. Ну, а як-жа быць тагды, калі веда нічога ня ведае і ведаць ня будзе, ніколі не прасякне ў сутнасьць рэчаў? Зьвярнуцца да веры; мо' вера дапаможа? Мо' пасьці на калені ды пачаць маліцца да вышэйшай боскай моцы? О, сьвятая наіўнасьць. Гэта-ж ужо сталецьці праходзяць, як людзі адно толькі і робяць, што моляцца, але той да каго зьвернуты ўсе гэныя мольбы маўчыць, як падзямелья муры; ён не пасылае буры, каб раздзьмухала увесь гэты сьвет крыўды, сьлёз, цярпеньняў. Няма ў мяне веры. Я бачу няшчасьце і ні з куль не бачу ратунку. Як слабыя мы людзі ў бядзе нашай, як безрадны. Іншым умеім даваць рады, а сабе ніяк рады даць ня можам. І меў праўду той лотра, які побач павешаны на крыжы з Іезусам казаў: іншым дапамагаў, то чаму-ж не дапаможаш цяпер сабе. Ён быў сцэптык. Іншы

быў веруючы. Таму Іезус паабецаў быць на другі дзень у раі. Але ці папаў ён у рай? Хто можа сьцьвердзіць гэта? Ніхто. Што будзе па нашай сьмерці з намі, таго ніхто ня ведае. Ці ёсьць той рай, ці не — усё гэта адны толькі дагадкі. Але вось конкрэтны прыпадак і хай хто небудзь дасьць раду, як дапамагчы чалавеку ў бядзе. Ні з куль няма рады на гэта.

Пачынаю уважаць аб нашай Бацькаўшчыне. Яна так сама хворая. З'яўляюцца розныя дахтары. Даюць розныя рады. Якая з іх найлепшая? Ці ўсё тоя, што я дагэтуль рабіў было добрае? Я працаваў, шчыра хацеў дабра свайму народу, змагаўся і заклікаў іншых на змаганьне. Ці ўсё гэта я мусіў рабіць? — Іншыя так сама рабілі. Але я ці мусіў, а што мне іншыя, мо' і яны памыляліся? А цяпер, напрыклад, іншыя ідуць з паклонам да ўчарайшых сваіх ворагаў, то ці і я так сама мушу ісьці? Яны-ж мне прапанавалі, радзілі, пагражалі, угаворвалі. Але чамусьці не пайшоў. Чаму? Бо я знайшоў сваю праўду. Ведама, і мая праўда, як усе іншыя праўды ёсьць умоўная праўда, абсалютнай праўды няма. Усе праўды ёсьць толькі людзкія праўды; усе людзкія праўды маюць служыць чалавеку спосабам дзеля удасканаленьня ягонага жыцьця, як асабістага, гэтак і грамадзкага. Каб чалавек мог жыць, мог паляпшаць сваё жыцьцё ён павінен ведаць праўду. Гэна праўда — ведаць дасканальна тыя абставіны сярод якіх ён міма сваей волі апыніўся. Чалавек нарадзіўся на сьвет міма свайго жаданьня. А нарадзіўшыся, як і кожная жывая бытасьць, мае інстынкт сябезахаваньня. Раней гэны інстынкт уплывае на жыцьцё чалавека, як не усьвядомленая нейкая сіла; з часам усьведамляецца, чалавек сьвядома жыве. Або інакш кажучы — чалавек сьвядома ставіць сабе мэты і заданьні. Усьвядомляны інстынкт сябезахаваньня, безупынна уплываючы на жыцьцё чалавека, у відзе жаданьня чагосьці або нежаданьня, адчуваньня прыемнага і непрыемнага; прыемнае чалавек імкнецца затрымаць на даўжэйшы час, а няпрыемнае ўхіліць; на вышэйшай ступені разьвіцьця чалавечай індывідуальнасьці, гэта тады, калі інстынкт чалавекам усьведамляецца, гэты інстынкт становіцца воляй. Воля як усьвядомлены інстынкт, з'яўляецца найвялікшай, дынамічнай сілай у жыцьці чалавека і ўсей людзкасьці. Чалавек, або грамада людзей усьведамляе, што вось нешта прынясе кожнаму чалавеку і ўсей грамадзе многа прыемнага, што скрасіць жыцьцё, удасканаліць, прыблізіць чалавека сучаснага да ўзапраўднага чалавека, як разумнай, сябеведамай псыха-фізычнай бытасьці. У кірунку жаданага напружана працуюць людзі, сваей упартасьцю напраўленай на ўцелаішчаньне пастаўленай мэты захопліваюць і іншых — воля незначнай лікам грамады людзей, але з ясна усьвядомленай мэтай, якая гэта вялізарная псыхо-маторная сіла! — Людзі ёсьць людзі. Чалавека трэба браць такім як ён ёсьць з усімі ягонымі недастаткамі і дастойнасьцямі. Адзін у адным мае больш недахватаў, іншы ў другім, як і дастойнасьцяў. А ў грамадзе ўсё гэта неяк адно на адно прыдзе так, што, казаў той: згодная грамада — адзін вялікі чалавек!

У нас беларусаў — гэта неабходна ясна і рашуча сьцьвердзіць — няма такой грамады. Аднэй з многіх прычын — мы ня ведаем Беларусі ні ў яе мінуўшчыне, ні ў сучаснасьці. Мы або ідэалісты-романтыкі, натхненыя

сваім каханьнем да бацькаўшчыны, жывём у намі створаных поэтычных марах-лятуценьнях, якія вельмі далёка стаяць ад рэальнага жыцьця; або матэрыялісты, што жывуць толькі сёняшнім днём, кіруючыся, казаў той, «законам ліцытацыі: хто больш дасьць». Аднак ні тоя, ні другоя не вядзе да пастаўленай мэты. Бо да яе уцелаішчаньня вядзе адзін толькі шлях: усьведамленьне тых абставін у якіх жыў беларускі народ да гэтага часу, у якіх абставінах жыве цяпер, і ўжо выходзячы з гэнага сьцьверджэньня існуючых фактаў, ствараць ідэал на будучыню, ставіць мэту і за яе уцелаішчаньне змагацца, гэта зн. усьведамляць, арганізоўваць, прабуджаць пачуцьце ініцыятывы і самадзеяльнасьці ў гушчы народных грамад. Наш ідэалізм павінен выходзіць з рэалізму, павінен абпірацца на існуючыя ў рэальным штодзенным жыцьці факты. Наша праўда ніколі не павінна разыходзіцца з ўзапраўднасьцю, г.зн. з істотнасьцю, з рэчавістасьцю, з рэальнасьцю. Інакш кажучы: беларусы маюць свае вызвольнае змаганьне абперці на моцным фундаманце істотнасьці, адкінуўшы ў бок усе марылятуценьні, што перашкаджаюць разуменьню ды ўсьведамленьню гэнай істотнасьці.

Такім чынам, у шуканьні канкрэтнага вызвольнага ідэалу беларускай нацыі, або — праўды аб Беларусі, я прыйшоў да гэткага выснаўку. — Наша праўда, ёсьць наша людзкая праўда, ёсьць праўда для чалавека. Мы займаемся досьледам Беларусі, каб ведаць добра істотны стан яе патрэбнасьцяў. Гэны патрэбнасьці ёсьць натуральным вынікам прыроднага разьвіцьця народа. Імкнемся задаволіць усе гэныя патрэбнасьці. Патрэбнасьць свабоды — гэта ёсьць першая неабходная ўмова. Гэтай свабоды цяпер беларускі народ ня мае. Трэ' яе здабыць. Першае заданьне наша: адваеваць свабоду Беларусі. Гэта ня ёсьць ні максімум ні мінімум. Свабода есьць неабходнай умовай жыцьця; гэта ёсьць прыродная неабходнасьць, як яда, паветра ды інш. функцыі біолёгічнага арганізму. Форма ўцелаішчаньня свабоды — незалежнасьць. Інакш ня будзе свабоды. Без поўнай незалежнасьці Беларусі зусім немагчыма свабодная Беларусь. Гэта ясна. А таму другое заданьне: незалежнасьць. Але як свабода, гэтак і незалежнасьць могуць быць толькі ад кагосьці, або ад чагосьці. Беларусь мае быць свабодна і незалежна, але ад каго ці-то ад чаго? Мы і кажамо: ад гнёту і падняволяньня, якоя цяпер існуе. Дамагаемся волі ад комуністычна-большавіцкага тыранства і ад панска-шляхэцкага самаўпраўства, дамагаемся незалежнасьці ад Масквы і ад Варшавы, якія аж да апошняга часу трымалі гвалтоўна наш родны край у сваей залежнасьці.

Мы рашуча і катэгорычна сьцьверджаемо, што воля і незалежнасьць Беларусі ёсьць прыродная патрэбнасьць, першая падваліна на шляху гістарычнага разьвіцьця беларускага народу. І чым хутчэй гэта патрэбнасьць будзе здаволяна, тым ляпей.

Я дапускаю магчымасьць, што далёка ня увесь беларускі народ усьведамляе гэну сваю прыродную патрэбнасьць волі ды незалежнасьці, як напрыклад, ня кожны чалавек усьведамляе сваё палавое пачуцьцё, у аснове якога ляжыць інстынкт захаваньня свайго роду. Але як палавы інстынкт чалавек адчувае, гэтак сама ён адчувае інстынкт волі ды незалежнасьці.

Наша трэцяе заданьне: ўсьвядоміць гэны інстынкт волі ды незалежнасьці, каб з неўсьвядомленага пачуцьця свабоды і незалежнасьці стала усьвядомленая воля дасягнуць гэтага. Мы павінны ўсьведамляць народ наш беларускі, вясьці неустанна прапаганду ў неабходнасьці змаганьня за волю ды незалежнасьць; мы павінны неустанна прабуджаць волю да змаганьня. А тагды настае чацьвертае наша заданьне: арганізацыі народнай волі, арганізацыі народнай псыхікі. Без арганізацыі немагчыма ніякае змаганьне; хто мае стварaць гэну арганізацыю народнай волі, народнай псыхікі? Адказ дужа просты: ягоная актыўная меньшасьць, што да канца прадумала і ўсьвядоміла яго долю. Гэна актыўная меньшасьць не павінна быць ужо такая і малая, але даволі значная, на тоя, каб магла спраўна працаваць у адпаведным кірунку. Прыходзім да пятага заданьня: стварэньня адзінай згоднай грамады змагароў за Беларусь. Найлепш, каб гэто была адзіная партыя. Немагчыма гэта, па тых ці іншых прычынах — сувязь партый, арганізацый, актыўных змагароў. Гэта сувязь беларускіх змагароў мае сабе сказаць: у імя праўды — ў рукі меч.

Я да гэткіх прыйшоў выснаўкаў. Што скажаш, Вацлаве на гэта? Пішу не таму, што хачу пераканаць цябе ці што. Проста пішу таму, што чую ў гэтым патрэбнасьць; я так думаю, гэта мая думка не дае мне супакою. Пішу, каб падзяліцца з табой, парадзіцца, а там ёсьць ведама, мо' да чаго небудзь і дагаворымся конкрэтнага ў кірунку супольнай працы, на карысьць нашай Бацькаўшчыны, Вольнай Беларусі.

%[3]

582.1.48:089&r-093&r

[1] Прадмесьце Прагі, дзе месьціцца псыхіятрычная лякарня. [2] Палута Бадунова. [3] Эміль Дзюбуа-Рэймонд (1818-1896) — нямецкі фізыёляг, або ягоны брат Пауль (1831-1889) — нямецкі матэматык. [3] Працяг ліста — дакумэнт №3782.

3770. Квіток аплаты за тэлеграму з Бэрліна ў Вільню за 27.07.1925, пасланую В.Бандрыўскім

582.1.48:071

3771. Паштоўка Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 27.07.1925

27 ліпеня 1925 году.
Рыга.

Высокапаважаны Вацлау Юстынавіч,

сенека атрымау Ваша пісьмо. Спраставаць сказанае у абвінавачвальным акце, аб удзеле Вашым у партыі сацыялістау-фэдэралістау я ня маю магчымасьці, бо гэта афіцыяльны судовы дакумэнт папраукі якога не дапушчаюцца.

Каб хоць крыху задаволіць Вас, я гэтыя свае тлумачэньня пауторываю у «Паштовай скрынцы». Тамака-ж адкажу я і на пытаньня аб «беларускім сэпаратызме» і «оппозыцыі» у Латвіі, бо паднятыя Вамі пытаньня вельмі цікавыя і я думаю потым адвесьці іх разгляду асобную стацьцю. А таму папярэднія заметкі, з якіх вынікала бы патрэба стацьці трэба зьмясьціць як падрыхтоуку у «скрынцы».

Чакаю «Слоунік». Вітаю Вас і Станіславу Пятроуну.
З пашанай К.Езавітаў
582.1.48:087

3772. Паштоўка Міколы Чарвякова (Рэвэль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.07.1925

[...] Чі атрымалі кнігу Карскаго? [...]
582.1.48:088

3773. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.07.1925

RIGA, 30 ліпеня 1925

Высокапаважаны Вацлау Юстынавіч,

сенека атрымау я перасланыя Вамі «Слоунікі».

Вельмі дзякую. Прыйшлі як раз у пару, бо заўтра еду у Дзьвінск на Зьезд беларусау-выбаршчыкау, дык вазьму частку іх з сабою.

Чую я, што у Коуні пачынаецца новая беларуская акцыя і што вядуць яе группы, якія Вы лічыце асабіста сабе варожымі[1].

Мне вельмі цяжка, здалек, адсюль, падаваць, як Вам, гэтак і ім, якія колечы рады, але я лічу грамадзкім сваім абавязкам выказаць абодвым старанам свае думкі.

Найперш, мне здаецца, што беларусам у Літве патрэбна спыніць далейшыя сваркі, і асабліва-ж уцягіваньне у курс гэтых сварак літвіноу, якія тады бяруць на сябе ролю судзьі і робюць спробы скіраваць ход падзей так, як гэта карысна літвінам і Літве. Павінна стаць прынцыпам — «у нашы беларускія унутрышнія справы ніхто ня мае права лезьці са сваім носам!»

Другое, што мне здаецца сваечасным, гэта падзел кампэтэнцыі і працы і спэцыяльнасьцяу у беларускім нацыянальным руху. Мне здаецца, што рух настолькі ужо узмацаваўся, што вясьці працу гэтак кажучы кустарным спосабам ужо ня можна. Няможна на адну асобу ці арганізацыю браць, ці узваліваць, усе напрамкі і галіны працы. Трэба спэцыялізацыя па адзелам і кірункам.

І гэта трэба даць зразумець і літвінам.

Мне здаецца, было-б добра, калі ня можа, па тым ці іншым асабістым прычынам, ці пераконаньням, наступіць поунае прымірэньне і згода паміж Вамі і БНР, дык размяжаваць галіны працы.

Зрабіце Вы добра пабудаванае, саліднае «выдавецкае беларускае таварыства на Літве». Хай літвіны падтрымліваюць яго і грашова і маральна, але хай не дамагаюцца, каб гэта-ж Т-ва было і нейкім палітычным папіхачом, ці хаурусьнікам с л у ж б о в ы м.

БНР хай вядзе палітычную акцыю.

Абедзьве групы — зусім незалежны адна ад аднэй і кождая вядзе сваю працу.

Кожды зможа найсьці свой шлях і кожды дасьць нашай справе максімум карысьці.

Бойкі і спрэчкі — наша згуба.

Ян Ігнатавіч[2] тутака лішні раз давеу мне гэта. Вынікі сучасныя здарыліся толькі таму, што ен хацеу панаваць над беларускаю меншасьцьцю у Латвіі не шляхам унутрашняга паразуменьня ці уплыву, а шляхам навязаньня сваяе волі, абапертае на латыскі урадовы кнут. Ну, вось, кнут, прыведзены у рух, і пачау сьцябаць направа і налева.

У выніку — разгром, які яшчэ ня худка будзе намі ліквідаваны.

Тое-ж і тамака у Вас. Было, есьць і будзе, калі не дойдзеце згоды і не размяжуецеся.

Гэта будзе свайго роду «дзялідзьба» сваякоу.

Даволі біцца і сварыцца — дзяліцеся!

Устануляйце мяжу у нашай агульнай нацыянальнай працы.

Шчыра шануючы і зауседы спагадны

К.Езавітаў.

582.1.48:084&r

[1] Маецца на ўвазе арганізацыя Беларускай Палітычнай Нарады зь ініцыятывы савецкага агента Аляксандра Ульлянава, які ўлетку 1925 году сустрэўся ў Коўне з А.Цьвікевічам. «Варожыя групы» — кола А.Цьвікевіча. [2] Краскоўскі.

3774. Ліст Аляксандра Шлюбскага (Менск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 30.07.1925

Высокапаважаны дз<ядзька> Ластоўскі!

Дазвольце мне падзякаваць Вас, па-першае, за аўтограф, які Вы пераслалі праз др. Ружанцова для майго альбому[1], а, па-другое, за добра выдадзеную маю працу аб бібліятэках[2].

Прыблізна на Каляды гэтага году Інсцітут Беларускае Культуры рыхтуецца склікаць зьезд працаўнікоў на крывіцкай навуковай ніве «з усяго сьвету» (як абвешчана ў газэтах), я на гэтым зьездзе хачу прачытаць даклад на тэму «Аб тэрмінах: беларус, беларусін і крывіч». Мне хацеласяб больш меньш навукова абаснаваць патрэбнасьць ужываньня апошняга тэрміну, але гэта цяжкая справа з прычыны навізны пытаньня і адсутнасьці належных крыніц. У грунт прыдзецца класьці, галоўным чынам, матар'ялы Вашых выданьняў. Задуманы даклад даволі шырока — ня ведаю, як ён выйдзе.

І ось тут мне трэба некаторая дапамога. З прычыны таго што Вы даўно працуеце над гэтым пытаньнем, што Вы так сама зацікаўлены ў закранутым пытаньні, я хачу прасіць Вас дапамагчы мне з падборам матар'ялу, паказаньнем на крыніцы, якія пэўна ў Вас адзначаны. на маю просьбу аб гэтым Ружанцову ён прыслаў мне «Студ. Думку» з артыкулам Станкевіча.

Упеўнены што Вы не адмовіце мне.

Моцна цісну Вашу руку.

Ал.Шлюбскі.

Адрас.: С.С.Р.Беларусь, Менск, Інсцітут Беларускае Культуры

582.1.48:085&r-086&r

[1] Магчыма, маецца на ўвазе выданьне: Крашаніна (набіванка). Віцебск, 1926. [2] Шлюбскі Ал. Матэрыялы да крыўскай гісторапісі: Доля кнігасховаў і архіваў // Крывіч. №9(1). Студзень-чэрвень, 1925.

3775. Ліст Тамаша Грыба (Радацін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 31.07.1925

Даражэнькі Вацлаве!

Вельмі перапрашаю, што гэтак доўга я нічога ня пісаў. Быў надта заняты. Маю шмат працы і цяпер: гатоўлюся да іспыту пэдагогічнага, а разам з гэтым шмат пішу цяпер. Благаслаўлёная адзінота! — я ўвесь аддаўся навуцы. Пішу салідную працу, ведама, навуковую, але распачаў, на падзіўленьне ўсім вераб'ям і гусям, пісаць беларускай ядрэнай прозай нібольш-ні-менш, як драму і раман. Ці закончу калі небудзь, ня ведаю. Але пішу. Гэтулькі было перажыта, перадумана — цяпер само неяк лезе на паперу, казаў той: «прэцца»!

Падумаць толькі: гэта-ж ужо восем месяцаў як мы бачыліся ў Празе і з таго часу ніякай весткі. Як гэта разумець? Праўда, я так сама нічога ня пісаў. Атрымаў слоўнік, месячнік і — ні гу-гу. Гэта з майго боку ня добра. Але прызнаюся зусім шчыра: я ледзьве выбраўся з даўгоў, якія зацягнуў на маю паездку ў Бэрлін на конфэрэнцыю міжн. рэв.-соц. бюро, якая адбылася ў сьнежні мінулага року. Мне часам так было туга з грашыма, што ня меў ня толькі на марку пачтовую, але на'т на сьнеданьне-абед-вячэру. Ну, але як небудзь ашукваючы свой жывот — адзіны спосаб у маім становішчы, каб зьберагчы лішнюю карону: недаеданьне — цяпер ўжо справіў свой фінансавы стан. Трошкі адпачыў на сонейку. Уціхамірыў свае нэрвы. А вясной кепска было; хваравіта нешта з легкімі. Цяпер то ўжо нічога. Сонца, рэчка, лес — найлепыя лякарства ад усіх хвароб фізычных і духоўных.

Ну, а як тваё здароўе? Як жывецца можацца?

Я чуў што пішаш гісторыю беларускай кнігі? Гэта добра. Твой слоўнік я хвалю, хоцяж з прадмовай ня зусім згаджаюся; па-мойму інакш трэ' былоб выявіць сваё адношаньне да Вялік. Літ.-Рускага Кн<яства>. Але я кепскі гісторык, мо' і ўзапраўды так і трэ' было.

Што новага ў цябе? Ці будзе выходзіць «Крывіч»? А ведаеш, мне ўжо папала за Крыўю. І што гэта ўзапраўды: каму па каму, а мне заўсёды два камы. Такая ўжо відаць мая доля. Але я упарты і заўсёды мяне чорт намаўляе за валасы пацягаць сваю долю. Ад таго і бывае так: часам я сваю долю, а часам доля мяне, то адзін то другі бяром верх — гэтак і валтузімся праз увесь час. А жорсткая і сьмешная мая доля. Каб я быў мастаком яб нарысаваў яе ў відзе пьянай распутніцы-шлюхі, гэткай жорсткай, сьмешнай і жалюгоднай, гордай і пакорнай, брудная але пад лахмоцьцем маючай чароўныя рысы цела. — А няўжо-ж, кожны чалавек мае сваю долю, нясе на галгофу свой «słomiany krzyżyk».

Я верыў, што з Пражскага студэнства выйдзе нейкі толк. Разьбілася мая вера. Слабы народ. Няма цьвердасьці, няма захопленьня, няма энтузыязму, пафосу вызвольнай барацьбы. Большасьць складаецца з кандыдатаў у чыноўнікі, служкі, пяталізьнікі ворагаў забранай Краіны. Я шмат змарнаваў часу у змаганьні з пасыўнасьцю. Будзь чым хочаш, толькі будзь актыўным, гордым і самастойным! Не абавязкова, каб належаў да тае партыі, да якой належу я. Але будзь разумным чалавекам,

будзь чэсным і да канца ідзі ў кірунку свайго пераконаньня — мала толку выйшла з гэтага. Цяпер апошняя спроба. Заснавалі Культурна-Навуковае Таварыства Дра Францішка Скарыны. Далі найменьне Крывіцкае і ў косках — беларускае. Пачаўся гвалт, загаманілі. Аж у Вільню пісьмо напісалі. Жарцікі здарэньне якое. Ну, але хай сабе. Я зусім сьвядома стаўлю гэта пытаньне на дыскусыю. Крыўя ці Беларусь?! — Ты пачаў, табе і пяро ў рукі. Будзь ласка дакажы ты гэнай публіцы чаму ўласьня мае быць Крыўя, а не Беларусь. Я ў гэтым нічога не разумею. Для мяне ўсё роўна. Але мяне ужо вінавацяць у хто ведае якіх «праступленьнях». Трэба сэр'езна паставіць дыскусыю на гэтую тэму. Ці так ці гэтак, але раз і назаўсёды! —

А цяпер вось аб чым. Нядаўна быў я у Е.А.Ляцкага. Гутарыў з ім аб нашых справах. А я даўно ўжо яго бачыў. Ня меў часу. Ён мне жаліўся на цябе, Вацлаве. Чаму ты нічога да яго не напішаш. Ён так паважае цябе, питает самые наилутшие симпатии и ценит очень... Я сказаў яму пра твой слоўнік, «Крывіча». Ён нічога не атрымлівае. Чаму? А якія у В<ацлава> Ю<стынавіча> адносіны, пытае, з Цьвікевічам? На колькі мне ведама, кажу, ніякіх, а калі мо' і ёсьць якія небудзь, то ў кожным разе, пасьля ўсяго таго што між імі сталася, цёплых сяброўскіх адносін цяпер быць ня можа, мо' з часам , але, а цяпер не. — А, таму відаць В.Юст. і да мяне зьмяніў сваё адношаньне, бо Цьвікевіч служыць у выдаўніцтве «Пламя». — Як гэта? - пытаю. Ды так. Ён узяў на сябе гэнэральнае контрагэнцтва на Літву. Але-ж гэта ёсьць чыста коммэрцыйная справа. Для нас усё роўна хто, абы карысьней. А ён карысна прадае нашы выданьні. — А, гэта ўсё магчыма, кажу. — Дык вы яму В.Ю. напішыця, каб ён ня зліўся на мяне. Аб выданьнях яго так сама: няхай прышле па тры экзэмпляры кожнае кнігі і ў абмен хай выбярэ сабе любых дзесяць кніг выд. «Пламя». — Добра, напішу. Вось і пішу аб гэтым цяпер. Але, бачыш, мяне усё гэта з Цвікевічам надта зьдзівіла. Ён служыць у выдавецтве «Пламя», каб прадаваць выдадзяныя гэным выдаўніцтвам рускія кнігі. А чаму-ж тады ён, А.Цвікевіч і іжэ с нім: Л.Заяц, П.Крычэўскі, Ул.Пракулевіч і В.Захарко, адмовіліся супрацоўнічаць з Ляцкім у справе выданьня беларускіх кніг? Нічога тут не разумею. Пытаюся тлумачэньня ў Ляцкага. Ён мне і кажа: — а гэта, бачыце, справа так стаіць: яны правалілі беларускае выдавецтва ў Празе. Ужо быў і крэдыт адшуканы на 150 т. kč. Не захацелі са мной працаваць, думалі мяне перахітрыць і — ўсё правалілі. Цяпер крэдыту няма. Усё прапала. А маглі залажыць тут саліднае беларускае выдаўніцтва. — Я сумна ўздыхнуў і ў сваім сэрцы сказаў: гэтак заўсёды у нас, беларусаў. З нейкім дзіўным шалёным натхненьнем стараемся пляваць у тую студню з якой на заўтра пьём. На колькі мы усе яшчэ дзеці. Але нашто было тагды маніць? На што яны крычалі, усім і кожнаму казалі, што выдавецтва ў Празе таму правалена, што Бадунова ім перашкодзіла, што Грыб ім справу папсаваў? Іхная мана цяпер аткрылася. Яны самі выдавецтва правалілі. А каб хацелі ведаць адношаньне да гэтага чэхаў, то вось яно ў чым выяўляецца: якія-ж дурні беларусы, давалі ім грошы на выдаўніцтва і яны іх ня сумелі выкарыстаць... — гэта

ёсьць словы Дра Z. — Дык на што яны манілі, унасілі разлад, дэзорганізацыю ў беларускае жыцьцё ў Празе; Каму гэта патрэбна? Проста па злосьці? Зазлаваўся і нарабіў глупства; а пасьля што? На гэтым-жа ня спыніцца жыцьцё. Будзем жыць, будзем не раз мы ў жыцьці спатыкацца: усе мы працуемо на беларускай роднай глебе. Дык што пасьля? Узаемнае зьнішчаньне, бязглуздае змаганьне? Каму гэта патрэбна? Няўжо ўсё гэта ў імя беларускай вызвольнай справы? Сумна, вельмі сумна ўсё гэта бачыць, ад прыяцеляў ды ад ворагаў усё гэта чуць. Ці не пара толькі нам паразумнець. А няўжо-ж паразумнець?! — Гэтак я казаў ў сваім сэрцы і больна мне стала. Пагана. Куды ня ткніся — непачаты куток працы, а тут ўзаемная грызьня, правакацыі розныя. Хто з кім і хто проці каго? Хто чаго хоча? Гэта-ж падумаць толькі: невялічкі гурток беларускай інтэлігэнцыі і — co ni głowa to rozum, поўнае ignopaваньне усіх і кожнага, страшэнная варажнеча, а — воз и ныне там, справа ні зь мейсца.

Ведаеш, я б хацеў сэр'ёзна аб усім гэтым падзяліцца сваімі думкамі. Гутарыў з М.Яўх.Ш<апавалам> — Па мойму перш за ўсё неабходна ясна і рашуча паставіць некалькі координальных пытаньняў і па іх згаварыцца, дайсьці да нейкага паразуменьня або разыйсьціся з адкрытым забралам, добры ведаючы кожны хто з кім і ў чым згаджаецца, а хто з кім не і ў чым. — Патрэбна яснасьць. Ёсьць многа цемры, маны, захуда[н?]ай хітрасьці. —

Ня ведаю, мне так здаецца. Ахвотна б падзяліўся сваімі больш падробна выкладзянымі думкамі і паглядамі. Зусім нічога ня ведаю аб табе, аб тваім настроі, аб сучасных паглядах на справу.

Шчыра прызнаюся: тыдзень таму напісаў табе я даўжэзны ліст, але не паслаў, устрымаўся. Чаму? Ды хто яго ведае. Мы неяк зчужанелі. А шкада...

Прымі шчырае прывітаньне і пажаданьне ўсяго найлепшага. Прывітаньне жонцы тваей.

ТамашГрыб

P.S. Пішы. Мой адрэс: Radotín u Prahy, H.266.

582.1.48:075&r-080&r

3776. Статут Літоўска-Беларускага Таварыства, зацьверджаны натарам у Коўне 31.07.1925

582.1.48:081-083 — мк

Заснавальнікі:
Vaclovas Lastauskas — Vytauto prosp. 30
Mykolas Romeris — Žalioji g. 21
Balys Stadzevičius — Kęstučio g. 26a
Matas Šalčius — Minties g. 5
Antanas Zmuidzinavičius — Daugirdo g. 2
Liudas Vailionis — Ukmerges pl 41a
Aleksandras Ružancovas — Karo Mokslo Skyriuje
Juozas Purickis — Lietuvos Redakcijoj
Klaudijus Duž-Dušauskas — Laisves aleja 42
Antanas Matačius — Mickevičiaus 15

Vincas Čepinskis — Maironio g. 4
Henrikas Žilevičius — 16 Vasario g. 1/64

3777. Расьпіска Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.08.1925 аб атрыманьні ганарару 200 літаў за матэрыялы, зьмешчаныя ў №№8 і 9 «Крывіча»

582.1.48:062

У №№8 і 9 зьмешчаныя апавяданьні з «Аль-Кітабу» і філялягічныя рэзэнзіі ды зацемкі.

3778. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.08.1925

RIGA, 7 жніуня 1925

Грамадзяніну Вацлаву ЛАСТОУСКАМУ.

Ужо праз паштовую скрынку дау я згоду на дыскусію у справе «БЕЛАРУСЬ-КРЫВІЯ».

Вельмі прашу для №9[1] падрыхтаваць і прыслаць Вашу стацьцю, у якой даць агляд матывау «за» Крывію. Гэта стацьця павінна адчыніць дыскусію. Зьмесьціць для гэтае мэты палеміку Вашую з Віленскаю аднаднеукаю[2] будзе не зусім паважна.

Чакаю срочнага адказу Вашага.

Што да справы выдавецтва і палітычнае групы у Літве, дык мне здаецца, што калі ня можа быць гутарак аб адзіным паміж Вамі фронце, дык прынамсі не павінна быць фронту варожага змаганьня аднае групы з другой.

Вашы заслугі у гісторыі беларускае культуры мы усе цэнім. Я асабіста думаю, што Вы маглі бы даць яшчэ больш, каб Вас не адрывалі для працы палітычнае. А таму і зусім зразумела чаму я казау аб паважным выдавецтве. Пад такім выдавецтвам я разумею выдавецтва, у якім Вам належала-бы кіруючая роля, але наукола каторага маглі бы працаваць усе здольныя да таго людзі, незалежна ад іх палітычных паглядау ці адносінау да іх паасобных літоускіх дзеячоу. Ну, зусім ужо зразумела, у гэтым выдавецтве Вы не павінны займацца коррэктурнымі працамі, для гэтага мы маемо ужо даволі моладзі, намі узгадаванай.

Не хаціце «адзінага фронта» і «сяброуства» зрабіце «перамірые» і абвесьціце нейтралітэт.

Але не павінна быць вайны. Яна для нас — згуба.

Не перашкаджайце працы тых, хто можа працаваць у напрамку палітычным. А яны не будуць псаваць Вашае працы культурнае.

Вітаю. Цісну руку.

З пашанаю

К.Езавітаў

Довады Вашыя аб нібыта «белай рускай акцыі» я лічу мала абаснаванымі.

Жаданьне «ачысьціць атмасфэру», каб сьвятая справа была чыстай я лічу не зусім асьцярожным.

Тутака я[е] пачау Ян Ігнатавіч[3] «чысьціць», дык мы ледзь не асталіся зусім без працаунікоу.

Трэба каля сябе гуртаваць людзей, выкарыстоуваць усе, што яны могуць даць добрага, даруючы іншы раз некаторыя непрыемнасьці і драбніцы дзеля агульнае карысьці і вынікау.

Па другое, ня можна ж на аднаго сябе узваліваць працу ва усіх галінах. Не патрэбна гэта, ды і шкодна гэткая манапалізацыя.

Я рашуча выказваюся за тое, каб нарэшці было спынена гэта унутрашняе змаганьне, якое ідзе на карысьць нашым ворагам і дарэмна марнуе нашыя сілы.

Аб гэтым я пішу у Прагу і гр. А.Цвікевічу.

Мне будзе вельмі прыкра канстатаваць, што у гэткі адказны момант як раз у Вас не знайшоў я падтрымкі сваім крокам.

Есьць у мяне да Вас пытаньня:

1, Ці істнуе Міністэрства Беларускіх Спрау, ці не

2, У якой форме атрымліваеце Вы ад літвіноу падтрымку на выданьня

3, Што за арганізацыя «Беларускі Цэнтр у Літве» і хто складае яе (прауленьне, сябры)

4, Як глядзіце Вы на віленскае пытаньне і як глядзіць на гэта Беларускі Цэнтр у Літве

5, Якая роля Іонінаса у вашым выдавецтве і у падтрымке яго

6, Чым кончылася спроба Ваша утварыць Т-ва «Беларуска-Літоускага аб'еднаньня» і чаму арганізацыйны сход саупау на дату схода Беларускага Камітэту у Літве

Я лічу пастауленыя пытаньня пытаньнямі грамадзкага характару і вельмі прашу не адмовіць у падрабязным на іх адказе.

Вельмі важна мне ведаць і тое, да якой палітычнае беларускае групы Вы сябе цяперака залічаеце, а таксама і адносіны Вашыя да партыі літоускіх «хрышчонісау»[4].

Чакаючы худкага адказу, з пашанай

К.Езавітаў

582.1.48:073&r

---

[1] Газэты «Голас Беларуса (Рыга). [2] Жыцьцё Вёскі. 1925.07.15. [3] Краскоўскі. [4] Хрысьціянскіх дэмакратаў (krikščionių demokratai).

3779. Ліст Эдмунда Зузэміля (Кёнігсбэрг) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.08.1925

582.1.48:074&r

З водгукам на новы нумар «Крывіча» і з прапановай аб арганізаваньні ў Коўне штодзённай беларускай газэты, якая б выцесьніла расейскамоўны й польскамоўны штодзённы друк у Літве

3780. Паштоўка Ўсевалада Боева (Стакгольм) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.08.1925

Щыро витаю з Межнарадовай Канфэрэнціи!

582.1.48:070

3781. Ліст В.Бандрыўскага (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.08.1925

582.1.48:072

«Пересилаю лист з Вільна, який одержав сьогодня [...]».

3782. Ліст Тамаша Грыба (Радацін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 13.08.1925

[Дапісаны на лісьце за 22.07.1925]

13.VIII.25.

Даражэнькі Вацлаве!

Вось тоя пісьмо, якоя не адважыўся я пераслаць табе, але цяпер перасылаю. Прачытай і напішы мне твой пагляд. З чым незгаджаешся — пішы рашуча, я ахвотна выслухаю ўсялякія закіды. Аб адно толькі прашу: будзьма шчырымі!

У нас нічога новага. Атрымаў «Крывіча»[1]. Ці будзе надалей выходзіць? А калі будзе, то калі?

Аб «боеўшчыне»[2] — трэ' з гэнай грамадой сэр'ёзна весьці гутарку, без вострай лаянкі, але аснавацельна. Што за нараду[3] яны маюць склікаць? Калі? Дзе? Хто прыедзе? Нарада каго? З гэтым жартаваць нельга. Асабліва, калі прыняць пад увагу віленскага двухлікага Януса. Дужа хацеў бы абзнаеміцца з тваім пратэстам; калі можна гэта — прышлі. Ды наогул, я-б хацеў больш ведаць аб «дзеяльнасьці» гэнай «цёплай кумпаніі».

А што скажаш аб «Гол. Беларуса»? Сымпатычная часопісь, ці-ж няпраўда? Асабліва першы нумар. А ўзяць хоць-бы і Праграму Т-ва Беларусаў выбаршчыкаў — зусім разумна напісана. За апошнія два-тры гады мала што разумнага пісалася ў беларускай мове. А гэта — адна любасьць. Бачу і перасьведчаюся, што беларусы пачынаюць паступова разумнець, пачынаюць сэр'езна падыходзіць да беларускае справы. А К.Езавітаў ёсьць чэсны, зусім адданы справе беларускага вызваленьня, чалавек. Гэткіх мала. Вось-бы такую часопісь бы яшчэ ў Вільні мець. Але там няма людзей. З віленскіх беларускіх дзеячоў ніхто «10 месяцаў» не сядзеў у вастрозе. А гэта шмат што азначае. Ого! праседзіць гэткі час у вастрозе, у адзіноце. Чалавек, або зьвіхнецца («зсучыцца» ёсьць добры турэмны тэрмін), або як сталь закаліцца. Асабліва яшчэ ў гэткія гады маладыя. Прызнаюся, я адчасьці за яго баяўся. Але нічога. Перамог, сябе перамог, сваю дацяпершчыну.—

А гэта былоб зусім добра, каб ён прайшоў у Парламэнт. Там-бы не на жарты распачаласяб беларуская рэальная праца. А я заўсёды лічу і вітаю толькі рэальную працу за настаюшчую працу. Я уважаю, што у сучасны момант, кожная выдадзеная у беларускай мове кніжка, кожная беларуская школа ці-то коопэратыў, тэатр, культурна-прасьветнае т-ва — гэта ёсьць цытадэлі незалежнай беларускай дзяржаўнасьці. У Латвіі гэта робіцца. А ў Вільні — не. І не таму, што там горш, больш ціснуць, а проста таму, што там няма людзей, няма каму займацца конкрэтнай рэальнай штодзеннай працай — там пераважна «кафэ-штральскія дыплёматы»[4].

Ах, і якое-ж яны робяць праступленьне перад адзінствам беларускай культуры заклікаючы беларускі народ ісьці у маскоўскую няволю. Аб гэтым дужа добра ў «Крывічу» напісана. Трэба ясней, яшчэ і больш рашуча выступіць. Што за дурніца! Аткрыта робяць здраду проці беларускай культуры ды яшчэ кагосьці лаяць. Падзівугодна нахабства! Гэта кожны скажа, бо гэта і сьляпы на'т сваім кіем нашчупае...

Ну, але жыцьцё ідзе сваей чарадой. Я атрымаў недаўна, гэтак з вясны неяк, пісьмо з Рад<авай> Бел<арусі> — там не так ужо і ціха, як гэтак здаецца. Ідзе бой. Проці «русацяпшчыны» паўстае моладзь, гэта ваюе і не на жарт, а ў сэр'ез ваюе.

Мо' атрымліваеш «С<авецкую> Б<еларусь>» з Менску? Прышлі, я пасьля прачытаньня акуратна буду адсылаць табе. Я раней мог атрымліваць, але цяпер не. Я ў сваіх публічных выступленьнях некалькі разоў цытаваў з «С.Б.», даводзячы як маскалі душаць беларускі рэв. вызв. рух. Калі можна — зрабі гэта. Буду надта ўдзячны.

Затым бывай. Ціснy руку.

Тамаш Грыб

582.1.48:093r-094&r

[1] №9(1) за студзень-чэрвень 1925 году. [2] Маецца на ўвазе грамадзкая зьява безагляднага супрацоўніцтва зь літоўскімі ўладамі на шкоду Беларусі (паводле Ўсевалада Боева, дзеяча Горадзенскай Гарадзкой Управы, якая ў сьнежні 1918 году вяла зь беларускімі арганізацыямі канкурэнтную барацьбу за права палітычнага прадстаўніцтва беларусаў у Літоўскай Рэспубліцы). [3] Магчыма, маецца на ўвазе рыхтаваная палітычная нарада з мэтай «самароспуску БНР». [4] Алюзія на «палітычны салён» у кавярні «Штраль» у даваеннай Вільні, наведнікамі якога былі браты Луцкевічы.

3783. Паштоўка Расейскага Замежнага Гістарычнага Архіву (Прага) рэдакцыі «Крывіча» (Коўна) за 14.08.1925 з падзякай за дасланы №9/1 «Крывіча»

582.1.48:065

3784. Ліст Віцебскага Акруговага Таварыства Краязнаўства Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.08.1925 з просьбай даслаць клішэ здымкаў слуцкіх паясоў, друкаваных у «Крывічы»[1]

582.1.48:066

[1] У №9(1) за студзень-чэрвень 1925 году.

3785. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.08.1925

Вельмішаважаны Спадáру Вячаславе,

Расьпіску, грошы сто шэсьцьдзесят пяць каронаў чэскіх і лісты дастаў. Вельмі дзякую. Лічу, што мне балей з «Крывіча» нічагусенькі не належыцца.

«Крывіча»[1] таксама дастаў, ён вельмі добры; хачу зрабіць яго рэцэнзію.

Не магу не зьвярнуць Вашэцяву ўвагу ў гэтым лісьце на дзьве словы з мовы «Крывіча»: 1) бяз жаднае рацыі Ваша ўжываеце рожны, рожніца

і г.д. заместа розны, розьніца. Тое, што Ваша раней пісаў, здаецца ў «матар'ялах да крывіцкага слоўніка» ў №4 «Крывіча», што словы рожны і розны маюць у нашай мове рознае значэньне ня выдзержуе жаднай крытыкі; гэта Вашэцю толькі так здалося, бо ў вадным месцы Ваша знайшоў рожны ў вадным значэньні а ў другім — розны ў іншым. Рожны гэта полёнізм, дзе таксама *ж* у гэтым слове ўзьнікла не фонэтычна, а па нейкай аналёґіі. Праславянскае было *orz-, адкуль мусіць быць роз- у ўсіх слав. мовах, апрача паўднёвых, дзе раз- (маскоўскае разный і інш. із старабаўгарскае мовы). Другою Вашэцяваю, дый ня толькі Вашэцяваю, абмылаю (слова з «Аль-Кітабу») ё пісаньня прыймя *ва*. Гэта як хочаце, але толькі не пакрывіцку; у крывіцкай мове гэта зусім немагчыма. Панашаму можа быць *у-ў* або *ува-ўва*, але ніколі ня можа быць *ва*. Тымчасам Ваша, ня гледзячы на нашаю ўмову не папраўляць мае мовы, гэтыя словы паставілі, заместа ўжытых мной, і ў маёй пісаніне. Шкада, што Ваша не прыслаў мне карэктуры (другое) апавяданьняў з «Аль-Кітабу»: там (у надрукаваным у №9 «Крывіча» тэксьце) ё карэкт. абмылы.

Як Вашэцю прыходзіцца дакладаць да «Крывіча», дык думаю, што адзін чалавек гэтак ня вытрывае.

У мяне ўзьнялася гарачая думка, каб у сёлетнія ўгодкі Фр. Скарыны Крывічы купілі хоць невялічкаю друкарню, як аснову будучае вялікае. Пісаў я аб гэтым ксяндзу А<даму> Ст<анкевічу> ў Вільню, але ён, адпісуючы, на гэта нічога не адказаў. Няма ў Вільні людзёў, якія маглі-б гэтай справай заняцца. А тымчасам бяз свае друкарні скандал, страшна пераплачуецца. Навет 200 тысячаў лужыцкіх сербаў мае некалькі сваіх друкарняў, а мы ніводнае ня маем. Мне здаецца, што можна закласьці друкарню адным із трох спосабаў: 1) грамадзкую, значыцца, што купілаб якое-небудзь т-ва; 2) акцыйную і 3) грамадзка-акцыйную, значыцца друкарня была-б маемасьцяй акцыйнага т-ва, але акцый гэтае друкарні найболей мела-б якое-небудзь ідэйнае крывіцкае таварыства. Мне найбалей падабаецца апошні спосаб. Ці ня мог -бы Ваша заняцца гэтай справай. Калі-б сёлета не ўдалося купіць друкарні, дык хоць залажыць пачатак друкарскага фонду. гэта справа мела-б гісторычнае значэньне. Ідэйнае крывіцкае т-ва, што ўзяло-б найбалей акцый друкарні, магло-б на гэтыя акцыі прыймаць ахвяры. Мне здаецца, што Ваша не спракудзіўся-б, калі-б, дастаўшы падмогу на наступны[1] № «Крывіча», ужыў яе як пачатак фонду на друкарню. Я спадзяюся, што маю дысэртацыю[2] за якісь час (1/2—1 год) хтось надрукуе. За ўвесь гонорар я купіў-бы акцыі друкарні. Зрабе́це ласку, адпішэце мне на закранутае пытаньне аб друкарні хоць у пісульцы. У справе «падтрымкі» напісаў у Вільню. Ці што паможа — ня ведаю. Няма там рашучых цьвярдых людзёў. Усё здаецца круціцца каля чалавека, які ад асабістае заўзятасьці не патрапляе адлучыць справаў грамадзкіх. З думкай аб аб'яднаньні, выказанай у Ваш. 2 лісьце згаджаюся, але як яе практычна правясьці, будучы раськіненымі па цэлай Эўропе? Ці не ляпей быў бы адзіны фронт без адзінае арганізацыі?

ЯСт...

582.1.48:067&r-067a&r

[1] №9(1) за студзень-чэрвень 1925 году. [2] «Мова рукапісу Аль-Кітаб».

3786. Запрашэньне Таварыства Літоўскіх Студэнтаў Санкт-Галена (Коўна) [Вацлаву Ластоўскаму?] (Коўна) на ўрачыстае традыцыйнае паседжаньне, якое мае адбыцца 14.08.1925 у будынку Курсаў Пошты, Тэлеграфу й Тэлефону (Коўна, Laisvės Al. 74)

582.1.48:068-069

3787. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 16.08.1925

Яго Міласьці
Грамадзяніну Вацлаву ЛАСТОУСКАМУ.

Анкета мне запатрэбавалася, каб нарэшце даць сабе ясную справаздачу у літоуска-беларускіх узаемаадносінах.

Споваду таго, што мае пытаньні і Вашы на ніх адказы не ахапілі усіх цікавіушых мяне пытаньняу, гэтым маю гонар прасіць Вас, Вацлау Юстынавіч, адказаць мне, па магчымасьці худчэй яшчэ на гэткія пытаньня:

1, Ці служачыя былога Міністэрства Беларускіх Спрау звольнены, ці не.

2, Ці само Міністэрства афіцыяльна існуе, ці не.

3, Якая беларуская інстытуцыя, ці якія інстытуцыі, калі іх некалькі, зьмяшчаюцца на Міцкевіча 13-а.

4, Які статут Беларускага Цэнтру у Літве. Кім ен зацьверджаны і калі. Копію статута.

5, Персанальны склад сяброу, склад Прауленьня і Рэвізыйнае Камісіі Нацыянальнага Беларускага Цэнтру у Літве.

6, Бюджэт гэтага Таварыства і крыніцы буджэту.

7, Колькі было агульных сходау сяброу Т-в і калі.

8, Хто іменна і праз якую установу, якім парадкам і у якім ліку адпушчае крэдыты на выдавецкую працу, на друк і іншыя выступленьня як Нацыянальнага Цэнтру гэтак і наагул рэпрэзэнтуемае Вамі групы у Літве.

Вы пішаце аб тым, што грошы на выдавецтва адпушчаюцца на тым жа грунце, як і беларускай меншасьці у Латвіі. Пажадана ведаць хто падае буджэт, ці праходзе ен праз Сойм, хто атрымлівае грошы і адказывае за іх.

9, На якім грунце гр. Іонінас яуляецца прэдстауніком «літоускае стараны», як Вы пішыце, у Беларускім Цэнтру.

10, Што за інстытуція па свайму характару Беларускі Нацыянальны Цэнтр у Літве: ці гэта грамадзкае Таварыства, ці якое-колечы урадова афіцыйнае, ці прост урадовая установа.

11, Колькі беларускіх школ у Літве.

12, Якая лічба беларусау, як меншасьці, у сучаснай Літве.

13, Якая лічба беларускіх эмігрантау у Літве, не зьяуляючыхся літоускімі падданымі.

14, Вы, персанальна, ці беларускі эмігрант у Літве, ці беларус літоускі падданы, пражываючы на сваей бацькаушчыне.

Вельмі прашу выбачыць за турбаваньне, але пастауленыя пытаньня маюць настолькі вялікую, як і самі Вы разумееце, грамадзкую вагу, што, спадзеюся, Вы не адмовіце іх падрабязна і вычэрпаюча высьветліць.

З грамадзкім прывітаньнем
К.Езавітаў

582.1.48:064&r

3788. Ліст Вацлава Ластоўскага (Коўна) Кастусю Езавітаву (Рыга) за 17.08.1925

Вельмішаважаны Канстантын Барысавіч.

Вось адповедзі на Вашы пытаньні.

1. Служачыя звольнены.

2. Я-ж Вам пісаў: акту аб закрыцьці не было, але пасьля «байкоту» няма бюджэту, а значa ёсць толькі вывеска, але заўсёды можа быць адпушчан бюджэт і адноўлена праца, трэба толькі дагаварыцца.

3. Зьмяшчаецца: «Беларускі Цэнтр у Літве», выдавецтва Беларускага Цэнтру і «Сувязь нацыянальна-дзяржаўнага вызваленьня Беларусі (Крывіі)».

4. «Беларускі Цэнтр у Л.» паўстаў шляхам перагавораў між беларусамі і літвінамі і зацьверджан Соймам. Статуту не мае.

5. Б.Ц. у Л. складаецца з 4 асоб беларусаў (Я, Душэўскі, Матач, Борысовіч) і аднаго ад літвіноў п. Іонінаса. У будучыне павінен быў быць дапоўнены шляхам кооптацыі грамадзянамі беларусамі.

6. Бюджэт на гэты год 60.000 літ. з сум адпушча́ных Соймам і зацьвярджа́ных па кождаму выдатку дзярж. кантролем. Павышэйшая сумма адпушчана на ўсю работу, якую падыймае Б.Ц. і прымыкаючыя да яго асоцыяцій, а таксама аплачываецца літэратурная праца, якую робяць грамадзяне для выдавецтва цэнтру і выдаецца падмога на друкаваньне «Крывіча», як прэдпрыемства незалежнага ад Б.Ц. у Л., а значa прыватнага.

8. Бюджэт укладаецца беларускімі прадстаўнікамі разам з п. Іонінасам, які праводзіць праз Сойм і атрымлівае і адпавядае за яго, але ініцыятыва выдаткаваньня пакінута беларусам.

9. Па назначэньню ад літоўскага ураду і Сойму.

10. Б.Ц.у Л. устаноўлена створаная у гэтым годзе з мэтай разьвіць яе у будучыне, а тым часам зьяўляецца фірмай, на якую асыгнуецца бюджэт і разам апаратам які вядзе работу пераважна выдавецкага характару*.

11. Адна школа.

12. Паводле спраўкі выданай мне Статыстычным Бюро, грамадзян Літвы і эмігрантаў, запісалася пры апошняй перапісі 4421 чалавек беларусамі.

13. Эмігрантаў у гэтым ліку да 200 чалавек.

14. Падданства літоўскага не маю.

****

Дайце хуткую адповедзь

1) Ці лічыце патрэбным папярэдні зьезд лідараў для утварэньня бюро зьезду і ліквідацій нападак.

2) Ці зможаце прыняць удзел у бюро зьезду.

3) Ці лічыце, што зьезд павінен даць запраўднае аб'яднаньне, ці толькі паслужыць да падтрыманьня якой аднэй групы, прыкладам, як Вы кажаце «палітыкаў».

З праўдзівай пашанай ВЛастоў...

17.VIII.25

---

*) Кождае палітычнае выступленьне Б.Ц.у Л., ці арганізацій да яго прытыкаючых адбывалася за згодай прадстаўнікоў Краю, пасьля спэцыальных зьездаў. ВЛ

582.1.48:059&r

3789. Ліст Беларускага Сялянскага Саюзу ў Празе Беларускаму Цэнтру ў Літве (Коўна) за 17.08.1925 у справе скліканьня Ўсебеларускага Зьезду

582.1.48:060&r

Зь пячаткай Саюзу.

3790. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 17.08.1925

Вельмішаважаны Спадару Вячаславе,

Дастаў ад Вашэці абодва expres. У Вільню ксяндзу[1] аб Жэнэве пераслаў. Фактычна Беларускага Грамадзкага Камітэту ў Празе ўжо два гады як няма. «Беларуская Рада» ў Празе складаецца із самага «ураду» і яшчэ адзін студэнт. Т-ва дра Скарыны ня змогуць захапіць.

Пасылаю тут заяву ад Сял. Саюзу. Наш Саюз ня ёсьць студэнскай арганізацыяй, хоць ня студэнтаў у ім мала. Просім каб далі нам 2 месцы на зьезьдзе. Што ў арганізацыйны камітэт ад т-ва Скарыны будзе пасланы наш чалавек ёсьць вялікая надзея, але няма абсалютбай пеўнасьці. Таму мы ўставілі аб гэтым дамаганьне ў нашаю заяву ад «Сял. Саюзу». Аднак думаю, што дзеля гэтага вялікіх стараньняў Вашэці ня трэба (ня варта) рабіць. Ад т-ва Скарыны будзем прасіць трох месцаў, з гэтага 2 будзе пэўне нашых. Ці сакалы захочуць прыняць учасьце, яшчэ ня ведаю. Прадстаўнік у варганізацыйны камітэт зможа прыехаць, калі будуць прысланы на дарогу грошы. Ермачэнка цяпер нейдзе на Прыкарпацкай Русі.

Думаю, што разважаць аб тым, ці патрэбны зьезд, няма чаго, бо, калі даюць грошы, дык усё роўна ён будзе.

Мне здаецца, што Вашэці трэба заняць гэткаю тактыку: 1) адхінуць Корчынскага, як не Беларуса, прынамся не сьвядомага, 2) з Бацькаўшчыны павінны ехаць толькі адказныя людзі або зусім ня ехаць, як гэта мы пішам у сваёй заяве.

Ня ведаю, ці будзе добра дзеля беларускай справы ў Лацьвіі, учасьце на зьезду Лацьвійцаў; Латышы будуць іх бяз дай прычыны падазраваць.

Ваш Я.Станкевіч

17.VIII.

582.1.48:063&r

582.1.48:061 — канвэрт

[1] Адаму Станкевічу.

3791. Ліст Тамаша Грыба (Радацін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 18.08.1925

18.VIII.25.
Radotín.

Даражэнькі Вацлаве!

Навіны ёсьць дужа цекавыя; няма што...—

Мае склікацца за граніцай беларускі з'езд, ці як гэта надрукавана ў часопісях — 2-я беларуская нацыянальная нарада, якая мае выбраць беларускае загранічнае прадстаўніцтва.

Я над гэтам шмат думаў і ў мяне ўзьнікла цэлы шэраг запытаньняў: 1. Зусім неясна сама пастаноўка пытаньня аб мэце з'езду: выбар беларускага загранічнага прэдстаўніцтва. Што гэта мае азначаць? Якое прэдстаўніцтва? Хто і каго або што мае «прэдстаўляць»? 2. Неясна так сама, хто мае прыймаць учасьце на гэтым з'ездзе. Сьпісак складзяны бел. нац. к-там у Коўні сьведчыць аб поўнай выпадковасьці учасьнікаў з'езду. На гэткі з'езд ніхто з сэр'ёзных паважаючых сябе людзей не паедзе. Ці з'езд мае быць скліканы на засадзе прэдстаўніцтва ад пэўных істнуючых арганізацый, ці проста пэрсональна будуць разасланы запросіны? 3. Няма ведама, калі і дзе мае адбыцца гэны з'езд (як многа часу засталося да яго скліканьня?) 4. Зусім няма ведама ці гэны з'езд будзе насіць характар палітычны ці-то апалітычны? 5. Ці змогуць прыняць учасьце беларусы з Латвіі з прычыны іх асабліва цяжкага становішча пасьля недаўна адбытага судз. працэсу? 6. Хто зможа прыехаць з краю? 7. Як на бацькаўшчыне адносяцца да думкі аб скліканьні гэткага з'езду?

Усе гэтыя запытаньні раптам узьніклі і я а ні на адно з іх не магу даць адказу. Ці ня змог-бы ты мне, Вацлаве, што небудзь аб гэтым напісаць, высьвятліць. Буду надта ўдзячны.

З свайго боку я ўсім чым толькі змагу пастараюся дапамагчы беларускаму нац. паліт. аб'еднаньню за граніцай.

Але перад усім — гэта павінна быць ясна і выразна зазначана — якая мае быць мэта гэтага аб'еднаньня ды якія выстаўляюцца спосабы дзеля яе дасягненьня.

Дзеля прыкладу я вазьму укр. рэв. вызв. саюз. Ёсьць зусім ясная мэта, указаны спосабы яе дасягненьня; істнуе арганізацыя, мае адпаведны статут. Гэта ёсьць аб'еднаньне. Сэр'езнае. Чыннае. Цэнтр знаходзіцца за граніцай, адбочкі — ўсюды: ў краі, ў Амэрыцы.

На мой пагляд гэткае самае аб'еднаньне варта былоб стварыць і нам, беларускай рэволюцыйна-вызвольнай дэмакратыі.

Перасылаю табе для інфармацыі «Дэклярацыю укр. рэв. вызв. саюза». Гэта дэкляцыя з'яўляецца праграмай саюза. Калі цябе гэта цекавіць — прышлю і статут. Гэта я разумею, гэта ёсьць аб'еднаньне!

Ня буду хавацца: я быў на тым паседжаньні украінскіх змагароў, на якім прыймалася гэта дэкляцыя і статут саюза. Адносіны ў мяне з імі самыя найлепшыя.

Што датыча т-ва ім. дра Фр.Скарыны ў Празе, то яно, як ведама, склалася на засадзе поўнай апалітычнасьці. Гэтага асабліва дамагаўся Я.С<танкеві>ч. Цяпер усе у раз'ездзе. Аж да восяні — прыблізна за два месяцы — зыйдзецца. Як аднясецца да ўчасьця на з'ездзе — трудна сказаць. Хутчэй за ўсё што т-ва, як гэткае, у палітычным з'ездзе ня прыме а ніякага ўчасьця. Каб гэта быў з'езд культурна-навуковы, то справа была-б зусім інакш.— Аб учасьці прэдстаўнікоў студэнства з Прагі — я ведаю як гэта магчыма. Сярод студэнства ёсьць розныя паліт. кірункі, ёсьць і наша арганізацыя — «Вольная Грамада». Адзінай арганізацыі няма.

Наогул — пытаньне аб скліканьні з'езду ёсьць вельмі складанае. Я на гэта гляджу зусім пэссэмістычна. Казаў гэта і Ів.Ігн.К<раскоў>скаму, калі ён тут быў і пытаўся аб маім паглядзе на гэту справу.

А вось аб саюзе, то варта падумаць. Гэта ёсьць жывая справа. Само жыцьцё гэтага вымагае. У гэткі саюз могуць уваходзіць партыі, арганізацыі, паасобныя адзінкі. Трэба ствараць нешта жывое, чыннае, рухавае, а божа барані — нейкую струпехласьць. Аб гэтым я пісаў і ў папярэднім сваім пісьме. Падумай, Вацлаве, і дай свой адказ. Чакаю.

Затым бывай.

Цісну руку.

Т.Грыб.

582.1.48:057&r-058&r

3792. Ліст кс. Францішка Чарняўскага (Рым) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.08.1925

582.1.48:054&r-056&r

582.1.48:053 — канвэрт

Адказ на ліст з падтрымкай прапановы прыняць назоў «Крывія». Пра кантакты зь біскупам Матулевічам і плянамі заснаваньня марыянскай сэмінарыі (у Друі?).

3793. Ліст Кастуся Езавітава (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.08.1925

RIGA, 20 жніуня 1925

Яго Міласьці
Грамадзяніну Вацлаву ЛАСТОУСКАМУ.

Я задаволены, што Канфэрэнцыя нарэшці вызнана патрэбнай.

Зразумела, я прыйму у ей удзел.

Зразумела, што папярэдняе утварэньне Бюро Конгрэса абавязкова патрэбна.

Бюро павінна апрацаваць:

праграму Кангрэса,

модус прэдстаўніцтва ад беларускіх арганізацій, партый і таварыстваў,

адшукаць сродкі,

прызначыць тэрмін,

вайсьці у перагаворы з урадам тае старонкі, дзе прызнана будзе больш адпаведным склікаць канфэрэнцыю (я, асабіста, і мае сябры тутака будзем за Рыгу, бо у нас зараз выбарчая праца і выезжаць у чужыя краі мы ня маемо магчымасьці),

падрыхтаваць сэкрэтарыят і стол прэсы,

вайсьці у зносіны з беларускімі арганізаціямі усяго Сьвету, каб выклікаць іх прэдстаунікоу на Нараду,

Бюро Кангрэсу павінна працаваць тамака, дзе будзе прызначаны Кангрэс (зноу жа прапаную Рыгу).

Пажадана, каб Кангрэс быу зложаны не з персанальных толькі грамадзян, але у пераважнай большасьці з прэдстаунікоу арганізацій.

Пажадана, каб гэты кангрэс меу сродкі на выпус[к] аб сабе добрае друкаванае памяткі.

Зьезд лідэрау, аб якім Вы кажаце, я разумею як стварэньне Бюро Кангрэса, аб якім я казау вышэй.

З гэтага пункту гледжаньня, ен безумоуна патрэбны.

Рабіць на Кангрэсе скандал, думаю, ахвотнікау ня знойдзецца, бо для гэтага мы ужо усе маемо да волі нацыянальнага і дзяржаунага розуму.

Ну, зразумела, гэты кангрэс не павінен зрабіць з нас літоускіх наймітау, якія бы перад чарговай сэсіяй Лігі Націй надавалі-бы літвіном рожных неадпаведных векселеу.

Што да нападак, якія могуць быць зроблены некаторымі коламі супроць Вас асабіста, дык гэты нападкі маглі бы быць толькі у плошчы абвінавачываньняу Вас у тым, што Вы занялі адносна Літвы службовую ролю, якая не да твару былому Старшыні Ураду БНР.

Тутака справа стаіць так, што Вам, зразумела, рана, ці позна, цяперака на Канфэрэнціі, ці пазней у будучыне, адказ на гэты закіды трэба будзе даць. І чым худчэй, тым лепш.

Калі Вы вялі толькі справу культурную (Вы пішаце, што Б.Ц. не вядзе палітычнае працы. Ну а т-ва «Вызваленьня Беларусі») і запрауды не былі палітычна залежны, дык адказы Вашы будуць кароткія і ясныя.

Унікаць гэтага Вам зусім не патрэбна. Не патрэбна і баяцца «скандала». Ваш грамадзкі абавязак даць шэраг інфармаціяу і адказау беларускаму грамадзянству. Вы 5 гадоу таму назад урачыста былі аблечэны даверыям беларускага грамадзянства. Вам трэба сказаць каб гэта дайшло і да народу, я[к] Вы выкарысталі дадзеныя Вам паунамоцтва, бо Вы, не гледзячы на адстауку Вашу, яшчэ і цяперака дужа часта выступаеце, як «былы» Старшыня Рады Міністрау БНР, а значa лічыце сябе моцна зьвязаным з БНР.

Я гляжу згары і збоку.

Я бачу усе дробныя тамака Вашыя сваркі.

За іх атрымаюць абедзьве стараны.

Але самае галоунае гэта вось што: ці Вы бачыце большага прыяцеля сабе асабіста і беларускаму народу у Янінасе, чым у нас, беларускім грамадзянстве? Ці Вы адчытываецеся перад ім, ці перад беларусамі? Ці Вы радзіцеся з ім, ці з намі?

Вы добра ведаеце, што я Вам нязьменны прыяцель а с а б і с т ы, аднак грамадзкая праца вымагае мець адвагу дапытываць сваіх асабістых прыяцеляу і нават крэуных аб іх грамадзкім кірунку.

І таму я вельмі прашу Вас даць мне адказ на усе пастауленыя Вам, як ранейшымі, гэтак і гэтым пісьмом пытаньня.

Гэта мне а б с а л ю т н а н е а б х о д н а ведаць да усякіх далейшых гутарак і перагавораy.

З грамадзкім прывітаньнем

К.Езавітаў

582.1.48:048&r

3794. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.08.1925

Вельміпаважаны Спадáру,

Толькі што дастаў ад Вашэці яшчэ адзін ліст; дзякую. На два expresy паслаў адказ Вашэці ў панядзелак 17.VIII. На гэты цяпер адказую.

Што я з Вашэцям згаджаюся, гэта Ваша ўжо пабачыў зь ліста і заявы «Сял. Саюзу», пасланых 17.VIII. Будзе лепшаю ўдачу мець Вашэцява прапазіцыя аб перадзьезнай нарадзе прадстаўнікоў 5-ёх групаў, калі-б на гэтай нарадзе былі 1-2 прадстаўнікі з краю. Думаю, што калі гэткаю папраўку зробіце да свае прапазыцыі, дык гэтым знайдзеце балей падзьдзержкі ў Ліцьвіноў, дый Цьвікевічу, прынамся з вонкавага боку*, будзе падабацца гэтая папраўка а тым самым і ўся пропозіцыя. Мне здаецца, што і дзеля добра справы ўчасьце прадстаўніка (ці двух) з краю было-б вельмі карысна. Гэта-ж вельмі выгодна дзеля самых прадстаўнікоў краю, бо калі хто ня можа ехаць ці гаварыць адкрыта, то можа зрабіці гэта цішком на нарадзе. Із задачамі гэтае нарады зусім із Вашэцям згаджаюся. Прадстаўце Ліцьвіном, што калі яны даюць падмогу на зьезд[1], дык пеўнеж ня хочуць, каб зьезд скандаліў Крывічоў і Ліцьвіноў. А ён будзе скандаліць, калі ня будзе перадзьезнай нарады.

Рагулю на зьезд прасіць нельга; ён яшчэ нядаўна быў заўзятым непрыяцелем крывіцкага руху.

90% ё за тое, што Жылка быў-бы на зьезьдзе з Цьвікевічам.

Дзе думаеце можа быць нарада? Ці не магла-б яна быць у Празе? Я баюся, што можа не змагу паехаці на нараду (надта няма калі), тады прышлося-б паслаць заместа мяне каго іншага.

Думаю, што «Сял. Саюзу» будзе прыслана афіцыяльная пропозіцыя; дзеля гэтага цяпер не пасылаем жаднага адказу на сьпісак кандыта[та]ў на зьезд.

Ва... Я...

20.VIII.

*Зробіць выгляд, што падабаецца.

582.1.48:051&r

[1] Няясна, ці ўдзельнічала Літва ў фінансаваньні канчатковага праекту канфэрэнцыі.

3795. Ліст Міхайлы Лазінскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.08.1925

582.1.48:052&r

3796. Хадайніцтва Аляксандры Мамонька за 24.08.1925 (Коўна) перад міністрам асьветы Літвы аб прызначэньні ёй стыпэндыі дзеля навучаньня ў Клайпедзкай кансэрваторыі

582.1.48:044

3797. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 24.08.1925

Вельмішаважаны Спадáру Вячаславе,

Сягодня я дастаў expres ад Краёвага Цэнтру зь Вільні. Пішуць, каб я ад іх імя наказаў (паведаміў) Вашэцю й Цьвікевічу, што 2 верасьня (2.IX.25) у Гданску будуць прадстаўнікі ад Краёвага Цэнтру зь Вільні дзеля перагавораў з Вашэцем і Цьвікевічам. Просяць Вас абодвых задзержыцца ў Reichshof hoteli. Быцьцё Вашэцявае абавязкава.

Адначасна пішу Цьвікевічу гэта самае.

Пісаў ад Краёвага Цэнтру кс. Адам[1]. Апрача просьбы перадаці наказ (паведамленьне) балей нічога ксёндз не напісаў. Але з пасыланага Вашэці «Жыцьцё Беларуса» крыху відаць аб розных настроях у Вільні.

Тэлеграму Вашэцяву таксама сягодня дастаў,- дзякую. Čakaju ліста.

Я думаю, як павесьці гэтаю справу із зьедам і што зь ім зьвязана, каб ня даць магчымасьці гультаём Крычэўскім і Ко захапіць некаторыя магчымасьці на тарганьне крывіцкай справай дзеля свае асабістае карысьці. Свае думкі вылажу тут Вашэці. Трэба павесьці справу так, што крывіцкая эміграцыя надта малая, каб магла сама ад сябе прадстаўляць крывіцкі народ і наагул самастойна весьці работу заграніцаю. Ня маючы пад сабою грунту ў эміграцыйных масах, якіх няма, нашая палітычная эміграцыя, раз павадзіўшыся, можа і далей толькі вадзіцца паміж сабой. Здаровая праца можа быць паведзена толькі пры аднэй неабходнай умове, што палітычная загранічная эміграцыя можа быць толькі загранічным прадстаўніцтвам краю, экзэкутываю заграніцаю краю а ўсе прынцыповыя й наагул галоўныя пастановы маюць выходзіць з краю. З гэтага прынцыпу вынікае 1) што заграніцаю так ці начай на крывіцкі кошт можа жыць толькі той, хто робіць крывіцкую работу, 2) заграніцаю могуць і маюць астацца а) людзі неабходныя дзеля працы заграніцаю b) людзі, што ў Бацькаўшчыну ня могуць вярнуцца, бо іх там перасьледавала-б чужая ўлада. Думаю, што гэтак Вашэці трэ было-б паставіць справу ў Гданску. Паставіўшы гэтак пытаньне 1/2 кандыдатаў у проектаваны камітэт адпадзе.

Ці няможна было ўмовіцца Вашэці ў Коўні з Цьвікевічам, каб ён адрокся сваіх дармаедных калекаў-«міністраў» (Крычэўскі, Захарка і інш.). Калі-б гэта ўдалося зрабіць, дык у камітэт увайшлі-б Вы разам із Цьвікевічам.

Грыб жыве на 1/2 ад Прагі. Нягледзячы на тое, што я Грыбу перадаваў пераз другіх, што маю зь ім пагаманіць аб зьезьдзе, ён аднак у Прагу не зьявіўся. Ці ня круціць ён хвастом? Ад яго ўсё магчыма.

Сягодня пішу ліст у Вільню, у якім выкладаю ўвесь пагляд на справу і справядліва пад[ч]ыркаваю Вашэцяваю працу.

З шчырым паважаньнем

ЯСт...

582.1.48:045-047&r

582.1.48:049 — канвэрт

[1] Станкевіч.

3798. Ліст Юозаса Пурыцкіса (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.08.1925

Дорогой Господинъ Ластовскій

Я уѣхалъ изъ Ковны оставивъ дѣло конференціи въ Вашихъ и г-на Цвикевича или вѣрнѣе г-на Головинскаго рукахъ. Очень жалал бы знать въ какомъ положеніи находится теперь это дѣло?

Будте любезны написать нѣсколько словъ по слѣдующему адресу: Berlin, Barbarossastr. 13 Dr Puryckis. Хотя я теперь въ Берлинѣ не буду, но мнѣ Ваше письмо перешлютъ.

Желая Вамъ всего лучшего остаюсь преданный Вамъ JP.
Berlin
26/VIII-25
582.1.48:043

3799. Ліст Міхала Біржышкі (Коўна) «друзьям-белоруссам (соймовцам)» (Вільня?) за 31.08.1925

582.1.14:024&r-027&r
582.1.14:028 — канвэрт

Ліст у справе агульнага змаганьня за Вільню, перададзены зь Цьвікевічам у Данцыг:

«[...] я не хотел обманывать и белорусов, когда увидел, что после нашей большой и общей работы в Вильне теперь хотят их кормить «культурными подачками» и держать подальше от политики [...]

Постарайтесь также привлечь к общей работе Ластовского, повлияв на его культурничество. Он — внутренне свободный белорусс, но его влияние парализуется внешней зависимостью [...]»

Надпіс на канвэрце: «Гражд. Цвикевичу — для дальнейшей передачи»

3800. Пасьведчаньне, выдадзенае рэдакцыяй «Крывіча» Станіславе Камінскай у тым, што яна скончыла беларускія 8-месячныя настаўніцкія курсы ў Вільні ў 1916 годзе

582.1.48:037

Дата невядомая. Кіраўніком курсаў быў В.Ластоўскі.

3801. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 1.09.1925

Вельмішаважаны Спадару Вячаславе!

Учора ў нас было паседжаньне «Крывіцкага т-ва Д-ра Фр. Скарыны» (прэзыдыума).

Аказалася, як я ўжо раней дагадаваўся, аб чым у вапошнім лісьце напісаў Вашэці, што с.р. (іх цяпер усяго тры — Мамонька, Грыб і Ґан, а ў нашым прэзыдыуме два апошнія) вычэкаваюць, каб прылучыцца да тае стараны, якая возьме верх. Учора Грыб із падзьдзержкай Ґана заявіў на паседжаньні, што ня можна выносіць жаднае пастановы, бо няма ведама чаго ліцьвіны будуць хацець. Хто знае Грыба, той ведае добра, што тут у іх грае ролю толькі вычэкаваньне. Калі толькі Цьвікевічу ўдасца захапіць некаторыя магчымасьці, дык паглядзіцеся, што есэры будуць зь ім. Дзеля таго, што нашае т-ва пастановы, зьвязаныя з палітыкаю, можа рабіць толькі аднагалосна, прышлося пытаньне зняці з парадку дня.

Напішэце калі ласка, як скончыліся перагаворы з Вільняй. Я зь з ведамых прычынаў аб гэтым не магу даведацца. Паклон жонцы Вашэцявай.

Я.... 1.IX.25
582.1.48:050

3802. Паштоўка Тамаша Грыба (Радацін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 9.09.1925

Даражэнькі Вацлаве!

Сёньнека я атрымаў (як сябра Рады Б.Н.Р.) афіцыальнае запрошаньне на II. Агульна-Беларускую Конфэрэнцыю, якая мае адбыцца ў Бэрліне 15. гэт. месяца. Сёньнека маемо 9. пры найлепшым жаданьні прыняць учасьце ў Конфэрэнцыі фізычна нельга гэта жаданьне споўніць. За пяць дзён дастаць пас загранічны і візы ды яшчэ разстарацца грошы на падарож — немагчыма. — Пэўна-ж гэткае самае запрошаньне атрымаеце і Вы ў Коўні. Што думаеце аб гэтым? на колькі ўсё гэта сэр'ёзна? Чаму гэткая пасьпешнасьць? — Пішы. Чакаю на адказ.

NB. Аб усім іншым трымаюся свайго старога пагляду. Нічога не сталася новага, каб зьмяняць сваё адношаньне да справы. Што ў цябе новага?

Цісну руку.

Тамаш

582.1.48:038&r

3803. Ліст Язэпа Мамонькі (Прага) Клаўдыюшу Душэўскаму (Коўна) за 9.09.1925

Дараженькі Клаўдюсь!

Телеграмму і ліста твайго дастаў і вельмі добро, што ты хоць трохі нас паінформаваў аб справах.

Канференцыя як відаць усеж такі будзе, хто на ей будзе гэта ня вядома; но мы думаем калі будуць предстаўнікі з краю[1] то варта прыняць удзел і я раіўбы Вам калі будзе канференцыя быць ў Берліне табе ці Власту каб мы маглі хоць як спаткацца і абгаварыць некаторыя справы.

Для нас ясна, што калі с краю ня будзе предстаўнікоў то такая канференцыя ня мае ніякога сэнсу. У краі як відаць з твайго ліста вельмі павярнулі руля на Менск, гэта вельмі апасная штука. Фактычна ня Менск сам па сабе апасны, а тая Маскоўская шаленая палітыка, ось чаго трэба баяцца. Што тычыцца Цвік. і Ко. то гэта усе мелачы агульнага нашага жыцьця і перад намі павінны стаяць большыя задачы чым грызьня паміж сабою.

Мы падыходзім к такому часу калі патрэбна удесяцеріць энергію нашай працы і гуртаваць ўсе сілы шчыра кахаючыя сваю бацькаўшчыну бо ворагі нашы також ня спяць у шапку, а с усякім днем мацуюцца нас задушыць. Нашым ворагам нават патрэбна каб мы грызліся паміж сабою. Супрацоўніц[тва] с літоўскім народам установяць ня дзеячы тыя ці іншыя а самі свабодныя народы як літоўскі так і беларускі, а наша справа толькі падгатовіць грунт для гэтай свабоды і супрацоўніцтва. Ось тыя думкі якія мы сабе уяўляем.

Што тычыцца канференцыі то мы еще добро няведаем ці будземо там ці не аб гэтым напішу калі узнаю.

Дараженькі Клаўдіс, я хачу прасіць цябе і Власта памагчы матэріальна Олі[2]. Яна мне піша, што жыве не важна, хоць паміж намі есць нязгода уже больш я[к] год але ж я лічу сваім абавязкам памагаць ей як чалавеку. Я прашу Цябе дараженькі братко пагаварыць з ей што яна думае рабіць далей і як яна уяўляе свае далейшае жыццё, толькі ня кажы, што гэта я прашу. Хаця мы і перапісываемся но радная связь у нас даўно уже порвана і я ня ведаю ці зможа быць ізноў.

Ты усе гэта выясні і зрабі так каб ня было лішніх разгавораў і сплетней за усе гэта я буду вельмі табе удзячны.

Будзь здаровенькі паклон Власту і Вашім семьям.

Ваш Язэп

Praha dne 9 zaři 1925 r.

582.1.48:246&r-247&r

[1] Зь Вільні. [2] Жонка Язэпа Мамонькі Аляксандра.

3804. Ліст Юрыя Сулімірскага [Вацлава Ластоўскага] (Коўна) невядомым адрасатам (Вільня) за 12.09.1925

В<ельмі> П<аважаныя> Грамадзяне!

На бягучую сэсію Лігі Націй трэба ўнесьці жалабу, найпазьней да 10.IX. г.г.

Падпісаную 2-3 грамадзянамі П<ольшчы>, якія не знаходзяцца пад судом.

У зажаленьні:

1. Няможна выходзіць з рамак польск. дзяржаўнасьці.

2. Нямогуць падпісываць палітычныя арганізацыі, якія змагаюцца проці пол. дзярж.

3. Зажаленьні ня могуць выходзіць з рамак пакту Польшчы з Лігай Нац. аб нац. меншасьцях.

4. Паданьне павінна быць напісана добрай мовай франц. або ангельскай.

Дзеля таго што астаецца мала часу, трэба агранічыцца некалькімі фактамі, але яркімі і дабіцца разгляду гэтай справы хоць раз на пленуме.

Ваш Юры Сулімірскі

12.IX.25.

582.1.48:039

3805. Камунікат дэлегацыі Украінскай Нацыянальнай Рады і Прэзыдыюма Камітэту Паняволеных Народаў за 27.09.1925 з побыту ў Жэнэве падчас працы Лігі Нацый

582.1.48:042 — мк

3806. Ліст Івана Бартовіча (Бэрлін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.09.1925

[...] Łysta peredaw i poinformuwaw po Waszym bażanniam [...]

Tomu szczo pojizdku w kraj musiw widłożyty na piznijsze widnis sia ja do Wp. Swiencickoho pysmenno. Na dniach spodijus widpowidy zhladno knyżky [...]

582.1.48:041

3807. Ліст Аляксандры Мамонька (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.10.1925

582.1.48:036&r

З запытам аб магчымай стыпэндыі ў Літве для навукі сьпеваў. «Язэп ўсё кідае і хутка бузде ў Коўні».

3808. Паштоўка Віцебскага Акруговага Таварыства Краязнаўства рэдактару «Крывіча» (Коўна) за 14.10.1925

[...] Сваім лістом ад 21/VIII г.г. Вы абяцалі выслаць нам фатаграфіі слуцкіх паясоу [... для] зборніка мясцовай прамысловасьці [...]

582.1.48:034

3809. Ліст Тамаша Грыба (Радацін) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 14.10.1925

14.X.25
Radotin

Даражэнькі Вацлаве!

Даруйце, што гэтак не акуратна я пішу — страшэнна заняты акадэмічнымі справамі. Як толькі трохі звольнюся — напішу падробна аб ўсіх справах. А ёсьць шмат цекавых навін. Зрэшта паінфармуе Я.Мамонько, які едзе ў Коўню. Дапамажы яму чым зможаш.

Разам з гэтым прашу цябе, Вацлаве, дапамагчы чым зможаш Івану Паўлавічу Форостэнко, украінскаму эмігранту, б. палкоўніку, акончыўшаму выш. агран. школу ў Празе, які езде ў Літву, каб знайсьці сабе якую небудзь працу ў галіне сваей спэцыальнасьці (інжэнэрно-агранамічнай). І.П.Форостэнко я добра ведаю. Чалавек дужа парадачны і сумленны. Украінцы — нашы сябры. Узаемна дапамагаемо дзе можна і як можна. Спадзяюся, што ты усё зробіш, што будзе ў тваей моцы.

Затым цісну руку
Тамаш Грыб

582.1.48:035&r

3810. Парадак дня Другой Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарады ў Бэрліне 14-15.10.1925

Парадак дзенны
Другое Нацыянальнае Беларускае Нарады ў Бэрліне

1. Адчыненьне ініцыятыўным Бюро конфэрэнцыі.

Арганізацыйная праца

2. Выбары прэзыдыуму конфэрэнцыи.
3. —"— мандатнае камісіі
4. —"— рэдакцыйнае камісіі
5. —"— Сэніорн-конвэнту (рады старшын)
6. Утварэньне сэкцый:
   а) палітычнай
   б) эканамічнай
   в) культурна-прасьветнай

Даклады з мейсц

7. Беларуска-Літоўскія адносіны
8. «Крыўская» акцыя
9. Латвійска-Беларускія адносіны
10. Беларуская Рада у Празе
11. Беларускае студэнства у Празе
12. Становішча пад польскай оккупацыяй
13. Літоуска-Польскія адносіны
14. Становішча у Радавай Беларусі

Даклады сэкцый
15. Культурна-Прасьветнай
16. Эканамічнай
17. Палітычнай
18. Даклад Ураду БНР
19. Кансалідацыя Беларускіх сіл за кардонам
20. Пытаньні паднятыя паасобнымі сябрамі конфэрэнцыі
582.2.61:005 — мк

3811. Рэзалюцыя Другой Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарады у справе так званай «крывіцкай прапаганды», прынятая ў Бэрліне 14.10.1925

РЭЗАЛЮЦЫЯ
2-ой Беларускай нацыянальна-палітычнай
нарады прынятай 14 Кастрычніка 1925 г.
у справе так зв. «крывічскай прапаганды»

Заслухаушы спрауку аб так званай «крывічскай прапаганды» Нарада лічыць, што думка аб перамене нацыянальнага імя Беларусі на «Крывію» есьць сьведчаньне гістарычнага рамантызму і у плашчыне акадэмічнай не зьяуляецца небяспечным. Аднак, прыймаючы пад увагу, што гэтая прапаганда 1) вядзецца і у плашчыне палітычнай і імкнецца надаць назове «Крывія» агульна-дзяржауны характар 2) што гэтая прапаганда актыуна падтрымліваецца суседнімі з Беларусьсю дзяржавамі у сваіх мэтах разьдзелу беларускай зямлі 3) што гэтая прапаганда уносіць разлад у сьвядомасьць народа у цяперашні цяжкі момант падзелу Беларусі 4) што краевые арганізацыі рашучча высказаліся супроць яе, — Конфэрэнцыя, не уваходзячы у акадэмічны разгляд пытаньня, лічыць «крывічскую прапаганду» шкодная інтэрэсам беларускага нацыянальнага адраджэньня.

СЭНІОР-КАНВЭНТ:
582.2.61:006 — мк

3812. Рэзалюцыя Другой Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарады ў справе сусьветнага кангрэсу беларусаведау у Менску (па дакладу Культурна прасьветнай сэкцыі)

РЭЗАЛЮЦЫЯ
у справе сусьветнага кангрэсу беларусаведау
у Менску (па дакладу Культурна прасьветнай сэкцыі)

Заслухаушы паведамленьне аб тым, што у сталіцы Радавае Беларусі склікаецца сусьветны кангрэс беларусаведау[1], Нарада горача вітаець гэтую першую спробу аб'яднаньня усіх беларускіх сіл на грунце нацыянальна-культурнага будауніцтва і заклікаець усе беларускія арганізацыі і паасобных культурных працаунікоу як у Крае, так і закардонам, прыняць чынны удзел у гэтым важным пачынаньні.

СЯБРЫ СЭНІОР-КАНВЭНТУ:
582.2.11:008 — мк

[1] Акадэмічная канфэрэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі.

3813. Рэзалюцыя Другой Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарады аб агульным палітычным становішчы Беларусі, прынятая ў Бэрліне 15.10.1925

РЭЗАЛЮЦЫЯ
2-ой Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарады
аб агульным палітычным становішчы Беларусі.

Заслухаушы даклад палітычнай сэкцыі аб агульным палітычным становішчы Беларусі, Нарада канстатуець:

Падзел, замацаваны рыскім трактатам, да сягодня рэжа жывое цела адзінага Беларускага Народу. Нарада сьведчыць, што яна, як і ўвесь Народ, ня лічыцца з гэтым падзелам, як з актам міжнародна-праўным і заклікаець усе сьвядомыя беларускія сілы далей змагацца за аб'яднаньне усяе Беларусі у адзінае дзяржаўнае цэлае.

Нарада канстатуець, што валаданьне Польшчай над Заходняй Беларусьсю есьць акт гвалтоунай оккупацыі. Дзяржауных правоу Польшчы на захопленныя абшары Нарада не вызнаець. Нарада рашуча пратэстуець супроць нечуванных зьдзекаў, якія творыць Польская улада над безабаронным беларускім жыхарствам.

Разам з тым Нарада вызнаець, што на усходніх абшарах Беларусі створана Беларуская дзяржава у форме Беларускай Радавай Рэспублікі. Нарада вызнаець справядлівым, каб да гэтае Рэспублікі былі далучаны, згодна воле мясцовага жыхарства, беларускіе часткі, як прыкладам Гомэль і інш. усходнія паветы.

Нарада вызнаець усю надзвычайную важнасьць імкненьняў Радавай Беларусі да зьдзейсьненьня нацыянальна-дзяржаўнага ідэалу Беларускага Народу і, вызнаючы Менск, як цэнтр беларускага адраджэньня, лічыць уселякія спробы актыўнай барацьбы супроць яго здрадай справе вызвольнага беларускага руху.

СЯБРЫ СЭНІОР-КАНВЭНТУ:

Бэрлін, 15 Кастрычніка 1925 г.
582.2.61:001 — мк

3814. Рэзалюцыя Другой Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарады ў справе беларуска-літоўскіх дачыненьняў, прынятая ў Бэрліне 15.10.1925

РЭЗАЛЮЦЫЯ
па пытаньню беларуска-літоускіх адносін
прынятая 2-ой Беларускай Нацыянальна-Палітычнай Нарадай

Нарада сьцьверджаець, што адносіны Літвы да беларускай справы як былі, так і застаюцца ня шчырымі. Літоуская палітыка увесь час імкнулася і надалей імкнецца разглядаць беларусау толькі як службовую сабе сілу у спрэчцы з Польшчай з за Вільні. Літоуская палітыка імкнецца паставіць беларускую старану у гэтай спрэчцэ у гэткае становішча, пры якім беларускіе інтэрэсы у Віленшчыне і Горадзеншчыне ня быліб нічым забяспечаны. Нарада пратэстуець супроць падобных спэкулятыуных комбінацый літоускай палітыкі і сьцьвярджаець:

Вільня і увесь абшар, атрыманы Літвой па умове 12 Ліпеня 1920 году, ляжыць у этнаграфічна-пераважна беларускай граніцы. Дзеля гэтага лес Вільні павінен быць вырашан ня шляхам дыплематычных комбінацый, ці гандлю паміж Літвой і Польшчай, а шляхам вольнага усенароднага рэфэрэндума.

Ня лічачы разам з беларускімі краевымі арганізацыямі Літву за значны фактар у беларускай вызвольнай барадзьбе, нарада ганьбіць тых беларусау, якіе пад знакам культурнічэства годзяцца служыць мэтам вузка шовіністычнай палітыцы і лічаць магчымым дзеля гэтага працаваць пад фальшывымі вывескамі, кшталтам міністэрства беларускіх спрау у Коуне.

СЯБРЫ СЭНІОР-К[А]НВЭНТУ:

Бэрлін, 15/X-1925 г.
582.2.61:002 — мк

3815. Пратакол пасяджэньня Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі ў Бэрліне 15.10.1925

ПРАТАКОЛ
пасяджэньня Рады Народных Міністрау
Беларускай Народнай Рэспублікі .

Бэрлін "15" Кастрычніка 1925 г.

СЛУХАЛІ

Даклад Старшыні Рады Міністрау А.Цьвікевіча аб сучасным стане Ураду БНР і аб агульным палітычным становішчы Беларусі.

ПАСТАНАВІЛІ

У зьвязку з сучасным становішчам Беларусі, заходняя часьць якой знайходзіцца пад окупацыяй Польшчы, а усходняя — творыць Беларускую Савецкую Рэспубліку у складзе Соцыялістычнага Савецкага Саюзу, у мэтах аб'яднаньня усіх сіл Народу для яго поунага нацыянальна-соцыяльнага вызваленьня у поуным паразуменьню з краевымі беларускімі арганізацыямі, — ПАСТАНАВІЛІ: абвесьціць ад сеньняшняга дня Урад Беларускай Народнай Рэспублікі зьліквідаванным і спыніушым сваю дзейнасьць.

Старшыня Рады Міністрау Беларускай Народнай Рэспублікі А.Цвікевіч

Вык. аб. Міністра Фінансау Захарка

Дзяржауны Кантралер Л.Заяц

Дзяржауны Сэкрэтар В.Пракулевіч
582.2.61:003 — мк

3816. Пастанова да пратаколу пасяджэньня Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі ў Бэрліне 15.10.1925

ПАСТАНОВА ДА ПРАТАКОЛУ
пасяджэньня Рады Народных Міністрау
Беларускай Народнай Рэспублікі 15
Кастрычніка 1925 г.:

У сьвядомасьці таго, [што] улада сялян і работнікау, замацаванная у Менску - сталіца Радавай Беларусі запраўдна імкнецца адрадзіць Беларускі народ культурна, эканамічна і дзяржауна, што Радавая Беларусь есьць адзіная рэальная сіла, якая можэ вызваліць Заходнюю Беларусь ад польскага іга, у поуным паразуменьню з краявымі арганізацыямі, ПАСТАНАВІЛІ: спыніць істнаваньне Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі і прызнаць Менск адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаунага адраджэньня Беларусі.

Старшыня Рады Міністрау Б.Н.Р. А.Цвікевіч

Дзяржауны Кантралер Л.Заяц

Дзяржауны Сэкрэтар В.Пракулевіч

Бэрлін 15 Кастрычніка 1925 г.

582.2.61:004 — мк

3817. Ліст Адама Багдановіча (Яраслаўль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.10.1925

20/X 25г., Ярославль,
Флотский пер., д№2а, кв.2.

Уважаемый Земляк!

Пишущий эти строчки — отец небезызвестного Вам белорусского поэта Максима Богдановича. Утруждаю я Вас настоящим письмом по просьбе Института Белорусской Культуры, который весной этого года обращался к Вам с просьбой — поделиться с ним материалами для издания полного собрания сочинений моего покойного сына, но не получил от Вас ответа.

Материально я не заинтересован в этом деле, но нравственно заинтересован даже и очень. Я делаю все возможное, чтобы предпринятое издание сочинений моего так рано отошедшего сына отличалось возможной полнотой и возможным совершенством.

Я передал Инбелкульту все рукописи моего сына (в том числе свыше 50 нигде ненапечатанных стихотворений, письма, карточки, печатные стихи с его поправками и замечаниями, свои и других лиц воспоминания о нем, статьи его в русской печати, переводы его стихотворений на русский язык, — словом — все, чем я располагал и что удалось мне спаст[и] с большим трудом и усилиями от ярославского пожара, в котором сгорело все мое имущество и моя чудная библиотека.

Я смотрю на это дело, как на долг перед памятью покойного и перед родиной, и перед молодой белорусской культурой, возрождению и служению которой он так безудержно отдавался.

Уверен, что эта точка зрения Вам вполне понятна и найдет живой отклик в Вашем сердце.

Поэтому во имя Вашей приязни к покойному поэту и тех сердечных уз, которые некогда Вас соединяли, я считаю долгом обратиться к Вам с покорнейшей просьбой — оказать свое содействие к возможно полному выявлению и литературной, и нравственной личности покойного. Не откажите, пожалуйста, чем можете помочь. Ведь это дело — чисто культурное, лишенное всякой политической окраски.

Хотелось бы, чтобы литературное наследие и духовный облик покойного выявились с наибольшей полнотой и жизненной правдой. Ведь так немного людей, которые его лично знали или были с ним в сношениях. «Одних уж нет», — как говорит Саади, — «другие странствуют далече...» А те, которые остались, так туги на под'ем, так раз'единены и рубежами, и взглядами, и убеждениями. Жаль, если что нибудь окажется недосказанным, утерянным...

У всякого времени — свой дух, свои задачи, свои вкусы. Явились новые птицы и запели новые песни и — может быть — шумливый хор их голосов заглушит скромную песню жаворонка белорусских полей. Я хочу сказать, что бог весть — появится ли в свет второе издание его сочинений. А если и появится, то уж очень нескоро.

Я, конечно, не судья в деле оценки его таланта и литературного значения, но несомненные факты свидетельствуют, что свою бедную родину, свой народ, его язык, его прошлое он любил до самозабвения, даже до смерти.

Я думаю, что такая любовь заслуживает и признания, и уважения.

Итак, дорогой Земляк (простите — не знаю Вашего имени-отчества) — не откажите посодействовать, чем можете. Может быть дадите Ваши воспоминания о покойном, может быть у Вас сохранились его письма и стихотворения ненапечатанные (по снятии копий все Вам будет возвращено), может быть укажете даты, известные Вам, его стихотворений и т.п., что может способствовать успеху этого культурного дела и к чему нас, живущих, обязывает добрая память о покойном. Если почему либо Вам нежелательно сноситься с Инбелкультом, благоволите адресовать на мое имя: Адаму Егоровичу Богдановичу. Адрес в начале.

Во всяком случае — позвольте расчитывать на получение Вашго ответа. Шлю Вам мой сердечный земляческий привет.

АБогданович

582.1.48:032&r-033&r

582.1.48:031 — канвэрт

3818. Ліст Яўгена Бачынскага (Жэнэва) рэдакцыі «Крывіча» (Коўна) за 25.10.1925

582.1.48:030

На блянку:

E. de BATCHINSKY

Représentant du Conseil Suprême de l'Eglise Autocéphalique Orthodoxe Ukrainienne et Délégué permanent pour l'Europe Centrale et Occidentale

UKRAINE: Kiev, rue Korolenko, 24

SUISSE: Genève, rue de la Muse, 10 (Résidence)

Падзяка за дасланы №1 «Крывіча». «Спеціально вітаю п. В.Ластовського, який чей-же не забув наше перебування в Льозані!» — у 1916 годзе.

3819. Ліст Яўгена Ляцкага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 26.10.1925

582.1.48:029

На блянку Аргкамітэту Славянскага Інстытуту пры Міністэрстве Замежных Справаў Чэхаславацкай Рэспублікі. Падзяка за дасланыя бібліятэцы Інстытуту выданьні

3820. Ліст Янкі Бялькевіча (Мсьціслаў) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 7.11.1925 з просьбай памагчы Інбелкульту з выданьнем Збору твораў М.Багдановіча.

[...] Цяпер троху аб сабе. Пры палякох быў заарыштаваны, сядзеў колькі месяцаў у турме, а потым быў вывезены разам з Грыбам да Варшавы, але па дарозе выскачыў з вагона, на поўным ходзе цягніка і прышоў да Менску. У Менску арганізоўваў Камісарыят Асьветы і быў загадчыкам Беларускага аддзелу, а потым загадч. Школьным аддзелам. З адчыненьнем у 1922 г. Унівэрсітэту, паступіў на лінгвістычнае аддзяленьне [п]а беларускай сэкцыі і ў гэтым годзе скончыў курс навукі універсытэцкай. Цяпер мяне прызначылі за Дарэктара Пэдагогічнаго Тэхнікуму у старым горадзе Мсьціслаўлі дзе я і працую; праводжу беларусізацыю на ўсходзе [...]

582.1.48:027&r-028&r

3821. Ліст Уладзімера Крупскага (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 20.11.1925 з просьбай аб дапамозе атрымаць літоўскае грамадзянства

582.1.48:026&r

Прысланы Янкам Ермачэнкам.

3822. Запрашэньне Ўкраінскага Вольнага Ўнівэрсытэту (Прага) рэдактару «Крывіча» (Коўна) на сьвяточную інаўгурацыю, якая мае адбыцца 29.11.1925 у вялікай залі Геалягічнага Інстытуту (Прага, Albertov, 6)

582.1.48:016
582.1.48:015 — канвэрт

3823. Ліст Аляксандра Вазьнясенскага (Менск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.11.1925

582.1.48:017&r,019
582.1.48:018 — канвэрт

«[...] спешу послать Вам рукопись своей статьи о Богдановиче». З просьбай знайсьці замежных выдаўцоў для напісанага Вазьнясенскім падручніка паэтыкі (тэорыі літаратуры) для сярэдніх школаў.

3824. Ліст Украінскага Інстытуту Грамадазнаўства (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за ?.12.1925 з просьбай даслаць артыкулы на тэмы «Вызвольны рух у Беларусі» і «Сучаснае становішча Беларусі»

для рыхтаваных зборнікаў «Народознавства», якія ад 1926 г. маюць выходзіць квартальна

582.1.48:001&r

Дакладная дата невядомая.

3825. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.12.1925 у справе перасылкі віленскіх газэт

582.1.48:020

3826. Ліст Адама Багдановіча (Яраслаўль) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 6.12.1925

6/XII 25г., Ярославль,
Флотский пер., д№2а, кв.2.

Глубокоуважаемый и дорогой Земляк!

Очень рад я был получить Ваше любезное письмо, полное сердечной симпатии к моему покойному сыну.

От души благодарю Вас и за живой отклик на мое обращение к Вам и за добрую память о нашем Максиме.

Говоря откровенно — меньшего я не ожидал, ибо был уверен, что интересы нашей общей родины и ее возраждающейся из праха и пепла, изпод чуждых наслоений культуры Вам дороги может быть более, чем кому либо другому. Спасибо Вам.

Очень жаль, разумеется, что содержимое Ваших архивов, поскольку оно касается Максима, не может быть использовано для подготовляемого издания Инбелкульта: оно от этого много потеряет в полноте и точности датировки. Но — что делать — раз нельзя, то нельзя. Будем терпеливы. И будем питать надежду, что использование только отложено, но возможность не потеряна. Последнее было бы очень печально. Авось дождемся лучших времен и второго издания.

Предполагаемое издание обещает быть значительно интересным и во всяком случае обещает выявить достаточно полный облик безвременно угасшего поэта. Оно предполагается трехтомным. Первый том — стихотворения (около 20 печатн. листов), всего около 300 пьес, в том числе около 150 нигде не напечатанных; второй том — его прозаические статьи на белорусском и русском языках (около 15-16 листов); третий — воспоминания о нем и материалы для биографии — около 10 листов. Иконографическая часть тоже будет не бедной. Из этого вы увидите, что Ваши воспоминания подойдут как нельзя более кстати и хотя они и будут лишены точных ссылок и дат, но лучше что нибудь, чем ничего.

Белоруссы его так мало знали, а для русских найболее сильная и ценная сторона в его деятельности — белорусские писания — не имеет никакого значения, даже некоторые относятся к ней отрицательно или, по меньшей мере, как к курьезам; а поэтому от них и нельзя ждать его оценки с этой стороны, а стало быть и нет особых побуждений писать о нем. Да и все его товарищи разбрелись кто куда, нет адресов, нет живой связи. Все же кое-кто из людей близких к нему дал свои воспоминания.

Чувствуется всего более недостаток именно в белорусских воспоминаниях и обрисовке его личности. Поэтому я усиленно Вас прошу дать все то, что Вы можете дать при настоящих условиях. Даже и без ссылок, и без цитат и пр. Ваши воспоминания будут представлять несомненный интерес, как воспоминания человека, которому все белорусское, все родное стоит близко к сердцу. Итак — в добрый час: дайте, что можете дать.

Всего проще посылать на имя проф. Ивана Иван. Замотина в Инбелкульт. Квартирный его адрес я потерял и не могу сообщить Вам. А если Вы почему либо сочтете, что лучше на мое имя писать — пожалуйста.

Я думаю, что Вы ничего не будете иметь против, если я Ваше письмо отошлю Замотину для приобщения к Максимовскому архиву: оно ведь заключает ценные сведения и значит является в некотором роде документом. С тем однако, что оно не будет напечатано без Вашего разрешения. Это условие мною поставлено по отношению ко всем письмам к Максиму, мною переданным в Инбелкульт.

Рад буду свидеться с Вами лично и пожать Вашу руку. Надеюсь, что такая возможность еще представится мне. А пока заочно сердечно Вам ее пожимаю.

Извиняюсь, что не отвечаю Вам по-белорусски. Я говорю и пишу по-белорусски, но это было бы мне труднее. С сердечным земляческим приветом

АБогданович

582.1.48:022&r-024&r

582.1.48:021 — канвэрт

3827. Ліст Янкі Станкевіча (Прага) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 12.12.1925

Паважаны Спадáру Вячаславе!

Сялянскі Саюз із Вільні просіць мяне перадаці Вашэцю ягоную просьбу, каб Ваша пісаў у «Сялянскую Ніву» на тэмы сялянскае ідэолёгіі і наагул. Ад сябе дадам, што гэта было-б вельмі патрэбна й добра. Як бачыце з №1[1], часопісь пры добрым кірунку ня мае жаднага публіцыстага а бяз гэтага ня можа быці запраўднай часопісяй.

Ці даставалі мой лісток, напісаны тыдень назад і гэтак сама ўклеены ў часопісь.

Ваш Бр. Скарыніч

12.XII.1925

582.1.48:025

[1] №1 «Сялянскай Нівы» выйшаў 6.12.1925.

3828. Ліст Уладзімера Пігулеўскага (Рыга) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 19.12.1925

582.1.48:014

Аб перасылцы віленскіх газэт: «...ад часу арэшту у мінулым годзе К.Езавітава, яны высылаюцца ў мой адрэс «для Власта» і «Цьвіка». Раней яны высылаліся на Люцын, а пасьля майго пераезду ў Рыгу — сюды».

3829. Ліст старшыні Літаратурнае Камісіі Інбелкульту прафэсара Івана Замоціна (Менск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 22.12.1925 (вых. №2449) з просьбай дапамагчы ва ўдакладненьні храналёгіі вершаў М.Багдановіча і прыслаць свае ўспаміны пра паэта

582.1.48:009

3830. Сьпіс вершаў Максіма Багдановіча, укладзены Літаратурнай Камісіяй Інбелкульту

582.1.48:010-013а

Дата невядомая. Пры некаторых вершах — храналягічныя ўдакладненьні В.Ластоўскага.

3831. Ліст вучонага сакратара Віцебскага Акруговага Таварыства Краязнаўства Міколы Касьпяровіча (Віцебск) рэдакцыі «Крывіча» (Коўна) за 23.12.1925

Беларуская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка
Вучоны Сакратар Віцебскага
Акруговага Таварыства Краязнаўства
м. Віцебск вул. Крылова, 4.
23 Сьнежня 1925 г.
Рэдакцыі журналу «Крывіч».

Шчыра просім Вас выслаць нам у парадку абмену «Гісторыю Беларускай Кнігі» і апошні нумар «Крывіча» па адрасу: Віцебск вул. Крылова 4, кв.4.

М.Касьпяровіч

582.1.48:007

3832. Ліст Аляксандра Вазьнясенскага (Менск) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 24.12.1925

582.1.48:002&r-003
582.1.48:004 — канвэрт

У справе супрацоўніцтва з «Крывічом»: «[...] могу предложить для Вашего журнала еще две свои статьи: первая «Построение белорусской науки о литературе» [...] Вторая: «Поэмы Янки Купалы» (стиль и сюжетное построение) [...]»

3833. Ліст Давіда Анэкштэйна (Ганд, Бэльгія) Вацлаву Ластоўскаму (Коўна) за 29.12.1925

[...] зкончыў свае наукі са званьнем доктора фізыкі і матэматыкі [...] Шукаю пасаду пры універсітэце яком-небудзь [...]

582.1.48:005&r-006

1932

3834. Беларускае Прэс-Бюро. Інфармацыйны бюлетэнь №1 Беларускай Рады ў Празе. 2.04.1932

• 25 сакавіка беларускай калёніяй у Празе-Чэскай былі урачыста адсьвяткаваны чатырнаццатыя угодкі абвешчаньня дзяржаунай незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Сход быу адчынен прамоваю Старшыні сходу В.Захаркі [...]

[...] пасьля дакладу д-ра Грыба[..]

• 25 сакавіка 1932 г. адбыуся, пад старшынствам грам. А.Калошы, агульны гадавы сход сяброу Беларускай Рады у Празе, на яком абраны новы Прэзыдыум Рады, у наступным складзе: Старшыня Рады В.Захарка, Намесьнік Старшыні інж. В.Русак, Скарбнік А.Калоша і Сэкрэтар М.Вітушка. У Рэвізыйную Камісыю абраны: інж. Астапкевіч, інж. Журэнкоу і М.Вершынін.

• З 2 красавіка 1932 г. Канцэлярыя Беларускай Рады у Празе знаходзіцца у памешканьні новага Старшыні Рады В.Захаркі. З гэтае прычыны усю караспадэнцыю на імя Рады належыць накіроуваць па наступнаму адрэсу: Беларуская Рада у Празе; Чэхославакія, Прага-Моджаны число 334.

582.2.64:001-003 — мк

У дакумэнце няма стар. 2.

1937

3835. Ліст Фабіяна Вайцілёнка (Варшава) рэдактару часапіса «Летапіс» (Вільня) за 3.07.1937 з просьбай надрукаваць артыкул

582.1.04:037

3836. Артыкул Фабіяна Вайцілёнка «Беларускія работнікі ў Варшаве»

582.1.04:038-040

1939

3837. Зварот старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Васіля Захаркі (Прага) да Беларуска-Амэрыканскага Нацыянальнага Саюзу (ЗША) за 18.01.1939

У Беларуска-Амэрыканскі Нацыянальны Саюз

Надыходзячыя новыя гістарычныя падзеі, выклікаюць новыя надзеі ва усём Беларуском Народзе. Надзеі гэтыя выцекаюць з пэуных вестак сучаснага момэнту, што Беларусь, на роуні з Украінай, мая быць дапушчанай стаць незалежнай дзяржавай.

На сколько такі плян ёсьць плянам надзвычайнай вагі, настолькі ён вымагая ад кожнага беларуса далажыць надзвычайных высілкау да здабыцьця нацыянальна-дзяржаунай незалежнасьці Беларусі.

Я, як Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, вызнаваемы да гэтага часу за галоунага прэдстауніка усей Беларусі, ужо зьвярнууся як у Край, так і ваусе эуропэйскія цэнтры беларускай эміграцыі, з прозьбай як мага глыбей і шырэй пасіліць нацыянальную працу з тым, каб больш падгатавана спаткаць вялікія падзеі.

У першую чаргу, я прашу нацыянальнага аб'еднаньня усіх беларусау, якое вымагаецца сучасным момэнтам і якому з гэтае прычыны, не павінны перэшкаджаць тыя ці іншыя падзелы і групаваньні беларускага грамадзянства. Па-другое, я рэкамэндую стварыць у кожным беларуском асяродку матэрыяльны грунт — «Беларускі Фо[нд»] так неабходны, як для інфармацыйнай працы, так і для падтрыманьня зьвязку паміж беларускімі арганізацыямі.

Калі дзяржауныя народы нясуць вялікія ахвяры на абарону свае дзяржавы, та нам — паняволенаму народу, трэба тым больш напружыць нашы сілы, на вызваленьне нашае дарагое Бацькаушчыны [з] пякельнай няволі і жахлівага здзеку акупантау.

З такою-ж самаю прозьбаю я зьвяртаюся і да беларускай іміграцыі у Амэрыцы. Я глыбока пераконан у тым, што усе нашы браты у Амэрыцы зразумеюць усю вагу мае прозьбы і усю тую атпаведальнасьць, якая ляжыць на кожным з нас за долю нашае Бацькаушчыны. У той час, калі так цяжка стогня наша Родная Матка Беларусь, нас беларусау не павінна дзяліць ні рэлігія, ні чужая культура, ні чужая прапаганда. У такі момант, сярод нас не павінна быць ні рэнегатау, ні янычарау.

Вось ужо двадцаць гадоу, як Беларускі Народ падзелен на пяць частак. На кожным кавалку парэзанай і акрываулена Бацькаушчыны ён вядзе, пры пекельных абставінах, невіданна цяжкое змаганьне за свае аб'еднаньне і за свае вызваленьне. Пры таком паложэньні, калі перэд нашыма вачыма стаіць увесь Беларускі Народ безпрауным і прыніжэным, калі сотні тысяч нашых братоу і сёстрау загінулі ад кулі і голаду, калі другія такія-ж сотні тысячау, як рабы, цяжка працуюць абарванымі і галоднымі: у калгасах, у лясох і акопах і калі на-рэшце лепшыя сыны Беларускага народу упакоуваюцца на загубу у акупантскія турмы, ніхто з нас, ці то бедны, ці то багаты, ці то дужы, ці то слабы не павінен запамінаць небывалага няшчасьця. Хто ня хоча быць выродкам, той чым толькі можа павінен дапамагаць разьбіваць ланцугі і разрываць вяроукі цяжкой няволі.

Калі б чэкаемыя падзеі на усходзе Эуропы затрымаліся на даужэйшы час, та я, як бы у дадатак да гэтага ліста, прыеду да вас асабіста.

Маючы доказы вялікай карысьці ад такіх паездак прэдстаунікоу украінскіх арганізацый у Празе, думаю, што і мая паездка акажэцца не-безплоднай.

На маю думку мая паездка у Амэрыку павінна заключаць у сабе ні што іншае, як працу. Прачытаны шэраг дакладау у рожных цэнтрах па-[ві]нен: абудзіць, узварушыць і павялічыць боль душы у беларускай іміграцыі. Пры гэтым я моцна спадзеюся, што мой прыезд будзе прыхільна прыняты Саюзам, на дапамогу каторага я разлічаю і пры сваёй працы у Амэрыцы.

Дзеля таго-ж, каб праца гэтая была больш пасьпешнай і карыснай я ветліва прашу Саюз без'аткладна паведаміць мяне якога сорту інфармацыямі і якога зьместу дакладамі можна было-б дасягнуць найлепшых вынікаў, як для нацыянальнай справы там — у вас, так і для справы агульна-беларускай на Бацькаушчыне.

З глыбокаю пашанаю В.Захарка

18 I 1939,
Modřany u Prahy č 688
Čecha-Slavakija
582.2.20:005&r-006 — мк

РЭДАКЦЫЯ
беларускай тыднёвай
часопісі
„РУНЬ“
2 чэрвеня 1920
№ ___
Менск, Кашарская, 10.

Вельмішанаваны Паночку!

Будзьце ласкавы, пастарайцеся выслаць па магчымасці хутчэй „Кнігу Ратынскага“ і фатографію В.-Дарашэнкага. На першае пытанне рачы ня мае, а на другое — кніга мне вельмі патрэбна для стацьці у „Рунь.“

Што чутно з Вашым месячнікам? Надрукуйце у ім абвестку аб „Руні“, мы тага зробім аб Вашай часопісі; пашлеце толькі тэкст абвесткі.

Са шчырым павагай. Ів. Луцэвіч

Ліст Івана Луцэвіча (Янкі Купалы) Антону Луцкевічу за 2. 06. 1920 (дак. №2166)

Беларускі Народзе!

Настал Гістарычны і адказны для усіх жыхароу нашай зямелькі момэнт: **праудзівы сын Беларусі**-Камандуючы Рускае Народнае Ахвотніцкае Армії-**Генерал Булак-Балаховіч,** адчуушы сваім чуткім сэрцам горо і стогн Беларускага Народу прыдушанага насільлям і эьдзекам бальшавікау, згодзілся прыняць пад сваю камэнду паустаршоу селянах і Зяленадубцау, якіе праз увесь час вялі барацьбу з бальшавікамі і іх пры-тульнікамі.

25-го гэтага Кастрычніка, подняушы Беларускі Штандар, наш Бацька Булак-Балаховіч перайшоу з войскам граніцу, установляную прэдімінарным мірам,

Шпарка Ен ідзе наперод, маючы мэту выгнаць захватчыкау уласьці-бальшавікау и празясьці у жыцьцё даунейшые мары усіх сьвядомых сыноу Беларусі-стварыць свае незалежнае Гаспадарство, даць змучанаму Беларускаму Народу тую зямлю, што дагэтуль давалі яму на паперы бальшавікі, даць магчымасьць працаваць на сваю карысьць, а не для бальшавіцкіх камісараў і уселякіх „**ісполкомау**".

Дык у гэты вельмі важны мамэнт клічам Цяуе, Беларускі Народзе, каб памог Ты у вялікай справе адбудовы свайго уласнага Гаспадарства. Клічам усіх, хто мае моц трымаць у руках вінтоуку—ідзіце да свайго Беларускага Бацькі, станавіцеся у шарэнгі ахвотніцкіх атрадау, каб моцна ударыць на бальшавікау і чым найхутчэй выгнаць дзікіх захватчыкау уласьці з радной зямелькі!

Ідзіце ж усе-каб наш удар быу моцны, каб паказаць усяму міру, што мы, Беларусы, як і іншые народы, ужо прачнулися для нацыянальнага жыцьця, ужо пачалі будаваць уласнае Гаспадарство!

Ідзіце усе-бо настау час уваскрасеньня Беларусі: Наш дарагі **Бацька** вядзе нас у апошні бой і ужо бягуць у паніцы ворагі, толькі што панававшые-як гаспадары-на нашай зямельцы.

Хай же істкуе Вольная Незалежная Беларусь!

Хай жыве наш дарагі Беларускі Бацька Булак-Балаховіч!

Хай жыве Руская Народная Ахвотніцкая Армія, дапамагаючая нам у цяжкі час нашага вызваленьня ад бальшавіцкага эьдзеку!

Хай жывуць нашые Беларускіе Партызаны і Зяленадубцы, не шкадуючыя свайго жыцьця для роднай Бацькаушчыны!

Не паложым аружжа пакульня выганім ворагау з роднай зямелькі, пакуль нашые штандары ня будуць краеваецца па усей Беларусі.

Беларускі Палітычны Камітэт пры Народнай Ахвотніцкай Армії Генерала Булак-Балаховіча.

Улётка Беларускага Палітычнага Камітэту пры Армії С. Булак-Балаховіча. Лістапад, 1920 (дак. №2488)

Фатакопія апошняй старонкі дагавору паміж урадамі БНР і Літоўскай Рэспублікі за 11. 11. 1920 (дак. №2493)

Вацлаў Ластоўскі. 1916-1920 (дак. №2643)



Нататкі алоўкам Вацлава Ластоўскага (дак. №2495)

Нота Ўраду БНР Лізе Нацыяў. Рукапіс Пятра Крэчэўскага (дак. №2657)

Узоры пячатак Выдавецкага Таварыства «Вызваленьне» і Хаўрусу Дапамогі Беларускім Пісьменьнікам імя А. Прушынскага (дак. №2364)

Малюнак Вацлава Ластоўскага (дак. №3364)

Асабістае дакументы
і перапіска

«Ня вер нікому
ня бойся нікога»
нар. прыказка

Загаловак справы 582.1.45 (дак. №2695)

Усім Жыхарам Беларусі.

Народзе Беларускі! Доўга і цяжка бароўся ты за сваю зямлю і волю. Палілі твае вескі, грабілі дабро, гналі у турмах, катавалі і разстрэлівалі тваіх лепшых сыноў польскіе паны абшарнікі і маскоўскіе наезднікі-камуністы. Зямлі табе не далі і самі ею не скарысталіся, а ты адзін толькі на яе маеш права.

Мучылі і катавалі цябе толькі за тое, што ты бярог свой хлеб для сябе і сваіх галодных дзяцей, а не аддаваў яго польскім і маскоўскім наезднікам.

Сёмы год на тваёй зямлі йдзе бязупынная барацьба, ужо мусі німа ні воднай пядзі зямлі не палітай тваёй крывёю. Ты моцна стаў і стаішь за сваю незалежнасьць і сваю беларускую уладу.

Тры разы ужо маскоўцы, немцы і палякі хацелі разьдзяліць тваю зямлю, але жыў дух беларускага народу ідэя незалежнасьці і непаддзельнасьці запануе над усім і не дасьць нашым ворагам падзяліць нас. Прэч усіх, хто хочэ дзяліць чужое дарбо бэз гаспадара. Ты гаспадар на Беларусі і у цябе першага павінны спытацца с кім і як ты хочэш жыць, Ад цябе бяруць хлеб, палатно і уселякае збожэ, а табе даюць нічога нівартые польскіе маркі, чы савецкіе рублі. Цябе абманываюць, не давай ім нічога.

Чэкай распарджэньня свайго Ураду, які хутка павінен вывясьці цябе з няволі — гуртуйцеся і чэкайце. Цеснымі брацкімі радамі пойдзем вызваляць сваю Бацькаўшчыну, калі гэта будзе трэба, Праўда за намі, сваю замлю не адаамо нікому. Лепш згінуць, чым быць батраком чужынца.

Прэзыдіум Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

25 Саковіка **1921**
Коўна

Адозва Прэзыдыюму Рады БНР за 25.03.1921 (дак. №2687)

Дэкларацыя.

Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі з прычыны трэцьцяй гадаўщчыны абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі.

Дзень 25 сакавіка—нацыянальнае сьвята Беларусі.

Тры гады таму назад у сталіцы Беларусі Менску, Беларуская Дзяржаўная Рада, выпаўняючы пастановы Ўсебеларускага Зьезду і баронючы Беларусь ад падзелу, абвесьціла наш край Дзяржавай вольнай і ад нікога незалежнай.

Гэтай граматай былі паложаны галоўныя падваліны Дзяржаўнага бытаваньня Беларусі:

а) што яна зьяўляецца Дзяржавай працоўных мас Беларускай Народнай Рэспублікі і што граніцы яе абхопліваюць усе тыя землі дзе ёсьць лічэбная перавага беларускага народу.

в) што ў гэтай народнай дзяржаве ўся земля павінна належыць працоўнаму селянству як стану, на які дзяржава апіраецца.

с) што ўсім нацыянальным меншасьцям Беларуская Народная Рэспубліка забяспечае ўсе грамадзянскія свабоды, поўнае роўнапраўе перад законам і культурна-нацыянальную аўтаномію.

д) што моцны парадак дзяржаўнага жыцьця Беларусі ва ўсіх галінах зацьвердзіць яе галоўны гаспадар—Устаноўчы Збор.

З таго дня і дагэтуль Урад Б. Н. Р., разам з старшынамі Дзяржаўнай Рады, як адзінная нацыянальная ўлада Беларусі, не пакідаў змагацца за правы свайго народу, вылажэныя ў гэтых пастановах.

Тры гады мінуло ўжо ў безупыннай барацьбе. За гэты час на нашай зямлі гаспадарылі і гаспадараць варожыя сілы. Пераходзячы з краю ў край нашу Маці-Беларусь чужацкія войскі палілі вёскі, руйнавалі гарады, пакідаючы за сабой голад і сьмерць.

С 1915 году мы ня можам адпачыць ад страшных жахаў вайны, ня можам пачаць спакойную творчую працу. Зямля наша зруйнаваная і дыміцца ад пралітай на ей крыві. Ва ўсім жыцьці цяжкі занепад.

Але моцна трымае Рэвалюцыйны Беларускі Урад у сваіх руках сьцяг незалежнасьці і непадзельнасьці роднага краю.

Пад гэтым сьцягам абъединяліся лепшыя сыны Беларусі, за гэты сьцяг аддалі яны сваё жыцьцё за волю народу гнояцца яны ў канцэнтрацыйных лагерох і турмах бальшавіцкіх і польскіх.

З гэтым сьцягам прэдстаўнікі Ураду йшлі загранiцу і голасна пратэставалі перад Урадамі сьвету і перад мільённым працоўным народам Эўропы супроць зьдзеку і гвалтаў чужакоў у родным краю.

Усюды, дзе толькі білося сэрцэ сыноў Беларусі, на ўсе куткі Беларусі Урад пасылаў слова надзеі, загады барацьбы за сваю праўду.

І цяпер у дзень нашага нацыянальнага сьвята ў дзень 25 сакавіка 1921 г. перабываючы часова на тэрыторыі братняга нам літоўскага народу, мы клічам да цябе, Беларускі Народзе; і разам з табой да ўсіх народаў, якія жывуць на Беларусі.

Ня верце чужынам, што твая доля ужо вырашана. Раней дзялілі нас фронтамі, цяпер улажылі граніцу, якой хочуць замацаваць разрыў твайго жывога цела.

Ня будзе гэтага.

Хочуць тваю зямлю замацаваць за польскімі панамі і маскоўскай камунай.

Ня будзе гэтага.

Хочуць насяліць да нас чужакоў, аддаўшы ім твае родныя полі, за якія ўміралі твае прадзяды, і якія абліты твайм крынёю і потам.

Ня будзе гэтага.

Жыла Беларусь і будзе жыць.

За папаленые будынкі, за рэквіраванае і награбленае дабро, павінна быць заплочэна.

Пад сьцягам Б. Н. Р., па загаду свайго ураду бійся за вольную і незалежную Беларусь, за яе непадзельнасьць, за сваю зямлю і волю. Добра ведай, што ў барацьбе твайм разарвецца ярмо, якое накідаюць чужакі на тваю галаву, згінуць граніцы, якімі хочуць падзяліць бацькоў ад сыноў, дзяцей ад маці. Недалёк ужо той дзень, калі ты вольны загаспадарыш у сваёй вольнай дзяржаве.

Слава тым, хто загінуў у барацьбе за Бацькаўшчыну.

Часьць усім тым, хто праліваў і праліває кроў сваю за правы народу, за тых, хто ў ланцугох і за рашоткай ненавідных астрогаў.

Ніхай жыве беларуская рэвалюцыя.

Ніхай жыве працоўны беларускі народ.

Ніхай жыве яго вольная дзяржава Беларуская Народная Рэспубліка.

Урад Беларускай Народнай Рэспублікі.

Дэкларацыя Ўраду БНР за 25.03.1921 (дак. №2690)



Аўтограф верша Власта «Наперад, змагарна наперад!..» (дак. №3138)

Паштоўка выдавецтва «Вызваленьне». Бэрлін, 1922 (дак. №3153)

Малюнак Вацлава Ластоўскага (дак. №2237)

15/III 1922 г.
58

Глыбокапаважаны Пане!

Пры гэтым дзелю фармальнасьці пасылаю Вам копію з дакумэнта пасьведчаньня аб стане майго здароўя.

Важныя ягчэ прасіць Вас, калі грошы мне на падарожжу дагэтуль ня выслана, выслаць іх на маёму даручэньню ці перавесьці на маё імя (тут ёсьць філія Рыскага Камэрцыйнага Банку). Праш. гэтак дзеля таго, што цяпер ня маю грошэй нават выехаць, каб залагодзіць замежную падарожжу, а другое-хачу, каб усе грошы, якія мне дасьцё, атрымаць адразу, бо надта баюся непрадбачаных акалічнасьцей, асабліва ў зьвязку з мяцежамі пераменамі ў палітычнай абстаноўцы Усходняе Эўропы. Калі мяне адрэзуць ад грошэй ці зробіцца штось падобнае — будзе не лягчэйшае, а ягчэ горшая хвароба.

Чытанье лекцыяў скончу к 25/III.

Надта а надта праш. Вас бачыць мне за гэтае пісьмо, каюся за дакуку.

З павагаю
М Гарэцкі.

Латвія, Дынабург,
Бульварная, 30.

Ліст Максіма Гарэцкага Вацлаву Ластоўскаму за 15. 03. 1922 (дак. №3155)

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАМІТЭТ У ІЛЛЫНОЙС

Whiterussian National Committee of Illinois

1632 N. ROBEY STREET

"У БАРАДЗЬБЕ ЗДАБУДЗЕМО
ЗЕМЛЮ, ВОЛЮ І ВОЛЬНУЮ БЕЛАРУСЬ!"

CHICAGO, ILL. 9 ліпня 1923.

Паважаны і Дарагі дзядзька Вацлаў:

Забудзем мінуўшчыну і аб ей ня будзем нават
і ўспамінаць. Падамо руку згоды і далей станем
тымі прыяцелямі, якімі мы былі ад часу першага
знаемства і ў працы, аж да майго ад'езду ў
Амэрыку. Вы знаеце, якім я быў праз ўвесь час з
Вамі і пры Вас у супольнай палітычнай працы.
Аб гэтым ня буду ўспамінаць, бо кожны знае,
калі загляне ў успамін прамінуўшы. Цяпер
падзялюся з Вамі тым, што ёсць у мяне
тут. Праезд мой ў Амэрыку адбыўся пры самых
цяжкіх варунках. Выехаў з Коўна без нямецкае
маркі, а ўсё то, калі ня я аддаваў ня толькі ўра-
давыя, но і свае асабістыя грошы, каб уста-
навіць добрыя адносіны з іншымі пасольства-
мі і з ўплывовымі чыноўнікамі Літвы.
Мае становішча тут ў Амэрыцы было
адным з самых страшэнных з'явішч у маім
маладом жыцьцю. Усё аддаваў, ня для сямей-
ных спраў, ня для асабістых выгад, а насьвяціў

Ліст Янкі Чарапука Вацлаву Ластоўскаму за 9. 07. 1923 (дак. №3413)

Пячатка Беларускага Камітэту ў штаце Іліной (дак. №3414)

KRYVIČIUS mėnesinis Literatūros, kultūros ir visuomeninio gyvenimo laikraštis
Redaktoriai
V. LASTAUSKAS ir K. DUŽ-DUŠAUSKAS.

КРЫВІЧ

МЕСЯЧНІК літэратуры, культуры і грамадзкага жыцьця
пад рэдакцыяй
В. ЛАСТОЎСКАГА І К. ДУЖ-ДУШЭЎСКАГА

Vytauto prosp. Nr. 30, Kaunas, Lietuva.

„27“ Сьнежня 1923.

У Камісарыят Асветы Б.С.С.Р.

~~т.~~ Камісару Асветы
т. Ігнатоўскаму.

Мы ужо поўгада дарэмна бясмоўна стараючыся наладзіць абмен выдавецтвамі з „Савецкай Беларусьсю“ і месячнікам „Полымя“. Высыланыя намі нумэры нашай часопісі вяртаюцца з Масквы назад. З трыдзаці адрэсоў на бібліотэкі і навуковыя установы не вяртаюцца толькі адрэсаваныя у Петраградзкую публічную бібліятэку да Румянцаўскі Музэй. Рэшта усе, не выключаючы Дзяржаўнай Бібліотэкі Б.С.С.Р. у Менску, вярочаюцца. Мне параілі у тутэйшым прадстаўніцтве Р.С.С.Р. напісаць аб гэтым да Вас, яны лічаць, што часопісь адрэсаваная у бібліятэкі павінна даходзіць. Нам, а, здаецца, і Вам важна каб абмен быў наладжан. Мы ахвотна друкуем усе ~~дада~~ весткі аб культурнай у Вас працы, а гэтак жа усё разыходзіцца шырока па заграніцы і інфармуе ня

Чарнавік ліста Вацлава Ластоўскага Ўсеваладу Ігнатоўскаму за 27.12.1923 (дак. №3531)

Высокапаважаны Пане Антон.

Перасылаючы пры гэтым копію паданьня ў Раду Лігі Нацыі ў справе Барана, Маслоўскай і інш., прашу Вас зрабіць захады, каб у магчыма карацейшы час пераслаць мне (Hotel des Alpes, Geneva) кароткую формулёўку юрыдычнага палажэньня гэтай справы, а такжа добра было-б каб беларускія партыі па гэтаму пытаньню вынесьлі рэзалюцыю, ў дапаўненьне да паданьня.

Наагул, ў Вашай асобе, прашу, ад імені Камітэту, помачы ў працы і кіраўніцтва ею, а такжа надсылкі часопісаў і іншых друкаваных ды патрэбных да справы матэрыялаў, калі якія у Вас маюцца.

Паднятая акцыя за звальненьне Барана і інш. будзе мець падтрымку са стараны Лігі абароны правоў чалавека і грамадзяніна. Гэта Ліга ў суботу (23.VIII.) адбыла паседжаньне прысьвечанае гэтай справе і ухваліла рэзалюцыю аб інтэрвэнцыі, а, ў дадатку, сябры яе ўходзяць і ў склад Ураду і ў склад Рады Лігі Нацыі і не толькі у Францыі але у Англіі і ў Італіі.

Заты ціску руку Вашу, бо мінулае дай я ўсё ў забудзь, а з другой стараны прыйшоў да пераконаньня што нашай справе патрэбны аўтарытэты і што пакуль іх у нас не будзе, будзе адна анархія, а зная таго што Вы адзін з тых якія найбольш палажылі ў нашу справу, я свой голас даю за Вас.

24. VIII. 24. З праўдзівай пашанай В.Ластоўскі

Ліст Вацлава Ластоўскага Антону Луцкевічу за 24. 08. 1924 (дак. №3619)

Вацлаў Ластоўскі. 1922 (дак. №3289)

201

ЯГО МІЛАСЬЦІ

Грам Вацлаву Ластоўскаму

Урад Беларускага Навуковага Т-ва у Вільні мае чэсьць прасіць Вас прыняць учасьце у урачыстай акадэміі, ладжанай Т-вам і пасьвячонай памяці першага беларускага друкара, д-ра Францішка СКАРЫНЫ, у 400-ыя угодкі заклядзінау у месьце Вільні першае друкарні. Акадэмія адбудзецца 25 сакавіка (марца) с. г. у 8 гадз. увечары у актовай салі Віленскае Беларускае Гімназіі (Вострабрамская 9).

Старшыня Т-ва: *А. Луцкевіч.*

Сэкратар: *Б. Тарашкевіч.*

Увага: Асобы, якія хацелі бы прамовіць на акадэміі, заклікаюцца заявіць аб гэтым старшыні Т-ва да адчыньця сходу.

Запрашэньне Вацлаву Ластоўскаму (дак. №3969)

БІБЛІЯГРАФІЯ

1. Архіўныя крыніцы

а) Дзяржаўны Архіў Літвы:

фонд 281: Беларускі Музэй імя Івана Луцкевіча
фонд 306: Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт
фонд 383: Міністэрства Замежных Справаў Літоўскай Рэспублікі
фонд 395: Міністэрства Беларускіх Справаў у Коўне
фонд 582: Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі
фонд 634: Беларускае Прэс-Бюро ў Коўне
фонд 923: Кабінэт Міністраў Літоўскай Рэспублікі
фонд 929: Міністэрства Аховы Краю Літоўскай Рэспублікі
фонд 1091-х: Беларускі Цэнтар у Літве
фонд 1290: Беларуска-Літоўскае Таварыства

б)Бібліятэка Акадэміі Навук Літвы:

фонд 21: Рукапісныя зборы Беларускага Музэю імя І.Луцкевіча аддзел старой пэрыёдыкі

в) Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь:

фонд 625: Беларуская Народная Рэспубліка

г) Цэнтральны Дзяржаўны Архіў-Музэй Літаратуры й Мастацтва:

фонд 3: Рукапісныя зборы Беларускага Музэю імя І.Луцкевіча

2. Дакумэнты й друкаваныя матэрыялы

Адраджэнне: Гістарычны альманах. Мінск, 1995

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918-1920 гг.: Сборник документов и материалов. Т.1. Минск, 1968; Т.2. Минск, 1971

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Т.1-2. Минск, 1957

Документы внешней политики СССР. Т.1. Москва, 1957

Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т.1-3. Москва, 1963-1965

Езовитов К. Белоруссы и поляки: Документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 годах. Ковна, 1919

З Архіваў БНР: Гэнэрал-Маёр Езавітаў, Канстантын. Кароткі жыцьцяпіс і праходжаньне службы, адрэдагаваны ўласнаручна К.Езавітавым // Запісы. №20. 1992

За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі: Дакумэнты і матэрыялы. Лёндан, 1960

Запруднік Я. Устаўныя граматы БНР // Запісы.. №13 1975

Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакумэнтаў і матэрыялаў. Т.1. (1917-1922 гг.). Мінск, 1997

Зюзькоў А. Крывавы шлях беларускай нацдэмократыі. Менск, 1931

Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918-1945. Ч.1. 1918-1928. Минск, 1990

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР: Документы и материалы по истории Белоруссии. Т.4. Минск, 1954

Кастрычнік на Беларусі: Зборнік артыкулаў і дакумэнтаў. Вып. І. Менск, 1927

Красная книга: Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях, 1918-1920 гг. Москва, 1920

Крах немецкой оккупации в Белоруссии в 1918 году: Сборник документов. Минск, 1947

Крэчэўскі П. Матэрыялы і дакументы // Замежная Беларусь. Кн.1. Прага, 1926

Мирные переговоры в Брест-Литовске. Т.1. Москва, 1920

Міхнюк У. Захоўваць вечна: справа №20951-С // Маладосць. 1992. №6

Міхнюк У. Справа Вацлава Ластоўскага // Маладосць. 1993. №8-9

Политика Советской власти по национальным делам за три года, 1917-1920. Москва, 1920

Польско-советская война, 1919-1920: (Ранее не опубликованные документы и материалы). Ч.1-2. Москва, 1994

Протоколы, постановления и материалы Всероссийского с'езда беженцев из Белоруссии в Москве 15-21 июля 1918 г. Москва, 1918

Собственноручные показания А.И.Луцкевича. 30 октября 1939 г. / Подг. Михнюк В., Климович Н., Гесь А. // Нёман. №1. 1995. С.127-166

Советская Россия и Польша. Москва, 1921

Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Рапалльского договора: Сборник документов. Т.1. Москва, 1968

Chambon H. La Lithuanie pendant la conférence de la paix (1919). D'après les documents tirés des archives de l'auteur. Lille-Paris, 1931

Dailidė P. Lietuvos sutartys su svetimomis valstybėmis. T.1. 1919-1929. Kaunas, 1930

Dokumenty i materiały do historii stosunków polsko-radzieckich. T.I-VI. Warszawa, 1962-1967

Russia, Poland, Lithuania and White Russia: hand. prep. under the directio of the hist. section of the foreign office / Intr. by G.W.Prothero. London: H.M.Stat.off., 1920

Tajne rokowania polsko-radzieckie w 1919 r. : Materiały archiwalne i dokumenty. Warszawa, 1986

3. Дзёньнікі і ўспаміны

Аляксееўскі К. Успаміны пра Ўсебеларускі Зьезд у г. Мінску // Чырвоны Шлях. 1918. №1-2

Антонаў І. Успаміны аб польскай акупацыі Горадзеншчыны у 1919-1921 г.г.: Малюнкі гвалту і зьдзеку фацэтных польскіх паоў на Беларусі: (Мае перажываньні). Б.м., б.д., 1921

В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте: Воспоминания активных участников Октябрьской революции. Минск, 1957

Вітан-Дубейкаўская Ю. Мае ўспаміны. Вільня, 1994

Гофман М. Записки и дневники, 1914-1918. Ленинград, 1929

Езавітаў К. Беларуская Вайсковая Цэнтральная Рада // Крывіч. 1924. №1; 1925. №2

Езавітаў К. Першы Ўсебеларускі Кангрэс // Беларуская Мінуўшчына. 1993. №1

Езовитов К. Освобожденіе Минска // Варта. 1918. №1

Краўцоў Макар. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі. Вільня, 1921

Краўцоў Макар. Ўсебеларускі Зьезд 1917 г. Вільня, 1921

Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1991. №4-5

Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў (1903-1928). Вільня, 1928

Мстиславский С. Брестские переговоры: (Из дневника). С приложением протоколов 1-й Брестской конф. СПБ, 1918

Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця: Успаміны. Мінск, 1974

Памяці Івана Луцкевіча. Вільня, 1920

Под красным знаменем Октября: Воспоминания участников революционных событий в Белоруссии в период Великого Октября. Минск, 1987

Сазонов С. Воспоминания. Москва, 1991

Сокал-Кутылоўскі А. Мае ўспаміны аб слуцкім збройным паўстаньні // Зважай. 1989. №4

Biržiška M. Del mūsų sostinės: (Iš Vilniaus darbo atsiminimų). Kn.1-2. London, 1960

Dowbór-Muśnicki J. Moje wspomnienia. Warszawa, 1935

Glinka W. Pamiętnik z wielkiej wojny. Narew-Berezyna. Warszawa, 1927

Handelsman M. W piątym pułku legionów. Dwa miesiące ofensywy litewsko-białoruskiej. Zamość, 1921

Klimas P. Dienoraštis: 1915.XI.1-1919.I.19. Čikago, 1988

Razumovič-Chmara V. Grimassy světové války: Vzpominki atamana partizánů. Praha, 1930

Rok 1920: Wojna pol.-radziecka we wspomnieniach i innych dok. Warszawa, 1990

Uspenskis. 1-as gudų pulkas Gardine ir kaip jis tapo lenkų nuginkluotas // Karo archyvas. I (1925). P.161-177

Wojniłłowicz E. Wspomnienia, 1847-1928. Cz.1. Wilno, 1931

4. Энцыкляпэдыі, слоўнікі, даведнікі

Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т.1-12. Мінск, 1969-1975

Гражданская война и военная интервенция в СССР: Энциклопедия. 2-е изд. Москва, 1987

Кніга Беларусі: Зводны каталог. Мінск, 1986

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.1-4. Мінск, 1993-1997

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т.1-5. Мінск, 1984-1987

Encyclopedia of Ukraine. Vol. I-V. Toronto—Buffalo—London, 1985-1993

Lietuvių enciklopedija. T. I-XXXVII. Boston, 1953-1985

Práce ruské, ukrajinské a běloruské emigrace vydané v Československu 1918-1945. Díl I, sv.1-3. Praha, 1996

5. Пэрыядычны друк

Абух (аднаднеўка, Вільня) 1924

Авадзень (Вільня) 1924-1925

Адраджэньне (Менск) 1922

Бальшавік/Большевик (Вільня) 1924-1925

Бацькаўшчына (Горадня) 1919

Беларускае Жыцьцё (Вільня, Менск) 1919-1920

Беларускае Слова (Горадня) 1920-1921

Беларуская Доля (аднаднеўка, Вільня) 1923

Беларуская Доля (Вільня) 1925

Беларуская Думка (Вільня) 1919

Беларуская Ніва (Вільня) 1925

Беларускі Голас (аднаднеўка, Вільня) 1921

Беларускі Гоман (аднаднеўка, Вільня) 1923

Беларускі Звон (Вільня) 1921-1923

Беларускі Народ (Горадня) 1919

Беларускі Партызан ([Коўна]) 1922
Беларускі Селянін (аднаднеўка, Вільня) 1925
Беларускі Студэнт (Прага) 1923
Беларускі Сьцяг (Коўна) 1922
Беларускі Шлях (Менск) 1918
Беларускі Шлях (Горадня) 1922
Беларускія Ведамасьці (Вільня) 1921-1922
Беларусь (Горадня) 1919
Беларусь (Менск) 1919-1920
Бобруйскій Голосъ (Бабруйск) 1918
Бюлетэнь АБСА (Прага) 1921, 1924
Бюлетэнь Беларускага Пасольскага Клюбу (Вільня) 1925-1926
Бюлетэнь Беларускага Прэс-Бюро (Бэрлін, Рыга, Прага, Коўна) 1919-1922
Бюлетэнь Рады БНР (Прага) 1926
Бюллетень Виленского В.-Революционного Комитета и Политотдела N армии (Вільня) 1920
Бюллетень Высшего Совета народного хозяйства С.С.Р. Литвы и Белоруссии (Вільня) 1919
Бѣлорусская Земля (Менск) 1918
Бѣлорусская Криница (Петраград) 1918-1919
Бѣлорусская Рада (Менск) 1917-1918
Бѣлорусское Слово (Кіеў) 1918
Бѣлорусское Эхо (Кіеў) 1918
Бѣлорусскія Вѣдомости (Менск) 1918
Бѣлоруссы въ Одессѣ (аднаднеўка, Адэса) 1918
Вайсковы (Коўна) 1921-1922
Варта Бацькаўшчыны (Дзьвінск) 1920
Варта (Менск) 1918
Варшавское Слово (Варшава) 1920-1921
Вечерній Телеграфъ (Вільня) 1918
Виленская Мысль (Вільня) 1921-1922
Виленская Рѣчъ (Вільня) 1922
Виленское Слово (Вільня) 1920-1921
Виленское Утро (Вільня) 1921-1925
Виленскій Курьеръ (Вільня) 1919-1921
Виленскія Епархіальныя Вѣдомости (Вільня) 1922
Виленскія Новости (Вільня) 1918
Вольная Беларусь (Менск) 1917-1918
Вольная Литва (Коўна) 1921-1922
Вольны Сьцяг (Вільня) 1923
Вольны Сьцяг (Менск) 1920-1922
Воля Народу (Вільня) 1923
Воля Россіи (Прага) 1921-1925
Воля (Рыга) 1920
Воля (укр., Вена) 1920
Вперед! (Львоў) 1921-1922
Время (Бэрлін) 1925
Выбух (Баранавічы) 1925
Вызваленьне Народу (Вільня) 1922-1923
Вясковы Пролетары (Горадня) 1922
Вѣстникъ Гродненскаго Губернскаго Центральнаго Комитета объед. общ.

организацій (Петраград) 1918
Вѣстникъ Православной Митрополіи въ Польшѣ (Варшава) 1923
Голас Беларуса (Вільня) 1924
Голас Беларуса (Рыга) 1925
Голас Грамадзяніна (аднаднеўка, Вільня) 1922
Голас Праўды (аднаднеўка, Вільня) 1921
Голосъ Гродны (Горадня) 1919
Голосъ Народа (Вільня) 1918
Голосъ Россіи (Бэрлін) 1919-1920
Гоман (Вільня) 1916-1918
Грамада (Менск) 1917
Грамадзкі Голас (Вільня) 1924-1926
Грамадзянін (Вільня) 1919
Дзень Чырвонае Арміі (Вільня) 1919
Дзяньніца (Петраград) 1916
Дзяньніца (Петраград—Масква) 1918-1919
Думка Беларуса (аднаднеўка, Вільня) 1925
Дѣло Труда (Менск) 1918
Жизнь Национальностей (Масква) 1918
Жыцьцё Беларуса (Вільня) 1925
Жыцьцё Вёскі (аднаднеўка, Вільня) 1925
За Народное Дѣло (Рэвэль) 1921
За Свободу (Варшава) 1922-1925
За Свободу Россіи (Рэвэль) 1920
Загон (аднаднеўка, Вільня) 1925
Зарава (аднаднеўка, Вільня) 1923
Зарніца (Вільня) 1925
Заря Запада (Менск) 1919
Звон (Менск) 1919
Звѣзда (Смаленск, Вільня) 1918-1920
Зеркало (Коўна) 1921
Змаганьне (Вільня) 1923-1924
Знамя Труда (Вільня) 1918
Зорка Беларуса (аднаднеўка, Вільня) 1925
Зорка (Горадня) 1919
Зорка (Менск) 1919-1920
Іскра (аднаднеўка, Вільня) 1925
Іскра (Вільня) 1925
Извѣстія Виленскаго Военно-Революціоннаго Комитета и Политотдѣла N арміи (Вільня) 1920
Извѣстія Временнаго рабоче-крестьянскаго Правительства Бѣлоруссіи (Менск) 1919
Каляда (аднаднеўка, Вільня) 1924
Коммунистъ (Вільня) 1918-1919
Красная Молодежь (Вільня) 1919, 1922
Красное Знамя (Вільня) 1920
Красный Шмель (Б.м.) 1920
